Закон.

ПАМЯЦЬ

ЛЕПЕЛЬСКІ РАЁН

МІНСК "БЕЛАРУСЬ" 1999



Знак горада на трасе Віцебск — Мінск

У 9—5 тысячагоддзях да н. э.	З'явіліся першыя пасяленні людзей на тэрыторыі сучаснага раёна
X ст.	Лепельшчына ўваходзіць у склад Полацкага княства
1439 г.	Першыя пісьмовыя звесткі аб Лепелі, які адышоў да Віцебскага рымска-каталіцкага касцёла
1541 г.	Лепель адышоў да Віленскай рымска-каталіцкай кафедры
1568 г.	Пачатак будаўніцтва Лепельскага замка

Гарадзішча ў в. Камень, VI—VIII, XII—XIII стст.

1566—1579 гг.	Існавала пабудаваная па загаду І. Грознага крэпасць Кап'ё на востраве Суша
1586 г.	Віленская рымска-каталіцкая кафедра прадала Лепель Льву Сапегу
XVII ст.	Леў Сапега заснаваў новы Лепель
1602 г.	Пабудаваны касцёл і царква ў Лепелі
1609 г.	Л. Сапега падарыў Лепель Віленскаму манастыру бернардзінак

Рэшткі Губінскага касцёла. 1714 г.

1714 г.	Пабудаваны ў Губіне касцёл св. Антонія і кляштар францысканцаў
1772 г.	Пабудаваны касцёл у маёнтку Ворань
1773—1776 гг.	Лепель — цэнтр Полацкага ваяводства
1779 г.	Пажар у Лепелі, згарэў сапегаўскі касцёл
1780 г.	Пабудаваны касцёл у мястэчку Пышна

Царква Вялікамучаніцы Параскевы Пятніцы. 1868 г.

1793 г.	Па другому падзелу Рэчы Паспалітай Лепельшчына ўвайшла ў склад Расіі
1797—1805 гг.	Будаўніцтва Бярэзінскай воднай сістэмы
1802 г.	Лепель — цэнтр павета Віцебскай губерні
1805 г.	Лепелю нададзены статус горада
1805 г.	Пабудаваны касцёл у маёнтку Завідзічы

…ёл святога Казіміра. 1876 г.

1812 г., 3 ліпеня — 15 кастрычніка	Лепель быў акупіраваны войскамі Напалеона
1830 г.	Адкрыта Лепельскае 4-класнае дваранскае вучылішча
1833 г.	У Лепелі здарыўся вялікі пажар, які знішчыў амаль чвэрць горада
1835 г.	Імператар Мікалай I зацвердзіў план забудовы Лепеля

Будынак спіртзавода ў в. Таронкавічы, канец XIX — пачатак XX ст.

1844 г.	Узведзены ў Лепелі каменны Праабражэнскі сабор
1852 г.	Лепель атрымаў герб «Пагоня»
1868 г.	Пабудавана драўляная царква св. Параскевы
1876 г.	Пабудаваны каменны касцёл св. Казіміра
1893 г.	Заснавана Лепельская метэаралагічная станцыя
1900 г.	Пабудавана царква на Георгіеўскіх могілках

Лепельскі краязнаўчы музей

1906 г.	Адкрыта Лепельскае жаночае Марыінскае вучылішча
1917 г., лістапад	У павеце ўстаноўлена Савецкая ўлада
1918 г., сакавік— верасень	Лепельскі павет акупіраваны нямецкімі войскамі
1919 г., кастрычнік — 1920 г., май	Павет акупіраваны белапалякамі

Гарадскі парк

1919—1924 гг.	Лепельскі павет уваходзіў у склад РСФСР
1921 г.	Вялікі пажар у Лепелі
1924—1926 гг.	Будаўніцтва чыгункі Орша—Лепель
1924 г., 17 ліпеня	Утвораны Лепельскі раён
1925 г., 30 студзеня	Створаны Бярэзінскі дзяржаўны запаведнік



Ушанаванне памяці загінуўшых у Вялікай Айчыннай вайне

1929 г.	Адкрыты Лепельскі педтэхнікум
1930 г., 21 лістапада	Выйшаў 1-ы нумар раённай газеты «Калгасная праўда»
1932 г.	Створана 1-ая Лепельская МТМ
1938 г.	Пачаў работу Лепельскі калгасна-саўгасны тэатр
1939 г.	Адкрыта Лепельскае пяхотнае вучылішча
1940 г.	Адкрыта артылерыйска-мінамётнае вучылішча



Падарожжа па Бярэзінскай воднай сістэме

1941 г., 3 ліпеня	Раён акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі
1943 г.	Утворана Лепельская партызанская брыгада імя Сталіна
1944 г., 28 чэрвеня	Лепельскі раён вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

Харэаграфічны ансамбль Лепельскай школы мастацтваў

1948 г.	Пачата будаўніцтва малочнакансервавага камбіната
1953 г.	Пачаў працаваць Лепельскі краязнаўчы музей
1954—1956 гг.	Будаўніцтва Лепельскай гідраэлектрастанцыі
1974 г.	Прыняў першых навучэнцаў Лепельскі гідрамеліярацыйны тэхнікум
1975 г.	У в. Чарнаручча ўстаноўлена стэла на магіле ахвяр генацыду, расстраляных 28.02.1942 г.

Народны хор ветэранаў вайны і працы раённага Дома культуры

1975 г.	Помнік (камень-валун) устаноўлены на ўшанаванне памяці Героя Савецкага Саюза В. С. Кладзілава
1976 г.	Створаны Лепельскі вопытна-эксперыментальны завод шасцерань
1977 г.	Заснавана Лепельскае ПТВ
1982 г.	Устаноўлена мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці партызанкі В. А. Маргевіч
1989 г., чэрвень	Адзначана 550-годдзе Лепеля

Да чытача

Кожны народ не без роду і племя
мае
Летапіс свой і гісторыі след
на старонках.

М. Гусоўскі

Я шчасны,
што сынам быць
гэтай зямлі
Мне лёсам наканавана.

Р. Барадулін

Паважаныя чытачы!

Вы адгарнулі старонку чарговай хронікі — дакументальнай кнігі «Памяць». Яе складальнікі сардэчна запрашаюць вас прайсціся сцяжынкамі памяці па цудоўным куточку Беларусі — Лепельскай зямлі. Калі гэтую зямлю ўбачыш хоць раз у жыцці — яе не забудзеш. Калі пройдзеш па гэтай зямлі — палюбіш яе.

Лепельскі край багаты на ўсё: лясы і палеткі, азёры і рэкі. Уся прыгажосць якідкай беларускай прыроды ўвасобілася тут. А сама яго назва, як сведчаць паданні, пайшла ад слова «лепей».

У далёкія часы на гэтай зямлі людзі заснавалі свае паселішчы, адно з якіх дало нараджэнне невялікаму, але прыгожаму гораду Лепелю.

Шмат падзей адбылося на Лепельскай зямлі за стагоддзі. На доўгім гістарычным шляху зведала яна нямала нястач, адбівала не адзін паход чужаземных заваёўнікаў.

Асабліва суровыя выпрабаванні выпалі на долю лепяльчан у гады Вялікай Айчыннай вайны. Але нішто не зламала іх жаданне бачыць сваю зямлю свабоднай і шчаслівай. На франтах, у партызанскіх атрадах, падпольных групах яны змагаліся з ворагам. Пяцёра лепяльчан сталі Героямі Савецкага Саюза, адзін кавалерам ордэна Славы 3 ступеняў, сотні ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Лепельшчына — край, дзе шануюць памяць сваіх сыноў і дачок, аддаўшых жыццё ў баях за Радзіму. І ранняй вясной, і позняй восенню цвітуць кветкі ля абеліскаў і на брацкіх магілах.

2. Зак. 434.

Лепельшчына — край, дзе ганарацца сучаснікамі: вучонымі і паэтамі, настаўнікамі і хлебаробамі, якія сваёй сумленнай працай памнажаюць славу роднай зямлі.

Дарагія чытачы! Яшчэ і яшчэ раз перагарніце старонкі гэтай кнігі, учытайцеся ў дакументы, прыгледзьцеся да здымкаў, і вы адчуеце веліч таго часу, падзей, спраў, іх вечнае значэнне для нашых дзён, для кожнага з нас.

Няхай і далей жыве гэта памяць аб мінуўшым у свядомасці і сэрцах не толькі людзей старэйшага пакалення, але і іх дзяцей, унукаў, праўнукаў, якія будуць нараджацца і жыць на Лепельскай зямлі!

Аўтарскі калектыў кнігі «Памяць. Лепельскі раён» удзячны ўсім, хто прымаў удзел у пошуку і зборы матэрыялаў: прадстаўнікам грамадскасці, настаўнікам, краязнаўцам, супрацоўнікам Лепельскага краязнаўчага музея.

Пры напісанні хронікі выкарыстаны публікацыі з газет і часопісаў, успаміны ўдзельнікаў і сведак гістарычных падзей, а таксама матэрыялы і дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных архіваў г. Віцебска і г. Полацка, Беларускай нацыянальнай бібліятэкі, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва, Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва, Расійскай нацыянальнай бібліятэкі.



ЛЕПЕЛЬСКІ РАЁН размешчаны на поўдні Віцебскай вобласці.

Плошча 1,8 тыс. км^2. Насельніцтва 45 300 чалавек (на 1 студзеня 1998 г.). 238 населеных пунктаў. Цэнтр — г. Лепель. Раён падзяляецца на 12 сельсаветаў: Баброўскі, Бароўскі, Валосавіцкі, Горскі, Домжарыцкі, Заазерскі, Каменскі, Лепельскі, Пышнянскі, Слабадскі, Стайскі, Сушанскі.

Сучасны рэльеф яго фарміраваўся працяглы час (больш 1 млрд. гадоў). Шмат разоў суша змянялася морам, а мора — сушай... Кожная геалагічная эра пакінула свае асадкавыя горныя пароды, якія залягаюць у асноўным гарызантальнымі пластамі на старажытным фундаменце Усходне-Еўрапейскай платформы. Карысныя выкапні — торф (193 радовішчы з агульнымі запасамі 92,1 млн. т), пясчана-жвіровыя матэрыялы і пяскі з запасамі 57,9 млн. м^3, гліны, суглінкі, вапнякі, даламіты.

Клімат умерана-кантынентальны. Сярэдняя тэмпература студзеня −7,2°, ліпеня +17,9°. Ападкаў — 638 мм за год. Таўшчыня снежнага покрыва 30—40 см. Вегетацыйны перыяд — 187 дзён.

Па тэрыторыі раёна часткова праходзіць водападзел паміж рэкамі Балтыйскага і Чорнага мораў — Бярэзінай і Заходняй Дзвіной.

Найбольшыя рэкі: Бярэзіна, правы прыток Дняпра; Эса з прытокамі Байна, Свядзіца, Бярэшча; Ула, Зеха і інш. Густата натуральнай рачной сеткі 0,40 км/км^2. Агульная даўжыня асушальнай сеткі 4,3 тыс. км.

Карта раёна

У раёне звыш 100 вялікіх і малых азёр, большая частка якіх ледавіковага паходжання. Самыя вялікія з іх Лепельскае (плошча 10,18 км^2), Окана, Бярэшча, Тэкліц, Ворань, Астроўна, Домжарыцкае, Бобрыца, Цяменіца, Какісіна і інш. Апошняе — гідралагічны заказнік мясцовага значэння.

Глебы ў раёне дзярнова-падзолістыя (54,7 %), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (23 %), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (8 %), поймавыя (алювіяльныя) (1,1 %), тарфяна-балотныя (13,2 %). Па механічнаму складу (у працэнтах) больш палавіны суглінкавых глебаў (50,2), супясчаных (29), пясчаных (7,6) і тарфяных (13,2).

Сельскагаспадарчыя ўгоддзі займаюць 33,1 %, у тым ліку 20,9 % — ворная зямля, трэць якой завалунена, 11,3 % сенажацей і пашаў. Якасная ацэнка ворных зямель 40 балаў (цана бала 0,3 ц/га збожжа).

Лясы (45 % тэрыторыі) — хваёва-шыракалістыя. Агульная плошча балот 32 тыс. га. Частка тэрыторыі раёна ўваходзіць у Бярэзінскі біясферны запаведнік.

У эканоміцы раёна галоўная роля належыць сельскай гаспадарцы. Асноўныя галіны — ільнаводства і малочна-мясная жывёлагадоўля. Вырошчваюць збожжавыя, бульбу, кармавыя культуры; з тэхнічных — лён.

У раёне прадпрыемствы па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, лёгкай і харчовай прамысловасці.

На 1.01. 1998 г. 12 калгасаў і 6 саўгасаў. Лепель звязаны шасейнымі дарогамі з Мінскам, Віцебскам, Полацкам, Докшыцамі, Ушачамі, Чашнікамі, Барысавам; чыгункай і шасейнай дарогай з Оршай.

На 1.01.1998 г. у раёне 21 сярэдняя, 3 базавыя, 7 пачатковых школ, 34 дашкольныя ўстановы; 4 музычныя школы, 2 школы мастацтваў; 2 цэнтры дзіцячай творчасці, дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, цэнтр фізічнага выхавання, гідрамеліярацыйны тэхнікум, ПТВ-175; 7 бальніц, 19 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, 2 амбулаторыі, 6 аптэк; метэаралагічная станцыя з 1893 г. Зона адпачынку — ваенны і дзіцячы санаторыі. Раённая газета — «Лепельскі край».

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

З глыбіні тысячагоддзяў

Пачатак гісторыі чалавечага грамадства адносіцца да эпохі каменнага веку. Першым яго этапам быў палеаліт (старажытнакаменны век, ад 2 млн. гадоў да 10 тыс. гадоў да н. э.). За гэты час чалавек авалодаў тэхнікай апрацоўкі каменю і косці, навучыўся будаваць жыллё і здабываць агонь. Галоўнымі сродкамі яго існавання былі паляванне і збіральніцтва. Нягледзячы на настойлівыя пошукі археолагаў, знайсці стаянкі людзей таго часу на тэрыторыі нашага краю не ўдалося.

У канцы 1980 — пачатку 1990-ых гадоў археалагічны атрад Інстытута гісторыі АН РБ пад кіраўніцтвам кандыдата гістарычных навук У. П. Ксяндзова правёў раскопкі ў Лепельскім раёне і знайшоў помнікі эпохі мезаліту (сяраднекаменнага веку, 9—5-ае тысячагоддзі да н. э.). На паўднёва-заходнім беразе Лепельскага возера ва ўрочышчы Пясчаніца археолагі, якім дапамагалі вучні мясцовых школ, знайшлі стаянку старажытнага чалавека, які жыў тут прыкладна 9 тыс. гадоў назад.

Вучоныя правялі абследаванне тэрыторыі на плошчы каля 500 м^2, знайшлі ў культурным пласце на глыбіні 0,4—0,5 м шматлікія прылады працы: скрабкі, скрэблы, разцы, скоблі для апрацоўкі скуры, рога, косці, дрэва; нажы, тапор, адбойнікі і інш. Яны выраблены з адшчэпаў і пласцін, якія здымаліся са спецыяльна падрыхтаваных кавалкаў крэйдавага крэменю блакітнага колеру — нуклеусаў. Спецыялісты сцвярджаюць, што жыло тут насельніцтва грэнскай культуры, помнікі якой знаходзяцца на поўдзень ад нас, у басейнах рэк Дняпра, Бярэзіны, Сожа.

Стаянак эпохі неаліту (новакаменнага веку, 4-ае тысячагоддзе да н. э. — пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э.) знойдзена некалькі. Адну з іх у 30-ыя гады вывучаў археолаг К. М. Палікарповіч. Знаходзіцца яна на востраве Лепельскага возера, які цяпер заліты вадой. Другое паселішча адкрыта ў вусці ракі Эсы, на правым беразе, і даследавана археолагам І. М. Ціханенкавым у 1964—1967 гг. Пазней ім было знойдзена яшчэ некалькі неалітычных стаянак, у тым ліку на паўднёвым беразе возера Окана. У гэты час з'явіліся лук і стрэлы, што дало магчымасць перайсці да паляванння на дробных жывёл. Паляванне на іх вялося невялікімі групамі людзей і патрабавала значна меншых намаганняў, чым загон. Рыбаловы ўжо мелі вуды з касцянымі кручкамі, зубчатыя коп'і (дзіды), восці, сеткі. Гэтыя прыстасаванні зрабілі рыбную лоўлю больш прадукцыйным промыслам, чым паляванне. Яна стала надзейным спосабам атрымання ежы.

У эпоху неаліту быў вынайдзены спосаб вырабу глінянага посуду. Авалоданне прыёмамі лепкі і абпальвання

яго палепшыла спосабы нарыхтоўкі ежы і аблягчала захоўванне яе запасаў. Усё гэта садзейнічала больш хуткаму пераходу да аселага спосабу жыцця.

На поўначы Лепельскага раёна археолагам Э. М. Зайкоўскім у 1979 г. вывучаны стаянкі Ворань-I і Ворань-II. Размешчаны яны адна насупраць другой на правым беразе невялікай рэчкі Вароніцы. Тут сустракаюцца рэшткі керамічных вырабаў, якія ў асноўным адносяцца да так званай нарвенскай культуры.

Гладкасценны посуд ляпілі без выкарыстання ганчарнага круга. У большасці з іх на месцы пераходу сценак у днішча ёсць выступ. Другі тып посуду вырабляўся ў форме гліняных слоікаў.

На поўначы Беларусі і на суседніх з ёй тэрыторыях з 2-га тысячагоддзя да н. э. па першую палову 1-га тысячагоддзя н. э. жылі плямёны, культура якіх была падобнай на культуру штрыхаванай керамікі. Яе назвалі днепрадзвінскай. Плямёны гэтай культуры займалі даволі вялікую тэрыторыю. У нашай мясцовасці ў той час будавалі дамы невялікіх памераў, слупавай канструкцыі. Гэта былі чатырохвугольныя пабудовы, у цэнтры якіх абсталёўваліся адкрытыя ачагі.

Сляды эпохі бронзы (пачатак 2-га тысячагоддзя — сярэдзіна 1-га тысячагоддзя да н. э.) захаваліся да нашых дзён. У гэты час з'явілася каляровая металургія. Найбольш старажытнымі цэнтрамі яе былі Урал, Закаўказзе, Скандынавія. Гатовыя вырабы або зліткі металу шляхам абмену паступалі на нашу тэрыторыю. Выкарыстанне металічных прылад працы зрабіла глыбокі пераварот у гаспадарчай дзейнасці людзей. У гэту эпоху адбыўся пераход ад мацярынскага да патрыярхальнага (бацькоўскага) родавага ладу. Сваяцтва лічылася ўжо не па мацярынскай лініі, а па бацькоўскай.

Цікавыя знаходкі зрабіў вядомы археолаг, гісторык, калекцыянер, ураджэнец в. Завідзічы Лепельскага павета, член Маскоўскага імператарскага археалагічнага таварыства Міхаіл Францавіч Кусцінскі (1829—1905 гг.), які яшчэ ў мінулым стагоддзі правёў археалагічныя даследаванні на нашай тэрыторыі.

У 1857 годзе ён раскапаў адзін з чатырох курганоў, якія ляжаць каля маёнтка Чэрцы, у 12 вярстах ад г. Лепеля. У самай сярэдзіне кургана знойдзены былі спаленыя чалавечыя косці, пры якіх стаяў гліняны гаршчок, таксама запоўнены спаленымі косткамі; на дне гаршка знойдзена маленькая бронзавая сякера ці бярдышак, які М. Ф. Кусцінскі прызнаў за эмблему або сімвалічны знак пахаванага. Бярдышак гэты, без сумнення, адносіцца да бронзавага перыяду і ўяўляе даволі рэдкую знаходку (Семянтоўскі А. М. Беларускія старажытнасці. Спб.: 1890. С. 20—21).

У бронзавую эпоху побач з металічнымі прыладамі працы яшчэ працяглы час выкарыстоўваліся і каменныя. У гэты час былі створаны нават новыя іх тыпы.

Пасля VII ст. да н. э. плямёны, што жылі ў Прыдзвінскім краі, навучыліся здабываць жалеза. У грамадскім ладзе ўжо ў самым пачатку жалезнага веку адзначаліся прыкметы разлажэння першабытнаабшчынных адносін. Гэта знайшло адлюстраванне і ў характары паселішчаў. Асноўным іх тыпам становяцца ўмацаваныя гарадзішчы. Спачатку яны ўмацоўваліся толькі драўлянымі сценамі, а пазней — земляными валамі, выкапанымі глыбокімі канавамі і інш.

У нашай мясцовасці вядомы гарадзішчы VII—V ст. да н. э. Такія археалагічныя помнікі ёсць на востраве

Рэканструкцыя касцюма дзяўчыны з курганнага могільніка Ворань XI—XII стст. Зроблена Л. У. Дучыц

Лепельскага возера, каля існаваўшай раней вёскі Гарадок, ля вёсак Азярцы, Бораўна, Верабкі, Ворань, Гарадзінец, Забаенне, Звязда, Камень, Кастрыца, Куляшы, Стараселле.

У Лепельскім краязнаўчым музеі экспануюцца знаходкі з гарадзішча ля в. Кастрыца Валосавіцкага сельсавета, сабраныя археолагам В. Г. Штыхавым у 1966 г. Тут каменныя сякеры, разцы, крэмневы нож, ручная зерняцёрка. На адным камені нескразная адтуліна: старажытныя людзі здабывалі агонь. Выраблены гэтыя прылады працы больш за 2 тыс. гадоў таму назад.

У 1976 г. праведзены раскопкі гарадзішча ля в. Бораўна. У справаздачы археолага А. Р. Мітрафанава пра палявыя работы чытаем:

«Гарадзішча Бораўна размешчана ў адным км на паўночны ўсход ад в. Бораўна, на левым беразе безыменнай рэчкі, якая ў 0,35—0,4 км на поўнач ад гарадзішча ўпадае ў р. Улу (правы бераг). Пабудавана на стрэлцы доўгага ўзгорка, які цягнецца з поўначы на поўдзень на 0,25—0,3 км. З заходняга боку да гарадзішча прылягае тарфяное балота. Схілы гарадзішча з паўночнага і часткова з паўночна-ўсходняга боку крутыя і высокія, іх вышыня не менш за 9—10 м. З палявога (паўднёвага) боку гарадзішча ўмацавана земляным валам.

Пляцоўка гарадзішча роўная, злёгку выпуклая, мае нахіл (да 1 м) на поўнач. У плане яна амаль круглая...» Тут знойдзены шматлікія абломкі гладкасценных слабапрафіляваных пасудзін, якія адносяцца да часу існавання культуры тыпу верхняга пласта Банцараўскага гарадзішча (VI—VIII стст.) і днепра-дзвінскай культуры. З другіх знаходак выяўлены жалезны серп, тронкі нажа, абломак сякеры, гліняныя прасёлкі, грузікі, абломак льячкі для плаўкі каляровых металаў, ікол мядзведзя, косткі свойскай жывёлы.

У 1991 г. на Лепельшчыне працавала археалагічная экспедыцыя Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі пад кіраўніцтвам Л. У. Дучыц. Каля вёскі Занькі Лепельскага сельсавета былі вывучаны два курганныя насыпы жалезнага веку. Знойдзены мужчынскія пахаванні без рэчаў. У ліпені гэтага ж года Л. У. Дучыц правяла раскопкі 9 курганоў XI—XII стст. паміж вв. Заазер'е і Ворань Заазерскага

сельсавета. Ёю знойдзены разнастайныя бронзавыя і шкляныя жаночыя ўпрыгожанні, што характэрна для балта-славянскага строю нашых продкаў.

Трэба адзначыць, што на Лепельскай зямлі ў розныя гады раскопкамі і даследаваннямі займаліся гісторыкі, археолагі, краязнаўцы М. Ф. Кусцінскі, А. М. Семянтоўскі, І. М. Ціханенкаў, К. М. Палікарповіч, А. М. Ляўданскі, А. Р. Мітрафанаў, А. З. Заяц, Г. В. Штыхаў, Э. М. Зайкоўскі, Л. У. Дучыц, У. П. Ксяндзоў, К. П. Шут, М. М. Чарняўскі і інш.

Буйным дасягненнем археалагічнай навукі з'явілася адкрыццё паселішчаў і могільнікаў славян V—VII стст. на Правабярэжнай Украіне, у Чэхіі, Славакіі, Румыніі, Польшчы, на ўсходзе Германіі. Упершыню яны былі выяўлены ў наваколлі Прагі і таму атрымалі назву культуры пражскага тыпу. Помнікі славянскай культуры знойдзены ў паўднёвай частцы Беларусі: на ўскраіне г. Петрыкава каля вёсак Курадава, Гарадзішча, Кажан-Гарадок, Чарнічы і інш., па рэках Прыпяць, Ясельда і Гарынь.

Як лічаць некаторыя вучоныя, першымі пасяленцамі на нашай тэрыторыі былі продкі фіна-ўгорскіх народаў. У канцы 3 — пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э. магутная хваля індаеўрапейцаў рассялілася на Беларусі. У іх складзе былі старажытныя балты, продкі сучасных латышоў і літоўцаў. У VI ст. у працэс «Вялікага перасялення народаў» уключыліся і славяне, якія на працягу стагоддзяў прасоўваліся з поўдня на поўнач у лясную зону Усходняй і Паўночнай Еўропы.

Паміж мясцовым насельніцтвам і прышэльцамі здараліся жорсткія сутычкі, аб чым сведчаць рэшткі вогнішчаў спаленых балцкіх гарадзішчаў.

Паступова мясцовае балцкае і фіна-ўгорскае насельніцтва збліжалася са славянамі, змешвалася ў адной тэрытарыяльнай абшчыне. Спрыяла гэтаму яшчэ і тое, што вераванні ў славян і балтаў былі аднолькавымі — язычніцкімі.

І. Ю. Януш

Гарадзішчы Лепельскага раёна

1. Гарадзішча Гарадок. За 2,5 км на захад ад Лепеля. Умацавана валам вышынёй да 1,2—1,5 м, шырынёй 7—10 м. Пляцоўка амаль круглая, памерам 40×38 м. Абследавана ў 1931 г. А. М. Ляўданскім, у 1972 г. — А. Р. Мітрафанавым. Знойдзены абломкі ляпной керамікі (пераважна штрыхаваных пасудзін), кавалкі жалезнага шлаку, абломкі печаў-домніц, косці свойскіх і дзікіх жывёл. Датуецца III—IV стст. н. э. Адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі.

2. Гарадзішча на невялікім востраве Лепельскага возера. Абследавалі ў 1931 г. А. М. Ляўданскі, у 1969 г. Г. В. Штыхаў, у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў, у 1981 г. Ю. А. Заяц. Пляцоўка выш. 1—1,5 м, дыяметрам 60 м. Знойдзена ляпная штрыхаваная кераміка III—IV стст. н.э.

3. Гарадзішча ля в. Азярцы Лепельскага с/с. За 0,2 км на ўсход ад вёскі. Памер пляцоўкі 70×55 м. Культурны пласт 1,1 м, мае два гарызонты. У верхнім знойдзены абломкі ганчарнага посуду, два невялікія абломкі гаршкоў; у ніжнім — рэшткі ляпных пасудзін, абпаленыя камяні, рэшткі жывёл. Гарадзішча функцыяніравала ў час днепра-дзвінскай культуры (III—IV стст.).

4. Гарадзішча ля в. Бораўна Лепельскага с/с. За 1 км на ПнУ ад вёскі. Гарадзішча ўмацавана валам шырынёй да 8—9 м каля асновы і вышынёй да 2,2 м. Памер пляцоўкі 37×35 м, выявіў і даследаваў у 1972 і 1976 гг. А. Р. Мітрафанаў. Знойдзены абломкі ляпной керамікі, шлакі, жалезны серп, выяўлены рэшткі жытлаў слупавай канструкцыі і гаспадарчых

Схема «Старажытныя пасяленні на тэрыторыі Лепельскага р-на». З экспазіцыі музея.



План гарадзішча каля в. Бораўна Горскага с/с. З экспазіцыі музея



Частка матэрыялаў з раскопак на гарадзішчы Бораўна Горскага с/с, знойдзеных А. Г. Мітрафанавым у 1976 г. З экспазіцыі музея

ям. Адносіцца да днепра-дзвінскай (III—IV стст.) і тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны (VI—VIII стст.) культур.

5. Гарадзішча ля в. Вербкі Слабадскога с/с. За 0,1 км на ўсход ад вёскі. Даўжыня пляцоўкі з зах. на ўсх. 68 м, максімальная шырыня 40 м, мінімальная 26 м. З зах. боку пляцоўка ўмацавана валам і шырокім ровам. Шырыня вала ў аснове да 9 м, вышыня 1,1 м. Глыбіня рова не менш за 10 м, шырыня да 20 м. Абследавалі ў 1972 г. А. Р. Мітрафанаў, у 1981 г. Ю. А. Заяц. Знойдзены абломкі штрыхаваных пасудзін, кавалкі жалезнага шлаку і абпаленыя камяні. Характар керамікі (дамешак жарствы, вострарабрыстая форма пасудзін, параўнальна добрае абпальванне) дае магчымасць датаваць гарадзішча I—III стст. і аднесці яго да культуры штрыхаванай керамікі.

6. Гарадзішча ля в. Ворань Заазерскага с/с. За 3 км на З ад вёскі, у лесе, на



План размяшчэння археалагічных помнікаў каля в. Ворань: *1 — гарадзішча, 2 — селішча, 3 — курганы*



Гарадзішча ў цэнтры в. Камень

бераза воз. Азяруты. Пляцоўка памерам 50×31 м. Схілы стромкія, вышыня ПнЗ 10—12 м, астатніх 6—8 м. Абследавана ў 1931 г. А. М. Ляўданскім, у 1972 г. А. Р. Мітрафанавым, у 1981 г. Ю. А. Зайцам. Знойдзены абломкі ляпнога посуду. Гарадзішча адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі, датуецца IV—I стст. да н. э.

7. Гарадзішча ля в. Гарадзінец Лепельскага с/с. Знаходзіцца за 0,3 км на ПнУ ад вёскі, на левым беразе рэчкі Талпянская. Пляцоўка амаль круглая, дыяметрам каля 25 м. Выявіў у 1966 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

8. Гарадзішча ля в. Забаенне Лепельскага с/с. За 1 км на ПнЗ ад вёскі. Пляцоўка авальная, памерам 35×20 м. Умацавана валам вышынёй 1,8 м і ровам глыбінёй 1,3 м. Абследавалі ў 1931 г. А. М. Ляўданскі, у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў. Знойдзены шлакі і абломкі штрыхаваных гліняных пасудзін. Адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі III—IV стст.

9. Гарадзішча ля в. Заглінікі Валосавіцкага с/с, нумар 1. Вядома пад назвай Замак. За 0,5 км на З ад вёскі. Пляцоўка памерам 70×85 см. Умацавана ровам глыбінёй да 1,5×2 м. Абследавалі ў 1965 г. Г. В. Штыхаў, у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў. Рэчаў не знойдзена.

10. Гарадзішча ля в. Заглінікі Валосавіцкага с/с, нумар 2. За 1 км ад гарадзішча-1. Пляцоўка памерам 40×35 м. Абследавалі ў 1965 г. Г. В. Штыхаў, у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў. Знойдзена ляпная кераміка днепра-дзвінскай культуры III—IV стст.

11. Гарадзішча пад назвай Аўгустова, знаходзіцца ля в. Звязда Пышнянскага с/с. За 1,5 км на ПнЗ ад вёскі, у лесе. Пляцоўка памерам 60×70 м. Абследаваў у 1931 г. А. М. Ляўданскі, А. Р. Мітрафанаў у 1953 г. Знойдзены абломкі штрыхаванай керамікі, жалезная сякера, дроцік з шыпамі, серп, два рыбалоўныя кручкі, жалезны шлак, 4 гліняныя прасліцы, касцяная праколка, косці свойскіх і дзікіх жывёл. Гарадзішча абследаваў таксама Ю. А. Заяц у 1981 г., датуецца IV—I стст. да н. э.

12. Гарадзішча ў в. Камень, цэнтры с/с. Знаходзіцца ў цэнтры вёскі на высокім (да 15 м ад асновы) крутым узгорку на беразе воз. Каменскае. Абследавалі ў 1956—1957 гг. Л. В. Аляксееў, у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў, у 1981 г. Ю. А. Заяц. Знойдзена ляпная і ганчарная кераміка. Гарадзішча было заселена двойчы: не пазней VI—VIII стст. і ў XII—XIII стст. Раскопкі не праводзіліся.

13. Гарадзішча пад назвай Царкавішча ля в. Кастрыца Валосавіцкага с/с. За 1,5 км на ПдЗ ад вёскі, на ўзгорку вышынёй да 20 м. Пляцоўка ў плане авальная, памерам 44×24 м. У 1965 г. раскопкі праводзілі Г. В. Штыхаў, К. П. Шут, абследаваў у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў. Культурны пласт у цэнтры пляцоўкі 0,2—0,4 м, па краях — 1 м. Мае тры гарызонты. У ніжнім выяўлены сляды жытлаў слупавай канструкцыі, знойдзены жалезныя сярпы, нажы, гліняныя прасліцы, тыглі для плаўкі бронзы, зерняцёркі, тачыльныя камяні і інш. рэчы днепра-дзвінскай культуры. У сярэднім гарызонце знойдзены жалезныя



Частка калекцыі матэрыялаў археалагічных раскопак гарадзішча каля в. Кастрыца Валосавіцкага с/с, знойдзеных Г. В. Штыхавым у 1966 г.

сякеры, сярпы, рыбалоўныя кручкі, наканечнік кап'я, абломкі гліняных пасудзін культуры тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны.

У верхнім гарызонце знойдзены спружынныя нажніцы, зубіла, нажы, тачыльныя брускі, прасліца, каменныя таўкачы, ганчарная кераміка. Адносіцца да IX — XII стст.

14. Гарадзішча каля в. Куляшы Стайскага с/с. Размешчана на левым беразе р. Уса ва ўрочышчы Дубок. Пляцоўка памерам 40 — 25 м. Абследаваў у 1931 г. А. М. Ляўданскі. Знойдзены абломкі лясных пасудзін, шлак і косці жывёл. У 1972 г. абследаваў А. Р. Мітрафанаў. Адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі IV — I стст. да н. э.

15. Гарадзішча ля в. Свядзіца Слабадскога с/с. Вядома пад назвай Батарэя. За 0,2 км на ПнУ ад безыменнага возера, у лесе, ва ўрочышчы Гогаль. Размешчана на пляцоўцы даўжынёй 60 м, шырынёй 7 — 12 м. Абследаваў у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў. Гарадзішча адносіцца да сярэдневяковых умацаванняў. Аб гэтым сведчыць яго своеасаблівая форма і сістэма земляных умацаванняў: тры абарончыя валы лініі — валы і равы.

16. Гарадзішча ля в. Стараселле Заазерскага с/с. За 2 км на З ад вёскі. Пляцоўка памерам 37×33 м. Абследавалі ў 1931 г. А. М. Ляўданскі, у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў, у 1981 г. Ю. А. Заяц. Знойдзены абломкі штрыхаваных гліняных пасудзін, абпаленыя камяні. Датуецца V — III стст. да н. э.

17. Гарадзішча ля в. Стары Лепель Заазерскага с/с. На востраве Лепельскага возера плошчай каля 25 га. Займае адзін з пагоркаў. Адкрыў у 1969 г. Г. В. Штыхаў. Абследавалі ў 1968 і 1979 гг. М. А. Ткачоў, у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў, у 1981 г. Ю. А. Заяц. У абрыве пляцоўкі, падмытай возерам, знойдзена ляпная штрыхаваная кераміка, косці жывёл, абпаленыя камяні, вуголле, шлак. Адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі III — IV стст.

Паселішчы

1. На зах. беразе воз. Лепельскае, ва ўрочышчы Пясчанка. Плошча 150×30 м. Выявіў і абследаваў у 1981 г. У. П. Ксяндзоў. Знойдзены крамянёвыя прылады працы: разцы, скрэблы, пласціны і адшчэпы, пласціны-ўкладышы, адбойнікі, нуклеусы. Адносіцца да эпохі мезаліту, 9 — 5 тысячагоддзі да н. э.

2. Паселішча-1 ля в. Ворань Заазерскага с/с, за 1,5 км на У ад вёскі. Памеры 50×50 м. Выявіў у 1956 г. Л. В. Аляксееў, даследаваў у 1979 г. Э. М. Зайкоўскі. Знойдзены крамянёвыя прылады працы, ляпная кераміка (эпоха позняй бронзы), кераміка тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны і сярэдневяковая.

3. Паселішча-2 ля в. Ворань Заазерскага с/с, за 1,7 км на У ад вёскі. Выявіў і даследаваў у 1979 г. Э. М. Зайкоўскі. Знойдзены крамянёвыя прылады працы. Адносяцца да позняга неаліту.

Селішчы

1. Селішча ля в. Ворань Заазерскага с/с. За 1 км на У ад вёскі. Выявіў у 1867 г. А. М. Семянтоўскі, абследавалі ў 1956 г. Л. В. Аляксееў, у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў, у 1981 г. Ю. А. Заяц. Знойдзены абломкі ляпных гладкасценных пасудзін. Селішча ўзнікла на месцы стаянкі эпохі бронзы.

2. Селішча ля в. Гарадзінец Лепельскага с/с. За 0,2 км на ПнУ ад вёскі. Выявіў у 1966 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

3. Селішча ля в. Кастрыца Валосавіцкага с/с. За 1,5 км на ПдЗ ад вёскі выявіў у 1965 г. К. П. Шут, абследавалі ў 1972 г. А. Р. Мітрафанаў, у 1981 г. Ю. А. Заяц. Раскопкі не праводзіліся.

4. Селішча-2 ля в. Кастрыца Валосавіцкага с/с. За 1,5 км на ПдЗ ад вёскі, побач з селішчам-1. Плошча каля 2 га. Раскопкі не праводзіліся.

5. Селішча ля в. Куляшы Стайскага с/с. На пясчанай дзюне паміж вёскай і возерам Святое. Раскопкі не праводзіліся.

6. Селішча ля в. Стары Лепель, на востраве Лепельскага воз. Абследавалі ў 1969 і 1970 гг. М. А. Ткачоў, у 1972 г. А. Р. Мітрафанаў. Знойдзены ганчарная кераміка XIV—XVI стст., медныя бранзалеты, пярсцёнкі, шкляныя пацеркі, манеты XV—XVI стст.

Курганы і курганныя могільнікі

У XIX ст. і ў 1930—1980 гг. адкрыты і даследаваны археолагамі М. Ф. Кусцінскім, А. М. Ляўданскім, Л. В. Аляксеевым, А. Р. Мітрафанавым, Г. В. Штыхавым, В. Б. Караткевічам, Ю. А. Зайцам, К. П. Шутам.

1. Курганны могільнік на ўсходняй ускраіне в. Ассё Пышнянскага с/с. Збераглася два насыпы: адзін вышынёй 1,5 м, дыяметрам 7 м. Другі выш. 2 м, дыям. 8 м. Раскопкі не праводзіліся.

2. Курганны могільнік-1 ля в. Бор Каменскага с/с. Збераглася 2 насыпы выш. да 2 м, дыям. 8—10 м. Раскопкі не праводзіліся.

3. Курганны могільнік-2, таксама ля в. Бор Каменскага с/с. За 0,8 км на ПдЗ ад



Курганны могільнік каля в. Валатоўкі

вёскі. 8 насыпаў выш. 0,5—1,2 м, дыяметрам 4—7 м. Раскопкі не праводзіліся.

4. Курганны могільнік ля в. Валатоўкі Валосавіцкага с/с. За 3 км на ПдЗ ад вёскі. 9 насыпаў дыяметрам 5—11,5 м, вышынёй 0,9—1,6 м. Раскопкі не праводзіліся.

5. Курганны могільнік ля в. Ворань Заазерскага с/с. Ва ўрочышчы Аўсянікі больш за 100 насыпаў, у плане круглыя. Каля 30 курганоў вялікія, дыяметрам 20—25 м, вышынёй 4—5 м. Астатнія дыяметрам 5—13 м, вышынёй 0,5—2,5 м. Пахавальны абрад — трупапалажэнне, знойдзены два скроневыя сярэбраныя кольцы, жалезны нож, апрацаваныя крэмні-крэсівы. Могільнік датуецца XI—XII стст.

6. Курганны могільнік ля в. Гарадзінец Лепельскага с/с. На тэрыторыі селішча 2 курганы дыяметрам да 8 м, вышынёй 1,5 м і 1,7 м. Раскопкі не праводзіліся.

7. Курганны могільнік ля в. Глыбочыца Лепельскага с/с. Ва ўрочышчы Княгінкі, на беразе воз. Глыбочыца. Захавалася 6 курганоў дыяметрам не менш за 10 м, вышынёй 1,5—2 м. Знойдзены жалезныя сякеры, коп'і, драцяны бранзалет, шкляныя пацеркі, адносяцца да XII—XIII стст.

8. Курганны могільнік-1 ля в. Домжарыцы, цэнтра с/с. За 1 км ад вёскі. 45 насыпаў дыяметрам 5—10 м, вышынёй 0,5—1,5 м. Раскопкі не праводзіліся.

9. Курганны могільнік-2 ля в. Домжарыцы. За 0,3 км на Пн ад вёскі. 200 насыпаў вышынёй 0,3—1,5 метраў, дыяметрам 3—8 м. У трох курганах знойдзены ляпныя і ганчарныя гаршкі, скроневыя кольцы, бронзавыя бранзалеты, шкляныя пацеркі. Адносіцца да II ст.

10. Курганны могільнік-1 ля в. Дрымаўшчына Лепельскага с/с. За 2 км на У ад вёскі, ва ўрочышчы Уцечча, да 40 насыпаў дыяметрам 5—12 м, вышынёй 0,5—2 м. Раскопкі не праводзіліся.

11. Курганны могільнік-2 ля в. Дрымаўшчына. За 0,15 км на У ад курганнага могільніка-1, ва ўрочышчы Пушча. Каля 300 насыпаў дыяметрам 5—15 м, вышынёй 0,6—2,5 м. Раскопкі не праводзіліся.

12. Курган ля в. Загліннікі Валосавіцкага с/с. За 1,5 км ад вёскі. Дыяметр 7 м, вышыня 1,5 м.

13. Курганны могільнік ля в. Занькі Лепельскага с/с. Мясцовая назва Валатоўкі. За 0,7 км на ПнЗ ад вёскі. Больш за 100 насыпаў дыяметрам 5—20 м, вышынёй 0,7—4,5 м.

14. Курганны могільнік-1 ля в. Звязда Пышнянскага с/с. На ПдЗ ускраіне вёскі, на беразе воз. Тэкліц. Не менш як 100 курганоў дыяметрам 5—13 м, вышынёй 0,5—3 м. Раскопкі не праводзіліся.

15. Курганны могільнік-2 ля в. Звязда. За 0,7 км на П ад вёскі. 4 падоўжныя насыпы памерам ад 10×6 да 12×6,5 м. Раскопкі не праводзіліся.

16. Курган ля в. Звязда. За 0,5 км на Пн ад вёскі. Насып падоўжнай формы, памерам 10,5×6,5 м, вышынёй 1,4 м.

17. Курганны могільнік ля в. Кастрыца Валосавіцкага с/с. На тэрыторыі селішча-2. 12 курганоў дыяметрам 10—15 м, вышынёй 0,8—2 м. Знойдзены шкляныя пацеркі, бронзавыя ўпрыгожанні. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Належаў крывічам.

18. Курганны могільнік ля в. Краснаялучка Валосавіцкага с/с. За 0,5 км на Пн і ПнЗ ад вёскі. Больш за 300 курганоў. Больш за 30 насыпаў дыяметрам 25—30 м, вышынёй 3,5—5,5 м, дыяметр астатніх 5—10 м, вышыня 0,5—3 м.

19. Курган на Пн ускраіне в. Навасёлкі Пышнянскага с/с. Насып вышынёй 3 м, дыяметрам 10 м.

20. Курганны могільнік-1 ля в. Несіна Баброўскага с/с. На Пд ускраіне вёскі, на беразе воз. Несіна. 4 насыпы дыяметрам 9—13 м, вышынёй 2—2,5 м. 2 авальныя насыпы памерам 8×10,5 м і 9,5×12,5 м, вышынёй 2—2,5 м.

21. Курганны могільнік-2. За 0,5 км на ПдУ ад в. Несіна. 7 круглых і авальных у плане курганоў. Круглыя дыяметрам 10—13 м, авальныя памерам ад 9×10 м да 14×17 м, вышынёй 0,8—3 м. Знойдзены пярсцёнак і пазалочаная шкляная пацерка. Датуецца XI ст.

22. Курганны могільнік-1 ля в. Новыя Валосавічы. За 0,5 км на З ад вёскі. 10 насыпаў дыяметрам 8—10 м, вышынёй 1—2 м.

23. Курганны могільнік-2 ля в. Новыя Валосавічы. Каля 30 насыпаў вышынёй 1—2,5 м, дыяметрам 5—15 м. Многія курганы абкладзены камянямі. Вядомы з 1924 г.

24. Курганны могільнік-1 ля в. Свядзіца Слабадскога с/с. На тэрыторыі сучасных могілак і каля іх. Да 20 насыпаў дыяметрам 7—15 м, вышынёй 1,5—3 м. Вядомы з 1924 г.

25. Курганны могільнік-2 ля в. Свядзіца. На Пд беразе воз. Заходняе. 10 курганоў дыяметрам 5—15 м, вышынёй 1—3 м. Пакінуты крывічамі ў XI—XIII стст.

26. Курганны могільнік-1 ля в. Слабодка Пышнянскага с/с. Не менш як 70 насыпаў, большасць вышынёй 0,5—2,5 м, дыяметрам 5—12 м.

27. Курганны могільнік-2 ля в. Свядзіца Слабадскога с/с. За 0,2 км ад курганнага могільніка-1. 30 круглых у плане курганоў вышынёй 0,6—2,5 м, дыяметрам 5—10 м. Раскопкі не праводзіліся.

28. Курганны могільнік-3 ля в. Свядзіца. За 0,5 км на ПнУ ад вёскі. 12 насыпаў. Большасць дыяметрам 12—15 м, вышынёй 1,5—2,5 м, некалькі — дыяметрам 7—10 м, вышынёй 0,8—1,2 м. Раскопкі не праводзіліся.

29. Курганны могільнік ля в. Старыя Валосавічы. За 0,5 км на У ад вёскі. 6 курганоў дыяметрам 7—15 м, вышынёй 1—3 м. Вядомы з 1924 г. Раскопкі не праводзіліся.

Стаянкі

1. Стаянка ля в. Окана Слабадскога с/с. Каля самай вёскі на мысе, утвораным берагам воз. Окана і рэчкі Оканіца. Культурны пласт 0,25—0,3 м. Знойдзены фрагменты гладкасценнай порыстай керамікі і крамянёвыя прылады працы, якія адносяцца да паўночнабеларускай культуры.

«З заметак аб курганах Лепельскага павета». М. Кусцінскі, сапраўдны член імператарскага Маскоўскага Археалагічнага таварыства

Места раскопок; название курганов; время появления.

Из раскопок курганов, произведенных мною в Лепельском уезде, прихожу к заключению, что их следует подразделить на две категории.

К первой отнесем курганы древнейшие, расположенные преимущественно в сосновых лесах, с поросшими на них старыми деревьями. Их бывает значительное количество в одной группе, — от 100 до 200 и более. Отличительная черта таких могильников та, что в них не только нет предметов, служивших в обыденном употреблении покойников, но даже и человеческие кости почти совершенно истлели; редко попадаются обломки глиняных сосудов и уголья.

Такие курганы видим: а) в казенной Гутовской лесной даче.

В 1879 году при раскопках в этой даче, по поручению Императорского Московского Общества любителей Естествознания и Антропологии, для собирания черепов на Антропологическую выставку, раскопано мною 15 курганов, в которых нашлось едва 4 черепа, кое-как сохранившиеся. б). В лесной даче имения Бездедовичи Ветринской волости раскопано в 1884 году при деятельном участии самого владельца имения А. А. Римского-Корсакова 10 курганов небольших размеров. Никаких предметов не найдено. Человеческие кости совершенно истлели. Число курганов в этой группе до 80. в). В лесной даче имения Завидичи, Вороньской волости, курганов более ста, некоторые из них больших размеров, до 7 сажень в окружности у основания, при высоте в 8 аршин; раскопано разновременно, с 1853 по 1890 год, 9 курганов, в них тоже ничего не найдено, кроме истлевших костей.

Такое отсутствие каких-либо предметов, при обыкновении язычников хоронить с покойником предметы, бывшие в ежедневном употреблении, доказывает низкое состояние культуры древнейшей эпохи язычества.

Вторую категорию составляют курганы позднейших времен язычества. Они сгруппированы в небольшом количестве, от 2 до 20. В них кости хорошо сохранились и часто содержат предметы, бывшие в употреблении при жизни покойника.

Из раскопанных курганов этой категории в Лепельском уезде можем указать на следующие группы: а). Близ Лепеля, на берегу канала, входящего в состав Березинской системы и соединяющего озеро Прошо с Лепельским озером, расположены три кургана. В одном из них при раскопке в 1887 году найден остов женщины: на руках — 2 браслета из бронзовой проволоки, с нанизанными на ней бусами; — из них 2 стеклянные позолоченные и 8 из массы (не то стеклянные, не то глиняные, словом, из какого-то состава) с разноцветными узорами, коих краски прекрасно сохранились; кольцо из бронзовой проволоки, скрученной спирально в 4 оборота; вокруг головы 7 серебряных колец, ни одно не спаяно, диаметром в $^{3}/_{4}$ вершка, (вероятно, эти кольца служили для поддержания прически волос); на шее мелкие стеклянные бусы зеленоватого цвета, штук около 80. б). Вторая группа этой категории — в 4 верстах от Лепеля над озером Боровно у самой дороги из Лепеля в Чашники; курганов — 7. В одном кургане, самом большом, раскопанном в 1860 году, было три костяка; первый лежал у основания насыпи: — мужской, при нем найдены: бронзовая пряжка от пояса, бронзовый перстень; второй костяк — женщины, выше первого на 1 арш.: на руках бронзовый перстень, довольно крупный, на шее бисер беловатый, вроде жемчуга, но разложившийся от сырости; в верхней части — костяк ребенка приблизительно лет десяти, при нем никаких предметов не было. Курган этот замечателен как единственный случай погребения трех покойников в одном кургане в три

яруса, а также как редкий случай нахождения костяка ребенка в кургане. г). В двух верстах от этой местности, на поле деревни Боровно насыпаны два довольно большие кургана, один возле другого. Урочище это, как объяснили крестьяне, называется «Княгиньки» или могила Князя. При том добавили следующее предание. «Когда-то, в старину, здесь был владетелем какой-то князь. При нем случилась война с соседним народом, в которой князь принял участие. Молодая жена осталась дома. Много прошло времени без вести об участи князя. Княгиня, полагая, что муж убит на войне, вышла замуж за другого. Между тем князь приехал жив и здоров. Узнав, что жена вышла за другого, в порыве ревности и гнева он убил жену, и сам лишил себя жизни. Их похоронили рядом». Раскопав оба кургана, в одном из них мы нашли остов мужчины, при нем с левого боку железное копье, с правого — такой-же большой топор, или, вернее, бердыш; в другом кургане скелет женщины, на шее серебряное ожерелье, довольно толстое, на руках бронзовый браслет спиралью.

Названия урочищ с курганами указывают иногда на род занятий или, вернее, на сословие хоронимых в тех курганах. Близ мест. Кубличи, ближе к границе Виленской губернии, есть урочище под названием «Боярники» с курганными насыпями, числом около 15. В двух раскопанных курганах я нашел в 1861 и вторично в 1883 году железные копья и топоры, или бердыши. Быть может, в этой местности жило какое-либо военное сословие, наподобие образовавшихся впоследствии «Панцырных» или «Путных» бояр, как это указывает название урочища. В одном из этих курганов, около ладони скелета человека, оказалась глиняная лампочка, круглая, с продолговатым отверстием для фитиля, длиною в 9 сантиметров, со следами масла или сала; сохранилась даже копоть при выходе фитиля*.

Перехожу, наконец, к вопросу: долго ли сохранился языческий обряд погребения в курганах, чтобы, не закапывая в вырытой в земле могиле, положить покойника на поверхности земли и насыпать над ним более или менее высокий курган. Что этот обряд долго сохранялся в Лепельском уезде, могу доказать следующим фактом. В 1879 году я раскапывал курганы на земле им. Заболотья Пышнянской волости, над озером, называемом Долгое. Курганов было около 10, расположенных в одну прямую линию. Последний курган прилегал к старому христианскому кладбищу, на котором уже с давних пор не хоронят, так что даже все кресты сгнили и обрушились. Заметны лишь малые могильные насыпи продолговатой формы, обнесенные небольшими камнями. Раскопаны были 2 кургана, ближайшие к кладбищу; в одном похоронена женщина, на ней был кожаный пояс, полуистлевший, усыпанный медными булавками; их было штук около 40; на руках 2 кольца. Изделие медных булавок никак не раньше XV или XVI столетия. В другом, ближайшем к кладбищу, был мужской остов; при нем лежали обломки кремня и стальной трехгранный напилок, служивший, вероятно, как огниво; на лобной кости черепа положена серебряная монета, — это Литовский пол-грош Сигизмунда Августа 1562 года; на лобной кости, на которой лежала монета, остались следы зеленой окиси металла. По какому поводу положена монета, объяснить не могу, во всяком случае ясное доказательство того, что в Лепельском уезде и в XVI столетии существовал обряд языческих похорон.

М. Кусцінскі.
Полацкія епархіяльныя ведамасці.
1903. № 7. С. 232—235

---

* Находка лампы в кургане — это второй пример в моей практике. Раскапывал я в 1874 году курганы в Смоленской губернии Импер. Московского Археологического общества, около станции ж. д. Гнездово: в одном кургане оказалась бронзовая лампа, длиною в 21 сантиметр, на ней рельефное изображение женской головки, изящной работы, украшенное бирюзою. Без сомнения, эта лампочка Византийской работы. Предмет весьма интересный, хранится в Историческом Музее в Москве.

У СКЛАДЗЕ ПОЛАЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ І ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Нараджэнне дзяржавы крывічоў

Землі, дзе хутка пасля прыходу крывічоў, вырасце Полацк і пачне ўмацоўвацца Полацкае княства, былі, як вядома, заселены значна раней.

Ад полацкіх крывічоў засталіся старажытныя археалагічныя помнікі — доўгія курганы IX—X стст. Крывічы займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, хатнімі промысламі. Сацыяльна-эканамічнае жыццё ўсходніх славян прывяло да ўтварэння класавага грамадства.

На важным водным шляху «з варагаў у грэкі» на Дняпры, Дзвіне, Ловаці і Волхаве ў X — пач. XIII ст. складваліся групы зямель і княстваў. На Дзвіне ўзвысіўся Полацк, на поўнач ад яго Ноўгарад, на поўдзень — Кіеў. Упершыню ў летапісах Полацк упамінаецца пад 862 г.

Полацкае княства размяшчалася ў басейнах Заходняй Дзвіны, Бярэзіны, Нёмана, займала тэрыторыю сучасных Віцебскай, паўночную частку Мінскай і Магілёўскай абласцей. Яно ляжала на заходнедзвінскім адгалінаванні шляху «з варагаў у грэкі», што садзейнічала эканамічнаму і палітычнаму развіццю Полацкай зямлі.

Тэрыторыя сучаснага Лепельскага раёна ўваходзіла ў той час у склад Полацкага княства. Ёсць думкі навукоўцаў, што праз Лепельскія землі магло праходзіць адно з адгалінаванняў гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі». Гэты шлях: Заходняя Дзвіна — р. Ула — Лепельскае возера — р. Эса — р. Бярэшча — воз. Бярэшча (воз. Окана) — волак — воз. Плаўна — воз. Манец — р. Сергуч — р. Бярэзіна — р. Днепр. (Пазней, у XIX ст., тут пабудавана Бярэзінская водная сістэма.) Гэта адгалінаванне, напэўна, мела мясцовае значэнне, але аказала ўплыў на эканамічнае развіццё.

Вядома, што Полацкая зямля, у складзе якой была і Лепельшчына, яшчэ ў сярэдзіне XIII ст. прызнала ўладу Вялікага княства Літоўскага, а ў 1307 г. канчаткова ўвайшла ў склад гэтай дзяржавы. Аб размерах яе можна меркаваць па тагачаснай карце, дзе наглядна абазначаны межныя ўладанні з цэнтрамі Полацк, Смаленск, Курск, Чарнігаў, Падолія (зямля ў міжрэччы Дняпра і Днястра з выхадам да берагоў Чорнага мора).

Ёсць шмат сведчанняў таго, што для аб'яднання зямель былі выкарыстаны выгадныя шлюбныя сувязі ўплывовых асоб, дыпламатычныя дагаворы. Было добраахвотнае падпарадкаванне. Нярэдка прымянялася і сіла. Штуршком для аб'яднання літоўскіх зямель і зямель Заходняй Русі з'явілася нападзенне мангола-татар і рыцараў-мечаносцаў. У выніку на карце Еўропы ўзнікла найбуйнейшая дзяржава. Яе тэрыторыя ў XVI ст. была падзелена на ваяводствы і паветы. Лепельшчына ўвайшла ў склад Полацкага ваяводства.

На думку гісторыка Л. Насевіча, калі ўзнікла Лукомскае княства, праз Лепельскія землі праходзіла мяжа паміж Полацкім і Лукомскім княствамі. (Паўднёвая частка сучаснага Лепельскага раёна ўваходзіла ў склад Лукомскага княства). На яго ж думку, у XV ст. частка гэтых зямель адышла да Чарэйскага княства, у тым ліку с. Белае, якое знаходзілася на месцы сучаснага Лепеля.

У XVI ст. частка Лепельскіх земель уваходзіла ў склад Харэцкай воласці.

Схема «Гісторыя ўзнікнення Лепеля»

Карта-схема Вялікага княства Літоўскага, XIII – XV стст.

Помнікі археалогіі, дакументы сведчаць, што паселішчы ўзніклі на Лепельскай зямлі з даўніх часоў, дакладна вядома, што ў XVII ст. акрамя Лепеля існавалі паселішчы Пышна, Суша, Кастрыца, Свяда, Слабада, Домжарыцы, Белае, Ляднае, Жэжліна, Завідзічы, Бораўна, Караевічы, Красналучка, Валосавічы, Таронкавічы (Вялікія і Малыя), Грыгаравічы, Слядневічы, Межыца і іншыя.

Лепель... Па сённяшні дзень мы не можам сказаць, адкуль прыйшла гэта назва. Ёсць розныя меркаванні. Прафесар БДУ В. А. Жучкевіч лічыў, што ў аснове назвы беларускія словы «лепей», «лепый» (у сэнсе *лепшы, прыгожы*), «ляпіць» (звязаны з ганчарным рамяством).

Навакольных жыхароў з даўніх часоў здзіўляла вялікае, празрыстае і глыбокае мясцовае возера. Асабліва прывабным яно было вясной і восенню, калі густыя малочна-белыя туманы шчыльна засцілалі вадзяную паверхню. Срэбрам ззяла возера ў светлыя месяцовыя ночы. Вось і назвалі яго мясцовыя пасяленцы Белым, а потым і прылеглыя да яго вёскі Белае, Бялеліца.

Вядомы гісторык, прафесар Адэскага універсітэта А. А. Качубінскі яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя зрабіў заключэнне, што слова «Лепель» паходзіць ад латышскага «ліепа» (ліпа) у сэнсе «возера сярод ліпавых лясоў». Ад назвы возера, лічыў ён, пайшла назва мястэчка, а потым і горада.

На наш запыт з музея гісторыі, літаратуры і мастацтва імя Я. Райніса (Латвія) прыслалі звесткі: слова «лепель» старажытнабалтыйскае (першабалтыйскае), узнікла ў 2-ім тысячагоддзі да н. э. Ад яго пазней з'явілася латышскае «лепе» і літоўскае «лепеле» — гэта значыць «жоўтыя гарлачыкі». Гэтыя расліны сустракаюцца на мелкаводдзі Лепельскага возера і зараз.

Беларускі тапаніміст Р. У. Аўчыннікава выставіла новую версію. Вывучаючы і параўноўваючы асновы слоў угра-фінскай групы народаў, яна прыйшла да высновы, што старажытная аснова «лепель» абазначае «альховы».

Згадваецца і легенда, якая дайшла да нашых часоў. Неяк завітаў на Ле-

пельшчыну знакаміты падарожнік, паглядзеў, падзівіўся: «О, як тут пышна!» Так узнікла назва Пышна. Едзе далей на ўсход, углядаецца. Бачыць за Стаямі цудоўны лес, мудрагелістую сістэму рэк і азёр і вельмі ўзрушваецца: «Ого, а тут яшчэ лепей!» Адсюль і Лепель.

У 1439 г. у перыяд княжання Сігізмунда Кейстутавіча яго сын Міхаіл перадаў у дар Віцебскаму рымска-каталіцкаму касцёлу Лепельскае паместце. Гэта першае, вядомае на сённяшні дзень, упамінанне нашага населенага пункта.

Яшчэ вядома, што ў 1503 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр II Казіміравіч зацвердзіў за Віцебскім касцёлам памянёны дар князя Міхаіла Сігізмундавіча і да гэтага прыбавіў яшчэ войтаўства Баравенскае, вёскі Машчоны і Соржыцу. Ёсць звесткі, што ў 1541 г. паместце Лепель было перададзена, з дазволу папы рымскага, Віленскай рымска-каталіцкай кафедры.

Пагроза агрэсіі нямецкага тэўтонскага ордэна і мангола-татарская навала прымусілі ВКЛ у 1385 г. заключыць саюз з Польшчай — Крэўскую унію. Крэўская унія і дагавор паміж ВКЛ і Польшчай паставілі праваслаўнае і каталіцкае насельніцтва Беларусі ў няроўныя ўмовы. Праваслаўная знаць апынулася ў дыскрымінацыйным становішчы. Яна нават пазбаўлялася права выбрання вялікага князя.

Шмат розных цяжкіх падзей у гэты час адбывалася на Беларусі, у тым ліку на Лепельшчыне. Не абышла наш край грамадзянская вайна 30-ых гадоў XV ст. і пагранічныя войны канца XV — пачатку XVI ст. У сярэднявеччы то маскоўскія стральцы, то польскія жаўнеры з'яўляліся каля Лепеля, Лукомля, Бешанковіч, Чашнікаў, усё спальвалі і нішчылі на сваім шляху. Людзі кідалі свае хаты і ўцякалі ў лясы.

Не лягчэйшымі былі для Лепельшчыны і гады Лівонскай вайны 1558 — 1583 гг., войны Расіі з Лівонскім ордэнам, ВКЛ, Рэччу Паспалітай, Швецыяй за Прыбалтыку і выхад да Балтыйскага мора (за Інфлянты). З 1562 г. маскоўскія войскі пачалі баявыя дзеянні супраць ВКЛ, дайшлі да Шклова, Копысі, Оршы, Дуброўны і Віцебска. У адказ харугвы ВКЛ правялі рэйд па Смаленшчыне. У лютым 1563 г. Полацк захапілі войскі Івана IV. Тады ж, у 1563 г., маскоўскія войскі занялі і спалілі Лепельскі замак, залажылі на замчышчы астрог і пакінулі ў ім значны гарнізон.

Калі ў 1563 г. цар Іван Грозны заваяваў Полацкую зямлю, рускі ўрад паклапаціўся аб складанні пісцовых кніг. У адну з іх была занесена Лепельская воласць з наступным запісам: «...Асе в Полоцком повете за рекою Двиною волость и села, по книгам «Семена Офонасьева сына Бартеньева... лета 7071 (1563)». Волость Лепель преж того была бискупа Виленского да князя Степана Избарского, на озере на Лепли, а в волости храм Николая Чудотворца. Да в той же волости того ж бискупа на Лепели же деревни оборочное. Да в той же волости сельца Белое и Ледное стоят по обе стороны озера Лепль, что было пана Остафья Воловича, да пана Ивана Селявина, да пана Омструха. Да в той же волости сельцо Железно было панов Яна да Василья, да Григория Омструховых. В той же волости сельцо Завидичи, на озере на Лепле, что было князя Ондрея Одинцовича, Оршинского «воеводы» (Даўгяла Дз. І. Лепель, павятовы горад Віцебскай губерніі. Віцебск, 1905).

У тым жа 1563 г. войскі на чале з гетманам М. Радзівілам Рудым штурмам узялі Лепель і ўмацаванні знішчылі. На Лепельскім возеры, на востраве, плошча якога прыкладна 25 дзесяцін, было заснавана «месца» Ле-



Крэпасць Суша. З гравюры 1579 г.

пель. У адпаведнасці з указам караля Сігізмунда II Аўгуста ў 1568 г. тут пачалося ўзвядзенне драўлянага замка. Лепель быў умацаваны, і кароль у гэтым жа годзе аддаў яго ў пажыццёвае валоданне полацкаму кашталяну Юрыю Мікалаевічу Зяновічу, які атрымаў тытул «старасты Лепельскага, дзяржаўцы Чачэрскага і Прапойскага». Пасля смерці Юрыя Зяновіча на тых жа ўмовах Лепель перайшоў да полацкага ваяводы Мікалая Манвіда Дарагастайскага, які правіў ім з 1577 па 1579 г.

У вайне супраць Маскоўскай дзяржавы ў 1564 г. праявіўся талент найвышэйшага гетмана ВКЛ Мікалая Радзівіла Рудага. Ён разам з Раманам Сангушкам, Рыгорам Хадкевічам, Мікалаем Сапегам, Багданам Саламярэцкім, Богушам Карэцкім распрацаваў стратэгію абароны нашага краю. Напачатку было вырашана не дапусціць злучэння 80-тысячнага войска князя Сярэбранага, што стаяў каля Оршы, і 30-тысячнага войска ваяводы Пятра Шуйскага, які ішоў туды з-пад Полацка. Велікакняскія ваяры сачылі за кожным крокам непрыяцеля. Бой вырашылі даць на Лепельшчыне ля Чашнікаў, на Іванскіх палях (па-над р. Улай).

Раптоўная атака радзівілаўскіх ваяроў — 5 тысяч коннікаў — вырашыла лёс бітвы. Войска Шуйскага было разгромлена, загінуў і сам ваявода. Гэта адбылося 26.1.1564 г.

Перамога на р. Уле, як і шэраг іншых — ля возера Дурбе, пры Сініх Водах, пад Грунвальдам і Оршай, — даказала, што наш народ цаніў незалежнасць і ўмеў бараніць сваю Айчыну ад захопнікаў.

Але вайна працягвалася. У час перамоў 1567 г. паміж ВКЛ і Маскоўскім царствам у Гародні Літва дамагалася вяртання Полацка і Смаленска, а Масква адвяргала гэта. Маскоўскія паслы прапаноўвалі, каб «Полоцкая область осталась за ними со всеми пригородами: Леплем, Капцом, Дрисой, Вороничем, Улою, Соколом...»

У час Лівонскай вайны па ўказу Івана IV Грознага на возеры Суша на востраве ў 1566 г. была ўзведзена крэпасць Кап'ё для ўмацавання пазіцый рускіх войск, будаўніцтвам якой кіравалі князь Пётр Сярэбраны і Васіль Паліцкі. Гарнізон складаўся з 6 тысяч чалавек.

У сярэдзіне 1568 г. Лепельскі замак заставаўся недабудаваным. Гэта вельмі заклапочвала караля. Жадаючы хутчэй закончыць будоўлю, Сігізмунд II аддаў загад, каб у дапамогу мясцоваму насельніцтву былі накіраваны людзі каралеўскіх валасцей, і пісьмова прапанаваў суседнім уладальнікам даць сваіх людзей на дапамогу «к работе того замка», які меў прамавугольную форму з вуглавымі фланкіруючымі вежамі. З паўночнага боку замак ад «места» аддзяляў шырокі і глыбокі роў, які часткова запаўняўся вадой з возера. У нанава пабудаваным замку размясціўся гарнізон з 200 коннікаў і 100 салдат — «драбаў». З Віленскага цэйхгаўза паступілі вялікія партыі зброі і амуніцыі. Дастаткова ў замку было і артылерыі. Польскі гісторык А. Гваньіні адзначыў, што «Лепеле —

места і замак дастаткова ўмацаваны, над возерам як бы на востраве пабудован».

Пасля радашковіцкай аперацыі бакі вялі лакальныя ваенныя дзеянні. Корпус Кміты-Чарнобыльскага хадзіў на Смаленшчыну, пад Лепелем былі разбіты фарміраванні царскіх стральцоў.

Новы этап вайны звязаны з дзейнасцю новага караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя. 30.08.1579 г. быў узяты Полацк. Пасля здачы Полацка Іван IV дазволіў сваім салдатам пакінуць замак Суша і прабівацца праз аблогу. Замак без бою здаўся М. Дарагастайскаму і тады ж быў разбураны.

У 1579 г., пасля вызвалення Полацка, кароль Стэфан Баторый адабраў Лепель у Дарагастайскага і вярнуў Віленскай рымска-каталіцкай кафедры.

У час паходу на Вялікія Лукі Стэфан Баторый затрымаўся з войскам у Чашніках, адкуль ездзіў аглядаць Лепельскі замак.

Бясконцыя крывавыя войны разбурылі наш край, знішчылі людзей. Калі скончылася вайна, будынкаў захавалася мала, іх знішчылі жаўнеры і стральцы, якія ездзілі паміж замкамі Суша, Ула, Лепель і Чашнікі.

Вайна закончылася падпісаннем 15.01.1582 г. Ям-Запольскага мірнага дагавора, але яго ўжо падпісвала новая дзяржава — Рэч Паспалітая.

Аб вёсках Лепельшчыны, якія ўваходзілі ў Лукомскую воласць

Паселішчы Боліна і Свяда, што перайшлі да Саковічаў пасля смерці княгіні Марыны, існавалі яшчэ на пачатку XX ст., што дазваляе лакалізаваць іх па карце Еўрапейскай Расіі выдання 1915 г. Боліна знаходзілася на мяжы сучасных Чашніцкага і Лепельскага раёнаў, паміж вёскамі Кастрыца і Дзераўня. Свяда — на рэчцы Свядзіцы, ля вёскі Слабада Лепельскага раёна. Іх межы ўпамінаюцца пры апісанні Полацкага павета маскоўскімі пісцамі ў 1563 г. Тэрыторыя Болінскага маёнтка тады цягнулася на поўнач да р. Улы і ўключала сяло Межыцу. Там жа ўпамінаецца мяжа сяла Свяда, што ішла ад возера Берашча па аднайменнай рэчцы да р. Эсы. Натуральнай мяжой гэтага сяла на захадзе было вялізнае балота ў водападзеле Эсы і Сергуча (доплыва Бярэзіны). Далей ляжалі землі сяла Домжарыцы, якое вылучалася з іншай воласці — Харэцкай, што ахоплівала вярхоўі Бярэзіны. Домжарыцы ўпамінаюцца з 1407 г., калі яны былі замацаваны за Войцахам Манівідам. У 1558 г. домжарыцкі ўраднік незаконна ўехаў у сумежную Свядскую пушчу і пабіў там звяроў, за што тагачасныя ўласнікі Свяды Станіслаў Петкавіч і княгіня Лукомская-Шчыдуцкая судзіліся з яго панам Васілём Тышкевічам.

На поўначы Боліна і Свяда межавалі з Полацкім паветам, у складзе якога маскоўскія пісцы ў 1563 г. вызначалі воласць Лепель («Лепль») вакол аднайменнага возера, з царкоўнымі і шляхецкімі сёламі Белае, Ляднае, Жэжліна і Завідзічы. Мяжу яны праводзілі па р. Эсе і Уле, але памыляліся, бо да Лепельскай воласці адносіўся значны абшар на поўдзень ад Улы. Сяло Белае, якое знаходзілася на месцы сучаснага райцэнтра Лепель, у першай палове XV ст. належала ўнуку Альгерда князю Андрэю Уладзіміравічу, пасля смерці якога ў 1457 г. адышло да родзічаў яго жонкі — паноў Чарэйскіх, а затым Сапегаў. Першапачатковы Лепель (сучасны Стары Лепель) у 1439 г. належаў сыну вялікага князя Жыгімонта Міхаілу, які падараваў яго Віцебскаму касцёлу. Яшчэ ў 1503 г. гэтаму касцёлу належалі Лепель і Бораўна (апошняе — на правабярэжжы Улы, недалёка ад Белай), якія пазней перайшлі да Віленскага біскупства.

Тое, што Лепельская воласць заходзіла

на правабярэжжа Эсы і Улы, наводзіць на думку, ці не вылучалася яна раней з Лукомльскай воласці, натуральна звязанай з вадазборам гэтых рэк? Сапраўды, Лепель мог быць таксама канфіскаваны Жыгімонтам у кагосьці з Лукомскіх і перададзены часткова ўласнаму сыну, часткова — Андрэю Уладзіміравічу. Але супраць такой думкі сведчыць лёс сяла Жэжліна, якое быццам бы было велікакняжацкай уласнасцю яшчэ пры Вітаўце. Позняя традыцыя сведчыць, што менавіта Вітаўт падараваў Жэжліна пачынальніку шляхецкага роду Місунаў, ад якіх яно пазней трапіла да Астравухаў (у пісцовай кнізе 1563 г. памылкова названых Амструхамі). Праўда, арыгінал прывілея Вітаўта невядомы, як і іншыя бясспрэчныя ўпамінанні Жэжліна ў XV ст., таму не выключана, што гэта толькі паданне. Такім чынам, пытанне аб магчымым вылучэнні Лепельскай воласці са складу Лукомльскай застаецца адкрытым.

Што тычыцца Улы, падараванай Станьку Саковічу Жыгімонтам, то няма падстаў звязваць яе з аднайменным паселішчам ля ўпадзення аднайменнай ракі ў Дзвіну. У пісцовай кнізе 1563 г. упамінаецца іншая Ула, якая знаходзілася ў 7 вярстах ад Чашнікаў і ў 25 вярстах ад Полацка. Яна названа цэнтрам асобнай воласці, «а в той волости села и деревни панские и монастырские многие». Пад манастырскімі сёламі, напэўна, трэба разумець уладанні манастыра Іаана Прадцечы, якому, паводле рэвізіі Полацкага замка ў 1552 г., належалі «люди коптевские, демидовские и пристойские» на р. Уле.

Уласна маёнтак Ула ўпамінаецца ў 1546 г., калі ён належаў князю Янушу Юр'евічу Гальшанскаму і калі адбывалася яго размежаванне з сялом Караевічы князя Андрэя Лукомскага на левабярэжжы р. Улы. У 1551 г. маёнтак належаў ужо троцкаму ваяводзе Мікалаю Юр'евічу Радзівілу і знаходзіўся ў закладзе ў Васіля Тышкевіча, прычым да маёнтка адносілася частка сяла Жэрына, другая належала князю Лукомскаму.

Ля гэтай жа Улы 11 лютага 1564 г. адбылася вядомая бітва Лівонскай вайны. Гетман Мікалай Радзівіл даносіў з месца сваёй перамогі, што яна адбылася ля Улы, «мястэчка пані ваяводзінай віцебскай». Пры гэтым ён яўна атаясамлівае Улу з Чашнікамі, якія сапраўды былі мястэчкам і належалі ўдаве віцебскага ваяводы Станіслава Кішкі Ганне Радзівілаўне.

М. Стрыйкоўскі, які ў 1573 г. наведаў месца бітвы і назіраў там шматлікія косці маскоўскіх ратнікаў, вызначаў гэтае месца ў адным выпадку «на палях Чашніцкіх», у другім — «на палях Іванскіх». Верагодна, уласна Ула знаходзілася недзе на поўнач ад Чашнікаў, непадалёку ад Іванска, Дзямідавічаў і Копцавічаў. Пры гэтым яе маёнткавы абшар дасягаў возера Жэрына і аднайменнага сяла. Усё гэта сведчыць аб цеснай сувязі Улы і Чашнікаў, якія, напэўна, папярэдне ўтваралі адзіны маёнткавы абшар. Абодва яны названы сярод уладанняў Ганны Радзівілаўны ў перапісе войска 1567 г. У XVI ст. гэтыя маёнткі адносіліся ўжо да Полацкага павета, але вельмі верагодна, што якраз тут знаходзілася тая Ула, якую ў свой час атрымаў пан Сянкевіч.

Аб папярэдняй прыналежнасці гэтага абшару да Лукомскай воласці сведчыць і тое, што непасрэдна да Чашнікаў адносілася тэрытарыяльна ізаляваная ад іх мясцовасць паміж Болінам і Свядам. У 1574 г., пры падзеле маёнткаў Ганны Радзівілаўны Кішчынай паміж яе дзецьмі, згадваюцца «замак і маёнтак Чашнікі і воласць, што ляжыць у Аршанскім павеце». У інвентары Чашніцкай воласці за 1633 г. гэтая тэрыторыя акрэслена больш выразна: там знаходзіліся сяло, мястэчка і слабада з аднолькавай назвай Валосавічы, засценак у Краснай Луцэ (пазнейшая — Красналучка), слабада Забаенне. Сёння Старыя і Новыя Валосавічы знаходзяцца ў Лепельскім раёне, у непасрэднай блізкасці ад паселішчаў, упамянутых у дараванні Станьку Саковічу: Таранкевічаў (Вялікіх і Малых) і Грыгаравічаў. У тым жа падараванні ўпамянуты падданы Андрэйка Сядневіч, прозвішча якога пераклікаецца з назвай вёскі Слядневічы.

Такія высновы прымушаюць звязваць з Лукомлем і абшар маёнтка Цяпіна, які знаходзіўся паміж Чашнікамі і Болінам, хаця ён непасрэдна ў час распаду Лу-

комльскай воласці не згадваецца. З пазнейшых звестак вынікае, што ў другой палове XV ст. Цяпіна дасталося нейкаму баярыну Амяльяну, а затым — яго сынам Івану і Грыгорыю Служкам. Ад першага з іх пайшоў род Амельяновічаў-Цяпінскіх, ад другога — род Служкаў, прычым абодва гэтыя роды ў XVI ст. выступаюць як саўладальнікі Цяпіна. Сыны Івана, Мацей і Мікалай Цяпінскія, упамінаюцца ў рэвізіі 1552 г., а сынам Мікалая быў вядомы беларускі асветнік Васіль Цяпінскі. Адначасова правы на Цяпіна захоўваў і Іван Грыгор'евіч Служка. У 1591 г. сярод маёнткаў яго ўнукаў Мікалая і Крыштафа Мікалаевічаў упамінаецца маёнтак Цяпіна з суседнімі сёламі Мокавічы і Прыстоі (частка апошняга з іх, нагадаем, выступае сярод манастырскіх уладанняў у складзе Ульскай воласці).

Да ўладанняў Служкаў папярэдне належала і сяло Караевічы на левым беразе Улы, насупраць Межыцы, якое затым трапіла да князя Багдана Андрэевіча Лукомскага. У дакуменце 1579 г. гаворыцца, што некалі Караевічы былі ўласнасцю продкаў жонкі Багдана: Зофеі Іванаўны Служчанкі. Ад Служкаў яны перайшлі нейкім чынам да бацькі Багдана, князя Андрэя Іванавіча Лукомскага. Там жа згадваецца, што ў 1562 г. полацкі ваявода Станіслаў Давойна спрабаваў уключыць Караевічы ў лік дзяржаўных сёл Полацкага ваяводства, але Лукомскі здолеў даказаць свае правы на яго. Такая спроба можа тлумачыцца тым, што названае сяло знаходзілася на самай перыферыі былой Лукомльскай воласці, побач з уладаннямі, якія здаўна цягнуліся да Полацка.

З артыкула Л. В. Насевіча
«Лукомль і Лукомльская воласць».
Гістарычна-археалагічны зборнік № 4,
«Сярэднявечча». М., 1994.

Дакументы сведчаць

Выпіс з Аляксандра-Неўскага летапісу

«А как послы вошли к королю в светлицу, и рада королевская по обе стороны всталі послом, и послы направо поклонилися, где бискуп Виленской сидит и князь Валеріян, для того, что на той стороне сидел государев изменник Курбской» — Колычев и Нагой жаловались, что их задерживали в городах Литовских и даже в поле, где не было жительства. Предложения государевы состоялі в том, чтобы:

1) Полоцкая область осталась за ними со всеми пригородами: Леплем, Копцом, Дрысом, Вороначем, Улою, Соколом, до Виленскаго и Витебскаго рубежа: также и вся Ливония до реки Двины;

2) Чтобы король именовал царя Ливонским, Полоцким и Смоленским. Колычев и Нагой выехали из Гродна 19 авг.

В Алекс.-Нев. Лет.: «Іюля (1566) поставлены бысть город Усвят Озерецского повету.

... Того же году дек. в Полоцком повете, на реке на Дрысе, усть Пищевского Устья, город Сокол, от Полоцка 30 вёрст, от Сибежа 70, от Дрисы 95, от конца 15... Месяца авг. (г. 1567) поставлен бысть в Полоцком повете за Двиною к Виленскому рубежу, на озере на Суше на острову, город: повеле же Государь звати тот город Копіе, от Полоцка 70 верст, от Лепли 25, от Лукомли 20».

В Архив. Псков. Лет г. 1567: «И которые люди Московскіе присланы на блюдение деловцов (строителей)» К. Петр Серебряных, да К. Вас. Дмитр. Палицкого, и Литовские люди пригнав изгоном на зори, да многих прибили».

В Делах Польск. № 7, л. 1010: «Государя вашего воеводы (сказали в Гродне Папы Королевские вашим послам) «К. Петр Серебряной, да Палицкой, пришедшие на Сушу ратью в Острожского держанье, и Государя нашего люди ваших побили, и наказы і грамоты из К. Петрова Серебряного взяли».

М. Карамзін.
Гісторыя дзяржавы Расійскай. Т. 9.

Крепость Суша (Копиё)

«Того ж (1566) лета, м. августа, повелением государя и в. кн. всея Руси Ивана Васильевича, постановлен бысть в его государеве вотчине, за Двиною-рекою, к виленскому рубежу, на оз. на Суше, на острову, городе; повеле же государь звати тот город Копие; от Полотцска по Улской дороге до того города 70 вер., а от литовских городов от Лепля пол — 30 в., от Лукомля 20 в. — А государьским промыслом смотрел того места и город ставил воевода кн. Юрьи Иванович Токмаков, пришед на то место безвестно, и сел на острове со всеми людми, и народ и лес городовой и запасы свои перепроводили на остров; и город поставил вскоре городовыми людми, которым тут годовати, и посошными людми, и по государьскому приказу город укрепил. А которые люди тутошние жилцы, и те проложилися к городу, государю царю и вел. кн. служити. А бережения для от литовских людей велел царь и вел. князь стояти близко того города боярину князю Петру Серебреному с товарыщи».

Гетман вел. кн. Лит. кн. Сангушко покушался не раз овладеть Сушею, но безуспешно.

«Получив известие о потере Полотцска и об истреблении гарнизона Сокола, — говорит Гейденштейн, — московский царь из Пскова удалился внутрь Москвы и с дороги послал грамоту к тем, кто находился в гарнизоне Суши, написанную не по его обычаю, и вручил ее для доставления нескольким различным гонцам. Он-де узнал, что по воле Божией Полотцск и Сокол достались в руки неприятелю; поэтому, мало имея возможности придти на помощь к ним, заперным со всех сторон, он разрешае им, испорти пушки и в особенности порох и остальныя военныя оружия, которых не могут унести с собою, а также закопав в землю образа и священныя вещи, чтобы оне не послужили предметом насмешки для неверных, — спасаться каким бы то ни было способом, не потому, чтобы он сомневался в их верности, но потому, что не желает подвергать их доблесть, которую он желал бы сохранить для более важных подвигов, ненадежному испытанию и жестокостей неприятелей».

«Одна из грамот попала в руки Мелецкого (гетмана польского), а другая полоцкому воеводе Николаю Дорогостайскому. Последний поспешил к Суше, и этот весьма укрепленный замок, после переговоров, был сдан добровольно; москвитянам обещан был свободный выход с имуществом в Москву; их вышло числом 6 т. Полоцкий воевода вступил в замок Сушу 6 октября; взято орудий больших 21, гаковниц 136, ручниц длинных 123, пороху 100 бочек, весом в 400 центнеров, железных пуль больших от орудий 4822 и весьма много других принадлежностей и провианта».

По рисунку С. Пахоловица, Суша, расположенная на острове оз. Суши, имела вид 4-угольника; стены — каменныя с 7 башнями и 2 воротами.

Замок находился близ пос. Суша, в Лепельском У., на ю.-з. от Улы, в 10 в. на с.-з. от Бочейкова. Не осталось и следов замка.

Сапуноў А. П. Полацка-віцебская старына. 1912. Вып. 11. С. 306—308.

Крыж на дарозе ў м. Улу

З артыкула «Каменныя крыжы на Беларусі»

...крыж, што знаходзіцца на дарозе ў м. Улу Лепельскага павету на мейсцы старадаўняй крэпасці Кап'ё, якая была разбураная Стэфанам Баторыям у час вайны з Янам Грозным у 1579 г. На гэтым крыжы груба славянскімі літарамі высечаны надпіс: «1569 г. ту положана 200 жовнераў во Хрысту поставіл после бітвы...».

Беларуская мінуўшчына, № 1, 1994 г.

Аб закладцы Лепельскага замка
(з Баркулабаўскай хронікі)

Пан Баркулаб Іванавіч Корсак, староста дзісенскі, ротмістр каралеўскі, войт дзісенскі, рыцар ды ваяр добры і славуты, разам з панам Раманам Хадкевічам ды са сваімі людзьмі па ўзяцці Полацка пазаклалі замкі Дзісну, Варонічы, Лепель, Чашнікі і месты добрымі людзьмі назасялялі. А потым у 1576 годзе, 20 жніўня, у панядзелак увечары, а другой гадзіне ночы, пан Баркулаб памёр на дзісенскім старостве ў замку Дзісне. Пахаваны ж шаноўны нябожчык у горадзе Вільні ў царкве святой Прачыстай Багародзіцы.

Полное собрание русских летописей.
Т. 32. М., 1975.

У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Міжусобныя войны

Міжусобныя войны, няўдачы ў Лівонскай вайне 1558—1583 гг. асабліва ўскладнілі становішча Вялікага княства Літоўскага. Польскія феадалы і каталіцкае духавенства выкарысталі гэтыя падзеі ў княстве, каб аб'яднаць яго з Польшчай.

У 1569 г. была заключана Люблінская унія, у выніку якой ВКЛ і Польшча аб'ядналіся ў адзіную федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую, з агульнадзяржаўным сеймам і адзіным выбарным каралём (ён жа і вялікі князь літоўскі Вялікага княства Літоўскага). Агульная знешняя палітыка праводзілася ў Рэчы Паспалітай.

У гэты час, у 1580 г., «места» Лепель ужо налічвала 300 дамоў, якія размяшчаліся не толькі на востраве, але і на суседнім заходнім беразе возера (цяпер в. Стары Лепель). Ля падножжа замка і пад яго аховай знаходзіўся гандлёвы порт. Ад яго прычалаў адпраўляліся вялікія стругі з розным таварам. Як сведчаць дакументы XVI ст., водны шлях у Рыгу з Лепельскага возера ішоў «... ад замка возерам у раку Улу (выцякае з возера), адтуль, зрабіўшы паварот пад замкам Ульскім, у Дзвіну». Шлях у Кіеў таксама пачынаўся ад замка, ішоў возерам да р. Эса. Па ёй і іншых водаёмах — да возера Окана. Тут пачынаўся «волак праз лес паўмілі да возера Плаўна». Затым па рэках Сергуч, Бярэзіна, Днепр плылі да Чорнага мора.

У 1586 г. мясцовыя землі адкупіў уладальнік Новага Лепеля (с. Белае) падканцлер, з 1589 г. канцлер ВКЛ Леў Сапега, ураджэнец Полацкай зямлі. За тры кіламетры ад «места» Лепель у канцы XVI ст. ён заснаваў у в. Белае Новы, або Белы, Лепель. Сюды быў перанесены гандлёвы цэнтр. Тут былі пабудаваны замак, царква. Каля 1602 г. у Лепелі быў пабудаваны драўляны касцёл. «Так лічыць дае права той факт, — піша гісторык Дз. І. Даўгяла, — што 11 кастрычніка 1602 г. папам Клімэнтам быў дадзены дазвол віленскаму епіскапу і яго пераемнікам на прыняцце пад свой патранат Лепельскага касцёла і манастыра».

У 1609 г. уладальнік абодвух Лепеляў — Новага і Старога — канцлер Леў Сапега зрабіў даравальны акт на карысць віленскіх манашак-бернардзінак, дадаўшы да гэтага вёскі Стаі, Бароўку, Залессе, Слабаду, Слабаду Новую, Зорніцу, Жэжлін і Поўсвіж у Полацкім ваяводстве. Гэтыя землі належалі манастыру да 1805 г. У 1607 г.

Леў Сапега

галоўны Літоўскі трыбунал зацвердзіў гэты дар Сапегі. З гэтага часу і да апошняй чвэрці XVIII ст. мы маем вельмі мала звестак аб Лепелі, які з'яўляўся прыватнаўласніцкім мястэчкам.

Згодна з Люблінскай уніяй 1569 г., ВКЛ фармальна захавала свае органы ўлады, войска і заканадаўства, але трапіла ў залежнае становішча. Устанаўліваўся нацыянальна-рэлігійны прыгнёт, які ўзмацніўся пасля заключэння Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. У другой палове XVII — пачатку XVIII ст. у дзяржаўных установах беларуская мова замянялася польскай. Пачалося апалячванне і акаталічванне насельніцтва.

Падзеі руска-польскай 1654 – 1667 гг. і Паўночнай 1700 – 1721 гг. войнаў праходзілі па Лепельскай зямлі. У 1654 г. зноў пачалася вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. За першы год вайны рускія войскі занялі Віцебск, Оршу, Полацк і іншыя беларускія гарады. Восенню яны выйшлі на рубеж Дзісна – Глыбокае – Чарэя – Шклоў, заняўшы паўночна-ўсходнюю частку Беларусі. На наступны год — амаль усю Беларусь.

У 1660 г. на Лепельскім напрамку зноў разгарнуліся актыўныя ваенныя дзеянні паміж рускімі і польскімі войскамі пад кіраўніцтвам князя І. А. Хаванскага і гетмана ВКЛ П. Я. Сапегі.

Бясконцыя войны з Масквой другой паловы XVII ст. выклікалі страшэнны голад, хваробы, разбурэнні сярод жыхароў Беларусі. Полацкае ваяводства ўсё было спустошана. На чалабітных таго часу захаваліся рэзалюцыі цара Аляксея Міхайлавіча. У адным з дакументаў чытаем, што выгнаныя са сваіх хат лепельскія «девицы законные католицкие шлехтянки честные» просяць дазволу жыць пры кляштарах і сваіх маёнтках. Рэзалюцыя цара была — «Адмовіць».

Р. Гэйдэнштэйн, аўстрыйскі дыпламат, праязджаючы ў тыя часы па Беларусі, пісаў, што здзекі і жорсткі гвалт маскоўскага войска над насельніцтвам «так адвярнулі ад маскавіцян сэрцы народа і адштурхнулі ўсякі давер да іх». Даніна беларускага народа, якую ён прынёс войнам XVII ст., была жудаснай. Колькасць насельніцтва скарацілася ў два разы. У Полацкім, Віцебскім і Мсціслаўскім ваяводствах 65 – 70 % сялянскіх хат стаялі пустыя.

Пасля царкоўнага расколу рускай праваслаўнай царквы XVII ст. у Рэчы Паспалітай, у т. л. на сучаснай тэрыторыі Лепельскага раёна, пачалі сяліцца стараверы, якія збеглі сюды з Маскоўскай дзяржавы ў час ганенняў на іх.

Складаныя і супярэчлівыя падзеі ў

Рэчы Паспалітай у XVII—XVIII стст. прывялі яе да падзелу ў канцы XVIII ст.

Асаблівую ролю Лепель пачаў адыгрываць пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г., калі паўночная частка Полацкага ваяводства, якая ляжала на правым беразе Зах. Дзвіны, разам з Полацкам была далучана да Расіі, а Лепель, на левым беразе ракі, застаўся за Польшчай. 8 лістапада 1773 г. у Лепелі быў адкрыты земскі і гарадскі суды і іншыя адміністрацыйныя судова-выканаўчыя ўлады. Аднак праз тры гады на Варшаўскім сейме быў прызнаны надзвычай нязручным для жыхароў Полацкага ваяводства з-за недахопу памяшканняў, адсутнасці прасцейшых зручнасцей. Таму Лепель уступіў першынство мястэчку Ушачы, куды былі перанесены ўсе ўрадавыя ўстановы.

Трэцяга мая 1791 г. галасаваннем паслоў (дэпутатаў) сейма Рэчы Паспалітай была ратыфікавана першая канстытуцыя Рэчы Паспалітай.

Расія і Прусія падзялілі Рэч Паспалітую другі раз у 1793 г. (Лепельшчына пры гэтым увайшла ў склад Расіі). Гэта выклікала паўстанне Т. Касцюшкі. Пасля паражэння паўстання адбыўся апошні падзел Рэчы Паспалітай у 1795 г. З гэтага часу Рэч Паспалітая, як дзяржава, перастала існаваць. Усе беларускія землі ўвайшлі ў склад Расіі.

Запіс аб падараванні Льва Сапегі на карысць Лепельскага касцёла. 1604.

Во имя Господа Бога, аминь. Я, Лев Сапега, канцлер Великого княжества Литовского, староста Слонимский, Перновский, Могилевский, и пр., всем вообще и каждому в отдельности, кому бы то надлежало нынешним и будущим поколениям людей объявляю, что ради чести и хвалы Господа Бога всемогущего, в Троице единого, я построил римско-католический костел во имя св. Казимира в своем местечке Новом Лепеле, находящемся над рекою Улою, в Полоцком воеводстве и на этот костёл даю и на правах вечного и неотъемлемого пользования записываю: во-первых, плац, на котором построен костел с цвинтарем, а к этому плацу четыре волоки — на плебанию, на школу, на богодельню и на огороды плебану в том же местечке Лепеле, в трех полях, согласно отграничению и описанию, сделанному во время измерения городской земли, с прибавками, к ним относящимися, а сверх сего с. Лядно, в котором по вновь исправленному измерению состоит 30 волок в одном обрубе с прибавками в различных местах. Означенное село согласно своему обмежеванию со всеми доходами, а также с прудом и лядненской мельницей, с озерком, прозываемом Белое и со вступом для ловли рыбы в озеро Бобрицу неротами, но не неводами, — надаю на тот вышеназванный костел Лепельский. Вдобавок орендатор Лепельских корчем обязан ежегодно в новый год давать плебану полпуда воска на свечи для костела, и арендатор с Нового Лепеля других полпуда воска.

Все вышеозначенное на правах неотъемлемого владения записываю на храм Божий римско-католический Лепельский, для пользования нынешнему плебану и его преемникам плебанам означенного костела Лепельского, и уже непосредственно от даты сего моего листа отрекаюсь и лично от права пользования, наследственной власти своей и всякого начальства, от всего того, что надаю на костел, и детей, потомков кровных и всех моих близких отдаляю навсегда, не оставляя ни себе, ни им никакого права, и никакому другому человеку.

Что касается до того, что лепельское имение со всею лепельской волостью, изъяв от детей, потомков и наследников, я отдал и навеки записал на коплицу свою при костеле св. Станислава в Виленском замке и на девичий монастырь, вновь сооруженный мною в Вильне на честь и славу Господа Бога всемогущего, то из этого исключаю ныне наданное на костел лепельский.

Поэтому патроном того костела лепельского назначаю ни своих детей, ни кого другого, только самого его милость епископа виленского, который по смерти одного плебана на место его без всякого промедления назначал бы иного, при том такового, который бы там при костеле всегда имел местожительство. Служители Божии — плебаны лепельские, навеки обязываются означенным моим наделем спокойно владеть, воздавать в сем доме Божьем честь и прославление Господу Богу по уставу в дни праздничные, высокоторжественные и воскресные и как возможно чаще отправлять св. литургии с проповедями, усердно научать людей римско-католической вере, святые таинства усердно совершать, сами лично, всегда жить при костеле, не слагая всего лишь на викария, содержать учителя для обучения в школах детей и певцов для пения в костеле, и прочия обязанности свои обязаны усердно исполнять и отправлять согласно с постановлением Тридентского собора. К этому обязую их собственною их совестью и сверх сего милостью и карой божьей, ради славы которого всё это надаю. И никто из моих потомков, что было мне угодно записать на костел, уже ни на мирское употребление, на какое-либо иное богоугодное дело не имеет права обращать этого наданья, но только лишь на то, на что я ныне надал и фундовал.

А если бы какой-либо человек из моего потомства, так и из посторонних осмелился бы нарушать и ломать этот мой фундуш и наданье, желая обратить его на какое-либо мирское употребление или другое богоугодное дело, такому пусть Господь Бог не будет милостивым и я вызываю всякого такого на страшный суд Божий и пусть на дом его придут все проклятия в сем и в будущем веке. Каковой фундушовой лист-запись мою вечную, своею рукой собственноручно подписавши, печать мою к нему приложил и для большей веры и твёрдости, по просьбе моей, печати свои приложивши, собственноручно подписали прелаты: ксендз Ян Рышковский, архидиакон виленский, ксёндз Николай Ясинский, кантор виленский, а также пан Ян Остик — виленский земский судья, пан Александр Корвин Гонсевский, староста виленский и пан Дмитрий Карп, секретарь его королевской милости, подвоевода виленский. Писано в Вильне, в лето от Рождества Сына Божия 1604, месяца августа 6 дня, в пятницу, в день Преображения Господня. ЛЕВ САПЕГА, канцлер Великого Княжества Литовского рукою своею.

Дз. І. Даўгяла. Лепель, уездный город Витебской губернии. Віцебск, 1905.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай

Далучаныя да Полацкага намесніцтва часткі тэрыторыі былога Полацкага ваяводства былі выдзелены ў асобны Лепельскі павет. У 1795 г. былі закрыты земскія і гарадскія суды Полацкага ваяводства ва Ушачах і ў поўным складзе пераведзены ў Лепель. 2 кастрычніка 1795 г. яны адкрылі свае пасяджэнні ў абноўленым складзе.

«Цяжка ў цяперашні час зусім упэўнена сказаць, — пісаў гісторык Дз. І. Даўгяла, — чаму ў якасці павятовага горада было выбрана самае ўскраіннае мястэчка ва ўсім павеце, і пры гэтым маленькае, асабліва ў параўнанні з такімі вялікімі мястэчкамі, як Бешанковічы, Чашнікі, Бачэйкава, ды і вышэй упомненае ўжо мястэчка Ушач. Але наўрад ці памылімся, зрабіўшы меркаванне, што на лёс Лепеля больш за ўсё аказала ўплыў ажыццяўленне думкі аб стварэнні Дняпроўска-Дзвінскай сістэмы праз рэкі Бярэзіну і Улу».

Бярэзінская водная сістэма даўжынёй 159 км была пабудавана ў 1797—1805 гг. і адыграла важную ролю ў гаспадарчым і культурным развіцці нашага краю.

У 1802 г. у сувязі з новым губерн-

скім падзелам Расіі ў Беларусі было ўтворана 5 губерняў. У Віцебскую ўвайшло 12 паветаў (у тым ліку і Лепельскі).

У 1803 г. у Лепель прыбыў і прыступіў да выканання сваіх абавязкаў новы гараднічы Марцін Афанасьевіч Амантаў, пераведзены сюды з полацкіх паліцмайстраў. У яго распараджэнне была перададзена штатная воінская каманда, адна з тых інвалідных каманд, якія стаялі па гарадах паводле палажэння 1774 г. і неслі вартавую службу.

У маі месяцы 1804 г. гараднічы атрымаў ад губернатарскай улады загад назіраць за будаўніцтвам у г. Лепелі «казённага дома» (цяпер памяшканне камбіната бытавога абслугоўвання на плошчы Свабоды) для размяшчэння дзяржаўных установ.

Гараднічаму былі перададзены план пабудовы і копія кантракта, зацверджанага Віцебскай казённай палатай 8 красавіка 1804 г. з селянінам Яраслаўскай губерні Емяльянам Пляцюхіным.

У верасні 1804 г. гараднічы атрымаў з Віцебска зацверджаны генерал-губернатарам І. І. Міхельсонам 1-ы план г. Лепеля.

Гараднічы зрабіў распараджэнне:

1. Кожны домаўладальнік пры жаданні зрабіць пабудову павінен звярнуцца да гараднічага і павятовага землямера.

2. Набярэжная вуліца, пачынаючы ад места і ўздоўж возера да яўрэйскай лазні, наступнай вясной павінна быць знесена, а таму гаспадары дамоў абавязваліся не рамантаваць жыллё, а рыхтавацца да зносу пабудоў.

3. Жыхарам Лепеля строга забаранялася без дазволу рабіць які-небудзь рамонт у дамах, хлявах і іншых пабудовах і асабліва крыць іх саломай.

4. Пры будаўніцтве дамоў прадпісвалася складваць печы абавязкова з комінамі.

Гэтыя распараджэнні стваралі шмат клопатаў па пераўтварэнні пабудоў з саламянымі стрэхамі і курнымі хатамі на гарадскі манер.

У канцы 1804 г. гараднічы ўзнімае новае важнае пытанне — школьнае. Ён даносіць губернатару Сяргею Аляксеевічу Шышкіну, што ў Лепель усё больш прыбывае чыноўнікаў, мяшчан, купцоў, хрысціян, яўрэяў і яны просяць аб адкрыцці такога вучылішча для сваіх дзяцей.

5 красавіка 1805 г. быў выдадзены ўказ імператара Аляксандра І аб перайменаванні мястэчка Лепель у павятовы горад: «Местечко Лепель в Витебской губернии, состоящее и Виленскому бернардинскому женскому монастырю принадлежащее, которое заключает в себе до 274 душ — монастырских крестьян и в котором находится уездный город, повелеваем: со всеми крестьянами причислить в казенное ведомство и обратить оное в уездный город, причислив и самих жителей того местечка в мещанское состояние, а окружную землю в городской выгон; бернардинскому же монастырю взамен того производить из казны ежегодно получаемый им ныне с того местечка доход, сколько оного по действительному расчету окажется» (Даўгяла Дз. І. Лепель, павятовы горад Віцебскай губерні. Віцебск, 1905).

Указ з'явіўся важным актам нараджэння новага горада Лепеля, які з прыватнаўласніцкага мястэчка ператварыўся ў павятовы горад Віцебскай губерні. Карэннае мясцовае насельніцтва — манастырскія прыгонныя сяляне гэтым указам залічваліся ў казённае ведамства і з 5 красавіка 1805 г. атрымалі статус мяшчан.

Пасля атрымання імператарскага ўказа была створана камісія для праверкі Лепельскага памесця манашак-бернардзінак, якое цяпер перайшло ў

казённае ведамства і перадавалася ў карыстанне гораду ў выглядзе аброчнага артыкула. У мяшчанства было пералічана 657 сялян абодвух полаў (328 мужчын і 329 жанчын). Пры гэтым даходу з былога Лепельскага манастырскага памесця было налічана 2488 руб. 85 з паловай капеек серабром і 108 асігнацыямі.

Зямля была абмежавана і раздадзена гораду ў якасці гарадскога выгану, і да гэтага горад атрымаў усё возера Лепельскае і возера Проша. Гэтыя азёры давалі гораду значны даход — звыш 1500 руб.

Указам ад 5 красавіка 1805 г. усе карэнныя жыхары Лепеля атрымалі права самакіравання, якое было прысвоена ў Заходнім краі мяшчанам.

Для выбрання членаў у гарадскую думу і гарадскі магістрат горад Лепель дзяліўся на 4 часткі — Віцебскую, Астравенскую, Суражскую і Халопеніцкую.

У 1805 г. у Лепелі налічвалася, да перайменавання яго ў павятовы горад, трыццаць шынкоў, у якіх вёўся гандаль моцным віном, півам, мёдам і інш. напіткамі.

Ні памешчыцкіх, ні сялянскіх корчмаў не было. Толькі духавенства уніяцкай царквы мела свой бровар, у якім выраблялі віно для дамашніх патрэб.

Указам Губернскага праўлення ад 10 жніўня 1806 г. было вырашана пытанне аб яўрэйскім вучылішчы. Гараднічы атрымаў прадпісанне аб'явіць яўрэям, «чтобы они по неимению в гор. Лепеле народного училища отдавали своих детей в ближайшие от гор. Лепеля народные училища в Полоцке или Витебске, буде же сего не пожелают, то, по силе Положения о евреях (пункт 6), приняли меры к построению школы в Лепеле»(Дз. І. Даўгяла. Лепель, павятовы горад Віцебскай губерні).

20 жніўня лепельскія яўрэі далі падпіску, што пабудуюць у Лепелі яўрэйскую школу ці народнае вучылішча.

Восенню 1805 г. было закончана будаўніцтва дома для лепельскіх дзяржаўных устаноў, і па акту ад 26 лістапада 1806 г., быў прыняты архітэктарам і гараднічым. 27 лістапада губернатар зрабіў прапанову, каб дзяржаўныя ўстановы перайшлі ў новае памяшканне. 1 снежня 1806 г. было зроблена асвячэнне гэтага дома, і ў ім размясціліся дзяржаўныя ўстановы, за выключэннем павятовага ніжняга земскага суда, «который отозвался, что за неимением мебели перейти не могут». У гэтым жа будынку былі змешчаны і арыштаваныя («калоднікі»).

У казённым доме дзяржаўныя ўстановы размяшчаліся так: у 2-павярховым доме ўваход з плошчы ў калідор ніжняга паверха і па лесвіцы на верхні этаж. На ніжнім паверсе ўлева ад увахода 4 пакоі: а) канцылярыя; б) архіў; в) два пакоі для «калоднікаў».

Хутка аказалася, што турма была надзвычай цеснай. У гэтых двух пакоях часта было 30—40 зняволеных. Таму гараднічы ў канцы 1808 г. хадайнічаў перад губернатарам аб прыбудове каменнага прысценка.

Направа ад увахода былі 4 пакоі для казначэйства: а) казначэйная, б) рахунковая, в) дзве кладоўкі.

На верхнім паверсе: пад гараднічым праўленнем улева ад увахода павятовы суд (тры пакоі) і архіў — усяго 8 вокнаў, а над казначэйствам (справа) ніжні земскі суд (два пакоі і архіў) і для павятовага землямера адзін пакой і архіў.

Бярэзінская водная сістэма

Яшчэ 200—300 гадоў таму назад велізарныя прасторы Верхняга Прыдняпроўя і Прыдзвіння былі пакрыты густымі лясамі. Высакаякасныя лісцёвыя дрэвы раслі на тэрыторыі былых Мінскай і Віцебскай губерняў. Для выкарыстання прыродных багацця патрэбны былі надзейныя шляхі зносін. Адсутнасць іх вымушала мясцовыя ўлады звяртаць увагу на прыродныя вадаёмы (рэкі, азёры, пратокі), якія выкарыстоўваліся для перавозкі розных тавараў, будаўнічых матэрыялаў, прадуктаў харчавання. Аднак суцэльнага воднага шляху не было. Трэба было шукаць выхад.

Маюцца звесткі, што яшчэ ў перыяд знаходжання Беларусі ў складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай былі зроблены спробы складання праектаў злучэння рэк і азёр сістэмы Бярэзіны і Улы, якая выцякае з Лепельскага возера. Спецыялісты атрымалі загад правесці даследчыя работы на мясцовасці, вызначыць расходы на праектаванне і будаўніцтва воднага шляху. Быў складзены будаўнічы праект, аднак задума не ажыццявілася.

У канцы XVIII ст. прадпрымальны польскі памешчык Чацкі пісаў рускаму імператару: «...Пры нязмерных раскошных лясах, якія пакрываюць частку Мінскай губерні ў басейне вярхоўяў Бярэзіны і Эсы, землеўладальнікі, аднак, перацягваюць свой лес сухім шляхам і, сплаўляючы па вельмі мала прыстасаваных для гэтага рэках, ледзь толькі праз два гады мелі мажлівасць даставіць яго ў чысты фарватэр Дзвіны або Дняпра. З гэтай прычыны той жа самы транспарт абыходзіцца надзвычай дорага, так што, напрыклад, мачтавае бервяно абыходзіцца 9 рублёў, і ўжо аднаго гэтага дастаткова, каб даказаць неабходнасць Бярэзінскага канала».

Лепель. Шлюз. Пачатак XX ст.



Схема часткі Бярэзінскай воднай сістэмы



Мост праз 2-і Лепельскі канал, 1904 г.



Мост праз р. Эсу, сплаў лесу

Далей падзеі развіваліся наступным чынам. Дырэктар водных камунікацый мясцовага краю граф Сіверс атрымаў указ імператара Паўла I ад 23 лютага 1797 г. наладзіць «водныя зносіны паміж рэкамі Дняпром і Заходняй Дзвіной пры дапамозе Бярэзіны».

Быў зацверджаны каштарыс у размеры 329 387 рублёў для правядзення гідратэхнічных работ. Будаўніцтва было распачата ў 1797 г. і закончана ў асноўным у 1805 г. Гэта было даволі буйное і складанае збудаванне для таго часу. Водны шлях злучыў р. Бярэзіну, Сергуцкі канал, р. Сергуч, азёры Манец і Плаўна, Бярэзінскі канал, воз. Бярэшча, р. Бярэшча, Верабскі канал, р. Эсу, воз. Проша, 1-ы Лепельскі канал, воз. Лепельскае, 2-і Лепельскі канал, р. Улу, Чашніцкі канал, р. Заходнюю Дзвіну. 14 шлюзаў рэгулявалі ўзровень вады ў сістэме. Такім чынам, ажыццявілася мара многіх пакаленняў мясцовых жыхароў. Высакаякасны лес з Віцебскай і поўначы Мінскай губерняў стаў сплаўляцца па водным шляху да Балтыйскага і Чорнага мораў. Прадметамі вывазу былі таксама драўнінны вугаль, дзёгаць, смала, пушніна, хлеб, лён, масла, сала і інш.

І ў наступныя гады працягвалася ўдасканаленне воднай сістэмы. У 1806 г. было закончана будаўніцтва водатрымальнай плаціны з ледарэзам на р. Уле супраць шлюза № 12, а таксама Чашніцкага канала ўздоўж звілістай часткі ракі. Для ніжніх чыноў каманды і наглядчыка сістэмы былі пабудаваны ў Лепелі два дамы.

На наступны год былі збудаваны дзве водатрымальныя плаціны — адна на Верабскім канале, другая — на р. Эсе.

Праз шлюз № 11 на першым Лепельскім канале і праз р. Улу ў месцы вытоку яе з Лепельскага возера (па Віцебскім тракце) былі пабудаваны два масты, абодва пад'ёмныя. Сем ледарэзаў ахоўвалі другі мост ад разбурэння.

У 1808 г. пабудаваны тры створы на р. Уле (супраць вёсак Жэжліна, Зорніца, Гарадзінец). Праз год пачалі дзейнічаць вадаспускі паміж шлюзамі № 1 і № 2 на Сергуцкім канале і паўшлюз на Бярэзінскім злучальным канале. У 1814 г. была абсталявана фашынная плаціна ў вусці р. Сергуч, а ў 1817 г. — дзве фашынныя плаціны ніжэй шлюза № 12 на р. Уле.

У 1823 г. упраўленнем Бярэзінскай сістэмы быў пабудаваны дом пад шпіталь на правым беразе р. Улы. Пры гэтым доме былі ўзведзены флігелі для пражывання доктара і фельчара, а таксама надворныя пабудовы.

У 1836 г. на ўсіх каналах і рэках воднай сістэмы пастаўлены верставыя слупы і ўздоўж Лепельскага возера — круглыя палі. Няцяжка ўявіць, які велічны і дзелавы выгляд атрымаў наш горад і канал у той час. Водная сістэма садзейнічала росту Лепеля, паколькі ён быў яе цэнтрам.

У 1812 г. французы спалілі пад'ёмны мост у Барысаве. У 1817 г. быў пабудаваны новы, нізкі, пад якім маглі праходзіць толькі плыты. Суднаходства на Бярэзіне ўзнавілася толькі пасля пабудовы новага пад'ёмнага моста ў 1843 г.

Хаця інжынерная служба воднай сістэмы рамонтныя работы праводзіла круглы год, аднак па шэрагу прычын была магчывасць сплаўляць невялікія плыты па 20—30 бярвенняў з глыбінёй асадкі не больш за 0,4—0,5 м.

У 1814 г. у Лепелі адкрыта школа Бярэзінскага канала. Гэта было невялікае спецыяльнае вучылішча суднаходства для дзяцей ніжніх чыноў, якія служылі пры воднай сістэме. Заняткі ў школе пачаліся з 15 вучнямі. Праз год быў набыты ва ўласнасць казённы дом, у якім размясцілася вучылішча. «4 мая 1826 г.,— піша гісторык Дз. І. Даўгяла, — з'явіўся найвышэйшы ўказ аб закрыцці школ кантаністаў пры сістэмах і заснаванні адной цэнтральнай «кандутарскай» школы ў С.-Пецярбургу. 12 ліпеня 1826 г. генералмаёр Родэр, які прыехаў у Лепель па гэтай справе, назначыў з навучэнцаў школы 16 чалавек для адпраўкі ў С.-Пецярбург, закрыў школу і загадаў апісаць усю маёмасць, а казённы школьны дом выкарыстаць для патрэб сістэмы».

Беларускі генерал-губернатар князь Н. Хаванскі прыслаў у Лепель правіцеля канцылярыі, які агледзеў водную сістэму і зрабіў наступны запіс: «Тэхнічныя збудаванні Бярэзінскай сістэмы ўтрымліваюцца ў найлепшым стане. Гэта сістэма ажыўляе цяпер... Лепель. Ва ўсякім выпадку жывуць тут чыноўнікі, воінская каманда, плывуць лясныя плыты ў Рыгу, і людзі на іх хоць што-небудзь запазычваюць ад Лепеля».

У 1894—1899 гг. па Бярэзінскай воднай сістэме было перапраўлена грузаў і матэрыялаў на суму каля 14 млн. рублёў. Найбольшая колькасць рабочых, занятых на лясных промыслах, была ў Барысаўскім павеце Мінскай губерні. У Віцебскай губерні за 1899 г. заробак склаў 136 800 рублёў. Тут працавала 7400 чалавек. На Лепельскі павет прыходзілася 3200 працуючых з заробкам 90 800 рублёў.

Як вядома, найбольш высокую аплату працы мелі сяляне, занятыя на высечцы і сплаве лесу. Аднак праца іх была вельмі цяжкай, знясільваючай. Аб рабоце плытагонаў у XIX ст. сведкі ўспамінаюць: «Хто бачыў гэтую нечалавечую працу, той не можа ўспомніць аб ёй без уздрыгу! Рабочыя часта церпяць крушэнні і, губляючы па шляху лес, мучацца да глыбокай восені. У гэтых выпадках яны абмяжоўваюцца адным задаткам, астатняя заработная плата ідзе на пакрыццё згубленага лесу. Нажываюцца толькі лесапрамыслоўцы і валасныя пісары, якія складаюць кантракты ў карысць купцоў». Гэту сумную карціну дапоўніў краявед І. Д. Гарбачэўскі. «І няма нічога дзіўнага, — пісаў ён, — што сяляне, якія хадзілі на выганку лесу, не дажываючы да старасці, паміраюць ад знясільваючых ліхаманак, рэўматызму і прастудных грудных хвароб».

Р. Б. Фідэльман

З гісторыі вядома, што ў канцы XIX—пачатку XX ст. у Расіі пачаўся ўпэўнены і стабільны эканамічны пад'ём. Былі пабудаваны дзесяткі тысяч кіламетраў чыгуначных шляхоў, у тым ліку ў напрамку да Чорнага і Балтыйскага мораў. Лес пачалі перавозіць чыгуначным транспартам. Бярэзінская водная сістэма абмялела, надводныя збудаванні яе разбурыліся. Яна страціла сваё эканамічнае значэнне і засталася як гістарычны помнік гідратэхнічнага будаўніцтва XIX ст. Сляды былой сістэмы дзе-нідзе захаваліся да нашых дзён.

Выявы ж каналаў, шлюзаў, плацінаў адлюстраваныя на фотаздымках і паштоўках знакамітага фатографа, лепельчаніна Р. Б. Фідэльмана.

І. Ю. Януш

Дакументы сведчаць

Указ імператара Расійскай імперыі Паўла I аб зацвярджэнні плана злучэння рэк Дняпра і Дзвіны. 23 лютага 1797

1797 г. февраля 23. — Указ Павла I д. т. сов. Сиверсу о соединении рр. Днепра и Двины.

Приняв за благо представленный нам план о соединении Днепра с Двиною посредством р. Березины и Уллы, повелеваем под главною дирекциею вашею произвесть оный в действо; и вследствие того указали мы нашему т. сов. и государственному казначею Васильеву отпустить в распоряжение ваше в число требуемой по смете суммы 329 387 руб. с копейками в нынешнем году из казначейств наших 80 000 руб., а остальные по соглашению с вами в будущих 1798 и 1799 гг.

Показанные по плану 3 мельницы, ко уничтожению следующие на рр. Сергучо и Улле, у частных людей повелеваем купить по добровольному с ними договору.

Деньги, нужные по списку, при плане, представленном на содержание при работе директора, 3 надзирателей и прочих чинов, заимствовать из оных же сумм, а инвалидов 4 унтер-офицеров и 24 рядовых истребовать от военного начальства...

Поўны збор законаў Расійскай імперыі. М., 1830. Т. XXIV. С. 348.

З запіскі ў канцылярыю генерал-пракурора аб будаўніцтве каналаў і водных шляхоў у Беларусі. 1800

1. Березинский канал, соединяющий р. Днепр и Двину в Белоруссии, начат в 1797 г., а кончить уповается в 1805 г. На сей канал по польной нивелировке отпущено было 329 387 руб. да к тому по недостатку еще назначено 500 000 руб., итого 829 387 руб.

4. Канал Огинского в Литве для соединения р. Ясельды и Щары, начат во время польского управления и довершается с 1799 г. и окончить уповается в 1802 г. Деньги на сей канал заимствуются из суммы Мариинского канала, доколе последует ассигнация.

Инженер-генерал (подпіс неразборлівы)

Инженер-генерал-лейтенант (подпіс неразборлівы)

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 1374. Воп. 3. Спр. 2498. Арк. 7.

Айчынная вайна 1812 г.

12 чэрвеня 1812 г. 600-тысячная армія Напалеона пераправілася праз Нёман і ступіла на землі Беларусі і Літвы.

Пачалася Айчынная вайна 1812 г.

1 ліпеня 1812 г. загадам Напалеона быў утвораны Часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага. Ураду падпарадкоўваліся губерні Віленская, Гродзенская, Менская і Беластоцкая вобласць, перайменаваныя ў дэпартаменты. Павятовую адміністрацыю ўзначальвалі прадпрыемствы. У кожным павеце стваралася жандармерыя. Камісіі Віцебскага і Магілёўскага дэпартаментаў, якія не ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага, падначальваліся непасрэдна французскім ваенным уладам.

Але рэальная ўлада на ўсёй тэрыторыі Беларусі знаходзілася ў руках напалеонаўскіх маршалаў і генералаў, войскі якіх былі тут пакінуты для аховы.

3 ліпеня 1812 г. французы захапілі Лепель і размясцілі тут свае лазарэты для раненых і хворых. «Горящие вокруг селения и предместья, города, улицы, усыпан-

ные ранеными и мертвыми, грабежи и насилования в городе и по деревням, убийства безоружных в их домах... — так апісвае відавочца зверствы напалеонаўскіх войск у Лепелі і дадае: —...В Лепеле были сосредоточены лазареты для больных и раненых воинов армии Наполеона, и здесь умерло до пяти тысяч эвакуированных. Жители в значительном количестве из города разбежались, а оставшиеся сильно терпели от произвола неприятелей. Французы требовали продукты, скот и все необходимое, и неисполнителей ожидали смерть или наказание». Горад быў спалены, ваколіцы спустошаны. Больш за ўсё пацярпелі ад французаў архівы, дамы прысутных месцаў і службовых асоб. Страты жыхароў горада склалі больш за 400 тысяч рублёў.

Як вядома, 26 жніўня (7 верасня) 1812 г. адбылася генеральная бітва расійскай арміі супраць французаў ля в. Барадзіно. Сілы праціўнікаў у гэты час былі ўжо прыблізна роўныя. Зыход бітвы быў няпэўным. Тым не менш фельдмаршал М. І. Кутузаў з мэтай захаваць армію аддаў загад адступіць, пакінуўшы ворагу Маскву. На працягу месяца яна знаходзілася ў руках французскай арміі, якая за гэты час амаль цалкам дэмаралізавалася.

Не дачакаўшыся адказу Аляксандра I на прапановы аб міры, Напалеон у пачатку кастрычніка 1812 г. аддаў загад аб адступленні з Масквы. Расійская армія прымусіла французаў адступаць на захад па старой, разрабаванай і спустошанай Смаленскай дарозе.

6—8 кастрычніка войскі генерала Вітгенштэйна авалодалі Полацкам. Французы адступілі ў напрамку Ушачы — Лепель — Чашнікі. Каля Чашнікаў адбыўся бой, у якім удзельнічаў і корпус маршала Віктора. Перамогу атрымалі расійцы.

14 лістапада каля вёскі Студзенка (15 км на поўнач ад Барысава) праз масты на рацэ Бярэзіне пераправіўся Напалеон са сваёй гвардыяй. У баях тут загінула каля 20 тысяч французаў.

У Смаргоні 24 лістапада Напалеон пакінуў армію і ад'ехаў у Парыж.

8 снежня 1812 г. расійскія войскі без



Схема вызвалення Лепельшчыны ад французаў, 1812 г.



Ліст М. І. Кутузава Вітгенштэйну аб мяркуемым адступленні французаў праз Лепель

бою занялі Гродна. Да Нёмана дайшлі менш за 30 тыс. французаў.

У даносе Лепельскага гараднічага губернатару адзначалася:

«...в прошлых 1812 и 1813 по май месяц годах трупов, как человеческих, так и скотских, не жжено, а закопано в землю в дальнем расстоянии от города и без всякой тогда опасности на песках, копая большие четвероугольные ямы глубиною по 2 и 3 сажени, устилая рвы трупами и засыпая каждый на аршин песком благо-

получно к великим удобствам, в разных местах, всего человеческих 3429, лошадиных — 2490. О чем от меня подробными рапортами предместнику вашему февраля 13 марта 2 и 8 чисел донесено».

Нягледзячы на ваенныя бедствы, беларускія губерні ў 1813—1814 гг. не былі вызвалены ад рэкруцкіх набораў і паставак на патрэбы расійскай арміі, якая працягвала паход на захад.

Пажар 1833 г. у Лепелі

У ноч з 27 на 28 красавіка 1833 г. у Лепелі здарыўся вялікі пажар, які знішчыў амаль чвэрць горада. Пацярпела самая густанаселеная частка горада. Пажар пачаўся а другой гадзіне апоўначы ў нежылой пабудове з паўночнага боку горада. У начны час пры моцным ветры агонь хутка перакінуўся на бліжэйшыя пабудовы і знішчыў цэлыя кварталы горада.

Спецыяльнай камісіяй для выяўлення прычын гэтага пажару быў складзены пайменны спіс жыхароў г. Лепеля, якія найбольш пацярпелі ад стыхійнага бедства. Гэты спіс ад 11 мая 1833 г. камісія прадставіла генерал-губернатару з тлумачэннем, што ад пажару пацярпелі 235 мужчын і 318 жанчын, згарэла 1 уніяцкая царква, 1 касцёл, 2 яўрэйскія школы, 1 дзяржаўная ўстанова (дума, кватэрная камісія і павятовы кагал), 1 багадзельня, 102 дамы, 33 лаўкі, 48 хлявоў і паветак, 56 свірнаў, 2 лазні, жывёлы 40 галоў, рухомай маёмасці на 182 990 рублёў і пабудоў на 302 710 рублёў.

Калі 10 мая 1833 г. у Лепель прыехаў прадстаўнік генерал-губернатара і зрабіў афіцыйны запыт у гараднічых: колькі мелася і якога пажарнага інструменту і якія меры былі прыняты для тушэння пажару, гараднічы адказаў, што «предместниками не было устроено никаких более пожарных инструментов, кроме двух крюков и двух вил, кои и нынче находятся. К тушению же пожара принимали все меры Великолукского пехотного полка и ведомства путей сообщения, чиновники и нижние чины, но по случаю сильного ветра невозможно было утушить».

11 мая 1833 г. пагарэльцы падалі генерал-губернатару Хаванскаму «слезное покорнейшее прошение» аб дапамозе ад казны на аднаўленне згарэлых пабудоў.

Па прадстаўленні ў Камітэт Міністраў, зацверджаным імператарам 10 ліпеня 1834 г., было дазволена: «следующую на пособие жителям г. Лепеля сумму для построения домов отпустить по расчету, Витебским гражданским губернатором выведенному, в количестве 32 100 рублей из капитала, определенного на пособия разоренным по разным несчастным случаям сроком на 10 лет без процентов, со взысканием оных по равным частям по миновании первых четырех лет в остальные 6 лет».

У 1834 г. імператар зацвердзіў прадстаўленне губернатара аб перадачы ў казённае ведамства маёнткаў, якія належалі Віленскаму манастыру бернардзінак, каб яны (бернардзінкі) у далейшым атрымлівалі аброк з маёнткаў ад казны.

21—23 жніўня 1834 г. Лепель наведаў віцебскі губернатар Шрэдэр, які склікаў тут гараджан для паведамлення ім «манаршай міласці» аб выдачы беспрацэнтнай пазыкі на будаўніцтва лепельскім пагарэльцам. Але гэта дапамога царскімі ўладамі звязвалася з пераводам паслядоўнікаў уніяцкай царквы ў праваслаўных, бо гэты працэс праходзіў вельмі цяжка і супярэчліва. Лепельскія уніяты вымушаны былі заявіць, што яны «присоединяются к церкви православной». Губернатар апавясціў епіскапа Смарагда аб жаданні лепельскіх уніятаў і неадкладна паведаміў аб гэтым імператару адначасова з дакладам аб далучэнні і прыхаджан Старалепельскага уніяцкага прыхода. Атрымаўшы паведамленне ад добрапрыстойнага лепельскага протаіерэя Стэфана Параменскага аб лепельскай падзеі, Смарагд сам паехаў у Лепель, каб «укрепить новоприобретенных чад глаголами живота вечного». Атрымаўшы паведамленне віцебскага губернатара Шрэдэра аб вяртанні з уніі ў праваслаўе жыхароў г. Лепеля і сял. Старога Лепеля, якія належаць Свята-М

хайлаўскаму Віленскаму манастыру манашак-бернардзінак, імператар загадаў сінадальнаму обер-пракурору князю Мяшчэрскаму заснаваць у г. Лепелі прыход і пабудаваць царкву для вярнуўшыхся з уніі.

У 1835 г. беларускі генерал-губернатар князь М. М. Хаванскі прыслаў у Лепель сваю даверaную асобу — упраўляючага канцылярыяй, які агледзеў горад, асабліва месцы, якія пацярпелі ад пажару, сустрэўся з протаіерэем Пароменскім і пагутарыў аб стане праваслаўя ў Лепелі і Ушачах сярод асоб, што далучыліся з уніі.

1836 г. стаў годам інтэнсіўнага будаўніцтва ў г. Лепелі. Узводзілі дамы ў першую чаргу тыя, хто пацярпеў ад пажару 1833 г.

Да 23 мая 1837 г. у Лепелі было раздадзена пагарэльцам 25 000 рублёў казённай дапамогі, пры гэтым на ўказаную суму было поўнасцю пабудавана 20 дамоў, не закончана 9 дамоў і 17 крам, распачата будаўніцтва 3 дамоў і рыхтаваліся матэрыялы для 9 дамоў і 4 крам. Горад Лепель упрыгожыўся цяпер больш прасторнай Базарнай плошчай і каменнымі радамі на ёй.

У 1837 г. камісія па выдачы пазыкі пагарэльцам прыняла праз гараднічага і гарадскога галаву 12 каменных лавак, з якіх 5 былі пабудаваны Абелем Абезгаўзам, а 7 — Борухам Рабіндэрам.

Феадальна-прыгонніцкія адносіны

У пачатку XIX ст. царскі ўрад Расіі ўзмацніў феадальна-прыгонніцкія адносіны ў Беларусі. Паводле архіўных дакументаў, на Віцебшчыне (у т. л. і на Лепельшчыне) на памешчыцкіх сялян былі ўскладзены цяжкія павіннасці. Вяскоўцы абавязаны былі працаваць на памешчыка тры дні ў тыдзень. Рабочы дзень лічыўся ад усходу да захаду сонца. Для адпачынку і прыняцця ежы селяніну дазвалялася выкарыстаць тры гадзіны летам і дзве зімой.

Віды працы падзяляліся на зімовыя і летнія. Зімой сяляне займаліся малацьбой, дастаўкай на падводах прыпасаў да месца спажывання, вывазам лесу на рамонт і новае будаўніцтва.

Летнімі работамі лічыліся вываз і раскідванне гною на палях, іх апрацоўка, сяўба, сенакос, жніво, перавозка сена і збажыны ў гумны. Кожны працаўнік на кані або валах павінен быў узараць сахой 0,5 дзесяціны гліністай або сугліністай глебы, пабаранаваць дзве трэція дзесяціны зямлі, перавезці грузу на адным кані ад 18 да 20 пудоў на адлегласць да 25 вёрст, перавезці з поля ў пуню 8 коп (у капе 60 снапоў) азімай збажыны, 12 коп ярыны, 8 вазоў сена вагой да 10 пудоў, вывозіць у поле гной, засеяць чатыры дзесяціны, на чвэрці дзесяціны зжаць збажыну, абмалаціць азімага збожжа адну капу, яравога — дзве капы; высекчы паўсажня 3-паленных дроў.

Памешчыкі не абмяжоўваліся працай прыгонных сялян і выкарыстоўвалі наёмных рабочых. З гэтай мэтай былі вызначаны цэны на падзённую работу: на пешага працаўніка 20—30 кап., а з канём — 40—50 і больш кап. серабром.

Пагаршэнне становішча сялянства ўплывала на ўзмацненне яго антыпрыгонніцкай барацьбы. У першай трэці XIX ст. адбылося не менш чым 46 буйных выступленняў сялян, якія ахапілі больш як 100 пасяленняў у 27 паветах Беларусі.

Крыніцай вытворчасці асноўнай масы сельскагаспадарчай і прамысловай таварнай прадукцыі з'яўлялася памешчыцкая гаспадарка, якая арыентавалася на вывазны гандаль. Калі меркаваць па ўраджайнасці зямлі і заможнасці сялян, то першае месца паміж паветамі займаў Рэжыцкі, за ім Люцынскі, Дрысенскі, Лепельскі, Віцебскі, Себежскі, Гарадоцкі, Полацкі, Веліжскі, Невельскі, Суражскі. З Беларусі ў расійскія цэнтры, на Украіну, у Польшчу, Прыбалтыку і краіны Заходняй Еўропы вывозіліся гарэлка, спірт, хлеб, лён, пянька, ільняное і канаплянае семя, алей, сала, лес і лесаматэрыялы, смала, дзёгаць, сукно, парусіна, канаты і інш. Увозіліся соль, металы, тканіны, фарфоравы і фаянсавы посуд, тытунь, рыба, чай, кава, сель-

скагаспадарчыя і прамысловыя тэхніка і абсталяванне. Знешні гандаль ажыццяўляўся ў асноўным па рачных сістэмах.

27 красавіка 1851 г. адбылося «адно из заседаний местных должностных лиц — предводителя дворянства, городничего, земского исправника, стряпчего и городского головы. Предметом обсуждения были ярмарки лепельские. Дело в том, что в 1835 году по инициативе городского головы состоялось учреждение 4 ярмарок в Лепеле, каждая по неделе, — две летние: на день Сошествия Св. Луки и на Рождество Пресвятой Богородицы и две зимние: на Богоявление Господне и на воскресенье масленицы.

Губернское правление утвердило эти ярмарки и потребовало за публикации 10 руб. 10 коп. В 1848 году — в губернских ведомостях была сделана новая публикация о ярмарках. Но ярмарки не заводились: съезда купечества и торговцев не было. Комиссия 1851 г. пошла на рассмотрение причин этого грустного явления и нашла, что «сие по случаю неоткрытия предполагаемых почтовых трактов из г. Лепеля в города Борисов и Полоцк», и постановила «назначенные в г. Лепеле ярмарки закрыть и о том представить губернскому правлению» (Дз. І. Даўгяла. Лепель).

Герб горада Лепеля

У 1852 годзе г. Лепель атрымаў свой герб. На праекце герба Лепеля ў Поўным зборы законаў Расійскай імперыі ад 20 ліпеня 1852 г. рукой імператара Мікалая II напісана: «зацвярджаю». Тут змешчана і апісанне герба: «шчыт падзелены на дзве роўныя часткі, у верхняй паказан герб Віцебскай губерні і ў ніжняй — барвовай — сярэбраны скачучы конь з такім жа коннікам, які трымае ўзняты меч у правай руцэ. Герб увенчаны гарадскою каронай (сярэбранай вежкай з трыма зубцамі).



Поўны герб Лепеля. 1852 г.

1 ліпеня 1850 года
У правячы сенат Віцебскага губернскага праўлення

РАПОРТ

В сем правлении слушали:

Отношение Витебского Дворянского Депутатского собрания от 15-го истекшего декабря № 2293 [м], коим уведомляет, что по производству Собрания не видно, чтобы Лепельский уезд или город Лепель имел герб, усвоенный ему обычаем в прежнее время, но Губернский Предводитель Дворянства составил проект герба для уезда с таким только от гербов прочих уездов различным, что нижней части щита полагается серебряное с малиновым полосатое поле. 4 июля.1847 года за № 1651[м], представил проект этот генерал-губернатору Витебскому, Могилевскому и Смоленскому на благоусмотрение и просил об исходатайствовании Высочайшего утверждения...

2 марта Сенат заключил рапорт сей принять к сведению, приобщить к делу по принадлежности.

Исполняющий должность товарища Герольдмейстера.

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1343. Воп. 15. Спр. 119. Арк. 144—147.

Аб гербе горада Лепеля

«2657[1]. — сентября 9. Сенатский, по Высочайшему повелению. — Об утверждении гербов городам: Балте, Лепелю и Ковелю.

Правительствующий Сенат слушали предложение Исправлявшаго должность Герольдмейстера, от 4 августа сего 1852 года, что Министр Юстиции в ордере к нему, от 30 июля сего года, прописал, что представленные при рапорте ему, Министру, проекты гербов городам: Балте, **Лепелю** и Ковелю, он вносил в Комитет Министров. Комитет полагал: означенные проекты гербов представить на Высочайшее утверждение Его Императорского Величества. На проектах гербов написано: 20 июля 1852 года, собственною Его Императорского величества рукою: «утверждаю». О чем Исправлявший должность Герольдмейстера предложил Правительствующему Сенату на благоусмотрение. Описания же означенных гербов следующия: ...г. **Лепеля**: щит герба разделен на две равные части, в верхней изображен герб Витебской губернии* и в нижней — червлёный серебряный скачущий конь с таким же всадником, держащим в правой руке поднятый меч. Герб увенчан городскою короною... ПРИКАЗАЛИ: С Высочайше утвержденных гербов для городов: Балты, **Лепеля** и Ковеля и описание оных, сняв копии, препроводить оныя, для надлежащего распоряжения, к Министру Внутренних Дел при указе: об утверждении же сих гербов дать знать, для сведения, указами всем Министрам, Военным Генерал-Губернаторам, военным губернаторам управляющим и гражданскою частью, Генерал-Губернаторам, Градоначальникам, Губернским, Областным и Войсковым Правлениям и Правительствам».

Поўны збор законаў Расійскай імперыі. Збор. II. Т. XXVII. Ад. 1. 1852. СПб., 1853. Арт. 26571. Арк. 546—547.

Паўстанні ў краі. 1831—1864 гг.

Французская буржуазная рэвалюцыя садзейнічала распаўсюджванню дэмакратычных ідэй («свабода», «роўнасць», «братэрства») у многіх краінах. Пад іх уздзеяннем разгортваўся вызваленчы рух і на Беларусі, які быў прадстаўлены тайнымі таварыствамі і гурткамі, што дзейнічалі ў Віленскім універсітэце, у некаторых гімназіях і вучылішчах, у войску.

Членамі таварыстваў з'яўляліся прадстаўнікі беларускай шляхты, прыхільнікі ідэй аднаўлення незалежнай Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Некаторыя з іх выступалі таксама за вызваленне сялян ад прыгону.

Віленскі універсітэт быў самым перадавым ва Усходняй Еўропе цэнтрам навуковай і грамадскай думкі. Яго студэнты Тамаш Зан, Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Юзэф Яжоўскі і іншыя ўраджэнцы Беларусі сфарміравалі тайнае таварыства філаматаў (аматараў навук). Назва «аматары навук» была прынята членамі таварыства, каб скрыць свае палітычныя мэты.

Польскіх магнатаў і шляхту не задавальняла дзяржаўная аўтаномія Каралеўства Польскага, утворанага паводле Венскага кангрэсу 1815 г., у складзе Расійскай імперыі.

Каралеўства мела сваю канстытуцыю, сейм, асобнае войска і кіраўніка адміністрацыі ў асобе вялікага князя, брата цара.

У 1830 г. весткі аб французскай рэвалюцыі ўскалыхнулі Еўропу. Намер рускага цара паслаць войскі для яе задушэння падштурхнуў да адкрытага выступлення польскіх шляхецкіх рэвалюцыянераў. У ноч на 29 лістапада ў Варшаве пачалося паўстанне, якое хутка ахапіла ўсё Царства Польскае. Галоўнакамандуючы польскай арміяй і фактычна намеснік цара ў Польшчы вялікі князь Канстанцін Паўлавіч вымушаны быў уцякаць з Варшавы, а польская армія перайшла на бок народа.

У лютым адбыліся першыя сур'ёзныя сутычкі.

[1] Нарысы гіст. Беларусі. Ч. 1. Мн., 1994. С. 286.

СПИСОКЪ

о семействѣ дворянина

Лепельскаго уѣзда, Витебской губерніи.

Игнатій Іосифовича Рэута.

Составленъ на основаніи 1108 и 1109 ст. IX т. закон. о сост. изд. 1876 года.

Дано 5 дня 189/ года.

Спіс членаў сям'і двараніна І. І. Рэута, удзельніка паўстання 1863 г. на Віцебшчыне

На беларускіх землях з'явіліся добраахвотнікі, якія далучыліся да паўстанцаў. У пачатку сакавіка паўстанне пачалося ў Літве, у красавіку — у Заходняй Беларусі.

На тэрыторыі Беларусі значных ваенных дзеянняў не адзначалася. Тут адбываліся асобныя сутычкі паміж атрадамі ўрадавых войскаў і паўстанцаў. Рускім войскам прыйшлося адбіваць у паўстанцаў Свянцяны, Дзісну, Вілейку, Ашмяны, Лепель.

На канец жніўня 1831 г. паўстанне на Беларусі было амаль цалкам падаўлена. А вестка пра ўзяцце 8 верасня рускай арміяй Варшавы прымусіла разысціся рэшткі атрадаў паўстанцаў, якія яшчэ хаваліся па лясах.

29 красавіка 1831 г. у Лепель прыехаў віцебскі губернатар, наведаў розныя ўстановы, у тым ліку і дваранскае вучылішча. З Лепеля ён выехаў на Полацк. Але, даведаўшыся па дарозе ля мястэчка Ушачы, што з Дзісненскага ў Лепельскі павет перамясціліся ўдзельнікі паўстання 1830—1831 гг., вярнуўся назад і паехаў другой дарогай, праз Бешанковічы. Гэта выклікала сярод чыноўнікаў г. Лепеля вялікі перапалох. Некаторыя пачалі адпраўляць свае сем'і ў Віцебск. 12 мая 1831 г. у Лепель былі ўведзены царскія войскі.

Рух паўстанцаў ахапіў і Лепельскае дваранскае вучылішча, з якога ў рады паўстанцаў пайшло 14 вучняў. Але ў верасні 1831/32 навучальнага года заняткі ў вучылішчы пачаліся як і звычайна. Вучні — удзельнікі паўстанцкіх атрадаў зноў былі прыняты ў вучылішча.

19 лютага 1861 г. Аляксандр II падпісаў Маніфест і «Палажэнні» аб вызваленні памешчыцкіх сялян ад прыгоннай залежнасці. Прыгонныя сяляне атрымалі, хоць і не адразу, асабістую волю і правы чалавека, фармальна незалежнага ад пана.

Паводле закона селянін павінен быў заплаціць памешчыку выкуп і за зямлю, і за сваю свабоду. Выкуп апошняй быў замаскіраваны шляхам завышэння цаны на зямлю. 80 працэнтаў сумы памешчыкам плаціла дзяржава. Сяляне рабіліся яе даўжнікамі на 49 гадоў і павінны былі выплачваць не толькі суму доўгу, але і вялікія працэнты за пазыку. Выкупныя плацяжы спаганяліся да першай расійскай рэвалюцыі.

Каб памешчыкі не заставаліся адразу пасля рэформы без рабочых рук, «Палажэннямі» прадугледжваўся выкуп сялянамі сваіх надзелаў не раней чым цераз 9 гадоў. Увесь гэты час яны лічыліся «часоваабавязанымі» і павінны былі за карыстанне надзелам, як і раней, адбываць паншчыну або плаціць памешчыку чынш.

Умовы «вызвалення» выклікалі масавае абурэнне сялян. У 1861 г. на Беларусі ўлічаны 379 выступленняў, звязаных з рэформай, што ў дзевяць разоў перавысіла паказчык папярэдняга года. У чэрвені 1861 г. сялянскія бунты на Лепельшчыне мелі месца ў маёнтках Будзілава, пазней у Жарах і іншых месцах, дзе памешчыкамі былі Буйніцкія, Грыгаровіч, Багушэвіч, Сялява, Спасоўская, Шчыт.

Многія сяляне былі не задаволены выбраннем старастаў і наадрэз адмаўляліся падпарадкоўвацца асобам, якія назначаліся пасрэднікамі. Сялянскія выступленні працягваліся, раслі і мацнелі. Аб вастрыні і размаху барацьбы сведчыць тое, што 125 з іх былі падаўлены войскамі і паліцыяй.

Ідэі расійскіх рэвалюцыйных дэмакратаў падзялялі радыкальна настроеныя члены падпольных рэвалюцыйных гурткоў, створаных у той час у Пецярбургу ўраджэнцамі беларуска-літоўскіх і поль-

скіх губерняў. Сярод іх былі выдатныя сыны Беларусі Канстанцін Каліноўскі, Валерый Урублеўскі і інш.

У сакавіку 1861 г. К. Каліноўскі вярнуўся на радзіму. Той жа вясной ён пачаў ствараць на Гродзеншчыне рэвалюцыйную арганізацыю, куды ўвайшлі В. Урублеўскі, Ф. Ражанскі, І. Мілевіч, С. Сангін і інш. Летам 1862 г. Каліноўскі стаў членам, а ў кастрычніку — старшынёй Літоўскага правінцыяльнага камітэта (ЛПК) у Вільні — цэнтра «чырвоных» у Літве і на Беларусі, які ўзначаліў падрыхтоўку ўзброенага паўстання супраць царызму.

На Віцебшчыне прынялі ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні паўстання мясцовыя паэты-дэмакраты А. І. Вярыга-Дарэўскі, Ф. Ф. Тапчэўскі, О. М. Грабніцкі, І. І. Рэут і інш.

У 1865 г. было закрыта Лепельскае павятовае дваранскае вучылішча, навучэнцы якога прынялі ўдзел у паўстанні.

Спіс землеўладальнікаў Лепельскага павета Віцебскай губерні 1878 г.

Лепельский уезд	Наименование имений	Пространство в десятинах и сажнях
Арнольд Паулина Осиповна	Прудок	110
Будзько Игнатий и Иозефа	Караевичи	10
Будзько Иосиф Лаврентьевич	Караевичи	40
Вейтко Ирина Осипова	Иринполь	439
Войт Владимир Карлович	Заболотье	682
Гайковичи: Осип, Иван и Леон Казимировы	Адамовка	18
Горновские Казимир и Михаил Иосифовы	Старобино	200
Дохтуров Николай	Пышногоры	911
Замковский Александр	Караевичи	28
Закржевские Григорий Андреев и Антонина	Савин Дуб	50
Змечеровская Францишка	Савин Дуб	50
Змечеровский Иван	Савин Дуб	53
Камионко Викторина Викентьевна	Ладосно	209
Камионко Адам, Винцентий и Николай	Сизовщина	294
Кладницкая Михалина	Черцы	1051
Козарин Викентий	Пунище	11
Козарин Игнатий	Пунище	11
Колочинский Антон	Адамовка	9
Корсак Станислав Рохов	Гущино	142
Корсак Адам Осипович	Суша	798
Коранцю Яков Иванович	Замошье	43
Котырловой Анны	Борсуки	40
Котырло Осип	Борсуки	20
Котырло Феликс	Борсуки	40
Кусцинский Михаил Францевич	Завидичи	1180
Ласский Иван Карлов	Жезлино	15
Ласский Игнатий Карпов	Жезлино	15
Ласская Иозефина Карповна	Заволотничье	33
Миладовский Константин Зенонович	Лутище	420
Недзвецкий Иван Андреевич	Загорцы	660
Немиры Адольф и Казимир	Городенец	1073
Никитины Иосиф и Федор	Адамовка	55

Працяг табл.

Лепельский уезд	Наименование имений	Пространство в десятинах и сажнях
Ноздровский	Вилы	95
Ноздровский Дмитрий	Вилы	251
Норницкий	Коровайно	1020
Огризко Иван Казимиров	Адамовка	55
Олендский Иосиф	Чересово	382
Олецкий Михаил Александрович	Бор	12
Оржесковская Марьяна Степановна	Каменка	64
Оссовская Домна	Рыбиниц	30
Оссовский Иосиф Иванович	Караевичи	32
Пакоша, наследники	Великий Камень	1088
Парфинович Викентий	Караевичи	9
Пестов Александр	Изабелино	679
Петров Осдор	Людчицы	721
Петрищо Леон Николаевич	Адамовка	10
Пиотух Александр	Боровка	13 1/2
Пржесецкий Казимир Евстафьевич		1520
Райко Алексей Николаевич	Вацлавово	2723
Реут Казимир Иосиф	Заволотничье	32
Реут Станислав Ромуальдович	Тадулино	103
Ржешевский Антон	Заозерье	87
Рженишевская Раиса	Казимирово	201
Рожновский Франц	Яново	103
Рожновский Валериан	Юрковщина	38
Рожновские Иван и Степан	Юрковщина	30
Романовский Петр	Караевичи	10
Романовский Феликс	Караевичи	30
Свирщевский Фома	Заглинники	45
Селляво Фекла	Воронь	1551
Селляво Валерия	Губино	1392
Славецкий Яков Иванович	Кугачино	20
Славецкий Ипполит Флорианович	Савин Дуб	32
Славецкий Фома Станиславов	Адамовка	20
Славецкий Фабиан	Адамовка	20
Славецкая Петрунеля	Слободка	30
Сляские, наследники	Тадулино	140
Снарский Иван Станиславович	Караевичи	42
Снарского Евзебия, наследники	Поречье	477
Соколовский Дионизий	Караевичи	35
Спасовская Евва	Заболотье	4153
Спиридович Иван	Иозефатово	131
Старосельский Иосиф Станиславович	Караевичи	14
Станкевич Югася Матвеевна	Заволотничье	31
Станкевича Антона, наследники	Заволотничье	31
Стефановский Адам Викентьевич	Несино	528
Стефановский Константин Адамович	Демешково	252
Стефановского Якова, наследники	Жезлино	177
Чернявские Игнатий и Станислав Иосифовы	Караевичи	18
Чехович Михаил Иванович	Тадулино	120
Штремберг Аполинарий Николаевич	Затеклясье	1095
Шелепина Фекла Антоновна	Караевичи	336
Щипчинские Екатерина и Розалия	Плешки	182

Працяг табл.

Лепельский уезд	Наименование имений	Пространство в десятинах и сажнях
Энгельфельд Павел Иванович	Заозерье	74
Ясевич Франц Антонович	Воропаевщина	895
Яхимович Михаил Иванович	Заволотничье	120
Яхимович Лаврентий	Заволотничье	163

Из «Памятной книги Витебской губернии на 1878 год». Витебск, 1878. С. 301—315.

Звесткі аб насельніцтве г. Лепеля і Лепельскага павета згодна з усеагульным перапісам насельніцтва Расійскай імперыі ў 1887 г.

Всеобщая перепись в декабре 1897 г. выяснила, что по количеству населения г. Лепель занимает из уездных городов Витебской губернии далеко не последнее место, и именно — считая по восходящей степени 5-е, а по нисходящей — 6-е. Перепись 1897 г. дает следующие статистические данные по Лепелю.

I. ОБЩЕЕ ЧИСЛО НАЛИЧНОГО НАСЕЛЕНИЯ:

а) русских подданных мужч. 2912, женщин — 3183, обоего пола — 6095 и, кроме того, временно находилось в месте переписи мужчин — 120, женщин — 59, обоего пола — 179.

б) иностранных подданных мужчин — 4, женщин — 4, обоего пола — 8, и временно пребывало мужчин — 2.

в) всего мужчин — 3038, женщин — 3246, обоего пола — 6284, причем половой состав населения не отступает от общего характера: женщин оказалось больше, чем мужчин, на 208.

II. ПО МЕСТУ РОЖДЕНИЯ И ПО СОСЛОВИЯМ:

	Местных уроженцев		Других уезд. Вит. губернии		Других губерний		Итого	
	м	ж	м	ж	м	ж	м	ж
а) Потомственные дворяне	56	52	9	16	34	33	99	101
б) Дворяне личные	23	23	17	12	18	20	58	55
в) Духовного звания	2	7	6	9	2	—	10	16
г) Потомств. и лич. поч. граждане	5	4	2	1	5	2	12	7
д) Купцы	24	33	3	—	3	7	30	40
е) Мещане	2023	2212	58	87	196	239	2277	2538
ж) Крестьяне	404	378	7	8	83	50	494	436
з) Других сосл. и ин. подданных	26	22	10	15	22	16	58	53
Итого:	2563	2731	112	148	363	367	3038	3246

Отсюда видно, что местные уроженцы составляют в Лепеле 84,2 %, уроженцы других уездов губернии составляют 4,2 %, словом, бесспорных белорусов по рождению 88,4 %, и только 11,6 % уроженцев других губерний. А так как из этих 11,6 % значительная цифра падает на белорусские губернии — Могилевскую (110 человек), Минскую (297), Виленскую (127) и Гродненскую (13) — всего 8,5 %, то на уроженцев из белорусских губерний остается всего 3,1 %.

III. ПО РОДНОМУ ЯЗЫКУ:

а) белорусский	— м. 997,	ж. 921,	об. 1918,	в %	—30 %
б) великорусский	— м. 245,	ж. 276,	об. 521,		— 8,2 %
в) малорусский	— м. 2,	ж. —	об. 2,	—	—
г) польский	— м. 212,	ж. 227,	об. 439,		— 7 %
д) литовский	— м. 1,	ж. 1,	об. 2,	—	—
е) латышский	— м. 3,	ж. 1,	об. 4,	—	—
ж) немецкий	— м. 9,	ж. 5,	об. 14,	—	—
з) французский	— м. 1,	ж. —	об. 1,	—	—
и) еврейский	— м. 1566,	ж. 1813,	об. 3379,	—	53,8 %
к) татарский	— м. 1,	ж. —	об. 1,	—	—
л) чешский	— м. 2,	ж. —	об. 2,	—	—

IV. ПО ВЕРОИСПОВЕДАНИЯМ:

а) православных	— м. 1177,	ж. 1138,	об. 2315
б) раск.старообряд.	— м. 8,	ж. —	об. 8
в) рим.-католиков	— м. 274,	ж. 289,	об. 563
г) лютеран	— м. 12,	ж. 6	об. 18
д) иудеев	— м. 1566,	ж. 1813,	об. 3379
е) магометан	— м. 1,	ж. —	об. 1

V. ПО ОБРАЗОВАНИЮ:

1. Получили образование в университетах и других высших учебных завед. м. 16, ж. 1 = 0,28 %
2. В средн. учеб. заведениях м. 38, ж. 25 = 1 %
3. Грамотных м. 1501, ж. 996 = 40 %
4. Неграмотных м. 1537, ж. 2250 = 52,72 %

Приведенные цифры показывают, что лепельское население более чем равнодушно относилось к школе за минувшее столетие. Цифру грамотных дают по Лепелю городские сословия — купцы и мещане самую большую (муж. 1169, жен. 1817), об. 2986, т. е. 46 %, затем крестьяне и другие сословия — 12,72 %.

VI. ПО ПОЛУ И ДЕСЯТИЛЕТНИМ ГРУППАМ население города Лепеля распределяется так (в скобках показано количество грамотных на каждую группу):

моложе года	1—9 лет	10—19 лет
м. — 93	м. 749 (900)	м. 680 (490)
ж. — 101	ж. 769 (58)	ж. 699 (366)
20—29 л.	30—39 л.	40—49 л.
м. — 455 (298)	м. 369 (221)	м. 243 (157)
ж. — 513 (260)	ж. 401 (156)	ж. 304 (173)
57—59 л.	60—69 л.	70—79 л.

м. — 213 (109) ж. — 208 (47)	м. 159 (62) ж. 148 (25)	м. 62 (35) ж. 69 (11)
80—89 л.	90—99 л.	100—109 л.
м. — 27 (10) ж. 22	м. 1 ж. 4	м. 2 ж. —

Из этой таблички видно, что в Лепеле детей (1—9 лет) было 1712, или 27,2 % общей цифры жителей и, прибавим от себя, на 4 % больше, нежели в других городах губернии. Затем население полурабочего возраста (10—19 л.) составило 1379 человек, т. е. 22 %, тоже больше других городов на 1 %. Группа лиц производительного возраста (20—59 л). = 2706 человек, или 43 %, то же, что и в других городах Витебской губернии.

VII. ПО СЕМЕЙНОМУ СОСТОЯНИЮ И ПО ВОЗРАСТУ:

	Холостых		Состоящих		Вдовых		Разведенных	
	муж.	жен.	муж.	жен.	муж.	жен.	муж.	жен.
0—16 лет	1381	1344	—	—	—	—	—	—
17—19 лет	142	221	—	6	—	—	—	—
20—29 лет	292	228	664	283	—	3	—	1
30—39 лет	27	34	337	340	6	23	—	4
40—49 лет	16	21	221	249	6	33	—	—
50—59 лет	6	10	190	143	17	54	1	1
60 и более лет	7	14	162	84	—	—	—	—
Итого:	1871	1872	1074	1105	91	262	1	6

Отсюда получаются следующие выводы о распределении видов семейного состояния: на 1018 холостых и незамужних приходится 2178 состоящих в браке, т. е. последних в 2 с лишним раза больше, нежели первых. При этом критическим возрастом оказывается для женатых мужчин 30—39 лет, для женщин — 40—49 лет. Далее наблюдается другое явление: число вдов почти в три раза больше, чем вдовцов.

VIII. ОБЩЕЕ ЧИСЛО ХОЗЯЙСТВ в городе = 1132, в этом числе хозяйств казенных и общественных учреждений — 7, остальные 1125 — хозяйства частные. Последние (частные) хозяйства распределялись так:

а) хозяйств артельных и вообще не связанных родством — 33, м. 84, ж. +24;
б) хозяйств лиц одиноких — 31, м. 20 + ж. 28 и
в) хозяйств лиц, связанных родством, — 1061, м. 2564 + ж. 2844.

IX. ПО ГРУППАМ ЗАНЯТИЙ:

Род занятий	Имели самост. занятия		Из них христиан	
	муж.	жен.	муж.	жен.
1. Администрация, суд и полиция	70	—	69	—
2. Обществ. и сословная служба	18	—	16	—
3. Частная юридическая деятельн.	2	—	1	—
4. Вооруженные силы	26	—	26	—

Працяг табл.

Род занятий	Имели самост. занятия		Из них христиан	
	муж.	жен.	муж.	жен.
5. Богослуж. православ. исповед.	5	—	5	—
6. — // — друг. христ. исповед.	3	—	2	—
7. — // — не христиан. исповед.	3	—	—	—
8. Лица при церквях, синагогах кладбищах и др.	6	—	2	—
9. Учебной и воспит. деятельностей	36	3	6	2
10. Наука, литература, искусство	7	1	1	1
11. Врачеб.-санитар. деятельность	19	4	12	4
12. Служба при благотв. учрежд.	—	—	—	—
13. Деятельность и служба частная	161	262	139	182
14. Доход с капиталов им. и род.	69	75	50	51
15. Сред. от казны общ. учр. и част. лиц	64	29	61	24
16. Лишен. свободы и отбывающ. наказ.	51	347	2	
17. Земледелие	154	21	151	21
18. Пчеловодство и шелководство	—	—	—	—
19. Животноводство	5	—	5	—
20. Лесоводство и лесные промыслы	14	—	8	—
21. Рыболовство и охота	5	—	—	—
22. Добыча руд и копи	1	—	—	—
23. Выплавка металлов	—	—	—	—
24. Обработка волокнистых веществ	3	8	—	4
25. — // — животных продуктов	5	—	2	—
26. — // — дерева	43	—	22	—
27. — // — металлов	31	—	7	—
28. — // — минер. веществ (керам.)	12	—	3	—
29. Производ. химич. и связ. с ними	2	1	—	—
30. Винокурение — пиво — медоварение	—	—	—	—
31. Крепкие напитки и бродильные вещества	—	1	—	—
32. Обработка раст. и пит. продуктов	22	4	3	1
33. Табак и изделия из него	—	—	—	—
34. Полиграфические производства	10	—	—	—
35. Инструменты оптич.хирург., и др.	3	—	—	—
36. Ювелиры, живописцы	3	—	1	—
37. Изготовление одежды	169	42	30	11
38. Строительство и ремонт	86	—	55	—
39. Производство экипажей и постр. деревянных судов	1	—	—	—
40. Не вошедшие в предыдущие группы	—	—	18	—
41. Водные сообщения	19	—	10	—
42. Железные дороги	10	—	10	—
43. Извозный промысел	43	—	9	—
44. Остальные сухопутные сообщ. средства передвижения	2	—	—	—
45. Почта, телеграф, телефон	8	—	8	—
46. Кредит. и обществ. коммерч. учрежд.	1	—	—	—
47. Торговое посредничество	3	1	—	—
48. Торговля вообще	77	24	—	—

Працяг табл.

Род занятий	Имели самост. занятия		Из них христиан	
	муж.	жен.	муж.	жен.
49. —//— живым скотом	7	—	3	—
50. —//— зерновыми продуктами	10	3	—	—
51. —//— остальными прод. с/х	57	16	2	—
52. Торговля строит. материалами	26	2	—	1
53. Торговля предм. домашнего обих.	2	2	—	—
54. —//— метал. товарами	2	1	—	—
55. —//— тканями и предм. одежды	10	3	—	—
56. —//— кожами, мехами и проч.	5	—	—	—
57. —//— предметами роскоши, науки, искусства	1	—	—	—
58. Торговля остальными предм.	2	—	—	—
59. —//— разносная и развесная	5	—	2	—
60. Трактиры, гост. меблированные комнаты, клубы	7	6	—	5
61. Торговля питейная	6	—	2	—
62. Чистота и гигиена тела	5	14	1	13
63. Лица неопределенных занятий	15	22	11	11
Итого:	1432	548	791	334

А всего из 1980 лиц, занимающихся самостоятельно, христиан 1125, остальные 885 — евреи, работающие самостоятельно. Не показанные же здесь 1606 мужск. и 2698 женск. пола составляли членов семьи лиц, вошедших в приведенную таблицу.

Что касается распределения этих занятий между народностями, то перепись 1897 года выяснила следующее: белорусов занято самостоятельным трудом 544 мужч. и 198 женщ. и великорусов 121 мужч. и 64 жен., итого 927 человек, которые имеют долг содержать на свои заработки 2512 членов семейств; евреев занято самостоятельным трудом 854 человека, имеющих у себя 2525 членов семьи; поляков занято 181 человек, при 259 ч. семьи, немцев 7 человек при 7 членах семьи, латышей 3 при 1 члене семьи, литовцев 2 и татарин 1. Самое большое количество населения по занятиям относится к группе: «прислуга, поденщики, деятельность и служба частная» — 326 христиан и 102 еврея; затем следует торговля, которою занято 6 христиан и 259 евреев; третье место принадлежит изготовлению одежды — 41 христианин и 170 евреев; четвертая группа — сельское хозяйство — 164 христианина и 3 еврея.

X. О ФИЗИЧЕСКИХ НЕДОСТАТКАХ:

Слепых	м. 2,	ж. 6
Немых	м. 2,	ж. 1
Глухонемых	м. 9,	ж. 9
Умалишенных	м. 4,	ж. 4
Итого:	м. 17,	ж. 20 = 37.

З кнігі Дз. І. Даўгяла «Лепель, уездный город Витебской губернии» Віцебск, 1905.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Лепельшчыны ў другой палове XIX — пачатку XX ст.

Буржуазны накірунак рэформ 60—70-ых гадоў, за выключэннем адмены прыгоннага права, на Беларусі быў больш абмежаваны, чым у Цэнтральнай Расіі, паколькі сутнасць палітыкі царызму ў заходніх губернях вызначалі вялікадзяржаўныя, каланізатарскія задачы. З мэтай русіфікацыі краю тут быў фактычна ўстаноўлены рэжым выключных законаў.

Вытворчыя адносіны ў парэформеннай беларускай вёсцы вызначаліся сялянскім малазямеллем, высокімі выкупнымі плацяжамі, шматлікімі дзяржаўнымі, земскімі і мірскімі падаткамі і павіннасцямі, якія вымушалі сялян на кабальных умовах арандаваць памешчыцкія палі, пашы і сенажаці, браць у паноў натуральныя і грашовыя пазыкі.

У 60—70-ыя г. важнай таварнай галіной у памешчыцкай і сялянскай гаспадарках заставалася вытворчасць зерня.

Другім важным накірункам спецыялізацыі памешчыцкай гаспадаркі было вінакурства. Мянялася структура пасяўной плошчы. Пасевы кармавых культур у 80—90-ыя гады павялічыліся ў сем разоў. Вытворчасць зерня прызначалася пераважна на корм для жывёлы і вінакурства. Паляпшалася апрацоўка зямлі, і павышалася ўраджайнасць. На поўначы Беларусі важным накірункам спецыялізацыі сельскай гаспадаркі з'яўлялася льнаводства, а ў Магілёўскай губерні — вырошчванне канапель. Як рыначная галіна на Беларусі паўсюдна развівалася свінагадоўля.

Патрэбам развіцця капіталістычнага рынку ў найбольшай ступені адпавядаў чыгуначны транспарт.

У «Памятнай кніжцы Віцебскай губерні на 1864 г.» сакратар Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта В. М. Семянтоўскі пасля наведвання Лепеля зрабіў такі запіс: «...В Лепеле 1 часовня и 3 православные церкви, из коих только один собор каменный, но и тот храм, к крайнему прискорбию, не отличается благолепием; римско-католический костел один деревянный, но близ торговой площади строится другой — каменный, весьма красивой архитектуры; еврейских синагог 4; домов каменных 38, деревянных — 562. Из заводов 1 кожевенный, 1 пивоварен-

План Лепеля. XIX ст.

ный и 2 кирпичных. Торговля Лепеля до того слаба, что даже на ярмарки, назначенные 30 января и 29 августа, съездов не бывает. Жителей в городе числится: мужчин — 1452, женщин — 1641 чел.» (Дз. І. Даўгяла. Лепель, павятовы горад Віцебскай губерні. Віцебск, 1905. С. 72).

У 1868 г. на Прудавай вуліцы Лепеля пабудавана Пятніцкая царква, у 1876 г. асвечаны касцёл Святога Казіміра.

У нарысе краязнаўца І. Д. Гарбачэўскага «Лепельскі павет Віцебскай губерні». Віцебск, 1895 г. знаходзім звесткі аб эканамічным і культурным развіцці Лепельшчыны ў канцы XIX ст.

Галоўным заняткам жыхароў Лепельскага павета з'яўляюцца земляробства і жывёлагадоўля. У сялян зямлі мала. На адзін надзел прыпадае менш за 4 дзесяціны, улічваючы прыдатную і непрыдатную. Таму ў апошні час яны ўзмоцнена стараюцца прыкупіць зямлю ў суседніх памешчыкаў з дапамогай зямельнага банка. Па прычыне частых сямейных падзелаў сяляне парэзалі свае надзелы на такія вузкія палоскі, па якіх з цяжкасцю праходзіць барана, не дакранаючыся да суседняй нівы. Пры гэтых умовах аб папярэчнай апрацоўцы зямлі не можа быць і гаворкі.

Гаспадарка вядзецца звычайная трохпольная: зямля ўгнойваецца слаба, але апрацоўваецца старанна. У горадзе Лепелі і мястэчках зямля ўгнойваецца лепш і прыносіць добрыя ўраджаі.

З азімых культур у павеце высяваецца жыта і азімая пшаніца, якая па добрай зямлі дае ўраджай да 6 зярнятак і больш.

З яравых культур высяваюць ячмень, авёс, гарох, боб, чачавіцу, месцамі на пясчанай глебе — яравое жыта і пшаніцу.

У некаторых месцах спрабавалі сеяць проса і атрымалі здавальняючыя ўраджаі, хоць проса і моцна церпіць ад пустазелля.

Усяго па павету кожны год збіраецца з палёў да 190 000 чвэрцяў жыта і пшаніцы, да 270 000 чвэрцяў яравога хлеба і да 220 000 чвэрцяў бульбы.

З аднаго сялянскага надзела пры дастатковым унясенні ўгнаенняў і стараннай апрацоўцы глебы сям'я атрымлівае да 20 коп жыта і столькі ж яравога хлеба без бабовых раслін.

Пятніцкая царква ў Лепелі, пабудаваная ў 1868 г.

Касцёл Св. Казіміра, пабудаваны ў 1876 г. Здымак 1930-ых гадоў

Разам гэта дае крыху больш за 100 пудоў зерня, якога хапае на засеў палёў і на пракармленне сям'і, не перавышаючай 5 чалавек, па 12 пудоў на кожнага.

Вялікай падмогай у гаспадарцы і істотнай падтрымкай хлеба паўсюдна з'яўляюцца бульба і агародніна. Лішак хлеба



Прылады працы сялян Лепельскага павета. XIX ст.

бывае толькі ў тых гаспадароў, якія выкарыстоўваюць па тры і чатыры надзелы зямлі: самыя бераглівыя з іх, дачакаўшыся больш высокіх цэн, прадаюць па некалькі соцень пудоў.

З тэхнічных культур у Лепельскім павеце высяваюцца лён і каноплі. У папярэднія гады лёну высявалі больш, і сяляне атрымлівалі немалыя грошы ад продажу льновалакна і льносемя.

Але па прычыне зніжэння цэн на гэтыя тавары і моцнага спусташэння льном глебы гаспадары скарацілі яго пасевы.

У апошні час сяляне сталі разводзіць больш жывёлы, вырабляць і выкарыстоўваць аднаконныя плугі.

Са свойскай жывёлы сяляне трымаюць коней, часта ад аднаго да трох і чатырох на гаспадарку, кароў ад адной да дзесяці, па некалькі свіней і авечак. Са свойскіх птушак у гаспадарках утрымліваюць курэй, гусей, качак, індзюшак.

Дзякуючы вялікай колькасці лугоў і сеяных траў у павеце разводзяць лепшыя пароды жывёлы — коней і кароў. Асабліва высокай пароды коней разводзяць у памесці Забалацце.

У павеце спрабавалі разводзіць танкарунных мерыносаў і атрымлівалі здавальняючыя вынікі.

Садоўніцтва і агародніцтва ў павеце знаходзяцца ў добрым стане. У многіх памешчыкаў маюцца вялікія пладовыя сады, якія прыносяць тысячныя даходы. Напрыклад, у Ворані, Завідзічах, Фатыні і інш. месцах.

Сяляне ў мястэчках і вёсках таксама паўсюдна пачалі садзіць утульныя садзікі. Пры гэтым назіраецца нават бачнае спаборніцтва ў гэтай справе паміж маладымі гаспадарамі. Цяпер у многіх садах і на асобных пасеках заўважаюцца па дзесятку і больш вулляў пчол.

Упарадкаваны і лепшы пчальнік з рамачнымі вуллямі знаходзіцца ў памесці Фатынь. Усяго ж у павеце можна налічыць да 1000 вулляў пчол, пераважна ў старых дзедаўскіх дуплянках.

Гандаль у Лепелі мае дробны характар. Буйныя гандлёвыя абароты вядуць толькі лесапрамыслоўцы і хлебныя гандляры.

Па выніках 1892 г. увесь гандлёвы абарот склаў 464 880 руб. з чыстым даходам 42 678 руб.

Галоўнымі гандлёвымі пунктамі ў павеце лічацца Чашнікі, Лепель і Бешанковічы. Тавары прывозяць з Масквы, Мінска, Віцебска, Варшавы, Вільні.

Непасрэдныя зносіны з вялікімі гандлёвымі арганізацыямі, фабрыкамі і заводамі маюць нямногія гандляры.

Дробныя прадаўцы атрымліваюць тавары ад іх і прадаюць з вялікай карысцю для сябе.

Галоўнае багацце павета — хлеб у колькасці да 600 000 пудоў грузіцца на лайбы і вывозіцца ў Рыгу.

Найбольшы прыбытак ад гандлю хлебам атрымліваюць памешчыкі, якія значную частку хлеба перапрацоўваюць у спірт.

Прадаецца ў асноўным пшаніца і семя лёну.

Самы буйны і распаўсюджаны ў павеце заробак дае высечка і сплаў лесу. Звычайна ўсю зіму да самага пояса ў снезе працуе селянін, ссякаючы лес і выцягваючы яго на бераг бліжэйшай сплаўной ракі.

З наступленнем вясны ён стаіць да самага пояса ў халоднай з лёдам вадзе, звязваючы бярвенні ў плыты ці лавы, мокры, здранцвелы, ён дрыжыць ад холаду, саграваючыся час ад часу выпітай гарэлкай.

Па заводскай і фабрычнай дзейнасці Лепельскі павет, пасля Дзвінскага і Рэжыцкага, займае трэцяе месца ў губерні. Даход мясцовых заводаў і фабрык у 1892 г. склаў 224 379 руб. Найбольшы прыбытак прынеслі 11 вінаробчых заводаў —

116 164 руб., 47 млыноў — 71 375 руб. і кардонная фабрыка — 20 000 руб.

З паляпшэннем дабрабыту і дастатку ў насельніцтва павялічваецца патрэба ў павышэнні адукацыі.

Па колькасці народных вучылішчаў Лепельскі павет займае першае месца ў губерні, гэтаму добра садзейнічае вялікая колькасць наяўных мястэчак (15), жыхары якіх выдзяляюцца высокім развіццём і імкненнем да адукацыі.

У 1893 г. у павеце на 140 859 чал. насельніцтва прыходзілася адно двухкласнае гарадское вучылішча са 118 вучнямі, адно прыходскае вучылішча з жаночай зменай, два яўрэйскія пачатковыя вучылішчы і 27 народных. У названых вучылішчах навучалася 1414 хлопчыкаў і 132 дзяўчынкі. У апошні час у дапамогу міністэрскай школе з'явіліся царкоўнапрыходскія вучылішчы і школы пісьменнасці, колькасць якіх хутка павялічваецца з кожным годам. У гэтым жа годзе ў 20 царкоўнапрыходскіх вучылішчах і 14 школах пісьменнасці навучалася да 594 чалавек; усяго ж у павеце ва ўсіх вучылішчах было 2140 вучняў, што складае каля 2 % усяго насельніцтва.

У адміністрацыйных адносінах Лепельскі павет быў падзелены на 4 станы, 15 урадніцкіх участкаў, на 4 міравыя ўчасткі, 2 следчыя ўчасткі і 27 валасцей (Бешанковіцкая, Бачэйкаўская, Стрыжэўская, Станіславоўская, Смаляніцкая, Капцэвіцкая, Цяпінская, Гарадчэвіцкая, Несінская, Каменская, Марцінаўская, Усайская, Чарсвяцкая, Варонецкая, Ветрынская, Нацкая, Арэхаўская, Бабыніцкая, Ушацкая, Кубліцкая, Гутаўская, Бельская, Вораньская, Пышнянская, Франопальская і Забалацкая).

Пры кожнай воласці маецца народнае вучылішча, а ў Капцэвіцкай воласці 2.

У Лепельскім павеце маецца 46 царкоўных прыходаў, 12 каменных і 60 драўляных цэркваў і капліц, 6 рымска-каталіцкіх прыходаў і касцёлаў.

Усяго населеных пунктаў у павеце налічваецца каля 1800, з якіх найбольш значнымі з'яўляюцца горад Лепель і 15 мястэчкаў.



Спаса-Праабражэнскі сабор, 1904 г.

У 1893 г. у Лепелі была заснавана метэаралагічная станцыя. Матэрыялы назіранняў характэрны для тэрыторыі з радыусам 25—35 км вакол станцыі. Метэаралагічная станцыя адзначыла сваё стагоддзе.

У канцы XIX ст. у Лепелі было праведзена добраўпарадкаванне месцаў пахавання продкаў. На сродкі папячыцельства гарадской управы вакол Георгіеўскіх могілак (раён Пясчанкі) у 1893 г. была зроблена каменная агароджа, а ў 1899 г. — вакол Пятроўскіх могілак (за Улай).

У 1897 г. праведзены Першы усеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі, які выявіў, што па колькасці насельніцтва Лепель займаў шостае месца сярод павятовых гарадоў. У ім пражывала 6284 чалавекі. Пры гэтым жанчын было больш, чым мужчын, на 208 чалавек.

Паводле дадзеных перапісу, у Віцебскай губерні беларусы складалі 52 %. У

Помнік протаіерэю Спаса-Праабражэнскага сабора І. М. Даўгялу на Георгіеўскім могільніку. Здымак 1991 г.

Віцебскай губерні да ліку паветаў з пераважна беларускім насельніцтвам адносіліся Дрысенскі, Веліжскі, Невельскі, Гарадоцкі, Лепельскі, Полацкі і Віцебскі.

Акрамя беларускага насельніцтва, у 5 заходніх губернях у канцы XIX ст. пражывала 3,1 млн. рускіх, палякаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў і яўрэяў. Апошнія адносна раўнамерна рассяляліся па ўсім краі, канцэнтруючыся ў гарадах і мястэчках, дзе складалі большасць. Прыкметнай сярод гараджан была і праслойка рускамоўнага насельніцтва.

20 верасня 1894 г. склаў свае абавязкі на пасадзе лепельскага гарадскога галавы Емяльян Цярэнцьевіч Камека, які служыў з 18 лістапада 1893 г. На гэтай пасадзе раней былі: Абезгаўз — 1803—1813 гг., Радкевіч —1813—1851 гг., Шостак Іван — 1851—1858 гг., Петрушкевіч Леў Дзмітрыевіч — 1859—1865 гг., Замкоўскі Марк Якаўлевіч —1865—1874 гг., 1891—1893 гг., Загрэцкі Рыгор Фролавіч —1874—1880 гг., Ардыновіч Іван Фёдаравіч —1880—1886 гг., Загрэцкі Максім Якаўлевіч — 1886—1890 гг., Камароўскі Дзяніс Восіпавіч — 1890—1891 гг.

У 1894 г. у Лепелі было ўведзена новае спрошчанае гарадское ўпраўленне з гарадскім старастам на чале. Першым на гэтую пасаду быў выбраны дваранін Петр Ільіч Галашчапаў.

З 1 сакавіка 1896 г. у Лепелі адкрылася 6-ая акруга акцызных збораў. У гэтую акругу ўвайшоў Лепельскі павет Віцебскай губерні, за выключэннем пяці валасцей: Бабыніцкай, Вораньскай, Ветрынскай, Нацкай і Арэхаўскай.

У ліпені 1897 г. у Лепелі ўведзены казённы продаж напіткаў; адкрыты 3 вінныя крамы і 2 рэйнскавыя скляпы.

У 1898 г. на Навачашніцкай вуліцы пабудавана драўляная капліца ў мясцовасці «пад крыжам».

У 1899 г. па ініцыятыве казначэя Мацвея Віктаравіча Даўгялы Лепельскае павятовае казначэйства набыло ва ўласнасць пляц зямлі і дом на Саборнай плошчы, у якім у той час яно размяшчалася. Раней гэта зямля была гарадская, а будынак належаў Лепельскай турме. Памяшканне казначэйства і надворныя пабудовы былі адрамантаваны, ва ўстанову завезена высакаякасная мэбля.

10 жніўня 1899 г. Лепель наведаў віцебскі губернатар Іван Ільіч Чапялеўскі. Асабіста наведаў Пятроўскі могільнік для вырашэння аб прыналежнасці могільніка праваслаўным ці католікам.

24 ліпеня 1900 г. асвечана ў імя Святога Вялікамучаніка Георгія Пабеданосца новая каменная царква на Георгіеўскім могільніку. Тут з давён-даўна існавала Георгіеўская царква, адкуль і назва могільніка (у сярэдзіне XVIII ст. поўнасцю спарахнела).

3 лютага 1902 г. памёр свяшчэннік Свята-Праабражэнскага сабора і Георгіеўскай царквы протаіерэй Іаан Максіміліянавіч Даўгяла і быў пахаваны на Георгіеўскім могільніку.

13 чэрвеня 1903 г. урачыста асвечана

Пушкінская вуліца, пачатак XX ст.

на Старым рынку Лепеля новая каменная капліца на месцы, дзе раней стаяла уніяцкая Ражаство-Багародзіцкая царква.

13 мая 1904 г. паступіў загад Св. Сінода аб аддзяленні часткі прыхода Лепельскага сабора і ўтварэнні самастойных прыходаў у вёсках Верабкі і Старое Лядна.

16 сакавіка 1903 г. у Лепелі адбыўся вялікі пажар на галоўнай вуліцы горада — Пушкінскай. Згарэла 10 жылых дамоў і 9 нежылых памяшканняў, агульнымі стратамі ў 20 тыс. рублёў.

У гэтым жа годзе лепельскі археолаг М. Ф. Кусцінскі напісаў нарыс «Лепельскі павет Віцебскай губерні» (на польскай мове), за які атрымаў прэмію часопіса «Вокруг света».

12 сакавіка 1905 г. адбыўся сход прадстаўнікоў гарадскога ўпраўлення з нагоды 100-годдзя надання Лепелю статуса горада, пры гэтым было вырашана хадайнічаць перад адпаведнымі ўстановамі аб адкрыцці ў Лепелі Марыінскага вучылішча. Што датычыцца самога свята — 5 красавіка, яно было перанесена на больш позні час у сувязі з ваеннымі падзеямі на Далёкім Усходзе. Да 100-гадовага юбілею Лепеля (5.04.1805 г. — 5.04.1905 г.) беларускі гісторык Дзмітрый Іванавіч Даўгяла (1868—1942 гг.) напісаў кнігу «Лепель, павятовы горад Віцебскай губерні». Віцебск, 1905.

Вясной 1905 г. пад непасрэдным уздзеяннем рабочага руху пачаўся масавы рэвалюцыйны рух сялянства, накіраваны супраць памешчыкаў і мясцовай царскай адміністрацыі. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ўзмацнілі рэвалюцыйную прапаганду сярод рабочых, сялян і салдат. Вясной 1905 г. у многіх валасцях Лепельскага


Лепель,

уѣздный городъ Витебской губерніи.

Хроника минувшей жизни.

составилъ

Дм. Ив. Довгялло.

ВИТЕБСКЪ.

Губернская Типо-Литографія

1905

Вокладка кнігі Дз. І. Даўгялы «Лепель, павятовы горад Віцебскай губерні»

павета распаўсюджвалася пракламацыя Полацкай арганізацыі РСДРП пад назвай «Да сялян». У красавіку некалькі дзесяткаў экземпляраў яе паліцыя забрала ў сялян, аб чым сведчаць пісьмовыя данясенні мясцовых улад віцебскаму губернатару. 7 красавіка 1905 г. віцебскі губернатар даносіў міністру ўнутраных спраў, што «са студзеня месяца гэтага года да мяне сталі паступаць даносы аб самавольных парубках гуртам сялян прыватнаўласніцкіх лясоў і аб аказанні ўзброенага супраціўлення лясной ахове і чынам паліцыі...»

Масавыя выступленні сялян, якія пакутавалі ад беззямелля і малазямелля, адбываліся восенню 1905 г. у вёсках Свядзіца, Велеўшчына, Востраў, Далікі, Свяда, Гаразянкі.

Кіраўнікамі сялян былі Іван Пшонка, Лук'ян Галоўка, Фёдар Сыган, Аўксенцій Сарока. Яны пераконвалі сялян весці высечку лесу, гаварылі, што лес сялянскі, а не панскі.

Сяляне вёсак Савін Дуб і Закаліўе патрабавалі ад памешчыка, каб ім вярнулі 340 дзесяцін зямлі. Але патрабаванні сялян не былі задаволены, не даў вынікаў і суд з памешчыкамі. Калі ў маёнтак прыехаў землямер, жыхары не дапусцілі да вымярэння межаў, збілі і прагналі яго, а памешчыку сказалі, што зямля павінна належаць ім. Тады з Лепеля прыехаў павятовы спраўнік з нарадам паліцыі. Сяляне з сем'ямі выйшлі на спрэчны ўчастак і заявілі, што ніякія насіллі не дапамогуць, бо яны стаяць за сваё. Спраўнік вымушан быў паехаць ні з чым.

З архіўных дакументаў вядома, што летам 1908 г. сяляне вёсак Заазер'е і Падлобнае самачынна пачалі пасвіць жывёлу ў маёнтку Ворань. Уладальнікі маёнтка выклікалі паліцыю, але сяляне стаялі на сваім, заявіўшы паліцэйскаму прыставу: «Як пасём жывёлу, так і далей пасвіць будзем!» Паліцыя арыштавала некалькі чалавек, сярод якіх быў Іван Падсобны, на думку мясцовых улад, «галоўны зачыншчык беспарадку».

Калі атрад паліцыі вяртаўся ў Лепель, у в. Юркава Сцяна мясцовыя сяляне выйшлі насустрач і хацелі вызваліць арыштаваных, але паліцыя іх разагнала.

Лепельскі павет па сялянскаму руху быў адным з самых актыўных у Віцебскай губерні. У 1905 г. тут было 51 сялянскае выступленне, у 1906 г. — 13, у 1907 — 12.

З 1907 г. на Беларусі пачалі ажыццяўляцца рэформы, ініцыятарам якіх з'яўляўся міністр унутраных спраў П. А. Сталыпін. Яны прадугледжвалі ліквідацыю абшчыннага землеўладання (у беларускім рэгіёне захоўвалася пераважна ў Магілёўскай і Віцебскай губернях), насаджэнне хутарскіх гаспадарак, дзе прыватнаўласніцкія землі размяшчаліся кампактна ў выглядзе асобных адрубаў, перасяленне беззямельных і малазямельных сялян у Сібір і іншыя аддаленыя мясціны. Стварэнне хутарскіх гаспадарак і перасяленчая палітыка фінансавалася сялянскім пазямельным банкам, але ўмовы пазыкі былі разлічаны толькі на багатых і заможных сялян. За 1907—1915 гг. у беларускіх губернях хутаранам было прададзена каля 250 тысяч дзесяцін зямлі. За гэты ж перыяд з Беларусі перасялілася звыш 385 тысяч чалавек. Праўда, падняць гаспадарку на новых месцах змаглі далёка не ўсе, таму кожны дзесяты перасяленец быў вымушаны вярнуцца назад. Сталыпінскія рэформы, як і па ўсёй краіне, садзейнічалі развіццю моцных сялянскіх гаспадарак, але набалелых і вострых праблем тагачаснай вёскі (галоўная — малазямелле) яны, натуральна, вырашыць не змаглі.

Развіццё капіталістычных адносін суправаджалася не толькі ростам прадукцыйнасці працы ў сельскай гаспадарцы, але і ўзмацненнем сацыяльнай дыферэнцыяцыі беларускай вёскі. Павялічыліся праслойкі вясковай беднаты і буржуазіі, змяншалася колькасць серадняцкіх двароў. Напярэдадні першай сусветнай вайны беднота складала каля 70 %, сяляне-сераднякі — 19—20, заможныя сяляне — 10—11 % усяго сялянства.

У 1900—1913 гг. буйная прамысловасць Беларусі найбольш хутка развівалася ў Менску і Віцебску, дзе колькасць рабочых на гэты час павялічылася ўдвая. Новыя адносна буйныя прадпрыемствы з'явіліся ў Гродне, Пінску, Гомелі і іншых гарадах. Аднак у цэлым для Беларусі і ў пачатку XX ст. было характэрна пераважнае размяшчэнне прамысловасці ў сельскай мясцовасці — бліжэй да крыніц сыравіны і больш таннай рабочай сілы.

Прамысловасць Лепеля і яго аколіц у пачатку XX ст. складалася з невялікіх прадпрыемстваў — мукамольні, двух крупадзёрак, тытунёвай фабрыкі, півамедаварнага завода, некалькіх вадзяных млыноў, смалакурань, цагельнага і некалькіх гарбарных заводаў.

На працягу 1911—1912 гг. у Лепелі друкавалася грамадска-эканамічная газета «Лепельский вестник», у 1913 г. — часопіс «Известия Лепельского общества сельского хозяйства».

У 1860-ыя гады ў Лепелі было адкрыта 2-класнае павятовае вучылішча, у якім у

Млын. 1910 г.

Базарная плошча. 1912 г.

першы навучальны год займалася 11 вучняў.

1 ліпеня 1878 г. Лепельскае павятовае вучылішча было пераўтворана ў гарадское 2-класнае вучылішча (у памяшканні павятовага вучылішча, на рагу паміж вул. імя Горкага і вул. Савецкай, у былым дваранскім).

З прычыны высокай платы за навучанне дзеці сялян у сярэдняй школе ў канцы 90-ых гадоў складалі толькі 6,5 працэнта. У далейшым гэты працэнт знікаўся з прычыны сумна вядомага цыркуляра 1887 г., якім забаранялася прымаць у гімназіі «дзяцей фурманаў, прачак, дробных гандляроў і да т. п.».

У 70—80-ыя гады ў Пінску, Менску і Магілёве былі адкрыты рэальныя вучылішчы, якія давалі сярэднюю адукацыю з прыродазнаўчым і тэхнічным ухілам.

У 1888 г. з Невеля ў Лепель было пераведзена яўрэйскае 2-класнае пачатковае мужчынскае вучылішча з рамесніцкім класам. Увосень 1897 г. была адкрыта Лепельская жаночая аднакласная царкоўнапрыходская школа. У 1898 г. жаночая змена, якая існавала пры мужчынскім прыходскім вучылішчы 65 год (з 1833 г.), была выдзелена ў самастойнае вучылішча.

У 1899 г. у Лепелі адкрылася яўрэйскае жаночае народнае аднакласнае вучылішча. Двухкласнае гарадское вучылішча было пераўтворана ў 3-класнае. За час існавання яго з 1878 г. закончылі 1748 вучняў, у сярэднім па 88 чалавек у год.

Удзельная вага пісьменных людзей на Беларусі і ў канцы XIX ст. заставалася невысокай — усяго 25,7 працэнта. У вёсцы яна зніжалася да 16 працэнтаў.

Змены, што адбыліся ў грамадска-палітычным жыцці краіны ў сувязі з рэвалюцыяй 1905—1907 гг., буржуазныя пераўтварэнні ў ходзе сталыпінскіх рэформ выклікалі неабходнасць істотнага абнаўлення і пашырэння сеткі навучальных устаноў. Царкоўнапрыходскія школы паступова замяняліся народнымі вучылішчамі. Колькасць вучняў у іх з 1905—1914 гг. павялічылася амаль у тры разы і дасягнула 305 тыс. Хутка расла колькасць гімназій і рэальных вучылішчаў.

У 1904 г. у Лепелі адкрылася аднакласная мужчынская царкоўнапрыходская школа. Пасля 1905 г. было адкрыта Лепельскае 4-класнае Марыінскае жаночае вучылішча (прагімназія).

У Лепельскім павеце ў 1910-ых гадах працавала каля 20 школ, з іх вышэйшых пачатковых — 4. У Лепелі дзейнічалі мужчынскае вышэйшае пачатковае 4-класнае вучылішча, жаночае Марыінскае вучылішча, мужчынскае і жаночае прыходскія вучылішчы, царкоўнапрыходскае вучылішча, народнае вучылішча. Ва ўсіх школах горада навучалася 400 вучняў.

Вялікі ўклад у развіццё навукі ў Беларусі ўнеслі ў канцы XIX — пачатку XX ст. ураджэнец Лепельшчыны Станіслаў Адамавіч Грабніцкі (1857—1941 гг.), вучоны ў галіне садоўніцтва; Ганна Баляславаўна Місуна (1869—1922 гг.), першая жанчына-геолаг у Беларусі.

Аб чым паведаміла анкета

Расправа

Восенню 1905 г. у Валосаўскай воласці Барысаўскага павета адбыўся сялянскі бунт супраць памешчыка Іванова. Ва ўрочышчы «Дзяржаны», якое размешчана непадалёку ад в. Свяда, сяляне навакольных вёсак секлі лес, які па праву належаў ім, але быў захоплены памешчыкамі.

Прыбыўшыя стражнікі жорстка расправіліся з сялянамі, а Івана Андрэевіча Пшонку, як зачыншчыка беспарадку, збілі прыкладамі, арыштавалі, адвезлі ў Барысаўскую павятовую турму, дзе ён прасядзеў да 12 сакавіка 1906 г.

У гэты дзень міністр унутраных спраў разгледзеў у Мінску справу «ўтрымліваемага пад аховай у Барысаўскай турме селяніна Івана Пшонкі, абвінавачваемага ў падбухторванні сялян да аграрных беспарадкаў і ў распаўсюджванні шкодных слухаў», і пастанавіў: «выслаць Пшонку на жыхарства ў адзін з аддаленых паветаў Валагодскай губерні (горад Каднікаў) пад публічны нагляд паліцыі на чатыры гады».

У рапарце каднікаўскага павятовага спраўніка валагодскаму губернатару ад 19 мая 1906 г. чытаем: «Селянін Іван Пшонка прыбыў у горад Каднікаў і падпарадкаван публічнаму нагляду паліцыі». У гэты ж дзень быў складзены спіс (анкета) аб Іване Андрэевічу Пшонку. Вельмі характэрнымі для буржуазна-памешчыцкай Расіі і разам з тым сумнымі былі адказы на пытанні анкеты. «Званне — селянін. Нарадзіўся ў в. Рудня Валосаўскай воласці, 29 год, непісьменны, пад судом не быў, жанаты на Ефрасінні Сцяпанавай, мае дзяцей: Сямёна — 6 год, Марфу — 4 гады, Аляксандра — паўгода».

На пытанне, ці мае ўласныя сродкі для існавання, значыцца такі адказ: «Нічога не мае». З анкеты даведваемся, што Пшонка займаўся земляробствам, што яго бацькі не маюць ніякага багацця.

Такім чынам, Іван Андрэевіч стаў палітычным ссыльным. Але ён не згадзіўся з прызнаннем яго вінаватым і з суровай мерай пакарання і падаў у міністэрства ўнутраных спраў прашэнне аб пераглядзе яго справы. І 8 ліпеня 1906 г. тэрмін ссылкі быў скарочаны да аднаго года.

Шмат выпрабаванняў выпала на долю сям'і Пшонкі. Яго жонка з трыма малалетнімі дзецьмі перабівалася, як магла. Харчавалася сям'я ў асноўным за кошт падаяння ад сялян в. Свяда.

З вялікай радасцю сустрэў Іван Андрэевіч і яго сям'я вестку, што «з пятага снежня 1906 г. яго накіроўваюць у месца прыпіскі — в. Рудня Валосаўскай воласці».

У 1927 г. Лепельская раённая камісія па правядзенні святкавання X гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі запрасіла ў Лепель «на раённае пасяджэнне ўдзельнікаў кастрычніцкага пераваротy, грамадзянскай вайны, а таксама ўдзельнікаў партызанскай барацьбы ў перыяд нямецкай і белапольскай акупацыі». Сярод шаноўных гасцей быў і Іван Андрэевіч Пшонка.

І. Ю. Януш

Дакументы сведчаць

1865 г. сакавіка 10. — Пратакол пасяджэння Віцебскай губернскай па сялянскіх справах канцылярыі аб вяртанні ў в. Сяргеяўшчызну Лепельскага павета сялян, якія прымусова былі пераселены памешчыкам Рылевічам у в. Зялёны Востраў.

Слушали: Отношение Лепельского уездного мирового съезда от 7 января за № 10, при котором, препровождая копии с протоколов мирового съезда от 3 ноября 1864 г. и 4 января с. г., копию акта мирового посредника от 18 ноября 1864 г. относительно наделения землею крестьян селения Зеленый Остров и план надела, просит по рассмотрении этих бумаг возвратить их мировому съезду.

При рассмотрении означенного дела оказалось, что при поверке мировым съездом уставной грамоты на селение Зеленый Остров, принадлежащее к имению малолетних помещиков Рылевичей, крестьяне этого селения в числе 6 домохозяев, между прочим, заявили, что покойный помещик весною в 1858 и 1859 гг. переселил их из д. Сергеевщизны в д. Зеленый Остров против их желания, и что в настоящее время они хотят возвратиться на прежнее место, так как в д. Зеленый Остров мало земли и земля эта худшего качества, чем в д. Сергеевщизне. Помещица же Рылевич заявила, что переселение это состоялось гораздо ранее, чем указывают крестьяне, и что она имеет доказательства. Вследствие сего мировой съезд поручил местному мировому посреднику проверить заявление крестьян о переселении их из д. Сергеевщизны и, если окажется, что переселение это совершено после издания высочайшего повеления 4 ноября 1858 г. и без соблюдения правил, предписанных этим повелением, то отобранную от них землю в д. Сергеевщизне возвратить.

Из произведенного мировым посредником исследования видно, что в селении Зеленый Остров 49 душ крестьян, которые получили в надел 125 дес. 1600 саж. удобной и 52 дес. 78 саж. неудобной (земли). Из числа этих крестьян 6 домохозяев: Семен Сидоров, Клементий Емельянов, Макар Иванов и Кондратий Павлов переселены владельцем Рылевичем из д. Сергеевщизны в марте месяце 1858 г., первые два в одну усадьбу, крестьяне же Степан Евгениев и Федор Николаев переселены весною 1859 г., что подтверждается показаниями спрошенных посторонних свидетелей и шляхты, арендующих землю переселенных крестьян. При переселении крестьян в Зеленый Остров 4 домохозяевам были приготовлены владельцем одни только ветхие избы без сеней и кровлей, а пятому — Федору Николаеву — никаких построек приготовлено не было, которые же имеет ныне, то приобрел сам. Действительность этого доказывается тем, что в настоящее время из переселенных крестьян Степан Евгениев имеет только одну совершенно ветхую избу длиной и шириной 2 саж. и из старого гнилого дерева, приобретенный им на свой счет сарай для содержания скота. Семен Сидоров и Клементий Емельянов кроме изб с сенями никаких других построек не имеют. При переселении крестьян из д. Сергеевщизны владелец Рылевич, не находя усадьбы для одного из переселяющихся домохозяев — крестьянина селения Зеленый Остров Леона Кириллова, перегнал из собственной его усадьбы в конец селения на пустошь, в ветхую с сенями избу, который и ныне кроме этих строений никаких более не имеет, и даже нажатый им овес помещается в огороде, сложенный в переплете. На шнуре, который принадлежит его усадьбе, высевает озимого хлеба от 10 до 17 гарнцев, ни лошади, ни рогатого скота он не имеет. Из других этих домохозяев ни один не имеет овинов для молотьбы хлеба, и вообще в этом селении строения крестьянские совершенно ветхи и избы тесны. Так как крестьяне Степан Евгениев и Федор Николаев окончательно перешли из селения Сергеевщизны в 1859 г. и без соблюдения со стороны владельца Рылевича правил, изложенных в высочайшем повелении 4 ноября 1858 г., а потому имеют право возвратиться на свои усадьбы в селение Сергеевщизну; положение остальных крестьян, переселенных из селения Сергеевщизны, при дурном качестве надела, при тесноте изб, недостатке необходимых хозяйственных строений так бедственно, что мировой посредник просит Лепельский мировой съезд обратить особенное внимание на крайне стеснительное положение крестьян селения Зеленый Остров.

Вследствие сего мировой съезд, находя: 1) что надел крестьян селения Зеленый Остров простирается только до 125 дес. 1600 саж. удобной земли, что на каждого из 49 душ составит только 2 дес. 1355 саж.; при таком незначительном количестве удобной земли она весьма неудовлетворительна по качеству своему и, будучи расположена среди болот и мшар, не может быть производительна; в 1858 и 1859 гг. покойный помещик Рылевич в то время, когда все дворянство Витебской губ. заявляло о желании улучшить быт здешних крестьян, переселил в Зеленый Остров всех крестьян, находившихся в д. Сергеевщизна, в числе 6 дворов; 4) четыре крестьянских двора были переселены весною 1858 г., а остальные 2 — весною же 1859 г., при этом некоторые из переселенцев получили одни только ветхие избы, другие же не получили и того; землю, которою пользовались крестьяне в селении Сергеевщизне, владелец отдал в аренду шляхте; будучи сбиты в кучу на малом клочке

неплодородной земли, крестьяне в продолжение 6 лет пришли в совершенно нищенское состояние. При скудном урожае, далеко не достающем на прокормление их семейств, крестьяне не только не могли исправить своих до крайности ветхих построек, но на покрытие различных сборов должны были продать и часть своего скота, чрез что они пришли к совершенному обеднению, а потому мировой съезд, находя положение крестьян Зеленого Острова клонящимся к совершенному разорению, полагает единственным и справедливым средством к улучшению их быта обратное переселение 6 дворов в селение Сергеевщизну с соответственным вознаграждением со стороны владелицы за понесенные крестьянами убытки. Вследствие сего поручить мировому посреднику сделать зависящее распоряжение о переселении тех 2 дворов обратно в Сергеевщизну, которые были перегнаны после издания высочайшего повеления 4 ноября 1858 г., и о взыскании с г-жи Рылевич убытков, понесенных крестьянами во время переселения. Об остальных же 4 дворах крестьян, переселенных в Зеленый Остров весною в 1858 г., просить губернское присутствие ходатайствовать у г-на главного начальника края дозволения перевести их обратно в д. Сергеевщизну, так как в противном случае мировой съезд не может принять на себя ручательство в исправном взносе крестьянами селения Зеленый Остров выкупных платежей, как бы ни был незначителен их размер.

Постановили: Рассмотрев вышепрописанные обстоятельства, губернское присутствие, совершенно разделяя мнение Лепельского мирового съезда об улучшении быта крестьян селения Зеленый Остров, пришло к заключению, что единственным к этому средством было бы обратное переселение 6 дворов в селение Сергеевщизну, переведенных оттуда покойным помещиком Рылевичем в 1858—1859 гг. Так как о переводе 2 дворов в селение Сергеевщизну, переселенных помещиком после издания высочайшего повеления 4 ноября 1858 г., мировым съездом сделано надлежащее распоряжение, то было бы весьма обидно для 4 остальных дворов, понесших равномерно убытки и находящихся ныне в таком же бедственном состоянии, оставить в селении Зеленый Остров потому только, что переселение их совершилось весною 1858 г., несколько ранее первых 2 дворов, получающих обратно прежние свои усадебные и полевые земли в д. Сергеевщизне.

Вследствие сего губернское присутствие полагает: представить г-ну главному начальнику края копию настоящего постановления и покорнейше просить, не признает ли е.в.п. возможным разрешить остальных 4 домохозяев, крестьян селения Зеленый Остров, переселенных туда помещиком Рылевичем весною 1858 г., перевести обратно в селение Сергеевщизну, так как этот способ признается губернским присутствием единственным для улучшения их быта, и при разрешении означенного обратно переселения в д. Сергеевщизну губернское присутствие полагает, что за понесенные крестьянами убытки они должны получить вознаграждение от помещицы в размере, который должен быть определен мировым съездом.

Секретарь: (подпіс неразборлівы)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.
Ф. 2654. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 2—10. Завераная копія. Рукапіс.

1866 г. лютага 3. — Данясенне падпалкоўніка Корпуса жандараў шэфу Корпуса жандараў аб нястачы харчавання ў сялян Віцебскай губ.

Секретно

Урожай озимого хлеба в Витебской губ. в минувшем 1865 г. был вообще плохой вследствие несвоевременного посева и то лишь незначительной части полей, так что на возвышенных только местностях озимый хлеб оказался посредственный, на низменных же местностях хлеб или вовсе не взошел, или же оказался до того редок, что землевладельцы едва ли возвратили то количество семян, какое употреблено было ими на посев.

Столь же неудовлетворительный урожай озимого хлеба в Витебской губ. был и в 1864 г.

...Из доставленных мне начальниками жандармских управлений письменных сведений оказывается, что крестьяне — собственники во многих уездах Витебской губ. действительно терпят крайний недостаток в продовольствии.

...В Лепельском у. крайний недостаток в продовольствии повсеместный, исключая местечки. Местными властями до сих пор никаких мер к предупреждению голода не принято, напроти того, крестьяне заявили, что их заставляют теперь же возвратить взятый ими заимообразно на посев хлеб из общественных магазинов. Большая часть крестьян приготовляет для себя хлеб, употребляя для этого 1/6 часть муки и 5/6 мякины; даже оставшийся от умолота колос они сушат, толкут и мешают с мукой и мякиной. Я имел образчик приготовленного таким образом хлеба. Трудно вообразить, как крестьяне в состоянии глотать этот ком колючей мякины. Некоторые крестьяне говорят, что им обещают выдать заимообразно хлеб из общественных магазинов, но не раньше марта и даже апреля месяцев...

Подполковник ТУРЦЕВИЧ

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 109,4 эксп. 1866. Спр. 196. Арк. 1—5. Арыгінал. Рукапіс.

Школьная справа на Лепельшчыне ў XIX — пачатку XX ст.

У канцы XVIII—пачатку XIX ст. у Расійскай імперыі (у тым ліку і ў Беларусі) адбываўся паступовы пераход ад адукацыі, якая знаходзілася ў руках царквы, да адукацыі свецкай.

У перыяд з 1772 па 1803 год, нягледзячы на некаторыя захады расійскага ўрада, адукацыя заставалася ў руках царквы. Далучэнне зямель былога Вялікага княства Літоўскага да Расійскай імперыі не ўнесла асаблівых перамен у сістэму адукацыі дзяцей з магнацкіх сем'яў. Як і раней, яны працягвалі атрымліваць хатнюю адукацыю. Для іх навучання запрашалі лепшых настаўнікаў па розных прадметах, гувернёраў-іншаземцаў. У гэтым асяроддзі размаўлялі і перапісваліся паміж сабой на французскай мове. Абавязкова вучылі лацінскую, нямецкую і англійскую мовы. Значна горш ведалі польскую або рускую. Дапаўнялі сваю адукацыю падарожжамі па Еўропе, дзе, калі была патрэба, наймалі вядомых прафесараў.

Дзеці сярэдняй шляхты заканчвалі вучылішчы і гімназіі, затым вучыліся ў Віленскім універсітэце або ва універсітэтах Масквы, Пецярбурга, Кіева, Дзерпта. Вучылішчы і гімназіі ў асноўным утрымліваліся на грошы бацькоў і за кошт грошай, якія ахвяраваліся на адукацыю багатымі людзьмі.

Для большасці дробнапамеснага і беспамеснага шляхецтва платныя вучылішчы і гімназіі былі недаступнымі. Доўгі час іх дзеці атрымлівалі пачатковую адукацыю ў парафіяльных школах, якія існавалі пры касцёлах, а таксама ў каталіцкіх і уніяцкіх манастырах. Школы ўтрымліваліся не толькі за кошт фундатараў, але і на сродкі манастыроў або духавенства.

Дзеці аднадворцаў і мяшчан вучыліся таксама, як і дзеці беднай шляхты, у парафіяльных, ланкастэрскіх школах, бо гэта не патрабавала значных затрат. Звярталіся і да паслуг танных хатніх настаўнікаў — «гувернёраў», «шпектараў», такіх жа бедных, як і вучні.

Дзяўчаты-шляхцянкі атрымлівалі адукацыю пры манастырах, пазней — у прыватных жаночых пансіёнах.

Менш за ўсё было навучальных устаноў для сялян. Многія з памешчыкаў не толькі не непакоіліся аб адукацыі сваіх сялян, але нават, калі і былі паблізу іх маёнткаў школы, забаранялі сялянам аддаваць туды дзяцей. І толькі некаторыя заможныя памешчыкі адчынялі школы.

Першая трэць XIX ст. (1803—1831) сталася пераходным перыядам, у які навучальныя ўстановы былі падпарадкаваны вучэбным акругам.

Павялічылася колькасць вучылішчаў, адчыніліся гімназіі, прыватныя пансіёны, ланкастэрскія школы, але усё ж значная частка дзяцей шляхты і духавенства ат-

рымлівала адукацыю ў парафіяльных (прыходскіх) школах пры касцёлах і манастырах.

У 1836 г. у Лепелі было адчынена ланкастэрскае вучылішча (па прозвішчу англійскага педагога Джозэфа Ланкастэра (1778—1838). Па яго метаду адзін настаўнік працаваў з 40—60 вучнямі і мог за кароткі час (некалькі месяцаў) пазнаёміць дзяцей з пачаткамі хрысціянскага вучэння, навучыць пісьму, чытанню і асновам арыфметыкі. Дзеля гэтага на пэўных этапах навучання вялікі клас падзяляўся на групы, якія складаліся з выдатнікаў і адстаючых, і першыя дапамагалі тым, каму навукі даваліся цяжэй. У 1858 г. ланкастэрскія школы ў Беларусі былі зачынены.

У 1832—1860 гг. пераважае свецкая адукацыя над царкоўнай. У той час у Лепелі існавалі ніжэйшыя навучальныя ўстановы:

Дваранскае 5-класнае павятовае вучылішча з 9 выкладчыкамі і 34 навучэнцамі.

У прыходскім аднакласным вучылішчы з 30 хлопчыкамі займаліся тры выкладчыкі.

У той час дзейнічала казённае 2-класнае яўрэйскае вучылішча першага разраду, дзе з адным выкладчыкам займаліся 4 вучні, і 11 дамашніх яўрэйскіх школ (меламбдаў) з 31 вучнем і 11 выкладчыкамі.

У Лепельскай школе кантаністаў займаліся 50 хлопчыкаў з 5 выкладчыкамі.

У Лепельскім павеце у 1863/64 навучальным годзе працавала Старалепельская сельская школа (17 вучняў і адзін выкладчык), а таксама валасныя вучылішчы сялян-уласнікаў у Несіне, Камені, Губіне, Сушы, Пышне, Забалацці, Ворані.

У другой палове XIX ст. пераважалі царкоўнапрыходскія школы і школы граматы. Выразна пачалі адрознівацца гэтыя два тыпы школ з 1884 г. Згодна з правіламі, зацверджанымі для школ граматы, гэта былі школы з 2—3-месячным тэрмінам навучання. Настаўнічалі ў іх сяляне, што скончылі 2-класную царкоўнапрыходскую школу, або дзячкі. Для гэтых школ былі выдадзены «Пачатковыя ўрокі Закона Божага», Буквар царкоўнаславянскай мовы, Евангелле, Часаслоў, Псалтыр. Галоўным для школ граматы было не столькі навучанне грамаце, колькі выхаванне богабаязных падданых. Вось менавіта такія школы атрымалі распаўсюджанне на Беларусі. І нават у заходніх губернях, сярод насельніцтва якіх значную колькасць складалі каталікі, праваслаўныя царкоўныя школы да канца XIX ст. займалі да 70 працэнтаў у сетцы пачатковых школ.

У 1882 г. у Лепельскім павеце функцыяніравалі **народныя вучылішчы**:

Лепельскае Франопальскай воласці, адкрыта ў 1863 г. Размяшчалася ў грамадскім будынку. На ўтрыманне вучылішча быў адпушчаны 181 рубель. Вучняў было 45 хлопчыкаў.

Настаўнік Сільвестр Рыгоравіч Кулягоў, які скончыў курс у Лепельскім павятовым вучылішчы, меў званне гарадскога прыходскага настаўніка. Аклад 150 руб. і кватэра. Праваслаўны законавучыцель протаіерэй Андрэй Міхайлавіч Юркевіч. Аклад 25 руб.

Вораньскае Вораньскай воласці заснавана ў 1864 г., размяшчалася ў казённым доме. На ўтрыманне вучылішча было адпушчана 77 руб. з дзяржаўнага казначэйства, 198 руб. — ад воласці. Займалася 30 хлопчыкаў і тры дзяўчынкі. Настаўніца Марыя Іванаўна Нікіфаровіч, праваслаўная, скончыла курс у Віцебскім вучылішчы дзяўчат духоўнага звання. Аклад 150 руб. і кватэра.

Праваслаўны законавучыцель святар Дзмітрый Нікіфаравіч Гняздоўскі закончыў курс у Полацкай духоўнай семінарыі. Аклад 25 руб.

Гарадчэвіцкае Гарадчэвіцкай воласці. Заснавана ў 1864 г., размяшчалася ў грамадскім будынку. На ўтрыманне было адпушчана 95 руб. з дзяржаўнага казначэйства, 1100 руб. — ад воласці. Вучняў: 39 хлопчыкаў і 1 дзяўчынка.

Настаўнік Уладзімір Восіпавіч Ігнатовіч, праваслаўны, меў званне сельскага настаўніка пачатковых народных вучылішчаў. Аклад 150 руб.

Праваслаўны законавучыцель святар Георгій Іванавіч Бяляўскі, скончыў курс у Полацкай духоўнай семінарыі. Аклад 25 руб.

Каменскае Каменскай воласці, заснавана ў 1865 г., размяшчалася ў грамадскім будынку. Было адпушчана 55 руб. з дзяр-

жаўнага казначэйства і 120 рублей з воласці. Вучылася 38 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак.

Настаўніца Марыя Феафілаўна Бржэзінская, праваслаўная, скончыла курс у Віцебскай жаночай гімназіі. Аклад 150 руб. і кватэра.

Праваслаўны законавучыцель святар Феафіл Іванавіч Бржэзінскі, скончыў курс у Полацкай духоўнай семінарыі. Аклад 25 руб.

Несінскае Несінскай воласці, заснавана ў 1865 г., размешчана ў грамадскім будынку. З дзяржаўнага казначэйства было адпушчана 125 руб. Вучняў было 29 хлопчыкаў.

Настаўнікам быў Патап Несцеравіч Саўчонак, праваслаўны, меў званне настаўніка сельскага пачатковага народнага вучылішча. Аклад 200 руб. і кватэра.

Праваслаўны законавучыцель Андрэй Фёдаравіч Счансновіч, скончыў курс Полацкай духоўнай семінарыі. Аклад 25 руб.

Пышнянскае Пышнянскай воласці, заснавана ў 1862 г., размешчана ў грамадскім будынку. На ўтрыманне вучылішча было адпушчана 102 руб. з казначэйства і 100 руб. ад воласці. Вучняў: 36 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак.

Настаўнік Тарас Герасімавіч Усачоў, праваслаўны, скончыў курс у Полацкай настаўніцкай семінарыі ў званні настаўніка пачатковых вучылішчаў. Аклад 150 руб. і кватэра.

Праваслаўны законавучыцель Мікалай Бакарэвіч, скончыў курс у Полацкай духоўнай семінарыі. Аклад 25 руб.

У 1889 г. у Лепельскім павеце працавалі пачатковыя народныя вучылішчы:

Пышнянскае пачатковае народнае вучылішча. У ім займалася 30 хлопчыкаў і адна дзяўчынка. Настаўнік Аляксей Гаўрылавіч Гаўрылаў, закончыў курс Прыб. настаўніцкай семінарыі, праваслаўны, на службе і на пасадзе з 15 лютага 1889 г.

Законавучыцель праваслаўны Аляксандр Тараткевіч, скончыў курс Віцебскай духоўнай семінарыі. На службе з 1880 г., на пасадзе з 1 кастрычніка 1881 г.

Лепельскае пачатковае народнае вучылішча Франопальскай воласці. Займалася 35 хлопчыкаў.

Настаўнік Сільвестр Рыгоравіч Куляшоў, меў званне настаўніка гарадскога прыходскага вучылішча, на службе з 1872 г., на пасадзе з 1 сакавіка 1878 г. Законавучыцель праваслаўнага веравызнання Піліп Лузгін, закончыў духоўную семінарыю, на службе і пасадзе з 1 жніўня 1888 г.

Гарадчэвіцкае пачатковае народнае вучылішча. У ім займалася 31 хлопчык і 2 дзяўчынкі. Заняткі вёў настаўнік Іван Станіслававіч Жылінскі, які закончыў настаўніцкую семінарыю. На службе з 1877 г., на пасадзе з 1 верасня 1887 г.

Законавучыцель праваслаўнага веравызнання Васіль Савіцкі, скончыў курс Віцебскай духоўнай семінарыі. На службе і на пасадзе з 1.10.88 г.

Каменскае пачатковае народнае вучылішча. Займалася 41 хлопчык і 3 дзяўчынкі. Настаўнік Фёдар Іванавіч Параменскі, скончыў курс Віцебскай духоўнай семінарыі, праваслаўнага веравызнання, на службе і на пасадзе з 1.12.1888 г.

Праваслаўны законавучыцель Феафан Бржэзінскі, закончыў курс Полацкай духоўнай семінарыі. На службе з 1860 г., на пасадзе з 1.09.1873 г.

Вораньскае пачатковае народнае вучылішча. Вучняў: 27 хлопчыкаў. Настаўнік Іван Пятровіч Вайцяховіч, скончыў настаўніцкую семінарыю, веры праваслаўнай, на службе і на пасадзе з 1 верасня 1888 г. Законавучыцель праваслаўнага спавядання — вакансія.

Несінскае пачатковае народнае вучылішча. Вучняў: 31 хлопчык, 5 дзяўчынак. Настаўніца Ганна Паўлаўна Багдановіч, скончыла жаночае духоўнае вучылішча, праваслаўнай веры, на службе з 1876 г., на пасадзе з 1 верасня 1887 г.

Законавучыцель праваслаўнага спавядання святар Андрэй Счансновіч, скончыў курс Полацкай духоўнай семінарыі. На службе з 1856 г., на пасадзе з 1.09.1865 г.

У 1889 г. існавала **Лепельскае яўрэйскае аднакласнае з падрыхтоўчым** класам пачатковае вучылішча. У ім займалася 46 хлопчыкаў. Загадчыкам працаваў Давід Рыгоравіч Мізлін, які сам скончыў пачатковае яўрэйскае вучылішча. На службе з 1866 г., на пасадзе з 1 жніўня 1888 г. Памочнікам працаваў Ісак Шварцоўскі,

які закончыў курс Віленскага яўрэйскага настаўніцкага інстытута. На пасадзе з 1 жніўня 1888 г.

Настаўнік падрыхтоўчага класа Арон Гальперн, закончыў курс яўрэйскага настаўніцкага інстытута, на службе з 1886 г., на пасадзе з 1 жніўня 1888 г., усе тры іудзейскай веры.

У пачатку XX ст. у Лепелі і павеце дзейнічалі разнастайныя навучальныя ўстановы. **У 1910 г. працягвала работу Лепельскае гарадское 4-класнае вучылішча**. Настаўнік-інспектар — Міхаіл Венядзіктавіч Садоўскі, праваслаўны, скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут, на службе з 1.10.1890 г., на пасадзе з 1.01.1904 г. Законавучыцель праваслаўнага спавядання — протаіерэй Піліп Якаўлевіч Лузгін, на пасадзе з 1 чэрвеня 1896 г. Рымска-каталіцкі ксёндз Павел Ксавер'евіч Карповіч, на пасадзе з 11.10.1905 г.

Настаўнікі: Аляксандр Мікалаевіч Загрэцкі, праваслаўны, скончыў Віцебскую духоўную семінарыю, на службе і пасадзе з 1.10.1909 г.

Марфа Густаваўна Вегнер, праваслаўная, скончыла Віцебскую Аляксееўскую жаночую гімназію, на службе і на пасадзе з 11.10.1909 г.

Міхаіл Якаўлевіч Высоцкі, праваслаўны, закончыў настаўніцкую семінарыю, на службе з 1.09.1905 г., на пасадзе з 6.10.1908 г.

Іншыя навучальныя ўстановы горада Лепеля і павета ў 1910 г.

Лепельскае мужчынскае прыходскае вучылішча, 1910 г.

Законавучыцель — праваслаўны святар Іван Георгіевіч Смірноў, на пасадзе са жніўня 1902 г. Ксёндз рымска-каталіцкага спавядання, дэкан Павел Ксавер'евіч Карповіч, на пасадзе з 1.10.1905 г. Настаўнік Андрэй Андрэевіч Шахлевіч, праваслаўны, скончыў настаўніцкую семінарыю, на службе з 1.09.1897 г., на пасадзе з 1.1907 г.

Настаўніца Ганна Фамінічна Каранкевіч, праваслаўная, скончыла Полацкае Ефрасіннеўскае жаночае духоўнае вучылішча, на службе і на пасадзе з 1.10.1909 г.

Лепельскае жаночае прыходскае вучылішча, 1910 г.

Законавучыцель праваслаўны Іван Георгіевіч Смірноў. Законавучыцель рымска-каталіцкай веры, дэкан Павел Ксавер'евіч Карповіч.

Настаўніца Іна Аляксандраўна Карэйша, праваслаўная, скончыла Віцебскую жаночую гімназію, на службе з 15.01.1903 г., на пасадзе з 1.09.1908 г.

Соф'я Канстанцінаўна Касецкая, праваслаўная, скончыла Ефрасіннеўскае жаночае вучылішча, на службе і на пасадзе з 1906 г. (настаўніца рукадзелля).

Настаўнік спеваў — з мужчынскага прыходскага вучылішча Андрэй Андрэевіч Шахлевіч, на пасадзе з 1907 г.

Лепельскае яўрэйскае пачатковае з падрыхтоўчым і рамесным класамі вучылішча, 1910 г.

Загадчык Самуіл Беркавіч Ляхавіцкі, іудзей, скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут, на службе з 1891 г., на пасадзе з 22.08.1903 г.

Настаўнік Давід Гіршавіч Левітан, іудзей, мае званне настаўніка пачатковых вучылішчаў, на службе і на пасадзе з 1.07.1907 г.

Настаўнік падрыхтоўчага класа — Лейба Мордух Бядзінскі, іудзей, скончыў Віленскі яўрэйскі настаўніцкі інстытут, на службе і на пасадзе з 1.09.1908 г.

Майстар — настаўнік слясарна-рамонтных спраў Моўша-Зуса Яўгеній Вайнман, іудзей, на пасадзе з 25.02.1908 г.

Урач — Ашэр Арон Фраімавіч Гельфанд, іудзей, скончыў Юр'еўскі універсітэт, на пасадзе з 11.02.1909 г.

Лепельскае яўрэйскае народнае жаночае вучылішча, 1910 г.

Загадчык — настаўнік Давід Меер Елін, іудзей, меў званне дамашняга настаўніка, на службе і на пасадзе з 1905 г.

Лепельскае 4-класнае Марыінскае жаночае вучылішча з прафесіянальным аддзяленнем, 1910 г.

Загадчыца — настаўніца Таццяна Васільеўна Акімава, праваслаўная, скончыла Віцебскую Марыінскую жаночую гімназію, на службе з 2.10.1870 г., на пасадзе — з 1.07.1906 г.

Законавучыцель — праваслаўны свя-

тар Андрэй Фёдаравіч Цытовіч, на пасадзе з 11.08.1906 г.

Настаўніцы: гісторыі, геаграфіі і чыстапісання — Аляксандра Дзянісаўна Любамудрава, праваслаўная, скончыла Царскасельскае жаночае вучылішча духоўнага ведамства, мела званне дамашняй настаўніцы, на службе з 1.09.1903 г., на пасадзе з 11.08.1806 г.;

арыфметыкі і геаметрыі — Алена Іосіфаўна Бекарэвіч, праваслаўная, скончыла Магілёўскае жаночае вучылішча духоўнага ведамства, мела званне дамашняй настаўніцы, на службе з 1.09.1901 г., на пасадзе з 11.08.1906 г.;

французскай і нямецкай мовы — Ефрасіння Нілаўна Сярэбранікава, праваслаўная, скончыла Віцебскую Марыінскую жаночую гімназію, мела званне дамашняй настаўніцы, на службе і пасадзе з 1.10.1909 г.;

рукадзелля — Феадосія Дзмітрыеўна Квяткоўская, праваслаўная, скончыла курсы кройкі ў С.-Пецярбургу, на сл. з 9.09.1905 г., на пасадзе з 6.08.1909 г.;

рускай мовы і малявання — Алена Мікалаеўна Лузгіна, праваслаўная, скончыла Віцебскую Марыінскую жаночую гімназію, мела званне дамашняй настаўніцы, на службе і пасадзе з 11.01.1907 г.;

настаўнік спеваў — Андрэй Андрэевіч Шахлевіч, праваслаўны, скончыў Панявежыскую настаўніцкую семінарыю, на службе з 1.09.1897 г., на пасадзе з 16.10.1909 г.;

законавучыцель іудзейскай веры — Самуіл Барысавіч Ляхавіцкі, іудзей, скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут, на службе з 24.08.1891 г., на пасадзе — з 1.09.1909 г.

Спіс царкоўнапрыходскіх школ г. Лепеля і павета, 1910 г.

Лепельская мужчынская царкоўнапрыходская школа

Загадчык — саб.(орны) прот.(аіерэй) Піліп Лузгін.

Законавучыцель і настаўнік — дыякан Віктар Аляксандравіч Цыпкевіч.

Лепельская жаночая царкоўнапрыходская школа

Загадчык і законавучыцель — свяшчэннік Андрэй Цытовіч, скончыў духоўную семінарыю.

Настаўніца Марыя Іванаўна Нарбут, скончыла Ефрасіннеўскае жаночае вучылішча.

Царкоўнапрыходскія школы ў Лепельскім павеце, 1910 г.

Верабская царкоўнапрыходская школа Франопальскай воласці

Загадчык і законавучыцель — свяшчэннік Андрэй Цытовіч. Настаўнік — Павел Высоцкі.

Губінская царкоўнапрыходская школа Каменскай воласці

Загадчык і законавучыцель — свяшчэннік Іван Камароў.

Настаўніца — Лідзія Марцінаўна Снарская, мае званне настаўніцы.

Памочніца настаўніцы — Марыя Марцінаўна Снарская, скончыла 4 класы Тадулінскага жаночага вучылішча.

Горацкая царкоўнапрыходская школа Гарадчэвіцкай воласці

Загадчык і законавучыцель — святар Стэфан Шыркевіч. Настаўніца Аляксандра Бяляўская, скончыла Ефрасіннеўскае жаночае вучылішча.

Гарадзецкая царкоўнапрыходская школа Франопальскай воласці

Загадчык і законавучыцель — святар Андрэй Цытовіч. Настаўнік Антон Алейнікаў, меў званне настаўніка.

Забалацкая царкоўнапрыходская школа Забалацкай воласці

Загадчык і законавучыцель — святар Аўксенцій Латышэўскі. Настаўнік Хрыстафор Стафанавіч Сцяпук, меў званне настаўніка.

Каменская царкоўнапрыходская школа

Загадчык і законавучыцель святар Георгій Коўганкін. Настаўніца Ніна Мікалаеўна Лузгіна, скончыла гімназію.

Несінская царкоўнапрыходская школа

Загадчык і законавучыцель святар Аляксандр Счансновіч. Настаўніца Ганна Фёдараўна Бародзіч, мае званне настаўніцы. Другі настаўнік — Аляксандр Шніткo, мае званне настаўніка.

Поўсвіжская царкоўнапрыходская школа Забалацкай воласці

Загадчык і законавучыцель святар Андрэй Цытовіч. Настаўнік Стэфан Насыр, меў званне настаўніка.

Старалепельская царкоўнапрыходская школа Франопальскай воласці

Загадчык і законавучыцель свяшчэннік Стэфан Забелін. Настаўніца Анастасія Іванаўна Хаўдок.

Спіс народных вучылішчаў у Лепельскім павеце ў 1910 г.

Вораньскае Вораньскай воласці народнае вучылішча

Настаўніца Таццяна Іпалітаўна Дэйлідовіч, праваслаўная, скончыла Полацкае епархіяльнае жаночае вучылішча, на службе з 1888 г., на пасадзе з 1905 г.

Законавучыцель свяшчэннік Пётр Якубовіч, на пасадзе з 1909 г.

Прудоцкае Вораньскай воласці народнае вучылішча

Настаўнік Максім Васільевіч Вусцін, праваслаўны, скончыў настаўніцкую семінарыю, на службе і на пасадзе з 1908 г.

Гарадчэвіцкае Гарадчэвіцкай воласці народнае вучылішча

Настаўнік Філімон Мікітавіч Шаура, праваслаўны, скончыў педагагічныя курсы пры гарадскім вучылішчы, на службе і на пасадзе з 1903 г. Законавучыцель свяшчэннік Стэфан Іванавіч Шыркевіч, на пасадзе з 1900 г.

Лепельскае Забалацкай воласці народнае вучылішча

Настаўніца Кацярына Іванаўна Барбарыка, праваслаўная, мела званне настаўніцы пачатковых вучылішчаў, на службе з 1904 г., на пасадзе з 1905 г.

Бараўнянскае Забалацкай воласці народнае вучылішча

Настаўніца Еўдакія Шумянко, праваслаўная, мела званне настаўніцы пачатковых вучылішчаў, на службе і пасадзе з 1908 г.

Каменскае народнае вучылішча

Першы настаўнік — Міхаіл Шчаглёў, меў званне настаўніка царкоўнапрыходскіх школ, на службе з 1898 г., на пасадзе з 1908 г. Другі настаўнік — Васіль Іванавіч Хадзянок, праваслаўны, скончыў педагагічныя курсы пры гарадскім вучылішчы, на службе і на пасадзе з 1909 г.

Законавучыцель свяшчэннік Георгій Каўганкін, на пасадзе з 1907 г.

Сушанскае Каменскай воласці народнае вучылішча

Настаўнік Васіль Карпавіч Насыр, праваслаўны, меў званне настаўніка пачатковых вучылішчаў, на службе з 1908 г., на пасадзе з 1909 г.

Несінскае Несінскай воласці народнае вучылішча

Настаўніца Надзея Стафанаўна Колесава, праваслаўная, скончыла Ефрасіннеўскае жаночае вучылішча, на службе і на пасадзе з 1893 г.

Радуньскае Несінскай воласці народнае вучылішча

Настаўніца Пелагея Андрэеўна Адынец, скончыла Ефрасіннеўскае жаночае вучылішча, на службе і на пасадзе з 1909 г.

Кавалеўшчынскае Несінскай воласці народнае вучылішча

Настаўніца Кацярына Халадкоўская, праваслаўная, скончыла духоўнае жаночае вучылішча, на службе і пасадзе з 1908 г.

Караевіцкае Несінскай воласці народнае вучылішча

Настаўнік Васіль Гаўрылавіч Камкоскін, праваслаўны, меў званне настаўніка царкоўнапрыходскіх школ, на службе і на пасадзе з 1908 г.

Пышнянскае народнае вучылішча

Настаўнік Павел Іванавіч Сакалоў, праваслаўны, меў званне настаўніка царкоўнапрыходскіх школ, на службе і пасадзе з 1903 г.

Законавучыцель свяшчэннік Аляксандр Віцкоп, на пасадзе з 1909 г.

У 1914/15 навучальным годзе на Беларусі працавалі 7682 агульнаадукацыйныя школы ўсіх тыпаў, у т.л. 7492 пачатковыя, 119 няпоўных сярэдніх, 71 сярэдняя. Ва ўсіх тыпах школ вучылася 489 тысяч вучняў (20 % усіх дзяцей школьнага ўзросту).

У 1919 г. Наркамат БССР увёў у дзеянне «Палажэнне аб адзінай працоўнай школе РСФСР». Навучанне ў школах вялося на роднай мове.

Па ініцыятыве братоў П.М. і М.М.

Лепяшынскіх быў створаны новы тып працоўнай школы — школы-камуны.

Асноўным тыпам школы ў той час стала 7-гадовая працоўная агульнаадукацыйная і політэхнічная школа для дзяцей ва ўзросце 8—15 гадоў.

У 1919 г. адкрыліся першыя вячэрнія школы для дарослых, а з канца 1920 г. арганізавана сетка школ для непісьменных.

Аб стане народнай адукацыі на Лепельшчыне знаходзім звесткі ў дакладзе загадчыка аддзела народнай адукацыі павятовага выканкама тав. Беленькага на Восьмым павятовым з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, чырвонаармейскіх і батрацкіх дэпутатаў Лепельскага павета 8—11 кастрычніка 1921 г. Вось іх змест: «З 280 школ, адчыненых у 1919 г., амаль палавіна будзе закрыта з-за недахопу сродкаў. Забеспячэнне школ вельмі непрыгляднае: няма сшыткаў, пер'яў, галоўнае — падручнікаў.

У сувязі з дэкрэтам Саўнаркома ад 15 верасня гэтага года поўнае ўтрыманне школ ускладаецца на насельніцтва.

У павеце ёсць школьныя працаўнікі, але многія з іх не працуюць па спецыяльнасці. У такіх жа складаных умовах знаходзяцца і дзіцячыя садкі».

З'езд прыняў рэзалюцыю, якая прапаноўвае павятоваму аддзелу народнай адукацыі: узмацніць дашкольную работу, забяспечыць прававую ахову дзяцей, прыняць меры па недапушчэнні кантактаў падросткаў з дэфектнымі і злачыннымі элементамі шляхам стварэння размеркавальна-прапускных пунктаў і ізалятараў; узмацніць дзейнасць і працаздольнасць павятовага палітпрасвета, хат-чытальняў, тэатраў і клубаў на месцах; неадкладна пачаць правядзенне чарговай кампаніі па ліквідацыі непісьменнасці.

У 1926 г. ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання (завершана да 1932 г.).

У 1926 г. заснаваны школы II ступені з 9-гадовым тэрмінам навучання (з 1932 г. — з дзесяцігадовым).

У 1929/30 навучальным годзе ў Лепелі адчынена сярэдняя навучальная ўстанова — Лепельскі белпедтэхнікум, а ў 1930/31 навучальным годзе — і педкурсы.

Да канца 1930-ых гадоў дзейнічалі таксама школы з выкладаннем на польскай, яўрэйскай і іншых мовах.

Аб школьных справах у Лепельскім раёне знаходзім даныя ў справаздачы Лепельскага райвыканкама VI раённаму з'езду Саветаў з 1927 па 1931 год.

Школьная сетка

	1927/28 навуч. г.	1928/29 навуч. г.	1929/30 навуч. г.	1930/31 навуч. г.
1. Школ 7-гадовых беларускіх	2	2	2	2
2. Школ 7-гадовых яўрэйскіх	—	1	1	
3. Школ 7-гадовых польскіх	—	—	—	1
4. Школ I ступ. польскіх	2	2	2	2
5. Школ беларускіх 4-кампл.	—	1	1	1
6. — 2-кампл.	11	12	15	27
7. — 1-кампл.	35	42	46	38
8. Школ яўрэйскіх 4-кампл.	1	—	—	—
9. Дапаможных груп	—	—	—	1

Склад настаўнікаў па адукацыі

	1929/30 навуч. г.	1930/31 навуч. г.
1. З вышэйшай і незак. выш. адукацыяй	12	20
2. З сярэдняй	36	56
3. З ніжэйшай	39	46
4. Духоўная навуч. школа	6	6
5. Другакласная настаўніцкая школа	16	16
6. Духоўная семінарыя	1	—

Усеагульным навучаннем ахоплена дзяцей школамі I ступені разам з першымі канцэнтрамі сямігодак — 5299 дзяцей. Другімі канцэнтрамі сямігодак — 578 дзяцей.

У 1929/30 навучальным годзе выдаткавана бюджэтных сродкаў на абутак і вопратку бяднейшым вучням у суме 2317 руб.

Дашкольнае выхаванне

У раёне ўсяго існавала дзве нулявыя групы пры сямігодках і адзін дзіцячы садок на 46 дзяцей, таксама ў час палявых работ існавала 13 пляцовак. Якасць выхавання дзяцей была невысокай, бо ў выхавальнікаў адсутнічала адпаведная кваліфікацыя.

З 1932/33 навуч. года ў Беларусі ўведзена абавязковае 7-гадовае навучанне (завершана да 1939/40 г.). У 1939 г. пісьменнасць насельніцтва дасягнула 78,9 %.

На тэрыторыі Зах. Беларусі з 400 беларускіх школ да 1937 г. не засталося ніводнай. У 1938 г. там у асобных раёнах было каля 70 % непісьменных. У 1940 г. у зах. абласцях уведзена 7-гадовае навучанне.

У пасляваенныя гады школьная сетка адноўлена.

У 1962/63 навучальным годзе на Беларусі (у т.л. і на Лепельшчыне) закончыўся пераход да ўсеагульнага 8-гадовага навучання, у 1975/76 навучальным годзе — да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі.

Склаў І. Ю. Януш

Як жылі землякі

Да нашага часу параўнаўча добра захаваліся архіўныя дакументы аб умовах жыцця і працы жыхароў Віцебскай губерні і Лепельскага павета ў сярэдзіне XIX ст.

Ва ўмовах феадальна-прыгонніцкага ладу ў царскай Расіі асабліва складаным было становішча сялян. Нізкія ўраджаі і беднасць вымушалі лепельчан акрамя земляробства шукаць іншыя сродкі, пры дапамозе якіх можна было зарабіць грошы для выплаты павіннасцей і на пражыццё. Зімой, калі занятасць была меншай, многія сяляне займаліся возніцтвам, дастаўляючы тавары купцоў у крамы, нарыхтаваных бярвенняў — да сплаўных рэк, прадуктаў — у Віцебск, Рыгу, Пецярбург.

Адным словам, кемлівы гаспадар, маючы добрага каня і спраўную вупраж, усю зіму праводзіў ў раз'ездах, мог пракарміць сябе і каня і вяртаўся дадому з грашыма, хоць і невялікімі.

Акрамя нарыхтоўкі дроў і лесаматэрыялаў для розных пабудоў некаторыя жыхары атрымлівалі карысць ад нарыхтоўкі дубільнай кары, якая выкарыстоўвалася на гарбарных заводах. Цесляры адпраўляліся на заробкі ў гарады ці да прыстаняў, дзе наймаліся будаваць баркі, стругі, выраблялі дошкі, гонты. Майстравыя займаліся сваім рамяством дома. Адны выраблялі драўляны посуд: міскі, талеркі, лыжкі, вёдры, кадушкі, іншыя — колы, сані, брычкі.

Рыбакі зімой наймаліся да купцоў, якія арандавалі азёры, лавіць рыбу. Тыя, якія не валодалі ніякім майстэрствам, секлі ў лесе дровы, везлі іх у гандлёвыя дні для продажу ў бліжэйшы горад ці мястэчка.

Калі на Заходняй Дзвіне пачынаўся крыгалом, рабочы люд з усіх бакоў гуртам імкнуўся да яе прыстаняў наймацца ў лоцманы, у рабочыя на судны або нагружаць тавар на баркі. У гэты час збор рабочых на прыстанях бываў асабліва вялікім.

Іншыя сяляне, якія жылі ў аддаленых ад сплаўных рэк мясцінах, атрымаўшы дазвол ад сельскага кіраўніцтва або па-

мешчыка, зімой або ў самым пачатку вясны адпраўляліся ў тыя губерні, дзе будаваліся шасейныя дарогі ці каналы. Там, у падрадчыкаў, на пэўны тэрмін наймаліся на работу. На месцы працы спехам будавалі буданы з сучча або зямлянкі. Па дамоўленасці з гаспадаром утрымліваліся на яго харчах або на сваіх.

У шлях адпраўляліся сяляне арцелямі чалавек па 20 і больш. Звычайна адзенне іх складалася з невялікай валенай з белай воўны шапкі (накшталт усечанага конуса), паўкажушка, сялянскай з белага сукна світкі, падвязанай поясам. Нашы землякі насілі, як правіла, лапці.

Заторкнуўшы сякеру за пояс, з рыдлёўкай на плячах і з вялікай торбай, у якой кашуля і хлеб, тутэйшы селянін пакідаў сваю сям'ю і адпраўляўся ў дарогу часам верст за 500 і больш. Будучы неперабарлівым і асабліва непатрабавальным да ежы, ён часта задавальняўся хлебам з вадой, затое не ўпускаў выпадку выпіць гарэлкі, калі меў у кішэні чым за яе заплаціць.

Захаваліся звесткі і аб вырабе гэтага прадукту ў той час. З пераведзеных на брагу 25 пудоў выганялі 18 вядзёр гарэлкі моцнасцю 24 градусы. Прасцей кажучы, з кожнага пуда жыта атрымлівалі тры гарцы гарэлкі (8,4 л). У корчмах павета, у памешчыцкіх і казённых вёсках вядро гарэлкі (11,3 л) прадавалі за два рублі серабром, а ў горадзе — за 3 рублі 50 капеек серабром. З 507 заводаў, якія дзейнічалі ў 1848 г. у Віцебскай губерні, 403 былі вінаробчыя. Тады было выгнана 436 772 вядры гарэлкі, а сярэдняя цана на яе складала 1 рубель 25 капеек серабром за вядро.

З горада Лепеля, мястэчак Чашнікі, Бачэйкава, Бешанковічы, якія ўваходзілі ў павет, многія жыхары вясной адпраўляліся ў Смаленскую губерню, у гарады Белы і Парэчча, дзе наймаліся ў лоцманы для праводкі барак з грузам па Дзвіне праз парогі, якія размяшчаліся за мястэчкам Краслаўка ў горадзе Якабштат. Звычайна лоцманаў і рабочых збіралася да 400 чалавек. Некаторыя пачыналі працаваць на барках з 14—15 гадоў. Спачатку былі яны рознарабочымі, потым памочнікамі лоцманаў, нарэшце, самі станавіліся лоцманамі.

Калі здаралася, што баркі садзіліся на пясчаную касу, тавар перагружалі на латышскія лодкі, якія называліся лайбамі. За праводку баркі з карысным таварам з горада Белага ў Рыгу старанны і вопытны лоцман браў ад 40 да 50 рублёў серабром, а з мястэчка Бешанковічы да Рыгі лоцману плацілі ад 25 да 30 рублёў серабром. Рабочыя ж, у залежнасці ад сілы і ўкладзенай працы, атрымлівалі ад 10 да 15 рублёў серабром.

Даставіўшы ў Рыгу тавар, лоцман з рабочымі, назапасіўшыся дарожным харчам, адпраўляліся ў зваротны шлях вялікімі арцелямі, праходзячы пешшу верст па 30—35 і больш у дзень, у залежнасці ад пары года і стану дарог. У шляху варылі сабе ежу, якая ў арцелі ім абыходзілася даволі танна.

Увішныя сяляне ў веснавое суднаходства паспявалі два разы з'ездзіць на суднах у Рыгу і звычайна вярталіся ў сваю вёску не пазней чэрвеня. Ад гэтых заробкаў беражлівы і цвярозы селянін заўсёды зарабляў столькі грошай, колькі яму патрэбна было, каб заплаціць розныя падаткі і павіннасці, заставалася яшчэ і на свае жыццёвыя патрэбы.

Вось у такіх умовах жылі і працавалі нашы продкі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя.

І. Ю. Януш

Артыкул з газеты «Наша ніва», № 13

20 чэрвеня 1908 г.

Лепэльскі павет ляжыць у палудзенна-заходняй часці Вітэбскай губ. Горад Лепэль ляжыць на Лепэльскім возеры, праз каторае праходзіць Лепэльскі канал, што злучае рэку З. Дзьвіну з Берэзінай. У нашым вуезьдзе шмат возераў — каля 900 штук, так што яго можна назваць «возерны» вуезд. Каб была добрая рыбная гаспадарка, то возеры давалі бы вялікіе грошы, але кожнае возеро мае некалькі гаспадароў, каторые маюць «вступ», і кожны хапае з возера рыбу, ня гледзячы ні на пару, ні на тое, што рыба ешчэ малая. Наш кут заўсягды быў неяк з боку, глаўны гандэль ішоў на г. Полацк; цяпер толькі

праз край павету прайшла Бологое—Седлецкая ж.д. і ст. Загатье ўжо ў Лепэльскім павеце. Водная дарога — Берэзінскі і Лепэльскі каналы ня маюць вялікай вартасці, бо па іх гоняць толькі плыты, а параходы і лайбы ня ходзяць, бо мала вады. Земля ў нас нічога сабе, добрая. Але гаспадарка вядзецца ў паноў і мужыкоў пастарасвецку; па весках вясной хоць зубы на паліцу кладзі. Паны пачалі палепшаць трохі гаспадарку на новы лад, але мужыкі-беларусы ані з мейсца! Напрыклад, у Віленскай губ. мужыкі куды лепш гаспадараць, як лепельскіе. У нас папар саўсім нічым не засеваюць, трэцця часць зямлі марнуецца, а падаткі плаці. У Віленскай губ. гаспадары ўжо сеюць на папары зялёны корм. Шмат у нас торфу, але з яго саўсім не карыстаюць, а дровы купляюць.

Нашы мужыкі ідуць на заработкі ў Мітаву, Маскву, Пецербург, так што і парабкоў цяпер цяжэй дастаць. У год парабак бярэ 40—50 руб. Глаўныя мястэчкі ў нас: Бешэнковічы на Заходняй Дзьвіне з $4^1/_2$ тысячамі душ народу; Чашнікі на р. Улле, гдзе 5 тысяч народу жыве; Кублічы, Ушачы. Другіе мястэчкі саўсім малые. У м. Чашніках ёсць вялікая паперня, ёсць і ешчэ 2 паперні; у папернях працуе каля тысячы людзей. Браваруў — 12, што вырабляюць атруту на людзей. Колькі паравых млыноў мелюць толькі на тутэйшые патрэбы. Трохі гоняць смалу. Як прайшла Бологое—Седлецкая ж.д., пачалі скупаць розныя тавары і пасылаць іх у Мінск, Вільню.

П'юць тут беларусы ня горш, як па другіх мясцох, умеюць навэт добра гнаць гарэлку с палітуры, каб каштавала танней. Манаполькі ў Кублічах, Селішчу, Бабынічах прадаюць у год на 80 тыс. руб. гарэлкі!

Каб палепшыць жыццё мужыкоў і краю, аб тым, бадай, нікому не баліць галава. Можэ, як увядуць калі земскае самаўпраўленне, людзі заварушацца і прабудзяцца.

Падарожны. Запісаў К.А. Кожан

Вачыма этнографа

З архіва Імператарскага Рускага геаграфічнага таварыства

Сличая по наружности народ*, среди которого живу с народом глубокороссийским, я не заметил никаких особенностей; правильное и стройное расположение частей тела — существенная его принадлежность. Скудная пища, постоянные труды и недостаток в свойственной климату одежде, положившие печальный отпечаток нищеты на большей части жителей моего круга, мне кажется, могут быть приняты причиною их худощавости. Ростом мои соокружцы большей частью среднего, с русыми, черными, а весьма редко с белыми волосами; цвет глаз преимущественно серый и голубой; из болезней в особенности подвергаются горячке (горючность), непроворны, усердно трудясь для себя, они неохотно трудятся для другого, успех в последнем случае получается только при значительном посредстве горячих напитков.

Домашний быт

Дома у нас строят деревянные без подмуровок, зато последние к земле два или три берна стен плотно обсыпываются землею снаружи и внутри; насыпь эта называется **завалиною**; кровли на домах соломенные. Воротами и главными окнами дома бывают обращены к улице. Всякий хозяин, строя для себя дом, всеми силами старается, чтобы солнце весь день светило в окна его дома; — это страсть, которая сопровождается нередко безпорядочным расположением домов в деревнях.

Вот план, которому стараются следовать мои соокружцы в построении домов; изменяет его только недостаток хозяйственных принадлежностей.

* Крестьяне, живущие в деревнях, шляхта (так называют у нас однодворцев и небогатых дворян) и мещане.

1). **Хата** — изба; 2). Сени; 3). Истопка, или изба, в которой почти никто не живет, а помещаются в них такие овощи и хозяйственные произведения, которые требуют теплоты во время зимы; у некоторых она же и банею. 4). Клець-амбарец. 5). Навес **павець**. 6). Дравасек, где рубят дрова, — бывает или в соединении с навесом и тогда образует **пуню**-сарай для сена, или для складки земледельческих орудий: сох, борон, колёс, смыков* и пр. 7). Хлев для помещения домашних животных. 8). **Даржень, дзяньник** — охотный двор.

Необходимые принадлежности избы составляют:

1). Икона — образ — **абраз**, которую ставят в почетном углу между двумя окнами за широкую доску с прорубленным большим отверстием; доска эта составляет будто шкафец без дверцев, называющийся **божни́цей**. Икону, или много икон, находящихся за доскою, обвешивают чистыми полотенцами.

2). **Печь** (курная, без трубы) находится по правую или по левую сторону порога, — поставляется на высоких каменных подпорах так, чтобы самое жерало или отверстие, в которое вкладывают дрова и вставляют варевные сосуды было у порога-же против окна. Подпоры, равно как и самая печь, примыкают стенами своими к двум стенам избы. В подпорах, — в этом нижнем основании печи пустота, в которую проделывается оконце, сюда загоняют курей.

3). Ровно с поверхностию печи укрепляется берно: одним концом в стену порога, а другим в соответствующую, параллельную этой; в параллель этому берну, в тех-же самых стенах укрепляется другое, в самом задку печи, на сии же два берна накладываются доски, и это составляют **пала́ци**, на которых спят.

4). Ниже палацей устраиваются еще другие, называемые **полом**, подобные помянутым; сии устраиваются, ровно с основанием печи и вершиною подпор, — на них спят сами хозяева дома. Под этим полом зимою делаются перегородки, в которых помещают молодую рухлядь, немогущую сносить зимние холода. Все это находится по ту сторону, где печь и простирается недалее третей части избы. Против печи устраиваются на высоких подпорах жо́рны — камни, в которых мелют известные хозяйственные продукты на муку; у некоторых они находятся в **исто́пке**. Около стен, составляющих угол для помещения икон, расположены:

5). **Ла́ўки** — скамьи, соединяющиеся под Божницею, которая основанием своим примыкает к **ла́ўкам**. В этом же углу, между лаўками, — стол. Место за столом у Божницы называется **ку́том** и предоставляется важнейшим лицам в доме. У порога над жернами и над лаўками в верху устраиваются —

6). **Полицы**, на которых помещаются столовые и кухонные приборы.

Се́ни и **истопка** бывают заставлены множеством дежей, тут же иногда ставят и **ку́бел***. **Исто́пка** устраивается по форме **хаты**, но без **пала́цей**, в истопке находятся ямы, в которые всыпаются на зиму огородные овощи. Устройство анбаров как внутреннее, так и наружное известно.

Хозяева, следуя общему в своей стороне вкусу в расположении помянутых строений, следуют собственно своему отдельному в расположении строений **гумна́**.

Верхняя одежда мужская и женская зимняя и летняя: сермяга, насоу́ и тулу́п. **Сермяги и насовы** по форме и покрою одинаковы как для мужчин, так и для женщин; **тулупы** женщины носят длинные, мужчины же короткие — до колена, нижняя одежда для обоего пола общая всем жителям Беларуси. Праздничная одежда же отличается от ежедневной опрятностью; немногие из женщин носят по праздникам **ката́нки**. **Катанка** таже самая **сермяга**, но только сшитая из черного сукна, или голубого, или другого какого-нибудь цвета.

---

* **Смык** есть борона, которая составляется из еловых, рассчепленных пополам кусков дерева с сучьями, куски эти соединены так, что, составляя ровную поверхность, образуют вниз сучьями зубцы, замечаемые в бороне.

* Деревянная же дежа, в которую прячут лучшую одежду, которая затворяется на замок.

Сермяги, тулупы и **катанки** — носят зимою, насова — летом носят мужчины, женщины же ходят в одном нижнем платье, сшитом из лавочной материи. Впрочем, всегда, когда только холодно летом, носят зимнюю одежду вместо летней. Все щегольство мужчин состоит в красном кушаке, сапогах и шапке, щегольство женщины в лавочном или опрятном домашней материи платье.

Пища ежедневная почти ничем не отличается от праздничной: и в праздники у нас едят (крестьяне и высший, но бедный класс) тот-же самый **пушны́й** хлеб, который составляется из двух частей мякины и одной части чистого хлеба; ту же самую **капу́сту**, **по́лиўку** и **бураки́**, такой же самый **кру́пник, куле́ш, пансак** и проч. Кушанья эти, по причине недостатка средств, заправляют же каким-нибудь жиром, бывают большею частью без всяких приправ. Обеды и ужины редко выходят до трех блюд и почти никогда, впрочем, в первое время по собрании с полей, все у нас кушают роскошнее, в своем роде: хлеб чистый, на столе кушаний два, три **«водка з дому ни выводная»**; весною роскошь эта заглаждается вздохами, омывается слезами и недостатком, — тогда часто кушают без соли и вместо двух блюд довольствуются одним скудным кулешом без хлеба. Картофель едят большею частью летом, когда она дозревает, поздней осенью и зимою она делается лакомым кушаньем и редким у многих. Но есть случаи, в которых всякий старается из последнего скушать что-нибудь получшее, — это праздники: **каляда́** (канун Р. Христова), **каля́ды** (3 дня празднования Рождества Христова), **багатая каляда́** (канун Богоявления), **за́говины, ма́сляная неделя, вяли́к дзень** (3 дня празд. Воскр. Христова).

Что едят в эти дни, равным образом, когда какия исполняют обряды, какие поют песни, — обо всем этом можно узнать подробно от нескольких десятков девиц, с недавнего времени находящихся в Санктпетербурге, в шолковом заводе купца Бинарда; девицы сии из имения помещицы Казановичевой, Сорицы, расстоянием от меня на 5 верст. Если таковая попытка доставит подробные сведения об отличительных чертах жителей моего круга, Санктпетербургскому топографическому обществу, в следствие присланой мне книжечки, — неудовлетворительна, то по первому требованию онаго в скорейшем времени сообщу недосказанное.

Умственные и нравственные способности и образование

Понятливостию, сметливостию и разсудительностию народ, о котором пишу, нисколько не превосходит жителей соседних губерний и уездов, — есть люди, в которых заметно порядочное развитие, помянутых способностей, но оно выказывается весьма редко, и в несовершенных формах. Грамотных весьма мало; местные владельцы, усматривая что-то вредное в образовании своих крестьян, стараются заградить им путь к сему полезному началу познавания. Во всем моем кругу, который простирается от места моего жительства во все стороны верст на 20-ть, найдется ли 10-ть человек грамотных.

Множество **карче́м** — кабаков, которых можно насчитать в моем-же кругу больше 40, породили в народ склонность к пьянству. Отцы и матери детей стали еще с младенчества научать пить водку; мне случилось однажды видеть, как отец, беднейший крестьянин, держа на коленах полунагого сына, уговаривает его глотать сей вредный напиток насильно: «сынок мой, **гарятничик мой! пи, пи!**», когда тот упорствовал, отец закричал грозно: «пи! дзелай так, як бацька дзелаець!.. » Не смотря на все это народ наш набожен, гостеприимен, скромен, вежлив и благотворителен. Самым большим преступлением считают у нас воровство и обман, но и это исключительно принадлежит цыганам и жидам. Свойства сии, возрастая вместе с летами людей двух этих родов, служат преимущественно ко вреду недальновидных крестьян.

Народныя предания и памятники

Народ сохранил весьма мало воспоминаний о событиях времен прошедших: известно только воспоминание о 12 годе

под именем **руи́ны**, **ревали́юции**, — о изобилии в прошлые лета; о кладах толкуют без умолку.

З артыкула Р. Кладніцкага «Этнаграфічныя звесткі аб жыхарах Лепельскага павета Віцебскай губерні», 1850.

* * *

На одну квадратную версту в Лепельском уезде приходится до 105 человек народонаселения, которое состоит из белорусов, великорусов, поляков и евреев. Из 140 859 душ обоего пола, по исчислению 1892 года, мужчин было 71 997 и 68 862 женщины; следовательно, перевес мужского пола над женским простирается до 3135 человек. Это свидетельствует об удовлетворительном состоянии народного здравия и об отсутствии в уезде нужды, обессиливающей население (естественный прирост народонаселения Лепельского уезда достигает до 2500 человек ежегодно).

Представляя собой как бы ворота, через которые с древнейших времен поныне славянские племена по речкам и озерам, входящим в состав Березинской системы, двигались с юга на север, нынешний Лепельский уезд с давних пор был густо заселен чистокровными кривичами, предками теперешних белорусов. Лепельские белорусы, особенно живущие подальше от местечек, сохранили в первобытной чистоте славянский тип: древнее наречие, обычаи, одежду и суеверные народные празднества. Они отличаются средним ростом, до 2 арш, $6^1/_2$ верш., шатены или блондины с голубыми и серыми глазами. В молодости мужчины отличаются правильными чертами лица, а светловолосые девушки — своей миловидностью и кротостью. Дородность не свойственна ни мужчинам, ни женщинам. По характеру белорусы добродушны и уступчивы, но преданностью не отличаются, тяжелое историческое прошлое сделало их недоверчивыми.

В местечках все стараются говорить по-русски, но в глухих деревнях разговаривают на чистейшем белорусском наречии, сохранившем много старинных сла-

Сялянка Лепельскага павета. XIX ст.

вянских форм и выражений. В южной окраине уезда: в Заболотской, Франопольской и Пышнянской волости удержалась старинная одежда: белый холщевый насов, белый кожух и белый суконный армяк. Меховые шапки в последнее время заменяются фуражками. Одетые с ног до головы в белые платья, бабы напоминают собой как бы привидения. Непременную принадлежность убора взрослого мужчины составляет чересло (широкий кожаный пояс) с отделениями для денег и курительных принадлежностей. Костюм довершают лыковые лапти и белые онучи, перевитые черными ремешками.

Дуда, как и у древних предков, у белорусов является любимым музыкальным инструментом. «Без дудочки, без дуды идуць ножки ни туды», — поется в одной веселой песне.

При крайнем суеверии крестьяне отличаются необыкновенной терпимостью к другим исповеданиям. Многочисленные

Вясельныя касцюмы сялян Лепельскага павета. XIX ст.

Деды, Радуница и Купала составляют лучшие народные празднества, потому что живо напоминают белорусу колыбель его младенчества. Как наивное дитя, он верит в русалок, боится чертей и чаровников, будто находящихся в связи с нечистой силой. «Бога бойся, а черта не гневи», — говорит этот взрослый младенец.

На купальскую ночь повсеместно зажигаются костры, и молодежь всю ночь прыгает через огонь, пляшет и поет около костра, прославляя древнего бога.

Крестьяне глухих деревень живут бедно и грязно, иногда в курных избах, дым которых вредит, действует на здоровье и ослабляет зрение. Едят они плохо, преимущественно хлеб, картофель и постные похлебки (капусту, крупеню, затирку), одеваются в плохую грубую одежу и сапоги составляют парадную обувь, бедняки же и старые скряги всю жизнь щеголяют в лаптях. Жители местечек, наоборот, имеют чистенькие, светлые домики с мещанской обстановкой. Садики около домов и цветы на окнах свидетельствуют о достатке и некотором эстетическом развитии хозяев, особенно где есть молодая девушка.

В праздничные дни молодые парни одеваются в пиджаки и суконные пары, а девушки ходят под зонтиками и затягивают в корсет свои внушительные талии, называя мальцев кавалерами, за что те величают их барышнями. На игрищах, вместо народных белорусских плясок, танцуют кадриль, польки и вальсы. Но верная прадедовским обычаям деревенская молодежь увеселяется по-старинному, отплясывая до упаду, под звуки скрипок и дуды, «крутиху», «левониху», «метелицу», «подушечку» и «казачка», от чего дом ходит ходенем. На лоск молодежи и на погоню за дорогой одеждой старики смотрят недружелюбно, находя это разорительным для хозяйства. В прежние годы самый богатый хозяин, выдавая дочь замуж, давал за нее в приданое кожух, армяк, кубел полотна и много, если еще в придачу корову; в настоящее же время деревенская девушка рискует остаться старой девой, если кроме хорошей одежды не имеет еще и сотни рублей; и деревенские женихи научились ценить более деньги, чем личные качества невесты.

Вообще, оставляя прадедовскую простоту и соединенную с ней чистоту нравов, молодежь быстро усваивает какую-то пошлую лакейско-фабричную цивилизацию, доводя этим до отчаяния стариков-родителей. И к прискорбию, в волостных правлениях появляется немало дел об обидах, причиняемых детьми родителям.

З артыкула І. Гарбачэўскага «Лепельский уезд Витебской губернии». Віцебск, 1895.

Развіццё адукацыі і культуры

4 чэрвеня 1830 г. паміж Лепельскім павятовым казначэем Іванам Ляскоўскім і ўправай Беларускай навучальнай акругі было афармлена пагадненне, па якому ён абавязваўся прадаць акрузе свой драўляны дом, які знаходзіўся непадалёку ад казённага дома дзяржаўных устаноў на гарадской плошчы, за 9 тыс. руб. асігнацыямі. Гаспадар павінен быў атынкаваць, пафарбаваць падлогі, вокны, дзверы, зрабіць класную мэблю, пабудаваць флігель на кватэру наглядчыку, надворныя пабудовы — павець, свіран, а таксама агароджу вакол участка.

Да пачатку лістапада ўсе гэтыя работы былі закончаны і дом прыняты ў казённае ведамства штатным наглядчыкам Антонам Мацвеевічам Дарашкевічам. 10 лістапада 1830 г. у прысутнасці знакамітых асоб з лепельскіх жыхароў у гэтых будынках афіцыяльна было адкрыта Лепельскае дваранскае 4-класнае вучылішча. У першы клас было залічана 10, у другі — 26 вучняў.

Настаўнікам гісторыі і геаграфіі ў вучылішчы працаваў Адам-Людвік Дзяменцьевіч Юцэвіч, вядомы літоўскі пісьменнік, этнограф, краязнавец.

У 1832/33 навучальным годзе Лепельскае дваранскае вучылішча склалася канчаткова. Тут было 8 настаўнікаў, 86 вучняў. Навучальнай акругай былі куплены за 11 615 руб. ад павятовага казначэя Івана Ляскоўскага два новыя драўляныя дамы з флігелем і надворнымі будынкамі на адным плане на Чашніцкай і Рачной вуліцах для пяці настаўнікаў Лепельскага дваранскага вучылішча. Акрамя таго, І. Ляскоўскі ўзяў на сябе абавязацельства пабудаваць трэці дом на суседнім участку, які падараваў вучылішчу памешчык Няміра для размяшчэння прыходскага вучылішча з ланкастэрскім класам.

У 1833 г. у Лепелі было адкрыта прыходскае мужчынскае аднакласнае вучылішча.

У 1850 г. быў напісаны нарыс «Этнографические сведения о жителях Лепельского уезда» свяшчэннікам Вяжыска-Шарыпінскай царквы Рыгорам Кладніцкім, членам Імператарскага Рускага геаграфічнага таварыства. Ён зрабіў дэталёвае і глыбокае апісанне дамашняга быту, адзення, ежы, а таксама мовы, народных паданняў сярод мясцовага насельніцтва.

Узровень беларускай архітэктуры першай паловы XIX ст. вызначалі панскія палацы, адміністрацыйныя і культавыя будынкі.

У 1845 г. ва ўрачыстай абстаноўцы быў асвечаны новы Праабражэнскі сабор, які стаяў на Саборнай плошчы горада (цяпер плошча Свабоды).

Значнай падзеяй для лепельчан было знаёмства з канцэртамі і драматычнымі спектаклямі, з якімі выступіла трупа артыстаў пад кіраўніцтвам Карла Баўра. Перш чым прыехаць у Лепель з трупай, прадстаўнік калектыву звярнуўся да лепельскага гараднічага з просьбай на атрыманне дазволу губернатара і перадаў яму спіс намечаных п'ес. Такі дазвол быў дадзены цыркулярам Міністэрства ўнутраных спраў № 797 ад 20 сакавіка 1831 г. і распаўсюджаны па Віцебскай губерні. У гэтым цыркуляры пералічваліся п'есы, якія былі адобраны Трэцім аддзяленнем канцылярыі для публічных пастановак.

У студзені 1832 г. лепельскі гараднічы прасіў у губернатара дазволу ў сувязі з тым, што «актер театральных представлений Баур, ныне занимающийся сим с дозволения начальства Минской губернии в Борисовском уезде, желает представить некоторые пьесы в городе Лепеле».

Баур сам паехаў да губернатара і павёз спіс п'ес, прызначаных для паказу. 29 студзеня губернатар зрабіў дазвол пры ўмове, што будзе дадзены адзін спектакль у карысць інвалідаў.

Пры гэтым пасля подпісу адпаведнай паперкі губернатар уласнаручна зрабіў прыпіску: «P.S. Сверх сего рекомендуется Вам наблюдать за тишиною и благопристойностью во время представлений, как равно и за огнем, и чтобы между актерами и актрисами не было таковых, которые принадлежали к людям и сословиям подозрительным, а чтоб все имели законные виды и паспорта».



Клуб і паліцыя. Пачатак XX ст.

З Віцебска Баур сам прывёз дазвол губернатара. У Лепелі яго ўжо чакала трупа ў складзе: а) жаночы персанал: 1) спадарыня Баур, 2) Мальчэўская — дзяўчына; б) мужчынскі персанал: 1) Баур; 2) Ендрыеўскі; 3) Радзевіч; 4) Платэнберг.

Прэм'ера пачалася 31 студзеня і закончылася 21 лютага 1832 г. у памяшканні пры шлюзах Бярэзінскай сістэмы. Спектаклі ў нядзелю пачыналіся ў 5 гадзін, а ў будныя дні — у 4 гадзіны апоўдні.

У пачатку 1837 г. сярод лепельскай інтэлігенцыі ўзнікла задума аб стварэнні ў горадзе клуба. Выконваючы ў той час абавязкі прадвадзіцеля дваранства суддзя Корсак заявіў аб гэтым лепельскаму гараднічаму, а апошні 9 студзеня звярнуўся з запытам да губернатара. У гэтым звароце выказваўся намер лепельскіх чыноўнікаў і дваран з'язджацца два разы ў тыдзень на танцы. Калі справа дайшла да губернатара, той «не изъявил на сие своего согласия» и 23 студзеня 1937 г. паведаміў аб гэтым гараднічаму.

У 1821 г. у Лепелі з'явілася першая аптэка. Утрымліваў яе правізар Адам Кірш. Неабходнае абсталяванне, медыкаменты ён прывёз з Віцебска.

У 1830-ыя гады пачаў сваю артыстычную дзейнасць ураджэнец Лепеля Карп Трафімавіч Саленік. Гэта быў востракамедыйны артыст, які з вялікім поспехам выступаў у розных гарадах Расіі.

Вялікі ўклад у развіццё жывапісу ўнес мастак Іван Фаміч Хруцкі. Ураджэнец м. Ула Лепельскага павета (цяпер Бешанковіцкі р-н) з вялікай пранікнёнасцю і ўлюбёнасцю ў свой край адлюстроўваў родную прыроду, пісаў на бытавыя тэмы, партрэты людзей.

Бібліятэка ў Лепелі

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь у Мінску захоўваюцца арыгіналы рукапісаў, якія ўтрымліваюць звесткі аб Лепельшчыне ў пачатку XX ст. З іх даведваемся, што ў 1902 г. у Лепелі была створана настаўніцкая бібліятэка. Выкладчыкі горада сабралі 249 кніг. Пастаянных чытачоў было звыш 30. У справаздачы аб стане бібліятэкі яе загадчык, настаўнік А. Шахлевіч, пісаў дырэктару народных вучылішчаў: «Бібліятэка слаба функцыяніруе, па-першае, таму, што яна небагата кнігамі ўвогуле, а навейшых пісьменнікаў зусім няма; па-другое, у цяперашні час бібліятэка не мае сродкаў, так як Лепельская земская ўправа адмовіла бібліятэцы 50 рублёў штогод на папаўненне яе. Для больш паспяховай дзейнасці бібліятэкі неабходна папоўніць яе кнігамі навейшых пісьменнікаў і дазволіць навучэнцам атрымліваць кнігі праз даверaных асоб, таму што г. Лепель знаходзіцца на ўскраіне павета і зносіны з ім бываюць часта цяжкімі».

Падрыхтаваў І. Ю. Януш

Яго адметнае слова (Ф. Тапчэўскі)

Пасля падаўлення паўстання 1863 г. у Беларусі ў цяжкім стане аказалася беларуская літаратура. Расійскія ўлады практычна забаранілі беларускае друкаванае слова. Толькі ў канцы XIX ст. пачалося ажыўленне, калі ў літаратуру прыйшлі новыя сілы ў асобе пісьменнікаў-дэмакратаў. Сярод іх пачэснае месца займае наш зямляк, ураджэнец фальварка Лесава Лепельскага павета Віцебскай губерні Фелікс Феліксавіч Тапчэўскі (1838—1892). Скончыўшы ў Лепелі павятовае дваранскае вучылішча, Ф. Тапчэўскі працаваў валасным пісарам, потым канцылярскім чыноўнікам у Віцебскім земскім судзе, адкуль у 1861 г. быў звольнены за крытычныя адносіны да мясцовых улад. Працуючы лесніком, лепельскі паэт падтрымліваў сувязь з паўстанцамі 1863 г.

У Лепельскім краязнаўчым музеі захоўваецца копія рапарта веліжскага павятовага спраўніка начальніку Віцебскай губерні аб выніках вобыску на кватэры Тапчэўскага 25 лютага 1864 г., дзе былі знойдзены рукапісы яго твораў, паштоўкі ад сяброў, за што паэт быў арыштаваны. Найбольш папулярнымі творамі мясцовага паэта з'яўляюцца «Вечарынка» (1880-ыя гг.), «Саўсім не тое, што было», «Ён і яна», «Грошы і праца» (1890-ыя гг.). Тады ў рукапісах яны хадзілі па руках, а надрукаваны былі значна пазней: першы твор — у 1915 г., а тры астатнія — у 1954 г.

Некаторыя вершы, падпісаныя псеўданімам Хвэлька з Рукшэніц, былі знойдзены сярод дакументаў у рукапіснай «Беларускай хрэстаматыі» папулярнага вучонага (таксама ўраджэнца Лепельшчыны), прафесара Пецярбургскага універсітэта Б.І. Эпімаха-Шыпілы.

Фелікс Феліксавіч у сваіх вершах праўдзіва і выразна паказвае жыццё, сацыяльныя супярэчнасці парэформеннай вёскі. Пільную ўвагу пісьменнік-дэмакрат накіроўвае на простага чалавека, які жыве ва ўмовах, не адпавядаючых яго цяжкай працы і важкаму ўкладу ў дабрабыт грамадства. Да гэтых людзей наш зямляк адносіцца з вялікай павагай і глыбокім спачуваннем.

Нарадзіўшыся і вырасшы сярод простага люду, Ф. Тапчэўскі глядзіць на жыццё вачыма селяніна-працаўніка, які вельмі крытычна адносіцца да маралі пануючых класаў. Ён рэзка выступае супраць сацыяльнай няроўнасці селяніна, які з'яўляецца непасрэдным стваральнікам матэрыяльных каштоўнасцей. Яскравы прыклад гэтых поглядаў паэта знаходзім у вершы «Грошы і праца». У гэтым і іншых вершах гутарка-апавяданне вядзецца на бытавым, часам жартоўна-юмарыстычным узроўні ад імя ўяўна дабрадушнага і наўмысна наіўнага селяніна.

Кажуць: мужык — хам, няцнота,
Гультай, шэльма, усё ліха!
А чыя ж гэта работа, —
Хатка, хлебец і грачыха?

Хто ж разробіў лес на поле,
Абсушыў балоты, топі
І для ўсіх зрабіў раздолле?
Ўсё ж гэта тыя хлопі...

Тапчэўскі не ўспрымае новыя капіталістычныя ўмовы жыцця і адмаўляе іх з пазіцый патрыярхальнага сялянства. На яго думку, усё ж лепшымі былі дакапіталістычныя, дарэформенныя парадкі, калі людзі не адчувалі сілы грошай. Аб гэтым чытаем у вершы «Саўсім не тое, што было».

Было ўстар усё як трэба,
Цяпер не стала таго, не!
...Жылі сабе дый прыпявалі,
Не зналі грошы пазычыць
Яшчэ й капейку заганялі,
Каб падчас беднаму падаць.

Апавядаючы ў сваіх творах аб сялянах, надзеленых многімі дадатнымі рысамі, Тапчэўскі падкрэслівае іх чалавечую годнасць, вострае рэагаванне на сацыяльную несправядлівасць. Пры гэтым адчуваецца блізкасць творчасці паэта да мясцовага фальклору. Для прыкладу згадаем колькі радкоў яго верша: «Панскае ігрышча», копія якога захоўваецца ў Лепельскім музеі:

— Каб гэта ведаў, пан-кумішча,
Што ўчора відзеў я:
У паноў было ігрышча,
Да якое ж — ай, ай, ай!

Як зайграюць усе разам
Музыканты казачка,
Ажно цёмна станець глазам
І няпомніш языка...

Пісьменнікі-дэмакраты XIX ст. аказалі дабратворны ўплыў на новае пакаленне літаратараў, якія залажылі асновы сучаснай беларускай літаратуры. Сярод іх быў Ф. Тапчэўскі — адзін з першых беларускіх паэтаў-гумарыстаў і сатырыкаў (ён пахаваны ў саўгасе «Глыбачаны» Ушацкага раёна).

Сёння мы па праву можам ганарыцца славутым земляком, які сказаў сваё адметнае слова, унёс важкі і адчувальны ўклад у далейшае развіццё нацыянальнай беларускай літаратуры.

І. Ю. Януш

Фелікс Тапчэўскі

ГРОШЫ І ПРАЦА

Кажуць: мужык — хам,
няцнота,
Гультай, шэльма, усё ліха!
А чыя ж гэта работа, —
Хатка, хлебец і грачыха?

Хто ж разробіў лес на поле,
Асушыў балоты, топі
І для ўсіх зрабіў раздолле?
Усё ж гэта тыя хлопі.

Божы храм, карабль на моры,
Церам, дварцы і палаты,
І сабе — грэблі й заборы,
І сабе — мізэрны хаты.

Хто ж зрабіў, чыя работа?
Хто пацеў, ірваўшы жылы?
Той жа хам і той няцнота,
Што празвалі паны быдлам.

Хто ж падпорай у вяльможы?
Чыя праца — іх палацы?
Хто ж паслаў ім мякка ложы?
Белы хлеб іх — чыя праца?

Чыім лбом разбіты муры?
Хто разрыў валы, акопы?
Хто ж не драў мужычай
шкуры?
Дзе ж няма хамскай работы?

Іхняй сілай і рукамі
Ставяць крэпасць, ліюць пушкі,
Робяць ружжы са штыкамі,
Сыплюць шанцы і гарушкі.

Можа, скажа хто, што грошы
Кормяць, робяць, нежуць цела.
Не! Паночак мой харошы,
Грош — пустое, праца — дзела!

Мы ж без грошай, а ўсе сыты,
Спляцём лапці, зробім хату,
Спрадзём лёну — і акрыты,
Яшчэ з карку дадзім брату.

Плюнуць толькі на грош трэба,
А дзяржацца крэпка працы;
Ах! не дадуць грошы хлеба,
І не вырастуць палацы.

Сядзь на кучы грошы, пане,
Ды глядзі на іх век цэлы,
Не дадуць яны, васпане,
Шоўку, жэмчуг і хлеб белы.

Жылі ж людзі перад гэтым
І не зналі срэбра, злата,
Быў люд людам і свет светам,
Елі хлеб, і была хата.

Грошы — выдумка пустая,
Яны трэба танкакожым,
Каб кармілі век гультая
І кармілі хлебам розум.

Хвэлька з Рукшэніц,
Ухвішчы, 27 красавіка 1890 г.
Упершыню надрукаваны ў часопісе
«Полымя» (1954. № 12).

Іасафат Пятровіч Агрызка (1826, Лепельскі павет Віцебскай губ.,— 18(30) сакавіка 1890, Іркуцк).

Лепельшчына — радзіма Іасафата Пятровіча Агрызкі, чалавека, які пакінуў свой след у гісторыі. Яго імя ўвайшло ў гісторыю рэвалюцыйнага і вызваленчага руху Расіі, Беларусі і Польшчы.

У XIX ст. ён быў шырокавядомы як буйны пецярбургскі чыноўнік і кнігавыдавец.

І.П. Агрызка нарадзіўся ў 1826 г. у Лепельскім павеце Віцебскай губ. у небагатай дваранскай сям'і. У 1837 г. паступіў у Лепельскае павятовае вучылішча. Пасля заканчэння чацвёртага класа ён перавёўся ў Мінскую гімназію, якую скончыў у 1844 г. За поспехі ў вывучэнні рускай мовы І. Агрызка ўдастоіўся права на атрыманне чына чыноўніка 14-га класа пры паступленні на грамадзянскую службу.

У 1845 г. ён быў залічаны на першы курс юрыдычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта. У гады вучобы ён меў некаторы заробак ад выкладчыцкай работы, якой займаўся ў вучылішчы правазнаўства, у школе гвардзейскіх прапаршчыкаў і іншых навучальных установах сталіцы.

Ва універсітэце Агрызка далучыўся да рэвалюцыйнага студэнцкага гуртка на чале з З. Серакоўскім. Сябры Іасафата Пятровіча пісалі аб ім у тыя гады, што ён адрозніваўся «ясным, цвярозым, пазітыўным розумам, без усялякіх схільнасцяў да паэтычнай летуценнасці».

У 1849 г. І. Агрызка заканчвае універсітэт і атрымлівае ступень кандыдата права.

Летам 1850 г. ён ужо працуе ў канцылярыі камісіі для рэвізіі і складання законаў (так званая кадыфікацыйная камісія)

Царства Польскага. 20 сакавіка 1852 г. І. Агрызка быў назначаны «па высачэйшаму пажаданню» і «ў выглядзе асобага выключэння з агульных правілаў» чыноўнікам кадыфікацыйнай камісіі ў чыне калежскага сакратара. У 1854 г. ён — тытулярны саветнік, у 1857 г. — калежскі асэсар і малодшы столаначальнік у дэпартаменце горных і саляных спраў.

І. Агрызка атрымлівае рэпутацыю «адаронага, працавітага, добрасумленнага і высакароднага чалавека».

За выдатную і руплівую службу ён неаднаразова заахвочваецца грашовымі прэміямі і ўзнагародамі, атрымлівае бронзавы медаль у памяць аб вайне 1853—1856 гг. Малады чыноўнік карыстаўся вялікай павагай у свайго начальніка. У той час ён меў ужо вялікія сувязі ў рускім грамадстве і ў яго вышэйшых колах.

І.П. Агрызка паспяхова спалучаў службу ў дзяржаўных установах з кнігавыдавецкай дзейнасцю.

У 1858 г. ён заснаваў друкарню, для якой прывёз з-за мяжы абсталяванне. Будучы за мяжой, Іасафат Пятровіч сустрэўся і ўстанавіў кантакты з прадстаўнікамі польскай эміграцыі, у т.л. з Іахімам Лелявелем.

Буйная і добра абсталяваная друкарня карысталася славай лепшай сярод іншых друкарскіх устаноў сталіцы. Аднак Агрызка прымаў да друкавання толькі тыя выданні, якія адпавядалі ідэйнай накіраванасці яго літаратурна-выдавецкай дзейнасці. За час існавання друкарні тут было выдадзена звыш 100 назваў кніг, якія мелі навуковую, агульнаадукацыйную і практычную каштоўнасць.

Адначасова з наладжваннем друкарні Іасафат Пятровіч дабіваецца дазволу ад урада на выданне ў Пецярбургу газеты «Слово»(Slowo) на польскай мове. На старонках газеты знайшлі асвятленне тры галоўныя тэмы: сялянскае пытанне, адукаванасць народа і міжнародная палітыка.

Аднак па палітычных матывах газета хутка была закрыта, а яе выдавец заключаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Але заключэнне было нядоўгім, а сам Агрызка апынуўся на волі. Яго вызваленню садзейнічала заступніцтва ўплывовых асоб і адсутнасць пераканаўчага складу злачынства.

У 1859—1860 гг. І. Агрызка выдаў Збор законаў, статутаў, дагавораў Рэчы Паспалітай пад назвай «Volumina Legum», выдадзеных раней Ордэнам Варшаўскіх піяраў (10 тамоў).

Значную цікавасць маюць выданні, звязаныя з абмеркаваннем сялянскай рэформы. Тут выходзяць чатыры першыя выданні перыядычнага лістка «Землеўладальніцкія заданні», «Зборнік урадавых распараджэнняў па ўладкаванню побыту сялян...», «Асновы палітычнай эканоміі» Міля і іншыя.

У друкарні друкаваліся работы буйнейшых рускіх педагогаў — К. Ушынскага, М. Сямеўскага, В. Золатава, так званыя кнігі для народнага чытання, падручнікі па археалогіі, «Гісторыя сярэдніх вякоў» М. Стасюлевіча, «Апавяданні па рускай гісторыі» В. Вадавозава, прыродазнаўча-навуковая і тэхнічная літаратура.

Пасля смерці М.А. Дабралюбава сябрамі было прынята рашэнне выдаць збор яго твораў. Выкананне гэтага задання ўзяў на сябе М.Г. Чарнышэўскі, які звярнуўся да паслуг выдаўца Агрызкі. На працягу 1862 г. выйшлі першыя чатыры тамы.

Друкарня нашага земляка ў канцы 1850—пачатку 1860-ых гадоў выконвала ролю легальнага апорнага пункта польскага і рускага рэвалюцыйнага падполля ў Пецярбургу.

Тым часам Іасафат Пятровіч працягваў хутка прасоўвацца па службовай лесвіцы. У 1863 г. яму даюць загадванне часовым аддзяленнем дэпартамента падаткаў і збораў, у гэтым жа годзе ўзводзяць яго ў чын калежскага саветніка. У 1861—1862 гг. ён здзяйсняе паездкі ў Вільню, Варшаву, Познань, унутраныя губерні Расіі, дзе, бачна, знаёміцца з дзейнасцю рэвалюцыйных арганізацый.

І.Агрызка падтрымліваў сувязь з будучымі ўдзельнікамі паўстання 1863—1864 гг. — З. Серакоўскім, Я. Дамброўскім, В. Пржыбыльскім. Па прапанове апошняга ў лютым 1863 г. ён быў назначаны агентам Польскага нацыянальнага камітэта ў Пецярбургу.

Вядомы пісьменнік-народнік, удзель-

нік рэвалюцыйнага руху В. Берві-Флярoўскі пісаў: «Я бачу толькі аднаго, якога я мог бы паставіць у адзін рад з ім (Чарнышэўскім), — гэта Агрызку», параўноўваючы, такім чынам, нашага земляка з выдатным рускім рэвалюцыянерам-дэмакратам.

У перыяд паўстання 1863—1864 гг. І. Агрызка перапраўляў моладзь у паўстанцкія атрады, дасылаў карты мясцовасці, збіраў патрэбныя сродкі.

Хоць прамых доказаў, што наш зямляк быў членам «Зямлі і Волі», няма, але менавіта ён ажыццяўляў вясной 1863 г. сувязь паміж Цэнтральным нацыянальным камітэтам у Польшчы і гэтай арганізацыяй. Ён быў знаёмы з братамі А.А і М.А. Серна-Салаўёвічамі, іх звязвала агульная выдавецкая дзейнасць. Агрызка быў адным з тых, каго М.Г. Чарнышэўскі прымаў у сябе ў любы час.

Сувязь І. Агрызкі з рускімі і польскімі рэвалюцыйнымі коламі не засталася не заўважанай царскімі ўладамі. ІІІ аддзяленне даўно звярнула ўвагу на дзіўныя паводзіны віднага пецярбургскага чыноўніка. Нарэшце, па неаднаразоваму патрабаванню М. Мураўёва, 14 лістапада 1864 г. І.П. Агрызка быў арыштаваны ў Пецярбургу і праз два дні дастаўлены ў Віленскую крэпасць.

Царскі суд прызнаў І.П. Агрызку вінаватым «у выкананні абавязкаў Варшаўскага рэвалюцыйнага камітэта ў С.-Пецярбургу» і прыгаварыў да пакарання смерцю. Пазней пакаранне было заменена на 20 гадоў катаргі. Адбываў зняволенне лепельчанін у розных месцах Сібіры: у Акатуі, Якуцку, Вілюйску, Верхнеленску. З 1876 г. і да канца жыцця ён знаходзіўся ў Іркуцку пад пільным наглядам паліцыі, дзе змагаўся з нягодамі, хваробамі. Тут ён займаўся сельскай гаспадаркай, здабычай золата. Аднак гэтыя заняткі не прынеслі яму нават матэрыяльнага дастатку.

Знаходзячыся ў ссылцы, Іасафат Пятровіч Агрызка не згубіў прагі да жыцця, цікавасці да палітычных падзей у краіне.

У ноч з 17 на 18(30) сакавіка 1890 г. І. Агрызка памёр у Іркуцку, дзе і пахаваны. Скончылася жыццё гэтага незвычайнага чалавека, энергія, воля і розум якога прыводзілі ў захапленне сяброў і палохалі ворагаў.

У 1874 г. у пісьме К. Кавеліну ён пісаў: «Мінулае беззваротна, але, дапусціўшы немагчымае, — я не жадаў бы, каб тое, што здарылася са мной, паўтарылася зноў, але, калі б, акрамя маёй волі, абставіны гэтыя паўтарыліся, я б зноў зрабіў так, як я зрабіў».

А. У. Стэльмах

Ян Чачот на Лепельшчыне

Паэт, фальклярыст, перакладчык Ян Чачот з 1833 па 1839 год жыў і працаваў на Лепельшчыне. Некаторыя дакументы аб гэтым перыядзе захоўваюцца ў мясцовым краязнаўчым музеі.

Нарадзіўся Ян Чачот 17 ліпеня 1796 г. у Малюшычы Наваградскага павета ў сям'і дробнай мясцовай шляхты.

Будучы паэт прагна засвойваў беларускія народныя казкі, паданні, песні, якія спявала мясцовае насельніцтва ў час святаў і гульняў, у час вандравання сям'і па Гродзеншчыне.

У Наваградскай павятовай школе ён пазнаёміўся і пасябраваў з Адамам Міцкевічам. У 1815 г. яны разам пераязджаюць у Вільню. Зрабіўшы няўдалую спробу паступіць у Віленскі універсітэт, Чачот уладкоўваўся на працу ва ўпраўленне радзівілаўскіх маёнткаў. Але працягваў наведваць лекцыі ва універсітэце, піша вершы. Ва універсітэце будучы паэт уступіў у студэнцкае таварыства філаматаў (сяброў навук).

На сходах моладзі гучалі і патрыятычныя вершы Я. Чачота:

І наступіць год, дзень гэты,
Выйдуць, рушаць з філарэтаў
Амярцвелыя сарматы
Меч узяць і ўзяць уладу,
Выйдуць, рушаць, як салдаты,
За ўсе крыўды на адплату!

Але ў 1824 г. тайнае студэнцкае таварыства (1817—1823) у Віленскім універсітэце, якое аб'ядноўвала аднадумцаў з Беларусі, Літвы і Польшчы, было раскрыта, яго члены арыштаваны. Ян Чачот быў асуджаны на шэсць месяцаў зняволення з

Указ імператара Мікалая I аб прысваенні Яну Чачоту звання губернскага сакратара. 1838 г.

далейшай бестэрміновай высылкай, якую ён адбываў спачатку ў Кізільскай крэпасці, а затым ва Уфе. І толькі ў 1833 г., пасля 10-гадовага зняволення, Чачот вярнуўся ў Беларусь. У Лепелі ўладкаваўся сакратаром канцылярыі інжынернага ўпраўлення пры Бярэзінскай воднай сістэме. Працягваў збіраць народны фальклор, але з-за цяжкай хваробы цяпер можа толькі з дапамогай сяброў. Такім чынам, Чачот сабраў два зборнікі наднёманскіх і наддзвінскіх песень.

Адзін з рукапісаў мае загаловак «Вясковыя песні з-над Дзвіны, з ваколіц Лепеля і з самога Лепеля, размешчанага над вялікім возерам і выходзячай з яго ракі Улы (часам называемай Ульянкай), якая ўпадае ў Дзвіну пад мястэчкам Улай». У рукапісе адзначана, што «другая яго частка сабрана паміж 1836—1839 гг.», указаны мясціны і колькасць запісаных там песень. Абедзве кнігі з'яўляюцца найбольш ранім зборам народнай паэзіі нашай мясцовасці.

У 1839 г. ён выдаў кніжку «Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны». У ёй змешчаны 94 наддзвінскія і 26 наднёманскіх вясельных, купальскіх, дажынкавых і іншых песень. Паэт выпусціў яшчэ чатыры зборнікі і амаль у кожны ўключыў песні прыдзвінскага краю.

У песнях Яна Чачота сустракаем словы аб цяжкай долі селяніна і яго крыўдзіцелях:

Покуль сонца не ўзыдзе,
Раса выесць вочы;
Кепска, як аконам
Лаяць, біць ахвочы.

Пане ты наш, пане!
Будзь жа нам ласкавы,
Не дай аканома,
Што асцёбаць жвавы...

(«Вясковыя песні...», 1844 г.)

Яну Чачоту належыць прыярытэт у збіранні і даследаванні беларускага дзіцячага фальклору. Ім зроблены ўзоры запісаў калыханак, песень для дзяцей.

З вялікай цеплынёй і спагадай звяртаецца паэт да вясковых дзяцей:

Падрастай, народ маленькі,
Гаспадынькі, араташ,
Адарыць мне вас няма чым —
Шчырым сэрцам адараю.

Але сапсаванае ссылкай і напружанай працай здароўе паэта пагаршаецца. У яго з'яўляецца жаданне пераехаць бліжэй да родных мясцін. З дапамогай сяброў ён уладкоўваецца ў бібліятэку графа Храповіча ў Шчорсах Наваградскага павета.

23 жніўня 1847 г. Ян Чачот памёр у Друскеніках і пахаваны ў суседняй в. Ротніца.

З вялікай пашанай і ўдзячнасцю мы ўспамінаем імя знакамітага паэта, які так многа ўвагі і клопату ўдзяліў нашаму краю, уславіўшы яго сваёй збіральніцкай дзейнасцю.

І. Ю. Януш

ПОКУЛЬ СОНЦА НЕ ЎЗЫДЗЕ...

Покуль сонца не ўзыдзе,
Раса выесць вочы;
Кепска, як аконам
Лаяць, біць ахвочы.
Пане ты наш, пане!
Будзь жа нам ласкавы,
Не дай аканома,
Што асцёбаць жвавы;
Хто мужычкоў глуміць,
Надвое варожыць:
Грош пану ў кішэню,
А два сабе ўложыць.

КАЛІ Ў ЗЯМЛЮ ЗЕРНЕ КІНЕШ...

Калі ў зямлю зерне кінеш,
Нясе табе зёран ста;
Як зарыеш ў зямлю грошы,
Грошы табе паесць ржа.
Чаму ж багач гаршчок грошы
У сыру зямлю закапаў?
Штоб паела ржа чырвонцы,
Гаршочак грошай штоб
прапаў.
Хто ведае, што смерць нясе:
Ці гарачка, ці пярун?
Як не скажаш, то не найдзе
Грошай тваіх сын-пястун.
Лепш бы купіць солі, мыла,
Нарогаў, сярпоў і кос,
І штоб сынок для прадажы
Усюды па сёлах павёз.
Меў бы і ты заработак,
Усё б дома было ў нас;
Не ждалі б мы кварты солі,
Нім пройдзе жыдом
шабас.
Не ржавелі бы чырвонцы,
Чорт не браў бы іх
ў зямлі;
Не быў бы ты бедны з грошмі,
Ні бедны без грошай мы.

Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны. 1844. Т. 4.

ДА МІЛЫХ МУЖЫЧКОЎ

Ды і я вам памагу
Песеньку спяваці,
Ды і я ж між вамі ўзрос
Пры бацьку і маці.
І мне бог на свеце даў
Гора гараваці,
Штобы лепш я вас любіў
І ўмеў спагадаці.
Ой, што ж вы напелі тут,
Ды якога дзіва!
Шкода, што на голас ваш
Старонка драмліва.
Але як прачнецца з сну
Гэта Дабрадзейка,
Пэўна, будзе слухаць вас
Лепш, як салавейка.
Будзем колісь так і мы,
Як тыя гуралі,
Што пан даў ім есць і піць,
Яшчэ й грошы бралі.
Трэба толькі слухаць нам
Рады таго татка,
Што-то казаў гараваць,
Каб аджыла хатка.
Толькі, мусіць, той сынок
Не піў, як мы, водкі,
А то б яму вялеў ён:
Кінь і мёд салодкі.
Ой, гаруйма, братцы, мы,
Кіньма горку жлопель,
Што не з жыта гоняць ўжо,
А з аўса, картопель.
Кіньце першы, жонкі, вы,
Мілыя дзяўчаты,
Доля, шчасце зачне жыць,
Дзе цвяроза хата.
Благаславіць будзе бог
У каморы, аборы,
І не будзе такі люд
Бяссільны, як хворы.
Ой, каб колісь нам дажыць
Да такой паправы,
То запеў бы з вамі я,
Што нам бог ласкавы!

Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны. 1846. Т. 6.

Таленавіты акцёр Карп Саленік

Гэтаму чалавеку было суджана ўпісаць яркую старонку ў гісторыю рэалістычнага тэатра першай паловы XIX ст. Карп Трафімавіч Саленік — буйнейшы камедыйны артыст, які нарадзіўся ў Лепелі ў 1811 г. у сям'і павятовага каморніка. Вучыўся на матэматычным факультэце Віленскага універсітэта, але цяга да тэатра прывяла яго ў 1831 г. у Харкаўскую тэатральную трупу І.Ф. Штэйна, дзе ён уладкаваўся суфлёрам. Праз год пачаў працаваць артыстам гэтага тэатра.

З 1836 г. ён выступаў у трупе Л. Млаткоўскага. У далейшым працаваў у тэатральных калектывах Курска, Кішынёва. Але асноўная акцёрская дзейнасць Саленіка праходзіла ў розных гарадах Украіны. Трупы, у якіх выступаў наш зямляк, былі надзвычай папулярнымі.

З поспехам ішлі п'есы, у якіх ён выконваў галоўныя ролі — Фамусава («Гора ад розуму» А.С. Грыбаедава), Качкарова, Хлестакова, Бобчынскага, Добчынскага, Восіпа («Жаніцьба» і «Рэвізор» М.В. Гогаля), Выбарнага, Вознага, Чупрыны («Наталка-Палтаўка», «Салдат-чарадзей» П. Катляроўскага) і іншых. Творчасць

Саленіка насіла глыбока народны, сапраўдны нацыянальны характар.

Сучаснікі К.Т. Саленіка — М.В. Гогаль, М.С. Шчэпкін, Т.Р. Шаўчэнка — далі высокую адзнаку майстэрству акцёра.

Ва ўзросце 40 гадоў таленавіты акцёр памёр у Харкаве, дзе і быў пахаваны.

Звесткі аб К.Т. Саленіку захоўваюцца ў Лепельскім краязнаўчым музеі.

І. Ю. Януш

З архітэктурнай спадчыны

К началу XVII в. Новый Лепель известен уже под именем «местечка», что свидетельствует о некоторой особой численности его населения, или особом его значении среди окружавших его селений. Быть может, на этот титул влияло появление в Лепеле наряду с церковью православной — что несомненно из дальнейшего — и римско-катол. костела. Это был чуть ли не третий костел во всей земле полоцкой.

Во всяком случае не подлежит никакому сомнению, что к 1604 г. в местечке Новом Лепеле был уже римско-католический костел.

От 1654 г. нам известна ревизия Лепельского костела. Ревизия была произведена ксендзом Симоном-Адальбертом Млынецким, состоявшим в должности визитатора Белой и Черной Руси. Приехал он в Лепель 24 июня 1654 г., но ксендза не застал. Последний за три дня до приезда визитатора под предлогом опасности от нашествия московских войск, которые меньше всего тогда могли угрожать Лепелю, оставил приход и костел и уехал неизвестно куда, забрав с собой наиболее ценные вещи из костельной утвари и местно-чтимую икону Богоматери.

Визитатор мог сделать только внешнее описание костела и дома приходского ксендза. Документальных данных в визите не приводится.

Из этой визиты мы узнаем, что представлял собой тогдашний Лепельский костел.

Лепельский костел во имя св. Казимира — патрона Велик. княж. Литовского — был деревянный в виде корабля. При ревизии стены найдены были ненадежными и гнилыми, усмотрена крайняя нужда в спешной реставрации. Окон в нем было: больших — 3, меньших — 2. Пол из неровных кирпичей. В костел вело крыльцо, сделанное из кольев. Близ костела на цвинтаре была звонница под большими воротами, построенная в виде башни, на ней три колокола, из которых самый большой 8 пудов.

Цвинтарь был обнесен бревенчатым забором и позади костела был весьма тесен, к тому же вода, падавшая с соседней крыши, действовала разрушительно на этот забор.

В костеле было три алтаря... больший — в нем Распятие с предстоящими Богоматерью и Иоанном Богословом; внизу — образ святителя Николая, вверху — св. Казимира, патрона Велик. княж. Лит., и на самой вершине имя «Iesus», написанное золотом и серебром. Второй — новый алтарь — Богоматери, образ которой, писанный на дереве, известен благодеяниями и чудесами, этот образ взят со всеми 30 табличками ксендзом, и поставлена на место его другая маленькая икона Пресвятой Девы с Предвечным Младенцем на руках; вверху — св. Доминик, молящийся пред Распятием; на самом верху имя «Мариа» третий алтарь из пары образов — внутренний Пресвятой Девы на облаках с младенцем Иисусом, а вверху Распятие с предстоящими. На самом же верху образ св. Казимира.

Различных образов на стенах костела десять. Орган на пять голосов, уже разломанный. Одежды: 3 антепедия, из них два из материи, называемой «nedra», и третий с изображением св. Казимира среди неба. Хоругви — 4, венцов — 2, утиральников — 2, покровов — 4.

Дом для приходского ксендза находился рядом с костелом, на фундушовой земле. Дом был большой, с низкою кры-



Выява горада Лепеля. Другая палова XIX ст.

шей. Рядом каменная со сводом баня в две комнаты и алькерж с передней. Конюшня и повет. Весь двор огорожен кольями с воротами.

Костелу принадлежало 18 подданных, которые жили близ местечка на 4 участках. Из этих участков одним пользовался «кантор».

В 1779 г., 8 сентября, в Лепеле был значительный пожар, во время которого сгорел костел, построенный еще канцлером Львом Сапегой, а также сгорела и униатская церковь.

17 марта 1845 г. прибыл в г. Лепель архиепископ Василий со своей свитой. 18 марта в сослужении архимандрита Витебского Маркова монастыря Павла, протоиерея Иоакима Копаевича и священников Василия Акимова (Леп. соб.), Никодима Редутто (Добрыгорской цер.) и Петра Пясковского (Старолеп. ц.), протодиакона и двух диаконов архиепископ торжественно освятил вновь построенный собор в г. Лепеле. Главный алтарь был устроен в честь Преображения Господня, правый — во имя Николая Чудотворца и левый — в честь Рождества Богородицы.

Мысль о постройке в Лепеле православного собора, возникшая в начале 30-х годов, наконец в 1839 г. получила утверждение верховной власти. В августе 1839 года из Свят. Синода преосв. Исидор получил извещение, что на постройку православного храма в Лепеле ассигновано 64 020 р. 25 к. ассигнациями (или 18 291 р. 49 $^{1}/_{4}$ коп. сереб.), из которых 20 357 руб. асс. (или 5816 руб. 28 коп. серебр.) ведомства путей сообщения и 43,663 руб. 25 коп. (или 1245 руб. 21 $^{1}/_{4}$ коп. серебр.) из синодального духовно-учебного капитала. В конце 1839 г. были получены из С.-Петербурга утвержденные планы этого храма, и наконец в 1840 г. состоялись торги на постройку храма. На торгах постройка осталась за помещиком Себежского уезда Петром Керном за сумму 64 000 руб. ассигн., — при этом подрядчик предложил вместо деревянного построить каменный храм, только лишь с деревянным куполом, и сделать вокруг храма деревянную ограду в каменных столбах.

Потребовались новые хлопоты об утверждении давно облюбованного православным причтом места для постройки храма и разрешении на сооружение каменного храма вместо деревянного.

18 апреля 1841 г. состоялось Высочайшее утверждение плана местности для сооружения в Лепеле православного собора. 10 же августа 1841 г. лепельский протоиерей Стефан Пороменский вместе с причтом лепельского собора освятил место.

За постройкою собора следила комиссия из соборного причта, старосты и управляющего Березинскою системою, подполковника инженера Тюфяева. Собор строился три года. Много забот доставили обильные подпочвенные воды на месте постройки.

18 октября 1844 г. постройка была освидетельствована особой комиссией, в состав которой входили бобыничский благочинный Иоанн Лаппо, священник Старо-Лепельской церкви П. Пясковский, витебского строительного присут. архитекторский помощник Димитриев, начальник I отд. XI окр. путей сообщения майор Витейлер и местный причт собора. Собор вышел достаточно поместительным, но по наружной форме продолговатого четырехугольника и по внутренней архитектуре — без всяких особых претензий. Разве только обращала внимание передняя башня, в которой помещаются колокола, поднимающаяся длинной узкой пирамидой вверх, — характерная особенность храмов Николаевского времени.

В 1868 г. на Прудовой улице, у богадельни, построена деревянная церковь во имя великомученицы Параскевы Пятницы.

В 1876 г. окончен на средства дворянина Мальческого и освящен во имя св. Казимира каменный костел в Лепеле, заложенный в 1857 г. Исторические сведения о сооружении этого костела сохранились следующие.

В 1852 г. 19 июля последовало разрешение центрального управления на построение в Лепеле каменного костела, вместо сгоревшего в пожар 1833 г.

Появление костела в г. Лепеле, как видно из фундушовой записи Льва Сапеги, было делом миссионерской ревности этого вельможи, как и наделение имением Лепель монашек — бернардинок виленских. Нужды в этом костеле не существовало. Костел Сапежинской постройки существовал до 1779 г., когда сгорел в 8 день сентября. Вскоре отстроенный, костел достоял до 1833 г., когда в пожар с 27 на 28 апреля сгорел дотла со всем имуществом. Об этом костеле известно, что он был деревянный, из тесаного леса, на каменном фундаменте, размерами $15 \times 8\,^{2}/_{3}$ саж., с 2 башнями в высоту 10 саженей, с двумя склепами, выстланными кирпичами. Сохранился любопытный список убытков, понесенных костелом в пожар 1833 г., составленный ксендзом Иосифом Микошей.

Орган отчасти вытащен, но перепорчен и требует большой починки	1300 р.
Шафа, в коей сохранялись св. олеи	10 р.
4 серебряные бляшки по 4 лота	15 р.
15 хитонов ткацких	12 р.
1 подризник швабского холста	15 р.
9 комж для прислуг во время богослужения	45 р.
4 епитрахили штофовые, 4 поручи штофовые и 12 воздухов для покрытия сосудов	60 р.
4 прикрытия на престолы	20 р.
5 утиральников	5 р.
3 престольных одежды	30 р.
1 занавес шелковый с голунами	100 р.
2 занавеса простого дамашку, вместо ковров употреб.	20 р.
2 требника	5 р.
1 евангелие	7 р.
1 кафедра для слушания исповеди	25 р.
9 лавок	50 р.
1 рама образа св. Антония	10 р.
1 колокольня, вновь построенная	75 р.
1 колокол большой, разбитый весом в $3\,^{1}/_{2}$ пуда	210 р.
2 малых колокольчика при алтаре	10 р.
Итого:	2049 р.

Отсюда прямо можно заключить о бедности костела. В 1852 г. прихожан костела считалось 1719 душ и состояло в приходе 4 приписных костела (почему-то именуемых каплицами):

1. В им. Воронь, устроенный в 1772 г. и ремонтированный в 1841 г. помещиком Селявою;

2. В им. Завидичи — построен в 1805 г. подкоморием Свяцким;

3. В м. Пышно, устроенный около 1780 г. камергером польского двора Кацицом;

4. В им. Лутики, построенный в 1802 г.

24 июля 1900 г. освящена во имя св. великомученика Георгия Победоносца вновь сооруженная каменная церковь на Георгиевском кладбище в Лепеле. Это кладбище, несомненно, представляет древнейшее церковище.

Здесь с незапамятных времен существовала Георгиевская церковь — откуда название кладбища — и в половине XVIII в. пришла в полное разрушение. Местность около кладбища омывается с севера Лепельским озером, с востока — р. Эссой, а с юго-запада — озером Прошо и представляет место древнейшего поселения в Лепеле. Недаром А.М. Сементовский даже называет эту часть Лепеля «Старым Лепелем», смешивая его с нынешним селом «Старый Лепель».

З кнігі Дз.І. Даўгяла «Лепель, павятовы горад Віцебскай губерні». Віцебск, 1905.

Нікольская царква

Никольская церковь существовала в Старом Лепеле до II-ой половины XIX века, когда она за ветхостью разобрана, а ея утварь перенесена в другую — Преображенскую церковь. Преображенская церковь также очень древняя. В 1900 году мы видели в Старолепельской церкви на разбитом колоколе, весом около 5 пудов, такую надпись, сделанную древнеславянским шрифтом: «сей звон роблен до Старого Лепля коштом и накладом всих мещан до церкви Преображения Господа нашего Исуса Христа року (1673) месяца августа (27) дня. Дилател Тимофей Яковлевич».

З кнігі Дз.І. Даўгяла «Лепель, павятовы горад Віцебскай губерні». Віцебск, 1905.

Камень — Губіна

Раней гэтая парафія называлася Камень і касцёл парафіяльны быў у Камені. Але, на жаль, касцёл гэты мы згубілі і маем толькі малую капліцу. Парафія перанесена да важнай францысканскай святыні ў Губіне. Гэтае малое мястэчка калісьці было ажыўленым. З аднаго боку, сюды ехалі з асабістым інтарэсам або з нагоды набажэнства, бо манастыр касцёла францысканцаў быў вельмі прыстойным і прывабліваў да сябе людзей. Сёння замест многіх манахаў — толькі адзін свяшчэнаслужыцель.

Парафія займае вялікую тэрыторыю і працягнулася на 30 вёрст, тым больш што да яе далучылі некалькі ліквідаваных парафій — Чашнікі, Кублічы, Белы Камень. У парафіі 1815 веруючых.

Як і ва ўсім павеце, у парафіі шмат азёр. Мясцовасць узгорыстая, зямля нядрэнная, аб чым сведчыць дабрабыт мясцовых жыхароў. Сёння маёнткі прыходзяць у заняпад.

Раней тут жылі вядомыя роды Рэутаў, Корсакаў, якія атрымалі ад караля вялікія надзелы. Сёння тут бачны толькі руіны. Такое старажытнае, калісьці вядомае, Паазер'е зараз у запусценні.

Прыхаджане — часцей дробная шляхта, што на арэндзе, часта пераязджала, жыла раскідана. У Губінскай парафіі няма суцэльных каталіцкіх пасяленняў. Усё перамяшалася. Некалі блукаючы каталік-гандляр пасяліўся ў Губінскай парафіі, што рэдка здаралася ў гэтых месцах. Больш католікаў жыве пад Чашнікамі, дзе маюць заробак ад папяровай фабрыкі пана Сялявы. Колькасць католікаў змяншаецца, бо многія выязджаюць у Амерыку. Ёсць сярод прыхаджан крыху літоўцаў, якія пры распродажы маёнткаў купілі сабе па ўчастку зямлі.

Як мы ўжо ўспаміналі раней, у Камені была парафія. Але прыгожы касцёл быў зачынены, а на прыходскі касцёл быў прызначаны стары драўляны будынак на могільніку. Думалі аб пабудове новага касцёла ў Камені. .Быў закладзены ўжо падмурак, але задума засталася неажыццёўленай. А на могільніку акрамя капліцы засталіся толькі падмуркі. Камень раней меў толькі капліцу, каля якой жылі ксяндзы-пенсіянеры.

У 1796 г. у Камені пабудаваны драўляны касцёл у Імя Святога Казіміра і адкрыта парафія. У малым мястэчку Губіна, акружаным некалькімі яўрэйскімі хаткамі, узвышаецца вельмі вялікі цагляны касцёл, пабудаваны ў 1714 г. полацкім стольнікам (прыдворным, ступенню ніжэйшым за баярына) Янам Пакошам у імя Святога Антонія. Дзякуючы Пакошаву пабудаваны таксама 2-павярховы кляштар (каталіцкі манастыр) францысканцаў. Касцёл пабудаваны ў форме крыжа, мае тры алтары, большы з якіх у гонар найсвяцейшай панны Марыі, умела выразаны з дрэва. Звяртае на сябе ўвагу прыгожы бакавы алтар у імя найсвяцейшай панны Марыі Вострабрамскай. У зручны час быў атрыманы дазвол на адкрыццё тут школы. Але, на жаль, гэты будынак зараз пустуе.

З настаяцеляў успомнім ксяндза Нарвайша, які кіраваў парафіяй 45 гадоў, і ксяндза Бема. Зараз ужо 12 гадоў кіруе парафіяй ксёндз Зарэмба, які шмат зрабіў для абнаўлення касцёла. Пры добрай захаванасці плебаніі (дома, дзе жыў ксёндз) захавалася яшчэ бібліятэка і багаты архіў манахаў-францысканцаў.

Маюцца капліцы ў Камені, Іванску, Паульску ў імя Ісуса і ў Сушы, пабудаваны Юзэфам Шчытам у 1789 г.

З кнігі «Нашы касцёлы 1910-ых гадоў». Пераклад з польскай мовы М.М. Янчышына, ксяндза Лепельскага касцёла Св. Казіміра

Выходзілі часопіс і газета

У пачатку дваццатага стагоддзя пераважнае развіццё ў нашым краі атрымала сельскагаспадарчая вытворчасць. З гэтай нагоды адпаведнае месца займала прапаганда сельскагаспадарчых ведаў, якія былі разлічаны на шырокае кола вясковых чытачоў. Шматлікія газеты і часопісы ў Беларусі распаўсюджвалі навуковыя веды, якія дапамагалі сялянам з большай карысцю і аддачай весці сваю гаспадарку.

Так, у Лепелі з 21 кастрычніка 1911 г. па 24 красавіка 1912 г. было выдадзена 26 нумароў штотыднёвіка грамадска-эканамічнай газеты «Лепельскі веснік» (рэдактар-выдавец М. Л. Хатаевіч). Выходзіў таксама два разы ў месяц эканамічны і сельскагаспадарчы часопіс «Весткі Лепельскага таварыства сельскай гаспадаркі». Рэдактарам-выдаўцом быў О.П. Лісоўскі, які выдаў 18 нумароў з 4 красавіка па 26 снежня 1913 г.

Якія мэты ставілі газета і часопіс? Самыя высакародныя. Сельскагаспадарчыя і эканамічныя выданні былі скіраваны на тых, хто цікавіўся поспехамі сельскай гаспадаркі, прагрэсам земскай справы, якая атрымала вялікае развіццё і паўсюднае прызнанне. Яна стала магутным рухавіком не толькі сельскагаспадарчай, але і агульнай культуры краю. Не ідэалагічныя і заклікальныя меры ставілі перад сабой выданні, а жаданне «па меры сіл і сродкаў» служыць шырокім інтарэсам сельскай гаспадаркі і папулярызацыі земскіх пачаткаў у нашым родным кутку.

У № 4 «Вестак Лепельскага таварыства сельскай гаспадаркі» сустракаем сцвярджэнне, што часопіс з'яўляецца органам, які папулярызуе ў магчымай меры тэарэтычныя звесткі з галін аграноміі, жывёлагадоўлі, раслінаводства, ветэрынарыі і іншых, звязаных з сельскай гаспадаркай навук. Выданні шчодра дзяліліся з чытачамі практычнымі навыкамі аб поспехах, дасягнутых у галіне сельскай гаспадаркі, а таксама аб вопыце вядомых тэарэтыкаў і практыкаў па гэтым пытанні. На старонках перыядычнага друку вяліся рубрыкі са звесткамі аб цэнах на рабочыя рукі і сельскагаспадарчыя вырабы, на куплю-продаж зямлі, лесу, прадуктаў.

На старонках часопіса і газеты друкаваліся адказы рэдакцыі на пытанні чытачоў па справах, якія іх цікавілі. Характэрна, што гэтым выданням у той час не патрэбна была матэрыяльная падтрымка, а толькі маральная ў асобе супрацоўнікаў і карэспандэнтаў пераважна мясцовай інтэлігенцыі, якая блізка стаяла да зямлі і земскай справы.

«Восенню наступнага года, — чытаем у артыкуле «Лепельскага весніка» за 21 кастрычніка 1911 г., — у нас мяркуецца правядзенне сельскагаспадарчай выставы. Мае намер арганізаваць яе Лепельскае таварыства сельскай гаспадаркі. Як на месца будучай выставы ўказваюць на вялікі сад, які належыць духоўнаму ведамству і размешчаны побач з казармай гарнізоннай каманды (у раёне сучаснай вуліцы Інтэрнацыянальнай). У арганізацыі выставы прымуць актыўны ўдзел прадстаўнікі Лепельскага павятовага земства, якое акажа выставе грамадскую дапамогу».

У артыкуле «Купілі зямлю» чытаем: «У Лепельскім павеце ў фальварку Белае з двара Забелы куплена вёска Гаравыя сялянамі, стварыўшымі таварыства з 8 гаспадароў, — 56 дзесяцін за 5921 руб. 90 кап. У фальварку Межыца з двара Здраеўскай куплена Іўкаўскім таварыствам (42 гаспадары) 35 дзесяцін за 3500 руб.».

Хочацца адзначыць, што пытанні развіцця сельскай гаспадаркі з'яўляюцца актуальнымі і сёння, хоць з часу выхаду ў свет лепельскіх выданняў па гэтым пытанні прайшло больш чым 80 гадоў.

І. Ю. Януш

Яны вывучалі наш край

Лепельскі археолаг, краязнавец М.Ф. Кусцінскі

У адзін з цёплых вераснёўскіх дзён мне пашчасціла зрабіць падарожжа да мясцін, дзе жыў, займаўся навуковай працай наш знакаміты зямляк Міхаіл Францавіч Кусцінскі — археолаг, гісторык, краязнавец. Гэта быў адзін з нямногіх памешчыкаў Віцебскай губерні, які, атрымаўшы універсітэцкую адукацыю, паспяхова займаўся сельскай гаспадаркай і адначасова навуковай работай — археалагічнымі даследаваннямі і калекцыяніраваннем.

Вось сядзіба Кусцінскіх. Яна была акружана садам, які займаў не менш трох дзесяцін. Дом знаходзіўся на адлегласці 50—70 метраў ад возера. Сад быў абнесены «жывой» агароджай з галінастых елак і кучаравых ліп. На гэтай тэрыторыі і сёння растуць экзатычныя дрэвы з іншых краёў, здзіўляючы сваёй незвычайнасцю.

На месцы дома былога гаспадара засталіся контуры падмурка з каменя, добрай якасці чырвонай цэглы, якая змацоўвалася вапнавым растворам. Асобныя цагліны добра захаваліся.

А вось і само возера. Паўночную частку яго называюць Кусцінскім. Тут яго шырыня метраў 800—1000. Яркія водбліскі нізкага сонца над вадой слепяць вочы. Дымчатая смуга сцеліцца над воднай гладдзю.

Блізка ад дарогі ў акружэнні старадаўніх таполяў, ліп і лістоўніц, пасаджаных у мінулым стагоддзі, стаяў рымскакаталіцкі касцёл, пабудаваны ў 1805 г. падкаморыем Свяцкім. Відаць, сюды прыходзіла сям'я Кусцінскіх, іх чэлядзь, сяляне. Гэтая культавая ўстанова была разбурана ў 1950-ыя гады.

І вось у гэтым асяроддзі, паміж родных сэрцу палёў і вадаёмаў, гоману мілагучнай беларускай мовы, нарадзіўся 28 (16) верасня 1829 г. Міхаіл Кусцінскі. Атрымаўшы першапачатковую адукацыю на Лепельшчыне, ён скончыў Віленскі дваранскі інстытут і юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Але пасля вучобы Міхаіл Францавіч асноўным заняткам выбраў няпростую работу археолага.

Сваю навуковую дзейнасць ён пачаў у 1852 г. археалагічнымі раскопкамі на водападзеле паміж вытокамі рэк Волгі, Дняпра і Заходняй Дзвіны, на радзіме старажытных крывічоў. Паспяхова даследаваў некалькі дзесяткаў курганоў, два гарадзішчы, Гнездаўскі курганны могільнік. Старанна вёў дзённікі раскопак, якія пазней перадаў у Маскоўскае імператарскае археалагічнае таварыства.

Думкі аб родным краі не пакідалі маладога вучонага. Ён разумеў, што Лепельшчына, размешчаная на старажытным шляху «з варагаў у грэкі», была даволі шчыльна заселена. Многія курганы, могільнікі, гарадзішчы, селішчы з'яўляліся пацвярджэннем гэтаму.

У 1855 г. М. Кусцінскі канчаткова пасяліўся ў сваім памесці Завідзічы. Тут ён правёў раскопкі курганных насыпаў у Гутаўскай лясной дачы, у Бяздзедавічах, Завідзічах, каля Бораўна, м. Кублічы, у Лепелі і інш.

У 1861 і 1883 гг. ля м. Кублічы археолаг знайшоў жалезныя сякеры, дзіды, гліняную лямпу з адтулінай для кнота і інш. Сабраная вучоным багатая калекцыя каменных, бронзавых, жалезных, гліняных і інш. прадметаў трапіла ў музеі Віцебска, Расіі, Польшчы. У 1871 г. прыняў удзел у мастацка-археалагічнай выставе ў Менску.

Матэрыялы раскопак М. Кусцінскі фатаграфаваў. Гэта перарасло ў сістэматычнае складанне фотатэкі (першае ў Беларусі) помнікаў старажытнасці Віцебскай і суседніх губерняў. Найбольш плённым вынікам яго шматгадовай працы было стварэнне археалагічнай карты Лепельскага павета.

Захавалася некалькі яго навуковых публікацый у перыядычным друку. Гэта «Заметкі аб археалагічных раскопках у Віцебскай губерні» (1860), «Вопыт археалагічных даследаванняў у Лепельскім павеце Віцебскай губерні» (1865), «Заметка аб знаходках у Віцебскай губерні ў курганах са спаленнем» (1871), «З заметак аб курганах Лепельскага павета» (1903).

Міхаіл Францавіч вывучаў таксама Ба-

рысавы (Дзвінскія) камяні, помнікі XII ст., збіраў этнаграфічныя звесткі аб жыхарах роднага краю.

Яго самаадданая і настойлівая праца стала вядома шырокай грамадскасці. За вялікі ўклад у навуковыя даследаванні Лепельскага краю ён быў абраны членам-карэспандэнтам, а з 1874 г. — сапраўдным членам Маскоўскага імператарскага археалагічнага таварыства.

Кусцінскія мелі 1180 дзесяцін зямлі (1878) з палямі, лясамі, вадаёмамі, вёскамі, да якіх былі праведзены грунтавыя дарогі. Міхаіл Францавіч клапаціўся аб паляпшэнні зямлі, праводзіў меліярацыйныя работы. Сляды глыбокіх каналаў захаваліся да нашых дзён.

Шматгаліновая гаспадарка ў маёнтку вялася на высокім агратэхнічным узроўні, выкарыстоўвалася шматполле. Тут вырошчваліся палявыя, агароднінныя і кармавыя культуры, лён. Утрымлівалася вялікая колькасць буйной рагатай жывёлы, коней, авечак, свіней. Вялася селекцыйная работа, прымяняліся арганічныя і мінеральныя ўгнаенні...

Кранаюць і яго гуманныя захады дапамагчы слабым і бедным, што прывяло яго ў рады папячыцеляў Лепельскай павятовай бальніцы. 2 ліпеня 1875 г. калежскі сакратар М.Ф. Кусцінскі быў абраны ганаровым міравым суддзёй Лепельскай акругі.

Памёр знакаміты лепельчанін у 1905 г. Уся яго навуковая і грамадская дзейнасць выклікае глыбокую павагу і ўдзячнасць.

І. Ю. Януш

Апісанне герба роду Кусцінскіх

ГАЛАЎНЯ II — у чырвоным полі сярэбраны знак. Над шчытом княжацкая мітра.

Кароткі радавод сям'і Кусцінскіх

КУСЦІНСКІ. КУСТЫНСКІ. ГАЛАЎНЯ II з Кусціна ў Навагародскім ваяводстве.

Ян Кустынскі гарадскі аршанскі пісар 1625—1626 гадоў. Ян Кусцінскі мінскі каморнік 1777.

Герб роду Кусцінскіх

Стэфан Кусцінскі полацкі гарадскі рэгент з Альжбетай Церпілоўскай меў сына Францішка ў лепельскім маёнтку Завідзічы.

Сын Францішка Міхаіл з маёнтка Завідзічы, ганаровы лепельскі суддзя 1880 г., ажаніўся на Махчынскай Канстанцыі. Іх дачка Марыя абвянчалася з Даніэлем Венцлававічам. Сын Чэслаў 1864 г. нараджэння жанаты ў 1892 г. на Тэклі Косак.

З «Залатой кнігі польскай шляхты» (Пераклад з польскай мовы)

Лепельскі настаўнік і краязнаўца

Віцебшчына з'яўляецца радзімай фальклярыста і этнографа, гісторыка і пісьменніка, выдатнага даследчыка роднага краю Івана Данілавіча Гарбачэўскага (1860—1914). Скончыўшы Полацкую настаўніцкую семінарыю (1877) і Віленскі настаўніцкі інстытут (1885), наш зямляк працаваў выкладчыкам гісторыі, рускай мовы ў Далыскім народным, Невельскім павятовым, Лепельскім гарадскім вучылішчах, дзе зарэкамендаваў сябе таленавітым педагогам. Былы вучань І.Д. Гарбачэўскага Варлам Рыгоравіч Пазняк, жыхар Лепеля, які сам пазней стаў настаўнікам, у сваіх успамінах за 1888 г. адзначыў: «У 1887/88 нав. годзе ў Лепельскім гарадскім двухкласным вучылішчы, дзе вучыўся я, з чатырма аддзяленнямі працаваў настаўнік Гарбачэўскі Іван Данілавіч. У


ЛЕПЕЛЬСКІЙ УѢЗДЪ

Витебской губерніи.

„За Лепелемъ и свѣту конецъ, и небо съ землей сошлося".

(Старин. нар. поговорка)

СОСТАВИЛЪ

И. Д. Горбачевскій.

ВИТЕБСКЪ.

Губернская Типографія.

1895.

БІБЛІАТЭКА БЕЛАРУСКАГА НАВУКОВАГА Т-ва ў Вільні.

Вокладка кнігі Г. Д. Гарбачэўскага «Лепельскі павет Віцебскай губерні»

дапамогу сабе ён нярэдка запрашаў лепшых вучняў старэйшых класаў, якія працавалі з малодшымі школьнікамі. Настаўнік Гарбачэўскі да сваіх выхаванцаў адносіўся ўважліва, добра ведаў сваю справу і зусім не ўжываў насільных дзеянняў у адносінах да вучняў».

Малады настаўнік любіў дзяцей, пісаў для іх казкі, апавяданні. Круг інтарэсаў у яго быў надзвычай шырокім і разнастайным. Ён зацікавіўся мясцовым фальклорам, старажытнай гісторыяй Беларусі, «вялікім перасяленнем народаў», у якім у VI—VIII стст. удзельнічалі і нашы продкі — славяне, што прасоўваліся ўздоўж рэк з поўдня на поўнач Беларусі ў лясную зону.

Стараннага і дапытлівага настаўніка заўважылі і абралі сябрам Педагагічнага таварыства выдатнага славянскага педагога Яна Амоса Каменскага, якое дзейнічала пры педагагічным музеі ў Пецярбургу.

Сабраўшы вялікую колькасць фактычнага матэрыялу, Іван Данілавіч пачаў друкаваць свае праблемныя даследаванні на старонках мясцовых перыядычных выданняў: «Витебские губернские ведомости», «Виленский вестник» і інш. Яго навуковыя здабыткі знайшлі адлюстраванне ў працах «Пра волакі Вялікага воднага шляху з варагаў у грэкі» (1894), «Зямля і Араты» (1894), «Уніз па Дзвіне» (1895) і інш. Фальклорна-этнаграфічны матэрыял выкарыстаны аўтарам у аповесцях «Даўніна старадаўняя» (1897), «Што з ёю будзе?» (1898) і інш.

З асаблівай цеплынёй і стараннасцю апісвае Іван Гарбачэўскі Прыдзвінскі край у нарысе «Лепельскі павет Віцебскай губерні» (1895). У яго працы знаходзім цікавыя звесткі аб асаблівасцях прыроды і гаспадарчай дзейнасці насельніцтва, па гісторыі і культуры Лепельшчыны, дзе ён некаторы час жыў і працаваў.

У канцы XIX—пач. XX ст. І.Д. Гарбачэўскі жыў удалечыні ад радзімы. Ён быў пераведзены на службу ў Закаўказскую вучэбную акругу, бо меў ужо багаты вопыт навуковых даследаванняў. Тут ён з вучнямі старэйшых класаў накіроўваўся ў экспедыцыі для вывучэння прыроды, быту насельніцтва паўднёвай часткі Кубанскай вобласці, дзе ажыццявіў нямала падарожжаў, у тым ліку і па горнай мясцовасці, перабіраючыся праз высокія перавалы да горада Сухумі.

Пазнаёміўшыся з жыццём горцаў, іх этнаграфіяй і фальклорам, краязнаўца зрабіў некалькі запісаў у часопісе «Матэрыялы для апісання мясцовасці і плямён Каўказа».

Аднак у думках Іван Данілавіч заўсёды быў побач з Беларуссю. Працуючы на новым месцы, ён супастаўляў, параўноўваў, дзяліўся сваімі думкамі з роднымі і сябрамі. У лістах на радзіму ў 1898 г. ён паведамляў: «Займаўся з вучнямі шаўкаводствам, атрымаў каля пуда шоўку» або «Я абяцаў прыслаць некалькі каўказскіх пчаліных матак, але, па існуючых паштовых правілах, перасылка пчол дазваляецца толькі ў пункты, дзе праходзіць чыгунка.

Я адпраўлю пасылку ў Віцебск. Прашу пасля атрымання пошты знайсці спосаб пераслаць пасылку ў Невель, і каб найхутчэй, бо затрымка пасылкі і пераварочванне яе ўверх дном... баюся, каб пчолкі не загінулі».

На працягу ўсяго жыцця Гарбачэўскі займаўся пчалярствам, клапаціўся аб яго развіцці і пашырэнні на Беларусі. У рукапісным артыкуле аўтар распавядае, што на Лепельшчыне ў Фатыні жыве пчаляр і садоўнік Восіп Кандратавіч Мароз. Гэта выдатны гаспадар. На кожным кавалачку зямлі ў яго садзе паміж дрэвамі каля пчальніка растуць меданосныя травы. Іван Данілавіч раіць маладым пчалярам-аматарам абавязкова наведаць Фатынь, павучыцца, пераняць вопыт, як трэба даглядаць «божую пчолку».

У апошнія гады свайго жыцця І.Д. Гарбачэўскі працаваў выкладчыкам на Магілёўшчыне, Гродзеншчыне. Дапытлівы і назіральны настаўнік-краязнаўца пакінуў багатую спадчыну сваіх даследаванняў у педагагічнай справе, па гісторыі і культуры роднага краю.

І. Ю. Януш

Даўгяла Дзмітрый Іванавіч

Беларускі гісторык, архівіст, крыніцазнавец. Нарадзіўся 20.10 (1.11) 1868, в. Казьяны Гарадоцкага пав. Віцебскай губ. — памёр красавік 1942 у сям'і свяшчэнніка Іаана Даўгялы. Адукацыю атрымаў у Віцебскай духоўнай семінарыі і Пецярбургскай духоўнай акадэміі, якую скончыў у 1894 г. Працаваў выкладчыкам у мужчынскай гімназіі, у духоўнай семінарыі Віцебска.

З 1897 г. Дзмітрый Іванавіч працаваў у Віцебскім, а з 1903 г. у Віленскім цэнтральным архівах старажытных грамат, адначасова займаючыся і выкладчыцкай дзейнасцю ў мясцовых навучальных установах. З 1906 г. рэдагаваў газету «Белая Русь».

У 1906—1915 гг., будучы членам Віленскай археалагічнай камісіі, Дз. Даўгяла паспяхова супрацоўнічаў з Рускім геаграфічным таварыствам, Віленскай навучальнай акругай, стаў ганаровым членам Віцебскай вучонай архіўнай камісіі.

Дз. І. Даўгяла

З 1915 г. ён працаваў у архіве Магілёва, быў прыхільнікам беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, прыняў удзел ва Усебеларускім кангрэсе 1917 г.

У 1921 г. Дзмітрый Іванавіч быў прызначаны загадчыкам Магілёўскага губернскага архіва. З 1925 г., будучы дацэнтам Белдзяржуніверсітэта, ён супрацоўнічаў з Інбелкультам, быў дырэктарам бібліятэкі, навуковым супрацоўнікам Акадэміі навук БССР.

Дз. Даўгяла быў удзельнікам, складальнікам, рэдактарам «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» (т. 27—32, 1899—1906), «Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі» (т. 32—37, 1907—1912), «Беларускага архіва» (т. 1—3, 1927—1930), «Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах» (т. 1, 1936) і інш. Ён быў аўтарам шматлікіх артыкулаў па гісторыі гарадоў і мястэчак Беларусі. Яго навуковыя распрацоўкі вызначаліся грунтоўнасцю, высокім навуковым узроўнем даследавання. Яшчэ і сёння можна ўбачыць на першакрыніцах заўвагі, пометкі, спасылкі вучонага ў архівах Мінска, Віцебска, Магілёва, Вільнюса.

Але праца вучонага была нечакана перапынена. 10 снежня 1937 г. па неабгрунтаваным абвінавачванні ён быў арыштаваны і па пастанове несудовых органаў у 1939 г. высланы ў Казахстан на 5 гадоў, дзе і памёр у 1942 г. Рэабілітаваны 9 чэрвеня 1964 г.

Некаторы перыяд жыцця Дз. Даўгялы звязаны з Лепельскім краем, калі яго бацька Іаан Максіміліянавіч быў праведзены протаіерэем (старшым па чыну свяшчэннікам) лепельскага Свята-Праабраджэнскага сабора. Дзмітрый Іванавіч

ражэнскага сабора з 1896 г. і назіральнікам царкоўнапрыходскіх школ павета. Наведваючы ў летнія месяцы Лепель, Дзмітрый Іванавіч зацікавіўся мінулым горада, вывучыў архіўныя дакументы аб ім. У выніку была напісана кніга «Лепель, павятовы горад Віцебскай губерні», Віцебск, 1905, прысвечаная 100-гадоваму юбілею з дня прысваення мястэчку статуса горада. У кнізе знайшлі адлюстраванне важнейшыя падзеі на нашай зямлі са старажытных часоў да пачатку XX ст., выкладзеныя ў пэўнай храналагічнай паслядоўнасці.

Бацька Дзмітрыя Іаан Максіміліянавіч Даўгяла памёр у 1902 г. і пахаваны ў Лепелі на Георгіеўскім могільніку каля каменнай царквы, асвечанай ім у 1900 г.

Сёння мы з удзячнасцю ўспамінаем сына і бацьку Даўгялаў, якія плённа працавалі на карысць роднага краю.

І. Ю. Януш

Нястомны даследчык роднага краю

РЫГОР КЛАДНІЦКІ

У першай палове мінулага стагоддзя ў Пецярбургу было створана Рускае геаграфічнае таварыства. У яго ўвайшлі многія вучоныя — гісторыкі, географы, этнографы. Яны вывучалі гісторыю, моўныя асаблівасці народаў, якія жылі як у цэнтральнай частцы Расіі, так і на яе ўскраінах. Былі сабраны багацейшыя звесткі аб быце, культуры сялян, старажытных помніках, вырабах народнай творчасці.

У гэту справу на месцах уключыліся многія настаўнікі, урачы, служачыя. Значнае месца сярод іх займаў Рыгор Кладніцкі, які доўгі час жыў на Лепельшчыне. Даследаванні, якія ён вёў не адзін год, ляглі ў аснову яго работы «Этнаграфічныя звесткі аб жыхарах Лепельскага павета», якая ў 1850 г. паступіла ў Рускае геаграфічнае таварыства.

Гэта было адно з першых даследаванняў аб Лепельшчыне. У ім знайшлі адлюстраванне падрабязныя звесткі аб адзенні, жыллі, звычаях мясцовых сялян. Аўтар шмат увагі ўдзяліў розным асаблівасцям мясцовай мовы. Гэта дапамагло скласці слоўнік беларускіх слоў, якімі карысталіся жыхары паўночнай часткі павета, дакладна фанетычна запісаць сялянскія размовы, перадаць іх гукавыя і артыкулярныя ўласцівасці.

Р. Кладніцкі ўдзяляў значную ўвагу збору вуснай народнай творчасці. У яго рабоце нямала крылатых народных выразаў, якімі ў тыя далёкія часіны карысталіся жыхары Лепельскай зямлі. Яны адлюстроўваюць разнастайныя жыццёвыя назіранні, тыя ці іншыя рысы характару людзей. Многія з выдатных па зместу і трапных выразаў жывуць і па сённяшні час.

Ён сабраў бясцэнны матэрыял для вывучэння гаворак лепельчан у першай палове мінулага стагоддзя. Ім жа быў падрыхтаваны і другі рукапіс аб Лепельшчыне: «Пасты і святы, суправаджаемыя асаблівымі звычаямі і павер'ямі». У ім аўтар паказаў змену звычаяў у працэсе гістарычнага развіцця, станаўленне новых, прагрэсіўных грамадскіх адносін.

Рыгор Кладніцкі быў адным з аўтараў зборніка «Быт беларускіх сялян», аднаго з першых даследаванняў па этнаграфіі Беларусі, якое было выдадзена ў 1854 г. у Пецярбургу.

Д.Я. Зарэцкі

АДАМ ЮЦЭВІЧ

Вялікую цікавасць да нашага краю праяўляў у свой час Адам Юцэвіч. Літовец па паходжанні (нар. у 1910 г. у Шавельеўскім павеце Ковенскай губерні). Ён з 1843 г. жыў і працаваў у Лепелі. Выкладаў гісторыю і геаграфію ў мясцовым дваранскім вучылішчы. Адначасова захапляўся зборам народных паданняў і казак, апісваў помнікі мінуўшчыны...

У 1844 г., жывучы ў Лепелі, ён працаваў над кнігай «Литовские песни в переводе Людовика из Покева». У прадмоўі да кнігі ён пісаў аб сабе: «еще будучи малолетним ребенком, любил я всякие рассказы и предания нашего народа, с любопытством слушал их. Бывало, в длинные зимние вечера, когда дорогие родители читали священные или религиозно-нравственные книжки, а сестры занимались одеваньем и убаюкиванием своих кукол, я

убегал в избу для челяди и усердно прислушивался к присказкам, религиозным рассказам и песням прях. Хотя сам Бог знает, как горько мне приходилось за эту любознательность. Видно, то было моим уделом, чтобы звание исследователя дорого стоило мне и было некоторым предвестником страданий, постигнувших меня вследствие такого отношения: они как саранча отовсюду меня окружили. С летами нисколько не заглушилась во мне охота к изучению этих милых предметов. Скромное призвание, которое я раньше было избрал — в видах стремления к высшим целям и ради принесения утехи и услады презрений части человечества, — сблизило меня с простонародием, из уст которого плывут преданья о седой старине, еще живущей в почтительных сердцах. Из каждого случая, из каждого сообщества с людьми я не забывал извлечь пользу, ни мало не обращал внимания на все препятствия, с которыми я на избранном поприще, как со стороны нерасположенных и считавших злонамеренными мои труды, так и со стороны самих сельчан, которые легко делятся своими знаниями, особенно с людьми высшего класса».

Працаваў ён і над жыццеапісаннем вучоных жмудзінаў. Меркаваў скласці да 200 біяграфій. Даследаванні падпісваў сваім прозвішчам «ксёндз Адам Люд. Юцевіч» і псеўданімам «Людвик из Покиева».

Памёр Адам-Людвік Дзяменцьевіч Юцэвіч 12 сакавіка 1846 г. і пахаваны на лепельскіх Георгіеўскіх могілках.

У гады першай сусветнай вайны

Барацьба Траістага саюза на чале з Германіяй і Антанты на чале з Англіяй за перадзел ужо падзеленых калоній і «сфер уплыву» прывяла да першай сусветнай вайны.

Напярэдадні і ў першыя дні вайны беларускія губерні былі аб'яўлены на ваенным становішчы. У сувязі з гэтым забараняліся забастоўкі, вулічныя шэсці і маніфестацыі. Уводзіўся жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым.

З пачатку 1915 г. фронт імкліва набліжаўся да Беларусі. У жніўні пачалося нямецкае наступленне ў накірунку Коўна — Вільня — Менск. 31 жніўня немцы захапілі Свянцяны і Вілейку. Пад пагрозай акружэння расійская армія ў пачатку верасня пакінула Вільню, а таксама Гродна, Ліду, Брэст, іншыя гарады Заходняй Беларусі. Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага была пераведзена з Баранавіч у Магілёў. 19 верасня перадавыя нямецкія раз'езды перарэзалі чыгуначную лінію Менск — Масква ў раёне Смалявіч. Толькі велізарным напружаннем сіл расійскай арміі ўдалося ліквідаваць Свянцянскі прарыў і адкінуць немцаў у раён азёраў Свір і Нарач.

У кастрычніку фронт стабілізаваўся на лініі Дзвінск — Паставы — Баранавічы — Пінск. Каля паловы тэрыторыі Беларусі апынулася пад нямецкай акупацыяй.

Гарады Беларусі былі перапоўнены вайскоўцамі і бежанцамі. Насельніцтва Менска на працягу аднаго года павялічылася са 100 да 250 тысяч чалавек. У сувязі з гэтым абвастрыліся розныя праблемы, асабліва харчовыя.

Сялянскі рух у самым пачатку вайны ў многіх месцах Беларусі выліўся ў своеасаблівую форму разгромаў мабілізаванымі памешчыцкіх маёнткаў, а ў зборных пунктах (мястэчках і павятовых гарадах) — харчовых і вінных магазінаў. Найбольш масавым і вострым ён быў у Сенненскім, Мазырскім, Ігуменскім, Менскім, Лепельскім паветах, дзе шматсоценныя натоўпы запаснікоў нярэдка ўступалі ў бойкі са стражнікамі, паліцыяй і вайсковымі патрулямі.

Вясною і летам 1915 г. у шэрагу мястэчак Наваградскага, Бабруйскага, Рэчыцкага, Менскага і Слуцкага паветаў у час кірмашоў сяляне грамілі крамы і дамы гандляроў. У Ігуменскім, Лепельскім, Гарадоцкім, Менскім паветах аналагічныя акцыі ў сувязі з мабілізацыяй учынілі навабранцы. У некаторых месцах яны ўступалі ў бойкі з паліцыяй, збівалі афіцэраў, якія суправаджалі партыі мабілізаваных.

І. Ю. Януш

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Лютаўская рэвалюцыя

Звесткі аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе прыйшлі на Беларусь 1—4 сакавіка і выклікалі сярод працоўных хвалю энтузіязму, які ў гарадах і мястэчках праявіўся ў масавых мітынгах і вулічных шэсцях з чырвонымі сцягамі і транспарантамі, з адпаведнымі лозунгамі і заклікамі. Удзельнікі гэтых выступленняў — рабочыя і салдаты — найперш раззбройвалі паліцыю і жандараў, вызвалялі палітычных зняволеных. Па прыкладу Петраграда ў гарадах і мястэчках ствараліся Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, народная міліцыя.

У Віцебску вестку пра перамогу рэвалюцыі ў Петраградзе атрымалі 2 сакавіка 1917 г.

Раніцай 4 сакавіка на сходзе бальшавікоў, меншавікоў і эсэраў у горадзе было прынята рашэнне стварыць Віцебскі Савет рабочых дэпутатаў. Для кіраўніцтва выбарамі сход стварыў арганізацыйную камісію з шасці чалавек. На працягу 3—4 дзён на прадпрыемствах і ва ўстановах горада было выбрана ў Савет 152 дэпутаты. 8 сакавіка адбыўся арганізацыйны сход, на якім быў створаны Віцебскі Савет рабочых дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт.

У першай палове сакавіка Саветы былі створаны ў Оршы, Полацку, Лепелі і іншых месцах.

Працоўныя Лепельшчыны прыхільна сустрэлі вестку аб перамозе Лютаўскай рэвалюцыі. У многіх мястэчках і вёсках прайшлі сходы, мітынгі ў яе падтрымку.

Лепельчане ў многіх месцах перасталі падпарадкоўвацца ўладам, а ў пяці валасцях знялі валасных старшынь і пісараў.

15 сакавіка ў Лепелі быў створаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Большасць у Савеце атрымалі меншавікі, эсэры, бундаўцы. Узначаліў Лепельскі Савет меншавік адвакат Іофе.

4 красавіка працоўныя Лепеля арганізавалі маніфестацыю на плошчы горада пад лозунгамі: «Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка!», «Свабода, роўнасць, братэрства!», «Няхай жыве раўнапраўе жанчын!» і інш.

Архіўныя дакументы знаёмяць нас з падзеямі таго часу. Так, сяляне маёнтка Астроўшчына Лепельскага павета дамовіліся сячы лес для сваіх патрэб, а таксама для продажу гораду.

Па гэтым жа пытанні звярнуўся ў Часовы ўрад памешчык Вячэрскі. Сяляне вёсак Замошша і Людчыцы, атрымаўшы дазвол Гарадчэвіцкага валаснога камітэта, мелі намер сячы лес памешчыка.

Як паведамляла газета «Віцебскі лісток» 18 мая 1917 г., у некаторых лясах і дачах Лепельскага лясніцтва сяляне разагналі казённую лясную ахову і паставілі на яе месца сваю.

У чэрвені Лепельская павятовая земская ўправа прыняла пастанову аб падзеле паміж сялянамі тых зямель, якія не будуць выкарыстаны пад пасевы.

У сярэдзіне лета 1917 г. сялянскі рух узмацніўся. Сяляне самавольна касілі памешчыцкія лугі. Напалоханыя памешчыкі ўсё часцей скардзіліся начальству.

Часовы ўрад накіроўваў зброю супраць народа. Аб гэтым сведчыць тэлеграма начальніка штаба Першай арміі віцебскаму губернскаму камісару: «Даводжу да ведама, што для садзейнічання грамадзянскім уладам камандзіраваны наступныя часці: па аднаму эскадрону або сотні ў Гарадок, Веліж, Себеж, Люцын, тры чвэрці эскадрона на станцыю Сушава, у Лепель, Бешанковічы і адзін узвод у Дрысу...»

Але сяляне працягвалі барацьбу. У Віцебскай губерні больш за ўсё здараліся выпадкі захопу лугоў і сенажацяў (40 выпадкаў), парубкі лясоў (38), захопу ўраджаю (28). Аб гэтым сведчыць кніга пасяджэнняў савета пры Віцебскім губернскім камісары за 1917 г. У кастрычніцкія дні 1917 г. бальшавікі Віцебска накіравалі ў Лепель свайго прадстаўніка Гусева для аказання дапамогі ў правядзенні рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Быў створаны Лепельскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт, у склад якога ўвайшлі А. Гейне, Дабравольскі, Наумаў, Фрайман.

Пасля перамогі ўзброенага паўстання ў Петраградзе і Маскве Лепельскі РВК правёў раззбройванне паліцыі і прыступіў да ліквідацыі старых устаноў улады.

Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі аднавіла сваю дзейнасць і Беларуская сацыялістычная грамада. Адначасова ўзнікла шмат нацыянальных арганізацый, гурткоў, суполак, згуртаванняў не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў Петраградзе, Маскве, іншых гарадах краіны, дзе было шмат беларусаў-бежанцаў.

25—27 сакавіка 1917 г. у Менску адбыўся з'езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый. Старшынёй з'езда быў абраны старэйшы дзеяч беларускай культуры, адзін з заснавальнікаў Грамады Казімір Кастравіцкі (Карусь Каганец).

Дэлегаты прызналі неабходным хутчэйшае стварэнне ў Менску Беларускай краёвай рады. Да выбараў апошняй з'езд абвясціў сябе «вышэйшай краёвай інстытуцыяй», а сваім выканаўчым органам — Беларускі нацыянальны камітэт (БНК), якому даручалася падрыхтаваць выбары ў Беларускую краёвую раду. З'езд выставіў патрабаванне дзяржаўнай аўтаноміі Беларусі ў складзе федэратыўнай дэмакратычна-рэспубліканскай Расіі. Пры гэтым беларускімі прызнаваліся Менская, Гродзенская, Магілёўская, часткі Смаленскай і Чарнігаўскай губерняў, але для дакладнага вызначэння этнаграфічных граніц Беларусі была прынята прапанова аб стварэнні спецыяльнай камісіі ў складзе вядомых вучоных: М. Любаўскага, М. Доўнар-Запольскага, Я. Карскага і А. Шахматава.

І. Ю. Януш

Тэлеграма Лепельскіх павятовых улад аб падтрыманні насельніцтвам Лепеля і павета рэвалюцыйных змен.
7 сакавіка 1917 г.

Губернскому комиссару из Лепеля.

Войска и население города Лепеля и уезда, присоединившись единодушно к вновь установленному порядку и правительству, шлют армии и правительству привет. Доносим, что местные полицейские власти во главе исправников обезоружены, часть арестованы, порядок образцовый поддерживается начальником гарнизона, нижними чинами. Конвой команды, новых войск не надо. Спешно организуется народная милиция города и уезда. Просим указаний, как поступить с арестованными чинами полиции, жандармами.

Лепельский уездный воинский начальник капитан Затонский, Начальник уездной милиции, уездный комиссар, председатель уездной Земской управы гражданин Александр Петров. Начальник городской милиции Александр Иофе.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 622. Воп. 1. Спр. 2.

Кастрычніцкая рэвалюцыя

У кастрычніку 1917 г. у Петраградзе атрымала перамогу ўзброенае паўстанне рабочых і салдат. 25 кастрычніка, калі ў руках паўстанцаў быў амаль увесь горад, У. І. Ленін ад імя Ваенна-Рэвалюцыйнага камітэта напісаў зварот «Да грамадзян Расіі», у якім адзначалася: «Часовы ўрад звергнуты. Дзяржаўная ўлада перайшла ў рукі органа Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў — Ваенна-Рэвалюцыйнага камітэта, які стаіць на чале Петраградскага пралетарыята і гарнізона».

На другім Усерасійскім з'ездзе Саветаў у Петраградзе былі прыняты дэкрэты аб міры, аб нацыяналізацыі зямлі і перадачы яе ў карыстанне працоўным, а таксама арганізаваны Савет Народных Камісараў.

11 снежня 1917 г. пачаў работу Надзвычайны з'езд Саветаў Віцебскай губерні, на якім прысутнічалі прадстаўнікі Лепельскага павета. Дэлегаты адобрылі Дэкрэты Савецкага ўрада, прызналі новую ўладу ў асобе Савета Народных Камісараў і заявілі, што будуць падтрымліваць усе яго мерапрыемствы.

У рэзалюцыі па зямельным пытанні з'езд прапанаваў, у адпаведнасці з Дэкрэтам аб зямлі, канфіскоўваць памешчыцкія і манастырскія землі на карысць беззямельных і малазямельных сялян.

У склад выбарнага з'ездам губернскага Савета рабочых, салдацкіх, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў увайшлі 65 чалавек, пераважна бальшавікоў і ім спачуваючых.

На Лепельскім павятовым з'ездзе Саветаў, які адбыўся 29—31 снежня 1917 г., прысутнічала 119 чалавек (19 ад рабочых, 31 — ад салдатаў і 69 прадстаўнікоў ад валасцей). Было прынята рашэнне аб арганізацыі Лепельскага Савета з аддзеламі: адміністрацыйнага, ваеннага, юрыдычнага, працы, зямельнага, прадуктовага, фінансава-эканамічнага, гандлёва-прамысловага, мясцовых паведамленняў, грамадскага самакіравання, апекі сірот і інвалідаў, культурна-асветніцкага.

У Лепельскі Савет было выбрана 27 чалавек ад усіх валасцей павета. Выканаўчы камітэт Савета складаўся з прэзідыума і аднаго прадстаўніка кожнага з 12 аддзелаў.

На з'ездзе было разгледжана пытанне аб дзейнасці павятовага зямельнага аддзела Савета, які ўводзіўся «для кіравання дзейнасцю валасных зямельных аддзелаў, зямельных камітэтаў валасных Саветаў па выкарыстанні лясоў, нетраў, воднага багацця, а роўна для кіраўніцтва і нагляду за вядзеннем на іх гаспадаркі і для аказання насельніцтву дапамогі ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі».

У красавіку 1918 г. былі праведзены адміністрацыйна-тэрытарыяльныя мерапрыемствы. Была створана Заходняя вобласць з цэнтрам Смаленск, у якую ўвайшлі Віцебская, Магілёўская, Менская і Смаленская губерні.

Утварэнне ССРБ і інтэрвенцыя

1 студзеня 1919 г. Часовы рабоча-сялянскі ўрад абвясціў утварэнне ў межах Заходняй вобласці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (ССРБ).

У лютым 1919 г. была створана Літоўска-Беларуская Рэспубліка. Але Віцебская (разам з Лепельскім паветам), Магілёўская і Смаленская губерні былі ўключаны ў склад РСФСР.

У лютым 1918 г. германскія войскі пачалі наступленне. Віцебскі губернскі Савет дакладваў Усерасійскаму з'езду Саветаў 15 сакавіка 1918 г.: «Нямецкія контррэвалюцыйныя атрады, не чакаючы ратыфікацыі мірнага дагавору, 13 сакавіка пачалі наступленне на Віцебск, занялі мясцовасць ад Полацка да Ушач, ад Докшыц да Лепеля, а 15 сакавіка наблізіліся на 6 вёрст да Бачэйкава».

Наступленне ішло па дарозе Докшыцы—Лепель. Сілы былі няроўныя. Чырвонаармейцы і партызаны пачалі адступаць, пакінуўшы для прыкрыцця невялікі атрад. Немцам удалося акружыць і схапіць 17 абаронцаў. 15 сакавіка яны былі расстраляны. Лепельчане пахавалі іх у брацкай магіле на Пятроўскіх могілках. У баі за Лепель прымаў удзел Сцяпан Рыгоравіч Дальчанін з в. Юркоўшчына. У час нямецкага наступлення ён у складзе партызанскага атрада абараняў горад. Пад націскам варожых сіл атрад адступіў, штаб яго быў перанесены з Лепеля ў Бешанковічы.

У Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета партызанскі атрад узначаліў старшыня выканкама Павел Сямёнавіч Шалак. У сваіх успамінах ён пісаў: «Атрад, у якім было 140 чалавек, накіраваўся на абарону Лепеля. Але да горада дайсці не паспелі і занялі абарону ў чатырох кіламетрах на ўсход ад Лепеля. Гадзіны праз дзве мы вымушаны былі адступіць...»

Лепель і заходняя частка павета былі акупіраваны германскімі войскамі. Інтэрвенты аднавілі прыватную ўласнасць на зямлю і прамысловыя прадпрыемствы. Нямецкія захопнікі забіралі ў насельніцтва прадукты харчавання, коней, хатнюю жывёлу. 27 жніўня 1918 г. Германія падпісала з Савецкай Расіяй дагавор, паводле якога немцы абавязаліся пакінуць да канца 1918 г. тэрыторыю Беларусі на ўсход ад р. Бярэзіны. 12 верасня ў Оршы адбылося пасяджэнне руска-германскай камісіі, дзе немцы заявілі, што яны перададуць савецкаму камандаванню тэрыторыю Лепельскага і Сенненскага паветаў раней тэрмінаў, вызначаных дагаворам. Неўзабаве германскае камандаванне пачало выводзіць з гэтых паветаў свае войскі.

26—28 верасня часці Чырвонай Арміі занялі заходнюю частку Сенненскага і Лепельскага паветаў.

У пачатку 1919 г. Польскі ўрад арганізаваў ваенны паход на рэспубліку. Пры дапамозе Англіі, Францыі і ЗША белапалякам удалося захапіць частку Беларусі і Украіны.

У прыфрантавым раёне на Лепельшчыне праводзіліся энергічныя абарончыя работы. Насельніцтва горада і вёсак было прыцягнута да будаўніцтва ваенных умацаванняў, нарыхтоўкі паліва, рамонту дарог. Лепельская павятовая партыйная арганізацыя мабілізавала і адправіла на фронт трэць свайго саставу.

Але пазней частка Лепельшчыны зноў была акупіравана ворагам. У захопленых раёнах польскія інтэрвенты аднаўлялі буржуазна-памешчыцкія парадкі: прамысловыя прадпрыемствы былі аддадзены ранейшым уладальнікам, памешчыкі вярнуліся ў свае маёнткі.

Белапалякі палілі населеныя пункты, рабавалі і забівалі людзей. Былі знішчаны вёскі Слабодка, Юзаўка, Малое Беразіно, Пустаселле.

У 1920 г. пачалося вызваленне захопленых белапольскімі войскамі раёнаў. Удзельнікам вызвалення Лепельшчыны быў Васіль Іванавіч Чуйкоў, які пазней, у гады Вялікай Айчыннай вайны, стаў маршалам Савецкага Саюза. У сваёй кнізе «Старонкі баявой маладосці», дасланай у Лепельскі краязнаўчы музей, Васіль Іванавіч напісаў, як ішло вызваленне Лепеля ад белапалякаў. За рашучасць, адвагу і гераізм, праяўленыя ў баі за горад, дваццацігадовы камандзір 43-га Чырванасцяж-

нага стралковага палка быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

У вызваленні нашага краю удзельнічаў ураджэнец вёскі Вялікі Поўсвіж І.І. Карабань. «Гарачы бой адбыўся за вёску Стаі, — пісаў Іван Іванавіч у сваёй аўтабіяграфіі. — Раніцай наш батальён вызваліў вёску. Белапалякі зрабілі спробу зноў захапіць яе. Але ворага мы сустрэлі трапным агнём, потым па камандзе ўсе байцы падняліся і з крыкам «Ура!» пайшлі ўрукапашную. Вораг быў адкінуты назад. Мы атрымалі перамогу».

Лепяльчане па-геройску змагаліся з ворагам і на іншых франтах. У 27-ай Омскай Чырванасцяжнай дывізіі ваяваў кавалер ордэна Чырвонага Сцяга Грыгалюн Мацвей Восіпавіч.

У баях пад Мінскам вызначыўся Браўковіч Герасім Аляксеевіч, былы курсант маскоўскіх кулямётных курсаў, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

У розных месцах ваявалі Пчолка Антон Пятровіч, Голікаў Мікалай Васільевіч, Берасцень Раман Іванавіч, Гласковіч Мікалай Іванавіч і іншыя.

І. Ю. Януш

Шляхам барацьбы і выпрабаванняў

Яшчэ да Лютаўскай рэвалюцыі на Беларусі пачалі ўзнікаць новыя партыі і рухі. Яны імкнуліся стварыць беларускую дзяржаву. У снежні 1917 года беларускія партыі згуртаваліся і склікалі ў Мінску Усебеларускі з'езд. 9 сакавіка 1918 г. выканкам Рады з'езда прыняў Другую Статутную грамату да народаў Беларусі, у якой фармальна абвяшчалася Беларуская Народная Рэспубліка. Гэта стала адзіна магчымым у тых умовах адказам на імперыялістычную палітыку кіраўніцтва Расіі і акупацыйных улад кайзераўскай Германіі. Абвяшчалася ўсеагульнае, прамое і роўнае выбарчае права, грамадзянам прадастаўляліся свабода друку, права ствараць палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі, прафсаюзы, гарантаваліся права на забастоўкі, свабода сумлення, недатыкальнасць асобы... Зямля, яе нетры, лясы і воды абвяшчаліся ўласнасцю рэспублікі. Зямля перадавалася ў спадчыннае карыстанне таму, хто на ёй працуе. Уводзіўся васьмігадзінны рабочы дзень. Усім без выключэння нацыянальным меншасцям прадастаўлялася права на нацыянальную аўтаномію, а іх прадстаўнікі ўключаліся ў састаў Рады БНР.

Аднак ні ў Расіі, ні ў Германіі Беларуская Народная Рэспубліка не была прызнана. І тады 25 сакавіка 1918 г. Рада БНР абвясціла незалежнасць Беларусі ў Трэцяй Статутнай грамаце. Гэта быў акт велізарнага гістарычнага значэння. Упершыню пасля ВКЛ Беларусь атрымала сваю дзяржаўнасць. Былі ўзаконены заваёвы Лютаўскай і часткова (перадача зямлі сялянам без выкупу) Кастрычніцкай рэвалюцый. Але германскія акупацыйныя ўлады не дазволілі развіцца беларускай дзяржаўнасці. Кайзераўцы перашкаджалі ствараць мясцовыя органы ўлады, не дазволілі мець беларускае войска, суд, паліцыю. Не дазволілі гэта і польскія акупанты ў 1919-ым...

Калі ў лістападзе 1918 г. Германія капітулявала, Беларуская Народная Рэспубліка аказалася ў цяжкім становішчы. З двух бакоў на нашу Бацькаўшчыну рушылі добра ўзброеныя сілы: бальшавіцкая Чырвоная Армія — з усходу і армія польскіх паноў — з захаду. Абодва бакі імкнуліся да захопу Беларусі і пазбаўлення яе незалежнасці. Бальшавікі захапілі ўсходнюю, а польскія паны — заходнюю часткі Беларусі.

БНР была ліквідавана.

Становішча Беларусі пасля сусветнай вайны і ваеннай інтэрвенцыі было вельмі цяжкім. Разарэнне дайшло да таго, што цэлыя галіны прамысловасці амаль не працавалі. У заняпад прыйшоў транспарт. На Заходняй чыгунцы колькасць няспраўных паравозаў даходзіла да 40 працэнтаў, а пасажырскіх вагонаў перавысіла 80 працэнтаў. Не лепшым было становішча ў сельскай гаспадарцы, прадукцыя якой складала менш за палову даваеннай. Запусцелі значныя абшары зямлі, была стра-

чана вялікая колькасць жывёлы, рэзка знізілася яе прадукцыйнасць.

У 1918 г. быў створаны Віцебскі губернскі Савет народнай гаспадаркі, які з'яўляўся выканаўчым органам у вобласці. Ён ведаў арганізацыяй і рэгуляваннем розных галін гаспадаркі, кіраваннем дзяржаўнымі прадпрыемствамі, арганізацыяй нарыхтовак, сыравінай і палівам, фінансаваннем прадпрыемстваў. Кіруючым органам губсаўнаргаса быў прэзідыум, выканаўчым — аддзелы, на чале якіх стаялі калегіі.

Пазней былі створаны павятовыя саветы народнай гаспадаркі, у тым ліку і Лепельскі. У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захаваліся некаторыя матэрыялы аб рабоце Лепельскага павятовага саўнаргаса ў 1918—1919 гг. Так, у дакладзе эканамічнага аддзела Лепельскага савета падведзены вынікі работы на 1 студзеня 1919 г. У ім адзначаецца, што ўзяты на ўлік у павеце ўсе млыны, якія функцыяніруюць на старых умовах, гэта значыць, служачыя атрымліваюць з-за адсутнасці грошай прадукты харчавання. Для абслугоўвання насельніцтва было створана аб'яднанне шаўцоў. З мэтай павелічэння выпуску абутку быў выяўлены ў насельніцтва скураны тавар і прададзены шавецкім майстэрням.

Пачаліся работы па арганізацыі рыбнай арцелі. Працавалі мылаварны завод і арцель па вырабу раслінага масла. Прадметы першай неабходнасці выраблялі кавальскія майстэрні, некалькі шкіпінарна-смалакурных заводаў.

Лепельскі павет адчуваў вострую патрэбу ў паліве, будаўнічых матэрыялах. Таму была створана рабочая арцель для нарыхтоўкі драўніны. Зімой насельніцтва было прыцягнута да нарыхтоўкі лесу. Драўніну вывозілі да рэк, каб вясной сплаўляць да месцаў прызначэння.

У пачатку 1922 г. быў створаны Лепельскі леспрамгас — самае буйное прадпрыемства горада.

Наогул усе прадпрыемствы былі дробнымі, мала аснашчанымі. Напрыклад, чарапічная майстэрня ў Лепелі мела адзін станок, на якім працавала два чалавекі. Прымаліся меры да пуску цагельных заводаў у Лепелі і ў вёсцы Зялены Востраў, вапнавых заводаў у Цяпінскай, Бачэйкаўскай і Гарадчэвіцкай валасцях.

С. Е. Ханяк, старшыня першага ў р-не калгаса «Новы крок»

Я. П. Юшкевіч, начальнік чыгуначнай станцыі ў Лепелі

Патрэба ў будаўнічых матэрыялах пастаянна ўзрастала. Каб поўнасцю задаволіць яе, за горадам на беразе ракі Улы пачалося ўзвядзенне цагельнага завода.

У 1921 г. у в. Губіна Каменскай воласці была створана першая арцель па сумеснай апрацоўцы зямлі. У яе ўвайшлі былыя чырвонаармейцы. Першым кіраўніком арцелі стаў Сямён Емяльянавіч Ханяк. Арцель назвалі «Новы крок». У ёй было 75 дзесяцін зямлі і 7 коней.

Эканамічныя цяжкасці перапляталіся з палітычнымі. Найбольш значным папярэджаннем аб вострым сацыяльна-эканамічным крызісе стала Кранштацкае паўстанне, якое адбылося ў лютым—сакавіку 1921 г. Яго ўдзельнікі выступілі супраць бальшавікоў, за ўладу Саветаў, а не партыі. Паўстанцы патрабавалі правесці перавыбары Саветаў, забяспечыць свабоду слова і друку, сходаў, прафесійных саюзаў, сялянскіх аб'яднанняў. Кранштацкае паўстанне разам са шматлікімі іншымі выступленнямі супраць савецкай улады паказала, што палітыка ваеннага камунізму прыйшла ў глыбокае супярэчанне з інтарэсамі працоўных.

Таму У. І. Ленін прапанаваў прынцыповую змену палітычнага курсу. Гэта знайшло ўвасабленне ў новай эканамічнай палітыцы, якую адобрыў у сакавіку 1921 г. X з'езд РКП(б).

Будынак чыгуначнага вакзала ў Лепелі, 1926 г.

Будаўнікі чыгункі Орша—Лепель, 1925 г.

15 лютага 1923 г. быў прыняты дэкрэт УЦВК «Аб адміністрацыйным аддзяленні Віцебскай губерні». Да Лепельскага павета была далучана тэрыторыя Сенненскага павета. У сувязі з узбуйненнем цэнтр павета быў перанесены з Лепеля ў Бачэйкава. Лепельскі павет быў перайменаваны ў Бачэйкаўскі. У ім было створана 9 узбуйненых валасцей з аднайменнымі цэнтрамі: Чарэйская, Лукомская, Ульянавіцкая, Чашніцкая, Несінская, Лепельская, Бешанковіцкая, Хоцінская, Ушацкая.

Гарады Сянно, Лепель, Дрыса і Гарадок з 15 сакавіка 1923 г. сталі пазаштатнымі.

15 сакавіка 1924 г. IV надзвычайны з'езд Саветаў БССР прыняў рэзалюцыю аб новым адміністрацыйным падзеле рэспублікі з улікам эканамічных, гаспадарчых і іншых патрэб насельніцтва. Замест існаваўшых паветаў і валасцей былі створаны акругі і раёны. Лепельскі раён увайшоў у склад Барысаўскай акругі Мінскай вобласці.

У 1923 г. пачалося будаўніцтва цеплавой электрастанцыі на беразе Лепельскага возера. Узведзены ў Лепелі цагельны завод выпусціў першыя паўмільёна штук цаглін. У 1925 г. у асноўным закончылася будаўніцтва чыгункі Орша—Лепель. З гэтага выпадку ў горадзе адбыўся ўрачысты мітынг. Чыгунка адыграла важную ролю ў далейшым развіцці горада і раёна. Тут пачаў сваю працоўную біяграфію наш знакаміты зямляк, тады малады інжынер Яўген Паўлавіч Юшкевіч. Спачатку ён працаваў дзяжурным па чыгуначнай станцыі, а потым стаў яе начальнікам. Пазней кандыдат тэхнічных навук Я. П. Юшкевіч ўзначаліў Беларускую чыгунку.

У справаздачы Лепельскага гарадскога Савета адзначалася, што ў горадзе у канцы 1920-ых гадоў маюцца цагельны завод, электрастанцыя, млын, друкарня, гарадская лазня.

Атрымала распаўсюджанне выкарыстанне ў вёсцы наёмнай рабочай сілы. У 1929 г. у сельскай гаспадарцы БССР працавала звыш 83 тыс. наёмных работнікаў. Арэндай зямлі ў 1927 г. карысталіся 11 працэнтаў сялянскіх гаспадарак — бядняцкіх, серадняцкіх, заможных.

Сацыяльна-эканамічная палітыка савецкай улады прывяла да значных сацыяльных змен на вёсцы. Ужо ў першыя яе гады ў выніку жорсткай класавай палітыкі колькасць заможных сялян рэзка зменшылася. Павялічылася серадняцкая праслойка вёскі. Серадняком належала больш за палову пасеваў і сродкаў вытворчасці. Серадняк стаў асноўнай фігурай на вёсцы.

На канец 1924 г. на Лепельшчыне пражывала 46 тысяч чалавек. Сельскай гаспадаркай займалася 8026 сем'яў.

Ворнай зямлі было 37 770 дзесяцін. Кааператыўная сельская гаспадарка складала 15 працэнтаў.

У кастрычніку 1923 г. на першай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўцы ў Маскве садавод-селекцыянер Іосіф Кандрацьевіч Мароз з в. Фатынь атрымаў некалькі дыпломаў, залатых і сярэбраных медалёў, прэмію за рацыянальнае вядзенне сельскай гаспадаркі.

Працягвала ў Лепелі развівацца саматужна-прыватная прамысловасць, у якой налічвалася да дваццаці галін і дзе было занята 145 чалавек, у асноўным працуючых паасобку.

30 студзеня 1925 г. пастановай Савета Народных Камісараў БССР на частцы тэрыторыі Лепельскага раёна і суседніх раёнаў Мінскай і Полацкай абласцей быў зацверджаны Дзяржаўны паляўнічы запаведнік (цяпер Бярэзінскі біясферны запаведнік).

Працягваліся змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле Беларусі. Пастановай ЦВК і СНК БССР ад 9 чэрвеня 1927 г. Барысаўская, Слуцкая, Калінінская і Рэчыцкая акругі былі ліквідаваны. Лепельскі раён увайшоў у склад Полацкай акругі.

Пад канец 20-ых гадоў у сувязі з хлебным крызісам і аб'яўленым курсам на калектывізацыю да заможных сялян былі прыменены надзвычайныя, жорсткія меры. За ўкрыванне збожжа ў іх канфіскавалася маёмасць, практыкавалася індывідуальнае абкладанне і г. д. Адмоўную ролю адыграла і тое, што чвэрць канфіскаванага ў кулакоў хлеба атрымлівалі беднякі, калі яны дапамагалі ў яго выкрыцці. Гэта разбэшчвала частку вяскоўцаў, арыентавала іх не на працу, а на даносы, што адпавядала сталінскай палітыцы размежавання сялян.

У 20-ыя гады значны размах у беларускай вёсцы набыў кааператыўны рух. У першую чаргу ён ішоў па шляху сумеснай вытворчасці ў некаторых галінах дзейнасці, стварэння невялікіх прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Пад канец 1929 г. у рэспубліцы налічвалася свыш 3,3 тыс. сельскагаспадарчых таварыстваў, якія аб'ядноўвалі больш за 740 тыс. чалавек. Пераважалі меліярацыйныя таварыствы, насенныя, машынныя, жывёлагадоўчыя, крэдытныя і інш. Хаця партыйна-дзяржаўныя ўлады пад канец 20-ых гадоў абмяжоўвалі кааператыўны рух, але тым не менш імкненне сялян да найпрасцейшых форм кааперавання прыдало яму значны размах.

У 1929 г. арцель «Новы крок», створаная яшчэ ў 1921 г. у в. Губіна С. Е. Ханяком, была пераўтворана ў калгас «Чырвоны сцяг». Гэта калектыўная гаспадарка пазней удзельнічала ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выставе ў Маскве.

І. К. Качан

А. С. Пахомаў — першы шафёр раёна

На 1 кастрычніка 1930 г. у раёне налічвалася 39 калгасаў. Іх старшынямі былі Ігнат Качан, Уладзімір Курган, Канстанцін Машара, Аркадзь Коўган, Міхаіл Кастрыцкі, Іван Літвін, Павел Мацкевіч, Міхаіл Шырко і многія іншыя.

У снежні 1927 г. XV з'езд ВКП(б) паставіў у якасці асноўнай задачы на вёсцы аб'яднанне дробных індывідуальных гаспадарак у буйныя калектывы. Актыўна пачалі ствараццa машынныя таварыствы. Ураджэнец Лепеля Апанас Сямёнавіч Пахомаў стаў першым шафёрам у нашым раёне. Ён удзельнічаў у будаўніцтве дарогі Віцебск — Бярэзіна праз Лепель. Пазней А. С. Пахомаў працаваў у Лепельскай МТС.

Ажыццяўленне новай эканамічнай палітыкі давала нядрэнны плён у іншых галінах гаспадаркі. У адносінах да прамысловасці палітыка савецкай дзяржавы ў пачатку 20-ых гадоў у значнай ступені была скіравана на падтрымку дробнай вытворчасці, здольнай за кароткі тэрмін ліквідаваць таварны голад, пашырыць таваразварот паміж горадам і вёскай.

На цвёрдым заканадаўчым грунце прадпрымальніцкі рух у Беларусі дасягнуў значнага размаху. У 1926 г. у рэспубліцы налічвалася звыш 60 тыс. дробных прамысловых прадпрыемстваў, дзе было занята больш за 100 тыс. чалавек.

У Лепелі ў гэты час працавалі тры смалакурныя заводы, арцель па рамонту сельскагаспадарчых машын, электрастанцыя, цагельны завод, паравы млын, леспрамгас, прамкамбінат, завод па пераапрацоўцы ягад і грыбоў.

Але паступова падатковы націск на прыватныя прадпрыемствы ўзрастаў. Ужо 8 верасня 1926 года СНК СССР пастанавіў максімальна ўзмацніць абкладанне прыватнага капіталу. Пачаўся пераход да адзяржаўлення дробнай вытворчасці і гандлю. Гэта азначала адкрытае наступленне на новую эканамічную палітыку.

26 ліпеня 1930 г. была прынята пастанова ЦВК і СНК БССР «Аб ліквідацыі акруг». Лепельскі раён стаў непасрэдна падпарадкоўвацца Мінску, цэнтральным рэспубліканскім органам.

Дакументы сведчаць

Загад № 86 выканкама Савета Віцебскай губерні аб бязлітаснай барацьбе з самагоншчыкамі і шынкарамі

30 жніўня 1918 г.

Всем Советам, Чрезвычайным Комиссиям и Милиции вменяется в непременную обязанность немедленно начать самую решительную борьбу с самогонщиками и шинкарями.

Члены Совета и милиционеры, виновные в попустительстве или же в неэнергичной борьбе с этим злом, подлежат преданию суду Революционного Трибунала за нерадение и попустительство по службе.

Самогонщики, застигнутые на месте преступления, подлежат расстрелу, а все их имущество конфискации.

Шинкари и все лица, причастные к выгонке самогонки, наказываются конфискацией всего имущества и отдаются суду Революционного Трибунала.

Комитеты Бедноты, оказавшие содействие в обнаружении самогонщиков, получают половину их имущества.

О всех обнаруженных самогонщиках и примененных к ним наказаниях надлежит немедленно сообщать Информационному подотделу Отдела управления Губисполкома, который обязан сводку этих данных ежемесячно представлять в президиум.

Подлинный подписал: Председатель Губисполкома МЕНИЦКИЙ

Скрепил: за Секретаря КУЗЬМИНСКИЙ

Верно, Делопроизводитель (подпіс неразборлівы)

С копией верно:

Делопроизводитель А. РАДЮК

Настоящий приказ на территории Лепельского уезда, освобожденной от оккупации немцев, входит в законную силу со дня объявления.

Октября 24 дня 1918 г. гор. Лепель

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 260. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 48.

Загад штаба Савета Заходняга фронту аб перадачы кіравання Лепельскім паветам мясцоваму Савету дэпутатаў

15 верасня 1918 г.

15 сентября 1918 г. Приказ штаба военного Совета Западного фронта Витебскому губисполкому об упразднении Лепельского военного Совета и о передаче управления Лепельским уездом местному Совдепу.

Ввиду образования в Лепельском уезде гражданской власти приказываем Лепельскому военному Совету передать управление Лепельским уездом местному Совдепу. По передаче управления Лепельский военный Совет расформировывается. Частям, находящимся в распоряжении Лепельского военного Совета, перейти первой роте Варшавского полка в м. Бешенковичи, а взводу артиллерии бригады оставаться в Лепеле. Военсов — Алибего, 15 октября № 12013. Нач. говоенсовсмол — Баранович.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 56. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 516.

Пратакол агульнага сходу сялян в. Стаі Лепельскага павета аб выбранні сялянскага камітэта беднаты

30 верасня 1918 г.

Повестка дня: избрание комитета бедноты.

Собрание, заслушав доклад тов. Сазонова по вопросу об организации комитетов бедноты, приступает к избранию такового и намечает 6 кандидатов, в состав которых вошли следующие товарищи: 1. Семен Лукьянов, 2. Василий Азаренок, 3. Семен Тухто, 4. Иван Дудель, 5. Василий Бык, 6. Карп Бык.

Принимая во внимание, что в комитет должны войти только беднейшие и стоящие на платформе Советской власти, кандидатура Карпа Быка отвергается, а остальные товарищи большинством голосов утверждаются.

Затем комитет из своей среды избирает президиум, в состав коего на должность председателя избирается тов. Семен Лукьянов, секретарем же — тов. Василий Бык. Вошли все в комитет бедноты коммунисты, солдаты бедноты, которые сразу повели энергичную работу по созданию Советской власти.

Председатель Семен Лукьянов.
Секретарь Василий Бык.
Члены Василий Азаренок, Семен Тухто, Иван Дудель.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 393. Воп. 3. Спр. 57. Арк. 350.

З пастановы эканамічнага аддзела Лепельскага павятовага Савета аб дзейнасці камітэтаў беднаты па ўліку гарбарных тавараў і вытворчасці абутку

13 лістапада 1918 г.

Предписать Уллъскому, Каменскому, Бочейковскому и Коптевичскому волостным исполнительным комитетам бедноты немедленно приступить к учету кожевенных товаров в местечках; невыделанные кожи сдавать в кожевенные заводы для выработки, а готовый товар передать в союз сапожников, если союза нет, организовать (мастерские) для изготовления обуви. Заготовленную обувь сдать в уездпродком, откуда при сдаче союз будет получать деньги за изготовление обуви.

Установить отчетность о товаре и ходе работ и представлять в отдел ежемесячно 10 и 25 числа.

Делопроизводитель /подпіс неразборлівы/

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 600. Спр. 1. Арк. 65. Копія.

Пастанова Лепельскага павятовага Савета аб арганізацыі камітэтамі беднаты рыбных арцеляў

13 лістапада 1918 г.

Обсудив вопрос о рыбных артелях, коллегия постановила предписать волостным комитетам бедноты уезда немедленно приступить к организации рыбных артелей, артели все зарегистрировать.

Списки лиц, вошедших в артели, прислать экономическому отделу.

Для выработки устава для артелей назначить комиссию из 3 лиц: представителя от упродкома, 1-от центрального профессионального союза и от экономического отдела — тов. Яхневича. Выработанный устав представить на утверждение коллегии.

Найбольш цяжкім і драматычным накірункам пераўтварэнняў, праведзеных пад сцягам пабудовы сацыялізму, з'явілася калектывізацыя сельскай гаспадаркі. У час яе ажыццяўлення пераважалі націскныя метады работы. Гэта быў прамалінейны жорсткі шлях, які не ўлічваў ні аб'ектыўных законаў эканамічнага развіцця, ні асаблівасцей вёскі.

Ажыццяўленне палітыкі масавай калектывізацыі фактычна пачалося ўжо з сярэдзіны 1929 г. Калі на 1 чэрвеня ў Беларускай ССР у калектыўных гаспадарках знаходзілася 12,9 тыс. сялянскіх двароў, то да канца лістапада таго ж года — 77,7 тыс. За гэты час узровень калектывізацыі павысіўся з 1,4 да 9,8 працэнта, гэта значыць у 7 разоў. Акрамя таго, у рэспубліцы налічвалася 227 саўгасаў.

Калектывізацыя паўсюдна суправаджалася рэзкай актывізацыяй барацьбы з заможнымі сялянамі, кулакамі. Гэта вылівалася ў палітыку раскулачвання. Прынятыя супраць кулацтва меры былі вельмі жорсткія. У выніку жорсткага націску на заможную частку вёскі да канца мая 1930 г. у БССР было раскулачана 15 629 гаспадарак. Іх маёмасць перадавалася ў непадзельныя фонды калгасаў.

Вынікам усіх гэтых дзеянняў з'явіліся масавыя выхады сялян з калгасаў, зніжэнне працэнта калектывізацыі. На працягу сакавіка—мая 1930 г. у БССР з калгасаў выйшла 370,3 тыс. сялянскіх гаспадарак, а працэнт калектывізацыі ўпаў з 58 да 11,1. Гэта быў самы нізкі ўзровень калектывізацыі. Але гэта не спыніла ажыццяўлення партыйнай лініі. Паступова ўлады зноў прыступілі да правядзення сталінскай стратэгіі. Да канца 1930 г. у Беларускай ССР працэнт калектывізацыі зноў узняўся да 15. На 1 кастрычніка 1930 г. у Лепельскім раёне было створана 39 калгасаў, у 1931 г. — 62 калгасы.

Было зразумела, што калі тэмпы калектывізацыі не будуць дапаўняцца пра-



М. Я. Салюк, трактарыст Лепельскай МТС у 1930-ыя гады

цай па арганізацыйна-гаспадарчым ўмацаванні калгасаў, то развіваць з такой цяжкасцю ствараемы калгасны лад будзе немагчыма. Таму вялікая ўвага надавалася механізацыі калгаснай вытворчасці. Гэта ажыццяўлялася ў форме стварэння машынна-трактарных станцый. Першая з іх у БССР — Койданаўская — узнікла ў 1929 г., пазней былі створаны тры Лельскія. На месцы ішла падрыхтоўка кадраў механізацыі.

У 1931 г. Лепельская МТС атрымала 36 трактароў. Зімой 1934—35 гг. на базе 2-ой Лепельскай МТС (в. Валосавічы) каля 35 чалавек закончылі курсы трактарыстаў, а зімой 1935/36 г. на гэтых курсах займаліся жанчыны. Звыш 10 лепяльчанак сталі ўладарамі «сталёвых коней». Першую жаночую трактарную брыгаду на Лепельшчыне ўзначаліла Макрына Лукінічна Дзёмка з в. Свяда. На палях нашага раёна працавалі трактарысткі сёстры Марыя, Матрона і Яфімія Зуевы, А. А. Пашкевіч, С. П. Пасмурцава і інш.

5—6 сакавіка 1931 г. у Лепелі праходзіў другі з'езд калгаснікаў раёна, дзе было 293 дэлегаты. Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў суправаджалася драконаўскімі сталінскімі мерамі. Гэта адносіцца ў першую чаргу да пастановы ЦВК і СНК СССР ад 7 жніўня 1932 г. «Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці». За дробныя правіннасці гэты «закон пяці каласоў», як яго празвалі ў народзе, прадугледжваў не толькі асуджэнне на тэрмін не ніжэй за 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці, але нават «вышэйшую меру сацыяльнай абароны — расстрэл». На працягу 1933—1934 гг. толькі у БССР па гэтаму антычалавечаму закону было асуджана больш за 10 тыс. чалавек.

Націскныя меры садзейнічалі ў значнай ступені павышэнню паказчыкаў у калектывізацыі. Ужо да канца 1934 г. яе працэнт узняўся да 72,6. Было абагулена $^4/_5$ пасяўных плошчаў. Калектывізацыя ў БССР была ў асноўным завершана.

На працягу 1939—1940 гг. звыш 160 тыс. хутарскіх гаспадарак рэспублікі былі прымусова пераселены ў калгасныя цэнтры. Гэта было вынікам недаверу сталінскага кіраўніцтва да сялянства, яго імкнення да яшчэ больш цэнтралізаванага кіравання ім. З мэтай павышэння актыўнасці калгаснікаў у грамадскай вытворчасці ўстанаўліваўся мінімум працадзён, якія патрэбна было выпрацаваць на працягу года. У БССР ён складаўся з 80.

У 1940-ых гадах працягвала ўзрастаць матэрыяльна-тэхнічная база калгасаў. На палях Лепельскага раёна працавалі 97 колавых трактароў, 15 збожжавых камбайнаў. У калгасах мелася 41 грузавая аўтамашына, 245 малатарняў, 250 зернеачышчальных машын і іншая тэхніка. Калгасы прадалі дзяржаве за год 2055 тон збожжа, 3858 тон бульбы, 990 тон ільнотрасты, 1496 тон малака.

Стальная магістраль

Недалёка ад чыгуначнай станцыі Лепель стаіць цагляны будынак. Час ад часу сюды заходзяць людзі ў форме чыгуначнікаў. Гэта члены дарожных брыгад, якія тут адпачываюць, рыхтуючыся да змены.

На першым паверсе будынка размясціўся рэдкі па свайму профілю і своеасаблівы музей гісторыі ўчастка чыгункі Орша—Лепель, які адкрыўся ў красавіку 1989 г. У невялікім пакоі шматлікія музейныя экспанаты, якія адразу прыкоўваюць увагу зацікаўленага наведвальніка. Яны апавядаюць аб гісторыі будаўніцтва і станаўлення чыгункі.

Паглядзеўшы на карту нашай рэспублікі, заўважаеш, як патрэбна была новая дарога паміж чыгуначнымі магістралямі Полацк—Маладзечна і Орша—Мінск—Маладзечна. Сталёвы шлях мог ажывіць вялізны рэгіён Аршанскага, Талачынскага, Сенненскага, Чашніцкага, Лепельскага раёнаў Віцебскай вобласці, значна аддалены ад буйных шасейных дарог. У перспектыве можна было б прадоўжыць будаўніцтва да станцыі Параф'янава Докшыцкага раёна з выхадам на Маладзечна, у Гродзенскую вобласць і Балтыю.

Шматлікія экспанаты музея расказваюць, як ажыццяўлялася будаўніцтва важнага народнагаспадарчага аб'екта, на які ўскладвалася светлая мара пераўтварэння мясцовага краю. У архіве г. Падольска Маскоўскай вобласці захоўваецца гістарычны фармуляр чыгуначнай часці, утворанай у кастрычніку 1918 г., якая займалася будаўніцтвам чыгунак у краіне.

У вышэйпамянёным фармуляры значыцца, што лінію Орша—Лепель пачаў будаваць 7-ы Чыгуначны полк, які ў 1930 г. быў рэфармаваны. Частка яго асабовага саставу ўвайшла ў в/часць 12670. Некаторыя звесткі аб пачатку работ знаходзім у кнізе С. С. Касовіча і А. М. Філімонава «Савецкія чыгуначныя».

Апавядаючы аб стварэнні чыгунак у краіне, аўтары ўпамінаюць і будаўніцтва нашай дарогі. «У сярэдзіне 20-ых гадоў, — пішуць яны, — было прынята рашэнне пабудаваць чыгуначную лінію Орша—Лепель у Беларусі. Зімой 1924/25 г. зводны чыгуначны полк прыступіў да падрыхтоўчых работ, а ўжо вясной амаль усе чыгуначныя часці Савецкай Арміі прыбылі на будоўлю і занялі свае ўчасткі. Палкі былі аб'яднаны ў корпус войск шляхоў зносін, камандзірам якога прызначылі Л. І. Канавалава, ваенным камісарам В. Н. Вераб'ёва, начальнікам штаба Н. В. Барадзіна. Корпус быў узмоцнены аўтатранспартнымі і сапёрнымі часцямі.

Асноўныя будаўнічыя работы пачаліся ў маі 1925 г., але тэмпы земляных і ўкладачных работ былі нізкімі. На працягу сутак будавалі не больш 800—1000 метраў шляху. Адставалі мостабудаўнікі. Адчуваўся на будоўлі недахоп механізмаў, будаўнічых матэрыялаў. На ўсёй трасе працаваў толькі адзін экскаватар, 22 аўтамабілі розных марак. Палавіна з іх пастаянна знаходзілася ў рамонце. Галоўнымі прыладамі працы былі рыдлёўкі, а асноўнымі транспартнымі сродкамі — тачкі і конныя павозкі. Справа ўскладнялася яшчэ тым, што дарога пракладвалася па перасечанай мясцовасці, дзе сустракаліся марэнныя ўзгоркі, лясы, хмызнякі, балоты. Адсутнічалі і пад'язныя шляхі. Часта насыпанае земляное палатно давала асадку. Усё гэта вымушала будаўнікоў выконваць дадатковую работу. Але чыгуначнікі працавалі з натхненнем, настойліва пераадольваючы ўсе перашкоды. Павышалася іх майстэрства. Былі зроблены пэўныя захады па ўкараненню ў вытворчы працэс сродкаў механізацыі. Усё гэта станоўча адбілася на тэмпах будаўніцтва. Сярэднясутачная выпрацоўка ўжо дасягнула 4,3 км.

Пасільную дапамогу ў будаўніцтве чыгункі аказала мясцовае насельніцтва, моладзь. 7 лістапада 1925 г. па чыгуначнай лініі Орша—Лепель прайшоў першы поезд. Разам з кіраўнікамі корпуса гэтым поездам з Оршы ў Лепель прыбыў камандуючы Заходняй ваеннай акругай М. М. Тухачэўскі.

Дзякуючы цяжкай і напружанай працы будаўнікоў чыгунка была пабудавана за кароткі тэрмін. Пры гэтым было ўкладзена ў палатно 24 тыс. куб. м дарогі, пяску і жвіру, пракладзена 160 км шляхоў, выканана 1,8 млн. куб. земляных работ, пабудавана 72 масты, праведзены 532 км правадоў тэлефонна-тэлеграфнай лініі сувязі.

На ўрачысты мітынг, прысвечаны заканчэнню работ, прыйшлі будаўнікі, госці, мясцовае насельніцтва. Гэта было радаснае і жаданае свята. Самаадданая праца чыгуначнікаў была адзначана ўрадам Беларускай ССР.

Палкі чыгуначных войск у 1926 г. былі ўдастоены беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, які быў зацверджан 24 ліпеня 1924 г. Прэзідыумам ЦВК БССР, і Ганаровых грамат ЦВК. Ударнікі будаўніцтва стальной магістралі былі ўзнагароджаны спецыяльна ўстаноўленым імянным значком «Орша—Лепель».

Узнагароды ўсхвалявалі будаўнікоў. 18 красавіка 1927 г. яны ў пісьме на імя Старшыні ЦВК БССР А. Р. Чарвякова і Старшыні СНК БССР Я. А. Адамовіча дзякавалі працоўным Беларусі «за ўвагу і клопаты, якія забяспечылі магчымасць выканаць з поспехам задачу пры будаўніцтве чыгункі Орша—Лепель».

...70 гадоў служыць раёну чыгунка. Яна надзейна звязвае Лепель з краінай. Адсюль ідуць у розныя куткі краіны і за мяжу льновалакно, лесаматэрыялы, малочныя кансервы, мэбля, шасцерні, пылососы і інш. Прыбываюць нафтапрадукты, машыны, абсталяванне. Калектыў станцыі прыкладае намаганні, каб выконваць план перавозкі грузаў і пасажыраў па мясцовай чыгунцы.

І. Ю. Януш

Брыгадзір трактарнай брыгады

— Нарадзілася я, — расказвае Макрына Лукінічна, — у 1917 г. І правяла дзіцячыя і юнацкія гады ў в. Свяда Лепельскага раёна. Толькі пазней, калі падрасла, зразумела, які цяжкі лёс напаткаў нашу сям'ю, калі часовымі гаспадарамі сталі немцы, а потым белапалякі. Ворагі рабавалі насельніцтва, забіралі жывёлу і прадукты харчавання, здзекаваліся над жыхарамі. Пасля жорсткіх катаванняў мая маці да канца свайго жыцця засталася інвалідам.

Макрына разам са сваімі аднагодкамі наведвала Слабадскую сямігодку. Вучылася яна ахвотна. Скончыўшы 5 класаў, працавала ў калгасе на розных работах, потым — у звяне па вырошчванні лёну.

— Калі прапанавалі вучыцца на трактарыстку, згадзілася, — успамінае Макрына Лукінічна, — хоць ведала, што справа гэта не з лёгкіх, ды і знаёмыя адгаворвалі. Але я была маладая і не баялася цяжкасцей. Скончыўшы курсы пры Валосавіцкай МТС зімой 1935/36 г., пачала працаваць спачатку на трактары «Універсал». Пазней мяне накіравалі на курсы брыгадзіраў трактарных брыгад у горад Чэрыкаў Магілёўскай вобласці. Закончыла іх паспяхова і ўзначаліла жаночую трактарную брыгаду, у якой працавала 8 мясцовых дзяўчат. За намі былі замацаваны чатыры трактары.

М. Л. Дзёмка, брыгадзір жаночай трактарнай брыгады ў 1930-ыя гады

М. Л. Дзёмка перадала на захоўванне Лепельскаму краязнаўчаму музею пасведчанне шафёра трэцяга класа, якое атрымала ў 1940 г. На славутай «паўтаратонцы» яна забяспечвала гаручым Валосавіцкую МТС.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Макрына дапамагала партызанам. А пасля вызвалення прапанавалі ёй работу ў магазіне в. Слабада, пазней яна загадвала тут малочным пунктам.

У 50-ыя гады сотні лепяльчан накіраваліся на важнейшыя народнагаспадарчыя аб'екты краіны. Сярод іх была і Макрына Лукінічна. Яна працавала ў Данбасе, здабывала там каменны вугаль. У працоўнай кніжцы жанчыны запісаны дзесяткі падзяк і заахвочванняў за ўдарную працу ў Данецку.

Цяпер М. Л. Дзёмка на пенсіі. Але яна не пакідае прывычнай сялянскай працы.

І. Ю. Януш

Дакументы сведчаць

Звесткі аб колькасці насельніцтва, двароў і населеных пунктаў па Лепельскаму раёну, 1927 г.

Назва	Беларусаў	Расейцаў	Палякаў	Яўрэяў	Латышоў	Іншых	Усяго	Пасяліш	Двароў	Увага
Лепельскі гарсавет	3590	125	30	2800	20	585	7000	5	1981	
Лепельскі	4765	—	—	—	—	—	4765	38	795	
Стайскі	4324	—	62	—	—	—	4886	78	800	
Пышнянскі	3009	7	500	110	—	4	3680	48	728	
Вараньскі	2860	68	950	27	—	—	3900	39	720	
Каменскі	3539	82	937	479	—	—	4987	68	968	
Несінскі	2759	—	336	—-	—	—	3095	51	681	
Прудокскі	2819	—	528	19	—	—	2866	62	559	
Палянскі	3500	7	142	25	—	4	3678	54	644	
Ляхаўскі	3873	—	237	35	—	—	4145	42	799	
Валосаўскі	2574	—	9	33	5	1	2622	85	585	
Весялоўскі	155	18	823	—	—	9	1000	29	186	
Зацякляскі	1391	—	245	17	—	—	1658	57	303	
Сьвяцкі	4308	—	—	—	—	—	1008	75	805	
Усяго:	42876	247	4799	3545	25	548	52035	626	9681	

Сакратар Райвыканкама подпіс неразборлівы

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 222. Воп. 1. Спр. 47. Арк. 505.

Звесткі аб медыцынскіх і дзіцячых установах па Лепельскаму раёну на 1930 г.

Наименование учреждений	Кол-во учрежд.	Кол-во развернутых коек	Поступило больных за год
1. Врачебные участки	3	—	—
в том числе:			
Латыгово	1	—	—
Волосовичи	1	—	—
Воронь	1	—	—
2. Больничные участки	2	32	1071
в том числе:			
г. Лепель	1	30	—
Краснолуки	1	2	—
3. Детская консультация	1	—	—
4. Аптека	1	—	—
5. Яслей постоянных, сезонных в колхозах	17	444	—
6. Количество врачей	6		
в том числе: терапевтов	1		
зубных	1		
акушеров	3		
фельдшеров	8		
санитаров	5		
фармацевтов	3		
млад. перс.	14		
других	4		
Итого медицинского персонала	44		

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь

Прат. № 32 от 24/XI-30 г.

У Прэзідыум Лепельскага раённага выканаўчага камітэта

арганізатара калгаса «Гарані»
Несінскага с/с у ліку 18 гаспадароў
ВАШУКА К. А.

Т Л У М А Ч Э Н Н Е

Вёска Гарані мае 36 гаспадароў, з іх беднякоў, аслабанёных ад с/г падатку з — 8 касп., сераднякоў — 28 касп., індывідуальна абкладзеных няма. У склад паселішча «Гарані» ўваходзіць пас. Гарані з 22 касп. і 14 асобных хутароў, распаложаных побач з пасёлкам. Плошча зямлі ўсяго пашні і сенажаці 221, 84 га. Арганізавана раней ужо 2 гады машыннае т-ва ў ліку 12 касп., маюцца машыны, т-ва працуе. 12/XI-30 г. на агульным сходзе па майму дакладу аб рашэнні XVI з'езда УКП(б) аб калгасным будаўніцтве большасць гаспадароў пажадалі свае гаспадаркі арганізаваць у калгасе ў поўным сэнсе ў добраахвотным парадку, прычым калгас, вынеслі пажаданне, арганізаваць самастойны. Правёў з імі яшчэ дзве гутаркі, два вечары аб жыцці і працы ў калгасе, на 3-м сходзе я прыступіў да афармлення калгаса, на першых парах у ініцыятыўную групу запісалась 18 гаспадароў з агульнай іх плошчаю 111 га, але адначасова на сходзе дагаварыліс, што пасля зацвярджання р. в. к. калгасу «Гарані» ўсе на 100% паселішча ўступаюць у калгас. Маю пэўную думку, што і калгас «Гарані» паследуе прыкладу раней арганізаванага мной калгаса «Воля», які арганізаваўся з 15 гаспадароў, а пасля зацвярджэння яго ўся вёска ў ліку 34 касп. уступіла ў калгас і ўжо заканчвае ворыва пад зяблёва, канчаткова знішчыў усе межы, гэты жа калгас «Воля» вызваў ужо на сацспаборніцтва ўноў арганізаваны мной калгас «Гарані», каб апошні паследаваў іх прыкладу і ўзяў такія ж тэмпы ворыва пад зяблёва, як і калгас «Воля».

Просьба калгас «Гарані» ў хуткім часе зацвердзіць і адаслаць на месца 1 экз. усіх папер па арганізацыі калгасу.

Вашук (подпіс)

14.XI.30 г.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 1457. Воп. 1. Спр. 262. Арк. 1.

Звесткі аб выніках калектывізацыі па Лепельскаму раёну

	на 1/1-1936 г.	на 1/1-1937 г.
Колхозов	128	129
Всего дворов в к-зе	8066	8227
Единоличников	892	638
Всего дворов по р-ну	8964	8865
% коллективизации	89,9	92,8

	1933 г.	1934 г.	1935 г.	1936 г.
Исключено	516	163	141	28
Выбыло	—	—	187	180

В число выбывших входят состоявшие ранее в колхозах учителя, служащие сельских Советов и кооперации, одиночки, вышедшие в замужество и уехавшие в города и на учебу, а также ушедшие в Красную Армию.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 222. Воп. 47. Спр. 301. Арк. 2.

Звесткі аб працаднях па калгасах Лепельскага раёна

	на 1935 г.	1936 г.
Зерновых		
до 50 гр.	26 колх.	100 колх.
до 1 кг	58	24
свыше	44	2
без выдачи зерн.	—	3
всего колхозов	128	129
Картофеля		
до 1 кг	2	2
до 2	23	10
от 2 до 3	37	21
от 3 до 5	51	68
от 5 до 7	14	22
от 7 до 10	1	6
	128	129
Денег		
до 20 коп.	76	81
до 40	33	34
до 60	9	12
от 60 до 80	5	1
до 1 р.	1	—
без выдачи денег	1	—
	128	129

Зав. РАЙЗО КОВАЛЕВСКИЙ
Инструктор по учету ХВАТЫНЕЦ

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 222. Воп. 4. Спр. 322. Арк. 1.

ТЭЛЕГРАМА
дырэктару Лепельскага лясгаса аб прадстаўленні звестак аб Стаханаўскім руху на прадпрыемстве

З Мінска 2387 сл. 24—27/XIII-36 г.

Лепель дырэктару Леспрамгаса. Безадкладна прадстаўце звесткі Стаханаўскім руху для даклада Маскву Наркому тав. Любаву тчк.

Матэрыял павінен быць трэсце 30—31-га жніўня Трэціхін, 28.VIII.36 г.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 1460. Воп. 1. Спр. 127. Арк. 63.

Тэлеграма «Лесбелу» ў Мінск дырэктара Лепельскага лясгаса аб колькасці стаханаўцаў на прадпрыемстве

Міхасенка *1 верасня 1936 г.*

Маецца Стаханаўцаў-лесарубаў 22, возчыкаў уласнага абоза 28, Цесчыкаў-раздзельшчыкаў 23, станкавых 10, кузняцоў 2.

Качан.

Дакладна: /подпіс неразборлівы/
1.IX.36 г.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 1460. Воп. 1. Спр. 127. Арк. 64.

Культурнае развіццё раёна

Важным накірункам пераўтварэнняў, якія ажыццяўляліся пад сцягам пабудовы сацыялізму, з'яўлялася культурнае развіццё. У першую чаргу неабходна было ажыццявіць усеагульнае пачатковае навучанне. Зыходзячы з поспехаў у гэтай галіне, ужо ў 1932 г. партыйныя і дзяржаўныя кіраўнікі БССР паспешліва абвясцілі аб выкананні гэтай задачы. На самай справе гэта было не так.

У 1934 г. XVII з'езд ВКП/б/ паставіў задачу дабіцца ажыццяўлення ў бліжэйшыя гады ўсеагульнага абавязковага навучання ў аб'ёме сямігадовай школы. Гэты пераход выконваўся ва ўмовах рэфармавання сістэмы адукацыі, якое фактычна пачалося з пачатку 30-ых гадоў. На аснове адпаведных пастаноў партыйна-дзяржаўных органаў СССР мяняліся праграмы, падручнікі, устанаўліваўся распарадак школьнага жыцця і іншае. Усталёўвалася адзіная школьная сістэма. Калі да гэтага часу ў БССР асноўным звяном школьнага навучання з'яўлялася сямігодка, то з сярэдзіны 30-ых гадоў яе змяніла дзесяцігадовая агульнаадукацыйная школа.

КАЛГАСНАЯ ПРАЎДА

ВЕЧАР

Арганізацыйна-гаспадарчае замацаванне калгасаў — аснова работы калгасных парт'ячэек

Газета «Калгасная праўда»

У 1934 г. у Лепелі быў узведзены новы будынак беларускай сярэдняй школы, якая адкрылася на базе сямігодкі. Праз два гады — руская сярэдняя школа. У 1940 г. на Лепельшчыне 91 школу наведвалі 10908 вучняў. Працавалі пяць дзіцячых садкоў і пяць ясляў.

У 1930 г. закончылася рэканструкцыя памяшкання для размяшчэння ў ім Лепельскага педагагічнага тэхнікума, які існаваў на працягу 26 гадоў.

21 лістапада 1930 года ў г. Лепелі выйшаў першы нумар раённай газеты «Калгасная праўда».

У складаных умовах развівалася навука Беларусі. Вядучая роля ў навуковых даследаваннях належала Беларускай Акадэміі навук.

У выніку сталінскіх рэпрэсій навуковым кадрам быў нанесены непапраўны ўрон.

З усталяваннем адміністрацыйна-камандна сістэмы, культу асобы ўзрасла практыка грубага ўмяшання ў развіццё літаратуры і мастацтва.

Тым не менш і ў гэтых умовах з'яўляліся мастацкія творы, якія ўвайшлі ў класіку беларускай літаратуры. Аднак кадры літаратараў панеслі ў выніку рэпрэсій вялікія страты. Былі рэпрэсіраваны пісьменнікі А. Александровіч, П. Галавач, М. Гарэцкі, Ц. Гартны, А. Дудараў, М. Зарэцкі, Т. Кляшторны, Я. Пушча, М. Чарот і многія іншыя.

Цяжкія ўмовы накладвалі таксама адбітак на развіццё сцэнічнага мастацтва, музыкі, кіно, скульптуры, архітэктуры, выяўленчага мастацтва, вуснай народнай творчасці.

У лістападзе 1938 г. пачаў сваю работу Лепельскі калгасна-саўгасны тэатр. Яго акцёрамі сталі былыя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці, мастацкім кіраўніком

А. А. Алейнікаў, дырэктар Лепельскай сярэдняй школы ў 1922—1924 гг.

якога быў прызначаны Казімір Пятровіч Стэцкі.

У Лепель прыйшло кіно. Адным з першых кінамеханікаў у горадзе стаў Уладзімір Аляксеевіч Мацкевіч, які загінуў у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны.

Да пачатку 1940-ых гадоў некаторыя поспехі былі дасягнуты ў галінах сацыяльнага страхавання, развіцця аховы здароўя насельніцтва.

На 1 студзеня 1940 г. у Лепельскім раёне было 5 бальніц на 216 ложкаў, 8 амбулаторый і паліклінік, 2 дзіцячыя кансультацыі, 11 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Павялічылася колькасць медработнікаў. У гэты час у раёне працавалі 16 урачоў, 7 зубных урачоў, 16 фельчараў, 7 акушэрак, 85 медсясцёр. Працавала Лепельская школа медсясцёр, у якой навучалася 184 чал. Аднак медыцынскія ўстановы адчувалі недахоп кваліфікаваных кадраў, абсталявання, медыкаментаў.

15 студзеня 1938 г. сесія Вярхоўнага Савета СССР зацвердзіла пастанову ЦВК БССР аб утварэнні ў рэспубліцы пяці абласцей: Мінскай, Віцебскай, Гомельскай, Палескай і Магілёўскай. Тэрыторыя Лепельскага раёна адышла да Віцебскай вобласці.

На жыццё Беларусі, як і ўсёй дзяржавы, пэўны адбітак наклала савецка-фінская вайна (зіма 1939—40 гг.). Насуперак планам вярхоўнага кіраўніцтва лёгкай перамогі не атрымалася. Яна была дасягнута значнымі людскімі і матэрыяльнымі стратамі.

У сувязі з пагрозай вайны з Германіяй у сярэдзіне 1940 г. быў уведзены 8-гадзінны рабочы дзень і 7-дзённы рабочы ты-

Члены рэдакцыі газеты «Калгасная праўда», 1934 г.: Чарняўскі — сакратар; Куроўскі — адказны рэдактар; Дзесюкевіч — заг. с/г аддзела



Будынак былога педтэхнікума ў 1930—1956 гг.

Навучэнцы педтэхнікума, 1933 г.

дзень. Парушэнні працоўнай дысцыпліны караліся судовымі органамі.

У той час, калі наша краіна займалася мірнай працай, на захадзе ваўсю ішла падрыхтоўка да ваеннага нападу на яе, да новай сусветнай вайны.

Склаў І. Ю. Януш

Выданні РОСТА

У архівах Масквы захавалася некалькі нумароў насценнай газеты выдання Лепельскага аддзела Расійскага Тэлеграфнага Агенцтва за 1920—1921 гг. Малюнкі на іх змяшчаліся падкрэслена простыя: з выразнымі сілуэтамі, з расфарбоўкай у 2—3 колеры.


СТЕННАЯ ГАЗЕТА РОСТА

Изд. Лепельского Отд. Росс. Телегр. Агентства.

ТОЛЬКО В ТРУДЕ ВМЕСТЕ С РАБОЧИМИ И КРЕСТЬЯНАМИ МОЖНО СТАТЬ НАСТОЯЩИМИ КОММУНИСТАМИ.

От слов к делу.

Фронт труда.

Программа выполнена целиком.

ДОНБАСС.

ВОССТАНАВЛИВАЮТ ТРАНСПОРТ.

ПО СОВЕТСКОЙ РОССИИ.

Из плена.

БОРЬБА С ГОЛОДОМ

В СТРАНАХ КАПИТАЛИЗМА

Угольный кризис в Америке.

К вопросам торговли.

НА ПУТЯХ К МИРОВОЙ РЕВОЛЮЦИИ.

В Польше.

В Турции.

Насценная газета Лепельскага аддзялення РОСТА, 1921 г.

Аб чым пісала насценная газета?

У адным з нумароў выдання за 4 мая 1921 г., якое выпускала Лепельскае ўпраўленне народнай адукацыі, быў змешчаны рэдакцыйны артыкул: «Следующий номер устной газеты выйдет в воскресенье 8 мая. Выпуск газеты будет сопровождаться научно-популярной лекцией по истории. Лектором выступит тов. Трофимов. Вход свободный.

Чтение лекций по различным отраслям знаний редакция предполагает ввести в систему при выпусках устных газет.

Просьба ко всем советским учреждениям снабжать материалами редакцию устгазеты унаробраза».

6 мая 1921 г. у газеце з'явілася аб'ява: «Библиотечная секция уполитпросвета в середине мая открывает газетный и книжный киоск на городском бульваре (теперь площадь Свободы). Выдача газет и книг для прочтения бесплатная, по служебным удостоверениям.

Уполитпросвет».

У рубрыцы «Па Лепелю» 6 лютага 1921 г. быў змешчаны водгук на паказ у горадзе аперэты:

«Постановкой на сцене Советского театра 5 февраля оперетты «Сон обывателя» положено начало сценической революционной сатире. Удачный подбор мелодий, преимущественно знакомых, и вполне хорошее исполнение встречены зрителями с большим удовлетворением.

Особенно хороша и типична была группа представителей буржуазного мира, обрушившаяся на ошеломленного «обывателя» с котелком на голове.

Публика (в большинстве красноармейцы) горячо аплодировала. Надо пожелать, чтобы революционная сатира в форме оперетт завоевала себе принадлежащее ей по праву почетное место в Советском театре».

Трэба адзначыць, што насценная газета мела тыраж 200 экземпляраў і друкавалася ў 1-ай Лепельскай дзяржаўнай друкарні. Рэдактарам яе быў Л. М. Беленькі.

І. Ю. Януш

Да ўсеагульнай сярэдняй

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. узмацніла наспеўшую патрэбу ў арганізацыі сярэдняй навучальнай установы ў горадзе. Але толькі пасля перамогі Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі пачала працаваць гімназія. Вучылася тады ў ёй каля 100 хлопчыкаў і дзяўчынак. Першым дырэктарам быў П. А. Счансновіч, ураджэнец м. Камень. Да гэтага ён выкладаў у Магілёўскай губернскай жаночай гімназіі. Вялікую арганізатарскую работу правялі мясцовыя настаўнікі А. І. Лобус і В. Я. Савіцкі.

Вучоба ў гімназіі была спынена ў сувязі з акупацыяй горада кайзераўскімі войскамі Германіі. Пасля іх выгнання ў кастрычніку 1918 г. адбыўся павятовы з'езд настаўнікаў. Яго ўдзельнікі азнаёміліся з «Палажэннем аб адзінай працоўнай школе», зацверджаным дэкрэтам УЦВК. У адпаведнасці з палажэннем, у Лепелі былі створаны тры школы першай ступені і тры — другой ступені. Упершыню ў нашай краіне было ўведзена абавязковае бясплатнае навучанне ўсіх дзяцей.

Асновай школьнага жыцця была вытворчая праца, «цесна звязаная з навучаннем асновам навук, якія асвятляюць святлом ведаў усё навакольнае жыццё».

Павятовы савет народнай асветы камандзіраваў настаўнікаў-энтузіястаў А. І. Лобуса і С. М. Шыёнка ў Петраград, а П. А. Счансновіча і П. І. Тараненку — у Маскву за дапамогай. Іх прынялі Я. М. Свярдлоў, А. В. Луначарскі, Н. К. Крупская. Былі выдзелены падручнікі, дапаможнікі, школьныя прыналежнасці, мастацкая літаратура. З прывезеных кніг стварылі народныя бібліятэкі ў Лепелі, Чашніках, Бешанковічах, Ушачах.

У Лепель прыбылі вядомыя педагогі краіны для арганізацыі работы павятовых настаўніцкіх курсаў. Сярод выкладчыкаў гэтых курсаў былі акадэмік Л. Б. Шчэрба, прафесары О. Г. Біргер, М. М. Васількоўскі і іншыя. На курсах навучалася звыш ста чалавек.

Нягледзячы на цяжкасці ваеннага часу, рабілася ўсё неабходнае для стварэння нармальных умоў работы школ. У іх арганізавалі бясплатнае гарачае харчаванне ўсіх навучэнцаў. Але мірная праца і гаспадарчая работа ў нашым краі зноў былі перарваны наступленнем войск белапанскай Польшчы. Значная частка павета была акупіравана. Школы спынілі сваю работу. Многія настаўнікі пайшлі ў рады Чырвонай Арміі.

П. А. Счансновіч, дырэктар гімназіі, 1920 г.

Пасля вызвалення Лепеля і раёна адразу аднавіць школьную сетку не было магчымасці. Да таго ж праз год у горадзе адбыўся вялікі пажар і многія школьныя будынкі былі знішчаны. Працавала толькі адна школа другой ступені. Яе дырэктарам быў А. А. Алейнікаў, у будучым доктар геалагічных навук, загадчык кафедры Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта.

Многія былыя навучэнцы гэтай школы сталі высокакваліфікаванымі спецыялістамі ў розных галінах народнай гаспадаркі. І. І. Агрызка — доктар геаграфічных навук, загадчык кафедры пединстытута імя Герцэна ў Ленінградзе, Н. Т. Кавалеўскі — генерал інжынерных войск, І. А. Сідорык — адказны работнік шляхоў зносін і многія іншыя.

У 1930 г. у горадзе быў адкрыты педагагічны тэхнікум, які стаў цэнтрам культурнага жыцця раёна. Тут у свой час вучыліся В. Ф. Шаура — былы загадчык аддзела культуры ЦК КПСС, Г. Ц. Кавалеўскі — буйны эканаміст рэспублікі, прафесар, Е. Лось, А. Вярцінскі — вядомыя беларускія паэты, А. А. Марунька — сакратар Лепельскага падпольнага райкама партыі ў гады мінулай вайны і многія іншыя партыйныя, савецкія і гаспадарчыя работнікі, педагогі і спецыялісты многіх галін народнай гаспадаркі.

У 1934 г. на базе сямігадовай школы адкрылася сярэдняя беларуская школа. У ёй вучыўся будучы Герой Савецкага Саюза І. М. Ерашоў. Праз пяць гадоў пачала працаваць руская сярэдняя школа.

А. С. Ханяк

Лепельскі тэатр

У лістападзе 1938 г. быў створаны Лепельскі калгасна-саўгасны тэатр. Яго акцёрамі сталі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці з Лепельскага, Ушацкага, Гарадоцкага і іншых раёнаў Віцебскай вобласці, людзі розных спецыяльнасцей і прафесій. Усіх іх аб'яднала любоў да драматычнага мастацтва і моцнае жаданне найлепш увасобіць літаратурныя вобразы на сцэне. Мастацкім кіраўніком быў прызначаны К. Катлінскі. У рэпертуары тэатра былі спектаклі, канцэртныя праграмы. За першае паўгоддзе калектыў зрабіў амаль 50 выступленняў, на якіх прысутнічала каля 20 тысяч рабочых, калгаснікаў, ваеннаслужачых.

Цёпла і ветліва сустракалі самадзейных артыстаў у Лепельскім і Ушацкім, Чашніцкім і Сенненскім раёнах. Гледачам падабаліся прастата і шчырасць, праўдзівасць выканання роляў. На першым часе не ўсё ўдавалася акцёрам. Таму яны пастаянна працавалі над сабой. Навучанне акцёраў праводзілася па спецыяльнай праграме, складзенай народным артыстам СССР Л. М. Леанідавым.

Самадзейныя артысты імкнуліся сустрэцца з прафесіянальнымі акцёрамі, павучыцца ў іх. Такая магчымасць прадставілася ў маі 1939 г. Калектыў тэатра выехаў у Віцебск, дзе пазнаёміўся з работай Тамбоўскага тэатра рускай драмы, які быў тут на гастролях. Лепельчане праглядзелі спектаклі ў выкананні гасцей, паслухалі лекцыі іх мастацкага кіраўніка. Карыснымі былі практычныя заняткі, праведзеныя акцёрамі з Тамбова.

У жніўні 1939 г. мастацкім кіраўніком і акцёрам Лепельскага калгасна-саўгаснага тэатра стаў Казімір Пятровіч Стэцкі. Прыехаўшы ў Лепель, малады мастацкі кіраўнік абнавіў рэпертуар мясцовага тэатра, запрасіў на работу новых акцёраў. Імі сталі Р. І. Ізмайловіч, Бароўскі, П. Банькоў, Н. Кузняцова, Д. Мініна, Д. Ляўковіч, М. Нарушэвіч, Салаўёў і іншыя. Многія лепельчане памятаюць яркія афішы, якія заклікалі жыхароў горада і суседніх вёсак паглядзець выступленні самадзейных аматараў сцэны. Тады былі паказаны спектаклі Ю. Германа, А. Глебава, К. Крапівы, К. Чорнага, А. Астроўскага і іншыя.

Будынак тэатра, у якім праходзілі спектаклі ў Лепелі, згарэў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Далейшы лёс тэатра склаўся так. У красавіку 1941 г. (згодна з пастановай Савета Народных Камісараў БССР) ён быў пераведзены ў Вілейскую воласць з базай у горадзе Глыбокім. На яго аснове быў створаны Вілейскі абласны калгасна-саўгасны тэатр.

І. Ю. Януш

З аўтабіяграфіі Стэцкага Казіміра Пятровіча

Нарадзіўся 7(20) верасня 1905 г. на хутары Пад'ельнік былой Лагойскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. Бацька арандаваў у памешчыка зямлю, маці была хатняй гаспадыняй.

У 1910 г. сям'я пераехала на жыхарства ў Мінск. Бацька быў добрым сталяром і цесляром, дапамагаў мінчанам у будаўніцтве дамоў.

У 1914 г. ён перайшоў на працу фурманам на трамвайную лінію.

У 1917 г. пасля цяжкай хваробы памерла маці.

На наступны год ад туберкулёзу памёр старэйшы брат. Я і малодшы брат вучыліся ў 6-ым мужчынскім прыходскім вучылішчы.

У 1918 г. бацька перавёз сям'ю ў вёску. Мяне аддаў батрачыць да памешчыка Раткевіча, а малодшага брата — пасвіць жывёлу да другога памешчыка на хутары Валокі Лагойскай воласці.

Сам бацька ўладкаваўся будаўніком на

К. П. Стэцкі, мастацкі кіраўнік Лепельскага калгасна-саўгаснага тэатра, 1939—1941 гг.

Сцэна са спектакля «Гаспадыня гасцініцы» Гальдоні

суседніх хутарах, праз некаторы час да яго далучыўся і я.

У 1925 г. бацька ажаніўся ў другі раз і зноў перавёз сям'ю ў Мінск. Тут я працаваў сталяром і цесляром у розных будаўнічых арганізацыях. Па вечарах вучыўся на рабфаку будаўнікоў.

У красавіку 1927 г. пры Польскім клубе імя Розы Люксембург адчынілася кароткатэрміновая вячэрняя тэатральная студыя, з якой у кастрычніку гэтага ж года быў створаны Дзяржаўны польскі перасоўны тэатр БССР, куды я быў залічаны акцёрам.

Працуючы ў тэатры, я адчуў недахоп ведаў, асабліва тэатральных. Пагэтаму ў 1930 г. паступіў у Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва ў Кіеве. Падчас вучобы ў інстытуце праходзіў стажыроўку ў Дзяржаўным польскім тэатры Украіны.

У 1936 годзе я скончыў інстытут як рэжысёр-акцёр з дыпломам першай катэгорыі і быў накіраваны на работу ў Дзяржаўны польскі тэатр УССР акцёрам з правам рэжысёрскай работы, дзе сумесна з мастацкім кіраўніком тэатра А. Сумарокавым падрыхтаваў спектакль «Разбойнікі» Шылера і «Дамы і гусары» Фрэдра. Самастойна падрыхтаваў другі склад акцёраў спектакля «Мазепа» Славецкага.

Пастановай Савета Народных Камісараў Украіны Польскі тэатр у маі 1938 г. быў расфарміраваны. Я быў пераведзены рэжысёрам і акцёрам у Жытомірскі тэатр, дзе паставіў спектакль «Назар Стадоля» Шаўчэнкі і «Танга» Арбузава.

Са жніўня 1939 года я працаваў мастацкім кіраўніком і акцёрам Лепельскага калгасна-саўгаснага тэатра.

14 красавіка 1941 г. Лепельскі тэатр, згодна з пастановай СНК БССР, пераведзены ў Вілейскую вобласць і рэарганізаваны ў абласны тэатр.

У Лепельскім калгасна-саўгасным тэатры мной ажыццёўлены наступныя пастаноўкі спектакляў: «Сын народа» Ю. Германа, «На чыстату» А. Глебава, «Сынуля» Мейе і Энексна, «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Ірынка» К. Чорнага, «Мінулася кату масленіца» А. Астроўскага і інш.

У снежні 1939 г. у Лепелі нарадзілася мая старэйшая дачка.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны наша сям'я была ў эвакуацыі. З верасня 1941 г. па 26 сакавіка 1942 г. я працаваў загадчыкам Зіянчурыйскага раённага Дома культуры Чкалаўскай вобласці.

26 сакавіка 1942 г. мясцовым райваенкаматам быў мабілізаваны ў працоўную армію і накіраваны на шахты Дамбараўскага рудніка Чкалаўскай вобласці, дзе працаваў забойшчыкам, старшым майстрам, дзесятнікам эксплуатацыйных работ, памочнікам начальніка шахты № 1 аж да 7 ліпеня 1944 г. За перавыкананне жніверскага плана здабычы вуглю (1942 г.) быў адзначаны Усесаюзнай грашовай прэміяй.

7 чэрвеня 1944 г. па ўрадаваму выкліку я выехаў у Маскву ў распараджэнне Упраўлення па справах мастацтваў БССР. З Масквы быў камандзіраваны ў вызваленыя ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў гарады Беларусі для ўкамплектавання

акцёрскімі кадрамі Рэчыцкага і Бабруйскага тэатраў.

9 верасня 1944 г. мяне прызначылі мастацкім кіраўніком Бабруйскага тэатра. Тут я паставіў спектакль «Урок жыцця» Галаўчынера. У 1945 г. гэты спектакль паўторна быў пастаўлены ў Баранавіцкім тэатры.

18 чэрвеня 1946 г. я быў прызначаны дырэктарам і мастацкім кіраўніком Палескага ансамбля песні і танца. У сувязі з адсутнасцю памяшканняў для рэпетыцый ансамбля і кватэр для запрошаных спецыялістаў 4 жніўня 1947 г. ансамбль аб'яднаны з Маладзечанскім ансамблем песні і танца з базай у Маладзечне. Я не пажадаў выязджаць з Мінска і 1 кастрычніка 1947 г. паступіў на працу ў Рэспубліканскі Дом народнай творчасці БССР загадчыкам тэатральнага аддзела.

14 студзеня 1958 г. перайшоў на работу ў студыю Беларускага тэлебачання і быў залічаны рэжысёрам. Тут працаваў старшым, галоўным, а з 1 сакавіка 1965 г. рэжысёрам вышэйшай катэгорыі галоўнай рэдакцыі грамадска-палітычнага вяшчання Беларускага тэлебачання.

З 1977 г. на пенсіі ў якасці персанальнага пенсіянера рэспубліканскага значэння.

Іх памятаюць на Лепельшчыне

Тодар Кляшторны

Тодар Тодаравіч Кляшторны нарадзіўся 11.3.1903 г. у в. Парэчча Лепельскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся на рабфаку ў Оршы. У 1931 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў на радыё, у рэспубліканскіх газетах і часопісах. Быў членам «Маладняка», «Узвышша», БелАПП. Восенню 1936 г. арыштаваны. 29.10.1937 г. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 30.10.1937 г. Рэабілітаваны ў 1957 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1925 г. (часопіс «Аршанскі маладняк»). Выйшлі зборнікі вершаў «Кляновыя завеі» (1927), «Светацені» (1928), «Ветразі» (1929), «Праз шторм на штурм» (1934), паэма «Палі загаманілі» (1930) і кніжка-малюнак для дзяцей «Пра зайца, ваўка і мядзведзя» (1935). У 1960 г. выдадзена кніга паэзіі «Залатое вязьмо», у 1970 г. — Выбраныя творы.

Пераклаў на беларускую мову раман Ф. Панфёрава «Брускі» (з М. Багуном, ч. 1, 1932), асобныя творы У. Маякоўскага, М. Асеева, А. Безыменскага, М. Галоднага, А. Лахуці, Л. Першамайскага.

Беларускія пісьменнікі (1917—1990): Даведнік. Мн., Маст. літ., 1994. С. 285—286.

«Мой бацька — Тодар»

З успамінаў Т. Т. Кляшторнай

Калі я ўспамінаю сваё дзяцінства, дык перш за ўсе бачу бацькавы вялікія і задумлівыя вочы, якія, здаецца, увабралі ў сябе ўсю дабрыню свету. У сям'і, дзе ён нарадзіўся, яго чамусьці ўсе звалі ласкава Тодзікам. Дзяцей там было сямёра: чатыры браты (Іван, Ціхан, Тодар, Ягор) і тры сястры (Агапья, Александрына, Анюта). Тодар быў вельмі падобны на сваю матулю Наталлю. І нават характар яе перадаўся яму. Маці яго вельмі любіла і часам з нейкім жаночым гонарам казала суседзям, што яе Тодзік нават мухі ніколі не пакрыўдзіць.

Бацькі яго былі бедныя сяляне, якія амаль да Кастрычніцкай рэвалюцыі не мелі сваёй зямлі. Каб пракарміцца, яны хадзілі наймацца працаваць да мясцовых багацеяў. У летні час Тодар наймаўся пастушком да мясцовых кулакоў. З дзяцінства ён бачыў іх здзекі, хітрасць, і гэта яго хвалявала. З дзяцінства ў хлопчыка пачаў праяўляцца талент складаць вершы. Яго

вершы падхоплівала вясковая моладзь і спявала прыпеўкамі. Бацькі заўважылі здольнасці сына і аддалі яго вучыцца ў мясцовую школу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі юнак уступіў адным з першых у камсамол. У краіне ішла барацьба з ворагамі савецкай улады. Аднойчы, калі Тодар вярнуўся з камсамольскага сходу, яго схапілі п'яныя ворагі, пасадзілі на вазок і павезлі ў лес расстрэльваць. Але ён скаціўся з вазка ў густы ельнік і выратаваўся. Гэтая падзея адлюстравана ў адным з яго вершаў — «Па слядах мінулага».

Ішоў час, і юнак зразумеў, што яму, каб развіваць свой паэтычны талент, трэба вучыцца. Сонечным восеньскім днём ён адпраўляецца пехатой у Оршу на вучобу ў рабфак. Праважала да шашы яго ўся вёска. На юнаку быў надзеты вайсковы шынель, а ў торбачцы ляжала кніжка вершаў С. Ясеніна, якая яму вельмі падабалася. Прыйшоўшы ў Оршу, ён паступіў на рабфак. Днём вучыўся, а па начах, каб не памерці з голаду, грузіў і разгружаў разам са сваімі таварышамі па вучобе вагоны. Першыя свае вершы прынёс у рэдакцыю ў газету «Аршанскі маладняк» у 1926 г., дзе яны і былі надрукаваны.

Затым ён пераязджае ў Мінск і паступае ў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працуе на радыё, у рэдакцыі талент Т. Кляшторнага развіваецца, шліфуецца. Яго вершамі захапляюцца студэнты і маладыя настаўнікі, рабочыя, сяляне, селькоры і вясковыя камсамольцы. Вершы маладога лірыка былі ім блізкія сваімі вытокамі, сялянскаю высноваю, рамантычнай узнёсласцю і ўяўным сумам маладога кахання.

Тодар Кляшторны — лірык па характары, па душы, крыху наіўны, узнёслы і рамантычны, як і належыць сапраўднаму паэту. Такім ён быў у паэзіі і ў жыцці, такім ён запомніўся тым, хто ведаў яго ў гады маладосці: высокі, з непаслухмянаю чупрынаю, сціплы, па-дзіцячаму даверлівы і добры, абыякавы да сябе, чулы і ўважлівы да людзей. У 1927 г. выйшаў яго першы зборнік вершаў «Кляновыя завеі». Праз год — «Святлацені», у 1929 г.— «Ветразі», у 1930 г. — «Палі загаманілі».

Т. Т. Кляшторны

За пяць наступных гадоў паэт выдаў яшчэ шэсць кніжак вершаў.

Да восені 1936 г. мы жылі ў Мінску ў доме па Магілёўскай шашы. У нашу кватэру часта прыходзілі паэты Алесь Пальчэўскі, Уладзімір Хадыка, Станіслаў Шушкевіч, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка і іншыя. У невялікім пакойчыку ўсім было ўтульна. Сябры чыталі свае новыя вершы, раіліся, спрачаліся, часам вялі літаратурныя дыскусіі. Мне, шасцігадовай дзяўчынцы, сустрэчы з бацькавымі сябрамі прыносілі асаблівую радасць і цікавасць, тым больш што бацька дазваляў мне садзіцца да яго на калені, і я, седзячы ў яго абдымках, мела магчымасць усё слухаць. Асабліва спадабалася мне слухаць вершы. Потым я хутка засынала, і мяне адносілі ў ложак. Маці жартавала: «Ізноў ваша чараўніца-паэзія закалыхала дачку».

Да нейкага часу ў маім шчаслівым дзяцінстве было больш светлага. Бацька браў мяне часам у Дом літаратара, дзе я бачыла Янку Купалу, Якуба Коласа. Чула іх гутарку з бацькам і разумела, што яны добра адзываюцца аб яго вершах, падтрымліваюць яго паэтычны талент.

Але на парозе ўжо стаяў 1937 г. ...

Восеньскай ноччу 1936 г., калі ўсе ўжо спалі, у кватэру моцна пастукалі. У прыхожую ўвайшлі тры вайскоўцы. Адзін з іх прад'явіў ордэр на арышт бацькі. Ад стуку я тады прачнулася. У кватэры пачаўся вобыск. Разам з кніжкамі Кляшторнага ў мех ляцелі паэтычныя зборнікі А. Звонака, М. Лужаніна, В. Хадыкі і іншых рэпрэсіраваных паэтаў.

Бацька суцяшаў маці, якая плакала: «Супакойся, гэта нейкая памылка. Разбяруцца, і я вярнуся». Але вярнуцца дадому яму ўжо не прыйшлося. Бацьку было прад'яўлена абвінавачанне, што ён з'яўляецца ворагам народа. На допытах, якія вяліся ноччу, адзін следчы змяняў другога, а Кляшторны праходзіў праз здзекі, пабоі і катаванні кожнага з іх. Яго саджалі на салёную ваду, кідалі ў карцэр, каб ён падпісаўся, што з'яўляецца ворагам народа, але ён не падпісаўся.

Маці пісала пісьмы Сталіну, але Сталін да такіх пісьмаў быў сляпым і глухім. Пасля арышту бацькі ў маці нарадзілася трэцяя дачка. А праз чатыры месяцы яе арыштавалі, як жонку «ворага народа», і разам з дачкой адправілі ў Акмолінскі карлаг. Там яна пакутавала дзесяць гадоў.

Нас, старэйшых дачок, уладкавалі ў дзіцячы дом. Доўгія гады я хацела даведацца пра лёс бацькі пасля арышту.

XX з'езд адкрыў мне вочы на многія трагічныя з'явы ў жыцці нашай краіны, але ж потым былі доўгія гады застою. Куды толькі я не пісала. І толькі ў 1988 г. атрымала дакумент з ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР, дзе паведамляецца, што пісьменнік Т. Кляшторны быў неабгрунтавана асуджаны ў г. Мінску. Яго справа была сфальсіфікавана работнікамі НКУС БССР. 30 кастрычніка 1937 г. ён быў расстраляны...

8 чэрвеня 1958 г. ён пасмяротна рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Цяжка і балюча было чытаць гэты дакумент.

У Мінску ёсць месца, дзе расстрэльвалі нявінных ахвяр сталінізму. Хутка там будзе ўзведзен помнік. Гэта месца называецца Курапаты. Я туды ездзіла, каб пакласці кветкі, і ў мяне нарадзіўся вось гэты верш.

КУРАПАТЫ

У бары, абветраным вясною,
Белыя падснежнікі цвітуць.
Курапаты — месца майго болю,
Смутку, што да скону не прайдуць.
Тут даўно нявінныя ахвяры
Сталінізму чорнага ляжаць —
Абарваныя надзеі, мары,
Толькі праўду нельга расстраляць.
Трыццаць сёмы ўсё жыцце крадзецца
Чорным ценем па маіх слядах
І страляе ў бацькавае сэрца,
Маці зніштажае ў лагерах...
Праўду ў Курапатах не схавалі,
Не спаліць яе і не забіць.
Каб карэнні зла не прарасталі,
Мы ўсё гэта мусім не забыць.

Народ не забудзе. А ў Курапатах устане помнік, які будзе напамінаць пра тых, хто нявінна загінуў. І сярод іх паэт Тодар Кляшторны, мой бацька, у лёсе якога адбіўся лёс народа.

З успамінаў П. Прудніка

Тодар Кляшторны прыйшоў у літаратуру ў сярэдзіне 20-ых гадоў, калі маладая беларуская літаратура была на ўздыме, набірала свой разгон. Пачынаў ён ціха, непрыкметна, не так, як, напрыклад, Андрэй Александровіч ці Алесь Дудар. Але ў хуткім часе яго слова было пачута ўсімі, хто меў дачыненне да літаратуры і хто любіў паэзію, таму што ён быў своеасаблівым, непадобным на іншых, меў свой арыгінальны голас.

Тодар Кляшторны быў ціхі, спакойны і выключна ветлівы чалавек. Ён заўсёды і ўсюды стараўся быць непрыкметным. Многа ведаў, слухаў іншых, але сам гаварыў мала. З выгляду ён быў прыгожы, высакарослы, крыху сутулаваты, як быццам гнуўся знарок, саромеючыся свайго росту, сінявокі, з добрай чупрынай непаслухмяных валасоў каштанавага колеру. Апранаўся звычайна — не па модзе. Як на вопратку, так і на абутак асаблівай увагі не звяртаў. Усе яго думкі і клопаты былі сканцэнтраваны на адным — паэзіі, якой ён самаддана служыў з дзіцячых гадоў свайго жыцця.

Я некалькі гадоў ведаў гэтага сціплага, удумлівага паэта. Ён быў значна старэйшы за мяне і друкавацца пачаў тады, калі я яшчэ толькі пачынаў крэмзаць першыя вершаваныя радкі. А калі і я пачаў друкавацца, ён меў ужо некалькі сваіх вершаваных зборнікаў — «Кляновыя завеі», «Святлацені», «Ветразі», «Палі загаманілі». Толькі ўсё гэта не шкодзіла нам быць

у добрых сяброўскіх адносінах і разам удзельнічаць у розных літаратурных вечарах і сустрэчах з чытачамі, а таксама час ад часу дзяліцца паміж сабою думкамі.

Вершы свае Тодар Кляшторны чытаў ціха, больш унутраным голасам, характэрным толькі для паэтаў. Як кажуць, нейкім аксамітным голасам. Ні жэстаў, ні мімікі не прымяняў. І, нягледзячы на ўсё гэта, слухачы яго вельмі добра прымалі.

П. Пруднікаў.
З кн. «Далёкае, але не забытае: Успаміны». Мн., 1988.

З успамінаў Станіслава Шушкевіча

Сярод аршанскіх рабфакаўцаў ён быў, бадай, самы высокі. На ім неяк смешна тапырыўся вынашаны салдацкі шынель з кароткімі рукавамі, а з-пад шапкі-будзёнаўкі звісаў цёмна-русы чуб. Вялікія вочы, здавалася, рэдка былі радасныя. Глыбокая ўдумлівасць і разважлівасць былі ў іх. З-за пазухі вытыркаўся ражок кнігі, з якой чалавек рэдка разлучаўся.

Ён не расставаўся з сябрамі, але любіў маўчаць. А калі прарывалася ў яго слова, дык яно было дасціпнае і кароткае. Гэты юнак многае ўжо бачыў, яго шынель патыхаў вятрамі баявых паходаў і нягод, дымам партызанскіх вогнішчаў.

Т. Кляшторнага абудзіла Кастрычніцкая рэвалюцыя, яна акрыліла яго творчыя сілы, дала яму магчымасць «чалавекам звацца». У 1924 г. у часопісе «Аршанскі маладняк» былі змешчаны першыя вершы Т. Кляшторнага. З гэтага года і пачынаецца літаратурная дзейнасць паэта.

Праз некаторы час Т. Кляшторны пераязджае ў Мінск. Тут ён супрацоўнічае ў часопісах «Маладняк», «Полымя», «Узвышша», газетах «Савецкая Беларусь», «Звязда», «Чырвоная змена» і прымае актыўны ўдзел у дзіцячым друку. Паэт вучыцца ў Дзяржаўным універсітэце, удзельнічае ў працы літаратурнага аб'яднання «Маладняк», а ў далейшым становіцца членам БелАППа.

Горад ашаламіў вясковага паэта. З душы паэта вырываліся іншы раз радкі, поўныя незразумелага болю:

Сумна тут, у мурах, да адчаю,
Здаецца, просіцца сэрца ў палі,
Дзе вясна залатымі ключамі
Адмыкае таемнасць зямлі...

Паэма «Калі асядае муць» (1927), у якой выразна адчувалася хваравітае захапленне багемай, выклікала незадавальненне ў нашай крытыцы. Паэт неўзабаве зразумеў непатрэбнасць такой паэзіі і пачаў шукаць рытмы і матывы для праўдзівага паказу рэчаіснасці.

Не раз радкі, поўныя грамадскага пафасу і шчырасці, а разам з тым і глыбокай лірычнасці, душэўнай прыгажосці, вабілі і цешылі чытача.

С. Шушкевіч.
Вяртанне ў маладосць. Мн., 1968.

Воіны-землякі, якія загінулі ў час савецка-фінляндскай вайны (1939—1940 гг.)

Г. ЛЕПЕЛЬ

БЫКАЎ Сямён Міхайлавіч, н. у 1910, г. Лепель, рад., памёр у 1940.

ЛАЗАРАЎ Аляксандр Пятровіч, н. у 1915, загінуў у сак. 1940.

КУЛЬГА Якаў Іванавіч, г. Лепель, загінуў у 1940.

МАЙСЕЕНКА Андрэй Васільевіч, н. у 1909, г. Лепель, прапаў без вестак.

БАБРОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАШКЕВІЧ Ягор Цімафеевіч, н. у 1906, в. Ладзеена, рад., загінуў у лютым 1940.

ЦІХАНОЎСКІ Міхаіл Уладзіміравіч, н. у 1921, в. Косцінка.

ЧЭПІК Васіль Апанасавіч, н. у 1908, в. Ладзеена, рад.

К. Ц. Аўтушка

ВАЛОСАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ШАМБАЛЁЎ Пётр Кузьміч, н. у 1911, в. Забаенне, рад., загінуў у лютым 1940.

ГОРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЕЙНІК Петр Стэфанавіч, н. у 1908, в. Шубнікі, загінуў у 1939.

ЛЯЎКО Гаўрыіл Сямёнавіч, в. Гарадчэвічы, прапаў без вестак у 1939.

МАРКОЎСКІ Васіль Фёдаравіч, н. у 1906, в. Людчыцы, рад., загінуў 27.01.1940.

ХАТКЕВІЧ Аркадзь Еўдакімавіч, н. у 1905, в. Адамаўка, загінуў.

ДОМЖАРЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АКСЮТА Іван Яфімавіч, н. у 1917, в. Пераходцы, загінуў на Кохтла-Ярве.

АЎТУШКА Кірыл Цітавіч, н. у 1915, в. Пераходцы, рад.

АЎТУШКА Уладзімір Іванавіч, в. Домжарыцы, загінуў у сакавіку 1940.

АЎТУШКА Фёдар Раманавіч, в. Саўскі Бор, санітар, загінуў 23.02.1940.

ВАШКЕВІЧ Пётр Андрэевіч, н. у 1916, в. Ствольна, прапаў без вестак.

ХАЦКЕВІЧ Лявонцій Міхайлавіч, н. у 1909, в. Кветча, загінуў у 1940.

ХАЦКЕВІЧ Пётр Усцінавіч, н. у 1910, в. Кветча, загінуў у 1940.

ШЫНКЕВІЧ Павел Цімафеевіч, н. у 1904, в. Домжарыцы, камандзір узвода, загінуў у 1940.

ЗААЗЕРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАДЗЕЙКА Іван Мікітавіч, в. Юркоўшчына.

ГАЛЕЦ Іван Мікітавіч, н. у 1913, в. Стары Лепель, загінуў 13.03.1940.

ГАРДЗІЁНАК Сафон Апанасавіч, н. у 1910, в. Заазер'е, рад., заг. у снежні 1939.

ГАРДЗІЁНАК Піліп Андрэевіч, н. у 1913, в. Балотнікі, лейт.

ГРАЧУХА Павел Емяльянавіч, н. у 1911, в. Ст. Лепель.

КАВАЛЕЎСКІ Мікалай Цярэнцьевіч, н. у 1907, рад., прапаў без вестак у 1940.

КАМЕКА Марцін Анісімавіч, н. у 1906, в. Юркоўшчына, рад., прапаў без вестак у 1940.

ЛЯХ Андрэй Карпавіч, н. у 1904, в. Балотнікі, загінуў у 1940.

МАШАРА Іван Максімавіч, н. у 1911, в. Ст. Лепель, загінуў у студзені 1940.

ПАДЛОБНЫ Дзмітрый Васільевіч, н. у 1908, в. Падлобныя, загінуў.

ПЛІГАЎКА Апанас Апанасавіч, н. у 1914, рад.

ПРАНІК Сцяпан Фядосавіч, рад.

КАМЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЯХНОВІЧ Іосіф Браніслававіч, 1906, в. Губіна, загінуў у 1940.

АЎСІЕВІЧ Нікіфар Іванавіч, в. Забароўе.

АЎТУХ Яфім Герасімавіч, н. у 1912, рад., прапаў без вестак у 1940.

ВАГОШКА Яфім Яфімавіч, н. у 1909, в. Макараўшчына, загінуў у 1940.

ВЕНДЖЫК Антон Пахомавіч, в. Стараселле, рад., прапаў без вестак у 1940.

КАЗАЧОНАК Аляксей Андрэевіч, в. Макоўе, рад., загінуў 17.01.1940.

КЛЯШТОРНЫ Ягор Віктаравіч.

ЛІСІЧЭНКА Нікіфар Нікіфаравіч, в. Камень, 1900, загінуў 13.02.1940.

ЛОБКІС Фёдар Гаўрылавіч, н. у 1909, в. Забароўе, загінуў у 1939.

ЛЯЙКО Фёдар Кузьміч, н. у 1907, в. Усавікі, загінуў 1.02.1940.

ПАШКЕВІЧ Мікіта Сямёнавіч, в. Парэчча, рад., загінуў у лютым 1940.

ШАКУТА Мацвей Фаміч, н. у 1912, в. Губіна, загінуў у 1940.

ФРАЛОЎ Ягор Васільевіч, н. у 1908, в. Макараўшчына, прапаў без вестак у 1940.

ЛЕПЕЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЗАРОНАК Павел М., в. Рассвет.

ГАРБАТЫ Аляксандр Кандратавіч, н. у 1912, в. Зялёны Востраў, памёр 2.01.1941.

ЗАНЬКО Пракоп Данілавіч, н. у 1909, в. Занькі, рад., загінуў у лютым 1940.

ЛУКОМСКІ Рыгор Фаміч, н. у 1910, в. Казіншчына, рад., загінуў у снежні 1939.

ЛЯЙКО Сцяпан Максімавіч, в. Чарнаручча, загінуў у пач. 1940.

МІХНА Антон Кузьміч, в. Забаенне, рад., загінуў у лютым 1940.

МІХНО Кірыл Рыгоравіч, в. Чарнаручча.

СІЛЬВАНОВІЧ Іван Аляксеевіч, н. у 1909, в. Зялёнка, радавы, загінуў у лютым 1940.

ШАЙТАР Пётр Іванавіч, н. у 1904, в. Юндзілаўка, загінуў у 1940.

ПЫШНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ГАТОЎСКІ Станіслаў Іосіфавіч, в. Заполле, 1911, загінуў у лютым 1940.

ГЛУШОНАК Пётр Васільевіч, н. у 1910, в. Забалацце.

КРЫВЕЦ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1916, в. Зароўе, загінуў у 1940.

КУЛЕШ Міхаіл Фаміч, в. Закаліўе, рад., загінуў у 1939.

МАЗГО Васіль Сцяпанавіч, н. у 1908, в. Пышнагоры.

МІРАНОВІЧ Фёдар Спірыдонавіч, н. у 1914, в. Саламахі, рад., прапаў без вестак.

ПЕРХУРОВІЧ Пётр Антонавіч, загінуў 23.12.1939.

ПРЫВАДА Іван Фёдаравіч, н. у 1915, в. Зароўе, прапаў без вестак у лютым 1940.

ПРЫВАДА Фёдар Сямёнавіч, н. у 1920, в. Зароўе, загінуў у лютым 1940.

РАМАНЕНКА Фёдар Сямёнавіч, н. у 1906, в. Уберцы, загінуў 8.02.1940.

ШЧУКА Лук'ян Апанасавіч, в. Уберцы, прапаў без вестак.

ЮХНАВЕЦ Дзмітрый Андрэевіч, н. у 1903, в. Закаліўе, загінуў у снежні 1939.

СЛАБАДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ТКАЧОНАК Мацвей Дзям'янавіч, н. у 1871 у в. Кавалевічы Валосавіцкага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 06.02.1930. Прыгавораны да расстрэлу 24.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ТКАЧОНАК Пётр Дзям'янавіч, н. у 1888 у в. Кавалевічы Валосавіцкага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 5.02.1930. Прыгавораны да расстрэлу 24.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ТКАЧОНАК Рыгор Дзям'янавіч, н. у 1895 у в. Кавалевічы Валосавіцкага с/с, аднаасобнік. Высланы ў Паўночны край 24.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ТКАЧОНАК Сцяпан Дзям'янавіч, н. у 1874 у в. Кавалевічы Валосавіцкага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 05.02.1930. Асуджаны на 5 гадоў 24.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ТРОН Ігнат Ягоравіч, н. у 1889 у в. Бароўна, старшыня калгаса. Асуджаны на 3 гады 08.05.1933. Рэабілітаваны ў 1956.

ТРОН Фёдар Васільевіч, н. у 1883 у в. Бароўна, калгаснік. Асуджаны на 5 гадоў 08.05.1933. Высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1958.

ТРУС Феліцыя Карлаўна, н. у 1895 у в. Дубраўка. Арыштавана 10.08.1949. Асуджана на 10 гадоў. Рэабілітавана ў 1991.

ТУХТА Аляксандра Іванаўна, н. у 1901 у в. Глыбочыца Лепельскага с/с. Арыштавана 12.10.1930. Выслана ў Казахстан на 3 гады 25.11.1930. Рэабілітавана ў 1991.

ТУХТА Пётр Фёдаравіч, н. у 1897 у в. Стаі. Асуджаны на 5 гадоў 27.02.1941. Рэабілітаваны ў 1967.

УДАЛОЙ Кандрат Яфімавіч, н. у 1888 у в. Забор'е Пышнянскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 13.02.1930. Высланы ў Паўночны край 09.03.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

УНУКОВІЧ Іван Аляксандравіч, н. у 1887, аднаасобнік. Жыхар в. Лукашонкі Горскага с/с. Арыштаваны 04.12.1932. Асуджаны на 10 гадоў 30.12.1932. Рэабілітаваны ў 1989.

УРБАН Іван Сямёнавіч, н. у 1874 у в. Пруднікі Пышнянскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 13.01.1930. Высланы ў Паўночны край на 3 гады 13.01.1930. Рэабілітаваны ў 1991.

УРБАН Аніcся Аляксееўна, н. у 1898 у г. Лепель. Арыштавана 17.12.1937. Расстраляна 30.12.1937. Рэабілітавана ў 1989.

УРБАН Лаўрэн Емяльянавіч, н. у 1850 у в. Прудок Пышнянскага с/с. Арыштаваны 02.02.1930. Высланы ў Паўночны край 24.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

УРБАН Лаўрэнцій Сцяпанавіч, н. у 1897 на хутары Барсукі Слабадскога с/с, калгаснік. Арыштаваны 19.09.1937. Расстраляны 11.12.1937. Рэабілітаваны ў 1968.

УРБАН Марк Цімафеевіч, н. у 1893 у в. Закаліўе Пышнянскага с/с. Арыштаваны 07.01.1938. Расстраляны 25.03.1938. Рэабілітаваны ў 1964.

УРБАН Мікіта Аляксеевіч, н. у 1897 у в. Пруднікі, старшыня калгаса. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 20.12.1937. Рэабілітаваны ў 1989.

УРБАН Фёдар Антонавіч, н. у 1895 у в. Студзёнка Пышнянскага с/с. Арыштаваны 05.01.1937. Асуджаны на 5 гадоў 21.08.1937. Рэабілітаваны ў 1989.

І. І. Урублеўскі

УРБАН Фядос Іванавіч, н. у 1897 у в. Пруднікі Пышнянскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 13.01.1930. Высланы ў Паўночны край на 3 гады 13.01.1930. Рэабілітаваны ў 1991.

УРБАНОВІЧ Вячаслаў Казіміравіч, н. у 1879 у в. Пункі Баброўскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 01.02.1930. Асуджаны на 10 гадоў. Рэабілітаваны ў 1989.

УРБАНОВІЧ Іван Казіміравіч, н. у 1879 у в. Пункі Баброўскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 01.02.1930. Высланы на 10 гадоў 23.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

УРБАНОВІЧ Іван Францавіч, н. у 1873 у в. Пункі Баброўскага с/с. Арыштаваны 05.08.1930. Асуджаны на 5 гадоў 24.02.1930. Рэабілітаваны ў 1993.

УРУБЛЕЎСКІ Іван Іосіфавіч. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1958.

Пасведчанне аб смерці рэпрэсіраванага І. І. Урублеўскага

Гражданин ВРУБЛЕВСКИЙ Иван Иосифович умер 01.09.1938 г. (первого сентября тысяча девятьсот тридцать восьмого года) в возрасте 43 лет, о чем в книге регистрации актов о смерти 1989 года февраля месяца 28 числа произведена запись за № 17 [13-1]. Причина смерти: расстрелян. Место смерти: город Минск республика БССР.

Место регистрации: отдел ЗАГС Крупского района Минской обл.
Дата выдачи: 30 мая 1989 г.

М.П.

Заведующий отделом (бюро)
записи актов гражданского состояния

Ш-ВН № 258290

Даведка аб рэабілітацыі рэпрэсіраванага І. І. Урублеўскага

ВОЕННЫЙ ТРИБУНАЛ
БЕЛОРУССКОГО
ВОЕННОГО ОКРУГА

12 февраля 1958 г.
№ 208

Дело по обвинению ВРУБЛЕВСКОГО Ивана Иосифовича /Осиповича/, до ареста — 1937 года — работал приемщиком лесоматериалов Лепельского леспромхоза, Витебской обл., пересмотрено Военным трибуналом Белорусского военного округа 11 февраля 1958 г. Постановление от 10 января 1938 г. в отношении Врублевского Ивана Иосифовича /Осиповича/ отменено и дело за отсутствием состава преступления прекращено.
Врублевский Иван Иосифович /Осипович/ реабилитирован посмертно.

Зам. Председателя Военного Трибунала
Белорусского военного округа
полковник юстиции /В. КОНДРАТЬЕВ/

ФЕДАРЭНЧЫК Канстанцін Васільевіч, н. у 1910 у в. Скобраўка, дырэктар НСШ. Асуджаны 15.11.1937. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ФІЛІП Адольф Готлібавіч, н. у 1886. Жыхар г. Полацка. Ксёндз. Арыштаваны 10.01.1927. Асуджаны на 10 гадоў 20.06.1927. Рэабілітаваны ў 1991.

ФІЛІПУК Іван Нікіфаравіч, н. у 1902. Начальнік чыгуначнай ст. Лепель, Арыштаваны 04.01.1931. Вызвалены з-пад арышту 02.10.1931. Рэабілітаваны ў 1989.

ФРАЛОЎ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1898 у в. Окана, калгаснік. Арыштаваны 24.08.1949. Вызвалены 03.09.1949.

ХАРКЕВІЧ Аляксей Іванавіч, н. у 1901, жыхар хутара Казімірава Баброўскага с/с, аднаасобнік. Асуджаны на 5 гадоў 03.03.1930. Рэабілітаваны ў 1963.

ХАРКЕВІЧ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1893. Жыхар хутара Казімірава Баброўскага с/с, аднаасобнік Высланы ў Паўночны край 03.03.1930. Рэабілітаваны ў 1963.

ХАРКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1889, жыхар хутара Казімірава Баброўскага с/с, аднаасобнік. Асуджаны на 5 гадоў 03.03.1930. Рэабілітаваны ў 1963.

ХАРКЕВІЧ Трафім Іванавіч, н. у 1899, жыхар в. Казімірава Баброўскага с/с, аднаасобнік. Асуджаны на 5 гадоў 03.03.1930. Рэабілітаваны ў 1963.

ХАЦКЕВІЧ Іван Дарафеевіч, н. у 1903 у в. Гарадок Слабадскога с/с, калгаснік. Арыштаваны 28.12.1932. Асуджаны на 5 гадоў 03.02.1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ХАЦКЕВІЧ Зінаіда Прохараўна, н. у 1900 у в. Забаенне Лепельскага р-на, аднаасобніца. Арыштавана 25.12.1937. Расстраляна 30.12.1937. Рэабілітавана ў 1989.

ХАЦКЕВІЧ Нікан Іванавіч, н. у 1883 у в. Гарадок Слабадскога с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 24.11.1932. Асуджаны на 10 гадоў 07.03.1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ХВАТЫНЕЦ Лідзія Данілаўна, н. у 1922 у в. Старое Лядна. Асуджана на 10 гадоў 16.02.1945. Рэабілітавана ў 1977.

ХМЫЗОЎСКІ Браніслаў Карлавіч, н. у 1880 на хутары Сябры Валосавіцкага с/с. Высланы ў Паўночны край 08.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ХРОЛ Пётр Міхайлавіч, н. у 1877 у в. Далікі Слабадскога с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 24.11.1932. Высланы ў Паўночны край на 3 гады 30.01.1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ХРЫСТАФОРАЎ Іларыён Хрыстафоравіч. Жыхар г. Лепель, святар. Арыштаваны 25.02.1937. Прыгавораны да расстрэлу 25.10.1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ХРЫШЧАНКА Герасім Іванавіч, н. у 1896 у в. Слабодка Лепельскага р-на, аднаасобнік. Арыштаваны 31.10.1937. Прыгавораны да расстрэлу 13.11.1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦВЯЦІНСКІ Цімафей Лук'янавіч, н. у 1871. Жыхар в. Ворань Заазерскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 01.02.1930. Высланы ў Паўночны край 08.03.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЕЛІЦА Іосіф Францавіч, н. у 1886 у в. Быкаўка Лепельскага павета, калгаснік. Арыштаваны 24.09.1932. Асуджаны на 3 гады 20.11.1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЕЛІЦА Франц Казіміравіч. Жыхар в. Кветча Домжарыцкага с/с. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1959.

ЦЕЦЕРУКОЎ Васіль Кузьміч, н. у 1904. Жыхар в. Бароўка Бабруйскага с/с. Асуджаны на 3 гады 20.05.1936. Рэабілітаваны ў 1996.

ЦІХОЦКІ Канстанцін Антонавіч, н. у 1888, паляк. Расстраляны 05.01.1938. Рэабілітаваны ў 1958.

ЦЫКМАН Казімір Іосіфавіч, н. у 1904. Жыхар г. Лепель. Арыштаваны 06.11.1937. Расстраляны 19.12.1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАРНЯЎСКІ Іосіф Станіслававіч, н. у 1870 у в. Караевічы Горскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 04.02.1930. Прыгавораны да расстрэлу 03.03.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАХОВІЧ Антаніна Міхайлаўна, н. у 1913 у в. Баравыя Пышнянскага с/с. Выслана ў Паўночны край у 1929. Рэабілітавана ў 1989.

ЧАХОВІЧ Вацлава Вацлаваўна, н. у 1896. Жыхарка г. Лепель, зубны урач. Выслана ў Сібір на 3 гады 10.11.1929. Рэабілітавана ў 1993.

ЧАХОВІЧ Іван Міхайлавіч, н. у 1909 на хутары Баравыя Пышнянскага с/с, аднаасобнік. Расстраляны 11.06.1929. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАХОВІЧ Марыя Антонаўна, н. у 1887. Жыхарка в. Баравыя Пышнянскага с/с, аднаасобніца. Выслана ў Паўночны край ў 1929. Рэабілітавана ў 1989.

ЧАХОВІЧ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1889 у в. Тадуліна Валосавіцкага с/с, аднаасобнік. Высланы ў Сібір на 3 гады 01.11.1929. Рэабілітаваны ў 1993.

ЧАХОВІЧ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1884 на хутары Тадуліна Валосавіцкага с/с, медык. Асуджаны на 3 гады 10.11.1929. Рэабілітаваны ў 1993.

ЧАХОВІЧ Міхаліна Міхайлаўна, н. у 1912 на хутары Баравыя Пышнянскага с/с, аднаасобніца. Выслана ў Паўночны край ў 1929. Рэабілітавана ў 1989.

ЧАХОВІЧ Юзэфа Міхайлаўна, н. у 1912 у в. Баравыя Пышнянскага с/с. Выслана ў Паўночны край ў 1929. Рэабілітавана ў 1989.

ЧУХМАН Залман Лейбавіч, н. у 1899 у Лепелі, калгаснік. Прыгавораны да расстрэлу 30.06.1929. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧУХМАН Зэльда Шаломаўна, н. у 1901 у Лепелі, калгасніца. Выслана ў Паўночны край у 1929. Рэабілітавана ў 1989.

ШАДЗЬКО Антон Іосіфавіч, н. у 1903 у в. Чаросава Каменскага с/с. Арыштаваны 13.09.1930. Высланы на 3 гады 14.10.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАДЗЬКО Іван Цімафеевіч, н. у 1869 у в. Чаросава Каменскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 11.02.1930. Прыгавораны да расстрэлу 14.03.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАДЗЬКО Іосіф Антонавіч, н. у 1882 у в. Мікалаёва Полацкага р-на, аднаасобнік. Арыштаваны 06.02.1930. Высланы ў Паўночны край 14.03.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАДЗЬКО Іосіф Яфімавіч, н. у 1863. Жыхар в. Чаросава Каменскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 13.11.1929. Высланы ў Паўночны край 03.01.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАДЗЬКО Франц Яфімавіч, н. у 1887. Жыхар в. Чаросава Каменскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 06.02.1930. Высланы ў Паўночны край 14.03.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАДКО Віктар Купрыянавіч, н. у 1938. Жыхар г. Лепель. Высланы на 3 гады 20.10.1945. Рэабілітаваны ў 1991.

ШАДКО Пётр Купрыянавіч, н. у 1944. Жыхар г. Лепель. Высланы на 3 гады 20.10.1945. Рэабілітаваны ў 1991.

ШАДКО Уладзімір Купрыянавіч, н. у 1939. Жыхар г. Лепель. Высланы на 3 гады 20.10.1945. Рэабілітаваны ў 1991.

ШАДКО Уладзіслава Францаўна, н. у 1918. Жыхарка г. Лепеля, рабочая леспрамгаса. Выслана на 3 гады 20.10.1945. Рэабілітавана ў 1991.

ШАЙТАР Баляслаў Іванавіч, н. у 1901 у в. Сяргееўшчына Лепельскага с/с. Арыштаваны 07.02.1930. Высланы ў Паўночны край 24.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЙТАР Баляслаў Іванавіч, н. у 1901 у в. Сяргееўшчына Лепельскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 09.12.1930. Асуджаны на 5 гадоў 26.01.1931. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЙТАР Іван Іванавіч, н. у 1897 у в. Сяргееўшчына. Арыштаваны 08.02.1930. Высланы ў Паўночны край 24.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЙТАР Франц Дамінікавіч, н. у 1901 у в. Сяргееўшчына Лепельскага с/с. Арыштаваны 07.02.1930. Высланы ў Паўночны край 24.02.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЛАК Аляксандр Барысавіч, н. у 1908 у в. Зорніца Горскага с/с. Прыгавораны да высылкі ў Паўночны край на 3 гады 15.04.1933. 21.08.1940 асуджаны на 8 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1991.

ШАЛАК Кузьма Барысавіч, н. у в. Зорніца Горскага с/с. Высланы ў Паўночны край на 3 гады 15.04.1933. Асуджаны на 8 гадоў 21.08.1940. Рэабілітаваны ў 1991.

ШАРАГОВІЧ Алена Сямёнаўна, н. у 1903 у г. Лепель, хатняя гаспадыня. Асуджана 28.09.1938. Расстраляна 29.09.1938. Рэабілітавана ў 1989.

ШАРКО Лука Карнеевіч, н. у 1877, жыхар в. Траўнікі Стайскага с/с. Арыштаваны 06.08.1937. Расстраляны 01.10.1937. Рэабілітаваны ў 1958.

ШАРКО Мікалай Карнеевіч, н. у 1888. Жыхар в. Траўнікі Стайскага с/с. Арыштаваны 06.08.1937. Расстраляны 01.10.1937. Рэабілітаваны ў 1958.

ШАРСТУК Кузьма Спірыдонавіч, н. у 1895 у в. Дуброўна, ляснік. Асуджаны 11.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАТЫБАЛКА Браніслаў Касперавіч, н. у 1897 у ф. Гарадзінец Горскага с/с, настаўнік. Арыштаваны 17.03.1933. Высланы ў Казахстан 09.05.1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ШКАКУН Іван Сямёнавіч, н. у 1870 у в. Суша Лепельскага р-на, калгаснік. Арыштаваны 03.02.1938. Расстраляны 11.03.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ШКІРАНДА Матрона Авяр'янаўна, н. у 1872. Жыхарка в. Слабодка Лепельскага р-на. Арыштавана 29.04.1937. Расстраляна 20.10.1937. Рэабілітавана ў 1963.

ШКУРЭНКА Уладзімір Анісімавіч, н. у 1901 у в. Залессе Лепельскага р-на, аднаасобнік. Арыштаваны 06.01.1938. Прыгавораны да расстрэлу 08.01.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЛЯХТО Апалінарый Іосіфавіч, н. у 1906 у г. Лепель. Арыштаваны 27.08.1937. Высланы на 10 гадоў 29.10.1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ШОСТАК Марыя Максімаўна, н. у 1898 у г. Лепель. Выслана ў Краснаярскі край на 5 гадоў 16.12.1950. Рэабілітавана ў 1991.

ШОСТАК Рыма Фёдараўна, н. у 1927 у г. Лепель. 16.12.1950 выслана ў Краснаярскі край на 5 гадоў. Рэабілітавана ў 1991.

ШОСТАК Фёдар Георгіевіч, н. у 1901 у г. Лепель. Арыштаваны 27.06.1927. Высланы на 3 гады 02.09.1927. Рэабілітаваны ў 1991.

ШПАК Рыгор Якаўлевіч. Жыхар г. Лепель, святар. Арыштаваны 22.10.1933. Высланы на 5 гадоў 25.02.1934. Рэабілітаваны ў 1989.

ШТЭЙНБАК Мендэль Сямёнавіч , н. у 1909 у г. Лепель. Арыштаваны 25.12.1934. Асуджаны на 3 гады 22.06.1935. Рэабілітаваны ў 1989.

ШТЭЙНГАРДТ Леў Шлёмавіч, н. у 1894 у г. Лепель, возчык. Асуджаны 20.09.1938. Расстраляны 29.09.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУЙСКАЯ Зінаіда Пятроўна, н. у 1896 у г. Лепель. Арыштавана 22.09.1929. Выслана на 3 гады 20.11.1929. Рэабілітавана ў 1991.

ШУШКЕВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1883 у в. Верабкі (Вяробкі), калгаснік. Асуджаны 25.09.1938. Расстраляны 07.10.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУШКЕВІЧ Сімклета Васільеўна, н. у 1894 у в. Забаенне. Арыштавана 14.04.1938. Вызвалена 17.05.1938.

ШЫДЛОЎСКАЯ Акуліна Іосіфаўна, н. у 1883 у в. Слабодка, краўчыха. Арыштавана 21.02.1937. Выслана на 10 гадоў 25.10.1937. Рэабілітавана ў 1985.

ШЫДЛОЎСКІ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1874 у в. Вялікія Пышнагоры Пышнянскага с/с, калгаснік. Арыштаваны 18.07.1937. Асуджаны на 10 гадоў 28.12.1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЫДЛОЎСКІ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1880 у в. Вялікія Пышнагоры Пышнянскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 02.12.1932. Асуджаны на 3 гады 24.12.1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЫМАНОЎСКІ Пётр Валяр'янавіч, н. у 1883 у в. Пепелева Ушацкага р-на, качагар. Асуджаны 11.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЫНКЕВІЧ Вікенцій Марцінавіч, н. у 1880. Жыхар в. Чаросава Каменскага с/с. Арыштаваны 21.11.1929. Высланы ў Паўночны край на 3 гады 13.01.1930. Рэабілітаваны ў 1991.

ШЫШПАР Фёдар Іванавіч, н. у 1901 у в. Колткі, чыгуначнік. Вызвалены 24.06.1941.

ЭБЕРЛЕЙН Дар'я Гаўрылаўна, н. у 1872 у в. Казялькі Лепельскага с/с, аднаасобніца. Выслана ў Сібір на 3 гады 10.11.1929. Рэабілітавана ў 1993.

ЭЛЬКІНД Арон Мендзелевіч, н. у 1894. Жыхар г. Лепель. Асуджаны 06.12.1937. Расстраляны 19.12.1937. Рэабілітаваны ў 1990.

ЮРЧАНКА Антаніна Лаўрэнцьеўна, н. у 1936 у в. Халімонава. Выслана ў Краснаярскі край на 5 гадоў 25.01.1947. Рэабілітавана ў 1991.

ЮРЧАНКА Зінаіда Лаўрэнцьеўна, н. у 1935 у в. Халімонава. Выслана ў Краснаярскі край на 5 гадоў 25.01.1947. Рэабілітавана ў 1991.

ЮРЧАНКА Лідзія Федасееўна, н. у 1914 у в. Навасёлкі. Выслана ў Краснаярскі край на 5 гадоў 25.01.1947. Рэабілітавана ў 1991.

ЮРЧАНКА Нэля Лаўрэнцьеўна, н. у 1932 у в. Халімонава. Выслана ў Краснаярскі край на 5 гадоў 23.01.1947. Рэабілітавана ў 1991.

ЮРЧАНКА Тамара Лаўрэнцьеўна, н. у 1940 у в. Халімонава. Выслана ў Краснаярскі край на 5 гадоў 25.01.1947. Рэабілітавана ў 1991.

ЮСТМАН Беньямін Азікавіч, н. у 1897. Жыхар г. Лепель, бухгалтар. Арыштаваны 10.03.1940. Высланы на 8 гадоў 20.06.1940. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮХНЕВІЧ Каспар Сцяпанавіч, н. у 1880, калгаснік. Асуджаны 11.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮШКЕВІЧ Севасцей Антонавіч, н. у 1882. Жыхар в. Заполле, аднаасобнік. Арыштаваны 01.03.1938. Прыгавораны да расстрэлу 10.03.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯКАЎЛЕЎ Філімон Нікандравіч, н. у 1882 у г. Лепель. Арыштаваны 03.06.1937. Прыгавораны да расстрэлу 25.10.1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯКУБАЎ Аляксей Кандратавіч, н. у 1901, будаўнік. Асуджаны на 15 гадоў 22.11.1937. Рэабілітаваны ў 1939.

ЯКУБЁНАК Іван Максімавіч, н. у 1896 у в. Стаі Лепельскага р-на, аднаасобнік. Арыштаваны 26.09.1932. Асуджаны на 5 гадоў 30.12.1932. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯЛУГА Пётр Станіслававіч, н. у 1867 у в. Макараўшчына Каменскага с/с, аднаасобнік. Арыштаваны 27.01.1930. Высланы ў Паўночны край 09.03.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯРАШЭВІЧ Антон Казіміравіч, н. у 1883 у в. Красналучка Валосавіцкага с/с. Арыштаваны 04.11.1929. Асуджаны на 5 гадоў 16.06.1930. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯРАШЭВІЧ Браніслаў Карлавіч, н. у 1888 у в. Домжарыцы Лепельскага р-на, калгаснік. Арыштаваны 03.01.1933. Асуджаны на 3 гады 19.04.1933. Рэабілітаваны ў 1964.

ЯРШОЎ Цімафей Сяргеевіч, н. у в. Зямцы, брыгадзір калгаса. Арыштаваны і рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1958.

ЯРЫГА Вікенцій Антонавіч, н. у 1903. Жыхар в. Курмялёўка Каменскага с/с. Прыгавораны да расстрэлу 22.10.1937. Памёр у г. Орша. Рэабілітаваны ў 1959.

ЯРЫГА Павел Антонавіч, н. у 1885. Жыхар в. Курмялёўка Каменскага с/с, калгаснік. Рэпрэсіраваны 03.11.1938. Памёр 18.11.1938. Рэабілітаваны ў 1960.

ЯЦЫНА Станіслаў Антонавіч, н. у 1896. Жыхар г. Лепель. Асуджаны 15.10.1938. Расстраляны 29.11.1938. Рэабілітаваны 11.09.1989.

1941

1945

ШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Так пачыналася вайна

22.06.1941 г. у 4 гадзіны раніцы нямецкія войскі адкрылі масіраваны артылерыйскі агонь па пагранічных заставах, вайсковых штабах, вузлах сувязі ў раёнах размяшчэння часцей Чырвонай Арміі. Адначасова нямецкія самалёты ўварваліся ў паветраную прастору СССР на 250—300 кіламетраў і пачалі варварскія бамбардзіроўкі гарадоў. Так пачалася Вялікая Айчынная вайна. З першага дня вайны Беларусь стала арэнай найвялікшых бітваў. На Беларусь наступала самая магутная групоўка нямецка-фашысцкіх войскаў, якая наносіла галоўны стратэгічны ўдар на Маскву, — група армій «Цэнтр», усяго 50 дывізій. Яе падтрымліваў 2-і паветраны флот. Праз тыдзень сілы ворага павялічыліся да 60 дывізій.

Першымі націск ворага прынялі пагранічнікі і перадавыя падраздзяленні войскаў прыкрыцця. Ніводная з 485 пагранічных застаў не здалася ворагу і не пакінула свой участак без загаду. Але сілы былі няроўныя, і Чырвоная Армія адступала.

Вайна прыйшла ў Лепель нечакана. Амаль 20 год Лепель быў прыгранічным горадам, і таму ўезд быў па пропусках. У 1939 годзе мяжу перанеслі на захад. Жыхары горада добра памяталі пагранічнікаў.

22 чэрвеня 1941 г. быў ціхі летні дзень, працавалі магазіны, пошта, нават ЗАГС. Заканчваліся заняткі ў школах, пачыналіся канікулы ў студэнтаў педтэхнікума і школы медсясцёр. Праўда, рады студэнтаў педтэхнікума часткова парадзелі ў 1940—1941 гг., калі ў Лепельскім раёне было створана 2 вайсковых вучылішчы і частка студэнтаў перайшла вучыцца туды. У студзені — лютым 1940 г. праводзілася фарміраванне Лепельскага пяхотнага вучылішча ў п. Бароўка (начальнік — палкоўнік М. І. Зайцаў, ваенны камісар — Я. М. Мельнікаў). На станцыі «116-ы км» у чэрвені 1940 г. было адкрыта Лепельскае артылерыйска-мінамётнае вучылішча (начальнік — генерал-маёр Б. Р. Церпілоўскі).

Першы сакратар Лепельскага РК КП(б)Б У. Е. Лабанок успамінаў, што раніцай 22 чэрвеня 1941 г. яго разбудзіў тэлефонны званок. Сакратар Віцебскага абкама партыі І. А. Стулаў паведаміў, што пачалася вайна. Было прынята рашэнне спешна правесці пасяджэнне райкама партыі і партыйныя сходы. Вельмі важна было правесці шырокую тлумачальную работу сярод насельніцтва. У сувязі з пачаткам мабілізацыі другому сакратару РК КП(б)Б Перагуду было даручана асабіста аказваць ваенкамату неабходную дапамогу.

Жыхары невялікага горада Лепеля ў 12 гадзін слухалі па радыё выступленне В. М. Молатава. Менавіта тады яны даведаліся, што пачалася вайна.

Заслужаная настаўніца БССР А. П. Чэкліна ўспамінала: «У першы момант людзі анямелі. А потым на некалькі гадоў пасяліліся трывога і надзея на перамогу Чырвонай Арміі».

На гарадской плошчы ў 17 гадзін адбыўся агульнагарадскі мітынг. Выступаючыя з вялікім абурэннем кляймілі гітлераўскіх захопнікаў. Тады ж мітынг адбыўся ў п. Бароўка, куды ў чэрвені 1941 г. было пераведзена Лепельскае мінамётнае вучылішча. Яшчэ раней, 10 мая 1941 г., Лепельскае пяхотнае вучылішча з Бароўкі перавялі ў г. Чарапавец. На мітынгу выступалі кіраўніцтва Лепельскага мінамётнага вучылішча, вайсковых часцей, прадстаўнікі грамадзянскага насельніцтва.

У першыя дні вайны над Лепелем з'явіліся нямецкія самалёты. Яны бамбілі горад. Мясцовыя жыхары памятаюць, як бамбілі невялікі палявы аэрадром у 7 кіламетрах на паўднёвым захадзе Лепеля, у раёне вёскі Дражна. Абслугоўваў гэты аэрадром 262-і батальён аэрадромнага абслугоўвання. Між тым становішча на франтах ускладнялася. Тэрыторыя Беларусі ўсё далей станавілася арэнай бязлітасных баёў. Пад іх грукат па дарогах на ўсход напраўлялася тэхніка, харчаванне. Калгаснікі раёна пагналі на ўсход жывёлу.

Ад'язджалі і адыходзілі цэлымі сем'ямі жыхары раёна на ўсход, вывозілі маёмасць прадпрыемствы. Было прынята рашэнне эвакуіраваць трактары Лепельскай МТС, гнаць іх на ўсход. Даехалі толькі да Талачына, далей фашысты перарэзалі дарогу. Тады трактарысты знялі асноўныя дэталі з трактароў і схавалі іх. Бухгалтар Лепельскага банка Г. М. Аўгусціновіч пагрузіў на фурманку ўсе каштоўнасці банка і павёз за лінію фронту. Шмат ён пражыў, пакуль у Туле здаў свой груз.

На жаль, усіх эвакуіраваць не паспелі. Засталіся на акупіраванай тэрыторыі выхаванцы Весялоўскага дзіцячага дома. Ужо ў першыя дні вайны праз Лепель і навакольныя вёскі ішлі бежанцы. Напалоханыя, стомленыя, галодныя.

Чырвоная Армія ўпарта супраціўлялася, але сілы былі няроўныя. Ужо да 26 чэрвеня ўсе тры арміі Заходняга фронту апынуліся ў катле паміж Беластокам і Мінскам. Іх разрозненыя падраздзяленні вялі цяжкія баі, каб прарваць акружэнне. Абарончыя баі пад Мінскам працягваліся 4 дні. 28 чэрвеня 1941 г. немцы захапілі Мінск. Жорсткія баі разгарнуліся каля Барысава. Фронт імкліва набліжаўся да Лепеля.

У першыя дні вайны ў Лепелі пабываў сакратар ЦК КП(б)Б У. Р. Ванееў і дапамог кіраўнікам раёна ў выпрацоўцы канкрэтнага плана дзеянняў па арганізацыі барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У гэты час па рашэнні Віцебскага абкама КП(б)Б сталі стварацца знішчальныя атрады для барацьбы з нямецкімі парашутыстамі і дыверсантамі. У Лепелі быў створаны батальён самаабароны з моладзі. Камандаваў ім лейтэнант запасу В. Вінаградскі. Гэты батальён ахоўваў важныя аб'екты і адышоў разам з часцямі Чырвонай Арміі. 2 ліпеня 1941 г. раніцай нямецкі самалёт па наводцы скінуў бомбы на ваенкамат, які знаходзіўся тады па вуліцы К. Маркса, дзе сабралі для адпраўкі на фронт чалавек сорак. Амаль усе загінулі.

З пачаткам вайны пачалася эвакуацыя зброі з ваенных складоў у п. Бароўка і «116-ы км». Эвакуацыю зброі ў ліку другіх павінны былі забяспечыць курсанты мінамётнага вучылішча. Згодна загаду камандуючага Заходнім фронтам ад 28.06.1941 г., з мэтай зрыву наступлення нямецкай 3-яй танкавай групы на Лепельскім напрамку і фарсіравання з ходу Дняпра ў раёне Лепеля ствараўся абарончы ру-

беж. Абарона ўскладалася на Лепельскую групу войскаў у складзе мясцовага гарнізона, Лепельскага мінамётнага вучылішча, Віленскага пяхотнага вучылішча (якое адступіла да Лепеля), 103-га асобнага супрацьтанкавага дывізіёна, 58-га асобнага сапёрнага батальёна маёра Кісялёва, які падрыхтаваў да падрыву ўсе масты, паставіў міны на дарогах. Калі ўзнікла пагроза захопу мастоў ворагам, воіны 169-га сапёрнага батальёна маёра Л. Н. Афанасьева па загаду начальніка Лепельскага гарнізона генерал-маёра Церпілоўскага ў ноч на 3 ліпеня ўзарвалі ўсе масты. Прыкрываў войскі, якія абаранялі Лепель, 161-ы знішчальны полк. Удзельнічаў у баях пад Лепелем 3-і дывізіён 360-га палка артылерыі рэзерву галоўнага камандавання, які дыслацыраваўся ў п. Бароўка.

3 ліпеня 1941 г. Лепель быў акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Саўінфармбюро ў зводцы за 4 ліпеня паведамляла аб вялікіх баях у раёне Лепеля.

У гэты час разгарнуліся жорсткія баі на Віцебскім напрамку ў раёне Сянно—Лепель. Гэтыя баі ўвайшлі ў гісторыю Лепеля як Лепельскі контрудар 6—10 ліпеня 1941 г. Перад войскамі Чырвонай Арміі была пастаўлена задача: разграміць групоўкі праціўніка, які наступаў у напрамку на Віцебск. Удзельнічалі войскі 20-ай арміі (генерал-лейтэнант П. А. Курачкін) Заходняга фронту ў складзе 5-га (генерал-маёр І. П. Аляксеенка) і 7-га (генерал-лейтэнант В. І. Вінаградаў) механізаваных карпусоў. Контрудар наносіўся з раёна Багушэўска на паўднёвым захадзе ад Віцебска ў напрамку на Сянно і Лепель па 3-яй танкавай групе нямецкіх войскаў. Злучэнні Чырвонай Арміі вызвалілі Сянно, прасунуліся на 30—40 кіламетраў, разгромілі 2 нямецкіх матарызаваных палкі, на Лепельскім напрамку знішчылі нямецкую матарызаваную дывізію. Пасля найбольш упартых баёў на поўнач ад Сянно (з двух бакоў удзельнічала каля 1,5 тыс. танкаў) механізаваныя карпусы вымушаны былі спыніць наступленне, і 10 ліпеня савецкія войскі адышлі ў раён Оршы.

3—4 ліпеня на вуліцах Лепеля чуліся рокат матораў і чужая мова. На будынках, стаўбах зазіхацелі загады, якія заканчваліся пагрозай: «За невыкананне — расстрэл». З'явілася нямецкая адміністрацыя. Як вядома, у гады вайны ва ўсходняй Беларусі не было нямецкай грамадзянскай адміністрацыі, тэрыторыя на ўсход ад лініі Полацк—Барысаў—р. Бярэзіна—воз. Краснае лічылася вобласцю аховы тылу групы армій «Цэнтр», і ўлада знаходзілася ў руках ваенных і паліцэйскіх органаў.

У Лепелі з'явілася паліцыя (начальнік Вайцяховіч). Бургамістрам Лепеля стаў былы выкладчык фізкультуры педтэхнікума Ю. Ц. Нядзелька. У вёсках прызначаліся старасты. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі раёна было адзначана рэпрэсіямі, расправамі над камуністамі, дэпутатамі і работнікамі Саветаў. З'явіліся першыя арыштаваныя і павешаныя ў гарадскім садзе «Дынама», цяпер на гэтым месцы знаходзіцца СШ № 3. У гэтыя дні былі расстраляны ваенком Лепеля Лунтэ, работнік райкама партыі Мохарт. Пазней расстраляюць дэпутата Вярхоўнага Савета БССР з в. Суша Я. Кішчанку. Адначасова з'явіліся лагеры для ваеннапалонных. Ваеннапалонных утрымлівалі ў голым полі, абцягнутым калючым дротам, у раёне аўтавакзала, сталовай Захарэнкі, сельгастэхнікі, шпіталя, былой бойні, ДЭУ, таксама ў вёсках Камень, Губіна, Бароўка. Вялікі канцлагер быў размешчаны каля чыгуначнай станцыі ў траншэях, частка якіх была заліта вадой. Умовы жу-

дасныя. Тут лютавала эпідэмія дызентэрыі. Асобных палонных, якія былі з гэтай мясцовасці, сваякі выкупілі, і іх адпусцілі дадому. Іншых пагналі далей. Вельмі многія загінулі па дарозе (памерлі, былі застрэлены). У вёсцы Гадзіўля захавалася магіла 30 ваеннапалонных, расстраляных у першыя месяцы вайны. Урач М. І. Бакштаеў дамогся дазволу гаспіталізаваць частку хворых у бальніцу. Калі вылечыліся, некаторыя з іх пайшлі ў партызаны. Архіўныя дакументы сведчаць, што пазней у Лепелі быў створаны канцлагер для грамадзянскага насельніцтва на 1 тыс. чалавек. Калі ўзнікла неабходнасць працаваць на пракладцы вузкакалейкі, немцы стварылі лагер для ваеннапалонных і грамадзянскіх асоб у лесе, у 15 км ад Лепеля ў м. Катловічы. Турма размяшчалася ў тым будынку, дзе цяпер магазін «Паляўнічага і рыбалова».

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Летам 1941 г. па загаду Гітлера пачалася распрацоўка плана «канчатковага вырашэння» яўрэйскага пытання. Дзесьці ў канцы ліпеня 1941 г. у Лепелі было створана гета. Лепель у 19 ст. уваходзіў у зону аседласці яўрэяў, таму іх шмат жыло ў горадзе перад вайной. Адразу пасля захопу Лепеля фашысты сабралі ўсіх яўрэяў і пад пагрозай забойства прымусілі намаляваць на сваіх дамах жоўтыя зоркі, патрабавалі насіць зялёную павязку на левай руцэ з надпісам «юдэ», а на адзенне нашыць жоўтыя шасціканцовыя зоркі. Потым усіх яўрэяў перасялілі ў гета, якое знаходзілася ў раёне вуліц Вакзальнай, Ленінскай і Канальнай. Дамы ў гета стаялі без акон і дзвярэй. У адзін дом зганялі 30—40 чалавек. Кожны дзень іх вадзілі строем на работу, дзе яны выконвалі розную брудную працу: пілілі дровы, чысцілі ўборныя, вазілі на сабе розныя грузы. 28 лютага 1942 г. раніцай немцы акружылі гета, пагрузілі яўрэяў на машыны і павезлі да в. Чарнаручча. Тут у 7 км ад Лепеля іх прымусілі распрануцца і расстралялі. Жанчын і дзяцей кідалі жывымі ў ямы. Каля 1 тыс. яўрэяў Лепельскага гета загінула ў гэты дзень. Менавіта ў гэтым месцы будуць расстрэльваць грамадзянскае насельніцтва, партызан. Жылі яўрэі да вайны і ў м. Камень. З прыходам немцаў іх прымусілі нашыць на адзенне жоўтыя зоркі. Усе працягвалі працаваць у калгасе. Гета ў Камені не было. 17 верасня 1941 г. немцы сагналі яўрэяў у адзін дом, дзе знаходзілася прадпрыемства па апрацоўцы воўны. Спачатку ва ўрочышча Баркі адвезлі на машыне мужчын, а потым жанчын і дзяцей. Мужчын прымусілі выкапаць ямы, а потым усе 177 чалавек, калгаснікаў, гандляроў, урача, расстралялі. Было шмат параненых, яшчэ жывых людзей, але яму засыпалі зямлёй.

Немцы гаспадарылі ў Лепелі. У Доме Саветаў адкрылі камендатуру (цяпер на гэтым месцы гастраном), у педтэхнікуме — гестапа, у будынку, які вядомы як былая гімназія, — нямецкую казарму. На месцы, дзе цяпер СШ №4, стаяла аптэка Орліса, пабудаваная яшчэ да рэвалюцыі. Яго жонку немцы расстралялі як яўрэйку.

Горад меў важнае стратэгічнае значэнне, бо быў размешчаны на магістралях, якія звязвалі яго з Мінскам, Віцебскам, Полацкам, Оршай, Барысавам. У Лепелі, Бароўцы размяшчаліся тылы 3-яй танкавай арміі немцаў. Горад быў добра ўмацаваны. Але трэба заўважыць, што на захопленай тэрыторыі акупанты адчувалі сябе няўтульна. З ліпеня 1941 г. па 28.06.1944 г. у

Лепелі і раёне дзейнічала антыфашысцкае падполле: Лепельскія падпольныя райкамы КП(б)Б (01.08.1941 — 29.06.1944) і ЛКСМБ (01.07.1942 — 29.06.1944). Падпольшчыкі друкавалі лістоўкі, адозвы, якія распаўсюджвалі сярод насельніцтва, дапамагалі вызваляць з канцлагера ваеннапалонных, зрывалі пастаўкі прадуктаў для нямецкай арміі, вялі антыфашысцкую прапаганду сярод «добраахвотнікаў» Камінскага, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, здзяйснялі дыверсіі і г. д.

Назаўсёды ў памяці лепяльчан застануцца імёны С. Р. Бараноўскага, А. А. Марунькі, Ф. Ф. Садкоўскай, К. А. Мельнікава, І. М. Шатыронка, У. А. Закрэўскага і інш.

Лепяльчане змагаліся з акупантамі ў партызанскіх атрадах. Першы партызанскі атрад № 68 узнік на тэрыторыі раёна вясной 1942 г., калі Лепельскі РК КП(б)Б вывеў у лес частку падпольшчыкаў і да іх далучылася група акружэнцаў на чале з Дз. Ц. Караленкам. 28 жніўня 1942 г. па рашэнні Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б на базе атрадаў № 68 і № 9 была сфарміравана партызанская брыгада «Дубава». Камандзірам стаў Ф. Ф. Дуброўскі, а камісарам У. Е. Лабанок. Праз год брыгаду «Дубава» раздзялілі на дзве: Лепельскую партызанскую брыгаду і брыгаду «Дубава». У нашым раёне дзейнічалі таксама партызанскія брыгады М. П. Гудкова, імя Чапаева, Чашніцкая «Дубава», Сенненская, Лёзненская, 1-ая Беларуская (2-га складу), 2-ая Ушацкая імя Панамарэнкі, Багушэўская (2-га складу), 2-ая імя Заслонава, 1-ая Антыфашысцкая, «Чэкіст», асобныя партызанскія атрады В. В. Шчарбіны — 1, 5, 10, 20-ы, выдавалася падпольная газета «Калгасная праўда».

Частка тэрыторыі Лепельскага раёна ўваходзіла ў Полацка-Лепельскую партызанскую зону. У кастрычніку 1943 г. у час Лепельскай аперацыі партызаны нанеслі ўдар па добра ўмацаваным нямецка-фашысцкім гарнізоне ў Лепелі. Вораг панёс значныя страты ў жывой сіле і тэхніцы.

У адказ на дзеянні партызан, падпольшчыкаў, за невыкананне нямецкіх загадаў фашысты кідалі ў турмы мірных жыхароў, расстрэльвалі іх, палілі дамы. За гады вайны ў раёне поўнасцю і часткова спалена 48 вёсак. У студзені 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі і закатавалі 159 жыхароў вёсак Слабодка, Пунішча, Крыўцы. Летам 1942 г. спалілі вёску Кісцялёва з жыхарамі. Згарэлі дзеці, жанчыны, старыя. 28 кастрычніка 1942 г. за тое, што жыхары в. Кветча не выканалі збожжавыя пастаўкі да 27 кастрычніка, наляцелі карнікі, адабралі ўсю маёмасць, вёску спалілі і расстралялі больш за 40 чалавек. У гады вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёскі Белая Куна, Калінец, Чырвоная Горка, Пескаваткі, якія больш не былі адноўлены.

Згодна з архіўнымі звесткамі, за гады вайны на Лепельшчыне знішчана звыш 4700 чалавек, у т. л. 1600 жанчын, 550 дзяцей, 903 чалавекі вывезены ў Германію на катаржныя работы.

Вайна пераблытала ўсе справы, думкі лепяльчан, пакалечыла тысячы жыццяў.

А. У. Стэльмах

Па старонках газеты «Віцебскі рабочы»

26 чэрвеня 1941 г.

ЛЕПЕЛЬ. (Па тэлефону). Ва ўсіх калгасах, на прадпрыемствах і ва ўстановах раёна адбыліся шматлюдныя мітынгі пратэсту супроць наглай правакацыі германскага фашызма.

На аб'яднаным мітынгу калгаснікаў сельгасарцелі «Чырвоны прамень», настаўнікаў і медработнікаў Пышнянскага сельсавета з прамовай выступіў дырэктар школы т. Марфенок.

— Нашай краіне, — заявіў ён, — наперакор міралюбівай палітыцы Савецкага ўрада германскі фашызм навязаў крывавую вайну. Але гэта вайна не застала нас знянацку. На ўдар падпальшчыкаў вайны мы адкажам ударам моцным, рашучым, такім, якога не вытрымаюць зазнаўшыяся ворагі. Увесь савецкі народ, поўны ўпэўненасці ў свае сілы, у адзін голас заяўляе: — Вораг будзе знішчан!

На мітынгу калгаснікаў сельгасарцелі «Чырвоны Кастрычнік», Вораньскага сельсавета, з гарачай, патрыятычнай прамовай выступіў т. Шараговіч.

— Агалцелы германскі фашызм, — заявіў ён, — напаў на нашу Радзіму. Мы клянёмся перад партыяй і ўрадам, што не пашкадуем сваіх сіл, а калі спатрэбіцца, то і жыцця, для абароны сваёй роднай краіны ад фашысцкіх варвараў. Мы мабілізуем усе свае сілы на тое, каб хутчэй і лепш выканаць сельскагаспадарчыя работы 1941 года, датэрмінова разлічыцца з дзяржавай па абавязковых пастаўках. Сваю Радзіму мы абаронім. Ніякаму ворагу не перамагчы савецкі народ!

Пры вялікай актыўнасці ўсіх удзельнікаў прайшоў мітынг работнікаў лесгаса. У сваёй рэзалюцыі яны запісалі: «Мы шлём сваё палкае прывітанне адважным воінам Чырвонай Арміі, сталінскім сокалам-лётчыкам, нашым слаўным чырвонафлотцам, якія з чэсцю выконваюць свяшчэнны доўг перад Радзімай, абараняюць чэсць і свабоду савецкага народа. Мы запэўніваем Цэнтральны камітэт камуністычнай партыі і савецкі ўрад, клянёмся перад вялікім Сталінам, што кожны з нас у любую мінуту гатоў узяць у рукі зброю і абараняць сваю Радзіму да апошняй кроплі крыві».

Л. Спірыдовіч

29 чэрвеня 1941 г.

Патрыятызм працоўных

ЛЕПЕЛЬ. (Па тэлефону). Кожны дзень у райваенкамат паступаюць заявы ад працоўных раёна з просьбай паслаць на фронт. Сярод людзей, жадаючых добраахвотна разам з Чырвонай Арміяй граміць подлага ворага, — мужчыны і жанчыны, старыкі і юнакі.

43-гадовы рабочы дрэваапрацоўчага завода № 4 т. Васільеў у сваёй заяве піша, што ён абараняў савецкую краіну ў час грамадзянскай вайны і лічыць сваім доўгам зараз таксама ўзяць у рукі вінтоўку.

Сваё жаданне грамадзянін Цімафееў выказаў у кароткай і лаканічнай заяве. «Прашу залічыць мяне добраахвотнікам у рады Чырвонай Арміі. Я жадаю ісці на барацьбу супроць германскага фашызма, са зброяй у руках абараняць сваю Радзіму».

У ваенкамат прыносяць свае заявы не толькі мужчыны, але і жанчыны, дзяўчаты. Вось што піша ў сваёй заяве хатняя гаспадыня Надзежда Васільеўна Алёшына: «Прашу накіраваць мяне на фронт для аказання першай дапамогі раненым байцам нашай доблеснай Чырвонай Арміі. Я хачу аддаць усе свае сілы для поўнага знішчэння ворага, які пасмеў нарушыць нашу граніцу».

Высокі патрыятычны дух адчуваецца і ў дружнай, арганізаванай рабоце, якая кіпіць на прадпрыемствах, у калгасах і МТС. Як ніколі ўмацавалася дысцыпліна працы ў калгасе «Звязда» Несенскага сельсавета. Зараз усе працаздольныя калгаснікі працуюць на полі. Звенні вядуць дружную работу на праполцы яравых культур, пад пасевы азімых вывозіцца гной.

Добра працуе ў гэтыя дні трактарная брыгада т. Раманенка 1-й Лепельскай МТС. Гадавы план трактарных работ брыгада выканала больш чым напалову. Трактарысты тт. Круклінскі і Буйніцкі пры норме ў 3,8 га ўзорваюць за змену 4—4,5 гектара.

2 ліпеня 1941 г.

Рыхтуюцца да ўборкі

ЛЕПЕЛЬ. На наглую вылазку германскага фашызма калгаснікі і калгасніцы раёна адказалі павелічэннем сваёй энергіі, дружнай стаханаўскай работай. У Валосаўскім сельсавеце ва многіх сельгасарцелях дружна ідзе праполка, вывозяцца ўгнаенні на палі, заканчваецца падрыхтоўка да ўборачнай.

Дружна і арганізавана ідзе работа на палях сельгасарцелі «XVII з'езд ВКП(б)». У калгасе шырока разгарнулася праполка пасеваў ільну, зернавых культур. Лепш за ўсіх працуе звяно Яніны Сакалоўскай, якая сама паказвае асабісты прыклад, выконваючы норму выпрацоўкі на 200 працэнтаў. Не адстаюць ад звеннявой калгасніцы Хрысціна Курта, Яніна Фрызель, Таццяна Бародзіч.

У калгасе поўнасцю закончан рамонт усяго ўборачнага інвентара і машын.

Добра рыхтуюцца да ўборкі і ў калгасе «Расцвет». Увесь інвентар, машыны, павозкі адрамантаваны поўнасцю і добраякасна. Многа клопатаў праяўляецца аб падрыхтоўцы складаў. Усе яны адрамантаваны, прыведзены ў парадак. Зараз ідзе будаўніцтва новага амбара. Працуючая тут брыгада плотнікаў абавязалася закончыць будаўніцтва да 11 ліпеня. Заканчваецца рамонт двух сіласных ям. У бліжэйшыя дні калгаснікі распачнуць сіласаванне кармоў.

Лепельскі абарончы рубеж

У пачатку вайны з мэтай зрыву наступлення 3-яй танкавай групы на Лепельскім напрамку і фарсіравання ёю з ходу Дняпра, згодна загаду камандуючага Заходнім фронтам ад 28.06.1941 года, у раёне Лепеля стварыўся абарончы рубеж. Абарона Лепеля ўскладалася на Лепельскую групу войск у складзе: мясцовага гарнізона, Лепельскага мінамётнага і Вільнюскага пяхотнага вучылішчаў, 103-га асобнага процітанкавага дывізіёна, 58-га асобнага сапёрнага батальёна, які ў раёне Лепеля падрыхтаваў да падрыву ўсе масты, паставіў міны на дарогах. На подступах да горада ішлі баі. У сувязі з пагрозай захопу мастоў праціўнікам воіны 169-га асобнага сапёрнага батальёна (камандзір батальёна маёр Л. Н. Афанасьеў), які дзейнічаў у якасці атрада загароджвання, па загаду начальніка Лепельскага гарнізона генерал-маёра Б. Р. Церпілоўскага ў ноч на 3 ліпеня 1941 года спалілі і ўзарвалі ўсе масты, калі на іх з'явіліся галаўныя танкі нямецкіх часцей 3-яй танкавай групы Гота, прыпынілі іх наступленне. Лепель быў акупіраваны 3 ліпеня 1941 года.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. Мн.: Энцыклапедыя, 1990. С. 299.

04.07.1941 г.

Ад Савецкага інфармбюро
(вячэрняе паведамленне)

На працягу ўсяго дня 4 ліпеня ішлі жорсткія баі на Дзвінскім, Барысаўскім, Бабруйскім і Тарнопальскім напрамках. На астатніх участках фронту нашы войскі, трывала ўтрымліваючы займаемыя пазіцыі, вядуць баі з праціўнікам, які пытаецца ўклініцца ў нашу тэрыторыю.

У баях на Дзвінскім напрамку праціўнік увёў моцнае танкавае злучэнне, услед за якім наступала мотапяхота...

Адначасова моцныя баі разгортваліся ў раёне Лепеля, дзе нашы войскі паспяхова адбівалі шматлікія атакі танкавых часцей праціўніка. У другой палове дня пасля моцнай авіяцыйнай падрыхтоўкі праціўніку ўдалося пацясніць нашы часці на некалькі кіламетраў на Усход.

З успамінаў Ф. П. Яско — ветэрана Вялікай Айчыннай вайны

Перад самай вайной у Лепелі быў сфарміраваны знішчальны батальён самаабароны з моладзі. Камандаваў ім лейтэнант запасу В. Вінаградскі. Батальён праводзіў тактычныя вучэнні, ахоўваў важныя грамадзянскія аб'екты.

2 ліпеня 1941 г., пахмурным ранкам, калі Лепель яшчэ спаў, на яго абрушыўся бомбавы ўдар. У налёце ўдзельнічалі 15 варожых самалётаў. Пры падлёце іх да горада з зямлі ўзвіліся сігнальныя ракеты. Гэта была справа рук дыверсантаў. І, зразумела, бомбы клаліся ў цэль. Галоўныя будынкі дзяржаўных устаноў былі зруйнаваны. У той дзень пачалася эвакуацыя насельніцтва.

Увечары абстаноўка ў горадзе яшчэ больш пагоршылася. Немцы падышлі зусім блізка, пачалі абстрэльваць горад з боку вёскі Стаі.

Нашаму батальёну самаабароны быў аддадзены загад адступіць разам з адыходзячымі часцямі Чырвонай Арміі. Байцы батальёна пакінулі горад апошнімі. Хачу нагадаць імёны некаторых камсамольцаў, якія ўваходзілі ў батальён. Гэта В. Крыцкі, Л. Грыгор'еў, М. Бельскі, К. Жарнасек.

Трэцяга ліпеня ў Лепель прыйшлі фашысты. Пачалася трохгадовая яго акупацыя.

Сцяг 84-га артылерыйскага палка

12 ліпеня 1944 г. у Лепельскі райкам партыі з'явіўся 77-гадовы Міснік Пётр Міхайлавіч з вёскі Косцінка са сваёю сястрой Міхно Еўдакіяй, што жыла ў вёсцы Забаенне. Яны паклалі на стол баявы сцяг, дакументы і пячаткі 84-га артылерыйскага палка. У гады вайны яны папераменна захоўвалі гэтыя рэчы, пераносілі іх з аднаго месца на другое. І збераглі за тры доўгія гады варожай акупацыі. Збераглі, рызыкуючы кожны дзень і кожны час сваім жыццём і жыццём сваіх родных.

Аб лёсе сцяга расказаў Міснік Раман Пятровіч: «20 чэрвеня 1941 г. па загаду штаба Прыбалтыйскай асобай ваеннай акругі наш полк паднялі па баявой трывозе і накіравалі ў пагранічны раён. Там занялі абарону. 22 чэрвеня 1941 г. у 6 гадзін раніцы ўступілі ў бой. Бомбы з неба... Узрывы гранат... Лавіна танкавых самаходак... Палкавыя гарматы расстралялі боекамплект і заціхлі — мы аказаліся адрэзанымі ад артсклада, без снарадаў, у поўным акружэнні.

Я, — працягвае ён, — па званню ў той час тэхнік-інтэндант 2-га рангу, быў загадчыкам сакрэтнай часці палка. Сцяг, асабовыя справы салдат і афіцэраў, палкавыя пячаткі — усё гэта знаходзілася ў маім распараджэнні... І вось загад камандзіра: гарматы знішчыць, асобнымі невялікімі групамі прабірацца да сваіх».

Да Лепельскага раёна прабіраліся амаль месяц. У ноч на 27 ліпеня Р. П. Міснік апынуўся ў вёсцы Забаенне, дзе жыла яго цётка Еўдакія Міхайлаўна Міхно. Тут ён пераапрануўся ў цывільную вопратку яе сына. Сцяг з дакументамі паклаў у кошык. Зверху насыпалі спелага жыта. На наступны дзень, калі сцямнела, разам з цёткай пайшоў у вёску Косцінкі да свайго бацькі. Разам выкапалі ў хляве глыбокую яму. Сцяг, пячаткі і дакументы паклалі ў вялікую бутэльку, у якой адбілі рыла. Тайнік добра замаскіравалі. «Зберажы, бацька, сцяг да майго прыходу. А прыйдзе Чырвоная Армія, перадай усё першаму камандзіру...» — былі яго словы на развітанне. Р. П. Міснік пайшоў на ўсход. 8 лістапада пад Тулай выйшаў да сваіх.

Праз 43 гады ў адной з залаў музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ён убачыў сцяг свайго палка. Яго перадалі ў Мінск з Лепельскага райкама партыі. Лепяльчане ганарацца адважным учынкам П. М. Місніка і Е. М. Міхно, якія былі ўзнагароджаны ўрадавымі ўзнагародамі.

А. У. Стэльмах

Як выратавалі лётчыка

Гэта было на пятнаццаты дзень вайны. Фашысты ўпарта прасоўваліся на ўсход. Савецкія воіны адступалі з баямі. Сведкамі аднаго з іх былі жыхары вёскі Стаі.

А было гэта так. Нечакана над вёскай праляцеў самалёт. Ляцеў ён на захад, у бок Мінска. Тады неба часта гудзела. І, магчы-

ма, на гэты раз ніхто б не звярнуў увагі на самалёт, калі б не адна акалічнасць. Неўзабаве над лесам, непадалёку ад вёскі, застракаталі кулямёты. Жыхары ўбачылі, як наш самалёт нагналі яшчэ тры. Яны былі незнаёмыя па свайму «апярэнню». «Фашысты напалі на нашых лётчыкаў», — пранеслася ў галовах вяскоўцаў. Яны з трывогай сачылі за няроўным паветраным боем.

Убачылі, як задыміўся і пайшоў па дыяганалі да зямлі нямецкі самалёт. Але задыміўся і наш, пачаў зніжацца. Неўзабаве ад нашага самалёта аддзяліўся светлы купал парашута: гэта выскачыў лётчык. Але да выратавання было яшчэ далёка. З хвіліны на хвіліну маглі з'явіцца фашысты і захапіць яго ў палон.

На дапамогу лётчыку прыйшлі вяскоўцы. Яны накармілі яго, пераапранулі ў цывільнае, паказалі дарогу на ўсход...

Аб гэтым напісаў у рэдакцыю былы ваенны лётчык М. Мажырын. Гэта ён 7 ліпеня ажыццяўляў разведвальны палёт на самалёце «СБ» над Лепелем. На яго напалі тры «мессеры».

«Памятаю маладую жанчыну Ксеню, у дом да якой зайшоў пасля прызямлення. Дзякуючы таму, што я пераапрануўся, мне лягчэй было выходзіць да сваіх. Вярнуўшыся ў часць, я працягваў ваяваць. Вельмі хочацца даведацца пра тых, хто дапамог мне ў цяжкую хвіліну», — пісаў Мажырын, які цяпер жыве ў Валгаградскай вобласці.

Праз газету рэдакцыя пазнаёміла жыхароў вёскі Стаі з гэтым пісьмом. Яны ўдакладнілі дэталі той падзеі. Жанчынай Ксеняй была Аксіння Трафімаўна Жарнасек, якая памерла ў 1969 г.

— Мне мама гаварыла, што прыйшоў лётчык, і яна яго накарміла. Тады ён папрасіў што-небудзь з вопраткі. Мама дала яму касцюм бацькі. Ён падзякаваў. І на гэтым яны развіталіся. Прайшло некалькі часу, і да іх дома пад'ехалі на матацыклах фашысты з сабакамі. Спыталі ў мамы, хто ў нас быў. Яна не сказала нічога пра лётчыка. І яны паехалі, — так расказала дачка Аксінні Трафімаўны Жарнасек З. Кулеш.

А. Аляксееў

Бессмяротны подзвіг

У Бранскім кніжным выдавецтве выйшаў зборнік «Бессмяротны подзвіг іх высокі». Гэта нарысы аб подзвігах Герояў Савецкага Саюза, ураджэнцах Тульскай вобласці. Адзін з хвалюючых расказаў аб актыўным удзельніку баёў на тэрыторыі Віцебшчыны, і ў прыватнасці, Лепельскага раёна, Мікалаі Міронавічу Чапурным.

У пачатку ліпеня 1941 г. матарызаваны корпус з групы гітлераўскага генерала Гота ўкліняўся ў парадкі нашых войскаў і пагражаў прарывам на Віцебска-Смаленскім напрамку. Камандаванне Заходняга фронту загадала войскам нанесці контрудар па ворагу з раёна Віцебска ў напрамку Лепеля.

Батальён М. М. Чапурнога дзейнічаў на самым цяжкім участку. Яму ўдалося фарсіраваць раку Чарнагосціца, углыбіцца ў абарону праціўніка на 3—4 кіламетры, знішчыць шмат жывой сілы і тэхнікі ворага. Але гітлераўцы падцягнулі свежыя часці. На працягу трох сутак батальён стрымліваў націск ворага. І толькі потым па загаду камандавання батальён з баямі адышоў ад займаемых пазіцый.

У раёне Віцебска фашыстам удалося акружыць часць, у складзе якой змагаўся батальён Чапурнога. Як выбрацца з акружэння? Капітан прапанаваў план прарыву варожага кальца. Разлік аказаўся верным. Гітлераўцы не вытрымалі і ў паніцы пабеглі.

Адважнаму камандзіру ўдалося неўзабаве вывесці сваіх людзей з акружэння. У баі ён быў некалькі разоў паранены, але знаходзіўся на самых небяспечных участках. За гэты подзвіг яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Баі працягваліся. У 1942 г. Мікалай Міронавіч Чапурны быў цяжка паранены. Доўга лячыўся. А калі пачаў хадзіць, папрасіўся зноў на фронт.

«Зразумейце мяне, — пераконваў ён урачоў. — Лепшыя лекі для мяне — гэта біць фашыстаў».

У канцы 1943 г. баявы камандзір дабіўся свайго. Пасля вайны працягваў служыць у радах Савецкай Арміі. У 1964 годзе М. М. Чапурнога не стала.

В. Даніленка

Лепельскі контрудар 1941 года

У сувязі са складанасцю абставін у пачатку ліпеня 1941 г. камандаванне Заходняга фронту зрабіла захады, накіраваныя на стварэнне ўстойлівай абароны на беразе Заходняй Дзвіны, у раёне Полацкага ўмацавання, каб не дапусціць прарыву варожых войскаў у Сянно, Оршу, у міжрэчча Бярэзіны і Дняпра.

На абарончым рубяжы канцэнтраваліся 19, 20, 22-ая арміі. На далёкіх подступах да Віцебска вораг сустрэў супраціўленне войск 20-ай арміі. Нягледзячы на значныя страты ў жывой сіле і тэхніцы, 5 ліпеня праціўнік выйшаў на рубеж Ула—Бешанковічы. Каб выправіць становішча, сюды перакінулі войскі 19-ай арміі пад камандаваннем І. С. Конева. Але чыгуначны транспарт быў перагружаны, і канцэнтрацыя злучэнняў гэтай арміі зацягвалася. Трэба было папярэдзіць прарыў матарызаваных карпусоў ворага ў раён Віцебска. Таму Ваенны савет Заходняга фронту са згоды Стаўкі прыняў рашэнне войскамі 20-ай арміі нанесці контрудар у напрамку Сянно — Лепель. Агульная глыбіня ўдару планавалася больш за 100 кіламетраў.

6 ліпеня 5-ы і 7-ы механізаваныя карпусы ва ўзаемадзеянні са стралковымі дывізіямі нанеслі контрудар па праціўніку з раёна паўднёвага захаду ад Віцебска. Перад імі стаяла задача знішчыць праціўніка ў напрамку Сянно — Лепель.

5-ым механізаваным корпусам камандаваў генерал-маёр танкавых войск І. П. Аляксеенка, 7-ым — генерал-маёр В. І. Вінаградаў. У карпусах былі танкі ў асноўным састарэлых узораў, але у 7-ым мехкорпусе, у палках 14-ай танкавай дывізіі ў баях удзельнічалі і новыя танкі Т-34 і КВ. У кожным мехкорпусе было па 2 танкавыя дывізіі і па адной мотастралковай.

У паласе дзеянняў 20-ай арміі, дзе сканцэнтраваліся 5-ы і 7-ы механізаваныя карпусы, нашым войскам супрацьстаялі значныя варожыя сілы — часці 47-га і 39-га матарызаваных карпусоў і стралковыя злучэнні. У раёне Лепеля наступала пяць варожых танкавых дывізій. Гэта была галоўная групоўка праціўніка, які рваўся да Віцебска.

Таму важна было разграміць правы фланг праціўніка ў паласе Заходняга фронту, яго лепельскай групоўкі.

Начальнік штаба 5-га механізаванага корпуса В. Буткоў успамінаў: «Наяўнасць у раёне маючых адбыцца баявых дзеянняў 5-га механізаванага корпуса вялікай колькасці рэк, азёр і балот сур'ёзна перашкаджала наступленню мотастралковых і танкавых войскаў. Яны павінны былі дзейнічаць на асобных напрамках уздоўж дарог, што вельмі абмяжоўвала манеўр, ускладняла арганізацыю ўзаемадзеяння родаў войск і вядзення агульнавайсковага бою».

Па задуме камандуючага 20-ай арміяй генерал-лейтэнанта П. А. Курачкіна, 5-ы механізаваны корпус павінен быў да 4 гадзін 6 ліпеня заняць зыходнае становішча для выступлення ў раёне Смальяны, Рамашкава, Туравічы, ударам у напрамку Толпіна, Лепель ва ўзаемадзеянні з 7-ым механізаваным корпусам разбіць 39-ы матарызаваны корпус і на зыходзе дня авалодаць Лепелем. Галоўныя сілы загадана было мець на левым флангу.

Перад 5-ым мехкорпусам стаяла задача знішчыць перадавыя часці праціўніка ў Расне, Абольцах, Замошшы і выйсці на рубеж Апечкі — Малая Беліца — Рыдомля. Далей разгортваць наступленне на Толпіна, авалодаць рубяжом Лыскі, Лукомль і на зыходзе дня выйсці ў раён Камень, Лепель. 7-му мехкорпусу — наступаць у напрамку Бешанковіч, Каменя і ва ўзаемадзеянні з 5-ым мехкорпусам разграміць 39-ы і частку сіл 47-га матарызаваных карпусоў ворага. Адначасова 1-ая мотастралковая дывізія, 115-ы асобны танкавы полк, часці 44-га і 2-га стралковых карпусоў павінны былі наступаць на Барысаў, маючы баявую сувязь з 5-ым механізаваным корпусам.

Аб характары баявых дзеянняў войск 20-ай арміі, якія наносілі контрудар у напрамку Сянно — Лепель, можна меркаваць па ўспамінах В. Буткова: «У адпаведнасці з баявой задачай генерал І. П. Аляксеенка прыняў рашэнне галоўны ўдар нанесці па леваму флангу сіламі 13-ай танкавай дывізіі ў агульным напрамку Абольцы, Толпіна і ва ўзаемадзеянні з 7-ым



Схема контрнаступлення савецкіх войск на Лепельскім напрамку 6—11 чэрвеня 1941 г.

мехкорпусам разграміць наступаўшыя часці 39-га матарызаванага корпуса і авалодаць Лепелем.

У 5-ым мехкорпусе баявы парадак прадугледжваўся ў два эшалоны. У першым павінны былі наступаць 17-ая і 13-ая танкавыя дывізіі, у другім — атрад 109-ай мотастралковай дывізіі. Акрамя таго, ствараўся карпусны рэзерв у саставе 8-га матацыклетнага палка, танкавага батальёна 16-га танкавага палка і мотастралковага батальёна 602-га мотастралковага палка.

Наступленне планавалася ў паласе шырынёю да 15 кіламетраў. 17-ая танкавая дывізія (камандзір палкоўнік І. П. Карчагін) павінна была з раёна Смальяны, Вязьмічы, Казлова наступаць уздоўж чыгункі Орша — Лепель і на зыходзе дня авалодаць паўночнай ускраінай Лепеля. Баявы парадак дывізіі ствараўся ў два эшалоны.

13-ай танкавай дывізіі (камандзір палкоўнік Ф. У. Грачоў) было загадана наступаць з раёна Іванаўск, Аленавічы, Рамашкава на Абольцы, Толпіна і на зыходзе дня ва ўзаемадзеянні з 17-ай танкавай дывізіяй авалодаць паўднёвай ускраінай горада Лепеля. Баявы парадак яна таксама мела ў два эшалоны. Кожнай дывізіі адводзілася паласа дзеянняў да 7—8 кіламетраў.

Атрад 109-ай мотастралковай дывізіі (камандзір маёр В. Ф. Мернаў) складаў другі эшалон корпуса. Яму трэба было з зыходнага раёна Росскі Сялец, Пагост наступаць за левым флангам 13-ай танкавай дывізіі ў напрамку Барадзіно, Рыдомля, Лукомля, Лепеля, развіць поспех і прыкрыць яго левы фланг ад магчымых атак праціўніка з поўдня.

Карпусны рэзерв наступаў за 17-ай тан-

кавай дывізіяй у гатоўнасці да адбою танкавых атак з поўначы. Для падтрымкі баявых дзеянняў войск са штатнай артылерыі была створана група ДД (далёкага дзеяння) 17-ай танкавай дывізіі ў складзе 467-га артылерыйскага палка і група ДД 13-ай танкавай дывізіі ў складзе 578-га артылерыйскага палка. У танкавых і мотастралковых палках ствараліся артылерыйскія роты падтрымкі танкаў і пяхоты з двух-трох артылерыйскіх дывізіёнаў.

Адсутнасць у праціўніка суцэльнага фронту наступлення давала магчымасць 5-му механізаванаму корпусу выступіць у калонах па некалькіх маршрутах.

Камандзіры дывізіі прынялі рашэнне на марш у прадбачанні сустрэчнага бою. Свае зыходныя пазіцыі яны размеркавалі такім чынам, каб пры сустрэчы з праціўнікам часці маглі хутка развярнуцца ў баявыя парадкі. У першым эшалоне павінны былі наступаць танкавыя палкі, у другім — мотастралковыя.

На падрыхтоўку корпуса да баявых дзеянняў камандуючы 20-ай арміяй адводзіў усяго адны суткі. Гэтага часу на стварэнне і планаванне наступлення корпуса было, вядома, зусім недастаткова. Штабы злучэнняў і часцей ледзь паспявалі падрыхтоўваць даведкавыя даныя для прыняцця рашэнняў камандзірамі. Спрабавалі стварыць разведку маршрутаў для дывізій на ўчастках забалочанай мясцовасці. Аднак у поўным аб'ёме выканаць гэту задачу разведорганы не змаглі. У зыходны раён для наступлення войска карпусы выйшлі са спазненнем, а карпусная і дывізійная артылерыя да пачатку баявых дзеянняў знаходзілася ў 10—15 кіламетрах ад перадавых войск.

У другой палове дня 5 ліпеня камандзір 5-га мехкорпуса ўдакладніў пытанні ўзаемадзеяння родаў войск у баі, даў указанні камандзірам дывізій па арганізацыі і вядзенню будучага наступлення.

6 ліпеня ў 5 гадзін 17-ая і 13-ая танкавыя і атрад 109-ай мотастралковай дывізіі выступілі калонамі па зададзеных маршрутах. Спачатку гітлераўцы не аказвалі актыўнага супраціўлення, аднак войскі прасоўваліся вельмі марудна. Ішоў праліўны дождж, на раскіслых дарогах ствараліся заторы. З падыходам да рубяжа Масюкі — Абольцы танкавыя дывізіі сустрэлі арганізаванае супраціўленне перадавых часцей 47-га матарызаванага корпуса. Імклівай атакай нашы войскі разбілі варожыя атрады і да 20 гадзін прасунуліся наперад на глыбіню 14—16 кіламетраў, выйшлі на рубеж: 17-ая танкавая дывізія — Серкуці, Будно, 13-ая — Замошша, Абольцы, атрад 109-ай мотастралковай дывізіі — 7 кіламетраў на захад ад Вязьміч.

Найбольшы поспех мела 17-ая танкавая дывізія. На галоўным напрамку тэмп наступлення быў значна ніжэйшы. Гэта абумоўлівалася тым, што населены пункт Абольцы гітлераўцы спешна падрыхтавалі да абароны і спрабавалі ўтрымаць у сваіх руках.

Абставіны склаліся так, што перад 17-ай танкавай дывізіяй парціўнік аказваў слабое супраціўленне. Увод у бой другога эшалона, або рэзерва корпуса, мог бы прывесці да больш дынамічнага развіцця поспеху. Аднак гэтага не змаглі зрабіць, таму што знаходзіліся ў 12 кіламетрах ад перадавых палкоў 17-ай танкавай дывізіі. Дарогі былі так перагружаны, што хуткасць іх перамяшчэння не перавышала чатырох кіламетраў у гадзіну. Да таго ж з-за адсутнасці авіяцыйнага прыкрыцця ім часта прыходзілася хавацца ў лясах ад удараў варожай авіяцыі. Наступленне 5-га мехкорпуса павінна была падтрымліваць 23-яя авіядывізія, якая мела толькі 23 самалёты («мігі» і «чайкі»).

На зыходзе 6 ліпеня танкі амаль зрасходавалі запас гаручага. Камандзір корпуса вырашыў прыпыніць далейшае наступленне, на працягу ночы дазаправіць машыны, удакладніць задачы злучэнням і на досвітку працягваць выконваць пастаўленую задачу.

Раніцай 7 ліпеня камандзіры танкавых дывізій выслалі наперад па аднаму перадавому атраду. Знішчаючы асобныя ачагі супраціўлення, яны прасунуліся да рубяжа Уздорнікі, Антаполле, дзе сустрэлі арганізаваную абарону. Было ўстаноўлена, што ў паласе наступлення корпуса дзейнічаюць часці 12-ай танкавай дывізіі (47-ы мк), а з паказанняў палонных немцаў стала вядома, што 39-ы матарызаваны корпус

наступаў у напрамку Бешанковіч, Віцебска, г.зн. у ходзе баявых дзеянняў 5 -ы мехкорпус сустрэўся не з 39-ым матарызаваным корпусам, а з 47-ым у саставе трох танкавых дывізій (12, 17, 18-ая), якія ўваходзілі ў другую танкавую групу.

З баявых данясенняў штабоў злучэнняў было высветлена, што асноўныя сілы 17-ай танкавай дывізіі на зыходзе дня вялі баі з 34-ым і 33-ім танкавымі палкамі на рубяжы Буй — Малая Беліца, 17-ы мотастралковы полк (другі эшалон дывізіі) рухаўся следам за 34-ым танкавым палком, 13-ая танкавая дывізія, выкарыстоўваючы поспех 17-ай танкавай дывізіі, разгортвала наступленне 26-ым танкавым палком і выйшла на рубеж 6 кіламетраў на захад ад Малой Беліцы, Асінаўкі. 23-і танкавы і 13-ы мотастралковы палкі былі звернуты ў калоны і рухаліся ў другім эшалоне.

У баях 7 ліпеня 1941 г. у 17-ай танкавай дывізіі стаў шырока вядомы подзвіг гарматнага разліку сяржанта В. Ф. Акімава, які ў адной з атак знішчыў пяць гармат ворага. З гонарам называлі аднапалчане імя малодшага сяржанта 33-га танкавага палка Ю. А. Жукава. Яго экіпаж у ходзе наступлення на Лепель удзельнічаў у чатырох танкавых атаках, знішчыў некалькі танкаў і 15 колавых машын.

7 ліпеня штаб 5-га мехкорпуса наблізілі да войскаў і размясцілі ў лесе на паўночным захадзе ад Расна. Абарону яго даручылі 8-му матацыклетнаму палку (камандзір маёр П. А. Белік).

Карпусныя разведчыкі паведамілі, што перад корпусам дзейнічае каля трох палкоў 12-ай танкавай дывізіі, з вялікай колькасцю палявой артылерыі і кулямётаў. У ноч на 7 ліпеня яны паспешна замацавалі за сабою найбольш важныя тактычныя рубяжы на лініі Уздорнікі — Антаполле. Іх абарона насіла ачаговы характар і мела глыбіню да 2 кіламетраў.

7-ы механізаваны корпус вёў цяжкія баі на поўнач ад Сянно. Там дзейнічалі 17-ая танкавая дывізія ворага і паветраны дэсант (каля пяхотнага палка), высаджаны 5 ліпеня на паўднёвы ўсход ад Сянно. Гэта стварала сур'ёзную пагрозу праваму флангу 5-га мехкорпуса, бо патрабавала вылучыць частку сіл для прыкрыцця фланга, што аслабляла ўдарную групоўку.

Ацаніўшы сілы свае і праціўніка, начальнік штаба палкоўнік В. В. Буткоў далажыў генералу І. П. Аляксеенку, што войскі корпуса могуць прарваць варожую абарону, знішчыць яго групоўку і авалодаць горадам Лепелем. Камандзір корпуса прыняў рашэнне раніцай 8 ліпеня прарваць абарончы рубеж, знішчыць гітлераўцаў у Асаўцы, Вятнах і на зыходзе дня авалодаць Лепелем. У адпаведнасці з гэтым рашэннем 17-ая танкавая дывізія павінна была наносіць удар 33-ім танкавым і 17-ым мотастралковым палкамі ў напрамку Вятны, а 34-ым танкавым палком прыкрываць правы фланг корпуса.

13-ая танкавая дывізія наступала на Антаполле, Лукомль. Атрад 109-ай мотастралковай дывізіі атрымаў задачу дзейнічаць за левым флангам 13-ай танкавай дывізіі і забяспечваць бой корпуса з поўдня.

Раніцай 8 ліпеня войскі корпуса аднавілі наступленне. 17-ая танкавая дывізія, нягледзячы на моцныя ўдары авіяцыі, прарвала абарону праціўніка і на працягу дня паспяхова працягвала рухацца наперад. Да 18 гадзін 34-ы танкавы полк вёў бой на рубяжы Дубнякі, Апечкі, прыкрываючы адкрыты фланг корпуса з поўначы. 33-і танкавы і 17-ы мотастралковы палкі, цесна ўзаемадзейнічаючы, змагаліся на рубяжы ст. Гразіна, Толпіна.

13-ая танкавая дывізія ў сваёй паласе правяла 5 атак, але поспеху не мела. У другой палове дня яна неаднаразова падвяргалася ўдарам варожай авіяцыі і вымушана была адмовіцца ад далейшых атак. Гітлераўскія самалёты бесперапынна і беспакарана бамбілі нашы часці на полі бою і стрымлівалі наступленне.

У 16 гадзін 8 ліпеня 17-ая нямецкая танкавая дывізія, пры падтрымцы авіяцыі, з боку Сянно ажыццявіла магутную контратаку па праваму флангу 17-ай танкавай дывізіі нашага мехкорпуса. Галоўны ўдар прыйшоўся па 34-му танкаваму палку, дапаможны — па праваму флангу 33-га танкавага палка. На працягу трох гадзін у раёне Дубнякі, Малая Беліца ішоў жорсткі танкавы бой. Панёсшы стра-

ты ў танках, фашысты вымушаны былі адказацца ад наступлення на Малую Беліцу. Яны перанеслі свой удар на ўсход у напрамку Рэчыца, Расна, у абыход корпуса з паўночнага ўсходу, пагражаючы КП корпуса, з выхадам ў тыл асноўнай групоўцы нашых войскаў. Камандаванне і штаб корпуса прынялі ўсе меры для арганізацыі абароны ў часцях 17-ай танкавай дывізіі. На рубеж чыгункі на поўнач ад Рэчыцы быў выкінуты карпусны рэзерв. Агульнымі намаганнямі войск дывізіі і рэзерву ўдар праціўніка быў адбіты. Але ў 20 гадзін 8 ліпеня ён распачаў новую атаку супраць 17-ай танкавай дывізіі.

Вялікія страты панеслі 33-і і 34-ы танкавыя палкі і адышлі на Малую Беліцу. 17-ы мотастралковы полк, паспяхова развіваючы наступленне ў напрамку Стараселля, акружыў і знішчыў на поўначы ад Толпіна звыш батальёна мотапяхоты праціўніка.

На зыходзе дня ў раёне Будна і Расна немцы адрэзалі танкавыя эшалоны з гаручым і боепрыпасамі. Карпусны рэзерв вымушаны быў адысці да Малой Беліцы. Увечары гітлераўцы высадзілі дэсант на поўдзень ад ст. Гразіна і ва ўзаемадзеянні з часцямі 12-ай танкавай дывізіі ў раёне Цотава поўнасцю акружылі 17-ы мотастралковы полк з артылерыйскім дывізіёнам і танкавым батальёнам. Полк працягваў весці цяжкі бой.

13-ая танкавая дывізія пад ударамі 12-ай танкавай дывізіі ворага адышла ў раён Рыжанкі, саўгаса «Відакі», Асінаўкі і заняла кругавую абарону.

Войскі корпуса былі пастаўлены пад пагрозу акружэння. На працягу 9 і 10 ліпеня яны вялі абарончыя баі. У гэтыя дні была аказана дапамога 17-му мотастралковаму палку. У ноч на 10 ліпеня сустрэчнай атакай 17-га мотастралковага палка і танкавага батальёна 33-га танкавага палка быў разгромлены 36-ы матарызаваны полк 12-ай танкавай дывізіі праціўніка.

Полк выйшаў з акружэння і з баямі прабіўся ў Малую Беліцу. 8 ліпеня цяжкія баі вёў 7-ы мехкорпус. Наступленне ажыццяўлялася марудна. Праціўнік сустрэў яго 14-ую і 18-ую танкавыя дывізіі моцным агнём супрацьтанкавых гармат і цяжкай артылерыі. Нашы танкавыя палкі вялі жорсткі бой у напрамку Чарнагосця.

Баявыя дзеянні 7-га мехкорпуса праходзілі ў складаных абставінах, асабліва яго 14-ай танкавай дывізіі, якая, маючы на ўзбраенні танкі Т-34 і КВ, з'яўлялася найбольш моцным злучэннем. Артылерыя нанесла па пазіцыях праціўніка магутны ўдар. Раздаўся незвычайнай сілы выбух. Гэта ўзарваўся варожы артылерыйскі склад. Затым у бой рынуліся 100 нашых танкаў. У раёне пераправы цераз рэчку стварыўся затор. Наляцела авіяцыя праціўніка. Атака была сарвана. Загінулі камандзіры танкавых батальёнаў Старых, Грышын, Хараборкін.

8 ліпеня камандаванню 7-га мехкорпуса стала відавочна, што праціўнік, сканцэнтраваўшы на поўнач ад Віцебска вялікія сілы, перайшоў у наступленне. Трэба было стрымаць, скаваць варожыя танкавыя дывізіі ў раёне Сянно. 14-ая і 18-ая танкавыя дывізіі перайшлі ў наступленне з поўначы на поўдзень. Пачаліся жорсткія баі за Сянно. Яны выявілі перавагу сіл праціўніка. Нашай 14-ай танкавай дывізіі пагражала акружэнне. Каб забяспечыць адыход, былі створаны два атрады. Ляснымі сцежкамі часці 14-ай дывізіі прабіліся цераз Кардоны, Каралі і занялі абарону ў раёне Лёзна, што ў 50 кіламетрах на ўсход ад Віцебска.

На правым флангу арміі 39-ы матарызаваны корпус ворага спыніў наступленне 7-га МК на рубяжы рэчкі Бярозка, а на некаторых напрамках адцясніў яго на ўсход.

Па загаду штаба 20-ай арміі корпус выводзіўся з баёў і павінен быў сканцэнтравацца на поўнач ад Оршы ў раёне Арэхі — Выдрыца, Стайкі, Хлусава. Выхад яго з бою праходзіў у вельмі складаных умовах. Войскі выходзілі дзвюма калонамі. Адыход корпуса І. П. Аляксеенкі вырашылі ажыццявіць цераз разрыў паміж перадавымі часцямі нашых войск і галоўнай групоўкай праціўніка на Аршанскім напрамку. Адыход прыкрываў атрад 109-ай мотастралковай дывізіі.

Выкарыстоўваючы начны час і лясныя масівы, часці корпуса на працягу 10 — 11 ліпеня былі выведзены з бою і сканцэнтраваны ў вызначаным раёне. Пры гэтым

нашы страты ў жывой сіле і тэхніцы склалі каля 60 працэнтаў.

У выніку контрудару, нанесенага войскамі 5 мк на Лепельскім напрамку, часці 47 мк немцаў панеслі вялікія страты, што значна знізіла іх ударную сілу і тэмпы прасоўвання на ўсход. У ходзе баёў дзве танкавыя дывізіі праціўніка былі скаваны ў вельмі адказны перыяд выхаду другой танкавай групы да Дняпра. Адбылася адна з буйных у пачатковы перыяд вайны танкавых бітваў, у якой з абодвух бакоў удзельнічала да паўтары тысячы танкаў. У танкавых баях перавага аказалася на баку ворага. Гэта тлумачыцца тым, што яго авіяцыя непадзельна панавала ў паветры і ад бомбавых удараў нашы часці панеслі вялікія страты ў танках.

На працягу чатырох сутак войскі нашых карпусоў прасунуліся на захад да 40 кіламетраў і былі блізка да выканання пастаўленай перад імі задачы.

Падрыхтавала А. У. Стэльмах

З гісторыі Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча

Першыя абарончыя баі

У фондах Лепельскага краязнаўчага музея захоўваецца альбом «Гісторыя Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча 1940—1946 гг.». Гэты вялікі тоўсты альбом зроблены ў 1946 г. У ім гісторыя вучылішча — расказ аб курсантах і выкладчыках, фотаздымкі, схемы баёў, у якіх удзельнічала вучылішча ўлетку 1941 г.

Вокладка альбома «История Лепельского артиллерийско-минометного училища. 1940—1946 гг.»

Альбом перадала ў музей пляменніца начальніка палітаддзела вучылішча Пугаўкіна Аляксандра Пятровіча. Пад яго кіраўніцтвам працавала камісія, якая збірала матэрыялы па гісторыі Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча.

Вучылішча было створана ў чэрвені 1940 г. ва ўмовах напружанага міжнароднага становішча. Фарміраванне вучылішча пачаў палкоўнік Карчагін, закончыў начальнік вучылішча генерал-маёр Церпілоўскі і намеснік па палітчастцы брыгадны камісар Купрын.

Курсант першага набору, цяпер маёр у адстаўцы Васіль Якаўлевіч Яшын успамінае: «Па прыбыцці ў Лепель я зразумеў, што гэта вучылішча толькі арганізоўваецца. Уступныя экзамены як след не зрабілі, са мною толькі пагутарылі. Не было вопытных кадраў для падрыхтоўкі мінамётчыкаў. Укамплектаванасць афіцэрскім саставам была разнастайнай — агульнавайсковы, кавалерыйскі, без вопыту работы ў вучылішчы, слаба падрыхтаваны. Раскватаравана было вучылішча на 116-ым кіламетры ў казармах кавалерыйскай дывізіі. Батальёны былі размеркаваны на тэрыторыі 500—2000 метраў. Штаб вучылішча — у двух кіламетрах ад казармы. Класных памяшканняў не было. Займаліся ў калідорах. Матэрыяльная база была вельмі слабая, не хапала прыбораў, нагляднасці, літаратуры».

У студзені 1941 г. вучылішча было перайменавана ў Лепельскае мінамётнае.

Да заняткаў прыступілі ў жніўні 1940 г. Курсантамі сталі салдаты і сяржанты, якія праслужылі ў арміі больш года, і вельмі невялікі працэнт добраахвотнікаў з грамадзянскіх навучальных устаноў. Паступова справа ў вучылішчы наладжвалася. Падбіраліся афіцэрскія кадры. Першапачаткова меркавалася рыхтаваць камандзіраў стралковых узводаў, а са студзеня 1941 г. — камандзіраў мінамётных часцей. Прыбылі новыя выкладчыкі — маёры Ціхмянаў, Ігнацьеў, Тачылкін, капітаны Герасіменка, Краснянскі, Марыновіч, Кузняцоў.

9 чэрвеня 1941 г. вучылішча перабазіравалася ў пасёлак Бароўку ў казармы танкавай дывізіі. На новым месцы палепшылася размеркаванне. Казармы былі размешчаны кампактна, стала прасторна. Аднак прыстасавацца як след не паспелі. Васіль Якаўлевіч Яшын успамінае аб дні 22 чэрвеня 1941 г.: «Быў прыгожы сонечны дзень, і мы рады былі такому надвор'ю. Нашы курсанты згрупаваліся па 4—6 чалавек. У нашай групе былі курсанты: Князеў (рускі, гарманіст, весялун), Бандарэнка (украінец, цудоўны спявак, удзельнічаў у мастацкай самадзейнасці, цудоўна граў на гітары), Харытонаў (рускі, танцор, таксама ўдзельнічаў у самадзейнасці, былы парашутыст), Бершацкі (башкір, гадзіннікавы майстар, фатограф, вельмі сур'ёзны хлопец), Пічэрскіх (беларус, гумарыст, весялун) і я (чуваш, вышэйуказанымі талентамі не валодаў, толькі па кіданню гранат займаў першае месца). Вось у такім саставе і гулялі мы ў сасновым бары каля ваеннага гарадка. Фатаграфаваліся, а затым пайшлі на возера Бароўка, дзе адпачывала многа грамадзянскага насельніцтва. Купаліся. У той жа час наш Князеў вылучыўся. Ён арганізаваў лоўлю рыбы, зрабіўшы з іголкі кручок, на які надзеў муху. Нам было вельмі цікава і смешна. «Мабыць, наловім на юшку», — гаварылі мы.

Раптам над нашымі галовамі праляцела некалькі нашых чырваназорных двухматорных цяжкіх бамбардзіроўшчыкаў. Іх было больш дваццаці. Харытонаў растлумачыў, што гэта баявыя самалёты, нагружаныя бомбамі, ляцяць курсам на захад. Хтосьці ўскрыкнуў: «Няўжо вайна?» Але

Б. Р. Церпілоўскі, начальнік Лепельскага артылерыйскамінамётнага вучылішча

паверыць у гэта не маглі, а ўскорасці прыбег сувязны і сказаў, што аб'яўлена ваенная трывога».

— Няхай жыве міравая рэвалюцыя! — крыкнуў хтосьці. І мы па трывозе бяжым у распалажэнне вучылішча.

На пляцу адбыўся вялікі мітынг, на якім прысутнічалі і мясцовыя жыхары. На мітынгу афіцыйна аб'явілі аб нападзенні фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз.

На працягу трох дзён вучылішча працягвала вучобу, выставіўшы ахову. Быў арганізаваны аператыўны штаб: начальнік вучылішча — Церпілоўскі, маёр Ціхмянаў — начальнік аператыўнага аддзела, капітан Тыдман — начальнік разведвальнага аддзела, маёр Тачылкін — начальнік сувязі і начальнік інжынернай службы Кузняцоў.

22 чэрвеня атрымалі загад арганізаваць абарону г. Лепеля, забяспечыць эвакуацыю боепрыпасаў на складах, якія знаходзіліся на 116-ым км і ў пас. Бароўка. Вучоба перапынілася, вучылішча прыступіла да выканання баявых заданняў. Аператыўная абстаноўка была невядомай, суседзяў не было. Вучылішча мела 120-мм мінамётаў — 8 штук, 82-мм — 18 штук, 50-мм — 20 штук, 76-мм пушак узору 1927 г. — 4 шт., станковых кулямётаў — 9 шт., ручных кулямётаў — 18. Боепрыпасаў было толькі для выканання вучэбна-практычных стрэльбаў. Вінтовак было на 50 працэнтаў штатнага саставу курсантаў, а вінтовачных патронаў — каля 50 штук на вінтоўку.

Фронт абароны, заняты ўначы з 26 на 27 чэрвеня на р. Эса, каля вёсак Камень,

Лепель, Валосавічы, быў вельмі вялікі — 50 кіламетраў. Увечары 27 чэрвеня быў атрыманы новы загад камандзіра корпуса генерал-маёра Карманава заняць абарону на р. Ула па лініі фронту Лепель — 116-ы кіламетр. Новы раён скарачаў абарону і забяспечваў галоўную задачу вучылішча: абарону і эвакуацыю складоў. У перыяд з 27 чэрвеня па 2 ліпеня падраздзяленне ўдасканальвала сістэму абароны, ішла эвакуацыя складоў і сямей афіцэраў.

Раніцай 2 ліпеня становішча ўскладнілася. Былі атрыманы звесткі аб адыходзе пагранатрада пад націскам праціўніка і аб знішчэнні моста цераз р. Бярэзіну. Бамбілі г. Лепель. Устанавіць сувязь з адыходзячымі часцямі не ўдалося. Чыгунка на Оршу ў многіх месцах была сапсавана. Транспарту не было. Акрамя таго, былі атрыманы супярэчлівыя загады зрабіць выпуск 800 курсантаў, перадыслакаваць вучылішча ў г. Мажайск, адысці на правы бераг Заходняй Дзвіны ў раён Бешанковіч, дзе паступіць у распараджэнне дывізіі генерал-маёра Бірукова.

Да Лепеля адышлі разбітыя часці Віленскага пяхотнага вучылішча амаль без усялякай зброі і пагранатрад маёра Бярэзіна, узброены толькі вінтоўкамі.

3 ліпеня да Лепеля падышлі мотамехчасці праціўніка. З альбома мы даведаліся прозвішчы некаторых удзельнікаў гэтых падзей. Гэта камандзір гарматы сяржант Лабяк, малодшы лейтэнант Раздабудзька, ст. лейтэнант Масленнікаў, капітан Фокін, старшы лейтэнант Мачкоў, сяржанты П. Е. Шышкін і Лаўчакоў.

Увечары 4 ліпеня генерал-маёр Карманаў пацвердзіў свой загад аб адыходзе на р. Заходняя Дзвіна, ствараючы па дарогах мінныя інжынерныя загароды.

У раёне Бачэйкава 5 ліпеня афіцэры і курсанты вучылішча прынялі сустрэчны бой. Тут вызначыліся маёр Сярэбранікаў, курсанты Румянцаў і Дзмітрыеў, старшы лейтэнант Гаілічэнка, батарэя лейтэнанта Масленнікава, курсант Ямцоў, лейтэнант Сабіраў. Узвод лейтэнанта Ігнаценкі хутка развярнуўся і пачаў абстрэл варожых танкаў, але не заўважыў набліжэння танкаў злева, а танкі ішлі прама на ўзвод. Лейтэнант Ігнаценка ўскочыў на лафет, кінуў гранату, танк спыніўся, але лейтэнант быў скошаны кулямётнай чаргой. Фашысты пачалі абыходзіць з боку, камандзір батальёна маёр Сярэбранікаў прыняў рашэнне перапраўляцца цераз р. Улу. У гэтым баі курсанты падбілі 10 танкаў. Нашы страты: 2 афіцэры, 18 курсантаў, 37 параненых.

Вучылішча заняло абарону на правым беразе р. Заходняя Дзвіна. На ўчастку Мурашкі — Гняздзілавічы (30 км) 3 дні стрымлівала націск усёўзрастаючых сіл праціўніка. Пасля прарыву на ўчастку дывізіі генерал-маёра Бірукова ноччу з 8 на 9 ліпеня вучылішча пачало адыходзіць у напрамку Віцебска.

Колькі мужнасці, адвагі, стойкасці праявілі ў гэтыя тры дні курсанты і афіцэры вучылішча. Курсанты Лопараў, Пагарэлаў, лейтэнанты Мачкоў і Масленнікаў сарвалі ворагу пераправу цераз Заходнюю Дзвіну. У гэтым баі лейтэнант Мачкоў быў смяротна паранены асколкам снарада. Ён быў лепшым камандзірам батарэі вучылішча.

7 ліпеня ў раёне вёскі Храпавічы пад праліўным дажджом 4-ая рота лейтэнанта Лагунова кінулася ў рукапашны бой. У гэтым баі загінуў лейтэнант Лагуноў. Альбом называе нам і іншыя прозвішчы ўдзельнікаў гэтага бою: лейтэнантаў Баброва, Калеснікава, курсанта Чарнышова.

У ноч з 8 на 9 ліпеня немцы распачалі яшчэ адну спробу пераправіцца цераз Заходнюю Дзвіну. Маёр Хадакевіч, капітаны Тыдман і Працветаў (апошні замяніў загінуўшага маёра Сярэбранікава), ст. лейтэнант Іскра арганізавалі абарону. Атака непрыяцеля была адбіта. Але раніцай 9 ліпеня праціўнік усё ж прарваў абарону ў раёне Улы і прасоўваўся ў напрамку Сіроціна — Старое Сяло. Узнікла небяспека акружэння з правага фланга. Камандзір дывізіі загадаў адступаць у напрамку Віцебска. Пачалі адыходзіць. 5-ая батарэя капітана Страхава, рухаючыся ў ар'ергардзе, нечакана была атакавана ў раёне Шарыпіна, дзе яна пачала пераправу. Змучаныя, зараныя, курсанты ўступілі ў бой. Загінуў палітрук Апарцаў — парторг другога батальёна. З баямі курсанты вучылішча 10 ліпеня адышлі да Віцебска. Па

распараджэнні камандуючага Заходняй ваеннай акругай генерал-лейтэнанта Курдзюмава вучылішча было перадыслакавана ў г. Барнаул Алтайскага края.

Выпускнікі вучылішча

Вучылішча за 5 гадоў свайго існавання выпусціла 6674 маладых афіцэраў-мінамётчыкаў, якія паказалі добрыя веды і ўмелае кіраўніцтва падраздзяленнямі ў баявых умовах. Многія з іх сталі камандзірамі дывізіёнаў і палкоў. Амаль усе маюць баявыя ўзнагароды.

Шэсць чалавек, выпускнікоў вучылішча, удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Гэта закончыўшыя вучылішча ў 1942 годзе камандзір батарэі капітан Труноў Павел Якаўлевіч і Логвін Піліп Андрэевіч; закончыўшыя вучылішча ў 1943 годзе начальнік разведкі дывізіёна капітан Сельскі Сямён Пятровіч, камандзір батарэі капітан Ціхмянаў Леанід Паўлавіч, камандзір батарэі лейтэнант Грыгор'еў Іван Якаўлевіч.

Героем Савецкага Саюза стаў адзін з першых курсантаў Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча, які закончыў яго ў 1941 годзе, камандзір мінамётнага дывізіёна Шышкін Павел Емяльянавіч.

У ліпені 1940 г. збылася мара Паўла Шышкіна. Ён стаў курсантам ваеннага вучылішча. З вялікай радасцю ён узяўся за вучобу. Але прыходзілася яму нялёгка. Сямігадовая адукацыя давала аб сабе знаць. Павел упарта авалодваў ваеннымі ведамі. Прайшоў год, і вучобу перапыніла вайна. Сяржант Шышкін разам з вучылішчам удзельнічаў у абарончых баях у канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1941 г. Пасля шматдзённых цяжкіх баёў разам з вучылішчам ён прыбыў у Барнаул. У жніўні адбыўся выпуск. Малады лейтэнант Шышкін прызначаны камандзірам узвода курсантаў у вучылішчы. У руплівай працы прайшлі два гады службы ў вучылішчы. На фронт ён папаў, калі Чырвоная Армія, прарваўшы абаронную лінію немцаў, у імклівым наступленні рухалася да Дняпра.

Разам са стралковым падраздзяленнем першай у злучэнні фарсіравала Днепр мінамётная батарэя старшага лейтэнанта Шышкіна. Стралковае падраздзяленне трывала ўтрымлівала плацдарм на правым беразе Дняпра. Мінамётчыкі батарэі Шышкіна падтрымлівалі агнём стралковае падраздзяленне. Немцы кінуліся ў контратаку, хацелі скінуць іх у рэчку, але былі адбіты. Так мінамётчыкі забяспечылі пераправу іншых часцей.

За гераізм, стойкасць і мужнасць, праяўленыя пры фарсіраванні Дняпра, і ўтрыманне плацдарма на правым беразе Паўлу Шышкіну прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, асабовы састаў батарэі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Па-рознаму склаўся лёс выпускнікоў вучылішча, многія загінулі ў першыя дні вайны, іншыя пасля на франтах Вялікай Айчыннай, а з тых, хто застаўся жыць, многія працягвалі служыць у Савецкай Арміі. Напрыклад, маёр у адстаўцы Яшын Васіль Якаўлевіч, падпалкоўнік у адстаўцы Белікін Васіль Канстанцінавіч, палкоўнік у адстаўцы Апалонаў Мікалай Паўлавіч і іншыя.

Вучылішча больш у Лепель не вярнулася і было, бачна, у 1946 годзе расфарміравана. Жыццё раскідала курсантаў Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча па ўсяму Савецкаму Саюзу. Большасць з іх ніколі больш не былі ні ў Лепелі, ні ў Барнауле, не сустракаліся ніколі паміж сабой, але назаўсёды зберагліі добрую памяць аб вучылішчы, сваіх аднакурсніках, сваёй маладосці, якая супала са страшэннай вайной. Аб гэтым яны гавораць, калі іх выпадкова лёс закіне ў Лепель, або зрэдку напішуць у музей.

А. У. Стэльмах

З успамінаў Г. М. Крылова, былога палітрука Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча

У мяне з Лепельскім артылерыйска-мінамётным вучылішчам звязана станаўленне армейскай службы як палітработніка. У склад вучылішча ўваходзіла тры курсанцкіх батальёны са штатнымі падраздзяленнямі і службамі. На ўзбраенні былі 120-міліметровыя палкавыя мінамёты, былі і вучэбныя мінамёты. Камандны сас-

таў быў узброены пісталетамі «ТТ», курсанты — карабінамі. На складзе аўтаўзбраення мелася 10—12 аўтаматаў.

Наступіў дзень 22 чэрвеня 1941 г. Раніцай таго ж дня камандаванне ЛМВ было тэрмінова выклікана ў Лепельскі райкам партыі. Па вяртанні з райкама вучылішча было паднята па трывозе.

Позна ўвечары 22.06.41 г. брыгадны камісар І. Т. Купрын выбыў у Мінск у штаб Заходняй асобай ваеннай акругі.

Вучылішчам камандаваў генерал Церпілоўскі, камісарам застаўся старшы батальённы камісар Кучын, начальнікам вучэбнага аддзела (штаба) — маёр В. А. Хадакевіч.

Фронт набліжаўся да Лепельшчыны. Гэта патрабавала ад камандавання ўвесці на даным напрамку ў састаў дзеючай арміі і ЛМВ. Наш курсанцкі полк з першых гадзін сутыкнення з праціўнікам і ў наступных баях паказаў сябе мужна і стойка. Наступаючыя гітлераўскія войскі, маючы вялікую перавагу ў авіяцыі, матарызаваных часцях і артылерыі, ірваліся ў Віцебскім напрамку.

Утрымаць праціўніка, ды яшчэ на шырокім участку, было не пад сілу курсанцкаму палку. Магчымасці курсанцкіх батальёнаў былі вельмі сціплымі. Страты ў тых баях канца чэрвеня — пачатку ліпеня 1941 г. сярод каманднага саставу і курсантаў былі вялікімі.

Не выконвалася распараджэнне наркама абароны маршала С. К. Цімашэнкі аб вывадзе вучылішча з саставу дзеючай арміі. На подступах да Віцебска, калі нашы страты складалі больш трэцяй часткі, паступіла ўказанне аб зняцці ЛМВ з баявых парадкаў. Збор асабовага саставу ў той час быў вельмі цяжкай справай. Пункт збору быў вызначаны ў раёне ст. Кардымава пад Смаленскам, а затым у Мажайску, куды прыбыў асноўны састаў вучылішча і потым праследаваў у Сібірскую ваенную акругу, у г. Барнаул.

Да месца збору многія выходзілі рознымі напрамкамі па аднаму або групамі.

Камандаванне ЛМВ, якое прыбыло ў Новасібірск, было выклікана ў штаб Сібірскай ваеннай акругі, адкуль у вучылішча не вярнулася. Праз многа гадоў у кнізе «Освобождение Белоруссии, 1944» (М.: Наука, 1970. С. 343) у нарысе камандарма генерала А. В. Гарбатава «3-я армия в боях за освобождение Белоруссии» прачытаў: «Многа сіл і труда ўклалі ў падрыхтоўку войск арміі да наступлення афіцэры і генералы штаба арміі М. В. Івашачкін, Б. Р. Церпілоўскі. Гледзячы на іх самаадданую працу, часам здавалася, што ў нас у арміі сабраліся самыя лепшыя, самыя адданыя нашай сацыялістычнай радзіме людзі».

Тады, у пачатку ліпеня 1941 г., старшы батальённы камісар Кучын сказаў мне прыкладна наступнае: «Маё месца быць побач з начальнікам вучылішча, а табе, Крылоў, трымацца штаба і быць там да нашай наступнай сустрэчы, як пакажуць абставіны». У распараджэнні штаба было некалькі машын і аўтобус. Вучэбны аддзел атрымаў заданне знайсці ў раёне «трох азёр» месца для КП. Штаб з калонай праехаў раніцай на наступны дзень некалькі кіламетраў па прасёлкавых дарогах, якія былі ў большасці сваёй размыты лужынамі. Машыны прыходзілася штурхаць. Сонца ўзышло, калона прыбыла ў вёску. У гэты час пачуліся крыкі: «Немцы!», пачалася страляніна, хтосьці заклікаў заняць абарону.

Фашысцкія самалёты пачалі пікіраваць на калону. Пасыпаліся бомбы. У гэтай мітусні ў мяне была перабіта левая шчыкалатка.

З цяжкасцямі дабраўся да Смаленшчыны, затым да г. Дзямідава. Тут сустрэўся з групай курсантаў ЛМВ. Дабраліся да Мажайска і даведаліся, што састаў з ЛМВ напярэдадні выбыў у Новасібірск. 26 ці 27 ліпеня 1941 г. эшалон ЛМВ прыбыў у Барнаул, а на наступны дзень ноччу ў Барнаул з групай прыехаў і я.

З успамінаў М. Л. Буткевіча, ваентэхніка 2-га рангу, намесніка начальніка артузбраення Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча

У Бароўцы размяшчалася Лепельскае артылерыйска-мінамётнае вучылішча. Начальнікам вучылішча быў Б. Р. Церпілоў-

скі. У апошнія дні чэрвеня 1941 г. асабіста ад яго атрымаў загад адвезці дзве машыны маёмасці артмайстэрні, ужо загружаных, на рампу ст. Лепель. Разгрузіць і пакінуць вартавых, па тэлефоне ўдакладніць у ваеннага каменданта аб часе прыбыцця эшалонаў у Лепель для эвакуацыі вучылішча.

Па прыбыцці ў Лепель быў здзіўлены тым, што не сустрэў ніводнага жыхара. Вуліцы былі пустыя. Сляды бамбёжкі, абарваныя правады, павыбіваныя шыбы акон і вітрын магазінаў. Зайшоў на пошту. Пуста. Разгрузіў машыны на рампе, адну машыну адправіў назад, а на другой пад'ехаў да вакзала. Зноў пуста. З'явіўся пажылы чыгуначнік, які паказаў, з якога тэлефона можна пазваніць у Оршу. Сувязь спрацавала адразу. Камендант пацікавіўся становішчам у горадзе і паабяцаў да вечара прыслаць эшалон. З гэтым я і вярнуўся ў Бароўку, далажыў начальству.

Сталі загружаць яшчэ дзве машыны для адпраўкі ў Лепель. Перад адпраўкай прыбег адзін з пакінутых у Лепелі вартавых. Далажыў, што, як толькі мы ад'ехалі ад вакзала, па іх адкрылі кулямётны агонь з пралятаючай «рамы», з гарышча вакзала і з воданапорнай вежы. Яны вымушаны былі адысці агародамі да моста праз канал (плаціну электрастанцыі). На мосце стаяў танк і сустрэў іх кулямётным агнём. Паездка была адменена і больш не аднаўлялася. Каб пазбегнуць акружэння, вучылішча адышло да Бешанковіч і заняло абарону на правым беразе ракі Заходняй Дзвіны.

7 ліпеня я падвозіў боепрыпасы да Бешанковіч са станцыі Шуміліна. Па дарозе Бешанковічы — Шуміліна я сустрэў фурманку, на якой ехалі камандзір першага батальёна вучылішча маёр Сярэбранікаў і начальнік штаба старшы лейтэнант (прозвішча не памятаю). Яны пераселі ў машыну, і я іх павёз на КП да генерала. Па дарозе мне старшы лейтэнант расказаў, што іх батальён паслалі ў абход Лепельскага возера, каб падысці да Лепеля з захаду і выбіць нямецкі дэсант. За возерам яны былі акружаны нямецкімі танкамі. Многія загінулі. Ён з камандзірам батальёна трымаліся разам. Па жыту, кустах выйшлі з акружэння і рушылі на ўсход. Сустрэліся з намі. Закончыць размову мы не паспелі, бо трапілі на засаду немцаў. Па машыне быў адкрыты кулямётны агонь. Шафёр быў паранены ў нагу. Мяне паранілі ў грудзі, а маёра забілі. Мяне і шафёра завезлі ў санчасць. Маёра пахавалі. Месца ведаю. А вось дзе пахаваны загінуўшыя курсанты і камандзіры першага батальёна, невядома.

Яшчэ мне хочацца ўспомніць вось пра што.

У снежні 1940 года ў вучылішча прыехала група дзяўчат з Мінскага педінстытута выкладаць англійскую мову. З адной з іх я пазнаёміўся. У сакавіку 1941 г. я зрабіў ёй прапанову. Была атрымана згода, але фармальнасці зацягваліся з-за напружанай працы ў яе і ў мяне. Але неяк мы выбраліся на выхадны дзень і паехалі ў Віцебск, дзе жыла мая мама, пазнаёміцца і зарэгістраваць шлюб. У спешцы яна забылася пашпарт. Так што знаёмства адбылося і нават благаславенне, але рэгістрацыя не адбылася. І толькі 22 чэрвеня 1941 года ў Лепельскім бюро ЗАГС мы атрымалі пасведчанне аб шлюбе за № 80, падпісанае справаводам Міхно. Вярталіся дамоў і пачулі выступленне В. М. Молатава. Было 12 гадзін. Закончылася наша мірнае жыццё.

З успамінаў В. А. Яцыны, былога курсанта Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча

З другога курса педвучылішча я паступіў у мінамётнае вучылішча. Гэта было ў кастрычніку 1940 г.

У 1941 г. наша вучылішча перавялі ў Бароўку.

Калі пачалася вайна, курсантаў вывелі ў лес. Ведаю, 1-ы батальён знаходзіўся за Лепелем у раёне вёскі Стаі. Там і сустрэліся з немцамі. Наш 2-і батальён апынуўся ў раёне ст. Чашнікі, адтуль пешшу мы прыбылі ў раён Бешанковіч і занялі абарону на правым баку р. Заходняя Дзвіна, дзе стрымлівалі націск немцаў, не даючы ім пераправіцца на правы бераг р. Дзвіны.

Потым паступіў загад вывесці вучылішча з бою. Мы прыбылі ў г. Віцебск, адарваўшыся ад немцаў у раёне в. Астроўна.

Ноч прабылі ў Віцебску, а раніцай групамі па смаленскай шашы накіраваліся ў бок Смаленска, дзе нас сустрэлі на зборным пункце.

Крыху пра баі за Бешанковічы. Я быў у мінамётным разліку, і мы вялі агонь з лесу. Адзін эпізод мне запомніўся на ўсё жыццё. Мы не паспелі адысці з пазіцый. Немцы напалі на нас (курсантаў). Палітрук, прозвішча яго не памятаю, павёў нас у рукапашны бой. Мы скінулі немцаў у Дзвіну. У гэтай атацы загінуў невядомы мне палітрук.

З успамінаў В. Я. Яшына, былога курсанта Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча

Нарэшце мы дагналі вучылішча. Лейтэнант Нятрэбін даклаў начальству аб прыбыцці нашай групы. Нас накармілі і адправілі ў раён абароны. Там мы ўбачылі свайго начальніка вучылішча. З-пад башлыка ледзь была відна генеральская фуражка.

На абароне Заходняй Дзвіны мы знаходзіліся 2—3 дні, не болей, немцы фарсіравалі раку на другім напрамку. Зноў мы апынуліся ў паўкальцы. Нам загадалі выйсці з гэтага паўкальца. Пад прыкрыццём ночы мы кранулiся на паўднёвы ўсход. Цяпер ужо арганізавана, па падраздзяленнях у калоне.

...Але мы апынуліся ў акружэнні немцаў. У лесе мы не сядзелі склаўшы рукі. Мы рабілі смелыя рэйды, нападалі на нямецкую ахову. Мы не елі 3 дні. Начальнік вучылішча давёў да нас загад міністра абароны, што наша вучылішча выводзіцца з бою і будзе дыслацыравацца ў горадзе Вязьме.

Ён з намі размаўляў як таварыш і бацька. Паставіў перад намі задачу, што з акружэння трэба выходзіць толькі пад прыкрыццём цемры, асобнымі мелкімі групамі, без ніводнага стрэлу. Пасля выхаду з акружэння месца збору сяло Краснаполле, дзе будуць дадзены дадатковыя ўказанні. Мы разышліся па некалькіх напрамках па 30—40 чалавек. З вялікімі цяжкасцямі, ад кусціка да кусціка, выкарыстоўваючы лагчыны і розныя ўпадзіны, дабраліся да шашы. Стала віднець, бачнасць лепшая. Калі выявім сябе, тады ўсё загінула.

З дазволу капітана, я і яшчэ адзін танкіст (з падбітага танка) перабеглі дарогу і схаваліся ў кустах. За намі перабеглі яшчэ некалькі курсантаў. Астатнія на чале з капітанам засталіся ў лесе. Мы вырашылі больш не вяртацца назад і рухацца наперад. Ззаду нас пачулася страляніна з аўтаматаў.

З наступленнем цемры мы пайшлі ў напрамку Краснаполля.

Зайшлі з боку агародаў. З голаду мы з'елі цыбулю, якая паказалася салодкай, як цукар, пасля 4 дзён галадухі. Сустрэліся з камісарам вучылішча і яшчэ з некалькімі курсантамі.

Камісар сказаў, што болей чакаць не будзем. Атрымалі загад маленькімі групамі ноччу выйсці на Вялікія Лукі. Днём у паветры панавалі нямецкія самалёты. Нямецкія войскі займалі вёску за вёскай. Мы ішлі за імі ўслед.

Нас было ўсяго пяцёра: камісар вучылішча, старэйшы інструктар (хімік) вучылішча і тры курсанты.

Мы выйшлі на Вялікія Лукі — горад цалкам разбураны.

Падвялі некаторыя вынікі. Больш 400 км мы прайшлі з баямі. Калі я пераабуваўся за гэты час, не памятаю. А вось у Вялікіх Луках пераабуўся, убачыў, што ад новых ботаў засталіся адны язычкі, рамантаваў сам наспех. На пятках мазалі.

Нас сабралі ў камендатуру і сказалі, што мы павінны эвакуіравацца ў горад Барнаул.

Выпіска са справаздачы аб баявой падрыхтоўцы Лепельскага мінамётнага вучылішча за 1941 год

1. Удзел вучылішча ў складзе дзеючай арміі на франтах Айчыннай вайны і перадыслакацыя вучылішча.

Лепельскае мінамётнае вучылішча пачало дзейнічаць з чэрвеня 1940 года з арганізацыйным перыядам да 1.12.1940 года. Яно было раскватаравана ў раёне г. Лепеля на чыгункі Лепель — Орша на 116-ым кіламетры (22—24 км ад Лепеля).

З 8.06.41 г. вучылішча пераходзіць у Бароўку ў 12 км ад Лепеля па дарозе Лепель — Віцебск. Першы набор быў завершаны, і вучылішча прыступіла да планавай рэгулярнай вучобы 1.12.40 г. Такім чынам, выпуск павінен быў адбыцца да 1.12.42 г.

Пачатак вайны з германскім фашызмам застае вучылішча ў Бароўцы з колькасцю курсантаў 1596 чалавек, якія да таго часу прайшлі: адна часць курсантаў 10—9 месяцаў вучобы, а другая — 7 месяцаў, што складала ад 40 да 30 працэнтаў матэрыялу двухгадовай праграмы.

26.06.41 г. Лепельскае мінамётнае вучылішча атрымала баявую задачу абараняць Лепельскі напрамак і г. Лепель да поўнай эвакуацыі ваенных складаў.

1.07.41 г. быў атрыман з ГАУ прыказ аб выпуску 800 курсантаў і перадыслакацыі вучылішча з 3 ліпеня ў г. Мажайск. У гэты ж дзень быў атрыманы агульнавайсковы прыказ ад камандзіра 64 корпуса (г. Віцебск) аб тым, каб вучылішча да раніцы 4.07.41 г. заняло абарону на Заходняй Дзвіне на ўчастку Ула — Бешанковічы. У гэты ж дзень адбываецца першае сутыкненне з фашысцкімі часцямі. З 9.07.41 г. у ходзе ваенных дзеянняў вучылішча распадаецца і перастае дзейнічаць, як цэласны кіруемы арганізм, адна палавіна вучылішча прарываецца на Віцебск, удзельнічае ў абароне Віцебска, затым адступае да Смаленска, дзе здае конны састаў, узбраенне. Людзі накіроўваюцца эшалонамі ў новае месца раскватаравання ў г. Барнаул, а другая часць, знаходзячыся ў акружэнні, асобнымі невялікімі групамі самастойна, або далучыўшыся да сустрэўшыхся часцей (галоўным чынам да часцей 214 сд) паступова выходзяць з акружэння, пасля чаго групамі або па аднаму адпраўляюцца ў Барнаул. Першая значная група прыбыла ў Барнаул 26.07.41 г. у складзе 70 чалавек начальніцкага саставу і 691 курсанта і паслужыла тым ядром, вакол якога пачалося фарміраванне па сутнасці новага вучылішча. Да 12.08.41 г. у Барнауле сабралася:

сярэдняга і старшага начальніцкага саставу	— 95 чалавек
малодшага начальніцкага саставу	— 17 чалавек
курсантаў	— 847 чалавек
радавых	— 63 чалавекі

Цалкам рэчы, вучэбныя дапаможнікі, літаратура, сакрэтная перапіска, грошы, усе дакументы гаспадарчага, страявога і навучальнага парадку засталіся на тэрыторыі, захопленай германскімі фашыстамі.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 60171. Воп. 35257. Спр. 15. Л. 185—186.

Лепельскае пяхотнае вучылішча

З успамінаў Вярбіцкага Віктара Васільевіча, былога курсанта Лепельскага пяхотнага вучылішча ў 1940—1941 гг.

Калі я вучыўся ў Лепельскім педвучылішчы, даведаўся, што праводзіцца набор у Лепельскае пяхотнае вучылішча. Многія навучэнцы вырашылі туды паступіць. Усяго падалі заявы каля 100 чалавек.

Размяшчалася вучылішча ў ваенным гарадку Бароўка-1. Начальнікам пяхотнага вучылішча быў прызначаны падпалкоўнік М. І. Зайцаў (як мне расказалі пазней, ён загінуў пад Віцебскам у 1943 г.). Яго намеснікам па МТЗ быў маёр Смірноў, камандзірам майго батальёна — Гукаў.

У маі 1941 г. вучылішча перавялі ў г. Чарапавец Валагодскай вобласці. Перад гэтым адзін выпуск курсантаў быў зроблены ў Лепелі, другі — у Чарапаўцы (10 чэрвеня 1941 г.). Наш батальён працягваў заняткі да 20 жніўня 1941 г.

Наогул у вучылішчы былі тры батальёны (прыкладна па 700 чалавек), рота малодшых лейтэнантаў, якіх рыхтавалі на 6-месячных курсах з асоб, адслужыўшых тэрміновую службу. У Бароўцы былі 2—3 выпускі малодшых лейтэнантаў, якія жылі ў казармах танкавай брыгады, пераведзенай у 1939 г. у г. Гродна.

Наша вучылішча было сярэдняе, курс навучання ў ім быў два гады. Рыхтавала яно пяхотных стралковых камандзіраў. З 20 жніўня 1941 г. нас выпусцілі ў званні «лейтэнант» і ў якасці камандзіраў стралковых рот накіравалі на фронт.

У пяхотнае вучылішча разам са мной паступілі Юркевіч Дзмітрый з в. Усовікі (зараз палкоўнік у адстаўцы, жыве ў Маскве), Галец Іван, Ганкевіч Аляксандр з в. Забароўе, загінулі абодва.

У артылерыйскае вучылішча паступіў Яцына І. А. Застаўся жывым пасля вайны Залубіцкі Уладзімір з Чашніцкага раёна.

Жывых засталося мала. Большасць загінула. Гэта Парахонька, Аксяновіч з Зорніцы, Парахонькаў, Яско з Луцішчаў, Міснік з Забаення, Бельскі з Залучына.

Ваенная служба мне падабалася. Вучыцца было цяжка. Наш лыжны батальён рыхтавалі адправіць на фінляндскую вайну. Усю зіму 1939/40 г. мы знаходзіліся ў лагерах ля палігона ў Ракавіцах. Жылі ў палатках. Ваенную праграму вывучалі на лыжах. Але перад самым выпускам савецка-фінляндская вайна скончылася.

Запісала А. У. Стэльмах

З архіўнай даведкі Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва № 339/І ад 22.07.91 г.

Фарміраванне вучылішча праводзілася ў г. Лепелі ў студзені — лютым 1940 г. па штату нармальнага вучылішча.

Начальнік вучылішча: палкоўнік Зайцаў М. І.

Ваенны камісар вучылішча: палкавы камісар Мельнікаў Я. М.

Акупацыя і акупацыйны рэжым

Акупацыя раёна цягнулася амаль тры гады. Гітлераўцы прынеслі многа гора, пакут і страт яго насельніцтву. Увесь раён быў насычаны гітлераўскімі войскамі, вайсковымі службамі. Агульная колькасць іх даходзіла да 12 тысяч чалавек; з іх франтавых пяхотных часцей да 7 тысяч чалавек, у тым ліку каля 4 тысяч фінаў, каля 1,5 тысячы «добраахвотнікаў». На іх узбраенні былі танкі, танкеткі. Быў і кавалерыйскі эскадрон. Штаб вайсковага злучэння знаходзіўся ў вёсцы Залучына (за 7 км ад Лепеля).

Тэрыторыя раёна, як увогуле і тэрыторыя Віцебскай вобласці, уваходзіла ў вобласць тылу групы армій «Цэнтр». У адміністрацыйных адносінах — у склад гаупткамісарыята Віцебск.

Кіраўніцтва раёнам ажыццяўлялі ваенныя ўлады цераз 3 палявыя і 7 мясцовых камендатур. Апошнім падпарадкоўваліся камендатуры вучэбных палігонаў, танкадрома, аэрадрома, які быў пабудаваны на паўночна-ўсходняй ускраіне Лепеля ў ліпені 1943 г.

Цывільную ўладу ў раёне прадстаўляў раённы камісар крайсшар-фюрэр Элербоок, Лепельская гарадская ўправа, 14 валасных старшынь, па вёсках — старасты.

На тэрыторыі раёна была сканцэнтравана вялікая колькасць гітлераўскіх войскаў. 201-ая ахоўная дывізія тылу групы армій «Цэнтр» (камандзір дывізіі Якабі) выконвала задачу па ахове ўчасткаў чыгункі Полацк — Невель, Полацк — Віцебск, Полацк — Дзінабург. Штаб дывізіі размяшчаўся ў вёсцы Бароўка, каля Лепеля. Тыя ж задачы стаялі перад 201-ым паліцэйскім матарызаваным батальёнам пры 62-ім ахоўным палку 201-ай ахоўнай дывізіі тылу групы армій «Цэнтр» (камандзіры Моха, Папхучы). Яго штаб размяшчаўся таксама ў вёсцы Бароўка.

181-ая палявая камендатура 201-ай ахоўнай дывізіі тылу групы армій «Цэнтр» (каменданты Хепе, Гірыбер) размяшчалася ў Лепелі. Галоўнымі задачамі ахоўных дывізій былі ахова камунікацый і ваенных аб'ектаў, барацьба з партызанамі, забеспячэнне гаспадарчай дзейнасці вермахта і германскіх фірм. Нямецкія войскі размяшчаліся ў г. Лепель, м. Камень, вёсках Стаі, Стары Лепель, Бароўка, Мацюшына і іншых населеных пунктах. Так, у мястэчку Камень, вёсцы Бароўка размяшчаліся роты 201-га паліцэйскага матарызаванага батальёна. У Бароўцы ў кастрычніку — снежні 1942 г. стаяў дывізіён цяжкіх зенітных гармат групы армій «Цэнтр». У 1943 г. у Лепелі размяшчаліся 3 узмоцненыя пяхотныя палкі, танкавы батальён, 2 артылерыйскія і 1 мінамётная батарэя. Гэта прыкладна 1800—2000 салдат і афіцэраў.

Прыдадзеныя палявым і мясцовым камендатурам групы ГФП (тайная палявая паліцыя) ажыццяўлялі ваенна-паліцэйскую ўладу. У Лепелі размяшчалася ГФП-727, якая дзейнічала пры 201-ай ахоўнай дывізіі. Яны займаліся пытаннямі барацьбы з падполлем, партызанскім рухам, супраць-

дзеяннем насельніцтва акупантам. Ім у дапамогу для аховы парадку на тэрыторыі раёна, разгрузкі каравульнай службы была створана мясцовая паліцыя. Яна дапамагала нямецкім акупацыйным уладам усталёўваць і ўмацоўваць ваенна-паліцэйскі рэжым.

У Лепелі і раёне быў уведзены каменданцкі час. Рух цывільных асоб забараняўся з вечара да ранку без спецыяльных пропускаў. Забаранялася хаваць зброю, радыёпрыёмнікі, фотаапараты. За непадпарадкаванне загадам і распараджэнням нямецкіх улад пагражалася расстрэлам. Была праведзена прымусовая рэгістрацыя насельніцтва. Усё было накіравана на тое, каб запалохаць людзей, зменшыць іх удзел у падпольнай і партызанскай барацьбе.

З гэтай жа мэтай была ўведзена сістэма заложнікаў. У турмах (у г. Лепелі пры жандарскіх участках, паліцэйскіх службах) катавалі і знішчалі савецкіх людзей. Гінулі і вязні лагера смерці, які знаходзіўся ў Лепелі.

Насельніцтва абавязана было выконваць шматлікія работы на ваенных аб'ектах. Тысячы людзей, асабліва моладзь, уганяліся на прымусовыя работы ў Германію. Толькі ў час карнай экспедыцыі «Свята вясны» (сакавік — май 1944 г.) было захоплена 11 тыс. чалавек.

Вялікую ролю ва ўмацаванні «новага парадку» адыгрывала нямецкая прапаганда. У Лепелі выдаваліся газеты «Новый путь» і «Боевой путь». Апошняя была органам брыгады Рускай вызваленчай народнай арміі. У Лепельскай друкарні выдаваліся газета «Голос народа» — орган аргкамітэта Нацыянал-сацыялістычнай працоўнай партыі Расіі і Лепельскага акружнога самакіравання — і часопіс для моладзі «Утро». Акрамя гэтых выданняў сярод насельніцтва раёна распаўсюджвалася газета «Новый путь», якая выдавалася ў Віцебску. Усе перыядычныя выданні, шматлікія лістоўкі, радыёперадачы, гутаркі мелі сваёй мэтай прапагандаваць поспехі нямецкай арміі, паражэнні савецкіх войскаў, пераконваць насельніцтва ў непераможнасці Германіі.

У 1941—1942 гг. на тэрыторыі Лепельшчыны бясчынствавалі айнзатцкаманды 8 і 9 айнзатцгрупы «Б». Яны расстрэльвалі савецкіх актывістаў, камуністаў, камсамольцаў, яўрэяў, палітработнікаў Чырвонай Арміі. Толькі за паўгода імі было знішчана 1500 жыхароў м. Камень, Пышна і іншых населеных пунктаў. Масавыя расстрэлы праходзілі ў Лепелі (каля 1000 чал.), каля Лепеля па дарозе Лепель — Полацк (850 чал.), каля вёскі Чарнаручча (1500 чал.), у вёсках Слабодка, Пунішча, Крыўцы (159 жанчын, старых, дзяцей), на яўрэйскіх могілках (1500 чал., савецкіх ваеннапалонных, мясцовых жыхароў, у тым ліку і яўрэяў). Да канца 1942 г. было знішчана амаль усё яўрэйскае насельніцтва.

Усяго ад рук катаў загінулі 4700 чалавек, у тым ліку 600 жанчын і 550 дзяцей.

Шматлікія ваенна-гаспадарчыя службы рабавалі насельніцтва. Сярод іх аддзяленні Віцебскага абласнога цэнтральнага гандлёвага аб'яднання, прадстаўнікі абласнога сельскагаспадарчага ўпраўлення, гаспадарчыя каманды ВІКА, сельскагаспадарчыя каменданты, ваенна-гаспадарчыя інспекцыі, каманды і групы.

Усе яны следавалі ўстаноўкам генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ, які гаварыў: «Мы прыбылі ў краіну з агульнай дырэктывай кіраваць краінай, выкарыстаць яе эканоміку для вядзення вайны на Усходзе і вывезці з гэтай краіны ўсё прамысловае абсталяванне, якое можна вывезці». І яны вывозілі лес, збожжа, лён, сельскагаспадарчыя прадукты. Большая частка з усяго захопленага ішла на патрэбы вермахта, астатняе — у рэйх. Загатоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі ў значнай меры залежалі ад выкарыстання ўзброенай сілы. Перад уборкай ураджаю па вёсках агітатрады заклікалі здаваць хлеб нямецкім уладам. Арганізоўваліся ўзброеныя атрады немцаў і паліцыі. На аўтамашынах яны прыязджалі на палі і забіралі нават неабмалочаны хлеб, які затым абмалочвалі ў населеных пунктах, якія кантралявалі (Пышна, Камень і інш.). Калі не ўдавалася збожжа вывезці ці абмалаціць, яго спальвалі. Так, 9—10 жніўня 1943 г. быў спалены хлеб каля вёскі Ворань. Каб вывезці збожжа, гітлераўцы намагаліся аднаўляць чыгунку на ўчастку Лепель — Орша. Падчыстую абіралі насельніцтва ў час карных экспедыцый. У справаздачы аб карнай экспедыцыі «Котбус» (май — чэрвень 1943 г.) адзначалася, што ў на-

сельніцтва было захоплена 6 тыс. галоў жывёлы, 684 т зерня, 24 т бульбы. А такіх карных экспедыцый пракацілася па Лепельшчыне 5. І ўсе яны ўносілі чалавечыя жыцці, маёмасць.

Спустошаны край пакінулі пасля сябе гітлераўцы. Знішчылі 47 вёсак. Тры з іх — Пастрэжжа, Слабодка, Кісцялёва — разам з жыхарамі. Іншыя з часткай жыхароў. Усё гэта было...

Р. А. Чарнаглазава

Дакументы сведчаць

(Загады, пастановы, распараджэнні нямецкіх акупацыйных улад)

З адміністрацыйнага распараджэння № 1 камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» генерала пяхоты фон Шэнкендорфа

07.07.1941

I. Аб прызначэнні бургамістраў у валасцях

1. На пасады бургамістраў у першую чаргу павінны быць прызначаны палітычна надзейныя і кваліфікаваныя асобы, па магчымасці з ліку беларусаў.

2. Бургамістр з'яўляецца прадстаўніком воласці.

3. Ён з'яўляецца службовым начальнікам над усімі асобамі, якія працавалі ў воласці. Ён прымае іх і звальняе з працы.

4. Бургамістр нясе адказнасць за фінансавыя справы воласці.

5. Усе жыхары, якія пражываюць у воласці, паводле становішча на 21.06.1941 г., павінны быць нанава ўлічаны і перапісаны бургамістрам.

6. Бургамістры неадкладна павінны паклапаціцца аб тым, каб усе жыхары былі забяспечаны адпаведнымі дакументамі, якія засведчваюць іх асобу: прозвішча і імя, час і месца нараджэння, месца жыхарства, склад сям'і, прафесія, род заняткаў, сацыяльнае паходжанне, веравызнанне, нацыянальнасць, падданства.

7. Бургамістры прыцягваюць да адказнасці вінаватых за ўчыненыя акты сабатажу ў даверанай ім воласці. Яны павінны ўсімі сродкамі прадухіляць акты сабатажу. У іх абавязкі ўваходзіць ахова прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі воласці, асабліва жыццёва важных.

8. Бургамістраў і іх намеснікаў у населеных пунктах, якія налічваюць да 20 000 жыхароў, прызначае мясцовы камендант, а ў населеных пунктах, у якіх звыш 20 000 жыхароў, прызначае камендант палявой камендатуры.

II. Аб забароне пакідання кватэр у начны час

1. У перыяд з 21.00 да 5.00 раніцы насельніцтву забараняецца пакідаць кватэры.

2. Выключэнні дапускаюцца па пісьмовым дазволе мясцовага каменданта для асоб, якія працуюць у начны час на жыццёва важных прадпрыемствах, дактарамі, акушэркамі, на машынах хуткай дапамогі.

3. Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам наказвацца мясцовымі камендантамі. Як дапаможнымі мерамі пакарання могуць быць часовы арышт з абмежаваным харчаваннем, насільнае затрыманне і прыцягненне да працы.

III. Адметныя знакі для яўрэяў і яўрэек

1. Усе яўрэі і яўрэйкі, якія знаходзяцца на занятай рускай тэрыторыі і дасягнуўшыя 10-гадовага ўзросту, неадкладна абавязаны насіць на правым рукаве верхняга адзення і сукенкі белую паласу шырынёй да 10 см з намаляванай на ёй сіянісцкай зоркай або жоўтую павязку шырынёй да 10 см.

2. Такімі павязкамі забяспечваюць сябе самі яўрэі і яўрэйкі.

3. Яўрэяў катэгарычна забараняецца вітаць.

Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам карацца мясцовым камендантам па месцы жыхарства.

VI. Стварэнне дапаможнай паліцыі

1. Для правядзення паліцэйскіх мер бяспекі бургамістрам даручана прыцягнуць у дапаможную паліцыю надзейных «фольксдойчэ» беларусаў, і калі такіх няма, тады палякаў, і выкарыстоўваць гэту паліцыю са згоды з начальнікамі каманд паліцыі бяспекі.

2. Служачыя дапаможнай паліцыі, якія працуюць у цесным кантакце з мясцовымі айнзатцкамандамі паліцыі бяспекі і СД, могуць падтрымліваць сувязь толькі з мясцовымі начальнікамі паліцыі бяспекі і СД або прызначанымі імі органамі.

3. Служачыя дапаможнай паліцыі носяць белую нарукаўную павязку з надпісам «Дапаможная паліцыя».

4. Мясцовыя камендатуры да 20-га чысла кожнага месяца, а ўпершыню да 20.07.1941 года, паведамляюць пра колькасць і ўзбраенні дапаможнай паліцыі.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1, 2, 4–5.

Падрыхтаваў У. І. Лемяшонак

Пастанова Лепельскай Гарадской управы

г. Лепель

10 мая 1943 г.

В целях урегулирования вопроса по части пастьбы скота и сбережения посевов, Городская управа постановляет:

1. Для пастьбы скота, имеющегося у гр-н г. Лепеля, на 1943 г. отвести пастбища в урочищах «Кладки», «Ровнянках» и «Таборище».

2. Гр-не, которые взялись пасти скот, должны представить списки всех гр-н, у которых ими принят скот для пастьбы.

3. Установить оплату за пастьбу скота в гор. Лепеле за каждую корову 10 фунтов ржи и два литра молока в месяц, за каждую козу и прочий мелкий скот 50 рублей в месяц.

4. За всякие произведенные потравы полевых земельных участков ответственность несут гр-не, пасущие скот, и при поступлении заявлений в Гор. управу о потраве последние будут подвергнуты штрафу до 1000 рублей с возмещением произведенных потрав.

5. Категорически воспрещается выпускать скот без надзора на улицу. При обнаружении скота, бродящего по садикам, скверам и улицам, а также по обсемененным огородам, хозяева будут подвергнуты штрафу до 800 руб., а при повторном обнаружении бродячего скота таковой будет передан с/х комендатуре.

6. Прогон скота по тротуарам строго воспрещается.

Газета «Новый путь», Лепель, 27 мая 1943 г.*

Падрыхтавала Р. А. Чарнаглазава

З распараджэння камандуючага аб працоўным абавязку і прызначэнні працоўных на работу ў вобласці ваенных аперацый вызваленых усходніх абласцей. 1943 г.

Распоряжение германского правительства о трудовой повинности и распределении рабочей силы служит для охвата и планомерного распределения всех хозяйственных ресурсов и возможностей при восстановлении под Германским руководством Европы. Эти распоряжения касаются не только территории самой Германии, союзных и дружественных с нею и ею оккупированных держав, но и частей освобожденных Восточных областей, уже включенных в европейское хозяйство.

Поэтому постановляется:

Отдел I

Трудовая повинность

№ 1

Все жители области военных операций в возрасте от 14 до 65 лет подлежат в зависимости от их трудоспособности всеобщей трудовой повинности, они обязаны по призыву явиться для регистрации на Биржу труда или в назначенные для этой цели учреждения.

* Газета выдавалася фашысцкімі акупацыйнымі ўладамі ў Лепелі з 1943 г.

Загад № 58
па Лепельскім гарадскім самакіраванні

г. Лепель

14 жніўня 1943 г.

Подушным налогом облагается все население города в возрасте от 15 до 65 лет.

Однако до настоящего времени многие граждане не сделали ни одного взноса в счет налога, несмотря на то, что прошли уже три срока уплаты.

Поэтому приказываю:

1. Следить, чтобы подушный налог уплачивался точно в указанные сроки.
2. Еще раз сообщается, что от подушного налога освобождаются только работники ОД, полиции и их семьи, состоящие на их иждивении.
3. На неплательщиков своевременно налога будут налагаться административные взыскания.

Бургомистр гор. Лепеля А. Жуйко
Газета «Новый путь», Лепель, 19 жніўня 1943 г.

Падрыхтавала Р. А. Чарнаглазава

Хроніка гарадскога самакіравання

...Городское самоуправление извещает население Лепеля, что с 15 июня началась проверка паспортов. Все жители города, имеющие паспорта, должны пройти проверку согласно объявлению.

За невыполнение в срок указанного постановления будет налагаться штраф в размере 100 рублей.

...На бирже труда производится запись желающих ехать на работу в Германию. Все справки о записи получать там же.

Все жители Лепеля в возрасте от 14 до 16 лет должны озаботиться получением паспортов. Срок получения — до 30 июня. При явке в паспортный отдел необходимо иметь на руках документ о возрасте.

Газета «Новый путь», Лепель, 17 чэрвеня 1943 г.

Падрыхтавала Р. А. Чарнаглазава

Зверствы фашыстаў

Дакументы сведчаць

Акт аб злачынствах нямецка-фашысцкіх акупантаў і іх памагатых па г. Лепель і Лепельскаму раёну

Копия

1) За время оккупации Лепельского района с июля 1941 г. по 28 июня 1944 г. немецко-фашистские варвары по приказу немецкого командования систематически производили истребление советских граждан, расстреливая, вешая ни в чем не повинных мужчин, женщин и детей. По району истреблено свыше 4700 человек, в том числе 600 женщин и 550 детей.

2) Комиссией обнаружены места массовых расстрелов:

а) В гор. Лепеле между улицами Советской и Карла Маркса на расположении «Динамо» расстреляно и похоронено около 1000 советских граждан. На место расстрела приводили по 15—20 человек, убивали их и, раздев донага, зарывали в заранее приготовленных ямах и рвах.

б) За г. Лепель по правой стороне дороги, идущей из г. Лепеля на гор. Полоцк, метрах в пяти от дороги обнаружено четыре ямы длиной по 10 метров, шириной по 4 метра и глубиной до 9 метров.

Комиссией установлено, что в каждой яме похоронено более 100 человек, кроме того, обнаружена яма, где зарыто более 450 советских граждан.

При вскрытии ям обнаружено, что производились расстрелы полуголых граж-

дан, которые иссечены пулями. Личностей установить не удалось из-за сильного разложения.

Чтобы скрыть от населения следы своих преступлений, фашистские палачи на места расстрела привозили граждан в закрытых машинах, в большинстве случаев вечером и ночью.

в) На еврейском кладбище гор. Лепель по Витебскому шоссе расстреляно около 1000 человек. Здесь убивали пленных партизан, городских жителей и жителей района. Среди убитых обнаружены дети.

На окраине кладбища обнаружено 18 могил, в которых зарыто по 10 — 12 человек, умерших от истязания. Около братской могилы Героев Октября обнаружены три могилы по 10 человек, также умерших от пыток.

Всего на этом участке похоронено около 1500 советских граждан.

г) В январе 1942 года в деревнях Лепельского района Слободка, Пунище и Кривцы немецкие варвары расстреляли и зверски замучили 159 человек, причем стариков, женщин и детей сожгли в домах живыми.

д) Около дер. Черноручье в лесу в феврале 1942 г. расстреляно около 1000 чел. еврейского населения, причем женщин и детей бросали живых в ямы. В ямах для силосования кормов зарыто свыше 500 человек. Таким образом, около дер. Черноручье расстреляно 1500 человек советских граждан.

е) 16 сентября 1941 г. немецко-фашистские бандиты произвели массовые расстрелы жителей д. Камень. Расстреляно и заживо похоронено около кладбища Борки 158 человек.

ж) За период оккупации немцы угнали в рабство в Германию граждан Лепельского района 555 человек.

п. п. Председатель комиссии (Панов)
(Волков)
(Киселев)

Ч л е н ы: (Атрашкевич)
(Устинов)
(Сальников)

С подлинным верно:

Ст. оперуполномоченный
Лепельского ГО НКГБ
к а п и т а н (Пантюшенко)

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 2088. Воп. 2. Спр. 3. Л. 178, 179, 188.

Паказанні сведак аб зверствах фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Лепеля

В 1941 году, когда немцы ворвались в гор. Лепель, они с первых же дней своего хозяйничания начали кровавую расправу с советскими гражданами. Для этого они превратили бывший сад «Динамо» в место массовых расстрелов.

Мне пришлось быть невольной свидетельницей почти ежедневных расстрелов. Живя в непосредственной близости от сада «Динамо», я почти каждое утро видела, как в саду «Динамо», на расстоянии около ста метров от моей квартиры, арестованные под конвоем рыли могилы. Примерно в 2 — 3 часа дня выводили из тюрьмы людей группами от 5 до 20 человек каждый раз, загоняли ударами палок в могилу и там расстреливали. Однажды вели на расстрел среди других седого старика со старухой. Они оба были слепые и шли, держась за руки, еще не сознавая, куда их ведут, но когда подошли к могиле, они начали просить пощадить им жизнь, но немцы были неумолимы, они сбросили стариков в могилу и под сатанинский хохот собравшихся со всех концов немцев убили их, а также остальных, после этого притащили откуда-то дохлых собаку и кошку и также бросили их в эту могилу. После этой «работы» они ушли с песнями и шутками.

Зимой приводили на расстрел людей совершенно босыми и полуголыми. Я видела, как в январе 1942 года вели шестерых молодых людей. Они были босиком, в нижних рубахах, причем у четверых на спине рубахи были красные от крови, руки связаны назад. Их положили на снег лицом книзу и в таком положении расстреляли.

Когда палачи ушли, прибежали другие немцы и долго издевались над трупами, стащили с них брюки, кололи штыками и хохотали.

Часто расстрелы производились ночью.

Всего в саду «Динамо» за год расстреляно около 1000 чел.

Свидетельница М.В. Нарушевич

Акт аб злачынствах нямецка-фашысцкіх акупантаў і іх памагатых па вёсках Слабодка, Пунішчы, Крыўцы

17 ліпеня 1944 г.

Камісія па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх акупантаў і іх судзельнікаў у саставе: старшыня камісіі Армонік і члены: Яско, Чэклін, Грак, Ладзік, Бакштаеў і Сычэнка, якія былі на месцы ўчыненых зверстваў нямецкімі акупантамі ў вёсках Слабодка, Пунішчы, Крыўцы, устанавіла, што ў студзені 1942 года нямецкія варвары зрабілі ў гэтых вёсках тэрарыстычныя справы, а менавіта: расстралялі і па-зверску закатавалі ў вёсцы Слабодка 132 чалавекі, у в. Пунішчы — 19, у вёсцы Крыўцы — 8 чалавек. Расстрэлы і катаванні грамадзян гэтых вёсак рабіліся нямецкай жандармерыяй і Лепельскай паліцыяй. Расстрэлы гэтых грамадзян немцы матывавалі забойствам двух немцаў у гэтай вёсцы партызанамі. Вёскі спалілі, дарослых расстралялі, жанчын, старых і дзяцей кідалі ў агонь жывымі.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 2088. Спр. 3. Л. 183.

Падрыхтавала А. Трусава

А К Т

25 июля 1944 г.

Мы, комиссия по установлению и расследованию злодеяний, причиненных немецко-фашистскими оккупантами и их сообщниками в Лепельском районе, в составе председателя комиссии — заместителя председателя райисполкома Армоника О. и членов: от Лепельского РК КП(б)Б Яско К., от Лепельского РК ВЛКСМ Ладика М., от Лепельского ГО НКВД Грака И., от нарсуда Лепельского района Чеклина Н., от райздрава врачей: тт. Бакштаева и Сыченко, сего дня выбыли на место, где производились расстрелы мирных советских граждан, и установили: на еврейском кладбище гор. Лепель, Витебское шоссе, расстреляно около 1000 человек городских жителей и жителей района, среди которых было некоторое количество детей. Количество могил установить трудно, ввиду того что могилы заравнивались наравне с землей и заросли травой. Около русского кладбища гор. Лепель одна еще полностью не заполненная яма, в которую зарыто 10 человек советских граждан. Очевидец этого расстрела тов. Скопинцев рассказывает: «Привели их полицейские полуголых, измученных, руки связаны проволокой, раздели догола и выстрелами в спину и в затылок расстреляли. Я узнал знакомого и только хотел подойти посмотреть, как эти палачи — полицейские стали стрелять по мне». На окраине этого кладбища обнаружено 18 могил, в которых похоронено по 10—20 человек в каждой. Это советские граждане, умершие, не вынеся фашистских издевательств, умершие бойцы Красной Армии, попавшие в плен, которых палачи замучили. Около братской могилы Героев Октября обнаружено три могилы, в которых вложено по 10 человек в каждую, также советские граждане не вынесли фашистских пыток и издевательств. Всех этих мучеников — советских граждан палачи зарывали голыми. Всего на этом участке (русское и еврейское кладбища) похоронено около 1500 человек советских граждан, расстрелянных и замученных немецко-фашистскими палачами и их сообщниками.

Председатель комиссии: (Подпись)

Члены (Подпись)

Копия верна: Ст. оперуполномоченный Лепельского РО МГБ
Ст. лейтенант г/б (Акатьев)

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл. Ф. 2088. Воп. 2. Спр. 3. Л. 185.

Найбольш крупныя нацысцкія лагеры смерці на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг.

1. Лепель Віцебскай вобл.
Колькасць знішчаных савецкіх грамадзян 1 тыс. чалавек.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 391. Воп. 1. Спр. 56. Л. 43; Ф. 845. Воп. 1. Спр. 57. Л. 23—26.

Падрыхтавала В. Я. Ланікіна

Абагульненыя звесткі аб ахвярах нямецка-фашысцкіх злачынстваў па Лепельскаму раёну

Наименование с/совета	Расстреляно			Сожжено			Угнано в немецкое рабство		Всего расстреляно, повешено, сожжено и угнано в немецкое рабство	Примечание, графа № 18
	Всего	В том числе		Всего	В том числе					
		Женщин	Детей		Женщин	Детей	Мужчин	Женщин		
Замошский	44	10	9	1			22	4	71	
Волосовский	62	4	1				61	9	132	
Вороньский	22	6	1	8	4		155	7	192	
Свядский	8						40	23	71	
Лепельский	48	21	3				16	11	75	1902
Полянский	28	12	3				16	12	56	
Каменский	232	96	47				80	36	348	
Стайский	31	8	3				96	3	130	
Затеклясский	63	8	1				40	31	134	
г. Лепель	514	200	152				30	21	565	1986
Прудокский	37	14	8				6		43	
Несенский	37	15	1				8	2	47	
Пышнянский										159
Ляховичский	47	10	3				57	7	111	
Сушанский										
Итого:	1173	404	232	9	4		627	166	1975	4047

Председатель комиссии (Атрашкевич)
Члены 1 (Поцей)
2 (Устинов)
3 (Каржыцкий)

Примечание: В графу № 18 включены 4047 чел. (четыре тысячи сорок семь чел.), расстрелянных и замученных по району, на которых не установлены фамилии и инициалы. Всего по району замучено, расстреляно, повешено и сожжено 5229 чел. (пять тысяч двести двадцать девять чел.).

Всего: 1) Убито, замуч. мирн. гражд. 5229 чел.
2) Угнано в немецкое рабство 793 чел.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. Воп. 84. Л. 2.

ЗНІШЧАНЫЯ НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ ЛЕПЕЛЬСКАГА РАЁНА

Назва населеных пунктаў	Колькасць да вайны		Колькасць знішчаных		Дата
	дваро ў	насельніцтва	дваро ў	насельніцтва	
а) населеныя пункты, знішчаныя разам з жыхарамі ў час фашысцкай акупацыі Беларусі і не адноўленыя пасля Айчыннай вайны					
1. в. Кісцялёва	12	47	12	26	чэрвень 1942 г.
б) населеныя пункты, знішчаныя разам з жыхарамі ў час фашысцкай акупацыі Беларусі і адноўленыя пасля Вялікай Айчыннай вайны					
1. в. Пастрэжжа	21	104	21	60	ліпень 1943 г.
2. в. Слабодка	28	139	28	127	студзень 1943 г.
в) населеныя пункты, знішчаныя з часткаю насельніцтва ў час фашысцкай акупацыі ў Беларусі і не адноўленыя пасля Айчыннай вайны					
1. в. Белая Куна	9	28	9	6	чэрвень 1943 г.
2. в. Калінец	8	48	8	2	чэрвень 1943 г.
3. в. Чырвоная Горка	5	33	5	1	чэрвень 1943 г.
4. в. Пясковаткі	5	29	5	—	чэрвень 1943 г.
г) населеныя пункты, знішчаныя з часткаю насельніцтва ў час фашысцкай акупацыі Беларусі і адноўленыя пасля Айчыннай вайны					
1. в. Атокі	31	108	27	3	ліпень 1943 г.
2. в. Будзеўцы	37	148	35	8	студзень 1943 г.
3. в. Ворань	82	410	82	16	ліпень 1942 г.
4. в. Велеўшчына	120	403	120	6	ліпень 1943 г.
5. в. Двор Чаросава	26	90	20	5	жнівень 1943 г.
6. в. Дзяньгубы	29	145	27	6	студзень 1943 г.
7. в. Дамжарыцы	85	340	85	23	ліпень 1943 г.
8. в. Забаенне	22	84	19	9	сакавік — красавік 1943 г.
9. в. Замошша	53	163	38	9	ліпень 1943 г.
10. в. Заазер'е	65	325	63	7	май 1942 г.
11. в. Зароўе	35	124	35	34	сакавік — красавік 1943 г.
12. в. Зацякляссе	46	212	46	2	красавік 1943 г.
13. в. Кабак	35	160	30	1	жнівень 1943 г.
14. в. Каменка	10	53	10	7	сакавік — красавік 1943 г.
15. в. Камень	166	764	138	198	жнівень 1943 г.
16. в. Кветча	42	202	42	7	ліпень 1943 г.
17. в. Крайцы	11	42	11	8	ліпень 1943 г.
18. в. Чырвоны Кастрычнік	20	64	20	7	кастрычнік 1943 г.
19. в. Крыўкі	11	57	11	6	сакавік — красавік 1943 г.
20. в. Крыўцы	14	72	14	8	сакавік — красавік 1943 г.
21. в. Курмялёўка	31	140	26	—	жнівень 1943 г.
22. в. Ладасна	85	352	71	47	жнівень 1943 г.
23. в. Мядзвёдаўка	42	115	42	7	сакавік — красавік 1943 г.
24. в. Навіны	6	31	6	5	сакавік — красавік 1943 г.
25. в. Навасёлкі	14	70	14	15	сакавік — красавік 1943 г.
26. в. Острава	39	121	39	4	ліпень 1943 г.

Працяг табл.

Назва населеных пунктаў	Колькасць да вайны		Колькасць знішчаных		Дата
	двароў	насельніцтва	двароў	насельніцтва	
27. в. Пераходцы	38	152	33	1	ліпень 1943 г.
28. в. Падлобныя	16	90	16	5	студзень 1943 г.
29. в. Пунішча	27	135	27	14	сакавік — красавік 1943 г.
30. в. Пышна	97	486	97	87	сакавік — красавік 1943 г.
31. в. Рожна	35	175	29	6	ліпень 1943 г.
32. в. Савін Дуб	24	125	24	12	сакавік — красавік 1943 г.
33. в. Саўскі Бор	17	56	17	—	ліпень 1943 г.
34. в. Стайск	52	128	52	9	ліпень 1943 г.
35. в. Ствольна	18	72	16	—	ліпень 1943 г.
36. в. Сукнеўшчына	14	65	14	1	ліпень 1943 г.
37. в. Цярэшкі	24	82	24	1	ліпень 1943 г.
38. в. Хвашчова	26	95	23	1	ліпень 1943 г.
39. в. Чарніца	27	85	24	10	ліпень 1944 г.
40. в. Шалафаны	36	168	32	16	жнівень 1943 г.

Нацистская политика геноцида и выжженной земли в Белоруссии 1941—1944. Мн.: Беларусь, 1984.

Трагедыя вёскі Слабодка

На ўскрайку вёскі стаіць помнік — маўклівы сведка крывавай расправы над мірнымі яе жыхарамі. На мармуровым абеліску высечаны словы: «Вечная памяць жыхарам вёскі Слабодка, па-зверску забітым нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 19 студзеня 1943 года».

І хоць лінія фронту праходзіла дзесьці на ўсходзе, далёка адсюль, але і тут таксама ішла вайна: грымелі выбухі, жорсткія баі з гітлераўцамі вялі партызаны. Немцы не маглі гаспадарыць у вёсцы. Пышняншчына ў большасці кантралявалася партызанамі, а ў Слабодцы амаль заўсёды знаходзіўся партызанскі пост. Калі і заглядвалі сюды фашысты, то з вялікай аховай з салдат і паліцаяў. Такое становішча, вядома, не магло быць па душы акупантам. І яны вырашылі сцерці з твару зямлі вёску, а жыхароў яе расстраляць.

...Сем гадзін раніцы. Мароз градусаў пад трыццаць. У маўклівай цішыні стаяць дрэвы, хаты.

З успамінаў былога жыхара вёскі Слабодка Мікалая Сямёнавіча Урбана:

Яшчэ было цёмна, як раптам пачуліся стрэлы, крыкі людзей. Стралялі адразу ў некалькіх месцах вёскі. Гэта здарылася так нечакана, што мы спачатку разгубіліся. Праз некалькі хвілін маці захацела паглядзець, у чым справа, і выбегла на ганак.

Яе адразу застрэлілі. Праз выбітую шыбу акна ў хату кінулі некалькі гранат. На некаторы час я страціў прытомнасць. Апрытомнеў, калі ў хаце ўжо было поўна дыму. Вельмі балела нага, і зусім не бачыў левым вокам. Але разважаць не было калі. Перамагаючы востры боль у нагах, выпаўз на ганак. Там ляжала забітая маці, але ў мяне ўжо не было сілы сцягнуць яе на зямлю. Я дапоўз да штабеля дроў і схаваўся за ім. Нямногія жыхары вёскі засталіся жывымі. Гэта Павел Івашкевіч. Ён схаваўся з 6—8-гадовай дачкой пад печчу. Жонка Івашкевіча засталася побач з хворай маці. Гітлераўцы расстралялі іх абедзвюх, а потым стралялі пад печ, паранілі дзяўчынку, але тая нават не заплакала. Яна ведала,

што трэба маўчаць, бо заб'юць і яе, і тату. Калі забойцы пакінулі хату, П. Івашкевіч з дачкой пабег у лес...

Засталіся жывымі Яўгенія Саламаха і Соф'я Шарай, Анатолій і Леанід Хрышчанкі. Астатнія 146 чалавек загінулі. Іх расстралялі па аднаму і групамі. Маленькіх дзяцей на вачах маці кідалі ў агонь. Былому старшыні калгаса Івану Саламаху каты адрэзалі пілой галаву...

Калі вечарам на месца, дзе стаяла вёска, прыйшлі партызаны, дым ужо крыху развеяўся. Снег быў чырвонага колеру. Дзе стаялі хаты — датлявалі апошнія галавешкі. Забойцы не пакінулі ніводнай хаты...

Увосень 1968 г. у Гомелі ішоў судовы працэс. На лаўцы падсудных 13 чалавек, былых паліцэйскіх, што ўдзельнічалі ў крывавых расправах не толькі над жыхарамі вёскі Слабодка. Кожны з іх атрымаў па заслугах.

М. Крывец

З гісторыі партызанскай лістоўкі «Отомсти фашистам!»

Немцы, узнав, что основные силы бригады ушли на Чашники, пробовали наступать на партизанский гарнизон в Пышно, были разбиты и в отместку устроили карательную экспедицию в деревнях Пунище и Слободка, расположенных невдалеке от Пышно. Окружили деревни, сожгли дома. С жителями расправились зверски.

В тот же день вечером меня вызвал Лобанок:

— Завтра поедете с Гутиевым в Слободку. Что можно, зарисуете и сфотографируете. Есть приказ из-за фронта: фиксировать зверства фашистов. Нужно выпустить листовки на фактическом материале и как можно быстрее их распространить. Езжайте с утра, охрану возьмете в Пышно.

...Дымились догорающие дома Слободки.

Тронулись потихоньку, объехав по дороге убитую лошадь. А дальше, в деревне, картины ужаса пошли сменяться одна страшнее другой. Среди дороги лежала женщина с грудным ребенком, проколотым вместе с матерью штыком. Рядом валялась разорванная красная губная гармошка. Неужели кто-то из карателей играл на этом пожарище? Невдалеке двое, старик и мальчик, зарывшиеся лицами в снег, оба сильно обгоревшие; видно, выбежали из горящего дома и были убиты. Фашисты запирали жителей в домах и поджигали избы, кто выбегал — расстреливали. У столбика сгоревшей изгороди — обнаженный труп парня, весь черно-синий от ожогов. Прошли еще немного и увидели возле сарая обезглавленные трупы стариков. Каратели заставляли стариков ложиться и рубили им головы топором на березовом бревне. Запах гари, траурные хлопья сажи, носившиеся в воздухе и оседавшие на снег, усиливали жуткое зрелище.

Преодолев оцепенение, начал торопли-

Плакат партызанскага мастака М. І. Абрыньбы «Новы парадак»

во делать наброски, альбом быстро заполнялся рисунками и описаниями зверств...

Ночью срочно делали с Колей рисунки для листовок. К утру эскизы были готовы, и за день мы приготовили сотню листовок «Отомсти фашистам!».

М. І. Абрыньба

Лепельская Хатынь

Гэту вёску калісьці зялёнай падковай агінаў векавы лес. Злева ён пераходзіў у славутую Саснягоўскую пушчу. Жыхарам Кісцялёва жылося ўтульна і хораша ў любую пару года. Двары і вуліцы аздабляў не толькі лес, але і дэкаратыўныя ліпы і клёны. Пышна цвілі яблыні, грушы, слівы. Веснавыя канцэрты наладжвалі салаўі, жаўрукі, шпакі.

Так было да вайны. А калі з'явіліся фашысты, вёска ашчацінілася супраць іх злосцю і нянавісцю. Менавіта тут, у Саснягоўскай пушчы, зарадзілася ядро партызанскага руху на Лепельшчыне, касцяком якога сталі мясцовыя камуністы і камсамольцы. Па закліку падпольнага райкама партыі сюды збіраліся з навакольных вёсак патрыёты. Кісцялёўцы дзяліліся з партызанамі не толькі хлебам, бульбай, але сваімі думкамі і спадзяваннямі, паведамлялі звесткі аб ворагу.

Гэтага ім не маглі дараваць акупанты. 10 чэрвеня, раніцай, у вёсцы нечакана з'явіўся атрад фашысцкіх карнікаў і іх памагатыя — паліцаі. Усіх жыхароў сабралі і пагналі ў вёску Косцінка. А карнікі, якія засталіся ў вёсцы, пачалі марадзёрнічаць. Яны заходзілі ў пустыя сядзібы і выграбалі адтуль усё, што маглі. Потым вёску падпалілі. Гарэлі хаты, пуні, кладоўкі, агонь знішчаў яшчэ неадцвіўшыя сады і кустоўе.

А фашысцкія халуі-паліцаі тым часам капалі вялікую яму-магілу для кісцялёўцаў. Калі «работа» была закончана, сюды прыгналі жыхароў вёскі. Заплаканымі вачыма з пачарнелых твараў жанчыны, дзеці, старыя апошні раз глядзелі, як у бушуючым агні знікае іх вёска, нажыты гадамі скарб. Адчуванне пакут і блізкай смерці, мабыць, не перадалося толькі дзевяці малалеткам, якія не разумелі таго, што адбываецца, і моцна прыціскаліся да матчыных грудзей і рук.

Смяротную пагрозу сваім блізкім усім нутром адчула бабуля Наталля, якая прыйшла ў Кісцялёва да дачкі і заначавала тут. Яна паказала карнікам дакумент, што з'яўляецца жыхаркай вёскі Халімонава. Тыя выштурхнулі яе з натоўпу разам з дачкой і ўнукамі. Не азіраючыся, яны пабеглі ў бок лесу і такім чынам выратаваліся.

А ў Кісцялёва каты чынілі жудасную расправу. Яны падводзілі па два-тры чалавекі да ямы і расстрэльвалі іх ва ўпор. Аўтаматныя чэргі прарэзвалі грудзі дзяцей, сівых дзядуляў і бабуль. У смяротнай агоніі яны курчыліся, абліваючыся крывёю, і падалі на дно ямы. Асаблівым вар'яцтвам вызначаўся мясцовы паліцай Лаўрэн. Калі на ўскрай ямы падвялі стрыечную сястру з дзецьмі, не злітаваўся над імі, яго не расчуліла ні заклінанне, ні маленне сястры, ні тое, нарэшце, што, просячы захаваць жыццё дзецям, яна ў тупым адчаі кінулася цалаваць яму ногі. Звер-кат ботамі скінуў асуджаных у яму і расстраляў.

75-гадовага Свірыда Шнітко расстрэльвалі апошнім. Ён быў чарговым старастам гінуўшай вёскі. Ворагі сказалі Свірыду, што ён ужо стары і яму даруецца жыццё. Акінуўшы сумным позіркам дагараючую вёску, аддаўшы нізкі паклон небу, сонцу і роднай старонцы, Свірыд спакойна кінуў:

— Н-е-е! Вы знішчылі ўсё, чым я жыў і дыхаў. Забілі маіх суседзяў, сваякоў, дзяцей, унукаў. Я з імі жыў і радаваўся на гэтым свеце, разам з імі пайду і на той. Хутчэй страляйце ў мяне, гады!

Раздалася доўгая аўтаматная чарга. Нерухомае цела Свірыда спаўзло ў магілу і распласталася, прыкрываючы зверху сваіх аднавяскоўцаў.

...Няма больш вёскі Кісцялёва. Яна не адрадзілася і пасля вайны. На яе месцы ўзвышаецца помнік-мемарыял з мармуровай плітой, на якой высечаны імёны загінуўшых жыхароў.

А абгарэлыя ў вайну ліпы і клёны ўстаялі. Яны растуць і цяпер ля былых асмаленых сядзіб.

Я. Стамінок

А. Вярцінскі

БАЛАДА ПРА СПАЛЕНУЮ ВЁСКУ І ЖЫВОГА ПЕЎНЯ

Гэта была не проста вайна.
Гэта было нешта больш страшнае, больш дзікае.
Помню, міма маёй роднай вёскі ішлі карнікі —
маю вёску яны абышлі.
А праз нейкі час мы пачулі страляніну, убачылі
дым — чорныя клубы дыму.
Назаўтра мы даведаліся, што спалена вёска
Кісцялёва (вы знойдзеце гэтую назву на могілках вёсак у Хатыні), а жыхары яе забіты,
ад старога да малога.
І яшчэ мы пачулі жахлівы расказ пра тое,
як некалькі дзён «дыхала» магіла, куды
карнікі скідалі кісцялёўцаў, як крычаў
на вогнішчах здзічэлы певень.
...І толькі апоўначы,
прарэзліва, з усіх сваіх сіл,
свой векавы абавязак помнячы,
певень запеў, загаласіў.
Запеў і здзівіўся ён, напэўна:
«Чаму не спяваюць іншыя пеўні?»
А потым крычаў і двойчы, і тройчы,
на золаку вёску будзіць пачаў.
Крычаў, на абпаленым плоце стоячы,
крыламі лопаў і крычаў.
Ён вёску будзіў,
крычаў да хрыпу.
Будзіў у каторы ўжо раз.
А вёска маўчала — ні рыпу, ні скрыпу,
ні груку, ні гуку ў адказ.
Ён вёску будзіў, галасіў адчайна,
пакуль не здзічэў, пакуль не знямеў.
А вёска маўчала, вёска маўчала.
Яна ўжо не чула той ранішні спеў...
Быў дзень вызвалення,
Дзень Перамогі вячыстай.
Вярталіся людзі да мірных спраў і сноў.
І пеўні — нястомныя фанфарысты —
мірныя дні абвяшчалі зноў.
Будзяць яны на досвітку сёлы,
І ў сёлах пачынаецца рух.
Яны, жывыя сёлы — не соні,
спяшаюцца рана на ніву і луг.
З пеўнямі сёлы прачынаюцца...
Толькі нічым не разбудзіш яе —
вёску,
дзе ранак інакш пачынаецца,
вёску,
дзе певень больш не пяе.

З успамінаў аб Лепельскім гета Р. С. Фішкінай

Создание гетто еще более ухудшило жизнь еврейского населения. Всех евреев выгоняли из собственных домов. На это было дано всего 2 часа. Гетто было организовано в квартале города между улицами Ленинской и Володарской и Банным переулком. Дома все были без дверей, не было в них пола. В один дом сгоняли по несколько семей, до 30—40 человек. Не хватало места, чтобы разместиться на полу. В домах не разрешалось зажигать свет, запрещалось ходить за водой к колодцу или на речку, воду приказали топить из снега. Каждый день строем водили на работу с песней из двух слов: «Иуде капут».

Тяжело вспоминать издевательства фашистов. Голодные, полураздетые, при 25-градусном морозе, узники шли и пели. Евреи пилили дрова, чистили уборные руками без лопат и вил, возили на себе параши, впрягаясь по 3—4 человека в повозку. Винтовкой и плеткой их погонял немец или кучер, бил, как лошадей, палкой. Хорошую одежду отнимали предатели. Во время выполнения работ немец или предатель бил палкой каждого по чем попало. Вечерами или по ночам фашисты с криком врывались в квартиры, избивали, насиловали женщин, забирали все, что было. И говорили при этом: «Отдавайте, «иуды», все, что есть у вас, вам оно не нужно, вас на днях расстреляют». Каждый день комендант, бургомистр Неделько, начальник полиции Войтехович как выкуп с евреев всего города собирали ценности. Сбор поручали еврейскому комитету. За невыполнение грозили расстрелом. Когда уже нечего было собирать, фашисты стали ходить по домам, избивали и требовали дорогие вещи и золото, после чего за невыполнение приказа тут же, на месте, расстреливали.

Русским запрещалось заходить в гетто, разговаривать с евреями. За этим строго следили предатели Сорокин, Войтехович, Мирголовский, Игнатович и др.

28 февраля 1942 года выдалось морозное утро. Стояла мертвая тишина. По улицам города проходила жандармерия с собаками и расставляла посты из немецких солдат и предателей.

В 8 часов утра на Володарской улице появились машины с фашистами с повязками «СС» на рукавах. Машины остановились. Первая подошла к дому на углу

улиц Володарской и Вокзальной. В квартиры врывались предатели, пинками сапог и прикладами винтовок выгоняли всех на улицу. А там их подхватывали эсэсовцы и садили на машины. Поднялся шум: плакали дети, женщины. Раздались выстрелы, за ними автоматные очереди. Все бросились врассыпную, поняв, что фашисты приехали их расстреливать. Бежавших жандармы и полицейские расстреливали на месте, трупы бросали в машины. Так началась кровавая расправа с еврейским населением. Груженые машины охранялись 8—10 вооруженными народниками и полицейскими. Машины двигались по улицам Володарской, Ленинской, М. Горького на юго-западную окраину города. Везли в направлении дер. Черноручье. Здесь были подготовлены небольшие ямы. Около них стояли солдаты. Раздевали всех привезенных догола, бросали в яму, расстреливали из автоматов и пулеметов. Маленьких детей резали ножами, ломали им спины о колено и бросали в яму. Так фашистские варвары расправлялись с еврейским населением.

Трудно описать эту кошмарную трагедию, которую пережила я, но чудом осталась в живых. Мои дочь, мать, отец, братья и сестры погибли. 28 февраля я ушла в лес, была в партизанской бригаде «Чекист», била фашистов, участвовала в 12 боях по разгрому немцев, полицейских.

Сейчас возвратилась в опустошенный фашистами свой родной город, работаю учительницей Лепельской НСШ.

21.09.1944 г.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. Воп. 84. Л. 104.

Мой апошні арышт

З успамінаў А. М. Парфянчук

Прысуджвалася я да смерці тры разы. Але раскажу аб апошнім выпадку. Быў жнівень 1943 г.

Па заданні камандзіра партызанскай разведкі Маркевіча Сяргея Васільевіча я ішла ў горад Лепель з лістоўкамі са зваротам да арміі Камінскага. У лесе, па дарозе да вёскі Казлы, я заўважыла, што хмызняк, нягледзячы на адсутнасць ветру, захістаўся. Хацела схавацца ў гушчары лесу, але было позна. Я пачула загад «Стой!» — і цяжкая рука сціснула мне плячо. Я паспела выкінуць лістоўкі, але гэта заўважыў затрымаўшы мяне паліцай, мясцовы жыхар. Праз некалькі хвілін мяне акружылі карнікі. Паліцай загадаў мне падняць скрутак з лістоўкамі, а калі я нагнулася, то атрымала страшэнны ўдар у спіну і павалілася. Мяне паднялі, загадалі распрануцца дагала і прывязалі да дрэва. У той час у мяне былі доўгія косы, імі прывязалі маю галаву да дрэва так, што я нават не магла зварухнуцца.

Гэтак я прастаяла гадзіны 3—4, пакуль карнікі хадзілі ў вёску Свяда, дзе ўчынілі расправу над жыхарамі.

Я была ўся ў крыві ад пабояў і вельмі пакутавала ад абляпіўшых мяне аваднёў і мух. Але адганяць іх не магла. Калі карнікі вярнуліся, мне дазволілі апрануцца, але рукі пакінулі звязанымі. Павялі ў горад цераз вёскі Юшкі, Чарнаручча, Забаенне.

У Лепель мы прыйшлі, калі ўжо сцямнела. Кінулі мяне ў агульную камеру, дзе не толькі не было дзе прылегчы, але і стаяць было цяжка.

Там я сустрэла знаёмых дзяўчат — членаў падпольнай групы Таню Змітрачонак і Жэню Талюш. Раніцай нас павялі на допыт у жандармерыю, якая знаходзілася ў былым інтэрнаце педагагічнага вучылішча. Пакой, дзе вялі допыт, быў на другім паверсе, а ўнізе гудзелі маторы, каб заглушыць крыкі людзей, якіх катавалі.

Дапытвалі па аднаму, а пакуль што мы ўсе стаялі ў розных канцах калідора з паднятымі рукамі. Першай вызвалі Талюш, яе доўга білі, выцягнулі ў калідор, аблівалі вадой. Затым упіхнулі ў пакой мяне. Я ўбачыла вялікую лужыну крыві і двух немцаў у халатах, таксама ў крыві, з бізунамі ў руках.

За сталом сядзелі два чалавекі — адзін тоўсты, лысы, а другі — худы, маладзейшы, друкаваў на машынцы. Ён спытаў прозвішча, імя, год нараджэння. Затым сталі дапытвацца, хто даў мне лістоўкі. Я адказала, што яны былі ў паліцая, які мяне затрымаў. Мяне сталі збіваць бізуна-

А. Вярцінскі

БАЛАДА ПРА СПАЛЕНУЮ ВЁСКУ І ЖЫВОГА ПЕЎНЯ

Гэта была не проста вайна.
Гэта было нешта больш страшнае, больш дзікае.
Помню, міма маёй роднай вёскі ішлі карнікі —
маю вёску яны абышлі.
А праз нейкі час мы пачулі страляніну, убачылі
дым — чорныя клубы дыму.
Назаўтра мы даведаліся, што спалена вёска
Кісцялёва (вы знойдзеце гэтую назву на могілках вёсак у Хатыні), а жыхары яе забіты,
ад старога да малога.
І яшчэ мы пачулі жахлівы расказ пра тое,
як некалькі дзён «дыхала» магіла, куды
карнікі скідалі кісцялёўцаў, як крычаў
на вогнішчах здзічэлы певень.
...І толькі апоўначы,
прарэзліва, з усіх сваіх сіл,
свой векавы абавязак помнячы,
певень запеў, загаласіў.
Запеў і здзівіўся ён, напэўна:
«Чаму не спяваюць іншыя пеўні?»
А потым крычаў і двойчы, і тройчы,
на золаку вёску будзіць пачаў.
Крычаў, на абпаленым плоце стоячы,
крыламі лопаў і крычаў.
Ён вёску будзіў,
крычаў да хрыпу.
Будзіў у каторы ўжо раз.
А вёска маўчала — ні рыпу, ні скрыпу,
ні груку, ні гуку ў адказ.
Ён вёску будзіў, галасіў адчайна,
пакуль не здзічэў, пакуль не знямеў.
А вёска маўчала, вёска маўчала.
Яна ўжо не чула той ранішні спеў...
Быў дзень вызвалення,
Дзень Перамогі вячыстай.
Вярталіся людзі да мірных спраў і сноў.
І пеўні — нястомныя фанфарысты —
мірныя дні абвяшчалі зноў.
Будзяць яны на досвітку сёлы,
І ў сёлах пачынаецца рух.
Яны, жывыя сёлы — не соні,
спяшаюцца рана на ніву і луг.
З пеўнямі сёлы прачынаюцца...
Толькі нічым не разбудзіш яе —
вёску,
дзе ранак інакш пачынаецца,
вёску,
дзе певень больш не пяе.

З успамінаў аб Лепельскім гета Р. С. Фішкінай

Создание гетто еще более ухудшило жизнь еврейского населения. Всех евреев выгоняли из собственных домов. На это было дано всего 2 часа. Гетто было организовано в квартале города между улицами Ленинской и Володарской и Банным переулком. Дома все были без дверей, не было в них пола. В один дом сгоняли по несколько семей, до 30—40 человек. Не хватало места, чтобы разместиться на полу. В домах не разрешалось зажигать свет, запрещалось ходить за водой к колодцу или на речку, воду приказали топить из снега. Каждый день строем водили на работу с песней из двух слов: «Иуде капут».

Тяжело вспоминать издевательства фашистов. Голодные, полураздетые, при 25-градусном морозе, узники шли и пели. Евреи пилили дрова, чистили уборные руками без лопат и вил, возили на себе параши, впрягаясь по 3—4 человека в повозку. Винтовкой и плеткой их погонял немец или кучер, бил, как лошадей, палкой. Хорошую одежду отнимали предатели. Во время выполнения работ немец или предатель бил палкой каждого по чем попало. Вечерами или по ночам фашисты с криком врывались в квартиры, избивали, насиловали женщин, забирали все, что было. И говорили при этом: «Отдавайте, «иуды», все, что есть у вас, вам оно не нужно, вас на днях расстреляют». Каждый день комендант, бургомистр Неделько, начальник полиции Войтехович как выкуп с евреев всего города собирали ценности. Сбор поручали еврейскому комитету. За невыполнение грозили расстрелом. Когда уже нечего было собирать, фашисты стали ходить по домам, избивали и требовали дорогие вещи и золото, после чего за невыполнение приказа тут же, на месте, расстреливали.

Русским запрещалось заходить в гетто, разговаривать с евреями. За этим строго следили предатели Сорокин, Войтехович, Мирголовский, Игнатович и др.

28 февраля 1942 года выдалось морозное утро. Стояла мертвая тишина. По улицам города проходила жандармерия с собаками и расставляла посты из немецких солдат и предателей.

В 8 часов утра на Володарской улице появились машины с фашистами с повязками «СС» на рукавах. Машины остановились. Первая подошла к дому на углу

улиц Володарской и Вокзальной. В квартиры врывались предатели, пинками сапог и прикладами винтовок выгоняли всех на улицу. А там их подхватывали эсэсовцы и садили на машины. Поднялся шум: плакали дети, женщины. Раздались выстрелы, за ними автоматные очереди. Все бросились врассыпную, поняв, что фашисты приехали их расстреливать. Бежавших жандармы и полицейские расстреливали на месте, трупы бросали в машины. Так началась кровавая расправа с еврейским населением. Груженые машины охранялись 8—10 вооруженными народниками и полицейскими. Машины двигались по улицам Володарской, Ленинской, М. Горького на юго-западную окраину города. Везли в направлении дер. Черноручье. Здесь были подготовлены небольшие ямы. Около них стояли солдаты. Раздевали всех привезенных догола, бросали в яму, расстреливали из автоматов и пулеметов. Маленьких детей резали ножами, ломали им спины о колено и бросали в яму. Так фашистские варвары расправлялись с еврейским населением.

Трудно описать эту кошмарную трагедию, которую пережила я, но чудом осталась в живых. Мои дочь, мать, отец, братья и сестры погибли. 28 февраля я ушла в лес, была в партизанской бригаде «Чекист», била фашистов, участвовала в 12 боях по разгрому немцев, полицейских.

Сейчас возвратилась в опустошенный фашистами свой родной город, работаю учительницей Лепельской НСШ.

21.09.1944 г.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. Воп. 84. Л. 104.

Мой апошні арышт

З успамінаў А. М. Парфянчук

Прысуджвалася я да смерці тры разы. Але раскажу аб апошнім выпадку. Быў жнівень 1943 г.

Па заданні камандзіра партызанскай разведкі Маркевіча Сяргея Васільевіча я ішла ў горад Лепель з лістоўкамі са зваротам да арміі Камінскага. У лесе, па дарозе да вёскі Казлы, я заўважыла, што хмызняк, нягледзячы на адсутнасць ветру, захістаўся. Хацела схавацца ў гушчары лесу, але было позна. Я пачула загад «Стой!» — і цяжкая рука сціснула мне плячо. Я паспела выкінуць лістоўкі, але гэта заўважыў затрымаўшы мяне паліцай, мясцовы жыхар. Праз некалькі хвілін мяне акружылі карнікі. Паліцай загадаў мне падняць скрутак з лістоўкамі, а калі я нагнулася, то атрымала страшэнны ўдар у спіну і павалілася. Мяне паднялі, загадалі распрануцца дагала і прывязалі да дрэва. У той час у мяне былі доўгія косы, імі прывязалі маю галаву да дрэва так, што я нават не магла зварухнуцца.

Гэтак я прастаяла гадзіны 3—4, пакуль карнікі хадзілі ў вёску Свяда, дзе ўчынілі расправу над жыхарамі.

Я была ўся ў крыві ад пабояў і вельмі пакутавала ад абляпіўшых мяне аваднёў і мух. Але адганяць іх не магла. Калі карнікі вярнуліся, мне дазволілі апрануцца, але рукі пакінулі звязанымі. Павялі ў горад цераз вёскі Юшкі, Чарнаручча, Забаенне.

У Лепель мы прыйшлі, калі ўжо сцямнела. Кінулі мяне ў агульную камеру, дзе не толькі не было дзе прылегчы, але і стаяць было цяжка.

Там я сустрэла знаёмых дзяўчат — членаў падпольнай групы Таню Змітрачонак і Жэню Талюш. Раніцай нас павялі на допыт у жандармерыю, якая знаходзілася ў былым інтэрнаце педагагічнага вучылішча. Пакой, дзе вялі допыт, быў на другім паверсе, а ўнізе гудзелі маторы, каб заглушыць крыкі людзей, якіх катавалі.

Дапытвалі па аднаму, а пакуль што мы ўсе стаялі ў розных канцах калідора з паднятымі рукамі. Першай вызвалі Талюш, яе доўга білі, выцягнулі ў калідор, аблівалі вадой. Затым упіхнулі ў пакой мяне. Я ўбачыла вялікую лужыну крыві і двух немцаў у халатах, таксама ў крыві, з бізунамі ў руках.

За сталом сядзелі два чалавекі — адзін тоўсты, лысы, а другі — худы, маладзейшы, друкаваў на машынцы. Ён спытаў прозвішча, імя, год нараджэння. Затым сталі дапытвацца, хто даў мне лістоўкі. Я адказала, што яны былі ў паліцая, які мяне затрымаў. Мяне сталі збіваць бізуна-

мі з двух бакоў. Затым тоўсты пазваніў па тэлефоне. Зайшлі яшчэ 3 салдаты і адзін афіцэр з белай паперай у руках, які зняў у мяне адбіткі пальцаў. Тоўсты, які аказаўся начальнікам жандармерыі, зноў спытаў мяне пра лістоўкі. Я адказала, што мне даў іх паліцай і сказаў, каб я аддала іх бургамістру альбо начальніку паліцыі. Мяне зноў білі.

Не памятаю, як я апынулася ў адзіночнай камеры ў падвале, у былым ваенным гарадку за тры кіламетры ад горада. Камера была халодная, сырая, цёмная. Калі вочы прывыклі да цемнаты, я разглядзела на сценах словы, напісаныя крывёю людзей, якія тут сядзелі. Знайшла я і надпіс Сяргея Бараноўскага: «Аддаю маладое жыццё за Радзіму, за партыю, за народ». Пакінуць свой след на сцяне ў мяне не было сіл: хацелася толькі аднаго — хутчэй бы канец.

Мяне разбудзілі крыкі на вуліцы. Дзверы адчыніліся, чатыры немцы выцягнулі мяне з камеры і ўкінулі ў машыну.

Павезлі мяне зноў на допыт да начальніка жандармерыі. Я адказвала тое ж самае, і зноў мяне білі да страты прытомнасці. Апрытомнела я ў той жа камеры. Пры трэцім допыце я ўжо не адчувала болю. Калі мяне вялі на другі паверх, спераду ішоў знаёмы чэх Марціноўскі. Ён сваімі спевамі даў знаць, што трэба трымацца мужна да канца, што маіх адбіткаў пальцаў на лістоўках не выяўлена, а вось адбіткі пальцаў паліцая былі. Але гэта мне не дапамагло. Каты вызвалі паліцая і загадалі яму прымусіць мяне гаварыць праўду. Мяне паставілі на акно, за валасы падвесілі з другога паверха. Затым білі на падлозе. Адзін немец стукнуў мне нагой у грудзі, яшчэ і цяпер, праз многа гадоў, у мяне захаваўся на грудзях след ад удару.

На гэтым допыце мяне асабліва катавалі — заганялі ў пазногці іголкі, паміж дзвярэй зацiскалі рукі, жалезнымі пальчаткамі білі па твары, выбілі зубы. Я бясконца траціла прытомнасць, але маўчала. Ачнулася я зноў у камеры.

Некалькі дзён мяне не чапалі, а затым вызвалі і пусцілі на мяне вялікага сабаку. Ён пакусаў мне нагу, а пасля, колькі яго ні нацкоўвалі, сабака не кранаў мяне, а толькі гыркаў. Мабыць, таму, што раны мае пачалі гнаіцца, ад іх ішоў смурод. Мяне зноў збілі і сказалі, што не дадуць есці і піць. Так і зрабілі.

Праз некалькі дзён мяне, галодную і знямоглую, зноў выклікалі на допыт. Там стаяў накрыты стол, каб прымусіць мяне прызнацца выглядам стравы і вады. Я папрасіла піць, мне далі, і я залпам выпіла амаль літр вады. А на іх пытанні паўтарала ўсё тое ж.

На гэтым допыце мяне так збілі, што я доўга не магла апрытомнець. Калі ачнулася, то ўбачыла побач з сабою жанчыну гадоў 35—40, якая пачала ласкава выпытваць мяне, спачуваць. Але я зразумела, што гэта правакатар, і яна нічога ад мяне не дазналася. Тады яна перастала маскіравацца і сказала вартавому, што ёй тут рабіць больш няма чаго. Назаўтра мне аб'явілі, што мяне расстраляюць альбо павесяць, і кінулі ў агульную камеру, дзе было 15 чалавек, прысуджаных да расстрэлу.

У 4 гадзіны раніцы адчынілі камеру. Усіх нас пасадзілі ў крытую машыну і пад узмоцненым канвоем павезлі за горад. З машыны выводзілі па аднаму, а каля ямы ставілі па 8 чалавек. Першую васьмёрку расстралялі. І я ўжо стаяла каля ямы. На нас цэліліся з аўтаматаў. Але ў гэты момант з'явіўся на кані пасланец і перадаў загад адвезці мяне назад.

Мяне павезлі ў Віцебск. Аказалася, што генерал паліцыі патрабаваў мяне для далейшага допыту, ён загадаў мяне лячыць. Сам некалькі разоў заходзіў у камеру і ўгаворваў, каб я расказала ўсё аб партызанах. Я нічога не сказала.

Лячылі мяне ваеннапалонныя ўрачы. Калі я крыху падужэла, прыкладна праз два месяцы, пачала прасіць урачоў, каб яны дапамаглі мне збегчы. Урачы ведалі, што паставы любіць выпіваць, і напаілі яго, пераапранулі мяне і паклалі на ложак памёрлай дзевачкі. Разам з мёртвымі ваеннапалоннымі адвезлі за шпіталь. Адтуль ноччу перавялі ў другі барак, дзе сядзелі не палітычныя.

Там я даведалася, што Талюш, Змітрачонак і Пад'ельская сядзяць у камеры для палітычных, і папрасіла тых жа ўрачоў

перавесці іх у мой барак. Ноччу мы збеглі разам з палоннымі ўрачамі — 25 чалавек.

З нямецкім генералам я спаткалася ў Мінску, калі ён сядзеў на лаве падсудных у зале пасяджэнняў Ваеннага трыбунала. Ён доўга глядзеў на мяне, пазнаў і ліслівa сказаў: «Я рады, што вы засталіся жывая».

Яму не было і адзінаццаці

З успамінаў Г. Астроўскага

У нашай вёсцы Новыя Валосавічы, у цэнтры саўгаса, стаіць помнік воінам, партызанам і мірным жыхарам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. На пастаменце — скульптура воіна. У жалобнай гаркоце апусціўся ён на адно калена, прыспусціў над магілай сцяг. У магіле, цяпер пад дываном кветак, ляжаць тыя, хто не дажыў да светлага дня перамогі.

Помнік стаіць ля самай дарогі. І хто б ні ішоў тут, абавязкова прыціша крок, затрымае позірк. У садзіку заўсёды ўтульна, ціха і журботна. І толькі пачынаючы з вясны да восені святую гэту цішыню парушаюць спевы салаўёў і іншых птушак.

На трох гранітных масіўных дошках 60 прозвішчаў. А мой позірк заўсёды спыняецца на адным — Г. Збар.

Выросла новае пакаленне, ды і пажылыя далёка не ўсе памятаюць, хто ж гэта такі.

Збар Гера... Я памятаю яго так, быццам бы толькі ўчора сам быў хлапчуком. Вось ён стаіць перада мной у светлым касцюмчыку і белай шапцы. У 1940—1941 гадах мы вучыліся ў адным класе і вельмі сябравалі. Настаўніца заўважыла гэта і пасадзіла нас за адну парту. Так было і ў трэцім, і ў чацвёртым класах. Хлопчыка-сірату знайшлі пры вызваленні Заходняй Беларусі ў 1939 г. Рабят у дзіцячым доме было каля 200, самых розных нацыянальнасцей: рускія, беларусы, палякі, украінцы. Гера — яўрэй.

Памятаю, звініць званок на вялікі перапынак. У Геры дзесятак спраў.

За 30 хвілін яму трэба зрабіць шмат, а перш-наперш забегчы на трусаферму — даўжэзны рад будак каля рэчкі. Была там і будка, якую ён зрабіў сваімі рукамі. Трэба пакарміць трусоў. За 5—7 хвілін да пачатку ўрока Гера шукаў мяне. Знаходзіў і дзяліў папалам полудзень, які толькі што атрымаў у сталоўцы. Порцыю ён атрымліваў, зразумела, адну, на сябе, але кожны раз абавязкова дзяліўся са мной.

У маі мы закончылі чацвёрты клас, а ў чэрвені пачалася вайна. Дзіцячы дом эвакуіраваць не паспелі. Пазней хадзілі чуткі, што ў гэтым рашаючую ролю адыгралі бездакзнасць і баязлівасць кіраўнікоў дзіцячага дома. Дырэктар сабраў дзяцей, сказаў, што пачалася вайна. Раздалі харч, адзенне і аб'явілі «свабоду».

Групамі разышліся па розных напрамках. Стала вядома, што ў гэтым паходзе ў першыя дні вайны многія загінулі, а некаторыя разышліся па вёсках. Многія жыхары вёсак Кавалевічы, Красналучка, Новыя Валосавічы і іншых падабралі дзяцей, яны жылі ў іх усю вайну. А Геру Збар не ўзяў ніхто...

У вёсцы Іван Бор ён аднойчы забег у хату і папрасіў хлеба. Яго пакармілі. Гера расказаў, што яго сябры разышліся і добра жывуць у сялян. А яму і прасіцца няма як. Ён яўрэй, загіне сам і пагубіць іншых. Пакуль выганяць нашы ворага, рашыў жыць у лесе. Так і блукаў па лясах, пакуль не трапіў у рукі немцаў. Завезлі яго ў Лепель. А ноччу хлопчык уцёк і рушыў у бок былога дзіцячага дома. Ён ведаў, што недзе каля Стайска, бліжэй да Лепеля, ёсць вёска Сяргееўшчына, дзе жыве найлепшы чалавек на свеце Іван Шарстук. Да вайны ён загадваў гаспадаркай у дзіцячым доме, сябраваў з Герам. Хлопчык асабліва любіў працаваць разам з дзядзькам Іванам на канюшні.

Але ў Сяргееўшчыну ён не трапіў, а выйшаў да вёскі Стайск.

У гэты час у Стайску прачнуліся паліцаі і пахмяляліся ў адной з хат. Убачылі праз акно добра апранутага хлопчыка.

Паліцаі зазвалі Геру ў хату і дапрасілі...

Потым пасадзілі ў вазок, павезлі ў лес у напрамку Сяргееўшчыны і загадалі зняць паліто і бацінкі.

Гера хуценька раздзеўся і паклаў адзенне на вазок. Паліцай махнуў рукой у

бок Сяргееўшчыны. Хлопчык пабег па снезе ў насочках і адной сарочцы...

Раздаўся выстрал. Хлопчык упаў. Усё гэта бачылі жыхары вёскі Стайск, якія ў лесе нарыхтоўвалі дровы.

Галіна Фёдараўна Славінская расказвала мне:

«Калі паліцай вярнуўся і пайшоў у хату зноў піць самагонку, мы, дзеці, пабеглі ў лес. Герка ляжаў голенькі на снезе, раскінуўшы ногі і рукі, на спіне. На другі дзень паліцай сказаў майму тату: «Вазьмі з сабой лом, рыдлёўку і абавязкова сякеру. Вялікай ямы ў такі мароз не раскапаеш. А вось ты яго пасячы на кускі. Справа аблегчыцца».

Жыхары вёскі Стайск пахавалі хлопчыка. А вясной зрабілі труну і пахавалі па-сапраўднаму, і агароджу паставілі. Пазней астанкі хлопчыка перанеслі ў брацкую магілу ў вёсцы Новыя Валосавічы.

Будзеце мае дзеці...

З успамінаў Ніны Шунто

До войны мы жили с одним папой, мама умерла. Когда папа ушел на фронт, остались с тетей. Тетя наша жила в деревне Задоры Лепельского района. Через месяц, как папа нас привез к ней и оставил, она наткнулась глазом на сук, выколола глаз, у нее получилось заражение крови, и она умерла. И мы остались одни с братом, а брат был маленький. Мы с ним пошли искать партизан, почему-то мы решили, что там наш папа. Ночевали где придется. Помню, когда была гроза, мы ночевали в стоге сена, вытянули сено, сделали ямку и ночевали там. Таких детей, как мы, было много. И все искали своих родителей, даже если они знали, что родители убиты, все равно говорили нам, что тоже ищут папу с мамой или кого-нибудь из родственников.

Мне запомнился такой случай. Мы шли по деревне, и в одной хате было открыто окно. И там, видно, недавно пекли картофельные пироги. И когда мы приблизились, брат услышал запах этих пирогов, он потерял сознание. Я зашла в эту хату, хотела попросить кусочек для брата, потому что он бы не поднялся. А я бы его не подняла — сил мало. В хате никого не было, я отломила кусочек пирога, и мы остались ждать хозяев, чтобы не подумали, что мы воруем. Пришла хозяйка, она жила одна. Она нас не отпустила, она сказала: «Будете моими детьми...»

В сорок четвертом деревню сожгли, нас подобрали партизаны. Из партизанского отряда на самолете отправили за линию фронта. Там мы узнали, что отец погиб...

С. Алексиевич. Последние свидетели. М.: Мол. гвардия, 1985. С. 57—58.

Ніколі не забыць

З успамінаў Ф. М. Мельнікавай, вязніцы канцлагера Асвенцым

У 1942 г. мой муж быў расстраляны немцамі пры выкананні баявога задання. Я тады жыла ў в. Саснягі Несінскага сельсавета, потым трапіла ў атрад У. Е. Лабанка. У час блакады немцы мяне з трыма дзецьмі захапілі ў палон.

Каля двух месяцаў прабыла ў турме, адкуль у жніўні 1943 г. вывезлі ў Віцебск у казармы 5-га палка. Цераз нядзелю адправілі ў Асвенцым. Разам са мной у гэты лагер папалі маці пісьменніка Петруся Броўкі, бацькі партызанскага камандзіра С. Пацэя, Буйніцкія з Навасёлак — маці з дочкамі Марыяй і Ганнай, Залатарова Зоя, Дакуцька, Ягорава і многія іншыя. Везлі нас у закрытых вагонах-цялятніках. Не выпускалі з вагонаў. Плакалі малыя дзеці ад голаду і смагі. Многія памерлі ў дарозе. Іх выкідвалі з вагонаў.

Асвенцым размяшчаўся ў нізіне. На тэрыторыі лагера было многа баракаў, сырых і халодных. Абнесены лагер быў электрычным провадам. Яго ахоўвалі нямецкія вайскоўцы. На тэрыторыі лагера знаходзіліся 6 крэматорыяў.

Наш эшалон падагналі да аднаго з іх. Выгналі ўсіх з вагонаў. Размясцілі ў бараках на сырой зямлі. Раніцай загадалі здаць залатыя рэчы.

Ф. М. Мельнікава

Усіх заставілі раздзецца, агалілі нашы галовы, ставілі на нас нумары. Выдалі драўляныя калодкі і шэрыя ў палоску сукенкі. Малыя дзеці не пазнавалі сваіх маці. Трымалі ў бараках. Толькі раніцай і ўвечары выганялі на «апель» — праверку. Ежу гатавалі, як для свіней, у асноўным з гарбуза, бульбяных лупін. Хлеба давалі па 100 грамаў. Пачаліся масавыя захворванні: сыпны тыф, захворванні страўнікаў. Людзі мерлі адзін за другім. Спальвалі хворых, мёртвых. Пачалі адбіраць дзяцей. Гэта было жудаснае відовішча. Дзеці крычалі, кідаліся да сваіх маці, але іх адрывалі сілком і кідалі за дзверы. Як потым высветлілася — для адпраўкі ў дзіцячы лагер Путуліца. Там у дзетак бралі кроў для нямецкіх ваяк. Там знаходзілася і мая 4-гадовая дачка Мая. З дзіцячага лагера бралі падлеткаў па 15 чалавек на работу ў маёнткі баўэраў. Жылі яны ў цяжкіх умовах, спалі на нарах у хлявах, уволю панаядаліся, толькі калі іх вызваліла Чырвоная Армія. Дзяцей адразу адправілі на Радзіму. Мая дачка папала ў Лепельскі дзіцячы дом.

З набліжэннем фронту вязняў Асвенцыма пераганялі на захад, з месца на месца ў глыб Германіі. 15 красавіка 1945 г. нас вызвалілі амерыканскія войскі ў Берген-Бельзене.

Сабралася мая сям'я разам толькі ў 1946 г., бо мой сын, як і іншыя хлопчыкі, пры вызваленні знаходзіўся пры вайсковых часцях.

Тыя, хто быў вязнем Асвенцыма, ніколі не забудуць тых пакут, таго гора.

Лёс Марыі Буйніцкай

Марыя Трафімаўна Буйніцкая не носіць кофты з кароткімі рукавамі. На левай руцэ ля пляча і сёння выразна бачны лічбы 61432.

Пад такім нумарам значыўся вязень канцлагера Асвенцым.

Яна нарадзілася ў сялянскай сям'і з дзевяці чалавек, дзе галоўным клопатам было накарміць дзяцей.

У 1931 г. Марыйка пайшла ў школу. Які гэта быў радасны дзень! Маці апранула яе ў самую лепшую сукенку, пашытую з даматканай тканіны, дала ёй зрэбную торбачку, у якую паклала буквар.

Аднак вучыцца прыйшлося нядоўга. З-за цяжкай хваробы закончыла толькі тры класы.

З 12 гадоў пачала дапамагаць маці на калгасным полі, зграбала сена, даіла кароў. Даглядала пяць сясцёр і брата.

Калі пачалася вайна і брат Іван пайшоў да партызан брыгады «Дубава», маці варыла ежу для партызан, мыла бялізну, калі яны стаялі ў вёсцы. Марыя была іх сувязной.

Шмат разоў хадзіла ў акупаваны Лепель. Збірала звесткі аб ворагу.

У 1944 г. фашысты пачалі блакаду супраць партызан. Усе жыхары Пышна і навакольных вёсак пайшлі ў лес. Карнікі хапалі ўсіх — і партызан, і сялян. Трапіла ў палон уся сям'я Буйніцкіх. Іх накіравалі ў Лепель, адтуль — у Асвенцым. Страшэнныя месяцы прабывання ў лагеры ніколі не забудуцца жанчыне. Са слязамі і гневам яна расказвае:

— Як толькі даставілі партыю палонных, адразу сталі выбіваць нумары. У мяне выбілі нумар 61432, у мамы — 61431. Мая малодшая сястрычка была вельмі слабенькая. Пасля кожнай выбітай лічбы яна заходзілася ад болю, траціла прытомнасць.

Пасля павялі ў халодную лазню, апранулі ў паласатую вопратку. Размясцілі нас у бараку, у якім, акрамя чатырохпавярховых нар, не было нічога, сагравалі мы адзін другога сваім целам. Пацягнулася жудаснае жыццё. Палачы здзекаваліся, як маглі.

У тры гадзіны ночы выганялі ў двор,

выстрайвалі і так трымалі да шасці гадзін раніцы. Тых, хто з сабой браў коўдру, ставілі на калені і аблівалі халоднай вадой з вядра. Потым гналі на работу. Працавалі вельмі цяжка, а атрымлівалі толькі 150 грамаў хлеба, 500 грамаў пахлёбкі з буракоў. Усе вязні хутка сохлі, падалі. Многія не вытрымлівалі, кідаліся на дротавую агароджу, па якой праходзіў электраток.

Запамятаўся Марыі такі эпізод. Вось іх вядуць з работы. А ў варотах стаіць гестапавец-канваір з гумавай дубінкай у руцэ. І дзеля забавы б'е ёй па вязнях дзе папала. Аднойчы сястру Марыі так ударыў, што яна доўгі час не магла сядзець і ляжаць.

Вядома, што фашысты не лічылі вязняў за людзей. Аднак так і не прымусілі іх скарыцца. Бо чалавек заўсёды застаецца чалавекам, нават у невыносных умовах канцлагера. Гэта даказалі зняволеныя. У 1944 г. вязні забаставалі — яны адмовіліся выйсці на работу: Тады гестапаўцы выгналі іх з баракаў у двор, насыпалі вострага каменя, распранулі ўсіх нагала і паставілі на калені. Пасля гэтай экзекуцыі ўсіх вязняў пагналі да крэматорыя, да печы, дзе спальвалі і мёртвых, і жывых. Патрымалі на холадзе шмат часу, а потым загналі ў баракі.

Тут трэба зазначыць, што так паступілі гестапаўцы не з-за «дабрыні», проста фашысцкая Германія выдыхалася пад пераможнымі ўдарамі Чырвонай Арміі, ёй усё больш патрабаваліся рабы, якія б працавалі на вайну.

Закончыліся пакуты сям'і Буйніцкіх толькі пасля разгрому Германіі.

У. Каздоў

Гора яе не зламіла

Яна выйшла насустрач, сівавалосая, крыху згорбіўшаяся пад цяжарам перажытага. Вочы глядзелі сур'ёзна. Здавалася, нішто не можа прымусіць іх усміхнуцца. Яны быццам хавалі ў сабе незабыўнае гора. Сапраўды, шмат перанесла гэта жанчына, шмат пакут выпала на яе долю.

Ганна Захараўна Дакуцька нарадзілася ў Лепелі. Тут прайшлі яе дзяцінства і маладосць, тут перад вайной выйшла замуж і разам з мужам гадавала дваіх дзяцей: дачку і сына. Гэта была звычайная сям'я, усё ў ёй ішло добра. Ды пачалася вайна.

Муж Ганны Захараўны адразу ж трапіў на фронт і загінуў у баях пад Мінскам. Толькі пасля вайны прыйшла пахаванка, а ўсе гады жанчына саграваля сябе надзеяй: можа, вернецца, можа, абыдзе яго бяда. Адной нялёгка было пракарміць двух малалетак. Знаходзіла ў сабе сілы не толькі на тое, каб іх гадаваць, але і на тое, каб наблізіць, чым магла, перамогу.

У горад пачалі прыбываць нашы ваеннапалонныя. Іх змяшчалі ў лагеры, дзе былі створаны нечалавечыя ўмовы. Многія гараджане, у тым ліку і Ганна Захараўна, дапамагалі ім, чым маглі. Многім дапамагла пайсці ў партызаны. Хутка яна стала сувязной Лепельскай партызанскай брыгады «Дубава». Гэта не засталося тайнай. І ў 1942 г. яе арыштавалі. Праўда, усё абышлося. Затым быў і другі арышт. Выйсце засталося адно: пайсці ў лес, да партызан. Ажыццявіць гэты намер не ўдалося, бо фашысты даведаліся аб жаданні жанчыны, яе зноў арыштавалі. На гэты раз апынулася ў Віцебску ў асобым лагеры. На допытах трымалася стойка, нічога не расказала ворагам. Разам з сотнямі іншых патрыётаў фашысты адправілі яе на Захад, у канцэнтрацыйны лагер Асвенцым. Пачалося поўнае трагедыі і нечалавечых выпрабаванняў жыццё ў лагеры смерці. Нярэдка здавалася, што ўжо не выжыць. У думках развітвалася з дзецьмі, з усімі блізкімі сэрцу людзьмі. Ад цяжкай работы балелі рукі, ногі. Есці давалі адзін раз у суткі. Гэта была пахлёбка з неачышчанай бручкі. Але і ў гэтых умовах знаходзіліся людзі, якія не падалі духам, падтрымлівалі іншых, верылі ў перамогу і гэту веру перадавалі аслабеўшым вязням. Сярод іх была і Г. З. Дакуцька.

Кожную ноч у лагеры праводзіліся праверкі. Людзей выганялі з баракаў на досвітку, і пачыналася пераклічка. Затым усіх без снедання гналі на работу. Смерць чакала ўсюды. За нязначныя парушэнні выганялі ў двор лагера і ставілі на цэлы дзень на калені або давалі ў рукі кожнаму па цяжкаму каменю і прымушалі скакаць да таго часу, пакуль усе не валіліся абяссіленыя на зямлю. Так прайшло два гады.

Нямногія засталіся ў жывых. Ад голаду, хвароб, катаржнай працы людзі гінулі як мухі. А калі ў пачатку 1945 г. савецкія войскі пачалі набліжацца, вязняў у тэрміновым парадку пастроілі калонай, як рабочую жывёлу, і пагналі да бельгійскай граніцы. Тут быў другі лагер смерці — Бальзінберген. У ім Ганна Захараўна сустрэла доўгачаканую свабоду. Лагер вызвалілі англічане.

Неўзабаве вярнулася ў Лепель. Дома ў жывых застала толькі сына. Дачка памерла.

— Сын вырас, стаў інжынерам,— расказвае Ганна Захараўна. — Жыве ў Віцебску. У яго свая сям'я. Не забывае мяне, часта прыязджае. Запрашае жыць да сябе, але я люблю свой Лепель. Прыходзяць да мяне старыя сяброўкі, ёсць з кім успомніць мінулае.

Лагерны знак 65753 пячэ душу. Стойкасць савецкай жанчыны перамагла, дапамагла выжыць. Гора не зламіла яе. І сёння маладыя бяруць прыклад з такіх людзей, вучацца ў іх мужнасці, стойкасці.

А. Бандарук,
1981

А. Вярцінскі

РЭКВІЕМ
ПА КОЖНЫМ ЧАЦВЁРТЫМ
(урывак)

У час мінулай вайны загінуў кожны чацвёрты беларус.

Эпілог
Урок спражэння
Не забываецца той урон,
не зарастаюць прагалы...
«Дзеці, вы вывучылі урок?
Дзеці, вы праспрагалі?
Я іду,
ты ідзеш,
а ён не ідзе,
ён мёртвы.
Я пяю,
ты пяеш,
маўчыць кожны чацвёрты.
Мы ідзём,
ідзяце вы,
Грунт пад нагамі цвёрды.
Яны не ходзяць — нежывы
кожны чацвёрты.
Любім мы,
любіце вы.
Колькі травы,
лістьвы,
сінявы! —
Хоць сэрца насцеж разгортвай.
А каб яшчэ ды быў жывы
кожны чацвёрты!

Лепельскае падполле

У ліпені 1941 г. па рашэнні ЦК КП(б)Б першы сакратар райкама партыі У.Е. Лабанок быў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі падполля і партызанскага руху. У выніку склаўшыхся цяжкіх абставін ён выйшаў за лінію фронту, трапіў у Гомель, дзе прайшоў кароткачасовыя курсы пры ЦК КП(б)Б.

У жніўні разам з работнікамі райкама В.Г. Гербачыкам і А.К. Шатыронкам вярнуўся на тэрыторыю свайго раёна.

Для работы ў падполлі былі падабраны надзейныя людзі: К.А. Яско з Ляхавіч, І.М. Дзямешчанка з Каменя, П.Ц. Пруднікаў з Караевічаў, П.В. Хацько з Радуні, Ф.Ф. Садкоўская з Несіна, Р.Л. Палянскі з Замошша, А.С. Ладзік з Сушы, В.К. Баграцоў з Несіна, Ф.М. Юрэвіч з Валосавічаў, М.А. Субач з Залесся, С.Р. Бараноўскі, К.А. Мельнікаў, А.С. Мілы, С.Ц. Слабодчыкаў, А.А. Марунька з Лепеля і іншыя. Гэтыя камуністы з'явіліся тым касцяком, на які падпольны райкам партыі абапіраўся, разгортваючы работу ва ўмовах падполля.

Улетку і восенню 1941 г. стварыліся падпольныя групы, якія ўзначалілі загадчык друкарні С. Р. Бараноўскі, аграном К.А. Мельнікаў, галоўны ўрач раёна С.Ц. Слабодчыкаў, медсястра бальніцы І.І. Вялюга, работнік Зацякляскага лясніцтва А.С. Мілы, навучэнка А.М. Парфянчук, дырэктар Несінскай НСШ Ф.Ф. Садкоўская, старшыня Ляхавіцкага сельскага Савета К.А. Яско.

Месцам размяшчэння падпольнага райкама партыі на перыяд акупацыі раёна была абрана Саснягоўская пушча.

Састаў Лепельскага падпольнага райкама КП(б)Б (1.08.1941 — 26.06.1944 гг.)

Сакратары:

Лабанок Уладзімір Елісеевіч — першы сакратар
1.08.1941—29.06.1944 гг.

Марунька Анатоль Адамавіч — другі сакратар (загінуў)
15.09.1942—22.12.1942 гг.

Булаўскі Іван Раманавіч — другі сакратар (загінуў)
11.01.1943—14.02.1943 гг.

Качан Уладзімір Лявонцьевіч — другі сакратар
2.04.1943—29.06.1944 гг.

Члены райкама:

Яско Канстанцін Антонавіч
15.09.1942—3.08.1943 гг.

Хацько Павел Васільевіч
15.09.1942—3.08.1943 гг.

Цыкавой Мікіта Яўсеевіч
11.01.1943—29.06.1944 гг.

Караленка Дзмітрый Цімафеевіч (загінуў)
3.08.1943—22.04.1944 гг.

Ярмаш Аляксей Васільевіч
3.08.1943—29.06.1944 гг.

Разам з райкамам партыі працаваў падпольны райкам камсамола, які быў створаны ў ліпені 1942 г.

Састаў Лепельскага падпольнага райкама ЛКСМБ (1.07.1942—29.06.1944 гг.)

Сакратары:

Пашкевіч Ганна Васільеўна
1.07.1942—29.06.1944 гг.

Ладзік Міхаіл Рыгоравіч — сакратар па прапагандзе
1.05.1943—29.06.1944 гг.

Члены райкама:

Ладзік Міхаіл Рыгоравіч
1.07.1942—1.05.1943 гг.

Чэклін Павел Пятровіч
1.07.1942—15.07.1943 гг.

Баграцоў Ілья Карпавіч
1.09.1942—29.06.1944 гг.

Ерашоў Віктар Данілавіч — інструктар па падпольнай рабоце
1.02.1943—1.04.1944 гг.

Маргевіч Вера Аляксандраўна
1.06.1943—20.10.1943 гг.

Марунька Ядвіга Паўлаўна — інструктар па падпольнай рабоце
1.07.1943—29.06.1944 гг.

Пацэй Пётр Купрыянавіч — інструктар па падпольнай рабоце
1.08.1943—29.06.1944 гг.

Армонік Руфін Ціханавіч — інструктар па падпольнай рабоце
1.07.1943—29.06.1944 гг.

Будкевіч Сцяпан Аляксеевіч — інструктар па падпольнай рабоце
1.08.1943 — 29.06.1944 гг.

Булух Настасся Максімаўна
люты — чэрвень 1944 г.

Першае пасяджэнне падпольнага райкама партыі адбылося 23 жніўня 1941 г. у в. Караевічы ў доме старшыні Караевіцкага сельсавета П.Ц. Прудніка. Абмеркавалі стварыўшаеся становішча на фронце і ў раёне. Адзначылі, што падпольныя групы паўсюдна прыступаюць да дзеянняў. Райкам паставіў перад імі ў якасці першачарговых такія задачы, як збор зброі і боепрыпасаў, распаўсюджванне антыфашысцкіх лістовак і паведамленняў Саўінфармбюро, сабатаж нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў для нямецкай арміі, арганізацыя дыверсій, найстражэйшае захаванне патрабаванняў канспірацыі.

Дзейнасць усіх груп у г. Лепелі ўзначаліў сакратар падпольнага райкама партыі Анатоль Адамавіч Марунька. Да вайны ён працаваў настаўнікам у вёсцы Стары Лепель і добра ведаў мясцовых жыхароў. Але добра і яго ведалі. Таму з прычыны магчымага арышту ён перабраўся у вёску Губіна.

Кіраўніцтва Лепельскім гарадскім падполлем было даручана камуністу Сяргею Рыгоравічу Бараноўскаму. Адначасова ён узначальваў падпольную групу друкарні.

Першачарговае значэнне надавалі падпольшчыкі палітычнай рабоце сярод насельніцтва. Спачатку яны збіралі лістоўкі, якія скідвалі савецкія самалёты, перапісвалі іх ад рукі і распаўсюджвалі сярод насельніцтва. Затым матэрыяламі для лістовак сталі зводкі Саўінфармбюро і іншыя важныя паведамленні з Масквы. Радыёприёмнікі былі ўстаноўлены ў дамах П.В. Вячэрскага (в. Дрымаўшчына), А. С. Куляшова (в. Матырына), П. Я. Ясюка (г. Лепель).

Актыўна дзейнічала група Кірылы Апанасавіча Мельнікава. Восенню 1941 г. К.А. Мельнікаў, Р.І. Бараноўскі (бацька Бараноўскага Сяргея), П.С. Лаўрыновіч, М.П.

Кулеш і М.Ц. Раманенка вывелі са строю чыгунку ў горадзе. У той час немцы рыхтавалі да пуску лінію Орша — Лепель, якая мела важнае значэнне для нямецкай танкавай арміі.

Падпольшчыкі хадзілі днём на станцыю, разглядвалі падыходы да яе. А ўначы на працягу васьмі сутак выводзілі са строю важныя аб'екты на станцыі.

Сувязь райкама партыі з падпольнымі групамі горада і раёна ажыццяўлялася цераз К.А. Мельнікава. Ён працаваў аграномам у гарадской управе і меў магчымасць па службе бываць у вёсках. Даставаў бланкі пропускаў і забяспечваў імі патрэбных людзей.

Вопыт падпольнай работы набываўся дарагой цаной. У красавіку 1942 г. былі арыштаваны і загінулі С.Р. Бараноўскі, Р.І. Бараноўскі, І.В. Чарняўскі, І.М. Дзямешчанка, П.Я. Ясюк, В.М. Ладзік. Але падполле горада і раёна працягвала існаваць і разгортвацца.

Важным месцам для падполля была друкарня. Пасля гібелі кіраўніка падпольнай групы С.Р. Бараноўскага яе ўзначаліў Ф.Ц.Раманенка.

Друкаваць лістоўкі ў нямецкай друкарні стала небяспечна. Група атрымала новае заданне — абсталяваць партызанскую друкарню. Падпольшчыкі ўпотай выносілі шрыфты, паперу, фарбу і перадавалі ў партызанскую брыгаду «Дубава». У выніку з красавіка 1942 г. стала рэгулярна выходзіць газета «Калгасная праўда» — орган Лепельскага падпольнага райкама партыі.

У часы акупацыі ў горадзе дзейнічалі 7 падпольных арганізацый і груп. Вялікую дапамогу партызанам аказвала група медыкаў пад кіраўніцтвам Серафіма Цітавіча Слабодчыкава. Яна забяспечвала іх медыкаментамі, перавязачнымі матэрыяламі. Члены групы ратавалі савецкіх ваеннапалонных, перадавалі ім у лагер цывільнае адзенне, харчы, дакументы, арганізоўвалі ўцёкі.

У канцы 1941 г. немцы даставілі ў бальніцу цяжка параненага ў грудзі савецкага афіцэра Пятра Гайдука. Урач М. І. Бакштаеў вылечыў яго і дапамог перайсці да партызанаў. Дзеля гэтага ён аформіў дакументы на мясцовага жыхара, сканаўшага ў бальніцы.

З самага пачатку падпольнай дзейнасці паўстала пытанне аб забеспячэнні падпольшчыкаў і іх сем'яў неабходнымі дакументамі. Пашпартыстам у гарадской управе ўладкаваўся Калішэвіч Міхаіл Міхайлавіч. Ён забяспечваў падпольшчыкаў чыстымі бланкамі пашпартоў і пропускаў з неабходнымі подпісамі і пячаткамі. На біржы працы працавала настаўніца Ганна Іванаўна Латышава. Яна спрыяла ўладкаванню патрэбных людзей на работу ва ўстановы акупантаў, забеспячэнню іх неабходнымі дакументамі.

У пачатку 1943 г. з Арлоўскай вобласці ў Лепель прыбыла «добраахвотніцкая» армія пад камандаваннем Камінскага. Падпольная група Уладзіміра Казіміравіча Закрэўскага разгарнула сярод здраднікаў шырокую антыфашысцкую прапаганду. Члены групы сістэматычна распаўсюджвалі звесткі Саўінфармбюро, газеты, плакаты, лістоўкі, звароты падпольнага райкама партыі з прызывам пераходзіць на бок партызан. У выніку некаторыя з «камінцаў» пачалі шукаць сувязь з партызанамі і падпольшчыкамі, каб перайсці на бок народных мсціўцаў.

У.К. Закрэўскі з Ф.Р. Макаравым наладзілі сувязь з камандзірам палка арміі Камінскага маёрам І. І. Тарасавым, які актыўна ўключыўся ў падрыхтоўку пераходу свайго палка на бок партызан. Але 23 верасня 1943 г. Тарасаў і восем яго сяброў былі арыштаваны і павешаны ў Лепелі. Пазней фашысты схапілі Макарава, жорстка катавалі яго, а потым расстралялі.

Аднак дзейнасць падпольнай групы мела вынікі. У ноч, калі быў арыштаваны Тарасаў, у Лепельскую партызанскую брыгаду імя І.В. Сталіна перайшлі каля 150 салдат і афіцэраў. Пазней перайшлі яшчэ дзве групы на чале з камандзірамі Пашчанка і Праватаравым, захапіўшы 15 коней, 12 павозак, мінамёт з боепрыпасамі, 3 кулямёты і больш 50 вінтовак.

Важную ролю ў баявой дзейнасці лепельскіх падпольшчыкаў адыгрывала разведка. Падпольная група пад кіраўніцтвам А.С. Мілага здабывала ў гарадской управе, палявой і мясцовай камендатурах важныя звесткі аб размяшчэнні і перамяшчэнні нямецкіх воінскіх часцей, складоў з боепрыпасамі і гаручым, аб наяўнасці ўмацаванняў у горадзе і вакол яго. Вясною

1943 г., калі нямецкае камандаванне рыхтавала буйную карную аперацыю супраць партызан пад кодавай назвай «Котбус», групе ўдалося раздабыць план гэтай аперацыі і перадаць партызанам. У выніку былі прыняты неабходныя меры, і партызанскія атрады выйшлі з-пад удараў ворага.

Мэтанакіравана дзейнічалі падпольшчыкі на тэрыторыі ўсяго Лепельскага раёна. Члены Несінскай падпольнай арганізацыі пад кіраўніцтвам Фаіны Францаўны Садоўскай неаднаразова псавалі лінію тэлефонна-тэлеграфнай сувязі на дарозе Лепель—Віцебск, распаўсюджвалі лістоўкі, арганізоўвалі сабатаж нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў для акупантаў, збіралі звесткі аб варожых гарнізонах.

Баявую арганізацыю згуртаваў на тэрыторыі Ляхавіцкага сельскага Савета Канстанцін Антонавіч Яско, які да вайны працаваў старшынёй гэтага сельсавета.

У 1941 г. падпольшчыкі паспяхова правялі кампанію па зрыву паставак прадуктаў харчавання нямецкай арміі. Сярод насельніцтва арганізавалі збор грошай і аблігацый. У фонд абароны Радзімы ляхавіцкія патрыёты сабралі больш за 100 тысяч рублёў.

З восені 1942 г. да вызвалення раёна К. А.Яско працягваў праводзіць палітыка-выхаваўчую работу сярод насельніцтва, кіраваў групамі ў якасці інструктара падпольнага райкама партыі. Некаторыя падпольныя групы складаліся выключна з камсамольцаў і моладзі.

У вёсцы Заслаўкі падпольную камсамольска-маладзёжную групу ўзначаліў малады настаўнік Пётр Купрыянавіч Пацэй. Член гэтай групы настаўнік Уладзімір Васільевіч Вашук схаваў творы класікаў і палітычную літаратуру са школьнай бібліятэкі. Вызначалася гэтая група і ў зборы зброі. Яна перадала ў партызанскі атрад 14 вінтовак, 2 ручных кулямёты, 130 гранат, звыш тысячы патронаў. Значную ролю ў арганізацыі падполля, папаўнення радоў партызан адыгралі камсамольцы, палітработнікі, байцы Чырвонай Арміі, трапіўшыя ў акружэнне.

Лепельскае падполле было звязана з разведвальнымі групамі Заходняга фронту. Па заданні штаба фронту ў тыл праціўніка была закінута разведвальная група ў складзе: Пётр Іосіфавіч Сахошка (кіраўнік), Васіль Андрэевіч Прыходзька (радыст), Таня (разведчыца). У адну з чэрвеньскіх начэй 1942 г. яны на парашутах удала прызямліліся на лясной паляне непадалёку ад вёскі Баравыя. Праз некалькі дзён ім удалося ўстанавіць сувязь з мясцовымі падпольшчыкамі. Цераз падпольшчыка Віктара Міхайлавіча Лапіна разведданыя рэгулярна перадаваліся ў штаб фронту.

Але разведчыкі былі схоплены фашыстамі. Гэта адбылося ў час аднаго з візітаў у Лепель. Пасля працяглых пакутлівых катаванняў разведчыкі былі расстраляны. На тэрыторыі Лепельскага раёна працавалі армейскі разведчык Барыс Мікалаевіч Яфімчанка, група пад кіраўніцтвам Паўла Васільевіча Буткевіча. Яны рэгулярна, аж да самага прыходу часцей Чырвонай Арміі, перадавалі звесткі аб Лепельскім і іншых гарнізонах, аб руху воінскіх часцей і ваенных перавозках.

В. Я. Ланікіна

Салдаты слова

Да вайны Сяргей Рыгоравіч Бараноўскі і Іван Васільевіч Чарняўскі працавалі ў лепельскай раённай газеце «Калгасная праўда».

Падпольшчыкі групы С.Р. Бараноўскага збіралі зброю і медыкаменты, прымалі і размнажалі зводкі Саўінфармбюро. Лістоўкі не толькі неслі людзям праўду аб падзеях на франтах, але і паказвалі, што ў тыле дзейнічаюць савецкія патрыёты.

Бараноўскі і яго сябры рыхтаваліся да таго, каб на змену рукапісным лістоўкам прыйшло друкаванае слова. І такі дзень настаў. Пачалася работа ў новых умовах, поўная небяспекі і рызыкі. Былы адказны сакратар раённай газеты «Калгасная праўда» Іван Васільевіч Чарняўскі пісаў тэксты лістовак, а Сяргей Бараноўскі, Міхаіл Раманенка, Настасся Каваленка, Матрона Бараноўская набіралі і друкавалі іх... Яны прыбягалі да розных штукарстваў, каб вынесці з друкарні «гатовую прадукцыю».

З'яўленне ў горадзе друкаваных лісто-

С. Р. Бараноўскі

І. В. Чарняўскі

вак ашаломіла гітлераўцаў. Яны праводзілі вобыскі і аблавы, арышты, але ніяк не маглі здагадацца, што лістоўкі выдаюцца ў іх жа друкарні. А,між іншым, падпольшчыкі не толькі друкавалі лістоўкі, але выносілі шрыфты, фарбу, паперу, перадавалі іх сувязным.

Вядома, акупацыйныя карныя органы не драмалі. У красавіку 1942 г. ім удалося натрапіць на след патрыётаў. У рукі фашыстаў трапілі С.Р. Бараноўскі, І.В. Чарняўскі і іншыя. Пачаліся допыты, катаванні, здзекі...

Напярэдадні вайны ў І.В. Чарняўскага пачалося чарговае абвастрэнне цяжкай хваробы — коснага туберкулёзу. Але Іван Васільевіч і на гэты раз не пакінуў работу, не лёг у ложак, як таго патрабавалі ўрачы. Ён быў у рэдакцыі, калі разнеслася страшная вестка аб вераломным нападзенні гітлераўскай Германіі на Савецкі Саюз. Разам з усім калектывам стаў рабіць газету ваеннага часу.

Аддаючыся барацьбе з акупантамі, Іван Васільевіч забываўся аб сваёй цяжкай хваробе. Ніхто з яго баявых таварышаў не чуў ад яго скаргаў. Таварышы па падполлі любілі яго, называлі сваім камісарам. Іван Васільевіч дзейнічаў упэўнена, смела праяўляў кемлівасць вопытнага разведчыка. Жыхары Лепеля помняць расклееную па горадзе ў дзень святкавання 24-ай гадавіны Кастрычніка лістоўку. Яна заклікала: «Таварышы! Не верце фашыстам! Масква была, ёсць і будзе заўсёды савецкай! Сталін у Маскве. 7 лістапада 1941 года таварыш Сталін з трыбуны Маўзалея У.І. Леніна прымаў парад Чырвонай Арміі і выступаў з прамовай, у якой заклікаў савецкіх людзей на акупіраванай тэрыторыі ўсімі сіламі і сродкамі змагацца з заклятым ворагам. Перамога будзе за намі. Будзе і на нашай вуліцы свята!»

Адной з галоўных рыс яго характару былі ўважлівыя адносіны да людзей. Партрэт журналіста-падпольшчыка будзе няпоўным, калі не ўспомніць яго сумленнасць і прамату. Асабліва праявіліся гэтыя рысы ва ўмовах падполля.

С.Р. Бараноўскі і І.В. Чарняўскі не дажылі да перамогі. Над імі доўга здзекаваліся гітлераўцы і ў рэшце рэшт жорстка закатавалі.

А. В. Гурко

Журналіст-падпольшчык

У перадваенныя гады Уладзімір Закрэўскі закончыў сярэднюю школу, працаваў у Лепелі на радыёвузле, завочна вучыўся, быў няштатным карэспандэнтам раённай газеты «Калгасная праўда».

У 1938 г. Уладзіміра прызвалі на службу ў Чырвоную Армію, але завочнай вучобы ён не кідаў. Марыў стаць журналістам. Уладзімір любіў літаратуру, пісаў вершы. Але вайна зламала яго планы. Як і яго таварышы па зброі, Закрэўскі рваўся на фронт, туды, дзе вырашаўся лёс Радзімы. Яго накіравалі карэспандэнтам у рэдакцыю адной з франтавых газет.

Як склаўся далей яго лёс? Пра гэта можна даведацца з кнігі «Летапісцы баявога подзвігу».

Восенню 1941 г. Уладзімір быў цяжка паранены, трапіў у палон. Але як толькі паправіўся, збег. Доўга прабіраўся ў родны край і нарэшце аказаўся ў Лепелі, у абдымках маці, сястры, блізкіх, а таксама сяброў. У хуткім часе ён пасябраваў з Сяргеем Бараноўскім.

Па ягонай парадзе Уладзімір уладкаваўся карэспандэнтам у нямецкую газету, якая выдавалася на рускай мове. Акупацыйныя ўлады паверылі, што Уладзімір гатовы «сумленна служыць новаму парадку». Закрэўскаму выдалі дакументы, якія дазвалялі бываць у воінскіх гарнізонах,

свабодна рухацца па горадзе і раёне. Яго забяспечылі пастаянным пропускам у друкарню. Так падпольшчыкі атрымалі дадатковыя магчымасці для сувязі, дабывалі разведданыя, вялі падрыўную дзейнасць сярод варожых салдат.

Работа ў нямецкай газеце стала для Уладзіміра надзейным прыкрыццём, дазваляла выконваць абавязкі падпольшчыка, савецкага разведчыка. Цераз сувязных Закрэўскі перадаваў сакрэтную інфармацыю, папярэджваў аб намячаемых рэйдах карнікаў і іншых планах акупацыйных улад. Даставаў і перадаваў партызанам зброю і боепрыпасы. Ён змог сабраць каштоўныя звесткі, скласці карту Лепеля і нанесці на яе воінскія аб'екты, агнявыя кропкі.

Падпольшчыкі і партызаны памятаюць, як у ноч пад новы, 1943 год Закрэўскі разам з некалькімі таварышамі па падполлі, замаскіраваўшыся, сігнальнымі ракетамі ўказвалі савецкім самалётам ваенныя аб'екты для бамбёжкі. Такія небяспечныя аперацыі пад яго кіраўніцтвам ажыццяўляліся неаднойчы.

Закрэўскі-журналіст змог і старонкі нямецкай газеты выкарыстаць у інтарэсах барацьбы з захопнікамі. Інфармаваў насельніцтва аб планах акупацыйных улад. Для гэтага ён прыбягаў да самых хітрых прыёмаў — іншавыказванняў, але тыя, да каго звяртаўся, расшыфроўвалі яго намёкі. Напрыклад, у адной са сваіх заметак Закрэўскі, быццам бы абураючыся, паведаміў, што жыхары вёскі Н. аказалі супраціўленне ўладам і не далі вывезці зерне і іншыя прадукты. Сяляне зразумелі, што такія рабаўніцтвы пачнуцца ўсюды і трэба надзейна хаваць хлеб і іншыя прадукты.

Ён заўсёды верыў і заклікаў насельніцтва горада і раёна верыць у хуткае вызваленне ад фашысцкай акупацыі.

У лістападзе 1943 года ў газеце «Новый путь» (выдавалася акупантамі ў г. Лепелі на рускай мове) быў надрукаваны яго верш «Ветер с востока», у якім Закрэўскі пісаў:

Третья осень прошла, но четвертая — верь —
Принесет, друг любимый, отраду:
Новый солнечный день постучится нам в дверь.
Будем оба несказанно рады!

...Нягледзячы на тэрор і арышты, Уладзімір разам з таварышамі па падполлі здолеў ажыццявіць не адну смелую дывер-

У. К. Закрэўскі

А. А. Адахоўскі

сію. У Лепелі яны спалілі майстэрню па рамонту ваеннай тэхнікі, замініравалі баявы танк. Магнітную міну раздабыў Закрэўскі, устанавіў яе падпольшчык Пётр Клац. Ад выбуху загінуў экіпаж танка, а таксама камандзір палка добраахвотнікаў Турлакаў.

Такія дзеянні не абыходзіліся без рэпрэсій у адказ, але напасці на прамы след, які прывёў бы да Закрэўскага, фашысты не змаглі. А тым часам Уладзімір умацоўваў свае сувязі з іншымі падпольнымі групамі. У прыватнасці, з групай Ірыны Вялюгі — фельчара раённай бальніцы, у якой лячыліся ваеннапалонныя і салдаты «добраахвотных» часцей.

...Лёс Уладзіміра Закрэўскага, Ірыны Вялюгі і некаторых іншых падпольшчыкаў у далейшым склаўся трагічна. Іх арыштавалі ў маі 1944 г. Шмат дапытвалі, білі. Многія зняволеныя ў турме захварэлі тыфам. Хворых павезлі ў тыфозны барак, а тых, хто яшчэ трымаўся на нагах, у тым ліку Закрэўскага і Вялюгу, 27 чэрвеня — напярэдадні вызвалення Лепеля — пагрузілі на адкрытыя платформы і павезлі. У раёне вёскі Ходараўка Докшыцкага раёна іх расстралялі.

Трагічна загінуў і родны брат Уладзіміра Закрэўскага Антон. У апошні дзень перад адступленнем фашысты ўчынілі жорсткую расправу — выкалалі яму вочы, адрэзалі язык. Пакалечанае цела паднялі на штыкі... Не дажылі браты да радасных дзён вызвалення роднай зямлі. А яны былі так блізка, гэтыя дні.

А. В. Гурко

Воіны нябачнага фронту

Анатоль Адамавіч Адахоўскі з вёскі Заазер'е. Было яму 24 гады, калі пачалася вайна. У армію не ўзялі па інваліднасці. Камсамолец хваравіта перажываў, што не змог са зброяй у руках змагацца з ворагам. Але сядзець склаўшы рукі не збіраўся. Пайшоў дырэктарам на цагельны завод «Раўнянка». Фашыстам патрэбна была цэгла, і таму яны асабліва клапаціліся аб гэтым прадпрыемстве. Людзей працавала там нямала. Новы дырэктар уважліва прыглядаўся да тых, хто быў побач, вывучаў іх. Памыліцца нельга было, гэта магло каштаваць жыцця. Не спяшаўся. Звярнуў увагу на аднаго хлопца. Крыху ведаў яго раней як актыўнага камсамольца. Рызыкнуў пагутарыць з ім больш-менш адкрыта. Уладзімір Мазано са здзіўленнем паглядзеў на дырэктара, і вочы яго заблішчэлі: «Няўжо?..»

Агульныя інтарэсы неўзабаве зрабілі гэтых людзей сябрамі і паплечнікамі. На заводзе час ад часу пачалі здарацца розныя непаладкі, у выніку якіх выпуск цэглы то зніжаўся, то спыняўся. Акупанты патрабавалі ад дырэктара навесці парадак. Той вельмі стараўся, але паломкі абсталявання паўтараліся.

Хацелася больш актыўных дзеянняў. На заводзе ўжо існавала група з пяці чалавек. Неўзабаве ўдалося звязацца з партызанамі брыгады «Дубава». На сувязь прыйшоў з лесу Іван Лагуноў. Ён перадаў загад партызан дастаць медыкаменты, соль і праз верных людзей пераправіць у атрад.

Анатолю Адамавічу ўдалося ўстанавіць кантакт з правізарам аптэкі Нінай Іосіфаўнай Матуйза. Яна перадала яму перавязачны матэрыял, ёд і некаторыя лекі. У нарыхтоўчай канторы за цэглу вытаргаваў соль нібыта для сваіх рабочых. Усё гэта пераправілі ў лес.

Успамінае жонка А. Адахоўскага Таццяна Фёдараўна:

«Неяк вечарам прыйшоў да нас незнаёмы чалавек. Жылі мы тады ў кватэры ля завода. Доўга гутарыў з Анатолем, перадаў яму пакет. Там аказаліся газеты. З хваляваннем чыталі паведамленні Саўінфармбюро, заметкі аб жыцці краіны, аб дзеяннях партызан. Гэта былі першыя звесткі, якія мы атрымалі на акупіраванай тэрыторыі.

Газеты надзейна схавалі, а назаўтра зайшоў за імі Уладзімір Мазано. Нямала экземпляраў газеты трапіла ў горад. Іх чыталі і рабочыя завода. Група паступова пашырала свае дзеянні».

Маці Уладзіміра Мазано ўспамінала:

«Сын даволі часта прыходзіў дамоў позна. На мае пытанні адказваў, што даводзіцца затрымлівацца на рабоце. Ды гэта было не так. Здагадвалася, што займаецца ён забароненай справай. Вядома, вельмі баялася за яго. А калі неяк прама сказала яму аб гэтым, пачула ў адказ:

— Інакш не магу. Я — камсамолец, маці. А ты не хвалюйся — усё будзе добра».

Дзейнічалі члены групы смела. На іх рахунку нямала добрых спраў.

З успамінаў жонкі А.А. Адахоўскага: «Памятаю, з лесу прыйшоў чалавек і прынёс пісьмо. Даслаў яго хтосьці з партызанскага камандавання. Гаворка ў ім ішла аб дзейнасці групы. Урэзаліся ў памяць радкі: «Зберажы пісьмо. Яно, у выпадку маёй смерці, пацвердзіць ваш удзел у барацьбе з ворагам».

Нярэдка Анатоль сустракаўся з сувязным у рэстаране, дзе я працавала афіцыянткай.

У камендатуру паступіў данос на дырэктара як на падазронага чалавека. Сігнал без увагі не застаўся. Фашыстам удалося напасці на след маладой жанчыны — сувязной падполля. Яна і выдала членаў групы. Іх арыштавалі. Гэта было незадоўга да вызвалення горада ад акупантаў.

Анатоль Адамавіч сядзеў у Лепельскай турме. Яго моцна збівалі. Ён перанёс усе здзекі, маўчаў. За добры хабар немец-ахоўнік дазволіў сустрэцца з ім.

Твар Анатоля нельга было пазнаць: пасінелы, увесь у кровападцёках. Ён паспеў сказаць, што ні ў чым не прызнаўся, нікога не выдаў. Групу арыштаваных перавялі з турмы ў канцлагер на ўскраіне горада. Ганялі капаць траншэі каля вёскі Зялёнка. Тут з Анатолем удалося пагутарыць. Мужна трымаўся і Уладзімір Мазано. Ён нікога не выдаў».

Падпольшчыкі былі расстраляны. Загінуў і бацька Анатоля Адамавіча. З вялікай групай аднавяскоўцаў немцы пагналі яго на замініраванае поле, а калі знясілены стары ўпаў, яго застрэлілі.

Д. Зарэцкі

Успамінае былы друкар «раёнкі»

18-гадовай дзяўчынай я пераступіла парог друкарні. Было гэта ў маі 1939 г. У той час калектыў друкарні быў куды большы, чым цяпер. Яно і не дзіўна. Усе работы выконваліся ўручную. Каб працавала друкарская машына, трэба было пастаянна круціць рукамі прывадное кола. На гэтай аперацыі спецыяльна быў заняты чалавек.

Прыйшла я працаваць вучаніцай наборшчыка ручнога набору. Трэба было вучыцца адзін год. Але я за тры месяцы авалодала спецыяльнасцю. Потым стала друкаром.

Нядзеля 22 чэрвеня 1941 г. выдалася надзвычай цёплай. Я паласкала бялізну на возеры. Дзесьці пасля 12 гадзін дня ўбачыла, як забегалі, занерваваліся людзі на беразе возера. Дома пачула жудаснае слова «вайна». Не ведала тады, колькі цяжкіх пакут, гора і бяды нясе яна людзям.

Яшчэ два разы выйшла наша «Калгасная праўда». Потым мы набіралі і друкавалі толькі зводкі Саўінфармбюро. Зводкі прымалі па радыё, якое было ўстаноўлена непадалёку ад рэдакцыі ў яўрэйскай лазні.

У ноч з 2 на 3 ліпеня заканчвалі друкаваць зводку. Раптам наваколле страсянуў магутны выбух. Потым другі, трэці... Бамбілі Лепель. Раніцай нас накіравалі ратаваць параненых. Па вуліцы Валадарскага ў адным з дамоў, у які трапіла бомба, знайшлі дзвюх параненых жанчын. У адной былі перабіты ногі. Другая засталася без рукі. Яшчэ горшае ўбачылі ў ваенкамаце. Бомба закранула частку памяшкання, дзе сабраліся мабілізаваныя на фронт. Загінулі ўсе. Кажуць, там знаходзіліся 32 чалавекі. Так вайна прыйшла ў Лепель.

Атрымалі загад эвакуіравацца. Некалькі кас са шрыфтамі вывезлі і схавалі. Астатнія шрыфты згрузілі ў кучу. Самі накіраваліся ў Віцебск. Там здалі партыйныя і камсамольскія білеты, знайшлі цывільнае адзенне. У абкаме атрымалі новае заданне — накіравацца ў тыл ворага. У тыл ішлі па «аршанцы» (так тады называлі шашу, якая звязвала Оршу з Лепелем). Навокал неразбярыха, бамбёжкі, страляніна. Нельга было без болю глядзець на калоны ваеннапалонных чырвонаармейцаў, галодных і знясіленых. У гэту калону трапілі і мы. Але выратавала грамадзянскае адзенне. Мірных жыхароў фашысты адпускалі. Ваеннапалонных трымалі пад пільнай увагай. Пры першай спробе ўцячы іх расстрэльвалі. Відовішча жудаснае.

Праз тыдзень-другі я дабралася ў родныя Людчыцы. Неўзабаве да мяне наведаўся дырэктар друкарні Бараноўскі. Папрасіў схадзіць ў Лепель, даведацца, што з нашай друкарняй.

Першы візіт нічога не даў. У наступны раз мне стала вядома, што немцы збіраюцца аднавіць друкарню. С. Бараноўскі паспяшаўся хутчэй уладкавацца ў друкарню. На работу рэкамендаваў і мяне. Так пачалася наша падпольная работа, поўная небяспекі і рызыкі. Распаўсюджвалі лістоўкі, вывозілі шрыфты, каб арганізаваць партызанскую друкарню. Многа згубіла сяброў — іх закатавалі, расстралялі фашысты. Мне пасля арышту давялося гнуць спіну на фашыстаў у Германіі. А, між іншым, сёння знаходзяцца людзі, якія ачарняюць наша мінулае. Памятаю, як некалькі юнакоў, ідучы ўперадзе мяне, стараліся перакласці вядомую песню «Дзень Перамогі» на нейкі жаргон. Ад крыўды зашчаміла сэрца. Так і не змагла ім сказаць, што людзі майго пакалення ішлі ў гады вайны на смерць дзеля іх шчаслівай будучыні. Нашчадкі не павінны забываць пра гэта.

А. І. Катырла

«Я — савецкі ўрач»

Радыё прыносіла несуцяшальныя весткі аб ходзе баёў. Многія ўстановы і арганізацыі згортвалі сваю работу, эвакуіраваліся. Фронт набліжаўся. У Лепель прыбывалі з захаду параненыя чырвонаармейцы. У бальніцы, дзе галоўным урачом працаваў Марк Сідаравіч Бакштаеў, раз-

гарнулі часовы шпіталь. У ім параненыя атрымлівалі неабходную дапамогу.

Апошніх дзевяць цяжка параненых чырвонаармейцаў Марк Сідаравіч вывез з горада на трох фурманках. Тут жа сядзелі і трое малых дзяцей урача. Бакштаевы, муж і жонка, ішлі пешшу.

У будынку Несінскага сельсавета знаходзілася кіраўніцтва раёна. На пытанне ўрача: «Што рабіць — разгортваць медпункт ці ехаць далей?» — паследаваў адказ адправіць параненых, а самому застацца да асобага распараджэння.

Але пад вечар, грукочучы па шашы, прамчаліся на ўсход фашысцкія танкі.

Бакштаеў з сям'ёй вярнуўся ў Лепель. І перш-наперш наведаўся ў бальніцу. На двары прама на зямлі ляжалі і сядзелі параненыя чырвонаармейцы, абы-як перавязаныя, у забруджаных павязках, а то і з адкрытымі ранамі. Паветра было насычана цяжкім смуродам. Гэты страшэнны малюнак сціснуў сэрца болем...

Галоўны корпус занялі фашысты пад свой шпіталь, іншыя будынкі — пад дапаможныя. Праз адчыненыя вокны было бачна, як там завіхаюцца ўрачы ў белых халатах. З кухні смачна пахла стравай. Праз вокны даносіліся гукі губнога гармоніка, смех...

...Пасля доўгіх, настойлівых просьбаў камендант дазволіў заняць пад шпіталь для чырвонаармейцаў будынак па Савецкай вуліцы. Гэта была першая перамога рускага ўрача. Але не было ложкаў, бялізны. Раненых размясцілі на саломе прама на падлозе. І ўсё ж гэта было лепш, чым на голай зямлі пад адкрытым небам.

Недастаткова было медперсаналу, асабліва сярэдняга. Толькі дзве медсястры мелі спецыяльную падрыхтоўку, астатнія жанчыны прыйшлі на дапамогу па закліку сэрца. Працавалі ваеннапалонныя ўрачы У. Булычаў, Я. Валчок, пазней — Вардасанідзе, Сталяроў, а таксама жонка Бакштаева Яўгенія Дзмітрыеўна. Медперсанал рабіў усё, каб вырваць людзей з кіпцюроў смерці. Не было прадуктаў. Акупанты выдавалі толькі па 200 грамаў хлеба, мізэрную колькасць круп і адгону. Ніякіх тлушчаў. Дапамагала насельніцтва навакольных вёсак: насілі малако, хлеб, бульбу, а хто-ніхто і масла, якое даставалася самым знясіленым хворым.

Праз нейкі час фашысты вывезлі свой шпіталь з бальнічных памяшканняў. Бакштаеў атрымаў дазвол заняць іх.

Каля станцыі размяшчаўся лагер ваеннапалонных. Там лютавала эпідэмія дызентэрыі. У гарадской бальніцы адкрылі аддзяленне для такіх хворых. Цяпер бальніца абслугоўвала і насельніцтва раёна. Медыкаменты атрымлівалі з грамадзянскай аптэкі па патрабаваннях Бакштаева.

Акушэркай працавала Ірына Вялюга. Аднойчы ў час начнога дзяжурства нехта нясмела пастукаў у кабінет галоўнага ўрача. Гэта была Ірына.

Галоўны ўрач даўно заўважыў, што гэтую маладую чарнявую прыгажуню з вялікімі сумнымі вачыма нешта хвалюе. Ён ведаў трагічны яе лёс: у першых сутычках з ворагам на граніцы загінуў яе муж, старшы лейтэнант Чырвонай Арміі. З палаючага дома Ірына выбегла з малым дзіцем на руках. Па дарозе з Гродна ў Лепель дачушка памерла ад голаду...

Ірына расказала Марку Сідаравічу, што ў лесе ёсць людзі, якія змагаюцца з захопнікамі. Ім вельмі патрэбны медыкаменты, вата, бінты. Бакштаеў згадзіўся дапамагчы партызанам, але папярэдзіў Ірыну захоўваць асцярожнасць і спакойна рэагаваць, калі з бальніцы будуць «знікаць» людзі.

...У 1943 г. немцы даставілі ў бальніцу групу жанчын, захопленых у час блакады. Сярод іх была адна з моцна абмарожанымі рукамі і нагамі. Калі адступаў боль, гэтая дзяўчына спявала савецкія песні. З ёю пасябравала Ірына і ўвесь час праводзіла каля яе ложка. Хворая даверылася Ірыне і расказала, што яна была паслана ў тыл ворага ў адну з партызанскіх брыгад з заданнем, ды трапіла ў блакаду. Партызаны рыхтаваліся вывезці яе. Гатаваліся да гэтага і ў бальніцы. На распухлыя ногі нельга было знайсці абутку. Тады разрэзалі на кавалкі коўдру, абкруцілі ногі і замацавалі шпагатам. На рукі знайшлі вялікія рукавіцы.

Да бальніцы пад'ехала фурманка. «Радзіху», захутаную ў велізарны сялянскі кажух, паклалі на сані. На партызанскі аэрадром адвёз яе Уладзімір Закрэўскі.

Аднойчы трапіў у бальніцу паранены навылёт у грудзі савецкі падпалкоўнік. Ён ляжаў у асобнай палаце. Марк Сідаравіч часта гутарыў з ім. Даведаўся, што жонка яго таксама ўрач. Нешта знайшлося агульнае, што зблізіла іх. Падпалкоўнік прызнаўся ўрачу, што доўга тут затрымлівацца яму нельга, і як толькі крыху паправіцца, то знікне з горада.

...Моцны грукат у дзверы разбудзіў Бакштаева. Уварваўшыеся фашысты на чале з камендантам перавярнулі ў кватэры ўсё ўверх дном. Прывялі ў камендатуру. Пыталі, потым паставілі да сцяны, стралялі з пісталета вакол яго галавы. Пратрымаўшы ўсю ноч у турме, фашысты адпусцілі ўрача за адсутнасцю ўлік. Але загадчыкам бальніцы прызначылі Вардасанідзе.

Пасля вайны М.С. Бакштаеў увесь час працаваў у раённай бальніцы і амбулаторыі.

М. У. Нарушэвіч

Мая дачка

З успамінаў Іосіфа Ігнатавіча Вялюгі

Дачка мая Ірына Іосіфаўна Вялюга, 1917 г. нараджэння, камсамолка, за некалькі гадоў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны закончыла Лепельскую фельчарска-акушэрскую школу і працавала ў Лепелі. Яна вельмі захаплялася мастацкай самадзейнасцю і была актрысай Лепельскага калгасна-саўгаснага тэатра. У пачатку 1939 г. Ірына выйшла замуж за лейтэнанта Чырвонай Арміі Паўла Усеню, мела дзіця. Пераехала ў г. Гродна па месцы службы мужа. Там і застала яе вайна. Муж Ірыны з першых дзён вайны быў на фронце, а Ірына з Гродна пехатою прыйшла да нас. Па дарозе памерла яе дзіця. Да нас Ірына прыйшла замучаная горам.

Мы з жонкай жылі ў в. Верабкі Лепельскага раёна. У дзень наступлення немцаў на Лепель, 3 ліпеня 1941 г., мы ўсе хаваліся ў склепе. Фашыст, які праходзіў паблізу склепа, даў чаргу з аўтамата, і куля трапіла Ірыне ў плячо. Рана аказалася не апаснай і хутка загаілася. Мы перабраліся ў г. Лепель.

І. І. Вялюга

Там аказалася і добрая сяброўка маёй дачкі — Марыя Нарушэвіч. Яна да вайны працавала ў рэдакцыі газеты і таксама, як Ірына, была актрысай тэатра. Яна як даведалася, што Ірына ў Лепелі, дык адразу наведала нас. Разам выходжвалі параненую Аляксандру Клац. З палону выкупілі яе мужа Пятра Клаца. Вакол Ірыны аб'ядналіся настаўніцы — Ганна Кудрава і Вольга Галуза, ветурач Ганна Анікеевіч, Анатоль Козыраў, Усцін Камека, некалькі пазней прыйшла ў Лепель Лёля Мяшкова і паэт Валодзя Закрэўскі. Яны часта збіраліся ў нас, гаварылі аб падзеях на фронце. Ды мала хто аб гэтым ведаў.

Памятаю, сабраліся сябры маёй дачкі вечарам 7 лістапада 1941 г. на кухні, завесілі акно. Мая старая прыгатавала што было да святочнага стала, а было ўсяго толькі бульба, хлеб і малако. Пачалі ўспамінаць, як сустракалі савецкія святы ў мірны час. Нехта сказаў, што чуў ад фашыстаў, што Масква захоплена імі і Савецкі ўрад з Масквы збег... Марыя Нарушэвіч выцягнула скрутак паперы і прачытала паведамленне з Масквы аб тым, што 7 лістапада 1941 г. у Маскве на Чырвонай плошчы І.В. Сталін прымаў парад войскаў. Адразу настрой змяніўся. Ірына прапанавала, каб гэтыя звесткі з Радзімы размножыць і тайна падкідваць людзям. Адразу ж селі за работу. Пісалі друкаванымі літарамі. Памятаю, што спачатку пісалі: «Прывітанне з Масквы! Таварышы, не верце фашыстам. Масква савецкаю была, ёсць і будзе! І далей ішло паведамленне аб парадзе ў Маскве, а ў канцы

прыпіска: «Прачытай і перадай іншаму». Некалькі такіх паведамленняў было расклеена ў горадзе. Хто гэта зрабіў, я не памятаю. Марыя часта прыносіла зводкі Саўінфармбюро, якія яна прымала па нямецкаму радыёпрыёмніку. Іх перапісвалі ад рукі.

Вось так пачалася падпольная дзейнасць маёй дачкі Ірыны Вялюгі і яе сяброў. Пазней яны звязаліся з партызанамі. Ірына працавала ў вайну ў раённай бальніцы акушэркай. За ёю часта прыязджалі з вёсак, і яна, маючы пропуск, ездзіла па вёсках. Немцы ёй гэта дазвалялі. Так, напэўна, і ажыццяўлялася сувязь з партызанскімі сувязнымі. Для партызан збіралі медыкаменты, перавязачныя матэрыялы, інструменты для партызанскага шпіталя, бланкі пашпартоў і пропускаў, а грошы і аблігацыі — у Фонд абароны Чырвонай Арміі. Вялі работу сярод ваеннапалонных, народнікаў, каб яны ішлі ў партызаны...

Памятаю, аднойчы да Ірыны прыехаў сувязны з вёскі, здаецца з Вялікага Поля, Міхаіл Разумаў. Ён унёс у дом хамут, адняў лямец, дастаў адтуль паперку і перадаў дачцэ. Такія дакументы захоўваць было небяспечна. Яшчэ прыходзіў да нас сувязны з вёскі Малы Поўсвіж па прозвішчы Кажан Іван, урач ці фельчар.

Па прапанове Ірыны я ўладкаваўся на працу на торфазавод «Курган», паблізу ад Лепеля, у лесе. Ірына цераз мяне перадавала Івану Кажану ўсялякія медыкаменты. На масла, яйкі і іншыя прадукты я выменьваў у немцаў тытунь, запалкі, мыла. Усё гэта для партызан. Прадукты на абмен я купляў за грошы, якія атрымлівала Ірына ад партызан.

Аднойчы Валодзя Закрэўскі і Марыя Нарушэвіч прывялі да нас нейкіх двух маладых людзей. Ірына папрасіла мяне перавесці іх на торфазавод як рабочых, адтуль далей у лес павёў іх Кажан.

У кузні мы знайшлі дзяўчынку месяцаў 10 ад роду. Я добра не памятаю, калі гэта было: ці перад расстрэлам, ці пасля расстрэлу яўрэяў у Лепелі. Хтосьці з суседзяў сказаў, што недалёка ад нашага дому, у кузні, ляжыць міна, закручаная ў анучы. Я адчыніў дзверы ў кузню, і сапраўды, бачу, ляжыць штосьці на зямлі ў коўдры. Я ўзяў доўгую жэрдку і, схаваўшыся за цагляную сцяну кузні, пачаў лёгенька падштурхоўваць тую «міну», і раптам «міна» заплакала. Прыбегла Ірына, схапіла дзіця на рукі і сказала, што гэта сам Бог паслаў ёй дзіця ўзамен загінуўшага. Прынеслі дадому, раскруцілі, аказваецца, гэта была дзяўчынка. Мы адразу здагадаліся, што гэта яўрэйскае дзіця. І каб выратаваць яго, мы вырашылі ахрысціць дзяўчынку ў царкве. Іра дала ёй імя Галіна.

Дзяўчынка выхоўвалася ў нашай сям'і як родная. І пасля гібелі Ірыны Галіна доўга жыла ў нас, прыязджала да нас на канікулы. Яна вельмі любіла маю старую Агаф'ю Савельеўну.

Ірыну арыштавалі ў пачатку мая 1944 г. Не магу да гэтай пары зразумець, як з'явілася ў Лепелі Ніна Савіч і хто яна такая: ці то яна была падаслана, каб выявіць падполле, ці то пры выкананні задання была схоплена немцамі, і каб выратаваць сябе, выдала людзей, якіх ведала. Ірыну арыштавалі вечарам, і ў тую ж ноч машына «чорны воран» пад'ехала да нашага дому. Забралі і нас са старой. Калі нас кінулі ў машыну, я ўбачыў, што там ужо знаходзілася і Нарушэвіч Марыя, паабапал яе сядзелі немцы з аўтаматамі. У хаце засталася трохгадовая дзяўчынка, яна гучна плакала. Намеснік бургамістра ўправы Штанговіч папрасіў немцаў, каб яны адпусцілі маю жонку прыглядзець за малым дзіцем, і яе адпусцілі. Штанговіч гэта зрабіў, магчыма, таму, што быў хросным бацькам Галіны. Ірына спецыяльна так зрабіла, каб у выпадку даносу немцам, што ў нас выхоўваецца яўрэйскае дзіця, Штанговіч, як уплывовы і аўтарытэтны ў немцаў чалавек, не дазволіў бы расстраляць сваю хрэсніцу. Папраўдзе, ён аб гэтым не ведаў і не прыглядваўся да Галінкі, калі хрысціў яе.

У турме я прабыў нядзелю-другую, і мяне выпусцілі. Гэта адбылося таму, што мая дачка і яе таварышы на допытах паказвалі, што родныя нічога не ведалі. Ірыну страшна катавалі: секлі бізунамі да крыві, білі гумавымі дубінкамі. Катавалі і яе сяброў. Кудрава Ганна і яе сястра

Галуза Вольга незадоўга да арышту былі паранены ў ногі асколкамі бомбы і ад ран у турме моцна пакутавалі без перавязак, раны гнаіліся. Арыштаваныя падпольшчыкі былі ў цяжкім стане, збітыя пры допытах траціліпрытомнасць, некаторыя з іх захварэлі тыфам. Замест бальніцы іх перавялі ў лагер за калючы дрот, за горадам.

За дзень да вызвалення Лепеля немцы вывозілі людзей з турмы і лагера. Грузілі арыштаваных на платформы. Жонка пабегла на станцыю (я ў той час хварэў). Яна расказвала, што Ірына была ўся ў сіняках, чорная, як зямля. Убачыўшы маці, яна ўсміхнулася і папрасіла не сумаваць аб ёй, берагчы Галечку. І яшчэ сказала, што калі хто застанецца з падпольшчыкаў жывым, каб звярталіся за даведкамі да Качана, Яско, Дубава і іншых, я ўжо не памятаю ўсіх прозвішчаў.

Як загінула мая дачка, я не магу расказаць. Чуў пасля вызвалення Лепеля, што іх расстралялі каля Параф'янава. Марыя Нарушэвіч, Ганна Кудрава засталіся жывыя, таму што знаходзіліся ў тыфозным бараку ў лагеры, а тыфозных не вывозілі.

1967 г.

Ёй і сёння 21 год

Нарадзілася Аня ў в. Паддуб'е, што ў Чэрскім сельсавеце. Закончыла педагагічнае вучылішча і была накіравана на работу ў горад Свіслач. У першыя дні вайны ўступіла ў рады Чырвонай Арміі. Ды нядоўга давялося ваяваць. Пры адступленні была цяжка кантужана і засталася жыць толькі дзякуючы намаганням простай сялянкі, якая ўзяла яе да сябе, выхадзіла, паставіла на ногі. Неўзабаве дзяўчына прыйшла ў родную вёску да бацькоў.

Расказвала сялянам аб бачаным, заклікала ўсімі сродкамі перашкаджаць акупантам і іх памагатым. У хуткім часе ўдалося ёй наладзіць сувязь з падполлем.

У яе дома часта бывала Ганна Латышава, новая сяброўка. Яны падоўгу пісалі лістоўкі, за якімі, звычайна ноччу, на веласіпедах прыязджалі маладыя хлопцы, забіралі пакеты. Гэта былі партызаны.

Г. Д. Трубчанка

Па заданні падполля Аня ўладкавалася на работу на біржу працы ў Лепелі. У яе з'явілася магчымасць устанаўліваць сувязь з патрэбнымі людзьмі, дапамагаць ім. Збірала і перадавала кіраўнікам падполля важныя звесткі.

«Зімой 1942 года, — расказвае Еўдакія Дзянісаўна Матырка, жыхарка Лепеля, — мая сястра Аня Трубчанка папрасіла дапамагчы пераправіць з горада некалькі нямецкіх аўтаматаў і патроны. Зброю потым передалі народным мсціўцам, якія прыйшлі з лесу».

Дзеянні падпольшчыкаў пашыраліся. І гэта не магло застацца незаўважаным. Немцы і паліцаі шукалі няўлоўных патрыётаў, але ніяк не маглі напасці на след. Ды знайшлася здрадніца. Яна і выдала падпольшчыкаў. Аню арыштавалі. Забралі і яе маці.

«Так здарылася, што давялося сядзець разам з Аняй у фашысцкай турме, — расказвала Марыя Цярэнцьеўна Кузьміна, былая медсястра, актыўная ўдзельніца лепельскага падполля. — Дзяўчына вяла сябе малайцом, падбадзёрвала ўсіх нас, узнімала настрой. Яна ўсё паўтарала: «Мала, вельмі мала зрабілі мы». Разам з імі сядзела ў камеры Е.П. Васільева. У сваім пісьме яна піша: «Мы бачылі, як вялі Аню да шыбеніцы, якая стаяла ў двары турмы. Яна ішла з горда ўзнятай галавой, не плакала... Аню павесілі. А праз дзень расстралялі яе маці...»

Д. Зарэцкі

Сям'я патрыётаў

З успамінаў А. С. Куляшова, былога кіраўніка падпольнай групы ў в. Матырына

Працаваў я да вайны загадчыкам Матырынскай пачатковай школы. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, абставіны склаліся так, што эвакуіравацца не ўдалося. Выйсце падказала сумленне. Быў у нашай сям'і невялікі радыёпрыёмнік. Начамі ўключалі яго, слухалі Маскву, зводкі Саўінфармбюро і, аб чым даведваліся, расказвалі блізкім, сябрам, таму, каму поўнасцю давяралі. Менавіта з такіх людзей склалася неўзабаве наша антыфашысцкая група. Бліжэйшымі яе ўдзельнікамі сталі члены сям'і Садкоўскіх з в. Залессе. Сустракаліся мы даволі часта, абмяркоўвалі, што можна зрабіць для Радзімы. Праўду аб вайне, аб падзеях у свеце, весткі з фронту рэгулярна даводзілі да насельніцтва.

Фаіна Садкоўская дастала дакумент аб тым, што радыёпрыёмнік здадзены ў камендатуру. Справа ў тым, што па загаду акупантаў усе, хто меў радыёпрыёмнікі, павінны былі іх здаць. Як паказалі далейшыя падзеі, мы своечасова падумалі аб сваёй бяспецы. Па заданні сакратара Лепельскага падпольнага райкама партыі У.Е. Лабанка наша група пачала больш актыўна дзейнічаць. Гэта не засталося незаўважаным. Знайшоўся правакатар, які паведаміў фашыстам, што ў маім доме ёсць прыёмнік, а сёстры Садкоўскія займаюцца распаўсюджваннем лістовак.

Неяк раніцай у вёску прыбыў невялікі атрад немцаў. Школа была акружана. Некалькі салдат з афіцэрамі ўвайшлі ў памяшканне, дзе мы жылі. Патрабавалі здаць радыёпрыёмнік. Я паказаў дакумент аб здадзеным прыёмніку. Але фашысты западозрылі, што мы маем яшчэ адзін, і патрабавалі паказаць яго.

Тут я ўспомніў, што дзеці гулялі з нейкімі радыёдэталямі. Быў і стары футляр ад прыёмніка. Папрасіў сына знайсці яго. І хутка ён вярнуўся з гэтым футлярам. Афіцэр доўга разглядваў яго і нарэшце пераканаўся, што кажу праўду. Тым не менш загадаў салдату праверыць, што знаходзіцца на гары.

Камсамольскі білет Я. А. Куляшова

На шчасце, той аказаўся не вельмі старанным, паленаваўся ўзбірацца на гару. А там якраз і была змацаваная антэна. Прыёмнік мы хавалі ў рускай печы.

Падпольная работа працягвалася. Лістоўкі распаўсюджвалі сярод насельніцтва. Сыны прыносілі іх з Лепеля. Аднойчы старэйшы сын Яўген быў схоплены ў Лепелі, у яго знайшлі паведамленне Саўінфармбюро. Яго жорстка катавалі, але нічога не дабіліся. 7 лістапада 1943 г. фашысты зверскі забілі нашага Яўгена. Загінулі ў засценках гестапа і сёстры Садкоўскія.

Д. Гарадзецкі

Лёс настаўніцы Лізаветы Захараўны Казлоўскай

У Стаі прыйшлі чужынцы... Стаяў ціхі дзень. Над лесам, што зусім блізка ад вёскі, узнімаўся слуп чорнага дыму. Вуліцы як бы вымерлі. Маладая настаўніца Ліза Казлоўская сабрала сяброў. Вырашылі заставацца на сваёй зямлі. І змагацца.

Сямікласніца Аня Садоўская, якая была сакратаром школьнай камсамольскай арганізацыі, пранікла ў школу, каб забраць спісы камсамольцаў. Але вынесці не ўдалося. Хтосьці перашкодзіў, і тады яна, рызыкуючы, спаліла іх.

А неўзабаве ў вёсках сельсавета пачалі

з'яўляцца напісаныя ад рукі на аркушах з вучнёўскіх сшыткаў невялікія лістоўкі. У іх быў заклік не верыць фашысцкай брахні, не ісці на службу да ворагаў, хаваць хлеб.

Калі Анатоль Марунька, пакінуты на акупіраванай тэрыторыі для падпольнай работы, цяжка захварэў, яго прыюціла сям'я аб'ездчыка лясгаса Віктара Мазго. Гэты сумленны чалавек рызыкаваў усім. Але не спыніўся перад небяспекай. Хворага хавалі на гары дома, аказвалі яму патрэбную дапамогу.

Сёння цяжка сказаць, як даведалася аб хворым Лізавета Казлоўская. Вядома толькі, што яна прыйшла ў хату аб'ездчыка і папрасіла аб сустрэчы з Марунькам. Той згадзіўся не адразу. І толькі пасля таго, як расказаў аб наведвальніцы Маруньку, па згодзе яго арганізаваў сустрэчу. Немагчыма цяпер устанавіць дакладна, аб чым ішла размова паміж падпольшчыкамі. Толькі пасля яе Лізавета неяк павесялела. Сустрэлася з хлопцамі і дзяўчатамі сваёй вёскі, падрабязна расказала ім, як і што трэба рабіць. Юнакі разумелі, што нехта з дарослых людзей стаіць за спінаю Лізы.

...У вёсцы Пунішча жыла былая піянерважатая Стайскай школы Алена Аношка. У яе хаце, здаралася, спыняўся Марунька. На гэты раз ён папрасіў гаспадыню наладзіць сустрэчу з Казлоўскай. Сабраўшы крыху рэчаў нібы ў абмен на харчы, Лізавета накіравалася ў Пунішча.

Аношка ўжо, бачна, з акна заўважыла госцю і ішла ёй насустрач. Сустрэча з Марунькам была кароткай. Лізавеце даручылі пераканаць Стайскі гарнізон перайсці да партызан...

Былі ў гарнізоне некалькі былых ваеннапалонных. З некаторымі была добра знаёма. А вось што ў іх на душы... Нялёгкая, рызыкоўная задача.

З Пунішча Лізавета прынесла невялікую кніжку. Гэта была прамова І.В. Сталіна ад 3 ліпеня 1941 г. Яна сама чытала яе шмат разоў. Чытала і людзям. Яны слухалі сваю настаўніцу, у сэрцах іх мацнела ўпэўненасць у перамозе над чорнай зграяй.

Неяк у клубе былі танцы. Прыйшлі з гарнізона паліцэйскія, народнікі. Яны запрашалі на вальсы і полькі вясковых дзяўчат. І хоць зусім не хацелася танцаваць, але Лізавета прыйшла ў клуб. Яна стаяла ля дзвярэй, глядзела на тых, хто кружыўся ў віхры вальса. Нечакана яе запрасіў на танец чалавек, якога яна бачыла дзень назад ля паліцэйскага ўчастка. Завязалася размова, звычайная ў такіх выпадках.

Л. З. Казлоўская

Не раз бачылі Лізавету з новым знаёмым. Сустрэчы сталі больш частымі. Леанід Зайцаў, так звалі знаёмага, былы камандзір Чырвонай Арміі, быў пераведзены ў Стаі з Валосавіцкага гарнізона. Сціплы чалавек, ён выдзяляўся сярод іншых добразычлівасцю да людзей, у ім не бачна было нахабства, дакучлівасці. Пачаў ён бываць і на кватэры настаўніцы. Доўгімі вечарамі, калі за акном круціла мяцеліца, расказваў аб сваім жыцці, з болем гаварыў аб цяжкіх днях адступлення... Успамінаў далёкую радзіму, дзе чакала яго каханая.

Паступова праз Леаніда пазнаёмілася Лізавета і з іншымі паліцэйскімі, былымі камандзірамі Шурыгіным, Івановым, Шумскім...

Па словах Леаніда Зайцава, які даверыўся Лізавеце, ён і яго таварышы шукаюць магчымасць перайсці да партызан, аб якіх нямала чулі. Ды ўсё ніяк не ўдаецца звязацца з патрэбнымі людзьмі.

Аб сваіх сустрэчах і размовах яна паведамляла А. Маруньку. Вырашылі са зброяй у руках перайсці да партызан. Тыя пагадзіліся.

Падрыхтоўка да пераходу вялася дэ-

талёва. Было вырашана, што 3-і партызанскі атрад брыгады «Дубава» ў вызначаны час падыдзе да Стай і гарнізон, які будзе папярэджаны аб гэтым, пяройдзе да народных мсціўцаў. Аб пераходзе ноччу папярэдзіла сваіх знаёмых. Але нечакана моцна пастукалі ў дзверы. У хату ўварваліся паліцэйскія...

За краты трапіла не толькі Лізавета, але і яе знаёмыя паліцэйскія, якія павінны былі перайсці да партызан. Даведалася аб гэтым Лізавета пазней, калі прывезлі яе ў Лепель, у турму. Сярод іх аказаўся здраднік, які ўсіх выдаў немцам.

Допыт змяняўся допытам. Наладжваліся вочныя стаўкі. Лізавета сцвярджала адно: «Нічога не ведаю».

І зноў камера. На гэты раз адзіночка. Мароз не даваў спакойна пасядзець, каб крыху адпачыць, сабрацца з думкамі. Галоўнае — трымацца, паказваць, што ніколькі не баішся. Толькі так! Яе былая вучаніца расказала:

«Прыйшла я ў фельдкамендатуру па справах, сядзела ў калідоры, калі прывялі на допыт настаўніцу. Была яна ў плюшавым чорным жакеце і цёмнай хустцы. Спакойны твар, вельмі стомлены. Паглядзела на мяне і хутка адвяла гарашчыя вочы. Бачна, не хацела паказваць, што мы знаёмыя. Такой і запомнілася. Яна вучыла нас любіць Радзіму, народ, быць патрыётамі. Гэтыя рысы ў поўнай меры былі ўласцівы ёй самой». Лізавету расстралялі... Ёй было ўсяго 23 гады... Яна, як і мора, не прызнавала спакою. Усё для людзей — веды, сэрца, жыццё. Такой выхавалі яе савецкая школа, камсамол. Ёй і цяпер усяго 23. Столькі, колькі было, калі ў апошні раз глядзела праз краты на шэрае зімовае неба. Такой яна засталася для ўсіх, хто ведаў яе. Такой я бачыў яе на фотаздымку, які змешчаны ў Кнізе баявой і працоўнай славы Стайскага сельскага Савета.

Д. Зарэцкі

Партызанскі рух

Летам 1941 г. у вёсцы Ісафатава Сушанскага сельсавета спыніліся сем ваеннаслужачых, якія выйшлі з акружэння, на чале з Дзмітрыем Цімафеевічам Караленкам. Восенню 1941 г. цераз мясцовага жыхара А. С. Ладзіка яны наладзілі сувязь з падпольным райкамам партыі, і з гэтага часу група выконвала яго заданні.

У сакавіку 1942 г. група Д. Ц. Караленкі, узброеная двума аўтаматамі і іншай стралковай зброяй, прыбыла на партызанскую базу ў Саснягоўскую пушчу і склала ядро першага партызанскага атрада. У яго ўвайшлі Д. Ц. Караленка, Г. А. Любаў, С. А. Емяльянаў, М. А. Розанаў, М. Д. Нямпомняшчы, А. А. Мамаеў, М. Я. Талстых.

Камандзірам атрада, якому далі № 68, стаў Уладзімір Елісеевіч Лабанок, камісарам — Анатоль Адамавіч Марунька, начальнікам штаба — Дзмітрый Цімафеевіч Караленка. Партызаны пачалі дзейнічаць: разграмілі і спалілі Несінскую і Палянскую ўправы, нападалі на паліцэйскія гарнізоны, пункты па нарыхтоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, знішчалі жывую сілу і тэхніку ворага.

Атрад рос з кожным днём.

Весткі пра баявыя дзеянні партызан з Саснягоўскай пушчы разляцеліся па ўсёй Лепельшчыне. З імі пераклікаліся паведамленні, якія прыходзілі з Ушацкага раёна. Там дзейнічаў атрад № 9 на чале з былым дырэктарам Ушацкай МТС, а перад самай вайной — старшынёй Ушацкага райвыканкама Фёдарам Фамічом Дуброўскім.

28 жніўня 1942 г. па рашэнні Віцебскага падпольнага абкама партыі абодва атрады аб'ядналіся і стварылі партызанскую брыгаду «Дубава». Камандаваў ёю Фёдар Фаміч Дуброўскі, камісарам быў Уладзімір Елісеевіч Лабанок, начальнікам штаба — Сцяпан Якаўлевіч Барадаўкін.

Баявым хрышчэннем партызанскай брыгады была аперацыя па разгрому варожага гарнізона ў мястэчку Камень, у якім знаходзілася 180 гітлераўцаў. Гэта адбылося ў ноч з 31 жніўня на 1 верасня.

Сілы варожага гарнізона і агнявыя пункты былі размешчаны такім чынам, што нападзенне неабходна было арганізаваць не ў адным, а адначасова ў некалькіх напрамках.

Затым была аперацыя ў Кублічах, засада на дарозе паміж мястэчкам Камень і Бароўкай, баі за Пышна і іншыя аперацыі.

Неўзабаве брыгада «Дубава» перабазіравалася ў Бярэзінскі лясны масіў, да вёскі Антунова.

Шмат клопатаў дастаўлялі акупантам і народныя мсціўцы, якія дзейнічалі ва Ушацкім раёне. 10 верасня 1942 г. 1-ы і 3-і атрады брыгады «Дубава» пад кіраўніцтвам начальніка штаба С. Я. Барадаўкіна падышлі да ўскраіны райцэнтра. Раздзяліліся на дзве групы. Адна з іх, на чале з камандзірам узвода Дзмітрыем Фраловым, вызваліла вязняў з камер ушацкай турмы. Другая, пад кіраўніцтвам Сяргея Маркевіча і Аляксея Ярмаша, паспяхова дзейнічала ў цэнтры пасёлка. Былі знішчаны склад сена і масласырзавод, забіта 25 гітлераўцаў і столькі ж паранена. Акупанты былі вымушаны зняць гарнізон ва Ушачах.

У студзені 1943 г. абстаноўка на франтах для гітлераўцаў была вельмі напружанай. Гітлераўцы ўсімі сіламі спрабавалі разамкнуць кола акружэння пад Сталінградам. Паўсюдна крычалі аб тым, што яны завяршылі захоп нафтаносных раёнаў Каўказа і рухаюцца далей на юг і ўсход. Арганізаваны ў такой абстаноўцы рэйд партызан з Ушацкага раёна праз увесь Лепельскі і частку Чашніцкага меў вялікае значэнне. Партызаны заходзілі амаль у кожную спадарожную вёску, чыталі франтавыя зводкі, праводзілі гутаркі, адказвалі на пытанні. Вось і Чашнікі. Бой пачаўся па сігналу — выстрал гарматы па будынку льнозавода. Перапалох у стане ворага (не толькі ў асаджаных Чашніках, але і ў Лепелі, Бачэйкаве, Бешанковічах) быў вялікім. Толькі на чацвёрты дзень нямецка-фашысцкае камандаванне здолела паслаць у Чашнікі падмацаванне.

Партызанская брыгада «Дубава» ўзмацнела і выросла ў баях і паходах. На момант утварэння ў ёй налічвалася каля 200 чалавек, летам жа яе колькасць перавысіла

Месца, дзе размяшчаўся Лепельскі падпольны РК КП(б)Б. Саснягоўская пушча, 1942 г.

2500. Палепшыўся баявы рыштунак, упарадкаваўся быт байцоў. У лагеры з'явілася электраасвятленне, паміж атрадамі была ўстаноўлена тэлефонная сувязь. Усё гэта дапамагала пашыраць і ўдасканальваць баявую дзейнасць брыгады. Многае рабілася для таго, каб не толькі асабовы састаў партызанскіх падраздзяленняў, але і мірныя жыхары былі ў курсе падзей на франтах, ведалі пра баявыя дзеянні партызан.

Наступленне савецкіх войск пад Ленінградам адыграла пэўную ролю ў далейшым развіцці партызанскага руху на Віцебшчыне. Справа ў тым, што нямецка-фашысцкае камандаванне пачало ліхаманкава мабілізоўваць рэсурсы для ўмацавання гэтага ўчастка фронту. Па чыгунцы пачалася ўзмоцненая перакідка на поўнач жывой сілы і тэхнікі ворага. Ва ўмовах перадыслакацыі войск праціўніка камандаванне брыгады «Дубава» лічыла, што адной з галоўных задач партызан з'яўляецца зрыў перавозак, знішчэнне войск і тэхнікі ворага на шляху да фронту. З гэтай мэтай група партызан пад камандаваннем У. Е. Лабанка арганізавала глыбокі рэйд у Літву. 10 красавіка 1943 г. у рэйд рушылі 80 партызан. У раёне станцыі Шаркаўшчызна яны пусцілі пад адхон, а затым атакавалі і разгромілі варожы эшалон, захапілі шмат зброі і боепрыпасаў.

Да чыгуначнай магістралі Вільнюс — Даўгаўпілс група выйшла за тры кіламетры ад станцыі Ігналіна. Тут ёй удалося

вывесці са строю два саставы праціўніка. Адзін з іх пусцілі пад адхон з дапамогай выбуховага прыстасавання, закладзенага пад рэйкі, другі, сустрэчны, наляцеў на вагоны пацярпеўшага крушэнне эшалона. 20 красавіка 1943 г. на мосце адной з рэк захапілі чацвярых літоўскіх паліцэйскіх. Іх абяззброілі і адпусцілі. Мост спалілі, на дарозе знішчылі тэлефонную сувязь.

21 красавіка партызаны ўварваліся ў мястэчка Далгавішкі, знішчылі 120 пудоў цукру, 180 пудоў солі, 5 бочак газы, разграмілі хлебапякарню, маслазавод, вузел сувязі, валасную ўправу, спалілі маёнтак, у якім было 15 тон хлеба, 8 свіней, 30 кароў, 20 коней.

Зваротная дарога з Літвы праходзіла ў надзвычай цяжкіх умовах. Акупанты праследавалі партызан літаральна па пятах. З баямі, прарываючыся з акружэння, група У. Е. Лабанка пераадолела шлях больш чым у 350 кіламетраў і 30 красавіка вярнулася на сваю базу. За час рэйду партызанскія страты склалі: 2 забітых і адзін паранены.

Па распараджэнні Беларускага штаба партызанскага руху і Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б 1 ліпеня 1943 г. брыгада «Дубава» была рэарганізавана ў дзве самастойныя брыгады: Чашніцкую (камандзір Фёдар Фаміч Дуброўскі, камісар Мікалай Васільевіч Старынскі, начальнік штаба Пётр Кірылавіч Шарко) і Лепельскую брыгаду імя Сталіна (камандзір Уладзімір Елісеевіч Лабанок, камісар Аляксей Васільевіч Ярмаш, начальнік штаба Дзмітрый Цімафеевіч Караленка).

Чырвоная Армія вяла ўжо баі на Віцебскім напрамку. Ход і зыход гэтых баёў залежалі ад забеспячэння нямецка-фашысцкіх войск. Чыгуначныя станцыі ператвараліся ва ўмацаваныя апорныя пункты, узмацнялася патруляванне чыгуначных путей, ахоўваліся масты.

У чэрвені — ліпені 1943 г. ЦК КП(б)Б і ЦШПР распрацавалі буйнамаштабную аперацыю «Рэйкавая вайна». Каб забяспечыць раптоўнасць удару, аперацыю планавалася пачаць адначасова на ўсіх асноўных камунікацыях праціўніка і пасля гэтага дзейнічаць бесперапынна: пакуль вораг адновіць адзін участак, разбурыць другі і г. д.

На дапамогу партызанам нярэдка прыходзілі байцы партызанскіх рэзерваў і жыхары бліжэйшых вёсак. Даведаўшыся пра намер фашыстаў аднавіць рух на чыгункі Орша — Лепель, партызаны сумесна з насельніцтвам Лепельскага і Чашніцкага раёнаў у ліпені 1943 г. разбурылі чыгуначнае палатно на адлегласці больш за 40 кіламетраў. У аперацыі ўдзельнічала больш за 3 тысячы мясцовых жыхароў. Праціўніку так і не ўдалося аднавіць рух на гэтай лініі.

Сумеснымі дзеяннямі брыгад «Дубава», імя Сталіна, Лявонава, імя Заслонава ўдалося вывесці са строю больш за 100 кіламетраў чыгункі ад станцыі Расна да Чашнікаў і Лепеля. А крыху пазней — яшчэ вузкакалейку Лепель — Параф'янава, якая будавалася, і іншыя ўчасткі.

У аперацыі асабліва вызначыліся партызаны атрадаў, якімі камандавалі Міхаіл Максімавіч Малкоў і Мікіта Яўсеевіч Цыкавы, Мікалай Нічыпаравіч Самусь і Мікалай Васільевіч Гальчанка, Міхаіл Апанасавіч Разанаў і Пётр Мікалаевіч Літвін, Юрый Яфімавіч Рабянкоў і Васіль Міхайлавіч Гарчакоў.

Як адзначалася ў баявой справаздачы, за час барацьбы на чыгуначных камунікацыях партызаны Лепельскай брыгады ўзарвалі 7530 рэек, знішчылі і пашкодзілі 23 цягнікі, 153 таварныя вагоны з ваеннымі грузамі і жывой сілай, 8 класных вагонаў, 18 чыгуначных мастоў, спалілі адну чыгуначную станцыю.

Фашысцкае камандаванне, імкнучыся засцерагчы ад небяспекі тылы сваёй 3-яй танкавай арміі, перакінула буйныя сілы карнікаў у раён Лепеля і Чашнікаў. Але гэта не знізіла баявой актыўнасці партызан. Быў вызвалены Лукомль. 8 кастрычніка Смаленскі партызанскі полк І. Ф. Садчыкава вызваліў Чарэю. З канца жніўня і да сярэдзіны верасня 1943 г. народныя мсціўцы знішчылі і паранілі больш за 500 варожых салдат і афіцэраў у Лепельскім раёне.

Для дэзарганізацыі праціўніка, адцягнення яго сіл з віцебскага ўчастка фронту ЦШПР распачаў буйную аперацыю па разгрому гарнізонаў у Лепелі і Чашніках.

Па Лепельскім гарнізоне ўдар наносілі

брыгады імя Сталіна, «Дубава», імя Чапаева, імя Панамарэнкі. Перашкодзіць падыходу падмацаванняў праціўніка даручалася дзвюм групам Смаленскага палка. 1-ай Віцебскай, 1-ай імя Заслонава і Лёзненскай брыгадам была пастаўлена задача авалодаць Чашнікамі. Брыгады «Аляксея», «За Савецкую Беларусь», 2-ая імя Заслонава грамілі гарнізоны ворага ў Камені і Бачэйкаве.

Аперацыя працягвалася 5 дзён. Барацьба была напружанай. З 12 варожых гарнізонаў 9 былі поўнасцю знішчаны. А такія буйныя, як у Лепелі, Чашніках, Бачэйкаве, панеслі вялікія страты. Галоўны вынік аперацыі заключаўся ў тым, што праціўнік быў вымушаны накіраваць новыя часці з танкамі і артылерыяй, зняўшы іх з фронту. Партызаны выклікалі агонь на сябе. Пачалося самае цяжкае. Фашысты праводзілі карныя аперацыі супраць партызан і мясцовага насельніцтва. Партызаны ўступілі ў працяглыя баі. У Полацка-Лепельскай партызанскай зоне ў канцы 1943 г. знаходзілася 16 партызанскіх брыгад агульнай колькасцю каля 17 тысяч чалавек. Выкананне пастаўленай задачы патрабавала адзінага кіраўніцтва. З гэтай мэтай ЦШПР вырашыў стварыць аператыўную групу пад кіраўніцтвам У. Е. Лабанка. У яе ўвайшлі падпалкоўнік Аляксей Іванавіч Бруханаў, маёр Аляксандр Фёдаравіч Бардадын, капітан І. І. Зіненка, капітан Дзмітрый Аляксеевіч Фралоў.

Паступаўшыя з розных крыніц разведданыя паказвалі, што праціўнік працягваў узмацняць і нарошчваць сілы на мяжы Полацка-Лепельскай зоны. Пачалі паступаць звесткі аб тым, што рыхтуецца новая карная аперацыя. Каб сарваць намеры праціўніка, 12 студзеня 1944 г. быў зацверджаны канчатковы план аперацыі па знішчэнні гарнізонаў праціўніка ўздоўж шашы Лепель — Докшыцы.

Разгром партызанамі адначасова 17 гарнізонаў вызваў замяшанне ворага. Карная аперацыя была сарвана.

У пачатку другой дэкады сакавіка праціўнік актывізаваўся на ўчастку Лепельскай партызанскай брыгады імя Сталіна. Атакі прыйшлося адбіваць атраду С. А. Пацэя. Баі працягваліся 4 дні. 14 сакавіка на досвітку пад прыкрыццём моцнага артылерыйскага агню праціўнік пачаў наступленне па ўсяму ўчастку абароны Лепельскай брыгады. Асноўны ўдар быў накіраваны на вёскі Падлобныя і Заазер'е, дзе трымаў абарону 9-ы атрад. Бой быў цяжкі. Пад націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка партызанам прыйшлося пакінуць вёску. Камандаванне брыгады накіравала падмацаванне. Раптоўны ўдар з фланга прымусіў гітлераўцаў · паспешна адступіць. У гэтым баі загінуў усеагульны любімец Сяргей Пацэй. Гэта быў сціплы, але разам з тым рашучы і цвёрды чалавек. Ён здолеў стварыць дысцыплінаваны і баяздольны партызанскі атрад, які праславіўся многімі баявымі справамі.

Найбольш вызначыліся ў баі камандзір разведкі 9-га атрада Ф. Ф. Лаўрыновіч, які забіў чатырох немцаў, але сам памёр ад атрыманага ранення; кулямётчык 9-га атрада Г. Гаўрылаў, на рахунку якога 10 немцаў, знішчаных у баі. Па 5 немцаў забілі П. Вядзернікаў і П. Туркоў.

Вораг працягваў нарошчваць сілы ля мяжы Полацка-Лепельскай зоны. Агульная колькасць праціўніка складала больш за 60 тысяч чалавек. Воінскім часцям, ахоўным і эсэсаўскім падраздзяленням было дадана 137 танкаў, 235 гармат, да 70 самалётаў з аэрадромаў Полацка, Улы, Бешанковіч, Беразіно. На станцыі Загацце стаяў браняпоезд, паміж станцыямі Зябкі і Празарокі курсіраваў другі.

Як сведчыць былы начальнік штаба 3-яй нямецкай танкавай арміі Ота Хейдкемпер, нямецка-фашысцкае камандаванне мела на мэце завалодаць тэрыторыяй зоны, акружаючы і знішчаючы партызанскія злучэнні. Агульнае кіраўніцтва карнай экспедыцыяй даручалася камандуючаму 3-яй танкавай арміяй генерал-палкоўніку Рэйнгардту і групенфюрэру СС фон Готбергу.

Опергрупа ўважліва сачыла за развіццём падзей па ўсяму кальцу абароны. Становішча з кожным днём ускладнялася. Ішлі цяжкія баі, партызаны пакідалі вёску за вёскай, павялічваліся абозы з параненымі. Па дарогах да Ушачаў пачалі сцякацца патокі мірных жыхароў. Партызанская лінія кругавой абароны складала 230

кіламетраў. Гэта было вогненнае кола, якое паступова звужалася.

Фашыстам процістаялі 17 485 партызан. На іх узбраенні было 9344 вінтоўкі, 1544 аўтаматы, 624 ручных і 97 станковых кулямётаў, 151 супрацьтанкавае ружжо — усяго 11 760 адзінак стралковай зброі. Са сродкаў артылерыі ў партызан мелася 143 мінамёты, 16 гармат 45-міліметровага і 5 гармат 75-міліметровага калібру з такім бедным запасам мін і снарадаў, што іх магло хапіць усяго на некалькі дзён баёў.

Акупанты спадзяваліся поўнасцю знішчыць партызанскія злучэнні, абрабаваць і ператварыць у рабоў мірнае насельніцтва. Меркавалася, што ўся аперацыя зойме 7—9 дзён. Закончыць аперацыю гітлераўцы разлічвалі да веснавога бездарожжа.

У час самых цяжкіх выпрабаванняў для партызан Полацка-Лепельскай зоны камандаванне 1-га Прыбалтыйскага фронту рабіла ўсё магчымае, каб аказаць ім дапамогу. І. Х. Баграмян успамінаў аб гэтым: «Асабліва страснае нецярпенне ахапіла воінаў, калі яны вясной 1944 года даведаліся, што гітлераўцы пачалі вялікую карную экспедыцыю супраць беларускіх партызан, якія заснавалі ў тыле акупантаў свайго роду партызанскую рэспубліку са сталіцай ва Ушачах. У гэтым раёне дзейнічала 16 партызанскіх брыгад. Жаданне дапамагчы доблесным партызанам было настолькі моцным, што нават мой стары сябра начальнік штаба фронту генерал В. В. Курасаў, які звычайна цвяроза ацэньваў абстаноўку, на гэты раз не вытрымаў і пачаў прапаноўваць ідэю неадкладнага наступлення. Але ва ўмовах склаўшайся ў той час абстаноўкі гэта жаданне, на жаль, было неажыццявімым: наступіла ўжо веснавое разводдзе, ды і войскі фронту яшчэ не былі гатовы да правядзення вялікага наступлення. Менавіта ў гэтых неспрыяльна склаўшыхся для нас умовах гітлераўскае камандаванне вырашыла нанесці беларускім партызанам рашаючае паражэнне, каб да пачатку летняй кампаніі 1944 года ліквідаваць іх асноўныя фарміраванні ў сябе ў тыле».

І ўсё ж 1-ы Прыбалтыйскі фронт знайшоў магчымасць аказаць дапамогу партызанам. Каб адцягнуць увагу праціўніка, войскі фронту на ўчастку 4-ай ударнай арміі з 20 красавіка сталі праводзіць некаторыя мерапрыемствы, меўшы на мэце прымусіць нямецкае камандаванне адцягнуць сілы на Полацкі напрамак. 25 красавіка было зроблена наступленне пяці стралковых батальёнаў, узмоцненых артылерыяй і танкамі. Савецкія войскі прарвалі абарончыя рубяжы праціўніка. Нямецкае камандаванне было вымушана падцягнуць у раён прарыву моцныя сілы.

Актыўная дапамога 1-га Прыбалтыйскага фронту, а таксама суседніх сіл Сянно-Аршанскай, Бягомльскай і Вілейскай партызанскіх зон затрымала акружэнне нямецка-фашысцкімі войскамі партызанскага злучэння ў раёне Ушачаў. Але ўсё ж 29 красавіка гітлераўцы зноў перайшлі ў наступленне на шырокім фронце. Яны паўсюдна ўвялі ў бой танкі і бронемашыны. Да канца красавіка 230-кіламетровая лінія кругавой абароны скарацілася да 20 кіламетраў. Грымелі баі на паўднёвых подступах да Ушачаў. Лепельскай партызанскай брыгадзе імя І. В. Сталіна, брыгадзе імя П. К. Панамарэнкі і палку І. Ф. Садчыкава прыйшлося адбіваць магутны націск вялікай колькасці нямецкіх танкаў. Аднак і ў гэтыя цяжкія дні партызаны праяўлялі масавы гераізм, здзяйснялі нападзенні і дыверсіі ў тыле ворага.

«Гэта былі бязмерна цяжкія дні, — успамінаў Уладзімір Елісеевіч Лабанок. — Такога ніколі не бачылі і не чулі. Гарматны грукат, які працягваўся гадзінамі, змяняўся ўдарамі з паветра. Амаль чапляючыся за востраканечныя купалы ушацкай царквы, захлёбваючыся клёкатам буйнакаліберных кулямётаў, раскідваючы бомбы і міны, нізка над зямлёй тройкамі, двойкамі і па адзінцы праносіліся «юнкерсы». Часам здавалася, што яны не лятаюць, а вісяць у паветры; гул матораў, кулямётная страляніна і бомбавыя ўзрывы не спыняліся ні на хвіліну. Варожая авіяцыя перамяшчала свае ўдары з пярэдняй лініі на бліжні тыл, затым далей, да Ушачаў. Адбамбіўшыся, «юнкерсы» хаваліся ў густой дымавой завесе. Іх змяняла новая партыя самалётаў.

Яшчэ лютавала ў паветры варожая авіяцыя, а на партызанскія пазіцыі ўжо

напаўзалі танкі. Напружанне на лініі абароны яшчэ больш узмацнялася.

Дарогі пад Ушачамі былі запоўнены бежанцамі. Пакінуўшы родныя вёскі, ішлі і ехалі старыя, жанчыны, дзеці. Людзі неслі вузлы са сваім скарбам, гналі жывёлу, коней. Бясконцы людскі паток падвяргаўся нападзенням фашысцкіх паветраных сцярвятнікаў. Нельга без болю ў сэрцы ўспамінаць, што прыйшлося перажыць мірнаму насельніцтву. Нельга без гордасці думаць аб мужнасці і цярпенні простых савецкіх людзей, на лёс якіх выпала столькі гора і пакут...»

Опергрупа, прааналізаваўшы становішча, прыйшла да высновы аб неабходнасці прарываць кальцо акружэння.

Аднак аператыўная абстаноўка склалася так, што да намечанага тэрміну не ўсе партызанскія брыгады паспелі сканцэнтравацца ў адпаведнасці з загадам. Намечаны на 1 мая прарыў прыйшлося адкласці. Ля возера Шо, рызыкуючы быць адрэзанымі ад іншых брыгад, адбівалі атакі карнікаў партызаны брыгады «Кастрычнік». Толькі ў ноч на 2 мая, адарваўшыся ад праціўніка і зрабіўшы цяжкі начны рэйд, брыгада аб'ядналася з галоўнымі сіламі. Склалася такая сітуацыя, калі ніхто, знаходзячыся за межамі кальца акружэння, не мог даваць правільныя ўказанні, куды, калі і як весці людзей на прарыў: абстаноўка мянялася не па днях, а па гадзінах.

Лабанок, прыняўшы на сябе ўсю адказнасць за лёс дзесяткаў тысяч людзей, днём 2 мая правёў нараду камандзіра саставу брыгад ва Ушачах, на якой было прынята рашэнне рабіць прарыў у ноч на 3 мая.

Арганізаваўшы прарыў баявых парадкаў праціўніка, опергрупа накіравала ва ўтворануюадтуліну брыгады «Аляксея», імя П. К. Панамарэнкі, частку атрадаў 16-ай Смаленскай брыгады, а таксама брыгад імя С. М. Кароткіна і імя У. І. Леніна, асобныя падраздзяленні з іншых брыгад. У начным баі асабліва зладжана дзейнічалі аляксееўцы. Разграміўшы варожыя гарнізоны ў вёсках Баяры, Бондары, Ляпейкі, Піскунова, Каміонка, яны разам з іншымі ўвайшлі ў лясы ля возера Шо.

Але галоўныя сілы, а з імі і опергрупа ўсё яшчэ працягвалі заставацца ў акружэнні. Занепакоеныя дзёрзкай начной аперацыяй партызан, карнікі сталі спешна сцягваць мотамеханізаваныя падраздзяленні, наглуха закрываючы ўсе пераходы, дарогі, спрыяльныя для прарыву месцы. Ацаніўшы абстаноўку, улічыўшы, што вораг сканцэнтраваў на заходнім напрамку вялікія сілы, вырашылі фарсіраваць рэчку Ушача і прабівацца ва ўсходнім напрамку. Каб паскорыць тэмп руху, вырашылі пакінуць частку абозаў. Камандаванню брыгад было загадана прыняць экстраныя меры па размеркаванню і вываду з кальца мірных жыхароў разам з партызанскімі падраздзяленнямі.

Але абставіны склаліся так, што ў матырынскі лес паспелі выйсці не ўсе брыгады, ды і групоўка аказалася разарванай надвае. Улавіўшы намер партызан прарвацца ва ўсходнім напрамку, карнікі сцягнулі вялікія сілы на рубеж ракі Ушача. Трэба было прымаць новае рашэнне, і Лабанок загадаў удзень 4 мая перайсці ў наступленне ў супрацьлеглым напрамку — на Двор Пліна.

Аперацыя пачалася ў 14 гадзін. На вузкім участку партызанам супрацьстаялі вялікія сілы праціўніка — пяхота з артылерыяй і танкамі. Але партызаны прарваліся да вёскі Роўны, патрыёты падышлі да вёскі Пліна і штурмам авалодалі ёю. Вораг увёў у бой рэзервы. Пад іх націскам партызаны вымушаны былі пакінуць толькі што занятую вёску Вялікія Угрынкі, адысці і заняць абарону.

І тут здарылася непрадбачанае: аператыўная група і батальён з 1-ай Антыфашысцкай брыгады на паўднёвым захадзе вёскі Пліна аказаліся адрэзанымі ад асноўных сіл, трапілі ў акружэнне.

Па балоцістым участку лесу, дзе яны знаходзіліся, бесперапынна білі мінамёты. Павялічвалася колькасць забітых, параненых. Лабанок даў заданне свайму ад'ютанту Мікалаю Ерашову праз балота прабрацца да асноўных сіл партызан і перадаць загад аб неадкладнай атацы ў напрамку лесу, дзе знаходзілася опергрупа.

Уладзімір Елісеевіч сабраў камандзіраў і загадаў падрыхтавацца да прарыву. Двойчы спрабавалі яны разарваць кальцо

ворага, але дарэмна: сілы былі няроўныя. Карнікі сціскалі кальцо ўсё шчыльней. Лабанок загадаў падрыхтаваць гранаты. Хвіліны чакання цягнуліся вельмі доўга. І раптам пачуліся крыкі «ўра» і нарастаючы гул бою. Гэта кінуліся на выручку опергрупе партызаны Смаленскага палка і брыгады імя ВЛКСМ...

Вечар 4 мая. На ўскрайку лесу на поўдзень ад вёскі Забароўна сабраліся асноўныя сілы злучэння для апошняга штурму. Карнікі ўмацаваліся ў вёсках Новае Сяло і Паперына.

Штурм пачаўся ў 23.30 па сігналу — дзве чырвоныя ракеты. Усе кінуліся ўперад. Доўгія вогненныя струмені прашылі начную цемру.

Вёскі Паперына і Новае Сяло засталіся ззаду... Галоўная небяспека мінула.

В. Я. Ланікіна

Полацка-Лепельская партызанская зона

У выніку актыўных баявых дзеянняў партызан увосень 1942 г. была створана Полацка-Лепельская зона, чацвёртая па ліку на тэрыторыі Беларусі. Да 1943 г. партызаны вызвалілі 3245 кв. кіламетраў, каля 1220 населеных пунктаў. Пад аховай партызан знаходзілася больш за 73 тыс. савецкіх грамадзян. У зону ўваходзілі Ушацкі, часткі Лепельскага, Ветрынскага, Бешанковіцкага і Полацкага раёнаў Віцебскай вобласці, Пліскі раён Вілейскай вобласці. Тут была адноўлена савецкая ўлада. Яна ўзнікла як ваенна-палітычная арганізацыя падпольных партыйных органаў і партызанскіх фарміраванняў.

У канцы 1943 г. у склад Полацка-Лепельскага злучэння ўваходзілі: брыгады імя У. І. Леніна, імя В. І. Чапаева, 2-ая Ушацкая імя П. К. Панамарэнкі, Лепельская імя І. В. Сталіна, імя К. Я. Варашылава, «Аляксея», «За Савецкую Беларусь», імя ВЛКСМ, імя С. М. Кароткіна, 16-ая Смаленская і Смаленскі партызанскі полк Віцебскай, 1-ая Антыфашысцкая Мінскай, імя ЦК КП(б)Б, «Октябрь», 1-ая імя Суворава, імя У. І. Леніна Вілейскай абласцей.

Злучэнне налічвала 17 тысяч байцоў, на ўзбраенні мелася звыш 9 тысяч вінтовак, каля 700 кулямётаў, 1577 аўтаматаў, 78 ПТР, 108 мінамётаў і 19 гармат рознага калібру. Полацка-Лепельскае партызанскае злучэнне дзейнічала пад кіраўніцтвам аператыўнай групы ЦК КП(б)Б і БШПР, створанай па загаду Цэнтральнага штаба партызанскага руху ад 28 лістапада 1943 г., на чале з упаўнаважаным ЦК КП(б)Б і БШПР Героем Савецкага Саюза У. Е. Лабанком.

З дапамогай насельніцтва была пабудавана сістэма ўмацаванняў уздоўж Заходняй Дзвіны ад Улы да Полацка, а таксама ўздоўж чыгункі ад Полацка да Крулеўшчызны, шасейных і грунтавых дарог ад Докшыц да Улы. На межах зоны ўзводзіліся ўмацаванні для кругавой абароны.

Зона была базай і тылам партызан. Мелася двухбаковая радыёсувязь з Вялікай зямлёй. На партызанскія аэрадромы і пасадачныя пляцоўкі, якія былі пабудаваны ў 1942—1943 гг., дастаўляліся зброя, боепрыпасы, медыкаменты, інструктары падрыўной справы...

Наладжвалася гаспадарка ў зоне. Аднавілі работу 2 шкіпінарна-дзягцярных заводы, 80 кавальска-слясарных, 54 скураных і 47 сталярна-бандарных майстэрань, ганчарнае прадпрыемства, некалькі майстэрань па рамонту і вырабу партызанскай зброі, абутку, вопраткі. У зоне працавалі 3 электрастанцыі, 6 млыноў. На 20 маслазаводах перараблялася льнасемя. Праводзіліся веснавая сяўба і ўборка ўраджаю.

Вялікую ўвагу надавалі партыйныя кіраўнікі і камандаванне партызанскіх фарміраванняў медыцынскаму забеспячэнню партызан і насельніцтва. У кожным атрадзе брыгады ствараліся шпіталі, для насельніцтва — амбулаторыі.

У населеных пунктах зоны ствараліся рэзервы. Імі былі тыя, хто мог трымаць зброю, гатовы да барацьбы з ворагам не на жыццё, а на смерць. З імі вяліся заняткі

па страявой падрыхтоўцы, тактыцы, вывучалася зброя, падрыўная справа. «Рэзервісты» разам з партызанамі ўдзельнічалі ў баях, дапамагалі чым маглі ў барацьбе з карнікамі. Напярэдадні і ў час карнай аперацыі «Котбус» 15 тыс. чалавек удзельнічалі ў стварэнні абарончых збудаванняў. Яны пабудавалі вялікую колькасць дзотаў і бліндажоў, 3 пасадачныя пляцоўкі для самалётаў, перакапалі грунтавыя і шасейныя дарогі Лепель — Полацк, Ула — Ушачы, Беразіно — Пышна (каля 50 км), узарвалі сотні мастоў на шасейных дарогах Віцебск — Лепель, Полацк — Лепель, Ула — Лепель, Лепель — Барысаў, Лепель — Докшыцы.

З восені 1943 г. у зону пачаўся прыток бежанцаў з Полацка, Улы, Ветрына, Фарынава, Празарокаў, Лепеля, Бароўкі і іншых населеных пунктаў, дзе размяшчаліся варожыя гарнізоны. У снежні 1943 г. іх было 7,5 тыс. чалавек. Каля 30 працэнтаў з іх былі бежанцы з Арлоўскай вобласці. Яны былі захоплены гітлераўцамі для адпраўкі ў Германію, але па дарозе ім удалося збегчы. Насельніцтва чым магло забяспечвала іх. У зоне ствараліся спрыяльныя ўмовы для паспяховай баявой дзейнасці партызан. Яна кантралявалася партызанамі амаль да поўнага вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Р. А. Чарнаглазава

Партызанскія брыгады, якія былі сфарміраваны і дзейнічалі на Лепельшчыне

Чашніцкая партызанская брыгада «Дубава»

Дзейнічала ў Лепельскім, Чашніцкім, Бешанковіцкім раёнах Віцебскай вобласці і Халопеніцкім, Бягомльскім раёнах Мінскай вобласці.

Створана ў жніўні 1942 паводле ўказання Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б на базе атрадаў 9-га (камандзір Ф. Ф. Дуброўскі) і 68-га (камандзір У. Е. Лабанок). Камандзір брыгады Ф. Ф. Дуброўскі («Дубаў»); камісары У. Е. Лабанок (жнівень 1942 — чэрвень 1943), М. В. Старынскі (ліпень 1943 — люты 1944), С. Я. Барадаўкін (красавік — чэрвень 1944); начальнікі штаба С. Я. Барадаўкін (да мая 1943), П. К. Шарко (май 1943 — чэрвень 1944).

На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй (28 чэрвеня 1944) у склад брыгады ўваходзілі 15 партызанскіх атрадаў.

1-ы атрад

Створаны ў жніўні 1942 ва Ушацкім раёне групай Ф. Ф. Дуброўскага, якая прыбыла ў варожы тыл у жніўні 1941 паводле ўказання ЦК КП(б)Б. Дзейнічаў самастойна, потым як атрад 9-ы ў складзе брыгады «Смерць фашызму» (гл. Партызанская брыгада імя В. І. Чапаева Віцебскай вобласці). У жніўні 1942 аб'яднаны з 68-ым атрадам у брыгаду. Камандзіры Ф. Ф. Дуброўскі (красавік — жнівень 1942), М. Д. Сафонаў (жнівень 1942 — лістапад 1943), У. А. Алейнікаў (лістапад 1943 — чэрвень 1944); камісары М. Ф. Карабань (красавік 1942 — ліпень 1943), П. І. Мурасін (жнівень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба М. М. Малкоў (май — верасень 1942), П. К. Шарко (верасень 1942 — сакавік 1943), І. В. Собаль (май 1943), Д. М. Касяк (ліпень — снежань 1943), І. Я. Прытула (снежань 1943 — чэрвень 1944).

2-і атрад

Створаны ў ліпені 1943 з часткі асабовага складу 1-га атрада. Камандзіры А. А. Суконька (ліпень 1943 — студзень 1944), І. Ц. Кулік (студзень — чэрвень 1944), К. М. Трыгубаў (ліпень — жнівень 1943), І. Д. Федарэнка (жнівень 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба Л. А. Гарбачоў (ліпень 1943 — чэрвень 1944).

3-і атрад

Атрад створаны ў жніўні 1942 з часткі асабовага складу атрада Ф. Ф. Дуброўскага як 2-і атрад. У ліпені 1943 перайменa-

Ф. Ф. Дуброўскі — камандзір; У. Е. Лабанок — камісар партызанскай брыгады «Дубава»

ваны ў 3-і атрад. У лістападзе 1943 атраду нададзена імя камандзіра атрада М. М. Дзідэнкі, які загінуў 11.10.1943. Камандзіры атрада М. Г. Жукаў (жнівень — лістапад 1942), І. І. Коннаў (лістапад 1942 — май 1943), М. М. Дзідэнка (май — кастрычнік 1943, загінуў), Д. І. Валькоў (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); камісары В. Ф. Вітко (жнівень — верасень 1942), М. М. Малкоў (верасень — кастрычнік 1942, в.а.), Р. І. Комар (кастрычнік 1942 — красавік 1944), А. І. Старавойтаў (красавік — чэрвень 1944); начальнікі штаба В. Д. Нікіфараў (жнівень 1942 — красавік 1943, загінуў), Д. І. Валькоў (май — кастрычнік 1943), І. Ф. Карнеенка (кастрычнік 1943 — красавік 1944).

4-ы атрад

Створаны ў ліпені 1943 з часткі асабовага складу 3-га атрада. Камандзір атрада Б. П. Звонаў (ліпень 1943 — чэрвень 1944); камісары І. Ц. Кулік (ліпень — снежань 1943), С. Я. Кісялькоў (снежань 1943 — чэрвень 1944), П. Г. Гаўрылаў (чэрвень 1944); начальнікі штаба С. Я. Кісялькоў (ліпень — снежань 1943), Ф. Д. Несцярцоў (снежань 1943 — чэрвень 1944).

5-ы атрад

Створаны ў жніўні 1943 з часткі асабовага складу брыгады як камсамольскі дыверсійны атрад. Камандзіры А. М. Кузняцоў (жнівень — верасень 1943), І. Г. Чарноў (верасень 1943 — чэрвень 1944); камісары І. Г. Чарноў (жнівень — верасень 1943), І. Ф. Гуркоў (кастрычнік — снежань 1943), Г. І. Крылоў (снежань 1943 — май 1944); начальнік штаба П. І. Міронаў (чэрвень 1944).

6-ы атрад

Створаны ў красавіку 1943 з часткі асабовага складу брыгады. У красавіку 1944 атраду нададзена імя камандзіра атрада В. Ф. Вітко, які загінуў 31.03.1944. Камандзіры атрада Д. Л. Бурко (красавік — верасень 1943), В. Ф. Вітко (верасень 1943 — сакавік 1944, загінуў), А. П. Кузьмічонак (красавік — чэрвень 1944); камісары А. І. Каранік (май — кастрычнік 1943, загінуў), В. В. Даніч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба І. Г. Чарноў (май — жнівень 1943), А. І. Кісялёў (жнівень — лістапад 1943), І. Ц. Папоў (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

7-ы атрад

Створаны ў маі 1943. Камандзір А. П. Любчык (май 1943 — чэрвень 1944); камісар І. В. Собаль (май 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба І. А. Арцёменка (май 1943 — сакавік 1944), М. В. Бесагонаў (сакавік — чэрвень 1944).

8-ы атрад

Створаны ў верасні 1943 паводле ўказання БШПР з дыверсійных груп. Камандзір атрада Л. П. Васілёнак (верасень 1943 — чэрвень 1944), камісары Г. І. Крылоў (верасень — лістапад 1943), І. Ц. Кулік (снежань 1943 — студзень 1944), С. В. Купрыкаў (студзень — чэрвень 1944); начальнікі штаба В. Д. Кірылаў (верасень — снежань 1943), І. І. Іваноў (студзень — чэрвень 1944).

9-ы атрад

Створаны ў верасні 1943 паводле загаду па брыгадзе на базе групы партызан, вылучанай з асабовага складу брыгаднай разведкі. Камандзіры атрада М. М. Бронікаў (верасень — лістапад 1943), Г. І. Крылоў (лістапад — снежань 1943), Д. М. Касяк (снежань 1943 — люты 1944, загінуў), І. А. Арцёменка (сакавік — чэрвень 1944); камісар П. С. Асташкевіч (кас-

трычнік 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба Ц. П. Сарокін (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

10-ы атрад

У сакавіку 1943 у брыгадзе створаны кавалерыйскі эскадрон, які паводле загаду па брыгадзе ў верасні 1943 пераўтвораны ў атрад. Камандзіры атрада П. К. Шарко (сакавік — май 1943), М. І. Чайкін (май — верасень 1943, загінуў), І. І. Коннаў (верасень 1943 — люты 1944), П. М. Акімаў (люты — сакавік 1944, загінуў), Р. І. Комар (красавік — чэрвень 1944); камісары М. Я. Цыкавы (сакавік — ліпень 1943), І. І. Коннаў (ліпень — верасень 1943), Ф. Д. Севярын (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба І. І. Коннаў (май — ліпень 1943), Н. Ф. Пацэйка (ліпень — верасень 1943), Р. Д. Гардзіёнак (верасень 1943 — чэрвень 1944).

11-ы атрад

Створаны ў лістападзе 1943 як дыверсійна-разведвальны атрад на базе групы М. С. Шчэрбіка. Камандзір атрада М. С. Шчэрбік (лістапад 1943 — сакавік 1944, загінуў); камісары Н. С. Журко (студзень 1944), Ф. Ф. Гайдукоў; начальнік штаба І. С. Белавусаў (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

12-ы атрад

Створаны ў маі 1943. Камандзіры атрада В. С. Клопаў (май — чэрвень 1943, загінуў), П. С. Севасцьянаў (ліпень 1943 — чэрвень 1944); камісары П. С. Севасцьянаў (май — ліпень 1943), А. М. Лужэцкі (жнівень 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба А. А. Кудраўцаў (ліпень 1943), П. І. Дэрыба (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944).

13-ы атрад

Створаны ў сакавіку 1944 на базе групы А. М. Кузняцова. Камандзір атрада А. М. Кузняцоў (сакавік — чэрвень 1944); начальнік штаба Г. І. Крацянок (сакавік — чэрвень 1944).

14-ы атрад

Створаны ў красавіку 1944 паводле загаду па брыгадзе на базе брыгаднай разведкі. Камандзір атрада П. С. Лагвіненка (красавік — чэрвень 1944); камісар М. А. Віннік (красавік — чэрвень 1944); начальнік штаба Я. Е. Дзямешка (красавік — чэрвень 1944).

15-ы атрад

У студзені 1943 у складзе брыгады пачаў ствараццa артылерыйскі дывізіён, які канчаткова сфарміраваны ў сакавіку 1943. У чэрвені 1944 артылерыйскі дывізіён перайменаваны ў атрад № 15. Камандзіры атрада А. В. Ярмаш (студзень — чэрвень 1943), Ц. А. Маркевіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944), І. С. Локцеў (чэрвень 1944); камісары І. Р. Булаўскі (студзень — люты 1943, загінуў), М. В. Старынскі (сакавік — чэрвень 1943), А. І. Дзямешка (ліпень 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба У. А. Алейнікаў (ліпень — лістапад 1943).

Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгункі Полацк — Маладзечна, Орша — Лепель, на шашэйных і грунтавых дарогах Чашнікі — Бачэйкава, Чашнікі — Лепель, Бачэйкава — Бешанковічы, Чашнікі — Чарэя, Лепель — Бачэйкава і інш. Правялі многа баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі па вызваленні тэрыторыі Лепельскага, Чашніцкага і Ушацкага раёнаў ад варожых гарнізонаў, паліцэйскіх участкаў і органаў акупацыйных улад, потым утрымлівалі вызваленую партызанскую зону. У верасні 1942 правялі некалькі наступальных аперацый на варожы гарнізон Ушачы, што прымусіла гітлераўцаў пакінуць гарадскі пасёлак. У студзені 1943 вялі баі за в. Пышна, у сакавіку разграмілі гарнізон на ст. Чашнікі, у красавіку нанеслі адначасова ўдар па 3 варожых гарнізонах у в. Забалацце, Студзёнка, Юркаўшчына Лепельскага раёна. У ліпені 1943, каб сарваць аднаўленне ворагам чыгункі Орша — Лепель, правялі баі з праціўнікам, разграмілі гарнізоны ў вёсках Цяпіна, Варкі, Залессе Чашніцкага раёна. У кастрычніку 1943 разам з Лепельскай брыгадай імя Сталіна ўдзельнічалі ў штурме варожага гарнізона ў Лепелі. У маі — чэрвені 1943 у час карных экспедыцый ворага ўдзельнічалі ў жорсткіх баях, у т.л. у раёне вёсак Пышна — Тартак — Логі —

Заазер'е (гл. Пышнянскія баі 1943); у верасні вялі абарончыя баі на рубяжы Лукомль — Чашнікі. У маі — чэрвені 1944 утрымлівалі лінію абароны каля в. Валовая Гара — Домжарыцы — Саўскі Бор Лепельскага і Бягомльскага раёнаў; прарвалі варожую абарону ў раёне вёсак Макаўе — Можніца Бягомльскага раёна. Удзельнічалі ў «рэйкавай вайне», толькі ў час аперацыі «Канцэрт» падарвалі каля 2 тысяч рэек. У чэрвені 1944 разам з савецкімі воінамі нанеслі ўдар па праціўніку пры яго адступленні ў раёне Чашнікі — Лукомль. Камандзіру брыгады Ф. Ф. Дуброўскаму і камісару брыгады У. Е. Лабанку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Лепельская партызанская брыгада імя І. В. Сталіна

Дзейнічала ў Лепельскім і Ушацкім раёнах.

Створана ў ліпені 1943 паводле ўказання Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б і Беларускага штаба партызанскага руху ў выніку разбуйнення Чашніцкай партызанскай брыгады («Дубава»). Камандзіры брыгады У. Е. Лабанок (ліпень — снежань 1943), Дз. Ц. Караленка (снежань 1943 — красавік 1944, загінуў), А. В. Ярмаш (красавік — чэрвень 1944); камісары А. В. Ярмаш (ліпень 1943 — красавік 1944), У. Л. Качан (красавік — чэрвень 1944); начальнікі штаба Дз. Ц. Караленка (ліпень — снежань 1943), М. Е. Атрашкевіч (снежань 1943 — чэрвень 1944).

На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй (29 чэрвеня 1944) у склад брыгады ўваходзілі 11 партызанскіх атрадаў.

1-ы атрад

У сакавіку 1942 у Лепельскім раёне па ініцыятыве сакратара Лепельскага РК КП(б)Б У. Е. Лабанка з мясцовых патрыётаў Ляхавіцкай, Лепельскай, Валосавіцкай, Ісафатаўскай, Несінскай і іншых падпольных груп створаны партызанскі атрад — 68-ы. Да жніўня 1942 дзейнічаў самастойна, потым у складзе Чашніцкай партызанскай брыгады «Дубава» як 3-і атрад, у ліпені 1943 перайменаваны ў атрад 1-ы. Камандзіры У. Е. Лабанок (сакавік — жнівень 1942), Дз. Ц. Караленка (жнівень — лістапад 1942, снежань 1942 — чэрвень 1943), А. А. Марунька (лістапад — снежань 1942), М. М. Малкоў (чэрвень — снежань 1943), А. Д. Каралевіч (снежань — чэрвень 1944); камісары А. А. Марунька (жнівень — лістапад 1942), М. Я. Цыкавы (лістапад 1942 — сакавік 1943, ліпень 1943 — чэрвень 1944), М. М. Малкоў (сакавік — чэрвень 1943); начальнікі штаба Д. Л. Бурко (жнівень — лістапад 1942), Д. Ц. Караленка (лістапад — снежань 1942). Г. А. Любаў (снежань 1942 — чэрвень 1943), А. Д. Каралевіч (ліпень — снежань 1943), М. А. Дзеравянка (снежань 1943 — чэрвень 1944).

2-і атрад

Створаны ў верасні 1942 на базе дыверсійнай групы Д. Л. Місунова і партызан 1-га і 2-га атрадаў. Дзейнічаў у брыгадзе «Дубава» 4-ым атрадам, у ліпені 1943 у Лепельскай брыгадзе імя І. В. Сталіна 2-ім атрадам. Група Д. Л. Місунова была заслана ў Вілейскую вобласць. Пасля гібелі камандзіра брыгады Дз. Ц. Караленкі (22.04.1944) 2-му атраду нададзена яго імя. Камандзіры атрада Д. Л. Місуноў (верасень 1942 — ліпень 1943), М. Н. Самусь (ліпень 1943 — чэрвень 1944); камісары Ф. К. Лайкоў (верасень 1942 — сакавік 1943), М. В. Гальчанка (1943 — май 1944, загінуў), А. Ц. Армонік (май — чэрвень 1944); начальнікі штаба В. І. Бурачэўскі (верасень 1942 — май 1943), М. А. Ткач (май — чэрвень 1943), М. Д. Кацубінскі (жнівень 1943 — сакавік 1944), А. П. Жукаў (сакавік — красавік 1944, загінуў), М. І. Загудаеў (май — чэрвень 1944).

3-і атрад

Створаны ў ліпені 1943 у выніку разбуйнення 4-га атрада (пазней 2-і атрад імя Дз. Ц. Караленкі). Камандзіры І. А. Сальнікаў (ліпень 1943 — люты 1944), Р. А. Сучынскі (люты — чэрвень 1944); камісары С. М. Маркін (ліпень — жнівень 1943), Р. А. Сучынскі (жнівень 1943 — люты 1944), Ф. І. Качан (красавік — чэрвень 1944); начальнікі штаба М. А. Ткач (ліпень — жнівень 1943), М. П. Чарноў (жнівень 1943 — чэрвень 1944).

4-ы атрад

Створаны ў жніўні 1943 з часткі асабовага складу 3-га атрада. Камандзір С. М. Маркін (жнівень 1943 — май 1944, загінуў); камісары Ф. Т. Пранік, М. А. Ткач (верасень 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба А. І. Хрышчанка (верасень 1943 — май 1944, загінуў).

5-ы атрад

Створаны ў лістападзе 1943. Камандзіры С. Хафізаў (лістапад 1943 — люты 1944), М. І. Кляшторны (люты — чэрвень 1944); камісары Я. П. Кажамякаў (лістапад 1943 — люты 1944), П. К. Пацэй (люты — чэрвень 1944); начальнікі штаба Д. М. Карабко (снежань 1943 — люты 1944), В. П. Андрэенка (люты — май 1944).

8-ы атрад

Створаны ў маі 1943 (да ліпеня 1943 у Чашніцкай партызанскай брыгадзе «Дубава»). Камандзіры І. М. Сісковіч (май — чэрвень 1943), М. А. Розанаў (чэрвень 1943 — чэрвень 1944); камісары А. І. Кулакоў (май — чэрвень 1943, в.а.), П. Машкін (чэрвень — ліпень 1943), П. М. Літвін (жнівень 1943 — чэрвень 1944).

9-ы атрад

Створаны ў маі 1943 у брыгадзе «Дубава». Пасля гібелі камандзіра атрада С. А. Пацэя (15.03.1944) атраду нададзена яго імя. Камандзіры С. А. Пацэй (май 1943 — сакавік 1944, загінуў), М. Д. Кацубінскі (красавік — чэрвень 1944); камісары П. П. Літвінаў (май — ліпень 1943), А. Ібраімаў (ліпень 1943 — красавік 1944, загінуў), К. Р. Пацэйка (май — чэрвень 1944); начальнікі штаба В. Н. Важдаеў (жнівень 1943 — сакавік 1944), Д. В. Полазаў (сакавік — чэрвень 1944).

13-ы атрад

Створаны ў маі 1943 (да ліпеня 1943 у партызанскай брыгадзе «Дубава»). Камандзіры атрада І. С. Алдошын (май — чэрвень 1943), П. П. Літвінаў (ліпень 1943 — 1944, загінуў), І. К. Баграцоў (красавік — чэрвень 1944); камісары П. Чэклін (май 1943), І. С. Алдошын (чэрвень 1943 — студзень 1944), І. К. Баграцоў (люты — красавік 1944), В. Д. Ерашоў (красавік — чэрвень 1944); начальнік штаба А. І. Галубятнікаў (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

Дыверсійны атрад

Створаны ў жніўні 1943. Камандзіры атрада Ю. Я. Рабінкоў (жнівень 1943 — люты 1944), А. І. Жукоўскі (сакавік — чэрвень 1944); камісар В. М. Гарчакоў (жнівень 1943 — красавік 1944, загінуў); начальнікі штаба А. М. Дастойнаў (жнівень 1943 — 1944), В. В. Косаў (красавік — чэрвень 1944).

Артылерыйскі дывізіён

Створаны ў ліпені 1943. Камандзіры М. Е. Атрашкевіч (ліпень — снежань 1943), М. І. Кляшторны (снежань 1943 — люты 1944), Я. С. Жалейка (люты — май 1944); камісар Я. С. Жалейка (ліпень 1943 — люты 1944); начальнік штаба В. П. Андрэенка (ліпень 1943 — люты 1944).

Кавалерыйскі эскадрон

Створаны ў ліпені 1943. Камандзір А. П. Панкратаў (ліпень 1943 — чэрвень 1944); камісары І. М. Сісковіч (ліпень 1943 — май 1944), І. С. Алдошын (май — чэрвень 1944); начальнікі штаба А. С. Драгалін (жнівень — кастрычнік 1943), І. М. Лях (лістапад — снежань 1943), І. С. Алдошын (студзень — май 1944), М. В. Цвяткоў (май — чэрвень 1944).

Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгуначных участках Лепель — Орша, Полацк — Маладзечна, шашэйных і грунтавых дарогах Лепель — Віцебск, Лепель — Барысаў, Лепель — Беразіно, Лепель — Бягомль, Камень — Бачэйкава, Камень — Ула і інш. Правялі многа баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, каб утрымаць свой раён дзеяння, — баі за в. Іван-Бор (верасень 1943), у раёне в. Свяда — Слабодка (кастрычнік 1943) Лепельскага раёна, разгромілі варожыя гарнізоны ў в. Катоўшчына і Парэчча (ліпень 1943), Студзёнка (верасень 1943), Забаенне (кастрычнік 1943). Толькі ў верасні 1943 у «рэйкавай вайне» падарвалі больш за 2 тысячы рэек. У ноч з 20.10. на 22.10.1943 разам з Чашніцкай брыгадай «Дубава» ўдзельнічалі ў штурме варожага гарнізона ў Лепелі, у

снежні вялі абарончыя баі каля вёсак Ліпнякі, Пуцілкавічы, Храмёнкі Лепельскага і Ушацкага раёнаў, у сакавіку 1944 за вёскі Падлобныя, Заазер'е, Забалацце Лепельскага раёна. У красавіку — маі вялі баі супраць карнай экспедыцыі нямецка-фашысцкіх войск у Полацка-Лепельскай партызанскай зоне, утрымлівалі лінію абароны на рубяжы вёсак Пышна — Забароўе Лепельскага раёна, асабліва жорсткія сутычкі з ворагам адбыліся за вёскі Забалацце, Плігаўкі, Ворань, Ізафатава, Пяскі Лепельскага, Двор Жары Ушацкага раёнаў. У маі 1944 разам з іншымі брыгадамі прарвалі варожую абарону каля вёсак Паперына, Новае Сяло Ушацкага раёна. У чэрвені 1944 разам з часцямі Чырвонай Арміі ўдзельнічалі ў баі за вёскі Шасцярні Ушацкага, Вокана і Свядзіца Лепельскага раёнаў. Камандзіру брыгады У. Е. Лабанку прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

На тэрыторыі Полацка-Лепельскай зоны ў розныя часы таксама дзейнічалі партызанскія брыгады імя В. І. Чапаева, «За Савецкую Беларусь», 1-ая Антыфашысцкая, імя К. Я. Варашылава, 2-ая Ушацкая імя П. К. Панамарэнкі, імя У. І. Леніна, 16-ая Смаленская, імя ЦК КП(б)Б, «Аляксея», імя А. В. Суворава, «Кастрычнік», імя ВЛКСМ, Смаленскі полк І. Ф. Садчыкава.

Друкуецца па кн.: Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Мн.: Беларусь, 1983.

Дакументы сведчаць

З дырэктывы СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 29 чэрвеня 1941 г. партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей

4) При вынужденном отходе частей Красной Армии угонять подвижной железнодорожный состав, не оставлять врагу ни одного паровоза, ни одного вагона, не оставлять противнику ни килограмма хлеба, ни литра горючего. Колхозники должны угонять скот, хлеб сдавать под сохранность государственным органам для вывозки его в тыловые районы. Все ценное имущество, в том числе цветные металлы, хлеб и горючее, которое не может быть вывезено, должно, безусловно, уничтожаться.

5) В занятых врагом районах создавать партизанские отряды и диверсионные группы для борьбы с частями вражеской армии, для разжигания партизанской войны всюду и везде, для взрыва мостов, дорог, порчи телефонной и телеграфной связи, поджога складов. В захваченных районах создавать невыносимые условия для врага и всех его пособников, преследовать и уничтожать их на каждом шагу, срывать все их мероприятия.

КПСС о Вооруженных Силах Советского Союза. Сборник документов. 1917—1958 гг. М.: Госполитиздат, 1958. С. 354—356.

З дырэктывы ЦК КП(б)Б ад 1 ліпеня 1941 г. партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям па разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага

2. Все местности Белоруссии, занятые врагом, должны немедленно покрыться густой сетью партизанских отрядов, ведущих непрерывную ожесточенную борьбу на уничтожение врага.

3. В районах и селах создаются подпольные партийные и комсомольские ячейки, главная задача которых — мобилизация народа на беспощадную расправу с врагом. Для этой цели все коммунисты и комсомольцы, способные носить оружие, остаются на территории, занятой врагом.

4. Подпольные организации и партизанские отряды должны иметь явочные квартиры, адреса которых сообщить военному отделу ЦК. Эти явки помогут держать связь, объединять (подпольщиков) и направлять (им) директивы и помощь.

5. Твердо помнить, что партизанская борьба не имеет ничего общего с выжидательной пассивной тактикой. Она имеет боевой наступательный характер. Не надо ждать врага — надо его искать и уничтожать.

6. Задачи партизан: уничтожать всякую связь в тылу врага, взрывать и портить мосты, дороги, поджигать склады горючего и продовольствия, автомашины, самолеты, устраивать крушения поездов. Уничтожать врагов, не давать им покоя ни днем ни ночью. Убивать их всюду, где застигнешь, убивать чем попало: топором, косой, ломом, вилами, ножом. Объединить несколько партизанских отрядов, нападать неожиданно на отряды противника и уничтожать. Особенно важно напасть на аэродромы, сжечь самолеты, перебить летчиков...

7. Нельзя ждать ни минуты, начинать действовать сейчас же, быстро и решительно.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1209. Л. 26.
Там жа. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1214. Л. 11.

Загад камандуючага 6-ай арміяй генерал-фельдмаршала фон Рэйхенау аб «Паводзінах войскаў на Усходзе»

10 кастрычніка 1941 г.

Отн.: поведение войск на Востоке.

О поведении войск по отношению к большевистской системе еще нет ясного представления.

Главной целью похода против еврейско-большевистской системы является полный разгром и искоренение азиатского влияния на европейскую культуру. Отсюда вытекают задачи, выходящие за рамки односторонних традиционных солдатских представлений. Солдат на Востоке является не только бойцом по всем правилам военного искусства, но также носителем беспощадной народной идеи и мстителем за зверства, причиненные немецкому и другим народам.

Поэтому солдат должен сознавать необходимость жестокого, но справедливого наказания еврейских недочеловеков. Другая задача — задушить в зародыше восстания в тылу вермахта, зачинщиками которых, как показывает опыт, всегда являются евреи. Борьба с врагом за линией фронта оценивается еще недостаточно серьезно. До сих пор коварных, ужасных партизан и выродившихся баб берут в плен, до сих пор с партизанами, одетыми в полувоенную или гражданскую одежду, и с бродягами обращаются как со строевыми солдатами и отправляют их в лагеря для военнопленных.

Независимо от всех политических соображений в будущем солдат должен безусловно выполнять две задачи:

1) Полное искоренение еретического большевистского учения, советского государства и его армии.

2) Беспощадное искоренение животной хитрости и жестокости и тем самым защита жизни немецкого вермахта в России.

Только такими средствами мы сможем выполнить нашу историческую задачу освобождения немецкого народа от азиатско-еврейской угрозы.

Подпись
верно: фон Кютцель, старший лейтенант

Война Германии против Советского Союза. 1941—1945. Берлин, 1995. Л. 122.

Асобы загад рэйхсфюрэра СС і начальніка нямецкай паліцыі Гімлера аб назве «Партызан»

31 ліпеня 1942 г.

Рейхсфюрер СС и начальник немецкой полиции

Хельсинки, 31 июля 1942 г.

Особый приказ!

По психологическим причинам впредь запрещено использовать слово «партизан», введенное в обиход большевиками и так ими обожаемое.

Для нас они не бойцы и солдаты, а бандиты и уголовные преступники.

Отделить этих коварных убийц от спокойного и мирного населения и тем самым лишить их какой-либо поддержки — вот важнейшее условие для их уничтожения.

Подпись: Г. Гиммлер

Война Германии против Советского Союза. 1941—1945. Берлин, 1995. Л. 132.

Першая аперацыя

Аперацыя па разгрому варожага гарнізона ў мястэчку Камень па свайму характару была камбінаванай і залежала перш за ўсё ад складанасці дзеянняў усіх трох атрадаў. Неабходна было з першых жа выстралаў раз'яднаць па колькасці амаль удвая большыя сілы праціўніка, не даць ім устанавіць узаемадзеянне і адначасовымі ўдарамі падавіць агнявыя кропкі на Царкоўнай гары, якая панавала над мясцовасцю, разграміць умацаванае памяшканне гарнізоннага інтэрната і спаліць маслазавод.

Нялёгкая задача выпала на долю 2-га атрада, які дзейнічаў з паўднёвага і паўднёва-заходняга бакоў супраць галоўных сіл праціўніка. Фашысты аказалі ўпартае супраціўленне. Сочачы за накіраваннем трасіруючых куль і ўспышкамі асвятляючых мясцовасць ракет, Лабанок падумаў, што трэба паслаць на падмацаванне ўзвод разведкі, але рашыў пакуль пачакаць.

Тым часам начны бой усё разгараўся. Гукі бою даносіліся з таго боку, дзе павінен быў размяшчацца гарнізонны інтэрнат. Успыхнулі языкі полымя на даху маслазавода. Але асабліва жорсткай была схватка на схіле Царкоўнай гары. Там бой яўна зацягваўся, што не прадугледжвалася планам аперацыі. Нечакана загрукацела на самай вышыні.

Пазней высветлілася, што дзёрзкую вылазку зрабіла частка байцоў 2-га атрада. У той час як асноўныя сілы атрада пад камандаваннем Жукава вялі бой на подступах да вышыні на тэрыторыі МТС і іншых аб'ектах, група смельчакоў на чале з камандзірам узвода Барысам Звонавым непрыкметна падабралася да варожых агнявых пазіцый на самай вышыні і закідала іх гранатамі.

Амаль адначасова бліскуча выканаў баявую задачу 3-і атрад пад камандаваннем Дзмітрыя Караленкі. Рашучым ударам ён разграміў казарму і памяшканне тэлефоннай сувязі. Фашысцкія сувязісты і ахова спрабавалі аказаць супраціўленне, але былі знішчаны.

Паспяхова справіўся са сваёй задачай і 1-ы атрад, які з боем узяў і знішчыў маслазавод. Толькі ў цагляным памяшканні МТС удалося ўтрымацца гітлераўцам. Але баявая задача ў цэлым была выканана. У баі партызаны знішчылі 35 і паранілі 18 гітлераўцаў, не страціўшы ніводнага чалавека.

Разгром варожага гарнізона ў Камені — першая буйная аперацыя брыгады Ф. Ф. Дуброўскага і У. Е. Лабанка. Прычым тут асабліва важныя былі не столькі маштабы і нанесены праціўніку ўрон, колькі сам факт нападзення некалькіх партызанскіх атрадаў на даволі важны для праціўніка і, па тых мерках, нядрэнна ўмацаваны варожы гарнізон.

В. Тараткевіч

Аперацыя на дарозе Камень—Бароўка

Кавалерийский отряд «Боевой» под командованием А. К. Флегонтова, совершая рейд из-за линии фронта, 10 сентября 1942 года достиг дер. Замошье Ушачского района, вблизи которой дислоцировалась бригада «Дубова» (Ф. Ф. Дубровского). Установив, что в военном городке Боровка расположен штаб 201-й охранной дивизии, командование отряда решило устроить засаду на шоссе Лепель — Витебск, по которому, как выяснила разведка, оживленно курсировали машины этого штаба. Выполнение задания поручили взводу под командованием И. В. Жохова. Вместе с ними на операцию пошли 11 человек из бригады «Дубова». Место засады выбрали в двух километрах от д. Боровки.

Шоссе проходило через густой смешанный лес, вырубленный по обе стороны на 150 метров. Подрывники С. Т. Агапонов, К. А. Шлыковский, А. А. Резский и другие заложили мины в трех местах. В центре — неизвлекаемую электромину с дополнительными головыми шашками, в 500 м от нее слева и справа — мины по методу «удочки», взрыв которых производился с помощью шнура.

Партизаны замаскировались среди спиленных и сложенных в штабеля бревен. В центре засады расположились расчет ПТР и пулеметчики З. Д. Сайфутдинов и М. П. Чистяков. Штурмовую группу возглавил З. Ф. Щербаков. Рядом с ними находились стрелки с бесшумными винтовками Г. А. Егоров и Ф. М. Фомин.

Гитлеровцы с самого утра 12 сентября начали проверку дороги. Пустили каток для разминирования, но партизаны завернули лошадь, тянувшую его, в лес. Затем появилась повозка с полицейскими. Подъехав к месту засады, они повернули назад, не обнаружив ничего подозрительного. Наконец показалась автоколонна. Впереди шла грузовая машина с боеприпасами, за ней две легковые. Когда головная машина подошла к центральной мине, П. Н. Литвинов не выдержал и выстрелил из ПТР. Пуля попала в мотор, и машина загорелась. В это время раздался взрыв на левом фланге: это минер С. Т. Агапонов подорвал грузовик в центре колонны. Оставшиеся в хвосте машины быстро развернулись и на большой скорости помчались обратно.

Командир штурмовой группы Зиновий Щербаков поднял бойцов в атаку. По всей линии засады разгорелся бой. Выскакивавшие из машин фашисты падали под меткими пулями партизан. Некоторые отстреливались. Десятка два гитлеровцев бросились в кювет, но были перебиты. Операция закончилась успешно. Было уничтожено 12 автомашин, из них 10 — с боеприпасами, убито около 80 солдат и трое штабных офицеров 201-й охранной дивизии.

В бою, спасая командира, погиб партизан Ф. М. Фомин. Мужество и находчивость проявили М. И. Аверин, А. Я. Булкин, С. П. Кочетков, Б. М. Макаров, Н. П. Смирнов, В. М. Сташкевич.

Друкуецца па кн.: Смирнов Н. От Москвы до Бреста. Мн., 1971. С. 19—25.

Штурм Лепеля

У пачатку восені 1943 года У. Е. Лабанок быў тэрмінова выкліканы ў Маскву. Як потым стала вядома, мелася на мэце яго назначэнне кіраўніком створанай аператыўнай групы, на якую ўскладаліся абавязкі каардынаваць баявыя дзеянні партызанскіх злучэнняў. Аднак вяртанне Лабанка некалькі зацягнулася, і ў гэты час аператыўны аддзел БШПР распрацаваў план захопу Лепеля. На мой погляд, з прыняццем такога важнага рашэння штаб паспяшаўся. Трэба было пачакаць Лабанка, чалавека, які быў надзелены ўладай кіраўніка партызанскіх брыгад. Як вядома, у адсутнасць яго кіраваць аперацыяй было даручана камандзіру брыгады «Дубава» Ф. Ф. Дуброўскаму. Ён хаця і карыстаўся аўтарытэтам, але камандзіры

іншых брыгад глядзелі на яго як на роўнага сярод роўных. І таму некаторыя з іх аднесліся да аперацыі без патрэбнай увагі. У гэтым мы і самі хутка пераканаліся.

Але загад ёсць загад. І ў першай дэкадзе кастрычніка ў вёсцы Валосавічы, дзе размяшчаўся 2-і атрад нашай брыгады, якім камандаваў Мікалай Самусь, Дуброўскі склікаў нараду каманднага саставу партызанскіх брыгад: Лепельскай (Караленка), імя Панамарэнкі (Уткін), Сенненскай (Лявонаў), «За Савецкую Беларусь» (Раманаў). Прысутнічала камандаванне брыгады імя Заслонава. Быў распрацаваны з улікам разведвальных звестак падрабязны план нападу на Лепель.

Штурм горада з паўднёва-заходняга боку павінна была ажыццявіць ударная група Лепельскай брыгады. У гэты час брыгадзе Лявонава даручалася ўварвацца ў горад на ўчастку паміж чыгуначнай станцыяй і ракой Уллянка, а брыгадзе Уткіна — нанесці ўдар з боку льнозавода.

Брыгадам імя Заслонава і Раманава даручалася блакіраваць Чашнікі і перагарадзіць шлях немцам з Віцебска на шашы каля Бешанковіч. Перад брыгадай Дуброўскага стаяла задача захапіць былы ваенны гарадок Бароўка. Штурм горада быў прызначаны на ноч з 19 на 20 кастрычніка.

Горад Лепель, як важны вузел транспартных камунікацый, займаў у планах гітлераўскага камандавання асаблівае месца. Праз яго праходзілі шасэйныя дарогі на Віцебск, Полацк, Улу, Барысаў, Бягомль, Беразіно, Докшыцы.

Вораг разумеў: калі партызанам удасца авалодаць Лепелем, то, згубіўшы яго, ён пазбавіцца і гэтых дарог. Таму фашысты ўмацоўвалі яго як маглі. У самім горадзе і вакол яго яны пабудавалі многа дотаў і дзотаў. Подступы былі густа пераплецены дротам. Акупанты ўмацаваліся ў цагляных дамах у цэнтры, а на ўскраінах неслі службу паліцэйскія. У верасні 1943 г. на дапамогу гарнізону, які налічваў 700 чалавек, прыбыла з Арлоўскай вобласці так званая Руская вызваленчая армія, камандаваў ёй Камінскі. Адзін з палкоў Камінскага пастаянна быў у Лепелі, другі ахоўваў Бароўку, трэці знаходзіўся ў розных гарнізонах. На ўзбраенні гэтай арміі было 7 танкаў, 2 браневікі, 5 гармат, 3 мінамётныя батарэі і 6 буйнакаліберных кулямётаў. Гэтае змяінае гняздо таіла ў сабе пастаянную пагрозу для партызан...

Скліканая нарада закончылася. Яе ўдзельнікі раз'ехаліся па сваіх месцах, пачалі рыхтавацца да аперацыі.

Перад нашай брыгадай стаяла складаная задача: захапіць паўднёва-ўсходнюю частку горада, якая ў народзе называецца тупіком. Там былі сканцэнтраваны асноўныя склады харчу, узбраення, фуражу, паліва. Там жа знаходзілася жывёла, якую фашысты меліся вывезці ў Германію. Непакоячыся за бяспеку гэтага месца, гітлераўцы ператварылі яго ў моцны вузел абароны, апаясалі дзевяццю дзотамі, акопамі і траншэямі. У былой машынна-трактарнай майстэрні (МТМ) знаходзілася пяць нямецкіх танкаў. Аб гэтым мы ведалі.

Рыхтуючыся да штурму пазіцый, мы разумелі, што прамой атакай іх не ўзяць. Вырашылі дзейнічаць знутры горада. Але ўзнікла пытанне: як туды трапіць? Адказ знайшлі. Наша задума была простая, хоць і была звязана з рызыкай. Стварылі штурмавую групу з 60 чалавек — чацвёртая частка атрада. Байцы групы ўзброіліся пераважна лёгкай аўтаматычнай зброяй, супрацьтанкавымі гранатамі, а таксама нажніцамі для рэзкі дроту. Узначаліць групу даручылі мне.

Месцам пранікнення ў горад выбралі ўчастак паміж МТМ і чыгуначнай станцыяй. Там менш было варожых умацаванняў. Пераадолеўшы дротавыя перашкоды, група павінна была як мага хутчэй пранікнуць у горад і з тылу атакаваць варожыя ўмацаванні.

Калі для фарміравання групы папрасілі выйсці са строю добраахвотнікаў, жадаючых аказалася больш, чым трэба. Гэта ў асноўным былі маладыя партызаны.

Заставалася апошняе: узгадніць наш план з камандаваннем брыгады. З гэтай мэтай Самусь і я 19 кастрычніка паехалі ў вёску Свядзіца на камандны пункт брыгады, каб там сустрэцца з Д. Караленкам. Звычайна будучы строгім, спакойным, Караленка быў на гэты раз прыкметна ўзрушаны. Як потым высветлілася, прычына была сур'ёзная. Караленка паслаў развед-

ку з мэтай звязацца з брыгадамі, якія будуць выступаць сумесна з намі. Аднак разведка не выявіла, дзе знаходзяцца іншыя брыгады. І здарылася гэта тады, калі да пачатку аперацыі заставалася ўсяго тры гадзіны. Не стрымалі сваіх абяцанняў і не выканалі загаду БШПР камандзір брыгады імя Панамарэнкі Уткін і камандзір Сенненскай брыгады Лявонаў. Чаму такое адбылося, заставалася толькі здагадвацца. Але адно для нас было зразумелым: цяпер прыйдзецца дзейнічаць сіламі адной брыгады.

Мы далажылі камбрыгу аб сваім плане. Ён уважліва выслухаў нас, а потым сказаў: «А вы маеце рацыю. Сапраўды, калі вораг моцны, то, як правіла, ён менш пільны. Значыць, яго можна абхітрыць. Калі не мы, то хто іншы будзе штурмаваць горад? — сказаў, падбадзёрваючы нас, камбрыг. — Бо наша брыгада носіць імя Лепельскай».

Вярнуўшыся позна вечарам у свой атрад, у вёску Малы Поўсвіж, мы зрабілі апошнюю падрыхтоўку да бою: праверылі экіпіроўку, растлумачылі аператыўную абстаноўку, паставілі задачу. У адзінаццаць гадзін ночы выйшлі на зыходныя пазіцыі. Хутка да нас падышоў і 1-ы атрад, якім камандаваў Міхаіл Малкоў. Ён паведаміў, што Караленка чамусьці рашыў 13-ы атрад пакуль што ў бой не ўводзіць.

Усе партызаны, як і было прадугледжана планам, заставаліся на зыходных пазіцыях, толькі наша штурмавая група, захоўваючы баявы парадак, рушыла па вызначанаму плану. Стаяла цёплая, ціхая ноч. Было цёмна. І гэта дзіўная цішыня насцярожвала. Але разам з трывогай нас не пакідала надзея на поспех.

Наблізіліся да дротавай загароджы. Заляглі, прыслухаліся. Праціўніка, здаецца, паблізу не было. Не губляючы часу, узяліся за справу. Разведчыкі Алег Армонік, Пётр Скамарошчанка, Мікалай Лось, Русаленка хутка перарэзалі калючку, зрабілі праходы. Штурмавікі ўмомант апынуліся на другім баку загароджы, імкліва кінуліся да цэнтра горада. У час перасячэння дарогі МТМ — чыгуначная станцыя нас заўважыў варожы патруль, распачаў страляніну. Мы не адказвалі. Упэўнена рухаліся наперад і хутка былі ўжо на вуліцы Валадарскага. Замацаваліся там. Абстаноўка накалялася...

...Разгублены ўпачатку праціўнік апомніўся, адкрыў артылерыйскі і мінамётны агонь з гарадскога стадыёна. Ажылі і кулямётныя кропкі. Але было позна. Мы захапілі ўжо варожыя траншэі. У кароткі прамежак часу, які заставаўся да нашай атакі, я дазволіў хлопцам расслабіцца. Запахла самасадам — партызаны закурылі. Пачуліся прыглушаныя галасы. Пасля доўгага маўчання хлопцам хацелася пагаварыць, пажартаваць.

Набліжаўся час атакі. Пакінуўшы ў траншэях невялікі заслон з ручным кулямётам, я аддаў загад падрыхтавацца да атакі. І вось ланцугом рухаемся ўздоўж дашчанай агароджы, што стаяла вакол МТМ, — туды, дзе былі намі зафіксаваны кулямётныя кропкі праціўніка. Але шлях групе перагарадзіў дзот, які раней мы не заўважылі, бо ён знаходзіўся за агароджай і толькі сваім кашэчым вокам паглядваў на вуліцу. На наша шчасце, кулямётчык адкрыў агонь раней, чым мы з'явіліся ў сектары абстрэлу. У гэты час я знаходзіўся да дзота бліжэй за ўсіх. Раздумваць было некалі. Падпоўз да яго па-пластунску і кінуў у амбразуру дзве гранаты. Кропка была падаўлена.

Партызаны рынуліся ў атаку. Вораг, які не чакаў нападу з тылу, зразумеў, што бой прайграны. Разгубленыя «камінцы» і паліцэйскія пакідалі зброю і кінуліся ўцякаць хто куды. У гэтай атацы мы забілі 19 і ўзялі ў палон 13 ваяк, захапілі 9 ручных кулямётаў, 17 вінтовак. Падпаліўшы нафтабазу, вярнуліся да МТМ, на свае раней занятыя пазіцыі. Але не паспелі перадыхнуць, як пачулі гудзенне матораў: гэта ў двары МТМ ажылі танкі. Яны вось-вось уступяць у бой. Трэба было знішчыць іх неадкладна. Даю каманду: «Гранаты да бою!» Вось першы танк выехаў за вароты на вуліцу, добра асветленую полымем гарэўшай нафтабазы. Мы з укрыцця кінулі некалькі гранат. Танк заскрыгатаў гусеніцамі і спыніўся. Услед за першым падбілі другі і трэці. З люкаў сталі выскокваць танкісты, але выратавацца ім не ўдалося.

Знішчыўшы танкі, мы праніклі ў двор МТМ. Там выявілі дзве 120-міліметровыя гаўбіцы, тры палкавыя кулямёты, сем грузавікоў і бранявік. Усё гэта цяпер было ў нашых руках. Была спакуса вярнуцца на базу на захопленым браневіку. Але сярод нас не было знаўцы гэтай баявой тэхнікі. Давялося ўзарваць. А вось грузавікі мы выкарысталі для перавозкі за горад зброі, харчу.

Вораг працягваў абстрэльваць подступы да горада. Прыціснутыя агнём да зямлі, партызаны 1-га і часткова 2-га атрадаў вымушаны былі заставацца на зыходных пазіцыях. Трэба было падавіць варожыя батарэі. Для гэтай мэты мы выкарысталі захопленыя мінамёты. Цяжкія міны палянцелі ў цэль. На стадыёне заціхла. Тады мы ўзялі пад абстрэл чыгуначную станцыю, якая заставалася яшчэ ў ворага. Хутка і там была падаўлена варожая кропка. Нашы хлопцы ўварваліся ў горад, не панёсшы страт. 1-ы атрад М. Малкова з ходу авалодаў станцыяй. На гэтым задача, якая ставілася перад Лепельскай брыгадай, была практычна вырашана.

Далей падзеі разгортваліся так. Падышоўшыя свежыя сілы брыгады кінуліся ў цэнтр горада, дзе ў цагляных дамах заселі фашысты, а мая група занялася вывазам захопленых палонных, зброі і харчу.

Бой у цэнтры разгараўся. Фашысты палівалі нападаючых партызан кулямётна-аўтаматным агнём. Але сіл не хапала. Мы чакалі, што вось-вось падыдуць атрады іншых брыгад. Да самай раніцы наша брыгада ўтрымлівала пазіцыі ля «пятачка». Але дапамогі так і не дачакаліся.

Наступіла пахмурная асенняя раніца. Мы атрымалі загад пакінуць горад.

Тым не менш, атрымаўшы звесткі аб паспяховых дзеяннях нашай брыгады, генерал-маёр Дуброўскі загадвае ў ноч з 20 на 21 кастрычніка аднавіць штурм горада. На гэты раз ён цвёрда абяцаў камандаванню нашай брыгады аказаць дапамогу. Як і ў першую ноч, нашы штурмавыя групы дзейнічалі на ранейшых напрамках.

Праціўнік, не паспеўшы яшчэ апомніцца ад папярэдняга ўдару, не быў гатовы да рашучых дзеянняў. Уварваўшыся ў горад, мы зноў атакавалі яго пазіцыі з тылу. Не сустрэўшы сур'ёзнага супраціўлення, забілі восем і ўзялі ў палон чатырох салдат, захапілі 7 кулямётаў і 11 вінтовак. Штурмавыя групы 1-га і 13-га атрадаў занялі чыгуначную станцыю і пачалі рухацца па вуліцы Вакзальнай да цэнтра. Там яны сустрэлі моцнае супраціўленне ворага, які засеў у былой дзесяцігодцы. Параніла аднаго з нашых кулямётчыкаў. За кулямёт лягла камісар атрада Вера Маргевіч. Яна вядзе трапны агонь па вокнах будынка. І калі агонь з боку праціўніка аслаб, Вера вырашыла змяніць пазіцыю. У час перабежкі яе скасіла варожая куля. Гэта была вялікая страта.

Нягледзячы на абяцанні Дуброўскага, і на гэты раз нашы намаганні па захопу горада не былі падтрыманы з боку іншых брыгад. Мы зноў вымушаны былі змагацца адзін на адзін з праціўнікам, які значна нас пераўзыходзіў. Пакідаючы горад, спалілі буйныя харчовыя і фуражна-рэчавыя склады, а таксама склад з боепрыпасамі. Акрамя ўсяго, мы адагналі ў партызанскую зону 750 кароў, якіх пасля раздалі насельніцтву.

Нашы дзеянні не прапалі дарэмна. Праціўніку былі нанесены вялікія страты: спалены чыгуначная станцыя, сельгаскамендатура, нафтабаза, МТМ, харчовыя і рэчавыя склады. Знішчаны пяць танкаў, восем аўтамабіляў, дзве гарматы, пяць мінамётаў, 15 дзотаў. Мы захапілі багатыя трафеі. У час аперацыі было забіта 56 варожых салдат і афіцэраў, паранена 38, узята ў палон 28. Нашы страты: трое забітых і восем параненых.

М. І. Кляшторны

Зацякляскі бой

У Лепельскі раён 1-ая Смаленская партызанская брыгада, якой камандаваў Мікіта Пятровіч Пятровічаў, прыйшла ў сярэдзіне снежня 1943 года. Атрады размясціліся ў вёсках Зацякляссе і Мядзвёдаўка.

Нялёгкім быў шлях брыгады ў беларускія лясы. З набліжэннем лініі фронту на Смаленшчыне брыгаду праследавалі карныя экспедыцыі. Амаль бяспынныя баі вяліся ў гусінскіх, ганнаўскіх і старадубіцкіх лясах. Патронаў заставалася мала — на кароткую сутычку з ворагам. Не ў кожнага партызана была зброя. Аднак у гэтых нялёгкіх умовах камандаванне брыгады не разгубілася і здолела вывесці атрады з акружэння.

Набліжаўся новы, 1944 год. Брыгада рыхтавалася да баёў, папаўнялася людзьмі. Разведчыкам, у ліку якіх знаходзіўся і я, было дадзена заданне наладзіць сувязь з жыхарамі суседніх вёсак. І людзі ахвотна дапамагалі нам. Напрыклад, у вёсцы Прудніке супрацоўнічаць з партызанамі выказалі жаданне Зіна Балотнік і Марыя Размысловіч. Яны былі верныя свайму слову.

З першых дзён свайго знаходжання на новым месцы партызаны 1-ай Смаленскай брыгады не давалі спакою фашыстам. На чыгунку і шасейную дарогу Лепель — Беразіно выходзілі спецгрупы пад кіраўніцтвам вопытнага мінёра Андрэя Глобы. Падрыўнікі ўзнімалі ў паветра масты, пускалі пад адхон варожыя эшалоны.

Не падабалася гітлераўцам такое суседства са смаленцамі. Неаднаразовыя налёты варожай авіяцыі і артабстрэлы наносілі страты партызанам, разбуралі вёску. Да вясны Зацякляссе было поўнасцю спалена. Насельніцтва эвакуіравалі ў глыб лясоў, на партызанскія базы і ў грамадзянскія лагеры. Фашысцкія самалёты раскідвалі лістоўкі, у якіх пагражалі камбрыгу і партызанам. Адчувалася, што захопнікі накопліваюць сілы, што яны маюць сур'ёзны намер расквітацца з брыгадай. Але і мы былі ўжо не тыя, што прыйшлі ў снежні 1943-га. За зіму ўсе шэсць атрадаў брыгады атрымалі добрае папаўненне, новыя кулямёты і аўтаматы. На ўзбраенні партызан былі нават процітанкавыя ружжы.

У пачатку вясны атрады поўнасцю акапаліся. У найбольш зручных месцах пабудавалі дзоты, прарылі траншэі для зносін з суседзямі. Нашаму 2-му атраду камандаванне брыгады даручыла самае адказнае месца абароны — вышыню ля ўсходняга ўскраю вёскі Зацякляссе, дзе ўстанавілі кулямёт «максім» і размясцілі разлік пэтээраўцаў. Тут жа пабудавалі два бліндажы. З гэтай вышыні можна было трымаць кругавую абарону.

Ацаніўшы пазіцыю, камандзір 2-га атрада Мікалай Палякоў прапанаваў на ўскрайку лесу падрыхтаваць фашыстам «цёплы прыём». Па чыстым полі акупанты наўрад ці пойдуць супраць кулямётаў і аўтаматаў. А вось з лесу могуць атакаваць вышыню. Тым больш, што да бліжэйшага партызанскага бліндажа ад ускрайку лесу было не больш за 20 метраў. Вырашылі замініраваць гэтыя подступы. А дзе ўзяць такую колькасць узрыўчаткі? Выхад са становішча падказаў жыхар вёскі Мядзвёдаўка Барыс Мацкевіч.

Да вайны паблізу вёскі Прудок знаходзіўся склад боепрыпасаў. Праўда, фашысты ў першыя ж дні разбамбілі яго, але пэўна нейкая колькасць снарадаў і мін засталася. Іх і выкарысталі на мініраванне. Барыс Мацкевіч прымаў у гэтым актыўны ўдзел. На кані ён прывозіў боепрыпасы ў Зацякляссе, дзе партызанскія мінёры пускалі іх у справу. На вышыні двух-трох метраў снарады і міны падвешваліся на дрэвы, старанна маскіраваліся галінкамі. Правадкі ад такіх «сюрпрызаў» таксама хавалі ад варожых вачэй. На самым узлеску пад тоўстай сасной закапалі 122-міліметровы снарад. Такім чынам даволі значная плошча лесу была, у поўным сэнсе слова, начынена «гасцінцамі».

Гэта было ў самым пачатку мая, калі адзначалася рэлігійнае свята, як называюць яго беларусы, Вялікдзень.

«Гасцей» доўга чакаць не прыйшлося. Як данеслі сувязныя і разведка, калоны гітлераўцаў раніцай 5 мая выступілі з боку вёсак Стаі, Прудніке, Аўгустова.

Фашысты імкнуліся акружыць Зацякляссе. Камбрыг Пятровічаў звязаўся па тэлефоне з брыгадай «Дубава», якая раз-

мяшчалася ў вёсцы Валова Гара, і папрасіў падмогі. На гэтым сувязь абарвалася: варожыя перадавыя атрады перарэзалі провад. Але галоўнае ўжо было зроблена: суседзі ведалі аб нашым становішчы.

Партызаны занялі кругавую абарону, затаіліся ў акопах. Заўсёды вясёлы брыгадны разведчык Жураўлёў падміргваў суседзям па траншэі: маўляў, сустрэнем, і дзелавіта раскладваў гранаты. А камандзір аддзялення Ільічоў, як заўсёды ў напружаны момант, шаптаў фразы з «Барадзіно». Адчувалася, што страху перад ворагам у партызан не было. Па акопах і траншэях пракаціўся загад: без каманды не страляць.

А вёска між тым была ўжо акружана. Як і меркавалася, фашысты накаплівалі сілы для рашаючай атакі якраз у замініраваным лесе. Паміж стваламі дрэў добра праглядваліся постаці ў варожых шынялях. Некаторыя ў адкрытую выходзілі з лесу.

Паступіла каманда: разведчыкаў нашага атрада адправіць сустракаць дубаўцаў. Пяць партызан на чале з камандзірам разведкі Яўдокавым пераваліліся цераз брустверк. Не паспелі мы адбегчы ад сваіх дзотаў метраў на пяцьдзесят і ўглыбіцца ў лес, як сустрэліся з групай карнікаў. Раздумваць было некалі. Рэзка ўдарылі нашы аўтаматы, хтосьці кінуў гранату... І затрашчэла, загуло наваколле. Бачна, нашы аўтаматныя чэргі сталі сігналам да бою.

Прыкрываючыся дрэвамі, разведчыкі адыходзілі ад ворага. Фашыстам было не да нас. Яны рынуліся на пазіцыі другога атрада. На іх шляху сталі першы дзот і аўтаматчыкі. У гэты ж час камандзір першага аддзялення другога атрада Аляксандр Кастачоў самадзельнай батарэйкай падпальваў канцы правадкоў... Адзін за другім грымелі выбухі. Стогадовыя сосны і елкі ламаліся папалам, іх з карэннем выварочвала з зямлі, падкідвала ў паветра. А разам з імі выбухі рвалі на шматкі, калечылі запрудзіўшых лес фашысцкіх ваяк.

Прыгадзіўся і зарыты на ўскрайку лесу 122-міліметровы снарад. Якраз пад той сасной уладкаваўся нямецкі кулямётчык. Сваім агнём ён прычыніў партызанам трэцяга атрада нямала непрыемнасцей. Нарэшце дайшла чарга і да сасны... Нібы на гумавай падушцы, падскочыла яна ўверх, бліснуў асляпляльны шар выбуху, і разламанае дрэва плюхнулася на зямлю, накрываючы сваімі галінамі рэшткі кулямётнага гнязда.

Бой разгараўся. Па некалькі разоў узнімаліся фашысты ў атаку, але, сустрэтыя шквальным агнём партызанскіх кулямётаў і аўтаматаў, вымушаны былі адступаць на зыходныя пазіцыі.

Пасланыя насустрач падмацаванню разведчыкі з'ядналіся з дубаўцамі і спяшаліся назад, каб ударыць па ворагу з тылу. Заўважыўшы падмогу, фашысты паспешліва пачалі падбіраць забітых і параненых. Бой стаў заціхаць. Гітлераўцы адступалі. Яны панеслі ў гэтым баі вялікія страты.

У партызанскай вёсцы Зацякляссе ўсталявалася цішыня. Займалі свае месцы пасты, сакрэты, дазоры. І раптам у гэтай цішыні нечакана скалыхнуў паветра магутны выбух. Пачуліся крыкі, стогны. Гэты выбух стаў трагічным для ўсёй брыгады. Асколкам перабіла нагу камбрыгу М. П. Пятровічаву. Загінулі многія таварышы.

А атрымалася вось што: у час бою кулямётнай чаргой перабіла провад ад адной з мін. У цяжкі момант Кастачоў, якому даручана было падрываць лес, здолеў ліквідаваць парыў. Але міна не спатрэбілася, бо атакуючыя пакінулі ўжо лес. Яна так і засталася неўзарванай. Пасля адступлення фашыстаў камандаванне брыгады і атрадаў вырашыла паглядзець на работу мінёраў. У гэты момант у бліндажы, адкуль рабіліся выбухі, знаходзіўся прыйшоўшы нядаўна з нямецкага лагера чалавек. Магчыма, гэта была запланаваная дыверсія, а магчыма — выпадковасць. Так ці інакш, але мы страцілі самых блізкіх і дарагіх людзей, баявых сяброў.

Цяжкапараненых пераправілі ва Ушацкі раён, адтуль — на Вялікую зямлю.

Адпачываць доўга партызанам 1-ай Смаленскай брыгады пасля Зацякляскага бою не прыйшлося. У хуткім часе пачалася блакада. Брыгада пакінула вёскі Мядзведаўка і Зацякляссе і накіравалася да возера Палік.

А. Кулічэнкаў,
былы разведчык 1-ай Смаленскай партызанскай брыгады

«Пасля разгрому фашыстаў сустрэнемся, усё раскажу...»

У цэнтры Лепеля, у скверы, пасля Вялікай Айчыннай вайны з'явіліся брацкія магілы. Кожны дзень каля іх праходзяць сотні людзей. Дарослыя спяшаюцца на работу, дзеці — у школу. У адной з магіл ляжыць прах рускага па пашпарту, украінца па крыві, загінуўшага на беларускай зямлі Аляксея Фёдаравіча Данукалава.

Партизаны, в атаку смелей!
Пусть единым наш будет
порыв.
За комбрига! За Алексея
Мы все дружно пойдем на
прорыв.

Такія радкі напісаў партызан брыгады «Аляксея» Д. С. Махлаеў адразу пасля гібелі праслаўленага камбрыга.

Аляксей Фёдаравіч Данукалаў нарадзіўся 29 лютага 1916 г. у вёсцы Новарасляеўка Новаўздзенскага раёна Самарскай губерні ў сям'і сялянскага каваля Фёдара Кузьміча Данукалы. Яго бацька і маці жылі на беразе Азоўскага мора, непадалёк ад Запарожжа, а ў перыяд Сталыпінскай рэформы перасяліліся ў Заволжа. Там і з'явіліся ў сям'і тры сыны і дзве дачкі, а потым у 1916 г. нарадзіўся і чацвёрты сын. Павезлі кум з кумою ў царкву ў Маўрынку хрысціць дзіця. Хросныя, паспеўшыя на радасцях прыняць лішняга, назвалі малога Аляксеем, забыўшыся, што ў Фёдара Кузьміча ўжо ёсць сын з такім імем. Калі бацюшку папрасілі памяняць імя, ён адмовіўся. Але каб не блыталі ў сям'і Аляксея-першага і Аляксея-другога, прыпісаў да прозвішча Данукало літару «в». Атрымалася Данукалов. Так з'явіўся ва ўкраінскай сям'і сын з рускім прозвішчам. А хросныя прыехалі і паведамілі, што сына назвалі Лёнькам. І звалі яго так да таго часу, пакуль не выявілі падман.

Калі яму споўніўся год, памерла маці. Усяго ў сям'і Данукалы было 12 дзяцей.

Аляксей вучыўся добра, быў завадатарам сярод камсамольцаў вёскі, першым удзельнікам мастацкай самадзейнасці. Спяваў, чытаў вершы, танцаваў, біўся на кулаках, скакаў на конях. Пасля сямі класаў паступіў у Балашоўскі сельгастэхнікум і ў 1936 г. стаў механікам. Працаваў у Омскай МТС Іркуцкага раёна загадчыкам рамонтных майстэрань. 17 кастрычніка 1937 г. яго прызвалі ў Чырвоную Армію. Служыў у артылерыі. А ў 1941 г. закончыў Іркуцкае ваенна-палітычнае вучылішча. Перад самай вайной з воінскім эшалонам Аляксей ехаў на захад. На станцыі Маўрынка быў прыпынак. А гэта побач з родным сялом. Забег на некалькі хвілін дамоў развітацца.

Сухія радкі энцыклапедычных выданняў расказваюць аб ваенным лёсе А. Ф. Данукалава: з чэрвеня 1941 г. на фронце. Удзельнічаў у абароне гарадоў Лепель, Орша, Смаленск. Пачынаў вайну палітруком танкавага ўзвода. У жніўні 1941 г. трапіў у акружэнне, арганізаваў партызанскі атрад «Радзіма», які дзейнічаў у Смаленскай і Віцебскай абласцях. Меў партызанскую клічку «Аляксей». З красавіка 1942 г. быў камандзірам партызанскай брыгады «Аляксея».

Калі ў 1942 г. ён стварыў партызанскую брыгаду, яму было 26 гадоў. А загінуў Аляксей Фёдаравіч Данукалаў у 28 гадоў.

Ён не збіраўся быць ваенным. Па ўспамінах былога партызана брыгады «Аляксея» М. Грыгор'ева, Аляксей Фёдаравіч пасля вайны марыў вярнуцца дамоў і працаваць механізатарам. Хаця ўсе адзначалі ў яго талент палкаводца. Яго любілі і партызаны.

За перыяд крыху больш за год (1942—1943 гг.) брыгада арганізавала 82 засады на дарогах, разграміла 10 гарнізонаў, 17 паліцэйскіх і валасных управаў, пусціла пад адхон 44 эшалоны. У пачатку 1944 г. брыгада перадыслацыравалася ва Ушацкі раён.

Немцы баяліся Данукалава. За галаву Аляксея яны абяцалі 100 тысяч рэйхсмарак і маёнтак.

У час апошняй карнай экспедыцыі немцаў супраць партызан у красавіку 1944 г. аляксееўцы вялі цяжкія абарончыя баі. 26 красавіка на тэрыторыі партызанскага шпіталя быў зроблены замах на жыццё А. Ф. Данукалава. На наступны дзень, 27 красавіка, у вёсцы Вялікія Дольцы ў час

А. Ф. Данукалаў

бамбёжкі Данукалаў знаходзіўся ў штабе. Калі самалёты паляцелі, з укрыццяў сталі выходзіць людзі. З-пад абломкаў суседняга са штабам дома хтосьці клікаў на дапамогу. Туды кінуўся камбрыг. У гэты час з-за лесу на брыючым палёце з'явіўся «юнкерс». З яго пасыпаліся бомбы. Асколкам быў цяжка паранены А. Ф. Данукалаў і на шляху ў шпіталь памёр.

Фашысты баяліся нават мёртвага Данукалава. Пасля адступлення партызан яны дасталі з зямлі труну з целам, сфатаграфавалі, а потым абклалі толам і ўзарвалі.

У 1946 г. прах А. Ф. Данукалава перавезлі ў Лепель, у цэнтр горада.

Шмат гора прынесла вайна ў сям'ю Данукалы. Першы сын, Аляксей, рэдактар газеты ў Пензе, пайшоў на фронт. На Курскай дузе быў цяжка паранены і пасля шпіталя памёр дома ў снежні 1943 г. Уладзімір дайшоў да Аўстрыі. Трэці брат, Юрый, цяжка параненым трапіў у палон пад Севастопалем. Пяць разоў спрабаваў уцячы. На шосты раз яго спроба ўдалася, дабраўся да Францыі, трапіў да саюзнікаў. Вярнуўся дамоў хворы на туберкулёз і ў верасні 1946 г. памёр.

А ад Аляксея Фёдаравіча Данукалава бацькі атрымалі пісьмо толькі ў верасні 1942 г. Паведаміў, што часова знаходзіцца ў Маскве, але хутка адправіцца на выкананне баявога задання. «Пасля разгрому фашыстаў сустрэнемся. Усё раскажу», — пісаў ён родным. Але больш бацькі не атрымалі ні радка.

У 1945 г. сям'і ўручылі грамату Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. У ёй гаварылася, што за гераічны подзвіг, праяўлены пры выкананні баявых заданняў у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у тыле праціўніка, і за асаблівыя заслугі ў развіцці партызанскага руху ў Беларусі Данукалаву Аляксею Фёдаравічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Атрымала сям'я таксама паведамленне аб яго гібелі.

Такое кароткае жыццё легендарнага партызанскага камбрыга. Ён быў адным з самых маладых і, бадай, самых любімых партызанскіх камандзіраў Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. І з таго часу на працягу 50 гадоў былыя партызаны брыгады А. Ф. Данукалава пастаянна прыязджаюць на магілу свайго камандзіра. Робяць гэта самастойна, па закліку сумлення і памяці. Аляксей Фёдаравіч пакінуў аб сабе добрую памяць у сэрцах людзей, з якімі побач ваяваў, каго абараняў. А ў вёсцы Новарасляеўка ён назаўсёды застаўся Лёнькам (Аляксеем), які пайшоў на вайну і не вярнуўся назад.

А. У. Стэльмах

МОГИЛЫ В СКВЕРЕ

Майским солнцем все вокруг залито,
Тополя склонились в тишине...
Только обелиски из гранита
Здесь напоминают о войне.

Уходить не хочется отсюда.
Ты, куда б, товарищ, ни спешил,
Задержись хотя бы на минуту
И постой у этих трех могил.

За строкой строка на лентах алых —
Благодарность памяти людской.
И глядит бесстрашный Данукалов
Сквозь десятилетья, как живой.

Эти незнакомые солдаты
В землю белорусскую легли,
От оков спасли ее когда-то,
Хоть себя они не сберегли.

Сколько песен было недопето —
Им теперь уже не рассказать.
И у каждого остались где-то
Сын, жена или седая мать.

Здесь шаги становятся чуть тише,
А вокруг кипит, смеется жизнь...
Ты, товарищ, подойди поближе,
У могил священных поклонись.

Р. Гольдзіна

Браты-артылерысты

У час Вялікай Айчыннай вайны партызанілі ва ўшацкіх лясах чатыры браты Маляўкі. Два былі родныя, два — стрыечныя. Усе з вёскі Дзяньгубы. Старэйшы з іх — Сцяпан Дзям'янавіч з першых дзён арганізацыі актыўнай барацьбы з акупантамі стаў сувязным. Хтосьці са здраднікаў паведаміў аб гэтым фашыстам. Прыйшлося ўсёй сям'ёй тэрмінова ісці да партызан. Зроблена гэта было своечасова, бо назаўтра акупанты наляцелі на вёску, шукалі іх.

Так аказаліся ў першым атрадзе брыгады імя Сталіна два Сцяпаны, Іван і Міхаіл Маляўкі. Апошні з іх быў самым маладым, яму не споўнілася яшчэ і 16 гадоў.

Міхаіл Дзям'янавіч стаў партызанскім разведчыкам. Нямала заданняў камандавання выканаў ён. У 1944 г. пры прарыве блакады яго параніла фашысцкая куля.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў усе чацвёра трапілі на фронт.

— Памятаю, пастроілі нас і загадалі: у каго ёсць сем класаў адукацыі, выйсці наперад. Я і мае стрыечныя браты Іван Антонавіч і Сцяпан Мікалаевіч зрабілі некалькі крокаў. А родны брат Сцяпан Дзям'янавіч застаўся ў страі. Не давялося яму закончыць сямігодку. Так мы расталіся з ім, — расказвае Міхаіл Дзям'янавіч.

Трох братоў накіравалі ў палкавую школу артылерыстаў, праз два з невялікім месяцы курсантам прысвоілі сяржанцкія званні.

— Ты, Міхаіл, старшы па званню, схадзі да начальства, папрасі, каб нас хаця б у адну батарэю накіравалі, — падказалі яму браты.

Камандаванне задаволіла іх просьбу. Братоў прызначылі не толькі ў адну батарэю, а нават у адзін разлік. Міхаіл стаў камандзірам 76-міліметровай гарматы, Іван — наводчыкам, а Сцяпан — зараджаючым. Іх батарэю накіравалі ў 76-ы артылерыйскі полк 145-ай стралковай дывізіі. Ваявалі ў Прыбалтыцы. Дывізія была ўдарнай, яе перакідвалі з прарыву ў прарыў.

Першы бой быў няўдалым. Батарэі загадалі заняць закрытую агнявую пазіцыю. За ноч трэба было акапацца, гэта значыць падрыхтаваць радыусам 3,5 метра месца для ўстаноўкі гарматы, зрабіць бруствер, выкапаць ровік для захоўвання боепрыпасаў і ўкрыцця разліку. Да раніцы так-сяк справіліся. Пачалі прыстрэлку. І тут іх засеклі варожыя карэкціроўшчыкі. Шквальны агонь абрушыўся на батарэю. Дзве гарматы, у тым ліку і іхняя, былі выведзены са строю.

— Не злічыць усіх баёў, — расказвае далей Міхаіл Дзям'янавіч, — па-рознаму ваявалі. Неаднойчы прыходзілася ставіць гарматы на прамую наводку і біць па танках. Цяжкія для нерваў такія баі. Танк рухаецца, манеўруе, а мы прыкаваны да аднаго месца. Таму галоўным для сябе лічылі трапны выстрал. У ім было наша выратаванне. І трэба сказаць, нам шанцавала, хаця баявых сяброў страціў нямала. А вось па атакуючай пяхоце было страляць куды весялей. Іншы раз ад беглага агню ствол гарматы раскаляўся так, што з яго злазіла фарба.

За адзін з такіх баёў з танкамі Міхаіла Дзям'янавіча ўзнагародзілі медалём «За адвагу».

Ужо пасля вайны Маляўкі даведаліся, што чацвёрты брат — Сцяпан Дзям'янавіч таксама ваяваў артылерыстам. Ён камандаваў разлікам саракапяткі. Гэта невялікая гармата рухалася заўсёды з атакуючымі, прамой наводкай знішчаючы кулямётныя дзоты, жывую сілу, бронемашыны. Сцяпан Дзям'янавіч ваяваў на Берлінскім напрамку, штурмаваў варожае логава, быў двойчы паранены. Яго баявы шлях адзначаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Славы III ступені, шматлікімі медалямі.

Пашанцавала братам. Усе чацвёра вярнуліся з вайны.

В. Хаванскі

Партызанскі камісар

А. А. Марунька

У Саснягоўскай пушчы летам 1941 г. быў створаны партызанскі атрад. Узначаліў яго першы сакратар Лепельскага падпольнага райкама партыі У. Е. Лабанок. Камісарам стаў Анатоль Марунька.

Час быў нялёгкі. У перыяд свайго станаўлення партызанскі рух перажываў значныя цяжкасці. Не хапала зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў, не было вопыту барацьбы з ворагам. Былы камандзір Чырвонай Арміі Марунька прыклаў нямала сіл для іх пераадольвання, вучыў людзей ваеннай справе, выхоўваў у іх любоў да Радзімы, нянавісць да ворага. Праявіў сябе ўмелым палітработнікам. «У цяжкую хвіліну, — як сказана ў справаздачы партызанскай брыгады, — ён заўсёды знаходзіў словы, каб падбадзёрыць байцоў, асабістым прыкладам вёў іх за сабой». Неўзабаве стаў другім сакратаром падпольнага райкама партыі.

У жніўні 1942 года была створана партызанская брыгада «Дубава». Камісарам 3-га атрада прызначылі Анатоля Адамавіча. Разам з камандзірам атрада Д. Ц. Караленкам распрацоўваў аперацыі, прымаў удзел у іх правядзенні. Адной з першых аперацый быў разгром варожага гарнізона ў мястэчку Камень. Камісар знаходзіўся ў гушчыні бою. А нямногім больш як праз тыдзень — новая буйная ўдача. На дарозе Віцебск — Лепель была зроблена засада.

«Мне пашчасціла блізка ведаць Анатоля Маруньку, — дзеліцца ўспамінамі былы камісар 13-га камсамольска-маладзёжнага атрада В. Д. Ерашоў. — Ён любіў людзей, і яны плацілі яму тым жа. У баі імкнуўся перамагаць ворага розумам і ваеннай хітрасцю. Стараўся берагчы партызан. Вельмі душэўна заўсёды гаварыў з імі. Словы яго даходзілі да сэрца кожнага і пакідалі глыбокае ўражанне. У яго быў прыроджаны талент педагога».

У хуткім часе абставіны склаліся так, што камісар узначаліў 3-і атрад. Пад яго камандаваннем было праведзена некалькі аперацый. Адна з іх — бой за Пышна — упісана ў партызанскі летапіс. Гэта мястэчка служыла як бы варотамі ў партызанскую зону з боку Лепеля. Недарэмна фашысцкае камандаванне імкнулася вярнуць сабе гэты важны населены пункт. 22 снежня 1942 г. яно кінула ў бой з народнымі мсціўцамі да батальёна салдат.

Вось як апісваецца гэты бой у справаздачы брыгады: «Атрад пад камандаваннем Марунькі, які ахоўваў гарнізон, завязаў бой з ворагам на ўскрайку лесу ў двух кіламетрах ад Пышна. П'яныя фашысты ўсё лезлі і лезлі... Былі моманты, калі здавалася, што вось-вось яны ўварвуцца на ўзлесак. Але гучны голас адважнага камандзіра ў цяжкую хвіліну падбадзёрваў байцоў, і вораг не вытрымліваў нашага агню, адкатваўся назад. Падышло падмацаванне. Фашысты адступілі. Больш за 40 забітых пакінулі яны на полі бою». Гэты бой быў апошнім для камандзіра. Ён гераічна загінуў.

Пахаваны партызанскі камісар і камандзір Анатоль Адамавіч Марунька ў Лепелі, у скверы на плошчы Свабоды. Яго імем названа Старалепельская васьмігадовая школа, адна з новых вуліц горада.

Д. Зарэцкі

Адважная партызанка

В. А. Маргевіч

Калі да жыхароў вёскі Гарані былога Несінскага сельсавета прыйшла страшная вестка аб пачатку вайны, сям'я Маргевічаў адразу вырашыла, што яе справа — змагацца з ворагам. І Вера, якая толькі-толькі закончыла Магілёўскае культасветвучылішча, неўзабаве арганізавала падпольную групу, а ў хуткім часе стала сакратаром падпольнай камсамольскай арганізацыі. Першыя крокі, вядома, былі не такімі ўжо і прыкметнымі, але яны мелі вельмі важнае значэнне для далейшага разгортвання барацьбы. Збіралі і хавалі да часу зброю, вялі растлумачальную работу сярод вяскоўцаў.

У канцы жніўня 1941 г., калі ў раёне ўжо дзейнічаў падпольны райкам партыі, несінскія патрыёты ўстанавілі з ім сувязь і пачалі выконваць заданні партыйнага кіраўніцтва. Яны бывалі ў варожых гарнізонах Бачэйкава, Камень, дабіраліся нават да Лепеля. Збіралі каштоўныя звесткі, вывучалі настрой жыхароў, сустракаліся з вернымі людзьмі. У Каменскім гарнізоне паліцыі быў аднакласнік Веры. Ад яго атрымлівала патрэбную інфармацыю аб размяшчэнні агнявых кропак, наяўнасці зброі...

Была Вера адчайная, рызыкоўная. Вось аб якім выпадку расказала блізкая сяброўка Веры Маргевіч. Былая падпольшчыца і партызанская медсястра Анастасія Максімаўна Булух успамінае:

— Неяк у вёсцы Баброва арганізавалі вечарынку.

Былі і мы там. Вера пайшла танцаваць з адным паліцэйскім. Непрыкметна паклала ў яго кішэню лістоўку, у якой быў змешчаны заклік сабатаваць загады акупантаў, весці супраць іх бязлітасную барацьбу. Такі ўчынак мог закончыцца трагічна...

Час ішоў, накопліваўся вопыт. І тым не менш засцерагчыся ад правалу не ўдалося. Знайшоўся здраднік, які выдаў арганізацыю. Пачаліся арышты. Уся сям'я Маргевічаў паспела ўцячы ў лес. Бацька і маці, два браты і Вера сталі партызанамі. Яна здабыла для сябе нямецкую зброю ў першым жа баі, калі грамілі гарнізон у вёсцы Іванск, на тэрыторыі Чашніцкага раёна. У хуткім часе яе прызначылі другім нумарам кулямётнага разліку.

У маі — чэрвені 1943 г. у час карнай экспедыцыі разгарнуліся жорсткія баі ў раёне Пышна—Тартак—Заазер'е. Атрад, у якім знаходзілася кулямётчыца, прымаў у іх непасрэдны ўдзел. Вера вяла сябе смела. Калі першы нумар быў паранены, заняла яго месца і працягвала трапна біць фашыстаў.

Да таго часу яе прынялі ўжо кандыдатам у члены партыі. Адважную партызанку прызначылі палітруком роты.

«Асіным гняздом» называлі партызаны Лепель. Тут знаходзіліся народнікі, паліцэйскія, іншыя здраднікі, шпіёны. Горад быў буйным апорным пунктам па барацьбе з партызанамі. Яго пастаянна ўмацоўвалі. У верасні 1943 г. сюды прыбыла брыгада здрадніка Камінскага. Апрача таго, стаялі нямецкія пяхотны полк, танкавы батальён, дзве артылерыйскія і адна мінамётная батарэі. Сілы немалыя...

Беларускі штаб партызанскага руху добра разумеў, якая небяспека вісіць над партызанамі зоны. Была распрацавана аперацыя па разгрому гарнізона. У яе ажыццяўленні прымалі ўдзел аб'яднаныя сілы некалькіх партызанскіх брыгад, у тым ліку Лепельскай брыгады імя Сталіна.

Наступленне пачалося ў ноч на 20 кастрычніка. Удалося ачысціць ад ворага ўскраіны горада. Атрады з боем рухаліся да цэнтра. Штурмавая група першага атрада заняла чыгуначную станцыю, камендатуру, знішчыла больш за 20 варожых

салдат. У першых радах нападаючых знаходзілася палітрук роты Вера Маргевіч.

Ды варожая куля падсцерагла яе ў самы разгар бою. Пахавалі Веру на партызанскіх могілках у вёсцы Пораўна на Ушаччыне. На магіле паставілі помнік.

Камсамольцы і моладзь Лепеля ўвекавечылі яе памяць. На Доме культуры ўстанавілі мемарыяльную дошку. На ёй партрэт дзяўчыны і надпіс: «У баі за горад Лепель 20 кастрычніка 1943 года загінула смерцю храбрых палітрук роты Лепельскай партызанскай брыгады імя Сталіна Маргевіч Вера Аляксандраўна».

Д. Зарэцкі

Даведка аб сям'і Маргевіч

Дана настоящая тов. Маргевич Пелагее Николаевне в том, что она и все члены их семьи — Маргевич Александр Павлович, Маргевич Вера Александровна и Маргевич Анатолий Александрович — являлись членами антифашистской подпольной организации, в которой активно работали по сбору оружия, распространению антифашистских листовок и т. д.

В августе месяце 1942 года вся семья Маргевич вступила в партизаны Лепельскай бригады имени Сталина.

Сын Маргевич П. А. — Маргевич Анатолий Александрович, с целью разложения полиции, партизанами был послан на службу в полицию. Будучи полицейским, тов. Маргевич доносил ценные разведывательные сведения о противнике. Впоследствии организовал среди полицейских заговор и с группой в количестве 5 человек с полным вооружением и боеприпасами перешел на сторону партизан.

Маргевич Вера Александровна, находясь в партизанском отряде, вначале была пулеметчицей, а затем помощником комиссара партизанского отряда по комсомолу.

За время пребывания в отряде т. Маргевич проявила себя бесстрашной патриоткой, преданной дочерью нашей Родины. В октябре 1943 года в боях за город Лепель т. Маргевич В. А. героически погибла.

Маргевич Александр Павлович также погиб в боях с немецкой карательной экспедицией в мае месяце 1943 года.

Вся семья Маргевич показала себя истинными патриотами нашей Родины.

Командир соединения партизанских бригад
Полоцко-Лепельской партизанской зоны
Герой Советского Союза полковник /Лобанок/

Дакументы сведчаць

№ 90
286-я охранная дивизия, оперативный отдел.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 943. Л. 214—215.

З аператыўных зводак разведаддзела пры штабе групы армій «Цэнтр» аб дзейнасці партызан

15.01.1944 г.

...Высвобождение дороги Лепель—Борисов натолкнулось на многочисленные дорожные заграждения и упорное сопротивление банд из бункеров и полевых укреплений, которое было сломлено лишь с использованием танков. Банды начали отступление на запад и юго-запад. Северо-восточнее и северо-западнее озера Лукомльское бандитский фронт оттеснен дальше на юг.

11.01.1944 г. банда в 300 чел. на 200 санных упряжках севернее озера Лукомльское проследовала на юг.

...В ходе операции «Бронислав» после ожесточенных боев с частями бригады «Дубова» на укрепленных полевых позициях и применения нами танков были захвачены дер. Староселье, Слобода и Свяда. Бандиты отступили на запад и юго-запад. После занятия нами Лукомля, банды преследовались на протяжении 9 км на юг. В ходе слабого сопротивления противника нами заняты дер. Слободка (15 км юго-западнее Чашников), Качино, Ковалевичи.

13.01.1944 года, во второй половине дня, снова на дороге Улла — Ловжа севернее дер. Буболи автомашины были обстреляны из пулеметов.

17.1944 г.

Освобождение дороги Лепель — Борисов наталкивается на ожесточенное сопротивление противника в районе дер. Гадивля, однако все же удалось потеснить банды северо-западнее озера Лукомльское дальше на запад.

14.01.1944 г.

...Произошло 5 вооруженных столкновений с бандами, в том числе:

а) в ходе операции «Бронислав» 12 и в ночь на 13.01.1944 занятая нами дер. в 8 км южнее Лепеля подверглась обстрелу из минометов и безуспешному нападению слабых бандитских групп. 13.01.1944 года с боем взяты дер. Свядица (9 км южнее Лепеля) и Лукомль.

б) Бой с бандитской группой 500 м восточнее Пышно.

в) 1 подрыв на мине, повреждение линии связи юго-западнее Пышно (вырезано 500 м провода).

22.02.1944 г.

...На территории 3-й танковой армии отмечается нарастающая активность банд в районе вокруг дер. Камень. Неоднократные бои с бандитами и обстрелы ими наших опорных пунктов на дороге и западнее дороги Камень — Улла...

25.02.1944 г.

...Произошло 5 вооруженных столкновений с бандитами при этом:

а) 22.02.1944 г. нападение 200—300 бандитов, вооруженных минометом, станковым пулеметом и противотанковым ружьем, на опорный пункт Лука (4 км северо-западнее Сенно, забрано 52 лошади).

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Адз. хр. 1065.

З дзённіка сакратара Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б І. Б. Пазнякова

2 августа 1943 г. После окончания боев с карательной экспедицией мною был отдан приказ шести партизанским бригадам зоны об одновременном ударе по коммуникациям врага.

...На шоссейной дороге Улла — Камень разгромлен гарнизон в деревне Сокорево. На дороге Витебск — Лепель уничтожен гарнизон в деревне Свеча и взорван мост длиной в 15 метров.

В селе Бочейково разгромлен крупный немецкий гарнизон и в нем уничтожено: склад горючего, 3 трактора, 3 автомашины, склад боеприпасов, сельхозсклад и склад с 206 веломашинами, склады с 10 тоннами зерна и 200 тоннами сена; уничтожена военная мастерская, узел связи. Захвачена база со скотом, где находилось 150 коров, 210 овец, 50 свиней и 50 лошадей.

Разгромлен... гарнизон Котовщина. Данную операцию выполнял отряд бригады им. Сталина. При выполнении этих операций было уничтожено до 100 человек немецких оккупантов. Наши потери составили 17 человек убитыми, и 23 человека было ранено...

4 августа 1943 года. Партизанский художник Гутиев нарисовал и по трафарету размножил плакат о проведенной нами

операции. Плакат назывался «Били, бьем и будем бить!». Экземпляры его путешествовали по всей округе. Вот и получилось, что совершенная партизанами боевая операция приобрела не только военное значение, но и окончательно разоблачила фальшивую гитлеровскую пропаганду о том, что партизаны уничтожены и их больше в данной зоне не существует... Мы живы и беспощадно бьем врага!

Друкуецца па кн.: Сергеев В. М. Красная лента. 2-е изд., доп. М.: Политиздат, 1979. С. 65—66.

Лясная друкарня

Ішоў другі год вайны. Падпольны райкам партыі зацвердзіў мяне рэдактарам газеты «Калгасная праўда». Патрабаваліся станкі, шрыфт. Да вайны я працаваў адказным сакратаром ушацкай раённай газеты, таму ведаў, дзе што было схавана з яе друкарні.

З групай у 5 чалавек паехалі ва Ушачы. Там дзейнічалі партызаны брыгады Мельнікава. Дасталі мы з калодзежа ціскальны станок. У вёсцы Ваўчо забралі паперу ў рулонах і друкарскую фарбу. Усё гэта даставілі ў лагер ля вёскі Антунова, дзе размяшчалася партызанская брыгада імя Сталіна.

Аднойчы ў мястэчка Ушачы па справах завіталі былы памочнік начальніка штаба брыгады У. Л. Качан і партызан Р. Шчэрбін. Выпадкова іх сустрэла жонка даваеннага намесніка рэдактара тутэйшай раённай газеты Міхаіла Іванавіча Плігаўкі. Яна запрасіла партызан на кватэру і сказала:

Рэдакцыя газеты «Калгасная праўда» Лепельскага падпольнага РК КП(б)Б

— Чула я, што ў вашай брыгадзе ствараецца друкарня. Я для яе захоўваю падарунак — зусім новы шрыфт.

Падзякавалі партызаны. Добры падарунак для лясной друкарні. Гэты шрыфт рэдакцыя атрымала перад самай вайной. Так і застаўся ён у пачках, не разабраны па касах. Плігаўка асноўную яго частку зберагла.

З вёскі Пліна прыйшлі нашы былыя наборшчыцы Вольга Конах і Насця Кослава. У трэцім атрадзе кулямётчыкам быў Уладзімір Рыгоравіч Качан, які да вайны працаваў наборшчыкам. Запрасілі і яго. Уцёк ад фашыстаў і старшы наборшчык Ілья Тарасавіч Пранік. Ім даручылі разбіраць шрыфт. Даставілі касы і рэалы. Камандзір трэцяга атрада Д. Ц. Караленка наборшчыкам выдзеліў самую вялікую зямлянку. Правялі туды электрасвятло. Друкаром стаў П. В. Красноў, які да вайны закончыў чатыры курсы БДУ. Ён пісаў байкі, сатырычныя куплеты, вершы. Карэктарам была настаўніца Ія Аляксандраўна Ягорава.

У студзені 1943 г. надрукавалі зводку Саўінфармбюро. Мастак М. Гуціеў на ліналіуме выразаў загаловак «Вести с Советской Родины». Зверху — Крэмль, а затым танк з зоркай. На танку надпіс: «Наперад, на захад!».

Першы нумар газеты рыхтавалі з вялікім хваляваннем. Перадавы артыкул называўся «Блізка час расплаты». Апублікавалі паведамленне аб зацвярджэнні нагруднага значка «Выдатны разведчык». Паведамілі чытачам аб тым, што ў Грузіі пачалася сяўба. Хлебаробы нясуць працоўную вахту, каб даць фронту больш прадуктаў.

Другая паласа адкрывалася аглядам ваенных дзеянняў Чырвонай Арміі. Тут

жа расказалі пра баявыя справы 13 атрадаў брыгады: «Вынікі засады», «Поспех падрыўнікоў», «Гараць эшалоны». Пісалі і аб зборы сродкаў на будаўніцтва танкавых калон і самалётаў.

З першых дзён райкам партыі аператыўна кіраваў друкаваным органам. Кожную раніцу ў радыста брыгады М. Ладзіка мы бралі новую зводку Саўінфармбюро. Яе выпускалі асобна, бо газета выходзіла толькі два разы ў тыдзень.

Газета вяла вялікую работу сярод насельніцтва. Яна знаёміла з падзеямі на франтах, расказвала аб задачах, якія стаяць перад працоўнымі раёна, заклікала не даваць хлеба, фуражу ворагу, выкрывала зверствы гітлераўцаў.

У артыкуле «Беларусь была і будзе свабоднай», апублікаваным 14 красавіка 1943 г., гаварылася: «Захопнікі хочуць ператварыць нашу рэспубліку ў сваю калонію, а беларусаў зрабіць рабамі. Фашысты разграбілі культурныя цэнтры, захапілі фабрыкі, заводы. На акупіраванай тэрыторыі асядаюць памешчыкі...» Артыкул заклікаў савецкіх людзей браць у рукі зброю і біць няшчадна гітлераўцаў і іх халуёў. «Чым больш трупаў фашысцкіх сабак будзе ўсцілаць беларускую зямлю, тым бліжэй час перамогі», — гаварылася ў артыкуле.

З нумара ў нумар газета публікавала дакументы, якія выкрывалі крыважэрны твар фашыстаў, паказвала іх злачынствы, называла прозвішчы закатаваных людзей. І насельніцтва цэлымі сем'ямі ішло ў партызаны. Вярбоўка ў Германію правалілася. Тады гітлераўцы пачалі гвалтоўны вываз людзей, асабліва моладзі. У ліпені 1943 г. «Калгасная праўда» пісала: «Зрывайце фашысцкую мабілізацыю, не давайцеся ў драпежныя лапы ворага!»

Газета-партызанка выходзіла тыражом 300—500 экземпляраў, не хапала паперы.

У лясной друкарні выдавалася 5 раённых газет: «Калгасная праўда», «Прымежны калгаснік», «Сцяг сацыялізму», «Чырвоная звязда» і «Сталінец» (Лепель, Ушачы, Чашнікі, Ветрына, Бешанковічы).

Апрача гэтага, друкаваліся «Вести с Советской Родины», звароты да насельніцтва, лістоўкі, плакаты.

Вялікія цяжкасці былі ў рэдакцыі і друкарні. Часта спынялі работу, уліваліся ў атрады і са зброяй у руках білі фашыстаў. Калі завязваліся адкрытыя баі, друкарня працавала, а журналісты апісвалі мужнасць, гераізм партызан і камандзіраў. Выязджалі яны на чыгунку знішчаць эшалоны, многа разоў хадзілі ў засады.

Падпольная газета «Калгасная праўда» была сапраўдным агітатарам, прапагандыстам і арганізатарам мас на барацьбу з лютым ворагам — фашызмам.

К. Пацэйка,
былы рэдактар падпольнай газеты
«Калгасная праўда»

Паветраны змей

Ідэя стварэння паветранага змея для раскідвання лістовак, быццам бы з лятучага самалёта, прыйшла Мішу Чайкіну, ад'ютанту камбрыга. Міша яшчэ нядаўна хадзіў займацца ў гурток авіямадэліравання пры Доме піянераў, а цяпер ужо ён быў ад'ютантам, па-заліхвацку скакаў верхам, як сапраўдны кубанскі казак.

Міша ўмеў рабіць велізарных змеяў, якія падымаюцца на вялікую вышыню, а па шнуру ўверх вецер гоніць ветразь, да якога прычэпліваюць 20—25 лістовак. Даходзіць «паштальён», так завецца парус, даверху, стукаецца аб перашкоду, падае сам і адчыняе кручок, на які прышпілены



Выкарыстанне партызанамі паветранага змея для распаўсюджвання лістовак

лістоўкі, вецер падхоплівае іх і нясе высока над зямлёй. Поўнае ўсведамленне, што скінуў лістоўкі самалёт. Так як падзеі ў іх адлюстроўваліся свежыя, то людзі думалі, што сувязь у партызан з Вялікай зямлёй выдатная, а можа, і самалёт у партызан ёсць...

Так былі раскіданы першыя лістоўкі аб зверствах фашыстаў у Слабодцы.

М. І. Абрыньба

Сувязь з Вялікай зямлёй

Штаб брыгады меў устойлівую радыёсувязь з Вялікай зямлёй. Па-майстэрску валодала рацыяй «Поўнач» прыбыўшая з-за лініі фронту Зоя Сямёнава. У любым паходным становішчы, у самых складаных сітуацыях у час карных экспедыцый яна забяспечвала надзейную сувязь з Беларускім штабам партызанскага руху, прымаючы і перадаючы ўсю неабходную інфармацыю. Услед за гэтым была наладжана і авіясувязь. У раёне Ушачаў пабудавалі дзве пасадачныя пляцоўкі — адну ў раёне вёскі Навасёлле (асноўная), другую ля вёскі Мішулькі (падсобная). Пры іх былі абсталяваны жылыя зямлянкі, складскія памяшканні, канюшні, агнявыя кропкі супрацьпаветранай абароны. Паміж пасадачнымі пляцоўкамі мелася тэлефонная сувязь. Тут бесперапынна знаходзіліся спецыяльна абучаныя каманды.

Вялікую дапамогу аказалі брыгадзе ваенныя лётчыкі авіяпалка, якім камандаваў палкоўнік Я. Т. Клусон; іншых авіяцыйных часцей. Першай прыбыла група старшага лейтэнанта Р. М. Маліноўскага. Яна адшукала і абсталявала пасадачныя пляцоўкі, наладзіла аэрадромную службу. Усё было зроблена так добра, што прыём самалётаў праводзіўся пры самых неспрыяльных метэаралагічных умовах, нават тады, калі праціўнік аказваў супраціўленне. Савецкія самалёты прыбывалі галоўным чынам уначы. На аэрадромах і пасадачных пляцоўках Полацка-Лепельскай зоны не было ніводнай аварыі або паломкі па віне абслугоўваючага персаналу.

Работнікі аэрадромнай службы не раз дапамагалі лётчыкам рамантаваць самалёты, якія атрымлівалі пашкоджанні. Якраз у дні «рэйкавай вайны» такі выпадак адбыўся з самалётам Лі-2 Барыса Рыгоравіча Лунца, які накіроўваўся ў раён Ушачаў. Непадалёк ад Полацка самалёт быў выяўлены і атакаваны фашысцкім знішчальнікам. Яму ўдалося вывесці са строю адзін матор самалёта, прабіць масляны бак. Аднак савецкі лётчык працягваў палёт да партызанскага аэрадрома. Умела манеўруючы, ён дасягнуў пасадачнай пляцоўкі і ўдачна прызямліўся. Аб здарэнні па радыё паведамілі камандаванню авіячасці. Наступнай ноччу лётчык С. Н. Багроў даставіў неабходныя запасныя часткі. За пяць дзён экіпаж разам з партызанскімі майстрамі правёў неабходны рамонт, і самалёт, узяўшы на борт параненых і пошту, вярнуўся на базу.

Друкуецца па кн.: Тараткевич М. В. Такой и должна быть легенда. М., 1985.

З успамінаў М. І. Абрыньбы, партызанскага мастака

Рисовать я начал с первых дней в партизанах. Сначала это были в основном листовки, плакаты, карты, по которым проводились боевые операции. Но во время одной операции удалось мне добыть краски, и стал я писать маслом. Первое — сделал на простынях два панно сухой кистью: на одном изобразил Чапаева на коне, летящего в бой, на другом — своих товарищей во время операции под Боровкой, когда удалось уничтожить одиннадцать автомашин с фашистами и броневик; это была первая крупная операция набиравшей силу бригады. Через оба панно шла надпись: «Да здравствует 25-я годовщина Великой Октябрьской революции. 1917—1942».

Стояла сухая теплая осень 1942 года, у людей был подъем, и у всех была вера в победу, сменившая прошлогоднее уныние.

Строили оружейные мастерские, госпиталь, баню; уже работали столовая и хлебопекарня в лесу.

Приближались ноябрьские дни, и наш лагерь, только что построенный, был убран очень торжественно. Между землянками дорожки посыпали желтым песком, навтыкали елочек; в центре лагеря, на большой поляне с огромным пеньком-трибуной, для митингов соорудили арку с красным полотнищем лозунга, портретом Сталина и гирляндами из елового лапника. По сторонам арки повесили мои панно.

Все это получилось как бы стихийно, само собой, никто не предполагал, что выйдет так торжественно. Но эффект от оформления оказался удивительный. Люди, намучившиеся под пятой фашистов, были так обрадованы, что «опять как при Советской власти», многие от радости просто плакали.

Однажды принесли нам с Николаем Гутиевым сто тюбиков губной помады, очень пригодилась — писали на белом полотне лозунги, так как кумача было мало, а потребность в лозунгах очень большая; в каждой деревне, где стоял наш гарнизон, людям хотелось утвердиться, что они живут, «как раньше»; слова «как до войны» звучали высшей похвалой.

...Я уже давно решил нарисовать Дубровского и тут предложил:

— Федор Фомич, попозируйте, я сделаю ваш портрет.

А он вдруг говорит:

— Пришли мы вдвоем, так и рисуй нас двоих — вместе, а не поодиночно.

Это меня ошеломило. Задача трудная — ни отхода, ни света. Лампа одна, их осветишь — на листе будет темно, да и двойного портрета я никогда не делал. Но нельзя мне сказать «не могу». Вспомнил про свой холст и решил: напишу их на холсте, маслом.

Усадил свою натуру на нары, сам сел на противоположные. Прислонил холст к спинке стула, на сиденье положил свою палитру стеклянную, выдавил краски. Кто-то из ребят уже принес и подключил вторую лампу.

Светло на холсте семьдесят пять на девяносто сантиметров, светит двухсотваттная лампа и еще одна, поменьше; комбриг

М. І. Абрыньба, М. Ц. Гуціеў

и комиссар сидят рядом, так и пишу их — рядом, в одинаковых зеленых гимнастерках командирских.

Я понимал, что нужно создать портрет, показывающий их дружбу и единство. Отряды их объединились в бригаду недавно и получили единое название — не Дубровского и не Лобанка, а от фамилии Дубровского: бригада «Дубова». Все делалось, чтобы укрепить авторитет двух командиров, чтобы не было антагонизма у бойцов, а была единая бригада — дубовцев. Дубровский — секретарь Чашникского подпольного райкома партии, Лобанок — Лепельского. Даже шубы у них одинаковые: белые, длинные; взяли их у немцев при разгроме эшелона.

Федор Фомич очень спокойный, обладает огромным тактом и внутренне очень интеллигентный человек. Несмотря на тяжелую жизнь и малое образование — три класса церковноприходской школы, он умеет руководить людьми, от него исходят спокойствие и доброта. Он никогда не приказывает: вызывает, разъясняет задачу — и это приказ; но слушаются беспрекословно.

Рост у Дубровского высокий, фигура крепко сколочена, чуть полноват, Володя

Лобанок рядом с ним кажется хрупким и маленьким. Володе тридцать четыре года, он моложе Дубровского. Небольшого роста, всегда очень подтянутый, с живой реакцией; во время сеанса мне то и дело приходится призывать его к спокойствию. Лицо у Лобанка все время в движении, глаза то живо загорающиеся, то с напряжением смотрящие — очень подвижное лицо, уловить его черты на холсте трудно, а если остановить их, то делается непохоже.

Пишу Лобанка чуть ближе, тогда они с Дубровским сравниваются больше в росте, потому что я знаю, если писать параллельно и получится один маленьким, а другой большим, это вызовет ущемление самолюбия, и Лобанок не преминет сказать: «Что ж ты комиссара такого маленького сделал?»

Холст пьет скипидар, краски чуть жухнут, но не темнеют, значит, грунт хороший. Работаю и все время боюсь, что не усидят они и не успею я прописать лица. Начинаю заводить разговор, чтобы им интереснее, не так утомительно сидеть было...

...Работаю на публике, ощущая и доброжелательность ее, и веру, и ответственность. И ребята чувствуют это. Ни звука, ни движения за моей спиной — забились на нары, оставив меня как бы с глазу на глаз с портретируемыми. Даже Тасс, мой пес, нем и глух, не шелохнется под нарами...

...В конце декабря удалось мне поработать над задуманной картиной о бригаде. Уже был составлен список, кого писать; сделал я эскиз, его тоже очень ревностно обсуждали — кто, на каком месте будет изображен.

Момент для картины взял — выход бригады на операцию, чтобы дать как можно больше портретов. Момент этот был всегда очень торжественным. Бригада выходила из леса и двигалась в Антуново, которое называли «Малой Москвой». Здесь был штаб нашей партизанской зоны, сюда выезжало командование, давались задания отрядам, и они уходили каждый своей дорогой. А операции тогда проводились очень большие, то на железной дороге, то наступления на крупные гарнизоны, такие как Чашники, Лепель, народу участвовало до тысячи человек. Вот такой момент я и решил взять.

Сделал подрамник, наши женщины сшили мне в швейной мастерской холст на него, сто на сто восемьдесят пять сантиметров. Кисти я тоже начал сам делать и теперь ждал Косого. Пообещал мне Косый Василь принести хорька для акварельных кистей, но никак не может поймать. Пока переношу эскиз на холст углем.

Уголь я тоже сам приготовил. Нарезал в размер консервной банки веточек березы и ивняка; береза тверже дает уголь, а ивняк мягче. Забил банку песком, замазал глиной и положил коробочку в угли костра, когда он прогорел, чтобы не было сильного жара. Потом сбил аккуратно глину и выбрал из песка угольные палочки. Рыжие отбросил — эти не годятся, а черными можно работать.

Угольный рисунок фиксирую акварельной краской: линии, которые нужно оставить, навожу, а остальные смахиваю, и получается прозрачный акварельный слой, под которым просвечивает рисунок. Теперь можно переходить на масло. У меня есть немного масла светлого в красках, и я жиденько, лессировками, начинаю аккуратно прорабатывать форму.

Картина большая, в землянке еле помещается. Пишу портрет за портретом, приходят партизаны, позируют; портреты делаю акварелью или карандашом, так как тратить масляные краски на этюды не могу, нужно для картины беречь. За день в нашей землянке перебывает такая масса народу, каждому интересно, кого художник рисует и что на картине нового.

...Вытянул мешочек с гильзами от патронов, опиленными слесарями в нашей кузнице и ждавшими, когда я буду вставлять в них щетину для кистей. Здесь же, в мешочке, пучок свиной щетины, вываренной в соли для мягкости. Разложил свое хозяйство на столе возле лампы и начинаю складывать, подбирать щетинки — кончик к кончику, волосок к волоску, чтобы внешние — мягкие и тонкие концы сделали эластичной кисть. Одну за одной перевязываю ниткой и откладываю в сторону свои заготовки, кисти решаю делать

потом, в другой раз. Но не могу удержаться и уже втаскиваю осторожно за ниточку аккуратно связанный пучок в гильзу; набиваю канифоли в свободный конец и держу его над огнем коптилки. Щетина впаивается в канифоль, вставляю с другой стороны гильзы выструганную палочку — и кисть готова. А рука уже сама тянется за следующей заготовкой...

Есть в мешочке и винтовочные пули, из которых выплавлен свинец, и обрезаны они с острого конца. Меня радует, что теперь они не будут убивать, а будут из них сделаны кисти, дающие тонкий и упругий мазок, что замечательно для работы над портретами. Эти кисти сделаю из ворсинок хорька, которого обещал поймать Василь Косый...

Партызанскі баян

У Лепельскім краязнаўчым музеі ў адной з экспазіцый, прысвечаных гераічнаму подзвігу савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, увагу наведвальнікаў прыцягвае баян. Гэта партызанскі баян. У лепельскія мясціны ён трапіў яшчэ ў 1940 г. Яго прывёз сюды з Ленінграда Павел Міхайлавіч Усцінаў. Малады настаўнік іграў на мандаліне, гітары, балалайцы і нават крыху на фартэпіяна. Па самавучыцелю быў знаёмы з нотнай граматай і даўно марыў навучыцца іграць на баяне. Але не паспеў: грымнула вайна. У партызанскі атрад прыйшоў з баянам. Там Павел Міхайлавіч сустрэўся з настаўнікам — Сцяпанам Антонавічам Пад'ельскім. Той свабодна чытаў ноты, добра іграў на баяне. Да вайны ў Лепелі нават па радыё выступаў. Узяў ён у рукі інструмент, кінуў пальцы зверху ўніз, уздыхнулі мяхі, і пацягнуліся на голас баяна партызаны. Стаялі, слухалі знаёмую і незнаёмую, блізкую і далёкую песню:

Лесом, полями, дорогой прямой
Парень идет на побывку домой.
Ранили парня, да что за беда:
Сердце играет и кровь молода.
— К свадьбе залечится рана твоя, —
Шуткой его провожали друзья.
Песню поет он, довольный судьбой:
«Крутится, вертится шар голубой...»

З гэтага і пачалася ў Лепельскай партызанскай брыгадзе мастацкая самадзейнасць. Знайшліся танцоры, спевакі, расказчыкі, паэты і нават драматургі. Любілі сваю самадзейнасць партызаны, не чулі душы ў ёй мясцовыя жыхары. Кожнае выступленне самадзейных артыстаў было сапраўдным святам. На канцэрце ў Кублічах гурткоўцаў прынялі за артыстаў з-за лініі фронту. Акрыленыя такой высокай адзнакай іх мастацкай творчасці, партызаны ў той жа вечар пайшлі на баявое заданне.

Друкуецца па кн.: Лобанок В. Е. Партизаны принимают бой. Мн.: «Беларусь», 1976. С. 99.

Засада

6 сакавіка 1944 г. у наш атрад прыехаў кінааператар, каб зняць паказальны бой «Засада». У атрадзе была падабрана група з 30—40 чалавек, у якую ўвайшлі: камандзір атрада Андрэй Каралевіч, камісар Мікіта Цыкавы, камандзіры рот Мікалай Няпомняшчы, Вярэцін, палітрук Аляксандр Іванавіч Савіч, камандзір узвода Бабко, кулямётны разлік у складзе Васіля Макаравіча Варошкі, Мікалая Міхайлавіча Ладзіка, Мікалая Маркавіча Александровіча, стралкі Міхаіл Маляўка, Аляксандр Хвошч і іншыя.

7 сакавіка наша група зрабіла пераход з вёскі Востава цераз населеныя пункты Ассё, Пунішча, Слабодка да вёскі Аўгустова. У раёне возера Тэклец ля шашы Лепель—Пышна зрабілі засаду. Левы фланг з боку Пышна прыкрываў Мікіта Цыкавы з групай. Правы фланг з боку Аўгустова прыкрывала наша група ў складзе Мікалая Няпомняшчага, Бабко, Васіля Варошкі, Мікалая Ладзіка, Мікалая Александровіча. У цэнтры засады знаходзіліся Андрэй Каралевіч, Аляксандр Савіч, Вярэцін і ўсе астатнія.

Па шашы Лепель—Пышна руху не было, і мы чакалі. Раптам па нашым флангу ўдарыў кулямёт і аўтаматы. Бабко параніла ў нагу. Ён упаў. Лежачы, ён убачыў, як карнікі перабежкамі заходзілі злева, стараючыся абысці фланг.

— Вася! — крыкнуў Бабко Варошку. У гэты момант яму разрыўной куляй раздрабіла другую нагу.

— Вася, перакрый ім дарогу, — крыкнуў Мікалай Няпомняшчы. У гэты момант аўтаматная чарга прашыла Мікалая Няпомняшчага. Ён упаў, шырока раскінуўшы рукі, лужына крыві расплывалася пад ім.

Васіль Варошка схапіў ручны кулямёт і папоўз наперарэз фашыстам. Ён умацаваўся за каменем. Немцы як на далоні і зусім блізка. Прыцэліўся і даў кароткую чаргу, затым яшчэ, і немцы прыціснуліся да зямлі. Фашыстам ішло падмацаванне. Каралевіч загадаў усім адыходзіць. У гэты момант з-за хмызняку выскачыла група карнікаў і кінулася за адыходзячымі партызанамі. Савіч ухапіў супрацьтанкавую гранату і кінуў яе ў гушчу ворагаў. Ад узрыву гранаты некалькі фашыстаў было забіта і паранена. Астатнія разгубіліся, замарудзілі і заляглі.

Васіль Макаравіч Варошка ўзваліў на плячо цела Мікалая Няпомняшчага, а Александровіч Мікалай Маркавіч і Мікалай Міхайлавіч Ладзік на маскхалаце пацягнулі ў небяспечнае месца Бабко. Андрэй Каралевіч загадаў атакаваць фашыстаў, тым самым даць нам выйсці з зоны агню. Палітрук Савіч Аляксандр Іванавіч першым кінуўся ў атаку, а за ім Вярэцін і іншыя. Немцы былі адкінуты, а затым Савіч і Вярэцін прыкрылі адыход групы. Нам удалося ўцячы ад фашыстаў і вынесці Мікалая Няпомняшчага і Бабко. Увечары вярнуліся ў Вострава. Ішлі паціху, зморныя, вынікамі засады засталіся незадаволены. Бабко ўначы адправілі самалётам за фронт.

На наступны дзень труна з прахам адважнага камандзіра нашай роты Мікалая Няпомняшчага была ўстаноўлена ў вялікай хаце. Праз кожныя пяць хвілін мянялася ганаровая варта. Партызаны атрада і сяляне аддалі апошнюю пашану любімаму камандзіру.

Увечары жалобны картэж пацягнуўся на могілкі вёскі Пораўна. Партызаны апусцілі ў магілу труну з целам Мікалая Няпомняшчага. Вырас пагорачак зямлі, які ўвесь пакрыўся вянкамі. Быў дадзены развітальны салют. Так не стала сярод нас любімага камандзіра і таварыша Мікалая Няпомняшчага.

М. М. Александровіч,
былы партызан 1-га атрада
брыгады імя Сталіна

Здымалі партызанскую вайну

З самалёта нас, мяне і Мікалая Пісарава, выкінулі да партызан, у Полацка-Лепельскую зону. Сустрэў нас палкоўнік У. Е. Лабанок і адразу ж накіраваў у брыгаду А. Ф. Данукалава. Стаяла брыгада ў вёсцы Вялікія Дольцы. Данукалаў, даволі малады чалавек, сустрэў нас добра і прапанаваў трымацца камандзіра К. Зюкава, сказаўшы, што ў яго заўсёды многа цікавых спраў.

На наступны дзень мы здымалі партызанскі лагер, быт партызан. Выбрацца на «перадавую» так і не змаглі. А «перадавая» — гэта кола абароны, якое апаясвала партызанскую зону. Увечары дазналіся, што Косця Зюкаў забіты.

Уранку выйшлі на здымкі. Пачулі аддалены гул самалётаў. Каля хаты стаяў А. Ф. Данукалаў і ўглядаўся ў неба. Аддаў нейкія распараджэнні. Гул самалётаў нарастаў. Мы накіравалі свае камеры на самалёты. Над вёскай самалёты пайшлі ў піке. Пасыпаліся бомбы. Застракаталі кулямёты. Загарэліся некалькі хат. Людзі раскрывалі вароты і выганялі жывёлу. Дым пажарышч закрыў сонца. Вакол ірваліся бомбы. Скрозь дым і пыл я ўбачыў Данукалава. Ён як бы паціху асядаў... Я кінуўся да яго, каб перавязаць рану. Але яна аказалася вялікай, з ірванымі краямі. Камандзір быў мёртвы.

Бой працягваўся. Мы з кулямётчыкам трымалі фашыстаў на прыцэле. Толькі партызан глядзеў скрозь праразь прыцэла, а я цераз візір. Кінаапарат і кулямёт заработалі амаль разам.

Кінааператар Марыя Сухава здымае партызана брыгады Лабанка

Блізкі ўзрыў сарваў нас з ложкаў. Схапілі апараты, выбеглі на вуліцу. На ўсходзе сонца толькі-толькі падымалася. Шум матораў і ляск заставілі мяне азірнуцца. Я ўбачыў танкі. Людзі беглі да ракі, за якой цямнеў лес. Мы таксама беглі, нізка нахіляючыся да зямлі. Ніколі не забуду жанчыну, якая цягнула за аброць худога каня. А на ёй сядзеў сонны, нічога не разумеючы хлопчык. Ён трымаўся за грыву каня. Навакол крычалі, плакалі, а яны трое — жанчына, хлопчык і конь — як бы нічога не бачылі, а ўпарта ішлі ўперад...

Кола блакады звужалася. Нямецкія аўтаматчыкі палівалі нас са сваіх «шмайсераў». Я прыгнуў у нейкую яму. Там ужо быў палкоўнік Радзівонаў са сваім ад'ютантам Васілём. Кулі біліся ў бруствер. Потым застракатаў кулямёт. Палкоўнік загадаў мяняць пазіцыі і зусім трошкі прыўзняўся. Я амаль гэтага не ўбачыў. Але яго цела абмякла і ён стаў спаўзаць на дно. Ён быў яшчэ жывы. Мы паклалі яго на плашч-палатку і пацягнулі да хмызняку. Праз 1—2 хвіліны ў нашу яму папала міна. У кустах мы ўбачылі, што палкоўнік Радзівонаў мёртвы.

...Памятаю, як мы ўзрадаваліся, калі да нас прыйшлі нашы калегі Ацілія Рэйзман і Маша Сухава. Яны здымалі, знаходзячыся ў самым пекле баёў. У Машы ў двух месцах быў прабіты кажушок, а ў Оці ў шапцы была ўнушальная дзірка. На досвітку мы рассталіся. Трэба было працягваць нашу работу, здымаць партызанскую вайну...

...Я паглядзеў ім услед. У гэты момант я не ведаў, што бачу Марыю Сухаву ў апошні раз. Ноччу пры прарыве кола блакады яна загіне. У тую ж ноч загіне і Мікалай Пісараў.

С. Школьнікаў

«Прабітыя кулямі ленты»

Водгук аб кінафільме «Балада аб мужнасці і любві» газета «Правда» выразна назвала «Прабітыя кулямі ленты». Чаму ж «прабітыя кулямі»? Таму, што іх здымалі франтавыя кінааператары, двое з якіх — Н. Пісараў і М. Сухава — загінулі ў час прарыву. Для Машы Сухавай паездка ў Полацка-Лепельскую зону была другой камандзіроўкай у тыл ворага. Некалькі раней яна здымала баявыя дзеянні партызан у Бягомльскім раёне. А цяпер разам з Аціліяй Рэйзман прыляцела ў Віцебскую вобласць.

Некалькі знятых плёнак Маша паспела перадаць з нашымі лётчыкамі за лінію фронту. У час бою варожая міна ўпала ля ног Сухавай... Асколкамі былі разарваны апошнія знятыя мужным аператарам ленты.

Для Мікалая Пісарава Ушацкая аперацыя была першым заданнем пасля заканчэння Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі. Ён адправіўся да партызан са сваім старэйшым калегам Сямёнам Школьнікавым. Аператары здымалі баі, якія вялі партызанскія брыгады — 1-я Антыфашысцкая і «Аляксея». Групу партызан, разам з якімі Мікалай Пісараў выходзіў з кальца, гітлераўцы акружылі ў лясным доміку. Пісараў узяўся прыкрываць агнём кулямёта таварышаў. Так ён загінуў, выратоўваючы жыццё баявых сяброў. А знятыя ім кадры, адпраўленыя за лінію фронту, і цяпер працягваюць жыць у мужным, суровым і разам з тым душэўным фільме «Балада аб мужнасці і любві»...

Друкуецца па кн.: Тараткевич М. В. Такой и должна быть легенда. М., 1985.

Наш доктар

І. П. Кажан

Першае знаёмства з Іванам Пятровічам Кажаном адбылося недалёка ад нямецкага гарнізона «Площадка» ў кастрычніку 1943 г., калі ён, будучы падпольшчыкам, прыйшоў да нас у хмызняк, які быў побач з вёскай Чарнаручча, дзе я з разведчыкам Міхаілам Русанкам вывучалі магчымасць разгрому нямецкага гарнізона. З веданнем справы, падрабязна ён выклаў усё аб гарнізоне (падыходы, размяшчэнне агнявых кропак). Тады я адчуў у ім чалавека з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, ярага ненавісніка фашызму, абаяльнага, сціплага.

У наступную ноч гэты гарнізон быў разгромлены. Паліцыянтаў засталі знянацку і ўзялі жывымі, частку з іх расстралялі на месцы. Захоплена ўся зброя (ручны і станковы кулямёты, ротны і батальённы мінамёты, сем скрынак патронаў, пяць скрынак мін, 36 вінтовак, адзін пісталет). Усё пагрузілі на павозку і вывезлі. Будынак гарнізона і мост былі спалены. У поспеху гэтай аперацыі была заслуга і Івана Пятровіча. Калі яму больш заставацца ў вёсцы Малы Поўсвіж было нельга, ён у лістападзе 1943 г. прыйшоў да нас у атрад, які стаяў тады ў вёсках Валосавічы, Весялова Лепельскага раёна.

Я ў той час быў на пасадзе намесніка камісара атрада па камсамолу і знаходзіўся пры штабе атрада, куды як атраднага ўрача прызначылі і Івана Пятровіча. У мяне была магчымасць бліжэй пазнаёміцца з гэтым цудоўным чалавекам.

Як урач Іван Пятровіч аддаваў сябе гэтай справе спаўна, з вялікай адказнасцю клапаціўся аб здароўі і лячэнні партызан. Хаця ў кожным узводзе былі медсёстры, якія аказвалі першую дапамогу параненым і хворым, Іван Пятровіч стараўся сам праверыць кожнага. Як чалавек быў просты, дабрадушны, заўсёды гатовы дапамагчы парадай, суцешыць, што вельмі трэба было параненым.

Ва ўмовах баявых абставін смела і рашуча прымаў рашэнні па аказанні дапамогі параненым партызанам. Ніколі не хаваўся ад варожых куль. Такім я яго бачыў у час баёў ля вёскі Забароўе Лепельскага раёна, ля вёсак Пуцілкавічы, Жары, Лагі Ушацкага раёна. Вельмі складаныя абставіны былі ля вёскі Лагі Ушацкага раёна ў студзені 1944 года, калі на атрад, які размясціўся на адпачынак, раптам наляцелі нямецкія «фоке-вульфы» і скінулі мноства бомб, частка з іх замаруджанага дзеяння. Ад разрыву гэтых бомб было паранена многа партызан, мабыць, атрад ніколі ў баі не меў столькі страт. Паранена была медсястра Наташа. Івану Пятровічу прыйшлося нялёгка. Маланкай насіўся ён ад аднаго параненага да другога і паспеў выратаваць усіх. У час налёту загінуў камандзір узвода Шатыронак Якаў, якога вельмі любілі партызаны. Патрабавалася нямала намаганняў, каб цяжкапараненых тэрмінова адправіць на партызанскі аэрадром для транспарціроўкі іх за лінію фронту, іншых размясціць па цёплых кватэрах і забяспечыць за імі догляд. У гэтых умовах ён арганізаваў лячэнне і догляд параненых. Вось чаму ён быў дарагім і любімым для партызан. Дзе б наш атрад ні спыняўся на адпачынак альбо на начлег, да яго ішлі жыхары і ён ім аказваў усялякую дапамогу.

Медыкаментаў яўна не хапала, але Іван Пятровіч меў сувязь з падпольшчыкамі, якія дапамагалі яму. Шырока выкарыстоўваў ён народную медыцыну, разнастайныя травы, настоі і г. д.

У час прарыву з акружэння ў раёне Паперына Ушацкага раёна ён быў цяжка паранены ў грудзі. Гэта было днём напярэдадні рашаючага начнога штурму, дзе многа нашых баявых сяброў склалі галовы. На прарыў з варожага акружэння цяжкапараненым ішоў і Іван Пятровіч, дзе па-геройску загінуў.

А. Ц. Армонік, былы камісар 2-га баявога атрада імя Караленкі Лепельскай партызанскай брыгады імя Сталіна

Рабілі зброю партызаны

Сярод балот і азёр туліцца невялікая вёска Мішулькі. Тут у беднай сялянскай сям'і ў 1907 г. нарадзіўся Апанас Васільевіч Цар. З маленства кемлівы хлапчук рамантаваў людзям замкі, патэфоны, гадзіннікі, веласіпеды, нават ружжы. Аднавяскоўцы называлі яго «Ляўшой».

У час вайны абараняў Маскву. Быў цяжка паранены, трапіў у палон. Па дарозе на Віцебск збег з поезда. Рушыў да родных мясцін. У родную вёску прыйшоў у пачатку студзеня 1942 г. у лахманах, галодны і замёрзлы. Скора дазнаўся, што ў Мішульках і іншых вёсках «прыжыліся», адбіўшыся ад сваіх часцей, афіцэры і салдаты нашай арміі. Іх было каля 15 чалавек, у тым ліку Дзмітрый Караленка, Генадзь Любаў, Міхаіл Розанаў, Іван Алдошын, Мікалай Самусь, Іван Кісялёў, Сяргей Маркін і іншыя. З імі і наладзілі сувязь Апанас і яго малодшы брат Міна.

У сакавіку 1942 г. усе пайшлі ў партызанскі атрад, якім камандаваў Уладзімір Лабанок. Апанаса і Міну пакінулі ў падполлі. Уся іх сям'я, многія суседзі працавалі на партызан: рыхтавалі харчаванне, збіралі зброю, соль, медыкаменты, адзенне. У жніўні 1942 г. Апанас і Міна прыйшлі ў партызанскую брыгаду «Дубава».

У дзесятках аперацый, праводзімых брыгадай, удзельнічалі браты. У ноч на 1 верасня 1942 г. удзельнічалі ў разгроме гарнізона ў мястэчку Камень. Па-геройску дзейнічалі і ў засадзе на шашы Бароўка — Камень — Віцебск, па якой рухалася калона варожых аўтамашын з жывой сілай.

Раслі партызанскія атрады. На ўсіх не хапала зброі. Камандаванне брыгады даведалася, што Апанас і Міна — майстры на ўсе рукі. У партызанскім лагеры яны цягнуліся да баявой тэхнікі, старанна вывучалі сваю і трафейную зброю. Яе шмат знаходзілі вакол Полацкага ўкрэпраёна, доты якога былі ўзарваны пры адыходзе Чырвонай Арміі ў першыя дні вайны. Браты шукалі неабходныя часткі для аўтаматаў, пісталетаў, рамантавалі іх. Вядома, атрымлівалася не заўсёды ўсё добра, але перамагала настойлівасць, кемлівасць. Іх зямлянка ператварылася ў сапраўдную

Зброевая майстэрня і збройнікі брыгады «Дубава». Сакавік 1943 г.

майстэрню па рамонту зброі. Да іх далучыліся яшчэ майстар-цясляр Пярэдня Фёдар і слесар Стрыжонак Аляксандр. Неўзабаве ў партызанскай брыгадзе з'явілася гармата, а потым яшчэ і яшчэ. Справа была так. Партызаны заўважылі, што недалёка ад вёскі Будзішча стаяў наш падбіты танк. З гарматай і кулямётамі. Умельцы ноччу знялі іх з танка і прывезлі ў партызанскі лагер. Потым агледзелі кінутую гармату ў ваколіцах Бароўкі. Яе таксама прыцягнулі да сябе. Праўда, у гармаце быў зняты страляючы механізм, выламаны дэталі лафета і прыцэльных прыстасаванняў. Усё гэта было адрамантаваць нялёгка. Бадай што немагчыма. Але браты ўзяліся за справу. Вельмі хацелася, каб у партызан была свая грозная зброя. Параіліся з былымі артылерыстамі, якія былі ў брыгадзе. Пацягнуліся дні, тыдні. Партызаны цікавіліся, ці скора будзе гатова гармата. Апанас адмоўчваўся. Але нарэшце прыйшоў дзень, калі гармату выкацілі на лясную прасеку. Далі першы выстрал. Усё ў парадку. Хутка ўступіла ў строй і другая гармата, потым трэцяя і г. д. Адна з іх экспануецца ў нашым музеі. У брыгадзе быў створаны артылерыйскі дывізіён. Яго камандзірам прызначаны Атрашкевіч Міхаіл.

Партызаны захапілі варожы склад боепрыпасаў, і «загаварылі» партызанскія гарматы, наводзячы жах на фашыстаў.

Неяк партызаны-разведчыкі знайшлі пакінуты нашай арміяй склад мін да палкавога мінамёта. Перавезлі іх у атрад. Але

мінамёта не было. Апанас і Міна са сваімі памагатымі знайшлі падыходзячую трубу, пяском шліфавалі яе ўручную да патрэбнага калібру, прадумалі ўсё для магчымай стральбы з мінамёта. Некалькі разоў зрабілі выпрабаванні і нарэшце перадалі мінамёт у артылерыйскі дывізіён, як новую баявую адзінку грознай зброі.

Майстэрня працягвала працаваць. Прынясуць партызаны з-пад Полацка дзесяткі ствалоў, а праз 3—4 дні — гэта новыя вінтоўкі, карабіны. Рабілі яны і скарастрэльныя кулямёты, пісталеты...

У 1944 г., калі немцы кінулі супраць партызанскага краю пераўзыходзячыя сілы з танкамі, самаходнымі гарматамі і самалётамі, браты змагаліся на перадавой. У час бамбежкі штаба брыгады ў в. Старына Апанас трапіў пад варожыя бомбы. Яго брат Міна камандаваў ротай партызан замест загінуўшага камандзіра. І калі б не партызанскі ўрач Фёдар Сальнікаў — зыход прадказаць было цяжка.

Радзіма высока ацаніла заслугі братоў, партызанскіх збройнікаў. Яны ўзнагароджаны ордэнамі і баявымі медалямі.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў браты некаторы час працавалі ў майстэрнях г. Лепеля. Але здароўе было падарвана. Спачатку памёр Міна, а ў 1970 г. — Апанас.

А. С. Ханяк

Няроўны бой

У Беларускім музеі Вялікай Айчыннай вайны сярод шматлікіх рэліквій захоўваецца Чырвоны сцяг ЦК ВЛКСМ, якім быў узнагароджаны 13-ы камсамольска-маладзёжны атрад Лепельскай брыгады імя Сталіна. Партызанскі камісар П. К. Пацэй успамінае аб першых кроках гэтага фарміравання.

П. П. Літвінаў

— Восенню 1943 года больш за сто актыўных падпольшчыкаў, якія дзейнічалі ў вёсках Прудоцкага, Несінскага і Каменскага сельсаветаў, папоўнілі рады народных мсціўцаў. Гэта былі маладыя, адважныя людзі. Яны ўжо бачылі, што нясе «новы парадак», і з вялікай нянавісцю да ворагаў вялі баі.

Аб адным з іх расказвае партызанскі летапіс.

Атрад дыслацыраваўся ў вёсцы Іван Бор. Адсюль ішлі на заданні, тут распрацоўваліся новыя аперацыі. Неяк сувязны далажыў у штаб аб набліжэнні да вёскі значных варожых сіл. Каля 300 нямецкіх салдат і афіцэраў з артылерыяй і мінамётамі рухаліся па дарозе. Камандзір П. Літвінаў загадаў хутка заняць абарону вакол вёскі.

Сілы былі няроўныя. Партызан было значна менш, ды і ўзбраення не хапала. Дастаткова сказаць, што толькі адну гармату змаглі проціпаставіць наступаючым.

— Нічога, хлопцы, не ўпершыню біць ворага! — падбадзёрваў маладых партызан камісар Алдошын. — Вытрымаем націск, не прапусцім фашыстаў!

Пачаўся бой. Першы ж снарад, які

выпусціў камандзір гарматы Пляханаў, разарваўся ў калоне захопнікаў. Тыя спачатку разгубіліся, але хутка апамяталіся і адкрылі моцны агонь з мінамётаў і кулямётаў. Аднак гэта не напалохала партызан. Яны, умела манеўруючы, на працягу ўсяго дня стрымлівалі націск ворага.

У справаздачы Лепельскай партызанскай брыгады адзначаецца, што перад грознай небяспекай ніхто не пахіснуўся, ні адзін нават не завагаўся. У час бою было на каго раўняцца. Там, дзе наступала асаблівае напружанне, з'яўляліся то камандзір, то камісар. Сваім прыкладам яны натхнялі людзей, узнімалі дух, баявы настрой.

Наступіла ноч. Цёмная, трывожная. Можна было крыху перавесці дух, падрыхтавацца да новай сустрэчы з фашыстамі. Але і ў варожым стане таксама не спалі. Пад покрывам цемры фашысты перагрупіравалі свае сілы і на золку пачалі новае наступленне. Снарады і міны не давалі ўзняць галавы. Напружанасць бою нарастала. Утрымліваць пазіцыі камсамольска-маладзёжнаму атраду станавілася ўсё цяжэй. І тады паступіў загад: вёску пакінуць, заняць абарону за ракой.

На новым рубяжы маладыя патрыёты стаялі насмерць, сустрэлі гітлераўцаў арганізаваным агнём. Тры кулямёты паліваліх свінцом. І далей ні адзін варожы салдат не прайшоў. Два дні цягнуўся гэты няроўны бой. 35 варожых салдат і афіцэраў знайшлі ля невялікай лепельскай вёскі свой бясслаўны канец.

Д. Зарэцкі

Дакументы сведчаць

№ 89

Са справаздачы камісара Лепельскай партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна А. В. Ярмаша аб партыйна-палітычнай рабоце за ліпень—жнівень 1943 г.

В отрядах бригады имеется 4 парторганизации, 5 партийно-кандидатских групп. За данный период парторганизация бригады выросла на 14 чел. Принято в члены ВКП(б) — 1 чел., кандидатами в члены ВКП(б) — 13 чел. и восстановлены кандидатами в члены ВКП(б) — 3 чел. По количественному росту являются передовыми парторганизации: парторганизация штаба бригады, райкома КП(б)Б и 1-го отряда. Парторганизации отрядов всю работу направляют на поднятие боевой деятельности отрядов, на воспитание и сплочение партизан вокруг партии Ленина.

Мероприятия противника среди населения деревень, расположенных вблизи гарнизонов. Противник, расположенный в гарнизонах, ставит своей задачей собрать хлеб с населения, поэтому он распространяет через предателей-полицейских различные слухи о мероприятиях, которые они будут проводить в период уборочной кампании. Противник заявляет, что во время уборки будут пущены экспедиции против партизан, а хлеб будет убираться с поля необмолоченный и свозиться в немецкие гарнизоны. Для этой цели будет использовано население, которое находится в немецких гарнизонах, и семьи полицейских, переехавшие в немецкие гарнизоны из зон партизанского влияния. Все эти замыслы противника не осуществляются. Хлеб убирается населением и охраняется партизанскими отрядами. Экспедицию предпринять противник пока не в силах.

Работа в городе и других немецких гарнизонах.

В гор. Лепеле организовано 5 подпольных групп. В работе этих групп принимают участие 20 чел. Ими распространено 500 экземпляров газет, листовок, брошюр, плакатов и журналов. Плакат «Гитлер зажат в руки союзников» был вывешен на заборе в гор. Лепеле и провисел 8 часов. В течение этого времени население гор. Лепеля рассматривало этот плакат. Листовки-обращения к «добровольцам», полицейским и бургомистрам были разложены на столах «добровольческой» столовой. Эти же обращения попали в общежитие «добровольцев». Газеты «Калгасная праўда» и «Віцебскі рабочы» были разбросаны по городу и на конференции учителей. Газеты «Віцебскі рабочы» попадали в волости, гор. Лепель и там читались. Посредством связи с городом мы получали информацию о противнике и его вооружении, рас-

положении и его намерении. Пересылались в бригаду из гор. Лепеля боеприпасы, гранаты, соль, медикаменты. Посредством нашей работы взят в бригаду из гор. Лепеля врач Слободчиков. В городе производились диверсии, в результате которых сожжена одна автомашина с боеприпасами, убито 5 офицеров, перерезали связь между гарнизонами Лепель—Стаи два раза. В немецкие гарнизоны Камень—Заболотье, Студенка, Площадка, Вилы заслано 600 экз. литературы.

Комиссар бригады Ярмош

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 17. Л. 21—22.

№ 23
З дакладной запіскі сакратара Лепельскага падпольнага райкама КП(б)Б У. Е. Лабанка аб рабоце за перыяд са студзеня па 28 ліпеня 1943 г.

Не пазней 28 ліпеня 1943 г.*

Работа РК КП(б)Б проводилась в свете выполнения указаний тов. Сталина, данных в его докладах и приказах, и выполнения решения V пленума ЦК КП(б)Б.

В основу всей своей работы РК КП(б)Б положил задачи — дальнейшее расширение партизанской борьбы, вовлечение в нее новых слоев населения, организационное укрепление и повышение боевой активности партизанских отрядов.

За истекший период времени РК КП(б)Б провел 10 заседаний, за май—июнь — 4 заседания, на которых рассматривались следующие вопросы: о приеме в партию, о работе комсомольских организаций, о распространении советской печати в тылу врага, о состоянии агитационной работы среди партизан и гражданского населения, о создании партизанских резервов, о фактах пьянства и мародерства, о работе инструкторов РК КП(б)Б, о работе первичных парторганизаций, о боевой деятельности партизанских отрядов.

РК КП(б)Б провел во всех парторганизациях занятия, партсобрания по итогам V пленума ЦК КП(б)Б и общие собрания по отрядам по данному вопросу. Проведены партийно-комсомольские собрания с вопросами: итоги месячной борьбы с карательной экспедицией.

РК КП(б)Б провел огромную воспитательную работу по росту и идейному укреплению своих рядов. С января 1943 г. всего принято кандидатов в члены ВКП(б) 31 чел., в члены ВКП(б) — 28 чел., в т. ч. принято за последнее время — два месяца: май, июнь — кандидатами в члены ВКП(б) 15 чел., восстановлено в партию кандидатов в члены ВКП(б) 10 чел., членов ВКП(б) — 5 человек. На отчетное число Лепельская парторганизация насчитывает кандидатов в члены ВКП(б) — 36 чел., членов ВКП(б) — 28 чел.

В результате проведенной большой партийной работы наша парторганизация имеет в своих рядах много товарищей, которые показали уже бесстрашие, подвиги, героизм в борьбе с фашистами, многие из них выдвинуты на ответственные руководящие работы. На работу командиров отрядов — 6 чел., комиссаров — 5 чел. и др. Последние хорошо справляются с возложенными на них задачами. Представлено к правительственным наградам 17 чел.

...РК КП(б)Б обратил особое внимание на создание подпольных парторганизаций. За отчетный период организовано по району 15 подпольных организаций, которые насчитывают в своем составе 52 чел. Последние провели большую работу по распространению большевистской печати, по разъяснению населению военного положения Советского Союза, крепости советского строя, побед Красной Армии, поражения немцев, по разоблачению демагогической пропаганды врага и воспитанию уверенности в приходе Красной Армии. Характерный случай по распространению наших газет и листовок в гор. Лепеле.

* Па заканчэнні справаздачнага перыяду.

7 мая 1943 г. немцы разбрасывали свои листовки по городу, наши люди в это время разбрасывали наши листовки и лепельскую газету «Калгасная праўда», и пока немцы осмотрелись, то на улицах оказалось много наших газет и листовок. После этого немцы окружали город и делали поголовный обыск всех граждан города, искали партизан. Силами подпольных организаций уничтожено 8 мостов и более 10 км связи.

При партизанских отрядах созданы первичные парторганизации. Основные вопросы, которые ставят в задачу своей работы первичные парторганизации, — это дальнейшее расширение и идейное укрепление партизанских отрядов, политико-воспитательной работы среди личного состава, рост и укрепление партийно-комсомольской организации. При каждом отряде среди личного состава развернуто соцсоревнование, соцдоговора состоят из конкретных пунктов, которые периодически проверяются и результаты выполнения освещаются в стенных газетах. Три раза в месяц выпускаются отрядные стенгазеты и 4 раза — боевые листки по районам.

Политико-воспитательная работа в отрядах возглавляется комиссарами, последние три раза в месяц подают политдонесения в РК КП(б)Б.

В результате проделанной большой партийной работы мы имеем огромный рост в боевом и количественном составе партизанских отрядов. За последние три месяца создано три новых партизанских отряда. Личный состав последних с каждым днем увеличивается; 9-й отряд 12 июня имел 16 бойцов, в настоящее время его состав увеличился до 32 бойцов.

Большую политико-воспитательную работу провела наша парторганизация среди партизан и гражданского населения. За истекший период времени прочитано докладов о международном положении — 32, «Наши враги» — 63, «Комсомол в годы гражданской войны и Великой Отечественной войны» — 38, «Роль партизанского движения» — 76... Доклад Мануильского — 76.

Личный состав бригады и большинство населения хорошо ознакомлены с докладами и приказами тов. Сталина и успехами Красной Армии. Широко популяризировали боевые эпизоды героев войны Заслонова, Сильницкого, книгу «Мой сын». При РК КП(б)Б имеется штат пропагандистов в количестве 5 человек, которые работают под руководством инструкторов РК КП(б)Б, за ними закреплены определенные зоны районов.

РК КП(б)Б организовал свою типографию, выпускает лепельскую газету «Калгасная праўда» и 3 газеты других районов, листовки и ежедневно сводки Совинформбюро. Газета нашего района издается 4 раза в месяц тиражом 200—300 экз. Выпущено всего 20 номеров тиражом 5 тыс. экземпляров. Распространено: центральных газет — 5 тыс. экз., листовок — 9500 экз., обращения к солдатам «русской народной армии» — 4 тыс. экз. Особенно сильно поставлена у нас наглядная агитация путем создания различных плакатов, которые систематически появляются на улицах и приклеиваются к столбам в гор. Лепеле. Было несколько случаев, когда наши плакаты висели на дверях комендатуры. Недавно наши плакаты и часть листовок были расклеены в парке гор. Лепеля, много проходило полицейских, «народников», читали их, но не срывали, были сорваны, когда заметил их нач. полиции. В результате проведенной большой массово-агитационной работы нашей парторганизацией непосредственно в немецких гарнизонах мы имеем переход на нашу сторону всего батальона солдат «русской народной армии» с оружием из гарнизона Боровуха.

Морально-политическое настроение гражданского населения нашего района положительное. Абсолютное большинство населения настроено за нас, оно кровно связано с партизанами, последним оно помогает везде, всем и всегда. Сила партизанского движения крепка в том, что за ним идет и помогает ему все население. Гражданское население не любит предателей, шпионов, оно само их разоблачает и помогает в этом партизанам. Мирное население помогает партизанам разрушать мосты и связь, уничтожать предателей, шпионов.

В работе РК КП(б)Б большое внимание было уделено работе комсомольской организации района. Комсомольская организация выросла в количественном и качественном отношении. За истекший период времени принято в ряды ВЛКСМ 104 лучших товарища, которые показали себя бесстрашными патриотами в борьбе с фашизмом. Дана рекомендация для вступления в ряды ВКП(б) — 25 чел. Выдвинуто

на руководящие посты — 37 чел., представлено к правительственной награде — 20 чел. Всего насчитывается в комсомольской организации 258 чел. Большая работа проведена по созданию подпольных комсомольских организаций по району.

Всего создано 55 подпольных организаций, в которых насчитывается 225 человек. Последние много сделали по проведению агитмассовой работы среди населения и по распространению большевистской печати. Силами подпольных комсомольских организаций взорвано 4 моста и 4 км связи.

Во время похода немецкой карательной экспедиции немецкие изверги уничтожили много деревень. Ограбили все гражданское население, много убили и угнали гражданского населения на каторжные работы в Германию.

Население 23 деревень нашего района полностью ограблено фашистскими извергами, скот весь угнан, лошади все забраны, склады крестьян открыты, хлеб и одежда забраны. В 28 деревнях, где насчитывается 915 домов, сожжено 612 домов, полностью сожжены следующие деревни: Стайчевка — 32, Велевщина — 130, Остров — 40, Озерцы — 25, Савин Дуб — 77, Заровье — 38, Пышно — 72, Киселево — 200, Старинка — 14, Слободка — 27, Пунище — 34, Кривцы — 16, Каменка — 15. Зверски убито гражданского населения 282 человека по этим деревням немецкими извергами. Угнано в Германию на каторжные работы 446 чел.; в дер. Воловая Гора немецкие изверги убили 18 мужчин на глазах родных. В деревнях Осново и Слободка фашистские мерзавцы изнасиловали молодых девушек на глазах родителей. В дер. Заровье фашисты убили 32 чел., причем раньше убили малых детей, а потом их родителей, до 1 года убито 3 ребенка.

Из бывшей партизанской бригады «Дубова» создано две бригады: Чашникская и Лепельская. Наша бригада в настоящий момент блокирует лепельский гарнизон. Выходы из Борисова на Бегомль, Березино закрыты. Выход из Лепеля и в Лепель имеется только по дороге Лепель—Витебск. Последняя тоже подвергается систематическому разрушению со стороны наших отрядов.

Секретарь Лепельского РК КП(б)Б Лобанок

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3793. Воп. 1. Спр. 62. Л. 1—2.

№ 194
Справаздача сакратара Лепельскага падпольнага райкама ЛКСМБ А. В. Пашкевіч аб камсамольскай рабоце за кастрычнік 1943 г.

5 лістапада 1943 г.

Всего по Лепельскому РК ЛКСМБ в бригаде Лобанка насчитывается 315 комсомольцев, из них девушек — 32. Принято в ряды Ленинского комсомола за октябрь 1943 г. 21 человек. Приняты люди, которые показали смелость и решительность в борьбе с немецкими оккупантами. 11 чел. поступило в ряды комсомола перед боем, т. е. при штурме гор. Лепеля, где сразу же открывали счеты по уничтожению немецких оккупантов. С комсомольскими билетами насчитывается 32 комсомольца. В октябре убит комсомолец Буйницкий. За октябрь рекомендовано комитетом комсомола кандидатами в члены ВКП(б) 9 чел., из них 4 комсомольца, идя в бой, сказали перед строем: «Считайте нас коммунистами» (Армоник Олег, Пацей Екатерина, разведчик Лось Николай, нач. штаба Чернов Михаил). Эти комсомольцы в первом бою оправдали высокое звание кандидатов нашей коммунистической партии.

Низовых комсомольских организаций насчитывается 11, во главе которых пом. комиссаров, секретари, в каждом взводе имеются комсорги. Комсомольского актива насчитывается 39 человек. Выдвинуто 2 комсомольца — Ладик Владимир и Коровов Константин на командно-политические должности. На политруков выдвинуто 4 комсомольца, 7 комсомольцев — на командиров отделений, 12 комсомольцев выдвинуто политагитаторами по зонам.

Командованием бригады представлено 8 комсомольцев к правительственной награде, из них 2 девушки. 195 комсомольцев получили благодарности...

По Лепельскому РК ЛКСМБ в бригаде Героя Советского Союза Лобанка насчитывается 67 пулеметчиков-комсомольцев, подготовлено 85 пулеметчиков, минометчиков — 18, подготовлено 35 подрывников.

В каждом отряде созданы диверсионные группы. Истребителей вражеских танков насчитывается 42 чел. Комсомольцы бригады показывают героические примеры борьбы с немецкими оккупантами. Комсомольцы отличились в боевой операции при штурме гор. Лепеля. Комсомолка Хоняк Анна... подожгла склад с немецким продовольствием, уничтожила связь в самом городе.

Когда партизаны ворвались в гор. Лепель, на улице началось движение немецких танков. Комсомолец Самсонов уничтожил вражеский танк, второй танк был подбит тоже им. Этим самым Самсонов обеспечил продвижение своего отряда в глубь гор. Лепеля. Командир отделения комсомолец Усовик Петр смело и решительно вел бойцов в атаку при штурме гор. Лепеля. Лично сам Усовик захватил 6 пленных. При подходе к городу была густая сеть проволочных заграждений, которая являлась преградой дальнейшего продвижения партизан. Комсомолец Жерносек Ф., перерезав проволочное заграждение, первым ворвался в доты противника. За ним пошло все остальное подразделение, комсомолец-пулеметчик Галай В. уничтожил экипаж танка и несколько огневых точек противника, этим самым обеспечил дальнейшее продвижение партизан. Комсомолец Козловский, ворвавшись в гор. Лепель, бросился в атаку на вражеский дзот, захватил в плен пулеметный расчет врага.

При штурме гор. Лепеля героически погибла секретарь комсомольской организации первого отряда Маргевич Вера, дважды представлена к награде... Вера за собой вела всех комсомольцев своего отряда на штурм гор. Лепеля. Когда они ворвались в город, здесь же, на улице, вражеская пуля прекратила жизнь молодой комсомолки. Комсомольцы на этом не остановились, они шли вперед, в глубь города. Комсомольцы Савич и Ладик Владимир с группой комсомольцев с криками: «Ура!», «За Родину!», «За любимую комсомолку Веру!» — бросились в атаку на вражеские дзоты. Немецкие стервятники не выдержали напора комсомольцев, разбежались, бросив свои пулеметы.

Комсомольцами артиллерийского дивизиона подорвано 2 автомашины с живой силой противника, группа комсомольцев под руководством комсомольца Петрова подорвала 2 автомашины. Комсомольцами-диверсантами кавалерийского эскадрона выведена из строя шоссейная дорога Камень — Улла на протяжении 1,5 км, этими же комсомольцами уничтожено 12 солдат и офицеров.

Комсомольцами диверсионного отряда в составе 7 чел. за октябрь 1943 г. пущено под откос 4 воинских эшелона противника, следовавших на фронт. Ими же уничтожено 4 ж.-д. моста.

Комсомолец Армоник Олег... в этом бою был ранен, но не оставлял своего автомата, беспощадно громил врага. Командованием бригады тов. Армоник представлен к правительственной награде... Брат Армоника Олега — Армоник Витя также беспощадно громил немецких захватчиков...

В каждом подразделении имеются политруки и политагитаторы, которые воспитывают бойцов на личных подвигах героев бригады и героев Отечественной войны. Ежедневно бойцов информируют о положении на фронтах. Один раз в месяц проводится инструктивное совещание политруков и агитаторов. В отрядах проведено 28 бесед на темы: «Надо знать хорошо свое оружие», «Любить и уважать командира» и ряд др. тем.

Особенно на высоком политическом уровне было проработано и подписано письмо тов. Сталину. Во всех отрядах в ответ на это письмо бойцы-комсомольцы и молодежь обязались еще больше громить немецких поработителей.

В связи с героической смертью комсомолки Маргевич Веры во всех отрядах проводятся беседы о жизни и боевой деятельности ее. Также в отрядах проведены доклады о дне комсомола.

Боевые листки, которые отражают жизнь и боевые дела отряда, выпускаются каждую пятидневку. Стенная газета выпускается один раз в 10-дневку. 19 комсомоль-

цев выделено от комсомольских организаций политагитаторами деревень, они охватывают деревни всей зоны. Комсомольцами проведено 113 докладов в деревнях на темы: «Героические успехи Красной Армии», «Подготовка ко дню 26-й годовщины Октября». Только комсомольская организация артиллерийского дивизиона в своей зоне, состоящей из 9 деревень, провела 15 докладов и 23 беседы.

Комсомольцы проводят беседы среди населения, например: «Как сберечь добро и жизнь в трудной обстановке». Кроме политагитаторов комсомольских организаций среди населения района работают инструкторы РК ЛКСМБ. Особый подъем среди населения вызвало письмо тов. Сталину, где население проявило активное участие в обсуждении и подписи письма, также в районе распространяется советская литература, засылается в немецкие гарнизоны. Выпускается бригадной типографией районная газета «Калгасная праўда», выпускаются листовки к молодежи Лепельского района. В деревнях проведены доклады о 25-летии комсомола.

Всего по Лепельскому району на октябрь насчитывается 69 подпольных комсомольских организаций, в которых состоит 207 чел. Подпольно работают 4 инструктора РК ЛКСМБ и первый секретарь РК ЛКСМБ. Подпольные комсомольские организации имеются и в гарнизонах. Они проводят большую работу по разложению армии противника.

Подпольщиками проводится большая разведывательная работа в гарнизонах. Через подпольщиков занесено в немецкие гарнизоны 840 экз. листовок, 200 экз. газеты «Калгасная праўда», 130 экз. «Савецкай Беларусі».

Секретарь Лепельского РК ЛКСМБ Пашкевич

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3856. Воп. 1. Спр. 16. Л. 237—239.

№ 43
Пастанова Лепельскага падпольнага райкама КП(б)Б «Аб падрыхтоўцы і правядзенні свята 26-ай гадавіны Чырвонай Арміі»

14 лютага 1944 г.

1. Предложить командирам, комиссарам и секретарям первичных парторганизаций отрядов в честь 26-й годовщины РККА подготовить и провести боевые операции.

Во всех отрядах 23 февраля 1944 г. провести торжественные вечера с докладами о 26-й годовщине РККА. К этому празднику выпустить специальные номера стенных газет и боевых листков, в которых отразить боевые дела отряда и показать лучших партизан, проявивших себя в боях с немецкими захватчиками.

2. Инструкторам и пропагандистам РК КП(б)Б во всех населенных пунктах провести собрания с докладами о 26-й годовщине РККА.

3. Предложить тов. Кислову подобрать и подготовить докладчиков в отрядах о 26-й годовщине РККА и провести с последними инструктивный доклад.

4. РК КП(б)Б призывает всех партизан и партизанок ко дню встречи праздника РККА еще больше усилить свои удары по коммуникациям, по уничтожению живой силы и техники врага. Сделать нашу борьбу смертельной для врага и тем самым приблизить нашу победу над кровавым фашизмом.

Секретарь Лепельского РК КП(б)Б Качан

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 259. Л. 124.

№ 314
З гісторыі Лепельскай партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна аб палітмасавай рабоце ў раёне са жніўня 1942 г. па 1 ліпеня 1944 г.

4 жніўня 1944 г.*

На 1 июля 1944 г. районная организация объединяла 6 партийных организаций и 3 партийно-кандидатские группы с общим количеством членов ВКП(б) — 24 чел., кандидатов ВКП(б) — 80 человек. Партийная организация росла за счет лучших партизан бригады, отважно борющихся с врагом. Только за период раздела бригады Лепельский подпольный РК КП(б)Б принял в члены ВКП(б) 20 чел., в кандидаты ВКП(б) — 124 чел. Комсомольская организация бригады на 1 июля 1944 г. насчитывала 223 чел. и объединяла 12 комсольских организаций. Коммунисты и комсомольцы бригады в борьбе с немецкими захватчиками показали себя как беззаветно преданные делу Ленина, любящие свою Родину и за освобождение ее готовые отдать жизнь. Руководящие посты в бригаде занимали коммунисты и комсомольцы. Находясь на этих постах, они организовывали и увлекали за собой беспартийную молодежь бригады и района.

Немало героических подвигов совершили коммунисты и комсомольцы бригады в боях с врагом. Коммунисты комбриг Короленко Д. Т., командир диверсионного отряда Рябенков, комиссары отрядов Гальченко, Горчаков, Ибрагимов, находясь всегда впереди, руководя отрядами, героически погибли в боях во время карательной экспедиции в апреле 1944 г. Комсомолец-пулеметчик Ладик Николай (1-й отряд) в боях за Воронь за 2 дня (21 и 22 апреля) истребил 18 гитлеровцев.

В боях за Изофатово комсомольцы-пулеметчики кавалерийского эскадрона Понизович К. и Позняк П. истребили вместе 50 гитлеровцев. Несмотря на то что оба были ранены, продолжали вести огонь по наступающему противнику до тех пор, пока не получили приказ об отходе. Командир взвода комсомолец тов. Ясюк (4-й отряд) в боях во время экспедиции проявляет смелость и находчивость, неоднократно заходил в тыл и фланг врага, решительным ударом ошеломлял врага, этим самым выводил отряд из затруднительного положения. Попав в окружение, бойцы взвода гранатами и огнем прорвали кольцо противника. За хорошую боевую деятельность комсомол бригады получил переходящее Красное знамя ЦК ВЛКСМ.

Интерес населения к событиям на фронтах был огромный. И в этом деле неоценимую роль сыграла наша партизанская печать, которая организовалась в феврале 1943 г. и непрерывно с 23 февраля печатала сводки Информбюро.

Больше 300 номеров сводок Совинформбюро и больше 100 номеров газет выпустила партизанская печать бригады с февраля 1943 г. по 1 мая 1944 г. Сводки и газеты в большинстве своем поступали в среду местного населения, где передавались из рук в руки, буквально зачитывались до дыр.

Ежедневно в партизанские отряды вливались юноши и девушки из немецкой зоны, чтобы мстить врагу, бить врага на своих родных полях. Население немецкой зоны видело свою защиту только в партизанах. Вот почему, когда немцы выходили из своей берлоги — гарнизонов и направлялись в какую-либо деревню, они ее находили почти пустой. Население уходило туда, где были их защитники-партизаны.

Помимо работы с населением немалую работу провела Лепельская парторганизация по разложению изменнических формирований. В этом деле огромную роль сыграли подпольные парторганизации, а затем, с развитием партизанского движения, партизанская печать и подпольщики, которые распространяли ее. Первым подпольщиком был коммунист Кимстач Н. (Каменская подпольная организация). Имея свой радиоприемник, он принимал сводки Совинформбюро и распространял среди населения (Об успехах Красной Армии), за что был зверски растерзан фашистскими палачами в 1942 году.

---

* Датуецца па часе напісання гісторыі брыгады.

Лістоўкі партызанскага мастака М. Ц. Гуціева

Коммунист Барановский (Лепельская подпольная парторганизация) печатал в немецкой типографии советские сводки, листовки и распространял их, также погиб от рук немецких палачей.

С развитием партизанского движения, а также и партизанской печати работа подпольщиков стала заключаться в распространении листовок, обращений. Большую помощь в этом деле оказала подпольщица Лавринович Дарья, проживавшая около немецкого гарнизона гор. Лепеля...

Листовки и обращения печатались в типографии и носили в большинстве случаев агитационный характер. Писались они к солдатам «РОНА», полицейским, бургомистрам с целью объяснить им, на какое позорное дело они решились и что свою вину им не поздно искупить, если повернуть свое оружие против фашистов и перейти на сторону партизан. В обращениях отражали наступление Красной Армии и неизбежность гибели фашистской Германии. Помимо листовок очень часто засылались в гарнизон гор. Лепеля плакаты партизанского художника Гутиева. В этих плакатах в большинстве случаев в карикатурной форме с саркастическими стихотворениями высмеивались фашистские главари Гитлер, Геббельс, Муссолини и изменники Родины Каминский, Власов.

Отражалось также могучее наступление Красной Армии, которая сметет фашистскую мразь с советской земли.

Командир бригады капитан	Ярмош
Комиссар мл. политрук	Качан
Нач. штаба лейтенант	Атрашкевич

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 17. Л. 487—490.

№ 119

З пастановы сакратарыята ЦК ВЛКСМ аб уручэнні Чырвонага сцяга ЦК ВЛКСМ камсамольскаму атраду партызанскай брыгады «Дубава»

2 верасня 1943 г.

... 2. Поручить ЦК ЛКСМ Белоруссии вручить Красное знамя ЦК ВЛКСМ комсомольской организации партизанской бригады* под командованием Героя Советского Союза генерал-майора Дубровского.

Секретарь ЦК ВЛКСМ Н. Михайлов

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 63. Воп. 13. Спр. 9. Л. 96.

№ 36

З рапарта камандзіра партызанскай брыгады «Чэкіст» Магілёўскай вобласці аб дзейнасці груп самаабароны ў вёсках Лепельскага і Чашніцкага раёнаў Віцебскай вобласці

15 снежня 1942 г.

В результате систематической, повседневной работы отрядов по деревням, проведения митингов, собраний, бесед об успешном наступлении Красной Армии, зверствах, издевательствах над русским населением немецко-фашистских мерзавцев, о коварном, низком обмане врага, стремящегося забрать всех жителей в Германию на холодную и голодную смерть, во многих деревнях созданы группы самообороны, которые совместно с партизанами работают, ведут разведку в пользу последних, сообщают о появлении противника, выполняют всей деревней указания командования по обороне деревни, устраивают лесные завалы, уничтожают деревянные мосты, задерживают и выявляют немецких шпионов, устраивают посты охраны и т. д. Группы самообороны приняли братскую клятву. Например, такая работа проведена в следующих деревнях:

1. В дер. Барсуки организована группа самообороны в количестве 25 чел. Этой группой произведены следующие операции: а) разобран деревянный мост 5×6 м на шоссе Лепель — Бегомль; б) разобран деревянный мост на Березовском канале со стороны подхода противника; в) сделано несколько лесных завалов на вероятном пути подхода противника.

2. В дер. Воловая Гора организована группа самообороны в количестве 20 чел. Группой сделано несколько лесных завалов на дороге, уничтожено 2 деревянных моста, преграждающих подъезд к деревне, установлены посты.

3. Организована группа самообороны в количестве 35 чел. в дер. Гадивля. Этой группой сделано: а) несколько лесных завалов на шоссе Лепель — Борисов; б) сожжен 14 декабря 1942 г. мост 6×40 м на шоссе Лепель — Борисов у своей деревни; в) уничтожен деревянный мост 2×4 м на пути подхода противника. Установлены посты.

4. В дер. Велевщина организована группа самообороны в количестве 40 чел. Этой группой сделано несколько лесных завалов на шоссе Лепель — Борисов, уничтожен деревянный мост на шоссе Лепель — Борисов.

Подобные группы самообороны созданы в дер. Острове в количестве 15 чел., Стайске в количестве 23 чел., Загатье — 11 чел., Малые Торонковичи — 8 чел. и т. д.

Работа по дальнейшему созданию групп самообороны в деревнях успешно продолжается. Исключительный прилив имеется в партизанские отряды. Народный подъем очень велик. Целые деревни желают вступить в партизанские отряды. Буквально все условия созрели для поднятия всенародного восстания, только надо вооружение, чего, к великому сожалению, мы не имеем. С нетерпением ждем принятия мер с Вашей стороны по доставке вооружения...

Командир бригады Кирпич

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 88. Л. 32—34.

* У дакументе «отряда».

№ 115

З рапарта камандзіра партызанскай брыгады «Чэкіст» аб баявой дзейнасці, масава-палітычнай рабоце сярод партызан і насельніцтва, аб стварэнні рэзерву і груп самаабароны ў вёсках Лепельскага і Чашніцкага раёнаў Віцебскай вобласці ў снежні 1942 — лютым 1943 гг.

26 лютага 1943 г.

22 февраля 1943 г. отряд при участии подрывной группы тов. Кириллова взорвал деревянный мост 5×6 м на шоссе Лепель — Бегомль в районе дер. Рудня — Веребки. 29 января 1943 г. отряд взорвал деревянный мост 5×30 м у дер. Тяпино на шляху Волосовичи — Чашники.

Отряд Иванова в ночь с 27 на 28 декабря 1942 г. при участии подрывной группы тов. Кириллова взорвал железобетонный мост 5×8 м на шоссе Лепель — Бегомль. С 15 декабря 1942 г. по 20 января 1943 г. отрядом доставлено бригаде авиабомб разного веса 100 шт. с аэродрома, расположенного в 7 км юго-западнее Лепеля. Отремонтировано 9 авиапулеметов типа «максим», 1 ПТО и 2 танковых пулемета. 26 февраля 1943 г. отряд вел бой с карательным отрядом в количестве 350 чел. в дер. Рудня. В 8-часовом бою убито 35 фрицев и 10 ранено. Наши потери: 4 убито, 2 ранено.

Отряд Симдянкина. 12 февраля 1942 г. отрядом сожжен мост у дер. Свядица. 12 февраля 1943 г. отряд вел бой у дер. Свядица с карательным отрядом в количестве 350 чел. Убито 2 фрица и 2 полицейских. 21 февраля 1943 г. отряд путем засады уничтожил 18 фрицев в районе дер. Карсавщина.

Отряд Якимова 18 декабря 1942 г. сжег деревянный мост 6×8 в дер. Рудня. 19 декабря 1942 г. сжег деревянный мост на шоссе Лепель — Бегомль в районе дер. Рудня. 18 февраля 1943 г. во взаимодействии с отрядом тов. Коржавина (быв. отряд ст. лейтенанта Шамарина) в открытом бою с карательным отрядом в количестве 250 чел. уничтожил 2 фрицев и 2 ранил. Ввиду превосходящих сил противника отряды отошли. 19 февраля 1943 г. отряд вел бой с карательным отрядом в дер. Карсавщина. Убито 6 фрицев.

14 февраля 1943 г. при взаимодействии отрядов Иванова, Маркова, Симдянкина, Коржавина с 8 час. до 16.00 вели бой с сильно укрепленным немецким гарнизоном в количестве 150 человек, который установлен на стройплощадке шоссе Лепель — Бегомль восточнее дер. Веребки. Потери противника: 4 ранено, 3 убито. Наши потери: 1 убит, 1 ранен. Артогнем разрушены общежитие противника и мост на площадке. Отрядами бригады выведены из строя и контролируются шоссе Лепель — Бегомль, Лепель — Борисов; шляхи Лепель — Чашники, Лепель — Лукомль.

Оперативная работа. Путем оперативной работы в бригаду переведено 25 человек из отряда «добровольцев» гор. Лепеля. Кроме винтовок они принесли 2 ручных пулемета, гранаты, патроны. Продолжаю вести оперативную работу по разложению «добровольцев» и полицейских. Наряду с открытой борьбой с врагом проведена большая работа по выявлению шпионов гестапо. ОО бригады разоблачено и уничтожено 12 шпионов.

Создание партизанских резервов. В 20 деревнях Лепельского и Чашникского районов подготовлены партизанские резервы и созданы группы самообороны, которые ведут разведку в пользу партизан, устанавливают посты наблюдения, помогают выявлять шпионов. Группы самообороны работают под непосредственным руководством командиров отрядов.

Данные разведки. В связи с наступлением противник из гор. Лепеля перебрасывает все склады в направлении гор. Витебска — приближает к железной дороге.

768-й зенитный дивизион в количестве 1 тыс. чел., сформированный частично в Тобруке, частично в Норвегии, из гор. Лепеля 12 февраля 1943 г. выехал в направлении Гомеля.

Противник активизирует свои действия в борьбе с партизанами и устанавливает большое количество гарнизонов.

Командир бригады Кирпич

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 88. Л. 35—37.

Па старонках справаздачы Лепельскай партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна

Рост і ўзбраенне брыгады

Брыгада мела	на 01.09.43 г.	на 01.04.44 г.
Людскі састаў	997	1743
Узбраенне:		
кулямётаў	26	56
аўтаматаў	73	143
вінтовак	466	725
асабістай зброі	34	54
мінамётаў	4	11
пушак	3	4
супрацьтанкавых руж.	8	9

На сувязі з Масквой камандзір партызанскай брыгады «Дубава» Ф. Ф. Дуброўскі. 1943 г.

Сувязь

Першапачатковая сувязь паміж атрадамі вялася шляхам абмену сувязнымі, а таксама паміж атрадамі і штабам брыгады. Для сувязных, як правіла, выбіраліся лепшыя партызаны і адначасова добра ведаючыя тую мясцовасць, у якой у даны момант дзейнічалі атрады, каб пасланы сувязны не заблудзіў. Гэта вельмі важна ў баявых абставінах. Пазней, калі брыгада займала сваю, ачышчаную ад немцаў тэрыторыю, была ўстаноўлена паміж атрадамі і брыгадай тэлефонная сувязь. Упершыню тэлефонную сувязь паміж атрадамі і штабам брыгады, а таксама атрадаў са штабам брыгады і суседнімі брыгадамі ўдалося аднавіць у лістападзе месяцы 1942 года. Даўжыня першай тэлефоннай лініі каля 30 кіламетраў. Даўжыня лініі да 1 ліпеня 1943 года была даведзена да 240 кіламетраў, а да лістапада 1943 года яна была ўжо больш за 300 кіламетраў. Важную ролю ва ўстанаўленні тэлефоннай сувязі паміж атрадамі сваёй брыгады, а таксама з суседнімі брыгадамі адыгралі камандзір узвода сувязі тав. Апёнак П. А. і манцёры-лінейнікі тав. Сарока Г. А. і Усцін Т. А.

Першапачатковая сувязь са штабам партызанскага руху вялася шляхам пераходу спецыяльных сувязных цераз лінію фронту, што было звязана з вялікімі цяжкасцямі і небяспекай. Пазней, з мая месяца 1943 г., была наладжана радыёсувязь. Радыёсувязі паміж атрадамі не было, бо брыгада мела толькі адну рацыю. Радыёсувязі з суседнімі злучэннямі амаль не мелі, акрамя сувязі тэлефоннай для перадачы асабліва важных паведамленняў сакрэтнага парадку. Пры штабе брыгады ад кожнага атрада меўся сувязны. Іншыя брыгады нарачных сувязных пасылалі па неабходнасці.

У баі, калі бой прыходзілася весці некалькімі атрадамі, для каардынацыі дзеянняў кожны атрад на камандны пункт дасылаў сувязных з данясеннем аб ходзе бою. Цераз гэтых жа сувязных з камандная пункта дасылаліся баявыя загады ў атрады. Сувязь сігналізацыяй амаль не прымянялася. Цераз сувязных жа сувязь трымалася і на маршы, і на адпачынку ў час вялікіх пераходаў.

Боезабеспячэнне

Зброя адшуквалася партызанамі з наступных крыніц: 1. Здабывалася ў насельніцтва, падабраная ім у 1941 годзе. 2. Са згарэўшых ці ўзарваных складоў часцямі Чырвонай Арміі (звычайна Полацкі ўкрэпраён). 3. Трафеі, захопленыя ў ворага. 4. Атрыманая з Вялікай зямлі. Таксама здабываліся і боепрыпасы.

У шпіталі партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна. 1943 г.

←
Урачысты марш пасля ўручэння партызанскаму атраду №13 брыгады імя І. В. Сталіна Пераходнага Чырвонага Сцяга ЦК ВЛКСМ. 1943 г.

Для аднаўлення і рамонту зброі меліся майстэрні ў кожным атрадзе, акрамя таго, брыгадная майстэрня боезабеспячэння, якая праводзіла больш складаныя работы, якія былі не пад сілу атрадным майстэрням. Да ўстанаўлення магчымасці атрымліваць боепрыпасы з-за фронту забеспячэнне імі было нездавальняючым, таму што здабытыя партызанамі боепрыпасы былі няякаснымі, напрыклад, патроны, якія дастаўляліся з узарваных складоў часцямі Чырвонай Арміі, былі сырымі, іржавымі, памятымі. Гэтыя недахопы часта ў разгар бою прыводзілі да адказу зброі, асабліва аўтаматычнай.

Звычайны камплект боепрыпасаў на партызана складаў 100—160 патронаў на вінтоўку, 500—800 — на ручны кулямёт, 1800—2500 — на станковы кулямёт. Гранаты меў не кожны, таксама і нажы.

Замежная зброя (бельгійская, нарвежская) часцяком бяздзейнічала з-за недахопу боепрыпасаў. Нямецкая забяспечвалася таксама недастаткова.

Агульная колькасць здабытай зброі ў насельніцтва — 58 вінтовак, падабрана і адноўлена кінутай зброі часцямі Чырвонай Арміі — кулямётаў — 14 (знята з разбітых самалётаў на Лепельскім аэрадроме), вінтовак — 180 (у большасці гарэўшых са складаў Полацкага ўкрэпраёна). Трафеі, узятыя ў ворага: кулямётаў — 26, вінтовак — 285, аўтаматаў — 12, мінамётаў — 6.

Медыцынская служба брыгады

25 жніўня 1942 г. у брыгадзе налічвалася 3 урачы, 2 зубных урачы, 10 медыцынскіх сясцёр. Да 1 мая 1944 г. у брыгадзе мелася 5 урачоў, 2 зубных урачы, 25 медсясцёр. Пры брыгадзе меўся шпіталь, у якім лячыліся ўсе партызаны атрадаў. У шпіталі праводзіліся аперацыі ў асноўным на канечнасцях: ампутацыя, перавязка сасудаў. Пачынаючы з ліпеня 1943 г. цяжкапараненыя, якія мелі патрэбу ў працяг-

лым лячэнні, адпраўляліся за лінію фронту. За лінію фронту адправілі 54 чалавекі цяжкапараненых з пашкоджаннем касцей і шырокім раненнем важных тканак. Усяго за перыяд з 25 жніўня 1942 г. па 1 мая 1944 г. цераз шпіталь прайшло 1012 чалавек параненых і хворых, з якіх 54 чалавекі былі адпраўлены за фронт, астатнія вернуты ў строй.

Брыгадныя ўрачы аказвалі хірургічную дапамогу іншым брыгадам, у прыватнасці Аляксеевай брыгадзе і Мядзведзевай. У апошнія месяцы брыгада была забяспечана неабходнымі інструментамі і перавязачнымі матэрыяламі, а таксама медыкаментамі з-за фронту.

Як мне дапамаглі чэхі

Успаміны Парфянчук Антаніны Іванаўны, падпольшчыцы г. Лепеля

Быў сакавік 1942 года, як цяпер, памятаю гэты нядзельны дзень у акупіраваным немцамі беларускім горадзе Лепелі Віцебскай вобласці. Па заданні штаба партызанскай брыгады я павінна была распаўсюджваць у горадзе лістоўкі. Справа ў тым, што кожную нядзелю на базар прыязджала нямецкая машына, у якой сядзеў бургамістр Нядзелька Юрый Ціханавіч і камендант горада. Яны зачытвалі закон аб ваенным становішчы, дзе за кожную нязначную правіннасць прадугледжвалася смяротная кара. Затым вялі агітацыю прыкладна ў такім сэнсе: «Насельніцтва павінна дапамагаць немцам і паліцыі выдаваць камуністаў, партызан, аказваць паслугі нямецкім салдатам».

Пасля такой агітацыі яны раскідвалі лістоўкі такога ж зместу. Гэты выпадак я і выкарыстала.

У тую нядзелю я, як заўсёды, прыйшла на рынак з кошыкам, праціснулася бліжэй да нямецкай машыны і, калі адтуль сталі кідаць лістоўкі, пачала кідаць свае. Не ведаю, ці дапусціла я тады якую-небудзь памылку, альбо гэта ўвогуле справа выпадку, але двое паліцэйскіх затрымалі мяне і адштурхнулі ад машыны, сабраўся вялікі натоўп. Раптам пачуўся голас: «Разысціся!» Да нас падышлі два немцы і сказалі, што па распараджэнні каменданта яны павінны даставіць мяне ў камендатуру. Абыякава яны штурхнулі мяне ў машыну і павезлі. Калі мы ўжо былі далёка ад натоўпу, за горадам, машына раптам спынілася, мне развязалі рукі і сказалі, што яны не немцы, а чэхі і каб я не баялася іх, што іх краіну таксама акупіравалі немцы і што яны цяпер, чэхі, усім, чым могуць, будуць помсціць ненавісным акупантам. Мы пазнаёміліся. Адзін з іх быў па прозвішчу Чэслеўскі, які ў далейшым вельмі многа зрабіў для нас, партызан.

— Ёсць у вас яшчэ лістоўкі? — спытаў ён мяне. Я зразумела, што адмаўляцца было дарэмна, я ўсё роўна была ў іх руках. Да таго ж не давяраць ім не было падставы пасля іх смелага ўчынку. Я аддала ім усе лістоўкі, якія ў мяне засталіся.

Прачытаўшы іх, чэхі сказалі: «Мы можам усім вам дапамагчы, а цяпер скажы, куды цябе адвезці?» Безумоўна, я адказала, што мне трэба папасці да сваіх, у лес, да партызан. Яны далі мне скрыню з патронамі і гранатамі.

З таго часу чэхі дапамагалі нам: даставалі зброю, узрыўчатку, медыкаменты, паведамлялі, калі немцы збіраюцца «прачэсваць» лес. У выніку мы заўсёды сустракалі фашыстаў там, дзе яны нас ніколі не чакалі. З дапамогай чэхаў мы здзейснілі і шэраг паспяховых дыверсій, знішчылі ўмацаваныя раёны ў тыле ворага. Пазней Чэслеўскі арганізаваў з ліку салдат, якія былі сілком забраны немцамі ў армію, падпольную групу. Тут былі людзі розных нацыянальнасцей: чэхі, румыны, палякі. Усе яны аднолькава ненавідзелі фашыстаў і гарэлі жаданнем адпомсціць ім за зганьбаваную радзіму, за кроў і слёзы мільёнаў людзей. Чэхі дабывалі партызанам звесткі пра намеры нямецкай воінскай часці, якая стаяла ў горадзе на адпачынку. Пра гэта мы паведамлялі за лінію фронту, і Чырвоная Армія наносіла ўдары менавіта туды, адкуль была знята гэта часць. Дарэчы сказаць, і мы тут не давалі адпачываць даволі патрапанай нямецкай часці.

Ніколі не забуду, з якім захапленнем расказваў Чэслеўскі аб сваёй роднай Чэхаславакіі, аб яе мужным і працавітым народзе, аб родных Карпатах. З сумам гаварыў аб каханай дзяўчыне, з якой фашысты разлучылі яго ў дзень вяселля. Ён марыў аб тым дні, калі гітлерызм будзе разгромлен і ён вернецца дадому, каб разам з любімай будаваць новую Чэхаславакію. Але яму не давялося дажыць да гэтага дня. Ускорасці яго павесілі на той самай базарнай плошчы, дзе ён калісьці вызваліў мяне.

Адважны патрыёт выратаваў некалькі чалавек ад расстрэлу: забіў вартавога, а другога параніў, той і выдаў яго. Перад пакараннем смерцю Чэслеўскі моцным голасам ускрыкнуў: «Дружбу народаў не знішчыце! Я паміраю, але я зрабіў тое, што павінен зрабіць кожны чалавек».

Смерць Чэслеўскага была вялікай стратай для ўсёй падпольнай арганізацыі на Віцебшчыне. Чэслеўскі многа людзей вызваліў з турэмных камер, многа ваеннапалонных пераправіў у партызаны, забяспечыўшы іх зброяй. Арганізаваў уцёкі з лагера ваеннапалонных.

Аб усім гэтым мне добра вядома, таму што не раз прыходзілася перапраўляць групы па 15—20 чалавек, падрыхтаваўшы для іх зброю, а затым прызначыўшы месца сустрэчы для групавой адпраўкі. Сустрэчы праходзілі ў дамах Нарушэвіч Марыі, Багдановіч Варвары і больш за ўсё ў Гласковіч Марыі, а затым я праводзіла іх да партызан.

Ганніна поле

Удзельнік першай сусветнай вайны Герасім Аношка, жыхар вёскі Свядзіца, вяртаючыся з германскага палону, прывёз дадому жонку-немку Ганну.

Няпроста складвалася жыццё маладой сям'і, асабліва для Ганны. Незнаёмыя людзі, чужы ўклад жыцця, няведанне мовы... Аднак муж і яго родныя стараліся дапамагчы ёй ва ўсім.

Нарадзілася ў іх трое дзяцей. У пачатку трыццатых гадоў адны з першых уступілі ў калгас.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, сям'я ў поўным складзе засталася ў сваёй вёсцы. Калі ў бліжэйшых лясах стварыліся партызанскія атрады, Герасім і Ганна стараліся ва ўсім дапамагаць ім.

Неаднойчы ў вёску наведваліся немцы, каб забраць для сваіх патрэб жывёлу. І першым абаронцам жыхароў Свядзіцы станавілася Ганна. Яна заўсёды прыходзіла па першаму выкліку і ўпрошвала вярнуць нячасным людзям карову ці свінню.

Аднак гэта не падабалася фашысцкім прыслужнікам. Яны шукалі любую прычыну, каб расправіцца з мужнай жанчынай. І аднойчы дамагліся свайго.

...У той летні дзень трое партызан завіталі на конях у двор да Аношкаў. Пакуль яны вялі гаворку з гаспадыняй аб сваіх справах, разнеслася чутка, што вёску акружаюць паліцаі. У спешным парадку коні былі схаваны, нават падвор'е вымелі, каб знішчыць сляды. Партызаны затаіліся ля хлявоў. Толькі бяды ўжо нельга было мінаваць: карнікі накіраваліся прама на двор да Аношкаў. Хоць партызаны абараняліся мужна, аднак сілы былі няроўныя. Двое з іх загінулі, а трэцяга, параненага, паліцаі схапілі і павесілі тут жа, ля калодзежа.

Ганну ж выпіхнулі з хаты і павялі да павозкі. Суседка, бачачы, што справа — дрэнь, кінулася да яе з кавалкам хлеба:

— Вазьмі, Ганначка! Хто ведае, што яшчэ будзе...

Адзін з паліцэйскіх груба штурхануў тую і прабурчаў:

— Дарэмна стараешся. Мы яе накормім іншай ежай.

Ледзь толькі падвода знікла за паваротам дарогі, пачуліся стрэлы. Толькі ўвечары адважыліся людзі паглядзець, што ж там здарылася. Ганна ляжала на баку, трава ля яе была крывавая. Не зважаючы на небяспеку, аднавяскоўцы прынеслі яе на могілкі, дзе і пахавалі.

У тое ж лета фашысты расстралялі Герасіма і двое старэйшых дзяцей — як памочнікаў партызан. Уцалеў самы малодшы, Андрэй. Ён і сёння жыве ў Свядзіцы, працуе ў калгасе трактарыстам.

Людзі, асабліва старыя, і па сённяшні дзень называюць тое поле, дзе загінула жанчына з далёкай Германіі, Ганніным.

А. Міснік

Жанчына з нумарам 61500

У вёсцы Окана, у маляўнічым месцы сярод азёр і лясоў, жыве Варвара Сямёнаўна Крыцкая. Усё было ў яе жыцці — і гора, і радасць. Рана засталася яна без бацькоў. 12-гадовай дзяўчынкай пачала яна сваю працоўную дзейнасць: няньчыла дзяцей, была падсобнай работніцай у лепельскай сталовай... Сустрэла добрага, прыгожага хлопца Рыгора Крыцкага. Пакахалі яны адзін аднаго. Пажаніліся. Разам працавалі ў калгасе, пачалі абзаводзіцца гаспадаркай. Але вайна ўварвалася ў іх жыццё, зблытала ўсе іх планы і намеры. Акупацыя родных мясцін не выклікала ў іх разгубленасці. Ведалі, што рабіць — збіраць зброю, ісці да партызан. Але Вара чакала дзіця. Трэба было пачакаць. Неўзабаве Вара нарадзіла двойню — хлопчыка і дзяўчынку. Рыгор Крыцкі вырашыў ісці да партызан. Якраз цераз іх мясціны ішла партызанская брыгада «Чэкіст». Партызанскай сувязной стала Вара. Брыгада ў хуткім часе перадыслацыравалася ў Шклоўскі раён на Магілёўшчыну. Рыгор Крыцкі пайшоў з брыгадай. Вара засталася даглядаць дзяцей. Але здраднік выдаў Вару Крыцкую гітлераўцам. Разам з дзецьмі яе адвезлі ў Лепель. Катавалі. Як цяжарную яе пасадзілі ў турму, дзе яна нарадзіла хлопчыка. Неўзабаве дзіця памерла. З турмы рыхтавалі групу для адпраўкі ў Германію. Ёй удалося перадаць свякроўцы дачку. А з сынам Рыгорам яе павезлі ў лагер смерці Асвенцым.

На руцэ Варвары Сямёнаўны і яе сына накалолі нумары — 61500 і 61501. Ад цяжкіх умоў, голаду і холаду захварэў хлопчык. Вара не змагла хадзіць на работу. І тады нямецкія ахоўнікі адабралі ў яе паўтарагадовага сына і адправілі яго ў крэматорый. Не вытрымала Вара гэтых пакут, цяжка захварэла. Сяброўкі па бараку падтрымлівалі яе як маглі. Яна пакрыху набіралася сіл. Выходзіла грузіць каменні, капаць канавы. Іх вызваліла Чырвоная Армія. У ліпені 1945 г. яна вярнулася на радзіму. Сустрэлася з мужам і дачкой. Зноў пачалі абжывацца, наладжваць жыццё. У іх нарадзіліся яшчэ тры сыны: Васіль, Віктар і Уладзімір.

Г. Кірпіч, былы камандзір партызанскай брыгады «Чэкіст»

Партызанскі сын

Чэрвеньскай раніцай 1941 г. з Віцебскага вакзала Ленінграда адышоў цягнік. У ім на лета да бабулі ехаў 14-гадовы хлопчык.

У вёсцы Ворань Вася Пятроў хутка асвоіўся, завёў сяброў. І сярод іх — дзед Ерафей, інвалід. Ён расказваў хлопцу шмат цікавага.

Дзяцінства абарвалася раптам — пачалася вайна. У вёсцы з'явіліся захопнікі, па вуліцах пачалі расхаджваць паліцаі. Яны ўсё чагосьці вышуквалі, здзекаваліся над людзьмі.

У трывозе жыла вёска. Пачалі даходзіць сюды чуткі, што з'явіліся ў лясах партызаны. Неяк вечарам пачуў Вася выстрал. Раптам з хмызняку выбег узброены чалавек. Хлопец здагадаўся, хто ён, і хутка павёў яго на двор, а адтуль цераз бульбяное поле — да лесу.

Пра гэта здарэнне расказаў дзеду Ерафею. Параіў ён Васілю абавязкова стаць партызанам і дапамог яму ў гэтым. Васіль прымаў удзел у баях за Пышна. Быў цяжка паранены ў ногі. Лячыўся ў партызанскім шпіталі ў вёсцы Гута, адтуль пераправілі яго ў прыфрантавы шпіталь. Падлячыўся і зноў папрасіўся да сваіх лясных сяброў. На партызанскім аэрадроме сустрэлі яго баявыя таварышы.

«Партызанскі сын» — так звалі Васіля ў атрадзе. Ваяваў ён храбра, смела. У 1944 г. у баі пад Паперына, калі народныя мсціўцы прарывалі варожую блакаду, хлопец з Ленінграда падбіў нямецкі танк. І ў гэты самы момант аўтаматная чарга прашыла яго.

Ц. Хрыпель, былы партызан

Ён быў піянерам

У Грыгаравіцкай сярэдняй школе кожны год ва ўрачыстай абстаноўцы адзначаюць дзень памяці свайго былога выхаванца Вані Кавалёва — юнага героя Вялікай Айчыннай вайны.

Ваня скончыў чатыры класы. Яму было трохі больш за 12 гадоў, калі пачалася вайна. У вёсцы з'явіліся фашысты і іх памагатыя. З якой нянавісцю глядзеў на іх піянер. А вось што рабіць — не ведаў. Вельмі ўзрадаваўся, калі пачуў, што ў лясах з'явіліся народныя мсціўцы, якія вядуць барацьбу з акупантамі. Ваня пайшоў у вёску Гурэц, дзе, па чутках, былі партызаны. На ўскраіне вёскі яго спынілі партызаны.

Так Ваня Кавалёў апынуўся сярод тых, каго шукаў. Яго пакінулі ў атрадзе. Ён аказаўся кемлівым і смелым, добра ведаў мясцовасць. Неўзабаве стаў сувязным-разведчыкам. Даволі складаныя заданні даручала яму камандаванне. І кожны раз ён выконваў іх з высокай адказнасцю. Асабліва нялёгка было перабрацца цераз лінію фронту, каб перадаць савецкаму камандаванню данясенне. Было яно напісана на тонкай паперы і так схавана, што знайсці яго было амаль немагчыма. Гэта была першая партызанская вестачка на Вялікую зямлю.

Дарога была цяжкай і небяспечнай. Але юны сувязны ўпарта прабіраўся на ўсход. Праз тыдзень-другі дабраўся да Барысава. Тут яму ўдалося разведаць, што адна з нямецкіх часцей адпраўляецца на фронт. Хлопец, а быў ён росту невялікага, «пасябраваў» з шафёрам-немцам. Насіў яму ваду, распальваў вогнішча, дапамагаў ва ўсім. Упрасіў яго ўзяць з сабой. Даехаў да Арла. Недалёка ішлі баі, праходзіла лінія фронту. Але як праз яе перайсці?

Юны разведчык пабываў у некалькіх прыфрантавых вёсках. Прыслухоўваўся, прыглядаўся. Аднойчы пашанцавала. Разгаварыўся са старым, спытаў дарогу.

І. І. Кавалёў (у дзяцінстве)

— Дапамагу табе, сынок, — пашкадаваў яго добры чалавек. Правёў яго непрыкметнымі сцяжынкамі праз лес і балота. Нарэшце спыніліся. — А цяпер ідзі прама. Хутка выйдзеш да нашых.

Тыдні праз два вярнуўся смелы хлопец у родныя мясціны. Ён паспяхова выканаў заданне, прынёс весткі з Вялікай зямлі. З такімі даручэннямі Ваня дабіраўся да Оршы, Барысава, Лепеля, сустракаўся з падпольшчыкамі, перадаваў ім антыфашысцкія лістоўкі, збіраў каштоўныя звесткі аб праціўніку. Аднойчы вяртаўся з Лукомля, куды хадзіў па заданні. Яго затрымалі паліцаі і даставілі да нямецкага каменданта. Пачаўся допыт, але яго па нейкай прычыне перапынілі. Ваню аднаго закрылі ў кабінеце. Праз фортачку яму ўдалося ўцячы.

Напярэдадні 26-ай гадавіны Вялікага Кастрычніка прабіраўся ён з лістоўкамі ў Чашнікі. Па дарозе яго затрымалі. Даставілі ў Халопенічы. Ніякія катаванні не прымусілі яго выдаць таварышаў па барацьбе. Катавалі доўга. Хлопчык маўчаў. І тады раз'юшаны фашыст выстраліў у яго.

Так абарвалася кароткае, але гераічнае жыццё вясковага хлопчыка.

У 1972 годзе на ўскраіне Лепеля з'явілася новая вуліца. Яе назвалі імем Вані Кавалёва.

Д. Зарэцкі

У 13 хлапечых гадоў

А. Ф. Бараноўскі

Восем дзён ішлі баі за вёску. На дзевяты ў Сянно ўвайшлі нямецкія салдаты. Аркадзь Бараноўскі са сваімі сябрамі шнырылі па пустых акопах, падбіралі зброю і боепрыпасы, хавалі ў тайніках. Разумелі, што можа спатрэбіцца. А пакуль, калі ўдавалася, устройвалі стрэльбы: надзявалі на жэрдку фашысцкую каску і стралялі.

Пачаліся будні акупацыі. Фашысты забралі з вёскі ўсё, што можна было забраць. Людзей пакуль не чапалі. Недалёка ад Сянно быў створаны лагер для савецкіх ваеннапалонных. Праз некалькі дзён у вёсцы з'явіўся Мікалай Пронін. Ён пастукаўся ноччу да суседа Аркадзя — Сакалоўскага і папрасіў прытулку. Пронін збег з лагера.

Салдата схавалі. Але той парываўся ў лес, да партызан.

Аркадзь адкрыў салдату тайну. Ён паказаў яму, дзе схавана зброя. Ноччу Пронін пакінуў Сянно.

Мікалай сустрэўся з партызанамі. Расказаў ім пра хлопцаў з вёскі Сянно. Да Аркадзя прыйшлі сувязныя. Ён перадаў партызанам усю зброю і папрасіў, каб тыя ўзялі яго з сабою. Але яго пераканалі, што ён патрэбен партызанам у вёсцы.

Былы намеснік камандзіра па разведцы 2-ой партызанскай брыгады імя Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонава К. П. Фёдараў успамінаў:

«...Занимаясь разведкой в тылу врага, мне приходилось иметь контакт со многими людьми из гражданского населения Белоруссии. В том числе был парнишка по имени Аркадий, ему в ту пору, в 43-м году, было лет 13—14. С его помощью я получал важные сведения для бригады, через него имел контакт с нашими людьми... Он привел к нам в бригаду 11—13 бывших полицаев из Сенно, которых сумел сагитировать, переубедить. Они перешли на нашу сторону с оружием, предварительно разгромив полицейский участок...»

Аб далейшых падзеях расказвае сам А. Ф. Бараноўскі:

— На другую сустрэчу лейтэнант Фёдараў прыязджае прыкладна праз месяц. Ну вось што, кажа, трэба адну справу зрабіць. Немцы мабілізавалі ў паліцыю моладзь. Дык трэба б тых, што не па сваёй волі пайшлі, пераправіць да нас. Разумееце, што гэта азначае? Кожную хвіліну я рызыкаваў сустрэцца з правакатарам. У душу чалавека не залезеш. Фёдараў кажа: «Аркаша, падумай. Калі не па сіле, не бярыся. Загубіш сам сябе. СД таксама працуе». Але я згадзіўся. Не спаў усю ноч. Думаў, як выканаць заданне. Спыніўся на Мікалаю Калымазе. Той ведаў, што я школьны сябар яго брата Івана. Аднойчы я падабраў такі момант, калі ён прыйшоў дадому снедаць. З ім пагутарыў я аб партызанах. Разам падрыхтавалі першую групу, са зброяй.

Можа паказацца, што ўсё было лёгка і проста. Бывала, і паддавалі мне, і пагражалі, раз ледзьве ў камендатуру не завалаклі. Узрост выручыў. Галоўнае ж у іншым: большасць з тых, што хадзілі ў паліцэйскай форме, не хацелі немцам служыць, а так склалася — хто разгубіўся, хто воляй не выйшаў... Вось так...

Праз месяц падрыхтаваў Аркадзь другую группу і сам прывёў яе ў атрад, бо яго папярэдзілі аб арышце...

І зноў заданне: высветліць колькасць, узбраенне карнікаў, якія з'явіліся ў навакольных вёсках. Пайшоў Аркадзь з сябрам Валодзем Шаўранскім.

Коннымі рухаліся яны раніцай уздоўж рэчкі. Зазірнулі на хутар — нікога. Наперадзе паказалася Купаваць. Тут іх чакала засада.

Яшчэ не паспела адгучаць да канца каманда «Хенде хох!», як хлопцы адказалі на яе дружным залпам. Саскочылі з

коней, а над галовамі з абодвух флангаў ляцелі кулямётныя чэргі. Валодзя крыкнуў: «Адыходзь да берага! Буду цябе прыкрываць!» — і кінуў у бок рэчкі гранату, каб расчысціць Аркадзю праход. Аркадзь паўзком вярнуўся да камандзіра. Валодзя ляжаў на спіне, прыціскаючы рукою да грудзей аўтамат. Ён быў забіты.

Аркадзь схапіў аўтамат і павёў агонь. Кінуў направа і налева па гранаце, каб прыкрыць свой адыход, але ў гэты момант аўтамат даў асечку. Калі Аркадзь спрабаваў змяніць дыск, яго параніла ў правую руку. Карнікі былі ў лічаных метрах ад яго. Хлопчык падняўся на ногі, разлічваючы зубамі вырваць кальцо апошняй, трэцяй гранаты і кінуць яе ў карнікаў, калі тыя падыдуць ушчыльную. Не паспеў.

Яго расстрэльвалі ва ўпор з пяці метраў. Выбілі гранату, аўтамат. Яго білі доўга прыкладамі, нагамі.

Чуў чужую мову. Бачыў фашысцкага афіцэра. Той пытаўся аб нечым у салдат. Затым даў каманду, адышоў. Салдат перахрысціўся, расшпіліў кабуру...

Аб сваім лёсе А. Бараноўскі пісаў свайму камандзіру К. П. Фёдараву:

«...Вы пытаецеся аб маім здароўі і зроку. На здароўе пакуль што не скарджуся. Усё добра. Калі я прыбыў у шпіталь, мне патрэбна была тэрміновая аперацыя, але ўрачы былі пад сумненнем — ці вытрымаю, ці перанясу наркоз. Мяне агледзеў хірург і сказаў, што, хаця я сур'ёзна знясілеў, затое сэрца выключна моцнае. Правае вока мне вынялі адразу ж. Праўда, калі я пачаў прачынацца і стаў праходзіць наркоз, у палаце я трохі папартызаніў, так што вымушаны былі прывязаць мяне да ложка. Цераз тры тыдні мне зрабілі другую аперацыю, затым яшчэ адну. Правая рука доўгі час не разгіналася, але зараз усё добра. Далі мне другую групу інваліда Айчыннай вайны пажыццёва...»

П. Дзямідаў

З гэтага моманту я стаў дарослым

З успамінаў У. В. Гарбачова

Маё юнацтва знітавана з дзівосным краем Беларусі — Лепельшчынай. Тут я спазнаў гора і пакуты, стаў партызанам...

...Наша сям'я жыла ў Мінску. Я толькі што скончыў восьмы клас. Разам з сябрамі ў нядзелю 22 чэрвеня 1941 г. пайшоў на адкрыццё Камсамольскага возера. Там і пачуў жахлівае слова «вайна». Нямецкія самалёты бамбілі горад. Пачаліся пажары. Людзі кінуліся з Мінска. Разам з вучнямі сваёй школы пайшоў з горада і я. Зусім выпадкова сустрэў сваю цётку, Мажэйку Сцепаніду Іванаўну. Разам з ёю дабраліся да вёскі Аношкі Лепельскага раёна, дзе жыў мой дзядуля Гарбачоў Іван Ільіч.

Апоўдні ў адзін са жнівеньскіх дзён з боку Лепеля ўсё часцей і выразней чуліся стрэлы з вінтовак, аўтаматныя чэргі. «Вясковае радыё» імгненна паведаміла: «Гоняць палонных». У другой палове дня калону вязняў прымуштравалі пад пагрозай смерці да в. Аношкі (дарога праходзіла па-за сядзібамі). Тут быў зроблены так званы «прывал». Мы з Колем Прускім, Косцем Мікулёнкам ці Васем Гарбачовым паімчаліся з усіх ног да грэблі, якая злучала вёскі Аношкі і Замошша, праходзіла праз узбалотак. Там знаходзіўся драўляны невялікі мост. Мы пачалі разбіраць яго бервяно за бервяном. Наша меркаванне было такое: група палонных дойдзе да гэтага месца, з абодвух бакоў лес, узнікне замінка, і найбольш кемлівым, смелым пашчасціць вырвацца з кіпцюроў акупантаў.

Праз лес мы вярнуліся назад у вёску. Усчалася аглушальная страляніна. Калі вязні і ахова пакінулі Аношкі, усе, хто мог, падаліся да дарогі і ўбачылі жудаснае, да болю ў сэрцы пякельнае відовішча. Поле грэчкі, праз якое змяілася шырокая сцяжынка, па абодва бакі было нібыта ўзарана. На ім ляжалі забітыя чырвонаармейцы, тыя, хто ледзь-ледзь дыхаў, з прагнасцю жавалі сарваную грэчку, іх, знясіленых, змардаваных, даймаў голад... Смяртэльна параненых занеслі на руках у вёску. На вялікі жаль, нікому з іх не ўдалося выжыць, зрашэчаныя кулямі, яны памерлі.

Напэўна, я ўпершыню ў свае няпоўныя 15 гадоў так горка плакаў ад бездапаможнасці, роспачы. Мусіць, у гэты дзень я стаў дарослым.

Вечарам было вельмі прыемна пачуць шчырыя словы падзякі ад ваеннапалонных, якім дапамог уцячы, уратавацца «паламаны» мост... Аношкаўцы, чым толькі маглі, спрыялі нашым воінам, дапамагалі стаць, што называецца, на ногі. І кармілі, і апраналі, і правялі патаемнымі сцежкамі да сваіх.

Бацька, пасля гутаркі са старшынёй сельсавета Раманам Палянскім, даручыў мне збіраць зброю па навакольных лясах. Да гэтай справы я далучыў сваю сястру Клаву, вясковых хлопцаў Мікалая і Сямёна Прускіх, Мікалая Пшонку, Косцю Мікулёнка, Васіля Гарбачова і іншых.

Збіралі газеты і лістоўкі, якія скідвалі савецкія самалёты. Самыя важныя звесткі з іх перапісвалі па некалькі разоў, а затым раскідвалі ў людных месцах. Бацька разам з мясцовымі сялянамі Кузьмой Прускім, Сялівай і Аксёнам Гарбачовымі, Сямёнам Шаблінскім, Архіпам Вашкевічам, Ісакам Гарбачовым праводзіў гутаркі па навакольных вёсках.

Цераз падпольшчыкаў Лобана і Палянскага бацька звязаўся з атрадам № 4 партызанскай брыгады імя Сталіна, стаў іх сувязным. Пазней яго залічылі ў гэты атрад.

З восені 1942 г. наша вёска Аношкі ўвайшла ў партызанскую зону. Нашы сувязі з партызанамі пашырыліся. Мы мелі сувязь з брыгадамі К. С. Заслонава, «Аляксея», Лявонава.

У маі 1943 г. і я, семнаццацігадовы юнак, стаў партызанам. Спачатку брыгады «Дубава», а потым — Лепельскай брыгады імя Сталіна. Разам са мной у атрад былі залічаны мае сябры па падпольнай барацьбе Косця Мікулёнак, Мікалай Пшонка, Васіль Гарбачоў, Мікалай Прускі. Здарылася так, што мы адразу ж трапілі нібыта ў пастку — пачалася карная аперацыя супраць партызан, вядомая пад назвай «Котбус». Удзельнічалі ў прарыве варожага акружэння...

Яшчэ больш жудасныя баі вялі партызаны ў памятным прарыве каля вёсак Паперына і Новае Сяло Ушацкага раёна ў маі 1944 г. Не давядзі божа нікому і ніколі зведаць падобнае...

У пасляваенныя гады наша сям'я жыла на Лепельшчыне. Бацька працаваў сакратаром, затым намеснікам старшыні райвыканкама.

Пасля вайны — зноў школа... Затым Віцебскі медыцынскі інстытут...

Брыгада Б. Камінскага на Лепельшчыне

У жніўні 1943 г. з Арлоўскай вобласці ў Лепельскі раён была перадыслацыравана брыгада «Рускай вызваленчай народнай арміі» (РВНА) на чале з генералам Б. У. Камінскім. Званне генерала было яму прысвоена немцамі летам 1943 г. Брыгада пачала фарміравацца ў 1941 г. з невялікіх па колькасці падраздзяленняў у п. Локаць Арлоўскай вобласці і яго наваколлях. Укамплектавана ў асноўным жыхарамі суседніх раёнаў вобласці. Да 1943 г. у брыгадзе налічвалася 12 тысяч чалавек (5 палкоў). Гітлераўскае камандаванне выкарыстоўвала яе для барацьбы з партызанамі на Арлоўшчыне і Браншчыне. Увосень 1943 г. было вырашана перакінуць яе на тэрыторыю Беларусі, каб выкарыстаць у тыле 3-яй нямецкай танкавай арміі, якая ўтрымлівала рубеж на подступах да Віцебска і Оршы. Разам з брыгадай прыбылі на Лепельшчыну і іх сем'і.

Партызаны Полацка-Лепельскай зоны вялі жорсткія баі з гітлераўцамі, у тым ліку і з брыгадай Камінскага. Адначасова яны вялі работу сярод байцоў РВНА. У выніку чаго ў верасні 1943 г. да партызан перайшла група салдат і афіцэраў батальёна брыгады. 21 кастрычніка ў поўным саставе 7-ы батальён, затым — частка 4-га батальёна. Пераходзілі да партызан салдаты і афіцэры з іншых падраздзяленняў брыгады. Да лістапада 1943 г. партызанамі сталі 1079 чалавек. Адначасова на бок партызан перайшлі 4 паліцэйскія гарнізоны, якія размяшчаліся ў зоне дзеянняў брыгады. Перайшоўшыя да партызан перадалі ім 4 танкі, 1 бронемашыну, 4 легкавыя аўтамашыны, 3 гарматы, 11 мінамётаў, 71 кулямёт, 59 аўтаматаў, 518 вінтовак, 70 тыс. патронаў.

Р. А. Чарнаглазава

Зварот нямецкага камандавання да насельніцтва Лепельскага, Ушацкага, Сенненскага, Чашніцкага і Бешанковіцкага раёнаў

ГРАЖДАНЕ И ГРАЖДАНКИ! Вы знаете, что германские войска в систематических боях против лесных разбойников – партизан, являющихся прислужниками иудо-большевизма, добились значительных успехов и начали очищать крупные пространства областей от этих варваров, грабящих и не щадящих русское население. Своими операциями германские солдаты освобождают вас от тяжелого бича и грабительских действий со стороны лесных бандитов, предотвращая угон вашего скота и уничтожение вашего крова. С ЦЕЛЬЮ ПОЛНОГО УНИЧТОЖЕНИЯ БАНДИТОВ ПО ЛЕПЕЛЬСКОМУ ОКРУГУ ГЛАВНОКОМАНДУЮЩИЙ ГЕРМАНСКОЙ АРМИЕЙ ПРИКАЗАЛ ОДНУ РУССКУЮ ОСВОБОДИТЕЛЬНУЮ АРМИЮ (РОА) ПЕРЕМЕСТИТЬ ДЛЯ ПРОДОЛЖИТЕЛЬНОГО РАЗМЕЩЕНИЯ В ВАШЕМ ОКРУГЕ.

Эта армия в двухлетних боях как на фронте, так и в борьбе против бандитов показала себя устойчивой и преданной русскому народу. Командиры этой армии взяли на себя всю ответственность за судьбу русского народа.

Эта армия, хорошо вооруженная технически и стремящаяся к борьбе и победе над большевизмом, приходит к вам, своим землякам, помочь очиститься от грязного мусора подонков русского общества, подлых трусов, не желающих с корыстной целью драться на фронте с вооруженными силами Германии, спасающих свою звериную шкуру в лесах, творя свое черное дело – грабить своих сестер, братьев и родных! Отсюда вывод: партизаны борются не за идеи русского народа, а помогают большевикам уничтожить русский народ, который освобожден германскими войсками от иудо-большевизма.

Граждане и гражданки! Вы должны сплотиться вокруг нового русского окружного военного командования, помогать ему уничтожить бандитов-разбойников и с помощью германских властей строить свое светлое будущее и будущее Новой России, о которой мечтали лучшие русские люди в течение 24 лет.

ПУСТЬ ЖЕ КАЖДЫЙ ДОБРОВОЛЬНО ВСТУПАЕТ В РЯДЫ РУССКОЙ ОСВОБОДИТЕЛЬНОЙ АРМИИ. Этим легче и скорее будет уничтожен бандитизм.

Кто будет сопротивляться строительству будущей России, тот будет безжалостно уничтожен.

ЛЕПЕЛЬСКИЙ ОКРУГ ПОЛНОСТЬЮ ПЕРЕХОДИТ В ПОДЧИНЕНИЕ РУССКОГО КОМАНДОВАНИЯ, КОТОРОЕ БУДЕТ РУКОВОДИТЬ ПОЛИТИЧЕСКИМИ, ХОЗЯЙСТВЕННЫМИ И ВОЕННЫМИ МЕРОПРИЯТИЯМИ С ЛОЗУНГОМ «ВСЕ ДЛЯ НАРОДА – ВСЕ ЧЕРЕЗ НАРОД».

Ваши земляки, солдаты РОА, привезут с собой свои семьи, своих сторонников – крестьян и рабочих, свой скот, имущество и уже собранный богатый урожай. То, что родные и семьи будут находиться при солдатах РОА, является большим преимуществом. Их присутствие в вашем округе заставит солдат РОА неутомимо сражаться за них и за вас против проклятого иудо-большевизма и бандитизма. ПРИМИТЕ ЭТИ СЕМЬИ РАДУШНО И ГОСТЕПРИИМНО, так как они к вам придут как друзья и помощники в строительстве новой жизни. Помогите им всеми силами, несмотря на возможные собственные ограничения. Покажите этим всему миру известное русское гостеприимство на деле и примите своих земляков с открытым сердцем в Ваших домах и хозяйствах. ВАШ ДОЛГ ПОЗАБОТИТЬСЯ О ТОМ, ЧТОБЫ ОНИ СЕБЯ ЧУВСТВОВАЛИ ХОРОШО В ВАШЕЙ СРЕДЕ. Этим вы отблагодарите солдат РОА, защищающих вас. При такой дружбе вы с солдатами РОА и с их семьями и сторонниками быстро доведете борьбу до полного разгрома большевизма-бандитизма в вашем округе!

ШМЕКЕЛЬ,
полковник и полевой
комендант

ПЛЮСКО А. П.,
начальник Лепельского
округа

Газета «Новый путь», 19 жніўня 1943 г.

Лістоўка Лепельскага падпольнага райкама КП(б)Б «Да салдат брыгады Камінскага». 1943 г.

Мы еще раз обращаемся к Вам, русским, бесстыдно обманутым гитлеровцами.

Ты, русский солдат, не только слышишь грохот канонады на Востоке, ведь ты сердцем чувствуешь приближение своих. И скажи, заставляет ли это тебя задуматься над своей судьбой, над тем, что ждет тебя и твою семью впереди?

Уже второй раз нагоняет твой трусливый бег Красная Армия. Наши войска уже возвратили Родине 24 районных центра, 18 белорусских городов, среди них Гомель, Кричев, Лоев, Ельск, Хойники, Добруш, Чериков и другие. Части Красной Армии успешно ведут наступление, они вплотную подошли к Полоцку.

На днях войска первого Прибалтийского фронта перешли в наступление и южнее Невеля прорвали оборонительную полосу противника протяжением по фронту около 80 километров и в глубину до 30 километров. За 5 дней боев освобождено 500 населенных пунктов и районный центр Витебской области Езерище. Скоро Красная Армия будет здесь.

Что же будет тогда с тобою и твоей семьей? До какого места ты будешь бежать от своих и к кому? Может быть, ты — наивный человек, мыслишь по-детски и надеешься на «теплое место» в Германии? Или ты все еще не знаешь о поражениях немцев?

Читал ли ты о бомбардировках англо-американскими самолетами городов Германии? Знаешь ли ты, что от Берлина, Гамбурга, Бремена, Эссена и других городов остались одни развалины? Только в ночь на 16 декабря авиацией наших союзников на Берлин было сброшено 1500 тонн бомб. Германия в огне, а вскоре железное кольцо фронтов сомкнется вокруг государства тиранов.

Не верь лживой пропаганде немецких «шефов» о расстрелах партизанами или Красной Армией перешедших на нашу сторону! У нас тысячи перебежчиков. 15 декабря к нам пришли из гарнизона м. Камень Шумаков Тихон, Рыжиков Александр, Шишеня Леонид и еще четыре товарища. Они принесли с собой 3 пулемета, 5 винтовок и боеприпасы. Последуй их примеру. Теперь они жестоко отомстят фашистам за все.

Ты влачишь жалкое существование человека-раба, получаешь хлеб с опилками и сухой паек, мерзнешь в рваных обносках с плеча немецкого солдата, унижаешься и стоишь «в струнку» перед самым паршивеньким немцем. Твоими руками немцы совершают страшные преступления: убивают твоих братьев по крови — беззащитных женщин, стариков и детей, сжигают жилища наших людей, разоряют твою страну. Сколько слез и крови невинных людей заставляет проливать твоя служба у врага! И ради чего?

Вот ты, Одесский Павел (15-й батальон), ты немецкий «шеф». Твой родной город Калинин давно освобожден... Денисов Федор, твоя Чкаловская область даже не была близка к фронту, подумайте, разве седеющая мать и старик отец ждут вас домой как изменников Родины? Они проклянут час, в который вы родились, узнав, что их дети подняли руку на своего, русского, защищая кровавую свору Гитлера.

Не теряй времени, пока есть возможность — бери оружие и переходи на сторону партизан. Здесь ты встретишь своих товарищей, здесь в борьбе с немцами ты завоюешь себе славу и оправдание.

Смелость и решительность твоих действий зависят от тебя. Не трусь! Переходи, пока не поздно.

Эта листовка одновременно является пропуском для перехода на сторону партизан группами и в одиночку.

ЛЕПЕЛЬСКИЙ РК КП(б)Б

Баі за Пышна

У сваіх кароткіх успамінах мне хочацца расказаць аб адной самай буйной аперацыі супраць партызан Полацка-Лепельскай зоны ў 1943 годзе, і ў прыватнасці аб баях за Пышна, якія ганебна скончыліся для акупантаў.

Гэта карная экспедыцыя ажыццяўлялася з 19 мая па 21 чэрвеня 1943 года пад камандаваннем групенфюрэра СС, генерал-лейтэнанта паліцыі фон Готберга і, згодна з трапіўшымі ў нашы рукі нямецкімі дакументамі, мела ўмоўную назву «Котбус».

Каб зразумець ход аперацыі і значэнне барацьбы супраць карнікаў, неабходна разгледзець абставіны размяшчэння фашысцкіх гарнізонаў, абкружаўшых партызанскі край.

У момант падрыхтоўкі карнай экспедыцыі варожыя гарнізоны былі размешчаны на захадзе партызанскай зоны па чыгунцы Полацк — Маладзечна, пры гэтым на ўчастку ад станцыі Фарынава да Докшыц мелася 12 гарнізонаў, у якіх налічвалася больш за 1500 варожых салдат і паліцэйскіх. Акрамя таго, на чыгунку высылаліся патрулі і дазоры. На станцыі Фарынава знаходзіўся браняпоезд.

З усходняга боку партызанскай зоны фашысты размясцілі больш за 10 гарнізонаў, у якіх знаходзілася каля 4600 салдат і афіцэраў, у тым ліку ў Лепелі — каля 700 чалавек, у Бароўцы — каля 2500 чалавек і ў Уле — каля 600 чалавек.

У акружэнні гэтых гарнізонаў і знаходзілася партызанская зона агульнай плошчай каля 10 тысяч квадратных кіламетраў з насельніцтвам звыш 150 тысяч чалавек.

У гэты час партызаны ўтрымлівалі ў сваіх руках дарогу Лепель — Пышна — Беразіно — Докшыцы да станцыі Параф'янава. Гэта была адзіная прамая дарога з Віцебска на захад, якой была пазбаўлена трэцяя танкавая армія генерал-палкоўніка Рэйнгардта. Пазней, калі партызаны перахапілі дарогу Орша — Віцебск, становішча праціўніка стала яшчэ больш катастрафічным — у яго засталіся магчымасці забяспечваць сябе толькі паветрана і цераз Полацк. Ключавой пазіцыяй за авалоданне дарогай з усходу з'яўлялася Пышна, з захаду — участак Докшыцы — Беразіно.

Камандаванне партызанскай брыгады «Дубава» выдатна разумела, наколькі важнай з'яўляецца гэта дарога, і рабіла ўсё неабходнае, каб утрымаць яе.

У момант карнай экспедыцыі Пышна абараняў другі атрад брыгады, адзін з самых загартаваных у баях.

19 мая 1943 года ў 4 гадзіны раніцы на партызанскі гарнізон Пышна пачалося наступленне праціўніка сілаю больш за полк, падтрымліваемае артылерыйскім і мінамётным агнём. У штабе брыгады аб гэтым стала вядома ўжо праз 15 хвілін. Гэта паведамленне не вызвала асаблівай трывогі, таму што наступленні на Пышна былі прывычнай для нас справай. Аднак тое, што гітлераўцы пайшлі ў наступленне вельмі рана, некалькі насцярожыла нас. Акрамя таго, нам стала вядомая актывізацыя акупантаў, якая пачалася некалькі раней на больш аддаленых подступах — з раёнаў Барысава ў напрамку Плешчаніц — Бягомля і з Маладзечна ў напрамку Докшыц.

Абарона партызанскага гарнізона была арганізавана наступным чынам: рота Карніенкі размяшчалася на левым флангу, у раёне могілак, рота Барыса Звонава — на правым флангу, у раёне вёсак Закаліўе — Пруднікі. Астатнія сілы былі размешчаны больш на поўнач і ў цэнтры. Палкавы мінамёт Івана Локцева і дзве 76-мм пушкі пад кіраўніцтвам камандзіраў гармат Уладзіміра Алейнікава і Канстанціна Корабава знаходзіліся больш на захад ад Пышна.

Падпусціўшы гітлераўцаў на блізкую адлегласць, кулямётчыкі Андрэй Бізяеў і Андрэй Багданаў, стралкі і аўтаматчыкі адкрылі па іх шквальны агонь. Вораг адкрыў агонь у адказ. Завязаўся гарачы бой. Варожы шквал агню ўзрастаў: здавалася, не было ніводнай кропкі на нашай пазіцыі, якая б не была прабіта свінцом. І вось пачала дзейнічаць наша артылерыя. Беглы агонь з дзвюх нашых пушак адначасова па ліпавай алеі і шашы, а затым перанесены ўглыбіню, па натоўпу праціўніка ў раёне Аўгустова, вызваў у яго радах поўную разгубленасць.

Атака праціўніка захліпнулася. Фрыцам стала зразумела, што адным палком ім не авалодаць Пышна. Бой сціхаў, пераходзячы на правы фланг, дзе ў лесе Барыс Звонаў са сваёй ротай праследаваў адступаўшых фрыцаў.

Не паспеў я па загаду камбрыга прыбыць у другі атрад, як ён пазваў мяне да тэлефона. Аказваецца, акрамя наступлення на Пышна, да 10 гадзін раніцы буйная групоўка праціўніка з Лепеля праследавала цераз Ворань — Пораўна — Замошша да Царкавішча, а з гэтай вёскі дзвюма калонамі пачала наступленне на Заазер'е — Тартак і Весніцк — Карчы. Для каардынацыі дзеянняў атрадаў нашай брыгады і брыгады імя Кароткіна, якія знаходзіліся ў гэтых месцах, туды быў пасланы начальнік штаба нашай брыгады П. К. Шарко. Я павінен быў выехаць у атрад Дзмітрыя Караленкі.

Праз некаторы час пасля захліпнуўшайся варожай атакі пад Пышна з'явілася «рама» — двухфюзеляжны самалёт, які зрабіў круг і паляцеў на поўдзень. Гэта быў разведчык. Была дадзена каманда — разгрупаваць жывую сілу, залезці ў зямлю, схавацца. Праз 30 хвілін у паветры з'явілася 9 бамбардзіроўшчыкаў, якія, зрабіўшы разварот, пачалі метадычна бамбіць раён Пышна. Бамбардзіроўка працягвалася ўвесь дзень 19 мая. Было зроблена 42 самалёта-вылеты (налёты) праціўніка, аднак атака больш не аднаўлялася.

Пераканаўшыся ў надзейнасці абароны Пышна, мы з Сяргеем Гардзеевым накіраваліся ў атрад Дзмітрыя Караленкі.

Прыйшоўшы ў атрад Караленкі, мы расказалі аб паспяховых баях Дзідэнкі за Пышна. Караленкаўцы таксама расказалі нам аб паспяховым баі супраць гітлераўцаў.

Сціплы, удумлівы, вельмі сабраны і нават некалькі суровы камандзір атрада Дзмітрый Караленка добра ведаў ваенную навуку і таму сумеў перамагчы ворага. Супраць наступаўшых з вёскі Царкавішча карнікаў ён правільна выбраў пазіцыю для бою — ля моста на р. Ушача, больш на поўнач ад вёскі Тартак. Сама прырода, здавалася, стварыла гэта месца для абароны. Усходні бок, які ўяўляў сабою высокі

Партызаны брыгады «Дубава» вядуць бой з карнікамі ў раёне вёскі Пышна

бераг, пакрыты стройным сасоннікам, мог быць захоплены толькі ў выніку пераходу цераз мост, таму што р. Ушача ў гэтым месцы з'яўляецца як бы перамычкай паміж азёрамі Мурогі і Лучыла з дрыгвяністымі, непраходнымі берагамі. Група трэцяга атрада ў складзе Жанеўскага, Буткевіча, Гарчакова, Сучынскага, Швяцова пад кіраўніцтвам сакратара падпольнага Лепельскага райкама камсамола Міхаіла Ладзіка своечасова замініравала мост і разам з астатнімі байцамі атрада чакала праціўніка ў засадзе.

Спачатку на мосце з'явілася варожая разведка. Сапёры замаскіраваліся і ляжалі нерухома, чакаючы, калі ўзыдзе на мост калона. Некалькі хвілін цішыні, і мост з фрыцамі ўзляцеў у паветра. Праціўнік адкрыў моцны агонь. Дачакаўшыся, каб ацаніць яго агнявую сілу, Караленка скамандаваў:

— Па праціўніку — агонь!

Выгадныя пазіцыі, разумна размешчаныя сілы забяспечылі канцэнтраваны контрудар. Вораг не вытрымаў і кінуўся наўцёкі, нават не падабраўшы на полі бою забітых.

Важнасць бою ў раёне Тартака была не толькі ў тым, што вораг быў адкінуты, панёс страты. Важныя былі дакументы, упершыню захопленыя партызанамі ў забітых фрыцаў. Сярод іх аказаліся салдацкія кніжкі, якія сведчылі аб тым, што вайсковыя злучэнні, якія прымалі ўдзел у аперацыі, прыбылі з розных месц, у тым ліку з Мінска і нават з Германіі.

Пры азнаямленні з дакументамі нам стала вядома, што гітлераўцы рашыліся на сур'ёзную аперацыю. Я заспяшаўся ў штаб брыгады далажыць камбрыгу Ф. Ф. Дуброўскаму. У гэты час начальнік штаба П. К. Шарко паведаміў, што другая калона, праследаваўшая з Царкавішча на Весніцк, заняла вёскі Карчы, Касары, пасёлак імя Леніна і Ульянаўку, 20 мая пачала наступаць з раёна Оснава на вёску Лагі. Чацвёрты атрад Данііла Місунова і тры артылерыйскіх разлікі нашай брыгады сумесна з адным атрадам Ляўковіча з брыгады імя Кароткіна занялі абарону на вышынях Лагі — Чарнаручча. Завязаўся гарачы бой. З абодвух бакоў былі кінуты ў ход усе агнявыя сродкі — пушкі, мінамёты, аўтаматы, вінтоўкі. Рашаючую ролю ў гэтым паядынку сыграла партызанская артылерыя.

Начальнік штаба артдывізіёна Міхаіл Атрашкевіч энергічна перакінуў 76-міліметровую пушку на вышыню ля маяка і з ходу адкрыў агонь.

Нашы артылерысты падавілі варожую пушку з артразлікам, пасля чаго гітлераўцы кінуліся наўцёкі.

Другі наш артразлік пад камандаваннем камандзіра батарэі Цімафея Маркевіча знішчыў на левым флангу варожы шасціствольны мінамёт з разлікам. У выніку падаўлення агнявых кропак праціўнік прыйшоў у замяшанне. Скарыстаўшы гэта замяшанне, камандзір кулямётнай роты 4-га атрада Аляксей Карабіцкі з кулямётным разлікам Сямёна Клопава сумеў абысці праціўніка з фланга, а затым ударыць па ім з тылу. Гэты смелы выхад у тыл прымусіў ворага пакінуць свой намер наступлення на вёску Лагі і вярнуцца на ранейшыя пазіцыі.

На зыходзе дня 20 мая наша разведка паведаміла, што праціўнік, які адступіў у раён Касары — Карчы — Заазер'е, пачаў узводзіць абарону: акопвацца, будаваць бліндажы. Чым растлумачыць, што наступаючы полк СС пачаў раптам пераходзіць да абароны? З характару прасоўвання групы праціўніка ў напрамку Лепель — Варань — Замошша — Царкавішча — Заазер'е — Карчы было вядома, што праціўнік парашыў раздзяліць партызанскую зону і ахапіць з флангаў групу партызан на паўночны ўсход ад Бярэзіны, затым абкружыць яе і знішчыць. Але для гэтага аднаго палка СС было мала, таму што гітлераўцам прыйшлося расцягнуць яго сілы на ўчастку ў 15 кіламетраў. У фашыстаў застаўся адзін выхад: заняць абарону і чакаць падмацавання. Наша ж задача заключалася ў тым, каб не даць ворагу арганізаваць абарону. Пасля майго дакладу камандаванне брыгады прыняло рашэнне: пакуль праціўнік не замацаваўся на рубяжы Тартак — Заазер'е — Карчы — Касары, перайсці ў наступленне, раз'яднаць яго сілы і знішчыць. Але дзе быць бою?

Мы падабралі найбольш свядомых і храбрых разведчыкаў Васіля Вітко, Пашу Лагвіненку, Міхаіла Чайкіна, Васіля Касых, Нікіфара Журко, Сяргея Гардзеева, Паўла Усцінава, Сцяпана Шатыронка, і я адправіўся з імі ў раён размяшчэння праціўніка для выбару ўчастка наступлення. Правёўшы пільную разведку, мы выбралі найбольш спрыяльным месцам для наступлення раён вёскі Карчы, дзе праціўнік не паспеў яшчэ ўмацавацца. А каб забяспечыць поспех штурмуючай групе, неабходна было стварыць бачнасць наступлення на ўсіх участках абароны праціўніка працягласцю каля 15 кіламетраў.

Пакуль мы завяршылі разведку, па загаду камбрыга ў лясны масіў ля вёскі Карчы прыбыў атрад Д. Караленкі.

Настала цёплая майская ноч. Разам з Д. Караленкам мы абышлі выстраены атрад, праверылі кожнага байца. Кожны крок партызаны робяць бясшумна, асцярожна, каб трэск сучча не насцярожыў ворага. Выйшлі на ўзлесак. Далі пяць хвілін для роздуму: кожны павінен уважліва агледзецца, выбраць патрэбны напрамак. Прыціснуліся ўшчыльную да размясціўшагася ў вёсцы Карчы праціўніка. Гучыць каманда «У атаку!». Магутнае «Ура!» скаланула наваколле. Партызаны ўварваліся ў траншэі і бліндажы, пачалася рукапашная схватка. Палітрук роты Аляксей Лапаткін знішчыў трох фрыцаў, кулямётны разлік камсамолкі Веры Маргевіч хутка заняў указанае месца і прыцэльным агнём знішчыў найбольш моцную агнявую кропку праціўніка, а затым закідаў

яго гранатамі. Кулямётчык Афанасій Кобзеў, дабраўшыся да акопаў, знішчыў 6 фрыцаў.

Як толькі атрад перайшоў у наступленне ў раёне вёскі Карчы, па ўсёй лініі абароны адкрылася перастрэлка, якая скоўвала суседнія падраздзяленні гітлераўцаў. Не вытрымаўшы націску партызан, фашысты кінулі ўмацаванні і пачалі адступаць. Дэмаралізаваны па ўсёй лініі і праследуемы партызанамі, эсэсаўскі полк да 24 мая быў адкінуты да вёскі Юркава Сцяна. У гэтым баі партызаны знішчылі 16 і паранілі 27 гітлераўцаў, спалілі самалёт, падбіты раней, які знаходзіўся на паляне ля вёскі Карчы.

Наш поспех яшчэ вышэй падняў баявы дух абаронцаў Пышна, якім было нялёгка трымаць абарону: баі тут ішлі амаль бесперапынна. Новы моцны націск вораг зрабіў 23 мая. На гэты раз асноўныя сілы гітлераўцаў былі сканцэнтраваны на ўчастку могілак, дзе абараняўся стралковы ўзвод Мікалая Клачкова на чале з начальнікам штаба атрада Дзмітрыем Вальковым, і ў раёне смолзавода (больш на поўнач ад Пышна), які ўтрымлівала кулямётная рота Андрэя Суконькі і палітрука Сяргея Кісялькова. Партызаны мужна стрымлівалі націск ворага. Камандзір роты Андрэй Суконька, тройчы паранены, адказаўся пакінуць пазіцыю і працягваў кіраваць боем. Ён заахвочваў усіх байцоў, сярод якіх асабліва вызначыліся кулямётныя разлікі Івана Цітова, Архіпа Вярхоўскага, Міхаіла Тарабарава, Кузьмы Ясюка, Мікалая Мялешкі, Васіля Шамшуры, Уладзіміра Рубаніка; стралкі Пётр Аніскевіч, Фёдар Косцін, Іван Дзям'янцаў, Косця Куракоў. Бранябойшчыкі Раман Шык і Уладзімір Крывапушчанка прыцэльным агнём вывелі са строю пушку праціўніка.

На працягу ўсяго дня вораг лез наперад, стараючыся выматаць сілы атрада і выбіць партызан з умацаванняў. Становішча было вельмі цяжкім: фрыцам удалося значна пацясніць нас. Было зразумела, што сіламі аднаго атрада стрымаць далейшае наступленне ворага немагчыма.

Па загаду камбрыга на дапамогу абаронцам Пышна былі тэрмінова вылучаны рота Барыса Звонава, артразлік 76-міліметровай пушкі Уладзіміра Алейнікава, палкавы мінамёт Івана Локцева і ротны Мікалая Папова.

Нягледзячы на моцны партызанскі агонь, вораг ішоў напралом. Аказваецца, усе фашысцкія малойчыкі былі моцна п'янымі. Падтрыманая гарматным і мінамётным агнём, стралковая рота камуніста Барыса Звонава з крыкамі «Ура!» перайшла ў атаку. Уперадзе байцоў ішлі камуністы Барыс Звонаў, камісар атрада Рыгор Комар, палітрук Іван Кулік, радавыя Ліда Топік, Фёдар Несцярцоў, Іван Майн, Афонька, Чэкутаў, якія павялі за сабой увесь атрад.

Контрнаступленне для фрыцаў было такім ашаламляльным, што яны ўцяклі, пакінуўшы на агнявой пазіцыі 37-міліметровую пушку з запасам снарадаў і трупы забітых.

Аднак частка гітлераўцаў, якая знаходзілася на зыходных пазіцыях, сумела прыкрыць адступаўшых і, такім чынам, выратавала ад поўнага знішчэння другі і трэці батальёны паліцэйскага палка СС.

З наступленнем цемнаты, калі становішча абодвух бакоў стабілізавалася, мы вырашылі забраць варожую пушку, якая засталася ў нейтральнай зоне. Мы з Дзідэнкам абышлі баявыя пазіцыі атрада, растлумачылі становішча. Сярод байцоў атрада знайшліся добраахвотнікі, вопытныя і загартаваныя ў баі партызаны Максім Віннік, Кузьма Ясюк і Раман Шык.

Узброіўшыся аўтаматамі і доўгай вяроўкай, прыціснуўшыся да зямлі, трое храбрацоў па-пластунску папаўзлі да пушкі. У начной цемры бесперапынна ўспыхвалі ракеты ворага. Дасягнуўшы пушкі, Максім Віннік пачаў прывязваць вяроўку да пушкі, а Кузьма Ясюк і Раман Шык абшукваць забітых ворагаў. Сярод іх аказаўся і камандзір 3-га батальёна, у якога Кузьма Ясюк забраў зброю і планшэт з дакументамі, затым, адпаўзаючы за ўзгорак, тройка партызан пачала падцягваць пушку. Пачуўшы гоман, гітлераўцы пачалі ўзмоцнена асвятляць ракетамі мясцовасць і абстрэльваць пушку, але было ўжо позна — нябачная сіла цягнула яе ў роў.

У рукі партызан трапілі важныя матэрыялы — нямецкая карта з шыфроўкай плана карнай экспедыцыі. На аснове ўмоўных адзнак на карце і ў дакументах нам удалося разгадаць намер ворага і адпаведна выпрацаваць план адказных дзеянняў.

Практыка пяцідзённых баёў у значнай ступені дапамагла ўразумець і правільна ацаніць тактыку карнікаў. Гітлераўцы імкнуліся раздзяліць партызанскую зону, замацавацца на занятых пазіцыях і стварыць кальцо акружэння. Затым, адсоўваючы партызан у лясны масіў, звузіць гэта кальцо да такой ступені, каб можна было пры прачэсванні лясных масіваў знішчыць партызан.

Адно кальцо акружэння планавалася вакол возера Палік, другое — на паўночны ўсход ад Бярэзіны (лясны масіў Пуцілкавічы — Карчы — Лясіны — Беразіно — Любава). Каб адцясніць і знішчыць па магчымасці больш партызан, карнікі пачалі прачэсваць спачатку раён вакол Маладзечна (аперацыя «Драуфгенгер I»), малінскія і рудзенскія лясы (аперацыя «Драуфгенгер II»), а затым, завяршыўшы іх і рухаючыся ў напрамку на поўнач, перайшлі да аперацыі «Котбус».

Гітлераўцы прынялі наступны парадак баявых дзеянняў: аператыўная група пад кіраўніцтвам падпалкоўніка ахоўнай паліцыі Клунша вяла наступленне на Бягомль — Беразіно; група оберштурмбанфюрэра Дзірлевангера — на паўночны захад ад возера Палік з задачай авалодаць дарогай Бягомль — Лепель, стварыць загароду, ізаляваўшы, такім чынам, партызанскія злучэнні, якія дзейнічалі больш на поўнач і поўдзень ад гэтай дарогі. Больш на ўсход ад возера Палік была выстаўлена загародгрупа «Поўдзень» у напрамку Барысаў — Пруды — Сялец — Рудня з задачай замкнуць кальцо акружэння і не дапусціць выхаду партызан на ўсход. Опергрупа «Норд» генерал-маёра Дормегена наступала ў напрамку Лепель — Студзёнка — Пышна, другі паліцэйскі полк пад камандаваннем маёра Гейнакера — з Лепеля на Ворань — Замошша — Весніцк — Лясіны з задачай замкнуць другое кальцо акружэння.

Паколькі кальцо акружэння ў раёне Карчы — Царкавішча было разарвана, то трэба было чакаць, што праціўнік нанясе новы, больш моцны ўдар. Таму камандаванне брыгады вырашыла тэрмінова перадыслацыраваць асноўныя базы ў глыбіню Ушацкага раёна, а на шляху магчымага наступлення праціўніка, пасля нашага адыходу з Пышна, стварыць тры лініі абароны. Мы таксама тэрмінова азнаёмілі камандзіраў суседніх партызанскіх брыгад «Жалязняк», імя Кароткіна, Мядзведзева, імя Чапаева, Цябута з намерамі ворага і планамі нашых дзеянняў.

У якасці канкрэтнага шагу па размеркаванню партызанскіх сіл, а таксама з мэтай узмацнення дзеянняў партызан у тыле расцягнуўшыхся камунікацый наступаючых аператыўных груп праціўніка два атрады нашай брыгады на чале з камісарам брыгады У. Е. Лабанком і два атрады брыгады Райцава, якія знаходзіліся ў раёне Валовай Гары, 26 мая прарвалі абарону загараджальнай групы «Поўдзень» на дарозе Барысаў — Лепель і выйшлі ў Чашніцкі раён. Пры гэтым яны забілі некалькі дзесяткаў фашыстаў, захапілі 2 кулямёты і 12 вінтовак.

Рыхтуючыся да новага наступлення, праціўнік пачаў канцэнтраваць свае войскі ў раёне Студзёнка — Аўгустова. Да 26 мая ва ўсёй аперацыі «Котбус» удзельнічала два паліцэйскія палкі СС, 7 ахоўных батальёнаў і адзін батальён 931-га грэнадзёрскага палка, штрафны батальён СС, тры матарызаваныя жандарскія ўзводы, 4 роты 392-ой оберфельдкамендатуры з адной батарэяй, адным супрацьтанкавым і адным узводам цяжкіх мінамётаў, другі дывізіён 213-га артпалка, 4 групы самалётаў 51-ай авіяэскадрыллі і 6 авіяэскадрылляў асобага прызначэння; спецыяльныя каманды сувязі, прапаганды, падрыўнікоў — усяго 21 назва воінскіх часцей. Пасля ж удару ў раёне Тартак — Карчы, трывалага адпору ля Пышна і паспяховай барацьбы партызанскіх брыгад у раёне возера Палік карнікі атрымалі падмацаванне — 9 асобных батальёнаў, адзін батальён веласіпедыстаў, чатыры артбатарэі і г. д. — усяго 19 назваў воінскіх спецыяльных часцей.

Улічваючы, што атрад Міхаіла Дзідэнкі з 19 мая вёў бесперапынна баі, ка-

мандаванне вырашыла даць яму часовы адпачынак у вёсцы Ворань. Замест яго абарону Пышна заняў атрад Дзмітрыя Караленкі. Аднак атрад Дзідэнкі адпачываў адносна спакойна ўсяго толькі да 4 чэрвеня.

Сканцэнтраваўшы значныя сілы ў раёне Забалацце — Ассё — Юркава Сцяна, вораг зрабіў другую спробу наступаць па дарозе Лепель — Ушачы з мэтай раз'яднаць партызанскія сілы і абхапіць іх з фланга. Наша разведка своечасова паведаміла аб гэтым, у выніку атрад сумеў ноччу выйсці з вёскі і размясціцца ў засадзе ля лясного масіва Каралевіц.

...Дзесяць кулямётных разлікаў атрада, стралкі, аўтаматчыкі занялі баявыя пазіцыі. Партызаны прапусцілі разведку праціўніка і, як толькі на шашы паказалася асноўная калона, адкрылі агонь. У адказ гітлераўцы адкрылі ружэйны і мінамётны агонь. Злева на дапамогу нашым таварышам падаспелі байцы кулямётнай роты Івана Сяверына. І хоць вораг некалькі пацясніў партызан, аднак пасля страты 60 салдат адказаўся ад далейшага маршу па дарозе Лепель — Ушачы.

А ў гэты час да Пышна фашысты падцягвалі свежыя войскі. Вораг метадычна вёў разведку боем, засякаў кожную агнявую кропку партызан. Такога роду прыстрэлка — першая прыкмета падрыхтоўкі да вялікага наступлення. Для ўзмацнення абароны Пышна на дапамогу трэцяму атраду быў назначаны чацвёрты атрад Д. Місунова, сёмы атрад брыгады імя Кароткіна, а таксама перакінуты ў раён Закаліўе — Прудніки — Савін Дуб для абароны правага фланга атрад М. Дзідэнкі. Каб забяспечыць небяспеку абаронцаў Пышна, у раён Замошша — Пораўна быў накіраваны восьмы атрад. Абарону флангаў у гэтым раёне забяспечвалі таксама брыгады імя Чапаева і Цябута. Два атрады брыгады «Жалязняк» і Мядзведзева абаранялі паўднёвы фланг у раёне Любава.

8 чэрвеня пасля бамбёжкі і моцнага артмінамётнага агню, пры дымавой заслоне вораг пачаў наступленне, якое падтрымлівалася танкамі. Адначасова ў тыл абаронцам Пышна, у раён вёскі Зароўе, быў выкінуты дэсант аўтаматчыкаў. Пачаўся гарачы бой. Ад узрыву бомбаў, снарадаў і мін уздрыгвала зямля, паднімаліся слупы пылу. На гэты раз самы моцны ўдар прыйшлося прыняць нашаму чацвёртаму атраду пад камандаваннем Місунова, які ўтрымліваў цэнтральную частку абароны. Першым прыняў бой узвод Ціхана Касых. Услед за ім запрацавалі кулямёты і аўтаматы роты Пшоннага. У ліпавай алеі ўступіў у бой узвод на чале з камандзірам Сцяпанам Паршонкам. У раёне сярэдняй школы пачалася перастрэлка з другой ротай. З боку населенага пункта Старынкі змагаўся ўзвод камсамольца Яшы Сабаева. Тут была яўная перавага праціўніка, але ўзвод пад баявы крык Сабаева: «Камсамольцы ідуць толькі наперад!» — мужна адбіў атаку. Партызаны знішчылі ў гэтым баі 60 фашыстаў, але страцілі свайго камандзіра Яшу Сабаева — варожая куля прабіла яму грудзі.

На другім участку абароны, у раёне Трактарнай вуліцы, пад прыкрыццём танка ў тыл роты палітрука Мікалая Краценкі прарваліся 30 варожых аўтаматчыкаў. Запрацавалі кулямёты Сямёна Клопава, бацькі і сына Буракоў. Іх своечасовы агонь выратаваў роту Мікалая Краценкі. Пяхота праціўніка вымушана была залегчы. Варожая куля параніла Клопава. Пакуль медсястра Ніна Флігоўская перавязвала яго, за кулямёт залягла камсамолка Надзя Касцючэнка. Але танк працягваў рухацца ўсё бліжэй і бліжэй да акопаў. Кулямётны агонь не ў сілах быў спыніць яго. Услед за танкам паднялася і пяхота. Але трапны кулямётны агонь Сямёна Клопава і Васі Буйніцкага прыціснуў яе зноў да зямлі. Кулямётная чарга з варожага танка — і абодва яны мерцвякі.

— Ні шагу назад, фашысты не пройдуць! — перадаў загад па акопу камандзір кулямётнай роты Аляксей Карабіцкі і націснуў на гашэтку кулямёта загінуўшага Клопава. Яго другім нумарам была медсястра Ніна Флігоўская. На дне акопа куча гільзаў, трэба эканоміць боепрыпасы, і Ніна паспявае падтрымліваць агонь з карабіна. Зноў кулямётная чарга з танка — і цела Аляксея Карабіцкага ўпала на дно акопа.

Ля кулямёта замест загінуўшага камандзіра засталіся Ніна і Надзя, дзве савецкія дзяўчыны. Яны працягвалі стрымліваць націск фашыстаў, а правей — у другім акопе — іх падтрымлівалі кулямётным агнём бацька і сын Буракі. У гэты час бранябойшчык Кравец з супрацьтанкавага ружжа падбіў танк праціўніка. Але наступаючай тут групе фашыстаў падкінулі падмацаванне. Камандзір атрада загадаў адысці па траншэях на новыя пазіцыі.

— Хіба можна адыходзіць, калі лезуць гады?! — сказала Надзя Касцючэнка і пачала паліваць гарачым свінцом фашыстаў. Праз некалькі хвілін кулямёт замоўк. Патрачаны патроны, забіта Ніна. Танк прасунуўся ўжо да бруствера акопа. Помсцячы за смерць сяброўкі, за радзіму, кулямётчыца Надзя Касцючэнка нізкай гранат падарвала фашысцкі танк.

Але бой яшчэ не закончыўся.

Лязгаючы гусеніцамі, трэці танк накіраваўся на акоп Бурака.

Аляксей Максімавіч Бурак і яго сын Мікалай мужна адбівалі насядаўшага ворага. Але вось сын падаў апошні дыск і, насупіўшы бровы, акінуў поглядам бацьку, даў яму зразумець гэта. Яшчэ некалькі чэргаў і... дыск пусты. Тады бацька і сын Буракі, узняўшыся ва ўвесь рост з гранатамі ў руках, кінуліся пад гусеніцы танка і ўзарвалі яго. Гэта была апошняя агнявая кропка кулямётнай роты Аляксея Карабіцкага на гэтым рубяжы.

Мужнасці і смеласці байцоў кулямётнай роты Аляксея Карабіцкага не было мяжы. Яны змагаліся як сапраўдныя патрыёты Савецкай Радзімы. Іх подзвіг стаў сімвалам гераізму, які быў увекавечаны партызанскім мастаком Мікалаем Абрыньбам на карціне «Бой пад Пышна».

Вечная слава вам, героі Пышна! Ваш подзвіг бессмяротны, як бессмяротны народ, нарадзіўшы такіх герояў.

Наступаўшай групе фашыстаў у ліпавай алеі таксама былі прыдадзены танкі, якія рваліся ў тыл узвода Сцяпана Паршонка. Калі адзін танк быў падбіты прамой наводкай бранябойшчыкам В. Карабавым, завязалася рукапашная схватка. Першым падняўся ў атаку на чале ўзвода намеснік палітрука Мікалай Андрэйчык. Фрыцы хацелі схапіць яго жывым. Але ён не разгубіўся. Забіўшы пяцярых фашыстаў, Мікалай вырваў загваздку «лімонкі» і ўзарваўся. Каля часу вялі байцы ўзвода рукапашную схватку. Яны біліся да самай смерці. Апошнім загінуў камандзір ўзвода Сцяпан Паршонак.

Слава вам, нашы дарагія сябры-камсамольцы Мікалай Андрэйчык, Сцяпан Паршонак, Васіль Лабянок, Пётр Бука, Сцяпан Доўгі, Раманоўскі, Мікалай Ражкоў, Валянцін Байкоў, Мікалай Глінскі, Пётр Сапелка, Васіль Бародзіч, Заруба і Калеткін!

Жорсткія баі ішлі па ўсёй абароне ад Савіна Дуба праз Закаліўе — Пышна да вёсак Старынкі і Навасёлкі. І хоць вораг пры наступленні нёс вялікія страты (толькі на ўчастку 4-га атрада было падбіта 4 танкі і знішчана больш за 100 чалавек), аднак агнявая магутнасць яго была мацнейшай, і мы таксама неслі вялікія страты. Да 12 гадзін дня 4-ы атрад страціў 20 чалавек забітымі і 8 параненымі. Было зразумела, што далейшае лабавое супраціўленне можа прывесці да неапраўданай страты жывой сілы партызан. У адпаведнасці з распрацаваным планам быў дадзены загад пакінуць Пышна і пачаць адыход: атраду Дзмітрыя Караленкі — у напрамку Тартак — Царкавішча, атраду Данііла Місунова — на Лагі — Оснава і атраду Міхаіла Дзідэнкі — на Пуцілкавічы — Чарнаручча — Карчы — Весніцк.

Адыход усе атрады завяршылі арганізавана, ператвараючы яго ў актыўную абарону ад рубяжа да рубяжа. Так, група байцоў пад кіраўніцтвам Кляшторнага знішчыла з засады каля возера Сверзна 25 стралкоў і двух танкістаў, некалькі бліжэй да Тартака група мінёраў Міхаіла Ладзіка сумела стрымаць праследаванне, узарваўшы пушку з гарматным разлікам. На подступах да Савіна Дуба атрад Дзідэнкі падбіў танк.

Пакінуўшы рубеж Пышна — Пуцілкавічы — Лагі — Карчы — Лясіны, партызаны занялі падрыхтаваны загадзя рубеж абароны Весніцк — Царкавішча — Замошша. Праціўнік узмоцненай опергрупай генерал-маёра Дормегена замкнуў кальцо акружэння ляснога масіву па раней названых населеных пунктах.

З паўночнага боку кальца акружэння супраць партызан знаходзіўся 13-ы паліцэйскі полк СС, які забяспечваў астатнім войскам карнай экспедыцыі магчымасць прачэсваць лясны масіў. З 9 па 21 чэрвеня паліцэйскія войскі СС шукалі партызан у лесе. Але дарэмна! Партызаны знаходзіліся ўжо ў іншым месцы.

С. В. Маркевіч,
былы намеснік камандзіра
партызанскай брыгады «Дубава»

Правал аперацыі «Котбус»

Вясной 1943 года пачалася буйная карная аперацыя, якая ставіла задачу знішчыць партызан на тэрыторыі ад Маладзечна да Лепеля.

Каб утрымліваць дарогу Лепель — Беразіно пад сваім кантролем, камандаванне брыгады «Дубава» вырашыла вясной 1943 года стварыць у Пышна свой гарнізон. Тут пастаянна па чарзе дзяжурылі атрады.

На світанні 19 мая супраць 2-га атрада Дзідэнкі, які знаходзіўся ў гарнізоне, было кінута з боку Лепеля не менш як полк салдат з нямецкай карнай групоўкі «Норд». Але праціўніку не ўдалося застаць партызан знянацку. Байцы рот Звонава і Кірыленкі сустрэлі ворага дружным кулямётным і аўтаматным агнём. Іх падтрымалі артылерысты. Вораг разгубіўся, запанікаваў і адступіў, панёсшы вялікія страты. Не мелі поспеху і наступныя яго атакі.

Зразумеўшы, што ў лоб Пышна не ўзяць, немцы вырашылі зайсці цераз вёскі Пораўна, Замошша і пераправу Тартак у наш тыл. Але іх манеўр заўважылі партызаны. Вось як гэта было. У гэты дзень я разам з партызанам трэцяга атрада Іванам Казаковым, выканаўшы заданне камандзіра атрада Д. Караленкі, вяртаўся на фурманцы з Вялікіх Дольцаў у гарнізон. Па дарозе заўважылі вялікую колькасць фашыстаў, якія рухаліся ў бок Пышна. Казакоў сцебануў каня пугай, і мы ў адно імгненне пераскочылі дарогу, схаваліся ў лесе. Фашысты адкрылі агонь. Куля прабіла Казакова са спіны, ён, смяртэльна паранены, упаў. Я схапіў лейцы і што ёсць сілы паімчаў у атрад. Прыбыўшы, неадкладна далажыў аб усім Караленку. Той загадаў стралковаму ўзводу Загудаева зрабіць засаду ў напрамку Тартака. Такім чынам была папярэджана небяспека быць разбітымі з тылу.

Аднак вораг наступаў. І хутка стала вядома, што калоны гітлераўцаў, мінуўшы Вялікія Дольцы, без перашкоды рухаюцца на Карчы, дзе знаходзіліся нашы прадуктовыя склады. Абставіны ўскладняліся. Трэба было прыняць тэрміновыя меры. Каб зберагчы склады, камандаванне брыгады накіравала насустрач ворагу атрады Місунова і Ляўковіча. Яны павінны былі перагарадзіць дарогу праціўніку. Але немцы не мелі намеру губляць час. Прасунуўшыся да ляснога масіву, яны кінуліся, каб адсекчы нашыя атрады ад баз. Аднак натыкнуліся на ўпартае супраціўленне перакінутых сюды партызанскіх сіл. Разгарэўся гарачы бой. Рашучае слова сказала ім наша артылерыя. Поспеху пасадзейнічаў і мужны ўчынак начальніка штаба партызанскага артдывізіёна Міхаіла Атрашкевіча. Выкаціўшы пад агнём праціўніка гармату на пануючую вышыню, ён разам з таварышамі прамой наводкай знішчыў варожую гармату, потым адкрыў агонь па наступаючай варожай пяхоце. Праціўнік не вытрымаў і адступіў.

Вечарам па загаду Д. Караленкі мой узвод замяніў узвод Загудаева на Тартаку. Стомленыя ў баях, ляглі адпачыць. Мы ведалі, што праціўнік, як правіла, ноччу не ваюе. Кароткая майская ноч прайшла спакойна. А раніцай усё паўтарылася. У 7 гадзін на дарозе з Вялікіх Дольцаў з'явіліся фашысты. Яны набліжаліся да нашай пазіцыі. Выбраўшы момант, я загадаў адкрыць агонь. Некалькі фрыцаў скасілі першыя чэргі. А тыя, што ўцалелі, заляглі і адкрылі агонь у адказ. Кулямётчык Апанас Кобзеў нечакана ўзняўся і тут жа быў забіты варожай куляй.

Рашыўшы адпомсціць за смерць таварыша, аддзяленне Сцяпана Скопінцава кінулася ў атаку. Праціўнік не вытрымаў нападу і кінуўся наўцёкі.

23 мая, выкарыстаўшы спрыяльныя абставіны пад Пышна, камандаванне брыгады вырашыла нанесці неадкладны ўдар па галоўных сілах 2-га паліцэйскага палка СС, які ўдзельнічаў у карнай аперацыі і знаходзіўся ў вёсках Карчы і Касары. Выканаць гэтую задачу даручылі партызанам на чале з Караленкам.

Зрабіўшы дваццацікіламетровы маршкідок з Пышна, мы размясціліся на лясной паляне ля вёскі Карчы. Тут злучыліся з групай партызан з брыгады Кароткіна.

Трэба было распрацаваць план новых дзеянняў. Справа ўскладнялася тым, што перад палянай, на якой мы знаходзіліся, ляжала роўнае поле. Яно аддзяляла нас ад вёскі і добра прастрэльвалася. Мы зразумелі, што ісці ў атаку па ім — вялікая рызыка. Яна магла каштаваць вялікіх страт. Вырашылі так: пакінуць на паляне групу для прыкрыцця, а з надыходам цемры асноўнымі сіламі абысці вёску з заходняга боку і там пачакаць, калі пакінутая група выявіць сябе абстрэлам вёскі і тым самым адцягне ўвагу праціўніка на сябе. У гэты час атрад нападзе на ворага. Задума ўдалася. Як толькі праціўнік сканцэнтраваў агонь на паляне, мы напалі на яго. Бой скончыўся для нас паспяхова. Спроба акупантаў ударыць партызанам у спіну была ліквідавана.

Выйграўшы бой, мы вярнуліся ў Пышна. Фашысты працягвалі наступаць.

27 мая вораг зноў атакаваў нашы пазіцыі. Натхнёныя перамогамі ў баях за Лагі, Чарнаручча, Карчы і на Тартаку, партызаны біліся мужна. Падпускалі праціўніка бліжэй, потым расстрэльвалі яго ва ўпор. Пераходзілі ў контратаку. У час адной з такіх контратак адбілі гармату. Такім чынам папоўнілі свой артдывізіён.

Не дабіўшыся выніку, варожае камандаванне ўмацавала сілы. З Паліка пад Пышна перакінулі 13-ы паліцэйскі полк, танкавую роту і зенітны артдывізіён. 16 чэрвеня пачалося новае наступленне на вёску. Пачалося яно з бамбардзіроўкі. У 8 гадзін над вёскай з'явілася дзевяць пікіроўшчыкаў. Апрацаваўшы нашы пазіцыі з паветра, вораг падключыў артдывізіён, а потым пайшла пяхота, яе падтрымалі танкі. У схватку з атакуючымі па ўсёй лініі абароны ад могілак з поўначы, далей па вуліцы Трактарнай да Савіна Дуба ўступілі атрады Караленкі, Місунова і Дзідэнкі. На працягу некалькіх гадзін мы стрымлівалі ворага. Спатрэбілася і захопленая гармата. Разлік, створаны з байцоў атрада Місунова, знішчыў чатыры танкі.

Аднак сілы былі няроўныя. Неслі і мы страты. Таму камандаванне брыгады загадала пакінуць пазіцыі і адысці на новыя, загадзя падрыхтаваныя, па лініі Весніцк — Царкавішча — Замошша...

Пакінуўшы за сябе палітрука Лапаткіна, я з дзесяткам аўтаматчыкаў пайшоў у разведку ў бок Пышна. Па шляху згледзелі сляды ад падкаваных нямецкіх чаравікаў: дзесьці паблізу былі фашысты. Хутка іх выявілі: на беразе ляснога возера стаяла сем варожых танкаў. Ля іх ляжала абмундзіраванне танкістаў, апошнія купаліся ў возеры. Вельмі карцела знішчыць танкі. Але ў нас не было з сабой супрацьтанкавых гранат. Вырашылі расстраляць танкістаў, тым самым абясшкодзіць танкі. Некалькі аўтаматных чэргаў — і фашысты пайшлі на дно...

Неяк мы заўважылі, як кожнай раніцай групы бяззбройных варожых салдат выходзяць з лесу і ідуць да ракі, каб прыняць водныя працэдуры. Гэта быў зручны момант для нападу. Для выканання задання я сабраў групу ў 30 чалавек. На заданне выйшлі ў 3 гадзіны ночы. Неўзабаве былі непадалёку ад лугавінкі, што знаходзілася ля моста цераз Ушачу. І бачым, як, усеўшыся паўколам на ёй, каля паўсотні фрыцаў уважліва слухаюць афіцэра, бачна, прапагандыста. Не губляючыся, аддаў загад: «Да бою!» Партызаны ўзялі фрыцаў на прыцэл. І па камандзе «Агонь!» ураз знішчылі іх. Поспех быў на нашым баку. Але адна акалічнасць азмрочыла радасць. У час адыходу сляпая варожая куля смяртэльна раніла палітрука Лапаткіна. Так мы страцілі любімага, вясёлага таварыша. Гэта ён быў аўтарам заўсёды выклікаючых у нас смех вершаваных радкоў, звернутых да фашыстаў: «Калі пайшоў ты на Тартак, то будзе табе гутэн так...»

М. Кляшторны,
былы камандзір 5-га атрада
Лепельскай партызанскай брыгады

Апошняя граната

У час першай блакады Лепельская партызанская брыгада вымушана была пакінуць свой пастаянны лагер у антуноўскіх лясах. З баямі адыходзілі партызаны са сваіх пазіцый. А вораг насядаў. Становішча вельмі ўскладнілася. У гэтых умовах штаб брыгады стварыў спецыяльную разведгрупу, якая атрымала загад: як мага больш даведацца аб планах гітлераўцаў, іх сілах. Задача не з лёгкіх. Нездарма ў групу ўключылі байцоў трэцяга атрада, якім камандаваў Д. Ц. Караленка, адзін з самых баявых камандзіраў. Як успамінае кіраўнік разведгрупы Андрэй Данілавіч Каралевіч, было разведчыкаў трынаццаць. Асабліва вызначаўся Альберт Жванскі, малады настаўнік з вёскі Савін Дуб. Ён добра ведаў мясцовасць, лёгка арыентаваўся ў лесе, правільна вёў групу па маршруту. Аднак байцоў падсцерагала небяспека. У раёне вёскі Ассё напароліся на засаду. Давялося абыходзіць яе. У адным месцы выйшлі на фашысцкі дот. Спрытна знялі вартавога, але іх заўважылі. Акупанты адкрылі агонь. У другі раз вырашылі адпачыць, выбралі прыдатнае месца. Раптам пачуліся каманды на нямецкай мове.

— Нас акружаюць, — крыкнуў Альберт Жванскі. — Адыходзьце хутчэй, я іх затрымаю.

— Выкарыстаць яго загад ніхто з нас, вядома, не спяшаўся, — успамінае Андрэй Данілавіч. — Завязаўся бой. Аляксей Грахоўскі, Павел Салаўёў, Аляксей Петухоўскі ды і іншыя хлопцы змагаліся без страху. І тут атрымаў раненне ў плячо Альберт. Фашысты ўсё бліжэй і бліжэй. Параненаму нялёгка адбівацца, ды і патроны на зыходзе. Фашысты ўшчыльную акружаюць байца. Ён прымае такое рашэнне: вырывае чаку з апошняй гранаты...

Былы ад'ютант камандзіра брыгады М. А. Ерашоў успамінае:

— Вестка аб подзвігу разведчыка хутка даляцела да штаба. Усіх нас яна моцна ўсхвалявала. Мы нізка схілілі галовы перад смеласцю маладога мсціўцы, які сваёй смерцю даў магчымасць таварышам адарвацца ад раз'юшанага ворага. Гэта быў прыклад непахіснай мужнасці.

В. Д. Ерашоў — былы камісар партызанскага атрада — працягвае:

— Альберт, якога я ведаў і да вайны, быў чалавекам высокіх маральных якасцей. Калі фашысты акупіравалі край, ён хаваў у сябе праследуемага інжынера Квакіна з Лепеля, актыўнага падпольшчыка. У доме настаўніка была явачная кватэра. Тут сустракаліся з патрэбнымі людзьмі сакратары Лепельскага падпольнага райкама партыі У. Е. Лабанок, А. А. Марунька і іншыя арганізатары падполля. У далейшым нам давялося ваяваць разам у адным атрадзе. Гэта быў смелы баец, верны таварыш — такім ён запомніўся ўсім.

Такім быў патрыёт з вёскі Савін Дуб. Ён вучыў дзяцей добраму, вучыў іх любіць Радзіму, а калі спатрэбілася, аддаў за яе жыццё, паступіў так, як падказала сумленне.

Загінуў Альберт Жванскі, партызанскі разведчык. За смерць яго фашысты заплацілі спаўна. А пахавалі героя ў лесе, на тым месцы, дзе сустрэў смерць.

Д. Зарэцкі

Браты Армонікі

Іх было чатыры: Віт (1918 года нараджэння), Алег (1920), Руфін (1924) і Леў (1928). Цяжкі лёс зведалі яны на сваім шляху. Жылі з бацькамі ў вёсцы Макараўшчына. Пасля грамадзянскай вайны іх бацька Ціхан атрымаў надзел зямлі, зарослы хмызняком і акружаны балотамі. Разам з жонкай раскарчавалі на ўзгорку ўчастак, пасадзілі там малады сад. Прычым упершыню ў нашай мясцовасці — у полі, далёка ад вёскі і параўнаўча вялікі — каля аднаго гектара.

У 1925 годзе ў садзе з'явіліся першыя яблыкі. Гаспадары вазілі іх у Полацк прадаваць, з кожным годам збіралі грошы, а потым купілі лесу і пабудавалі на сваім хутары звычайную хату-пяцісценку з невялікай верандай. Непадалёк паставілі

Браты Армонікі: Віт, Алег, Руфін, Леў

хлеў для жывёлы, свіран для збажыны. Падрасталі дзеці, Віт і Алег ужо сталі дапамагаць бацькам.

Але знайшліся зайздроснікі. Па іх ініцыятыве ў 1929 годзе гаспадарку раскулачылі, а сям'ю выслалі ў Котлас на лесанарыхтоўкі. Знясілены цяжкай працай і недаяданнем, памёр бацька. Маці з чатырма дзецьмі (Лёву не было яшчэ і двух гадоў) вярнулася ў сваю пустую хату.

Усё трэба было пачынаць спачатку. Прыхінуліся людзі, дапамаглі перавезці хату ў вёску. Маці працавала ў калгасе, а дзеці пачалі вучыцца (Віт да высылкі закончыў 4 класы). Пакрысе сталі зажывацца, купілі карову, гадавалі парсюка, трымалі курэй.

Але ў 1937 годзе па даносу мясцовых «актывістаў» усю сям'ю, як былую кулацкую, зноў выслалі. На гэты раз значна далей — на Калыму.

Ад гора, слёз і цяжкай працы там памерла маці. Пасля гэтага малодшых траіх дзяцей адпусцілі дамоў, а Віт яшчэ год знаходзіўся ў лагеры зняволеных. У канцы 1938 года і ён, з дазволу ўлад, вярнуўся ў родную вёску.

За год да вайны Віт і Алег скончылі Лепельскае педагагічнае вучылішча. Сталі працаваць настаўнікамі. Руфін кінуў вучобу і пайшоў падсобным рабочым на будоўлю. Леў паспеў скончыць 5 класаў.

Вераломная вайна зблытала ўсе добрыя надзеі на будучае. Але ўсе браты добра разумелі, што на нашу зямлю прыйшоў вораг. Што рабіць? Неаднойчы яны пыталіся адзін у аднаго, абмяркоўвалі розныя варыянты і трывожна сустракалі кожную ноч.

Аднойчы ў канцы лета 1941 года ноччу хтосьці асцярожна пастукаў у акно. Выйшаў Віт. Каля хаты стаяў незнаёмы мужчына з зарослым тварам.

— Дазвольце пераначаваць у вас, — нясмела папрасіўся ён.

— Заходзьце, калі ласка, — адказаў Віт.

Пасля кароткай размовы ўсё стала зразумелым. Чырвонаармеец, трапіўшы ў акружэнне яшчэ ў Прыбалтыцы, паступова рухаўся на ўсход з надзеяй перайсці фронт.

Крыху падсілкаваўшыся, прадоўжылі гутарку, пазнаёміліся.

— Завуць мяне Мікалай, прозвішча Самусь, — сказаў прыйшоўшы. — Сам я аж з берагоў Азоўскага мора, ёсць там невялікі гарадок Цямрук. А вось лёс закінуў мяне сюды. Іду ад Балтыйскага мора, боты стапталіся, цяпер амаль босы, але намер перайсці фронт не страціў.

— Ну нічога, што-небудзь прыдумаем. Адпачні ў нас дзянькі тры-чатыры, а потым пойдзеш далей.

Назаўтра збіраліся капаць бульбу. Госць таксама прапанаваў сваю дапамогу.

— Не, — запярэчыў Алег, — ты ледзь на нагах стаіш, адпачні. Ды ў нас і кошыкаў не хапае.

— Кошыкаў не хапае? — спытаў Мікалай. — Дык гэта мая справа. Вунь і лаза расце. Я зараз змайструю.

Хлопцы заняліся бульбай, да іх падышлі суседскія дзяўчаты. Справа спорылася.

— Ну вось вам і яшчэ кошык, — праз нейкі час падышоў да іх Мікалай.

Кошык быў такі прыгожы, што дзяўчаты наперабой загаманілі:

— Вось каб і мне такі! А ці можаш зрабіць яшчэ?

— Мы гэтакіх ніколі і не бачылі!

Хутка работу закончылі. Увечары наварылі свежай бульбы, знайшлася шкварка, аднекуль з'явілася бутэлька самагону. Загаманілі...

— Мікалай, — звярнуўся Віт да госця, — спадабаўся ты нам. Заставайся ў нас на

зіму. Будзеш плесці кошыкі, бачыш, яны патрэбныя ў нашай вёсцы. А каб да цябе не чапляліся нямецкія ўлады, будзеш у нас за дваюраднага брата, так сказаць, пятым Армонікам. Антон, сын нашага дзядзькі Апанаса, цяпер у Чырвонай Арміі, на фронце, а ты вельмі падобны на яго. За гэты час знойдзем табе боты, якое-небудзь адзенне. Адным словам, неяк будзем.

Такім чынам, у хаце сталі жыць пяць братоў. Да іх прыходзілі таварышы па вучобе, суседзі. У хаце было заўсёды гаманліва.

Неяк познім восеньскім вечарам, калі ўсе браты былі дома, Віт сказаў:

— Учора я быў у Губіне і выпадкова сустрэў Анатоля Маруньку. Пасля размовы з ім стала лягчэй дыхаць. Ён паведаміў, што ў раёне ёсць людзі, якія разгортваюць барацьбу з акупантамі. Трэба нам рыхтавацца да гэтага. Будзем пакрыху збіраць зброю, якая засталася пасля абыходу нашай арміі. Марунька папярэдзіў, каб аб гэтым ні гу-гу. Сувязь трымаць толькі з ім...

Памятаецца, у студзені 1942 года я зайшоў у хату да Армонікаў. Сям'ю гэту ведаў, бо да вайны вучыўся ў адным класе з Алегам.

— Слухай, Толя, — асцярожна пачаў размову Алег. — З ранку я сек дровы ў хмызняку і там знайшоў пачак лістовак, у якіх гаворыцца аб наступленні Чырвонай Арміі пад Масквой. Відаць, ноччу з самалёта скінулі. Давай станем на лыжы і развязём гэтыя лістоўкі па навакольных вёсках. Хай чытаюць людзі.

— Давай, — адразу згадзіўся я, — гэта ж столькі радасці будзе для ўсіх.

Так мы і зрабілі.

— Вядома, я тады не ведаў, што гэтыя лістоўкі былі надрукаваны ў Лепельскай друкарні, адтуль смелыя людзі даставілі іх у Губіна да Марунькі. Ад яго і атрымалі браты Армонікі лістоўкі.

Вясной нечакана прапаў Антон Апанасаў (Мікола Самусь). Усе гаварылі, што бачылі, як яго на полі ўзялі нейкія ўзброеныя людзі. Хто яны — паліцаі ці партызаны — ніхто не ведаў.

А партызаны пачалі ўжо дзейнічаць. То там, то тут праводзіліся дыверсійныя акты на дарогах, прымаліся меры пакарання да актыўных памагатых акупантаў. Людзі з навакольных вёсак адзін за другім сталі падавацца ва ўшацкія лясы да партызан.

У ліпені 1942 года пайшоў і я разам з аднавяскоўцамі Паўлам і Барысам Чэкліным, Іванам Ялугам, Ганнай Ханяк і іншымі. У партызанскім лагеры каля вёскі Істопішча сустрэў Міколу Самуся. Пагаварылі.

— Хутка ўсе мае браты прыйдуць сюды, — у канцы размовы паведаміў ён. Потым дадаў: — А пакуль яны патрэбны там. Так прапанаваў Анатоль Марунька. Ён цяпер — камісар партызанскага атрада, камандзір — Дзмітрый Караленка.

У пачатку 1943 года ў атрадзе сапраўды з'явіліся ўсе браты Армонікі. Хату сваю замкнулі, вокны забілі дошкамі. Праз некаторы час немцы спалілі яе.

Мікола Самусь у той час камандаваў кулямётнай ротай, папрасіў камандзіра атрада, каб братоў прызначылі да яго. Так і зрабілі. За братамі замацавалі трафейны станковы кулямёт. Баявыя сябры дапамагалі асвоіць складаную зброю.

Пачаліся баявыя аперацыі. Партызаны білі акупантаў на дарогах, у гарнізонах, на чыгункі Полацк — Маладзечна. І заўсёды кулямёт братоў Армонікаў знаходзіўся ў самым гарачым месцы. Ніколі не падводзіў.

Асабліва гарачыя баі разгарнуліся ў маі — чэрвені 1943 года, калі акупанты распачалі карную экспедыцыю «Котбус» па разгрому партызанскай зоны. Пад няспынным націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка прыйшлося некалькі адступіць. Абарону занялі на ўзгорках непадалёк ад вёскі Вялікія Дольцы. Зранку немцы пачалі моцны артылерыйскі абстрэл партызанскіх пазіцый. Здавалася, усё змяшалася з зямлёй, нічога жывога не засталося. І вось фашысты пайшлі ў атаку. На схіле аднаго з узгоркаў побач з могілкамі размяшчаўся кулямётны разлік братоў Армонікаў. Віт папярэдзіў:

— Агонь будзем адкрываць толькі тады, калі фашысты наблізяцца на 150 метраў. Трэба берагчы патроны.

Карнікі лезлі, як мурашкі. Бачна, ім



БЕЛОРУССКИЙ
ШТАБ
ПАРТИЗАНСКОГО ДВИЖЕНИЯ
13 . 8 1946
№
ок/346/к/28060

(Заполняется в 3-х экземплярах)
Гр. АРМОНИК Олег Тихонович
(фамилия, имя, отчество)
Брестская Обл, Косовский р-
ст. Ивацевичи
(точный адрес)

ИЗВЕЩЕНИЕ

Ваш брат АРМАНИК Витт Тихонович
(муж, сын, брат, фамилия, имя и отчество)
зам. К-ра П/о 19 19 рождения, участник Великой Отечественной войны
(должность и часть)
против немецко-фашистских оккупантов, ранее работавший
(название)
Нет данных в должности студент
учреждения, предприятия, учебного заведения)
с окладом в месяц, в бою за Социалистическую родину против немецки
15 июня 1944 пропал без вести
(убит, был ранен и умер от ран)
(место похорон)
Настоящее извещение является документом для возбуждения ходатайства о
Начальник штаба
Начальник отдела кадров
Зак. 27

Паведамленне на Армоніка Віта аб тым, што ён прапаў без вестак

перад атакай далі спіртнога. Застракаталі аўтаматы, адкрылі агонь стралкі. Аднак наступаючыя ўпарта набліжаліся да ўзгорка.

— Чаму маўчыць кулямёт? — трывожна пыталіся адзін у аднаго партызаны.

І тут прагучала рэзкая, але нядоўгая чарга кулямёта Армонікаў. Потым яшчэ і яшчэ. Фашысты заляглі, агонь з боку партызан узмацніўся. Пачуліся крыкі «Ура!».

Вораг не вытрымаў, адкаціўся назад. На месцы засталося больш за дзесятак забітых і параненых.

Праз некаторы час атака паўтарылася. І зноў яна захліпнулася. Так было некалькі разоў. Потым наляцелі самалёты, пачалі скідваць бомбы на пазіцыі партызан. Фашысты зноў пайшлі ў атаку. Іх было цяпер больш, бачна, прыйшло падмацаванне. Некаторыя партызаны кінуліся назад, за імі — іншыя.

— Давай я лягу за кулямёт, — прапанаваў Віту Алег, — а ты назірай за левым флангам, адтуль адышлі партызаны. Вазьмі мой аўтамат. Нам адысці з кулямётам не ўдасца, будзем змагацца да апошняга патрона.

Кулямёт застракатаў. Віт і Руфін білі з аўтаматаў. Паядынак працягваўся да вечара. Вораг не вытрымаў, адышоў назад. На полі засталося ляжаць некалькі дзесяткаў трупаў.

На другі дзень атак не было.

Падзеі на Курскай дузе прымусілі нямецкае камандаванне шукаць рэзервы і спешна перакідваць іх на фронт. Знялі з пазіцый і вайсковыя часці, якія дзейнічалі ў карнай экспедыцыі «Котбус».

Да гэтага часу было прынята рашэнне аб раздзеле партызанскай брыгады «Дубава» на два злучэнні, пачалі стварацца новыя атрады. На камандныя пасады вылучаліся бывалыя партызаны, у тым ліку і браты Армонікі. Віт быў прызначаны намеснікам камандзіра кавалерыйскага эскадрона па разведцы, Алега зацвердзілі на такую ж пасаду ў другім атрадзе, якім камандаваў Мікалай Самусь. Руфіну даручылі быць інструктарам падпольнага РК ЛКСМБ, а пятнаццацігадовы Лёва стаў камандзірам новага кулямётнага разліку ў саставе другога атрада.

І зноў пайшлі адна за другой баявыя аперацыі.

Алег з невялікай групай разведчыкаў разграміў варожы гарнізон у вёсцы Двор Парэчча, узяў у палон двух варожых салдат. Прайшоў невялікі час, і ён з адважнымі разведчыкамі прарваўся ў даволі моцны варожы гарнізон «Пляцоўка», які размяшчаўся на востраве паміж двума рукавамі ракі Эса. Амаль без бою смельчакі абяззброілі абаронцаў гарнізона, частка якога адразу ж перайшла на бок партызан, астатнія, у тым ліку і начальнік, трапілі ў палон. Былі захоплены значныя трафеі.

За гэту дзёрзкую аперацыю і іншыя баявыя заслугі Алег быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Значны ўклад у паспяховую аперацыю па штурму вельмі моцнага варожага гарнізона ў Лепелі ўнеслі разведданыя, якія здабылі разведчыкі пад камандаваннем Віта і Алега. Руфін праз свой актыў сувязных і падпольшчыкаў вёў вялікую работу па дэмаралізацыі асабовага саставу варожых гарнізонаў у Лепелі, Камені, Катоўшчыне, Бароўцы. Леў праявіў сябе сапраўдным героем пры штурме Лепеля ў кастрычніку 1943 года.

Найбольш цяжкія выпрабаванні браты Армонікі перанеслі разам з іншымі ў час карнай экспедыцыі «Свята вясны», якую акупанты праводзілі ў красавіку — маі

1944 года. Амаль месяц партызаны вялі цяжкія баі з пераўзыходзячымі сіламі ворага. Тады мы страцілі многіх баявых таварышаў, у тым ліку і камандзіра Лепельскай партызанскай брыгады Д. Ц. Караленку.

Штурм аб'яднаных сіл некалькіх партызанскіх брыгад каля вёскі Паперына Ушацкага раёна дазволіў вырвацца асноўным сілам з варожага катла. Пры штурме Лёва з цяжкім кулямётам адарваўся ад сваіх таварышаў, прымкнуў да партызан брыгады радзівонаўцаў і яшчэ некалькі дзён працягваў баі з карнікамі. Нарэшце і яму ўдалося прарвацца з акружэння. У вёсцы Мішулькі ён сустрэўся са старэйшым братам Вітам. Радасці не было канца. Але праз некалькі дзён у час разведвылазкі ў вёсцы Губіна Віт трапіў на варожую засаду і апынуўся ў руках гітлераўцаў. Яго расстралялі каля мястэчка Ула.

Пасля вызвалення раёна ад акупантаў браты ўключыліся ў мірную працу па аднаўленні разбуранай гаспадаркі. Але нядоўга працягваўся гэты час. Алег, будучы памочнікам старшыні Лепельскага райвыканкама, папрасіўся добраахвотнікам на фронт. Лёву мабілізавалі ў армію па ўзросту, а Руфіна накіравалі ў заходнія раёны Беларусі на ліквідацыю бандытызму.

Цяпер тры браты Армонікі на пенсіі. Алег жыве ў г. Уздзе, дзе працаваў дырэктарам сярэдняй школы, затым загадчыкам райана, Руфін — у Наваполацку, працаваў на нафтаперапрацоўчым камбінаце, Лёва жыве ў Маладзечне, працаваў інжынерам на радыёзаводзе.

Вось такія браты Армонікі, грудзьмі сталі на абарону свайго народа, сваёй Радзімы.

А. Ханяк, былы партызан

Баі з карнікамі

Карная экспедыцыя супраць партызан.
Красавік—май 1944 г.

Использовав затишье на фронте и с целью обеспечить себе прочный тыл на случай летнего наступления Красной Армии, германское командование решило очистить Ушачский, Лепельский и частично другие районы от партизанских бригад. Противник, сняв часть фронтовых войск, предпринял одновременно концентрическое наступление против всех бригад.

На нашем участке обороны от м. Пышно до дер. Заборовье включительно действовали части противника 95-й стрелковой дивизии и 6-й авиаполевой дивизии (из слов захваченных пленных «языков»).

Немцы, сосредоточив превосходящие силы пехоты, под прикрытием танков, артиллерии (самоходной), авиации, повели на нашем участке активное наступление с 21 апреля 1944 года. Основной удар противник наносил на населенные пункты Заболотье, Будевцы, Подлобные, Заборовье. В своем расположении это были крайние пункты партизанской зоны, где была построена оборона.

Кав. эскадрон командира Понкратова и комиссара Сисковича в неравных боях 3 часа удерживал дер. Заболотье от наседающего врага. Вводя все большее и большее количество людей и техники в бой, враг предпринял фланговый обход. Командир отряда дал приказ об отходе на дер. Замховые. Здесь на переправе отряд отбил несколько атак противника, но, не заметив фланговых обходов, попал в окружение. Только благодаря хорошему знанию местности и искусному руководству командир и комиссар вывели отряд из окружения в дер. Остров с потерями два раненых. Противник потерял 28 убитыми и 30 раненых немецких солдат и офицеров.

Немного раньше Замховых противник занял дер. Будевцы, на обороне которой стоял 1-й отряд — командир Королевич и комиссар Циковой. Враг силой до 1000 человек с тремя танками типа «тигр», двумя самоходными орудиями и минометами оттеснил отряд на оборону южнее дер. Воронь. Здесь бой продолжался до 20 часов. Неоднократные атаки немцев были отбиты. За день боев убито 8 и ранено 15 гитлеровцев. Наши потери — 2 раненых.


Линия обороны Полоцко-Лепельской партизанской зоны на 11 апреля 1944г.
Места дислокации партизанских бригад на 11 апреля 1944 г.
Линия обороны Полоцко-Лепельской партизанской зоны на 30 апреля 1944 г.
Места сосредоточения партизанских бригад на 1 мая 1944 г.
Боевые действия партизанских бригад по прорыву блокады 1—5 мая 1944 г.
Места сосредоточения немецко-фашистских войск
Основные направления боевых действий противника
Полоцко-Лепельская оперативная группа ЦК КП(б) Б и ВШПД
Ветрино
Заскорки
Семенец
Горяны
Воронцы
Бобыничи
Матырино
Лутово
Сорочино
Подсвилье
Кубличи
Мосар
Жары
Весница
Камень
Бочейково
Сокорово
Суша
Лилово
Боя Дольцы
Зарубовщина
Антифашистская
Казимирово
Березина
Гомель
Тетча
Горбатичи
Смоленская
Дубровка
Загорье
Отолово
Заречье
Ворона
Заборовье
Усвеча
Зап. Двина
Полномо
Уша
Уллянь
Ульяновка
Ульяны
Смоленщина
Рябчинки
Палерино
Шеи
Селище
Ольшанка
Ольшанка
Ольшанка

технике, отряд отступил в дер. Дудчино. В боях отличился боец Кагур А. А., который убил 4 немцев и сам погиб смертью храбрых, пулеметчик Шатыренок Ч. убил 5 немцев, бронебойщик Пузиков А. прямым попаданием из бронебойки подбил одну автомашину.

4-й отряд на этом фланге по приказанию комбрига делал удар с тыла со стороны кладбища по дер. Болотники. Уничтожен орудийный расчет и запряжка лошадей 76-мм пушки. Убили 25 гитлеровцев и ранили 30. Отряду с боем пришлось отойти и занять оборону между дер. Азаринки и Застенок. Потери отряда: 1 убитый, 1 раненый.

9-м отрядом имени Пацея за день боев убито 37 и ранено 48 гитлеровцев, при своих потерях 7 раненых. Не выдержав натиска противника, отряд отошел с опушки леса около Подлобных на оборону у дер. Азаринки. В боях отличился 2-й взвод Каширина, пулеметчик Долгий П.

В центре обороны южнее дер. Воронь вновь введенный в бой 2-й и 5-й отряды весь день сдерживали натиск врага. Только после того как на правом фланге врагу удалось оттеснить с обороны 1-й отряд, который отступил к хуторам Воровка, 2-й и 5-й отряды отходят за озеро Воронь к северной части деревни. В противном случае отрядам угрожала опасность быть отрезанными и окруженными.

Командир 2-го отряда Самусь Н. и комиссар Кальченко Н., 5-го отряда тов. Кляшторный М. и комиссар Пацей П. проявили себя как настойчивые и волевые командиры, умеющие руководить боем. Двумя отрядами за день боев убито больше 20 гитлеровцев и ранено около 30, при своих потерях 4 раненых из второго отряда.

Саперами 1-го отряда подорван один танк. Отряд уничтожил 22 гитлеровца, потерял своих убитыми 3, раненых 2 партизана.

Наступление гитлеровцев на дер. Остров было безуспешным. Кав. эскадрон отразил все попытки противника занять деревню, нанеся ему потери: убитыми 9 и ранеными 23 немецких солдата и офицера.

8-й отряд Розонова был крайним на правом фланге, занимал оборону после деревни Осье, в дер. Поровно, Изофатово и в этот день в боях не участвовал.

В этот день, находясь на передовой, в центре обороны, около дер. Застенок, руководя непосредственно ходом боя, героически погиб командир бригады Короленко Дмитрий Тимофеевич от разрыва вражеской мины. Комбригом становится комиссар бригады Ярмош, а комиссаром бригады секретарь Лепельского подпольного РК КП(б)Б Качан В.

23 апреля 1944 года противнику, несмотря на всю ярость наступления, удалось потеснить только 4-й отряд Маркина и 9-й Коцубинского, которые занимали оборону восточнее и западнее деревни Азаринки. 4-й отряд, нанеся противнику потери убитыми 20 и ранеными 27 гитлеровцев, при своих потерях 3 убитых и 10 раненых, отступил и занял оборону западнее Дудчино. 9-й отряд отошел к деревне Бочкары. За день боев потери противника в целом составляли 65 убитыми и 70 ранеными.

24 апреля 1944 года на левом фланге обороны наблюдалось затишье. Велась разведывательная деятельность и артиллерийско-минометная перестрелка. На правом фланге враг, при поддержке авиации и артиллерии, повел наступление на дер. Остров. После двух часов боя отряд был вынужден отойти и занять оборону левее 8-го отряда в дер. Изофатово. В боях за Остров немцы потеряли 20 убитыми и 18 ранеными солдат и офицеров.

25 апреля 1944 года наиболее крупное наступление противника главным образом было вдоль шоссе Лепель—Ушачи, по обе стороны, на 9-й, 2-й и 1-й отряды. Бой начался в 11.00 и длился до 17.00 часов. Несколько раз враг переходил в атаку и вновь отбрасывался назад мужественно сражавшимися партизанами. В лесных схватках 2-й отряд уничтожил более 60 гитлеровцев. 9-й отряд в боях за Бочкары нанес врагу потери в количестве 15 убитых и 26 раненых фашистов. Свои потери отряда были также относительно велики: 6 убитых (в том числе комиссар отряда Ибраимов) и 10 раненых.

Группа автоматчиков диверсионного отряда под руководством зам. командира отряда тов. Скработуна И. штурмом отбросила одну далеко зарвавшуюся группировку противника, уничтожила 17 гитлеровцев и столько же ранила. Свои потери 1 человек.

Дз. Ц. Караленка

1-й отряд, выдержав несколько атак противника на хуторах Воровка и истребив в лесных боях 16 гитлеровцев, согласно приказу штаба бригады, занял оборону в дер. Боровцы.

К вечеру приказом 9-й и 2-й отряды отошли из лесу и заняли оборону по обе стороны дер. Двор Жары.

Таким образом, на 26 апреля отряды занимали линию обороны, которая проходила южнее дер. Жары — с северной стороны Двор Жары — около дер. Углы и дальше через Бочкары — Боровцы — Изофатово — Поровно. Отряды по этой линии располагались в следующем порядке: крайний на левом фланге 13-й, за ним — 4-й, 9-й, 2-й (Двор Жары), 1-й, 5-й, диверсионный, кав. эскадрон, 8-й левее Поровно.

26 апреля 1944 года с 12.00 часов дня враг начал наступление на нашу линию обороны. Главный удар гитлеровцев был сосредоточен на оборону у дер. Двор Жары и дер. Поровно, Изофатово. На Двор Жары, где занимал оборону 2-й отряд — командир Самусь и комиссар Гальченко, противник повел наступление силою 280-го пехотного полка при поддержке 7 танков, авиации и артиллерийско-минометного огня. Противник имел задачу: овладеть этим населенным пунктом и достичь площадки аэродрома «Новоселье» (из слов захваченных пленных «языков»). Благодаря упорству и решительности командиров и партизан отряда, в боях противник понес большие потери в живой силе и технике. Было отбито три атаки врага, захвачен пленный «язык»-немец. В бою героически сражался начальник штаба тов. Жуков Аким, который от тяжелого ранения умер, зам. командира по разведке Армоник Олег, пулеметчики Пивоваров и Шетина, которые погибли в бою с немецкими карателями смертью храбрых. После короткой передышки враг снова возобновил атаки на второй отряд. Отбив еще две атаки, отряд отошел на следующую линию обороны в районе дер. Углы.

Одновременно немцы численностью до 800 человек пехоты при поддержке танков, артиллерийско-минометного огня и авиации повели наступление на оборону кав. эскадрона и диверсионного отряда в районе дер. Изофатово. Разгорелся жестокий бой. Бойцы и командиры под командованием командира кавалерийского эскадрона Понкратова и командира диверсионного отряда Жуковского упорно сдерживали натиск врага. Бой длился 13 часов. В этом бою противник понес большие потери в живой силе: только убитыми 80 солдат и офицеров, ранеными больше 100 гитлеровцев. В этих боях отличились партизаны, погибшие смертью храбрых, но не сдавшие своих позиций: тт. Краско, Шалафаненко, Шарамет. Отличились и пулеметчики: тт. Понизович, который из своего пулемета убил до 25 гитлеровцев, Позняк, который убил до 15 гитлеровцев. Оба пулеметчика были ранены в бою. Из диверсионного отряда героически погиб комиссар отряда Горчаков Василий.

Группа автоматчиков диверсионного отряда во главе начальника штаба отряда тов. Косого В. пробрались в тыл противника и быстрым налетом уничтожили пушку врага, убили 13 вражеских солдат и офицеров, ранили 18. Особенно отличился в бою командир взвода Цикин А., бойцы Литвин И., Устин П., Коробовский И.

На левом фланге враг пытался занять дер. Жары, но бойцы и командиры 13-го и 14-го отрядов, проявляя мужество и героизм, сдержали натиск врага. В боях отличился 2-й взвод тов. Клюко (4-го отряда) под командованием зам. командира отряда Ляха Ивана, который до последнего держал неравный бой с противником. Потеряв командира взвода, пулеметный расчет и большую часть взвода (10 стрелков), зам. командира Лях сдержал наступление на своем участке до прихода подкрепления.

В последующие дни, с 27 апреля по 1 мая, враг все яростнее наседал на участок нашей обороны. Каждый шаг продвижения стоил гитлеровцам огромных жертв. Бойцы и командиры с беспримерным героизмом проявляли смелость и находчивость в трудной обстановке.

В боях за дер. Дворицы противнику удалось прорвать оборону 4-го отряда, тогда взвод командира Ясюка смелым маневром заходит с фланга и ударом во фланг врага ошеломляет его. Этим самым прорыв был ликвидирован. Немцы потеряли 12 убитыми и 21 ранеными солдат и офицеров. В другой раз восточнее дер. Гута противнику удалось прорвать оборону и отрезать тот же взвод Ясюка. Подпустив на близкое расстояние, взвод открывает ураганный огонь по противнику и забрасывает его гранатами. Убив 11 гитлеровцев и 29 ранив, взвод вышел из окружения, потеряв 4 бойцов ранеными.

С исключительным упорством отражали атаки врагов 2-й и диверсионный отряды в районе деревень Углы, Рагуцкие, Новый Двор. Каждую линию обороны врагу приходилось брать после длительных боев, с огромным численным превосходством, с участием авиации, танков и артиллерии.

В ночь на 5 мая 1944 года бригада в районе дер. Поперино, Новое Село штурмом прорвалась в район Селищенского леса, оставив заслон для прикрытия, вышла в район Самовки, Пуща.

Во время штурма противник понес большие потери убитыми и ранеными, оставив на поле боя танки, пушки, минометы. Уничтожить технику врага не удалось ввиду сильного огня с флангов. Был захвачен в плен немец.

На 6 мая 1944 года бригада, маневрируя с целью отрыва от преследования противника, совершила ночной марш, вышла в район леса западнее дер. Ралля—Тухатено. После дневного привала было принято решение вывести бригаду в район Воловой Горы, что достигли 9 мая.

При штурме и прорыве кольца окружения, ввиду сильного огня со стороны противника, бригада понесла большие потери. Таким образом, за период экспедиции и прорыва бригада имеет следующие общие потери:

убитыми	— 101 человек
ранеными	— 161 человек
пропавшими без вести	— 440 человек
дезертировавших партизан	— 18 человек
ВСЕГО	— 720 человек

Личный состав бригады после экспедиции и выхода из окружения составляет 1023 человека. На 1 апреля 1944 года личный состав бригады составлял 1743 человека.

После выхода бригады из окружения отряды были размещены в Лепельском районе: 5-й и 9-й — в районе дер. Суша, 2-й и 13-й — в районе дер. Волосовичи, 3-й и кав. эскадрон — в районе Волова Гора, 1-й, 8-й и диверсионный отряды — в районе лесов северо-западнее гор. Лепель.

С июня месяца немецкая карательная экспедиция начала свои действия в Лепельском районе по направлению Воловой Горы. Нанося врагу большой урон в живой силе, отряды защищали каждый метр своей земли.

3 июня в бою за дер. Оконо отличилось отделение Якубовского (3-й отряд, командир Сучинский), которое удерживало сильный натиск превосходящих сил противника в течение полутора часов. Отделение отразило две атаки, нанесло противнику большие потери в живой силе.

Группа партизан под командованием начальника штаба 3-го отряда тов. Чернова М. держала бой в районе дер. Свядица с превосходящими силами противника численностью до 400 человек. В бою партизанами уничтожено до 23 немецких солдат и офицеров. В этой схватке героически сражался с врагом партизан Дорохов. Он первый бросился в рукопашный бой на противника, где был тяжело ранен вражеской

пулей. Командир отделения т. Каваль М. не оставил раненого на поле боя, под ураганным огнем вынес раненого Дорохова с поля боя и сохранил ему жизнь.

5 июня противник занял дер. Волова Гора. Штаб бригады с диверсионным отрядом, кав. эскадроном и 3-м отрядом отошли за реку Бузянку в район дер. Ствольно, где была поставлена задача: 3-му отряду прорваться в тыл противника в район Воловой Горы и действовать там в дальнейшем. Штаб бригады с диверсионным отрядом и кав. эскадроном отошел в лес около дер. Крайцы. В целях выхода из окружения и заблуждения противника маневром штаб бригады с диверсионным отрядом прорвались 10.VI.44 года в район н/п Медведовка, Затеклясье с дальнейшей задачей выхода в район расположения 1-го отряда (Воронский лес). Три раза пытались прорваться через ж. д. и большак Лепель—Березино, но ввиду сильной охраны пройти не удавалось. Только на 17 июня 1944 года удалось переправиться в районе дер. Студенка, где вышли в Воронский лес и соединились с 1-м отрядом. В этом лесу находились до 28 июня 1944 года, 28 июня 1944 года соединились с частями Красной Армии.

Са справаздачы Лепельскай партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна. 1944 г. Фонд Лепельскага краязнаўчага музея.

З успамінаў У. Е. Лабанка

Вясною 1944 года пачалі набліжацца сур'ёзныя падзеі на тым напрамку, дзе дзейнічала наша злучэнне. Рыхтавалася аперацыя «Баграціён». Цэнтральны штаб партызанскага руху, ацаніўшы становішча, вырашыў: Полацка-Лепельскі край утрымліваць сіламі партызанскіх брыгад. Мы павінны былі яшчэ больш актывізаваць свае дзеянні. За брыгадамі нашага злучэння замацоўваліся пастаянныя абарончыя раёны глыбінёй 15—20 кіламетраў. Аператыўная група злучэння распрацавала варыянты баявых дзеянняў, у якіх спалучалася актыўная абарона на шырокім фронце з партызанскімі метадамі барацьбы, старанна адпрацавалі мы пытанні ўзаемадзеяння ўнутры брыгад, паміж брыгадамі, з суседнімі партызанскімі злучэннямі, з часцямі войск 1-га Прыбалтыйскага фронту. Трэба адзначыць, што ў канцы снежня 1943 года, глыбока ўбіўшы клін у абарону нямецка-фашысцкіх войск паміж Віцебскам і Полацкам, 1-ы Прыбалтыйскі фронт амаль ушчыльную прыблізіўся да паўночных граніц нашай партызанскай зоны.

Нямецкае камандаванне вырашыла зрабіць усё, каб засцерагчы ад партызан свае баявыя парадкі і бліжэйшыя тылы: гітлераўская ж прапаганда абвясціла абарону ў беларускім выступе «бітвай за фатэрлянд». У пачатку красавіка 1944 года гітлераўцы кінулі на Полацка-Лепельскі партызанскі край 6 дывізій рэгулярных войск і 15 эсэсаўскіх і паліцэйскіх палкоў. Праціўнік сканцэнтраваў супраць нас 60-тысячную групоўку. Воінскім часцям, ахоўным і эсэсаўскім падраздзяленням было прыдадзена 137 танкаў, 235 гармат, да 70 самалётаў. Уся гэта армада атрымала заданне ў кароткі час знішчыць партызан. Яна складалася з дзвюх аперацый: першая — «Регеншауэр» («Лівень») і другая — «Фрюлінгсфэст» («Свята вясны»). Агульнае кіраўніцтва экспедыцыяй ускладалася асабіста на генеральнага камісара акупіраваных абласцей Беларусі генерал-лейтэнанта Готберга і камандуючага 3-яй танкавай арміяй генерал-палкоўніка Рэйнгардта.

Якія задачы ставіў перад сабою праціўнік? Аб іх нам стала вядома з захопленых пазней сакрэтных загадаў і інструкцый 3-яй нямецкай танкавай арміі. Гітлераўцы пры дапамозе 49 танкаў і вялікай колькасці артылерыі планавалі зламаць абарону партызан і авалодаць левым берагам Заходняй Дзвіны, выціснуць партызан з лясных масіваў у больш абмежаваны раён і пазбавіць іх манеўранасці. Адначасова наступленнем усіх сваіх часцей праціўнік меркаваў адціснуць нас да чыгункі на ўчастку Загацце—Празарокі і знішчыць. Што ж датычыць мірнага насельніцтва, то тут намячалася партызанскі край поўнасцю разграбіць, вынішчыць усё непрацаздольнае насельніцтва, а прыгодных да працы загнаць у рабства.

Аднак гэта карная экспедыцыя не застала нас знянацку. Партызанская і вайско-

вая разведкі своечасова данеслі аб рыхтуемым вялікім наступленні праціўніка. Усе партызанскія сілы былі прыведзены ў баявую гатоўнасць. Шляхі магчымага прасоўвання праціўніка ў партызанскую зону былі папсаваны, іх перакапалі, зрабілі лясныя завалы, знішчылі варожыя пасты, замініравалі аб'езды. У месцах магчымых атак збудавалі надаўбні, равы, эскарпы, контрэскарпы, новыя акопы і бліндажы. У кожным узводзе з найбольш смелых, праявіўшых сябе байцоў рыхтаваліся знішчальнікі танкаў.

...11 красавіка 1944 года адначасова з усіх бакоў гітлераўцы пачалі магутнае наступленне. Але, наперакор спадзяванням фашыстаў, партызаны не пайшлі ў лясы. Наадварот, мы выйшлі з лесу і адразу прынялі бой. Першымі ўступілі ў няроўную схватку брыгады імя Леніна і імя Чапаева.

Дваццаць сем дзён наша 17-тысячная групоўка адбівала шалёны націск фашыстаў. Але кола акружэння сціскалася. Ускорасці асноўныя сілы партызан і мірныя жыхары сканцэнтраваліся на лясістым участку непадалёк ад Ушачаў — партызанскай «сталіцы». Далейшыя нашы дзеянні трэба было ўзгадніць з Ваенным саветам 1-га Прыбалтыйскага фронту, асабіста з камандуючым фронтам І. Х. Баграмянам і прадстаўніцтвам Беларускага штаба партызанскага руху. Па радыё я паведаміў аб склаўшымся становішчы. Ваенны савет фронту накіраваў радыёграму ў Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандавання. У адпаведнасці з указаннямі Ваеннага савета 1-га Прыбалтыйскага фронту камандаванне зоны прыняло рашэнне прарваць кола акружэння.

...Вечар 4 мая. Асноўныя сілы партызан занялі выгадны зыходны рубеж на ўзлеску на поўдзень ад вёскі Забароўна. Уперадзе поле, за вёскаю сяло Паперына, там моцна замацаваліся гітлераўцы. Гарнізоны не абысці — прадбачыцца цяжкі бой. Прарывацца трэба неадкладна, сёння ж, заўтра будзе позна. Цераз сувязных перадаю загад камбрыгам: штурм пачынаем у 23.30.

І вось у неба ўзняліся дзве чырвоныя ракеты. І адразу пакацілася магутнае

Распрацоўка аперацыі «Баграціён». Камандзіры брыгад Полацка-Лепельскай зоны. 1944 г.

«Ура-а-а!». Нашы сілы, сабраныя тут у адзіны кулак, імкліва рвануліся наперад. Гітлераўцы жорстка адбіваюцца — з іх умацаванняў ударылі мінамёты, пушкі. Усё зліваецца ў суцэльны грукат. Наперад, толькі наперад. Наш націск быў нястрымны. Партызаны змялі гарнізон карнікаў. У прабітую брэш рушылі мірныя жыхары.

Так быў ажыццёўлен гэты прарыў. Дорага каштавала гітлераўцам спроба разграміць і знішчыць партызан Полацка-Лепельскага краю. «Адсутнічаюць словы, якія маглі б апісаць д'ябальскія і грозныя дзеянні партызан у гэтыя дні...» — піша ў сваёй кнізе «Віцебск. Барацьба і гібель 3-яй танкавай арміі» былы начальнік яе штаба О. Гейдкемпер.

Пасля прарыву блакады партызаны Полацка-Лепельскай зоны працягвалі змагацца з гітлераўцамі. Яны па-ранейшаму ішлі насустрач галоўнаму ўдару нашых войск. Напярэдадні аперацыі «Баграціён» Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання паставіла перад партызанамі Беларусі задачу — дэзарганізаваць аператыўны тыл праціўніка, сарваць падвоз яго рэзерваў да лініі фронту, а таксама перакідку войск паміж франтамі. Партызаны рыхтаваліся да трэцяга этапа «рэйкавай вайны». У ноч на 20 чэрвеня 1944 года на ўсім працягу чыгункі ад лініі фронту да дзяржаўнай граніцы загрукаталі магутныя ўзрывы, за адну ноч было пашкоджана 40 795 рэек. Вось чым павярнуўся гэты «начны канцэрт» для гітлераўцаў.

А праз некалькі дзён хвалюючая незабыўная сустрэча з часцямі Чырвонай Арміі.

Дакументы сведчаць

Найбольш буйныя карныя аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызан і мірнага насельніцтва Беларусі

Назва аперацыі ці яе нумар	Час і месца правядзення аперацыі	Найменаванне вайсковых часцей, якія праводзілі аперацыі. Колькасць знішчаных савецкіх грамадзян	Крыніца
«Балотная ліхаманка — Поўнач Тройенфельд I»	Жнівень 1942 г. Лепельскі раён	1-ая матарызаваная брыгада СС, баявая група Баркхольдта	НАРБ. Ф.685. Воп.1. Спр.1. Л.107—110
«Котбус»	Май—чэрвень 1943 г. Докшыцкі, Лепельскі раёны Віцебскай вобл., Барысаўскі, Лагойскі Мінскай вобл.	Баявыя групы падпалкоўніка Клунша, Дзірлевангера, «Норд», генерал-маёра Дормагена, палкоўніка Кінцэля. Самалёты 4-ай авіяэскадрыллі асобага прызначэння. Карнікі расстралялі, замучылі і спалілі 9786 савецкіх грамадзян, больш за 6 тыс. угналі ў Германію. Захапілі звыш 6 тыс. галоў жывёлы, 684 т зерня, 24 т бульбы і інш.	Мачульский Р. Страницы бессмертия. Мн., 1972. С.30—33 Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. Мн., «Беларусь», 1965. С. 86—95
«Карл»	Снежань 1943 г. Докшыцкі, Лепельскі раёны	Часці 3-яй танкавай арміі	НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 916. Л. 192
«Баклан»	Май—чэрвень 1944 г. Барысаўскі, Віцебскі, Крупскі, Лагойскі, Мінскі, Маладзечанскі, Смалявіцкі, Докшыцкі, Лепельскі раёны	Баявая група фон Готберга ў складзе груп Анхальта, Шмаля, Дзярыга, часцей 3-яй танкавай і 4-ай палявой армій	НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 937. Л. 110—119, 253
«Імжысты дождж» «Навальніца»	Красавік 1944 г. Докшыцкі, Лепельскі, Полацкі, Ушацкі раёны	12 ням.палкоў СС і паліцыі, часці 5 пехотных дывізій, 6-ай авіяпалявой, 3 ахоўных дывізій. Камандаваў аперацыяй камандуючы 3-яй танкавай арміяй генерал-палкоўнік Рэйнгардт	Лобанок В.Е. Партизаны принимают бой. Мн., 1972. С. 137—144
«Свята вясны»	Красавік—май 1944 г. Докшыцкі, Лепельскі, Полацкі, Ушацкі раёны	Сілы, якія ўдзельнічалі ў аперацыях «Імжысты дождж» і «Навальніца», і баявая група фон Готберга. У ходзе аперацыі карнікі захапілі для ўгону ў Германію больш за 11 тыс. чалавек	Там жа, с. 137—144 НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 937. Л. 252

Друкуецца паводле кн.: Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі. 1941—1944. Мн., 1995.

Падрыхтавала В. Я. Ланікіна

З баявога данясення камандуючага баявой групай брыгадэнфюрэра СС і генерал-маёра паліцыі фон Готберга аб карнай аперацыі «Котбус»

26 чэрвеня 1943 г.

...2. **Задание**: По приказу начальника соединений по борьбе с бандами при государственном управлении «СС» создана боевая группа фон Готтберг, под руководством группенфюрера «СС» и генерал-лейтенанта полиции фон Готтберга, которая получила задание атаковать эти банды, уничтожить лагеря, разрушить, запасы забрать.

3. **Наши силы**: В распоряжении находилось:

1. 2-й полицейский полк «СС»
2. 13-й полицейский полк «СС»
3. Штрафной батальон «СС» Дирлевангер
4. Дружинные соединения «СС»
5. 15-й охранный батальон (добровольцев)
6. 102 — // —
7. 118 — // —
8. 1-я полицейская танковая рота
9. 12 — // —
10. 1-й батальон 931-го гренадерского полка
11. 237-й охранный батальон
12. 600-й казацкий батальон
13. 633-й восточный батальон
14. 4 роты 392-й оберфельдкомендатуры с 1 батареей, 1 противотанковый и 1 взвод тяжелых минометов
15. Усиленная рота 286-й охранной дивизии
16. 2-й дивизион 213-го арт. полка (без одной батареи)
17. 3 жандармских взвода (моторизованные)
18. Особые команды «СД» для каждого батальона
19. Восстановительная группа связи, подрывная группа
20. Силы пропаганды
21. Самолеты: 4 группы 51-й бомбардировочной эскадры и 7-й авиаэскадрильи особого назначения

Оперативным группам Клунш и Дирлевангер, после того как боевой разведкой была установлена необходимость усиления, были приданы дополнительно:

1. 2 роты командующего полицией безопасности и «СД»
2. Армейский батальон Колсовский
3. Оперативные силы генерального комиссариата численностью в 200 человек
4. 1-я батарея зенитного дивизиона штаба госуд. управления «СС»
5. Усиленный 57-й охран. батальон (добровольцев)
6. 3-й батальон 2-го гренадерского велополка
7. 637-й восточный батальон
8. 1-й батальон 61-го охранного полка
9. Батальон 931-го охранного полка
10. 496-й охранный батальон (без одной роты)
11. 1-й взвод 1-го дивизиона 221-го арт. полка
12. 1-й взвод 8-й батареи арт. полка «Смоленск»
13. 3-я батарея 80-го артиллерийского танкового полка
14. 2-я батарея 56-го артиллерийского полка
15. Половина батальона «Рейх»
16. — // — «Тешендорф»
17. Команда жандармерии особого назначения «Крейкен-бом»
18. 1-й батальон 31-го полицейского полка
19. Штаб 2-го гренадерского велополка

Противник: В противоположность к ранее проведенным операциям по борьбе с бандами, при операции «Коттбус» надо было уничтожить противника, который был безукоризненно обучен и часто располагал лучшим в большом количестве оружием,

чем наши участвующие в операции части. Также оказалось, что тактическое руководство противной стороны было хорошим. Захватом многих радиостанций доказано, что противник руководился непосредственно из Москвы.

Благодаря этой перегруппировке сил 13-й полицейский полк «СС» был полностью освобожден и снят с южной линии заграждения. Он был в течение 6 и 7.06.1943 года придан опергруппе «Север».

Заградгруппа «Юг» получила от меня приказ с 7.06.1943 г. начать наступление с юга и юго-востока на север при одновременном недопущении прорыва противника на восток. Наступление заградгруппы «Юг» проводилось напрямик и планомерно до достижения большой болотистой местности севернее озера Палик. Благодаря умелому руководству командира заградгруппы полковника Кинцеля удалось даже и в этой сильно заболоченной местности пройти сравнительно быстро вперед. Частично ожесточенные бои, при которых противник нес кровавые потери в людях, оружии и материале. Я сам лично убедился в трудностях наступления заградгруппы «Юг», которые созданы природой, укреплениями и минированием.

С 18.06.1943 г. было очищено кольцо окружения дороги Бегомль—Лепель до большой болотистой местности (Фере/86/72 — Пристан/84/64/ — Могилки/88/56/ — Ямск/96/62/ — Ровница/94/70/). Остатки окруженной банды отошли на болотистый остров. Этот остров можно было достичь только по немногим сильно заминированным тропам, которые противник держал под огнем.

В этом месте я хочу указать на то, что при наступлении заградгруппы «Зюд» авиация действовала превосходно. Особенно было эффективно действие сбрасываемых над болотом мелкокалиберных бомб. Для проведения наступления в основном кольце окружения я усилил заградгруппу «Юг» одним батальоном и батареей. Наступление, назначенное на 19.06, было мною перенесено на 20.06.1943 г. Часть находящихся в кольце бандитов под руководством большевистского командира бригады Коли (кличка) в ночь с 19 на 20.06.1943 г. предприняла попытку к прорыву, которая была отбита. При этом погиб командир бригады Коля, который осенью прошлого года был назначен московской централью на руководство различными силами банд в Белоруссии. Находящиеся в кольце банды были через голод и преследование деморализованы так, что они больше не думали об упорном сопротивлении. Так, в течение с 20 по 21.06.1943 г. удалось очистить кольцо, и в 24.00 21.06.1943 г. я приказал окончить операцию «Коттбус».

5. **Настроение, выдержка и боевое качество войск.**

6. **Противник.**

7. **Опыты действий**. Захват людей и скота часто затруднялся тем, что необходимые для этого команды, несмотря на своевременное затребование, прибывали с опозданием. Если они прибывали, то требовали сильной охраны, которую нельзя было дать и в которой не было нужды. Необходимо заботиться о том, чтобы в наших командах по захвату рабочей силы и скота были решительные командиры.

8. **Боевые навыки**. Минирование многих дорог и стежек делает необходимостью изготовление вспомогательных приспособлений для розыска мин. Создание батальоном Дирлевангера приспособления для розыска мин хорошо оправдало себя. Из этого следует, что при операции необходимо исключить всякое человеческое влияние к населению, как в операции «Коттбус», ибо постоянно приходилось устанавливать, что местное население, также женщины и дети, постоянно минировали дороги в тылу наших частей...

9. Результаты операции «Коттбус»:

Потери противника:	погибло в бою	6084
	уничтожено	3709
	пленено	599
Захвачено рабочей силы:	мужской пол	4997
	женский пол	1056

Наши потери:

немцы: убито 5 офицеров (в т.ч. 1 ком. б-на)
83 унтер-офицера и солдата
ранено 11 офицеров (в т.ч. 2 ком. полка)

374 унтер-офицера и солдата
пропали без вести 3
иностранцы: убито 40, ранено 152, пропало без вести 4.

Трофеи:

Разрушено: 194 бандитских лагеря, частью состоявших из блока домов с пекарнями, бойнями, складами зерна и т. д., 422 бункера. Захвачено сельскохозяйственных продуктов:

3262 коровы
2182 овцы
904 лошади
153 свиньи
1618 кож разных видов
684 тонны зерна
24 тонны картофеля
38 центнеров льняного семя
70 центнеров муки
3 центнера водки
2 мешка льна
2 мешка льняных ниток

П. П. фон Готтберг «СС» — бригаденфюрер и генерал-майор полиции

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Л. 317—321.

Падрыхтавала да друку Р. А. Чарнаглазава

Вызваленне

Лепельшчына была вызвалена войскамі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў у ходзе праводзімых на першым этапе аперацыі «Баграціён» Віцебска-Аршанскай (23—28 чэрвеня), Полацкай (29 чэрвеня—4 ліпеня) і Мінскай (29 чэрвеня—4 ліпеня 1944 г.) наступальных аперацый.

«Вызвален 28 чэрвеня 1944 года войскамі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў у ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі.

1-ы Прыбалтыйскі фронт: 43-яя армія — 1-ы стралковы корпус (генерал-лейтэнант М.А. Васільеў) у складзе: частка сіл 306-ай стралковай дывізіі (генерал-маёр М.І. Кучаравенка), 357-ая стралковая дывізія (генерал-маёр А.Г. Кудраўцаў), 10-ая гвардзейская танкавая брыгада (палкоўнік М.У. Волкаў), 39-ая гвардзейская танкавая брыгада (палкоўнік І.П. Калінін), 1203-і сапёрны батальён (палкоўнік А.І. Сяроў); 3-яя паветраная армія — 211-ая штурмавая авіяцыйная дывізія (палкоўнік П.М. Кучма); частка сіл 335-ай штурмавой авіяцыйнай дывізіі (палкоўнік С.С. Аляксандраў), 259-ая знішчальная авіяцыйная дывізія (палкоўнік Я. А. Курбатаў).

3-і Беларускі фронт: 7-ая гв. мехбрыгада (палкоўнік М.І. Радзівонаў), 3-і гв. механізаваны корпус (генерал-лейтэнант танкавых войск В.Ц. Абухаў)». (*З кн.: Освобождение городов. Справочник по освобождению городов в период Великой Отечественной войны 1941—1945 гг. М., 1985. С. 139, 140.*)

Баявыя дзеянні вялі злучэнні 2-га гвардзейскага стралковага корпуса 6-ай гвардзейскай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту, 215-ая стралковая дывізія 5-ай арміі і 3-га Беларускага фронту.

Раніцай 23 чэрвеня 1944 года войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту нечакана для гітлераўцаў перайшлі ў наступленне. Пераадольваючы супраціўленне ворага, злучэнні 6-ай гвардзейскай і 43-яй армій у першы дзень аперацыі зламалі іх абарону на поўнач ад Віцебска. Яны прадзвінуліся на 12—16 кіламетраў і вызвалілі 185 населеных пунктаў. 25 чэрвеня войскі 43-яй арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту і 39-ай арміі (генерал І.І. Людніка ў) 3-га Беларускага фронту з баямі злучыліся ў раёне Гняздзілавічаў. У акружэнне трапілі пяць пяхотных дывізій 3-яй нямецкай танкавай арміі.

Бой за г. Лепель, чэрвень 1944 г.

Імкнучыся затрымаць наступленне савецкіх войск, праціўнік уводзіў усё новыя сілы. На Полацкім і Лепельскім напрамках супраць 1-га Прыбалтыйскага фронту былі кінуты 290-ая, 81-ая і 212-ая пяхотныя дывізіі. Але перашкодзіць наступленню савецкіх войск было ўжо немагчыма.

...У ноч на 28 чэрвеня часці 3-га гвардзейскага механізаванага корпуса, 306-ай і 357-ай стралковых дывізій завязалі бой на подступах да Лепеля. Першымі ў гэты дзень у 7 гадзін раніцы ў горад з поўдня і ўсходу на вялікай хуткасці ўварваліся танкісты 10-ай гвардзейскай танкавай брыгады з дэсантам аўтаматчыкаў і байцы 7-ай гвардзейскай механізаванай брыгады, а ў хуткім часе — часці 357-ай стралковай дывізіі. Баі ішлі за кожны дом. Гітлераўцы ўпарта супраціўляліся, але да 10 гадзін горад быў поўнасцю ачышчаны ад акупантаў.

У баях за вызваленне горада Лепеля прымалі ўдзел 357-ая стралковая дывізія (камандзір генерал-маёр Аляксандр Георгіевіч Кудраўцаў), 306-ая стралковая дывізія (камандзір генерал-маёр Міхаіл Іванавіч Кучаравенка), 10-ая асобная гвардзейская брыгада (камандзір палкоўнік Мікалай Уладзіміравіч Волкаў), 39-ая асобная гвардзейская танкавая брыгада (камандзір палкоўнік Мікалай Міхайлавіч Лебедзеў), 7-ая гвардзейская механізаваная брыгада (камандзір Міхаіл Іосіфавіч Радзівонаў), 326-ы гвардзейскі мінамётны полк (камандзір падпалкоўнік Іван Васільевіч Калошын), 1203-і самаходна-артылерыйскі полк (камандзір падпалкоўнік Аляксандр Іванавіч Сяроў).

Непасрэдную дапамогу наземным войскам аказвалі 211-ая, часткова 335-ая штурмавыя і 259-ая знішчальная авіяцыйныя дывізіі 3-яй паветранай арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту.

Значную ролю ў ходзе наступальных аперацый адыгрывалі партызаны. Так, на Віцебскім напрамку важныя разведданыя паступалі ў штабы 43-яй, 39-ай і 4-ай ударных армій ад аператыўнай групы БШПР пры Ваенным Савеце 43-яй арміі, якую ўзначальваў маёр А.Е. Паўлючэнкаў. Аператыўная група ўстанавіла радыёсувязь з усімі брыгадамі Полацка-Лепельскай зоны і рэгулярна перадавала ў штабы армій разведзвесткі, атрыманыя партызанамі і падпольшчыкамі. Штаб 39-ай арміі атрымаў ад гэтай групы наступнае данясенне: «22 верасня 1943 г. на Віцебск праследавала 5 эшалонаў. У Віцебску будуюцца на паўднёвай і паўднёва-ўсходняй ускраінах дзоты і акопы». З партызанскай брыгады імя А.Ф. Данукалава былі перададзены звесткі аб тым, што ў Віцебск прыбыло каля сотні самалётаў, большасць з іх знішчальнікі. Разведчыкі партызанскай брыгады імя К.К. Ракасоўскага (камандзір А.В. Раманаў) паведамілі, што ў Уле базіруецца 70—80 самалётаў, аэрадром прыкрываюць тры зенітныя батарэі...

Вырваўшыся з варожага акружэння, папоўніўшы боезапасы, партызаны зноў развярнулі актыўныя дзеянні, наносілі адчувальныя ўдары па гітлераўцах. Брыгада імя А.Ф. Данукалава знішчыла 175 і ўзяла ў палон 236 варожых салдат і афіцэраў. Партызаны ўтрымлівалі адзіную шасэйную дарогу з Віцебска праз Лепель, Беразіно на захад, дзейнічалі на чыгункі, нападалі на гітлераўцаў з засад.

У баях за вызваленне раёна вызначыліся шмат савецкіх воінаў і партызан. Сярод іх Герой Савецкага Саюза гвардыі радавы, сапёр 62-га асобнага гвардзейскага матарызаванага сапёрнага батальёна 3-га гвардзейскага механізаванага корпуса Віктар Сідаравіч Кладзіеў. Ураджэнец Белгародскай вобласці аддаў жыццё за вызваленне беларускай зямлі 30 чэрвеня 1944 года, у час навядзення пераправы цераз раку Бярэзіна на шляху Лепель—Бягомль. Ён пахаваны ў вёсцы Крайцы.

У горадзе Лепелі пахаваны астанкі Героя Савецкага Саюза камандзіра парты-

занскай брыгады «Аляксея» А.Ф. Данукалава.

Ураджэнцы Лепельшчыны змагаліся з гітлераўцамі на розных франтах вайны. Пяць з іх удастоены звання Героя Савецкага Саюза: Іван Міхайлавіч Яршоў, Вячаслаў Антонавіч Квіцінскі, Мікалай Мікалаевіч Тамашэвіч, Іван Мікітавіч Туфтоў, Павел Уладзіміравіч Ялугін.

З вёскі Занькі пайшоў на фронт Фёдар Пятровіч Занько. Вярнуўся з вайны поўным кавалерам ордэна Славы.

Р.А. Чарнаглазава

Зводкі Саўінфармбюро паведамлялі

25 чэрвеня 1944 г.

На працягу 25 чэрвеня на захад ад Віцебска нашы войскі, разгортваючы наступленне, фарсіравалі р. Заходняя Дзвіна на фронце 30 км і з баямі занялі больш 150 населеных пунктаў. На ўсход ад Бешанковіч нашы войскі перарэзалі шашу Віцебск—Лепель.

26 чэрвеня 1944 г.

...На Аршанскім напрамку нашы войскі з баямі прасоўваліся наперад і авалодалі раённымі цэнтрамі Віцебскай вобласці — горадам Дуброўна, горадам і буйной чыгуначнай станцыяй Талачына, а таксама занялі больш 400 населеных пунктаў, у тым ліку і чыгуначную станцыю Стайкі, Юрцава, Смаляны, Лемніца. Нашы войскі перасеклі шашу і чыгункі Орша—Барысаў і Орша—Лепель.

На захад і паўднёвы захад ад Віцебска нашы войскі, разгортваючы наступленне, авалодалі раённым цэнтрам Віцебскай вобласці горадам Бешанковічы і з баямі занялі больш 700 іншых населеных пунктаў, у тым ліку г. Улу, буйныя населеныя пункты Обаль, Бачэйкава, Каміншчына, Алексінічы, Чарэя і чыгуначныя станцыі Княжніца, Обаль на чыгункі Віцебск—Полацк.

27 чэрвеня 1944 г.

...На Лепельскім напрамку нашы войскі з баямі прасоўваліся наперад і авалодалі раённым цэнтрам Чашнікі, а таксама захапілі больш 200 іншых населеных пунктаў, сярод якіх буйныя населеныя пункты Усвея, Усая, Хоціна, Батукалава, Камень, Мядзвецк, Козанаўка, Лукомль і чыгуначныя станцыі Вятны, Чашнікі.

28 чэрвеня 1944 г.

На працягу 28 чэрвеня на поўдзень ад Полацка нашы войскі, пераадольваючы супраціўленне і інжынерныя камунікацыі праціўніка, у міжазёрных дэфіле, вялі наступальныя баі, у ходзе якіх авалодалі раённым цэнтрам Віцебскай вобласці горадам Лепелем, а таксама занялі больш 100 іншых населеных пунктаў, і сярод іх Чарніцы, Краснае, Зацечча, Зямцы, Замошша, Старое Лядна, Вялікае Поле.

Сообщения Совинформбюро. М., 1945. Т. 7. С. 4—11.

Яны вызвалялі Лепельшчыну

З успамінаў Маршала Савецкага Саюза А.М. Васілеўскага

Да распрацоўкі канкрэтнага плана правядзення Беларускай аперацыі і плана летняй кампаніі 1944 г. увогуле Генштаб ушчыльную прыступіў у красавіку 1944 г. У аснову была пакладзена задума, якой прадугледжвалася магутнымі сыходнымі ўдарамі па флангах беларускага выступу — з поўначы ад Віцебска цераз Барысаў на Мінск і з поўдня цераз Бабруйск таксама на Мінск — разграміць галоўныя сілы нямецкай групы арміі «Цэнтр», якія зна-

ходзіліся пасярэдзіне выступу на ўсход ад Мінска. Меркавалася, што паспяховае выкананне задумы дазволіць поўнасцю вызваліць тэрыторыю Беларусі.

Для разгрому групы арміі «Цэнтр» Стаўка лічыла неабходным прыцягнуць войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту (камандуючы генерал арміі І.Х. Баграмян), 3-га Беларускага (камандуючы генерал-палкоўнік, затым генерал арміі І.Д. Чарняхоўскі), 2-га Беларускага (генерал арміі Г. Ф. Захараў) і 1-га Беларускага франтоў (маршал К.К. Ракасоўскі), Дняпроўскую ваенную флатылію, буйныя сілы партызан.

Планам прадугледжваўся адначасовы пераход у наступленне на Лепельскім, Віцебскім, Багушэўскім, Аршанскім, Свіслацкім і Бабруйскім напрамках з тым, каб магутнымі, нечаканымі для ворага ўдарамі раздрабніць яго стратэгічны фронт абароны, акружыць і знішчыць нямецкія групоўкі ў раёне Віцебска і Бабруйска, пасля чаго, імкліва разгортваючы наступленне ўглыбіню, акружыць і разграміць войскі 4-ай нямецкай арміі на ўсход ад Мінска, што стварыла б спрыяльныя ўмовы для развіцця аперацыі ўсіх чатырох франтоў.

30 мая Стаўка канчаткова зацвердзіла план аперацыі «Баграціён». Канфігурацыя фронту ў Беларусі ўяўляла сабой да таго часу вялікі выступ на ўсход плошчай каля 250 тысяч квадратных кіламетраў, які велічэзнай дугой абгінаў Мінск. Галоўная паласа варожай абароны праходзіла па лініі Віцебск — Орша — Магілёў — Рэчыца — Жлобін — Бабруйск. Асабліва ўмацаваны былі раёны Віцебска і Бабруйска. Моцную абарону група арміі «Цэнтр» мела таксама на Аршанскім і Магілёўскім напрамках. Г.К. Жукаў і А.М. Васілеўскі былі прызначаны прадстаўнікамі Стаўкі для каардынацыі дзеянняў 1-га і 2-га Беларускіх, 3-га Беларускага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў.

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання планавала наступны план развіцця аперацыі. Намаганні 1-га Прыбалтыйскага фронту накіраваць цераз Полацк, Глыбокае, Швянчоніс (Свянцяны) — на Шауляй, адсякаючы нямецкую групу арміі «Поўнач» ад групы «Цэнтр», і, выйшаўшы на Балтыку ў раёне Клайпеды, войскі 3-га Беларускага фронту пасля разгрому ворага ў раёне Віцебска і Оршы і ўдару на Барысаў накіраваць цераз Мінск, Маладзечна, Вільнюс, Каўнас, Ліду і Гродна да граніц Усходняй Прусіі. Адпаведныя ўказанні атрымалі 1-ы і 2-і Беларускія франты.

Адпаведна з дырэктывай Стаўкі ад 31 мая 1944 г., 3-і Беларускі фронт з левым крылом 1-га Прыбалтыйскага фронту і войскамі 2-га Беларускага фронту павінны былі разграміць віцебска-аршанскую групоўку ворага. Для гэтай мэты прадугледжвалася нанесці два ўдары: адзін 39-ай і 5-ай арміямі на поўначы фронту, прычым 39-ая, абыходзячы Віцебск з паўднёвага захаду, ва ўзаемадзеянні з левым крылом 1-га Прыбалтыйскага фронту павінна была разграміць віцебскую групоўку ворага і авалодаць Віцебскам, а пятая — цераз Багушэўск, Сянно і Лукомль прабівацца па верхнім цячэнні р. Бярэзіны, другі ўдар — 11-ай гвардзейскай і 31-ай арміямі, разграміўшы аршанскую групоўку ворага, развіваць наступленне ўздоўж мінскай аўтастрады на Барысаў.

Другі эшалон фронту складалі рухомыя злучэнні: 3-і гвардзейскі мехкорпус, 3-і гвардзейскі кавалерыйскі корпус, а ў далейшым і 5-ая гвардзейская танкавая армія; у 11-ай гвардзейскай арміі — 2-і танкавы Тацынскі корпус. Згодна з дырэктывай Стаўкі ад 31 мая, камандаванню 1-ым Прыбалтыйскім фронтам на першым этапе стратэгічнай Беларускай аперацыі прыказвалася ва ўзаемадзеянні з 3-ім Беларускім фронтам разграміць віцебска-лепельскую групоўку праціўніка і выйсці на паўднёвы бераг Заходняй Дзвіны ў раёне Чашнікі — Лепель, для чаго сіламі 6-ай гвардзейскай і 43-яй армій прарваць абарону праціўніка на паўднёвым захадзе ад Гарадка. Войскі абавязаны былі фарсіраваць Заходнюю Дзвіну, авалодаць раёнам Бешанковічы; часткаю сіл ва ўзаемадзеянні з правым крылом 3-га Беларускага фронту разграміць віцебскую групоўку і вызваліць Віцебск, у далейшым разгортваць наступленне ў агульным напрамку на Лепель.

Камандаванне фронту вырашыла прарваць нямецкую абарону на стыку 16-ай і

3-яй танкавай нямецкіх армій (групы «Поўнач» і «Цэнтр»). Да месца прарыву сканцэнтроўваліся 6-ая гвардзейская, галоўныя сілы 43-яй арміі, рэзервы, 1-ы танкавы корпус. Галоўны ўдар вырашылі наносіць сумежнымі флангамі армій у агульным напрамку Бешанковічы—Лепель з бліжэйшай задачай прарваць абарону, разграміць віцебскую групоўку ворага, фарсіраваць з ходу Заходнюю Дзвіну і авалодаць плацдармам.

У далейшым разгортваць наступленне галоўнымі сіламі на захад, разграміўшы лепельскую групоўку, з ходу авалодаць Лепелем, а ўдарам часткі сіл уздоўж правага берага Заходняй Дзвіны адсячы войскі 16-ай арміі ад войскаў 3-яй танкавай арміі. Гэтую задачу павінны былі выканаць войскі 43-яй арміі ва ўзаемадзеянні з 39-ай арміяй 3-га Беларускага фронту.

Войскі 6-ай і 43-яй гвардзейскіх армій ноччу на 28 чэрвеня авалодалі г. Лепель і выйшлі на фронт Астраўляны, м. Ушачы, Старое Сяло, Лепель, прасунуўшыся за 28 чэрвеня на 15—25 кіламетраў.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Василевский А.М. Дело всей жизни. Воспоминания. Т. 2. М.: Политиздат, 1988. С. 119—148.

З успамінаў Маршала Савецкага Саюза І.Х. Баграмяна

1-му Прыбалтыйскаму фронту ў аперацыі па вызваленні Беларусі належала сіламі 6-ай, 11-ай гвардзейскіх і 43-яй армій, 1-га танкавага і 3-га гвардзейскага кавалерыйскага карпусоў прарваць абарону праціўніка на паўночны захад ад Віцебска, фарсіраваць Заходнюю Дзвіну і, прыкрываючыся з боку Полацка 4-ай ударнай арміяй, наступаць галоўнымі сіламі ў напрамку Лепель—Докшыцы—Маладзечна, а часткай сіл — у напрамку Сянно ва ўзаемадзеянні з войскамі 3-га Беларускага фронту. У далейшым змянілася задача 1-га Прыбалтыйскага фронту. Калі па першапачатковых планах войскі фронту павінны былі пасля выканання бліжэйшай задачы наносіць глыбокі ўдар у паўднёва-заходнім напрамку на Маладзечна, то цяпер ім належала наступаць на захад, у паласе на поўдзень ад Заходняй Дзвіны.

31 мая мы атрымалі дырэктыву Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання, згодна з якой войскам фронту трэба было ва ўзаемадзеянні з 3-ім Беларускім фронтам фарсіраваць р. Заходняя Дзвіна і авалодаць раёнам Бешанковічы. Часткай сіл ва ўзаемадзеянні з правым крылом 3-га Беларускага фронту разграміць віцебскую групоўку праціўніка і авалодаць г. Віцебскам. Далей разгортваць наступленне ў агульным напрамку на Лепель, трывала забяспечваючы галоўную групоўку фронту з Полацкага напрамку.

Для выканання гэтай задачы мы мелі ў распараджэнні тры агульнавайсковыя і адну паветраную арміі, адзін асобны стралковы і адзін танкавы карпусы франтавога падпарадкавання. На чале іх стаялі надзейныя, выпрабаваныя ў бітвах генералы, і я сказаў бы, па-сапраўднаму таленавітыя военачальнікі.

4-ай ударнай арміяй камандаваў генерал-лейтэнант П.Ф. Малышаў. 6-ую гвардзейскую армію ўзначальваў генерал-лейтэнант І.М. Чысцякоў.

Войскамі 43-яй арміі кіраваў самы малады з камандзіраў па ўзросту, але не па баявому вопыту генерал-лейтэнант А.П. Белабародаў. Стройны, падцягнуты, невысокага росту генерал здзіўляў сваёй невычарпальнай энергіяй і смеласцю рашэнняў.

3-яй паветранай арміяй камандаваў вопытны военачальнік генерал Н.Ф. Папівін. Першы танкавы корпус узначальваў генерал В.В. Буткоў.

Было вядома, што праціўнік у паласе наступлення, якое павінна было адбыцца, мае 12 дывізій, 2 дывізіённыя групы, 10 асобных ахоўных палкоў і звыш 40 батальёнаў рознага прызначэння. Асноўная частка гэтых войск групавалася ў раёне Полацк—Лепель—Глыбокае (70 км на паўночны захад ад Лепеля). Большая частка рэзерваў 3-яй танкавай арміі знаходзілася ў паласе наступлення нашага фронту.

Акрамя другой абарончай паласы, углыбіні праціўнік падрыхтаваў рубяжы на левым беразе Заходняй Дзвіны і на лініях Полацк—Лепель і Даўгаўпілс (Дзвінск) — возера Нарач. Асабліва непакоіла Заходняя Дзвіна, якую войскі павінны былі фарсіраваць у ходзе наступлення, а таксама раён паміж Полацкам і Лепелем, моцна перасечаны лясіста-балотнымі масівамі.

Галоўны ўдар наносіўся сумежнымі флангамі 6-ай гвардзейскай і 43-яй армій у агульным напрамку на Сіроціна, Шуміліна, Бешанковічы, Лепель. Бліжэйшая задача — разграміць віцебскую групоўку. Далей мелася на ўвазе разграміць лепельскую групоўку гітлераўцаў.

25 чэрвеня, на зыходзе дня, дывізіі 60-га стралковага корпуса злучыліся на пойдзень ад Гняздзілавіч з часцямі 39-ай арміі 3-га Беларускага фронту. Гэта была перамога. Было зразумела, што віцебская групоўка гітлераўцаў асуджана на разгром. Таму я загадаў генералу Белабародаву пакінуць для ўдзелу ў ліквідацыі ворага толькі частку войск арміі, а галоўнымі сіламі разгортваць поспех на Лепель, для вызвалення якога генералу Белабародаву было загадана стварыць армейскую рухомую групу. Пачаўшы пераправу на захоплены плацдарм, часці 1-га танкавага корпуса я вырашыў накіраваць не на Лепель, як прадугледжвалася, а на Камень і далей на Ушачы, г. зн. на паўночны захад, з мэтай перахвату чыгункі Полацк — Маладзечна. У гэты час 1-ы стралковы корпус і рухомая група 43-яй арміі імкліва наступалі на Лепель, на падыходзе да якога разгарэўся жорсткі бой. І зноў байцы і камандзіры праявілі выключны гераізм. Калі фашысцкія часці спрабавалі прабіцца на Лепель, іх атакаваў з тылу 1-ы стралковы корпус. Нашы байцы, якія наступалі ўздоўж шашы Віцебск — Лепель, паўсталі на шляху гітлераўцаў.

Эфектыўную падтрымку пяхоце аказалі лётчыкі генерала Папівіна. Яны ператварылі шашу Віцебск — Лепель з дарогі адступлення ў «дарогу смерці», як назвалі яе палонныя немцы. Сапраўды, уся шаша ад Каменя да Лепеля ўяўляла суцэльны магільнік тэхнікі, трупаў варожых салдат і афіцэраў.

Разграміўшы прарваўшыеся з усходу на захад групы праціўніка, часці 1-га стралковага корпуса і армейскай рухомай групы з ходу ўварваліся ў Лепель і на зыходзе 28 чэрвеня цалкам ачысцілі яго ад ворага.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Освобождение Белоруссии. 1944. М., 1974. С. 111, 115—117, 129—131.

А.П. Белабародаў — генерал-лейтэнант, двойчы Герой Савецкага Саюза

З успамінаў генерал-лейтэнанта А.П. Белабародава

БЕЛАБАРОДАЎ Афанасій Паўлавіч, нарадзіўся 31 студзеня 1903 г. у в. Акініна, цяпер Іркуцкага раёна Іркуцкай вобласці, у сям'і селяніна. Рускі. Член партыі з 1926 г. Закончыў 3 класы сярэдняй школы. У Савецкай Арміі ў 1919—1920 гг. і з 1923-га. Закончыў Ніжагародскую пяхотную школу ў 1926 г., ваенна-палітычныя курсы — у 1929 г., Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе — у 1936 г. Удзельнічаў у баях на КВЖД у 1929 г.

На франтах Вялікай Айчыннай вайны з кастрычніка 1941 г. Камандаваў стралковай дывізіяй, карпусамі. З 1944 г. — 43-яй арміяй.

За ўмелае камандаванне войскамі пры прарыве абароны праціўніка ў раёне Віцебск — Полацк і фарсіраванні р. Заходняя Дзвіна 22.07.1944 г. генерал-лейтэнанту Белабародаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Войскі арміі пад яго кіраўніцтвам праславіліся таксама пры ліквідацыі групоўкі праціўніка на паўночны захад ад Кёнігсберга (Калінінград) і ў баях пры авалоданні горадам.

19.04.1945 г. генерал-лейтэнант Белабародаў узнагароджан другой медаллю «Залатая Зорка».

Пасля вайны — начальнік курсаў «Выстрал». У 1957—1963 гг. — начальнік Галоўнага ўпраўлення кадраў Міністэрства абароны СССР. У 1963 г. — генерал арміі. У 1963—1968 гг. — камандуючы войскамі МВА. З 1968 г. — у групе генеральных інспектараў МА СССР. Член КПСС. У 1966—1971 гг. — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР трэцяга, сёмага скліканняў.

Узнагароджан чатырма ордэнамі Леніна, пяццю ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Суворова I і II ступені, Кутузава II ступені, Айчыннай вайны I ступені, медалямі і замежнымі ордэнамі.

Бронзавы бюст героя ўстаноўлены ў г. Іркуцку.

Танкавае падмацаванне складалі 10-ая гв. танкавая брыгада палкоўніка М.У. Волкава і 39-ая гв. танкавая брыгада пад камандаваннем палкоўніка І.П. Калініна.

У 43-яй арміі работы па матэрыяльна-тэхнічнаму і медыцынскаму забеспячэнню аперацыі ўзначальваў член Ваеннага Савета па тылу генерал-маёр Н.Л. Осін, аўтамабільную службу ўзначальваў палкоўнік І.І. Удовікаў. Ва ўмовах 43-яй арміі ажыццяўляць падвоз ваенных грузаў было вельмі складана, недастатковая сетка дарог у паласе арміі, недастатковая колькасць машын. У распараджэнні І.І. Удовікава быў толькі 1 аўтамабільны батальён, і гэта ў перыяд падрыхтоўкі аперацыі. Але работа застаўшыхся ў распараджэнні І.І. Удовікава аўтамашын была спланавана і ажыццяўлялася так дакладна і тэхнічна, што, нягледзячы на недахоп аўтатранспарту, задачы падвозу былі паспяхова выкананы. У ходзе наступлення аўтамабілісты таксама аказаліся на вышыні. Па меры прасоўвання арміі наперад аўтаддзел праводзіў вялікую работу па зборы і выкарыстанні трафейных аўтамабіляў. Ужо ў раёне Лепеля было сабрана каля 50 грузавых аўтамабіляў, палова з якіх адразу ж была пушчана ў ход. У ноч на 25 чэрвеня пачаўся апошні, трэці этап Віцебскай аперацыі, у час якога войскі 43-яй арміі ва ўзаемадзеянні з 39-ай арміяй 3-га Беларускага фронту завяршылі акружэнне праціўніка і ліквідацыю віцебскай групоўкі праціўніка. Дзеянні ўскладняліся тым, што войскам арміі прыйшлося весці баі на знешнім і ўнутраным франтах акружэння пры значным разрыве паміж імі. У сувязі з гэтым было прынята рашэнне арганізаваць дапаможны пункт кіраўніцтва войскамі, якія наступалі на Лепель.

Нямецкае камандаванне ў ноч на 25 чэрвеня пачало адвод войскаў з раёна Віцебска на захад і паўднёвы захад. Яны імкнуліся, што б там ні было, утрымаць дарогу Віцебск — Бешанковічы. Гэтым вызначаўся жорсткі характар баёў 25—27 чэрвеня. Для ўдзелу ў акружэнні ворага ў раёне Віцебска былі вылучаны ад 43-яй арміі 60-ы, 92-і стралковыя карпусы, 179-ая стралковая дывізія 1-га стралковага корпуса. На знешнім фронце наступалі 306-ая і 357-ая стралковыя дывізіі і армейская рухомая група ў складзе 10-ай і 39-ай гвардзейскіх танкавых брыгад. 25 чэрвеня праціўнік аказаўся ў акружэнні, але імкнуўся вырвацца з акружэння, і 25—26 чэрвеня 60-ы і 92-і стралковыя карпусы пры ўзаемадзеянні 39-ай арміі 3-га Беларускага фронту вялі напружаныя баі з мэтай рассячэння і ліквідацыі віцебскай групоўкі праціўніка. У ноч на 26 чэрвеня часці 43-яй і 39-ай армій авалодалі горадам Віцебскам.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Освобождение Белоруссии. 1944. М.: Наука, 1974. С. 319, 320, 334, 340.

З успамінаў Маршала Савецкага Саюза М.І. Крылова

КРЫЛОЎ Мікалай Іванавіч, нарадзіўся 29 красавіка 1903 года ў с. Галяеўка, цяпер Вішнёвае Тамалінскага р-на Пензенскай вобл., у сям'і служачага. Рускі. Адукацыя сярэдняя. Член партыі з 1927 года, у Савецкай Арміі з 1919 года. Скончыў пяхотна-кулямётныя курсы чырвоных камандзіраў у 1920 г., курсы «Выстрал» — у 1928 г.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. Начальнік аператыўнага аддзела штаба, начальнік штаба Прыморскай арміі. З верасня 1942 г. — начальнік штаба 62-ой арміі, з чэрвеня 1943 года камандаваў 21, 5, 5-ай гвардзейскай танкавай арміямі, якія ўдзельнічалі ў Беларускай, Усходне-Прускай аперацыях і ў разгроме Квантунскай арміі ў перыяд савецка-японскай вайны.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, 19.04.1945 г. генерал-палкоўніку М.І. Крылову прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. 8.09.1945 г. за ўмелае камандаванне арміяй у баях з японскімі мілітарыстамі ўзнагароджан другім медалём «Залатая Зорка».

Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі, у 1963—1972 г. — галоўнакамандуючы Ракетнымі войскамі стратэгічнага прызначэння, намеснік міністра абароны СССР.

Узнагароджан 5 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, 4 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава I ступені, ордэнам Кутузава I ступені, ганаровай зброяй, замежнымі ордэнамі, медалямі.

Памёр у 1972 г. Пахаваны на Краснай плошчы ля Крамлёўскай сцяны.

28 чэрвеня 1944 года перадавыя часці 5-ай арміі падышлі блізка да Бярэзіны. Правафланговая 7-ая гвардзейская мехбрыгада 3-га гвардзейскага Сталінградскага мехкорпуса, праследуючы часці 201-ай нямецкай ахоўнай дывізіі, гнала іх у балота возера Плаўна, дзе з поўначы з боку Мядзвёдаўкі і Зацяклясся ім наносілі адчувальныя ўдары атрады 1-ай Смаленскай партызанскай брыгады пад камандаваннем камандзіра У.І. Целішчэўскага, камісара І.Х. Вайзуліна.

Цяпер стаяла незвычайна цяжкая задача — фарсіраваць Бярэзіну, шырока пакрытую непраходнымі лясамі, багністымі балотамі. Багністымі былі і берагі яе прытокаў.

На Бягомльскім напрамку наступала 277-ая стралковая дывізія. Перадавы атрад дывізіі пад камандаваннем капітана І.П. Луева да гэтага часу выйшаў да Бярэзіны. Але з боку Кальніка, Бабцаў і на поўдзень ад моста быў спынены агнём праціўніка. 4-ая стралковая рота 850-га стралковага палка, якой кіраваў ст. лейтэнант Шчукін, дзве гадзіны вяла бой за шасэйны мост, але захапіць яго так і не змагла. Пры падыходзе да Бярэзіны батальён капітана І.П. Луева сустрэў разведчыкаў аднаго з атрадаў партызанскай брыгады «Жалязняк», якія былі накіраваны камандаваннем для сустрэчы часцей Чырвонай Арміі.

Рэшткі Лепельскага гарнізона і адышоўшых з-пад Віцебска часцей, а таксама 720-ы пяхотны і 391-ы ахоўны палкі абаранялі Кальнік, Бабцы і астравок на поўдзень ад шасэ. Зразумела, што ў гэтай з багністымі балотамі мясцовасці, у раёне шасэйнага моста Бярэзіну фарсіраваць не ўдасца, і трэба гэтыя месцы абысці з дапамогай партызан і ўдарыць з фланга і тылу. Камандзір 277-ай стралковай дывізіі загадаў 854-му стралковаму палку наступаць уздоўж шашы Лепель — Бягомль і актыўнымі дзеяннямі скоўваць праціўніка, 850-му стралковаму палку — рухацца 2—3 км на поўнач ад шасэ, прайсці па балотах да Бярэзіны і там у раёне на поўнач ад Кальніка фарсіраваць яе галоўнымі сіламі дывізіі.

У тую ж раніцу партызанскімі сцежкамі, патанаючы па калена ў балотнай жыжцы, 850-ы полк рушыў у абход нямецкай абароны. На гэтым напрамку Бярэзіна мае 4 забалочаныя пратокі, кожная каля 30 метраў. Першым ішоў другі батальён. Усю зброю, боепрыпасы, абмундзіраванне байцы неслі на сабе, аж да самых лёгкіх пераправачных сродкаў. Падышоўшы да першай пратокі, прыйшлося зрабіць паплаўкі з салдацкіх палатак, напаўняючы іх хворастам і звязваючы ў плыткі. Да асноўнага цячэння Бярэзіны дабраліся толькі вечарам, змарыліся, вядома. Капітан Луеў вывеў другі батальён на сухія астраўкі, а сам выйшаў з камандзірамі рот на бераг, паказаў ім месца знаходжання вёскі Кальнік і паставіў задачу. Пасля праверкі гатоўнасці кулямётаў ст. лейтэнанта Даніленкі і мінамётаў лейтэнанта Галавы, капітан Луеў загадаў пачаць фарсіраванне. Першымі ў ваду кінуліся старшы сяржант В. Іўякоў і І. Плотнікаў.

Апусціўся змрок, калі стралковыя роты ціха фарсіравалі Бярэзіну, быццам гром сярод яснага неба ўдарылі па ворагу. За батальёнам капітана Луева ноччу пераправіліся астатнія батальёны палка.

Партызаны брыгады «Жалязняк» на поўнач ад возера Палік захапілі пераправу цераз Бярэзіну, да падыходу часцей 35-ай танкавай брыгады генерала А.А. Асланава хутка навялі два масты, па якіх пераправіліся 35-ая танкавая брыгада, а таксама 8-ая і 9-ая гвардзейскія механізаваныя брыгады, якімі кіравалі палкоўнікі Крэмер і Гарачаў 3-га Сталінградскага мехкорпуса генерала В.Ц. Абухава.

Партызанскія брыгады Полацка-Лепельскай партызанскай зоны, пасля таго як частка партызан пайшла на папаўненне Чырвонай Арміі, пачалі ачышчаць лясы і балоты ад гітлераўцаў.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Освобождение Белоруссии. 1944. М.: Наука, 1970. С. 267—301.

З успамінаў былога начальніка штаба 7-ай механізаванай брыгады 3-га Сталінградскага корпуса палкоўніка М.В. Цвяткова

ЦВЯТКОЎ Мікалай Васільевіч, нарадзіўся ў 1906 г. у Верхняволжжы. Карэл. Скончыў прафтэхшколу. Працаваў слесарам-інструментальшчыкам на Сталінградскім трактарным заводзе.

У Чырвоную Армію быў прызваны па спецнаборы. Скончыў Саратаўскае танкавае вучылішча. У 1943 г. з пасады начальніка штаба 43-га гвардзейскага танкавага палка быў прызначаны начальнікам штаба 7-ай гвардзейскай механізаванай брыгады 3-га гвардзейскага мехкорпуса. Удзельнічаў у бітвах на Курскай дузе, пры фарсіраванні Дняпра, у аперацыі «Баграціён», у вызваленні Прыбалтыкі. Вайну закончыў на Далёкім Усходзе.

Узнагароджаны васьмю ордэнамі: Аляксандра Неўскага, Чырвонай Зоркі, у тым ліку двойчы ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны і медалямі.

Ганаровы грамадзянін горада Смаргоні (Гродзенская вобласць). Жыве ў Маскве.

Схема баявога шляху 7-ай механізаванай брыгады 3-га Сталінградскага механізаванага корпуса

У чэрвені 1944 г. наша брыгада ў саставе конна-механізаванай групы была ўведзена ў прарыў на ўчастку паміж Віцебскам і Оршай. У першы дзень наступлення брыгада з баямі прайшла 50 кіламетраў, вызваліўшы буйны населены пункт Сянно.

Вораг адступаў на Лепель, Барысаў. Гвардыі генерал-лейтэнант Абухаў атрымаў загад дзейнічаць у напрамку на Лукомль, Красналукі, Волакі, Плешчаніцы, з задачай выйсці да рэчкі Бярэзіна і фарсіраваць яе не пазней 28 чэрвеня на ўчастку Ліпск — Зембін, авалодаўшы раёнам Бягомль, Плешчаніцы, Мсціж.

Для забеспячэння дзеянняў корпуса з поўначы генерал Абухаў паставіў перад камандзірам 7-ай мехбрыгады гвардыі палкоўнікам М.І. Радзівонавым задачу авалодаць г. Лепелем і ўтрымліваць яго да падыходу пяхоты суседняга 1-га Прыбалтыйскага фронту.

26 чэрвеня пачалося наступленне 7-ай мехбрыгады з раёна Лукомля ў напрамку Лепеля. Лепель быў умацаваны ворагам. Яго абараняў 99 пяхотны полк немцаў. Вакол Лепеля былі створаны траншэі поўнага профілю і іншыя інжынерныя ўмацаванні. Таму задача авалодаць Лепелем была пастаўлена некалькім часцям. Усе яны рухаліся ў гэты раён.

На падыходзе да Лепеля брыгадзе прыйшлося пераадолець супраціўленне праціўніка на некалькіх участках. На паўночным захадзе ад Лукомля брыгада разграміла батальён 201-ай пяхотнай дывізіі немцаў. У в. Плаўнік было разбіта каля батальёна пяхоты і знішчана некалькі гармат і мінамётаў ворага. У гэтым баі загінуў ст. лейтэнант І.М. Філоненка. На поўнач ад в. Слідцы капітан Фірсаў з мінамёта і каля в. Бор капітан Ажгібекаў агнём перакрылі бальшак на Лепель. Батальён Алабушава захапіў Слідзец.

Двухкіламетровая паласа ўздоўж дарогі, захопленая танкамі палкоўніка Шалаева, ператварылася для адступаючага праціўніка ў пекла. Але пасля бою не прыйшлося доўга адпачываць. Уперадзе разведка натрапіла на абарону немцаў. Гітлераўцы займалі прамежкавыя рубяжы Данілаўка — Замошша, асядлаўшы зноў дарогу на Лепель. Атаку арганізавалі з ходу. Гітлераўцы бегалі па полі, многія здаваліся ў палон. Але ім усё ж удалося падбіць танк Л.І. Царэнкі. Машына выйшла са строю.

Брыгада з баямі ўсё бліжэй прасоўвалася да Лепеля. Перад вёскай Чэрцы ў засадзе сядзелі каля двухсот нямецкіх салдат. Але вораг быў своечасова выяўлены разведкай. У гэтым баі загінуў малодшы сяржант Коваль Мацвей Андрэевіч.

М.К. Шалаеў (другі злева) — палкоўнік, камандзір 43-га гвардзейскага танкавага палка

Пры выхадзе брыгады да вёскі Уцечча перадавы атрад сустрэў супраціўленне каля двухсот гітлераўцаў. У кароткім баі гэта група праціўніка часткова была знішчана, часткова рассеяна. У раёне вёсак Данілаўка, Забалацце было таксама разбіта не менш батальёна нямецкай пяхоты і захоплены палонныя.

З выхадам да Лепеля разведка данесла, што подступы да горада з паўднёвага ўсходу замініраваны і моцна абараняюцца праціўнікам. У раёне на захад ад в. Залессе праціўнік перакапаў дарогу, зрабіў суцэльныя завалы. Немцы прыкрывалі адзіную ў гэтым раёне шашу Лепель — Бягомль. Камандаванне брыгады прыняло рашэнне не наступаць на Лепель з паўднёвага ўсходу, а прайсці на працягу ночы лясамі справа і цераз Вялікае Жэжліна, Слабодку выйсці на паўночны ўсход ад Лепельскага возера і нечакана атакаваць гітлераўцаў з тылу. У той жа час разведроце была пастаўлена задача на світанку пачаць дэманстрацыю наступальных дзеянняў з паўднёвага ўсходу. Абмінуўшы Вялікае Жэжліна і Слабодку, брыгада выйшла на дарогу Камень — Лепель.

Зрабіўшы па бездарожжы цяжкі марш, мы думалі, што дасягнулі мэты і засталося толькі зрабіць паварот падраздзяленняў налева, каб пачаць наступленне на Лепель. Аднак мы памыліліся. Дзейнічаючая на правым флангу разведка данесла, што па дарозе з боку Бароўкі рухаецца аўтакалона праціўніка з пяхотай. Прыйшлося спыніць рух і разграміць аўтакалону.

Вызначыўся ў гэтым баі начальнік медыцынскай службы гвардыі маёр Бекоеў Тадыос Давыдавіч. Ён захапіў у палон немца, але, як толькі падышлі да шашы, гітлеравец пабег. За ім кінуліся старшыя сяржанты Фёдар Багуненка і Сяргей Цвяткоў. За пагоркам яны ўбачылі групу немцаў. Пераадолеўшы імгненную разгубленасць, яны ў адзін голас крыкнулі: «Хендэ хох!» Немцы, на здзіўленне, ускочылі, пакідалі зброю і паднялі рукі. Сяржанты ўзялі ў палон 30 фашысцкіх салдат. За гэты смелы ўчынак гвардыі старшы сяржант Фёдар Багуненка быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, гвардыі старшы сяржант Сяргей Цвяткоў — ордэнам Чырвонай Зоркі.

Перадавы атрад брыгады ў складзе танкаў, мотапяхоты, артылерыі і мінамётаў фарсіраваў р. Улу і за ноч выйшаў на паўночна-ўсходні ўскраек Лепеля.

З падыходам галоўных сіл на досвітку 28 чэрвеня 1944 г. брыгада разгарнулася і нечакана на вялікай хуткасці, без папярэдняй падрыхтоўкі атакавала гітлераўцаў з тылу. Разведчыкі капітана Шульжэнкі прайшлі лясамі да нямецкіх пазіцый з боку Сянно і пачалі адцягваць увагу праціўніка.

Нягледзячы на наяўнасць у горадзе і вакол яго ўмацаванняў, праціўнік не змог аказаць працяглага супраціўлення. Рота старшага лейтэнанта І.І. Плотнікава, атакуючы праціўніка, выйшла на камандны пункт камандзіра 99-га нямецкага пяхотнага палка. Немцы запанікавалі і пачалі адступаць. Атака была хуткай і нечаканай. Немцы не паспелі ўзарваць мост цераз р. Эсу. Мост захапіла рота старшага лейтэнанта Г.А. Шандрука. У баі за горад было знішчана каля 250, захоплена ў палон 100 гітлераўцаў і вялікія трафеі.

У гэтым баі вызначыліся часці падраздзялення гвардыі палкоўніка М.К. Шалаева, гвардыі маёра Ф.А. Алабушава, гвардыі капітана О.А. Нанаўяна, гвардыі старшага лейтэнанта Гарбузава, гвардыі капітана Ажгібекава, гвардыі капітана Фірсава і гвардыі старшага лейтэнанта Шульжэнкі.

Мотастралковыя роты батальёна Ф.А. Алабушава на правым флангу прайшлі на

Афіцэры 3-га мотастралковага батальёна 7-ай механізаванай брыгады, 1944 г.
(у другім радзе чацвёрты злева гвардыі маёр О.А. Нанаўян)

машынах амаль увесь першы квартал. Пры падыходзе да цэнтра пачаўся абстрэл з гармат і мінамётаў з боку гарадскога рынку. Каля скверыка на цэнтральнай плошчы камандзір узвода лейтэнант М. Сонін паказваў машынам, куды рухацца. З крайняга дома паляцела бутылка з гаручай сумессю. У адно імгненне лейтэнант Сонін ператварыўся ў яркі сноп агню. Гэту варожую агнявую кропку падавіць не змаглі.

Чырвонаармеец Аляксей Бегуноў, які спрабаваў кінуць гранату, быў забіты.

І ў раёне гарадскога рынку з разбуранага дома стракатаў кулямёт. Наступленне спынілася. Але падышоўшы танк лейтэнанта В.А. Музырава заставіў яго змоўкнуць.

А.М. Самсонаў у кнізе «От Волги до Балтики» так апісвае баі за горад Лепель: «Адным з першых у горад уварваўся экіпаж танка гвардыі старшага лейтэнанта В.А. Музырава. Танкісты вялі агонь, знішчаючы гітлераўскіх салдат і афіцэраў. Прарваўшы абарону праціўніка на ўскраіне, Музыраў павёў сваю роту далей, дапамагаючы мотастралкам ачышчаць вуліцы горада ад ворага». В.А. Музыраў са сваім экіпажам падбілі танк і знішчылі дзве процітанкавыя гарматы. Знішчалі фашыстаў і пехацінцы 2-га мотастралковага батальёна гвардыі капітана Ф.А. Алабушава. Сам Алабушаў уварваўся ў горад разам з перадавым атрадам.

Уступіў у бой і камсорг танкавага палка гвардыі лейтэнант І.М. Заўялаў. Гвардзейцы пайшлі на збліжэнне з праціўнікам, прыблізіўшыся да гітлераўцаў на адлегласць кідка гранаты. Частка афіцэраў падняла рукі. Але іншыя аказалі супраціўленне. Заўялаў кінуў адну за другой дзве гранаты. У гэты момант варожая куля абарвала жыццё гвардзейца.

Штурм Лепеля і яго вызваленне назаўсёды звязаны з імем гвардыі лейтэнанта А.Ф. Сярова. Ураджэнец ст. Знаменка Варонежскай вобласці Шаталаўскага раёна, камсорг першага мотастралковага батальёна карыстаўся вялікай павагай і аўтарытэтам. У дзень штурму Лепеля А. Сяроў узначаліў узвод аўтаматчыкаў. На

чале ўзвода Аляксей Сяроў уварваўся на вуліцы горада і з'яўляўся ў самых небяспечных месцах. Ён знішчыў чатырох фашыстаў, трох узяў у палон. Узвод Сярова прасоўваўся ўсё далей і далей наперад. Раптам ён выкінуў аўтамат і ўпаў на зямлю. Куля трапіла ў жывот. Яго эвакуіравалі ў медсанузвод у раён горада Чашнікі, дзе ў той жа дзень, не даехаўшы да шпіталя, ён памёр. Пахавалі Аляксея Сярова ў 300 метрах на паўночны захад ад вёскі Лужкі Чашніцкага раёна.

Гвардыі старшы сяржант С. Арцюхоўскі, кінуўшы гранату ў акно хаты, прымусіў змоўкнуць нямецкі кулямёт. Камсамолец Чарткоў чаргою з аўтамата зняў снайпера. Аўтаматчык Віктар Казноў заўважыў, што гітлераўцы, робячы перабежку, канцэнтруюцца ў адным катлаване. Казноў падпоўз туды і ўбачыў, што ў катлаване сабралася вялікая група немцаў, крыкнуў і падняў над галавой гранату. Ён узяў у палон 47 немцаў і даставіў іх у штаб брыгады.

Галоўны ўдар брыгада наносіла левым флангам па ўмацаваннях праціўніка ўздоўж шашы Лепель — Бягомль і па ўсходняй частцы горада. Танкі ішлі на вялікай хуткасці. Ускорасці падаспелі часці 1-га стралковага корпуса 43-яй арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту.

На шашы ў бок Бягомля немцы высунулі танк Т-4, каб прыкрыць эвакуацыю сваіх тылоў і тэхнікі. Танк лейтэнанта І.І. Берагавога (Алег Міш'янін, Павел Сергіенка, Васіль Аністратаў, Лапацін) расстраляў гэты танк і разбіў уцякаючую з горада калону машын і павозак.

Першы мотастралковы батальён капітана В.А. Фёдарава ачысціў разам з танкамі падпалкоўніка Мікалая Кірылавіча Шалаева траншэю па дарозе Лепель — Бягомль, вёў бой на ўсходніх вуліцах горада. Яны заблакіравалі вялікую групу немцаў у будынку, падобным на памяшканне для агародніны. Вызначыўся тут лейтэнант Г.І. Сарока. З ротай лейтэнанта Г.І. Сарокі змагаўся і лейтэнант А.Ф. Сяроў. У вулічных баях загінуў сяржант Дзмітрый Іванавіч Маёраў, малодшы сяржант Б.Р. Пічугін.

Для развіцця поспеху ў бой быў уведзен трэці мотастралковы батальён капітана Г.Е. Гарбузава. Батальён рынуўся ў атаку. Праціўнік, адстрэльваючыся, пачаў адступаць да вакзала. У гэтым баі сяржант Якаўлеў Сямён Мікалаевіч з г. Белы Калінінскай вобласці разам з шафёрам Ванем Табульскім захапілі трох палонных. Лейтэнант Берагавы знішчыў нямецкі танк і разбіў калону, узарваў мост і ў горадзе каля чыгуначнага вакзала тараніў мінамётную батарэю праціўніка.

А.Ф. Сяроў

Лейтэнант Ігар Масальскі наткнуўся танкам на варожую аўтамашыну, якая хацела ўцячы з Лепеля. Танкісты і мотастралкі ачысцілі горад ад ворага. Бой у Лепелі сціх.

Часовым камендантам Лепеля быў прызначан начальнік хімслужбы брыгады капітан С.А. Байкоў, а вечарам у Лепелі байцы адзначалі другую гадавіну ўтварэння брыгады.

Многія салдаты і афіцэры брыгады за баі ў Беларусі, у тым ліку за вызваленне г. Лепеля, былі ўдастоены ўрадавых узнагарод, а камандзіру брыгады гвардыі палкоўніку Міхаілу Іосіфавічу Радзівонаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза і воінскае званне генерал-маёра танкавых войск. А ў далейшым ён будзе ганаровым грамадзянінам горада Лепеля.

29 чэрвеня 1944 г. 7-ая гвардзейская мехбрыгада, перадаўшы абарону Лепеля падышоўшым часцям 1-га Прыбалтыйскага фронту, пачала прасоўвацца да р. Бярэзіна па маршруце Лепель — Пышна — Бярэзіно.

Маршрут быў цяжкі. Мясцовасць на паўднёвы захад ад Пышна нізкая і ў асноўным лясіста-балоцістая. Уздоўж да-

Разведчыкі 7-ай механізаванай брыгады (у трэцім радзе злева направа гвардыі капітан Шульжэнка, маёр Дзелімбетаў, падпалкоўнік Грыцаенка, палкоўнік Цвяткоў, падпалкоўнік Смірноў)

рогі гітлераўцы пабудавалі дрэва-земляныя крэпасці, прыстасаваныя да кругавой абароны. Крэпасці былі пабудаваны для аховы дарогі Беразіно—Лепель і для ўкрыцця ад раптоўных удараў беларускіх партызан, якія актыўна дзейнічалі ў гэтым раёне. З выхадам да рэчкі разведка брыгады данесла, што крэпасці немцамі не заняты, што праціўнік знаходзіцца на супрацьлеглым беразе і ў населеным пункце Беразіно.

У момант падыходу мотастралковых злучэнняў да р. Бярэзіна праціўнік адкрыў па іх моцны агонь з супрацьлеглага берага. Бой працягваўся дапазна. У гэтым баі загінулі смерцю храбрых камандзір разведроты гвардыі капітан Шульжэнка, камандзір першай мотастралковай роты лейтэнант Сарока і іншыя.

Вечарам 30 чэрвеня з падыходам агульнавайсковых часцей камандзір атрымаў загад: перадаць ім свае пазіцыі і выйсці да наведзенага моста ў раёне на ўсход ад Бягомля, пераправіцца на правы бераг р. Бярэзіны і наступаць на г. Вілейку.

Зрабіўшы за кароткую чэрвеньскую ноч начны марш уздоўж левага берага рэчкі, першага ліпеня на світанні брыгада пераправілася на правы бераг р. Бярэзіны і прыступіла да выканання пастаўленай задачы.

З успамінаў генерал-палкоўніка танкавых войск камандзіра 3-га Сталінградскага гвардзейскага механізаванага корпуса В.Ц. Абухава

АБУХАЎ Віктар Цімафеевіч, нарадзіўся 3.04.1898 г. у сяле Нікольскае, цяпер Арэнбургскага р-на Арэнбургскай вобл., у сям'і селяніна. Рускі. Член партыі з 1918 г. У Савецкай Арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1924 г. скончыў Вышэйшую кавалерыйскую школу, у 1934 г. — Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзе. Удзельнічаў у баях на р. Халхін-Гол у 1939 г.

На франтах Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. Камандзір 3-га гвардзейскага

механізаванага корпуса (3-і Беларускі фронт) гвардыі генерал-лейтэнант Абухаў у чэрвені 1944 г. умела арганізаваў прарыў варожай абароны ў раёне гарадоў Віцебск, Орша. За трое сутак корпус прасунуўся больш чым на сто кіламетраў, удзельнічаў у вызваленні г. Лепеля. 28.06.44 г. фарсіраваў р. Бярэзіну і захапіў плацдарм на правым беразе. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4.07.1944 г.

Пасля вайны працягваў службу ў арміі. У 1952 г. скончыў Ваенную акадэмію Генштаба. З 1965 г. генерал-палкоўнік танкавых войск Абухаў — адстаўнік. Жыў у г. Маскве. Ганаровы грамадзянін шэрага гарадоў. Узнагароджан 3 ордэнамі Леніна, 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава I ступені, ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр 26.11.1975 г.

В.Ц. Абухаў

Упартыя баі разгортваліся ў нас ззаду, дзе наступалі войскі 5-ай арміі. Вораг там жорстка супраціўляўся. Перад нашым жа корпусам у асноўным у аператыўнай глыбіні дзейнічалі раздробненыя падраздзяленні, якія аказвалі жорсткае супраціўленне толькі да таго моманту, як іх абыдуць нашы падраздзяленні з флангаў і з тылу.

Дзякуючы высокай манеўранасці і хуткасці корпус дасягаў вялікіх поспехаў, не маючы часта перавагі над праціўнікам.

Вораг адыходзіў на Лепель і Барысаў, магчыма, з мэтай заняць абарону на р. Бярэзіна. Для выканання пастаўленай задачы загадана корпус павярнуць строга на захад, каб па карацейшых напрамках выйсці да Бярэзіны і фарсіраваць яе з ходу. Для гэтага мной было вырашана ўвесці ў бой у напрамку Чарэі, на поўнач ад Бродаў, 35-ую гвардзейскую танкавую брыгаду (дагэтуль у рэзерве прыкрывала тылы 3-га мехкорпуса), умацаваўшы яе 129-ым мінамётным палком, 334-ым асобным гвардзейскім мінамётным дывізіёнам, 743-ім знішчальным супрацьтанкавым дывізіёнам, двумя батарэямі 1705-га зенітнага палка. Такім чынам, на гэтым напрамку, з улікам 9-ай гвардзейскай мехбрыгады, была створана галоўная групоўка корпуса. З мэтай забеспячэння правага фланга гэтай групоўкі перад камандзірам 7-ай гвардзейскай мехбрыгады палкоўнікам М.І. Радзівонавым з двума дывізіёнамі 326-га мінамётнага палка, прыдадзенага корпусу на ўзмацненне, была пастаўлена задача авалодаць г. Лепелем.

З раніцы 27 чэрвеня асноўныя сілы корпуса павялі рашаючае наступленне да Бярэзіны. Для захопу перапраў былі накіраваны перадавыя атрады брыгад у складзе ўзмоцненых батальёнаў.

Раніцай на світанні 28 чэрвеня перадавы атрад 35-ай гвардзейскай танкавай брыгады з ходу фарсіраваў Сергуцкі канал і да 9 гадзін выйшаў да Бярэзіны. Першым вырваўся да рэчкі бронетранспарцёр разведузвода на чале з начальнікам разведкі капітанам С.Г. Празоравым, які для разведкі прыцягнуў беларускіх партызан. Разам з перадавымі часцямі брыгады партызаны прымалі ўдзел у будаўніцтве перапраў. Усімі работамі асабіста кіраваў камандзір брыгады Герой Савецкага Саюза генерал-маёр Азі Ахадавіч Асланаў. Ён быў любімцам брыгады, маючы вялікую асабістую храбрасць.

Выйшаўшы да Бярэзіны, брыгада прыступіла да фарсіравання на падручных сродках, адначасова камандзір загадаў пачаць будаваць мост у раёне вёскі Прыстань. Але калі цераз гатовы мост паспрабавалі пераправіцца танкі, першы ж з іх апынуўся ў вадзе разам з мостам. Мост аказаўся недастатковай грузападымальнасці. На зыходзе 28 чэрвеня на ўчастку гэтай брыгады ўдалося пераправіць асабовы састаў і частку машын батальёна аўтаматчыкаў, разведузвода, штаб брыгады, машыны роты ўпраўлення і ўзвод танкаў. Астатнія танкі заставаліся без гаручага і знаходзіліся ў лесе ў 2 кіламетрах на паўднёвы захад ад населенага пункта Прыс-

тань. На іншых участках фарсіраванне Бярэзіны ажыццяўлялася наступным чынам. На зыходзе 28 чэрвеня перадавы атрад 9-ай гвардзейскай мехбрыгады выйшаў да ракі ў раёне Рожна і завязаў бой з праціўнікам. Працягваючы бой усю ноч, гвардзейцы-аўтаматчыкі з раніцы наступнага дня перайшлі раку ўброд, некаторыя, выкарыстоўваючы падручныя сродкі, перапраўліся ўплаў. На заходнім беразе быў замацаваны плацдарм. Да 12 гадзін 28 чэрвеня сапёры ў раёне вёскі Ніўкі пры дапамозе мотастралковых падраздзяленняў пабудавалі нізкаводны драўляны мост. Па ім пачалі перапраўляцца падышоўшыя галоўныя сілы 9-ай гвардзейскай мехбрыгады. Але ўскорасці гэты мост быў разбураны наляцеўшай авіяцыяй. На працягу 28 і 29 чэрвеня пры фарсіраванні Бярэзіны склаліся цяжкія абставіны, нягледзячы на масавы гераізм воінаў, якія, не шкадуючы свайго жыцця, пад агнём ворага, на падручных сродках і ўплаў фарсіравалі раку.

Але трэба было пераправіць тэхніку і зброю. Быўшыя тут раней масты былі праціўнікам разбураны. Пантонна-перапраўвачных сродкаў у корпусе не было, а тыя пераправы, што будаваліся пад агнём праціўніка, разбураліся варожай авіяцыяй, асабліва на ўчастку Бабцы — Ускром'е, дзе ажыццяўлялі фарсіраванне 9-ая гвардзейская механізаваная і 35-ая гвардзейская танкавая брыгады.

Найбольш спрыяльныя ўмовы для фарсіравання Бярэзіны склаліся на ўчастку 8-ай гвардзейскай механізаванай брыгады. Яна наступала з прыдадзенай ёй ротай 62-га сапёрнага батальёна і іншымі часцямі ўзмацнення на левым флангу корпуса і выйшла да ракі ў раёне Броды. Тут была пабудавана пераправа для танкаў і аўтатранспарту. Асноўныя сілы брыгады фарсіравалі Бярэзіну. Пераправы працягвалі дзейнічаць. Улічваючы гэта, 29 чэрвеня было загадана ўсім часцям корпуса, якія не змаглі пераправіцца, сканцэнтравацца ў раёне Броды і ажыццявіць там пераправу па ўжо наведзеных мастах.

Корпус за 5 дзён баёў прасунуўся на 180 кіламетраў. Фарсіраваўшым Бярэзіну падраздзяленням і часцям было загадана працягваць няспыннае наступленне на заходнім беразе. На працягу 1 ліпеня поўнасцю была закончана пераправа цераз раку ўсіх астатніх часцей і злучэнняў корпуса, у тым ліку і 7-ай гвардзейскай механізаванай брыгады.

Воіны 3-га Сталінградскага механізаванага корпуса ў ліку іншых злучэнняў 3-га Беларускага фронту атрымалі ўдзячнасць Вярхоўнага Галоўнакамандуючага за паспяховае фарсіраванне Бярэзіны.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Освобождение Белоруссии. 1944. М.: Наука, 1970. С. 565—589.

З успамінаў Івана Сцяпанавіча Каламейчука, былога камандзіра 1-га артылерыйскага дывізіёна 1043-га артпалка 306-ай сд 1-га ск 43-яй арміі

28 чэрвеня 1944 г. палкі 306-ай дывізіі, якія падтрымліваліся агнём дывізіёнаў артпалка дывізіі, пераадолеўшы супраціўленне фашыстаў, уварваліся ў г. Лепель і завязалі вулічныя баі. Найбольш імкліва дзейнічала стралковае падраздзяленне 935-га палка, падтрымліваемае агнём сваёй 120-мм мінамётнай батарэі, і першага дывізіёна 1043-га артпалка. Мужнасці і гераізму воінаў не было межаў. Фашысты пакідалі вуліцу за вуліцай.

Вораг, умацаваўшыся на ўскраіне лесу на захад ад Лепеля і абапіраючыся на раней падрыхтаваныя пазіцыі, некалькі разоў на працягу дня 28 чэрвеня пераходзіў у контратаку. Да гэтага часу ў нас была арганізавана сістэма агню. Агнявыя пазіцыі першага дывізіёна 1043-га палка былі непасрэдна на ўсходняй ускраіне Лепельскага возера.

У баях на подступах да горада і за горад Лепель вызначыліся воіны 935-га стралковага палка пад камандаваннем палкоўніка А.І. Бяспятава: Я. Хайсман, І. Вятроў, Н. Новікаў, Ю. Маткін, М. Міхуткін, В. Безбародаў, Н. Папоў, В. Русакоў, І. Мелікаў; воіны першага дывізіёна 1043-га артпалка: І. Шастак, Н. Навуменка, І. Вінаградаў, Л. Падтопельны, В. Сцефанаў, Качэрлі, Вераб'ёў, І. Мінчанка, Б. Мазунін, Г. Амелькаў і іншыя.

З успамінаў былога камандзіра аддзялення разведкі штаба КАД 357-ай стралковай дывізіі А.П. Кудраўцава

Лепель гарэў. Гарэлі прадуктовыя і рэчавыя склады праціўніка. Пад націскам нашых войскаў фашысты адступалі. Раніцой, калі завязаліся баі на ўскраінах і ў самім горадзе, мы — група разведчыкаў, пасля выканання свайго задання, з ускраіны горада рухаліся ў бок дарогі, якая вяла ў горад. Па ёй ішлі машыны, танкі, абозы. Не ведаю, што адбылося на дарозе, але рух прыпыніўся. Частка абозу цераз поле накіравалася да горада цераз чыгунку. І раптам з насыпу па абозе пачалі страляць два нямецкія кулямёты. Але гэта нікога не спыніла, павозкі імчаліся да насыпу. Падаспеўшыя разведчыкі, сапёры, сувязісты знішчылі варожыя агнявыя кропкі. Абознікі пераскочылі цераз чыгуначны насып і ўвайшлі ў горад.

У час баёў за Лепель з нашай батарэі быў цяжка паранены сувязіст Аляксандр Нохрын, падарваўся на міне Кліменцьяў Сяргей.

З успамінаў Х. Атангулава, удзельніка вызвалення Лепеля

Знясіленыя, выйшлі мы да г. Лепеля. З правага боку — блакітнае возера, з левага — пакатае ўзвышша, а насупраць — чыгунка, за якой дыміцца некалькі хат...

Пасля ўзяцця горада крыху адпачылі. Вечарам зноў рушылі ў дарогу. Як толькі выйшлі да заходняй ускраіны горада, мяне быццам бы аглушыла ўзрывам. Я ўпаў тварам на зямлю. Расплюшчыў вочы і ўбачыў, што трава стала барвовай ад крыві. Перакруціўся на спіну. Падбеглі санітаркі. Мяне параніла ў галаву. Перавязалі. Аказалася, што я паранены яшчэ і ў руку. Рукаў разрэзалі нажніцамі, забінтавалі. Павялі мяне на пункт збору раненых. У выніку ранення застаўся інвалідам.

Газета «Знамя», 1984. 7 чэрв.

Іх не забудуць*

ВАСІЛЬЕЎ Мікалай Аляксеевіч, нарадзіўся 27.07.1900 г. у вёсцы Скачэлі, цяпер Бацецкага р-на Наўгародскай вобл., у сям'і селяніна. Рускі. Член КПСС з 1929 г. Скончыў пачатковую школу, быў рабочым на чыгунцы. У Савецкай Арміі з 1919 г. Скончыў КУОС у 1927 г., Вышэйшую пагранічную школу ў 1935 г. Камандаваў узводам, атрадам, палком. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. Удзельнік аперацыі «Баграціён». 357-ая і 306-ая стралковыя дывізіі першага стралковага корпуса, якімі камандаваў генерал-лейтэнант М.А. Васільеў, удзельнічалі ў вызваленні г. Лепеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 28 чэрвеня 1944 г.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 26 кастрычніка 1943 г. за паспяховае фарсіраванне Дняпра. У 1949 г. скончыў вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба. З 1968 г. генерал-лейтэнант М. А. Васільеў — адстаўнік.

Узнагароджан двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Кутузава I і II ступені, двума ордэнамі Суворова II ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр 27 кастрычніка 1971 г.

ШАЛАЕЎ Мікалай Кірылавіч — камандзір 43-га гвардзейскага танкавага палка гвардыі падпалкоўнік нарадзіўся ў 1909 годзе пад Віцебскам. З 1931 года знаходзіўся ў Чырвонай Арміі. Гэта быў смелы камандзір, які паказваў прыклад падначаленым асабістай мужнасцю ў баях. Так, ягоныя танкі першымі ўварваліся ў Лепель. У ліку першых у горад уварваўся і сам камандзір палка. За ратныя подзвігі

* Звесткі пра Герояў Савецкага Саюза ўзяты з кнігі «Герои Советского Союза». Т. 1, 2. М., 1987.

летам 1944 года Мікалай Кірылавіч Шалаеў быў узнагароджан ордэнам Леніна.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны адстаўнік жыў у горадзе Валгаградзе.

П.Фралоў. У баях за Лепель// Ленінскі сцяг.

КАЛЕСНІКАЎ Сямён Мікітавіч, нарадзіўся 2 лютага 1911 г. у с. Падвіслава, цяпер Ражскага р-на Разанскай вобл., у сям'і селяніна. Член КПСС з 1943 г., скончыў пачатковую школу. Жыў у Ленінградзе, працаваў такелажнікам-мантажнікам на заводзе імя Леніна. У Савецкай Арміі з 1933 г. У 1942 г. скончыў кулямётнае вучылішча у г. Энгельсе Саратаўскай вобл.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны са снежня 1942 г. Камандзір стралковай роты 7-ай гвардзейскай механізаванай брыгады (3-і гвардзейскі мехкорпус, 1-ы Прыбалтыйскі фронт). Удзельнічаў у вызваленні г. Лепеля Віцебскай вобл.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24 сакавіка 1945 г.

Пасля вайны прадаўжаў службу ў арміі. З 1955 года маёр С.М. Калеснікаў — адстаўнік.

Узнагароджан ордэнам Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр 28 красавіка 1975 г. Пахаваны ў Ленінградзе.

КРЫЛОЎ Васіль Меркур'евіч, нарадзіўся 26.08.1907 г. у в. Чубарава, цяпер Навадугінскага р-на Смаленскай вобл., у сям'і селяніна. Рускі, член КПСС з 1940 г. Скончыў няпоўную сярэднюю школу ў с. Селішча, працаваў у сельскай гаспадарцы. У 1927 г. быў сакратаром, а з 1928 г. — старшынёй сельсавета. З 1930 г. жыў у Ленінградзе, працаваў на Балтыйскім заводзе слесарам. У Савецкай Арміі з 1941 г.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з ліпеня 1941 г. Скончыў Казанскае танкавае вучылішча ў 1944 г. Камандзір танкавай роты 43-га гвардзейскага танкавага палка (7-ая мехбрыгада, 3-і гвардзейскі механізаваны корпус, 1-ы Прыбалтыйскі фронт). У саставе 7-ай мехбрыгады ўдзельнічаў у баях за г. Лепель Віцебскай вобл. 28.06.1944 г.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24 сакавіка 1945 г.

Пасля вайны прадаўжаў службу ў арміі. У 1949 г. скончыў Вышэйшую афіцэрскую бранятанкавую школу. З 1956 г. падпалкоўнік В.М. Крылоў — адстаўнік. З 1957 па 1968 год працаваў на Балтыйскім заводзе.

Узнагароджан ордэнам Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Ганаровы грамадзянін г. Шаўляя. Яго іменем названа школа ў г. Вольску Саратаўскай вобласці.

КУЧАРАВЕНКА Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 5 лютага 1904 г. у г. Палтаве ў сям'і рабочага. Украінец, член КПСС з 1927 года. Адукацыя н/сярэдняя. У Савецкай Арміі з 1919 па 1921 год, з 1925 г. — удзельнік грамадзянскай вайны. У 1928 годзе скончыў Іванава-Вазнясенскую пяхотную школу.

На франтах Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1942 г. Камандзір 306-ай стралковай дывізіі (43-яя армія, 1-ы Прыбалтыйскі фронт) генерал-маёр М.І. Кучаравенка пры падрыхтоўцы Беларускай аперацыі ўмела арганізаваў і 23.06.1944 г. паспяхова ажыццявіў прарыў варожай абароны. Яго дывізія 28 чэрвеня 1944 г. удзельнічала ў вызваленні г. Лепеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22 ліпеня 1944 года.

У 1951 г. скончыў Вышэйшыя акадэмічныя курсы пры Ваеннай акадэміі Генштаба. З 1959 г. — адстаўнік. Жыў у г. Омску.

Узнагароджан двума ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Памёр 5 кастрычніка 1971 г.

ХУДАЛЕЕЎ Рыгор Аляксандравіч, нарадзіўся 22 лютага 1902 г. у в. Ізабеліна Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. у сям'і селяніна. Беларус. Член КПСС з 1926 г. Скончыў 10 класаў. Працаваў у Ляшчынскім сельскім Савеце. У Савецкай Арміі з 1924 г. У 1930 г. скончыў Мінскае артылерыйскае вучылішча.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. Камандуючы артылерыяй 306-ай стралковай дывізіі (43-яя армія, 1-ы Прыбалтыйскі фронт). Палкоўнік Р.А. Худалееў вызначыўся ў ходзе Беларускай аперацыі пры прарыве абарончай паласы праціўніка ў раёне Шуміліна (Віцебская вобл.), пры фарсіраванні р. Заходняя Дзвіна ў раёне в. Шарыпіна, пры вызваленні г.п. Бешанковічы. Удзельнік вызвалення г. Лепеля.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22 ліпеня 1944 г.

Пасля вайны прадаўжаў службу ў арміі. У 1947 г. скончыў ваенную акадэмію. З 1955 г. — адстаўнік. Жыў у Мінску.

Узнагароджан двума ордэнамі Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр 4 чэрвеня 1964 г.

ТРАЎКІН Іван Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1922 г. у в. Папоўка, цяпер Максаціхінскі р-н Цвярской вобл., у сям'і селяніна, рускі. Скончыў 4 класы. Працаваў у калгасе.

У Савецкай Арміі з 1941 г. У дзеючай арміі са жніўня 1941 г. Памочнік камандзіра ўзвода 938-га стралковага палка (306-ая стралковая дывізія, 43-яя армія, 1-ы Прыбалтыйскі фронт), камсамолец, старшы сяржант І.М. Траўкін у ліку першых пераплыў раку Заходняя Дзвіна ў раёне в. Шарыпіна (Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл.). Удзельнічаў у вызваленні г. Лепеля.

Уступіўшы у бой з праціўнікам, разам з байцамі захапіў участак траншэі, агнём забяспечыў пераправу ўзвода.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22 ліпеня 1944 г.

Пасля вайны дэмабілізаваўся. Працаваў майстрам лесасплаву ў Максаціхінскім р-не Цвярской вобл. Жыў у в. Іванькова Кімрскага р-на.

Узнагароджан ордэнам Леніна і Чырвонай Зоркі.

Памёр 5 красавіка 1974 г.

БЯСПЯТАЎ Аляксей Іванавіч, нарадзіўся 20 чэрвеня 1920 г. у станіцы Прочнаакопская Новакубанскага р-на Краснадарскага края. Рускі. У 1940 г. завочна закончыў Армавірскае педвучылішча. Працаваў настаўнікам. У Савецкай Арміі з 1937—1939 і з ліпеня 1941 г. У 1939 г. скончыў Пензенскае артылерыйскае вучылішча, у снежні 1941 г. — КУКС і быў накіраваны ў дзеючую армію.

А.Г. Кудраўцаў — генерал-маёр, камандзір 357-ай стралковай дывізіі

Камандзір 935-га стралковага палка (306-ая стралковая дывізія, 43-яя армія, 1-ы Прыбалтыйскі фронт).

Падпалкоўнік Бяспятаў вызначыўся ў баях у чэрвені 1944 г. 23 чэрвеня ўдзельнічаў у прарыве абароны праціўніка ў раёне пасёлка Шуміліна Віцебскай вобласці. Затым полк на падручных сродках першым фарсіраваў раку Заходняя Дзвіна ў раёне вёскі Шарыпіна (Бешанковіцкі р-н), захапіў плацдарм, забяспечыўшы пераправу часцям дывізіі. У баі за горад Лепель быў паранены, але застаўся ў страі.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22 ліпеня 1944 г.

Да 1968 г. працягваў службу ў арміі. Жыве ў горадзе Сочы Краснадарскага края.

Узнагароджан ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

КУДРАЎЦАЎ Аляксандр Георгіевіч, нарадзіўся 20 жніўня 1901 г. у сяле Высокаў-Палома Калагрыўскага р-на Кастрамской вобл. у сялянскай сям'і. Адукацыя сярэдняя. У 1919 г. быў мабілізаваны калчакаўцамі, але ўскорасці з гэтай арміі збег і добраахвотнікам уступіў у Чырвоную Армію. У 1920 г. скончыў кароткатэрміновыя курсы чырвоных камандзіраў, стаў

камандзірам узвода. Член ВКП(б) з 1921 г. У 1923 г. скончыў Омскае пяхотнае вучылішча і паслядоўна займаў камандзірскія і штабныя пасады. У даваенны час — да намесніка камандзіра ўключна.

У чэрвені 1941 г. прызначан камандзірам 178-ай стралковай дывізіі, у якой прайшоў шлях да кастрычніка 1943 г., удзельнічаючы ў разгроме немцаў пад Масквой, Ржэвам, на Смаленшчыне. Восенню 1942 г. яму было прысвоена званне генерал-маёра.

7 кастрычніка 1943 г. ён прызначан камандзірам 357-ай стралковай дывізіі, якой камандаваў да канца вайны, удзельнічаючы з ёй у баях за вызваленне Пскоўскай вобласці, Беларусі, Літвы, Латвіі і Усходняй Прусіі.

Узнагароджан ордэнам Леніна, пяццю ордэнамі Чырвонага Сцяга, а таксама ордэнамі Суворава, Кутузава, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі і многімі медалямі.

Пасля вайны працягваў камандаваць 357-ай ордэна Суворава стралковай дывізіяй да 1948 г. У 1949 г. скончыў Вышэйшыя акадэмічныя курсы ў Маскве і быў накіраваны ваенкомам у Башкірскую АССР. У 1950 г. — адстаўнік па стану здароўя. Памёр у 1978 г. у г. Кастраме.

ГАЛУБКОЎ Аляксей Канстанцінавіч, нарадзіўся 24 сакавіка 1912 г. у в. Міхайлаўскае, цяпер Судзіслаўскі р-н, Кастрамская вобл., у сям'і селяніна. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Скончыў 10 класаў, працаваў у калгасе. Пасля сканчэння школы ФЗН у Кастраме працаваў на заводзе «Рабочы металіст». У Савецкай Арміі з 1942 г.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1942 г. Камандзір аддзялення сувязі 923-га артпалка (357-ая стралковая дывізія, 43-яя армія, 1-ы Прыбалтыйскі фронт), удзельнічаў у вызваленні г. Лепеля. Сяржант Галубкоў праславіўся у г. Швянчоніс 6.07.1944 г. Загінуў у гэтым баі.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24 сакавіка 1945 г. пасмяротна.

Узнагароджан ордэнам Леніна, медалямі. Пахаваны у п.г.т. Лынтупы Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Навек занесены ў спіскі воінскай часці.

ЛЯМІН Міхаіл Андрэевіч, нарадзіўся 26 снежня 1906 г. у в. Хамякова Увінскага р-на Удмурцкай АССР. У 1926 г. скончыў настаўніцкую семінарыю ў Новым Мултане, вучыўся ў Казанскім педагагічным інстытуце, затым у Ленінградскім пединстытуце імя Герцана. Выкладаў у абласной саўпартшколе. У 1934 г. прызваны ў Чырвоную Армію.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў у саставе 357-ай ордэна Суворава II ступені стралковай дывізіі. Удзельнічаў у вызваленні Ржэва, Вялікіх Лук, Невеля, Віцебска, Лепеля, Прыбалтыкі. Аўтар кнігі «Чатыры гады ў шынялях» (нарыс аб 357-ай стралковай дывізіі).

Узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, ордэнам «Знак Пашаны», баявымі і працоўнымі медалямі.

У 1960 годзе яму прысвоена званне народнага пісьменніка Удмурцкай АССР. Памёр у 1978 годзе.

Газета «Удмуртская правда», 1978. 11 июля. № 159.

ПАЎЛЮЧЭНКАЎ Максім Барысавіч, нарадзіўся 13 мая 1913 г. у в. Азарава Ярцаўскага р-на Смаленскай вобл. Пасля сканчэння сярэдняй школы паступіў на курсы журналістыкі Смаленскага абкама ВКП(б). З таго часу працаваў у розных органах друку, а пасля сканчэння ў 1939 г. Ленінградскага камуністычнага інстытута журналістыкі быў карэспандэнтам «Комсомольской правды» ў Новасібірску, карэспандэнтам «Звязды», начальнікам аддзела акружной газеты.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў у саставе 357-ай стралковай дывізіі першага стралковага корпуса 43-яй арміі, быў рэдактарам дывізіённай газеты «За Радзіму», удзельнік вызвалення Лепельскага раёна.

За ратны працоўны шлях М.Б. Паўлючэнкаў узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі, многімі медалямі.

Пасля вайны ён працаваў загадчыкам аддзела і адказным сакратаром газеты «Советская Белоруссия». З 1951 года, з дня заснавання газеты «Физкультурник Белоруссии», і да выхаду на пенсію ў 1973 годзе быў яе рэдактарам.

Член КПСС з 1942 года. Член Саюза журналістаў СССР. Заслужаны дзеяч фізічнай культуры БССР. Некалькі гадоў ён выбіраўся сакратаром праўлення Саюза журналістаў БССР, старшынёй Федэрацыі спартыўных журналістаў БССР.

Памёр 27 красавіка 1983 года.

ЯКІМЕНКА Мікалай Сямёнавіч, нарадзіўся 7 кастрычніка 1924 г. у с. Яўсюкава Ісількульскага р-на Омскай вобл. Рускі. Бацькі сяляне. Скончыў 10 класаў Верхнекамсамольскай сярэдняй школы Бастандзінскага р-на Паўднёваказахстанскай вобл. у 1952 г., калі служыў у Савецкай Арміі. У 1942 г. скончыў Томскае ваенна-мінамётнае вучылішча і Ваенную акадэмію імя Фрунзе ў 1956 г.

У Савецкай Арміі з сакавіка 1941 г. да 31 жніўня 1986 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, з 25 красавіка 1942 г. па 9 мая 1945 г. на Калінінскім, 1-ым Прыбалтыйскім (у саставе 357-ай стралковай дывізіі ўдзельнічаў у вызваленні г. Лепеля) і 2-ім Прыбалтыйскім і Ленінградскім франтах.

Узнагароджан двума ордэнамі Айчыннай вайны, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, двума медалямі «За баявыя заслугі», медалём «За адвагу» і іншымі медалямі.

Працаваў на курсах «Выстрал» у горадзе Сонечнагорску. Член савета ветэранаў 43-яй арміі.

ЖАНЗАКАЎ Абдула, нарадзіўся ў 1918 г. у пас. Акраб Ісатайскага р-на Актюбінскай вобл. З сялян. Казах. Працаваў на ферме ў саўгасе «Акрабскі». У Чырвонай Арміі з 1940 г. На фронце з 1941 г. Аўтаматчык яфрэйтар А. Жанзакоў вызначыўся пры вызваленні Віцебшчыны. 23 чэрвеня 1944 г. пры штурме вышыні ля в. Сіроціна падпоўз да варожага дзота, закідаў яго гранатамі, знішчыў 12 салдат і афіцэраў, узяў палоннага. 24 чэрвеня 1944 г. на падручных сродках пад агнём праціўніка фарсіраваў Заходнюю Дзвіну, удзельнічаў у захопе плацдарма. У баі за чыгунку ў раёне Лепеля першым выйшаў на чыгуначнае палатно і агнём прыкрыў падыход астатніх байцоў.

Загінуў 30 чэрвеня 1944 г. пры фарсіраванні р. Ушача. Пахаваны ля в. Заскоркі Полацкага р-на.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 27 ліпеня 1944 г.

На подступах да Лепеля

«Ключом» ад Лепеля былі вёскі Плоткі, Іканкі і Ласосніца. У той час як 306-ая дывізія білася за в. Плоткі, якая прыкрывала дарогу Камень — Лепель, наша 357-ая пад камандаваннем генерал-маёра А.Г. Кудраўцава завязала цяжкі начны бой за Ласосніцу і Іканкі. Узяць у лоб гэтыя дзве вёскі пяхоце не ўдалося, фашысты добра ўмацаваліся ў гэтых апорных пунктах. Іх пазіцыі былі густа насычаны артылерыяй і мінамётамі. Па нас білі іх штурмавыя гарматы. Фашысты пераходзілі ў частыя контратакі. І калі б не нашы палкавыя артылерысты, пяхоце прыйшлося б вельмі туга. Нічога не дала і лабавая танкавая атака, ды і танкаў было мала.

Добра памятаю тую ноч. Ярка палалі вёскі на подступах да Лепеля. Пры святле пажараў было бачна ўсё як на далоні. Наступальны начны бой вельмі цяжкі. Лягчэй тым, хто абараняецца. У іх усё прыстрэлена. Вядомы арыенціры. Свой пярэдні край яны паспелі абтыкаць мінамі. Кінуцца наперад было немагчыма. Сапёры толькі прыступілі да разміравання. Акапацца хутка таксама не было магчымасці. А праціўнік добра бачыў нашу пяхоту і вёў інтэнсіўны агонь. Затым паступіў загад рухацца ў правы бок. Камандаванне вырашыла наступаць з флангаў.

Адважна змагаліся ў тую памятную ноч многія мае аднапалчане. Хочацца добрым словам памянуць сёння і жывых, і загінуўшых у тым баі. Некалькі разоў хадзілі ў атаку перадавыя батальёны нашых палкоў, гераічна біліся пехацінцы Віктар Ратнікаў, Балат Тангіраў, Мікалай Белазёраў, Леў Кураўскі, Мікалай Свірскі, Мікалай Красперaў, Аляксей Умняшкін,

Алег Мухін, разведчыкі Генадзь Андросаў, Пётр Багданаў, Васіль Ціханаў; мінамётчыкі Уладзімір Гомараў і Аляксандр Лапшын і многія іншыя.

Палкавыя 45-мм і 76-мм пушкі камбатаў Антоненкі і Якіменкі знаходзіліся ў баявых парадках пяхоты і падтрымлівалі іх агнём. Выдатна грамілі ворага камандзіры гармат Міхаіл Якаўлеў і Георгій Какарын. Умела кіравалі сваімі батальёнамі камандзіры палкоў дывізіі падпалкоўнікі В'юшкін, Кусяк, Гаршкоў, заўсёды адчуваючы цвёрдасць загадаў камандзіра дывізіі генерала Кудраўцава.

Начны бой працягваўся некалькі гадзін — прамой наводкай білі па фашыстах, засеўшых у вёсцы, не толькі палкавыя гарматы, але і дывізіённая артылерыя.

Я бачыў, як хутка, з ходу разгарнуў сваю 122-мм гаўбіцу з 923-га артпалка дывізіі камандзір разліку Іван Працэнка, наводчык Іван Косціцын, зараджальшчык Мікалай Паўленка і іншыя. Ды і камандзір другога артылерыйскага дывізіёна маёр Георгій Паздзееў быў побач з камісарамі стралковых батальёнаў.

Адказаўшыся ад лабавой атакі, абыходзячы апорныя пункты з флангаў, выкарыстоўваючы магутны агонь артылерыі, пры падтрымцы танкаў нашай пяхоце ўдалося выбіць фашыстаў з вёсак Ласосніца і Іканкі. Яны адкаціліся назад, панёсшы значныя страты.

Стралковыя батальёны палкоў першага эшалона дывізіі, выкарыстоўваючы ўмовы мясцовасці, у цэнтры паласы наступлення быў вялікі прасторны роў, пачалі накопліваца для апошняга кідка на Лепель.

Якіменка Мікалай Сямёнавіч — старшыня савета ветэранаў 357-ай ордэна Суворава стралковай дывізіі.
Мухін Алег Андрэевіч — ветэран 357-ай стралковай дывізіі.

Камандзіру 1 ск

Баявое данясенне № 0176, штадыв 357
Лепель, 28.6.44. 15.00
Карта 50000-37 г.

1. Противник, прикрываясь мелкими группами, на отдельных рубежах главными силами отходит в общем направлении на запад.

Дивизия к 9.30 27.06.44 г., сломив сопротивление противника и выйдя на рубеж Браздецкая, м. Чашники, ст. Чашники, построила боевые порядки в две колонны, повела наступление на запад с задачей — овладеть г. Лепелем. В ходе наступления на период с 10.00 27.6. частями дивизии сломлено сопротивление противника на пяти рубежах, из них первый рубеж: Олимполье—Новики, 2 — военный городок на 116 км; 3— в районе Караевичи; 4 — в лесу 500 метров восточнее Корчи и 5 — Боровно. Особенно сильное сопротивление противника, поддерживаемое артиллерией, минометами и самоходными пушками, противник оказал на рубеже военный городок на 116 км и лес — 500 м восточнее Корчи.

Части дивизии, наступая 1188 сп в направлении Браздецкая, Боровизна, Паулье, Гецовщина—Митьковщина—Малое Жежлино—Большое Жежлино—Лепель; 1192 сп и 1190 сп в направлении м. Чашники—Проземля—Залесье — 116 км — Зорницы—Боровно—Лепель, сломив сопротивление групп прикрытия противника на 5 рубежах, к 8.00 28.6.44 подошли к восточной и северо-восточной окраине г. Лепеля и завязали огневой бой с противником.

В 8.30 по большаку в город прорвались танки с десантом автоматчиков. Пехота, развернувшись и приняв боевые порядки, к этому времени с ходу пошла на штурм. Сломив незначительное огневое сопротивление противника, части к 9.30 полностью вошли и овладели г. Лепелем.

1192 сп, преследуя отходящего противника, выйдя из города, повел наступление на Стаи.

1190 сп закрепился на западной окраине г. Лепеля.

1188 сп, перегруппировавшись, вышел и занял оборону на восточной окраине г. Лепеля.



Схема баявога шляху 357-ай стралковай дывізіі з 27 чэрвеня па 2 ліпеня 1944 г.

За сутки боя, с 27.6. по 28.6.44 г., дивизия понесла потери: убито — 24, ранен 91 человек. За это время уничтожено до 500 немецких солдат и офицеров. Взято в плен 67 немецких солдат и офицеров. Уничтожено 4 самоходных орудия типа «Пантера», 7 автомашин. Захвачено одно самоходное орудие типа «Пантера» в исправном виде, которое передано 10 ТБР, тягачей — 2, легковых автомашин — 2, одна в исправном состоянии, мотоциклов — 3, лошадей — 7, пушек — 1, пулеметов — 11.

Решил одним полком преследовать отходящего противника, выйти и укрепиться на рубеже Стаи.

Двумя полками прочно удерживать гор. Лепель до 19.00. С 19.00 наступать в общем направлении на Березино.

Командир 357 сд генерал-майор Кудрявцев
Начальник штаба полковник Просалов

43-яя армія ў Віцебскай аперацыі

Задума Віцебскай аперацыі

Улетку 1944 года раён Віцебска і Віцебска-Лепельскі напрамак увогуле мелі важнае значэнне для абодвух бакоў. Захоп гэтага раёна савецкімі войскамі ў далейшым забяспечыў ім ахоп групы армій «Поўнач» з поўдня і даў магчымасць пры прасоўванні ў заходнім напрамку наносіць флангавыя ўдары па войсках груп армій «Цэнтр» і «Поўнач».

Як паказаў ход баявых дзеянняў у аператыўнай глыбіні абароны Віцебска-Лепельскага напрамку, супраць 43-яй арміі гітлераўцы змаглі выкарыстаць толькі часці 201-ай ахоўнай дывізіі і падраздзялення ваеннай школы 3-яй танкавай арміі. Агульная колькасць гэтых войск праціўніка складала каля 10 тысяч салдат і афіцэраў. Часці 201-ай ахоўнай дывізіі размяшчаліся галоўным чынам на заходнім беразе р. Улы, несучы паліцэйскую службу.

Ваенная школа 3-яй танкавай арміі праціўніка знаходзілася ў раёне Іканкі (14 км на ўсход ад Лепеля). Па заяве камандуючага арміяй генерал-палкоўніка Рэйнгардта, асабісты састаў школы складаў яго «железный резерв», які меркавалася ўвесці ў бой у тым выпадку, калі становішча будзе вельмі цяжкім.

Камандаванне групы армій «Цэнтр» накіравала ў раён Лепеля і на захад ад яго 95-ую пяхотную дывізію.

У састаў 43-яй арміі ўваходзілі: 22-і гвардзейскі, 1-ы і 92-і ск (8 стралковых дывізій), 155-ы ўкрэпраён, 46-ая механізаваная брыгада і 105-ы асобны танкавы Дзямідаўскі полк. Танкавае ўмацаванне 43-яй арміі складалі 39-ая гвардзейская і 10-ая танкавыя брыгады.

Віцебская аперацыя планавалася як састаўная частка першага этапа Беларускай аперацыі, праведзенай савецкімі войскамі ўлетку 1944 года. Стварэнне вонкавага фронту, акружэнне віцебскай групоўкі праціўніка камандуючы 1-ым Прыбалтыйскім фронтам усклаў на войскі 6-ай гвардзейскай арміі. Гэтай арміі было загадана прарваць абарону праціўніка на ўчастку правей 43-яй арміі (фронт прарыву 18 км) і наступаць у агульным напрамку на Сіроціна, Бешанковічы, Лепель, Глыбокае. Пасля прарыву галоўнай паласы абароны праціўніка на стыку 43-яй і 6-ай гвардзейскай армій меркавалася ўвесці ў бой рухомую групу фронту — 1-ы Чырванасцяжны танкавы корпус з задачай з ходу фарсіраваць Заходнюю Дзвіну, авалодаць вузлом дарог Бешанковічы з тым, каб не дапусціць адыходу варожых войск у гэтым напрамку з раёна Віцебска. Акрамя таго, часткай сіл корпус павінен быў выйсці ў раён Каменя, Чашнікаў, каб не даць магчымасці рэзервам праціўніка падысці да Віцебска.

43-яя армія павінна была злучыцца з часцямі 39-ай арміі і тым самым замкнуць кола акружэння віцебскай групоўкі праціўніка.

Авіяцыйнае забеспячэнне наступальнай аперацыі 43-яй арміі ажыццяўлялася 3-яй паветранай арміяй — камандуючы генерал-лейтэнант авіяцыі Н.Ф. Папівін.

На авіяцыю ўскладалася наступная задача:

— забараніць падыход рэзерваў праціўніка з напрамкаў Полацка, Лепеля, Чашнікаў, Сянно і г.д.

Ход баявых дзеянняў

Баявыя дзеянні 43-яй арміі ажыццяўляліся адначасна з наступленнем савецкіх войск на працягу ўсяго цэнтральнага ўчастка савецка-германскага фронту ад Полацка да Мазыра. Баявыя дзеянні 43-яй арміі ў Віцебскай аперацыі дзеляцца на два этапы агульнай працягласцю 6 дзён.

На першым этапе (з 23 па 24 чэрвеня) войскі арміі прарвалі тактычную зону абароны праціўніка, паглыбілі захоп яго віцебскай групоўкі.

На другім этапе (з 25 па 28 чэрвеня) войскі фарсіравалі Заходнюю Дзвіну, стварыўся суцэльны фронт акружэння, вялі баявыя дзеянні на вонкавым фронце акружэння і ліквідавалі віцебскую групоўку нямецка-фашысцкіх войск.

У гэтых баях вызначыўся камандзір узвода аўтаматчыкаў старшы сяржант І.М. Траўкін.

У сувязі з завяршэннем акружэння віцебскай групоўкі праціўніка і з яго спробамі прарвацца з акружэння камандуючы 43-яй арміяй загадаў 1-му ск раніцай 25 чэрвеня ўскоранымі тэмпамі закончыць фарсіраванне Заходняй Дзвіны, пасля чаго неадкладна перайсці ў наступленне, перарэзаць шашу Віцебск—Лепель і авалодаць рубяжом Ржаўка, Мядзведзі. Злучэнне войск 39-ай і 43-яй армій у раёне Астроўна, як гэта прадугледжвалася планам аперацыі, не адбылося ў гэтым раёне з-за моцнага супраціўлення ворага, а таксама прамаруджвання 1-га і 6-га ск з фарсіраваннем Заходняй Дзвіны. Да злучэння ў Задарожжы войскі 43-яй арміі прасунуліся з цяжкімі баямі ўвогуле на 35 км, войскі 39-ай арміі — на 42 км.

У ліквідацыі дробных груповак разгромленай пад Віцебскам 3-яй танкавай арміі праціўніка актыўны ўдзел прымалі партызаны і мясцовае насельніцтва. Так, напрыклад, другая партызанская брыгада імя К. Заслонава (камбрыг В.П. Комлеў) і атрады брыгады Ф.Ф. Дуброўскага перахоплівалі адступаючага праціўніка на рубяжы Чашнікі, возера Лукомльскае і знішчалі яго.

Атрады брыгады Ф.Ф. Дуброўскага, ачышчаючы тэрыторыю Чашніцкага і суседніх з ім раёнаў ад праціўніка, знішчылі ў баях каля 700 і захапілі ў палон больш 2270 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Паспяховае развіццё Віцебскай аперацыі дзякуючы рашучым дзеянням войск 39-ай і 43-яй армій дазволіла камандаванню апошняй адразу ж, па меры фарсіравання Заходняй Дзвіны, накіраваць галоўныя сілы 1-га ск і большую частку танкаў арміі для стварэння вонкавага фронту. Гэтым войскам, а пазней і ўсім сілам 43-яй арміі камандуючы 1-ым Прыбалтыйскім фронтам загадаў імклівым праследаваннем нямецкіх войск у агульным напрамку на Лепель, Глыбокае забяспечыць поўны разгром віцебска-лепельскай групоўкі праціўніка і ва ўзаемадзеянні з 6-ай гвардзейскай арміяй перашкодзіць перакідцы варожых войск з саставу групы армій «Поўнач» у паўднёвым напрамку, сарваць мерапрыемствы гітлераўскага камандавання па арганізацыі абароны на р. Бярэзіна на лініі Шаркаўшчына—Маладзечна.

Дзеянні 6-ай гвардзейскай арміі з паветра з 27 чэрвеня забяспечваліся 332-ой штурмавой і 90-ай знішчальнай авіяцыйнымі дывізіямі.

У адпаведнасці з загадам камандуючага фронтам 43-яя армія павінна была (ва ўзаемадзеянні з 39-ай арміяй), працягваючы баі па знішчэнні віцебскай групоўкі праціўніка, часткай сіл разгортваць наступленне ўздоўж левага берага Заходняй Дзвіны ў агульным напрамку на Макаравічы, Баяры, Прыстоі.

25 чэрвеня 306-ая сд 1-га ск ва ўзаемадзеянні з іншымі падраздзяленнямі авалодала Бешанковічамі.

М.І. Кучаравенка — генерал-маёр, камандзір 306-ай стралковай дывізіі

Ноччу 27 чэрвеня р. Ула (Ульянка) была фарсіравана галоўнымі сіламі 306-ай сд.

357-ая сд пад камандаваннем генерал-маёра А.Г. Кудраўцава, уведзеная ў бой з-за левага фланга 306-ай сд, на зыходзе 26 чэрвеня авалодала рубяжом Наддача — В. Ведрань. А левафланговы корпус 6-ай гвардзейскай арміі з 24-ым танкавым палком 46-ай механізаванай брыгады, наступаючай у агульным напрамку на Камень, да 7 гадзін 27 чэрвеня захапіў апорны пункт праціўніка Бачэйкава. У выніку праследавання праціўніка войскі 1-га ск 43-яй арміі прасунуліся за суткі на 32 кіламетры. Наступленне часцей гэтага корпуса на вонкавым фронце акружэння было такім імклівым, што разрозненыя гітлераўскія падраздзяленні пад яго націскам разбегліся.

Па меры далейшага прасоўвання нашых войск спробы гітлераўцаў спыніць іх станавіліся ўсё больш прыкметнымі. Праціўнік выкарыстаў спрыяльную для абароны лясіста-балоцістую і азёрную мясцовасць. Рэшткам разбітых часцей і войскам яго аператыўнага рэзерву ўдавалася арганізаваць сур'ёзнае супраціўленне на некаторых рубяжах. Так, пасля крушэння абароны на лініі Бачэйкава, Чашнікі нямецка-фашысцкае камандаванне разлічвала выгадаць час, неабходны для арганізацыі больш рашучага супраціўлення нашым войскам на рубяжы р. Бярэзіна, Камень, Лепель. Для гэтага на лініі Камень—Лепель нямецкае камандаванне сканцэнтравала асноўныя сілы 201-ай ахоўнай дывізіі і падраздзяленне школы знішчальнікаў танкаў 3-яй танкавай арміі. Да таго ж раёна праціўнік падцягваў з рубяжа р. Бярэзіна часці 95-ай пяхотнай дывізіі, а таксама 212-ую пяхотную дывізію з раёна Пскова. Трэба было сарваць гэты разлік праціўніка. На Лепельскім напрамку гэту задачу павінна была выканаць 43-яя армія. Па рашэнні камандуючага арміяй 27 чэрвеня была сфарміравана рухомая танкавая група ў саставе 10-ай і 39-ай гв. брыгад. Камандаваў гэтай групай палкоўнік Мяньшоў. Гэта група ўмацоўвалася 1203-ім самаходным і 712-ым знішчальнымі супрацьтанкавымі палкамі, і ёй было загадана нанесці імклівы ўдар у напрамку Чашнікаў і да 15 гадзін 27 чэрвеня авалодаць г. Лепелем, які ўтрымліваць да падыходу часцей 1-га ск.

З мэтай стварэння выгаднага зыходнага становішча для далейшага праследавання праціўніка танкавай групе было загадана захапіць перадавымі атрадамі вузлы дарог на захадзе і на паўночным захадзе ад Лепеля ў раёне Слабодка, Ст. Лепель, Вялікі Поўсвіж.

Армейская танкавая група фарміравалася на хаду. З прычыны затрымкі яе часцей на пераправах цераз Заходнюю Дзвіну яна была ўведзена ў бой з вялікім спазненнем. Адмоўна паўплывала на яе дзеянне таксама спазненне з падвозам гаручага.

Выконваючы пастаўленую задачу, танкавая група пасля пераправы цераз р. Заходняя Дзвіна да 14 гадзін 27 чэрвеня дагнала галоўныя часці 357-ай сд і ва ўзаемадзеянні з імі і з другой партызанскай брыгадай імя К. Заслонава з боем авалодала важным апорным пунктам абароны немцаў і вузлом дарог Чашнікі.

Аднак з прычыны адставання перапраўных сродкаў і марудных тэмпаў аднаўлення разбураных праціўнікам мастоў і перапраў цераз лясіста-балоцістыя ўчасткі і рэчкі танкавай групе не ўдавалася высунуцца наперад баявых парадкаў стралковых злучэнняў, якія, сустрэўшы ўпартае супраціўленне немцаў, замарудзілі сваё наступленне.

Часці 201-ай ахоўнай дывізіі і спецпадраздзяленні з рэзерву трэцяй танкавай арміі немцаў уводзіліся ў бой па меры іх падыходу да фронту і ўсё часцей пераходзілі ў контратакі. Асабліва ўпарта праціўнік супраціўляўся ў населеных пунктах, размешчаных на вузлах дарог і паміж азёрамі. Асабліва жорсткія баі часцям 1-га

ск і танкавай групе прыйшлося вытрымаць на зыходзе 27 чэрвеня пры авалоданні вузлом дарог з населеным пунктам Плоткі і ў раёне Іканкі, Ласосніца. Аказваючы супраціўленне ў гэтых населеных пунктах, праціўнік прыкрываў Лепель з усходу.

У ходзе жорсткага бою за Плоткі часці 306-ай сд, наносячы ўдары з фронту з флангаў, вызвалілі гэты населены пункт. З раніцы 28 чэрвеня яны перасеклі шашу Камень—Лепель. Да гэтага ж часу рухомая танкавая група ва ўзаемадзеянні з часцямі 357-ай сд, уначы, пры святле пажараў, узнікшых у Ласосніцы і Іканках, выбіла немцаў з гэтых населеных пунктаў.

У імклівым праследаванні праціўніка 1-ы ск ва ўзаемадзеянні з 46-ай механізаванай брыгадай і танкавай брыгадай з конна-механізаванай групы 3-га Беларускага фронту ў 8 гадзін 28 чэрвеня ўварваўся ў Лепель і ў ходзе непрацяглых вулічных баёў авалодаў ім.

Першым уварваўся ў горад узвод 712-га знішчальнага супрацьтанкавага палка малодшага лейтэнанта Бадаляна. Хутка раскруціўшыся, узвод агнём са сваіх гармат падпаліў самаходную ўстаноўку праціўніка і гэтым забяспечыў прасоўванне наступаўшых за ўзводам танкаў.

Адступаючы праціўнік не паспеў узарваць замініраваны мост цераз р. Эсу, якая ўяўляла сабой перашкоду на шляху наступлення нашых войск. Заняццем г. Лепеля — важнага акружнога пункта і вузла шасэйных дарог у аператыўнай глыбіні абароны 3-яй танкавай арміі немцаў, а таксама захопам плацдармаў на супраць-леглым беразе рэчкі Эса войскі 43-яй арміі закончылі Віцебскую аперацыю. З выхадам на лінію Камень—Лепель 43-яя армія злучылася з асноўнымі сіламі партызан.

Вялікую дапамогу нашым войскам, і перш за ўсё войскам 43-яй арміі, аказалі партызаны Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. Па даных штаба 1-га Прыбалтыйскага фронту, партызанскія злучэнні гэтай зоны за чэрвень 1944 года знішчылі і разбурылі: чыгуначных эшалонаў — 49, паравозаў — 25, вагонаў, цыстэрнаў і платформаў — 247, аўтамашын — 114. За перыяд з 20 па 29 чэрвеня партызаны ўзарвалі 23 369 рэек.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Кирюхин С.П. 43-я армия в Витебской операции. М., 1961. С. 6—129.

Адважны сяржант

Масавы гераізм праявілі воіны 1190-га стралковага ордэна Суворава палка пры вызваленні Віцебшчыны і горада Лепеля. Вось адзін з яркіх прыкладаў мужнасці воінаў палка.

Гэты подзвіг здзейсніў у баях за Лепель камсамолец, камандзір аддзялення супрацьтанкавых гармат малодшы сяржант Мікалай Іванавіч Сізоў.

Адно з падраздзяленняў палка займала абарону на вялікай, але тактычна важнай вышыні. У воінаў быў загад: утрымаць займаемы рубеж, хоць сілы былі няроўныя.

Аддзяленне супрацьтанкавых гармат малодшага сяржанта Сізова спаткала насядаўшых гітлераўцаў агнём з гармат, аўтаматаў і гранатамі. Разам з Сізовым адважна біліся тры яго байцы. Аднак хутка камандзір застаўся адзін. Гітлераўцы задумалі ўзяць Мікалая жывым, як «языка». Фашыстам удалося акружыць малодшага сяржанта. Завязалася крывавая схватка. Калі з рук Сізова выбілі разбіты аўтамат, ён біў фашыстаў кулакамі, галавой, нагамі. Ад удару па галаве аўтаматам Сізоў страціў прытомнасць. У такім стане ворагі схапілі яго.

Калі Мікалай апрытомнеў, ён убачыў вакол сябе шэсць гітлераўцаў. Наперадзе пачыналася мінная поле. Бачны былі тонкія дротавыя ніці нацяжнога дзеяння.

— Тут міны, калі пройдзем, убачыш сваіх, — сказаў на ломанай рускай мове адзін з фашыстаў.

Малодшы сяржант выпраміўся, паглядзеў вакол і гучна крыкнуў: «Няхай жыве мая Радзіма! Смерць вам, бандыты!» Пасля імгненна кінуўся ўбок і, вядома, закрануў дрот ад нацяжной міны. Грымнуў выбух. Асколкамі міны Мікалай быў цяжка паранены ў жывот, спіну і руку. Воін зноў страціў прытомнасць. Калі апрытом-

неў, убачыў вакол сябе пяць варожых трупаў. Шосты фашыст быў яшчэ жывы. І, заўважыўшы, што рускі салдат папоўз, выстраліў у яго. Сцякаючы крывёю, пераадольваючы нясцерпны боль, малодшы сяржант падпоўз да забітага гітлераўца, зняў з яго аўтамат і выстраліў услед гітлераўцу, прыкаваў яго да зямлі назаўсёды.

Паўжывы Сізоў папоўз да сваіх. Яго ўбачылі таварышы паблізу сваіх траншэй, падхапілі на рукі. Герой паспеў расказаць аб усім, што адбылося.

Так загінуў у баях за Радзіму пры вызваленні Віцебшчыны верны да канца воінскай прысязе камсамолец, малодшы сяржант М.І. Сізоў.

Г. Сарокін, ветэран Узброеных Сіл СССР, г. Гродна

Пісьмы з фронту

Франтавое пісьмо Магілеўскага Ю.А., ветэрана 306-ай стралковай дывізіі

Ю.А. Магілеўскі

Фронт 10/VII-44 г.

Здравствуйте дорогие мои мамочка, папочка и Мусичка.

Сообщаю, что пока остаюсь жив, здоров. Жизнь протекает в упорных боях. Воюем на территории Литвы. Движемся по несколько десятков километров в сутки, но вот сейчас снова жестокий бой, но ночью немцы будут драпать, хорошо бьет наша «Катюша». Вновь пойдем вперед. Спать почти не приходится, спим редко и то 2—3 часа в сутки (это через 2—3 дня один раз). Но все это пустяки, нас зовет вперед на Запад кровь замученных наших людей. Только лишь вперед. Моя дорога домой, как и всех других, проходит через Берлин. В отношении питания очень хорошо, но все равно похудел, бессонные ночи, большие переходы по преследованию немцев. Ваши письма и от Оли получаю часто.

Ну пока до встречи. Любящий Вас сын и брат. Юзеф.

Пісьмо Росліка Г.І., разведчыка 43-га гвардзейскага танкавага палка 7-ай гвардзейскай мехбрыгады дамоў ад 29 чэрвеня 1944 г., на наступны дзень пасля вызвалення Лепеля

Здравствуйте, мои дорогие!

Вчера, мамка, мне вручили одно твое письмецо и я спешу ответить. Кругом война, полно всего навалено, вчера ночью все горело и немец спать не давал, сегодня немножко спокойнее. А много ли солдату на войне нужно. Сегодня мы уже шутим, вспоминая вчерашний день, все его тревоги, и как ловили немцев, как ходили в разведку, попадали и под обстрел, бомбежку. Результаты всего этого вы слышите по радио.

А дела идут хорошо. Вот, как немец наступал, так и гонят его теперь. Не успевает отходить, бросает все, полно убитых, пленных, в окружении. Хлопцы действуют смело и рискованно. Сколько волнующих встреч с жителями. Молодец, Беларусь, не сдалась немцу. Кто может держать оружие в руках, все вооружены. А как они смотрят на нас. Ведь не верили, что есть еще такая армия, так одета, так кормят, столько техники. Вот я угощаю маленьких ребятишек сахаром, а они не знают, что с ним делать.

В отношении пищи, так немец столько оставил, что и от кухни можно отказаться. Вообщем, мама, не беспокойся.

Писем писать нет времени, и спать тоже не всегда приходится.

Мне пишите. Порадуйтесь со мной вместе освобождению Белоруссии. Я рад, что и от вас фронт отходит. Рад и освобождению Лепеля.

Вот и все. Крепко целую тебя, мамка, Наташу и бабушку. Будьте здоровы родные. Привет всем. Геннадий.

29.06.44 г.

Дакументы сведчаць

Ст. сержант Воробьев Василий Андреевич, командир расчета 2-й минроты, 992 сп., 1914 года рождения, русский (Калининская область, Высоковский район, Дорокин с/с).

В бою за овладение г. Лепелем 28.6.44 г. Воробьев В.А. смело и мужественно командовал своим расчетом и, ведя огонь по противнику, уничтожил три повозки с военным имуществом, трех лошадей и 7 немецких солдат. Когда противник пытался контратаковать нашу пехоту, т. Воробьёв стал сам за наводчика и вывел из строя 9 гитлеровцев.

Награжден орденом Славы III степени.

Рядовой Гизатулин Роман Гамеаулович, стрелок 935 сп., 1926 года рождения, татарин (г. Семипалатинск, ул. Сталина, 40).

28.6.44 г. в районе г. Лепеля в лесу гитлеровцы оказали сильное сопротивление. Патроны были на исходе. Немцы шли в контратаку. Красноармеец Гизатулин активно участвовал в отражении контратаки. Уничтожил более 10 фрицев. Ходатайствую о награждении орденом Славы III степени.

Награжден орденом Красной Звезды.

Старший сержант Корниенко Петр Севостьянович, 1913 года рождения, подносчик боеприпасов, 429 ОППТД, украинец (Черниговская область, Батуринский район, дер. Кербутовка).

При выполнении боевого задания при доставке боеприпасов на передний край 28.6.44 г. в г. Лепеле неожиданно попал под автоматный огонь противника, не растерялся тов. Корниенко, из автомата убил двух офицеров, остальные разбежались, задание точно и в срок по доставке боеприпасов было выполнено. Тем самым дал возможность артиллеристам разрушить и уничтожить огневые точки противника и продвигаться вперед.

Награжден орденом Красной Звезды.

Рядовой Лопатин Михаил Григорьевич, стрелок 2-й стрелковой роты 992 стрелкового полка, 1926 года рождения, русский (Кировская область, Шаранский район, д. Большие Климары).

28.6.44 г. в бою за Лепель, будучи стрелком 2-й стрелковой роты, проявил мужество и отвагу. На подступах к городу строчил немецкий пулемет, преграждавший путь для продвижения роты. Тов. Лопатин подкрался к пулемету и уничтожил его. Одним из первых ворвался в город, являя пример для остальных бойцов.

В последующих боях он в атаках проявил бесстрашие и мужество, увлекая личным примером за собой остальных бойцов.

Награжден орденом Славы III степени.

Ст. сержант Мальцев Егор Прокофьевич, 1917 года рождения, командир отделения разведки 2-й батареи 76-мм пушек 429-го ОППТД (Коми АССР, Сыктывкарский район, село Иб).

В наступательных боях в районе деревни Заозерье 29.6.44 г. по его инициативе была обнаружена 37-мм пушка противника, которая мешала продвижению нашим частям. Доложил об этом, точно скорректировал и с первого снаряда пушка была разбита. После этого был послан в разведку для уточнения, где находятся пехотные части противника, ведя разведку, столкнулся с группой вражеских солдат. Не теряясь, дал очередь из автомата, убил трех офицеров, остальные разбежались. Задание было выполнено точно и в срок.

Награжден орденом Красной Звезды.

Сержант Назипов Накип Назипович, начальник Р/ст. 1 батареи 1043 ап., 1922 года рождения, татарин (Татарская АССР, Випинский район, дер. Чумай).

В бою под д. Матюшина Стена участвовал в отражении контратаки противника, где лично убил двух немцев.

Под д. Прудок противник превосходящими силами пошел в атаку. При переходе в контрнаступление наших стрелковых подразделений товарищ Назипов вместе с пехотинцами истреблял немецких захватчиков.

Награжден орденом Красной Звезды.

Мл. лейтенант Садырбаев Жатпасбай, командир стрелкового взвода, 935-й стрелковый полк, 1921 года рождения, казах (Казахская ССР, Аксукский район, село Аксу). 27 июня 1944 г. в бою в лесу в районе г. Лепеля со своим взводом уничтожил группу до 20 немецких солдат и сам лично в упор убил трех фрицев.

Награжден орденом Красной Звезды.

Рядовой Филиппов Василий Филиппович, 1924 года рождения, химинструктор 429 ОППТД, русский (Рязанская область, Рыбневский район, д. Перакаль).

В боях за город Лепель 28.6.44 г. первым с третьей батареей ворвался и лично сам стал увлекать пехоту продвигаться вперед...

Награжден орденом Красной Звезды.

Шашкин Политарий Васильевич, 1926 года рождения, сержант, наводчик первой пулеметной роты 992-го стрелкового полка, русский (Горьковская область, Б. Мурашканский район, Холязинский сельсовет, село Ключище).

При наступлении на Лепель 28.6.44 г. вел интенсивный огонь по противнику, активно отражал его контратаку и получил ранение. Поле боя не покинул и остался в строю.

Награжден орденом Славы III степени.

Мл. сержант Ярош Федор Трофимович, стрелок ПТР, первого стрелкового батальона, 992 стрелкового полка, 1924 года рождения, украинец (Полтавская область, Миргородский район, село Кибейцы).

28.6.44 г. в бою за овладение г. Лепелем он метким выстрелом из ПТР уничтожил одну немецкую автомашину.

Награжден орденом Славы III степени.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 1614. Воп. 2. Спр. 67. Л. 161, 237, 30, 180, 35, 141, 39, 49, 93, 95.

З апісання баявых дзеянняў 306-ай СРД 1-га стралковага корпуса 43-яй арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту з 1 красавіка па 1 кастрычніка 1944 г.

Июнь месяц 1944 года.

...23.6.44 г. дивизия перешла в решительное наступление, прорвала глубоко эшелонированную полосу обороны противника и совместно с 179 стрелковой дивизией овладела районным центром и ст. Шумилино. К исходу 24.6.44 г. части дивизии подошли к р. Западная Двина и с хода на подручных средствах форсировали ее.

При этом проявлен массовый героизм.

Продолжая стремительно преследовать противника, не давая ему закрепиться на промежуточных рубежах, части дивизии штурмом овладели районным центром Бешенковичи и во взаимодействии с 357-й стрелковой дивизией г. Лепель и более 300 населенных пунктов. Прошли с боями 160 км, вышли на левый берег реки Черница.

Начальник штаба дивизии
полковник Харин



Схема баявога шляху 306-ай стралковай дывізіі з 23 чэрвеня па 3 ліпеня 1944 г.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 306 сд. Воп. 484190. Спр. 1. Л. 7—8.

Афіцэры і радавыя 306-ай стралковай дывізіі. У трэцім радзе: першы — Р.А. Худалеяў, камандуючы артылерыяй; другі — М.І. Кучаравенка, камандзір дывізіі; пяты — А.П. Белабародаў, камандуючы 43-яй арміяй

Аператыўная зводка № 00176
штадыв 306-ай

28.6.44 карта 50000-36

1. Противник под натиском наших частей продолжает отход, оказывая на промежуточных рубежах упорное сопротивление: между озер в районе Долгое, Прудок. С 14.00 до 20.00 27.6.44 шли упорные бои на рубеже этих озер. Противник численностью до 600 человек перешел в контратаку на правый фланг 935-й сп в районе Долгое — Соколы. Контратака была отбита с большими потерями для противника. После чего противник в беспорядке отходит в юго-западном направлении, пытаясь закрепиться в Лепеле.

Истребительная штурмовая авиация проявляла значительную активность — штурмовала наши боевые порядки и переправы, пытаясь задержать передвижение наших войск.

2. Части дивизии, преодолевая упорное сопротивление и отбивая контратаки, с боями продвигались вперед и в 7.50 28.6.44 г. штурмом овладели крупным населенным пунктом ж.д. станции Лепель, полностью очистив его от противника.

992 сп, следуя за боевым 935 сп, развил удар в направлении Лепеля и во взаимодействии с 357 сд штурмом овладел ж.д. Лепель, форсировал р. Эссу и достиг западного берега оз. Проша.

938 сп, преследуя отходящего противника, встретив упорное сопротивление в районе Плотки — Прудок, в течение ночи вел тяжелые бои и, продвигаясь вперед, овладел: Плотки, Губа, Прудок, Березовка, Мал. Жежлино, прошел Лепель и, повернув на северо-запад, овладел Матюшина Стена.

935 сп продолжал наступление, овладел Новины, Островы, Костинка, встретил упорное сопротивление в районе озер Плотки—Долгое и, развернувшись в боевой порядок, огнем пехотного оружия разгромил контратакующего противника, отбросив его в паническое бегство.

И на рубеже отм 170,7 фланговым ударом обратил в бегство вклинившуюся роту противника, овладев Екиманье, Еренполье и достиг юго-запада окраины Лепеля.

Противнику нанесен урон: уничтожено до 50 человек солдат и офицеров, захвачено 70 пленных, легковая автомашина и другие трофеи, которые уточняются.

Наши потери: убито 26, ранено 80 человек и убито 5 лошадей.

Начальник оперативного отдела
майор Шульга

Начальник штаба
полковник Харин

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі.
Ф. 306 сд. Воп. 86120 сс. Спр. 2. Л. 151—152.

Камандзіру 306-ай СРД генерал-маёру Кучаравенка

Баявое данясенне № 197 штаполк
935 КПП-Лепель
9.00 29.6.44 Карта 50000-36 г.

Полк в полном составе во взаимодействии с 992 сп 9.00 28.6.44 овладел Лепелем, форсировал р. Эсса и к 14.00 28.6 занял Жарцы, Матюшина Стена, занял временный оборонительный рубеж:

1 сб зап. Матюшина Стена,

2 сб юго-зап. Матюшина Стена, 3 сб южнее Матюшина Стена.

Личный состав полка в районе сосредоточения приводил в порядок себя и вооружение, готовясь к предстоящим задачам. После небольшой передышки полк в полном составе продолжал наступательные действия и с боями овладел: Забелино, Рачицы, Соломахи, Клеузы, Мал. Пышногоры и вышел к 10.00 29.6.44 2-й и 3-й сб ведут бои за Поплавки; 1-й сб ведет ожесточенные бои за Большие Пышногоры.

2. Противник после боев отступился из Лепеля и оказывает сопротивление, отступает в западном направлении. Выставив сильные заслоны на рубежах Мал. и Бол. Пышногоры, противник упорно сопротивляется огнем. После овладения полком Мал. Пышногоры, противник, сосредоточившись в Бол. Пышногоры, продолжает упорное огневое сопротивление.

3. За прошедшие сутки в личном составе полка имеются потери: (по предварительным данным) ранено 27 человек, убито до 10 человек.

Противник за это время понес потери ранеными и убитыми до 50 человек. Захвачено автомашин легковых — 6, грузовых — 15, тракторов — 5. Складов с продовольствием — 3, складов с военным снаряжением — 2.

4. Полк на 29.6.44 прод. фуражом обеспечен полностью (недостаточно боеприпасов, приняты все меры подвозки боеприпасов к переднему краю).

5. Решил: пополниться боеприпасами и, не задерживаясь на достигнутом, обойти Большие Пышногоры слева и продолжать наступление.

6. Связь с подразделением — рация.

Начальник штаба
майор Городниченков

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі.
Ф. 306 сд. Воп. 32905. Спр. 2. Л. 176.



Схема баявога шляху 10-ай танкавай брыгады

Начальніку палітаддзела 43-яй арміі палкоўніку Цітову

16 ліпеня 1944 г.
№ 0292

Данясенне
аб геройскіх подзвігах, праяўленых у апошніх баях

...5. Сержант Атамуратов Пезы, туркмен, 1920 года рождения, беспартийный, командир отделения.

В наступательных боях показал себя смелым и инициативным младшим командиром. В бою на подступах к Лепелю, когда выбыл из строя командир роты, товарищ Атамуратов смело принял на себя командование и продолжал выполнять поставленную задачу. Личным примером воодушевлял бойцов на смелое продвижение вперед. В другом бою он из своего автомата уничтожил трех немцев.

6. Красноармеец Ибатулин Кадыр Шабутдинович, татарин, 1926 года рождения, беспартийный, стрелок.

При прорыве немецкой обороны одним из первых ворвался в траншеи противника, забрасывая их гранатами. При штурме опорного пункта на подступах к городу Лепелю он поднялся в атаку и увлек за собой остальных бойцов. За период боев им уничтожено 17 немцев. В бою 2 июля при отражении вражеской контратаки был ранен, но ушел с поля боя только тогда, когда была отбита контратака.

Все отличившиеся в боях представлены к правительственной награде.

Начальник политотдела 306
Стр. Рибшевской дивизии
гвардии полковник (Гетманов)

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 306 сд. Воп. 165659. Спр. 2. Л. 36—37.

З дзённіка баявых дзеянняў 10-ай гвардзейскай
Гарадоцкай асобнай танкавай брыгады ў аперацыі «Баграціён»

23.06. Наступленне на Шуміліна.

24.06. ...на зыходзе дня ачысцілі ад захопнікаў вёскі: Дзедаўшчына, Міткавічы, брыгада выйшла да р. Заходняя Дзвіна.

25.06. Брыгада зрабіла пераправу цераз рэчку Заходняя Дзвіна і выйшла ў раён Шарыпіна.

27.06. Брыгада ў вёсцы Свеча.

28.06. Ноччу з 27 на 28 чэрвеня — атака брыгады з раёна Залессе на Лепель з часцямі першага стралковага корпуса.

У 7.30 28 чэрвеня брыгада з дэсантам мотастралкова-кулямётнага батальёна ўварвалася ў горад Лепель і стала на абарону заходняй і паўднёва-заходняй ускраін горада.

29.06. Наведзена пераправа цераз р. Эсу, брыгада праследуе праціўніка на захад і заняла: Поплаўкі, Аўгустова, затым Слабодку і Пышна.

Падрыхтаваў намеснік камандзіра брыгады па т/ч, старшыня савета ветэранаў гвардыі палкоўнік Н.В. Іконнікаў

Ваенны будаўнік

Калі лепяльчане адзначалі 40-годдзе вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, на ўрачыстасці прыехалі многія былыя воіны, якія прымалі ўдзел у баях за горад. Прозвішчы многіх былі названы на сустрэчах з працоўнымі. Сярод іх капітан Аляксей Кузьміч Дорахаў, інжынер аднаго з палкоў 357-ай стралковай ордэна Суворава II ступені дывізіі.

Да Вялікай Айчыннай вайны ён быў будаўніком. Яго прафесія спатрэбілася і на фронце. Узводзіў масты, рамантаваў

дарогі, па якіх нашы войскі ішлі на захад. Рабіў гэта пастаянна ў баявой абстаноўцы і ў непасрэднай блізкасці ад праціўніка. Нярэдка пад варожым агнём. Ды хіба гэта магло спыніць ваенных будаўнікоў, перашкодзіць ім рабіць сваю нялёгкую, але вельмі патрэбную справу.

Нашы часці наступалі, і абавязак будаўнікоў быў у тым, каб стварацъ для гэтага спрыяльныя ўмовы.

Капітан А.К. Дорахаў выконваў свае абавязкі як падабае воіну. У час наступлення на Лепель ён ажыццяўляў інжынернае забеспячэнне. Нярэдка прыходзілася пускаць у ход ручны кулямёт, які быў у яго. Полк вёў баі, і не раз кулямёт палкавога інжынера паліваў агнём праціўніка.

У баях за Лепель капітан праявіў сябе смелым воінам. Ён быў узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі. І гэта была яго першая ўзнагарода. Затым атрымаў яшчэ тры ордэны.

Калі скончылася Вялікая Айчынная вайна, капітан А.К. Дорахаў вярнуўся ў родны горад Чымкент Казахскай ССР. Перад выхадам на пенсію працаваў прарабам на будаўніцтве завода фосфарнай солі.

П. Фралоў.
Газета «Ленінскі сцяг», 1984. 18 вер.

У баях за Лепель

У вызваленні горада Лепеля ў саставе 7-ай мехбрыгады ваяваў гвардыі малодшы лейтэнант Віктар Іванавіч Кандакоў. Ён працаваў да вайны ў Ташкенце. Там вучыўся ў аэраклубе. Скончыўшы вучобу, ён паступіў у ваенна-паветранае вучылішча, але лётчыкам не стаў. Пачалася вайна. Сумесна з групай таварышаў курсант падаў заяву аб адпраўцы яго на фронт. Сяржант стаў камандзірам стралковага аддзялення, а ў 1943 годзе скончыў спецыяльныя курсы. Яму было прысвоена афіцэрскае званне.

...Кулямётчыкі ішлі ў бой на танках або за танкамі. І там, дзе не маглі прайсці грозныя машыны, праходзілі гвардзейцы са сваімі кулямётамі. Брыгаду ўвялі ў прарыў, а яна працягвала рухацца на Лепель. На подступах да Лепеля кулямётны ўзвод тройчы ўступаў у бой. Два разы ён адбіваў контратакі, а на трэці раз паўстаў на шляху гітлераўцаў, якія зрабілі спробу вырвацца з акружэння, каб прарвацца ў Лепель, дзе яшчэ былі нямецкія войскі.

У ліку першых малодшы лейтэнант Кандакоў В.І. увайшоў у Лепель. Пры яго вызваленні, а затым у баях пры вызваленні раёна кулямётчыкі знішчылі больш за 50 фашыстаў і 28 захапілі ў палон.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 года гвардыі малодшы лейтэнант Кандакоў Віктар Іванавіч быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Удзельнічаў у баях за Вільнюс і Шаўляй.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны В.І. Кандакоў працаваў у органах міліцыі Бранскай вобласці.

П. Фралоў.
Газета «Ленінскі сцяг», 1982. 30 снеж.

У небе лепельскім

У вызваленне Лепельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў унеслі свой уклад лётчыкі. Летам 1944 г. маёр Г.М. Дзянісаў быў намеснікам камандзіра 683-га авіяцыйнага штурмавога палка і ўдзельнічаў у вызваленні Лепельшчыны. Ваявалі лётчыкі ў цесным кантакце з танкістамі.

Жорсткія баі ішлі каля вёскі Камень. Яшчэ да падыходу стралковых часцей маёр Г.М. Дзянісаў вадзіў туды сямёрку «ілаў» для штурму нямецкіх войск на дарогах. А было іх там нямала. Удары з паветра наносілі значны ўрон праціўніку, не давалі сканцэнтраваць сілы. А калі варожыя часці імкнуліся выйсці з-пад удару наземных войск, іх даганялі лётчыкі.

У дакументах палка, якія захоўваюцца ў ваенным архіве, расказваецца, што М.І. Саламацін, камандзір звяна самалётаў-штурмавікоў Іл-2, у небе над Лепелем быў сем разоў. Першы раз яго звяно атакавала гітлераўцаў на дарогах Камень — Лепель і Лепель — Пышна. На дарогах Камень — Лепель было многа варожых войск. Двац-

цаць кіламетраў дарогі на Лепель адпрасавалі лятаючыя крэпасці. Пасля зрабілі налёт на пышнянскую дарогу. Звярнулі направа і абстралялі ворага каля вёсак Забалацце, Заазер'е і Забароўе і зноў з'явіліся над дарогай Камень — Лепель. Гітлераўцы думалі, што савецкія лётчыкі пакінулі іх у спакоі, і аднавілі рух. На гэты раз лётчыкі знізіліся бліжэй да зямлі і на брыючым палёце атакавалі варожыя калоны.

У ліку тых, хто адважна граміў ворага, быў паветраны стралок-радыст І.В. Капейкін. У саставе экіпажа пікіруючага бамбардзіроўшчыка ён прымаў удзел у разгроме праціўніка ў раёне Лепеля, каля вёсак Камень і Старое Лядна. Ён вызначыўся ў гэтых аперацыях. Некалькі разоў лётаў экіпаж на разведку і фатаграфаванне тэрыторыі, занятай ворагам.

За выдатныя баявыя дзеянні, у тым ліку за актыўны ўдзел у вызваленні Лепельскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 23.02.45 г. І.В. Капейкіну было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Другі паветраны стралок, які ваяваў у небе Лепельшчыны, І.Д. Варушын. Ён нёс службу у 953-ім авіяцыйным штурмавым Віцебскім ордэна Суворава і Кутузава палку. 28 чэрвеня 1944 г. ён удзельнічаў у штурме варожых войск у вёсках Забароўе, Камень, Старое Лядна.

А пасля вайны І.Д. Варушын асвойваў залежныя землі, быў сакратаром парткома ў адным з саўгасаў. Да ваенных узнагарод і чатырох ордэнаў, сярод якіх тры ордэны Славы ўсіх трох ступеняў, прыбавіўся ордэн за працу — «Знак Пашаны».

Жыве І.Д. Варушын у г. Паўладары, працуе ў таварыстве «Веды».

Герой Савецкага Саюза Б.А. Хлуд ваяваў у складзе 115-га гвардзейскага знішчальнага авіяцыйнага палка. Ваяваў храбра. Удзельнічаў у вызваленні г. Лепеля.

Не вярнуўся з баявога задання ў р-не Пышна 28.06.44 г. малодшы лейтэнант, лётчык 683-га штурмавога авіяцыйнага палка 335-ай штурмавой авіяцыйнай дывізіі І.М. Маурын.

А.У. Стэльмах

КУЧМА Пётр Міхайлавіч. У вызваленні Лепеля прымала ўдзел 211-ая штурмавая авіяцыйная дывізія. Камандаваў ёю палкоўнік П.М. Кучма. Летчыкі дывізіі ляталі на самалётах Іл-2, якіх немцы вельмі баяліся з-за высокіх баявых вартасцей, называлі іх «лятаючымі танкамі». Яны штурмавалі адступаючага праціўніка на дарогах. За баі за Лепель камандзір П. Кучма быў узнагароджаны ордэнам баявога Чырвонага Сцяга.

Газета «Лепельскі край», 1993. 26 чэрв.

ДЗЯНІСАЎ Георгій Міхайлавіч, нарадзіўся 1 верасня 1917 г. у г. Цямрук, цяпер Краснадарскі край, у сям'і рабочага, рускі. Член партыі з 1941 г. Адукацыя сярэдняя. У Савецкай Арміі з 1936 г. У 1939 г. скончыў Сталінградскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча.

На франтах Вялікай Айчыннай вайны з мая 1943 г. Намеснік камандзіра 683-га штурмавога авіяцыйнага палка (335-ая штурмавая авіяцыйная дывізія, 3-яя паветраная армія, 3-і Беларускі фронт). Удзельнічаў у разгроме віцебска-лепельскай групоўкі праціўніка.

Да красавіка 1945 г. здзейсніў 150 баявых вылетаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 29.06.1945 г.

Пасля вайны служыў у ВПС. У 1956 г. скончыў Ваенную акадэмію Генштаба. У 1974 г. генерал-маёр авіяцыі Г.М. Дзянісаў звольнены ў запас.

Узнагароджан ордэнам Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Яго імя носіць школа № 62 г. Кіева.

САЛАМАЦІН Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся 3 кастрычніка 1920 г. у с. Пірагова, цяпер Серпухаўскі р-н Маскоўскай вобл., у сям'і селяніна. Рускі, член партыі з 1942 г., скончыў 8 класаў, працаваў электраманцёрам. У Савецкай Арміі з 1940 г. У 1942 г. скончыў Краснадарскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча.

У дзеючай арміі з чэрвеня 1944 г. Камандзір звяна 683-га штурмавога авіяцый-

нага палка (335-ая ш.а.д., 3-яя паветраная армія). Удзельнічаў у разгроме віцебскалепельскай групоўкі ворага. Да мая 1945 г. здзейсніў 103 баявыя вылеты.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 29.06.1945 г.

З 1946 г. — у запасе. Працаваў лётчыкам у ГВФ. З 1951 г. прызваны ў Савецкую Армію. З 1958 г. капітан М.І. Саламацін — у запасе. Працаваў у інстытуце металургіі ў Маскве.

Узнагароджан ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, трыма ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

ХЛУД Барыс Аляксеевіч, нарадзіўся 24 чэрвеня 1917 г. у г. Бежыца, цяпер у межах Бранска, у сям'і служачага, рускі, член партыі з 1942 г., скончыў 2 курсы Кіеўскага механічнага тэхнікума, працаваў токарам на заводзе «Арсенал», інструктарам цэнтральнага аэраклуба ў Кіеве. У Савецкай Арміі з 1938 г. У 1938 г. скончыў Адэскую ваенную школу пілотаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. Камандзір эскадрыллі 146-га знішчальнага авіяцыйнага палка (7-ая гвардзейская знішчальная авіяцыйная дывізія, 2-і знішчальны авіяцыйны корпус, 1-ая паветраная армія, Заходні фронт). У 52 паветраных баях збіў 11 самалётаў асабіста і ў складзе групы — 1 самалёт праціўніка. Удзельнічаў у разгроме віцебскалепельскай групоўкі праціўніка.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 2.09.1943 г.

З 1946 г. — у запасе, жыве ў Кіеве.

Працаваў начальнікам аўташколы ДТСААФ, начальнікам групы ў НДІ. Узнагароджан ордэнамі Леніна, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені, двума — Чырвонага Сцяга і медалямі.

Гэты дзень настаў

Лепель быў вызвалены 28 чэрвеня 1944 г. у ходзе аперацыі «Баграціён», яе першай часткі — Аршанска-Віцебскай аперацыі. У вызваленні г. Лепеля ўдзельнічалі войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў. Войскі 1-га Прыбалтыйскага павінны былі наступаць праз Полацк, Глыбокае, Свянцяны на Шаўляй, адсякаючы групу арміі «Поўнач» ад групы «Цэнтр», выходзячы на Балтыку ў раёне Клайпеды.

3-і Беларускі фронт рухаўся на Віцебск—Оршу праз Мінск, Маладзечна, Вільнюс, Каўнас, Ліду да межаў Усходняй Прусіі. Такім чынам, Лепель знаходзіўся на мяжы двух франтоў.

Перад войскамі 1-га Прыбалтыйскага фронту стаяла задача: пасля акружэння Віцебска развіваць наступленне на Лепель, дзеля гэтага фарсіраваць р. Заходнюю Дзвіну, авалодаць Бешанковічамі, вызваліць Чашнікі і ва ўзаемадзеянні з правым крылом 3-га Беларускага фронту наступаць на Лепель. Непасрэдна разграміць лепельскую варожую групоўку і авалодаць Лепелем павінны былі войскі 43-яй арміі ва ўзаемадзеянні з 39-ай арміяй 3-га Беларускага фронту.

25 чэрвеня, у канцы дня, дывізіі 60-га ск злучыліся на поўдзень ад Гняздзілавічаў з часцямі 39-ай арміі, завяршылі акружэнне Віцебска. Генерал арміі камандуючы 1-ым Прыбалтыйскім фронтам І.Х. Баграмян загадаў генерал-лейтэнанту А.П. Белабародаву стварыць армейскую рухомую групу і разгортваць галоўнымі сіламі наступленне на Лепель.

25 чэрвеня 1944 г. на ўсход ад Бешанковічаў нашы войскі перарэзалі шашу Віцебск—Лепель.

Танкавае падмацаванне рухомай армейскай групе забяспечвалі 10-ая гв. танкавая брыгада палкоўніка М.У. Волкава, 39-ая гвардзейская танкавая брыгада палкоўніка І.П. Калініна.

Эфектыўную падтрымку пяхоце аказвалі лётчыкі генерала Папівіна (маёр Дзянісаў, лейтэнант Саламацін і інш.).

Удзельнічала ў вызваленні г. Лепеля 7-ая мехбрыгада 3-га Сталінградскага мехкорпуса. Камандзір яго гвардыі генерал Абухаў атрымаў загад выйсці да р. Бярэзіны не пазней 28 чэрвеня 1944 г., авалодаўшы Бягомлем, Плешчаніцамі, Мсціжам. Для забеспячэння дзеянняў корпуса з поўначы генерал Абухаў паставіў перад

камандзірам 7-ай механізаванай брыгады М.І. Радзівонавым задачу авалодаць г. Лепелем і ўтрымліваць яго да падыходу пяхоты 1-га Прыбалтыйскага фронту.

26 чэрвеня пачалося наступленне 7-ай механізаванай брыгады з раёна Лукомля ў накірунку на Лепель. Абараняў Лепель 99-ы пяхотны полк праціўніка.

Падыходы да Лепеля з паўднёвага ўсходу былі замініраваны, немцы трымалі моцную абарону. Па дарозе на Лепель гітлераўцы займалі прамежкавыя рубяжы. Брыгада з баямі прасоўвалася да Лепеля. Рухаючыся па дарозе Бор — Чэрцы — Залессе, брыгада каля в. Залессе павярнула направа і лясамі за ноч выйшла на шашу Камень — Лепель. Перадавы атрад брыгады ў складзе танкаў, мотапяхоты, артылерыі фарсіраваў р. Улу і да раніцы выйшаў да паўночна-ўсходняй ускраіны горада.

На світанку 28 чэрвеня 1944 г. брыгада разгарнулася і на вялікіх хуткасцях, без папярэдняй падрыхтоўкі атакавала гітлераўцаў з тылу. Разведчыкі капітана Шульжэнкі, прабраўшыся лясамі (Залессе — Лепель), з боку Сянно адцягнулі ўвагу праціўніка, вызываючы агонь на сябе, імітуючы наступленне з усходу.

Рота лейтэнанта Плотнікава выйшла прама на камандны пункт 99-га пяхотнага палка фашыстаў. Мост праз р. Эсу захапіла рота ст. лейтэнанта Г.А. Шандрука. Мотастралковыя роты батальёна Алабушава на правым флангу прайшлі аж да цэнтра горада, не сходзячы з машын. У цэнтры горада немцы аказалі супраціўленне.

Галоўны ўдар брыгада наносіла левым флангам па ўмацаваннях праціўніка ўздоўж шашы Лепель — Бягомль і па ўсходняй частцы горада.

На Лепельскім напрамку наступала 43-яя армія. Супраць яе гітлераўцы выкарыстоўвалі часці 201-ай ахоўнай дывізіі і падраздзяленні ваеннай школы 3-яй танкавай арміі (у раёне Іканкі, 14 км на ўсход ад Лепеля).

Паспяховае развіццё Віцебскай аперацыі дазволіла камандаванню 43-яй арміі направіць галоўныя сілы, 1-га стралковага корпуса і большую частку танкаў арміі ў напрамку Лепель, Глыбокае, каб забяспечыць разгром лепельскай групоўкі немцаў і ва ўзаемадзеянні з 6-ай арміяй перашкодзіць ворагу перакінуць войскі з саставу групы армій «Поўнач» у паўднёвым накірунку, сарваць мерапрыемствы па арганізацыі абароны па рацэ Бярэзіна на лініі Шаркаўшчына — Маладзечна.

25 чэрвеня 1944 г. 306-ая стралковая дывізія ва ўзаемадзеянні з 46-ай мехбрыгадай і 6-ай гвардзейскай арміяй авалодала Бешанковічамі.

Да канца дня 26 чэрвеня 1944 г. на падручных сродках 306-ая стралковая дывізія перадавымі часцямі фарсіравала р. Улу. У ноч на 27 чэрвеня р. Ула была фарсіравана галоўнымі часцямі 306-ай стралковай дывізіі.

357-ая стралковая дывізія, уведзеная ў бой з левага флангу, да канца дня 26 чэрвеня авалодала рубяжом Наддачы — В. Ведрань. А левафланговы корпус 6-ай гвардзейскай арміі з 24-ым танкавым палком і 46-ай мехбрыгадай наступаў на Камень і да 7 гадзін 27 чэрвеня захапіў Бачэйкава. За суткі 1-ы стралковы корпус прайшоў 32 кіламетры.

На лініі Камень — Лепель немцы сканцэнтравалі асноўныя сілы 201-ай ахоўнай дывізіі і падраздзяленні школы знішчальнікаў танкаў 3-яй танкавай арміі. Сюды ж з р. Бярэзіны падцягнулі часці 95-ай пяхотнай дывізіі, а таксама 212-ую пяхотную дывізію з раёна Пскова.

27 чэрвеня 1944 г. генерал-лейтэнант А.П. Белабародаў сфарміраваў рухомую групу. Яе ўмацавалі 1203-ім самаходным і 712-ым знішчальным супрацьтанкавым палкамі. Гэта група наносіла ўдар па Чашніках і да 15 гадзін 27 чэрвеня павінна была авалодаць г. Лепелем, утрымліваць яго да падыходу часцей 1-га стралковага корпуса.

Армейская група фарміравалася на хаду, затрымлівалася на пераправах, былі спазненні з падвозам гаручага. У бой рухомая група была ўведзена са спазненнем. Да 14 гадзін 27 чэрвеня яна дагнала перадавыя часці 357-ай стралковай дывізіі і ва ўзаемадзеянні з імі і 2-ой партызанскай брыгадай Заслонава з боем авалодала г. Чашнікі. 27 чэрвеня былі вызвалены Батукалава, Камень, Замошша (Сушанскага с/с). К канцу дня ў жорсткіх баях 1-ы стралковы корпус і танкавыя групы авалодалі вузлом дарог з населенымі пунктамі Плоткі і Іканкі, Ласосніца.

28 чэрвеня 1944 г. войскі 1-га стралковага корпуса 43-яй арміі ва ўзаемадзеянні з 46-ай механізаванай і 10-ай танкавай брыгадамі, 39-ай танкавай брыгадай з конна-механізаванай групы 3-га Беларускага фронту ўварваліся ў г. Лепель. Гэтыя падзеі завяршылі Віцебскую аперацыю.

Баі па вызваленні краю працягваліся. 28 чэрвеня 357-ая стралковая дывізія вызваліла в. Саламахі, Клёўзы, М. Пышнагоры, на наступны дзень вяла баі за Поплаўкі і В. Пышнагоры. 29 чэрвеня 306-ая стралковая дывізія вяла баі ў раёне Заазер'я. Да 30 чэрвеня войскі 306-ай і 357-ай стралковых дывізій выйшлі да р. Бярэзіны.

30 чэрвеня 1944 г. 7-ая мехбрыгада атрымала загад пераправіцца цераз р. Бярэзіну ў раёне Бягомля і наступаць на Вілейку.

7-ай мехбрыгадзе была пастаўлена задача авалодаць Лепелем, каб забяспечыць правы фланг 3-му механізаванаму корпусу — дзеля таго, каб з ходу змог фарсіраваць р. Бярэзіну.

28 чэрвеня, з ходу фарсіраваўшы Сергуцкі канал, перадавы атрад 35-ай танкавай брыгады выйшаў да р. Бярэзіны. Завязаўся бой, які працягваўся ўсю ноч. Раніцай аўтаматчыкі перайшлі раку ўброд, замацавалі плацдарм. Пачалі разам з партызанамі будаваць мост ля в. Прыстань. Але мост аказаўся недастатковай грузападымальнасці. К канцу дня 28 чэрвеня пераправілі асабісты састаў, частку машын, але танкі заставаліся ў лесе на ўсход ад в. Прыстань.

Тое ж адбылося і з перадавым атрадам 9-ай мехбрыгады. Пабудаваны каля в. Ніўкі мост быў разбураны нямецкай авіяцыяй. Уброд фарсіравала Бярэзіну каля в. Кальнікі 277-ая стралковая дывізія.

Больш спрыяльныя ўмовы склаліся для 8-ай мехбрыгады. Яна разам з ротай 62-га сапёрнага батальёна выйшла да ракі ў раёне в. Броды. Тут была пабудавана пераправа для танкаў і аўтатранспарту. Асноўныя сілы брыгады фарсіравалі р. Бярэзіну. На працягу дня 1 ліпеня была закончана пераправа праз р. Бярэзіну ўсіх астатніх злучэнняў.

Войскі пайшлі далей на захад.

А.У. Стэльмах

Ганаровыя грамадзяне Лепеля

ВОЛКАЎ Мікалай Уладзіміравіч, нарадзіўся 24 сакавіка 1908 г. у в. Міхабабаева Пскоўскага р-на Пскоўскай вобл., рускі, член партыі з 1932 года. У арміі з 1930 года. Служыў у Забайкаллі на пасадах: 1931 г. — сяржант, механік-вадзіцель танка Т-26; 1932—1933 гг. — старшына, камандзір танка Т-26; камандзір танка БТ; 1934 г. — камандзір танкавага ўзвода; 1935 г. — камандзір танкавага ўзвода палкавой школы; 1939—1940 гг. — слухач ЛКБТ курсаў у г. Ленінградзе, прысвоена званне старшы лейтэнант.

У дзеючай арміі з 1941 г., на пасадзе начальніка аддзялення па баявой падрыхтоўцы АБТО 16-ай арміі ў званні капітана, у 1942 г. — у званні маёра выконвае абавязкі намесніка начальніка аператыўнага аддзела ў аўтабронетанкавым аддзеле 16-ай арміі да прызначэння ў 10-ую гвардзейскую асобную танкавую брыгаду.

28 чэрвеня 1944 г. брыгада з дэсантам мотастралковага кулямётнага батальёна ўварвалася ў г. Лепель і стала ў абарону на заходняй і паўднёва-заходняй ускраінах горада. 29 чэрвеня — наведзена пераправа цераз р. Эсу, брыгада гоніць праціўніка на захад і заняла населеныя пункты: Поплаўкі, Аўгустова, Слабодку, Пышна.

Па ўспамінах ветэранаў брыгады, М.В. Волкаў быў таленавітым, смелым камандзірам. За прарыў абароны праціўніка, за ўдзел у вызваленні горада Лепеля і далейшае паспяховае наступленне гвардыі палкоўнік Мікалай Уладзіміравіч Волкаў быў узнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга.

Пасля вайны працягваў службу ва ўпраўленні баявой падрыхтоўкі Галоўнага ўпраўлення БТ і МВ Савецкай Арміі. У 1960 г. звольніўся ў запас з радоў арміі. Узнагароджан ордэнамі Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу» і іншымі медалямі, а таксама ордэнамі Аляксандра Неўскага і Айчыннай вайны I ступені.

13. Зак. 434.

Рашэннем Лепельскага РБ КПБ і выканкама гарадскога Савета народных дэпутатаў ад 18 ліпеня 1984 года за адвагу, гераізм і ўмелае камандаванне 10-ай гвардзейскай Гарадоцкай Чырванасцяжнай ордэна Суворава асобнай танкавай брыгадай у час баёў за вызваленне горада Лепеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у чэрвені 1944 года і ў сувязі з 40-годдзем вызвалення Беларусі, раёна і горада Волкаву Мікалаю Уладзіміравічу прысвоена званне ганаровага грамадзяніна г. Лепеля Віцебскай вобласці.

Сакратар Лепельскага райкама КПБ *А. Хрусцель*

Старшыня гарвыканкама *В. Захарава*

У.М. Волкаў

М.І. Радзівонаў

РАДЗІВОНАЎ Міхаіл Іосіфавіч, нарадзіўся 20 ліпеня 1902 г.у в. Колесава, цяпер Задонскі р-н Ліпецкай вобл., у сям'і селяніна. Рускі, член партыі з 1920 г. Скончыў пачатковую школу, працаваў табельшчыкам на цукровым заводзе у г. Ялец. У Савецкай Арміі з 1920 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў КУКС у 1921 г., КУКС пры Арлоўскай бранятанкавай школе — у 1932 г.

На франтах Вялікай Айчыннай вайны з 1942 г. 7-ая механізаваная брыгада, (3-і гвардзейскі механізаваны корпус 3-га Беларускага фронту) пад камандаваннем гвардыі палкоўніка М.І. Радзівонава вызначылася ў ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі: праследуючы адступаючага ворага, брыгада ўварвалася ў г. Лепель і пры падтрымцы іншых часцей 28.06.1944 г. вызваліла яго.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4.07.1944 г.

Пасля вайны працягваў службу ў арміі. У 1952 г. скончыў КУОС пры Ваеннай акадэміі бранятанкавых і механізаваных войск. З 1952 г. генерал-маёр М.І. Радзівонаў у запасе (адстаўнік). Жыў у Кіеве. Ганаровы грамадзянін г. Лепеля.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

Памёр 26 мая 1987 г. Пахаваны на Лук'янаўскіх могілках у г. Кіеве.

Віншаванне Радзівонаву М.І.

Рашэннем выканкама Лепельскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных ад 26 чэрвеня 1967 года № 61 Вы абраны Ганаровым грамадзянінам горада Лепеля Віцебскай вобласці БССР.

Гарадскі Савет і ўсе працоўныя горада Лепеля жадаюць вам добрага здароўя, шчасця, сямейнага жыцця, поспехаў у працы на карысць нашай сацыялістычнай Радзімы.

Выканкам Лепельскага гарадскога Савета.

ЛАБАНОК Уладзімір Елісеевіч, нарадзіўся 20 чэрвеня 1907 г. у в. Востраў Ігуменскага павета Мінскай губерні, цяпер Пухавіцкі раён. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза (1943 г.). Дзяржаўны і партыйны дзеяч. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ў 1931 г., ВПШ пры ЦК КПСС у 1956 г. З 1941 г.— першы сакратар Лепельскага райкама КП(б)Б. Са жніўня 1941 г. да чэрвеня 1944 г.— першы сакратар Лепельскага падпольнага райкама КП(б)Б, адначасова з сакавіка 1942 г.— камандзір 68-га партызанскага атрада, са жніўня 1942 г.— камісар Чашніцкай партызанскай брыгады «Дубава», з ліпеня 1943 г.— камандзір Лепельскай партызанскай брыгады імя Сталіна. У снежні 1943 г. узначаліў аператыўную групу ЦК КП(б)Б і БШПР па Полацка-Лепельскай партызанскай зоне. З 1944 г.— у апараце

Ф.П. Занько — кавалер трох ордэнаў Славы

І.М. Туфтоў — Герой Савецкага Саюза

ЦК КПБ, старшыня Полацкага і Гомельскага аблвыканкама, першы сакратар Палескага, Віцебскага абкамаў КПБ. З 1962 г. — першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, міністр вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў БССР. З 1974 г. — намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Член Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС у 1961—1976 гг. Член ЦК КПБ з 1949 г., кандыдат у члены Бюро ЦК КПБ з 1962 г. і з 1976 г., член Бюро ЦК КПБ у 1966—1976 гг., дэпутат Вярхоўнага Савета СССР з 1946 г., БССР — у 1951—1955 гг., з 1963г. — намеснік Старшыні Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР. Аўтар кніг «У баях за Радзіму» (3-яе выданне, 1964), «Партызаны прымаюць бой» (1976). Яго імем названы саўгас-тэхнікум у г. Мар'іна Горка, Лепельская СШ № 1, вуліцы ў Лепелі і Мінску.

Памёр у 1984 г.

Героі-землякі*

ДЗІВІН Раман Антонавіч, нарадзіўся 19.11(1.12).1893 г. у в. Кальнікі Лепельскага павета Віцебскай губерні. З сялян. Член КПСС з 1918. Скончыў Вышэйшую артылерыйскую школу (1922), Вышэйшую ваенную педагагічную школу (1927). У арміі з 1914, у Чырвонай Арміі з красавіка 1918, удзельнік грамадзянскай вайны. Са снежня 1918 да сакавіка 1921 на Паўднёвым, Заходнім, Паўночна-Заходнім франтах — камандзір узвода, батарэі; удзельнік разгрому кранштацкага мяцяжу. Генерал-маёр артылерыі (1940). У Айчынную вайну начальнік ППА Паўднёва-Заходняга напрамку, камандзір зенітна-артылерыйскай дывізіі Цэнтральнага фронту. Удзельнік абароны Палтавы, Харкава, Варонежа, баёў каля Белгарада, на Арлоўска-Курскай дузе. З 1945 — у войсках ППА, Галоўным штабе ВПС. З ліпатада 1950 — у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 5 іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр 21.03.1957.

ЖАРНАСЕК Ілья Максімавіч, нарадзіўся 02.08.1918 г. у в. Падымхі Лепельскага павета Віцебскай губерні. З сялян. У Чырвонай арміі з 1938. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940. У Айчынную вайну начальнік фінансавага забеспячэння шпіталя і штаба арміі. Член КПСС з 1942. Скончыў Ваенную акадэмію тылу і забеспячэння (1947). З 1953 — навуковы супрацоўнік, начальнік аддзела ў Міністэрстве абароны СССР; з 1965 — начальнік кафедры Ваеннай акадэміі тылу і транспарту; генерал-маёр (1966), доктар ваенных навук (1967), прафесар (1968). Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі. Памёр у 1993 г.

ЗАНЬКО Фёдар Пятровіч, нарадзіўся 22.09.1921 г. у в. Занькі Лепельскага р-на. З 1940 г. у Чырвонай Арміі, з 1941-га — на фронце. У 1943 г. скончыў школу паветраных стралкоў. Удзельнік баёў пад Сталінградам. Паветраны стралок авіяпалка гвардыі старшына Ф.П. Занько вылучыўся ў баях за вызваленне Крыма, Беларусі і Усходняй Прусіі. Здзейсніў 234 баявыя вылеты на штурмоўку жывой сілы і тэхнікі ворага, у паветраных баях збіў 3 варожыя самалёты. Кавалер ордэна Славы 3 ступеняў. Пасля вайны Ф.П. Занько працаваў у калгасе кавалём. Памёр 9.05.1979 г.

ТУФТОЎ Іван Мікітавіч, нарадзіўся 24.12.1912 г. у в. Гарадзінец Лепельскага раёна. На фронце з 1941 г. Кулямётчык, радавы. Вылучыўся ў баях за вызваленне Украіны. У сакавіку 1944 г. у час пераправы савецкіх войскаў цераз Паўднёвы Буг агнём з кулямёта знішчыў дзве кулямётныя кропкі ворага, на самаробным плыце пераправіў кулямёт і ў баях за плацдарм знішчыў больш за 20 гітлераўцаў.

* Звесткі пра Герояў Савецкага Саюза ўзяты з кнігі «Герои Советского Союза». Т. 1, 2. М., 1987.

22.03.1944 г. у раёне г. Магілёў-Падольскі з кулямётам фарсіраваў Днепр і працягваў наступленне.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 13.09.1944 г. Памёр 21.07.1974 г.

Слаўны танкіст

ТАМАШЭВІЧ Мікалай Мікалаевіч, нарадзіўся 13.05.1921 г. у в. Н. Валосавічы Лепельскага р-на.

З 1941 г. на фронце. Удзельнік баёў у Эстоніі, Запаляр'і. Камандзір танка гвардыі малодшы лейтэнант вызначыўся ў баях за вызваленне Ленінградскай вобл.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 28.08.1944 г.

Да 1956 г. служыў у Савецкай Арміі.

М.М. Тамашэвіч — Герой Савецкага Саюза

П.У. Ялугін — Герой Савецкага Саюза

У студзені 1944 г. пачалася Ленінградска-Наўгародская наступальная аперацыя нашых войск, мэтай якой быў прарыў блакады Ленінграда. У ходзе наступлення першаму батальёну брыгады было загадана авалодаць вёскай Кшэнціцы. Тут гітлераўцы стварылі моцны апорны пункт. Па папярэдніх дадзеных разведкі, у вёсцы знаходзілася каля 25 супрацьтанкавых гармат, некалькі мінамётных батарэй. Але дзе яны знаходзіліся, было невядома. Выявіць іх вырашылі разведкай боем. Гэтую складаную задачу даручылі Тамашэвічу — камандзіру танка 7-ай гвардзейскай танкавай брыгады 8-ай арміі Ленінградскага фронту.

Праз некалькі хвілін танк Тамашэвіча рухаўся ў патрэбным кірунку, за ім астатнія баявыя машыны падраздзялення. На палянцы яны спыніліся, і далей пайшоў танк Мікалая Тамашэвіча.

І калі баявая машына панеслася да вёскі, Тамашэвіч замяніў наводчыка гарматы. Не таму, што не давяраў яму, а таму, што сам лічыўся ў батальёне «танкавым снайперам», бо лепш за ўсіх трапляў у цэль.

Дакладна ў трынаццаць гадзін танк Тамашэвіча ўварваўся ў Кшэнціцы. У гэты час фашысты абедалі. Убачыўшы палявую кухню і салдат ля яе, вадзіцель Сергіенка на поўным хаду наляцеў на іх. Некалькі гітлераўцаў кінуліся да гарматы, але Мікалай Мікалаевіч двума снарадамі знішчыў гармату з разлікам.

Танкісты працягвалі рэйд. Праскочылі ў канец вёскі, развярнуліся, падмяўшы пад сябе адну супрацьтанкавую гармату, потым — другую. Камандзір танка вёў агонь па іншых цэлях.

Скіраваўшы ўвагу на адзінкавы савецкі танк, які бясстрашна атакаваў іх, фашысты не заўважылі, як да вёскі наблізілася танкавая рота гвардзейцаў. Яна без бою захапіла варожую батарэю, потым — другую, знішчыла гарматы.

Хаця праціўнік панёс вялікія страты, аднак сілы ў яго яшчэ хапала. Нашы танкісты таксама панеслі страты. Пад вечар быў падбіты і танк Тамашэвіча. Загінуў механік-вадзіцель Сергіенка. Тамашэвіч сам сеў за рычагі. У гэты момант снарад разбіў правую гусеніцу. Агнём ад выбуху апаліла твар камандзіра. Тамашэвіч падняўся у вежу, агледзеў мясцовасць. Заўважыў хлеў, у сцяне якога было выстаўлена бервяно, і ўспышку ад выстралу. Зразумеў, што там схавана гармата. Дакладнымі выстраламі Тамашэвіч знішчыў агнявую кропку.

Толькі ноччу, калі скончыўся боезапас, танкісты пакінулі баявую машыну, вярнуліся ў часць. Заданне было выканана.

У многіх баях удзельнічаў танкіст. Але гэты бой яму запомніўся на ўсё жыццё. За яго М.М. Тамашэвічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Горад на Няве захоўвае добрую памяць аб храбрым лепяльчаніне. Яго імя высечана на мармуровай дошцы, якая знаходзіцца ў Памятнай зале велічнага манумента, створанага ў гонар гераічных абаронцаў Ленінграда.

А. Каваленка, г. Ленінград

Пераправа, пераправа

ЯЛУГІН Павел Уладзіміравіч, нарадзіўся 02.09.1910 г. у в. Янова Лепельскага раёна.

Закончыў ваеннае пяхотнае вучылішча. З 1941 г. на Паўночна-Заходнім, Сталінградскім, 3-ім Украінскім франтах. Удзельнік абароны Севастопаля. Гвардыі капітан, камандзір стралковага батальёна. Вызначыўся ў баях пры фарсіраванні Дняпра каля Днепрапятроўска.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 9 сакавіка 1944 г., падпалкоўнік. Жыў у Маскве.

— Вайна застала мяне ў Новарасійску. Толькі што закончыў ваеннае вучылішча, — пачаў свой расказ Павел Уладзіміравіч Ялугін. — А 29 чэрвеня нас перакінулі ўжо да Літвы. Назаўтра давялося сустрэцца з фашыстамі і прыняць бой. Там мяне параніла першы раз. Лячыўся я ў Краснадары. Пасля ваяваў у Крыму, быў ранены другі раз. Зноў падлячыўся. Трапіў на Сталінградскі фронт. Трымалі абарону. Удзельнічаў у ліквідацыі акружанай варожай групоўкі. Нашу 39-ую гвардзейскую стралковую дывізію перакінулі пад Калач, і адтуль мы пагналі фашыстаў да Сталінграда. Яны ж вельмі хацелі туды, а цяпер спрабавалі вырвацца з акружэння. Далей — Арлоўска-Курская дуга, Днепр...

У той час я быў начальнікам штаба батальёна. Цэлы дзень назіраў за праціўнікам, які замацаваўся на правым беразе магутнай ракі, вышукваючы больш зручнае месца для пераправы. А вечарам выклікалі да камандзіра палка. Атрымаў загад ноччу пачаць пераправу.

Выдзелілі мне 42 чалавекі, некалькі кулямётаў. Пагрузіліся ў дзве фанерныя лодкі і, калі добра сцямнела, пачалі перапраўляцца. Спачатку шанцавала. Да супрацьлеглага берага заставалася якіх-небудзь метраў семдзесят, як праціўнік нас заўважыў. Вада вакол лодак закіпела ад выбухаў і куль. Так-сяк дабраліся да берага, страціўшы лодкі, а разам з імі нямала зброі і боепрыпасаў. Схавацца ад агню амаль немагчыма, заляглі прама ў вадзе. Над намі ў тым месцы толькі з паўметра выступаў бераг. Гэты выступ і стаў нашым прытулкам.

Што рабіць? Атакаваць — значыць загубіць байцоў. Загадаў звязацца па рацыі з камандаваннем палка, аказалася, што рацыю разбіла. Нічога не заставалася, як ляжаць і чакаць.

Раніцай, калі ледзь заняўся золак, гітлераўцы спынілі стралянінy, заварушыліся ў акопах. «Рус, капут!» — пачуліся іх выкрыкі. Мы маўчалі, і гэта, бачна, было адзіным нашым шанцам. Цікаўнасць фашыстаў паглядзець, што з намі здарылася, прымусіла іх пакінуць акопы. Вось яны ўжо набліжаюцца да калючага дроту, які раздзяляў нас...

Я загадаў падрыхтавацца.

— Ура! За Радзіму! Наперад! — падаў каманду ў зручны момант.

Байцы дружна ўзняліся з вады і рынуліся на варожыя ўмацаванні. Спачатку гітлераўцы разгубіліся, павярнулі назад. А мы, пакідаўшы шынялі, перамахнулі па іх цераз калючую агароджу і, як кажуць, на плячах у ворага ўварваліся ў акопы. Бой быў кароткі, але жорсткі. Праз некалькі хвілін мы выбілі фашыстаў з першай лініі абароны.

Падлічылі свае сілы. Нас засталося 18 чалавек. Занялі абарону. У хуткім часе немцы пайшлі ў атаку. Адбілі мы яе, затым — другую... У варожых зямлянках засталіся такія-сякія прадукты, зброя. Усё згадзілася.

Ноч прайшла спакойна. Перад світаннем дабраўся да нас сувязіст з тэлефонам, але падмацавання чамусьці не далі. Днём фашысты зноў пачалі ўжо якую па ліку атаку. Выходзілі яны з кукурузнага поля колькасцю звыш роты, а ў нас жменька байцоў. Звязаўся з камандзірам палка, далажыў абстаноўку. Папрасіў падтрымаць «кацюшамі».

У хуткім часе раздаўся магутны гул. Быццам бы ветрам здзьмула фашыстаў з поля.

Толькі на трэцюю ноч пачало паступаць папаўненне. Аказваецца, камандзір нашага батальёна звярнуў не туды, дзе мы трымалі абарону.

Не чакаючы галоўных сіл, самі перайшлі ў наступленне. Захапілі аэрадром, на ім шэсць спраўных баявых самалётаў. І сёння дзіву даюся: чаму яны не ўцяклі? Бачна, фашысцкія ваякі яшчэ верылі свайму фюрэру, што дняпроўскі вал непрыступны...

Да слоў расказчыка трэба дадаць, што за фарсіраванне Дняпра і ўтрыманне плацдарма Павел Уладзіміравіч Ялугін быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

П.У. Ялугін памёр 22 сакавіка 1990 г. Пахаваны у в. Суша.

В. Хаванскі

Адважны сокал

ЕРАШОЎ Іван Міхайлавіч, нарадзіўся 26.9.1911 г. у г. Лепелі.

Закончыў Лепельскі педтэхнікум, Сталінградскае ваенна-авіяцыйнае вучылішча, Ваенна-паветраную акадэмію. Працаваў настаўнікам.

На фронце з мая 1943 г. Камандзір штурмавога авіяпалка. Удзельнік баёў на Курскай дузе, вызвалення Украіны. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Аляксандра Неўскага, медалямі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4 лютага 1944 г. Памёр у 1948 г. Пахаваны ў г. Новачаркаску.

СШ № 2 г. Лепеля носіць яго імя.

...Камандаванне 3-га Украінскага фронту паставіла задачу лётчыкам-штурмавікам: разбамбіць адзін з чыгуначных мастоў цераз Днепр.

Камандзір 306-ай авіядывізіі пасылаў сваіх штурмавікоў на цэль групу за групай. Аднак моцны зенітны агонь і знішчальнікі праціўніка не давалі яе накрыць. Патрэбны былі добраахвотнікі, гатовыя пайсці на яўную рызыку бамбіць мост з малой вышыні.

Першым са строю выйшаў камуніст Іван Ерашоў. Палкоўнік Ісупаў моцна паціснуў руку адважнаму лётчыку, пажадаў яму ўдачы. 20 верасня 1943 г. некалькі гадзін на аэрадроме, дзе размяшчаўся штурмавы полк Івана Ерашова, ішла дзейная падрыхтоўка да палёту. Каля камандзірскага Іл-2 мітусіліся інжынеры і тэхнікі. Яны ўжо каторы раз выпрабоўвалі на трываласць тросы, правяралі бомбатрымальнікі, рухавік. Для такой стараннасці была прычына: ніколі раней авіятарам не прыходзілася падвешваць пад самалёт бомбы, спараныя пры дапамозе металічнага троса. Гэта была навінка ў авіяцыйнай практыцы. Яе прапанаваў камандзір палка.

Усё выверана. Самалёт Івана Ерашова адарваўся ад узлётнай пляцоўкі. Мінуту-другую яго бачылі над аэрадромам. Затым, набіраючы вышыню, ён знік на захадзе. Самалёт імкліва ляцеў над Днепрапятроўскам... А зусім хутка здарылася такое, аб чым нават цяпер не могуць забыць многія жыхары ўкраінскага горада. Яны бачылі, як, апусціўшыся ніжэй дахаў дамоў, уздоўж цэнтральнага праспекта, што выходзіць да вялікага Дняпроўскага моста, на гранічнай хуткасці, нібы віхор, пранёсся савецкі штурмавік. Праз некалькі хвілін пасля гэтага пачулі выбух страшэннай сілы: ад прамога пападання бомб абваліўся жалезабетонны мост.

Фашысты апамяталіся, калі справа была зроблена. Іх артылерыйскія батарэі і кулямётныя разлікі адкрылі па самалёту бязладны шквальны агонь. Адзін са снарадаў трапіў у фюзеляж самалёта, і той, страціўшы кіраванне, хутка пайшоў на зніжэнне і ўпаў у сланечнік.

Байцы на руках асцярожна вынеслі з кабіны Ерашова і штурмана. Маёр быў цяжка паранены.

* * *

...Чацвёрты вылет у тыл ворага зрабілі штурмавікі за гэты дзень. Танкавая часць праціўніка ў раёне Жытоміра знішчалася з паветра разважліва і планамерна. Узяўшы курс назад, лётчыкі заўважылі вялікую групу «юнкерсаў».

— Атакуем! — скамандаваў камандзір палка і першым развярнуў сваю машыну.

І здарылася непрадбачанае. Штурмавікі, падобна знішчальнікам, накіраваліся ў атаку на бамбардзіроўшчыкаў. Гэта не было выпадковасцю. Вопытны, бывалы і валявы камандзір разлічыў усё — і перавагі неспадзяванага нападу, і выдатныя баявыя якасці машын, і злётанасць экіпажаў.

Атака выклікала замяшанне сярод гітлераўцаў. Строй іх машын распаўся.

— Бі фашыстаў і глядзі ў абодва! — загадаў Іван Ерашоў свайму паветранаму стралку, а сам рашуча павёў штурмавік у атаку. Вось ён націснуў на гашэтку. Доўгія трасы снарадаў і куль пацягнуліся да варожага самалёта, і той, загарэўшыся, пайшоў уніз.

І.М. Ерашоў — Герой Савецкага Саюза

В.А. Квіцінскі — Герой Савецкага Саюза

Ерашоў пачаў рабіць заход на другую цэль. Але адчуў, як пад плоскасцю штосьці трэснула, самалёт шпурнула ўбок. Іван з цяжкасцю вывеў яго з пікіравання.

— «Матылёк», «Маланка», працягвайце атаку! — кінуў ён у мікрафон і, ледзь перацягнуўшы вышыню, адчуў, што машына падбіта. У гэты час другі снарад трапіў у яго самалёт, пашкодзіў рулявое кіраванне. Востры боль пранізаў правую нагу і грудзі. Самалёт падаў. Велізарнай сілай волі Ерашову ўдалося пратрымацца ў паветры яшчэ некалькі імгненняў і дацягнуць да лесу. Дрэвы змякчылі ўдар. Усе гэта адбылося за лініяй фронту, у тыле ворага. Стралок быў забіты, цяжка паранены лётчык. Гітлераўцы бачылі, як падаў савецкі самалёт. Яны адразу ж падбеглі да яго і выцягнулі з кабіны савецкага лётчыка, які страціў прытомнасць.

Колькі нечалавечых пакут, зняваг давялося перанесці ў фашысцкіх засценках Ерашову, але ён і там заставаўся мужным воінам, сапраўдным патрыётам. Яго гераічны пабег з фашысцкага палону — лепшы гэтаму доказ.

...Здарылася гэта ў час Яса-Кішынёўскай аперацыі савецкіх войскаў. Ноччу нашы развёдчыкі, паглыбіўшыся ў тыл ворага, падабралі на ўзлеску чалавека. Ён ледзь рухаўся. Пачуўшы рускую мову, чалавек хацеў прыўзняцца, але не змог. Гэта быў Іван Ерашоў. Ён уцёк з фашысцкага канцлагера ў нямецкім горадзе Ваймары і каля трох месяцаў прабіраўся да сваіх.

Ерашоў зноў у страі. Але на гэты раз ён лятаў з адной нагой, другую замяніў пратэз.

94 разы вадзіў камандзір палка І.М. Ерашоў групы сваіх «ілаў» на варожыя аб'екты.

У рэляцыі на камандзіра 672-га штурмавога авіяцыйнага палка маёра І.М. Ерашова пералічаны многія яго баявыя справы: знішчаны сотні аўтамашын з войскамі і грузамі, дзесяткі танкаў, эшалоны з гаручым і жывой сілай праціўніка, склады боепрыпасаў, артылерыйскія батарэі, самалёты на аэрадромах і многае іншае. Асабіста камандзір палка на самалёце Іл-2 у паветраных баях збіў чатыры варожыя знішчальнікі.

За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання і праяўленую адвагу і гераізм 4 лютага 1944 г. маёру І.М. Ерашову было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля вайны І.М. Ерашоў некаторы час служыў у марской авіяцыі. Аднак здароўе, падарванае вайной, прымусіла яго выйсці ў адстаўку.

В.Я. Ланікіна

Герой з Лепельшчыны

КВІЦІНСКІ Вячаслаў Антонавіч, нарадзіўся 25.11.1920 г. у в. Антавільна Лепельскага р-на.

Закончыў Кіеўскі дзяржаўны універсітэт.

Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. З 1941 г. на Паўднёва-Заходнім фронце. З кастрычніка 1941 г. член Наваград-Валынскай падпольнай арганізацыі, затым кулямётчык, кіраўнік дыверсійнай групы 1-га Валынскага партызанскага атрада, камандзір дыверсійнага атрада, які дзейнічаў на Украіне і Беларусі, у Польшчы, Чэхаславакіі.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 2 мая 1945 г.

Першыя дні вайны сурова абышліся з Вячаславам Квіцінскім: разам з баявымі сябрамі ён трапіў у акружэнне. «...Нам удалося выйсці з акружэння. Я спачатку не сумняваўся, што мы здолеем дабрацца да лініі фронту. Аднак усе дарогі на Кіеў былі адрэзаны. Тады мы рушылі на поўнач у надзеі сустрэцца з партызанамі, — успамінае В.А. Квіцінскі. — Группа наша тая-

ла з кожным днём. У выніку нас засталося толькі трое: шыракаплечы кулямётчык Іван Цыбін, сувязіст Васіль Грыгор'еў і я, артылерыст».

Дабраліся да ўкраінскага горада Навагрод-Валынска. Некалькі дзён хаваліся, назіраючы за рабочымі, якія рамантавалі дарогу. Змучаныя голадам і холадам, не вытрымалі.

— Больш так нельга: будзь што будзе! — сказаў Квіцінскі таварышам. І першы выйшаў з укрыцця.

Высокі чорнавалосы мужчына, які кіраваў работамі, спытаў:

— Хто вы такія?

— Ды бежанцы мы, — адказаў Васіль Грыгор'еў.

— Хопіць ісці без мэты, — падтрымаў яго Цыбін. — Хочам папрацаваць — без хлеба не пражывеш.

— Калі шукаеце сумленнай работы, вазьму, — адказаў мужчына. — Работы ў мяне хопіць. Я — майстар, Дубаў Піліп Іванавіч. Паказвайце дакументы.

Што маглі паказаць майстру акружэнцы? Квіцінскі сціснуў у кішэні пісталет, а кулакі Цыбіна пабялелі ад напругі. Гэта не схавалася ад уважлівага позірку Дубава. Ён усміхнуўся, сказаў спакойна:

— Усё зразумела. Няма дакументаў. Спяшаліся, забыліся... Добра, уладкуем. А жыллё выбірайце самі — дамы свабодныя.

Так Вячаслаў Квіцінскі ўвайшоў у састаў падпольнай групы.

«Мы пачалі дзейнічаць. Кіраваў намі камітэт, які збіраўся час ад часу ў Міхаіла Лянгуса або ў Піліпа Дубава. Была створана камсамольска-маладзёжная падпольная група», — успамінаў пасля вайны В. Квіцінскі.

Баявое ядро складалі Анатоль Будзішэўскі, Мікалай Бурмістраў, Кірыл Іваноў і іншыя. Увайшоў у яго і Квіцінскі. Усе камсамольцы, усе маладыя, усе марылі аб баявых аперацыях. Спачатку прыйшлося займацца зусім іншым.

Адно з першых заданняў наогул расчаравала: Лянгус даў параду збіраць усялякую рухлядзь, абломкі разбітых машын і складваць іх туды, дзе ўкажа Дубаў.

Не адразу зразумелі падпольшчыкі, навошта гэта патрэбна. Але пайшлі асеннія дажджы, у кюветах скапілася вада. Хутка яна выйшла на палатно дарогі. А вясной «плаціны» зрабілі яшчэ большую справу: дарогі былі размыты, куды ні зірнеш — усюды вада. Праехаць па іх было немагчыма. Вячаслаў Антонавіч расказвае:

— Асфальт ператварыўся ў месіва. Вадзіцелі выскоквалі з кабін, расходзіліся збіраць хвораст. Мы старанна дапамагалі ім, прыкрываючы выбоіны дошкамі, жардзём. А хвост машын станавіўся ўсё даўжэйшым і даўжэйшым. Рух на дарозе амаль спыніўся поўнасцю.

Потым падпольшчыкі на чале з Дубавым «адрамантавалі» мост цераз раку Случ: вясной яго знёс ледаход. Тры тыдні ні адна машына не пераправілася на другі бераг.

Адначасова падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі. Іх рэдагаваў камсамолец Мікалай Нікалаеў. Шмат лістовак было распаўсюджана, шмат слоў праўды дайшло да людзей. Але знайшоўся здраднік, які выдаў Нікалаева гітлераўцам. Мікалай прайшоў праз усе пакуты, але таварышаў не выдаў. Гэта паскорыла адыход падпольшчыкаў у лес для арганізацыі партызанскага атрада.

Ліпеньскім днём сабраліся атрады партызан пад кронамі магутных дрэў. Леў Мікалаевіч Пастухоў, камандзір новага атрада, сказаў:

— Цяпер мы ўсе байцы 1-га Валынскага партызанскага атрада. Прыйшлі сюды добраахвотна, але падпарадкоўвацца будзем суровай ваеннай дысцыпліне.

І пачаліся для Вячаслава Квіцінскага партызанскія суровыя будні. Ён стаў кулямётчыкам, а праз некаторы час узначаліў дыверсійную групу. Паходы на чыгунку і шашу, мініраванне, знішчэнне варожых аўтамашын, іншай ваеннай тэхнікі сталі яго паўсядзённым заняткам.

Далейшы баявы шлях Вячаслава Квіцінскага можна прасачыць па расказах самога героя, па архіўных дакументах. Вось кароткая выпіска з афіцыйнай даведкі:

«3 мая 1943 года — камандзір дывірсійнага атрада, дзеючага на Украіне і Беларусі, у Брэсцкай вобласці. Са студзеня па красавік 1943 года атрад зрабіў дыверсіі на чыгунках Брэст—Ковель, Брэст—Пінск, падарваў 19 эшалонаў праціўніка,

пашкодзіў кабель, які звязваў Берлін з гітлераўскім камандаваннем на фронце. Дзесяць разоў партызаны выводзілі са строю тэлефонную сувязь на лініі Роўна — Кіеў, узарвалі тры чыгуначныя масты».

* * *

...Прыкарпацце не вельмі ветліва сустрэла людзей з-за лініі фронту. І ўсё ж парашутысты прызямліліся ўдала. Праз гадзіну-паўтары ўсе 23 байцы былі ў зборы. Вячаслаў Антонавіч Квіцінскі — камандзір атрада — пастроіў іх і хуткім крокам павёў у глыб лесу.

Выбрана глухое зручнае месца. Аб'яўлен прывал. Стомленыя байцы валіліся на зямлю і тут жа моцна засыналі. Не да сну было толькі Вячаславу Антонавічу.

Дыверсійны атрад Квіцінскага ў 1944 годзе пачаў рэйд па паўднёва-ўсходніх раёнах Польшчы. Атрад актыўна праводзіў баявыя аперацыі. Рабіў на дарогах засады, узрываў масты, пускаў пад адхон эшалоны.

Мясцовыя падпольныя антыфашысцкія арганізацыі аказвалі атраду вялікую дапамогу: паведамлялі аб размяшчэнні варожых гарнізонаў, давалі надзейных праваднікоў, забяспечвалі прадуктамі харчавання, накіроўвалі ў атрад савецкіх людзей, якія ўцякалі з фашысцкай катаргі.

6 жніўня 1944 года з Украінскага штаба партызанскага руху атрад атрымаў радыёграму: «...паскорце выхад у раён Прошава. Арганізуйце баявую і дыверсійную дзейнасць. Пры выхадзе ў вызначаны раён зрабіце пляцоўку. Радзіруйце, груз пададзім. Рэгулярна паведамляйце сваё месцазнаходжанне».

У ноч на 9 жніўня атрад перайшоў польска-чэхаславацкую граніцу і выйшаў у Славакію. Праз некалькі дзён група падрыўнікоў пусціла пад адхон воінскі эшалон, знішчыла паравоз і тры вагоны. Было забіта 70 фашыстаў. Адначасова партызаны вялі масава-палітычную работу сярод насельніцтва, і паўсюдна сотні патрыётаў уключаліся ў барацьбу. Надпаручык Ян Джунда прывёў падраздзяленне славацкай арміі ў складзе 116 чалавек. У верасні атрад ужо налічваў 360 узброеных партызан і быў ператвораны ў брыгаду. На працягу верасня яна правяла 58 баявых аперацый. Было ўзарвана 17 эшалонаў з баявой тэхнікай і войскамі, знішчана 20 паравозаў, 77 вагонаў, 12 платформ, 38 аўтамашын, танк, узарваны два склады, сем мастоў, выведзена са строю звыш тысячы варожых салдат і афіцэраў.

У баях раслі рады партызан, загартоўвалася іх воля. У кастрычніку брыгада ўжо налічвала 760 чалавек. Ёй была прысвоена назва — Асобная партызанская брыгада імя Клемента Готвальда.

Аб смелых дзеяннях брыгады ведалі па ўсёй Чэхаславакіі. А яе камандзіра Вячаслава Квіцінскага ласкава называлі «камбрыг Слаўка».

За гераічныя подзвігі, праяўленыя пры выкананні баявых заданняў, і за асобыя заслугі ў развіцці партызанскага руху на Украіне ў і Чэхаславакіі В.А. Квіцінскі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Яго грудзі ўпрыгожваюць два ордэны Леніна, ордэн Чырвонага Сцяга, некалькі медалёў. Адзначыў баявыя заслугі Вячаслава Антонавіча і чэхаславацкі ўрад, узнагародзіўшы яго ордэнамі «За свабоду Чэхаславакіі» I ступені, «Ваенны крыж 1939 года», «Славацкага народнага паўстання» I ступені і медалём «За храбрасць».

М. Салаўёў, І. Алексін

Прозвішчы на абеліску

Помнік загінуўшым аднавяскоўцам устаноўлены ў Барсуках. На ім пяць аднолькавых прозвішчаў — Кірплеўскія. Ініцыялы пры іх навялі на думку, ці не браты яны? Апытваў сялян, ды ніхто нічога аб іх не ведаў.

Аднойчы ў рэдакцыю раённай газеты прыйшло пісьмо. У ім скарга на недахопы ў гарадскім быце. Уразіў подпіс: Кірплеўская. Адраса на канверце не было. Але цераз пашпартны стол даведаўся: вул. Валадарскага, д. № 57.

Адбылася сустрэча з аўтарам пісьма. Напрыканцы гутаркі запытаў аб прозвішчах Кірплеўскіх з Барсукоў. Аказалася, што гэта браты Ефрасінні Іванаўны Кірплеўскай Антось, Ігнат, Стась, Міхаіл, Іосіф — усе яны загінулі ў першыя дні вайны. Яна паведаміла, што ля вёскі Барсукі, паблізу сённяшняй аўтобуснай будкі,

быў калісьці хутар Сокал. Там і жылі Кірплеўскія. Яны не былі кулакамі. У першыя дні той вядомай калектывізацыі старыя Кірплеўскія ўступілі ў калгас, бо разлічвалі на лепшае жыццё, чым іх аднаасобнае. Пакуль наладжвалася новае жыццё, грымнула вайна.

З усіх пяцярых братоў, бадай, сама больш паваяваць давялося Міхаілу і Антосю. Апошні быў партызанам.

Трывожыў народных мсціўцаў бальшак. Так завуць і сёння дарогу на Мінск, якая праходзіць ля Барсукоў. Па ёй часта рухаліся калоны гітлераўцаў. І партызаны, не паспеўшы яшчэ арганізавацца ў атрад, знішчылі яе. Фашысты не маглі гэтага дараваць. Яны наляцелі зранку. У доме Антося Кірплеўскага знайшлі сабраную на месцах баёў зброю. Яго расстралялі дзесьці ў Лепелі.

Ігнат быў кадравым ваенным. Прыехаў да бацькоў, пагасцяваў дзень-другі, з'ездзіў у Забалацце да блізкіх і родных. Там на вечарынцы сустрэўся з дзяўчынай. Была яна прыгожая. Палюбіў яе з першага позірку. Сказаў бацькам, што будзе жаніцца. Але сваякі нявесты былі з ліку рэпрэсіраваных. У той час гэта гучала як «вораг народа». І бацькі запярэчылі. Але Ігнат не паслухаў, ажаніўся. У яго сапраўды потым былі непрыемнасці па службе. Але пачалася вайна. Дзесьці ў баі на Беларусі ён загінуў.

Стась быў шафёрам. Вельмі любіў спорт — вядомы ў раёне баксёр. У час, калі ехаў з іншымі прызыўнікамі на фронт, наляцелі фашысцкія сцярвятнікі, разбамбілі эшалон...

Міхаіл настаўнічаў. І сёння ў Несіне яго былыя вучні могуць шмат чаго расказаць пра Міхаіла Іванавіча. Перад самай вайной закончыў пяхотнае вучылішча, паспеў нават паведаміць бацькам, што прыедзе ў водпуск. Чакалі Міхаіла, афіцэра, усе ў вёсцы. Але ён не прыехаў: як потым высветлілася, у першыя дні вайны вучылішча накіравалі ў Ленінград. Там і загінуў лейтэнант М. Кірплеўскі.

Іосіф быў самы малодшы. Служыў у арміі недзе пад Масквой. Там і загінуў.

«Пяць братоў у нас было. Усе загінулі. А дзе пахаваны, не ведаем. Вось пахаронкі толькі засталіся», — гаворыць Ефрасіння Іванаўна.

Такі лёс у многіх нашых бацькоў, дзядоў. Знайсці іх магілы, хоць бы месца гібелі, — наш абавязак.

А. Вашкевіч

Выпрабаванне на трываласць

Лепяльчанін Зяма Барысавіч Штэйнгарт пачаў свой баявы шлях 20-гадовым хлопцам. Служыў у марскіх пагранічных войсках на Поўначы. Там і застала яго вайна.

Неўзабаве быў пераведзены на карабель. Ахоўвалі караваны суднаў, якія дастаўлялі ваенныя грузы з ЗША.

«Прайшло ўжо больш 40 гадоў з таго часу, — расказвае ветэран. Але мне добра памятаецца адзін выпадак. Немцы выйшлі на караван нашых суднаў, які ішоў у Мурманскі порт. Нас моцна бамбілі з самалётаў, каб патапіць. Быў я тады на караблі кулямётчыкам. Бой ішоў жорсткі. Цягнуўся ён шэсць сутак. Каля 50 бомб скінулі на карабель нямецкія самалёты. Адна з іх упала на палубу. Пачаўся пажар. Са строю была выведзена зенітная гармата, а другая пашкоджана. Я страляў па фашыстах са спаранага кулямёта.

Адзін з варожых самалётаў раптам задыміўся і пачаў падаць.

Бой працягваўся. Маракі адбівалі атакі з паветра. З вялікімі цяжкасцямі ўдалося патушыць агонь. Каштоўны груз быў дастаўлены па прызначэнні.» За гэты бой матрос З.Б. Штэйнгарт быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Не адразу пасля вайны вярнуўся матрос дадому. Ён працягваў служыць у марскіх пагранічных войсках, адкуль яго перавялі ў школу малодшых камандзіраў, дзе вучыў моладзь.

Г. Шкалікава

Кавалер трох медалёў «За адвагу»

Яму пашанцавала: прайшоў скрозь агонь і вярнуўся жывы. 18-гадовым юнаком Васіль Аўтушка стаў партызанам брыгады «Жалязняк». Першы яго бой — у вёсцы Пустаселле, дзе стаяў нямецкі гарнізон. Было горача, фашысты не хацелі пакідаць свае пазіцыі, ды не ўстаялі перад націскам партызан.

Пасля першага баявога хрышчэння хлопец стаў разведчыкам. З групай таварышаў пайшоў на заданне — трэба было разведаць сілы гарнізона ў Шаркаўшчыне. Толькі пасля другога разу, калі поўнасцю выявілі агнявыя кропкі ворага, пайшлі ў бой, гарнізон разграмілі. Неаднаразова давялося хадзіць на чыгунку. Непадалёку ад станцыі Параф'янава за адну ноч узарвалі тры кіламетры палатна. Рух цягнікоў быў спынены на значны час.

Унёс свой уклад у вызваленне Беларусі хлопец з Кветчы. З гонарам носіць В. Аўтушка медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны». Мужна ён ваяваў і ў радах Чырвонай Арміі, стаў камандзірам кулямётнага аддзялення. У час прарыву нямецкай абароны ва Усходняй Прусіі праявіў мужнасць і салдацкую кемлівасць. Кулямётчыкі білі ворага трапна, не давалі і галавы ўзняць. За ўмелыя дзеянні ўсе былі адзначаны, а камандзір аддзялення атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі.

— Гэта была першая баявая ўзнагарода, — гаворыць Васіль Паўлавіч. А першым медалём «За адвагу» ўзнагародзілі яго за ўдзел у штурме Інстэрбурга, другім — за бой непадалёку ад Кёнігсберга. Аддзяленне знішчыла не адну варожую агнявую кропку.

На грудзях храбрага кулямётчыка зазяў яшчэ адзін медаль «За адвагу». Гэта было ўжо ў Маньчжурыі, дзе ішлі цяжкія баі з японскімі войскамі. Падраздзяленне наступала, але яму перашкаджаў агонь з адной сопкі.

Аддзяленне Аўтушкі, умела дзейнічаючы, заставіла варожы кулямёт змоўкнуць. Наступленне на ўчастку паспяхова працягвалася...

С. Блажэвіч

У небе Літвы

Тры гады літоўскі народ знаходзіўся пад пятой акупантаў. Многа было ахвяр. І вось прыйшла Савецкая Армія, яна прынесла радасць вызвалення. Гэта радасць дасталася нялёгкай цаной. У баях на літоўскай зямлі воінамі былі здзейснены вялікія подзвігі. Нямала вызваліцеляў аддалі сваё жыццё. Літва заўсёды памятае аб іх. У гэтыя дні, калі ідзе падрыхтоўка да святкавання 30-годдзя вызвалення, у нашай школе ўзмацніўся пошук матэрыялаў аб героях баёў. Члены створанага ваенна-гістарычнага гуртка школы даведаліся шмат аб чым новым. Знойдзены дакументы аб адважным лепяльчаніне.

Рыгор Фёдаравіч Дзятлаў нарадзіўся ў вёсцы Загліннікі ў 1917 г. Калі надышоў час служыць, папрасіўся ў авіяцыю.

З першых дзён удзельнічаў у баях у якасці стралка на бамбардзіроўшчыках. Храбра змагаўся воін. Ужо ў лістападзе 1941 г. ён быў узнагароджаны медалём «За адвагу». Да першай узнагароды прыбавілася другая — ордэн Чырвонай Зоркі.

Яны ляталі ўтрох. Камандзірам экіпажа і эскадрыллі быў гвардыі капітан Я. Селязнёў, штурманам — гвардыі старшы лейтэнант Н. Аргуноў, Рыгор Дзятлаў — стралком. У час вызвалення Літвы баявыя вылеты пачасціліся. 28 жніўня 1944 г. экіпаж бамбіў скопішча варожых танкаў каля г. Ауцэ. Пападанні былі трапныя. Назаўтра камандуючы фронтам удзельнікам бамбёжкі аб'явіў падзяку. 19 верасня полк, дзе быў і Р. Дзятлаў, выканаў надзвычай важную задачу — разбамбіў аэрадром праціўніка. На зямлі было знішчана семнаццаць варожых самалётаў.

Апошні бой Р.Ф. Дзятлава адбыўся 22 кастрычніка 1944 г. На бамбёжку ваенных аб'ектаў у г. Клайпедзе вылецелі ўсім палком. Яшчэ на падыходзе да цэлі самалёт атрымаў пашкоджанне ад зенітнага снарада. Левы матор машыны заглох. Але экіпаж не выйшаў з бою. Вось і цэль. Адна за другой бомбы кладуцца на аб'ект. Заданне выканана. Але задыміў другі матор. Пры пералёце лініі фронту яго ахапіла полымя. Агонь перакінуўся на левую плоскасць. У кабіне стала дымна. Ляцелі на вышыні трох кіламетраў. Камандзір Селязнёў загадаў выкідвацца з парашутамі. Аднак голасу камандзіра Рыгор Фёдаравіч ужо не чуў. Ён быў забіты. З гэтага палёту не вярнуўся і штурман Н. Аргуноў. Ахопленая полымем паветраная машына рухнула на лес.

Загінуўшых штурмана і паветранага стралка пахавалі на воінскіх могілках у г. Рэтавасе. Усе члены экіпажа былі адзна-

чаны. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена Н. Аргунову пасмяротна. Р. Дзятлаў і Я. Селязнёў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга.

П. Фралоў, 1975 г.

Жыццё не па легендзе

Жыццё паставіла жыхара г. Лепеля Івана Коцарава побач з такім праслаўленым разведчыкам, як Рыхард Зорге...

Я даведаўся пра яго толькі таму, што галоснасць закранула органы дзяржбяспекі. Гутарка з начальнікам аддзела КДБ рэспублікі падпалкоўнікам В.Н. Дашкоўскім раскрыла многае аб яго жыцці.

Дзяцінства звычайнае, вясковае. Але ўхітрыўся ён у гады юнацтва марзянку вывучыць і рацыю. У пачатку вайны прызначылі яго ў радыёшколу. Пасля паскораных курсаў атрымаў заданне вылецець у 11-ы кавалерыйскі корпус, які рэйдзіраваў у фашысцкім тыле, і аднавіць парушаную сувязь са штабам Калінінскага фронту. Нагрузілі — ледзь у самалёт залез.

На першым часе, вядома, хваляваўся. І недарэмна: з-за завірухі лётчык збіўся з курсу, трапіў пад зеніткі. Ледзь жывымі засталіся — выбіла палавіну левага ніжняга крыла. Паліва скончылася, селі прама на поле. Далей рушыў пешшу. Нарэшце наткнуўся на забітага каня, другога, пятага — значыць, ішоў верняком. У першай жа вёсцы штаб сустрэў. Наладзіў сувязь і застаўся там ваяваць. Па вясне пачаў корпус выходзіць да сваіх. Не пашанцавала: ноччу іх схапілі немцы. Так Іван Коцараў аказаўся ў Сычоўскім лагеры для ваеннапалонных, гэта на Смаленшчыне... Двойчы рабіў пабегі. Лавілі, білі, здзекаваліся. Каб выжыць, трапіў у Катынскую абвераўскую разведшколу. Атрымаў новае прозвішча — «Дубіцкі». Вучыўся з паўгода. У ноч на 3 мая 1943 г. яго з сябрам Паладзіем, па легендзе Белазёравым, выкінулі пад Масквой, ля станцыі Петушкі, з радыёстанцыяй, зброяй, камплектамі розных дакументаў, 300 тысячамі рублёў. Як і дамовіліся з сябрам, адразу з'явіліся ў органы. Турма на Лубянцы. Допыты... У хуткім часе савецкая контрразведка завяла праз іх радыёгульню з абверам...

І.Н. Коцараў у форме нямецкага афіцэра. 1943 г.

Зноў перайшоў да немцаў, як разведчык «Абверкаманды-103». Прайшоў праз «штаб-бюро І» — цэнтр праверкі вярнуўшыхся з задання агентаў і вярбоўкі новых. У штабе-бюро ў Мінску аб'явілі загад аб прысваенні яму афіцэрскага звання, узнагароджанні двумя медалямі «За храбрасць». Дарэчы, напарнік яго, Мікалай Лукіч, у хуткім часе немцамі таксама быў удастоены «Жалезнага крыжа» і чына обер-лейтэнанта. У другі раз абвераўцы закінулі «Дубіцкага» ў Горкі. Разам з Лукічом павінен быў кантраляваць ваенныя заводы Паволжа. «Працавалі» ліха, аднойчы спецыяльны сувязнік разам з дакументамі, шыфрамі, круглай сумай грошай перадаў і падзяку цэнтра «за старанне». Па меры свайго адступлення немцы

загадвалі выехаць спачатку ў Заслаўль, Маладзечна, потым Каўнас...

Пасля вайны працаваў на лесахімучастку, старшынёй калгаса, у раённым таварыстве аховы прыроды. З вялікім хваляваннем глядзеў ён фільмы «Шлях у Сатурн», «Канец Сатурна» аб нямецкай разведвальнай школе. На пытанне, ці падобна яна была на тую, што паказалі ў фільмах, ён адказаў: «Агульныя рысы ў кіно схоплены верна, хаця на справе ўсё выглядала інакш».

А. Уліцёнак

З успамінаў А. Кошкіна, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны

На вайне я правёў амаль чатыры гады. Узводзіў пераправы на Волхаўскім, Ленінградскім, 2-ім Беларускім франтах. І. заўсёды пад агнём праціўніка.

Успамінаецца 1943 год — год карэннага пералому ў вайне. Мы наступалі, ачышчалі сваю зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Падышлі да Чудскага возера. Сапёрнаму ўзводу, якім я камандаваў, было загадана забяспечыць фарсіраванне Чудска-Пскоўскага праліва шырынёй 1,8 кіламетра. Пад покрывам ночы сабралі паромы, якія буксіраваліся катэрамі. Наладзілі на пераправе каменданцкую службу.

На золку пачалі перапраўляць жывую сілу і тэхніку. Было ціха, і раптам па дэсанце вораг адкрыў моцны агонь. Пантанёры не разгубіліся. Яны тут жа забівалі пробкамі прабоіны ў пантонах. Вось і супрацьлеглы бераг. З ходу нашы воіны ўступілі ў бой. Сапёры разам з пяхотай замацаваліся на плацдарме і разам выбівалі фашыстаў з умацаванняў. Гэта дазволіла хутка ажыццявіць перакідку нашых часцей цераз праліў. Полк паспяхова выканаў сваю задачу. Ордэнам Айчыннай вайны II ступені быў адзначаны мой удзел у гэтай аперацыі.

Наступленне працягвалася. Вялі баі ўжо на тэрыторыі Эстоніі. Давялося ўдзельнічаць у высадцы дэсанта на астравы Муху, Сарэма ў Балтыйскім моры. Яны былі асабліва ўмацаванымі. Фашысты ўтрымлівалі іх усімі сродкамі. Праліў — 8,5 кіламетра шырынёй. І гэту адлегласць трэба было пераадолець. Шматлікія плыўсродкі выйшлі ў мора. Быў моцны шторм. Хвалі залівалі наш паром, але мы ўпарта ішлі да мэты. Перад высадкай авіяцыя апрацавала пярэдні край фашыстаў. Увесь бераг быў у агні. Высадзіліся — і ў бой. Пераправа пад прыкрыццем нашых самалётаў дзейнічала бесперабойна. І гэта садзейнічала паспяховаму правядзенню аперацыі.

Далёка нялегкімі былі баі пры фарсіраванні ракі пад Данцыгам (Гданьскам). Вораг займаў выгадную пазіцыю і поўнасцю кантраляваў раку. Дэсант высаджвалі на лодках. Яго задача — зачапіцца на заходнім беразе, адкінуць гітлераўцаў на 200—300 метраў, не даць ім весці прыцэльны агонь па пераправе.

Сустрэў нашы лодкі агнявы шквал. Мне пашанцавала: лодка, на якой плыў, дабралася да берага. Тут жа мы пайшлі ў атаку. Фашысты вымушаны былі адысці. У гэтым баі я быў паранены. Захапілі нямала палонных. Полк атрымаў найменаванне «Данцыгскі», а на маіх грудзях заззяў ордэн Чырвонай Зоркі. Мае аднапалчане Паўлаў і Незамудзімаў сталі Героямі Савецкага Саюза. Яны на палаючых катэрах даставілі да супрацьлеглага берага паромы з дэсантнікамі.

І яшчэ адна пераправа, у забеспячэнні якой давялося ўдзельнічаць. Было гэта ўжо на Одэры — апошнім водным рубяжы, перад Берлінам. Аперацыя праводзілася непадалёку ад Шчэціна. Рыхтаваліся да яе асабліва дэталёва. Прайшлі партыйныя і камсамольскія сходы ў ротах, палку. Выступалі прадстаўнікі камандавання фронту. Размеркавалі абавязкі паміж камуністамі, членамі ВЛКСМ. Кожны добра ведаў, што і як павінен рабіць. Галоўнае — хуткасць дзеянняў. У гэтым — залог перамогі. Перад пачаткам пераправы сабраў нас камандзір палка і спытаў, хто хоча першым добраахвотна высадзіць дэсант — 125 аўтаматчыкаў з кулямётамі і супрацьтанкавымі гарматамі. Папрасіў даверыць мне першы рэйс. Хутка пагрузіліся — і ў дарогу. Варожы бераг быў няблізка. Прайшлі невялікі праліў, абагнулі астравок. Одэр у тых мясцінах — гэта, па

сутнасці, дзве ракі. Паміж імі пойма. Рэкі звязаны паміж сабой рукавамі і каналамі. Усё гэта ўскладняла пераправу.

Не дайшлі яшчэ да заходняга берага, як фашысты адкрылі шквальны агонь. Па камандзе ўсе пакінулі паром і зачапіліся за вузкую палоску зямлі, ля самай вады. Пачалі акопвацца. Камандзір роты аўтаматчыкаў загінуў. А далейшае прамаруджванне магло скончыцца для нас трагічна. Перадаў па ланцугу: «Падрыхтавацца да атакі», а потым з крыкам «Уперад!» узняў салдат. «Выкурылі» гітлераўцаў з прыбярэжных зараснікаў, і тут загаварылі нашы кулямёты. Не вытрымалі фашысты, многія ўзнялі рукі, пакідалі зброю. Даставіў на наш бераг 36 палонных. Праўда, поўнасцю задачу па высадцы дэсанта на супрацьлеглы бераг Одэра выканаць не ўдалося, але пойму ад немцаў ачысцілі. Ордэнам Аляксандра Неўскага ўзнагародзілі мяне за гэты бой.

Сапёраў называлі працаўнікамі вайны. Колькі мастоў, вялікіх і малых, давялося ўзводзіць, будаваць абарончыя і іншыя збудаванні, мініраваць і размініраваць...

Ваенныя медыкі

Хочацца ўспомніць добрым словам сваіх землякоў — медыцынскіх работнікаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай. Жыве ў Лепелі Галіна Іосіфаўна Лаўрова, кавалер ордэна Славы III ступені, персанальная пенсіянерка, інвалід Вялікай Айчыннай вайны. Яна захоўвае шматлікія падзякі камандавання «за мужнасць, знаходлівасць і адвагу пры аказанні дапамогі параненым». Галіна Іосіфаўна ўспамінае: «Суправаджала машыны з параненымі з перадавой у санбат. Па дарозе нас абстралялі з засады фашысты. Мы не разгубіліся, адкрылі агонь у адказ і далі магчымасць машынам хутка выйсці з зоны агню. Усе параненыя былі дастаўлены ў санбат. Вельмі часта даводзілася перавязваць раненых пад моцным кулямётным і артылерыйскім агнём...»

Сярод тых, хто выратоўваў жыццё параненых байцоў і камандзіраў, была кавалер ордэна Леніна і многіх медалёў М.Ф. Бельская, якая закончыла вайну ў Порт-Артуры. Прайшлі ваеннымі дарогамі ўрач Ю.П. Кравец, медыцынскія сёстры В.С. Яско, В.Г. Ерашова, А.Г. Шашылоўская, Р.П. Акулава. Праславілі сябе партызанская медсястра А.М. Булух, урач М.П. Крылосаў.

Усе яны працавалі на перамогу.

Б. Гурэвіч

Яе называлі «сястрыца»

Чатыры доўгія гады Францыска была ў трох кроках ад фронту. Пад стрэлы і выбухі старанна выконвала свой абавязак медыка.

Францыска Ігнатаўна Койкава ў першыя дні вайны была залічана медсястрой у 106-ы хірургічны палявы рухомы шпіталь.

...Цяжкія баі пад Масквой. У шпіталь бесперапынна паступаюць параненыя, у большасці цяжкапараненыя. Няма часу для сну. Аперацыя за аперацыяй — і эвакуацыя ў тыл. Яе ласкава называлі «сястрыца». І для яе гэта было вышэйшай узнагародай.

У час кароткага адпачынку яна спяшалася ў палаткі, пісала пісьмы ад імя цяжкапараненых. У кожнага — свая бяда. Пакрамсаныя металам, абпаленыя, абмарожаныя байцы просяць напісаць аб тым, што вораг не возьме Масквы, што перамога будзе за намі, што яны яшчэ вернуцца ў строй.

А дзесьці, у такім жа шпіталі, знаходзіўся смяртэльна паранены муж, абаронца Масквы. Аб гэтым яна даведаецца пасля.

Францыска прыпамінае такі эпізод. Паспела маліна. Сёстры назбіралі яе, пачалі частаваць параненых. І трэба было бачыць, як звычайны ўчынак задаволіў іх.

Францыска Койкава была цяжка паранена.

Тысячы байцоў прайшлі праз шпіталь, вярнуліся ў строй. І зрабілі гэта франтавыя медыкі. Дзесяткамі атрымлівае Францыска Ігнатаўна пісьмы. Яе не забываюць франтавыя сябры, тыя, хто абавязаны ёй сваім жыццём.

А. Вашкевіч

Танкіст з Лепеля

Перадваенны Лепель... У гарадскім кінатэатры дэманструецца фільм «Калі заўтра вайна». Кінамеханік Уладзімір Міцкевіч тады і ўявіць сабе не мог, што неўзабаве сам стане ўдзельнікам падзей, якія не пойдуць ні ў якае параўнанне з убачаным.

Служыць яму давялося ў Заходняй Украіне, у танкавых войсках каля г. Рава-Руская Львоўскай вобласці, недалёка ад граніцы з Польшчай. І калі пачалася вайна, танкісты з ходу ўступілі ў бой.

Аднапалчанін Уладзіміра Міцкевіча Пётр Ладзік успамінаў:

КАМЕКА Алена Ягораўна з дзіцём, загінула пры бамбёжцы.

КРЫВЕЦ Міхаіл Восіпавіч, н. у 1922, загінуў пры бамбёжцы ў 1941.

КУДРЭЎ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1931, загінуў пры артабстрэле ў 1942.

КУЗНЯЦОВА Ксенія Цімафееўна, н. у 1912, расстраляна ў 1942.

КУЛЯШОВА, 70 гадоў і ўнукі: 7, 6 і 3 гады.

МАЗГО Іван, н. у 1902, рабочы будзавода.

РАДЗЬКО Ягор, н. у 1888, шавец.

РАДЗЮК Ірына, 65 гадоў, хатняя гаспадыня.

РАЦКЕВІЧ Е., 45 гадоў, хатняя гаспадыня.

СЕМЕРКАНАЎ Генадзь, 8 гадоў.

СНЕГІРОЎ Міхаіл, н. у 1902, урач, ваеннапалонны.

СТАЛЯРОЎ Ігар, н. у 1912, урач, ваеннапалонны.

ТРОН, 40 гадоў, шафёр.

ФІНДЗЮКЕВІЧ Вера Васільеўна, н. у 1910, сын **Уладзімір** 10 гадоў, дачка **Валянціна** 6 гадоў, сын **Леанід** 4 гады.

ФРАЛОВА Марына, 45 гадоў, муж 40 гадоў, дачка **Таня** 4 гады.

ЯЎРЭЙСКАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА ГОРАДА ЛЕПЕЛЯ

АБЯЗГАУС Мендэль, 65 гадоў.

АБЯЗГАУС Геня, 65 гадоў.

АБЯЗГАУС Марыся, 25 гадоў.

АБЯЗГАУС Шлёма, 27 гадоў.

АБЯЗГАУС, 52 гады, жонка 40 гадоў, дачка 18 гадоў.

АЛОЙ Есень, 65 гадоў, жонка 60 гадоў, дачка Бэла 29 гадоў.

АЛОЙ Сафія, 29 гадоў, дачка 25 гадоў, дзіця 2 гады.

АМХІР.

АМХІР Ліба, 35 гадоў.

АМХІР Мота, 45 гадоў.

АМХІР Хена.

АНІКУЛАЎ, 50 гадоў, жонка 40 гадоў, сын 7 гадоў, дачка 6 гадоў.

АСІНОЎСКІ Сямён, жонка **Хена**.

АФРАЙМКОВІЧ Залман, н. у 1910.

АФРАЙМКОВІЧ Дора, н. у 1910, двое хлопчыкаў, дзяўчынка.

АФРАЙМОВІЧ Фрыда, н. у 1910.

АФРАЙМОВІЧ Шасіна, 60 гадоў.

АФРАЙМОВІЧ Абрам, 70 гадоў, трое дзяцей ад аднаго да дзесяці гадоў.

БЕЛЕНЬКІ Гірша, 35 гадоў.

БЕЛЕНЬКАЯ Мар'яся, 35 гадоў.

БЕЛЕНЬКІ Гірша, 15 гадоў.

БЕЛЕНЬКІ Лейзер, 9 гадоў.

БЕЛЕНЬКАЯ Маня, 3 гады.

БЕНСМАН Берка, 50 гадоў, жонка 45 гадоў, дачка **Рыва** 20 гадоў, дзіця 2 гады.

БЕНСМАН, 70 гадоў, жонка 65 гадоў, **Цыдра** 20 гадоў, дзіця 2 гады.

БЕНСМАН Лейба, 70 гадоў.

БЕНСМАН Сімха, 80 гадоў.

БЛЯХМАН Бэрка, 40 гадоў, **Сара** 34 гады, **Сёма** 12 гадоў, дзеці: 8 і 4 гады.

БОРД Евель, н. у 1910.

БОРД Сара, н. у 1910, дзеці: 3, 6 і 10 гадоў.

БОРД Цына, 80 гадоў.

БОРД Сіма, 80 гадоў.

БОРД Міхаль, н. у 1918.

БОРД Соня, н. у 1924.

БОРД Мендэль, н. у 1926.

ВАЙМАН Зуся, 45 гадоў, жонка 40 гадоў, сын 16 гадоў, дачка 13 гадоў.

ВАСАРМАН Пейсік, 50 гадоў, жонка 40 гадоў, дзеці: 10 і 5 гадоў.

ВІНТЭР Маісей, 40 гадоў, жонка **Мера** 30 гадоў, сыны: 15 і 13 гадоў.

ВУЛЬФ, 65 гадоў, жонка 60 гадоў.

ВЯЗЬМЕР (сям'я).

ГАРДОН Залман, н. у 1887.

ГЕЛЬФАНД Арон, 65 гадоў.

ГЕЛЬФАНД Муся, 58 гадоў.

ГЕЛЬФАНД Захар Віктаравіч, н. у 1897.

ГЕЛЬФАНД Гіта, н. у 1895.

ГЕНЕРСОН Ёскер, 70 гадоў.

ГЕНЕРСОН Ціра, 70 гадоў.

ГЕНЬКІН Руман, 55 гадоў, жонка 50 гадоў, **Мендэль** 13 гадоў, **Хаім** 10 гадоў, **Хася** 7 гадоў.

ГЕРШМАН Шмуня, 60 гадоў, жонка 55 гадоў.

ГІЛЕРСОН Гіля, 40 гадоў, **Малка** 40

гадоў, **Цыпа** 10 гадоў, **Зэлда** 8 гадоў, **Міхаіл** 12 гадоў.

ГІСМАН Нахама, 58 гадоў.

ГІТЛІН Шмуіл, 50 гадоў, жонка 45 гадоў, дзеці: 18, 10 і 7 гадоў.

ГІТЛІНА Зіна, 28 гадоў.

ГЛАЗМАН, 50 гадоў, жонка 40 гадоў, сыны: 16 і 14 гадоў.

ГЛАЗМАН Бейля, 17 гадоў.

ГЛАЗМАН Фейга, 14 гадоў.

ГЛАЗМАН Берта, 42 гады.

ГЛАЗМАН Люба, 35 гадоў.

ГЛАЗМАН Мося, 4 гады.

ГЛАЗМАН Гірша, 24 гады.

ГЛАЗМАХ Нахім, 60 гадоў, жонка 60 гадоў.

ГЛОНМАН Элька, 68 гадоў.

ГЛОНМАН Эська, 60 гадоў.

ГОЛУХАВА Маня, 3 гады.

ГОЛУХАЎ Анатоль, 2 гады.

ГУРЭВІЧ Абрам, 50 гадоў, жонка 40 гадоў, дзеці: **Матус** 13 гадоў, **Лейба** 12 гадоў, **Мося** 7 гадоў.

ГУРЭВІЧ Евель, 45 гадоў, сын **Веля** 19 гадоў, дочкі: 5 і 7 гадоў.

ГУРЭВІЧ Люся, 60 гадоў.

ГУТКОВІЧ Зуся, 70 гадоў.

ГУТКОВІЧ Буня, 50 гадоў.

ГУТКОВІЧ Злата, 58 гадоў.

ГУТКОВІЧ Велька, 60 гадоў.

ГУТКІН Лейзер, н. у 1901.

ГУТКІНА Малка, н. у 1903, двое дзяцей.

Давід, 60 гадоў, жонка 50 гадоў.

ДЗЯГЦЯР Барыс Шаломавіч, 35 гадоў.

ДЗЯГЦЯР Двося, 30 гадоў і двое дзяцей.

ДЗЯГЦЯР Моўша, 65 гадоў, жонка 60 гадоў, **Соф'я** 20 гадоў, **Хава** 18 гадоў.

ДЗЯГЦЯР Хайм-Юда, 50 гадоў, жонка.

ЗАЙДАНЯ Рыва, 28 гадоў.

ЗАЙДАНЯ Люба, н. у 1918.

ЗАЙДАНЯ Рахіла, н. у 1935.

ІОФА Берка, 52 гады.

ІОФА Рахіль, 50 гадоў.

ІОФА Двейра, 80 гадоў.

ІОФА Гіта, 35 гадоў.

ІОФА Залман, 45 гадоў, жонка 40 гадоў, **Залман** 14 гадоў, **Лейба** 11 гадоў, **Нёма** 9 гадоў і дачка 2 гады.

КАГАН Вульфа, 50 гадоў, жонка 47 гадоў, сыны: 16 і 13 гадоў.

КАГАН Давід, 50 гадоў, **Марыся** 45 гадоў, **Ханя** 23 гады, **Берка** 15 гадоў, **Сімон** 35 гадоў, **Двейра** 35 гадоў, **Бейля** 13 гадоў, **Зіна** 6 гадоў.

КАЛБАНОЎСКІ Арон.

КАЦ, 35 гадоў, жонка 30 гадоў, двое дзяцей.

КАЦЕВА Люба (Моця), 35 гадоў, сын 6 гадоў, дачка 2 гады, **Фрума** 65 гадоў.

КАЦМАН Эля, 55 гадоў, **Рахіль** 55 гадоў, чацвёра дзяцей ад 3 да 10 гадоў.

КАЦМАН Янкель, 45 гадоў, **Мася** 45 гадоў.

КІРЗОН Шанок, 45 гадоў.

КІРЗОН Браня, 35 гадоў.

ЛАБОК Бэрка, 65 гадоў, **Ханя** 60 гадоў.

ЛЕВІНА Бася, 70 гадоў.

ЛЕВІНА Геня, н. у 1920.

ЛЕВІНА Соня, н. у 1918.

ЛЕВІНА Брайна, н. у 1900.

ЛЕВІН Велька, 60 гадоў, **Бася** 60 гадоў, **Бейня** 25 гадоў, **Цыпа** 24 гады, **Геня** 17 гадоў.

ЛЕВІТАН Абрам, 60 гадоў, **Двейра** 65 гадоў, **Барыс** 4 гады.

ЛЕВІТАН Беня, 60 гадоў, жонка 55 гадоў, **Моця** 25 гадоў, жонка 20 гадоў, дзеці 3 і 2 гады.

ЛЕВІТАН Лейба, 40 гадоў, **Хайм** н. у 1926, **Лейба** Ім. 40 гадоў, **Эдзя** н. у 1941.

ЛЕВІТАН Маісей, жонка, сын **Хайм**.

ЛЕВІТАН Шлёма, жонка, дачка **Доба**.

ЛЕЙТМАН Сара, 35 гадоў, дачка 18 гадоў, сыны: 16 і 17 гадоў, дачка 8 гадоў, сын 5 гадоў.

ЛЕЙТМАН С., 30 гадоў, С., 25 гадоў, **Люба** 2 гады.

ЛІБЕРМАН Барыс, 50 гадоў, **Соня** 50 гадоў, **Маня** н. у 1928.

МАНЕВІЧ Рыва, 50 гадоў, **Таня** н. у 1926, **Рая** н. у 1918, **Міша** 2 гады.

МАНЕВІЧ Рыва, 50 гадоў, **Галя** 18 гадоў.

МАЛКІН Лэйзан, 45 гадоў, жонка 40 гадоў, сыны: 16, 14, 13 гадоў, дочкі: 10 і 8 гадоў.

МАЛЬЧЫН Евель, 40 гадоў, **Хая** 40 гадоў, **Эля** 12 гадоў, **Лейба** 15 гадоў.

МАЛЬЧЫН Сіма, н. у 1930, **Жэня** н. у 1932.

МАЛЬЧЫН Соня, 31 год, **Іда** н. у 1928, хлопчык 2 гады.

МАТОРЫНА Эдзя, 29 гадоў, **Ніна** 10 гадоў, **Уладзімір** 4 гады, **Віктар** 2 гады.

МАРКІНА Эдзя, 37 гадоў, **Ніна** 6 гадоў, **Вова** 3 гады, **Міша** 2 гады.

МЕЛЬНІКАЎ, 45 гадоў, жонка 40 гадоў.

МЕЛЬНІКАЎ Эмануіл, 55 гадоў, жонка 45 гадоў, дочкі: 25, 5 і 3 гады.

МІРКІН Ісак, 38 гадоў, **Хана** 32 гады, дочкі: **Хая** і **Эма** 16 і 5 гадоў, сын **Барыс** 8 гадоў.

МОРДУК Абрам, 45 гадоў, **Ента** 40 гадоў, **Ідык** 3 гады.

НЕДМЕН Ракеша, 55 гадоў, жонка 45 гадоў, дочкі: 12, 14, 7 гадоў.

НЕДМЕН Самуіл, 40 гадоў, жонка 35 гадоў, дочкі: 15, 10 гадоў, сын 8 гадоў.

НЕДМЕН, 60 гадоў, жонка 65 гадоў

НЯМЦОЎ Саламон, 40 гадоў, **Бася** 35 гадоў, дочкі: 8, 7 гадоў, сын 5 гадоў.

НЯМЦОВА Эстэр, 65 гадоў, **Шыфа** 35 гадоў.

НІСНЕВІЧ Леў Ісакавіч, 70 гадоў.

НОСТ Юда, 65 гадоў, **Муся** 60 гадоў, **Моця** 30 гадоў, **Бета** 30 гадоў, **Ніна** 5 гадоў, **Соня** 3 гады.

ПАТАШНІК Віхна 17 гадоў, **Бэрка** 15, **Цука** 13, **Геня** 10 гадоў.

Р. Маневіч

ПАТАШНІК Мася, 50 гадоў, **Абрам** 65 гадоў.

ПАТАШНІК Шлёма, 48 гадоў, жонка 45 гадоў, **Абрам** 19 гадоў.

ПЛАЎНІК Рыва, 65 гадоў, **Паша** 32 гады, **Дора** н. у 1918.

ПРЫГОЖЫН Залман, 50 гадоў, **Сара** 50 гадоў, **Ліпа** н. у 1924, **Рая** н. у 1928, **Цыпа** н. у 1932, **Абрам** н. у 1934.

ПУХАВІЦКІ Аба, 55 гадоў, **Хася** 50 гадоў, дочкі: **Геня** 6 гадоў, **Люся** 19 гадоў, **Бэла** 22 гады, **Рая** 16 гадоў, **Пэся** 13 гадоў, сын **Бора** 10 гадоў; маці **Цыля** 80 гадоў.

ПШОНІК, 45 гадоў, жонка 50 гадоў, сыны: 16 і 14 гадоў, дачка 10 гадоў; бацька 70 гадоў.

РАКШНЕЛЬ, 60 гадоў.

РАПАПОРТ Брайна, 65 гадоў, **Каця** н. у 1918, сын 2 гады.

РОЗЬБА Поля, н. у 1910.

РОЛЬБАНТ Сіма, 65 гадоў, **Лея** 60 гадоў.

РОЯН(К), 45 гадоў, жонка 40 гадоў, сын 17 гадоў.

РУБІН, 58 гадоў, жонка 50 гадоў, **Гірша** 22 гады, дочкі 20 і 16 гадоў.

РУХМАН Гіля, 38 гадоў.

РУХМАН Роха, 80 гадоў.

РЫЎКІН Лейба, н. у 1890, **Сара** 50 гадоў, **Меня** 10 гадоў, **Сёма** 11 гадоў, **Фірка** 3 гады.

СВІДЛЕР Залман, 65 гадоў, **Двейра** 65 гадоў, **Соня** 16 гадоў.

СВЯРДЛОВА Дуся, н. у 1915, сын 4 гады, дачка 2 гады.

СВЯРДЛОВА Ханя, 35 гадоў, сын 7 гадоў, дачка 4 гады.

СКУРАЖНІК Ян, 35 гадоў, жонка 35 гадоў, сыны 13 і 3 гады, дачка 7 гадоў.

СЛАВІН Ёсель, 45 гадоў, жонка 55 гадоў, дочкі 12, 10, 9 гадоў, сын 6 гадоў.

СЛАВІН Маісей, 70 гадоў, жонка 60 гадоў, дачка 25 гадоў.

СОН Гіта, 30 гадоў, дзяўчынкі: 7 гадоў, 5 і 2 гады.

СОН Іцка, 45 гадоў, **Шулька** 35 гадоў, **Фрума** 25 гадоў, **Лейба** 60 гадоў, **Бася** 50 гадоў, **Шалом** 25 гадоў.

СОН Сара, 35 гадоў, **Элька** н. у 1918, **Хая** 12 гадоў, **Абрам** н. у 1918.

СОН Шлёма, 40 гадоў, жонка **Хава** 35 гадоў, дочкі **Іда** і **Соня** 15 і 25 гадоў.

СОСКІНА Мар'яся, 60 гадоў, **Соня** 25 гадоў.

СОСКІНА Марыся, 65 гадоў.

СОСКІНА Соня, н. у 1918, **Маня** н. у 1937, **Вова** н. у 1939.

ТАЎБІНА Лея, 42 гады, **Рован** 15 гадоў, **Хая** 10 гадоў.

ТОЗБІНА Фруна, 75 гадоў, **Сара** 45 гадоў, **Бэрка** 45 гадоў, **Грыша** 12 гадоў.

ФЕЙГЕЛЬМАН, 35 гадоў, жонка 30 гадоў, сын 15 гадоў, дачка 13 гадоў, маці 60 гадоў, **Муся** 35 гадоў.

ФІГЕЛЬМАН Соня, н. у 1915, **Эдзік** 3 гады, **Анва** н. у 1910, **Міша** 2 гады, **Дыня** 58 гадоў, **Фаня** н. у 1920, **Бэрка** н. у 1930.

ФІШКІНА Мося, н. у 1911, **Сара** 60 гадоў.

ФІШКІНА Рахіль, 45 гадоў, дочкі 19 і 20 гадоў.

ХАЙКІНА Роза, 40 гадоў, **Мая** 13 гадоў, **Лена** 13 гадоў.

ХАМАРНЕР Т., 55 гадоў, **Навум** 25 гадоў, **Ёсель** 20 гадоў, жонка 40 гадоў.

ХАЦ Хася, 40 гадоў, **Ізраіль** 40 гадоў, сын **Нохам** 8 гадоў, сын **Хаім** 11 гадоў, дачка **Маша** 4 гады.

ХОДУС Маісей, 40 гадоў, жонка 34 гады.

ЦЭРЭФМАН Гірша, 45 гадоў, жонка 40 гадоў, сыны 17 і 15 гадоў.

ЦЫЛЬМАН, 48 гадоў, жонка 40 гадоў, дочкі 15 і 8 гадоў, сын 10 гадоў.

ЦЫПА, 50 гадоў.

ЧУПРЫНСКІ Аляксандр, н. у 1914.

ЧУХМАН Геня, 45 гадоў, сыны 12 і 10 гадоў, дачка 7 гадоў.

ШАПІРА Ліза, н. у 1907.

ШВАРЦБУРГ Хэля, 30 гадоў.

ШЛЕЙФЕР Іда, 60 гадоў, Сіма 60 гадоў, Рая 25 гадоў.

ШПІЛЬМАН Рывен, 70 гадоў, Геня 45 гадоў.

ШТЭЛЬМАН, 6 месяцаў.

ШТЭНБАК Бэрка, 40 гадоў, жонка 36 гадоў, сыны: 13 і 10 гадоў, дачка 6 гадоў.

ШТЭНГАРД Хая Л., 40 гадоў, сын **Шлёма** 13 гадоў, дачка **Міра** 18 гадоў.

ЯЗНЕР Ганна Захараўна, н. у 1919, **Захар** 40 гадоў, **Доба** 40 гадоў, **Маня** 8 гадоў.

ЯХКІНД (сям'я).

Асноўныя скарачэнні, якія прыняты ў спісах

абр — артылерыйская брыгада
абс — асобны батальён сувязі
авд — авіяцыйная дывізія
авп — авіяцыйны полк
ад — артылерыйская дывізія
азадн — асобны зенітны артылерыйскі дывізіён
азптадн — асобны знішчальны процітанкавы артылерыйскі дывізіён
азптабр — асобная знішчальная процітанкавая артылерыйская брыгада
азсп — асобны запасны стралковы полк
аінжб — армейскі інжынерны батальён
амарсбр — асобная марская стралковая брыгада
амедсб — асобны медыка-санітарны батальён
амцб — асобны мотацыклетны батальён
амцп — асобны мотацыклетны полк
ап — артылерыйскі полк
асп — асобны полк сувязі
арад — асобная разведвальная дывізія
арб — асобны разведвальны батальён
арс — асобная рота сувязі
асп — асобны стралковы полк
асапб — асобны сапёрны батальён
асбр — асобная сапёрная брыгада
аўтбр — аўтамабільная брыгада
аўтп — аўтамабільны полк
баа — батальён аэрадромнага абслугоўвання
бад — бамбардзіровачная авіяцыйная дывізія
бап — бамбардзіровачны авіяцыйны полк
в. — вёска
ваяв. — ваяводства
вобл. — вобласць
воп. — вопіс
г. — год, горад
габр — гаўбічная артылерыйская брыгада
гап — гаўбічны артылерыйскі полк
гв. — гвардыі, гвардзейскі
гл. — глядзі
г. п. — гарадскі пасёлак
дбап — далёкабамбардзіровачны авіяцыйны полк
Днвфл — Дняпроўская ваенная флатылія
драп — далёкаразведвальны авіяцыйны полк
дыв. — дывізія
зенад — зенітная артылерыйская дывізія
зенадн — зенітны артылерыйскі дывізіён
зенап — зенітны артылерыйскі полк
зн. — знішчальны
зптабр — знішчальная процітанкавая артылерыйская брыгада
зптадн — знішчальны процітанкавы артылерыйскі дывізіён
зптап — знішчальны процітанкавы артылерыйскі полк
зсп — запасны стралковы полк
інш. — іншы
ісапб — інжынерна-сапёрны батальён
ісапбр — інжынерна-сапёрная брыгада
кам. аддз. — камандзір аддзялення
кап. — капітан
кап — карпусны артылерыйскі полк
кд — кавалерыйская дывізія
кк — кавалерыйскі корпус
л. — ліст
лейт. — лейтэнант
лкп — лёгкі кавалерыйскі полк
мал. — малодшы
мбр — механізаваная брыгада
медсб — медыка-санітарны батальён
мінп — мінамётны полк
мінбр — мінамётная брыгада
міндн — мінамётны дывізіён
мк — матарызаваны корпус
мп — матарызаваны полк
мсбр — мотастралковая брыгада
мсд — мотастралковая дывізія
мсп — мотастралковы полк
мтап — міна-тарпедны авіяцыйны полк
мтад — міна-тарпедная авіяцыйная дывізія
мцп — мотацыклетны полк
н. — нарадзіўся
падпалк. — падпалкоўнік
палк. — палкоўнік
памбр — пантонна-маставая брыгада
пас. — пасёлак
пдд — паветрана-дэсантная дывізія
пдсп — паветрана-дэсантны стралковы полк
п/п — палявая пошта
рад. — радавы
рап — разведвальны авіяцыйны полк
с. — старонка
с/с — сельсавет
сап — самаходны артылерыйскі полк
сбр — стралковая брыгада
сд — стралковая дывізія
ск — стралковы корпус
сп — стралковы полк
спр. — справа
старш. — старшына
ст. — старшы
сяржс. — сяржант
т. — том
тб — танкавы батальён
тбр — танкавая брыгада
тд — танкавая дывізія
тк — танкавы корпус
тп — танкавы полк
тыс. — тысяча
ф. — фонд
цсап — цяжкі самаходны полк
цтп — цяжкі танкавы полк
шад — штурмавая авіяцыйная дывізія
шап — штурмавы авіяцыйны полк
яфр. — яфрэйтар

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

З руін і папялішчаў

28 чэрвеня 1944 г. Лепельскі раён быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За час акупацыі ў раёне былі ліквідаваны ўсе калгасы, разбураны і спалены тры МТС, МТМ, знішчаны 6 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, бальніца, 5 амбулаторый, калгасныя палі зараслі травой і бур'яном. Агульная сума ўрону, нанесенага нямецка-фашысцкімі захопнікамі па Лепельскаму раёну, склала 316 млн. 427 тыс. 620 рублёў (у цэнах 1926—1927 гг.).

Адразу пасля вызвалення горада там пачалі дзейнічаць органы савецкай улады. Першыя рашэнні Лепельскага райвыканкама былі накіраваны на ўлік маёмасці, прадуктаў харчавання і жывёлы, на арганізацыю дзяржзакупак збожжа і бульбы, на мабілізацыю працаздольнага насельніцтва на аднаўленчую працу. Аднаўлялася таксама работа выканкамаў сельскіх Саветаў.

Да вайны прамысловасць раёна, якая працавала на базе мясцовых сыравінных рэсурсаў, выпускала шырокі асартымент будаўнічых матэрыялаў, мэблі, прадуктовых тавараў, прадметаў шырокага ўжытку. Валавая прадукцыя прамысловасці за 1940 г. склала звыш 6 млн. рублёў (у цэнах 1926—1927 гг.). На прадпрыемствах працавала каля 2 тыс. чалавек. Пасля вайны не засталося нічога: ні вытворчых пабудоў, ні абсталявання, ні транспартных сродкаў. Увесь транспарт райпрамкамбіната, напрыклад, складаўся з трох коней.

За справу ўзяліся ўчарашнія партызаны, састарэлыя, жанчыны, падлеткі. Усё працаздольнае насельніцтва пачало адбудоўваць горад.

Першым быў пушчаны хлебазавод. Ужо на сёмы дзень пасля вызвалення ён даў першую прадукцыю, і да пачатку 1945 г. хлебапрадукцыя ўзрасла да 10 тон у суткі. Услед за хлебазаводам запрацавалі млын, электрастанцыя. Прамысловасць раёна аднаўлялася хуткімі тэмпамі. Да 1 верасня 1944 г. пачалі дзейнічаць будзавод, вапнавы, цагельны, смалакурны заводы, прамкамбінат, кавальска-калёсная майстэрня, ганчарная арцель.

Сярод руін некалі буйнейшага прадпрыемства раёна — будзавода знайшлася старая піларама і лакамабіль, якія настроілі і пусцілі ў ход. Так быў арганізаваны лесацэх, які выдаваў 12 кубаметраў піламатэрыялаў пры кругласутачнай рабоце.

На цагельным заводзе была адрамантавана печ абпалу ёмістасцю 85 штук цаглін. Калектыў торфазавода рапартаваў аб датэрміновым адкрыцці сезона 1945 г. Пачала выпуск прадукцыі адна печ вапнавага завода прамарцелі «Першага Мая». Райпрамкамбінат і прамарцель арганізавалі выраб бочак, хатняга посуду, колаў, апрацоўку скур.

19. Зак. 434.

Райпрамкамбінат пачаў працаваць у горадзе з 1945 г. У яго падпарадкаванні знаходзіліся будзавод (недалёка ад в. Куляшы), млын, кузня, цагельны завод «Раўнянка» і Свядзіцкі цагельны завод. На будзаводзе выраблялі рамы, дзверы, шафы для адзення, канапы, бытавыя інструменты. На райпрамкамбінаце рамантавалі і сельгасінвентар. Прадукцыя прадпрыемства карысталася вялікім попытам у насельніцтва і шырока разыходзілася за межы раёна.

У пачатку 1945 г. узнавіла работу арцель «Пралетарская перамога».

На трох адноўленых МТС і МТМ было толькі 18 трактароў і 3 грузавыя машыны. На 1 красавіка 1945 г. на фермах калгасаў раёна налічвалася 1787 галоў буйной рагатай жывёлы, 1,5 тысячы авечак, 12 свіней. Калгаснікі прыводзілі ў парадак запусцелыя за гады вайны палі і лугі, адбудоўвалі гаспадарчыя памяшканні.

У жніўні 1945 г. у Лепелі пачала дзейнічаць аўтатранспартная кантора, у якой мелася 15 аўтамашын ГАЗ-51. Яна абслугоўвала ўстановы і прадпрыемствы па перавозцы розных грузаў і будаўнічых матэрыялаў. Праз паўгода адкрылася маршрутная лінія Лепель — Камень. Спачатку па ёй курсіравалі грузавікі, пераабсталяваныя пад аўтобусы. С цягам часу гаспадарка развівалася, папаўнялася новай тэхнікай.

На 1 студзеня 1945 г. насельніцтва раёна складала 36 668 чалавек, у тым ліку 4168 гарадскога і 32 000 сельскага.

У пачатку 1946 г. была адноўлена чыгунка Орша — Лепель, і машыніст Т.А. Хлусевіч прывёў з Оршы першы састаў з прамысловым абсталяваннем. За першую пасляваенную пяцігодку Хлусевіч выканаў 14 нормаў.

Нягледзячы на вялікія цяжкасці, своечасова пачаўся новы 1944/45 навучальны год. Было адноўлена 12 школьных будынкаў, асобныя школы займалі прыстасаваныя сялянскія хаты. Да 1 мая 1945 г. у раёне дзейнічала 77 школ (з іх 27 ва ўласных школьных будынках), колькасць вучняў складала 6987, настаўнікаў — 180.

За 1944—1948 гг. на будаўніцтва жылля ў Лепельскім раёне дзяржава выдзеліла 112 000 куб. м лесу, 243 000 руб. крэдыту. Усяго па раёну было адрамантавана і пабудавана 1310 дамоў.

У сельскай гаспадарцы адбывалася ўзбуйненне калгасаў. Так, са 109 калгасаў у 1950 г. утварыліся 43 у 1951 г.

На 1 студзеня 1951 г. у раёне налічвалася 13 сельскіх Саветаў, 1 саўгас, 43 калгасы, 8010 уласных гаспадарак калгаснікаў, 926 гаспадарак рабочых і служачых. Пасяўная плошча пад ураджай 1951 г. па калгасах складала 25 313 га, у тым ліку 10 067 га пасеваў яравых культур, 17 740 га азімых, 2468 га бульбы. МТС мелі ў наяўнасці 80 трактароў.

З 215 паляводчых брыгад 96 атрымалі высокія ўраджаі. Так, паляводчая брыгада калгаса «Авангард» Несінскага сельсавета (брыгадзір Дз. Ф. Галай) атрымала ўраджай азімага жыта па 16 ц/га з плошчы 20 га, а брыгада калгаса імя Чапаева Лепельскага сельсавета (брыгадзір А.І. Сімановіч) — азімай пшаніцы 18,4 ц/га з плошчы 3,5 га і яравой — па 18 ц/га.

Стан жывёлагадоўлі на 1 студзеня 1951 г. па калгасах складаў: буйной рагатай жывёлы — 8190, у тым ліку 1570 кароў, 3495 коней, 3055 свіней, 6360 авечак і коз, 5387 птушак.

На адзін працадзень калгаснікі атрымлівалі па 250 г зерня, 0,34 руб. грошай і 2,4 кг сена.

Першую пасляваенную пяцігодку прамысловасць раёна адзначыла добрымі вытворчымі і фінансавымі паказчыкамі. Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, цэглы, вапны, харчовай прадукцыі і здабычы торфу пераўзышла даваенны ўзровень. Ужо ў 1951 г. цэглы

было выпушчана на 50 % больш, чым у 1950 г., піламатэрыялаў — на 60 %, торфу — на 63 %. Праводзілася значная работа па радыёфікацыі і сувязі. Усяго ў горадзе і па вёсцы былі радыёфікаваны 900 дамоў, тэлефанізаваны 3 калгасы.

У верасні 1952 г. пушчаны ў эксплуатацыю льнозавод у Лепелі, дзе пачалі выпускаць сыравіну для ткацкіх прадпрыемстваў (ільновалакно). У асноўным вытворчасць аснашчалася з улікам тагачасных тэхнічных дасягненняў. Сваю лепту ўнеслі і заводскія рацыяналізатары, асабліва К.П. Бельскі. Штогод завод пераапрацоўваў 5000 т трасты.

У 1953 г. на ўскраіне Лепеля поўным ходам ішло будаўніцтва агародніна-сушыльнага завода: узведзены вытворчы корпус, працягваліся работы па ўзвядзенні сховішча для агародніны. У гэтым жа годзе закончылі будаўніцтва новага гаража і іншых пабудоў на новай сялібе першай Лепельскай МТС. Былі ўстаноўлены такарны, фрэзерны і іншыя станкі, наладжаны рамонт машын і трактароў. Пачалося ўзвядзенне Лепельскай гідраэлектрастанцыі.

У першыя пасляваенныя гады ў газетах часта пісалі пра электразваршчыцу В.Ц. Паляжаеву. Вярнуўшыся з эвакуацыі ў Лепель у снежні 1944 г., яна адразу пайшла працаваць на будоўлю. Дзённую норму выконвала на 200 %. Такую высокую прадукцыйнасць працы Паляжаева ўтрымлівала ва ўсе часы сваёй працоўнай дзейнасці.

2 ліпеня 1958 г. для ўзмацнення дапамогі РТС калгасам і саўгасам Лепельскую міжраённую майстэрню капітальнага рамонту рэарганізавалі ў Лепельскі рамонтны завод. Значна павялічыўся працоўны калектыў, узрос аб'ём выконваемых работ. Тут сталі рамантаваць не толькі трактары, але і аўтамабілі. Новае жыццё ў прадпрыемства пачалося з 1974 г., калі была створана новая вытворчая база. Завод атрымаў назву экскаватарарамонтны (ЭРЗ).

7 мая 1961 г. арганізавана Лепельскае раённае аддзяленне «Сельгастэхніка» на базе Лепельскай РТС і міжраённай базы «Галоўтаргмаш». У 1973 г. уступіла ў строй 2-ая чарга рамонтнай майстэрні «Сельгастэхнікі». Акрамя галоўнага корпуса былі ўзведзены падкрапавая эстакада, станцыя паліўна-змазачных матэрыялаў, электрападстанцыя. У 1987 г. прадпрыемства перайменавалі ў «Райаграпрамтэхніку».

У красавіку 1961 г. даў першую прадукцыю Лепельскі малочна-кансервавы завод. У 1962 г. на базе завода арганізавалі камбінат. Асартымент выпускаемай прадукцыі вызначаўся разнастайнасцю. Гэта цэльнамалочная прадукцыя, масла, тварог, сухое малако, вяршкі.

У 1964 г. вялікі размах атрымалі работы па электрыфікацыі калгасаў і саўгасаў раёна. Да дзяржаўнай электрасеткі было падключана 9 гаспадарак, і да канца 1967 г. электрафікаваны ўсе населеныя пункты раёна. Не было ніводнага сяла, дзе б не гучала радыё, толькі за 9 месяцаў колькасць радыёкропак павялічылася на 233.

У студзені 1964 г. пачаў працаваць мантажна-эксплуатацыйны ўчастак звадкаванага газу. У гэтым жа годзе пабудавалі новы механізаваны хлебазавод магутнасцю 45 т хлеба ў суткі.

1 чэрвеня 1967 г. на базе прарабскага ўчастка Бачэйкаўскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення створаны Лепельскі будаўніча-мантажны ўчастак. У лютым 1968 г. яго перайменавалі ў будаўніча-мантажнае ўпраўленне, у снежні 1971 г. — у перасоўную механізаваную калону № 24 (ПМК-24), падпарадкаваную трэсту «Полацкводбуд» Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі.

У 1970-ыя гг. у горадзе пачалі дзей-

нічаць аўтавакзал, РІВЦ, аўтазаправачная станцыя, механізаваная пральня, камбінат бытавога абслугоўвання, рамонтныя майстэрні «Сельгастэхнікі», камбікормавы завод.

Па загаду былога Міністэрства трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання ад 19 жніўня 1976 г. у Лепелі створаны вопытна-эксперыментальны завод шасцерань — філіял Мінскага завода (ВЭЗШ). У снежні 1976 г. была выраблена першая шасцярня да камбайна 61-203А. За 17-гадовую дзейнасць завод асвоіў выраб 25 найменняў шасцерань, выпуск тавараў народнага спажывання.

У другой палове 70-ых гадоў будаўнікі ПМК-35 здалі ў эксплуатацыю Лепельскае СПТВ-175 (1977 г.), дзіцячы сад Бярэзінскага запаведніка, базу ДБР-34 і іншыя аб'екты.

У Лепельскім СПТВ-175 было падрыхтавана 7,5 тыс. спецыялістаў па 8 прафесіях: трактарысты, экскаватаршчыкі, фермеры, повары, швеі, гаспадыні сялібы.

У 1974 г. гасцінна прыняў вучняў Лепельскі гідрамеліярацыйны тэхнікум, дзе ў 1992—1993 гг. навучалася 460 студэнтаў па 4 спецыяльнасцях: гідрамеханіка, механізацыя меліярацыйных работ, эканоміка і планаванне народнай гаспадаркі, будаўніцтва і эксплуатацыя будынкаў і збудаванняў.

Звыш 10 гадоў працаваў у Лепелі філіял Віцебскага вытворчага аб'яднання «Маналіт», які выпускаў спецыфічную прадукцыю — кандэнсатары, а таксама тавары народнага спажывання. З 2-га квартала 1991 г. прадпрыемства стала самастойным і атрымала назву «Лепельскі электрамеханічны завод».

З 1991 г. назіраецца спад у прамысловасці. У 1992 г. 6 прадпрыемстваў з 10 знізілі вытворчасць на 12—52 %. У параўнанні з папярэднім годам аб'ём прамысловай вытворчасці па раёну скарачыўся на 34 %. Спад вытворчасці закрануў і Лепельскі льнозавод, які меў патрэбу ў рэканструкцыі. Намаганнямі невялікага калектыву (81 чалавек, у асноўным жанчыны) удалося выправіць становішча, аб'ём вытворчасці павялічыўся.

Стабільна працуе Лепельскае дрэваапрацоўчае вытворчае аб'яднанне. Яно выпускае мэблю для кухні, рабочае адзенне. З чэрвеня 1991 г. атрымаў самастойнасць і назву «Лепельскі рыбгас» участак Новалукомльскага рыбгаса ў Лепелі.

Цяжкае становішча застаецца на Лепельскім вопытна-механічным і камбікормавым заводах. Аб'ём прамысловай вытворчасці на апошнім знізіўся ў 1992 г. у параўнанні з 1990 г. у 2 разы. Каля 70 відаў прадукцыі выпускае завод жалезабетонных вырабаў, створаны ў 1976 г. на базе дапаможнай гаспадаркі Лепельскай, Бешанковіцкай і Докшыцкай МПМК.

У сельскай гаспадарцы ідзе працэс удасканальвання і пошук новых форм арганізацыі працы і матэрыяльнага стымулявання: узбуйненне калгасаў, стварэнне буйных механізаваных брыгад, знаходзіць падтрымку метад сямейнага падраду. Нядрэнных паказчыкаў у апошнія гады дасягнулі саўгас «Лепельскі», які ў 1989 г. адзначыў сваё 20-годдзе, калгас «Палітаддзелец» і іншыя. У 1989 г. калгас імя Тэльмана адзначыў свой юбілей. Гэта адзін са стабільна працуючых калгасаў, дзе праяўляюць пэўны клопат аб людзях. Да паслуг сяльчан (пасля аб'яднання з калгасам імя Дзімітрава) 2 дзіцячыя садкі, 2 дамы быту, 2 фельчарска-акушэрскія пункты.

Больш за 30 гадоў існуе саўгас «Бароўка», створаны на базе калгаса імя Крупскай.

Паспяхова вядзецца жыллёвае будаўніцтва ў саўгасах «Баброва», «Бароўка», «Сушанскі», калгасе імя Калініна і інш.

У 1991—1992 гг. раён выканаў план

продажу дзяржаве зерня, ільновалакна, травяной мукі, але не справіўся з заданнем па бульбе, малаку і мясе. У сувязі з недахопам будаўнічых магутнасцей перапынена будаўніцтва 2-ой чаргі свінагадоўчага комплексу ў калгасе «Салют».

У 1991 г. даярка калгаса імя Калініна Надзея Маляўка надаіла больш за 6000 кг малака ад кожнай каровы. На наступны год ніхто не дасягнуў рубяжа 5000 кг. Найлепшыя вынікі ў жывёлаводаў калгасаў імя Тэльмана, імя Чапаева, «Чырвоны партызан», «Барсукі». У некаторых гаспадарках скарочана пагалоўе буйной рагатай жывёлы.

У 1992 г. рэалізацыя прадукцыі жывёлагадоўлі знізілася на 27 %, а ў 7 гаспадарках — на 50 %.

Лепш ідзе справа на зерневытворчасці. У 1992 г. 10 гаспадарак з 17 атрымалі лепшыя ўраджаі збожжавых, чым у 1991 г.

З прыходам новага старшыні М.І. Баранава цікавае развіццё атрымалі падсобныя промыслы ў калгасе «Парыжская камуна». Тут па старадаўніх латышскіх рэцэптах вараць піва (напітак «Сялянскі»), вырошчваюць шампіньёны, гатуюць чай, працуе малое прадпрыемства па апрацоўцы драўніны. У калгасе абсталявалі спіртзавод, працуе цэх па вытворчасці вяндліны. Зараз калгас узяў у арэнду востраў на Лепельскім возеры, дзе плануюць зрабіць зону адпачынку. У калгасе імя Тэльмана таксама працуе швейны цэх, вырабляюць мэблю, будуецца вінны завод, ёсць цяпліца, заводы па вырабу драўніннага вугалю і асфальтавы.

На 1 кастрычніка 1994 г. у раёне зарэгістравана 13 фермерскіх гаспадарак. У в. Домжарыцы адкрыўся «Цэнтр экалагічнай адукацыі» — малое прадпрыемства, заснавальнікамі якога з'яўляюцца Бярэзінскі біясферны запаведнік і бюро маладзёжнага турызму «Спутнік». У асноўным цэнтр займаецца экскурсійнай і турыстычнай дзейнасцю.

Расце ўвага да вырашэння сацыяльных праблем. Пабудаваны Бароўская і Баброўская сярэднія школы, пашыраны да сярэдніх Поўсвіжская і Сушанская васьмігадовыя школы, да паслуг насельніцтва гарадскі стадыён, дзіцячыя садкі ў Лепелі, саўгасах «Сушанскі», «Бароўка», «Лепельскі», калгасе «Салют».

У раёне маецца 27 бібліятэк, кніжны фонд раённай бібліятэкі налічвае каля 43 тысяч кніг. Пры раённым Доме культуры створаны розныя гуртки, аркестр народных інструментаў, студыя бальных танцаў, тэатры «Пошук» і «Балаган», хор ветэранаў вайны і працы. У 1988 г. на базе музычнай школы адчынена школа мастацтваў. Цікавая экспазіцыя Лепельскага краязнаўчага музея.

Усяго ў раёне існуе 28 клубных устаноў, 54 кінаўстаноўкі, 3 музычныя школы, 2 школы мастацтваў.

Многія лепяльчане ў вольны час займаюцца спортам. Традыцыйнымі сталі чэмпіянаты раёна па многіх відах спорту. Школьнікі займаюцца цяжкай атлетыкай, барацьбой самба, наведваюць секцыі ручнога мяча, грэблі на байдарках і каноэ, лыжную секцыю. Самым масавым відам спорту з'яўляецца футбол. У 1992 г. зборная каманда раёна па футболе выйграла кубак вобласці і заняла другое месца ў розыгрышы кубка рэспублікі. У дзіцячаспартыўнай школе 250 вучняў займаюцца гандболам.

Пэўная ўвага ўдзяляецца народнай адукацыі. Усяго ў раёне налічваецца 18 сярэдніх, 6 няпоўных сярэдніх, 9 пачатковых школ, у якіх у 1993 г. навучаліся 7163 вучні і працавала 570 настаўнікаў. У Лепелі — 3 сярэднія і 1 няпоўная сярэдняя школа з агульнай колькасцю больш за 3000 вучняў.

У 1992 г. у горадзе і раёне працавалі 43 дзіцячыя сады.

Добра вядомыя самадзейныя лепельскія паэты і пісьменнікі з літаб'яднання «Выток». Выдадзеныя імі за свае сродкі 2 зборнікі вершаў «Запалі імгненне» і «Наступіць дзень» апяваюць харство роднага краю, яго працавітых людзей. Аб навінах Лепельшчыны чытачы даведваюцца з газеты «Лепельскі край» (да 1992 г. — «Ленінскі сцяг»).

Славіцца Лепельшчына сваімі землякамі. Гэта радзіма беларускіх паэтаў Анатоля Вярцінскага і Пятра Дудо. Тут у педвучылішчы вучыліся Еўдакія Лось і дзіцячая паэтэса Тадзіана Кляшторная. На Лепельшчыне нарадзіліся доктар ваенных навук Ілья Максімавіч Жарнасек, доктар медыцынскіх навук, адзін з вядучых кардыёлагаў рэспублікі Уладзімір Васільевіч Гарбачоў.

Лепель — радзіма доктара медыцынскіх навук, члена-карэспандэнта Акадэміі медыцынскіх навук СССР, былога загадчыка кафедры фармакалогіі Рыжскага мединстытута Макса Львовіча Беленькага (памёр у 1965 г.). Плённа працуюць лепяльчане — доктар эканамічных навук Рыгор Ціханавіч Кавалеўскі, доктар біялагічных навук Георгій Валянцінавіч Багацікаў.

У 1989 г. Лепель адзначыў сваё 500-годдзе, але жыццё працягваецца, і яно ўпіша новыя старонкі ў летапіс Лепельскага раёна.

В. А. Касцюкова

Успаміны мінёра

З успамінаў К.П. Шыдлоўскага, былога жыхара в. Ірынполле

Мы, прызыўнікі 1928 г., праходзілі дапрызыўную падрыхтоўку ў Лепельскім гарваенкамаце. У 1945 г. мяне выклікалі ў ваенкамат і ўключылі ў групу мінёраў. Мы шукалі і ўзрывалі міны, снарады і бомбы, якія засталіся ад вайны на тэрыторыі Лепельскага раёна. Гэтай працай кіравалі спецыялісты — вайскоўцы і супрацоўнікі Асаавіяхіма з Віцебска і Лепеля.

Асабліва запомніўся мне адзін выпадак. Каля в. Ляхавічы мы сабралі і склалі ў штабель міны і снарады. Час быў пад вечар. Я падпаліў шнур і пабег у сховішча. Раптам чую крык: «Дзеці!» Да месца ўзрыву бегла група дзяцей. Я павярнуўся, пабег назад, выдзернуў шнур, які праз некалькі хвілін дагарэў у маёй руцэ. З гэтым шнурам у рўцэ я стаяў, пакуль яго не вырваў у мяне падбегшы інструктар. Я і цяпер, праз 50 год, як успомню гэты выпадак, адчуваю, як у правай руцэ дагарае шнур. Зараз я разумею, што гэта была надзвычайная сітуацыя. Нам аб'явілі падзяку і абяцалі мяне прадставіць да ордэна Чырвонай Зоркі.

Салдатка

У жыцці Марыя Усцінаўна Размысловіч бачыла многа гора. Расказваць ёй цяжка. Таму аб усім напісала...

«Жыццё маё прайшло няроўна. У 1941 г. выйшла замуж. А пажыла з мужам усяго некалькі дзён. Неўзабаве пасля вяселля муж пайшоў на фронт. Трапіў у палон. Уцёк. Потым партызаніў. Аднойчы трапіў у засаду. Народнікі пазналі яго. Сказалі, што Размысловіч камуніст і былы старшыня сельскага Савета. Мужа забралі ў турму ў Лепелі. Здзекаваліся над ім так, што знаёмыя не маглі пазнаць. Расказваюць, фашысты для пацехі запрагалі яго ў павозку, садзіліся туды і бізуном паганялі. Самі рагаталі. У турме, бачна, і загінуў мой Гаўруша».

Злачынствы акупантаў выклікалі гнеў і абурэнне. Месца загінуўшых мужоў і бацькоў займалі жанчыны і дзеці. Стала сувязной партызан і Марыя.

«Цяпер апішу, што я рабіла ў час вайны. І сама не веру, што я была такая адчайная. Кожнае заданне партызан імкнулася выканаць. Загадвалі схадзіць у занятую вёску. Часцей за ўсё я хадзіла не адна — з Прасінняй Васільеўнай Жарнасек. Разведвалі ўсё: колькі фашыстаў і паліцаяў, як узброены, з якога боку лепш падысці да вёскі. У кожнай вёсцы ў нас былі надзейныя памочнікі: А.В. Юхнавец, К.В. Гардзіёнак, А.В. Гардзіёнак, М.І. Размысловіч. Усе звесткі мы перадавалі партызанам Лабанка».

Кожны дзень, кожную гадзіну рызыкавала Марыя сваім жыццём, маленькай дачкой.

Вайна закончылася. Ніхто з мужчын не прыйшоў у яе лясную вёсачку Пруднікі, што была ў партызанскім краі на Пышняншчыне.

«Ціт, Цімошка, Мішка... Усіх мужчын пабілі...» — піша Усцінаўна. І, адчуваецца, зноў са слязьмі на вачах.

Ды клікала жыццё да справы, клікала настойліва. Патрэбна была ўпартасць, моцная, мужчынская, ад знясіленых вайной жанчын, дзяцей. Пайшла Усцінаўна туды, дзе цяжэй: на свінаферму, што ў Закаліўі. А ферма тая была — адна назва. У хляўку, збітым з дошак, Марыя і сяброўкі вырошчвалі свіней. І хутка дабіліся, як пішуць у афіцыйных дакументах, высокіх прываг. А прывагі сапраўды былі важкімі. Магчыма, і цяпер, пры сучаснай адпрацаванай тэхналогіі, калі і корму хапае, і рукам лёгка, такіх не ўсюды дабіваюцца — да 600 грамаў у суткі.

«Трэба ж было самім і прыгатаваць корм, і пакарміць свіней. Прыйдзем, а яшчэ цёмна. Запалім смалякі, смаркулькамі іх звалі, ды з дапамогай іх і гатуем корм, раздаём. А корму таго мала было. Дзе я толькі не выбівала яго са слязьмі, з угаворамі. Я і ў райкам лятала за касцявой мукой. Бо падказалі, што ад яе хутчэй растуць свінні. Хто яго ведае, чаго я да іх прыліпла так».

А жыццё ішло сваёй хадою, часцей за ўсё няспешнай. Бо калі яно ішло хутка для ўдавы, для салдаткі?

«Калі ў нас быў добры дзень, збяромся з сяброўкамі-салдаткамі, паплачам. Вось і ўсё наша свята было».

Разам з Марыяй працавалі іншыя жанчыны. І так ужо склалася, што раз-пораз знаходзілі яны сваіх абраннікаў, пасля вяселля па розных прычынах пакідалі ферму. І толькі Марыя засталася адна. Здавалася, і прыгожая была, і ўвішная... Але не магла Марыя ўбачыць сярод іх лепшага за свайго Гаўрушу. Так і засталася вернай яму на ўсё жыццё. У працы знаходзіла ўцеху і рэшткі шчасця, нялёгкага шчасця адзінокай жанчыны.

«Калі сэрца не парвецца адразу з гора, то яно будзе жыць», — лічыць Марыя Размысловіч.

Глыбока ўражваюць гэтыя словы, сказаныя жанчынай пра жаночае, трапяткое, чуйнае сэрца, якому лёсам наканавана кахаць, успрымаць усё добрае, светлае і адгукацца пяшчотай.

Калі Усцінаўна надзявае пінжак з узнагародамі, яны, здаецца, успыхваюць кожны раз яркімі, свежымі кветкамі...

А. Паўловіч

Вызначыліся працай

Героі Сацыялістычнай Працы

ЗАНЬКО Аляксандра Фёдараўна, н. 10.11.1927 г. у в. Велеўшчына. Закончыла Лепельскае педвучылішча, Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. З 1945 г. — выхавацельніца Лепельскага дзіцячага дома, настаўніца СШ № 2 г. Лепеля.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы атрымала ў 1978 г.

Памерла ў 1990 г.

МАЗАЛА Ганна Васільеўна, н. 22.12.1925 г. у в. Закаліўе.

З 1944 г. — калгасніца калгаса «Красный луч», брыгадзір паляводчай брыгады, свінарка, сакратар партарганізацыі калгаса імя А.А. Жданава. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, дэлегатам XXIV з'езда КПБ. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы атрымала ў 1966 г.

Яны ўзнагароджаны ордэнам Леніна

БЕЛЬСКАЯ Матрона Фёдараўна, санітарка аблпсіхбальніцы;

ГАЛІНСКАЯ Ефрасіння Піліпаўна, даярка калгаса «Перамога»;

ЖАРНАСЕК Рыгор Лукіч, трактарыст калгаса «Салют»;

ЖУКОЎСКІ Кузьма Кузьміч, трактарыст калгаса імя Тэльмана. Узнагароджаны таксама ордэнам **Працоўнага Чырвонага Сцяга**;

КАРБОЎСКІ Мікалай Карпавіч, работнік свінафермы калгаса «Чырвоны партызан»;

КРАСКО Пётр Пракопавіч, намеснік начальніка цэха раслінаводства калгаса імя Тэльмана;

КУЛАКОЎ Васіль Пятровіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана;

КУЛАКОЎ Іван Васільевіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана;

ЛАДЗІК Леанід Іванавіч, трактарыст калгаса «Калгасная праўда»;

ПАПКО Аляксандр Мацвеевіч, старшыня калгаса імя Тэльмана;

ПАПКО Марыя Іванаўна, звеннявая саўгаса «Валосавічы»;

СКІБСКАЯ Фядосся Пятроўна, звеннявая саўгаса «Грыгаравічы»;

ШАЛАК Генадзь Аляксеевіч, механізатар калгаса «Парыжская камуна»;

ШКАЦЁНАК Ірына Фёдараўна, былы старшыня калгаса імя Чапаева. Узнагароджана таксама ордэнамі **«Знак Пашаны»**, **Працоўнага Чырвонага Сцяга**.

А. Ф. Занько

Г. В. Мазала

Заслужаныя дзеячы навукі

БЕЛЕНЬКІ Макс Львовіч, н. у 1911 г. у Лепелі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, армейскі таксіколаг.

Закончыў 2-і Ленінградскі медыцынскі інстытут. Працаваў участковым урачом у Сібіры, заг. кафедры фармакалогіі Рыжскага медыцынскага інстытута. Доктар медыцынскіх навук, член-карэспандэнт Акадэміі медыцынскіх навук СССР. Аўтар шматлікіх навуковых работ па прымяненні матэматычных метадаў у фармакалогіі.

Памёр у 1965 г.

ГАРБАЧОЎ Уладзімір Васільевіч, н. 10.01.1926 г. у г. Талачын Віцебскай вобл. З канца чэрвеня 1941 г. жыў у в. Аношкі Лепельскага р-на. З мая 1941 г. стаў партызанам атрада № 5 брыгады «Дубава», а пасля яе рэарганізацыі — атрада № 4 Лепельскай партызанскай брыгады імя Сталіна. Пасля вайны ў 1945—1947 гг. працягваў вучобу ў школе № 1 г. Лепеля. Пасля заканчэння ў 1952 г. Віцебскага медыцынскага інстытута працаваў у Полацку (загадчык эпідэміялагічнага аддзела Полацкай абласной санэпідэмстанцыі), затым у г. Талачын (галоўны ўрач раённай санэпідэмстанцыі, загадчык райздраўаддзела, галоўны ўрач райбальніцы, галоўны ўрач раёна). Пры Мінскім медыцынскім інстытуце закончыў аспірантуру.

М. Л. Беленькі

У. В. Гарбачоў

Працаваў там асістэнтам, дацэнтам кафедры шпітальнай тэрапіі I і II, дэканам педыятрычнага факультэта. З 1970 г. у Беларускім інстытуце ўдасканалення ўрачоў (загадчык кафедры тэрапіі, кардыялогіі, прарэктар па навуковай рабоце). З 1991 г. па сённяшні час — прафесар кафедры кардыялогіі Беларускага інстытута ўдасканалення ўрачоў.

У 1969 г. абараніў доктарскую дысертацыю. Званне «прафесар» прысвоена ў 1972 г. Званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь» — у 1991 г.

Асноўныя навуковыя накірункі: патагенез, дыягностыка і лячэнне каранарнага атэрасклерозу і ішэмічнай хваробы сэрца.

Педагагічная дзейнасць: з 1958 г. па сённяшні час — Мінскі медыцынскі інстытут (асістэнт, дацэнт) і Беларускі інстытут удасканалення ўрачоў (прафесар).

Аўтар больш за 200 навуковых прац, сярод якіх:

Цяжкасці і памылкі ў дыягностыцы захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы. Мн., 1978;

Г. Ц. Кавалеўскі

Дыягностыка кардыялагічных захворванняў (сааўтары: А.Г. Мрочак, У.П. Сыты, У.С. Адзінец, М.С. Прыстром, Т.Д. Цябут). Пад рэдакцыяй У.В. Гарбачова. Мн., 1990;

Даведнік урача агульнай практыкі (калектыў аўтараў): У 2-х тамах. Пад рэдакцыяй В.С. Казакова. Мн., 1995;

Дысліпапратэідэміі (сааўтар А.Г. Мрочак). Мн., 1996;

Лячэнне ўнутраных хвароб (даведнік). Пад рэдакцыяй Р.П. Мацвяйкова, глава «Лячэнне сардэчна-сасудзістых захворванняў». Мн., 1997;

Практычная кардыялогія (сааўтары: А.Г. Мрочак, У.П. Сыты, М.С. Прыстром, Т.Д. Цябут): У 2-х тамах. Пад рэдакцыяй У.В. Гарбачова. Мн., 1997.

КАВАЛЕЎСКІ Георгій Ціханавіч, н. у 1918 г. у в. Мацюшына Сцяна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Закончыў Лепельскае педагагічнае вучылішча (1936). Працаваў настаўнікам ва Ушацкім р-не, дырэктарам НСШ, загадчыкам райана. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ўзначаліў Інстытут эканомікі Акадэміі навук БССР (1952—1964), працаваў там загадчыкам сектара палітэканоміі (1964—1973), загадчыкам кафедры палітэканоміі Інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў вузаў пры БДУ імя Леніна. Кандыдат эканамічных навук. Аўтар звыш 70 навуковых работ.

Заслужаныя настаўнікі

БАРАНОЎСКАЯ Ірына Іванаўна, н. у 1890 г. у Польшчы. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны.

Да вайны працавала настаўніцай Кавалевіцкай, Ірынпольскай і Лепельскай пачатковых школ, у педвучылішчы. У пасляваенны час загадчыца райпедкабінета Лепельскага райана.

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1956 г.

ВІШНЕЎСКАЯ Ефрасіння Ільінічна, н. у 1917 г. у м. Бабінавічы Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны, сувязная партызанскіх брыгад «Дубава», імя І.В. Сталіна.

Закончыла Віцебскае педагагічнае вучылішча. У 1934—1941 гг. працавала загадчыцай Ладаснянскай пачатковай школы, настаўніцай Грыгаравіцкай НСШ.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны — дырэктар НСШ № 3 г. Лепеля, з 1946 г. і да пенсіі — настаўніца і завуч пачатковых класаў Заслонаўскай СШ.

Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны, 6 медалямі, знакам «Выдатнік народнай асветы», граматамі.

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена 24.08.1965 г.

ЖАВАРАНКАВА Антаніна Іванаўна, н. у 1927 г. у в. Окана. Закончыла Лепельскае педагагічнае вучылішча. Працавала ў Оканскай пачатковай школе.

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1968 г.

ЗЫЛЬКОЎ Раман Апанасавіч, н. 9.02.1907 г. у в. Беразеція Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. З 1933 г. — настаўнік СШ № 2 г. Лепеля, Лепельскага педагагічнага вучылішча, дырэктар СШ № 1 г. Лепеля. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, знакам «Выдатнік народнай асветы».

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1956 г.

КАНДРАЦЬЕЎ Міхаіл Кандрацьевіч, н. 15.10.1905 г. у в. Металухі Лёзненскага р-на. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут. З 1936 г. — настаўнік рускай мовы і літаратуры СШ № 10 г. Полацка, дырэктар Лепельскага педвучылішча.

Узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку».

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1946 г.

КУЛАКОВА Клаўдзія Фёдараўна, н. 9.01.1936 г. у в. Бабча.

Закончыла Лепельскае педвучылішча, Віцебскі і Смаленскі педагагічныя інстытуты. З 1955 г. — настаўніца ў школах Лепельскага р-на, дырэктар Бароўскай СШ. З 1994 г. на пенсіі і працягвае працаваць настаўніцай матэматыкі ў Бароўскай СШ.

У 1962 г. узнагароджана знакам «Выдатнік народнай асветы».

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1968 г.

МІРАНОВІЧ Стэфанія Кандратаўна, н. у 1918 г. у в. Крупяжына Віцебскай вобл. Удзель-

ніца Вялікай Айчыннай вайны, сувязная партызанскай брыгады «Чэкіст».

Закончыла Аршанскае педагагічнае вучылішча. З 1938 г. — настаўніца пачатковых класаў Зубрэвіцкай НСШ Аршанскага р-на.

Пасля вайны працавала настаўніцай пачатковых класаў у Мацюшынскай школе, сярэдняй школе № 1 г. Лепеля.

Узнагароджана знакам «Выдатнік народнай асветы», медалём «Ветэран працы», граматамі.

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена 17.08.1964 г.

Памерла 11.11.1987 г.

РЫЎКІНА Еўдакія Аляксандраўна, н. у 1932 г. у г.п. Плешчаніцы Мінскай вобл. Закончыла Віцебскі педагагічны інстытут. З 1954 г. — настаўніца гісторыі, арганізатар пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы СШ № 2 г. Лепеля.

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1970 г.

ТАЛЮШ Рыма Сідараўна, н. 20.08.1931 г. у г. Лепель. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны.

Закончыла Лепельскае педвучылішча, потым Віцебскі педагагічны інстытут.

Пасля вайны працавала выхавацельніцай Лепельскага дзіцячага дома, загадчыцай Вершанінскай пачатковай школы Усць-Ілімскага р-на Омскай вобл., загадчыцай Ерахаўскай пачатковай школы Езярышчанскага р-на. З 1962 па 1993 г. — настаўніца пачатковых класаў Межыцкай пачатковай школы.

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1968 г.

ТУМАШКОВА Галіна Васільеўна, н. 30.01.1928 г. у г. Лепель. У 1945 г. скончыла 7 класаў СШ № 1. Закончыла Лепельскае педвучылішча, Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага. З 1949 г. — настаўніца рускай мовы і літаратуры СШ № 2 г. Лепеля, завуч, дырэктар школы-інтэрната г. Лепеля, загадчыца навучальнай часткі ПТВ-56. З 1983 г. на пенсіі.

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1967 г.

УСЦІНАЎ Павел Міхайлавіч, н. у 1909 г. у в. Зановінне Ушацкага р-на. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Закончыў Полацкае педвучылішча, Магілёўскі педагагічны інстытут.

Працаваў завучам Каменскай СШ, дырэктарам Ушацкай СШ, пасля вайны — загадчык Лепельскага раённага аддзела народнай адукацыі, дырэктар СШ № 2 г. Лепеля.

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1964 г.

ЧЭКЛІНА Алена Пятроўна, н. у 1926 г. у в. Замошша. Закончыла Лепельскае педвучылішча. З 1946 г. працавала ў дзіцячым доме г. Лепеля, у Замошскай школе, РАНА, школе № 3 г. Лепеля, з 1954 па 1989 г. — выкладчыца рускай мовы і літаратуры СШ № 2 г. Лепеля.

Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1967 г. Зараз на пенсіі.

Заслужаныя ўрачы

ГВОЗДЗЕВА Галіна Іванаўна, н. 1.07.1916 г. у г. Луганск. Закончыла Растоўскі медыцынскі інстытут. З 1940 г. — інспектар па ахове мацярынства і дзяцінства на будоўлі чыгуначнай лініі Акмолінск — Карталы ў Казахстане, педыятр райаддзела 6-га ўрачэбнага ўчастка.

З 1943 па 1945 г. — урач-ардынатар эвакашпіталя № 2133 у г. Сочы, затым — загадчыца дзіцячай кансультацыі ў г. Лепель. У 1959 г. — загадчыца дзіцячага аддзялення райпаліклінікі. З 1976 г. да пенсіі — урач-педыятр Лепельскай раённай паліклінікі.

Выдатнік аховы здароўя. Узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі.

Званне «Заслужаны ўрач БССР» прысвоена ў 1966 г.

Памерла 29.04.1995 г.

ЖЫГАР Марыя Абрамаўна, н. 15.05.1919 г. у г.п. Васілевічы Гомельскай вобл. Закончыла рабфак, Мінскі і Яраслаўскі медыцынскія інстытуты. З 1941 г. працавала ў райбальніцы Панамароўскага р-на Чкалаўскай вобл., загадчыцай Тураўскай амбулаторыі, загадчыцай Озеранскага ўрачэбнага ўчастка, галоўным урачом Жыткавіцкай і Тураўскай райбальніц, урачом-тэрапеўтам Лепельскай райбальніцы, галоўным урачом Лепельскай псіхіятрычнай бальніцы, галоўным урачом Лепельскай ЦРБ, медстатыстыкам райбальніцы. З 1981 г. на пенсіі.

Узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі.

Званне «Заслужаны ўрач БССР» прысвоена ў 1960 г.

МАЦВЕЕЎ Іван Аляксандравіч, н. 9.11.1914 г. у в. Цыганы Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, начальнік санслужбы партызанскай брыгады «За Савецкую Беларусь», воін Чырвонай Арміі.

Закончыў Віцебскі медыцынскі інстытут. З 1945 г. — загадчык райздраўаддзела, галоўны ўрач Лепельскага абласнога дзіцячага касцёватуберкулёзнага санаторыя.

Званне «Заслужаны ўрач БССР» прысвоена ў 1961 г.

Зараз на пенсіі.

САЛЬНІКАЎ Фёдар Сямёнавіч, н. 5.05.1905 г. у в. Жары Лепельскага пав. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, начальнік санслужбы партызанскіх брыгад «Дубава» і імя І.В. Сталіна.

Г. І. Гвоздзева

М. А. Жыгар

І. А. Мацвееў

Ф. С. Сальнікаў

Г. В. Багацікаў

І. М. Жарнасек

Закончыў рабфак, медыцынскі інстытут. З 1940 г. — урач у Акмолінску, загадчык Лепельскага райздраўаддзела, урач-рэнтгенолаг Лепельскай раённай бальніцы.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Званне «Заслужаны ўрач БССР» прысвоена ў 1964 г.

Памёр у 1983 г.

Імі ганарацца землякі

БАГАЦІКАЎ Георгій Васільевіч, н. 19.06.1943 г. у г. Лепель. Закончыў Віцебскі медыцынскі інстытут.

З 1967 г. працаваў ст. навуковым супрацоўнікам сектара вірусалогіі навукова-даследчага інстытута мікрабіялогіі МА СССР. Доктар біялагічных навук, вірусолаг. Мае больш за 60 навуковых прац. Удзельнік міжнародных сімпозіумаў.

ЖАРНАСЕК Ілья Максімавіч, н. 2.08.1918 г. у в. Падымхі. Удзельнік савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Закончыў з залатым медалём і занясеннем на мармуровую дошку Ваенную акадэмію тылу і забеспячэння.

З 1950 г. на навуковай рабоце. Працаваў у адным з даследчых інстытутаў Міністэрства абароны былога СССР. Доктар ваенных навук. Памёр у 1993 г.

Ганаровыя грамадзяне г. Лепеля

ПОЛАЗАЎ Аляксандр Несцеравіч, н. у 1900 г. у в. Звоні Ушацкага р-на Віцебскай вобл. Закончыў народнае вучылішча, потым настаўніцкія курсы, атрымаў званне настаўніка.

У 1917 г. прыехаў у Петраград, дзе паступіў на службу ў 237-ы гарадскі лазарэт. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі Аляксандр Несцеравіч часта выступаў на сходах і мітынгах з бальшавіцкіх пазіцый, запісаўся ў Чырвоную гвардыю.

А. Н. Полазаў прымаў удзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе. Потым Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам быў накіраваны ў Беларусь для аказання дапамогі ва ўстанаўленні Савецкай улады. Прыехаўшы на Лепельшчыну, Аляксандр Несцеравіч вёў растлумачальную работу сярод рабочых і сялян аб значэнні сацыялістычных пераўтварэнняў. Ён праводзіў падрыхтоўку да першага павятовага з'езда Саветаў, арганізоўваў камбеды, стварыў лепельскую павятовую Надзвычайную камісію.

Затым А. Н. Полазаў працяглы час служыў у пагранічных войсках. Аляксандр Несцеравіч Полазаў — ветэран Камуністычнай партыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У яго 35 урадавых узнагарод, знакаў адрознення і воінскай доблесці, якія атрымаў за ратныя і працоўныя поспехі.

З кастрычніка 1975 г. Ганаровы грамадзянін г. Лепеля.

Памёр у 1982 г.

ЧУЙКОЎ Васіль Іванавіч, н. у 1900 г. у в. Сярэбраныя Пруды Маскоўскай вобласці. Рускі. Член КПСС з 1919 г. Закончыў сельскую школу. У Савецкай Арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай вайны, у 1920 г. вызваляў Лепельшчыну ад белапалякаў.

Закончыў Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе ў 1925 г., курсы пры Ваеннай акадэміі механізацыі і матарызацыі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў 1936 г. З 1927 г. ваенны саветнік у Кітаі, у 1929—1932 гг.— начальнік аддзела штаба Далёкаўсходняй арміі.

У перыяд савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. камандаваў 9-ай арміяй.

З 1942 г. В. І. Чуйкоў на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Камандаваў 62-ой (8-ай гв.) арміяй. За ўмелае камандаванне войскамі арміі 19.03.1944 г. яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У красавіку 1945 г. за паспяховыя дзеянні арміі ў Вісла-Одэрскай аперацыі і асабістую мужнасць Васіль Іванавіч узнагароджаны другой медаллю «Залатая Зорка».

Пасля вайны ён намеснік, 1-ы намеснік галоўнакамандуючага і галоўнакамандуючы Групы савецкіх войск у Германіі. З 1953 г. камандаваў войскамі КВА, з 1960 г.— намеснік міністра абароны.

Маршал Савецкага Саюза (1955 г.). У 1964—1972гг. начальнік Грамадзянскай абароны СССР. З 1972 г. у Групе генеральнай інспекцыі МА СССР.

Узнагароджаны 17 ордэнамі, медалямі.

З 1979 г. Ганаровы грамадзянін г. Лепеля.

Памёр у 1982 г.

Загінулі ў ваенных канфліктах за межамі Радзімы

АЎГУСЦІНОВІЧ Аляксандр Міхайлавіч, н. 1.04.1967, рад. Загінуў у Афганістане. Пахаваны ў в. Ляхавічы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі пасмяротна.

АЎТУХ Сяргей Уладзіміравіч, н. 24.12.1962, рад. Загінуў у баі ў Афганістане 18.02.1983. Пахаваны ў в. Кабак. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі пасмяротна.

ВОЮШ Іван Паўлавіч, н. 20.06.1953. Быў цяжка паранены ў Афганістане. Памёр 6.09.1987. Пахаваны ў г. Кіеў.

ЖАРНАСЕК Васіль Іванавіч, н. 16.08.1951, прапаршчык. Быў цяжка паранены ў Афганістане. Памёр ад ран 19.12.1980. Пахаваны ў в. Поўсвіж. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі пасмяротна.

ЖАРНАСЕК Міхаіл Міхайлавіч, н. 29.11.1953, лейт., загінуў у Анголе 25.11.1985. Пахаваны ў в. Вялікі Поўсвіж.

НАПАДОЎСКІ Ігар Анатольевіч, н. 30.01.1966, мал. сярж. Загінуў у баі ў Афганістане 23.01.1985. Пахаваны ў г. Лепель. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

САДОЎСКІ Уладзімір Іванавіч, н. 11.09.1965, рад. Быў цяжка паранены ў Афганістане. Памёр ад ран 21.03.1985. Пахаваны ў в. Цярэшкі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі пасмяротна.

САЛАЎЁЎ Ігар Аляксандравіч, н. 28.01.1965, рад. Загінуў у Афганістане 28.09.1983. Пахаваны ў г. Лепель. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі пасмяротна.

СПІРЫДОВІЧ Сяргей Антонавіч, н. 25.01.1967, рад., загінуў у баі ў Афганістане 3.08.1986. Пахаваны ў г. Лепель.

А. М. Аўгусціновіч

С. У. Аўтух

І. П. Воюш

В. І. Жарнасек

М. М. Жарнасек

І. А. Нападкоўскі

У. І. Садоўскі

І. А. Салаўёў

С. А. Спірыдовіч

Народная асвета

За час фашысцкай акупацыі ў раёне былі разбураны ўсе школы, але навучальны 1944/45 г. пачаўся своечасова. У кастрычніку 1944 г. у Лепелі сталі працаваць 2 школы (руская сярэдняя, беларуская сямігадовая) і педвучылішча. Пераадольваючы вялікія цяжкасці (холад, адсутнасць вучэбных дапаможнікаў, падручнікаў, сшыткаў), педагогі з дапамогай грамадскасці горада правялі вялікую работу па аднаўленні школ і арганізацыі навучання дзяцей і моладзі. У раёне было адкрыта 67 школ, з іх 1 сярэдняя, 9 сямігадовых, 57 пачатковых, адноўлена 12 школьных будынкаў, асобныя школы займалі прыстасаваныя сялянскія хаты.

Да 1 мая 1945 г. колькасць школ узрасла да 77 (з іх 27 ва ўласных будынках), у якіх навучаліся 6987 дзяцей і працавалі 180 настаўнікаў.

Адразу пасля вайны прынялі 390 сірот 2 дзіцячыя дамы ў г. Лепель і в. Весялова.

У 1945 г. была адбудавана сярэдняя школа № 2 у Лепелі. На працягу 20 гадоў яе ўзначальваў заслужаны настаўнік БССР Пётр Міхайлавіч Усцінаў. З 1980 г. заняткі праводзяцца ў новым будынку з сучасным абсталяваннем. Намаганнямі настаўнікаў і вучняў створаны музей гісторыі школы, якая па праву ганарыцца сваімі выхаванцамі.

Некалькі тысяч чалавек атрымалі адукацыю ў вячэрняй і завочнай школах. Сярод іх Герой Сацыялістычнай Працы Г. В. Мазала.

У 1944 г. у Лепелі аднавіла работу педвучылішча, адкрытае ў 1929 г. (тады тэхнікум). Да вайны педтэхнікум скончылі будучы вучоны-эканаміст Г. Ц. Кавалеўскі, вядомы дзяржаўны дзеяч В. Ф. Шаура, кіраўнік партызанскага руху на Лепельшчыне А. А. Марунька і іншыя.

Працавалі ў педвучылішчы выдатныя педагогі: В. Р. Батурын, Г. А. Кірзан, Ц. П. Віннік, Ф. Л. Бурцаў, Р. А. Зылькоў, М. М. Пятрэнка (аўтар музыкі да вядомай песні «Ручнікі» на вершы В. Вярбы).

Большасць настаўнікаў Лепельскага раёна, асабліва старэйшага пакалення, заканчвалі гэта вучылішча. Атрымалі адукацыю тут заслужаныя настаўнікі БССР

А. І. Жаваранкава, К. Ф. Кулакова, Р. С. Талюш.

Многія выпускнікі педвучылішча скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы. Сярод іх паэты Т. Т. Кляшторная, А. І. Нафрановіч. У Лепельскім педвучылішчы вучыліся вядомыя беларускія паэты Е. Лось і А. Вярцінскі.

У 1956 г. вучылішча было закрыта і на яго базе створаны інтэрнат. Выхаванцамі школы-інтэрната сталі дзеці з аддаленых вёсак, дзе не было школ, а таксама дзеці з мнагадзетных сем'яў і сіроты. Настаўнікі і выхавальнікі прыкладалі ўсе намаганні, каб дзеці раслі здаровымі, атрымлівалі добрыя веды; праводзілі цікавыя зборы, паходы. Арганізавалі работу ў садзе і агародзе. У інтэрнаце быў створаны музей.

У 1954 г. у раёне дзейнічала 55 пачатковых, 21 сямігадовая і 10 сярэдніх школ, у якіх навучалася 8458 вучняў і працавала 554 настаўнікі.

У 1955 г. вучні Заазер'я і навакольных вёсак атрымалі да новага навучальнага года добры падарунак — новую сямігадовую школу.

У 1958 г. адзначыла сваё 40-годдзе беларуская сямігадовая школа ў г. Лепель (зараз СШ № 3). Па ініцыятыве навучэнцаў тут абсталявалі геаграфічную пляцоўку, пасадзілі пладовы сад, школьны парк, стварылі вопытны ўчастак. У 1956 г. за высокія ўраджаі капусты «Слава», бульбы «Лорх», кукурузы «Партызанка» 10 юннатаў школы разам з загадчыцай участка Я. В. Раманоўскай былі зацверджаны ўдзельнікамі ВДНГ і ўзнагароджаны бронзавымі медалямі. У 1957 г. школа атрымала прэмію Міністэрства асветы БССР па выніках агляду вопытных участкаў. У школе працавала майстэрня па апрацоўцы драўніны і металу. На працягу многіх гадоў вучні выконвалі заказы Лепельскага рамонтнага завода па вырабу ручак для слясарных інструментаў, а з 1959 г. сталі выраблять дубовую мэблю. У канцы 1958 г. створаны школьны музей. Вялікая ўвага ўдзялялася краязнаўчай рабоце. На другім рэспубліканскім злёце турыстаў у 1958 г. каманда, якая складалася з вучняў школы і выхаванцаў дзіцячага дома, заняла 3-яе месца ў рэспубліцы.

Сярод выпускнікоў школы дацэнт Мінскага педагагічнага універсітэта, кандыдат геаграфічных навук І. І. Агрызка, дэкан фізіка-матэматычнага факультэта Віцебскага педінстытута Е. П. Кальчэўская.

У лістападзе 1968 г. закладзены падмурак, а ў верасні 1971 г. закончана будаўніцтва школы на 200 месцаў у в. Губіна.

У 1969 г. пачалося будаўніцтва новай школы ў саўгасе «Бароўка», а ў 1970 г. — гідрамеліярацыйнага тэхнікума ў Лепелі. У 1974 г. тэхнікум прыняў першых студэнтаў.

У 1976 г. у горадзе і раёне дзейнічалі 83 школы (9264 вучні, 722 настаўнікі), 52 групы падоўжанага дня, 11 прышкольных інтэрнатаў. У Лепелі — 3 сярэднія (2642 вучні) і 1 няпоўная сярэдняя школы. Пры дзіцячым санаторыі былі адчынены агульнаадукацыйныя класы.

У маі 1982 г. Домжарыцкую школу зацвердзілі ўдзельніцай ВДНГ БССР. На базе школы ёсць школьнае лясніцтва, за якім замацавана 40 га лесу.

1 верасня 1984 г. Новавалосавіцкая сярэдняя школа атрымала новы будынак.

У 1986 г. СШ № 1 імя Лабанка ў Лепелі адзначыла сваё 50-годдзе. Школа ганарыцца сваімі выпускнікамі. Гэта прафесар, доктар навук У. В. Гарбачоў, заслужаная настаўніца БССР Е. А. Рыўкіна, доктар біялагічных навук Г. В. Багацікаў.

У 1992 г. у горадзе і раёне налічвалася 34 школы: 18 сярэдніх і 9 няпоўных сярэдніх, дзе навучалася 7163 вучні і працавала 570 настаўнікаў.

Ідзе час, адно пакаленне змянее другое. Раніцай з партфелямі ў руках ідуць у школу юныя жыхары Лепельшчыны. Жыццё працягваецца...

А. У. Стэльмах

Лепельская школа-інтэрнат

Трыццаць шэсць год існавала ў Лепелі школа-інтэрнат, заснаваная ў ліпені 1956 г. і закрытая ў жніўні 1992 г. Больш чым 1200 выхаванцаў закончылі яе, атрымалі пуцёўкі ў самастойнае жыццё. Жылі і вучыліся ў інтэрнаце ў большасці дзеці з цяжкім лёсам: былі сярод іх хлопчыкі і дзяўчынкі, страціўшыя па розных абставі-

нах бацькоў, але болей было дзяцей, якія лічыліся сіротамі пры жывых бацьках, якія забыліся пра свае бацькоўскія абавязкі. З параненымі сэрцамі, пакрыўджаныя самымі блізкімі людзьмі, калючыя і непаслухмяныя з'язджаліся яны ў канцы лета ў школу з усёй Віцебскай вобласці. Колькі ж трэба было цярпення і дабрыні прыкласці настаўнікам і выхавацелям, каб сцены школы сталі для дзяцей утульнымі, замянілі ім на многія гады бацькоўскі дом! Не кожны педагог мог вытрымаць рэжым работы ў школе-інтэрнаце — ад пад'ёму і да адбою, часта без выхадных і святочных дзён. Самааддана працавалі Т. І. Макеева, Ц. П. Віннік, М. А. Чарнышоў, А. С. Ханяк, Г. В. Тумашкова, М. П. Памалейка, В. С. Дзягілеў, А. І. Адахоўскі, Г. Г. Савіцкая, Н. А. Грыб і многія іншыя. Былыя навучэнцы школы сталі настаўнікамі, інжынерамі, артыстамі, выбралі іншыя прафесіі. Навуковыя ступені маюць Сяргей Буяльскі і Сяргей Сіманькоў, прарэктарам Екацярынбургскага лесатэхнічнага інстытута працуе выпускнік інтэрната Васіль Андрэевіч Азаронак. А з афганскай вайны не вярнуўся цудоўны хлопец-салдат Аўтух Сярожа, да канца выканаўшы свой воінскі абавязак...

Праходзіць час, няма болей у Лепелі інтэрната, але сотні былых яго выхаванцаў у многіх кутках нашай краіны з цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінаюць сваіх настаўнікаў і гады, праведзеныя імі ў школе.

Л. С. Садоўская

Лепельскі дзіцячы дом

Створаны ў ліпені 1944 г. адразу пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў для дзяцей, якія засталіся без бацькоў. Спачатку ў дзіцячым доме выхоўвалася 70 дзяцей, колькасць іх хутка павялічылася і саставіла больш за 200.

Тут працавалі самаадданыя, улюбёныя ў сваю працу людзі: Вольга Ігнатаўна Гарыслаўка, Фёдар Прохаравіч Лябікаў, Аляксандр Антонавіч Быкоўскі, Канстанцін Міронавіч Корабаў , займаўшыя пасады дырэктара, Зоя Фёдараўна Насавец, завуча — Вольга Пракопаўна Якубава.

Лінейка ў Лепельскім дзіцячым доме. 1950-ыя гг.

Заслужанай настаўніцай БССР, Героем Сацыялістычнай Працы стала выхавацельніца дзіцячага дома Аляксандра Фёдараўна Зянько.

У 1960 г. дзіцячы дом быў ліквідаваны. Дзеці былі пераведзены ў школу-інтэрнат і іншыя дзіцячыя дамы.

Былыя выхаванцы дзіцячага дома знайшлі сваё прызначэнне ў розных галінах народнай гаспадаркі. Іван Іванавіч Бараноўскі працуе галоўным эканамістам завода ЖБВ, Яўген Раманавіч Багдановіч доўгі час з'яўляўся завучам Лепельскай СШ № 3, Мікалай Пятровіч Мацюшэўскі выкладае матэматыку ў адным з тэхнікумаў г. Мінска, Ала Петушкова займае пасаду пракурора ў г. Гомель і г. д.

А. С. Ханяк

З гісторыі дзіцячага дома ў Весялове

Калі ў лютым 1993 г. Новавалосавіцкая (Весялоўская) СШ адзначала сваё 70-годдзе, успаміналі і аб Весялоўскім дзіцячым доме, які адкрыўся 60 гадоў назад. Іх нельга раздзяліць. Гісторыя школы цесна звязана з гісторыяй Весялоўскага дзіцячага дома.

Па ўспамінах старажылаў, яшчэ ў пачатку XX стагоддзя землі, дзе зараз знаходзяцца вёскі Весялова, Стайск, Кавалевічы, належалі памешчыку, які быў родам з Польшчы. Па яго прапанове асвойваць «урадлівыя» землі прыехалі сем'і паля-

каў. Убачыўшы вакол балота, многія з іх паехалі назад, а нашчадкі тых, хто застаўся, і цяпер жывуць тут. Пасля рэвалюцыі на гэтай тэрыторыі быў польскі сельскі Савет. У 1922 г. у в. Весялова адкрылі пачатковую школу з польскай мовай навучання.

У 1926 г. яна стала сямігадовай.

Многа працы і сіл аддаў Весялоўскай сямігадовай школе яе першы дырэктар Сцефановіч. Настаўнікі былі ў асноўным прыезджыя. З вялікай павагай адносіліся да іх вучні і мясцовыя жыхары. Зварот да настаўніка пачынаўся са слова «товажишо», што азначала «товарищ». У школе была наладжана мастацкая самадзейнасць.

У 1934 г. Весялоўскую сямігодку скончыла Багдановіч Валянціна Іосіфаўна, паступіла ў педагагічнае вучылішча з польскай мовай навучання. Скончыўшы яго, працавала ў Барысаўскім раёне, затым 25 гадоў у Кавалевіцкай пачатковай школе.

Цяжкі лёс выпаў на долю выпускніцы 1937 г. Квяцінскай Соф'і Віктараўны. Ва ўзросце двух гадоў яна засталася без бацькоў. Спачатку выхоўвалася ў сястры, потым у дзядзькі. Самастойна вывучала польскую мову. Калі дзядзьку рэпрэсіравалі, дзяўчына засталася зусім адна, але працягвала вучыцца. Пасля школы паступіла ў Лепельскае педагагічнае вучылішча, аднак з трэцяга курса навучанне стала платным, яна вымушана была пайсці на працу ў Весялоўскую школу і перавесціся на завочнае аддзяленне. Пачалася вайна. Заканчваць вучобу прыйшлося пасля вайны. З 1948 па 1975 год працавала настаўніцай пачатковых класаў Весялоўскай сярэдняй школы.

Гады рэпрэсій цяжка адбіліся на лёсе дзяцей. У 1938 г. пачынае існаваць Весялоўскі дзіцячы дом. Сюды, у глухую беларускую вёску, прывезлі дзяцей рэпрэсіраваных бацькоў з усяго Савецкага Саюза. Былі тут дзеці розных нацыянальнасцей. Праблемы дзіцячага дома былі падобныя да праблем школы. Не хапала прадуктаў харчавання, падручнікаў, наглядных дапаможнікаў і г. д. Становішча дзіцячага дома ўскладнілася яшчэ тым, што вучэбныя заняткі дзетдомаўцаў да вайны праводзіліся ў Валосавіцкай сямігодцы.

З пачаткам вайны лёс выхаванцаў дзіцячага дома аказаўся трагічным. Дзя-

Выхаванцы Весялоўскага дзіцячага дома. 1950—1960-ыя (?) гг.

цей не эвакуіравалі, яны былі пакінуты на волю лёсу. Часткова іх разабралі мясцовыя жыхары. А яўрэйскага хлопчыка Збор Геру расстраляў паліцай зімою 1942 г. Мясцовыя жыхары пахавалі яго ў лесе ля в. Стайск, а пасля вайны астанкі перанеслі ў брацкую магілу ў в. Новыя Валосавічы.

У 1939 г. школа перайшла на беларускую мову навучання. У гады Вялікай Айчыннай вайны настаўнікі і вучні паўсталі на абарону Радзімы. Героем Савецкага Саюза стаў ураджэнец в. Новыя Валосавічы Тамашэвіч Мікалай Мікалаевіч. Актыўным удзельнікам партызанскага руху з'яўляўся выпускнік Весялоўскай школы Красоўскі Станіслаў Станіслававіч. Выхаванец Весялоўскага дзіцячага дома, ураджэнец вёскі Кавалевічы Панцялееў, Іван Сямёнавіч паўтарыў подзвіг М. Гастэлы. Пасмяротна ён узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. З 1964 г. школа носіць яго імя.

Сувязной партызанскай брыгады «Дубава» была выпускніца Весялоўскай школы Кажарская Валянціна Самуілаўна.

Школа аднавіла сваю працу ў 1944 г. Будынкі дзетдома і школы былі разбураны. Заняткі праводзіліся ў дамах мясцовых жыхароў. Класы ўтвараліся рознаўзроставыя. Часам у першым класе аказваліся вучні 10—14 гадоў. Цяжка, складана было ўсім. Але дзеці імкнуліся да ведаў. Школа, як магла, заахвочвала лепшых вучняў. За добрую вучобу, грамадскую працу яны атрымлівалі падарункі да Новага года. Гэта магла быць хусцінка, кашуля, адрэз на сукенку. Мнагадзетныя сем'і

лён. Такім чынам, былі ўсе атрыбуты студэнцкага жыцця: ад сесіі і экзаменаў — да танцаў і студэнцкіх вяселляў.

Інтэрната не было. Іншагароднія студэнткі жылі на прыватных кватэрах.

У 1968 г. Л. Ф. Гайсёнак паехаў у Мінск на перакваліфікацыю, і загадчыцай філіяла стала З. Ф. Камека. Пазней Л. Ф. Гайсёнак на працягу 15 гадоў працаваў галоўным урачом Лепельскага раёна. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалём Пірагова.

У 1969 г. адбыўся апошні, трэці выпуск, і летам гэтага ж года Лепельскі філіял Аршанскага медвучылішча закрылі. Праблема кадраў сярэдняга медыцынскага персаналу была часткова вырашана. А ў Оршы медвучылішча расшырылі, узвялі новы будынак.

Усяго ў сценах Лепельскага медвучылішча атрымалі прафесію 239 чалавек. Больш за 10 выпускнікоў атрымалі дыпломы з адзнакай. Сярод іх В. М. Міцкевіч, М. П. Дадэркіна, Н. Б. Падольская і іншыя.

Выпускніцы Лепельскага філіяла Аршанскага медвучылішча працуюць у многіх кутках былога Саюза. У 1967 г. у студэнтаў першага выпуску было ўсесаюзнае размеркаванне ў Краснаярскі край, Амурскую і Сахалінскую вобласці.

Многія выпускніцы медвучылішча больш як 25 гадоў аддалі сваёй высакароднай прафесіі: толькі ў Лепельскім раёне працуе больш за 60 чалавек. Ёсць сярод іх узнагароджаныя граматамі і дыпломамі, хто неаднойчы займаў першыя месцы ў конкурсах «Лепшы па прафесіі». Яны не толькі добра працуюць, але і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці.

25 лістапада 1994 г. у Лепельскім краязнаўчым музеі, адзначаючы 30-годдзе адкрыцця філіяла медвучылішча ў Лепелі, выпускніцы ўспаміналі сваю маладосць, студэнцкія гады, пазнавалі і не пазнавалі адзін аднаго і выкладчыкаў амаль праз тры дзесяцігоддзі. Па-рознаму склаўся іх лёс, але ў Лепелі, у медвучылішчы, прайшлі лепшыя гады, тут яны атрымалі вельмі патрэбную высакародную прафесію і засталіся ёй верныя на ўсё жыццё.

А. У. Стэльмах

На варце здароўя людзей

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў раёне працавала 16 урачоў. Усе бальніцы былі ўкамплектаваны медперсаналам з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

За гады вайны фашысты знішчылі ўсе лячэбныя ўстановы г. Лепеля і раёна, спалілі гарадскую аптэку, амбулаторыю, Валосавіцкую, Слабадскую бальніцы, Пышнянскую і Домжарыцкую амбулаторыі, Воранскі фельчарска-акушэрскі пункт...

У першы месяц пасля вызвалення пачалася эпідэмія сыпнога тыфу. У выніку экстранна прынятых мер захворванне ў раёне скарацілася ўжо да чэрвеня 1945 г. на 65 %.

Да 1 мая 1945 г. у раёне прымалі хворых ужо 2 бальніцы, стацыянар на 115 ложкаў, 5 амбулаторый і паліклінік, дзіцячая кансультацыя, 10 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, дзе працавала 9 урачоў, 11 фельчараў, 9 акушэрак, 55 медыцынскіх сясцёр.

З падзякай успамінаюць землякі старшую аперацыйную медсястру хірургічнага аддзялення раённай бальніцы Яско Вольгу Сцяпанаўну. У 1941 г. яна скончыла Лепельскую школу медсясцёр. З 1942 г. і да вызвалення Лепельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прымала актыўны ўдзел у партызанскім руху. У партызанскай брыгадзе імя Сталіна была медсястрой у шпіталі. Доўгі час у Лепелі працаваў Фёдар Сямёнавіч Сальнікаў, урач-рэнтгенолаг.

Да 1955 г. у раёне налічвалася 130 бальнічных ложкаў, у тым ліку ў сельскай мясцовасці — 30, дзейнічала раённая бальніца, супрацьтуберкулёзны дыспансер, вендыспансер, санітарна-эпідэміялагічная станцыя, Каменская, Валосавіцкая бальніцы, 3 сельскія амбулаторыі, 9 фельчарска-акушэрскіх пунктаў.

У 1982 г. у Лепелі пабудавалі новую бальніцу і паліклініку. Усяго ў Лепель-

скае тэрытарыяльнае медыцынскае аб'яднанне ўваходзяць 3 амбулаторыі і 18 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, дзе працуе 81 урач і 338 чалавек сярэдняга медперсаналу. Акрамя таго, у Лепелі знаходзіцца аблпсіхбальніца, касцёватуберкулёзны дзіцячы санаторый.

Добра вядомы ў раёне: Леанід Іванавіч Бельскі, загадчык хірургічнага аддзялення раённай бальніцы, узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны»; Ганна Фёдараўна Грышанава, галоўны ўрач Пышнянскай участковай бальніцы, узнагароджана значком «Выдатнік аховы здароўя»; Валянціна Савельеўна Разумейка, фельчар в. Вялікі Поўсвіж, якая ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР і прызнана лепшай па прафесіі.

В. А. Касцюкова

Лепельскі ваенны санаторый

Лепельскі ваенны санаторый заснаваны 15 мая 1946 г.

Ён з'яўляецца спецыялізаванай многапрофільнай установай, дзе лечаць захворванні органаў кровазвароту, стравання і абмену рэчываў, хваробы нервовай сістэмы і органаў дыхання нетуберкулёзнага характару.

Санаторый мае лячэбны корпус, аснашчаны навейшай лячэбна-дыягнастычнай апаратурай, тры спальныя корпусы з палатамі на 2—3 адпачываючыя, кухню-сталовую на 460 месцаў, кіназалу, танцавальную залу, кафэ, залу лячэбнай фізкультуры, пляцоўкі для гульні ў валейбол, вялікі тэніс, гарадкі, бадмінтон і інш.

Знамянальная гісторыя гэтай здраўніцы. Летам 1936 г. на тэрыторыі Віцебшчыны праводзіліся вялікія вучэнні — манеўры войск Чырвонай Арміі пад кіраўніцтвам наркама абароны СССР К. Я. Варашылава. Ён звярнуў увагу на цудоўны куточак беларускай прыроды, які знаходзіўся за 12 км ад Лепеля, паміж трох вялікіх глыбакаводных азёраў, быццам паўвостраў, пакрыты сасновым борам. Побач дарогі на Мінск, Віцебск, Полацк. Па прапанове наркама праз некаторы час тут пачалося будаўніцтва трохпавярховага будынка пад шпіталь на 200 месцаў. Да канца 1940 г. было завершана. Пачалося ўнутранае абсталяванне корпуса і падрыхтоўка да адкрыцця шпіталя. Але грымнула Вялікая Айчынная вайна...

У перыяд акупацыі гітлераўцы разгарнулі ў корпусе свой шпіталь — прафілакторый для афіцэраў. Перад адступленнем яны замініравалі корпус, намерваючыся ўзарваць яго. Аб гэтым стала вядома партызанам Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. Яны перашкодзілі намерам фашыстаў.

Пасля вайны было прынята рашэнне аднавіць корпус і выкарыстоўваць яго як санаторый. 15 мая 1946 г. за кошт штату асабістага саставу Сноўскага ваеннага дома адпачынку пачаў функцыяніраваць Лепельскі ваенны санаторый Беларускай ваеннай акругі. У адзіным у той час корпусе размяшчаліся пакоі для адпачываючых, лячэбныя пакоі, водагразелячэбніца і кіназала. Хутка ўзвялі другі двухпавярховы невялікі спальны корпус — сямейны. У 1972 г. — трэці шасціпавярховы спальны корпус на 250 месцаў. У 1979 г. на беразе возера пабудавалі сталовую з кіназалай.

У 1986 г. вырас пяціпавярховы спальны корпус, пазней — двухпавярховы будынак пад кафэ.

Яшчэ ў 50-ых гг. геадэзістамі былі знойдзены на тэрыторыі санаторыя дзве глыбінныя крыніцы мінеральных вод. А ў 1975 г. уведзены ў эксплуатацыю дзве свідравіны з мінеральнай вадой і пабудаваны бювет для піцця мінеральнай вады са свідравіны № 2. Вада са свідравіны № 1 выкарыстоўвалася для прыняцця ваннаў.

Мінеральная вада свідравіны № 1, атрыманая на глыбіні каля 600 м, з'яўляецца бромістым расолам (мінералізацыя 41,4 г/л) сульфатна-хларыдна-натрый-кальцыевага саставу. Блізкімі аналагамі яе з'яўляюцца воды курортаў «Усолле» і «Друскенінкай», санаторыяў «Дорахава» (Маскоўская вобл.), «Зіменкі» (Ніжагародская вобл.).

Мінеральная вада свідравіны № 2 з глыбіні 300 м з'яўляецца сярэднемінералізаванай, слабашчолачнай сульфатна-хларыдна-натрыева-кальцыевага саставу (мінералізацыя 5,6 г/л). Блізкімі аналагамі

гэтай вады з'яўляюцца угліцкая мінеральная вада, мінеральныя воды Іжэўскай крыніцы, крыніц № 1 і № 2 курорта «Трускавец», курорта «Кашын», а таксама мінеральныя воды Беларусі: «Ждановіцкая», «Нарачанская».

Зараз у санаторыі адначасова адпачывае 450 чалавек, ён прымае каля 6 тысяч хворых.

Лепельский военный санаторий. Мн., 1992.

Каб былі здаровы нашы дзеці

Лепельскі дзіцячы санаторый — адзін з найбольш вядомых у вобласці. Лепельшчына выдзеліла яму цудоўны куток: празрыстае возера, пляж, чыстае, свежае паветра. Сосны тут нібы кранаюцца сваімі вершалінамі неба. Спакой і гармонія разліты ва ўсім.

Вось што паведаў галоўны ўрач санаторыя Іван Аляксандравіч Мацвееў, які працаваў тут на працягу 25 гадоў:

— Наш санаторый адкрыўся на базе былога санпрапускніка ў жніўні 1951 г. Тады ён налічваў 50 месцаў. Са жніўня 1954 г. быў пашыраны да 75 месцаў. Зараз ён прымае да сотні дзяцей.

Да 1972 г. у санаторыі лячыліся дзеці з касцявым туберкулёзам. Цяпер санаторый перапрафіліраваны, тут знаходзяцца хворыя з парушэннямі апорна-рухальнага апарату.

Назва «санаторый» не зусім дакладная — лепш было б назваць яго цэнтрам рэабілітацыі, бо дзеці паступаюць сюды пасля перанесеных аперацый, доўгага і не заўсёды ўдалага лячэння ў звычайных бальніцах. У залежнасці ад цяжкасці захворвання яны праводзяць у санаторыі тры-чатыры гады. Медсёстры, урачы, санітаркі ў прамым сэнсе выходжваюць дзяцей, настаўнікі і выхавацелі даюць ім паўнацэнныя веды. І ўвесь калектыў санаторыя прыкладае нямала намаганняў, каб перамагчы хваробу.

Працэс выздараўлення ідзе паступова. Вялікі і пакутлівы шлях прыходзіцца прайсці маленькім пацыентам, іх бацькам, работнікам санаторыя да поўнай рэабілітацыі хворых.

Спецыфіка работы як педагагічнага, так і медыцынскага персаналу такая, што ў калектыве санаторыя не затрымліваюцца людзі выпадковыя, тыя, у каго няма ў душы месца чужому гору, хто нездатны прымаць людскі боль. Медсястра Ларыса Уладзіміраўна Нікандрава прыйшла сюды, каб быць побач са сваім хворым дзіцем, і засталася пасля яго выздараўлення, бо не магла інакш. Далёка за межамі раёна ведаюць Сабіну Францаўну Дабрыцкую. Безліч удзячных пісьмаў прыходзіць ёй з усіх куткоў Беларусі.

Усе дзеці школьнага ўзросту займаюцца ў школе. Для маленькіх існуе падрыхтоўчая група. Не трэба турбавацца бацькам за сваіх дзяцей. Яны ў надзейных руках.

Яшчэ адным неаспрэчным доказам гэтага з'яўляюцца запісы малых пацыентаў, якія, развітваючыся з санаторыем, пакідаюць на памяць шчырыя свае прызнанні. Вось адно з іх: «Куды б ні закінуў нас лёс — на Поўнач ці на Далёкі Усход, мы заўсёды з гонарам і пачуццём высокага абавязку будзем памятаць гады, праведзеныя ў Лепельскім дзіцячым санаторыі. Колькі клопатаў і ласкі, пяшчотнасці і мацярынства праявіў працуючы тут калектыў! І няхай адышлі ў мінулае тыя часы, калі мы былі тут, але ўсякі раз, калі ўспамінаеш аб іх, пачуццё вялікай радасці напаўняе нашы сэрцы».

А. У. Стэльмах

На спартыўнай арбіце

У краязнаўчым музеі ў Лепелі захоўваюцца фотаздымкі, граматы, дыпломы, якія сведчаць аб спартыўных поспехах лепяльчан у пасляваенныя гады. Яны нагадваюць аб тым, што ў 1948 г. лепельскія спартсмены занялі 1-ае месца ў вобласці па плаванні, у 1954 г. удзельнічалі ў абласных спаборніцтвах па футболе, валейболе, баскетболе. У 1956 г. каманда Лепельскага раёна атрымала дыплом III сту-

пені па фехтаванні, дыплом I ступені за кулявую і стэндавую стральбу. У 1957—1960 гг. лепяльчане ўдзельнічалі ў спаборніцтвах па лыжах і гандболе.

Маюцца граматы і дыпломы каманды Лепельскага раёна за 1-ае месца па ўсёй праграме зімовай спартакіяды Віцебскай вобласці (1962, 1963), за 3-яе месца па канькабежным спорце (1962), за 1-ае—2-ое месцы ў спаборніцтвах па класічнай барацьбе, цяжкай атлетыцы, шахматах, боксе, вольнай барацьбе (1960—1964).

У 70—90-ыя гг. добра на абласным узроўні выступалі лепяльчане на спаборніцтвах па футболе, гандболе, дзюдо, самба, цяжкай атлетыцы, веславанні на байдарках і каноэ.

З 1970-ых гг. нашы землякі ўдзельнічалі ў спаборніцтвах па ручным мячы ў праграме абласной спартакіяды школьнікаў. У 1982 г. яны атрымалі дыплом і кубак за 1-ае месца ў першынстве БССР сярод юнакоў. У гэтым жа годзе сярод раёнаў Віцебскай вобласці каманда Лепельскага раёна заняла 3-яе месца на спаборніцтвах па шахматах.

У 1984 г. навучэнка Лепельскай ДЮСШ Л. Яско гуляла ў складзе зборнай БССР па ручным мячы, а ў зборную БССР па гандболе ўваходзілі лепяльчане П. Воюш, А. Охры.

У 1985 г. каманда «Агеньчык» з Лепеля заняла 2-ое месца ў рэспубліканскіх фінальных спаборніцтвах юных футбалістаў на прызы клуба ЦК ВЛКСМ «Скураны мяч». У гэтым жа годзе каманда стала сярэбраным прызёрам Віцебскай вобласці. Гандбалісты Лепельскай ДЮСШ завявалі бронзу на Усебеларускіх сельскіх гульнях.

У 1992 г. дыплом I ступені федэрацыі футбола Віцебскай вобласці атрымала каманда «Колас» з Лепеля, у 1994 г. зборная каманда Лепельскага раёна выйграла кубак Віцебскай вобласці па футболе.

У апошнія гады самымі шматлюднымі ў раёне з'яўляюцца спаборніцтвы па валейболе і футболе.

У раёне праводзіцца круглагадовая спартакіяда сярод фізкультурных калектываў раёна. Яна ўключае вясенні і восеньскі крос, лёгкаатлетычную эстафету па горадзе на прыз раённай газеты «Лепельскі край», прысвечаную Дню Перамогі, летнюю спартакіяду па лёгкай атлетыцы, мнагаборства ГПА, настольны тэніс, лыжныя гонкі, футбол, баскетбол, валейбол.

У сярэдзіне 80-ых праведзена рэканструкцыя гарадскога стадыёна. У 1990 г. уступіў у строй фізкультурна-аздараўленчы комплекс.

У Лепелі дзейнічаюць дзве спартыўныя школы — ДЮСШ ГАРАНА (ручны мяч, бокс, футбол) і абласная ДЮСШ ДФСО прафсаюзаў (веславанне), працуюць філіялы абласной школы па самба і дзюдо і філіял абласной школы па цяжкай атлетыцы. Некаторыя выхаванцы гэтых школ дасягнулі значных поспехаў. Былая вучаніца Пышнянскай СШ Алена Вініцкая, выхаванка трэнера В. В. Маскаленкі, стала чэмпіёнкай свету на дыстанцыі ў тры кіламетры сярод юніёраў, а ў 1994 г. — бронзавым прызёрам чэмпіянату Еўропы сярод дарослых. У першынстве свету сярод юніёраў (сярод весляроў) удзельнічаў М. Гінтафт (пераможца маладзёжных гульняў РБ). У склад зборнай рэспублікі ў 1994 г. была ўключана А. Галымава (трэнеры В. Я. Харкевіч, С. І. Французаў).

Другое месца ў чэмпіянаце рэспублікі па дзюдо ў 1993 г. заняла выхаванка Лепельскай ДЮСШ, студэнтка Беларускай акадэміі фізічнай культуры С. Полазава. Яна выйграла і першынство Мінска. У 1995 г. на чэмпіянаце свету ў Ісландыі (гандбол) выступаў Ю. Гардзіёнак (трэнер П. І. Сініцкі).

У раёне склалася добрая традыцыя правядзення раз у год вечароў, прысвечаных спартсменам і аматарам спорту. Гэтыя вечары ператвараюцца ў спартыўнае свята.

Вялікі ўклад у развіццё спорту на Лепельшчыне ў апошнія гады ўнеслі М. М. Серыкаў, А. А. Суворын, Г. Папоў, У. А. Рыжычэнка, П. І. Сініцкі.

А. У. Стэльмах

Любімы від спорту

Веславанне на байдарках і каноэ ў г. Лепелі пачало развівацца з 1987 г., пасля прыезду ў горад трэнераў Харкевіча Вале-

рыя Якаўлевіча і Харкевіч Тамары Казіміраўны. База веславання размясцілася ў будынку былой ГЭС. У 1989 г. першыя яе выхаванцы Аношка Аляксандр стаў бронзавым прызёрам маладзёжных гульняў БССР і Гершанковіч Ігар — прызёрам першынства рэспублікі.

Харкевічу Валерыю Якаўлевічу было прысвоена званне «Майстар спорту СССР». Да гэтага часу ён двойчы займаў першае месца на першынстве СССР, быў чэмпіёнам рэспублікі і пераможцам міжнародных рэгат у Балгарыі і Польшчы.

У 1991 г. адкрыта аддзяленне грэблі ў в. Суша, дзе трэнерам стаў Емяльянаў Пётр Іванавіч.

У 1992 г. з прыездам трэнера Французава Сяргея Іванавіча аддзяленне веславання было адкрыта ў в. Камень, затым у в. Двор Бабча.

У 1994 г. пасля заканчэння Акадэміі фізічнага выхавання і спорту на Лепельшчыну прыехаў працаваць Харкевіч Валерый Валер'евіч. Ён трэніраваў спартсменаў в. Бароўка.

З 1993 г. пераможцамі і прызёрамі сталі Гінтаўт Міхаіл, Аржаны Сяргей, Харкевіч Кірыл, Юшкевіч Дзмітрый, Карбоўскі Аляксей, Шчарбакоў Ян, Супруненка Аляксандр, Галымава Аксана.

В. Я. Харкевіч

Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа

У 1952 г. у Лепелі пачалі працаваць аддзяленні фехтавання і баскетбола. На іх базе стала дзейнічаць дзіцяча-юнацкая спартыўная школа. Яе ўзначаліў К. Андрэйчанка.

Вучні з ахвотаю прыходзілі ў спартыўную залу СШ № 2, дзе наладжваліся заняткі. Кожны хацеў узяць у рукі рапіру ці шпагу. Заняткі праходзілі рэгулярна, расло майстэрства юных спартсменаў. За кароткі час тут падрыхтавалі добрых фехтавальшчыкаў, якія сталі чэмпіёнамі вобласці і рэспублікі, як, напрыклад, Л. Гайсёнак і Н. Лур'е.

Потым адкрыліся новыя аддзяленні па кіданні кап'я (А. Гарэнікава), бар'ернаму бегу (В. Міхно). Але найбольшую папулярнасць школе прыносіць гандбол. Пад кіраўніцтвам вопытных трэнераў У. Цыганкова і У. Рыжычэнкі каманды настойліва авалодвалі ручным мячом. Старанне прыносіла плён. Нашы гандбалісты сталі чэмпіёнамі рэспублікі.

За час існавання школа выхавала добрыя спартыўныя кадры.

В. І. Селюкоў

Лепельшчына літаратурная

ВЯРЦІНСКІ Анатоль Ільіч, н. 18.11.1931 г. у в. Дзямешкава.

У 1956 г. закончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Працаваў у рэдакцыях раённых газет у Давыд-Гарадку, Камянцы, Клімавічах, Рагачове, газеты «Літаратура і мастацтва», быў рэдактарам у выдавецтве «Беларусь». Сакратар праўлення СП БССР. Паэт з вялікім грамадзянскім пафасам.

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы класічнай і сучаснай рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, балгарскай, польскай, венгерскай паэзіі.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

У 1988 г. яму прысуджана Дзяржаўная прэмія.

А. Вярцінскі

Мы жывём, каб вяртацца
час ад часу туды,
дзе мінула юнацтва,
дзе маленства сляды.
Мы жывём, каб вяртацца.
І лепшага шляху няма.
Мы жывём, каб вітацца:
«Мама! Дзень добры, мая!»
Ну а раптам напасце,
бяда ў той хаціне старой!
Ну а раптам няшчасце —
і маці ў зямлі сырой!
Мы жывём, каб вяртацца,
А куды тады вернешся ты?
З кім так будзеш вітацца,
як тады, да бяды?

А. І. Вярцінскі

А. Вярцінскі

Давайце ўважліва глянем
адзін аднаму ў твар.
Магчыма, не ўбачымся болей:
выпадак — наш гаспадар.
Калі ж і сустрэнемся, можа,
праз доўгія гады,
такімі мы ўжо не будзем,
іншымі будзем тады.
Давайце ўважліва глянем...

ДУДО Пятро (Пётр Дзмітрыевіч), н. 4.09.1911 г. у в. Забалацце. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1935 г. — у Чырвонай Арміі. Закончыў камуністычны інстытут журналістыкі ў Мінску ў 1940 г. З 1940 г. — намеснік рэдактара газеты «Вольная праца» (Беласток), з 1949 г. — карэспандэнт газеты «Во славу Родины». Аўтар нарысаў, апавяданняў, аповесці «Першы салют» (1958 г.), сатырычнай камедыі «Чортаў тузік» (1963 г.). Узнагароджаны 4 ордэнамі, медалямі.

ЛОСЬ Еўдакія Якаўлеўна, н. 1.03.1929 г. у в. Старына Ушацкага р-на Віцебскай вобл. у сялянскай сям'і.

У 1948 г. скончыла Глыбоцкае педвучылішча, у 1955 г. — Мінскі педагагічны інстытут. Працавала літработнікам у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Зорька», рэдактарам Вучэбна-педагагічнага выдавецтва БССР. У 1960 г. скончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве, зноў працавала ў Вучэбна-педагагічным выдавецтве БССР, літработнікам газеты «Звязда», адказным сакратаром часопіса «Работніца і сялянка». У 1975—1977 гг. — галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка». Член СП СССР з 1957 г.

Выступіла ў друку ў 1948 г. (полацкая газета «Большевистское знамя», часопіс «Работніца і сялянка»). Аўтар зборнікаў вершаў «Сакавік» (1958), «Палачанка» (1962), «Людзі добрыя» (1963), «Харастро» (1965), «Яснавокія мальвы» (1967), «Вянцы зруба» (выбранае, 1969), «Перавал» (вершы і паэмы, 1971), «Галінка з яблыкам» (1973), «Лірыка» (1975), «Лірыка ліпеня» (вершы і паэмы, 1977), «Валошка на мяжы» (выбранае, 1984). Для дзяцей выйшлі кніжкі вершаў «Абутая ёлачка» (1961), «Казка пра Ласку» (1963), «Вяселікі» (1964), «Зайчык-выхваляйчык» (1970), «Дванаццаць загадак» (1974), «Смачныя літары» (1978), апавяданняў «Дзесяць дзён у Барку» (1984). У 1979 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2-х тамах.

Напісала кнігі прозы «Пацеркі» (1966) і «Травіца брат-сястрыца» (1970). У 1977 г. у часопісе «Полымя» надрукаваны цыкл «Навелы пятага паверха».

Пераклала на беларускую мову кніжку вершаў С. Баруздзіна «Краіна, дзе мы жывём» (1977).

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалём.

Памерла 3.07.1977 г.

Беларускія пісьменнікі (1917—1990): Даведнік. Мн.: Мастацкая літаратура, 1994. С. 340—341.

Е. Лось

УСПАМІН АБ ЛЕПЕЛЬСКАЙ ДАРОЗЕ

Зімой сляпіла завіруха,
улетку ногі сек жарсцвяк.
Ішлі імжой, ішлі, як суха,
калі пад'еўшы, калі — так...
Ішлі натхнёныя дзяўчынкі
дарогай ранішняй зары.
Вятры трапалі іх хусцінкі,
туліў ад вей бор стары.
Яны вясёла гаманілі
на першых вёрстах дваццаці,
хаця нічога не ўлучылі
і не спазналі ў жыцці.
Апроч бяды, вайны гарачай,
што іх, як кветкі, апякла,
Дарожанька, пасля бядачай,
у міры — першаю была.

Вяла да кніжчынага свята,
таму й сама была святой,
хоць падбіваліся дзяўчаты
дзесь на вярсце саракавой...
Цяпер па ёй не ездзяць многа,
бо лічыцца, што лішні круг.
З Ушач да Лепеля дарога
даўно раўнейшая, мой друг.
Імчыш ты ў свет на шпаркіх колах
асфальтаванаю шашой!
А я ўсё іду, іду наўкола
са спадарожніцай сястрой...

Е. Лось

Зялёны Лепель, сэрцу мілы,
азёрнай гладзі акіян,
ва ўтульным садзіку — магілы,
байцоў і слаўных партызан.
Жывеш ты, ліўнямі прамыты,
грамамі хрышчаны не раз,
шпакамі з даўніх дзён абжыты
і бэзам — быццам напаказ!
Жывеш, раённая сталіца,
сярод палёў як працаўнік.
«У Леплі злеплен!» —
ганарыцца
мой аднагодак-жартаўнік.

З успамінаў М. Я. Ярашэвіч пра сястру Еўдакію Лось

У Лепельскае педвучылішча Дуня не прыехала, а прыйшла пешшу з м. Ушачы, што за 40 кіламетраў. Тады не ездзілі ні машыны, ні аўтобусы, яшчэ ішла вайна, хоць Беларусь і была вызвалена. Ды і бальшака, які зараз ад Лепеля да Ушач, не было, была проста дарога, зарослая бур'яном, кустамі, хмызняком, па якой вельмі страшна было хадзіць... Прыйшла Дуня да мяне, я тады вучылася ўжо на другім курсе. Гэта быў 1945 год.

Жылі мы з сястрой у інтэрнаце з абгарэлымі сценамі, у халодным пакойчыку, дзе мерзлі рукі і ногі, дзе стаяла «буржуйка», але не было паліва, каб абагрэцца. Адзін раз, помніцца мне, недзе мы адшукалі трэсачак, палачак некалькі, запалілі гэтую «буржуйку», крыху пагрэліся, а потым вырашылі пасушыць свае бурачкі, якія мама пашыла з трапак-анучак і прынесла нам. Моцна заснулі, і бурачкі нашы сатлелі да попелу, дыму поўна ў пакойчыку, ледзь не задыхнуліся.

Вучыліся тут з 1945 па 1946 год. Пастаянна галадалі, холад, наогул, цяжкое матэрыяльнае становішча, — мы з Дуняй вырашылі перавесціся на вучобу ў Глыбоцкае педвучылішча. Там лягчэй было пражыць, бо людзі былі багацейшыя: быў у іх хлеб, бульба, сала... Дырэктар Кандрацьеў не адпускаў ні Дуню, ні мяне, не аддаў нам дакументаў, і мы самавольна паехалі на таварняку ў Глыбокае. Ужо пасля, калі мы вучыліся ў педвучылішчы (нас там ахвотна прыняў дырэктар Гарбукоў), па запатрабаванні дырэкцыі нам выслалі дакументы.

МІХНО Уладзімір Фёдаравіч, н. 6.03.1964 г. у в. Чэрцы. Скончыў Чэрскую васьмігодку, затым вучыўся ў Лепельскай СШ № 3. У 1986 г. скончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Працаваў на Чашніччыне, у раённай газеце «Чырвоны прамень». З 1990 г. — у газеце «Чырвоная змена», з 1993 г. — у «Настаўніцкай газеце». Уласны карэспандэнт па Віцебскай вобласці.

Выступае ў галіне прозы. У 1993 г. выйшла кніжка «Горкі зефір» у серыі «Бібліятэчка часопіса «Маладосць». У 1994 г. друкаваўся ў калектыўным зборніку «Карані».

З апавяданнямі выступае ў рэспубліканскім друку, на радыё.

У. Міхно

Людзі едуць на дачу, у адведкі... да маці,
Настальгуюць па вёсцы са сталічных нябёс.
Не часовы я госць у бацькоўскай хаце,
Тут планіда мая, тут Радзіма, тут лёс.
Мне казалі, нібыта за Лепелем лепей,
У сталіцы культура і шмат кілбасы,
Я паверыў, ды ўдалечы сніўся мне Лепель...
Небагатыя вёскі, баравыя лясы...
Бачыў маміну хату і маму — у хаце,
Там, дзе бацька прылёг, — на кладах курганок,
І пачулася мне, бы паклікала маці:
«Ты прачніся, сынок, ты вярніся, сынок!»
І балела душа на асфальце пякучым,
І ўцякаў я, злавіўшы «папутку» за хвост,
Каб падыхаць паветрам празрыстым, гаючым,
Каб убачыць ізноў праз Бярэзіну мост.
Апусцела ў душы, абязлюдзела ў хаце,
Я вярнуўся дадому, цяпер — да сябе,
Я, пакінуўшы хціўцам пасады, багацце,
Дацямна паруплюся на ціхай сяўбе...

У. Ф. Міхно

Т. Т. Кляшторная

Людзі едуць на дачу, у адведкі... да маці,
Настальгуюць па вёсцы са сталічных нябёс,
Я не госць, не чужы у бацькоўскае хаце,
Я — тутэйшы, бо Лепель, бо Чэрцы — мой лёс.

КЛЯШТОРНАЯ Тадзіана Тадораўна, н. 5.01.1929 г. у в. Парэчча. Закончыла Каменскую СШ, Лепельскае педагагічнае вучылішча.

Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры на Браслаўшчыне, у Ленінградзе і іншых гарадах, у дзіцячым садку ў Віцебску.

Вершы пачала пісаць яшчэ ў педвучылішчы, тэматыка вершаў разнастайная, але пераважна піша для дзяцей.

Член літаратурнага аб'яднання пры газеце «Віцебскі рабочы».

Т. Кляшторная

ВЯСНА

Вецер гладзіць мае валасы,
Ціха сад абудзіўся за домам,
Свет спявае на ўсе галасы:
ручаём, цёплым дожджыкам, громам.
На узгоркі, лугі і лясы
Хтосьці сыпле зялёныя зоры,
І блакітныя вочы вясны
Усміхаюцца небу — азёрам.
І мяне нехта ў гай заманіў,
Свежым сокам бяроз напаіў.
І заснуць не дае давідна —
Гэта кліча ў дарогу вясна.

Газета «Віцебскі рабочы». 1976. 17 крас.

Мастакі Лепельшчыны

Лепельскі край багаты на мастакоў. Можа, сама цудоўная прырода натхняе маляваць. Для адных жывапіс — захапленне, якое стала часткаю іх жыцця, для іншых — гэта прафесія, лёс.

Анатоль Уладзіміравіч Ільіноў скончыў мастацкі факультэт Маскоўскага паліграфічнага інстытута. Член Саюза мастакоў СССР (1972). Жыве ў Віцебску, але яго творчая дзейнасць звязана з Лепельшчынай. У сваіх графічных работах ён выкарыстоўвае розныя выразныя сродкі графікі — контурныя лініі, штрых, фон ліста. У карцінах «Лепельская ГЭС», «Утро в заповеднике», «К осени», «Соты на террасе» і іншых А. У. Ільіноў адлюстроўвае сённяшні дзень краю. Працуе ён і ў акварэлі. Удзельнічаў у абласных, рэспубліканскіх і саюзных выставах.

Віктар Васільевіч Мядзведскі нарадзіўся ў в. Адамаўка, вучыўся ў Лепельскай школе-інтэрнаце. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута. Член Саюза мастакоў СССР. Свае карціны выстаўляў больш чым на 15 рэспубліканскіх выставах. У яго работах прыцягвае прадуманасць, выразнасць малюнка, сакавітасць фарбаў («Родные места», «Деревенька», «Лепельские мотивы»).

Зусім іншы напрамак у выяўленчым мастацтве — наіўны жывапіс (прымітывізм) прадстаўляе Васіль Сцяпанавіч Жарнасек, напэўна, адзін з самых вядомых у Беларусі самадзейных мастакоў. Нарадзіўся ён у в. Сітнікі. У 12-гадовым узросце хлопчыка напаткала страшная бяда: ад выпадковага ўзрыву бомбы ён застаўся без правай рукі і страціў зрок. Зрок на адно вока яму цудам вярнулі, а вось працаваць і маляваць вучыўся левай рукой. У Лепелі загадваў клубам, працаваў мастаком-афарміцелем. Пісаў карціны, у якіх адлюстроўваў родную прыроду, блакітныя азёры з цудоўнымі лебедзямі і лясы з казачнымі

дрэвамі. Яго творы ўпрыгожваюць музеі Мінска, Масквы, Кіева, Адэсы, Сімферопаля, Ніжняга Ноўгарада, Урэнгоя, Віцебска, Лепеля. Знаходзяць яны гледача і ў далёкім замежжы.

На адной з выстаў В. С. Жарнасека ў Мінску мастацтвазнаўца Міхаіл Раманюк напісаў: «Гляджу на ўсе карціны і вяртаюся ў райскія сады, чыстыя і незабруджаныя прасторы, дзе пануюць спакой і ўзаемаразуменне».

Мікалай Пятровіч Казачэнка нарадзіўся ў Лепелі, скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута. Зараз працуе выкладчыкам чарчэння Лепельскага гідрамеліярацыйнага тэхнікума. Гэты мастак перадае прыгажосць навакольнай прыроды цераз колер. Для яго характэрна паэтычная трактоўка прыроды, акварэльныя работы пакараюць празрыстасцю, мяккасцю, пяшчотнасцю фарбаў.

Разнастайная творчасць Рыгора Іванавіча Колчына, які ў 1950 г. пераехаў у Лепель з далёкай Чувашыі. Ён майстар пейзажа, партрэта, карцін на бытавыя і гістарычныя тэмы. Мастак-самавучка стаў лаўрэатам першага Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці, удзельнічаў ва Усесаюзнай выставе самадзейных мастакоў «Слава труду». Шырока вядома серыя яго карцін, прысвечаная 40-годдзю перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне («Партрэт Героя Савецкага Саюза Л. М. Даватара», «На дапрос», «Горе матери», «Обманутые» і інш.). У 1973 г. у РДК г. Лепеля адбылася персанальная выстава мастака. Апошняя карціна Колчына «За землю русскую» экспанавалася ў Полацку на выставе, прысвечанай 800-годдзю «Слова о полку Игореве». Але сам мастак не паспеў пабываць на выставе — у 1986 г. ён раптоўна памёр.

Алег Аляксандравіч Скавародка нарадзіўся ў в. Ассё. Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута. Член Саюза мастакоў СССР. Удзельнік усесаюзных і міжнародных выстаў. Працаваў у творчых групах на Кольскім паўвостраве, на нафтаправодзе «Дружба», на возеры Байкал і БАМе.

Яго жывапіс складаны для ўспрымання, карціны вызываюць спачатку здзіўленне, застаўляюць спыніцца і задумацца.

А. У. Ільіноў

В. В. Мядзведскі

А. А. Скавародка

А. В. Бухаркін

Ганарацца лепяльчане творамі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны М. І. Абрыньбы, М. Ц. Гуціева, В. А. Барміна. У краязнаўчым музеі знаходзяцца таксама работы П. А. Жарнасека, А. М. Чулкова, І. М. Будзіча і маладых мастакоў. У іх яшчэ ўсё наперадзе.

А. У. Стэльмах

Мастак ад прыроды

З гонарам носіць імя самадзейнага мастака Анатоль Віктаравіч Бухаркін. Калі глядзіш на яго карціны, першая думка, што ўзнікае: «Як у жыцці». Яны заварожваюць, хочацца цішыні, спакою, узнікае парою жаданне пабегчы ў той лес, на тую палянку. У кожным яго творы столькі душэўнай дабрыні. А лёс жа не шанаваў

Ф. Л. Бурцаў

яго. Стрэл у Кірава ў 1935 г. рыкашэтам трапіў у бацьку, ленінградскага прафесара. Дзяцінства з сургучным адпячаткам — сын ворага народа. Бацька прапаў без вестак, маці блукала ў пошуках працы, настаўнічаць ёй забаранілі. Дзесяцігодку Толя скончыў на пасяленні на Калыме. Паступіў у лесатэхнічную акадэмію ў Ленінградзе. Пасля яе заканчэння яму прапанавалі застацца ў горадзе, але хлопец ірваўся ў лес, бліжэй да стаўшай яму роднай прыроды. Урэшце трапіў у Бярэзінскі запаведнік. Проста ляснічым. І ўсе сорак гадоў ні разу не пашкадаваў аб гэтым. Выклікала жаль толькі адзінае: што ў свой час не скончыў яшчэ адну акадэмію — мастацкую.

...Раптам прыйшло жаданне выгаварыцца ў лясным пустэльніцтве, паведаць аб прыгажосці прыроды некранутай, нябачнай. І тады ён узяў у рукі пэндзаль. Ён вучыўся размаўляць з дапамогай фарбаў, без настаўнікаў, студый, акадэмій. Ён мастак ад прыроды.

Вось ужо два гады Анатоль Віктаравіч на пенсіі. Але па-ранейшаму абыходзіць свой запаведны лес, толькі цяпер ужо з эцюднікам. Нядаўна стаў абучаць маляваць дзяцей з Домжарыцкай школы. Нехай яны не стануць мастакамі, але навучацца бачыць свет і прыгажосць, як іх настаўнік.

Жыццё ўдалося, як і любімы асенні пейзаж мастака.

Т. Пастэрнак

Свет мастацтва

Бурцаў Фёдар Львовіч н. у 1917 г. у г. Лепелі. Тут жа скончыў школу. З ранняга дзяцінства захапляўся маляваннем. Пачынаў вучыцца ў Маскве на курсах жывапісу і малюнка, але закончыць іх не паспеў, бо ўвосень 1939 г. быў прызваны ў армію.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў у аўтатранспартным батальёне. Перамогу сустрэў у шпіталі, куды трапіў пасля цяжкага ранення.

Пасля вайны вярнуўся на Лепельшчыну, працаваў і завочна працягваў вучыцца.

Уся яго працоўная біяграфія звязана з мастацтвам: быў ён выкладчыкам Лепельскага педагагічнага вучылішча, настаўнікам у школе-інтэрнаце. Многія гады працаваў у філіяле Віцебскіх мастацкіх майстэрняў.

Яго карціны розныя па сюжэтах і тэматыцы, але галоўнае, што іх аб'ядноўвае, — родны край, яго памятныя мясціны. Мастак быў больш схільны да пейзажа. Прырода ў яго творах заўсёды на першым плане. Умеў Фёдар Львовіч фарбамі перадаць прыгажосць прыроды Лепельшчыны. Яго малюнкі — старонкі гісторыі нашага краю. Карціны як бы параўноўваюць тое, што было і што сталася.

Многа работ Ф. Л. Бурцаў прысвячаў ваеннай тэматыцы. Яны напісаны на ўражаннях, якія застаюцца ў памяці да канца жыцця.

Творы Фёдара Львовіча выстаўляліся на розных выставах, ёсць яны і ў краязнаўчым музеі. Памёр Ф. Л. Бурцаў у 1979 г.

Перадаць творчы агеньчык

Кожны чалавек па-рознаму прыходзіць у сваю прафесію. Ігар Генадзьевіч Будрэвіч вельмі любіў маляваць. Гэта і вызначыла яго жыццёвы шлях — паступіў у Віцебскі педагагічны інстытут на мастацка-графічны факультэт. Паколькі ў яго сям'і ніхто маляваннем не займаўся і школу мастацтваў хлопчык не наведваў, то ўсё ў яго будучай прафесіі было новым і цікавым — нават такую празаічную рэч, як мальберт, упершыню ўбачыў у інстытуце.

Іван Мікалаевіч Будзіч таксама закон-

чыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педінстытута. Але карані яго захаплення вырастаюць з сямейных традыцый. Яшчэ дзед займаўся разьбой па дрэве, не цураўся пэндзліка бацька, а дваюрадны брат і родная сястра выбралі для сябе маляванне асноўным заняткам жыцця.

Цяпер І. Г. Будрэвіч і І. М. Будзіч працуюць у Лепельскай дзіцячай школе мастацтваў.

Звычайная хата на вуліцы Войкава мала прыстасавана для дзіцячых заняткаў. Але тым не менш заняткі ў школе ўражваюць. Дзеці займаюцца хто чым. Надакучыла маляваць — можаш папрацаваць з дрэвам або з пластылінам, паглядзець за акно. Да кожнага індывідуальны падыход, з кожным — свая сістэма работы, бо ўсе дзеці розныя. «Толькі не бойся колеру. Не азірайся на іншых. Рабі так, як бачыцца табе», — ціхія слоўвы да адной з дзяўчынак, а колькі ў іх сэнсу!

Юныя мастакі не любяць выхадных дзён, і ў канікулы яны б хадзілі ў сваю школу кожны дзень. І не дзіўна.

Цесна, весела, часам шумна, старэйшыя дапамагаюць малодшым. У краязнаўчым музеі і ў раённым Доме культуры праходзіла выстаўка дзіцячых работ, рыхтуецца яшчэ адна.

І. М. Будзіч захапляецца графікай, яму падабаецца выказваць свае пачуцці з дапамогай абмежаванай каляровай гамы і строгіх ліній. З яго творамі аматары мастацтва маглі пазнаёміцца на персанальнай выставе ў Віцебску, некалькі разоў экспанаваліся работы мастака ў Лепельскім краязнаўчым музеі.

Але з асаблівым задавальненнем працуе Будзіч над экслібрысамі, па-мастацку афармленымі кніжнымі знакамі. Прывабліве ў іх раскрыццё ў маленькім малюнку душы і сутнасці чалавека. Са сваімі экслібрысамі Іван Мікалаевіч выступаў у Мінску і Віцебску, некаторыя яго работы пабывалі ў Аўстрыі і Польшчы. А ўсё пачалося з дыпломнай работы, вокладкі да кнігі У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Потым І. М. Будзіч працаваў над вокладкамі кніг М. Рыльскага, М. Маляўкі, амерыканскай пісьменніцы К. Мак-Калерс і іншых. Ёсць у мастака і вопыт работы ў жанры плаката, галоўным чынам на экалагічную тэматыку.

Захапляецца Іван Мікалаевіч Будзіч разьбой па дрэве. Яго захапленне перадалося і вучням.

Ігар Генадзьевіч Будрэвіч таксама гарачы прыхільнік разьбы па дрэве.

Вядома, не ўсе вучні стануць прафесійнымі мастакамі. Але творчы агеньчык настаўнікаў яны пераймуць абавязкова.

Л. Л. Барадзейка

Установы культуры

Раённы Дом культуры

У 1956 г. на цэнтральнай гарадской плошчы Лепеля адчыніў дзверы раённы Дом культуры. Ён мае глядзельную залу на 350 пасадачных месцаў, пакоі для вядзення гуртковай і адміністрацыйна-гаспадарчай працы. Яго супрацоўнікі праводзяць вялікую культурна-асветную работу сярод насельніцтва, шмат робяць у развіцці мастацкай самадзейнасці і народных традыцый, прыкладаюць усе намаганні, каб РДК стаў сапраўдным цэнтрам высокай культуры. У гэтым заслуга былых дырэктараў Дома культуры Ф. Л. Бурцава, Р. Г. Ганчарова, Р. Л. Высюкевіч і інш., а таксама яго цяперашняга кіраўніка Т. К. Харкевіч.

У РДК працуюць 6 народных і 2 узорныя калектывы мастацкай самадзейнасці. Па асноўных жанравых напрамках яны дабіліся немалаважных вынікаў і заслужылі павагу лепяльчан. У 1984 г. пры РДК арганізавана дзіцячая студыя выяўленчага мастацтва, якая ў 1986 г. атрымала званне «ўзорная». Лепшыя работы вучняў студыі выстаўляліся на абласных выставах.

Другі ўзорны калектыў — ансамбль бальнага і сучаснага танца «Лілея», створаны ў 1981 г. За гэты час здзейснена шмат харэаграфічных пастановак і праграм. Шмат дзяцей — выхаванцаў студыі ўжо сталі дарослымі людзьмі, якія і сёння любяць танец, удзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці. Некаторыя з іх самі працу-

юць кіраўнікамі самадзейных танцавальных калектываў. Гэта Вольга Калуцкая, Святлана Федарцова.

Калектыў часты госць на прадпрыемствах горада, у саўгасах і калгасах. Неаднаразова ўдзельнічаў у раённых і абласных аглядах-конкурсах мастацкай самадзейнасці. Прымаў удзел у заключным канцэрце выканаўцаў і ансамбляў бальнага танца Віцебскай вобласці, у 1987 г. заняў другое месца ў конкурсе ансамбляў сярод дзіцячых калектываў. Прымаў удзел у гала-канцэртах «Надзея-93, -94, -95», якія адбыліся ў Віцебску. Вялікая заслуга ў творчым росце ўзорнага ансамбля бальнага і сучаснага танца «Лілея» яго кіраўніка С. П. Сухаміравай, якая з'яўляецца сапраўдным знаўцам сваёй справы. Яна кваліфікаваны спецыяліст і добры арганізатар. Вельмі многа часу ўдзяляе выхаваўчай рабоце з дзецьмі, умела садзейнічае выяўленню творчай індывідуальнасці кожнага дзіцяці.

Заўсёды мнагалюдна на выступленнях ансамбля народнай песні «Рэчанька».

Цікавая гісторыя яго стварэння.

У 1987 г. мінскі фальклярыст З. Я. Мажэйка прапанаваў мясцовым спявачкам прыняць удзел у днях фальклору Беларусі ў Маскве. Выступленне прайшло ўдала, песні запісалі на радыё, знялі фільм. Зараз ні адно мерапрыемства ў горадзе не праходзіць без удзелу гэтага калектыву, апладзіравалі яму гледачы Мінска, Віцебска, Полацка.

Салісткі ансамбля М. Т. Ламека, Г. Н. Тарнаўская, Ф. Т. Дуброўская і З. А. Стэльмах прайшлі праз Айчынную вайну, бачылі многа гора, але з імі заўсёды была песня.

Сакрэт папулярнасці ансамбля «Рэчанька» ў тым, што ён услаўляе спрадвечныя святыні сваіх продкаў.

Т. К. Харкевіч

Школа мастацтваў

У 1958 г. у Лепелі адкрылася дзіцячая музычная школа. Яе філіял знаходзіўся ў пасёлку Заслонава. Спачатку ў школе займаліся 60 чалавек. У студзені 1959 г. дырэктарам школы быў зацверджаны А. М. Палонскі, які працаваў на гэтай пасадзе больш за 20 гадоў.

Навучанне праводзілася па дзвюх спецыяльнасцях: фартэпіяна і баян.

Першы выпуск 14 вучняў адбыўся ў 1963 г.

У 1965 г. адкрыўся 2-і філіял школы ў пасёлку Бароўка.

У далейшым школа з кожным годам павялічвала свой колькасны састаў за кошт адкрыцця новых аддзяленняў і класаў: домры, балалайкі, скрыпкі, гітары, цымбалаў, трубы і інш. Гэта патрабавала дадатковай плошчы. У студзені 1986 г. школа перайшла ў другое памяшканне, што дазволіла адкрыць новыя аддзяленні, у прыватнасці аддзяленне мастацтваў. У 1988 г. быў праведзены першы набор па класе харэаграфіі. У 1989 г. з'явіліся адразу 2 новыя аддзяленні: мастацкае і тэатральнае. Дзіцячая музычная школа была пераўтворана ў школу мастацтваў. У ёй навучалася ўжо 315 дзяцей; і зноў востра адчувалася нястача плошчы.

Гарадскія ўлады з разуменнем аднеслі ся да патрэб школы, і ў студзені 1992 г. ёй перадалі будынак былога райкама партыі. У гэты час у школе налічвалася 336 навучэнцаў і 35 выкладчыкаў, сярод якіх і былыя выпускнікі школы Т. С. Лыско, Т. В. Мандрык, А. П. Валынец, В. А. Габовіч, Н. У. Варошка. З 1983 г. і па сённяшні дзень дырэктарам школы з'яўляецца Б. П. Кавалеўскі, таксама былы выпускнік школы. Другі выпускнік — А. І. Кандрацюк працуе дырэктарам Наваполацкага музычнага вучылішча. У Віцебскім музычным вучылішчы добра зарэкамендавалі сябе былыя вучні школы В. Г. Стрыжонак, В. І. Шэвянкоў, у Віцебскім вучылішчы мастацтваў — М. А. Краснагір, паспяхова працуе ў Мінскім ансамблі народнай музыкі «Бліскавіца» А. П. Балотнік.

Многія выпускнікі школы працуюць выкладчыкамі ў розных дзіцячых музычных школах: А. М. Кулакова выкладае ў Глыбоцкай ДМШ, Г. І. Хрол у Бешанковіцкай ДМШ, Л. М. Цернавая — у Наваполацкай ДМШ. Папоўнілі выпускнікі і музычныя школы Лепельскага раёна. У Стайскай школе мастацтваў працуе С. І. Чарнышоў і С. М. Ткачэнка, у Слабадскім філіяле Домжарыцкай ДМШ — Н. В. Меліхава і Н. А. Самахвал, у Старалепель-

скай ДМШ — В. В. Хлябоўская і А. М. Шушкевіч.

Вялікая група выпускнікоў школы прыйшла ў клубныя ўстановы. У Лепельскім РДК доўгі час працуе акампаніятарам В. С. Шпак, у раённым цэнтры народнай творчасці — А. П. Міхно і І.І. Бусава. У Чарэйшчынскім сельскім клубе — Л. Ф. Усовік , у Юркоўшчынскім СДК — Н. Р. Міснік.

У 1993 г. Лепельская школа мастацтваў атрымала статус прафарыентаванай школы. Навучальны працэс зарыентаваны па 2 накірунках: па прафарыентацыі і агульнаэстэтычным навучанні. Усе без выключэння выступленні школы з'яўляюцца вынікам калектыўных намаганняў усіх аддзяленняў. Асабліва плённа ў гэтым напрамку працуе тэатральнае аддзяленне (загадчык Наталля Васільеўна Джамілашвілі).

Палюбілі ў горадзе стаўшыя ўжо традыцыйнымі мерапрыемствы «Пасвячэнне ў мастацтва», «Навагоднія вечары», конкурс «Вясёлыя ноткі», справаздачныя канцэрты школы ў рамках дзён культуры Лепельшчыны, святочныя канцэрты для жанчын горада ў дзень 8 Сакавіка.

Як правіла, кожны навучальны год заканчваецца вялікім дзіцячым святам, фестывалем мастацтва, з удзелам лепшых калектываў школ Лепельскага раёна. А да гэтага заўсёды праводзяцца адборачныя агляды-конкурсы інструментальных і вакальных калектываў. Лепшыя з іх выходзяць у фінал і з'яўляюцца ўпрыгожаннем гэтых святаў.

У 1989 г. філіялы ў пасёлках Бароўка і Заслонава сталі самастойнымі школамі мастацтваў.

Добры, зладжаны калектыў аб'яднаны адным імкненнем зрабіць школу ўзорнай па ўсіх паказчыках. У 1994 г. у спецыяльныя навучальныя ўстановы рэспублікі паступілі 18 яе выхаванцаў.

У сённяшні цяжкі і складаны час школа мастацтваў на аснове высокай духоўнасці выхоўвае новае падрастаючае пакаленне, нашу будучыню.

Э. М. Літвін

Пашанцавала на педагога

У працоўнай кніжцы Э. М. Літвіна ўсяго два запісы: першы — прыняты 15 жніўня 1959 г. выкладчыкам па класе баяна ў Лепельскую музычную школу, другі — прызначаны намеснікам дырэктара па навучальнай частцы. Паміж гэтымі запісамі больш 30 гадоў карпатлівай працы.

Нездарма гавораць: настаўнік паўтарае сябе ў вучнях. Гэтыя словы цалкам адносяцца да Эдуарда Міхайлавіча. Побач са сваім настаўнікам працуе Н. Э. Смажэўская, у Віцебску і Наваполацку — В. Г. Стрыжонак, Л. І. Цярновая, у Віцебскім культпрасветвучылішчы выкладае М. А. Краснагір. Дарэчы, дырэктар Лепельскай музычнай школы Б. П. Кавалеўскі — таксама былы вучань Э. М. Літвіна. Нядаўна ў Мінску па ініцыятыве заслужанай артысткі БССР Валянціны Пархоменкі стварыўся ансамбль народнай музыкі «Жывіца», музычным кіраўніком якога стаў выпускнік Лепельскай музычнай школы Аляксандр Балотнік.

Яшчэ ў дзяцінстве, якое прайшло ў в. Вялікія Дольцы, Эдуард Літвін захапляўся музыкай. Кумірам для яго была сям'я Гоманаў, у якой добра гралі на гармоніку. Народная музыка, лічыць Эдуард Міхайлавіч, свая, кроўная, сэрцам перажытая, з'яўляецца той жыватворнай крыніцай, якая дапамагае ў жыцці.

З невялікім «музычным багажом», дзвюма на слых падабранымі песнямі, з'явіўся ён на праслухоўванне ў Віцебск. Педагогі прыкмецілі не толькі музычныя здольнасці хлопца, але і яго працавітасць.

Паспяхова закончыў Віцебскае музычнае вучылішча. Прыехаў у Лепель. З таго часу ён і далучае дзяўчынак і хлопчыкаў да прыгажосці.

Кампазітарскія здольнасці і музычны густ часцей праяўляе Эдуард Міхайлавіч у напісанні партыі для кожнага музычнага інструмента, каб зладжана гучаў аркестр.

Яго песня «Салдаты», напісаная да 40-годдзя Перамогі, на абласным аглядзе заняла трэцяе месца. Ёсць у пачынаючага кампазітара песні аб Лепелі, родным краі.

В. А. Самахвалава

Гарадскі цэнтр дзіцячай творчасці

Лепельскі гарадскі цэнтр дзіцячай творчасці быў створаны ў кастрычніку 1994 г. У яго склад увайшлі станцыі юных тэхнікаў і натуралістаў, турбаза. Да гэтага часу гэтыя ўстановы функцыяніравалі самастойна.

Лепельская гарадская турыстычная база піянераў і школьнікаў заснавана ў маі 1975 г. Уся работа турбазы была накіравана на актывізацыю краязнаўчай, турыстычнай, экскурсійнай работы са школьнікамі. Члены гурткоў «Пешаходны турызм», «Юныя турысты» вывучалі гісторыю роднага краю, прыроду, авалодвалі тэхнікай спартыўнага турызму. Піянеры актыўна ўдзельнічалі ва ўсесаюзнай турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі «Мая Радзіма — СССР», дзе арганічна спалучаліся грамадска карысная праца, пазнавальная дзейнасць і актыўны адпачынак. Праводзіліся турыстычныя злёты, краязнаўчыя віктарыны, семінары, экскурсійныя паездкі.

Пазней пры турбазе былі створаны гурткі «Юныя эколагі», «Гісторыкі-краязнаўцы», «Фотатурысты», «Спартыўнае арыентаванне», «Юныя краязнаўцы», «Літаратурнае краязнаўства». Уключыўшыся ў работу ўсебеларускай экспедыцыі «Наш край», гурткоўцы працягвалі вывучэнне роднага краю, гістарычнага мінулага, этнаграфіі і фальклору, народнага мастацтва. Удзельнікі экспедыцый праводзяць паходы, экскурсіі, розныя спаборніцтвы. Па выніках абласнога агляду турыстычных баз у 1993/94 навучальным годзе Лепельская турбаза заняла III месца і была адзначана дыпломам Рэспубліканскай станцыі юных турыстаў за актыўны ўдзел у экспедыцыі «Наш край». Найлепшых вынікаў у рабоце дасягнулі кіраўнікі гурткоў «Юныя краязнаўцы» І. Ю. Януш, «Літаратурнае краязнаўства» В. І. Пугач, Л. С. Садоўская, «Пешаходны турызм» М. М. Сініцын, Н. І. Камароўская. Турбаза падтрымлівае сяброўскія сувязі з рознымі гарадамі Расіі, Украіны і Беларусі — Санкт-Пецярбургам, Ноўгарадам, Пскова м, Беразнякамі, Масквой, Кіевам, Севастопалем, Брэстам, Мінскам, Віцебскам, Магілёвам, Полацкам. У склад Цэнтра дзіцячай творчасці турбаза ўвайшла ў кастрычніку 1994 г.

Станцыя юных тэхнікаў створана ў жніўні 1969 г. Там працавалі гурткі: авіямадэльны, радыётэлеграфны, радыётэхнічны, фотагурток. Крыху пазней стаў дзейнічаць гурток картынгістаў, нязменным кіраўніком якога стаў У. М. Пузанаў. Выхаванцы гуртка картынгістаў і радыёспартыўнага, якім кіруе В. А. Трэгубенкаў, з'яўляюцца неаднаразовымі чэмпіёнамі вобласці і прызёрамі рэспубліканскіх спаборніцтваў. Выхаванец станцыі У. М. Нядбальскі працуе зараз на станцыі кіраўніком авіямадэльнага гуртка. За апошнія гады значна ўзмацнілася матэрыяльныя база станцыі. У 1994 г. станцыя юных тэхнікаў пераўтворана ў тэхнічны аддзел ЦДТ.

З 1 верасня 1994 г. адкрылася станцыя юных натуралістаў. Яе ўзначаліла Г. К. Мазго. Першапачаткова работа вялася ў напрамку арганізацыі метадычнай і матэрыяльнай базы. У жніўні 1996 г. прынялі жадаючых першыя гурткі. Гурткоўцы актыўна ўключыліся ў даследчую і вопытніцкую работу. Станцыя стала цэнтрам метадычнай работы па вопытніцкім, натуралістычным і прыродаахоўчым напрамках. Гурткоўцы пад кіраўніцтвам Г. М. Бяляцкай, Е. У. Самадзелкінай, М. Р. Арцеевай, Т. Я. Дзерваед прымалі ўдзел у абласных і рэспубліканскіх выставах, конкурсах, экспедыцыях, былі адзначаны граматамі і дыпломамі.

Аб'яднанне пазашкольных устаноў у ЦДТ у 1994 г. дало магчымасць скаардынаваць метадычную работу, надаць практычную накіраванасць дзейнасці ўсіх аддзелаў. На базе ЦДТ для школьнікаў горада і раёна праводзяцца масавыя мерапрыемствы, для настаўнікаў і кіраўнікоў — семінары, практыкумы, кансультацыі па розных напрамках выхаваўчай і творчай работы з дзецьмі.

У 1994/95 навучальным годзе пры ЦДТ працаваў 131 гурток, у якіх займалася больш як 1500 дзяцей.

Зараз у ЦДТ існуе 4 аддзелы: тэхнічны, эколага-турыстычны, эстэтычны, арганізацыі вольнага часу дзяцей і падлеткаў. Ёсць цяпліца, турыстычная база на 35 месцаў.

Кіраўнікі гурткоў — высокакваліфікаваныя спецыялісты. Званне «народны майстар» прысвоена кіраўнікам гуртка «Роспіс па дрэве» Г. М. Качан і «Мяккая цацка» Л. В. Дружыне. Тэатральная студыя «Трыяда» пад кіраўніцтвам В. М. Маханенка атрымала званне «ўзорная».

Н. І. Камароўская

Народныя калектывы

Тэатр «Пошук»

Створаны на базе драматычнага гуртка РДК. З часу заснавання гуртка (1970) і да нашых дзён яго ўдзельнікамі было пастаўлена шмат спектакляў па творах класічнага і сучаснага рэпертуару. Гэта «Трыбунал» па п'есе А. Макаёнка (кіраўнік В. З. Майзус, 1970), «Паўлінка» Я. Купалы, «Мудрамер» А. Макаёнка (кіраўнік В. І. Закрэўская, 1984); «Святой и грешный», «Приговор» М. Варфаламеева, «Колокол вечного боя» М. Сарокіна, «Прымакі» Я. Купалы, «Злом», «Вечар» А. Дударава, «А зори здесь тихие» Б. Васільева, «Зойкина квартира» М. Булгакава (кіраўнік В. І. Джамілашвілі, 1989).

У 1992 г. народны тэатр «Пошук» выйшаў пераможцам у абласным фестывалі тэатральнага мастацтва ў г. Талачын, дзе быў паказаны спектакль «Злом» (рэжысёр В. І. Джамілашвілі). Джамілашвілі быў узнагароджаны прызам за рэжысуру гэтага спектакля, мастак-пастаноўшчык І. Будзіч атрымаў першую прэмію за сцэнаграфію, а С. Кухто — за выкананне ролі Афганца.

У 1993 г. тэатр стаў дыпламантам Рэспубліканскага фестывалю тэатральнага мастацтва ў г. Мазыр.

Званне «народны» прысвоена ў 1992 г.

Драматычна-гумарыстычны гурток «Балаган»

У 1989 г. у РДК пачаў дзейнічаць драматычна-гумарыстычны гурток, створаны С. А. Кухто. Першая эстрадная праграма прагучала на першакрасавіцкім свяце смеху і жартаў пад назвай «Банна-рэстаранная быль». Спачатку мініяцюры для выступленняў удзельнікі прыдумвалі самі («У рэстаране», «У лазню», «Акрабатычны эцюд»). Потым калектыў звярнуўся да літаратурных твораў вядомых аўтараў. У рэпертуары з'явіліся мініяцюры М. Жванецкага, С. Альтава і інш. Штогод па традыцыі 1 красавіка ўдзельнікі «Балагана» выступаюць перад гледачамі горада і раёна і з'яўляюцца там самымі жаданымі гасцямі.

На абласным аглядзе-конкурсе культарганізатараў калектыў быў узнагароджаны прызам за лепшае ўладанне публікай.

Састаў калектыву неаднаразова змяняўся, але ў 1991 г. творчую групу саставілі аднадумцы-культработнікі. 1993 г. быў асабліва плённым для яго ўдзельнікаў. Калектыў стаў лаўрэатам рэспубліканскага фестывалю гумару і сатыры «Канвеер смеху-93», які праходзіў у Оршы, пераможцам сярод дэбютантаў на Рэспубліканскім фестывалі «Кірмаш гумару» ў Мінску.

Званне «народны» прысвоена ў 1993 г.

Ансамбль жартоўнай песні «Грымзолі»

Створаны ў 1989 г. Ансамбль з'яўляецца лаўрэатам абласнога фестывалю «Грай, гармонь» (1993 г.), дыпламантам рэспубліканскага конкурсу «Грай, гармонь і цымбалы», удзельнікам канцэртнай праграмы «Славянскі базар-93». Салісты ансамбля — Людміла Шыпуля, Аляксандр Міхно.

Званне «народны» калектыў атрымаў у 1993 г.

Аркестр народных інструментаў

Створаны ў 1975 г. Кіраўнік — У. М. Саўчык. Асноўны састаў аркестра складаюць выкладчыкі і былыя вучні музычнай школы. У рэпертуар аркестра ўваходзяць творы беларускіх і рускіх кампазітараў, а таксама мясцовых аўтараў. Гэта «Мой горад», «Вецер ля бярозак», «Ціха яблыня цвіце», «Наша свята» Э. М. Літвіна, «Домжарыцкі вальс», «Скерца», «Прэлюдыя» У. М. Саўчыка.

Званне «народны» прысвоена ў 1986 г.

Выступленне тэатра «Балаган». 1993 г.

Ансамбль жартоўнай песні «Грымзолі». 1994 г.

Клуб «Ветэран»

Клуб створаны на базе хору ветэранаў вайны, працы і ўзброеных сіл. Арганізатары клуба — Г. М. Лабачова, В. І. Карабан, Н. Б. Сапсай, старшыня — Г. П. Сяргеева, якая з'яўляецца таксама і салісткай хору.

Галоўная задача клуба — прапаганда нацыянальнай культуры, ваенна-патрыятычнае і маральна-эстэтычнае выхаванне насельніцтва, асабліва моладзі. Удзельнікі клуба П. Г. Хадун і А. М. Палонскі на Рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці таварыства інвалідаў былі ўзнагароджаны граматамі і каштоўнымі падарункамі. «Ветэран» вядзе актыўную культурную і асветніцкую дзейнасць, удзельнічае ў раённых і абласных фестывалях.

Званне «народны» прысвоена ў 1992 г.

Клуб «Выток»

Арганізаваны ў 1989 г. Кіраўнік — В. Я. Бародзіч. Гэта самадзейнае літаратурнае аб'яднанне займаецца грамадскай дзейнасцю, накіраванай на прапаганду і папулярызацыю роднай літаратуры, культуры, краязнаўства Лепельшчыны.

Званне «народны» прысвоена ў 1995 г.

Клуб «Скарбонка»

Клуб арганізаваны ў канцы 80-ых гадоў. Ён аб'ядноўвае майстроў народнай творчасці, якія сваёй мэтай ставяць адраджэнне традыцыйных нацыянальных рамёстваў. Назва «Скарбонка» як бы ўвабрала ў сябе ўвесь той скарб, тое багацце, што стварылі талент і працавітасць продкаў, тое, што выяўляе нацыянальнае аблічча беларусаў.

Клуб актыўна ўдзельнічае ў раённых, абласных, рэспубліканскіх святах народных рамёстваў і фальклору. Паспяхова праходзілі асабістыя выставы мастакоў клуба В. С. Жарнасека, А. В. Бухаркіна, П. А. Жарнасека, работ вышывальшчыцы П. П. Воюш, ткачых Домжарыцкага сельскага Савета, разьбяроў па дрэве А. М. Саланенкі, М. Ф. Пауса і іншых.

Вясной 1991 г. за работу па эстэтычным выхаванні насельніцтва, адраджэнні традыцыйных нацыянальных рамёстваў клуб атрымаў званне «народны». Вялікай падзеяй для членаў клуба і ўсіх аматараў народнай творчасці стала адкрыццё ў Лепелі мастацкага салона з такой жа назвай. Самадзейныя і прафесійныя майстры і мастакі атрымалі магчымасць не толькі выстаўляць свае вырабы, але і рэалізоўваць іх лепяльчанам і гасцям нашага горада.

Лепельская зямля багата талентамі. Але майстроў, якія ў свае вырабы ўкладваюць нацыянальны дух і традыцыі, становіцца ўсё менш і менш. Вось таму і ўзнікла ідэя адкрыцця ў Лепелі Дома рамёстваў, асноўнымі задачамі якога было б далучэнне насельніцтва да нацыянальнай беларускай культуры цераз арганізацыю гурткоў, курсаў, школ рамёстваў на даму. Ён пачаў сваё існаванне з лютага 1992 г.

Кіраўнікі гурткоў вывучаюць і збіра-

юць матэрыялы аб традыцыйнай культуры Лепельшчыны, набываюць вырабы народнай творчасці і іншыя матэрыялы з мэтай стварэння музейнага і навуковага фонду, арганізацыі выстаў, кірмашоў, публікуюць у лепельскай газеце матэрыялы аб лепшых майстрах і розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Асаблівую ўвагу супрацоўнікі Лепельскага Дома рамёстваў удзяляюць ткацтву і вышыўцы. Ткацтва заўсёды было самым пашыраным з усіх відаў беларускага народнага мастацтва. Уменне ткаць было абавязковым для кожнай сялянкі, і нездарма асноўную частку пасагу дзяўчыны складалі тканыя вырабы: адзенне, пасцель, ручнікі, абрусы і інш. З ткацтвам звязана шмат старадаўніх народных звычаяў і абрадаў.

Сёння, калі хапае розных тканін прамысловай вытворчасці, ткацтва перастала быць масавым заняткам. Але нельга дапусціць, каб гэты від мастацтва быў ў занядзе.

Даўняе паходжанне мае і вышыўка. У найбольш чыстым выглядзе нацыянальная адметнасць ткацтва і вышыўкі выявілася ў дэкоры ручнікоў, посцілак і дываноў. Але найлепш мастацкія здольнасці ткачых і вышывальшчыц бачны ў аздабленні традыцыйных строяў, асабліва святочнага жаночага адзення.

Сёння, праўда, вельмі складана адшукаць традыцыйны касцюм лепельскага строю, які бытаваў у XIX—XX стст. Але супрацоўнікі Дома рамёстваў не трацяць надзеі калі не знайсці, дык аднавіць гэты касцюм намаганнямі сучасных майстроў. Для гэтага праводзяцца этнаграфічныя экспедыцыі па раёне, закупляюцца старажытныя рэчы, ткацкія і вышывальныя вырабы, старадаўняе адзенне, запісваюцца расказы старажылаў мясцовасці.

В. Е. Жукава

Фальклорныя калектывы

Фальклорны гурт «Оканіца» (в. Окана)

У 1986 г. сышліся восем жанчын з жаданнем зрабіць так, каб у роднай вёсцы зноў пайшлі калядоўшчыкі, загарэліся купальскія вогнішчы, загучалі спрадвечныя песні. Ініцыятарам стварэння калектыву была Вольга Мікалаеўна Маханенка, а яго душой сталі Зінаіда Пятроўна Шытава і Васіль Кірылавіч Кузьмічонак. «Оканіца» выконвае веснавыя песні і гульні, абрады «Жніво», «Вяселле», «Жаніцьба Цярэшкі», разнастайныя танцы, шмат лірычных песень.

Першае выступленне калектыву адбылося на абласным конкурсе фальклорных калектываў, дзе яны паказалі абрад «Заручыны».

Жанчыны ахвотна выступаюць з канцэртнымі праграмамі: яны частыя госці ў суседніх вёсках, а таксама на раённых святах. З удзелам гурта «Оканіца» створаны відэафільм «Жаніцьба Цярэшкі».

Губінскія музыкі

«Губінскія музыкі» — так называюць у раёне Мікалая Пятровіча Чэкліна, Міхаіла Іванавіча Тарана і Пятра Піліпавіча Хрола. Не ўсе яны жывуць у в. Губіна — Мікалай Пятровіч і Міхаіл Іванавіч з в. Макараўшчына. Але ж аб'яднала іх адно — любоў да музыкі.

М. П. Чэклін — майстар ігры на гармоніку, у руках П. П. Хрола ажывае бубен, а М. І. Таран — майстар мастацкага свісту.

Разам яны пачыналі граць на вясковых вяселлях і гулянках. І ў 1987 г. іх запрасілі на раённае свята «Грай, гармонь». Зараз ансамбль добра вядомы не толькі ў раёне. Ён ужо некалькі год удзельнічае ў абласным святе «Грай, гармонь».

Самадзейныя музыканты граюць эмацыянальна, дынамічна. Лёгка і жвава выконваюцца імі народныя мелодыі. Багатая і рэпертуарная скарбонка: гэта полькі, вясельныя і песенныя, танцавальныя мелодыі.

Музыка ў выкананні губінскіх музыкантаў заварожвае, яна выклікае водгук у сэрцах слухачоў, і ногі не ўтрымліваюцца, каб не пусціцца ў скокі.

Там, дзе музыкі, — заўжды добры настрой.

Гарманісты з в. Велеўшчына

Цікавы дуэт гарманістаў склаўся ў в. Велеўшчына. Гэта сям'я Шамшураў. У дуэце граюць бацька Мікалай Піліпавіч і сын Леанід Мікалаевіч. Але музычная спадчына сям'і ідзе ад маці Мікалая Піліпавіча, якая добра грала на цымбалах, гармоніку і была цудоўная пявуння. Яе талент перадаўся сыну і ўнуку.

У 1976 г. Леанід Мікалаевіч скончыў культасветвучылішча, і з гэтага часу бацька і сын выступаюць разам.

Дуэт вядомы не толькі ў сваёй вёсцы, але і ў раёне. Ён жаданы госць на вяселлях, вясковых гульнях, святах, вечарынах.

Фальклорны гурт «Спадчына» (в. Стаі)

Фальклорны гурт заснаваны ў 1987 г. Яго мастацкім арганізатарам стала мясцовая настаўніца беларускай мовы і літаратуры Вера Буланда, чалавек, улюбёны ў самабытную народную культуру Лепельшчыны, паэтэса. Менавіта яна паспрыяла таму, каб абудзіць любоў да песні ў душах жанчын сваёй вёскі, выклікаць у іх жаданне вярнуць у побыт сваю каранёвую культуру, даць магчымасць мастацкаму самавыяўленню. Пачалі аднаўляць традыцыю з вяселля, потым прыпомнілі хрэсьбіны, затым і каляндарныя святы, і загучалі ў Стаях песні.

Яшчэ больш грунтоўна сталі аднаўляць мясцовыя культурныя традыцыі ўдзельніцы гурта з прыходам сюды мастацкага арганізатара Людмілы Лантух: прыпомнілі старыя песні, больш увагі сталі надаваць папулярызацыі мясцовых песень. Душа гурта — Галіна Савельеўна Фаміна, адна з мясцовых спявачак «мудрага» ўзросту, таленавітая, абаяльная жанчына, добрая апавядальніца і знаўца безлічы народных песень.

Усе адзінаццаць жанчын — шчырыя сяброўкі і праводзяць разам не толькі традыцыйныя святы сваёй вёскі, але і сустракаюцца падчас дзён нараджэння і проста ў вольныя дні. А аб'ядноўвае іх родная песня, што надае іх жыццю асаблівы сэнс.

Музеі

Лепельскі краязнаўчы музей

Адпаведна з распараджэннем Савета Міністраў БССР ад 4 лістапада 1953 г. у Лепелі быў створаны краязнаўчы музей, які размясціўся на беразе возера ў драўляным будынку пачатку XIX ст.

Першым дырэктарам прызначылі С. Т. Камека. З ліпеня 1957 г. гэтую пасаду заняла ўдзельніца Вялікай Айчыннай вайны Н. Ф. Шыпуля, якая адпрацавала ў музеі 10 гадоў.

Для наведвальнікаў музей адчынены ў 1954 г. Яго экспазіцыя была прадстаўлена залай «Сацыялістычнае будаўніцтва». Адначасова ішла праца па другіх раздзелах.

У 1959 г. будынак музея перавезлі на скрыжаванні вуліц М. Горкага і Калініна (Мопраўская), дзе ён знаходзіцца і зараз.

У жніўні 1967 г. дырэктарам музея стала Э. Жарнасек. У гэты час у музеі было ўжо больш за 3 тыс. экспанатаў асноўнага фонду.

Да будынка музея робіцца прыбудова для фондасховішча.

Паступова павялічвалася плошча музея, расла колькасць экспанатаў. У 1974 г. у асноўным фондзе музея налічвалася ўжо 4200 адзінак.

У цяперашні час музей мае 7 экспазіцыйных залаў (пл. экспазіцыі 283 м^2), 12,6 тыс. экспанатаў асноўнага фонду (1.01.1995 г.), аддзелы прыроды, гісторыі дасавецкага і савецкага перыядаў. У экспазіцыі адлюстравана гісторыя краю ад старажытнасці да нашых дзён. Дэманструюцца прылады працы і побыту сялян XIX—XX стст., калекцыя адзення, музычныя інструменты, археалагічныя знаходкі, прадметы нумізматыкі, у тым ліку

З клады манет, матэрыялы аб удзельніках рэвалюцый, грамадзянскай і 1-ай сусветнай войнаў, асабістыя рэчы і дакументы партызан і ўдзельнікаў вызвалення Лепельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, карціны мясцовых мастакоў.

Сярод асабліва цікавых экспанатаў трэба адзначыць зброю XIX—XX стст., фотаздымкі і паштоўкі лепельскага фатографа Р. Б. Фідэльмана, пячаткі павятовых і валасных органаў улады XIX ст. і іншыя.

Краязнаўчы музей стаў месцам правядзення сустрэч лепяльчан з ветэранамі вайны і працы, краязнаўцамі, знакамітымі землякамі, паэтамі, мастакамі. Сталі традыцыйнымі выставы, мерапрыемствы «Усёй сям'ёй у музей», святкаванне юбілеяў.

Дырэктарам музея В. Я. Ланікінай, малодшымі навуковымі супрацоўнікамі І. Ю. Янушам, А. У. Стэльмах, В. А. Касцюковай, Н. М. Верасавой праведзена вялікая работа па падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі «Памяць» Лепельскага раёна, якую яны пісалі на працягу некалькіх гадоў. За гэты час былі таксама складзены і ўдакладнены спісы загінуўшых удзельнікаў вызвалення Лепельшчыны, спісы землякоў, якія загінулі ў гады савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ахвяр палітычных рэпрэсій 1930—1950 гг. Краязнаўчы музей з'яўляецца своеасаблівым захавальнікам падзей нашага далёкага і блізкага мінулага.

А. У. Стэльмах

Школьныя музеі

Значнае месца ў вывучэнні помнікаў гісторыі і культуры краю належыць школьным музеям, працуючым на грамадскіх пачатках.

Сярод іх вядучае месца належыць музеям гісторыі школы (СШ № 1, № 2 г. Лепеля, Новавалосавіцкая школа), мастацка-этнаграфічнаму (СШ № 3 г. Лепеля), літаратурнаму (СШ № 4 г. Лепеля) і краязнаўчым (Пышнянская СШ, Домжарыцкая СШ).

У верасні 1983 г. заснаваны музей гісторыі школы ў СШ № 2 г. Лепеля. На працягу некалькіх гадоў пад кіраўніцтвам

Экспанаты краязнаўчага музея. Частка клада сярэбраных прадметаў, знойдзеных у 1989 г.

настаўніцы гісторыі Е. А. Рыўкінай працягваўся збор экспанатаў для музея. Зараз у яго экспазіцыі шмат цікавых матэрыялаў, фатаграфій, архіўных дакументаў аб развіцці народнай адукацыі на Лепельшчыне, аб знакамітых настаўніках і вучнях школы. Асобна прадстаўлены матэрыялы лётчыка, Героя Савецкага Саюза, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, выпускніка школы І. М. Ерашова. Зараз школа носіць яго імя.

Багатыя нацыянальныя традыцыі тоіць у сабе народная творчасць. Адкрыць гэтае багацце дзецям і імкнецца створаны ў школе № 3 г. Лепеля мастацка-этнаграфічны музей. Яго кіраўнік В. У. Гандар, лаўрэат III Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, актыўны прапагандыст народнага мастацтва Беларусі. У экспазіцыі музея дэманструюцца прылады для рукадзелля, прадзення, ткацтва, вырабы народных майстроў: вышыўка, ткацтва, вязанне, пляценне, вырабы з лазы і саломкі, дрэва, ганчарства.

У музеі праводзяцца выставы, заняткі гуртка «Народныя промыслы Беларусі», сустрэчы з народнымі майстрамі.

Асноўнай мэтай дзейнасці літаратурнага музея СШ № 4 г. Лепеля (створаны ў жніўні 1991 г., дырэктар Л. С. Садоўская) з'яўляецца вывучэнне літаратурных традыцый роднага краю, знаёмства з жыццё-

вым і творчым шляхам паэтаў і пісьменнікаў, лёс якіх быў звязаны з лепельскім краем. Экспазіцыя музея ўключае наступныя раздзелы: «З глыбінь вякоў», «Прадвесне беларускай літаратуры», «Паэты новага часу», «Ліра не маўчала», «Песні з душою пяюцца», «Жыві, наша мова!», «Квітней, Беларусь!».

Работа актывістаў музея праходзіць у асноўным праз дзейнасць літаратурна-краязнаўчага гуртка, які праводзіць разнастайную пошукавую работу, арганізуе сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі, вечары паэзіі, экскурсіі для гасцей па родных мясцінах.

Н. М. Верасавая

Музей чыгункі

У далёкім 1925 г. пабудова і адкрыццё руху чыгункі Орша — Лепель з'яўлялася важнай падзеяй не толькі для жыхароў раёна. Аб гісторыі стварэння чыгункі, аб тых, хто працаваў тады і хто працуе тут сёння, можна даведацца ў музеі гісторыі ўчастка дарогі Орша — Лепель , які адкрыўся ў 1989 г. на станцыі Лепель.

Наведвальнікі музея як бы перагарнулі зноў старонкі летапісу краю. Яны пазнаёміліся з цікавымі матэрыяламі, фотаздымкамі, дакументамі. Ужо стаў гістарычным фотаздымак мітынгу чыгуначных войскаў, прысвечаны прыбыццю ў кастрычніку 1925 г. першага поезда, ёсць здымкі часоў Вялікай Айчыннай вайны, партызан, якія ўстанаўліваюць міны на ўчастку чыгункі Чашнікі — Лепель. Шмат матэрыялаў аб ветэранах чыгункі К. С. Тухце, Ф. А. Аўдзееве, які ў 1942 г. быў расстраляны фашыстамі, а таксама аб сённяшніх працаўніках станцыі, якія з гонарам працягваюць справу першых чыгуначнікаў.

В. А. Самахвалава

Прырода

Прыродная характарыстыка Лепельскага раёна

Расліннасць. На тэрыторыі пераважаюць хваёва-шыракалістыя (змешаныя) лясы. Расліннае покрыва па характары ўздзеяння на глебу і інш. прыкметах падраздзяляецца на тры фармацыі: лясную, лугавую, балоцістую.

Лясы займаюць 45 % ад усёй тэрыторыі раёна. Яны характарызуюцца высокай удзельнай вагой хваёвых — 47,5 %; яловыя 13,8 %, бярозавыя 20,4 %, чорнаальховыя 11,1 %, шэраальховыя 3,6 %, асінавыя 2%, ясянёвыя 0,8 %, дубовыя 0,7 %, іншыя 0,1%, 12,7 % лясоў — штучныя, пераважна хваёвыя насаджэнні. Лясы багатыя на ягады, грыбы, лекавыя расліны.

Натуральныя лугі і паша займаюць трэцюю частку тэрыторыі раёна. Пераважаюць нізінныя заліўныя лугі. Лугі і паша з'яўляюцца прыроднымі кармавымі ўгоддзямі.

Агульная плошча балот — каля 32 тыс. га, з іх 13,3 тыс. га верхавыя, 18,3 тыс. га нізінныя, каля 360 га пераходныя.

Нізінныя балоты жывяцца грунтавымі водамі. Для іх характэрны чарот, асака, трыснёг, аер і інш. Верхавыя балоты ўтвараюцца з нізінных. На іх растуць пушыца, хвошч, багун, чахлая сасна і інш.

У Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь занесены баранец звычайны, мнаганожка звычайная, альдраванда пухіраватая, пералеска высакародная, каменяломнік балотны, першацвет веснавы, купальнік горны, наперстаўка буйнакветкавая, ладдзян трохнадрэзаны, тайнік сэрцападобны, асака заліўная, шпажнік чарапіцавы, чараўнік двухлісты.

Жывёльны свет вельмі разнастайны. У лясах водзіцца лось, дзік, ліс звычайны, воўк, казуля, янотападобны сабака, рысь, заяц-бяляк і заяц-русак, вавёрка, тхор, куніца, выдра, норка, андатра.

З ахоўных жывёл сустракаюцца буры мядзведзь, барсук, скапа, змеяед, беркут, арлан-белахвост, сапсан, белая курапатка, чорнаваллёвая гагара, чорны бусел, дзербнік, вялікі кулон, даўгахвостая няясыць, трохпальцы дзяцел, гогаль, пусталыга, шэры

журавель, шэры саракуш, чаротная рапуха.

У рэках і азёрах водзіцца акунь, карась, лешч, лінь, шчупак, язь...

І. Ю. Януш

Бярэзінскі запаведнік

На Беларусі ўжо мала засталося унікальных па сваёй прыгажосці і неацэнных для навукі куткоў прыроды, некранутай дзейнасцю чалавека. Адным з такіх месцаў з'яўляецца Бярэзінскі біясферны дзяржаўны запаведнік, створаны ў 1925 г. Вучоныя называюць яго «эталонам прыроды». Такая назва невыпадковая. Ужо цяпер нельга знайсці ў Беларусі тэрыторыю з захаваным раслінным і жывёльным светам, якой можна было б па праву даць такую назву. Усюды чалавек пераўтварыў і хуткімі тэмпамі працягвае пераўтвараць прыроду, падпарадкоўваючы яе сваім мэтам і задачам, карэнным чынам мяняючы і перастройваючы яе аблічча. Прырода стала акультуранай: ралля і сенакосы, лугі, рэкі, азёры і моры — усё гэта эксплуатуецца чалавекам, на жаль, не лепшым чынам. Зусім іншая справа ў запаведніку. Тут на плошчы 81 тыс. га, як бы ў мініяцюры, захаваліся да нашых дзён прыродныя комплексы, уласцівыя раней прыродзе паўночнай часткі Беларусі — Паазер'ю, але якія хутка змяніліся пад усё ўзрастаючым уплывам тэхнізацыі жыцця краіны. У запаведніку ўсялякае ўмяшанне ў прыроду забаронена законам. Гэта зроблена для таго, каб прасачыць працэс натуральнай эвалюцыі прыродных комплексаў. Гэта абарыгенныя месцы мядзведзя, лася, дзіка, бабра, глушца, чорнага бусла і многіх іншых жывёлін і птушак. У запаведніку растуць таксама унікальныя віды раслін: венерын чаравічак, пылкагалоўнік чырвоны, купальнік горны, асака заліўная, сушаніца ляжачая, пузырнік судзецкі, лілея кучаравістая, гладыёлус чарапічны і іншыя.

Тэрытарыяльна запаведнік знаходзіцца ў Докшыцкім, Лепельскім раёнах Віцебскай і Барысаўскім Мінскай абласцей. Цэнтральная сядзіба размяшчаецца ў пасёлку Домжарыцы, што за 3 кіламетры ад шашы Мінск — Лепель.



Помнік прыроды. Дуб ля в. Тадуліна. Узрост каля 400 год

Цяжкі і слаўны лёс Бярэзінскага запаведніка. Цяжкімі былі першыя арганізацыйныя гады: падбор спецыялістаў, арганізацыя навуковых даследаванняў, будаўніцтва жылых і адміністрацыйных памяшканняў, стварэнне калекцыйнага фонду і многія іншыя клопаты. Пятнаццаць гадоў стараннай працы — усё гэта затым будзе знішчана нямецкімі захопнікамі.

У ліпені 1944 г., калі яшчэ дыміліся руіны вызваленага Мінска, беларускі ўрад прыняў спецыяльную пастанову па аднаўленні Бярэзінскага запаведніка. У найцяжэйшых умовах разбуранай пасляваеннай эканомікі, пры недахопе людзей, сродкаў, матэрыялаў наладжваецца ахова запаведных тэрыторый, арганізоўваецца навуковы аддзел, будуюцца адміністрацыйныя і жылыя памяшканні, ствараюцца музей і бабровая ферма (замест разбураных фашыстамі), праводзіцца ўлік дзікіх жывёл. Па ўспамінах А. Т. Хацкевіча, у той час выконваючага абавязкі дырэктара запа-



Будынак музея прыроды ў Бярэзінскім запаведніку

ведніка, людзі жылі і працавалі ў зямлянках, да Мінска дабіраліся 4—5 дзён, ездзілі туды, маючы адзінага каня. Але, нягледзячы на цяжкасці, да 1950 г. гаспадарка была адноўлена. Навуковы аддзел займаўся, у асноўным, распрацоўкай метадаў клетачнага развядзення бабра.

Аднак у 1951 г. запаведнік ліквідуецца і на яго тэрыторыі ствараецца паляўнічы заказнік рэспубліканскага значэння. За 1951—1958 гг. леспрамгасамі высечана 4 тыс. га спелых пасадак. Услед за скарачэннем плошчы лясоў змяншаецца колькасць паляўніча-прамысловых жывёл. Таму пастановай Савета Міністраў БССР ад 29 красавіка 1958 г. «Аб мерах паляпшэння лясной гаспадаркі і рацыянальнага выкарыстання лесасыравінных рэсурсаў рэспублікі» Бярэзінскі запаведнік ізноў быў адноўлены ў былых межах — на плошчы 67 тыс. га. Дзейнасць сваю ён аднавіў з 1 студзеня 1959 г. У 1965 г. да запаведніка адышлі землі двух калгасаў, якія знаходзіліся ў яго межах, агульная плошча павялічылася да 76,2 тыс. га.

У 1976 г. у Бярэзінскім запаведніку праведзена дыферэнцыяцыя тэрыторыі на ўчасткі з розным рэжымам аховы. У абсалютна запаведнай зоне (35 тыс. га) забараняецца ўсялякая гаспадарчая дзейнасць. Тут дазваляюцца толькі навукова-даследчыя работы, звязаныя з праграмай экалагічнага маніторынгу. На тэрыторыі буфернай зоны (49 тыс. га) дазваляецца правядзенне мерапрыемстваў па падтрыманні раўнавагі ў прыродных комплексах. У гэтай зоне таксама вядуцца навукова-даследчыя работы. Эксперыментальна-гаспадарчая зона (7 тыс. га) прызначана для забеспячэння насельніцтва, якое пражывае на тэрыторыі запаведніка, сельскагаспадарчай прадукцыяй і ўтрымання індывідуальных гаспадарак у строга абмежаванай колькасці.

Вакол запаведніка створана ахоўная зона з 33 тысяч га. Яна мае шырыню 2 км па Віцебскай вобласці і 1 км — па Мінскай. Гэтая зона належыць лясгасам, калгасам і іншым гаспадаркам і служыць мэтам аховы прыродных комплексаў запаведніка ад уплыву гаспадарчай дзейнасці звонку. У ахоўнай зоне дазваляецца праводзіць работы толькі пры станоўчым заключэнні спецыялістаў навуковага аддзела ці вучонага савета. Гідралагічная зона (шырыня 5 км вакол гаспадаркі) садзейнічае захаванню ўсталяванага гідралагічнага рэжыму і балот запаведніка. Тут забаронены любыя работы, звязаныя з меліярацыяй.

Бярэзінскі запаведнік значыўся ў ліку першых сярод сямі міжнародных біясферных запаведнікаў у былым СССР, зацверджаных ЮНЕСКО 19 лютага 1979 г.

У 1983 г. на базе Бярэзінскага запаведніка праходзіў I Міжнародны кангрэс па біясферных запаведніках. У рабоце форуму прынялі ўдзел 112 спецыялістаў з 47 замежных краін, а таксама вялікая група вучоных і практыкаў з розных прыродаахоўных устаноў былога Савецкага Саюза. Зараз у рамках выканання міжнароднай праграмы ЮНЕСКО «Чалавек і біясфера» калектыў запаведніка ўдзельнічае ў работах па захаванні і вывучэнні генетычнай разнастайнасці прыроды, праводзіць аналіз стану акружаючага асяроддзя. Запаведнік з'яўляецца базай навуковых даследаванняў Інстытута эксперыментальнай батанікі АН Беларусі, Інстытута заалогіі АН Беларусі і іншых навуковых устаноў.

Для паспяховай навуковай работы ў запаведніку створаны ўсе ўмовы. Да паслуг вучоных — добра аснашчаныя прыборамі лабараторыі, вялікія лясныя масівы, у многіх месцах захаваўшыя рысы першапачатковасці, разнастайны жывёльны

свет. Павышэнне экалагічных ведаў, папулярызацыя ідэй аховы прыроды — адна з важнейшых задач усяго калектыву запаведніка. Тысячы людзей з розных куткоў краіны, а таксама замежныя турысты штогод наведваюць запаведнік. Знаёмяцца з музеем прыроды, экскурсійным гадавальнікам дзікіх жывёл, месцамі партызанскай славы, цікавымі месцамі дзікай прыроды. Штогод у запаведніку бывае каля 50 тысяч экскурсантаў. Вялікую работу сярод турыстаў праводзіць музей прыроды і цэнтр экалагічнай асветы.

У запаведніку многа памятных гістарычных мясцін. Вялікую археалагічную цікавасць уяўляюць паселішчы, якія называюцца «могільнікамі» старажытных насельнікаў гэтага краю, размешчаныя на краі Ражнянскіх балот. Праз цэнтральную тэрыторыю запаведніка праходзіць частка воднай сістэмы, якая злучае Бярэзіну з Заходняй Дзвіной, і тым самым басейн Чорнага і Балтыйскага мораў. Сярод непраходных балот, карыстаючыся толькі сякерамі, лапатамі, тачкамі, яе пабудавалі за сем гадоў у 1804 г. Бярэзінскі запаведнік — гэта партызанскі край. Яго зямля паліта крывёю савецкіх людзей, асобныя вёскі напаткаў журботны лёс Хатыні.

А. А. Лукашук

Веснавы Зімнік

Не ўсе лепяльчане ведаюць гэты лясны масіў. Добра вядомы ён, бадай, толькі насельнікам паўднёвай часткі раёна. Гэты залесены куток адыгрывае ў іх жыцці немалую ролю. Ужо назва пушчы — Зімнік — кажа сама за сябе. Толькі зімой можна карыстацца яго некалькімі коннымі, а апошнім часам пешаходнымі дарогамі.

Раскінуўся Зімнік паміж вёскамі Гадзіўля і Велеўшчына. Плошча яго адносна невялікая — якіх пару кіламетраў ушырыню ды разы ў тры-чатыры болей удаўжыню. Аднак непраходнасць, былая нерушнасць, таямнічая велічнасць гэтых мясцін ствараюць уражанне аб іх боязнай бясконцасці...

Сёлетні невялікі снег сышоў даўно. Веснавое сонейка лагодна паліває зямлю доўгачаканай цеплынёй. За Гадзіўляй з братам Васілём ледзь перабіраемся цераз напоўненую талай вадой яшчэ панскую канаву, Васіль двойчы правальваецца, набірае ў боты, затым доўга выкручваецца. І ўсё адно далей не ідзём конскай дарогай, якой ніхто даўно не карыстаецца, а збочваем правей, каб трапіць у тую частку Зімніку, дзе хадзіць яшчэ ні мне, ні яму не даводзілася...

Праз Зімнік пралягае адзіная аўтамагістраль, калі можна так назваць жвіроўку Чарнаручча — Красналукі. Цяпер яна бойкая, высокая, цвёрдая. А якіх 20 гадоў таму вясной тут пешшу нельга было прайсці, не тое што на машыне праехаць.

Шмат людскога гора бачыла гэта дарога. У першы год вайны гналі немцы ёю палонных на Барысаў. Шкада было гадзіўлянцам знямоглых, галодных учарашніх вайскоўцаў. Пачалі яны кідаць у калоны акрайцамі хлеба, блінамі, варанай бульбай. Не ўсім трапляла такая дапамога, распачыналася валтузня. Канвойныя пускалі ў ход прыклады, стралялі. Трупы валіліся на зімніцкую дарогу...

Чула чалавечы боль і ўжо новая жвіроўка. Здараюцца часам на яе бясконцых фантастычных выкрунтасах аварыі аўтатранспарту.

...Толькі далёка мы ад аўтатрасы. Мінулі забалочаную пойму канавы, праціснуліся праз узлескавы хмызняк і апынуліся нібы пад дахам з густых яловых лапак. Дол паміж тоўстымі, у абхопак, ялінамі заліты талай вадой. Пад ёй коўзкі, яшчэ моцны лёд. Не дабіраюцца да яго скрозь зялёны гушчар касыя веснавыя промні. Змрок наўкола і цішыня. Глухая, нязвыклая, своеасаблівая.

Але не доўга цешыць зрок ды сэрца гэтая спрадвечная нерушнасць. Праз колькі соцень метраў святлее, ёлкі змяняе хмыз. Першая дзялянка. Мабыць, лясгасаўская, бо леспрамгасаўскія значна большыя. Дрэвы спілавалі даўно: пні чорныя ад старасці. Шмат ламачча. Сядаем адпачыць ды перакусіць на павалены, але не звезены ствол. Успамінаем японцаў, у якіх нават ігліца ідзе ў справу.

Незалечаную рану нанеслі пушчы ў 70-ыя гады нарыхтоўшчыкі хвойнай мукі.

Сотні сякер ды пілаў тады апусціліся на смалістыя водарныя ствалы. Падалі дрэвы магутныя ды дрэўцы кволыя побач, падалі крыж-накрыж. Выкарыстоўваліся толькі тонкія канцы лапак, а рагатыя абракадабры стварылі непраходныя, непразныя завалы. Быццам Тунгускі метэарыт секануў па Зімніку. Цяпер па тых мясцінах прасоўвацца так-сяк можна — рагатыя хлысты большай часткай пагнілі, спарахнелі.

Цёпленька на сонечнай купіне. Адпачываецца лепш, чым на чарнаморскім пляжы. Аднак трэба ж крочыць далей. З кургана на курган, з кораня на корань, а дзе і проста па вадзе выходзім на прамую дарогу з Гадзіўлі ў Велеўшчыну. Нікому яна ўжо не патрэбная. З возам па ёй не паедзеш, бо надта ўжо часта перагароджаная яна павыдзіранымі з каранямі ялінамі, якія моцны вятрыска пакідаў чамусьці якраз упоперак дарогі. А раней жа, пакуль не было жвіроўкі, па ёй хадзіў маршрутны аўтобус на Цярэшкі. Праўда, толькі зімой. На тое і Зімнік. У астатнія ж поры года даўно ўяўляла амаль суцэльную стужку з вады ды гразі.

Злева да дарогі ўшчыльную туліцца адна дзялянка, а справа свеціцца вялізная другая. Вось такі ён, знявечаны, закінуты, пакрыўджаны Зімнік. Як бачна, крыўдаваць яму на людзей ёсць за што. Карыстаюцца тыя ягонымі багаццямі. Штолета бягуць у пушчу навакольныя жыхары па брусніцы, чарніцы, маліны, лекавыя расліны. Грыбоў няшмат, паколькі лес яловы, аднак можна назбіраць груздоў, свінух, чарнушак. Сустракаюцца і падбярозавікі, падасінавікі, баравікі. А колькі лесу шуміць па свеце з насення незлічоных мільярдаў шышак, што паасобку ды гронкамі звісалі з кожнай ёлкі, кожнай лапкі. Чаму ж тады так па-варварску адносяцца да ляснога масіву людзі? Няўцям Зімніку, што мясцовыя жыхары яго разумеюць ды шануюць. Нішчаць жа пушчу тыя, хто жыве далёка. Чужога не шкада.

Па-ранейшаму ціха ў Зімніку. Нягледзячы на вясну, рэдка патрывожыць ціньканне сініцы. Не стала жывёлы. Раней узімку можна было нібы па асфальце хадзіць па заячых ды ласіных сцежках. Кожны з мясцовых жыхароў неаднойчы сустракаўся тут з дзікамі. Начамі ў самых нетрах вылі ваўкі. Жыў мядзведзь. А цяпер у Зімніку, як у гарадскім парку — хіба што вавёрку выпадкова сустрэнеш. Уцяклі звяры ў Бярэзінскі запаведнік, куды забаронена дарога чалавеку з сякерай.

Вось так, бяздумна, сквапна, у пагоні за сённяшнім рублём, ствараем мы сабе Сахары...

У. К. Шушкевіч, 1992 г.

Служба надвор'я

У 1993 г. споўнілася 100 гадоў з дня пачатку метэаназіранняў у г. Лепелі. Іх праводзіць метэаралагічная станцыя Лепель II разраду. У яе функцыі ўваходзіць забеспячэнне метэаралагічных і аграметэаралагічных назіранняў і назіранняў за радыеактыўным забруджваннем актыўнай паверхні і правядзенне адбору ападкаў на трытый. Акрамя гэтага метэастанцыя забяспечвае неабходнымі данымі гарвыканкам, гаркамгас, лясгас, сельгасхімію, сельгасэнерга, ДЭУ-202, ДРБК, праводзіць абслугоўванне паветранай авіяцыі. Гэтыя даныя неабходны для складання прагнозаў надвор'я, штомесячнікаў, штогоднікаў.

Метэаралагічныя назіранні на станцыі пачаліся ў 1893 г. па праграме станцыі III разраду, а з 1905 г. у архіве Галоўнай геафізічнай абсерваторыі з'явіліся назіранні па праграме станцыі II разраду. Станцыя працавала без перапынку да 1918 г. уключна. За гэты перыяд назіранні за ападкамі, навальніцай, снежным покрывам публікаваліся ў летапісах Галоўнай геафізічнай абсерваторыі. Пасля значнага перапынку назіранні былі адноўлены ў 1926 г. і працягваліся да чэрвеня 1941 г. У ліпені 1944 г. станцыя адноўлена і працягвае працаваць па цяперашні час.

Назіранні ў мінулым праводзіліся прымітыўнымі прыборамі. Толькі з чэрвеня 1951 г. на станцыі быў устаноўлены ападкамер Траццякова, а з верасня 1958 г. — флюгер. Але гэта толькі нямнога аблегчыла назіранні, яны па-ранейшаму абцяжарваліся запускам шара-пілота, запоўненага вадародам, для выяўлення вышыні ніжняй мяжы воблакаў. Здабыча вадароду,

якая праводзілася на станцыі, патрабавала вялікай затраты часу, а ўначы прыходзілася запускаць шар-пілот разам з ліхтарыкам для падсвету, што стварала свае цяжкасці. Ускладнялася сітуацыя і пры візуальным вызначэнні бачнасці.

Зараз станцыя абсталявана сучаснай камп'ютэрнай тэхнікай. Лепельская метэаралагічная служба прыняла трэцяе пакаленне ЭВМ. Машыны робяць замярэнні тэмпературы, ціску, здымаюць паказчыкі прыбораў на стандартнай метэапляцоўцы, самастойна фіксуюць, кадзіруюць і перадаюць інфармацыю ў Мінск.

Ужо 32 гады працуе на станцыі тэхнік-метэаролаг Раіса Пятроўна Скорба. Шмат сіл аддала сваёй любімай працы Антаніна Станіславаўна Капановіч і іншыя. А вось В. А. Дзям'янчанка і Т. А. Каласоўская прыйшлі сюды нядаўна. Апошняя з іх вучыцца ў Маскоўскім гідраметэаралагічным каледжы. Дарэчы, метэаролагаў рыхтуюць усяго ў трох навучальных установах — у Маскве, Адэсе і Санкт-Пецярбургу. Такім чынам, прафесія метэаролага рэдкая і, як сведчаць работніцы, вельмі цікавая.

Магчыма, у будучым людзі змогуць перадаверыць тэхніцы частку работы і тады далёкім успамінам стануць стамляючыя начныя змены. Ну а пакуль без перапынкаў на абед і выхадных дзён, неадхільна ад заведзенага графіка, выходзяць на сувязь у адзін і той жа час метэаролагі.

Л. Л. Барадзейка

Лепельскія краязнаўцы

Чалавек і яго захапленне

80 год жыве на свеце гэты чалавек, і да гэтага часу не пакідае ён даследаваць невядомыя старонкі жыцця Лепельшчыны.

Праз усю вайну пракрочыў выпускнік Горкаўскага вучылішча зенітнай артылерыі Анатоль Сямёнавіч Ханяк. Упершыню сутыкнуўся з ворагам ён у беларускім горадзе Кобрыне. Пад Кіевам трапіў у палон. Вязнем вайсковага лагера пачынаў будаваць стаўку Гітлера пад Вінніцай. Ад немінучага расстрэлу выратаваўся ўцёкам. Воўчымі сцежкамі дабраўся на родную Лепельшчыну і ўступіў у мясцовае падполле, затым — у партызанскі атрад. Пасля вызвалення Беларусі ў складзе Першага Беларускага фронту штурмаваў Берлін...

Мінуўшчынай Анатоль Сямёнавіч захапіўся ў 1953 г., калі пачаў працаваць дырэктарам Лепельскай сямігодкі. На працягу 6 гадоў разам з вучнямі кіраўнік адшукваў карані заснавання першай сярэдняй навучальнай установы Лепеля, якая вядзе адлік з 1917 г. Навялі даведкі пра яе першага дырэктара П. А. Счасновіча. Здзейснілі двухтыднёвы паход па партызанскіх сцежках маршрутам Лепель — Камень — Белае — Мосар — Жары — Пораўна — Вялікія Дольцы — Антунова — Пуцілкавічы — Пышна — Лепель і дзесяцідзённую вандроўку Лепель — Слабада — Замошша — Вобалачча — Валатоўкі — Чорная Лаза — Сялец — Студзёнка — Стайчаўка — Велеўшчына — Лепель. Па матэрыялах даследаванняў стварылі школьны музей.

Ужо на пасадзе завуча Лепельскай школы-інтэрната, на якой знаходзіўся з 1959 па 1961 г., разам з членамі краязнаўчага гуртка Анатоль Сямёнавіч захапіўся вывучэннем стварэння і дзейнасці Бярэзінскай воднай сістэмы — помніка гідратэхнічнага будаўніцтва XVIII—XIX стст. Арганізаваў музей пры школе. Яго напоўнілі экспанаты, здабытыя сумесна са школьнікамі дзіцячага дома ў кіеўскай Боярцы, дзе Мікалай Астроўскі будаваў вузкакалейку. Тры пакоі заняў музей. Аднак наступнае кіраўніцтва школы-інтэрната пасля працяглага рамонту памяшкання ўсе экспанаты вывезла на... звалку.

Працуючы намеснікам старшыні райвыканкама, Анатоль Ханяк заняўся вывучэннем дзейнасці «беларускага Мічурына», мясцовага селекцыянера Язэпа Мароза. Свае даследаванні краязнаўца змясціў на старонках раённай газеты «Ленінскі сцяг» у 1974 г. Не даспадобы прыйшлося

А. С. Ханяк, курсант Горкаўскага вучылішча зенітнай артылерыі. 1940 г.

камусьці ўсхваленне працы заможнага вяскоўца першых гадоў савецкай улады. Паскардзіўся «добразычлівец» на аўтара ў вобласць. Прыехала адтуль камісія штурмаваць «крамольніка». Аднак нядрэнныя людзі ў яе ўваходзілі. Крамолы ў даследаваннях Анатоля Сямёнавіча і дзейнасці Язэпа Кандратавіча не ўбачылі. Выручыла тое, што ў 1918 г. па ініцыятыве самога Мароза на тэрыторыі яго гаспадаркі быў створаны саўгас, а гаспадар пачаў працаваць у ім галоўным аграномам.

Ужо пенсіянеру Ханяку ў 1980 г. прапанавалі ўзначаліць краязнаўчы музей, Анатоль Сямёнавіч згадзіўся і жахнуўся, убачыўшы тую гаспадарку. Установа доўгі час была зачынена з-за адрахлення ўнутранага аздаблення будынка. Два гады цяжкай працы спатрэбілася цяпер ужо прафесіянальнаму краязнаўцу, каб адраманта-ваць памяшканне і аднавіць экспазіцыю.

Анатоль Сямёнавіч Ханяк даўно ўжо прыпыніў працоўную дзейнасць. Аднак ён не перастае вывучаць свой край, даносіць землякам праўду аб яго гісторыі. Да вопытнага краязнаўца нярэдка звяртаюцца настаўнікі, вучні, студэнты з рознымі пытаннямі і атрымліваюць кваліфікаваную дапамогу.

Анатоль Сямёнавіч прымае ўдзел у краязнаўчых мерапрыемствах раёна, шчодра дзеліцца вопытам краязнаўчай работы з навучэнцамі школ, тэхнікума, ПТУ г. Лепеля. У кватэры спрактыкаванага краязнаўца захоўваюцца каштоўныя дакументы з далёкіх часін, даўняя гістарычная літаратура, рэдкія фотаздымкі. Словам, жытло Анатоля Ханяка — сапраўдны цікавы музей.

У. К. Шушкевіч

Шушкевіч Уладзімір Канстанцінавіч

Нарадзіўся ў в. Верабкі Лепельскага р-на ў 1952 г. Скончыў Гарадоцкі саўгастэхнікум у 1979 г. З 1986 г. пачаў займацца вывучэннем стану малых рэк і азёраў Лепельшчыны.

У 1986 г. краязнаўцам даследавана рака Эса (пачынаецца на Міншчыне);

у 1967 г. — рака Оканіца (выцякае з в. Окана, упадае у р. Бярэшча);

у 1988 г. — рака Палявежа (выцякае з в. Доўгае і ўпадае ў Эсу ля в. Юшкі), рака Бярэшча з Верабскім каналам, рака Ула, Бярэзінскі канал (пачынаецца ля в. Валова Гара і цячэ ў в. Бярэшча), Сергуцкі канал (выцякае з р. Бузянка, упадае у р. Бярэзіну), рака Кеста (пачынаецца каля в. Востава, упадае у воз. Бярэшча);

у 1989 г. — рака Бузянка (выцякае з воз. Тэкліц, упадае ў Сергуцкі канал ля в. Домжарыцы);

у 1991 г. — рака Зеха (пачынаецца з воз. Пышна ля в. Пунішча, упадае ў Лепельскае воз.);

у 1992 г. — воз. Нюля (за цагельным заводам), воз. Баравенка (ля в. Жарсцвянікі), воз. Луконец (ля в. Бяседы), воз. Тэкліц (ля в. Аўгустова), лясны масіў Зімнік (каля в. Гадзіўля), балота Чысцік (каля в. Гадзіўля), лясны масіў Гарэльнік (каля в. Гадзіўля), рака Старобінка (пачынаецца каля в. Замошша Чашніцкага р-на, упадае ў р. Свядзіца каля в. Азярцы).

Усе пералічаныя рэкі прайшоў пехатою ад вусця да вытоку. Кожны маршрут, атрыманыя ўражанні, стан вадаёмаў, іх наваколле падрабязна апісаў і апублікаваў ў раённых, абласных і рэспубліканскіх выданнях. Па шматлікіх газетна-часопісных артыкулах прыняты канкрэтныя меры. У выніку стварыліся магчымасці па выратаванні і захаванні адметных лепельскіх куточкаў прыроды.

І. Ю. Януш, 1992 г.

Традыцыі і звычаі

...Год пачыналі Каляды. Тры куцці на вёсках спраўлялі: першая, посная, перад Ражством Хрыстовым, другая — багатая, навагодняя і трэцяя — посная, на Вадохрышча. Сонца паварочвала на лета, вітала будучую вясну, і на вёсках ад малога да старога ладзіліся дапамагчы маці-прыродзе ў пераадоленні цемры і сцвярджэнні Новага года. На Лепельшчыне калядоўшчыкі амаль не хадзілі, толькі дзеці бегалі па хатах, насілі дровы. Кожнаму гаспадыня блін і скварку давала, дзякавала за добрыя пажаданні.

А гаспадар з поўнай лыжкай куцці клікаў-запрашаў Мароза і прасіў самую прыроду з душамі продкаў аб дабрабыце і ладзе:

Мароз, Мароз, хадзі куццю есці,
Пад мяжой не ляжы, а пашэньку пашы.
— Мароз, Мароз, хадзі куццю есці.
— Еў, еў, на колічку сеў,
З колічка звалiўся,
Кажушком накрыўся.

Ну а дзяўчаты на Хрышчэнне пасцілі ад адной зоркі да другой, цэлыя суткі, каб «выпасціць» сабе жаніха.

На Лепельшчыне вызначаліся Каляды старажытнай цікавай абрадавай гульнёй «Жаніцьба Цярэшкі». Моладзь, а некалі даўно і ўсё дарослае насельніцтва вёскі, збіралася разам, каб разбіцца па парах і заключыць паміж сабой сімвалічны шлюб. Кіравалі дзеяй «бацька» з «маткай», якія потым пачыналі другую частку: лавілі-даганялі адзін другога. Гульня вядомая і ў суседніх раёнах, аднак на Лепельшчыне захаваліся яе адметныя асаблівасці. Так, у асобных вёсках хлопец напярэдадні ішоў да бацькоў абранай дзяўчыны і прасіў жаніць з іх дачкой «Цярэшку». І ў час гульні хлопцу даводзілася частаваць «бацьку» з «маткай», каб вывелі яму ў круг яго сяброўку. Бо існаваў закон — каго бацькі прысудзяць, з кім злучаць, з тым і заставаўся на вечар цэлы. Часта здаралася, што і на ўсё жыццё...

Цярэшку цярэжыла,
На печы не ўлежыла.
З печачкі скаціласа,
За дзедзьку схапілася.

Палавіну зіміцы пазначалі Грамніцы, а на Лепельшчыне, акрамя таго, ведалі і прысвятак Грамнічкі, калі бабулі прыносілі ў хату гусака і кармілі яго на стале, разаслаўшы кажух. На Масленку цягнулі па вуліцы калоду, засланяючы ёю дзверы хат, і адкатвалі толькі за выкуп. Гаспадар жа далучаўся да працэсіі, і так праз усю вёску. У другіх жа сёлах раёна натоўп мужчын хапаў жанчыну, што першай сустрэлася ім на вуліцы, і на санках цягнуў яе дадому, каб пачаставала. Не прапускалі сялянкі і Саракоў, і не сорак пакутнікаў паміналі яны, а чакалі ў гэты дзень сорак выраяў. Напякалі сорак клёцачак, запякаючы ў адну з іх цукерку, а ў другую сыпалі перац, каб паваражыць пра будучы лёс. На Благавешчанне чакалі бусла ды пачыналі заворваць поле.

На Вербніцу раненька ламалі галінкі вярбы ды неслі асвячаць іх у царкву. Прынёсшы дадому, прыбіралі іх рознымі стужкамі ды кветкамі. А дзеці хапалі тыя дубчыкі і бегалі з імі па хатах, каб сцебануць сяброў, і прыпявалі: «Не я б'ю. Вярба б'е. Ішла баба з загор'я, несла кораб здароўя».

Апошні перад Вялікаднем — чысты чацвер, калі ўсе старанна прыбіраліся-рыхтаваліся да найвялікшага свята — уваскрэсення Сонца і Хрыста. На Лепельшчыне існавала цікавая традыцыя: у гэтую ноч, да сонца, ісці ў крыніцу па ваду, каб абмыцца самім, абмыць каровак, папаіць, а рэшткі зліць у бутэльку і цішком закапаць, каб ніхто не бачыў і не крануў.

У суботу перад святам гаспадыні расчынялі цеста ды фарбавалі яйкі ў колеры сонца, што сімвалізавала адраджэнне сонца, святла і цяпла. Сімвал Вялікадня: яйка — новага жыцця калыска, яйка Кашчэя — смерць забіўшае, яйка — Хрыста ўваскрэсенне. А назаўтра па сяле ішлі-брылі валачобнікі, і ў песнях кожная хата станавілася палацам і «ў кожным хляве дзіва дзеелася».

У квецені і водары садоў прыходзіла Юр'е. Занудзіўшае за зіму па ніве сэрца цягнула гаспадара ў поле, дзе ўжо зелянела рунь. Са святой вярбой, свечкай грам-

нічнай і хлебам-соллю ён абыходзіў ніву. Часам на полі збіраліся і за чаркаю, елі і з надзеяй на багаты плён ішлі дадому. Імкнуліся выгнаць на юраўскую расіцу і жывёлу, каб перадаць яе апеку самому Юрыю.

На Купалле на ўзвышшах, да неба бліжэй, палілі вогнішчы. Дзяўчаты не міналі паваражыць аб будучым замужстве — ішлі моўчкі праз тры жытнёвыя полі, расой умываліся і цішком клаліся спаць, каб сасніць суджанага. А жанчыны клапаціліся аб надзейнай ахове сваёй жывёлы ад чараўніц, што ладзілі ў гэтую ноч баляванні.

Ну а Купалле «жаць запрашала». Жніўны абрад на Лепельшчыне, хоць і разгортваўся ў адзіным рэчышчы з агульнай традыцыяй, змяшчаў у сабе і свае, адметныя дэталі. Зажынаючы, неслі дадому снапок, які называлі «гаспадаром» ці «гадавым гасцьком». Ну а дажынкі станавіліся сапраўдным святам. Пакідалі на полі некалькі нязжатых каласкоў — «бараду». З іх верхавін плялі вянок, а «бараду» качалі — валілі гаспадара і качаліся з ім па тых каласах: «Пакоцімся мы гурбой, каб кацілася жыта трубой». Дзяўчаты кідалі праз галаву сярпы, каб даведацца, дзе жыве суджаны.

Восень праходзіла непрыкметна, уся ў клопатах і справах. Пакідалі пра сябе ўспамін толькі Чуды — вераснёўскі прысвятак, калі «чудзілі» — зацягвалі на дах пеўня ці казу і інш. Спарадкаваўшы плён увесь, спыняліся ва ўрачыстым роздуме — паміналі продкаў, спраўлялі Дзяды. І быццам бы сапраўды прыляталі яны, каб пабачыць жыццё нашчадкаў.

Цэлым цыклам абрадаў і павер'яў суправаджалася і само жыццё чалавека — ад нараджэння і да скону. Лепельскія хрэсьбіны вылучаліся сваім найбагацейшым песенным суправаджэннем і цікавымі рытуаламі. Так, паўсюдна збіралі дзіцяці «на мыла», падыходзячы да гасцей, трэсачкай жартам «голячы» іх і патрабуючы грошай. Не абыходзілася і без абавязковай бабінай кашы.

Аб лепельскіх вяселлях — разгорнутых песенных дзеях — можна гаварыць бясконца, бо кожная вёска ўносіла ў абрад свой каларыт і непаўторнасць. Тут было ўсё: і сватанне з дыялогамі — перламі народнай дасціпнасці, і запоіны з тужлівым дзявочым зборам, і само вяселле з каравам, цыганамі, песнямі і гульнямі. Ноччу гасцям-хлопцам падкладалі на пасцель ступу, а дзяўчатам — таўкач, пераапраналі жаніхом з нявестай старых дзеда і бабу. І праз усё — песні і песні.

Са сваімі рытуаламі праводзілі чалавека ў апошні зямны шлях. Верылі, што адыходзіць-адлятае ён у таемны вырай.

Ну а будні былі напоўнены «законамі», і праца не абыходзілася без песень, а вечары без гульняў, загадак і казак. І так з году ў год.

Т. В. Валодзіна

Лепельскі строй

Лепельскі строй — традыцыйны комплекс беларускага народнага адзення Падзвіння. Бытаваў у XIX — пач. XX ст. пераважна ў Лепельскім, Ушацкім, Чашніцкім раёнах. Аснову летняга касцюма жанчын складалі спадніца, фартух. Кашуля мела тунікападобны або з прамымі плечавымі ўстаўкамі крой, сціплае аздабленне вузкімі паскамі чырвона-чорнага геаметрычнага арнаменту на рукавах і плечавых устаўках. Спадніцу (саян, дрыліх, андарак, шарак) шылі з 3—4, у заможных сялян з 7 полак пярэстых або аднаколерных даматканых тканін у блакітна-белым, сіне-фіялетавым, вохрыста-чырвоным каларыце, фартух — з 1—2 полак кужэльнага палатна, аздаблялі ўзорыстым ткацтвам (пераборы), вышыўкай (мярэжка), карункамі. Галаўныя ўборы — намітка, чапец, хустка, вянок, карона (галаўны ўбор дзяўчыны-мяшчанкі накшталт падвічкі з парчы, расшытай бліскаўкамі) і інш. Мужчынскае адзенне складалі кашуля (насілі навыпуск, падпяразвалі поясам ці дзягай), нагавіцы, камізэлька з чорнай або цёмна-сіняй крамнай тканіны. Галаўныя ўборы — саламяны або лямцавы капялюш, белая магерка, картуз. Верхняе мужчынскае і жаночае адзенне — армяк, сярмяга, світка, кажух.

Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 288.

З гісторыі назваў

Жыхары краю вельмі цікавяцца тымі мясцінамі, дзе яны нарадзіліся, жывуць, працуюць. Іх цікавіць паходжанне назваў населеных пунктаў. Як вядома, гэтым пытаннем займаецца айканімія — частка навукі тапаніміі (ад грэч. topos — месца, onyma — імя).

Адным з першых даследвальнікаў гэтай праблемы быў прафесар Белдзяржуніверсітэта Вадзім Андрэевіч Жучкевіч, які пачаў збіраць матэрыялы па беларускай тапаніміі яшчэ ў другой палове 40-ых гг. У 1974 г. у Мінску была выдадзена яго кніга «Кароткі тапанімічны слоўнік Беларусі» (на рускай мове). У прадмоўі да яе аўтар адзначыў: «Крыніцай фактычнага матэрыялу для дадзенага слоўніка з'явіліся літаратурныя крыніцы, а таксама звесткі, атрыманыя са службовай перапіскі, даведнікі, спісы населеных пунктаў, гістарычныя дакументы, летапісы, архіўныя матэрыялы, геаграфічныя карты розных гадоў выдання, афіцыяльныя даныя картатэкі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і, нарэшце, асабістае знаёмства з тапаніміяй на месцы, дзе сабрана і праверана ад 30 да 90 % усіх пададзеных у слоўніку назваў».

Багаты факталагічны матэрыял знаходзім у «Слоўніку» і аб паходжанні назваў вёсак Лепельскага раёна. Вялікая група іх звязана з імёнамі ці прозвішчамі пасяленцаў або пераважаемымі ў вёсках прозвішчамі. Напрыклад, Антонаўка, Адамаўка, Валосавічы, Казлы, Караевічы, Домжарыцы (назва ўтваралася ад старажытнарускага імя «Доможир — багаты», «жирный» дом), Тадуліна (Тадулін — прозвішча цюрскага паходжання), Экімань (царкоўнаславянскае імя «Екімань»), Шаркоўка (ад бел. слоў шэры, шарко), Велеўшчына (ад прозвішча з асновай «вялікі»), Аношкі, Занькі, Зяленка (Зелянкоў), Каранёўка, Касцюкоўшчына, Мядзвёдаўка, Мішулькі, Матырына, Мягелі, Несіна, (Несім), Пунты, Старобіна, Цярэшкі, Усовікі, Сяргееўшчына, Ірынполле, Макараўшчына, Грыгаравічы, Губіна і інш.

На працягу многіх стагоддзяў складваліся назвы, якія абазначаюць тэрміны. Гэта Лядна (ляда — участак з-пад лесу, падрыхтаваны пад раллю або сенажаць), Луцішча, Лутчына (лут, лута — лыка маладой ліпы), Ніўкі (апрацаваны ўчастак зямлі), Жарцы (першапачатковае спальванне лясоў для земляробства), Ассё (устар. назва асіны), Атокі (месца, дзе быў ток), Сцаі, Стайск (стая, стайня — часовы навес для жывёлы), Студзёнка (студня-калодзеж), Свяда, Свядзіца («свидина» — назва расліны), Дворышча (месца былога двара), Хвашчова (ад асновы «хвошч»), Чарніца (ад асновы «чарніца»), Ляхавічы (ляхамі ў мінулым называлі палякаў), Стараселле (старое, першапачатковае паселішча), Поплаўкі (заліўныя лугі), Паданіцы (самаасемянёныя палі), Селішча (астатак старажытнага неўмацаванага паселішча), Суша (сухое поле), Навасёлкі, Навіны (новыя паселішчы), Далікі (паселішчы, размешчаныя далёка ад тых месцаў, дзе яны ўзніклі), Слабада, Слабодка (пасяленні ў XI—XVIII стст., якія часова вызваляліся ад выплаты падаткаў), Пераходцы (пераход праз рэчку, балота), Пунішча (пуня — хлеў, «сарай»), Пышна (пахун — рыхлы грунт), Бяседы (бяседа — прыдарожны знак і збудаванне на старых шляхах), Будзяўцы, Будзішча (буда — невялікая пабудова, часовае жыллё), Гарадчэвіцы (пасяленцы па паходжанні з горада) і інш.

Са старажытных часоў населеным пунктам давалі назвы па мясцовых арыенцірах. Напрыклад, Вілы (раздваенне дарог, развілак), Забалацце (паселішча за балотам), Забароўе (за борам), Зацякляссе (за возерам Тэкліц), Крайцы (на краі зямельнага масіву), Крыўкі, Крыўцы (крывая вёска), Паддуб'е (месца ля дубоў), Межыца (мяжа, граніца), Масцішча (каля маста), Чарнаручча (паселішча каля чорнага ручая), Парэчча (паселішча каля ракі) і інш.

З развіццём гаспадарчай дзейнасці ўзнікалі назвы вытворчага характару. Паташня (месца выпрацоўкі паташу, які выкарыстоўваўся для адбельвання ў шкляной вытворчасці), Рудня (у мінулым невялікае прадпрыемства, на якім выплаўлялі жалеза з руды), Сітнікі (людзі, якія займаліся вырабам сітаў), Чарэйшчына, Чаросава, Чэрцы (у аснове славянскі

тэрмін «чартала» — назва прымітыўнага прыстасавання для апрацоўкі глебы), Дражна (невялікае прадпрыемства, дзе дзяўблі чаўны, ступы, карыты і інш.).

Ад звычайных агульных слоў утварыліся: Жарсцвянікі (жарства — буйны пясок), Бароўка (бор — сасновы лес), Варань (варона), Валатоўкі (волат, гігант, асілак), Гаравыя, Загорцы (гара), Калінаўка (каліна), Кветча (кветка), Кастрыца (кастра), Ліпкі (ліпа), Бабча (баба), Прудзнікі («пруд» — сажалка), Рожна («рожь» — жыта), Ладасна, Ладзейна («ладья» — лодка), Камень (камяністае поле) і інш.

Некаторыя назвы іншамоўнага паходжання. Кальнікі (латыш. «кальнік» — камяністая горка), в. Окана (літ. «акно») і інш.

Трэба памятаць, што кожная назва адлюстроўвае пэўныя этапы гістарычнага, этнаграфічнага, геаграфічнага развіцця краю. І змяненне іх без асаблівай неабходнасці робіцца ў рэдкіх выпадках.

І. Ю. Януш

Звесткі аб населеных пунктах Лепельшчыны

Большой Полсвиж, деревня при озере Полсвиж, дворов 34, жителей 344, волостное правление (уездный город в 4-х верстах). В 1-й версте Заболотье, винокуренный завод.

Веребки, село при Березинском канале, дворов — 16, жителей — 180, православная церковь.

Воронь, село при озере Зано, дворов — 25, жителей — 301, волостное правление (уездный город в 15-ти верстах), церковь православная, школа. В 1/2 версты — усадьба Воронь, римско-католическая церковь, винокуренный завод.

В 10-ти верстах — усадьба Завидичи, часовня, винокуренный завод, водяная мельница.

Городчевичи — село, дворов — 19, жителей — 110, волостное правление (уездный город в 15-ти верстах), церковь православная.

В 6-ти верстах — усадьба Медучицы, римско-католическая церковь, кожевенный завод, ветряная мельница.

Гущин Прудок, село, при реке Заозерке, дворов — 4, жителей — 38, православная церковь, часовня, водяная мельница.

Заборовье, село, при озере Негроза, дворов — 19, жителей — 10, православная церковь, кладбище.

Камень, местечко, при озере Каменском и Истинке, дворов — 22, жителей — 134, волостное правление (уездный город в 17-ти верстах), православная церковь, римско-католическая церковь, синагога, школа, почтовая станция, водяная мельница, 6 постоялых дворов, 16 лавок, 3 ярмарки.

В 9-ти верстах — усадьба Поречье, пивоваренный завод, ветряная мельница. В 5-ти верстах — усадьба Губин, римско-католическая церковь, водочный завод, водяная мельница.

В 11-ти верстах — Суша, винокуренный завод.

Кривцы, село, при озере Долгом, дворов — 9, жителей — 76, православная церковь.

Макаровщина, село, при озере Макаровщина, дворов — 15, жителей — 110, православная церковь.

Несино, усадьба, волостное правление (уездный город в 23-х верстах), православная церковь, школа.

Пышно, местечко, дворов — 14, жителей — 128, волостное правление (уездный город в 16-ти верстах), церковь православная, еврейский молитвенный дом, школа, кожевенный завод, лавки. В 6-ти верстах — усадьба Заболотье, винокуренный завод, водяная мельница.

Старый Лепель, село, при озере Лепель, дворов — 37, жителей — 400, 2 православные церкви, богодельня.

Юркова Стена, деревня, при озере Лепель, дворов — 48, жителей — 520, волостное правление (уездный город в 7-ми верстах).

З кнігі «Волости и важнейшие селения Европейской России». СПб, 1886. С. 137—138.

Населеныя пункты, якія не існуюць

БАБРОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Азёрава, Альшанка, Антаполле, Астравы, Баброва, Блізняты, Быхава, Вазнясенск, Вілы, Галаеўшчына, Галаі, Гарбадзеева, Грабіжава, Заазер'е, Іканка, Кавалеўшчына, Кісцялёва, Кліменцава, Навіны, Нізы, Плоткі, Пляшкі, Пячышча, Румна, Сокалы, Устрань, Уютак;

хутары: Ажанава, Барсукі, Гараватка, Гарані, Кабачок, Казіміра ва, Малінава, Навамыслі, Наваянск, Неклач, Радунь, Слабодка;

двары: Матырына.

ВАЛОСАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Амосаўка, Балінка, Бузышчына, Бяляеўка, Васькоўшчына, Вацлавова, Ветчына 1, 2, Вобалачча, Гарцакаўшчына, Дварэц, Заполле, Зара, Зафіеўка, Ігрушка, Кабылянка, Калінкі, Капцы, Капцюгаўшчына, Кляўзы, Красоўшчына, Ленінск, Молат, Мшорск, Потак, Рамальдова, Растраб, Сасна, Серп, Схеда, Чырвоны Гай, Шчураўка;

хутары: Аўгустова, Белы Клён, Владзіслава, Другая Лука, Завалы, Калінаўка, Каменны Ручай, Ласіныя Ямы, Ляхавічы, Мар'янава, Навінка, Новае Заполле, Новы Свет, Сінічана, Сябры, Таронкавічы.

ГОРСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Антонава, Весялова, Герцаўшчана, Гушчына, Камшанава, Лазовікі, Ласосніца, Лукашонкі, Міцькаўшчына, Сцяфанава;

хутары: Бораўна, Глыбачка, Замошша, Карчы, Лашчына, Маланка, Навіны, Надзей, Полазава, Хірыніца, Царкавішча;

двары: Гарадзінец, Караевічы.

ДОМЖАРЫЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Забаенне, Залазы, Заціша, Мар'янава, Пастрэжжа, Прыстань;

хутары: Асавінаў, Астравок, Ласіныя Ямы, Макрына, Плясінка, Рашэўскага.

ЗААЗЕРСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Альховікі, Дубкі, Духавічы, Заазер'е 1, 2, Замховыя, Мартынаўка, Пруднікі;

хутары: Азяруты, Барсукі, Буранка, Лазовікі, Ласіннікі, Судакі, Янова;

пасёлкі: Ільнозавод.

КАМЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Азярцы, Аленчыкі, Бараўцы, Баркі, Бубноўшчына, Варонікі, Вугал, Вялікі Лес, Зады, Каменны Ручай, Мазнікі, Макоўе, Мурашкі, Мягелі 1, 2, Навасёлкі, Пузаны, Ракаўцы, Рапейшчына, Сакалоўшчына, Свярбячына, Смалярка, Стараселле 1, 2, Сукнеўшчына, Таргоншчына, Уладзіміра ва, Фернаполле, Хралова, Шалафаны 1, 2;

хутары: Альхоўцы, Баярцы, Горкі, Жабка, Забароўе, Замасціша, Камень, Лагеры, Нагоры, Пагары, Студзёны Вугал, Сукнеўшчына, Уланава, Уліценкі, Фантазія, Янікі;

пасёлкі: Брава, Венера, Ільнозавод, Іменкі, Крыўцы, Кугачына, Снежкава, Экімань, Янікі;

былыя маёнткі: Астроўна.

ЛЕПЕЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Акцябрская, Востраў, Гараватка 1, 2, Гушчын Прудок, Данілаўка 1, 2, Дзекаманы, Завалочча, Замчык, Засценак, Зялёнка 1, 2, Казялькі, Канстанцінаўка, Лазовікі, Ленінок, Лугі, Масціша, Міхалінава, Некалач, Окзіна, Старобіна, Тарчылава, Уезд;

хутары: Аўгустова, Барсукі, Бобрыцкая Гара, Бярозаўка, Гараватка, Гушчын Прудок, Казлы, Карчы, Лукомка 1, 2, Людчыцы, Ляхі, Малое Жэжліна, Малядоўшчына, Мартынаўка, Масціша, Мяжа, Прудок, Сілаводна 1, 2, Чырвонка, Юрачка, Ясянок;

пасёлкі: Антунова, Барсукі, Беразняк, Бобрыца, Вярцёлкі, Глініша, Масціша, Прудок, Уцечча, Філімонаўка, Флорынтава, Ягадка;

двары: Вялікае Жэжліна, Прудзіша, Казіміра ва, Луціша, Малое Жэжліна, Павулле;

былыя фальваркі: Антавільня, Васькоўшчына.

ПЫШНЯНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Баравыя, Бярэзнікі, Вясёлая Горка, Вяцэнтава, Заастроўе, Завалотнічча, Зарэчча, Ложкі, Прудніки;

хутары: Альховікі, Аржанікі, Бабін Бор, Вінжанцінава, Гай, Залеж, Звезна, Лагеры, Лазовікі, Ліпнікі, Навінкі, Параснік, Пацеха, Пескавацікі, Ражкі, Ржаўка, Рудакі, Сталяжоўка, Старына, Чартоўка;

пасёлкі: Калінец, Чырвоная Гара, Чырвоная Горка, Чырвоная Ніва;

былыя фальваркі: Забалацце, Пышна, Старынка.

СЛАБАДСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Верабкі 1, 2, Востава 1, 2, 3, Гарадок, Дзяржаны, Калюга, Кляцішча, Краснае, Красны Барок, Ліпкі, Маладаўшчына, Міхалова, Падбрусы, Папоўкі, Прудок, Свяда, Стайчаўка, Чысцік;

хутары: Аполаска, Ардынск, Баброўніца, Багдановічаў, Барадзіно, Барсукі 1, 2, 3, Бруснічная, Будрэвічаў, Бярозавы Востраў, Бярэзінскае Балота, Вайцюроў, Валова Гара, Варацішча, Весялова, Вілянчыха, Вольны Бор 1, 2, 3, Восіпіха, Воўкаў, Гарбачыха, Гарэлы Бор, Гілярова, Глабусова, Глухое Балота, Горнае, Грышкаў, Дубы, Жарнасекаў, Завадская Дача, Ізопка, Кавырыца 1, 2, Калавур 1, 2, 3, Кашадры, Кліны, Ліскі 1, 2, 3, 4, Лявонаў, Ляды, Ляпкоўскі, Мыскаў, Наўгушы, Окана, Падазер'е, Падгор'е, Паканечнае, Папоў Кашэль, Паўлава, Петрачыха, П'яная Гара, Роспаш 1, 2, Роўніца, Рунніца, Рэпішча, Рэчкі, Садок, Стажкі 1, 2, Сталюгі 1, 2, 3, Сокал 1, 2, Тані, Траўнае, Чорны Дуб, Шамшураў, Шлюз, Шырачыха, Шырнеўка 1, 2, 3, Юраўка 1, 2, Язэпіха, Япрыха;

пасёлкі: Вясёлка, Гадзіўля, Капланаўка, Косава, Ліпкі, Стараселле.

СТАЙСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Гарадок, Грасіменка, Дражна 1, 2, Дуброва, Забароўе, Осава, Прудаўцы, Руна, Сталь, Траўнікі, Цецянкі, Шустоўка;

хутары: Весялова, Гарэлы Бор, Законнае, Зацішша, Казінка, Каліна, Кранштат, Лаўкі 1, 2, Ляды, Сокалкі, Стрыжанкі, Тоні 1, 2;

пасёлкі: Баравуха, Дзяржына, Заквіт, Згоды, Прудок.

СУШАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

Вёскі: Гайноўшчына, Ізафатава, Малінаўка, Шаўрыно, Янова;

хутары: Валатоўка, Валяр'янава, Набродаўшчына, Парні, Прудок, Рагоўшчына, Скавародкі, Суша;

пасёлкі: Вясёлая Горка, Травянкі.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел

БАБРОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Астравы, Баброва, Варапаеўшчына, Гарадзец, Гарані, Дзямешкава, Доўгае, Залессе 1, Залессе 2, Заружанне, Косцінка, Ладзеена, Матырына, Несіна, Пагарэлае, Падаліца, Радунь, Саснягі, Слабодка, Сызаўшчына, Фатынь, Халімонава, Чырвонае Сяло.

БАРОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёска Бароўка-1.

ВАЛОСАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Валатоўкі, Весялова, Вялікія Таронкавічы, Грыгаравічы, Двор Таронкавічы, Заглінікі, Кавалевічы, Калінаўка, Каміншчына, Кастрыца, Касцюкоўшчына, Коранеўка, Красналучка, Ліпкі, Лутчына, Ляхавічы, Малыя Таронкавічы, Новыя Валосавічы, Пахомлевічы, Слабодка, Слядневічы 1, Слядневічы 2, Стайск, Старыя Валосавічы, Турыца, Шчаслівае Жыццё.

ГОРСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Баравенскія Хутары, Бачкары, Бораўна, Будзішча, Гарадзінец, Гарачэвічы, Глінніца, Горкі, Залессе, Заслонава, Зорніца, Караевічы, Межыца, Міхалова, Паляны, Пункты, Слабада, Хутар Мельніца.

ДОМЖАРЫЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Домжарыцы, Забаенне, Кветча, Крайцы, Ніўкі, Пераходцы, Рожна, Саўскі Бор, Ствольна.

ЗААЗЕРСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Будзяўцы, Ворань, Дзяньгубы, Заазер'е, Падлобныя, Стары Лепель, Юркоўшчына.

КАМЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Астроўна, Аўласава, Бабча, Балотнікі, Бароўка-2, Бор, Губіна, Двор Бабча, Двор Парэчча, Двор Чаросава, Забароўе, Задоры, Кабак, Камень, Катоўшчына, Курмялёўка, Ладасна, Макараўшчына, Марозава Слабодка, Мягелі, Паземшчына, Парэчча, Плігаўкі, Пяскі, Слабодка, Стараселле, Уліценкі, Усавікі, Чаросава, Чарэйшчына, Шалафаны.

ЛЕПЕЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Адамаўка, Азярцы, пас. Белаазёрны, Бяленіца, Вялікае Жэжліна, Вялікае Поле, Вялікі Поўсвіж, Глыбочыца, Двор Людчыцы, Дворышча, Дрымаўшчына, Жарсцвянікі, Забаенне, Забалацце, Завідзічы, Залучына, Занькі, Зарыбіна, Захоціна, Зялёнка, Зялёны Востраў, Ірынполле, Казіншчына, Казлы, пас. Лепельскі, Луцішча, Людчыцы, Малое Жэжліна, Малы Поўсвіж, Навіны, Новае Лядна, Паддуб'е, Падымхі, Рассвет, Слабодка, Старое Лядна, Сяргееўшчына, Тадуліна, Чарнаручча, Чэрцы, Шаркоўка, Шубнікі, Шунты, Экімань, Юндзілаўка.

ПЫШНЯНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Антонаўка, Ассё, Вялікія Пышнагоры, Забалацце, Забор'е, Закаліўе, Заполле, Зароўе, Звязда, Каменка, Клёўзы, Крыўкі, Крыўцы, Малыя Пышнагоры, Навасёлкі, Навіны, Поплаўкі, Пунішча, Пышна, Савін Дуб, Саламахі, Слабодка, Студзёнка, Уберцы.

СЛАБАДСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Аношкі, Барсукі, Бяседы, Валова Гара, Белеўшчына, Верабкі, Вілы, Востpава, Гадзіўля, Гаразянкі, Далікі, Паташня, Рудня, Сваяда, Свядзіца, Слабада, Стайск, Сталюгі, Цярэшкі, Чарніца, Чырвоны Кастрычнік, Юшкі.

СТАЙСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Гарадзец, Дражна, Жарцы, Зацякляссе, Кальнікі, Куляшы, Мацюшына Сцяна, Мядзвёдаўка, Окана, Прудок, Рачыцы, Свабоднае Жыццё (Ізабеліна, Забыліны), Селішча, Сітнікі, Стаі.

СУШАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Атокі, Батукалава, Варошкі, Гаравыя, Двор Суша, Заазерная, Завадзіна, Загорцы, Замошша, Заслаўкі, Зямцы, Мішулькі, Суша, Хвашчова.

З гісторыі населеных пунктаў Лепельскага раёна

У цяперашні час на тэрыторыі Лепельскага раёна знаходзіцца каля 240 населеных пунктаў. Пераважная большасць з іх уяўляе сабой вёскі. Шматлікія населеныя пункты размешчаны ў прыгожых мясцінах, каля азёр і рэк, сярод лясоў. Паселішчы Лепельшчыны не раз цярпелі ад ваенных і іншых ліхалецяў. У выніку шэраг населеных пунктаў знік. Забываюцца нават іх назвы. На жаль, знікаюць яны па розных прычынах і зараз. І таму вельмі важна захаваць звесткі пра нашы паселішчы для нашчадкаў. І таму падрыхтаваны для гэтай кнігі кароткія даведкі пра населеныя пункты Лепельшчыны, якія змешчаны ніжэй. Рамкі кнігі не дазваляюць больш поўна асвяціць іх гісторыю.

АДАМАЎКА, вёска Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 14 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Лічаць, што назва ўтворана ад імя Адам ці ад прозвішча, дадзенага ад гэтага імя. На пачатку XX ст. Адамаўка была вядома як пасёлак Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ім было 5 двароў, 58 жыхароў. У 1969 г. — вёска Адамаўка, 23 двары, 81 жыхар. На 1997 г. — 23 падвор'і, 40 жыхароў.

АЗЯРЦЫ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 14 км на поўдзень ад горада Лепель, пры возеры Азярцы. На пачатку XX ст. Азярцы былі вядомы як маёнтак «Азярцы» Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якім быў 1 двор, каля 20 жыхароў. Належаў Корсакам. На 1924 г. хутар Азярцы, 18 жыхароў. У 1997 г. у вёсцы мелася 7 падвор'яў, 11 жыхароў. Каля Азярцаў знаходзіцца археалагічны помнік — гарадзішча.

АНОШКІ, вёска ў складзе калгаса «Радзіма» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 20 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Назва паселішча ўтворана ад прозвішча Аношка. Па

пісьмовых крыніцах Аношкі вядомы з пачатку XX ст. На 1906 г. яны ўяўлялі сабой засценак Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якім на той час мелася 10 двароў, 46 жыхароў. У 1997 г. вёска, 13 падвор'яў і 26 жыхароў.

АНТОНАЎКА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 10 км на паўночны захад ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. На 1906 г. маленькая вёска Пышнянскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 11 двароў, 73 жыхары. Сумежна з вёскай знаходзілася сядзіба Антонаўка, 2 двары, 11 жыхароў. У 1924 г. у вёсцы мелася 74 жыхары. На 1997 г. налічвалася 6 падвор'яў, 8 жыхароў.

АССЁ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 16 км на паўночны захад ад горада Лепель. Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку XX ст. як вёска Ассё Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было 27 двароў, 229 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў быў калгас імя Молатава, працавала кузня. На 1997 г. у вёсцы Ассё мелася 18 падвор'яў, 33 жыхары. Паблізу вёскі ёсць археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 2 насыпы.

АСТРАВЫ, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 27 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Астравы вядомы па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. У 1906 г. яны ўяўлялі сабой невялічкую вёсачку Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было толькі 7 двароў, 41 жыхар. На 1997 г. мелася 3 падвор'і, 8 жыхароў.

АСТРОЎНА, вёска ў калгасе «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Знаходзіцца за 21 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Астроўна. Назва паселішчу дадзена ад наймення возера. Астроўна вядома ў XIX ст. як маёнтак, які належаў Дакішэвічам. У 1855 г. у маёнтку было 12 мужчынскіх і 12 жаночых рабочых душ. Гаспадар маёнтка выдзяляў для карыстання па 5 дзесяцін зямлі на кожнага работніка-мужчыну, а на ўсіх работнікаў — 60 дзесяцін. На пачатку XX ст. вёска Астроўна Каменскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 7 двароў, каля 60 жыхароў. Побач з вёскай знаходзіўся маёнтак Дакішэвічаў, 4 двары, 26 жыхароў. У 1997 г. 5 падвор'яў, 8 жыхароў.

АСТРОЎНА, вёска ў складзе калгаса «Радзіма» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 23 км на поўдзень ад горада Лепель. На 1997 г. мелася 6 падвор'яў, 8 жыхароў.

АТОКІ, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана за 30 км на паўночны ўсход ад горада Лепеля, каля ракі Дзева. Паселішча вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. як вёска Атокі Каменскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было толькі 9 двароў, 95 жыхароў. На 1940 г. 31 гаспадарка, 108 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Атокі і загубілі з іх жыхароў (ліпень 1943 г.). У 1997 г. у вёсцы мелася 12 падвор'яў і 25 жыхароў.

АЎЛАСАВА, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана за 22 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. паселішча было вядома як фальварак Аўласава Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1906 г. у ім было 3 двары, 16 жыхароў. Пасля рэвалюцыі фальварак пераўтвораны ў вёску. У пачатку 1930-ых гадоў тут створаны калгас «Батрак», працавалі ваўначоска і кузня. У 1997 г. у вёсцы мелася 16 падвор'яў і 38 жыхароў.

БАБРОВА, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Баброва». Размешчана за 25 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, пры возеры Астроўна, на шашы Лепель — Віцебск. Баброва вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Баброва Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было 39 двароў, 357 жыхароў. З 20.08.1924 г. вёска з'яўляецца цэнтрам сельсавета. У 1970 г. у Баброве налічвалася 75 гаспадарак, 192 жыхары. На 1997 г. мелася 147 двароў, 405 жыхароў. На тэрыторыі вёскі размешчаны сельсавецкая і саўгасная сядзібы, механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, клуб, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, ашчадная каса, дзіцячыя сад-яслі, масавая бібліятэка, магазін, помнік — скульптура воіна ў жалобе (1968 г.) на брацкай магіле 145 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у Вялікую Айчынную вайну.

БАБЧА, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Размешчана каля возера Бабча, за 16 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Назва ўтворана ад наймення возера. У XIX ст. Бабча была вядома як маёнтак памешчыкаў Пржысецкіх. На 1855 г. у маёнтку было 92 мужчынскія і 93 жаночыя рабочыя душы. На аднаго работніка-мужчыну

ЗААЗЕРСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Будзяўцы, Ворань, Дзяньгубы, Заазер'е, Падлобныя, Стары Лепель, Юркоўшчына.

КАМЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Астроўна, Аўласава, Бабча, Балотнікі, Бароўка-2, Бор, Губіна, Двор Бабча, Двор Парэчча, Двор Чаросава, Забароўе, Задоры, Кабак, Камень, Катоўшчына, Курмялёўка, Ладасна, Макараўшчына, Марозава Слабодка, Мягелі, Паземшчына, Парэчча, Плігаўкі, Пяскі, Слабодка, Стараселле, Уліценкі, Усавікі, Чаросава, Чарэйшчына, Шалафаны.

ЛЕПЕЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Адамаўка, Азярцы, пас. Белаазёрны, Бяленіца, Вялікае Жэжліна, Вялікае Поле, Вялікі Поўсвіж, Глыбочыца, Двор Людчыцы, Дворышча, Дрымаўшчына, Жарсцвянікі, Забаенне, Забалацце, Завідзічы, Залучына, Занькі, Зарыбіна, Захоціна, Зялёнка, Зялёны Востраў, Ірынполле, Казіншчына, Казлы, пас. Лепельскі, Луцішча, Людчыцы, Малое Жэжліна, Малы Поўсвіж, Навіны, Новае Лядна, Паддуб'е, Падымхі, Рассвет, Слабодка, Старое Лядна, Сяргееўшчына, Тадуліна, Чарнаручча, Чэрцы, Шаркоўка, Шубнікі, Шунты, Экімань, Юндзілаўка.

ПЫШНЯНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Антонаўка, Ассё, Вялікія Пышнагоры, Забалацце, Забор'е, Закаліўе, Заполле, Зароўе, Звязда, Каменка, Клёўзы, Крыўкі, Крыўцы, Малыя Пышнагоры, Навасёлкі, Навіны, Поплаўкі, Пунішча, Пышна, Савін Дуб, Саламахі, Слабодка, Студзёнка, Уберцы.

СЛАБАДСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Аношкі, Барсукі, Бяседы, Валова Гара, Белеўшчына, Верабкі, Вілы, Востава, Гадзіўля, Гаразянкі, Далікі, Паташня, Рудня, Свяда, Свядзіца, Слабада, Стайск, Сталюгі, Цярэшкі, Чарніца, Чырвоны Кастрычнік, Юшкі.

СТАЙСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Гарадзец, Дражна, Жарцы, Зацякляссе, Кальнікі, Куляшы, Мацюшына Сцяна, Мядзвёдаўка, Окана, Прудок, Рачыцы, Свабоднае Жыццё (Ізабеліна, Забыліны), Селішча, Сітнікі, Стаі.

СУШАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ: вёскі Атокі, Батукалава, Варошкі, Гаравыя, Двор Суша, Заазерная, Завадзіна, Загорцы, Замошша, Заслаўкі, Зямцы, Мішулькі, Суша, Хвашчова.

З гісторыі населеных пунктаў Лепельскага раёна

У цяперашні час на тэрыторыі Лепельскага раёна знаходзіцца каля 240 населеных пунктаў. Пераважная большасць з іх уяўляе сабой вёскі. Шматлікія населеныя пункты размешчаны ў прыгожых мясцінах, каля азёр і рэк, сярод лясоў. Паселішчы Лепельшчыны не раз цярпелі ад ваенных і іншых ліхалецяў. У выніку шэраг населеных пунктаў знік. Забываюцца нават іх назвы. На жаль, знікаюць яны па розных прычынах і зараз. І таму вельмі важна захаваць звесткі пра нашы паселішчы для нашчадкаў. І таму падрыхтаваны для гэтай кнігі кароткія даведкі пра населеныя пункты Лепельшчыны, якія змешчаны ніжэй. Рамкі кнігі не дазваляюць больш поўна асвяціць іх гісторыю.

АДАМАЎКА, вёска Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 14 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Лічаць, што назва ўтворана ад імя Адам ці ад прозвішча, дадзенага ад гэтага імя. На пачатку XX ст. Адамаўка была вядома як пасёлак Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ім было 5 двароў, 58 жыхароў. У 1969 г. — вёска Адамаўка, 23 двары, 81 жыхар. На 1997 г. — 23 падвор'і, 40 жыхароў.

АЗЯРЦЫ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 14 км на поўдзень ад горада Лепель, пры возеры Азярцы. На пачатку XX ст. Азярцы былі вядомы як маёнтак «Азярцы» Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якім быў 1 двор, каля 20 жыхароў. Належаў Корсакам. На 1924 г. хутар Азярцы, 18 жыхароў. У 1997 г. у вёсцы мелася 7 падвор'яў, 11 жыхароў. Каля Азярцаў знаходзіцца археалагічны помнік — гарадзішча.

АНОШКІ, вёска ў складзе калгаса «Радзіма» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 20 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Назва паселішча ўтворана ад прозвішча Аношка. Па

пісьмовых крыніцах Аношкі вядомы з пачатку XX ст. На 1906 г. яны ўяўлялі сабой засценак Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якім на той час мелася 10 двароў, 46 жыхароў. У 1997 г. вёска, 13 падвор'яў і 26 жыхароў.

АНТОНАЎКА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 10 км на паўночны захад ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. На 1906 г. маленькая вёска Пышнянскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 11 двароў, 73 жыхары. Сумежна з вёскай знаходзілася сядзіба Антонаўка, 2 двары, 11 жыхароў. У 1924 г. у вёсцы мелася 74 жыхары. На 1997 г. налічвалася 6 падвор'яў, 8 жыхароў.

АССЁ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 16 км на паўночны захад ад горада Лепель. Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку XX ст. як вёска Ассё Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было 27 двароў, 229 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў быў калгас імя Молатава, працавала кузня. На 1997 г. у вёсцы Ассё мелася 18 падвор'яў, 33 жыхары. Паблізу вёскі ёсць археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 2 насыпы.

АСТРАВЫ, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 27 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Астравы вядомы па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. У 1906 г. яны ўяўлялі сабой невялічкую вёсачку Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было толькі 7 двароў, 41 жыхар. На 1997 г. мелася 3 падвор'і, 8 жыхароў.

АСТРОЎНА, вёска ў калгасе «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Знаходзіцца за 21 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Астроўна. Назва паселішчу дадзена ад наймення возера. Астроўна вядома ў XIX ст. як маёнтак, які належаў Дакішэвічам. У 1855 г. у маёнтку было 12 мужчынскіх і 12 жаночых рабочых душ. Гаспадар маёнтка выдзяляў для карыстання па 5 дзесяцін зямлі на кожнага работніка-мужчыну, а на ўсіх работнікаў — 60 дзесяцін. На пачатку XX ст. вёска Астроўна Каменскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 7 двароў, каля 60 жыхароў. Побач з вёскай знаходзіўся маёнтак Дакішэвічаў, 4 двары, 26 жыхароў. У 1997 г. 5 падвор'яў, 8 жыхароў.

АСТРОЎНА, вёска ў складзе калгаса «Радзіма» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 23 км на поўдзень ад горада Лепель. На 1997 г. мелася 6 падвор'яў, 8 жыхароў.

АТОКІ, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана за 30 км на паўночны ўсход ад горада Лепеля, каля ракі Дзева. Паселішча вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. як вёска Атокі Каменскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было толькі 9 двароў, 95 жыхароў. На 1940 г. 31 гаспадарка, 108 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Атокі і загубілі 3 іх жыхароў (ліпень 1943 г.). У 1997 г. у вёсцы мелася 12 падвор'яў і 25 жыхароў.

АЎЛАСАВА, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана за 22 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. паселішча было вядома як фальварак Аўласава Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1906 г. у ім было 3 двары, 16 жыхароў. Пасля рэвалюцыі фальварак пераўтвораны ў вёску. У пачатку 1930-ых гадоў тут створаны калгас «Батрак», працавалі ваўначоска і кузня. У 1997 г. у вёсцы мелася 16 падвор'яў і 38 жыхароў.

БАБРОВА, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Баброва». Размешчана за 25 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, пры возеры Астроўна, на шашы Лепель — Віцебск. Баброва вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Баброва Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было 39 двароў, 357 жыхароў. З 20.08.1924 г. вёска з'яўляецца цэнтрам сельсавета. У 1970 г. у Баброве налічвалася 75 гаспадарак, 192 жыхары. На 1997 г. мелася 147 двароў, 405 жыхароў. На тэрыторыі вёскі размешчаны сельсавецкая і саўгасная сядзібы, механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, клуб, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, ашчадная каса, дзіцячыя сад-яслі, масавая бібліятэка, магазін, помнік — скульптура воіна ў жалобе (1968 г.) на брацкай магіле 145 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у Вялікую Айчынную вайну.

БАБЧА, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Размешчана каля возера Бабча, за 16 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Назва ўтворана ад наймення возера. У XIX ст. Бабча была вядома як маёнтак памешчыкаў Пржысецкіх. На 1855 г. у маёнтку было 92 мужчынскія і 93 жаночыя рабочыя душы. На аднаго работніка-мужчыну

гаспадар выдзяляў ад 5 да 7 дзесяцін зямлі. На пачатку XX ст. вёска Бабча (Бабчы) Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой меліся 51 двор, каля 360 жыхароў. У 1912 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі было пераўтворана ў савецкую працоўную школу I ступені. На 1924 г. у вёсцы налічвалася 435 жыхароў, у школе — 75 вучняў. У пачатку 1930-ых гадоў тут працавалі калгас «Камінтэрн» і кузня. У 1997 г. у Бабчы было 51 падвор'е, 97 жыхароў. Ёсць магазін.

БАЛОТНІКІ, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Камянецкага сельсавета. Размешчана каля возера Азаранскае, за 16 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. як вёска Балотнікі Вораньскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было толькі 9 двароў, 81 жыхар. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвоная зорка» і кузня. На 1997 г. у вёсцы Балотнікі было 15 падвор'яў і 23 жыхары.

БАРОЎКА, пасёлак, цэнтр пассавета. Знаходзіцца ў паўночна-заходняй частцы раёна, пры шашы Лепель — Віцебск. У 1997 г. налічвалася 1344 гаспадаркі і 3798 жыхароў. На тэрыторыі пасёлка размешчаны санаторый «Бароўка», аддзяленне сувязі, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, масавая бібліятэка.

БАРОЎКА 2-ая, вёска ў аграфірме «Белая Русь» Каменскага сельсавета. У Вялікую Айчынную вайну ў наваколлі вёскі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў дзейнічалі партызаны Чашніцкай («Дубава»), імя Сталіна брыгад і атрада А. К. Флягонтава. 12 верасня 1942 г. партызаны атрада Флягонтава і Чашніцкай брыгады каля вёскі Бароўка 2, на шашы Лепель — Віцебск, разгромілі нямецка-фашысцкую калону аўтамашын. Было знішчана ў гэтым баі 12 варожых аўтамашын, каля 80 гітлераўцаў (у тым ліку генерал). У 1967 г. на месцы бою ўстаноўлены помнік — стэла. На 1997 г. у вёсцы было 18 падвор'яў, 31 жыхар. У наваколлі вёскі размешчана радовішча пясчана-жвіровага матэрыялу «Бароўка».

БАРСУКІ, вёска, цэнтр калгаса «Барсукі» Слабадскога сельсавета. Размешчана пры аўтамабільнай дарозе Лепель — Докшыцы, за 24 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Назва ўтворана ад мясцовасці, ад наймення ўгоддзевага ўрочышча Барсукі, дзе было заснавана паселішча. На 1970 г. мелася 54 двары, 162 жыхары. У 1997 г. у вёсцы было 70 падвор'яў і 152 жыхары. На тэрыторыі Барсукоў знаходзяцца калгасная сядзіба, ветэрынарны пункт, механічныя майстэрні, базавая школа, клуб, масавая бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, дзіцячыя яслі-сад, магазін, помнік — скульптура воіна з аўтаматам (1971 г.) на ўшанаванне памяці 71 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

БАТУКАЛАВА, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана каля возера Астроўкі, за 29 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX стагоддзя вёска Батукалава Каменскай воласці Лепельскага павета, у якой было 16 двароў, 119 жыхароў. На 1940 г. 33 гаспадаркі, 105 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі амаль усю вёску. На 1997 г. у Батукалаве было 14 падвор'яў і 19 жыхароў.

БАЧКАРЫ, вёска ў калгасе «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 16 км на ўсход ад горада Лепель. Па пісьмовых крыніцах паселішча вядома з пачатку XX ст. як вёска Бачкары Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. тут было толькі 2 двары і 19 жыхароў. У 1924 г. мелася 78 жыхароў. На 1997 г. вёска Бачкары, 6 падвор'яў, 14 жыхароў.

БЕЛААЗЁРНЫ, пасёлак у складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. На 1997 г. мелася 42 падвор'і і 103 жыхары.

БЕСЕДЫ, вёска ў складзе калгаса «Барсукі» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 8 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Паводле пісьмовых крыніц, у XIX — пачатку XX ст. вёска Беседы Франопальскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1906 г. у ёй было 34 двары. У 1997 г. мелася 13 падвор'яў і 22 жыхары.

БОР, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Размешчана на беразе возера Бор, за 21 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У сярэдзіне XIX ст. Бор уяўляў сабой маёнтак Кандыбаў Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. вёска Бор, тых жа воласці і павета, 4 двары, 22 жыхары. У гэты час побач з вёскай знаходзіўся фальварак Бор Прашынскіх, 1 гаспадарка, 11 жыхароў. У 1997 г. вёска Бор, 30 падвор'яў, 69 жыхароў. Каля вёскі знаходзяцца 2 археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі. Адзін з іх мае 2 насыпы (мясцовая назва Валатоўкі), а другі — 8 насыпаў.

БОРАЎНА, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 6 км на паўднёвы ўсход ад горада

Лепель. Больш вядома па дакументах XIX — пачатку XX ст., калі ўяўляла сабой вёску Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. Паводле перапісу 1897 г., тут было 596 жыхароў. На 1906 г. у вёсцы мелася 80 гаспадарак і 549 жыхароў. У 1997 г. у Бораўне налічвалася 74 падвор'і і 158 жыхароў. На тэрыторыі вёскі ёсць магазін, а за 1 км на паўночны ўсход ад яе, на беразе безыменнай рэчкі знаходзіцца археалагічны помнік — гарадзішча.

БУДЗІШЧА, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 16 км на ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Будзішча Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1906 г. у ёй было 14 двароў, 100 жыхароў. У 1924 г. тут налічвалася 185 жыхароў. У 1997 г. у Будзішчы мелася 38 падвор'яў і 65 жыхароў.

БУДЗЯЎЦЫ, вёска ў складзе калгаса імя М. І. Калініна Заазерскага сельсавета. Знаходзіцца за 7 км на поўнач ад горада Лепель. У 1906 г. вёска Будзяўцы (яны ж Будзішча) Франопальскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было толькі 11 двароў і 88 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў тут працавалі калгас «Чырвоны Кастрычнік» і кузня. У 1940 г. у Будзяўцах налічвалася 37 гаспадарак і 148 жыхароў. У студзені 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі яе 8 жыхароў. На 1997 г. мелася 24 падвор'і і 32 жыхары.

БЯЛЕНІЦА, вёска ў калгасе імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана за 17 км на поўнач ад горада Лепель. На 1997 г. было 26 падвор'яў і 59 жыхароў.

ВАЛАТОЎКІ, вёска ў саўгасе «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана пры рацэ Эса, за 30 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Назва ўтворана ад урочышча Валатоўкі, у якім узнікла паселішча. На пачатку XX ст. паселішча было вядома як фальварак Валатоўкі Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якім былі 1 двор, 4 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі фальварак пераўтвораны ў вёску. На 1997 г. было 8 падвор'яў і 12 жыхароў. За 3 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе ракі Эса знаходзіцца археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 9 насыпаў.

ВАЛОВА ГАРА, вёска ў складзе калгаса «Барсукі» Слабадскога сельсавета. Размешчана пры Бярэзінскім канале, за 10 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Назва дадзена ад мясцовасці, ад урочышча, у якім узнікла паселішча. На пачатку XX ст. Валова Гара ўяўляла сабой фальварак Пышнянскай воласці Лепельскага павета, у якім былі 1 двор, каля 10 жыхароў. У савецкі час фальварак пераўтвораны ў вёску. У 1997 г. тут было 39 падвор'яў, 58 жыхароў.

ВАРАПАЕЎШЧЫНА, вёска ў складзе саўгаса «Баброва» Бабруўскага сельсавета. Размешчана пры возеры Варапаеўшчына, за 27 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Назву паселішча атрымала ад наймення возера. З дакументаў бачна, што Варапаеўшчына ў XIX — пачатку XX ст. уяўляла сабой маёнтак Мартынаўскай воласці Лепельскага павета, уласнасць памешчыкаў Ясевічаў. У 1855 г. у маёнтку было 78 рабочых душ (39 мужчын, 59 жанчын), надзел зямлі на аднаго работніка-мужчыну складаў ад 5 да 9 дзесяцін, агульная колькасць зямлі ў карыстанні работнікаў складала 236 дзесяцін. У 1906 г. у маёнтку была 1 гаспадарка, 11 жыхароў. Пры савецкай уладзе маёнтак быў пераўтвораны ў вёску. У 1997 г. у вёсцы налічвалася 9 падвор'яў, 14 жыхароў.

ВАРАШКІ, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана пры рэчцы Пузанка, за 23 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Варашкі Каменскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. мелася 23 двары, 164 жыхары. У 1930 г. тут створаны калгас «Іскра рэвалюцыі», працавала кузня. На 1997 г. у вёсцы былі 21 двор, 31 жыхар.

ВЕЛЕЎШЧЫНА, вёска, цэнтр калгаса «Радзіма» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 22 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. У пачатку XX ст. вёска Велеўшчына Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якой мелася 60 двароў, каля 640 жыхароў. У 1910 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. Паводле рукапісных архіўных матэрыялаў, у 1924 г. у школе налічвалася 55 вучняў (усе хлопчыкі). У 1940 г. у Велеўшчыне было 120 гаспадарак, 403 жыхары. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 6 яе жыхароў (ліпень 1943 г.). У 1970 г. у Велеўшчыне мелася 92 двары, 358 жыхароў. У 1997 г. было 154 двары, 420 жыхароў. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца калгасная сядзіба, майстэрні па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, ве-

тэрынарны пункт, базавая школа, Дом культуры, дзіцячыя яслі-сад, фельчарска-акушэрскі пункт, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

ВЕРАБКІ, вёска ў складзе калгаса «Барсукі» Слабадскога сельсавета. Знаходзіцца за 10 км на паўднёвы захад ад горада Лепель, пры Бярэзінскім канале. Па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст., Верабкі вядомы як сяло ці вёска Франопальскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1886 г. сяло Верабкі, 16 двароў, 180 жыхароў, працавала праваслаўная царква. У 1906 г. вёска, 23 двары, 317 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адкрыта працоўная школа 1-ай ступені. На 1923 г. было 193 жыхары. У 1997 г. мелася 57 падвор'яў і 124 жыхары. Ёсць магазін. Паблізу Верабкоў знаходзіцца археалагічны помнік — гарадзішча.

ВЕСЯЛОВА, вёска ў складзе саўгаса «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 24 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Вядома з 1920-ых гадоў. Паводле рукапісных архіўных звестак, у 1925 г. мелася 62 жыхары. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Весялова» і кузня. У 1997 г. у вёсцы было 40 падвор'яў і 76 жыхароў.

ВІЛЫ, вёска ў складзе калгаса «Пражэктар» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 11 км на поўдзень ад горада Лепель. Назва ўтворана ад мясцовасці, ад наймення ўгоддзевага ўрочышча, у якім узнікла гэта паселішча. У сярэдзіне XIX ст. Вілы былі вядомы як маёнтак Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. На пачатку XX ст. засценак Вілы тых жа воласці і павета. У 1906 г. у ім было 8 двароў, 48 жыхароў. На 1997 г. вёска, 15 падвор'яў, 30 жыхароў.

ВОРАНЬ, вёска ў калгасе імя М. І. Калініна Заазерскага сельсавета. Знаходзіцца на паўночна-заходнім беразе возера Ворань, за 13 км на поўнач ад горада Лепель. У XIX — пачатку XX ст. сяло Ворань — цэнтр воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, уласнасць Сяляваў (сярэдзіна XIX ст.). У 1864 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча. На 1886 г. у сяле налічвалася 25 двароў, 304 жыхары, працавалі земскае народнае вучылішча (29 вучняў, з іх толькі 2 дзяўчынкі), праваслаўная царква, валасное праўленне, земскае народнае вучылішча, вінакурны завод, каталіцкая царква. У 1906 г. у сяле Ворань было 52 двары, каля 340 жыхароў. Сумежна з сялом знаходзіўся маёнтак Ворань, 2 двары, 20 жыхароў. У 1923 г. былі адкрыты хата-чытальня і бальніца. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча створана савецкая працоўная школа 1-ай ступені, у якой вучылася каля 90 хлопчыкаў і дзяўчынак, працавалі 2 настаўнікі (1924 г.). На 1924 г. у сяле было 447 жыхароў, а ў былым маёнтку (знаходзіўся побач з сялом) 70 жыхароў. З 20.08.1924 г. да 16.07.1954 г. Ворань з'яўлялася цэнтрам сельсавета. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвоны Кастрычнік» і кузня. На 1940 г. вёска Ворань, 82 двары, 410 жыхароў. У ліпені 1942 г. гітлераўцы спалілі вёску і загубілі 16 яе жыхароў. У 1997 г. налічвалася 67 двароў, 144 жыхары. На тэрыторыі Ворані знаходзяцца магазін, археалагічныя помнікі — гарадзішча, селішча, курганны могільнік (каля 100 насыпаў), 2 паселішчы (усе каля вёскі).

ВУСАВІКІ, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Размешчана за 12 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. паселішча было вядома як сяло Вусавікі Бельскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ім мелася толькі 9 двароў, 65 жыхароў. Непадалёку ад сяла знаходзіліся фальварак Вусавікі, 1 гаспадарка, 15 жыхароў. На 1997 г. налічвалася 32 падвор'і і 54 жыхары.

ВЯЛІКАЕ ЖЭЖЛІНА, вёска ў складзе калгаса імя Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана каля возера Жэжліна, за 10 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Назва ўтворана ад возера. У XIX — пачатку XX ст. вёска Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было 50 двароў, 403 жыхары. Паблізу вёскі ў той час знаходзіліся назвай Жэжліна маёнтак, сядзіба і фальварак. Разам у іх налічвалася 3 двары, 23 жыхары. Маёнтак належаў Стэфаноўскім, а фальварак Бародзічавым. У 1913 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі яно было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. У 1924 г. у ёй вучылася 45 хлопчыкаў і дзяўчынак. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Асаавіяхім», кузня і цагляны завод. На 1997 г. у Вялікім Жэжліне налічвалася 66 падвор'яў, 123 жыхары. Ёсць магазін.

ВЯЛІКАЕ ПОЛЕ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 3 км на поўдзень ад горада Лепель, пры рацэ Эса. Як расказвае мясцовая легенда, паселішча было заснавана на ўчастку зямлі, які меў найменне Вялікае Поле (урочышча), таму і назвалі яго Вялікае Поле. На 1906 г. маленькая вёсачка Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было толькі

7 двароў, каля 60 жыхароў. На 1997 г. мелася 15 падвор'яў, 27 жыхароў.

ВЯЛІКІ ПОЎСВІЖ, вёска, цэнтр саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана каля возера Поўсвіж, за 5 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель, на шашэйнай дарозе Лепель — Новыя Валосавічы. Па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. вядома як вёска Вялікі Полевіж, цэнтр Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1886 г. было 34 гаспадаркі, 344 жыхары, працаваў вінакурны завод, дзейнічала валасное праўленне. У 1905 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1906 г. тут было 53 двары, больш за 300 жыхароў, размяшчалася праўленне Забалацкай воласці. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1924 г. навучалася каля 60 дзяцей, з іх толькі 11 дзяўчынак. У гэтым жа годзе ў вёсцы было 436 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Савецкая Беларусь» і кузня. У 1970 г. налічвалася 86 двароў, 291 жыхар. На 1997 г. мелася 186 гаспадарак, 530 жыхароў. На тэрыторыі Вялікага Поўсвіжа знаходзяцца механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, саўгасная сядзіба, сярэдняя школа, Дом культуры, масавая бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін, помнік — скульптура жанчыны (1967 г.) на ўшанаванне памяці 164 жыхароў з населеных пунктаў саўгаса «Лепельскі», якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ВЯЛІКІЯ ПЫШНАГОРЫ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 10 км на паўночны захад ад горада Лепель. У сярэдзіне XIX ст. паселішча вядома як маёнтак Пышнагоры Пышнянскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, які з'яўляўся ўласнасцю Камюнкоў і Траноўскіх. У 1855 г. у маёнтку было 36 мужчынскіх і 34 жаночыя рабочыя душы. На пачатку XX ст. Вялікія Пышнагоры ўяўлялі сабой невялікую вёску тых жа воласці, павета і губерні, у якой было толькі 6 двароў і 59 жыхароў. Сумежна з вёскай знаходзіўся маёнтак Пышнары, 4 двары, 67 жыхароў. У 1924 г. у Вялікіх Пышнагорах мелася 150 жыхароў. У 1997 г. у вёсцы налічвалася 13 падвор'яў, 20 жыхароў.

ВЯЛІКІЯ ТАРОНКАВІЧЫ, вёска ў складзе саўгаса «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчаны за 23 км на паўднёвы ўсход ад Лепеля. У пачатку 1930-ых гадоў тут існаваў калгас «Таронкавічы», працавала кузня. На 1997 г. было 2 падвор'і і 4 жыхары.

ГАДЗІЎЛЯ, вёска ў складзе калгаса «Радзіма» Слабодскага сельсавета. Размешчана за 21 км ад горада Лепель на паўднёвы захад. Па пісьмовых крыніцах, вядома з пачатку 20 стагоддзя як засценак Гадзіўля Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якім тады было 3 гаспадаркі, каля 20 жыхароў. У 1997 г. мелася 25 падвор'яў, 35 жыхароў.

ГАРАВЫЯ, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана каля возера Астраўкі, за 28 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Па пісьмовых крыніцах, вядома з пачатку XX ст. На 1906 г. вёска Гаравыя Каменскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 7 двароў, 67 жыхароў. У 1997 г. у вёсцы мелася 7 падвор'яў і 12 жыхароў.

ГАРАДЗЕЦ, вёска ў складзе калгаса «Гарадзец» Стайскага сельсавета. Знаходзіцца за 6 км на захад ад горада Лепель. Паселішча вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Гарадзец Франопальскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было 42 двары, каля 340 жыхароў. На 1997 г. меліся 61 двор, 128 жыхароў.

ГАРАДЗІНЕЦ, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 12 км на ўсход ад горада Лепель, пры рэчцы Гарадзінец, ад якой утворана назва паселішча. На пачатку XX ст. Гарадзінец уяўляў сабой невялікую вёску Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было толькі 11 двароў, 90 жыхароў. Паблізу вёскі знаходзіўся аднайменны маёнтак Няміраў, 3 двары, 63 жыхары. На 1997 г. мелася 23 падвор'і і 36 жыхароў.

ГАРАДЧЭВІЧЫ, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 16 км на ўсход ад горада Лепель. Па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст., гэта паселішча вядома як сяло Гарадчэвічы, цэнтр воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1864 г. у сяле было адкрыта земскае народнае вучылішча. На 1886 г. тут мелася 19 двароў, 110 жыхароў, дзейнічалі земскае народнае вучылішча (39 вучняў, з іх толькі 3 дзяўчынкі), праваслаўная царква, валасное праўленне. У 1906 г. у сяле налічвалася 24 двары, 164 жыхары. У 1924 г. — 142 жыхары. У канцы 1920-ых гадоў створаны калгас імя Р. Люксембург, працавала кузня. У 1997 г. у вёсцы мелася 19 падвор'яў і 32 жыхары.

ГАРАДЗЯНКІ, вёска ў складзе калгаса «Пражэктар» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 13 км на поўдзень ад горада Лепель. У 1997 г. мелася 27 падвор'яў і 59 жыхароў.

ГАРАНІ, вёска ў складзе саўгаса «Баброва» Бабруўскага сельсавета. Размешчана за 44 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст., малая вёска Гарані Мартынаўскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. тут было толькі 9 двароў, 64 жыхары. У 1924 г. мелася 173 жыхары. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Авангард» і кузня. У 1997 г. у вёсцы налічвалася 8 падвор'яў, 8 жыхароў.

ГЛІННІЦА, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 12 км на ўсход ад горада Лепель. Паводле рукапісных архіўных матэрыялаў, у сярэдзіне XIX ст. Глінніца ўяўляла сабой маёнтак Лепельскага павета, уласнасць Мініцкіх. У 1855 г. у маёнтку былі 3 мужчынскія і 2 жаночыя рабочыя душы. Гаспадар на аднаго работніка-мужчыну выдзяляў 5 дзесяцін зямлі. У пачатку 20 стагоддзя вёска Глінніца Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. тут было 6 двароў, каля 50 жыхароў. На 1997 г. мелася 4 падвор'і і 8 жыхароў.

ГЛЫБОЧЫЦА, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 3 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель, пры возеры Глыбочыца. Назва дадзена ад наймення возера, каля якога было заснавана паселішча. Глыбочыца вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. У 1906 г. яна ўяўляла сабой маленькую вёсачку Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой у гэты час мелася толькі 5 двароў, 61 жыхар. На 1997 г. у Глыбочыцы было 6 падвор'яў, 9 жыхароў. Непадалёку ад вёскі, ва ўрочышчы Княгінкі, на беразе возера Глыбочыца знаходзіцца археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 6 насыпаў.

ГОРКІ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Парыжская камуна». Размешчана за 15 км на ўсход ад горада Лепель, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Заслонава, каля шашы Лепель — Чашнікі (3 км). Горкі вядомы па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. як вёска Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было 18 двароў, 153 жыхары, адкрыта царкоўнапрыходская школа. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі тут створана працоўная школа 1-ай ступені. У 1924 г. у вёсцы налічвалася 197 жыхароў, а ў школе вучылася 63 дзіцяці (з іх толькі 8 дзяўчынак). У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас імя Войкава і кузня. На 1971 г. у Горках было 68 гаспадарак, 214 жыхароў. З 1986 г. цэнтр сельсавета. У 1997 г. тут мелася 108 двароў, 290 жыхароў. На тэрыторыі вёскі размешчаны сядзібы сельсавета і калгаса, ветэрынарны пункт, майстэрні па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, ашчадная каса, сярэдняя школа, клуб, масавая бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, магазін.

ГРЫГАРАВІЧЫ, вёска, цэнтр саўгаса «Грыгаравічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 28 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель, на аўтамабільнай дарозе Лепель — Халопенічы. У 1904 г. сяло, адкрыта царкоўнапрыходская школа, працавала праваслаўная царква. У 1918 г. створана працоўная школа 1-ай ступені. На 1924 г. сяло, 195 жыхароў. У школе вучылася 119 дзяцей, працавалі 2 настаўнікі. У 1971 г. у вёсцы мелася 36 двароў, 112 жыхароў. На 1997 г. тут было 115 падвор'яў і 359 жыхароў. На тэрыторыі Грыгаравічаў знаходзяцца саўгасная сядзіба, ветэрынарны ўчастак, механічныя майстэрні па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, сталовая.

ГУБІНА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Сцяг» Каменскага сельсавета. Размешчана на беразе возера Макараўшчына, за 25 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля аўтамабільнай дарогі Лепель — Ула (1 км). Губіна вядома па дакументах XIX — пачатку XX ст. як маёнтак Губіна Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, уласнасць Сяляваў. Як бачна з рукапісных матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, у 1855 г. у маёнтку было 240 рабочых душ (130 мужчын, 110 жанчын). На аднаго работніка (мужчыну) гаспадар маёнтка выдзяляў ад 5 да 7 дзесяцін зямлі, а на ўсіх — 660 дзесяцін зямлі. У 1906 г. у маёнтку Губіна было 6 двароў, 45 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі маёнтак быў пераўтвораны ў вёску, у якой пабудавалі свае сядзібы колішнія парабкі маёнтка і сяляне-беднякі з суседніх вёсак. У 1921 г. тут створана арцель па сумеснай апрацоўцы зямлі «Шаг уперад», у якую ўваходзілі таксама сяляне-беднякі суседніх вёсак Атокі, Губіна і Замошша. Першым яе старшынёй быў С. М. Ханяк. У 1924 г. у Губіне было 192 жыхары. У канцы 1920-ых гадоў створаны калгас «Чырвоны Сцяг». У 1934—1935 гг. калгас удзельнічаў ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. На 1971 г. у вёсцы налічвалася 53 гаспадаркі, 152 жыхары. У 1997 г. у Губіне мелася 92 падвор'і, 236 жыхароў. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца калгасная сядзіба, механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, базавая школа, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін, дзіцячыя яслі-сад, помнікі — стэла (1971 г.) у гонар стварэння сельскагаспадарчай арцелі «Шаг уперад»; скульптуры

воіна і жанчыны (1971 г.) на ўшанаванне памяці 73 землякоў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

ДАЛІКІ, вёска ў складзе калгаса «Пражэктар» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 12 км на поўдзень ад горада Лепель. У XIX — пачатку XX ст. вёска Далікі Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1906 г. у ёй былі 41 двор, 325 жыхароў. На 1997 г. у вёсцы меліся 61 двор, 142 жыхары. Ёсць магазін.

ДВОР БАБЧА, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана каля шашы Лепель — Ула (3 км), за 25 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. Двор Бабча ўяўляў сабой маёнтак Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якім налічвалася 2 двары, 18 жыхароў. У 1971 г. мелася 36 двароў, 128 жыхароў. На 1997 г. было 76 падвор'яў, 242 жыхары. На тэрыторыі вёскі ёсць пачатковая школа, магазін, помнік — абеліск (1966 г.) на ўшанаванне памяці 71 земляка, якія загінулі ў баях падчас Вялікай Айчыннай вайны.

ДВОР ЛЮДЧЫЦЫ, вёска Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 18 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Двор Людчыцы Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, 40 двароў, 311 жыхароў. На 1997 г. мелася 19 падвор'яў, 40 жыхароў.

ДВОР ПАРЭЧЧА, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана за 19 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Парэчча. У XIX — пачатку XX ст. вёска Двор Парэчча Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. было тут 23 гаспадаркі, 181 жыхар. На 1997 г. 28 гаспадарак, 60 жыхароў.

ДВОР СУША, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Знаходзіцца за 29 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Даўней паселішча было вядома як маёнтак Суша Корсакаў Каменскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у маёнтку было 2 двары, 19 жыхароў. Пасля на базе маёнтка створана вёска Двор Суша. У 1997 г. у ёй было 44 падвор'і і 78 жыхароў.

ДВОР ЧАРОСАВА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Сцяг» Каменскага сельсавета. Размешчана за 19 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Чаросава. У пачатку XX ст. вёска Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой мелася 13 двароў, 79 жыхароў. На 1940 г. у вёсцы Двор Чаросава было 26 гаспадарак, 90 жыхароў. У жніўні 1943 г. гітлераўцы спалілі 20 двароў і загубілі 5 жыхароў. На 1997 г. было 1 падвор'е, жыў 1 чалавек.

ДВОРЫШЧА, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 6 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Як расказвае мясцовая легенда, паселішча было заснавана на месцы колішняй сядзібы (двара), якая была знесена ці разбурана. Таму яно і названа Дворышча. У пачатку XX ст. уяўляла сабой невялікую вёску Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было толькі 12 двароў, 103 жыхары. На 1925 г. 207 жыхароў. У 1997 г. тут мелася 18 падвор'яў, 32 жыхары.

ДЗЯМЕШКАВА, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 20 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Матырына. Па пісьмовых крыніцах, вядома з XIX ст. як маёнтак Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, які належаў Стэфаноўскім. У пачатку XX ст. таксама маёнтак тых жа воласці і павета, 1 двор, 2 жыхары. На 1997 г. мелася 11 падвор'яў і 18 жыхароў.

ДЗЯНЬГУБЫ, вёска ў складзе калгаса імя М. І. Калініна Заазерскага сельсавета. Размешчана за 10 км на поўнач ад горада Лепель. У 1906 г. Дзяньгубы вёска Франопальскай воласці Лепельскага павета, у якой налічвалася 16 двароў, 82 жыхары. На 1940 г. тут было 29 гаспадарак і 145 жыхароў. У студзені 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Дзяньгубы і загубілі 6 іх жыхароў. У 1997 г. мелася 17 падвор'яў, 24 жыхары.

ДОМЖАРЫЦЫ, вёска, цэнтр сельсавета. Размешчана на беразе Сергуцкага канала, за 35 км на паўднёвы захад ад горада Лепель, каля шашы Мінск — Віцебск. Гэта старажытнае паселішча, гісторыя якога пачынаецца ў глыбіні вякоў. Па пісьмовых крыніцах населены пункт вядомы з сярэдзіны XVI ст. пад назвай Домжарычы, калі ўваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага, а з 1569 г. Рэчы Паспалітай. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.) у складзе Расіі. З 20.08.1924 г. вёска Домжарыцы з'яўляецца цэнтрам сельсавета. На 1940 г. у вёсцы мелася 85 двароў, 340 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Домжарыцы і загубілі 23 іх жыхары (ліпень 1943 г.). У 1971 г. у вёсцы мелася 115 гаспадарак і 342 жыхары. У 1997 г. было 172 падвор'і, 445 жыхароў. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца сельсавецкая сядзіба, сярэдняя школа, клуб, масавая бібліятэка, стало-

вая, бальніца, аптэка, аддяленне сувязі, ашчадная каса, аўтаматычная тэлефонная станцыя, археалагічныя помнікі — 2 курганныя могільнікі (каля вёскі). Паблізу ад вёскі знаходзіцца Домжарыцкае радовішча торфу.

ДОЎГАЕ, вёска ў саўгасе «Бароўка» Бабруйскага сельсавета. Размешчана за 25 км на паўночны ўсход ад г. Лепель. Па пісьмовых крыніцах канца XIX — пачатку XX ст., вядома як вёска Доўгае Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было 11 двароў, 70 жыхароў. У 1924 г. мелася 123 жыхары. На 1997 г. 8 падвор'яў і 13 жыхароў.

ДРАЖНА, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Знаходзіцца за 8 км на захад ад горада Лепель. На пачатку XX ст. у Франопальскай воласці Лепельскага павета. Сумежна знаходзіліся 2 маленькія вёскі з назвай Дражна, у якіх разам было толькі 8 двароў, 74 жыхары. У пачатку 1930-ых гадоў тут працавалі калгас «Чырвоны лагер» і кузня. У 1997 г. вёска Дражна, 26 двароў, 56 жыхароў.

ДРЫМАЎШЧЫНА, вёска Лепельскага сельсавета. Размешчана за 17 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. вёска Дрымаўшчына Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой тады мелася 14 двароў, каля 100 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвоная Дрымаўшчына» і кузня. У 1997 г. у вёсцы было 25 падвор'яў і 68 жыхароў. Непадалёку ад вёскі знаходзяцца 2 археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі, у адным налічваецца да 40 насыпаў, а ў другім — каля 300 насыпаў.

ЖАРСЦВЯНІКІ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 3 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель, пры возеры Глыбочыца. У канцы XIX — пачатку XX ст. вёска Жарсцвянікі Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1906 г. было 15 двароў, 95 жыхароў. У 1997 г. 24 падвор'і і 48 жыхароў.

ЖАРЦЫ, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Знаходзіцца за 5 км на захад ад горада Лепель. Па пісьмовых крыніцах паселішча вядома з пачатку XX стагоддзя як вёска Жарцы Франопальскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой на гэты час мелася толькі 12 двароў, каля 100 жыхароў. На 1997 г. тут былі 21 двор, 32 жыхары.

ЗААЗЕР'Е, вёска ў складзе калгаса імя М. І. Калініна, цэнтр сельсавета. Размешчана на рацэ Зэха, каля возера Ворань (1,5 км), за 12 км на поўнач ад горада Лепель, на аўтамабільнай дарозе Лепель — Ушачы. Назва абумоўлена размяшчэннем паселішча на мясцовасці, азначае населены пункт, які знаходзіцца за возерам. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Заазер'е (Зазер'е) Вораньскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй мелася 27 двароў, каля 200 жыхароў. На 1924 г. тут было 137 жыхароў. У 1940 г. у вёсцы мелася 65 гаспадарак, 325 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 7 яе жыхароў (май 1942 г.). З 16.07.1954 г. Заазер'е з'яўляецца цэнтрам сельсавета. У 1971 г. тут было 56 двароў, 153 жыхары. На 1997 г. мелася 45 падвор'яў і 100 жыхароў. На тэрыторыі вёскі ёсць лясніцтва, сядзіба сельсавета, ветэрынарны пункт, пачатковая школа, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, аўтаматычная тэлефонная станцыя, помнік — абеліск (1967 г.) на ўшанаванне памяці 59 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЗААЗЁРНАЯ (УРОДА), вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Знаходзіцца за 33 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У 1997 г. налічвалася 24 падвор'і і 37 жыхароў.

ЗАБАЕННЕ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана пры рацэ Эса, за 3 км на поўдзень ад горада Лепель. На пачатку XX ст. вёска Забаенне ў складзе Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой мелася на той час 14 двароў, каля 100 жыхароў. У пачатку 1930-ых гадоў тут працавалі калгас «Будаўнік» і кузня. У 1940 г. у Забаенні было 22 гаспадаркі, 84 жыхары. У сакавіку — красавіку 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 19 двароў і загубілі 9 жыхароў вёскі. На 1997 г. мелася 102 падвор'і, 250 жыхароў. У вёсцы ёсць пачатковая школа, клуб і магазін; за 1 км на паўночны захад ад яе размешчаны археалагічны помнік — гарадзішча.

ЗАБАЛАЦЦЕ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана каля сажалкі, за 5 км на поўдзень ад горада Лепель. Паходжанне назвы тлумачыцца першапачатковым размяшчэннем паселішча на мясцовасці, калі яно знаходзілася каля балота (за балотам). У XIX — пачатку XX ст. вёска Забалацце Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. Воласць насіла назву вёскі, але валасное праўленне знаходзілася за 1 км ад Забалацця, у сяле Вялікі Полевіж (цяпер Вялікі Поўсвіж). У 1880-ыя гады ў вёсцы праца-

валі вінакурны завод і вадзяны млын. У 1906 г. у Забалацці было 27 двароў, 274 жыхары. У 1912 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. На 1924 г. у вёсцы мелася 375 жыхароў, а ў школе — 82 вучні (59 хлопчыкаў і 23 дзяўчынкі). На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгасы «Чырвонае Забалацце» і «Усход», 2 кузні. У 1997 г. у вёсцы было 58 падвор'яў і 109 жыхароў. Ёсць магазін.

ЗАБАЛАЦЦЕ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана пры возеры Забалацце, за 10 км на паўночны захад ад горада Лепель. Паходжанне назвы такое ж самае, як і папярэдняй вёскі. Па пісьмовых крыніцах XIX — першай чвэрці XX ст., Забалацце вядома як вёска ці сяло Забалацце Пышнянскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, уласнасць Пісунохавых (сярэдзіна XIX ст.). У 1887 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, працавала праваслаўная царква. У пачатку XX ст. вёска, мелася 38 двароў, каля 240 жыхароў. Побач з вёскай знаходзіўся маёнтак Забалацце, 1 гаспадарка, 50 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі тут адкрыта працоўная школа 1-ай ступені. Як бачна з рукапісных матэрыялаў Нацыянальнага архіва Беларусі, у 1924 г. Забалацце з'яўлялася сялом, у якім у гэты час было 350 жыхароў. Сумежна з сялом у гэты ж час знаходзіўся пасёлак Забалацце (былы маёнтак), 82 жыхары. У тым жа годзе ў мясцовай школе вучылася 55 дзяцей (з іх 13 дзяўчынак). На 1997 г. у вёсцы налічвалася 38 падвор'яў, 62 жыхары.

ЗАВАДЗІНА, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Знаходзіцца за 35 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У 1997 г. у вёсцы мелася 11 падвор'яў і 17 жыхароў.

ЗАБАРОЎЕ, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Знаходзіцца каля шашы Віцебск — Полацк (0,5 км), за 18 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Назва геаграфічнага паходжання, звязана з першапачатковым размяшчэннем паселішча на мясцовасці (населены пункт, які знаходзіцца за борам (лесам). У XIX — пачатку XX ст. Забароўе было вядома як сяло Бельскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1886 г. тут налічвалася 19 двароў, 162 жыхары, працавала праваслаўная царква. На 1906 г. мелася 36 двароў, 213 жыхароў. У 1924 г. у Забароўі налічвалася 247 жыхароў, адкрыта працоўная школа 1-ай ступені (у ёй у гэтым жа годзе вучылася 72 хлопчыкі і дзяўчынкі). На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвоная зорка» і кузня. У 1972 г. мелася 74 гаспадаркі, 225 жыхароў. На 1997 г. было 96 падвор'яў, 262 жыхары. На тэрыторыі Забароўя ёсць магазін, аддзяленне сувязі, дзіцячыя яслі-сад, сярэдняя школа, базавая школа, масавая бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт і помнік-абеліск (1967 г.) на ўшанаванне памяці 76 землякоў, якія загінулі ў баях падчас Вялікай Айчыннай вайны.

ЗАБОР'Е, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Знаходзіцца за 10 км на паўночны захад ад горада Лепель. Населены пункт быў заснаваны паблізу лесу (бору), за лесам (борам), таму яго і назвалі Забор'е. Паводле архіўных рукапісных матэрыялаў, у сярэдзіне XIX ст. Забор'е ўяўляла сабой маёнтак Пышнянскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, уласнасць Скіўскіх. На 1855 г. у маёнтку было 18 жаночых і 19 мужчынскіх рабочых душ. Аднаму работніку-мужчыне гаспадар маёнтка выдзяляў у карыстанне 5 дзесяцін зямлі, а ўсяго — 95 дзесяцін. У пачатку XX ст. Забор'е вядома як невялічкая вёска тых жа воласці і павета. У 1906 г. у ёй было толькі 7 двароў, каля 60 жыхароў. У 1997 г. у вёсцы мелася 13 падвор'яў і 20 жыхароў.

ЗАВІДЗІЧЫ, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана за 5 км на поўнач ад горада Лепель, на беразе возера Лепельскае. На 1880-ыя гады Завідзічы ўяўлялі сабой сядзібу Вораньскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой працавалі капліца, вінакурны завод і вадзяны млын. На пачатку XX ст. Завідзічы былі вядомы як маёнтак, дзе мелася 2 двары, 40 жыхароў. Уласнасць Кусцінскіх. Пры Савецкай уладзе маёнтак пераўтвораны ў вёску. У 1921 г. тут адкрыты дзіцячы сад. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «З-ці рашаючы» і кузня. На 1997 г. у Завідзічах было 10 падвор'яў, 34 жыхары.

ЗАГЛІННІКІ, вёска ў складзе саўгаса «Грыгаравічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана пры рацэ Эса, за 30 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Паводле архіўных (рукапісных) матэрыялаў, у 1925 г. вёска Загліннікі, 212 жыхароў. На 1997 г. тут было 10 падвор'яў і 15 жыхароў. Каля вёскі знаходзяцца 3 археалагічныя помнікі — курган, 2 гарадзішчы.

ЗАГОРЦЫ, вёска ў саўгасе «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана каля возера Какісіна, за 26 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. Загорцы былі

вядомы як маёнтак Каменскай воласці Лепельскага павета, належаў сельскагаспадарчаму таварыству. На 1906 г. мелася 16 двароў, 126 жыхароў. У 1997 г. было 29 падвор'яў, 48 жыхароў.

ЗАДОРЫ, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана за 20 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У 1925 г. тут было 117 жыхароў. На 1997 г. мелася 22 падвор'і і 40 жыхароў.

ЗАКАЛЙЎЕ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 17 км на паўночны захад ад горада Лепель. Назва ўтворана ад мясцовасці, ад наймення ўгоддзевага ўрочышча Закаліўе, у якім узнікла паселішча. У XIX — пачатку XX ст. у дакументах сустракаецца як вёска Закаліўе Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у вёсцы налічвалася 44 двары, 282 жыхары. У 1940 г. 70 двароў, 355 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 9 двароў і загубілі 12 жыхароў Закаліўя (сакавік — красавік 1943 г.). На 1997 г. у вёсцы было 39 падвор'яў, 62 жыхары.

ЗАЛЕССЕ, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 18 км на ўсход ад горада Лепель. Залессе вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета. На 1906 г. у ёй было 43 двары, 245 жыхароў. У 1997 г. мелася 8 падвор'яў, 20 жыхароў.

ЗАЛЕССЕ 2-ое, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 25 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. вёска Несінскай воласці Лепельскага павета, у якой на гэты час было толькі 8 двароў, 48 жыхароў. У 1997 г. мелася 17 падвор'яў і 30 жыхароў.

ЗАЛЕССЕ 1-ае, вёска ў складзе саўгаса «Баброва» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 27 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. вёска Залессе Мартынаўскай воласці Лепельскага павета, каля 20 двароў, 170 жыхароў. У 1997 г. было 12 падвор'яў і 28 жыхароў.

ЗАЛУЧЫНА, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 6 км на поўнач ад горада Лепель. Назва дадзена ад мясцовасці, ад прыроднага ўрочышча Залучына, каля якога ўзнікла паселішча. У канцы XIX — пачатку XX ст. вёска Залучына Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. тут было 19 двароў, 131 жыхар. На 1997 г. 36 падвор'яў, 70 жыхароў.

ЗАМОШША, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана за 25 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Каменскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было 39 двароў, 198 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «1-га Мая» і кузня. На 1940 г. было 53 гаспадаркі, 163 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 38 двароў і загубілі 9 жыхароў (ліпень 1943 г.). На 1997 г. у Замошшы было 29 падвор'яў і 48 жыхароў.

ЗАНЬКІ, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 8 км на поўнач ад горада Лепель, на беразе возера Лепельскае. У XIX — пачатку XX ст. вёска Занькі Вораньскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было 38 двароў, 254 жыхары. У 1997 г. мелася 27 падвор'яў, 59 жыхароў. Непадалёку ад вёскі, у лесе, размешчаны археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 9 насыпаў. Мясцовая яго назва Валатоўкі.

ЗАПОЛЛЕ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 8 км на паўночны захад ад горада Лепель. На пачатку XX ст. Заполле ўяўляла сабой маёнтак Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ім была 1 гаспадарка і 8 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі маёнтак пераўтвораны ў вёску. На 1997 г. вёска, 8 падвор'яў, 17 жыхароў.

ЗАРОЎЕ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Знаходзіцца на беразе возера Доўгае, за 20 км на паўночны захад ад горада Лепель. Назва дадзена ад мясцовасці, ад наймення ўрочышча, у якім узнікла паселішча. На пачатку XX ст. Зароўе ўяўляла сабой невялічкую вёсачку Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй мелася толькі 9 двароў, 79 жыхароў. У канцы 1920-ых гадоў тут створаны калгас «Чырвонае Зароўе», працавала кузня. На 1940 г. у вёсцы было 35 двароў, 124 жыхары. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты ў сакавіку — красавіку 1943 г. спалілі Зароўе і загубілі 34 жыхары. У 1997 г. у вёсцы налічвалася 10 падвор'яў і 15 жыхароў.

ЗАРУЖАННЕ, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 26 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Заружанне. Назва паселішча ўтворана ад наймення возера. У пачатку XX ст. Заружанне ўяўляла сабой невялікую вёску ў складзе Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1906 г. у ёй было

толькі 14 двароў, 145 жыхароў. У 1997 г. тут мелася 6 падвор'яў, 7 жыхароў.

ЗАРЫБІНА, вёска ў калгасе імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана за 10 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Жэжліна. На пачатку XX ст. Зарыбіна ўяўляла сабой невялічкую вёсачку Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было толькі 2 двары, 36 жыхароў. На 1997 г. мелася 8 двароў, 18 жыхароў.

ЗАСЛАЎКІ, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана каля возера Урада, за 26 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX стагоддзя як вёска Каменскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было 20 двароў, 150 жыхароў. На пачатку 1930-ых гг. быў калгас «Зара волі», працавала кузня. У 1997 г. у Заслаўках мелася 33 падвор'і, 60 жыхароў.

ЗАЦЯКЛЯССЕ, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана пры рацэ Сургучка, за 12 км на захад ад горада Лепель. На 1886 г. паселішча было вядома як засценак Зацякляссе (Ухватка) Пышнянскай воласці Лепельскага павета, у якім на той час меўся 1 двор, 10 жыхароў, працавала праваслаўная царква. У 1906 г. маленькая вёска, 4 двары, 25 жыхароў. Непадалёку ад вёскі знаходзіўся маёнтак Зацякляссе, 1 двор, 14 жыхароў, належаў Пётухавым. Паводле рукапісных крыніц Нацыянальнага архіва Беларусі, у 1924 г. у вёсцы Зацякляссе было 62 жыхары, працавала працоўная школа 1-ай ступені (33 вучні, з іх толькі 3 дзяўчынкі). З 20.08.1924 г. да 20.05.1960 г. цэнтр сельсавета. У пачатку 1930-ых гг. працавалі калгас «Чырвоная перамога» і кузня. У 1940 г. у вёсцы было 46 гаспадарак і 212 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Зацякляссе і загубілі 2 яго жыхароў (красавік 1943 г.). На 1997 г. у вёсцы мелася 59 падвор'яў і 119 жыхароў. Ёсць магазін, помнік — скульптурная кампазіцыя воіна і партызанкі (1971 г.) на брацкай магіле 55 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну.

ЗАХОЦІНА, вёска ў калгасе імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 10 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. Захоціна ўяўляла сабой маленькую вёсачку Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, дзе было толькі 5 двароў, 42 жыхары. На 1997 г. мелася 7 падвор'яў і 13 жыхароў.

ЗВЯЗДА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана каля азёр Тэкліц і Луконец, за 16 км на паўночны захад ад горада Лепель. Раней паселішча мела назву Аўгустова. У 1906 г. яно ўяўляла сабой фальварак Аўгустова Пышнянскай воласці Лепельскага павета, уласнасць Шчытаў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі фальварак быў пераўтвораны ў вёску. На 1924 г. у вёсцы Аўгустова мелася 75 двароў. Пазней вёска перайменавана, стала называцца Звязда. У 1997 г. у ёй было 105 двароў, 322 жыхары. На тэрыторыі вёскі знаходзіцца магазін, археалагічныя помнікі — 2 курганныя могільнікі (у адным каля 100 курганоў, у другім — 4 насыпы) і гарадзішча (усе помнікі размешчаны каля вёскі).

ЗОРНІЦА, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана на рацэ Ула, за 8 км на ўсход ад горада Лепель. У XIX — пачатку XX ст. вёска Зорніца Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было 36 двароў, 242 жыхары. На 1924 г. мелася 280 жыхароў. У 1997 г. налічвалася 54 падвор'і і 112 жыхароў. Ёсць магазін.

ЗЯЛЁНКА, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 12 км на поўнач ад горада Лепель. У 1997 г. налічвалася 44 падвор'і і 98 жыхароў.

ЗЯЛЁНЫ ВОСТРАЎ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 19 км на поўдзень ад горада Лепель, на шашы Лепель — Халопенічы. Назва ўтворана ад мясцовасці, ад наймення ўгоддзевага ўрочышча Зялёны Востраў, дзе было заснавана паселішча. У пачатку XX ст. вёска Зялёны Востраў Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было 28 двароў, каля 180 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Зялёны Востраў» і кузня. На 1997 г. мелася 59 падвор'яў, 124 жыхары.

ЗЯМЦЫ, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Знаходзіцца за 30 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, пры рацэ Дзева. Зямцы вядомы з пачатку XX ст. як вёска Каменскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было 14 двароў, 111 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоны барэц», працавала кузня. На 1997 г. 9 падвор'яў, 16 жыхароў.

ІРЫНПОЛЛЕ, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана каля возера Жэжліна, за 8 км на поўнач ад горада Лепель. Назва ўтворана ад мясцовасці, ад участка зямлі, якая калісьці належала нейкай Ірыне, дзе было заснавана паселішча. У пачатку XX ст. населены пункт быў вядомы як маёнтак Ірынполь Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, 2 двары, 7

жыхароў. Уласнасць Вейткаў. У 1997 г. у вёсцы налічвалася 36 падвор'яў, 68 жыхароў.

КАБАК, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана каля возера Кабак, за 17 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Назва дадзена ад наймення возера. У XIX — пачатку XX ст. сяло ці вёска Кабак Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1886 г. 8 двароў, 52 жыхары, працавала праваслаўная царква. У 1906 г. тут было 12 двароў, 81 жыхар. На 1924 г. 165 жыхароў. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Камінтэрн», ваўначоска і кузня. На 1940 г. 35 гаспадарак, 160 жыхароў. У жніўні 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 1 жыхара. У 1997 г. у вёсцы Кабак было 23 падвор'і, 61 жыхар.

КАВАЛЕВІЧЫ, вёска ў складзе саўгаса «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 23 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Кавалевічы Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1906 г. у вёсцы мелася 36 двароў, 316 жыхароў. У 1914 г. тут было адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. На 1997 г. у вёсцы мелася 23 падвор'і, 32 жыхары.

КАЗІНШЧЫНА, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана за 6 км на поўнач ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Казіншчына Вараньскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. мелася 20 двароў, 153 жыхары. У 1997 г. было 34 падвор'і, 63 жыхары.

КАЗЛЫ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 5 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель, каля возера Доўгае. У пачатку XX ст. вёска Казлы Забалацкай воласці Лепельскага павета Мінскай губерні, у якой мелася 18 двароў, каля 150 жыхароў. На 1997 г. было 16 падвор'яў і 26 жыхароў.

КАЛЬНІКІ, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана за 5 км на захад ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. як маленькая вёска Франопальскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было толькі 5 двароў, 61 жыхар. На 1997 г. мелася 11 падвор'яў, 14 жыхароў.

КАМЕНКА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана каля возера Доўгае, за 17 км на паўночны захад ад горада Лепель. Назва ўтворана ад мясцовасці, ад наймення прыроднага ўрочышча Каменка, у якім узнікла паселішча. Паводле рукапісных крыніц, у сярэдзіне XIX ст. маёнтак Каменка Лепельскага павета належаў Навіцкім. На месцы сучаснай вёскі ў пачатку XX ст. знаходзіліся 2 фальваркі з назвай Каменка, у якіх разам было 2 гаспадаркі і 15 жыхароў. Адзін фальварак належаў Караленкавым, а другі — Парахонькам. Уваходзілі ў склад Пышнянскай воласці Лепельскага павета. Пры Савецкай уладзе фальваркі былі пераўтвораны ў вёску Каменка, у якой пабудавалі свае сядзібы колішнія беднякі і парабкі з гэтых фальваркаў і суседніх населеных пунктаў. У 1940 г. у вёсцы было 10 двароў і 53 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Каменку і загубілі 7 яе жыхароў (сакавік — красавік 1943 г.). На 1997 г. было 1 падвор'е, жыў 1 чалавек.

КАМЕНЬ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана за 20 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля азёр Каменскае і Вязава, на аўтамабільнай дарозе Лепель — Віцебск. Па пісьмовых крыніцах, паселішча вядома з сярэдзіны XVI ст. як сяло Камень у складзе Вялікага княства Літоўскага, а з 1569 г. Рэчы Паспалітай. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.) Камень апынуўся ў складзе Расіі, мястэчка, цэнтр воласці Лепельскага павета, уласнасць Розенаў. У 1865 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1886 г. у мястэчку налічвалася 22 двары, 134 жыхары, дзейнічалі валасное праўленне, праваслаўная царква і каталіцкі касцёл, сінагога, конная паштовая станцыя, земскае народнае вучылішча (35 вучняў, усе хлопчыкі), вадзяны млын, 6 піцейных дамоў, на год 3 ярмаркі, за 2 вярсты ад мястэчка знаходзіліся піваварны завод і ветраны млын. У 1906 г. у мястэчку мелася 1319 жыхароў, 305 пабудоў (з іх толькі адна мураваная, астатнія драўляныя); апрача названых вышэй устаноў працавалі паштовае аддзяленне і царкоўнапрыходская школа. У 1923 г. былі адкрыты хата-чытальня, бібліятэка, аптэка. З 20.08.1924 г. Камень з'яўляецца цэнтрам сельсавета. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Батрак», льнозавод, кравецкая і шавецкая майстэрні, млын, сукнавалка, красільня. З 1938 г. вёска Камень. У 1940 г. тут было 166 двароў, 764 жыхары. З ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. вёска акупіравана нямецкімі фашыстамі. У жніўні 1943 г. акупанты спалілі Камень і загубілі 198 жыхароў. У 1971 г. мелася 150 гаспадарак, 452 жыхары. У 1997 г. 179 двароў, 425 жыхароў. На тэрыторыі Каменя знаходзяцца сядзібы сельсавета і калгаса, механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, сярэдняя школа, Дом быту, клуб, масавая біб-

ліятэка, бальніца, аптэка, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, аўтаматычная тэлефонная станцыя, 3 магазіны. Ёсць помнікі — скульптура салдата (1964 г.) на брацкай магіле 83 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941—1943 гг., і 22 мірных жыхароў, якія былі расстраляны гітлераўцамі (сярод пахаваных — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР Я. К. Кішчанка); абеліск (1967 г.) на магіле ахвяр фашызму (каля вёскі); абеліск (1968 г.) на ўшанаванне памяці 120 землякоў, што загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну; археалагічны помнік — гарадзішча.

КАМІНШЧЫНА, вёска ў складзе саўгаса «Грыгаравічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 27 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. На 1997 г. мелася 15 падвор'яў, 24 жыхары.

КАРАЕВІЧЫ, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 30 км на ўсход ад горада Лепель, каля возера Сызаўшчына. На пачатку XX ст. вёска Караевічы Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было 34 двары, 201 жыхар. Побач з вёскай размяшчаліся ў той жа час з назвай Караевічы 12 сядзіб і маёнтак (належаў Шалепіным). Ва ўсіх мелася 17 двароў, 53 жыхары. У 1912 г. у вёсцы Караевічы адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. У 1924 г. у школе налічвалася 54 вучні (з іх толькі 3 дзяўчынкі); у вёсцы было каля 340 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў тут працавалі калгас імя К. Маркса, вадзяны млын і кузня. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў Караевічах дзейнічаў Лепельскі падпольны райкам КП(б)Б, які размяшчаўся ў доме мясцовага патрыёта М. Ц. Прудніка з верасня 1941 г. да сакавіка 1942 г. У гонар дзейнасці падпольнага райкама на доме ў 1975 г. устаноўлена мемарыяльная дошка. На 1997 г. у вёсцы Караевічы мелася 40 падвор'яў, 70 жыхароў.

КАСТРЫЦА, вёска ў складзе саўгаса «Грыгаравічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 28 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. У 1997 г. мелася 34 падвор'і і 58 жыхароў. Непадалёку ад вёскі (1,5 км) размешчаны археалагічны помнік — гарадзішча, які адносіцца да перыяду Кіеўскай Русі.

КАСЦЮКОЎШЧЫНА, вёска ў складзе саўгаса «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 26 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Па пісьмовых крыніцах, вядома з пачатку XX ст., вёска Касцюкоўшчына Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якой было толькі 10 двароў, 65 жыхароў. На 1997 г. мелася 4 падвор'і, 6 жыхароў.

КАТОЎШЧЫНА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Сцяг» Каменскага сельсавета. Размешчана за 25 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Катоўшчына. Назва дадзена ад наймення возера. У XIX — пачатку XX ст. вёска Катоўшчына Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. мелася 27 двароў, 216 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвоны Сцяг», млын і сукнавалка. На 1997 г. мелася 41 падвор'е, 80 жыхароў.

КВЕТЧА, вёска Домжарыцкага сельсавета. Размешчана за 24 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Паводле пісьмовых крыніц, у пачатку XX ст. Кветча ўяўляла сабой засценак Бярэзінскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У ім быў 1 двор, 25 жыхароў. На 1940 г. вёска, 42 гаспадаркі, 202 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы спалілі Кветчу і загубілі 7 яе жыхароў (1943 г.). У 1997 г. 39 падвор'яў і 70 жыхароў. На тэрыторыі вёскі ёсць магіла ахвяр фашызму, у якой пахаваны 67 мірных жыхароў вёсак Кветча і Пастрэжжа, якіх загубілі гітлераўцы ў 1943 г. У 1964 г. на магіле ўстаноўлена стэла.

КІСЦЯЛЁВА, колішняя вёска Баброўскага сельсавета. Яна знаходзілася за 29 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, за 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Сасняг гэтага ж сельсавета. На пачатку XX ст. маленькая вёска Кісцялёва Несінскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 3 двары, 33 жыхары. Побач з вёскай знаходзілася сядзіба Кісцялёва Кантавых, 1 двор, 9 жыхароў. У 1940 г. у ёй налічвалася 12 двароў, 47 жыхароў. 17 чэрвеня 1942 г. вёска Кісцялёва знішчана нямецка-фашысцкімі акупантамі разам з жыхарамі. Пасля вайны не адрадзілася. На магіле ахвяр фашызму, якая размешчана на месцы колішняй вёскі, у 1958 г. устаноўлены помнік — абеліск. Вёска Кісцялёва ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

КЛЕЎЗЫ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 8 км на паўночны захад ад горада Лепель. У пачатку XX ст. паселішча было вядома як фальварак Клеўзы Пышнянскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, уласнасць Барадзейкаў. У 1906 г. у фальварку была 1 гаспадарка, 18 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі фальварак быў пераўтвораны ў вёску. На 1997 г. у Клеўзах мелася 2 падвор'і і 2 жыхары.

КОСЦІНКА, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 27 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Косцінка, ці Косцінкі, Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. тут было 20 двароў, каля 150 жыхароў. На 1924 год 189 жыхароў. У 1997 г. у вёсцы мелася 10 падвор'яў і 15 жыхароў.

КРАЙЦЫ, вёска Домжарыцкага сельсавета. Размешчана за 36 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. На 1940 г. у вёсцы было 11 двароў, 42 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну за 12 км на захад ад вёскі, у лесе, базіравалася (1943—1944 гг.) Сенненская партызанская брыгада. У 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 21 мірнага жыхара. На 1997 г. у Крайцах было 40 падвор'яў і 105 жыхароў. У вёсцы ёсць помнікі — стэла (1962 г.) на магіле ахвяр фашызму і скульптура воіна (1962 г.) на брацкай магіле 37 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях пры вызваленні Лепельскага раёна ў чэрвені 1944 г. Сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза В. С. Кладзіеў. За 9 км на ўсход ад Крайцоў знаходзіцца брацкая магіла 73 савецкіх воінаў і партызан, якія таксама загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну. На брацкай магіле ў 1962 г. устаноўлены помнік — скульптура воіна з аўтаматам, а на месцы базіравання Сенненскай партызанскай брыгады пастаўлены мемарыяльны знак (1968 г.).

КРАСНАЕ СЯЛО (ПЛЯШКІ), вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. На 1997 г. у Красным Сяле было 20 падвор'яў, 33 жыхары.

КРАСНАЛУЧКА, вёска ў складзе саўгаса «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 20 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. паселішча вядома як ваколіца Красналучка Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якой было на той час 20 двароў, каля 220 жыхароў. У 1997 г. вёска, 30 падвор'яў і 66 жыхароў. Паблізу вёскі, у лесе, знаходзіцца археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае больш за 300 насыпаў.

КРАСНЫ АКЦЯБР, да 1939 г. Іван Бор, вёска ў складзе калгаса «Пражэктар» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 9 км на поўдзень ад горада Лепель. На 1940 г. у вёсцы было 20 двароў, 64 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 7 яе жыхароў (кастрычнік 1943 г.). На 1997 г. у Красным Акцябры мелася 1 падвор'е, пражываў 1 чалавек.

КРЫЎКІ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 14 км на паўночны захад ад горада Лепель. У XIX — пачатку XX ст. Крыўкі былі вядомы як маёнтак Пышнянскай воласці Лепельскага павета, уласнасць Макарэвічаў (сярэдзіна XIX ст.). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі маёнтак пераўтвораны ў вёску. У 1940 г. у вёсцы было 11 двароў, 57 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 6 яе жыхароў (сакавік — красавік 1943 г.). У 1997 г. тут мелася 6 падвор'яў, 9 жыхароў.

КРЫЎЦЫ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Знаходзіцца на беразе возера Доўгае, за 13 км на паўночны захад ад горада Лепель. Крыўцы вядомы па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як сяло ці вёска Пышнянскай воласці Лепельскага павета. На 1886 г. невялікае сяло Крыўцы, у якім было толькі 9 двароў, 76 жыхароў, працавала праваслаўная царква. У 1906 г. мелася 12 двароў, 92 жыхары. На 1940 г. 14 двароў, 72 жыхары. У сакавіку — красавіку 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 8 яе жыхароў. На 1997 г. у Крыўцах было 13 падвор'яў, 27 жыхароў.

КУЛЯШЫ, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана каля возера Святое і ракі Эса, за 6 км на захад ад горада Лепель. У XIX — пачатку XX ст. Куляшы ў дакументах адзначаюцца як сяло ці вёска Бельскай воласці Лепельскага павета. У 1886 г. яны з'яўляліся вёскай, у якой была толькі 1 гаспадарка і 8 жыхароў. За 4 км ад яе ў той час працавалі вінакурны завод, ветраны і вадзяны млыны. На 1906 г. сяло Куляшы, у якім быў толькі 1 двор, 14 жыхароў. На 1997 г. у Куляшах было 14 падвор'яў і 25 жыхароў. Паблізу вёскі размешчаны археалагічныя помнікі — гарадзішча і селішча.

КУРМЯЛЁЎКА, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана за 18 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Ладасна. У 1906 г. Курмялёўка ўяўляла сабой маленькую вёсачку Каменскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 4 гаспадаркі, 36 жыхароў. У 1925 г. 68 жыхароў. На 1940 г. мелася 31 гаспадарка і 140 жыхароў. У жніўні 1943 г. Курмялёўка была спалена нямецкімі фашыстамі. У 1997 г. у вёсцы налічвалася 30 падвор'яў і 75 жыхароў.

ЛАДАСНА, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана за 21 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Ладасна. Назва дадзена ад

назвы возера. У XIX — пачатку XX ст. вёска Ладасна Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, уласнасць Каменкаў (сярэдзіна XIX ст.). У 1906 г. тут было 19 двароў, каля 140 жыхароў. У 1913 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. На 1924 г. у вёсцы мелася 87 жыхароў, дзейнічала працоўная школа 1-ай ступені (46 вучняў). У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Зорка жыцця» і кузня. У 1940 г. у Ладасне налічвалася 85 гаспадарак, 352 жыхары. У жніўні 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 47 яе жыхароў. У 1997 г. было 42 падвор'і і 82 жыхары. Ёсць магазін.

ЛАДЗЕЙНА, вёска ў складзе саўгаса «Баброва» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 28 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. У 1906 г. вёска Ладзейна Мартынаўскай воласці Лепельскага павета, у якой было 23 двары, 218 жыхароў. У 1997 г. было 31 падвор'е, 74 жыхары.

ЛІПКІ, вёска ў складзе саўгаса «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 22 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. У 1997 г. мелася 5 падвор'яў і 5 жыхароў.

ЛУТЧЫНА, вёска ў складзе саўгаса «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 22 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Паводле рукапісных матэрыялаў, у 1925 г. вёска Лутчына, 125 жыхароў. На 1997 г. у вёсцы было 20 падвор'яў і 53 жыхары.

ЛУЦІШЧА, пасёлак у складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчаны за 8 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. У XIX — пачатку XX ст. Луцішча ўяўляла сабой памешчыцкі маёнтак Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, належаў Міладоўскім. На 1855 г. у маёнтку было 54 рабочыя душы (24 мужчыны і 30 жанчын). Аднаго работніка (мужчыну) гаспадар надзяляў 5 дзесяцінамі зямлі, а ўсіх — 120 дзесяцін. У 1906 г. у маёнтку быў 1 двор, 23 жыхары. У 1920-ыя гады на месцы былога маёнтка створаны пасёлак, у якім пабудавалі свае сядзібы колішнія парабкі мясцовага памешчыка. У 1925 г. у ім было 253 жыхары. На 1997 г. тут мелася 15 падвор'яў і 24 жыхары.

ЛЮДЧЫЦЫ, вёска Лепельскага сельсавета. Размешчана за 18 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. вёска Людчыцы Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой на той час было 40 двароў, каля 300 жыхароў. У 1997 г. у Людчыцах мелася 28 падвор'яў, 66 жыхароў. Паблізу ад Людчыцаў знаходзіцца вёска Двор Людчыцы (19 падвор'яў, 40 жыхароў у 1997 г.).

ЛЯХАВІЧЫ, вёска ў складзе саўгаса «Грыгаравічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 26 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У 1910 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. З 20.08.1924 г. да 21.11.1959 г. цэнтр сельсавета. У 1925 г. у вёсцы мелася 350 жыхароў, а ў школе 58 вучняў. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Ляхавічы» і кузня. У Вялікую Айчынную вайну ў Ляхавічах быў створаны 17 жніўня 1941 г. Лепельскі падпольны райкам КП(б)Б. На 1997 г. у вёсцы налічвалася 61 падвор'е і 107 жыхароў. Ёсць магазін. На доме, у якім адбылося першае пасяджэнне Лепельскага падпольнага райкама КП(б)Б, устаноўлена мемарыяльная дошка (1975 г.).

МАКАРАЎШЧЫНА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Сцяг» Каменскага сельсавета. Знаходзіцца каля Макараўскага возера, за 23 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Назва ўтворана ад наймення возера. У XIX — пачатку XX ст. Макараўшчына ўяўляла сабой сяло ці вёску Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1884 г. сяло, адкрыта царкоўнапрыходская школа, працавала праваслаўная царква. На 1886 г. у сяле было 15 двароў, 110 жыхароў. У пачатку XX ст. Макараўшчына вядома як вёска. У 1906 г. у ёй мелася 22 двары, 142 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі тут адкрыта працоўная школа 1-ай ступені. У 1924 г. у вёсцы было 217 жыхароў, а ў школе 2 настаўнікі вучылі 58 дзяцей, з якіх толькі 8 дзяўчынак. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвоны Сцяг» і кузня. На 1997 г. мелася 30 двароў, 52 жыхары.

МАЛОЕ ЖЭЖЛІНА, вёска ў складзе калгаса імя Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана за 10 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Малое Жэжліна Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. тут было толькі 4 двары, 71 жыхар. На 1997 г. мелася 10 падвор'яў, 21 жыхар.

МАЛЫ ПОЎСВІЖ, вёска ў саўгасе «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана пры Дамашнім возеры, за 4 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. на тэрыторыі, дзе знаходзіцца сучаснае паселішча, было 2 вёскі з назвай Малы Полевіж Забалацкай воласці Лепельскага павета. У іх разам было 38 двароў, каля 280 жыхароў. Пазней вёскі былі аб'яднаны ў адзін населены пункт. У 1925 г. ён быў вядомы як хутар Малы Полевіж, 417 жыхароў. У 1997 г. тут было 72 падвор'і, 179 жыхароў. Ёсць пачатковая школа, клуб і магазін.

МАЛЫЯ ПЫШНАГОРЫ, вёска ў калгасе «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 10 км на паўночны захад ад горада Лепель. Гэта паселішча вядома было на пачатку XX ст. як вёска Пышнагоры Пышнянскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой мелася толькі 4 двары, 61 жыхар. На 1924 г. вёска Малыя Пышнагоры, 86 жыхароў. У 1997 г. тут было 13 падвор'яў і 19 жыхароў.

МАЛЫЯ ТАРОНКАВІЧЫ, вёска ў складзе саўгаса «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 22 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. На 1997 г. мелася 17 падвор'яў, 26 жыхароў.

МАРОЗАВА СЛАБАДА, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана за 17 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Часцінка. На пачатку XX ст. Марозава Слабада ўяўляла сабой вёску Каменскай воласці Лепельскага павета, у якой мелася 2 двары, 18 жыхароў. У 1997 г. у вёсцы было 15 падвор'яў і 32 жыхары.

МАТЫРЫНА, вёска, цэнтр саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 20 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Заслонава, на беразе возера Матырына. Назва паселішча ўтворана ад наймення мясцовага возера. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, уласнасць Канапацкіх (сярэдзіна XX ст.). У 1906 г. у вёсцы было 24 двары, 176 жыхароў. Непадалёку ад вёскі знаходзіліся з назвай Матырына 12 сядзіб і 1 маёнтак, ва ўсіх мелася 14 гаспадарак і 48 жыхароў. Маёнтак належаў Воўкавым, а сядзібы — Ярашэвічам, Жыгальскім, Паўлоўскім, Забалоцкім, Станкевічам, Канапацкім, Чаховічам. На 1925 г. мелася 270 жыхароў. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвонаармеец» і кузня. У 1997 г. налічвалася 149 двароў, 421 жыхар. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца саўгасная сядзіба, майстэрні па рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны пункт, масавая бібліятэка, клуб, аддзяленне сувязі, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом быту, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, 2 магазіны.

МАЦЮШЫНА СЦЯНА, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана за 4 км на захад ад горада Лепель. У XIX — пачатку XX ст. паселішча было вядома як вёска Мацюшына Сцяна Франопальскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй мелася 54 двары, 362 жыхары. У 1918 г. тут адкрыта працоўная школа 1-ай ступені. На 1924 г. вёска Мацюшына Сцяна, 475 жыхароў. У школе вучылася 35 дзяцей (сярод іх толькі 4 дзяўчынкі). На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвонае Мацюшына» і кузня. У 1997 г. у вёсцы было 78 падвор'яў і 150 жыхароў.

МЕЖЫЦА, пасёлак у складзе Горскага сельсавета (ваенны гарадок). У 1997 г. налічвалася 654 жыхары. Тут ёсць масавая бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, клуб, аддзяленне сувязі, сярэдняя школа, магазін.

МІХАЛОВА, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 8 км на ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Міхалова Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй налічвалася 12 двароў, 84 жыхары. На 1997 г. было 13 падвор'яў і 33 жыхары.

МІШУЛЬКІ, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана за 34 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У 1997 г. было 3 падвор'і і 4 жыхары.

МЯГЕЛІ, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана за 18 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Ладасна. На пачатку XX ст. Мягелі ўяўлялі сабой маёнтак (калектыўнае таварыства) і вёску Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, знаходзіліся побач. У 1906 г. у іх разам было 33 двары, 226 жыхароў. На 1997 г. вёска Мягелі, 38 падвор'яў і 84 жыхары.

МЯДЗВЁДАЎКА, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана за 14 км на захад ад горада Лепель. Назва ўтворана ад мясцовасці, ад наймення ўгоддзевага ўрочышча, у якім узнікла паселішча. У XIX — пачатку XX ст. вёска Мядзвёдаўка Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй мелася 29 двароў, 229 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Мядзвёдаўка» і кузня. У 1940 г. у Мядзвёдаўцы было 42 двары, 115 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 7 яе жыхароў (сакавік — красавік 1943 г.). На 1997 г. у вёсцы было 23 падвор'і і 31 жыхар.

НАВАСЁЛКІ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 19 км на паўночны захад ад горада Лепель. У XIX — пачатку XX ст. вёска Навасёлкі Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у вёсцы было 17 двароў, 74 жыхары. У пачатку 1930-ых гадоў тут працавала тарная майстэрня. На 1940 г. у вёсцы

мелася 14 гаспадарак, 70 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Навасёлкі і загубілі 15 жыхароў (сакавік — красавік 1943 г.). У 1997 г. у вёсцы налічвалася 11 падвор'яў, 18 жыхароў. На тэрыторыі вёскі знаходзіцца археалагічны помнік — курган.

НАВІНЫ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 20 км на паўночны захад ад горада Лепель. Вядома з пачатку XX ст. як вёска Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У 1909 г. у ёй было толькі 5 двароў, 38 жыхароў. У 1998 г. у вёсцы Навіны мелася 8 падвор'яў, 14 жыхароў.

НАВІНЫ, вёска ў складзе калгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 11 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. невялічкая вёска Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было толькі 12 двароў, 93 жыхары. На 1997 г. налічвалася 6 падвор'яў і 8 жыхароў.

НЕСІНА, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана на беразе возера Несіна, за 23 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Назва паселішча ўтворана ад наймення мясцовага возера. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX ст., калі з'яўлялася сялом ці сядзібай, цэнтрам воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. Уласнасць Стэфаноўскіх (сярэдзіна XIX ст.). У 1865 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча. На 1886 г. сядзіба, у ёй дзейнічалі валасное праўленне, праваслаўная царква, земскае народнае вучылішча (28 вучняў, у тым ліку толькі 1 дзяўчынка). У 1906 г. Несіна ўяўляла сабой пагост, у якім было 4 двары, 11 жыхароў, працавалі валасное праўленне, праваслаўная царква, земскае народнае вучылішча, карчма. Сумежна з пагостам знаходзіўся маёнтак Несіна Стэфаноўскіх, 1 двор, 2 жыхары. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой навучалася каля 70 хлопчыкаў і дзяўчынак (1924 г.). У 1923 г. тут адкрыта хата-чытальня. З 20.08.1924 г. да 26.03.1973 г. Несіна з'яўлялася цэнтрам сельсавета. У 1925 г. у вёсцы было 162 жыхары. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Авангард» і кузня. У 1997 г. у вёсцы налічвалася 55 падвор'яў і 111 жыхароў. Ёсць магазін і 2 археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі, якія знаходзяцца на беразе возера Несіна. Адзін могільнік мае 4 насыпы, а другі — 7 курганоў.

НОВАЕ ЛЯДНА, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана за 7 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Белае. У пачатку XX ст. невялікая вёска Новае Лядна Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой мелася 14 двароў, каля 100 жыхароў. На 1997 г. было 15 падвор'яў, 33 жыхары.

НОВАЗАСЛОНАВА, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Паселішчу назва дадзена ад прозвішча славутага Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава, які вызначыўся і загінуў у змаганні з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1997 г. у вёсцы было 130 падвор'яў і 397 жыхароў.

НОВАЗАСЛОНАВА, пасёлак (ваенны гарадок) Горскага сельсавета. У 1997 г. тут было 2495 жыхароў. Ёсць масавая бібліятэка, сярэдняя школа, магазін, клуб, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, дзіцячыя яслі-сад.

НОВЫЯ ВАЛОСАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Валосавічы». Размешчана за 20 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель, на аўтамабільнай дарозе Лепель — Халопенічы, на беразе штучнага вадасховішча. Вядомы па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст., калі з'яўляліся сялом, цэнтрам воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1867 г. у сяле было адкрыта земскае народнае вучылішча. На 1886 г. было 34 двары, 208 жыхароў, дзейнічалі валасное праўленне, земскае народнае вучылішча, праваслаўная царква, конная паштовая станцыя, раз на год (15 жніўня) кірмаш. У пачатку XX ст. сяло Новыя Валосавічы, 59 двароў, 332 жыхары. Побач з сялом знаходзіўся маёнтак Новыя Валосавічы, 1 гаспадарка, 30 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе земскага народнага вучылішча была створана працоўная школа 1-ай ступені. У 1924 г. у сяле налічвалася 498 жыхароў, а ў школе 67 вучняў. З 20.08.1924 г. цэнтр сельсавета. Падчас Вялікай Айчыннай вайны Новыя Валосавічы амаль поўнасцю былі спалены нямецка-фашысцкімі акупантамі. У 1997 г. тут было 233 двары, 542 жыхары. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца сядзібы сельсавета і саўгаса, механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, Дом быту, лясніцтва, Дом культуры, сярэдняя школа, масавая бібліятэка, бальніца, аптэка, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, аўтаматычная тэлефонная станцыя, сталовая, 4 магазіны, помнік — скульптура воіна (1964 г.) на брацкай магіле 90 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях у Вялікую Айчынную вайну. Ёсць 2 археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі. Адзін з іх мае 10 насыпаў, а другі — 30 насыпаў.

ОКАНА, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана пры возеры Окана, за 6 км на захад ад горада Лепель. Назва ўтворана ад наймення возера. Вядома на пачатку XX ст. як маленькая вёска Окана Пышнянскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. тут было толькі 3 двары і 22 жыхары. На 1997 г. мелася 35 падвор'яў і 59 жыхароў. Каля вёскі, на мысе, які ўтвораны берагам возера Окана і рэчкай Оканіца, знаходзіцца археалагічны помнік — стаянка.

ПАДАЛІЦА, вёска (з 1997 г. не існуе) Баброўскага сельсавета. Знаходзілася за 30 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У сярэдзіне XIX ст. Падаліца вядома як маёнтак Мышынскіх Мартынаўскай воласці Лепельскага павета. На пачатку XX ст. у той жа воласці побач знаходзіліся 2 вёскі пад назвай Падаліца, у абедзвюх было 39 двароў, каля 300 жыхароў. У 1997 г. паселішча перастала існаваць, выбылі яго апошнія жыхары.

ПАГАРЭЛАЕ, вёска ў складзе калгаса «Баброва» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 29 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст., калі ўваходзіла ў склад Бачэйкаўскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. вёска, 25 двароў, 199 жыхароў. Побач з вёскай знаходзіліся сядзіба Пагарэлае, 1 двор, 29 жыхароў. У 1924 г. у вёсцы было 256 жыхароў. На 1997 г. мелася 2 падвор'і, 2 жыхары.

ПАДДУБ'Е, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана на аўтамабільнай дарозе Лепель — Халопенічы, за 10 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Назва ўтворана ад наймення прыроднага ўрочышча, у якім расло шмат дубоў і дзе было заснавана паселішча. У 1906 г. Паддуб'е ўяўляла сабой маленькую вёсачку Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой на гэты час мелася толькі 9 двароў, 66 жыхароў. У 1997 г. 71 падвор'е і 194 жыхары. На тэрыторыі вёскі ёсць магазін, Дом культуры, пачатковая школа і помнік — скульптурная выява воіна (1980 г.) на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Прозвішчы загінуўшых на помніку не адзначаны.

ПАДЛОБНЫЯ, вёска ў складзе калгаса імя М. І. Калініна Заазерскага сельсавета. Размешчана на рацэ Забалацце, за 12 км на поўнач ад горада Лепель. На пачатку XX ст. Падлобныя ўяўлялі сабой невялікую вёску Вораньскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было толькі 10 гаспадарак, 56 жыхароў. У 1940 г. налічвалася 16 двароў, 90 жыхароў. У студзені 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску, загубілі 5 яе жыхароў. У 1997 г. мелася 15 падвор'яў, 35 жыхароў.

ПАЗЕМШЧЫНА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Сцяг» Каменскага сельсавета. Размешчана за 26 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. На 1997 г. мелася 5 двароў, 9 жыхароў.

ПАДЫМХІ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 12 км на поўдзень ад горада Лепель. На 1997 г. было 15 падвор'яў, 29 жыхароў.

ПАЛЯНЫ, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 15 км на ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Паляны Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. тут было 18 двароў, 138 жыхароў. З 20.08.1924 г. да 19.02.1971 г. вёска Паляны з'яўлялася цэнтрам сельсавета. На 1997 г. мелася 12 падвор'яў, 19 жыхароў.

ПАРЭЧЧА, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Размешчана каля возера Парэчча, за 19 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Назва ўтворана ад наймення возера і ўрочышча Парэчча, дзе заснавана паселішча. У пачатку XX ст. вёска Парэчча Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было 23 двары, каля 180 жыхароў. Побач з вёскай знаходзіўся маёнтак Парэчча, 3 двары, каля 20 жыхароў. Належаў маёнтак Снарскім. У пачатку 1930-ых гадоў у вёсцы працавалі калгас «Полымя» і кузня. На 1997 г. у Парэччы было 24 двары, 40 жыхароў. Вёска з'яўляецца радзімай беларускага паэта Тодара Тодаравіча Кляшторнага (26.02.1903 — 26.11.1938 гг. жыцця).

ПАСТРЭЖЖА, былая вёска Домжарыцкага сельсавета. Знаходзілася за 24 км на паўднёвы захад ад горада Лепель, непадалёку ад вёскі Кветча. У 1940 г. у Пастрэжжы былі 21 двор, 104 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Пастрэжжа і загубілі 60 яго жыхароў (ліпень 1943 г.). Ахвяры фашызму пахаваны ў вёсцы Кветча. Пасля вайны вёска была адноўлена. Перастала існаваць з 1995 г. Пастрэжжа ўвекавечана ў мемарыяльным комплексе Хатынь.

ПАТАШНЯ, вёска ў складзе калгаса «Пражэктар» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 18 км на поўдзень ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. Даўней тут была майстэрня па вырабу паташу, таму паселішча і назвалі Паташня. У 1906 г.

вёска Паташня Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якой было на той час 28 двароў, 197 жыхароў. На 1924 г. 224 жыхары. У 1997 г. у Паташні мелася 6 падвор'яў і 10 жыхароў.

ПАХОМЛЕВІЧЫ, вёска ў складзе саўгаса «Грыгаравічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 27 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Паводле рукапісных (архіўных) матэрыялаў, у 1925 г. у вёсцы Пахомлевічы было 219 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвоная зорка» і кузня. У 1997 г. тут мелася 11 падвор'яў і 16 жыхароў.

ПЕРАХОДЦЫ, вёска Домжарыцкага сельсавета. Размешчана за 15 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. У 1940 г. у вёсцы налічвалася 38 двароў, 152 жыхары. У ліпені 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 1 жыхара. На 1997 г. мелася 26 падвор'яў і 43 жыхары.

ПЛІГАЎКІ, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Знаходзіцца за 11 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. Плігаўкі ўяўлялі сабой фальварак Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якім было 2 двары, 23 жыхары. Фальварак належаў сялянам Шнітка і Папко. У савецкі перыяд фальварак пераўтвораны ў вёску. У 1997 г. вёска, мелася 13 падвор'яў, 25 жыхароў. На паўднёвай ускраіне вёскі знаходзіцца помнік — абеліск (1975 г.), які ўстаноўлены на месцы гібелі камандзіра Лепельскай партызанскай брыгады імя Сталіна Дзмітрыя Цімафеевіча Караленкі, які загінуў на гэтым месцы ў баі супраць нямецкіх акупантаў 22 красавіка 1944 г.

ПОПЛАЎКІ, вёска, цэнтр калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 12 км на паўночны захад ад горада Лепель, каля аўтамабільнай дарогі Лепель — Докшыцы (1 км). Па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст., вёска Паплаўкі Пышнянскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1904 г. тут было адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1906 г. у вёсцы мелася 26 двароў, 196 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі земскае народнае вучылішча было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. У 1924 г. у вёсцы было 215 жыхароў, а ў мясцовай школе вучылася 18 хлопчыкаў і 9 дзяўчынак. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Барэц» і кузня. У 1997 г. у вёсцы мелася 40 двароў, 79 жыхароў. На яе тэрыторыі знаходзяцца калгасная сядзіба, механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, клуб, масавая бібліятэка, магазін, пачатковая школа, помнік — скульптура воіна (1971 г.) на брацкай магіле 26 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1941 і 1944 гг.

ПРУДОК, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана за 9 км на захад ад горада Лепель, пры ручаі Прудок, ад наймення якога ўтворана назва паселішча. Паселішча вядома з сярэдзіны XIX ст. як маёнтак Прудок Пышнянскай воласці Лепельскага павета, уласнасць Арнольдаў. На 1906 г. Прудок уяўляў сабой маленькую вёсачку тых жа воласці і павета, у якой на той час было толькі 3 двары, 17 жыхароў. З 20.08.1924 г. да 16.07.1954 г. цэнтр сельсавета. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Перамога», вадзяны млын і кузня. У 1997 г. у вёсцы было 3 падвор'і, 4 жыхары.

ПУНІШЧА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана каля возера Доўгае, за 13 км на паўночны захад ад горада Лепель. Паселішча заснавана на месцы, дзе да гэтага была гаспадарчая пабудова, пуня, таму яго і назвалі Пунішча. Паводле пісьмовых крыніц, у пачатку XX ст. вёска Пунішча Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй мелася 18 двароў, 127 жыхароў. У 1940 г. у вёсцы было 27 гаспадарак, 135 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Пунішча і загубілі 14 яго жыхароў (сакавік — красавік 1943 г.). На 1997 г. было 20 падвор'яў і 32 жыхары.

ПЫШНА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны партызан». Размешчана за 18 км на паўночны захад ад горада Лепель, на аўтамабільнай дарозе Лепель — Докшыцы. Па пісьмовых крыніцах, паселішча вядома з сярэдзіны XVI ст. як прыватнаўласніцкае сяло Пішна ў складзе Вялікага княства Літоўскага, а з 1569 г. Рэчы Паспалітай. З 1766 г. мястэчка. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.) далучана да Расіі, мястэчка Пышна, цэнтр воласці Лепельскага павета Полацкай, з 1802 г. Віцебскай губерняў, уласнасць Шытаў. У 1862 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. На 1886 г. у мястэчку было 14 двароў, 128 жыхароў, працавалі валасное праўленне, гарбарны завод, земскае народнае вучылішча (41 вучань, з іх толькі 2 дзяўчынкі), яўрэйскі малітоўны дом, некалькі лавак. У 1906 г. у мястэчку мелася 141 пабудова (у тым ліку адна мураваная), 618 жыхароў, працавалі паштовае і тэлеграфнае аддзяленні. Побач з мястэчкам знаходзіўся маёнтак Пышна, 1 гаспадарка, 97 жыхароў. У лістападзе 1917 г. устаноўлена Савецкая ўлада. З лютага да верасня 1918 г. Пышна было акупіравана нямецкімі войскамі.

Восенню 1919 г. захоплена польскімі войскамі. У пачатку мая 1920 г. часці 56-ай стралковай дывізіі 15-ай арміі пачалі баі за Пышна і да сярэдзіны мая таго ж года вызвалілі яе ад польскіх акупантаў. У баях за вызваленне Пышна вызначыліся і былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга камандзір і камісар батальёна І. Кальван, Дз. Арлоў, камандзір узвода М. Ліхачоў. У 1918 г. мясцовае земскае народнае вучылішча было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені (на 1924 г. 2 настаўнікі вучылі каля 70 вучняў). У 1923 г. тут адкрыта хата-чытальня. З 20.08.1924 г. Пышна з'яўляецца цэнтрам сельсавета. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Чырвоны прамень», кравецкая майстэрня, вапнавы завод і млын. З 1938 г. вёска Пышна. На 1940 г. было 97 двароў, 485 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну Пышна з ліпеня 1941 г. да канца чэрвеня 1944 г. была акупіравана нямецкімі фашыстамі. У кастрычніку 1942 г. партызаны Чашніцкай («Дубава») брыгады разгамілі гарнізон гітлераўцаў у вёсцы Пышна і аднавілі ў ёй Савецкую ўладу. Акупанты імкнуліся зноў захапіць Пышна. 19 мая 1943 г. яны разгарнулі шырокае наступленне. 20 дзён партызаны брыгад Чашніцкай («Дубава»), імя С. М. Кароткіна, імя В. І. Чапаева, 2-ой Ушацкай імя П. К. Панамарэнкі, «Жалязняк», імя ЦК КП (б)Б мужна адбівалі атакі гітлераўцаў. Баі за Пышна (19 мая — 8 чэрвеня 1943 г.) увайшлі ў гісторыю пад назвай «Пышнянская абарона». Гераічны подзвіг абаронцаў вёскі адлюстраваны ў карціне партызанскага мастака М. Абрыньбы «Бой за Пышна». Гітлераўцы спалілі вёску і загубілі 87 яе жыхароў (сакавік—красавік 1943 г.). У 1997 г. тут было 145 гаспадарак і 363 жыхары. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца сядзібы сельсавета і калгаса, механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, Дом быту, сярэдняя школа, Дом культуры, масавая бібліятэка, бальніца, аптэка, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, аўтаматычная тэлефонная станцыя, 2 магазіны. У цэнтры вёскі, у скверы, размешчаны брацкія могілкі чырвонаармейцаў, савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях з польскімі інтэрвентамі ў 1920 г. і з нямецка-фашысцкімі акупантамі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1959 г. устаноўлены помнік — скульптурная кампазіцыя: жанчына і падлетак у вайсковай форме. Там жа ў 1966 г. пастаўлены абеліск на ўшанаванне памяці 114 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Дом культуры адзначаны мемарыяльнай дошкай (1974 г.) у гонар партызанскіх брыгад, якія вялі баі за вёску Пышна ў 1942 і 1943 гг.

ПЯСКІ, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Размешчана за 15 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Вядома з пачатку XX ст. На 1906 г. маленькая вёска Пяскі Вораньскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 7 гаспадарак і 90 жыхароў. У 1924 г. мелася 108 жыхароў. На 1997 г. было 24 падвор'і, 50 жыхароў.

РАДУНЬ, вёска ў складзе саўгаса «Баброва» Бабруўскага сельсавета. Размешчана за 30 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Па пісьмовых крыніцах, паселішча вядома ў XIX — пачатку XX ст. як вёска Радунь Несінскай воласці Лепельскага павета. На 1906 г. у Радуні было 34 двары, 328 жыхароў. Паблізу вёскі размяшчаўся маёнтак Радунь, 2 гаспадаркі, 4 жыхары. Маёнтак з'яўляўся ўласнасцю Рэўтаў. У 1910 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча, якое ў 1918 г. было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. У 1924 г. у вёсцы налічвалася 324 жыхары, а ў школе — 47 вучняў. На 1940 г. у Радуні мелася 35 гаспадарак і 175 жыхароў. У ліпені 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі 26 двароў і загубілі 6 жыхароў Радуні. У 1997 г. налічвалася 16 падвор'яў і 27 жыхароў.

РАЧЫЦЫ, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана за 7 км на захад ад горада Лепель. Паводле пісьмовых крыніц, у пачатку XX ст. Рачыцы ўяўлялі сабой фальварак Пышнянскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ім быў 1 двор, 8 жыхароў. Фальварак належаў Спасоўскім. Пры савецкай уладзе фальварак пераўтвораны ў вёску. У 1997 г. у Рачыцах было 5 падвор'яў, 9 жыхароў.

РОЖНА, вёска ў складзе Домжарыцкага сельсавета. Размешчана каля ракі Бярэзіна і шашы Лепель — Мінск, за 35 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. У XIX — пачатку XX ст. вёска Бярэзінскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. На 1906 г. мелася 23 двары, 158 жыхароў. У 1940 г. 35 гаспадарак, 175 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны гітлераўцы спалілі 26 двароў і загубілі 6 жыхароў (ліпень 1943 г.). У ваколіцы вёскі пры навядзенні пераправы цераз раку Бярэзіна вызначыўся 30 чэрвеня 1944 г. сапёр, гвардыі радавы Віктар Сідаравіч Кладзіеў. Ён, паранены, працягваў наводзіць пераправу пад агнём ворага, асабістым прыкладам натхняў байцоў на выкананне баявога задання. Загінуў у той жа дзень. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, якая знаходзіцца ў суседняй вёсцы Крайцы. Пасмяротна Кладзіеву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (24.03.1945 г.). На месцы подзвігу Кладзіева, за 5 км на захад ад вёскі, каля моста праз Бярэзіну ў 1975 г. устаноўлены камень-валун з мемарыяльным надпісам. У 1997 г. у вёсцы было 49 падвор'яў, 81 жыхар.

РУДНЯ, вёска ў складзе калгаса «Пражэктар» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 12 км на поўдзень ад горада Лепель. Даўней тут была майстэрня (рудня, рудніца), у якой выплаўлялі жалеза з балотнай руды, таму паселішча і атрымала такую назву. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст., вёска Рудня Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1906 г. тут было 45 двароў, 372 жыхары. У 1914 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. На 1924 г. у школе вучылася 39 хлопчыкаў і дзяўчынак. У пачатку 1930-ых гадоў у Рудні працавалі кузня, ваўначоска, сукнавалка, вадзяны млын. На 1997 г. у вёсцы мелася 20 падвор'яў і 40 жыхароў.

САВІН ДУБ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана на рацэ Сургучк, за 21 км на паўночны захад ад горада Лепель. У пачатку XX ст. Савін Дуб уяўляў сабой маленькую вёску Пышнянскай воласці Лепельскага павета, дзе мелася толькі 4 гаспадаркі і 28 жыхароў. Вакол вёскі знаходзілася 5 сядзіб з назвай Савін Дуб, у якіх разам было 5 двароў, 29 жыхароў. Сядзібы належалі Буевічам, Гервятоўскім, Закржэўскім, Славецкім. На 1997 г. у вёсцы мелася 9 падвор'яў, 17 жыхароў.

САЛАМАХІ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 8 км на паўночны захад ад горада Лепель. Назва вёскі ўтворана ад прозвішча Саламаха. Вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. У 1906 г. Саламахі ўяўлялі сабой маленькую вёсачку Пышнянскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 8 двароў, 76 жыхароў. У 1997 г. налічвалася 3 падвор'і і 3 жыхары.

САСНЯГІ, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 27 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Саснягі Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было толькі 14 двароў, 114 жыхароў. Побач з вёскай знаходзілася сядзіба Саснягі, 2 гаспадаркі, 18 жыхароў. Сядзіба належала Рэўтам. На 1924 г. мелася 124 жыхары. На пачатку 1930-ых гадоў у вёсцы працавалі калгас «Камунар» і кузня. З ліпеня 1941 г. да канца чэрвеня 1944 г. Саснягі былі акупіраваны нямецкімі фашыстамі. У 1942 г. у Саснягоўскай пушчы, за 3 км на поўдзень ад вёскі, базіраваліся партызанскі атрад № 68 і Лепельскі падпольны райкам КП(б)Б. У 1997 г. у вёсцы Саснягі налічвалася 4 падвор'і і 5 жыхароў. Каля вёскі, на месцы базіравання партызанскага атрада № 68 і Лепельскага падпольнага райкама КП(б)Б, у 1966 г. адноўлена зямлянка і ўстаноўлена стэла, а за 2 км на паўднёвы ўсход ад Саснягоў устаноўлены абеліск (1958 г.) на магіле 46 ахвяр фашызму (пахаваны жыхары былой вёскі Кісцялёва, якіх загубілі на гэтым месцы 17.06.1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты).

САЎСКІ БОР, вёска ў складзе Домжарыцкага сельсавета. Размешчана за 23 км на паўднёвы захад ад горада Лепель, пры Бярэзінскім канале. Па пісьмовых крыніцах, Саўскі Бор вядомы з пачатку XX ст. На 1906 г. ён уяўляў сабой засценак Бярэзінскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якім на той час было 2 двары, 26 жыхароў. У 1940 г. вёска, 17 двароў, 56 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну вёска была спалена гітлераўцамі (ліпень 1943 г.). За 3 км на поўнач ад Саўскага Бору, у лясным урочышчы Маліўнік, з лютага 1942 г. да ліпеня 1944 г. знаходзіўся шпіталь партызанскай брыгады «Жалязняк», у 1997 г. у вёсцы налічвалася 3 падвор'і, 5 жыхароў. Каля вёскі (0,2 км) знаходзяцца брацкія могілкі 100 савецкіх воінаў і партызан брыгады «Жалязняк», якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у Вялікую Айчынную вайну. У 1963 г. на брацкіх могілках пастаўлены помнік — скульптура жанчыны ў жалобе. На месцы размяшчэння партызанскага шпіталя ўстаноўлены мемарыяльны знак, адноўлена зямлянка (1963 г.).

СВАБОДНАЕ ЖЫЦЦЁ, да 1939 г. Ізабеліна, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Знаходзіцца за 5 км на ўсход ад горада Лепель. На 1997 г. мелася 36 падвор'яў, 71 жыхар.

СВЯДЗІЦА, вёска ў складзе калгаса «Пражэктар» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 14 км на поўдзень ад горада Лепель, на рацэ Свядзіца (прыток Эсы), ад якой паселішча і атрымала сваю назву. Паводле пісьмовых крыніц, у XIX — пачатку XX ст. вёска Свядзіца Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні. У 1906 г. у ёй мелася 67 двароў, 451 жыхар. У 1924 г. тут было каля 400 жыхароў, працавала працоўная школа 1-ай ступені (39 вучняў, з іх толькі 3 дзяўчынкі). На 1997 г. мелася 91 падвор'е, 149 жыхароў. Паблізу вёскі знаходзяцца археалагічныя помнікі — гарадзішча, 2 курганныя могільнікі (адзін мае 20, а другі — 10 насыпаў).

СЕЛІШЧА, вёска ў калгасе «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана на беразе возера Окана, за 8 км на захад ад горада Лепель. Паселішча заснавана на селішчы, гэта значыць на месцы, дзе раней ужо існавала сяло, якое па

нейкіх прычынах было разбурана ці знесена, таму яно і атрымала такую назву. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. У сярэдзіне XIX ст. Селішча ўяўляла сабой маёнтак Лепельскага павета, які належаў Сялявам. На 1906 г. вёска Селішча Франопальскай воласці Лепельскага павета, у якой мелася толькі 12 двароў, 86 жыхароў. У 1997 г. налічвалася 24 падвор'і і 45 жыхароў.

СІТНІКІ, вёска ў складзе калгаса «Салют» Стайскага сельсавета. Размешчана за 5 км на захад ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. На 1906 г. маленькая вёска Сітнікі Франопальскай воласці Лепельскага павета, у якой на той час было толькі 10 двароў, 80 жыхароў. У 1997 г. тут мелася 18 падвор'яў і 33 жыхары.

СЛАБАДА, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Пражэктар». Размешчана за 14 км на поўдзень ад горада Лепель. У 1924 г. пасёлак Слабада, 62 жыхары, працавала працоўная школа 1-ай ступені, у якой вучылася 42 вучні (усе хлопчыкі). З 16.07.1954 г. цэнтр сельсавета, вёска. У 1997 г. у вёсцы было 224 двары, 571 жыхар. На тэрыторыі Слабады знаходзяцца сельсавецкая і калгасная сядзібы, механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, лясніцтва, сярэдняя школа, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, ашчадная каса, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, 2 магазіны, помнік-абеліск (1966 г.) на ўшанаванне памяці 154 землякоў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

СЛАБАДА, вёска ў складзе калгаса «Парыжская камуна» Горскага сельсавета. Размешчана за 16 км на ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Слабада Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у вёсцы налічвалася 14 двароў, 104 жыхары. На 1997 г. у Слабадзе было 14 падвор'яў і 27 жыхароў.

СЛАБОДКА, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Размешчана каля возера Слабодка, за 15 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. вёска Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой быў 21 двор, 140 жыхароў. У 1924 г. тут мелася 200 жыхароў, працавала працоўная школа 1-ай ступені (адкрыта ў 1918 г., у 1924 г. навучалася 46 дзяцей). У 1997 г. у Слабодцы было 34 падвор'і, 59 жыхароў.

СЛАБОДКА, вёска ў калгасе «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 16 км на паўночны захад ад горада Лепель. Па рукапісных крыніцах вядома з сярэдзіны XIX ст. як маёнтак Штромбергаў Пышнянскай воласці Лепельскага павета. У пачатку XX ст. вёска тых жа воласці і павета. На 1906 г. 22 двары, 139 жыхароў. У 1924 г. тут было 140 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты абрабавалі, спалілі вёску, расстралялі ці спалілі жывымі 127 мірных жыхароў. Многіх жыхароў гітлераўскія карнікі надта катавалі. Асабліва здзекаваліся яны са старшыні калгаса Саламахі: яму пасля моцных пабояў адсеклі рукі, ногі, галаву. Пасля вайны вёска была адноўлена. У 1997 г. у Слабодцы налічвалася 18 падвор'яў, 36 жыхароў. На тэрыторыі вёскі ёсць помнік-абеліск (1967 г.) на магіле ахвяр фашызму, а непадалёку ад яе 3 археалагічныя помнікі — курганныя могільнікі. Адзін могільнік мае 70, другі — 30, трэці — 12 насыпаў.

СЛАБОДКА, вёска ў складзе саўгаса «Баброва» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 28 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. На пачатку XX ст. вёска Слабодка Бачэйкаўскай воласці Лепельскага павета, у якой было 28 двароў, 201 жыхар. У 1997 г. 11 падвор'яў, 17 жыхароў.

СЛАБОДКА, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 6 км на поўнач ад горада Лепель. На пачатку XX ст. Слабодка з'яўлялася маленькай вёсачкай Забалацкай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 3 гаспадаркі, каля 30 жыхароў. На 1997 г. мелася 56 падвор'яў і 127 жыхароў.

СЛЯДНЕВІЧЫ 1-ыя, вёска ў складзе саўгаса «Грыгаравічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 26 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Паводле рукапісных (архіўных) звестак, у 1924 г. вёска Слядневічы 1-ыя, 70 жыхароў. На 1997 г. было 7 падвор'яў і 9 жыхароў.

СЛЯДНЕВІЧЫ 2-ія, вёска ў складзе саўгаса «Грыгаравічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 26 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Паводле рукапісных (архіўных) крыніц, у 1924 г. вёска Слядневічы 2-ія, 66 жыхароў. У 1997 г. тут было 4 падвор'і, 5 жыхароў.

СТАІ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Салют». Размешчана на аўтамабільнай дарозе Лепель — Докшыцы, за 5 км на захад ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. як вёска Стаі Франопальскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. Паводле перапісу 1897 г., Стаі ўяўлялі сабой

значную і шматлюдную вёску, у якой мелася 750 жыхароў. На пачатку XX ст. тут было 126 двароў, каля 740 жыхароў. Восенню 1905 г. Стаі і многія іншыя навакольныя вёскі Лепельскага павета былі ахоплены сялянскімі хваляваннямі супраць памешчыцкага ўціску. Яны праяўляліся ў такіх формах, як масавая высечка лесу, адмаўленне ад выплаты падаткаў і выканання іншых павіннасцей і інш. Сяляне вёскі Стаі дружна і адкрыта секлі і вывозілі памешчыцкі лес. Узброіўшыся стрэльбамі, калмі, сякерамі, віламі, яны збілі і прагналі з лесу і вёскі леснікоў і паліцэйскіх, якія намагаліся спыніць высечкі, рабілі вобыскі ў сялянскіх дварах. Каб задушыць сялянскае выступленне, у вёску была накіравана рота салдат 3-га пяхотнага Данскога палка. Сяляне звярнуліся да камандзіра роты з патрабаваннем неадкладна вызваліць арыштаванага ім вяскоўца. Калі гэта патрабаванне не было выканана, яны накінуліся на камандзіра і салдат. Па загадзе камандзіра салдаты адкрылі агонь. У гэтай сутычцы трое сялян былі забіты, а 4 паранены. Хваляванне было задушана. У 1912 г. у Стаях адкрыта земскае народнае вучылішча, якое пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі было пераўтворана ў працоўную школу 1-ай ступені. У 1924 г. у вёсцы налічвалася 1087 жыхароў, а ў школе — 48 вучняў (з іх толькі 2 дзяўчынкі). З 20.08.1924 г. Стаі з'яўляюцца цэнтрам сельсавета. На 1997 г. 355 двароў, 928 жыхароў. На тэрыторыі Стаяў знаходзяцца сельсавецкая і калгасная сядзібы, механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, ашчадная каса, сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, клуб, масавая бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, 3 магазіны, помнік — скульптура партызана і дзяўчынкі (1974 г.) на ўшанаванне памяці 167 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

СТАЙСК, вёска ў складзе калгаса «Радзіма» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 20 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Паселішча вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. На 1906 г. Стайск уяўляў сабой засценак Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якім у гэты час было 10 двароў, 86 жыхароў. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Стайск» і кузня. У 1940 г. вёска Стайск, 52 гаспадаркі, 128 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 9 яе жыхароў (ліпень 1943 г.). У 1997 г. мелася 9 падвор'яў і 11 жыхароў.

СТАЛЮГІ, вёска ў складзе калгаса «Радзіма» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 19 км на поўдзень ад горада Лепель. На 1997 г. было 11 падвор'яў і 14 жыхароў.

СТАРОЕ ЛЯДНА, вёска, цэнтр калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана за 10 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Лядна, на аўтамабільнай дарозе Лепель — Віцебск. Назва ўтворана ад назвы возера. Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. На 1906 г. вёска Старое Лядна Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой на той час было 32 двары, 216 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну часткова спалена нямецкімі фашыстамі. У 1997 г. налічвалася 123 гаспадаркі, 343 жыхары. На тэрыторыі Старога Лядна знаходзяцца механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, калгасная сядзіба, базавая школа, клуб, масавая бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, 2 магазіны, помнікі — У. Леніну, В. Чапаеву (1977 г.), скульптурная кампазіцыя (1967 г.) на ўшанаванне памяці 220 жыхароў з населеных пунктаў калгаса імя Чапаева, якія загінулі ў баях падчас Вялікай Айчыннай вайны.

СТАРАСЕЛЛЕ, вёска ў складзе аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Размешчана за 17 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. у Бельскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні побач знаходзіліся 2 сялы з назвай Стараселле, у якіх разам было 50 гаспадарак і каля 350 жыхароў. У 1924 г. у абодвух сёлах налічвалася каля 500 жыхароў. На 1997 г. вёска Стараселле, 68 падвор'яў, 128 жыхароў. Ёсць магазін. За 2 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадзішча, размешчаны археалагічны помнік — гарадзішча.

СТАРЫ ЛЕПЕЛЬ, вёска ў складзе калгаса імя М. І. Калініна Заазерскага сельсавета. Размешчана на заходнім беразе возера Лепельскае, за 5 км на поўнач ад горада Лепель, на аўтамабільнай дарозе Лепель — Ворань. Гэта адно з самых старажытных паселішчаў Лепельскага раёна. Вядома па рукапісных дакументах з 1439 г. як сяло ці горад у складзе Вялікага княства Літоўскага, а з 1569 г. Рэчы Паспалітай. Спачатку Стары Лепель з'яўляўся дзяржаўнай (велікакняжацкай) уласнасцю. З 1439 г. ён належаў Віцебскаму каталіцкаму касцёлу, з 1541 г. Віленскай каталіцкай кафедры. З 1586 г. уласнасць магнатаў Сапегаў, з 1609 г. уласнасць Віленскага бернардзінскага жаночага манастыра. У Лівонскую вайну 1558—1583 гг. тут быў пабудаваны замак, узнік сярэдневяковы горад, адбываліся жорсткія баі паміж рускімі і літоўскімі войскамі, якія прынеслі вялікія страты Старому Лепелю. У 1562 г. замак меў вялікі гарнізон, які быў узброены рушніцамі і артылерыяй. У 1563 г. рускія войскі захапілі Стары Лепель, спалілі замак, залажылі на

замчышчы астрог і пакінулі значны гарнізон. Аднак у тым самым годзе войскі Вялікага княства Літоўскага на чале з гетманам М. Радзівілам Рудым штурмам узялі яго і спалілі. Неўзабаве ўмацаванні былі адноўлены і ў 1563 г. побач з імі было заснавана «места» Лепель. У 1568 г. пачалося ўзвядзенне новага драўлянага замка. Яго будавала мясцовае насельніцтва пад кіраўніцтвам лепельскага старасты Юрыя Зяновіча. Замак акружаў шырокі і глыбокі роў. У пабудаваным замку размясціўся гарнізон з 200 коннікаў і 100 салдат «драбаў». Дастаткова ў замку было і артылерыі. У 1580 г. у Старым Лепелі налічвалася 300 дамоў. Стары Лепель з'яўляўся гандлёвым цэнтрам. Мяшчане горада карысталіся шэрагам вольнасцей і каралеўскіх прывілеяў. Яны былі вызвалены на 13 гадоў ад усіх дзяржаўных павіннасцей, за выключэннем адной — будаваць і рамантаваць замак. Важнае значэнне для развіцця эканомікі, гандлю і рамяства горада Стары Лепель мела выгаднае размяшчэнне яго на скрыжаванні 2 вялікіх гандлёвых гасцінцаў. Адзін з іх ішоў з Віцебска на Вільню, а другі — з Магілёва на Дзісну і Рыгу. Як бачна з дакументаў XVI ст., каля замка і пад яго аховай знаходзіўся гандлёвы порт. Ад яго прычалаў адпраўляліся ў Рыгу, Полацк і Кіеў караблі з рознымі таварамі. У канцы XVI ст. гандлёвы і адміністрацыйны цэнтры былі перанесены са Старога Лепеля ў мястэчка Новы Лепель (цяпер Лепель), горад заняпаў, ператварыўся ў звычайнае сельскае паселішча. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.) Стары Лепель апынуўся ў складзе Расіі, сяло Лепельскага павета Полацкай, а з 1802 г. Віцебскай губерняў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны 1812 г. быў разбураны французскімі заваёўнікамі. На 1886 г. сяло Стары Лепель Франопальскай воласці Лепельскага павета, у якім у гэты час налічвалася 37 двароў, 400 жыхароў. Дзейнічалі 2 праваслаўныя царквы, багадзельня, конная паштовая станцыя. Паводле перапісу 1897 г., сяло Стары Лепель, 545 жыхароў. У 1906 г. сяло Стары Лепель Франопальскай воласці Лепельскага павета, у якім мелася 64 гаспадаркі, 519 жыхароў, працавалі праваслаўная царква і царкоўнапрыходская школа, конная паштовая станцыя. У 1917 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча, на базе якога ў 1921 г. створана Савецкая працоўная школа 1-ай ступені. У 1924 г. у школе навучалася 35 дзяцей, з якіх была толькі адна дзяўчынка. На 1924 г. у сяле мелася 557 жыхароў. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас імя М. І. Калініна і кузня. З 1938 г. вёска. З 6 ліпеня 1941 г. да 28 чэрвеня 1944 г. Стары Лепель быў акупіраваны нямецкімі фашыстамі. У 1997 г. было 123 двары, 246 жыхароў. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца базавая школа, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін, помнік — скульптурная кампазіцыя (1970 г.) на ўшанаванне памяці 90 жыхароў з населеных пунктаў калгаса імя Калініна, якія загінулі ў баях падчас Вялікай Айчыннай вайны. Непадалёку ад вёскі знаходзяцца археалагічныя помнікі — гарадзішча, селішча, замчышча.

СТАРЫЯ ВАЛОСАВІЧЫ, вёска ў складзе саўгаса «Валосавічы» Валосавіцкага сельсавета. Размешчана за 22 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель, каля аўтамабільнай станцыі дарогі Лепель — Халопенічы. У 2-ой палове XIX ст. паселішча было вядома як вёска Валосавічы Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, дзейнічалі вінакурны завод і вадзяны млын. Сумежна з вёскай быў аднайменны маёнтак, 30 жыхароў. На пачатку XX ст. вёска Старыя Валосавічы тых жа воласці і павета, у якой было 38 двароў, каля 270 жыхароў. У 1924 г. мелася 350 жыхароў. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас імя Дзяржынскага, кузня і цагельны завод. На 1997 г. у Старых Валосавічах налічвалася 62 падвор'і, 110 жыхароў. У вёсцы ёсць магазін, а за 0,5 км на ўсход ад яе археалагічны помнік — курганны могільнік, які мае 6 насыпаў.

СТВОЛЬНА, вёска Домжарыцкага сельсавета. Размешчана за 20 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. На пачатку XX ст. Ствольна ўяўляла сабой маленькую вёсачку Бярэзінскай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якой было на той час толькі 7 двароў, 41 жыхар. У 1940 г. у вёсцы мелася 18 гаспадарак, 72 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Ствольна (ліпень 1943 г.). У 1997 г. было 11 падвор'яў і 19 жыхароў.

СТУДЗЁНКА, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 10 км на паўночны захад ад горада Лепель. Мясцовая легенда расказвае, што паселішча было заснавана каля калодзежа (студні), таму яно і названа Студзёнка. Вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. На 1906 г. вёска Студзёнка Пышнянскай воласці Лепельскага павета, у якой на той час было 14 двароў, 96 жыхароў. У 1924 г. мелася 108 жыхароў. На пачатку 1930-ых гадоў тут былі калгасы «Трыбуна» і «Чырвоная Студзёнка», працавалі 2 кузні. У 1997 г. у Студзёнцы мелася 28 падвор'яў, 43 жыхары.

СУША, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Сушанскі». Размешчана паміж азёрамі Цеменіца, Астраўкі, Вогзіна, за 33 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Вядома з XVI ст., калі ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага, а з 1569 г. знаходзілася ў Рэчы

Паспалітай. Падчас Лівонскай вайны (1558–1583 гг.) на месцы сучаснай вёскі па загаду цара Івана IV Грознага рускімі ў 1566 г. была пабудавана крэпасць Суша, ці Кап'ё, у якой да 1579 г. знаходзіўся гарнізон рускіх войск. У 1567 і 1579 гг. пад сценамі ўмацавання адбываліся жорсткія баі паміж літоўскімі і рускімі войскамі. У 1579 г. крэпасць была ўзята і разбурана палякамі. Захаваліся да нашых часоў толькі рэшткі абарончых валоў XVI ст. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793 г.) паселішча апынулася ў складзе Расіі, вёска Суша Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, уласнасць Багдановічаў. У 1886 г. працаваў вінакурны завод. У 1906 г. 37 двароў, 285 жыхароў. Сумежна з вёскай размяшчаўся маёнтак Суша, 2 гаспадаркі, 19 жыхароў. З 20.08.1924 г. цэнтр сельсавета. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Суша» і кузня. У 1997 г. у Сушы мелася 101 падвор'е, 279 жыхароў. На тэрыторыі вёскі знаходзяцца сядзібы сельсавета і саўгаса, ветэрынарны і фельчарска-акушэрскі пункты, механічныя майстэрні, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, магазін, аўтаматычная тэлефонная станцыя, помнік – скульптура воіна (1966 г., каля мясцовых могілак) на брацкай магіле 22 савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў баях падчас Вялікай Айчыннай вайны. Захаваліся рэшткі абарончых валоў XVI ст.

СЫЗАЎШЧЫНА, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана на беразе возера Доўгае, за 19 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У XIX – пачатку XX ст. паселішча вядома як маёнтак Несінскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у маёнтку мелася 2 двары і 13 жыхароў. Належаў Сцяпанавым. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на месцы колішняга маёнтка створана аднайменная вёска, дзе пабудавалі свае сядзібы былыя беднякі і парабкі. На 1997 г. у Сызаўшчыне налічвалася 3 падвор'і і 4 жыхары.

СЯРГЕЕЎШЧЫНА, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 7 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Назва ўтворана ад імя Сяргей ці ад прозвішча, якое дадзена ад гэтага імя. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. як вёска Сяргееўшчына Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета. У 1906 г. у ёй было толькі 5 дамоў, 35 жыхароў. На 1997 г. мелася 2 падвор'і і 3 жыхары.

УБЕРЦЫ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны партызан» Пышнянскага сельсавета. Размешчана за 18 км на паўночны захад ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. На 1906 г. вёска Уберцы Пышнянскай воласці Лепельскага павета, у якой тады было 19 двароў, 101 жыхар. У 1940 г. тут налічвалася 27 гаспадарак, 138 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Уберцы і загубілі 17 іх жыхароў (сакавік – красавік 1943 г.). На 1997 г. у вёсцы мелася 14 падвор'яў і 23 жыхары.

УЛІЦІНКІ, вёска ў аграфірме «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Знаходзіцца за 17 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Неградзь. У 1906 г. невялікая вёска Уліцінкі Каменскай воласці Лепельскага павета, у якой было толькі 12 двароў, 111 жыхароў. На 1924 г. 168 жыхароў. У 1997 г. у вёсцы Уліцінкі мелася 23 падвор'і, 42 жыхары.

ТАДУЛІНА, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Знаходзіцца за 16 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель. Лічаць, што назва паселішча ўтворана ад прозвішча Тадулін. У XIX – пачатку XX ст. маёнтак Тадуліна Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета, уласнасць Рэўтаў, потым Сляскіх. Паводле рукапісных матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, у 1855 г. у маёнтку было 13 мужчынскіх і 11 жаночых рабочых душ. Гаспадар маёнтка Рэўт надзяляў аднаго работніка-мужчыну ад 5 да 7,5 дзесяціны зямлі, а ўсіх разам – 80 дзесяцінамі. У 1906 г. у маёнтку была 1 гаспадарка, 19 жыхароў. У гэты час побач з маёнткам існаваў фальварак Тадуліна Чаховічаў, 1 двор, 15 жыхароў. Пры савецкай уладзе на месцы былых маёнтка і фальварка створана вёска Тадуліна. У 1997 г. у ёй мелася 6 двароў, 6 жыхароў.

ХАЛІМОНАВА, вёска ў складзе саўгаса «Бароўка» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 15 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. вёска Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй налічвалася 14 двароў, 187 жыхароў. На 1997 г. было 17 падвор'яў і 30 жыхароў.

ХВАШЧОВА, вёска ў складзе саўгаса «Сушанскі» Сушанскага сельсавета. Размешчана каля возера Урада, за 29 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. Вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. У 1906 г. невялічкая вёска Хвашчова Каменскай воласці Лепельскага павета, у якой налічвалася толькі 12 двароў, 92 жыхары. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «Пуцілавец» і кузня. У 1940 г. у вёсцы Хвашчова мелася 26 двароў, 95 жыхароў. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 1 жыхара. На 1997 г. было 5 падвор'яў і 7 жыхароў.

ЦЯРЭШКІ, вёска ў калгасе «Радзіма» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 25 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. У 1940 г. у вёсцы Цярэшкі было 24 гаспадаркі, 82 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Цярэшкі і загубілі 1 жыхара (ліпень 1943 г.). На 1997 г. было 6 падвор'яў і 10 жыхароў.

ФАТЫНЬ, вёска ў складзе саўгаса «Баброва» Баброўскага сельсавета. Размешчана за 28 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. Фатынь была вядома як маёнтак Бачэйкаўскай воласці Лепельскага павета. На 1906 г. у ім было 2 двары, 7 жыхароў. У савецкі перыяд маёнтак пераўтвораны ў вёску. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі тут калгас імя У. Леніна і кузня. На 1997 г. 16 падвор'яў, 35 жыхароў.

ЧАРНАРУЧЧА, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 5 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель, пры рэчцы Эса. Па пісьмовых крыніцах, Чарнаручча вядома з пачатку XX ст. як вёска Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было толькі 13 двароў, 118 жыхароў. У пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгас «11 ліпеня» і кузня. На 1997 г. у вёсцы мелася 22 падвор'і, 33 жыхары. За 1 км на поўнач ад Чарнаручча, злева ад шашы Лепель — Мінск, знаходзіцца магіла больш за 2 тыс. мірных савецкіх жыхароў, расстраляных 28.02.1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1975 г. на магіле ўстаноўлена стэла.

ЧАРНІЦА, вёска ў складзе калгаса «Барсукі» Слабадскога сельсавета. Размешчана за 9 км на паўднёвы захад ад горада Лепель. Назва дадзена ад мясцовасці, ад назвы прыроднага ўрочышча, у якім узнікла гэта паселішча. Па пісьмовых крыніцах населены пункт вядомы з пачатку XX ст. На 1906 г. невялічкая вёска Чарніца Валосавіцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, у якой на той час было толькі 12 гаспадарак, 116 жыхароў. У 1940 г. тут мелася 27 двароў, 85 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 10 яе жыхароў. На 1997 г. у Чарніцы было 30 падвор'яў і 55 жыхароў.

ЧАРОСАВА, вёска ў складзе калгаса «Палітаддзелец» Каменскага сельсавета. Знаходзіцца за 19 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля возера Чаросава. Назва ўтворана ад найменя возера. На пачатку XX ст. Чаросава ўяўляла сабой маленькую вёску Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было 13 двароў, каля 90 жыхароў. У 1997 г. мелася 12 падвор'яў і 28 жыхароў.

ЧАРЭЙШЧЫНА, вёска, цэнтр аграфірмы «Белая Русь» Каменскага сельсавета. Размешчана за 18 км на паўночны ўсход ад горада Лепель, каля аўтамабільнай дарогі Лепель — Віцебск (2 км). На пачатку XX ст. Чарэйшчына ўяўляла сабой маленькую вёсачку Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. тут было толькі 3 двары, 25 жыхароў. У 1924 г. мелася 39 жыхароў. У 1944 г. гітлераўцы расстралялі 8 жыхароў вёскі. На 1997 г. у Чарэйшчыне было 107 двароў, 302 жыхары. На яе тэрыторыі знаходзяцца пачатковая школа, Дом культуры, масавая бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, дзіцячыя яслі-сад, помнік — скульптура воіна (1971 г.) на ўшанаванне памяці 40 землякоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЧЭРЦЫ, вёска Лепельскага сельсавета, цэнтр Віцебскай абласной Дзяржаўнай сартавыпрабавальнай станцыі. Размешчана за 12 км на паўднёвы ўсход ад горада Лепель, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Заслонава, каля возера Чэрці, ад найменя якога атрымала сваю назву, на аўтамабільнай дарозе Лепель — Орша. У XIX — пачатку XX ст. Чэрцы былі вядомы як маёнтак Пальчэўскіх і Кладніцкіх. У 1906 г. у складзе Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета, 1 двор, 28 жыхароў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі маёнтак быў пераўтвораны ў вёску. У пачатку 1930-ых гадоў тут створаны калгас «Новы шлях», працавала кузня. На 1997 г. у вёсцы мелася 97 двароў, 251 жыхар. На тэрыторыі Чэрцаў знаходзяцца базавая школа, клуб, масавая бібліятэка, ветэрынарны ўчастак, урачэбны ўчастак, аддзяленне сувязі, магазін, аптэка, дзіцячыя яслі-сад, помнік — скульптура салдата (1971 г.) на брацкай магіле 22 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць гітлераўцаў у чэрвені 1944 г.

ШАЛАФАНЫ, вёска ў складзе калгаса «Чырвоны Сцяг» Каменскага сельсавета. Размешчана за 23 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. Шалафаны ўяўлялі сабой маленькую вёску Каменскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было толькі 10 двароў, 82 жыхары. На 1924 г. мелася 92 жыхары. У 1940 г. 36 гаспадарак, 168 жыхароў. У жніўні 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Шалафаны і загубілі 16 жыхароў. На 1997 г. мелася 10 падвор'яў, 12 жыхароў.

ШАРКОЎКА, у складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана каля возера Белае, за 5 км на паўночны ўсход ад горада Лепель. У пачатку XX ст. невялікая вёска Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1903 г. тут было створана земскае народнае вучылішча. На 1906 г. мелася 12 двароў, 42 жыхары. У 1922 г. створана працоўная школа 1-ай ступені, у якой вучылася 46 дзяцей (1924 г.). У 1997 г. мелася 19 падвор'яў, 35 жыхароў.

ШУБНІКІ, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 11 км на поўдзень ад горада Лепель. У 1906 г. Шубнікі ўяўлялі сабой невялічкую вёсачку Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні, у якой было тады толькі 12 двароў, 93 жыхары. На 1997 г. налічвалася 14 падвор'яў і 23 жыхары.

ШУНТЫ, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана за 6 км на поўнач ад горада Лепель, каля Лепельскага возера. На пачатку XX ст. Шунты ўяўлялі сабой маленькую вёску Забалацкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было толькі 6 гаспадарак і 66 жыхароў. На 1997 г. мелася 1 падвор'е, пражывала 2 чалавекі.

ЭКІМАНЬ, вёска ў складзе калгаса імя В. І. Чапаева Лепельскага сельсавета. Размешчана за 9 км на поўнач ад горада Лепель. На пачатку XX ст. Экімань (Ікімань) невялічкая вёска Несінскай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. У 1906 г. у ёй было толькі 4 двары, 39 жыхароў. У 1997 г. было 7 падвор'яў, 11 жыхароў.

ЮНДЗІЛАЎКА, вёска ў складзе саўгаса «Лепельскі» Лепельскага сельсавета. Размешчана за 12 км на поўдзень ад горада Лепель. У XIX – пачатку XX ст. вёска Юндзілаўка Гарадчэвіцкай воласці Лепельскага павета Віцебскай губерні. На 1906 г. у ёй было 30 двароў, 216 жыхароў. На 1997 г. у вёсцы Юндзілаўка налічвалася 20 падвор'яў, 40 жыхароў.

ЮРКОЎШЧЫНА, з 1939 г. Чапаева, вёска, цэнтр калгаса імя М. І. Калініна Заазерскага сельсавета. Размешчана пры возеры Лепельскае, за 10 км на поўдзень ад горада Лепель. У XIX – пачатку XX ст. паселішча было вядома як вёска Юркава Сцяна, цэнтр Франопальскай воласці Лепельскага павета. На 1886 г. у Юркавай Сцяне было 48 гаспадарак, 520 жыхароў, дзейнічала валасное праўленне і праваслаўная царква. Паводле перапісу 1897 г., 686 жыхароў. У 1906 г. 102 двары, 690 жыхароў. У 1923 г. створана хата-чытальня. На пачатку 1930-ых гадоў працавалі калгасы «Чырвоны Кастрычнік» і «Шлях Леніна», 2 кузні. У 1997 г. у вёсцы Юркоўшчына было 185 гаспадарак, 458 жыхароў. На яе тэрыторыі знаходзяцца сядзіба калгаса, механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, масавая бібліятэка, клуб, базавая школа, магазін, дзіцячыя яслі-сад.

ЮШКІ, вёска ў складзе калгаса «Пражэктар» Слабадскога сельсавета. Размешчана пры рацэ Ясь, за 10 км на поўдзень ад Лепеля. Вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. На 1906 г. маленькая вёсачка Забалацкай воласці Лепельскага павета, у якой у гэты час было толькі 9 двароў і 69 жыхароў. Паводле архіўных звестак, у 1924 г. мелася 76 жыхароў. У 1997 г. налічвалася 15 падвор'яў, 37 жыхароў.

Г. М. Новікава

ЗМЕСТ

Да чытача 17

Зямля нашых продкаў 21

З глыбіні тысячагоддзяў (21). Гарадзішчы Лепельскага раёна (24). «З заметак аб курганах Лепельскага павета» (30).

У складзе Полацкай дзяржавы і Вялікага княства Літоўскага 32

Нараджэнне дзяржавы крывічоў (32). Аб вёсках Лепельшчыны, якія ўваходзілі ў Лукомскую воласць (36). Дакументы сведчаць (38).

У складзе Рэчы Паспалітай 40

Міжусобныя войны (40). Запіс аб падараванні Льва Сапегі на карысць Лепельскага касцёла. 1604 (42).

У складзе Расійскай імперыі 43

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай (43). Бярэзінская водная сістэма (46). Дакументы сведчаць (49). Айчынная вайна 1812 г. (49). Пажар 1833 г. у Лепелі (51). Феадальна-прыгонніцкія адносіны (52). Герб горада Лепеля (53). Паўстанні ў краі. 1831—1864 гг. (54). Спіс землеўладальнікаў Лепельскага павета Віцебскай губерні 1878 г. (56). Звесткі аб насельніцтве г. Лепеля і Лепельскага павета згодна з усеагульным перапісам насельніцтва Расійскай імперыі ў 1887 г. (58). Сацыяльна-эканамічнае развіццё Лепельшчыны у другой палове XIX—пачатку XX ст. (63). Аб чым паведаміла анкета (71). Дакументы сведчаць (71). Школьная справа на Лепельшчыне ў XIX—пачатку XX ст. (74). Як жылі землякі (81). Артыкул з газеты «Наша Ніва». № 13. 20 чэрвеня 1908 г. (82). Вачыма этнографа (83). З архіва імператарскага рускага геаграфічнага таварыства (83). Развіццё адукацыі і культуры (88). Бібліятэка ў Лепелі (89). Яго адметнае слова (Ф. Тапчэўскі) (89). Іасафат Пятровіч Агрызка (91). Ян Чачот на Лепельшчыне (93). Таленавіты акцёр Карп Саленік (95). З архітэктурнай спадчыны (96). Нікольская царква (99). Камень—Губіна (99). Выходзілі часопіс і газета (100). Яны вывучалі наш край (101). У гады першай сусветнай вайны (106).

На крутым павароце гісторыі 107

Лютаўская рэвалюцыя (107). Кастрычніцкая рэвалюцыя (109). Утварэнне ССРБ і інтэрвенцыя (110). Шляхам барацьбы і выпрабаванняў (111). Дакументы сведчаць (115). Арганізатары камуны (126). Жыццё, прысвечанае саду. Садавод Я. К. Мароз (127). Нацыянальна-культурнае Адраджэнне (131). Эканамічнае развіццё раёна (132). Стальная магістраль (133). Брыгадзір трактарнай брыгады (135). Дакументы сведчаць (136). Культурнае развіццё раёна (139). Выданні РОСТА (141). Да ўсеагульнай сярэдняй (142). Лепельскі тэатр (143). З аўтабіяграфіі Стэцкага Казіміра Пятровіча (143). Іх памятаюць на Лепельшчыне (145). Тодар Кляшторны (145). «Мой бацька — Тодар». З успамінаў Т. Т. Кляшторнай (145). З успамінаў П. Прудніка (147). З успамінаў Станіслава Шушкевіча (148). Воіны-землякі, якія загінулі ў час савецка-фінляндскай вайны (1939—1940 гг.) (148). Вернутыя імёны (151). Шляхам пакут і выпрабаванняў (151). «За кіпучай чэкісцкай работай» (152). Ахвяры беспадстаўных палітычных рэпрэсій (152).

Ішла вайна народная 181

Так пачыналася вайна (181). Па старонках газеты «Віцебскі рабочы» (186). Лепельскі абарончы рубеж (187). З успамінаў Ф. П. Яско — ветэрана Вялікай Айчыннай вайны (188). Сцяг 84-га артылерыйскага палка (188). Як выратавалі лётчыка (188). Бессмяротны подзвіг (189). Лепельскі контрудар 1941 года (190). З гісторыі Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча (195). Першыя абарончыя баі (195). Выпускнікі вучылішча (198). З успамінаў Г. М. Крылова, былога палітрука Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча (198). З успамінаў М. Л. Буткевіча, ваентэхніка 2-га рангу, намесніка начальніка артузбраення Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча (199). З успамінаў В. А. Яцыны, былога курсанта Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча (200). З успамінаў В. Я. Яшына, былога курсанта Лепельскага артылерыйска-мінамётнага вучылішча (201). Лепельскае пяхотнае вучылішча (202). Акупацыя і акупацыйны рэжым (203). Дакументы сведчаць (загады, пастановы, распараджэнні нямецкіх акупацыйных улад) (205). Зверствы фашыстаў (208). Дакументы сведчаць (208). Знішчаныя населеныя пункты Лепельскага раёна (212). Трагедыя вёскі Слабодка (213). З гісторыі партызанскай лістоўкі «Отомсти фашистам!» (214). Лепельская Хатынь (215). А. Вярцінскі «Балада пра спаленую вёску і жывога пеўня» (216). З успамінаў аб Лепельскім гета Р. С. Фішкінай (216). Мой апошні арышт (217). Яму не было і адзінаццаці (219). Будзеце мае дзеці (220).

Ніколі не забыць (220). Лёс Марыі Буйніцкай (221). Гора яе не зламала (222). Лепельскае падполле (223). Салдаты слова (226). Журналіст-падпольшчык (227). Воіны нябачнага фронту (229). Успамінае былы друкар «раёнкі» (230). «Я — савецкі ўрач» (230). Мая дачка (232). Ёй і сёння 21 год (234). Сям'я патрыётаў (235). Лёс настаўніцы Лізаветы Захараўны Казлоўскай (235). Партызанскі рух (237). Полацка-Лепельская партызанская зона (243). Партызанскія брыгады, якія былі сфарміраваны і дзейнічалі на Лепельшчыне (244). Чашніцкая партызанская брыгада «Дубава» (244). Лепельская партызанская брыгада імя І. В. Сталіна (247). Дакументы сведчаць (249). Першая аперацыя (251). Аперацыя на дарозе Камень—Бароўка (252). Штурм Лепеля (252). Зацякляскі бой (256). «Пасля разгрому фашыстаў сустрэнемся, усё раскажу...» (258). Браты-артылерысты (260). Партызанскі камісар (261). Адважная партызанка (262). Дакументы сведчаць (263). З дзённіка сакратара Віцебскага падпольнага абкама КП(б)Б І. Б. Пазнякова (278). Лясная друкарня (279). Паветраны змей (280). Сувязь з Вялікай зямлёй (281). З успамінаў М. І. Абрыньбы, партызанскага мастака (281). Партызанскі баян (284). Засада (284). Здымалі партызанскую вайну (285). «Прабітыя кулямі ленты» (286). Наш доктар (287). Рабілі зброю партызаны (288). Няроўны бой (289). Дакументы сведчаць (290). Як мне дапамаглі чэхі (302). Ганніна поле (303). Жанчына з нумарам 61500 (304). Партызанскі сын (304). Ён быў піянерам (305). У 13 хлапечых гадоў (306). З гэтага моманту я стаў дарослым (307). Брыгада Б. Камінскага на Лепельшчыне (308). Баі за Пышна (311). Правал аперацыі «Котбус» (318). Апошняя граната (320). Браты Армонікі (320). Баі з карнікамі (324). З успамінаў У. Ё. Лабанка (329). Дакументы сведчаць (331). Вызваленне (334). Яны вызвалялі Лепельшчыну (336). З успамінаў Маршала Савецкага Саюза А. М. Васілеўскага (336). З успамінаў Маршала Савецкага Саюза І. Х. Баграмяна (338). З успамінаў генерал-лейтэнанта А. П. Белабародава (339). З успамінаў Маршала Савецкага Саюза М. І. Крылова (340). З успамінаў былога начальніка штаба 7-ай механізаванай брыгады 3-га Сталінградскага корпуса палкоўніка М. В. Цваткова (342). З успамінаў генерал-палкоўніка танкавых войск камандзіра 3-га Сталінградскага гвардзейскага механізаванага корпуса В. Ц. Абухава (346). З успамінаў Івана Сцяпанавіча Каламейчука, былога камандзіра 1-га артылерыйскага дывізіёна 1043-га артпалка 306-ай сд 1-га ск 43-яй арміі (348). З успамінаў былога камандзіра аддзялення разведкі штаба КАД 357-ай стралковай дывізіі А. П. Кудраўцава (349). З успамінаў Х. Атангулава, удзельніка вызвалення Лепеля (349). Іх не забудуць (349). На подступах да Лепеля (353). 43-яя армія ў Віцебскай аперацыі (355). Задума Віцебскай аперацыі (355). Ход баявых дзеянняў (356). Адважны сяржант (358). Пісьмы з фронту (359). Дакументы сведчаць (360). Ваенны будаўнік (364). У баях за Лепель (365). У небе лепельскім (365). Гэты дзень настаў (367). Ганаровыя грамадзяне Лепеля (369). Героі-землякі (371). Слаўны танкіст (372). Пераправа, пераправа (373). Адважны сокал (374). Герой з Лепельшчыны (375). Прозвішчы на абеліску (377). Выпрабаванне на трываласць (378). Кавалер трох медалёў «За адвагу» (378). У небе Літвы (379). Жыццё не па легендзе (380). З успамінаў А. Кошкіна, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны (381). Ваенныя медыкі (382). Яе называлі «сястрыца» (382). Танкіст з Лепеля (383). З успамінаў былога ваенурача А. Нізова пра лепяльчаніна Р. Я. Буяльскага (383). Апошні салют (384). Воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі ці прапалі без вестак пры вызваленні Лепельскага раёна (386). Пра тых, хто прапаў без вестак (422). Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны, загінуўшыя партызаны і асобы, якія садзейнічалі партызанскаму руху (423). Воіны, якія былі прызваны Лепельскім РВК і загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны (515). Загінуўшыя ўдзельнікі антыфашысцкага падполля (534). Мірныя жыхары, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (539).

У мірнай працы 561

З руін і папялішчаў (561). Успаміны мінёра (566). Салдатка (566). Вызначыліся працай (567). Героі Сацыялістычнай Працы (567). Яны ўзнагароджаны ордэнам Леніна (567). Заслужаныя дзеячы навукі (568). Заслужаныя настаўнікі (569). Заслужаныя ўрачы (570). Імі ганарацца землякі (571). Ганаровыя грамадзяне г. Лепеля (571). Загінулі ў ваенных канфліктах за межамі Радзімы (572). Народная асвета (573). Лепельская школа-інтэрнат (574). Лепельскі дзіцячы дом (575). З гісторыі дзіцячага дома ў Весялове (575). Лепельскі філіял Аршанскага медвучылішча (577). На варце здароўя людзей (578). Лепельскі ваенны санаторый (579). Каб былі здаровы нашы дзеці (580). На спартыўнай арбіце (580). Любімы від спорту (581). Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа (582). Лепельшчына літаратурная (582). Вярцінскі Анатоль Ільіч (582). Дудо Пятро (Пётр Дзмітрыевіч) (583). Лось Еўдакія Якаўлеўна (583). З успамінаў М. Я. Ярашэвіч пра сястру Еўдакію Лось (584). Міхно Уладзімір Фёдаравіч (584). Кляшторная Тадзіана Тадораўна (585). Мастакі Лепельшчыны (585). Мастак ад прыроды (586). Свет мастацтва (587). Перадаць творчы агеньчык (587). Установы культуры (588). Раённы Дом

культуры (588). Школа мастацтваў (589). Пашанцавала на педагога (590). Гарадскі цэнтр дзіцячай творчасці (591). Народныя калектывы (592). Тэатр «Пошук» (592). Драматычна-гумарыстычны гурток «Балаган» (592). Ансамбль жартоўнай песні «Грымзолі» (592). Аркестр народных інструментаў (592). Клуб «Ветэран» (593). Клуб «Выток» (593). Клуб «Скарбонка» (593). Фальклорныя калектывы (594). Фальклорны гурт «Оканіца» (594). Губінскія музыкі (594). Гарманісты з в. Велеўшчына (595). Фальклорны гурт «Спадчына» (595). Музеі (595). Лепельскі краязнаўчы музей (595). Школьныя музеі (596). Музей чыгункі (597). Прырода (597). Прыродная характарыстыка Лепельскага раёна (597). Бярэзінскі запаведнік (598). Веснавы Зімнік (600). Служба надвор'я (601). Лепельскія краязнаўцы (602). Чалавек і яго захапленне (602). Шушкевіч Уладзімір Канстанцінавіч (603). Традыцыі і звычаі (604). Лепельскі строй (605). З гісторыі назваў (606). Звесткі аб населеных пунктах Лепельшчыны (607). Населеныя пункты, якія не існуюць (608). Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел (609). З гісторыі населеных пунктаў (610).

ПРАЦА Ў АРХІВАХ, ПОШУК, ЗБОР І ПАДРЫХТОЎКА МАТЭРЫЯЛАЎ, НАПІСАННЕ ДАВЕДАК, СКЛАДАННЕ СПІСАЎ:

Н. М. Верасавая, В. А. Касцюкова, В. Я. Ланікіна, В. М. Пятунін, М. К. Савіцкі, А. У. Стэльмах, І. Ю. Януш.

ДАПАМАГАЛІ Ў ЗБОРЫ І ПАДРЫХТОЎЦЫ МАТЭРЫЯЛАЎ:

В. В. Барбуцкі, М. А. Галавач, Л. М. Грыб, Л. У. Колчына, Н. М. Лур'е, Л. А. Ротава, Л. М. Тухта, Т. У. Яцкевіч.

Каляровыя здымкі М. Д. Другакова

Фота: М. Д. Другакова, з фондаў Лепельскага краязнаўчага музея, асабістых архіваў.

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Лепельскі раён

Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі

Мастацкі рэдактар
А. П. Макаўцоў

Тэхнічнае рэдагаванне
і камп'ютэрная вёрстка
С. Л. Печанёвай

Карэктары
Р. П. Іваненка, Л. Р. Кузьміна,
Н. Г. Лешчанка, Ю. Ц. Петрыкеева,
Г. К. Піскунова, Г. Б. Шынкевіч

ISBN 985-01-0291-8

Падпісана да друку з арыгінала-макета 07.06.99. Фармат 70×100 1/16. Папера афс. № 1. Гарнітура Кудрашоўская. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 52,0. Ум. фарб.-адб. 57,85. Ул.-выд. арк. 58,97. Тыраж 3000 экз. Зак. 434.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 2 ад 31.12.97. 220004, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220024, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.